# ПАДАТКОВЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
(АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА)*
29 снежня 2009 г. № 71-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2009 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 18 снежня 2009 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 174-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 253, 2/1726) <H11000174>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2011 г. № 241-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 8, 2/1793) <H11100241>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877) <H11100325>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 330-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 8, 2/1882) <H11100330> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2012 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2013 г. і 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 330-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 8, 2/1882) <H11100330> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2012 г. і 1 студзеня 2013 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 330-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 8, 2/1882) <H11100330> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2012 г., 1 студзеня 2013 г. і 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2012 г. № 337-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 8, 2/1889) <H11200337>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 431-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.11.2012, 2/1983) <H11200431> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 96-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.01.2014, 2/2094) <H11300096>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 сакавіка 2015 г., 1 красавіка 2015 г., 19 красавіка 2015 г., 1 ліпеня 2015 г. і 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г. і 1 сакавіка 2015 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 красавіка 2015 г., 19 красавіка 2015 г., 1 ліпеня 2015 г. і 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г., 1 сакавіка 2015 г. і 1 красавіка 2015 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 19 красавіка 2015 г., 1 ліпеня 2015 г. і 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г., 1 сакавіка 2015 г., 1 красавіка 2015 г. і 19 красавіка 2015 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 ліпеня 2015 г. і 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г., 1 сакавіка 2015 г., 1 красавіка 2015 г., 19 красавіка 2015 г. і 1 ліпеня 2015 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 224-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2222) <H11400224> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2015 г., 1 сакавіка 2015 г., 1 красавіка 2015 г., 19 красавіка 2015 г., 1 ліпеня 2015 г. і 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 343-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2343) <H11500343> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2016 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 сакавіка 2016 г., 1 ліпеня 2016 г. і 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 343-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2343) <H11500343> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2016 г. і 1 сакавіка 2016 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 ліпеня 2016 г. і 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 343-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2343) <H11500343> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2016 г., 1 сакавіка 2016 г. і 1 ліпеня 2016 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 343-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2343) <H11500343> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2016 г., 1 сакавіка 2016 г., 1 ліпеня 2016 г. і 1 студзеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 2016 г. № 372-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.06.2016, 2/2370) <H11600372>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2016 г. № 432-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.10.2016, 2/2430) <H11600432> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2017 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2018 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2016 г. № 432-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.10.2016, 2/2430) <H11600432> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2017 г. і 1 студзеня 2018 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 15-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 12.01.2017, 2/2453) <H11700015>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 128-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.07.2018, 2/2566) <H11800128>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 159-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2019, 2/2594) – новая рэдакцыя <H11800159>

*Пры прымяненні спасылкі на Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь (яго структурны элемент) у выпадку ўнясення ў яго змяненняў і (ці) дапаўненняў, яго тлумачэння, прыпынення дзеяння, адмены або прызнання страціўшым сілу ўказваюцца дата прыняцця Агульнай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь (19 снежня 2002 года) і крыніцы афіцыйнага апублікавання Агульнай і Асаблівай частак Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ V
## РЭСПУБЛІКАНСКІЯ ПАДАТКІ, ЗБОРЫ (ПОШЛІНЫ)

## ГЛАВА 14
## ПАДАТАК НА ДАБАЎЛЕНУЮ ВАРТАСЦЬ

### Артыкул 112. Плацельшчыкі падатку на дабаўленую вартасць

Плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць (далей, калі не ўстаноўлена іншае, у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца:

арганізацыі;

індывідуальныя прадпрымальнікі з улікам асаблівасцей, устаноўленых артыкулам 113 гэтага Кодэкса;

даверныя кіраўнікі па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія ўзнікаюць у сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю, атрыманай у давернае кіраванне, у інтарэсах даручальнікаў і (ці) выгаданабытчыкаў;

фізічныя асобы, на якіх у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, мытным заканадаўствам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ускладзены абавязак па ўплаце падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 113. Асаблівасці прызнання плацельшчыкамі індывідуальных прадпрымальнікаў пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў

1. Плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў прызнаюцца:

1.1. індывідуальны прадпрымальнік, які выкарыстоўвае агульны парадак падаткаабкладання, калі сума вызначаных у парадку, устаноўленым артыкулам 205 гэтага Кодэкса, выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і даходаў у выглядзе аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці нарастаючым вынікам з пачатку года перавысіць 420 000 беларускіх рублёў без уліку падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі.

У суму выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў не ўключаецца выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) пры ажыццяўленні дзейнасці, па якой у адпаведнасці з гэтым Кодэксам выплачваюцца адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб і (ці) падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання;

1.2. індывідуальны прадпрымальнік, які выкарыстоўвае спрошчаную сістэму падаткаабкладання, калі сума вызначаных у парадку, устаноўленым артыкулам 205 гэтага Кодэкса, выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і даходаў у выглядзе аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, атрыманай ім ад камерцыйных арганізацый (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), удзельнікамі, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца ён, яго муж (жонка), бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удочароныя), нарастаючым вынікам з пачатку года перавысіць 420 000 беларускіх рублёў без уліку падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі;

1.3. індывідуальны прадпрымальнік незалежна ад узнікнення абставін, указаных у падпунктах 1.1 і 1.2 гэтага пункта, калі ім прынята рашэнне аб уплаце падатку на дабаўленую вартасць і пададзена ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне аб прынятым рашэнні.

2. Індывідуальны прадпрымальнік да заканчэння падатковага перыяду прызнаецца плацельшчыкам у адносінах да ўсіх аб'ектаў падаткаабкладання:

пры ўзнікненні абставін, указаных у падпунктах 1.1 і 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, – пачынаючы з месяца, які ідзе следам за месяцам узнікнення такіх абставін;

пры прыняцці рашэння аб уплаце падатку на дабаўленую вартасць – пачынаючы з месяца, які ідзе следам за месяцам падачы паведамлення аб прынятым рашэнні, калі іншае не прадугледжана часткай другой гэтага пункта.

Індывідуальны прадпрымальнік, дзяржаўная рэгістрацыя якога ажыццёўлена ў бягучым падатковым перыядзе, які падаў паведамленне аб прынятым рашэнні ў месяцы яго дзяржаўнай

рэгістрацыі, прызнаецца плацельшчыкам у адносінах да ўсіх аб'ектаў падаткаабкладання пачынаючы з месяца падачы паведамлення аб прынятым рашэнні і да заканчэння падатковага перыяду.

**Артыкул 114. Выкананне абавязку плацельшчыка беларускімі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі**

1. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва і якія не знаходзяцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – замежныя арганізацыі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь), абавязак па падліку і выплаце ў бюджэт падатку на дабаўленую вартасць ускладаецца на арганізацыі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і, калі іншае не ўстаноўлена артыкулам 141 гэтага Кодэкса, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія набываюць гэтыя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы.

Такія арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі маюць правы і нясуць абавязкі, установленыя артыкуламі 21 і 22 гэтага Кодэкса.

2. Замежныя арганізацыі, у тым ліку генеральныя падрадчыкі, субпадрадчыкі, якія ажыццяўляюць будаўніцтва ці зборку аб'ектаў і знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, падлічваюць і плацяць падатак на дабаўленую вартасць з пачатку ажыццяўлення такой дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў абавязак па падліку і выплаце ў бюджэт падатку на дабаўленую вартасць ускладаецца на арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на аснове такіх дагавораў з замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

Такія арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі маюць правы і нясуць абавязкі, установленыя артыкуламі 21 і 22 гэтага Кодэкса.

4. Абавязак па падліку і выплаце ў бюджэт падатку на дабаўленую вартасць ускладаецца таксама на арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, удзельнічаюць у разліках непасрэдна з замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, і заключылі з такімі замежнымі арганізацыямі дагавор (у тым ліку дагавор, які ўстанаўлівае аказанне паслуг па заключэнні дагавору на набыццё (рэалізацыю) прац (паслуг), маёмасных правоў), у выніку якога тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы рэалізуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Такія арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі маюць правы і нясуць абавязкі, установленыя артыкуламі 21 і 22 гэтага Кодэкса.

5. На абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, распаўсюджваюцца палажэнні пункта 2 артыкула 115 і пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 115. Аб'екты падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць прызнаюцца:

1.1. абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, уключаючы абароты:

1.1.1. па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў плацельшчыкам сваім работнікам;

1.1.2. па абмене таварамі (працамі, паслугамі), маёмаснымі правамі;

1.1.3. па бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

1.1.4. па перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па пагадненні аб даванні наўзамен выканання абавязацельства адступнога, а таксама прадмета закладу заклададавальнікам закладатрымальніку (крэдытору) пры невыкананні ці неналежным выкананні забяспечанага закладам абавязацельства;

1.1.5. па перадачы лізінгадавальнікам прадмета дагавору фінансавай арэнды (лізінгу) (далей – прадмет лізінгу) лізінгаатрымальніку;

1.1.6. па здачы арэндадаўцам аб'екта арэнды арандатару;

1.1.7. па адгрузцы (звароту) зваротнай тары прадаўцом пакупніку (пакупнікам прадаўцу).

Зваротнай тарай з'яўляецца тара, кошт якой не ўключаецца ў цану рэалізацыі тавараў, якія адгружаюцца ў ёй, і якая падлягае звароту прадаўцу тавараў на ўмовах і ў тэрміны, устаноўленыя дагаворам ці заканадаўствам;

1.1.8. па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія ўзнікаюць у давернага кіраўніка ў сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю па дагаворы давернага кіравання маёмасцю ў інтарэсах даручальніка (выгаданабытчыка);

1.1.9. па перадачы тавараў у рамках дагавору пазыкі ў выглядзе рэчаў;

1.1.10. па іншым выбыцці тавараў уласнай вытворчасці, змешчаных пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, у магазінах бяспошліннага гандлю, калі пры іх набыцці ў таварна-транспартных накладных была вылучана стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў у адпаведнасці з падпунктам 1.10 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса;

1.1.11. па перадачы маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці;

1.1.12. па рэалізацыі маёмасці даўжніка ў рамках выканаўчага вядзення, уключаючы перадачу маёмасці даўжніка спагнанніку;

1.1.13. па перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне пазыкаатрымальніку;

1.1.14. па перадачы абанентам субабанентам усіх відаў атрыманых энергіі, газу, вады;

1.2. увоз тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і (ці) іншыя абставіны, з наяўнасцю якіх гэты Кодэкс і (ці) акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, мытнае заканадаўства, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, звязваюць узнікненне абавязку па ўплаце падатку на дабаўленую вартасць.

2. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць не прызнаюцца:

2.1. сумы, атрыманыя ўпаўнаважанымі органамі за здзейсненыя юрыдычна значныя дзеянні пры даванні арганізацыям і фізічным асобам пэўных правоў (дзяржаўная пошліна, патэнтныя пошліны, консульскі збор), выплаты ў бюджэт або ў бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

2.2. здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)) прадпрыемства ў цэлым як маёмаснага комплексу, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, , пры якой атрыманыя сумы арэнднай платы падлягаюць пералічэнню ў даход бюджэту;

2.3. адчужэнне маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры якім атрыманыя грашовыя сродкі падлягаюць накіраванню ў бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, якія рэгулююць парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, і (ці) на мэты, вызначаныя гэтымі актамі заканадаўства, або падлягаюць размеркаванню згодна з указанымі актам заканадаўства, у тым ліку:

у працэсе прыватызацыі маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

вызваленых матэрыяльных рэсурсаў Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый Рэспублікі Беларусь;

2.4. перадача ў рамках дагавору простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці):

тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг), маёмасных правоў у якасці ўкладу ўдзельніка простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці) у агульную справу (за выключэннем тавараў, адчужальных на ўмовах указанага дагавора іншаму ўдзельніку);

тавараў пры падзеле тавараў, якія знаходзіліся ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці);

расходаў, якія кампенсуюцца ўдзельніку ў адпаведнасці з дагаворам простай суполкі (дагаворам аб сумеснай дзейнасці) асобай, якая ажыццяўляе вядзенне агульных спраў;

2.5. бязвыплатная перадача:

2.5.1. маёмасці (прац, паслуг) беларускім арганізацыям, якія ажыццяўляюць гаспадарчую дзейнасць па вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалаводства, пры ўмове выкарыстання атрыманай маёмасці (прац, паслуг) для ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці па вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалаводства;

2.5.2. маёмасці, пры набыцці (увозе) якой сумы падатку на дабаўленую вартасць аплачаны за кошт бязвыплатна атрыманых сродкаў бюджэту або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і аднесены на павелічэнне яе кошту ці за кошт указаных крыніц;

2.5.3. арганізацыям культуры:

культурных каштоўнасцей;

тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў для ажыццяўлення культурнай дзейнасці.

Для мэт гэтай главы і главы 16 гэтага Кодэкса да культурнай дзейнасці адносяцца віды дзейнасці, вызначаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

2.5.4. дзяржаўнай маёмасці, за выключэннем тавараў, указаных у частцы першай падпункта 2.6 гэтага пункта;

2.5.5. тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы аплату рахункаў за набытыя і перададзеныя тавары (выкананыя працы, аказаныя паслугі), маёмасныя правы бюджэтным арганізацыям аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізкультуры і спорту;

2.6. абароты па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (уключаючы абароты па бязвыплатнай перадачы) бюджэтнымі арганізацыямі набытых (бязвыплатна атрыманых) тавараў, за выключэннем асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, па цэнах іх набыцця (для бязвыплатна атрыманых тавараў – па цэнах іх атрымання).

Пад цаной набыцця (атрымання) тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, разумеецца цана з падаткам на дабаўленую вартасць (цана без падатку на дабаўленую вартасць – для тавараў, абароты па рэалізацыі якіх не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць або вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам), указаная прадаўцом тавараў у першасных уліковых дакументах, якія прымяняюцца пры адгрузцы тавараў;

2.7. унутраныя абароты арганізацый, якія вядуць лясную гаспадарку;

2.8. перадача членам:

2.8.1. некамерцыйных арганізацый тавараў (прац, паслуг), набытых (увезеных) за кошт паявых (членскіх) узносаў;

2.8.2. прафсаюзнай арганізацыі, якія з'яўляюцца работнікамі, што маюць працоўныя адносіны з наймальнікам, тавараў (прац, паслуг), набытых за кошт адлічэнняў, якія атрымліваюцца прафсаюзнай арганізацыяй ад наймальніка ў адпаведнасці з калектыўным дагаворам;

2.9. абароты па аплатнай і бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), уключаючы асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы, маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых часткай другой гэтага падпункта.

Калі ў склад адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь уваходзіць хаця б адно адасобленае падраздзяленне, якое выконвае падатковыя абавязацельствы гэтай юрыдычнай асобы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, то могуць праводзіцца падлік і ўплата падатку на дабаўленую вартасць (прымяняцца вызваленне ад падаткаабкладання):

адасобленым падраздзяленнем юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь, якое выконвае падатковыя абавязацельствы гэтай юрыдычнай асобы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы;

юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы адасобленаму падраздзяленню, якое выконвае падатковыя абавязацельствы гэтай юрыдычнай асобы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Пералік тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры перадачы якіх у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь праводзяцца падлік і ўплата падатку на дабаўленую вартасць (прымяняецца вызваленне ад падаткаабкладання), паказваецца ва ўліковай палітыцы плацельшчыка;

2.10. абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў беларускімі арганізацыямі (філіяламі юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь), зарэгістраванымі ў якасці плацельшчыкаў за межамі Рэспублікі Беларусь, у частцы дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь;

2.11. вываз тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза ў сувязі з іх перадачай у граніцах адной юрыдычнай асобы;

2.12. абароты па пакрыцці:

2.12.1. суполцы ўласнікаў (арганізацыі забудоўшчыкаў, гаражнаму кааператыву, садаводчай суполцы, дачнаму кааператыву, кааператыву, які ажыццяўляе эксплуатацыю аўтамабільных стаянак) яго ўдзельнікамі (членамі) кошту:

тавараў (прац, паслуг), набытых для гэтых удзельнікаў (членаў) і звязаных з утрыманнем і эксплуатацыяй нерухомай маёмасці;

выкананых прац (аказаных паслуг) для гэтых удзельнікаў (членаў) і звязаных з утрыманнем і эксплуатацыяй нерухомай маёмасці;

тавараў, уключаных у кошт прац (паслуг), указаных у абзацы трэцім гэтага падпункта;

2.12.2. арэндадаўцу (лізінгадавальніку) арандатарам (лізінгаатрымальнікам) кошту набытых прац (паслуг), звязаных з арэндай (фінансавай арэндай (лізінгам)), не ўключанага ў суму арэнднай платы (лізінгавага плацяжу), за выключэннем выпадкаў, устаноўленых падпунктам 9.3 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

Дадзенае палажэнне распаўсюджваецца на абароты па пакрыцці арандатару (лізінгаатрымальніку) арэндадаўцам (лізінгадавальнікам) кошту набытых прац (паслуг), звязаных з арэндай (фінансавай арэндай (лізінгам));

2.12.3. пакупніком тавараў іх прадаўцу кошту набытых паслуг па дастаўцы (перавозцы) тавараў, не ўключаных у кошт гэтых тавараў;

2.12.4. камісіянеру (паверанаму) камітэнтам (давернікам) сум расходаў на набыццё тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не пакрываюцца ўзнагародай камісіянера (паверанага);

2.12.5. экспедытару кліентам па дагаворы транспартнай экспедыцыі сум расходаў на набыццё выкарыстаных пры аказанні паслуг па гэтым дагаворы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, указаных у дагаворы транспартнай экспедыцыі і не пакрытых узнагародай экспедытара;

2.12.6. бібліятэкам затрат, звязаных з вырабам чытацкіх білетаў;

2.12.7. плацельшчыку, які вырабляе падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны, указаных у пункце 5 артыкула 160 гэтага Кодэкса сум акцызаў уласнікам падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны;

2.13. уступка:

2.13.1. права патрабавання першапачатковым крэдытoрам, якая ўзнікае з дагавораў, накіраваных на рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у суме, якая не перавышае памер першапачатковага абавязацельства па такіх дагаворах;

2.13.2. правоў (патрабаванняў) спецыяльнай фінансавай арганізацыі пры сек’юрытызацыі;

2.14. адчужэнне маёмасці па судовай пастанове ў парадку спагнання падаткаў, збораў (пошлін), пеняў, штрафаў за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў і (ці) злачынстваў;

2.15. кошт харчавання, падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, прац (паслуг), набытых (аплачаных) плацельшчыкам для сваіх работнікаў і (ці) членаў іх сямей, а таксама для пенсіянераў, якія раней у яго працавалі;

2.16. абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам Рэспублікі Беларусь;

2.17. абароты па рэалізацыі доляў у статутных фондах арганізацый або іх частак;

2.18. абароты па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), якія пастаўляюцца, перадаюцца (выконваюцца, аказваюцца) пастаўшчыком тавараў (прац, паслуг) праекта (праграмы) міжнароднай тэхнічнай дапамогі і (ці) атрымальнікам міжнароднай тэхнічнай дапамогі для яе ажыццяўлення, а таксама абароты па іх далейшай бязвыплатнай перадачы ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі праектаў (праграм) міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

2.19. перадача маёмасці:

давернаму кіраўніку даручальнікам па дагаворы давернага кіравання маёмасцю;

якая вяртаецца даручальніку даверным кіраўніком пры спыненні дагавора давернага кіравання маёмасцю;

2.20. абароты па перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, пры якой:

2.20.1. не праводзіцца пакрыццё пазыкадавальніку расходаў на ўтрыманне маёмасці і (ці) іншых расходаў, звязаных з маёмасцю, у тым ліку:

сум налічанай амартызацыі, зямельнага падатку ці арэнднай платы за зямельны ўчастак, падатку на нерухомасць;

расходаў на эксплуатацыю, рамонт маёмасці;

затрат на камунальныя паслугі;

2.20.2. абавязак пакрыцця пазыкадавальніку расходаў, указаных у падпункце 2.20.1 гэтага пункта, прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых падпунктам 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага  Кодэкса.

Для мэт гэтага  падпункта да абаротаў па перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне адносяцца падлеглыя пакрыццю пазыкадавальніку наступныя яго расходы:

сумы налічанай амартызацыі, зямельнага падатку ці арэнднай платы за зямельны ўчастак, падатку на нерухомасць;

кошт набытых ім прац (паслуг) па ўтрыманні маёмасці і (ці) іншых набытых ім прац (паслуг), звязаных з маёмасцю (у тым ліку расходаў на эксплуатацыю, рамонт маёмасці, затрат на камунальныя паслугі);

2.21. абароты па рэалізацыі тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру рээкспарту;

2.22. абароты па рэалізацыі рэлігійнымі арганізацыямі ў рамках рэлігійнай дзейнасці:

2.22.1. паслуг па арганізацыі і правядзенні рэлігійных абрадаў, цырымоній, малітоўных сходаў ці іншых культавых дзеянняў;

2.22.2. рэлігійнай літаратуры і (ці) прадметаў рэлігійнага прызначэння (акрамя падакцызных);

2.23. абароты па выпуску матэрыяльных каштоўнасцей з дзяржаўнага і (ці) мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, а таксама па вяртанні і пастаўцы матэрыяльных каштоўнасцей у дзяржаўны і (ці) мабілізацыйны матэрыяльныя рэзервы пры ажыццяўленні аперацый па асвяжэнні, запазычанні, замене, перамяшчэнні, назапашанні, разбраніраванні гэтых матэрыяльных каштоўнасцей у адпаведнасці з заканадаўствам адказнымі захавальнікамі і пастаўшчыкамі;

2.24. абароты па рэалізацыі каштоўных папер (у тым ліку пры іх размяшчэнні, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам), форвардных і ф'ючарсных кантрактаў, апцыёнаў і іншых фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, за выключэннем рэалізацыі фінансавых інструментаў, якія прадугледжваюць пастаўку базіснага актыву.

Для мэт гэтай главы да абаротаў па рэалізацыі каштоўных папер:

адносяцца непасрэдна рэалізацыя каштоўных папер, камісійныя даходы (уключаючы ўзнагароджанні па дагаворах камісіі ці даручэння) па аперацыях з каштоўнымі паперамі, налічэнне даходаў, дэпазітарная дзейнасць, а таксама пагашэнне каштоўных папер эмітэнтам у форме, устаноўленай заканадаўствам;

не адносяцца рэалізацыя бланкаў каштоўных папер, бланкаў разліковых і плацежных дакументаў, а таксама банкаўскіх плацежных картак;

2.25. абароты ад ажыццяўлення дзейнасці па здзяйсненні ініцыяваных фізічнымі і юрыдычнымі асобамі аперацый з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі (дзейнасці на пазабіржавым рынку Форэкс);

2.26. абароты па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прац (паслуг), якія выконваюцца (аказваюцца):

органамі ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (іх падраздзяленнямі);

органамі і падраздзяленнямі па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

Палажэнні гэтага падпункта прымяняюцца таксама ў адносінах да аперацый па здачы аб'екта арэнды ў арэнду;

2.27. аперацыі па даванні аплатных грашовых пазык, у тым ліку камерцыйных пазык, якія даюцца пакупнікамі тавараў (прац, паслуг) у выглядзе авансу ці папярэдняй аплаты.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца ў адносінах да:

мікрапазык, якія даюцца камерцыйнымі арганізацыямі, уключанымі Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у рэестр мікрафінансавых арганізацый, фізічным асобам пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання;

камерцыйных пазык, якія даюцца прадаўцамі тавараў (прац, паслуг) у выглядзе адтэрміноўкі ці растэрміноўкі аплаты адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг);

2.28. абароты па рэалізацыі:

каштоўных металаў пры заключэнні дагавору з перапрацоўчай арганізацыяй на пастаўку каштоўных металаў у выглядзе лому і адходаў з абавязацельствам перапрацоўчай арганізацыі па іх перапрацоўцы і пастаўцы атрыманых каштоўных металаў у Дзяржаўны фонд каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – Дзяржфонд);

каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама выкананых прац (аказаных паслуг) пры водпуску каштоўных металаў і каштоўных камянёў з Дзяржфонда;

2.29. выдача:

акцызных марак Рэспублікі Беларусь, кантрольных і спецыяльных марак для маркіроўкі алкагольных напояў, акцызных марак Рэспублікі Беларусь і спецыяльных марак для маркіроўкі тытунёвых вырабаў, кантрольных (ідэнтыфікацыйных) знакаў для маркіроўкі тавараў, кантрольных знакаў для маркіроўкі суправаджальных дакументаў, інструкцый (метадычных указанняў) па кантролі сапраўднасці ўказаных марак і знакаў у камплекце з ідэнтыфікатарам латэнтнай (скрытай) выявы;

рахункаў-даведак на рэалізацыю аўтамотатранспарту;

кніг заўваг і прапаноў;

марак пошлін і збораў, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

2.30. абароты па рэалізацыі:

2.30.1. прадпрыемства як маёмаснага комплексу даўжніка ў працэдуры конкурснага вядзення;

2.30.2. маёмасці даўжніка, прызнанага ў адпаведнасці з заканадаўствам эканамічна неплацежаздольным (банкрутам), у працэдуры ліквідацыйнага вядзення, уключаючы перадачу маёмасці крэдыторам;

2.31. абароты па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, якія фінансуюцца з бюджэту, вырабаў, выраблёных:

у рамках лячэбна-працоўнай дзейнасці і на занятках у гуртках па інтарэсах;

пры правядзенні мерапрыемстваў па развіцці даступных працоўных навыкаў інвалідаў;

2.32. абароты па рэалізацыі тавараў, прац (паслуг), маёмасных правоў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь.

3. Месца рэалізацыі тавараў вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 116 гэтага Кодэкса.

4. Месца рэалізацыі прац (паслуг), маёмасных правоў вызначаецца ў адпаведнасці:

з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, які складае права Еўразійскага эканамічнага саюза, у выпадку рэалізацыі прац (паслуг), маёмасных правоў у дзяржавах – членах Еўразійскага эканамічнага саюза;

з артыкулам 117 гэтага Кодэкса – у іншых выпадках.

5. Палажэнні пункта 2 гэтага артыкула распаўсюджваюцца таксама на ўказаныя ў пункце 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса сумы, атрыманыя (належныя да атрымання) па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, абароты па рэалізацыі (па перадачы, па пакрыцці) якіх не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання згодна з пунктам 2 гэтага артыкула.

6. Палажэнні гэтай главы, якія вызначаюць парадак падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць:

6.1. па дагаворах арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), прымяняюцца таксама ў адносінах да дагавораў найму жылога памяшкання і бязвыплатнага карыстання;

6.2. камітэнтамі і (ці) давернікамі, прымяняюцца таксама для кансігнантаў і іншых аналагічных асоб;

6.3. камісіянерамі і (ці) паверанымі, прымяняюцца таксама кансігнатарамі і іншымі аналагічнымі асобамі.

7. Для мэт гэтай главы:

7.1. да тавараў не адносяцца грошы і маёмасныя правы;

7.2. здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці па дагаворы арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), які прадугледжвае вяртанне аб'екта арэнды (прадмета лізінгу) пасля завяршэння прадугледжанага дагаворам арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)) тэрміну часовага валодання і карыстання, з'яўляецца абаротам па рэалізацыі паслуг;

7.3. здача маёмасці ў арэнду па дагаворы арэнды, які прадугледжвае выкуп аб'екта арэнды, з'яўляецца абаротам па рэалізацыі:

паслуг у частцы арэндных выплат;

тавару ў частцы выкупной цаны;

7.4. перадача маёмасці ў фінансавую арэнду (лізінг) па дагаворы (фінансавай арэнды (лізінгу)), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, з'яўляецца абаротам па рэалізацыі:

тавару – у частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу, па якім прадмет лізінгу перададзены. Кантрактны кошт прадмета лізінгу ўключае ў тым ліку выкупны кошт;

паслуг – у частцы ўзнагароджання (даходу) лізінгадавальніка і інвестыцыйных расходаў лізінгадавальніка, за выключэннем інвестыцыйных расходаў, якія кампенсуюцца ў кошце прадмета лізінгу.

**Артыкул 116. Месца рэалізацыі тавараў**

1. Месцам рэалізацыі тавараў прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі:

1.1. тавар знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і не адгружаецца і не транспартуецца:

пакупніку (атрымальніку, указанаму пакупніком);

камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе (атрымальніку, указанаму камісіянерам, паверанным ці іншай аналагічнай асобай) – пры рэалізацыі тавараў на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных дагавораў;

1.2. тавар у момант пачатку адгрузкі ці транспарціроўкі:

пакупніку (атрымальніку, указанаму пакупніком) знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе (атрымальніку, указанаму камісіянерам, паверанным ці іншай аналагічнай асобай) знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь – пры рэалізацыі тавараў на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных дагавораў.

2. Пры рэалізацыі тавараў плацельшчыкам Рэспублікі Беларусь плацельшчыку іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, калі перавозка (транспарціроўка) тавару пачата за межамі мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза і завершана ў іншай дзяржаве – члене Еўразійскага эканамічнага саюза, месцам рэалізацыі такога тавару прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі на яе тэрыторыі тавар змяшчаецца пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання.

**Артыкул 117. Месца рэалізацыі прац, паслуг, маёмасных правоў**

1. Месцам рэалізацыі прац, паслуг, маёмасных правоў прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі:

1.1. працы, паслугі непасрэдна звязаны з нерухомай маёмасцю, у тым ліку з той, якая будуецца (за выключэннем паветраных, марскіх суднаў і суднаў унутранага плавання, а таксама касмічных аб'ектаў), якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Гэта палажэнне прымяняецца таксама ў адносінах да:

здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) і ў наём нерухомай маёмасці;

паслуг экспертаў і агентаў па ацэнцы нерухомай маёмасці, непасрэдна звязаных з нерухомай маёмасцю інжынірынгавых, дызайнерскіх паслуг, паслуг аўтарскага і тэхнічнага нагляду за будаўніцтвам;

1.2. працы, паслугі звязаны з рухомай маёмасцю, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)) рухомай маёмасці, уключаючы транспартныя сродкі.

Гэта палажэнне прымяняецца таксама ў адносінах да паветраных, марскіх суднаў і суднаў унутранага плавання, а таксама касмічных аб'ектаў;

1.3. паслугі фактычна аказваюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у сферы:

культуры, мастацтва, фізічнай культуры і спорту, турызму, адпачынку;

навучання (адукацыі), за выключэннем паслуг у сферы навучання (адукацыі), пры якіх атрыманне адукацыі ажыццяўляецца ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі;

1.4. пакупнік (набытчык) прац, паслуг, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і (ці) месцам яго знаходжання (месцам жыхарства) з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

У выпадку, калі пакупніком прац, паслуг, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці з'яўляецца замежная арганізацыя, а спажыўцом з'яўляюцца яе прадстаўніцтва, пастаяннае прадстаўніцтва ці філіял, якія ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і (ці) месцам знаходжання якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, то месцам рэалізацыі прац, паслуг, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці:

прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена абзацам трэцім гэтай часткі;

не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь у адносінах да прац, паслуг, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці (за выключэннем арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)) рухомай маёмасці, якая не з'яўляецца транспартным сродкам), расходы на набыццё якіх адлюстроўваюцца ў заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, указаным у пункце 10 артыкула 180 гэтага  Кодэкса.

Палажэнні гэтага  падпункта прымяняюцца ў адносінах да наступных прац, паслуг, маёмасных правоў:

маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

аўдытарскіх, кансультацыйных, маркетынгавых, юрыдычных, бухгалтарскіх, інжынірынгавых паслуг;

рэкламных паслуг, за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

паслуг па прадстаўленні інфармацыі;

паслуг па апрацоўцы інфармацыі, за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

дызайнерскіх паслуг (уключаючы паслугі па распрацоўцы дызайн-макетаў);

паслуг у сферы навучання (адукацыі), пры якіх атрыманне адукацыі ажыццяўляецца ў дыстанцыйнай форме атрымання адукацыі;

навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных (тэхналагічных) прац;

паслуг па даванні, найме персаналу ў выпадку, калі персанал працуе ў месцы дзейнасці пакупніка;

арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)) рухомай маёмасці, за выключэннем транспартных сродкаў;

паслуг (прац) па распрацоўцы, мадыфікацыі, тэсціраванні і забеспячэнні тэхнічнай падтрымкі праграмнага забеспячэння;

паслуг хостынгу (размяшчэння інфармацыйных рэсурсаў на серверы і забеспячэння доступу да гэтых рэсурсаў), у тым ліку паслуг вэб-хостынгу (уключаючы комплексныя паслугі па размяшчэнні і кіраванні вэб-сайтамі), за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

паслуг па стварэнні баз даных, забеспячэнні доступу да баз даных, за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

паслуг, з дапамогай якіх ажыццяўляецца пошук і (ці) даецца заказчыку інфармацыя аб патэнцыяльных пакупніках (спажыўцах), за выключэннем аказання паслуг у электроннай форме;

паслуг асобай, якая прыцягвае ад свайго імя для асноўнага ўдзельніка дагавора (кантракта) або ад імя асноўнага ўдзельніка дагавора (кантракта) іншую асобу для выканання прац (аказання паслуг), прадугледжаных гэтым падпунктам;

паслуг у электроннай форме;

1.5. пакупніком (набытчыкам) паслуг у электроннай форме з'яўляецца фізічная асоба (у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік), якая адпавядае крытэрыям, вызначаным пунктам 2 артыкула 141 гэтага Кодэкса (далей у гэтай главе – фізічная асоба (у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік), якая набывае паслугі ў электроннай форме ў Рэспубліцы Беларусь);

1.6. дзейнасць арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка ажыццяўляецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і (ці) месцам іх знаходжання (месцам жыхарства) з'яўляецца Рэспубліка Беларусь і імі выконваюцца працы, аказваюцца паслугі, рэалізуюцца (перадаюцца) маёмасныя правы (за выключэннем маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці), не прадугледжаныя падпунктамі 1.1–1.5 гэтага пункта.

Гэта палажэнне прымяняецца, у прыватнасці, у адносінах да:

паслуг па перавозцы тавараў, пасажыраў і іх багажу;

арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)) транспартных сродкаў, уключаючы арэнду (фрахт) транспартных сродкаў з экіпажам.

2. У выпадку, калі ў рамках аднаго кантракта (дагавора) выконваецца, аказваецца некалькі відаў прац, паслуг і рэалізацыя адных прац, паслуг носіць дапаможны характар у адносінах да рэалізацыі іншых прац, паслуг, месцам рэалізацыі дапаможных прац, паслуг прызнаецца месца рэалізацыі асноўных прац, паслуг.

3. Для мэт гэтага артыкула:

транспартныя сродкі – марскія і паветраныя судны, судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання, адзінкі чыгуначнага ці трамвайнага рухомага саставу, аўтобусы, аўтамабілі, уключаючы прычэпы і паўпрычэпы, грузавыя кантэйнеры, кар'ерныя самазвалы, якія выкарыстоўваюцца для перавозкі людзей ці грузаў;

адзінкі чыгуначнага рухомага саставу – асобныя аб'екты чыгуначнага рухомага саставу: лакаматывы, грузавыя і пасажырскія, маторныя і нематорныя вагоны, з якіх фарміруюцца электрацягнікі, дызель-цягнікі, аўтаматрысы, рэйкавыя аўтобусы, дызель-электрацягнікі, электраматрысы, прызначаныя для перавозкі грузаў, людзей і (ці) багажу, пошты.

4. Да паслуг у электроннай форме адносяцца:

4.1. даванне правоў на выкарыстанне праграмнага забеспячэння (уключаючы камп'ютарныя гульні), баз даных, іх абнаўленняў і дадатковых функцыянальных магчымасцей праз сетку Інтэрнэт, у тым ліку шляхам давання аддаленага доступу да іх, а таксама электронных кніг (выданняў) і іншых электронных публікацый, інфармацыйных, адукацыйных матэрыялаў, графічных выяў, музычных твораў з тэкстам ці без тэксту, аўдыявізуальных твораў праз сетку Інтэрнэт, у тым ліку шляхам давання аддаленага доступу да іх для прагляду і (ці) праслухоўвання праз сетку Інтэрнэт;

4.2. рэкламныя паслугі ў сетцы Інтэрнэт, у тым ліку з выкарыстаннем праграм для электронна-вылічальных машын і баз даных, якія функцыянуюць у сетцы Інтэрнэт, а таксама даванне месца і часу для рэкламы ў сетцы Інтэрнэт;

4.3. паслугі па размяшчэнні прапаноў аб набыцці (рэалізацыі) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у сетцы Інтэрнэт;

4.4. паслугі, якія ажыццяўляюцца аўтаматычным спосабам праз сетку Інтэрнэт пры ўводзе даных пакупніком паслуг, аўтаматызаваныя паслугі па пошуку даных, іх адборы і сартаванні па запытах, даванні ўказаных даных карыстальнікам праз інфармацыйна-тэлекамунікацыйныя сеткі (у тым ліку зводкі фондавай біржы ў рэжыме рэальнага часу, ажыццяўленне ў рэжыме рэальнага часу аўтаматызаванага перакладу);

4.5. паслугі па пошуку і (ці) даванні заказчыку інфармацыі аб патэнцыяльных пакупніках;

4.6. паслугі па даванні праз сетку Інтэрнэт тэхнічных, арганізацыйных, інфармацыйных і іншых магчымасцей, якія ажыццяўляюцца з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій і сістэм, для наладжвання кантактаў і заключэння здзелак паміж прадаўцамі і пакупнікамі (уключаючы даванне гандлёвай пляцоўкі, якая функцыянуе ў сетцы Інтэрнэт у рэжыме рэальнага часу, на якой патэнцыяльныя пакупнікі прапаноўваюць сваю цану праз аўтаматызаваную працэдуру і бакі апавяшчаюцца аб продажы шляхам адпраўленага аўтаматычна створанага паведамлення);

4.7. забеспячэнне і (ці) падтрыманне прысутнасці ў сетцы Інтэрнэт для асабістых мэт ці ў мэтах ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, падтрымка электронных рэсурсаў карыстальнікаў (сайтаў і (ці) старонак сайтаў у сетцы Інтэрнэт), забеспячэнне доступу да іх іншых карыстальнікаў сеткі Інтэрнэт, даванне карыстальнікам магчымасці іх мадыфікацыі, аказанне паслуг па адміністраванні інфармацыйных сістэм;

4.8. захоўванне і апрацоўка інфармацыі пры ўмове, што асоба, якая дала гэту інфармацыю, мае да яе доступ праз сетку Інтэрнэт;

4.9. даванне ў рэжыме рэальнага часу вылічальнай магутнасці для размяшчэння інфармацыі ў інфармацыйнай сістэме;

4.10. даванне даменных імёнаў, аказанне паслуг хостынгу;

4.11. даванне доступу да пошукавых сістэм у сетцы Інтэрнэт;

4.12. вядзенне статыстыкі на сайтах у сетцы Інтэрнэт;

4.13. паслугі па арганізацыі і (ці) правядзенні праз сетку Інтэрнэт азартных гульняў.

5. Да паслуг у электроннай форме не адносяцца:

5.1. рэалізацыя тавараў (прац, паслуг), калі пры заказе праз сетку Інтэрнэт пастаўка тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг) ажыццяўляецца без выкарыстання сеткі Інтэрнэт;

5.2. рэалізацыя (перадача правоў на выкарыстанне) праграм для электронна-вылічальных машын (уключаючы камп'ютарныя гульні), баз даных, якія змяшчаюцца на матэрыяльных носьбітах;

5.3. аказанне кансультацыйных паслуг па электроннай пошце;

5.4. аказанне паслуг па даванні доступу да сеткі Інтэрнэт.

**Артыкул 118. Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць абароты па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:

1.1. лекавых сродкаў, медыцынскіх вырабаў па пераліку, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, пры выкананні адной з наступных умоў:

у адносінах да зарэгістраваных лекавых сродкаў, медыцынскіх вырабаў – уключэнне звестак аб іх адпаведна ў Дзяржаўны рэестр лекавых сродкаў Рэспублікі Беларусь ці Дзяржаўны рэестр вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі Рэспублікі Беларусь;

у адносінах да незарэгістраваных лекавых сродкаў, медыцынскіх вырабаў – наяўнасць дазволу на рэалізацыю і (ці) медыцынскае прымяненне незарэгістраваных лекавых сродкаў, медыцынскіх вырабаў, які выдае Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.2. медыцынскіх паслуг (за выключэннем касметалагічных паслуг нелячэбнага характару). Для мэт гэтага падпункта да медыцынскіх паслуг адносяцца:

1.2.1. дыягнастычныя паслугі:

лабараторная дыягностыка – агульнаклінічныя (неінвазійныя) і біяхімічныя метады даследавання, мікрабіялагічная, гематалагічная, генетычная, імуналагічная, цыталагічная, клінічна-марфалагічная (гісталагічная), паразіталагічная, ВІЧ-дыягностыка;

прамянёвая дыягностыка – рэнтгеналагічная, радыенуклідная, камп'ютарная тамаграфія, магнітна-рэзанансная тамаграфія, ультрагукавая, цеплабачанне, паталага-анатамічная, функцыянальная, эндаскапічная дыягностыка;

1.2.2. спецыялізаваныя медыцынскія паслугі ў галіне:

акушэрства, алергалогіі і імуналогіі, анестэзіялогіі, вакцынацыі, венералогіі, гастраэнтэралогіі, гематалогіі, генетыкі, гінекалогіі, дэрматалогіі, дыеталогіі, інфекцыйных хвароб, кардыялогіі, камбустыялогіі, лячэбнай фізкультуры, прамянёвай тэрапіі, масажу, наркалогіі, неўралогіі, нефралогіі, артапедыі, афтальмалогіі, практалогіі і прафпаталогіі;

анкалогіі, у тым ліку мамалогіі і анкагематалогіі;

атарыналарынгалогіі, у тым ліку сурдалогіі;

педыятрыі, у тым ліку неанаталогіі;

пратэзавання (малочнай залозы, вочнага, вушнога, суставаў, канечнасцей і фрагментаў канечнасцей);

псіхіятрыі, псіхатэрапіі, пульманалогіі, радыялогіі, рэабіліталогіі, рэаніматалогіі і рэўматалогіі;

стаматалогіі (тэрапеўтычныя, хірургічныя, артадантычныя, артапедычныя, зубатэхнічныя);

тэрапіі, таксікалогіі, траўматалогіі, трансплантацыі органаў і (ці) тканак, фізіятэрапіі і фтызіятрыі;

уралогіі, у тым ліку андралогіі;

хірургіі, у тым ліку ангіяхірургіі, дзіцячай, кардыяхірургіі, рэнтгена-эндаваскулярнай, таракальнай, сківічна-тварнай, эндаскапічнай, нейрахірургіі, афтальмалогіі хірургічнай, у тым ліку мікрахірургіі, пластычнай хірургіі, якая выконваецца па медыцынскіх паказаннях (хірургічныя ўмяшанні пры пасттраўматычнай дэфармацыі, прыроджаных дэфектах, гігантамастыі);

экстракарпаральных метадаў лячэння, у тым ліку дыялізу, гемасорбцыі, плазмаферэзу;

эндакрыналогіі;

1.2.3. нетрадыцыйныя медыцынскія паслугі:

апітэрапія, гірудатэрапія, гамеапатыя, ірыдадыягностыка, рэфлексатэрапія, мануальная тэрапія, фітатэрапія;

лячэнне і дыягностыка іншымі сродкамі прыроднага паходжання;

1.2.4. паслугі медыка-сацыяльнай дапамогі па доглядзе за хворымі;

1.2.5. паслугі першаснай медыцынскай дапамогі;

1.2.6. паслугі хуткай медыцынскай дапамогі;

1.2.7. паслугі па нарыхтоўцы органаў і (ці) тканак – забор органаў і (ці) тканак, арганізацыя донарства крыві, нарыхтоўка, перапрацоўка, захоўванне крыві, яе кампанентаў і прэпаратаў з донарскай крыві;

1.3. ветэрынарных мерапрыемстваў. Для мэт гэтага падпункта да ветэрынарных мерапрыемстваў адносяцца:

1.3.1. прафілактыка, дыягностыка і лячэнне хвароб жывёл;

1.3.2. выдача ветэрынарных дакументаў;

1.3.3. правядзенне спецыяльных лабараторных даследаванняў для ацэнкі бяспекі ў ветэрынарна-санітарных адносінах харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, кармоў і кармавых дабавак, якасці ветэрынарных прэпаратаў;

1.3.4. ветэрынарна-санітарная экспертыза прадуктаў жывёльнага паходжання, а таксама ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі, прадуктаў расліннага паходжання пры іх рэалізацыі на рынках;

1.4. сацыяльных паслуг па пераліку такіх паслуг, які зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, што аказваюцца:

недзяржаўнымі некамерцыйнымі арганізацыямі ў форме стацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання;

дзяржаўнымі арганізацыямі (іх структурнымі падраздзяленнямі);

1.5. прадуктаў харчавання, выпрацаваных:

1.5.1. установамі адукацыі, іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, для навучэнцаў, якія атрымліваюць дашкольную адукацыю, спецыяльную адукацыю на ўзроўні дашкольнай адукацыі, пры арганізацыі іх харчавання;

1.5.2. структурнымі падраздзяленнямі ўстаноў адукацыі, пры арганізацыі харчавання навучэнцаў у гэтых установах адукацыі;

1.5.3. суб'ектамі грамадскага харчавання, якія спецыялізуюцца на ажыццяўленні арганізацыі харчавання навучэнцаў ва ўстановах адукацыі шляхам заключэння адпаведнага дагавору;

1.5.4. сталовымі ўстаноў аховы здароўя і сацыяльнай абароны;

1.6. паслуг па падрыхтоўцы спартсменаў-навучэнцаў у спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах;

1.7. паслуг у сферы культуры па пераліку такіх паслуг, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

1.8. арганізацыямі культуры, а таксама Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь, закрытымі акцыянернымі таварыствамі «Другі нацыянальны тэлеканал», «Сталічнае тэлебачанне» (далей у гэтым артыкуле – тэлерадыёвяшчальныя арганізацыі):

праграм (буклетаў) аб культурна-відовішчных мерапрыемствах, каталогаў (буклетаў), паштовак, якія змяшчаюць інфармацыю аб музеях (выстаўках);

маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў;

прац па вытворчасці фільмаў шляхам увасаблення творчай задумы іх аўтараў на тэхналагічнай аснове кінематаграфіі (далей – працы па вытворчасці фільмаў);

прац па тыражаванні фільмаў і аўдыязапісаў;

дапаможных прац, якія выконваюцца на тэхналагічнай аснове кінематаграфіі пры вытворчасці фільмаў;

прац па рэстаўрацыі фільмаў;

прац па вырабе копій з музейных прадметаў і з дакументаў з музейных фондаў;

прац па складанні бібліяграфічных спісаў і даведак;

прац па складанні каталогаў кніг, друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, рукапісаў, архіўных дакументаў, мастацкіх калекцый;

прац па вырабе копій дакументаў з бібліятэчных фондаў;

1.9. арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, арганізацыям культуры, тэлерадыёвяшчальным арганізацыям:

культурных каштоўнасцей па пераліку відаў такіх каштоўнасцей, зацверджаным Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь (далей – культурныя каштоўнасці);

прац па вытворчасці фільмаў, а таксама тэлерадыёперадач;

прац па вырабе камп'ютарнай графікі;

прац па вырабе дэкарацый, мэблі і рэквізіту, бутафорый, касцюмаў, абутку, галаўных убораў, грымёрна-пасціжорскіх вырабаў, зброі, піратэхнікі, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў і вытворчасці фільмаў, тэлерадыёперадач;

маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі культурных каштоўнасцей у адпаведнасці з абзацам другім часткі першай гэтага падпункта з'яўляецца заключэнне Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб аднясенні тавараў да культурных каштоўнасцей;

1.10. замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь:

1.10.1. арганізацыям культуры, тэлерадыёвяшчальным арганізацыям:

рэкламных паслуг;

маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў;

1.10.2. прац (паслуг), звязаных з удзелам беларускіх арганізацый і (ці) беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў у міжнародных канферэнцыях, форумах, сімпозіумах, кангрэсах, у выставачна-кірмашовых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў замежных дзяржавах;

1.10.3. рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання паслуг, якія аплачваюцца імі за кошт бюджэтных сродкаў;

1.11. тавараў (прац, паслуг) асацыяцыяй грамадскіх аб'яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў», творчымі саюзамі Рэспублікі Беларусь і іх фондамі па пераліку такіх арганізацый, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

1.12. паслуг, звязаных з арганізацыяй пахаванняў. Для мэт гэтага падпункта да паслуг, звязаных з арганізацыяй пахаванняў, адносяцца:

1.12.1. даванне (пракат) рытуальна-пахавальных вырабаў, прыстасаванняў для правядзення пахаванняў, інвентару для догляду за ўчасткамі для пахавання;

1.12.2. дастаўка рытуальна-пахавальных вырабаў, надмагільных збудаванняў і звязаныя з ёй пагрузачна-разгрузачныя працы;

1.12.3. арганізацыя і правядзенне пахаванняў, уключаючы падачу аб’яў, некралога, складанне тэкстаў жалобнай прамовы, апавяшчэнне сваякоў;

1.12.4. паслугі цырульніка, касметолага, бальзаміроўшчыка (санітара) па падрыхтоўцы цела (астанкаў) памерлага (загінулага) да крэмацыі або пахавання;

1.12.5. даванне халадзільнай камеры для захоўвання цела (астанкаў) памерлага (загінулага);

1.12.6. здача ў арэнду памяшкання і яго афармленне для правядзення пахаванняў;

1.12.7. вынас труны з целам (астанкамі) памерлага (загінулага), урны з прахам (попелам), суправаджэнне іх да месца пахавання;

1.12.8. музычнае суправаджэнне пахаванняў;

1.12.9. даванне транспартных сродкаў для перавозкі і перавозка цела (астанкаў) памерлага (загінулага), урны з прахам (попелам), суправаджальных асоб (сваякоў) да месца правядзення пахаванняў;

1.12.10. паслугі па перапахаванні цела (астанкаў) памерлага (загінулага), урны з прахам (попелам);

1.12.11. паслугі па пахаванні і падпахаванні цела (астанкаў) памерлага (загінулага), урны з прахам (попелам) у зямлю на могілкі, склеп або урны з прахам (попелам) у калумбарый, у тым ліку копка і засыпка магілы, уключаючы падрыхтоўчыя працы для копкі магілы ў зімовы час (уцяпленне, прагрэў паверхні зямельнага ўчастка, распрацоўка (нарэзка, рыхленне) мёрзлага грунту механізаваным спосабам);

1.12.12. паслугі крэматорыя:

крэмацыя цела (астанкаў) памерлага (загінулага);

змяшчэнне праху (попелу) у урну;

утрыманне урны з прахам (попелам) у калумбарыі;

захоўванне урны (капсулы) з прахам (попелам);

падрыхтоўка урны з прахам (попелам) для адпраўлення за межы Рэспублікі Беларусь;

1.12.13. добраўпарадкаванне дадзенага ўчастка для пахавання, мастацкае афармленне магілы, склепа, месца ў калумбарыі;

1.12.14. нанясенне (высечка, гравіроўка) надпісаў, эмблем, малюнкаў, барэльефаў, выкананне графічных партрэтаў на надмагільных помніках, устаноўка медальёнаў, таблічак, мацаванне літых элементаў да надмагільных помнікаў;

1.12.15. азеляненне тэрыторыі месца пахавання;

1.12.16. утрыманне, рамонт і аднаўленне надмагільных узгоркаў і збудаванняў, склепаў, калумбарыяў, у тым ліку разбураных (пашкоджаных) у выніку надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, актаў вандалізму;

1.12.17. устаноўка, дэмантаж надмагільных збудаванняў;

1.12.18. уборка тэрыторыі месца пахавання, замацаванай сумежнай тэрыторыі і вываз з гэтых тэрыторый адходаў;

1.13. надмагільных помнікаў, агароджаў і іншых рытуальных прадметаў, звязаных з пахаваннем, а таксама прац па іх вырабе;

1.14. рэлігійнай літаратуры і (ці) прадметаў рэлігійнага прызначэння (акрамя падакцызных), за выключэннем абаротаў па рэалізацыі, указаных у падпункце 2.22 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса;

1.15. вырабаў народных мастацкіх рамёстваў прызнанай мастацкай якасці па пераліку такіх вырабаў, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Падставай для вызвалення плацельшчыкаў ад падатку на дабаўленую вартасць служыць заключэнне аб аднясенні прадукцыі да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, якое выдае экспертная камісія па аднясенні прадукцыі арганізацый народных мастацкіх рамёстваў да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў.

Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца таксама на ўсіх плацельшчыкаў, якія рэалізуюць набытыя вырабы, указаныя ў частцы першай гэтага падпункта. Падставай для прымянення пакупніком вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць служыць атрыманая ад прадаўца копія заключэння аб аднясенні прадукцыі да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў;

1.16. тавараў (прац, паслуг) плацельшчыкамі, якія выкарыстоўваюць працу інвалідаў, калі колькасць інвалідаў у іх у сярэднім за перыяд складае не менш чым 50 працэнтаў ад колькасці работнікаў у сярэднім за гэты ж перыяд.

Для мэт гэтага падпункта:

да тавараў (прац, паслуг) не адносяцца набытыя тавары, падакцызныя тавары, брокерскія і іншыя пасрэдніцкія паслугі, здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці;

колькасць работнікаў (інвалідаў) арганізацыі ў сярэднім за перыяд з пачатку года да справаздачнага перыяду ўключна вызначаецца шляхам падсумоўвання сярэдняй колькасці работнікаў (інвалідаў) за ўсе месяцы, мінулыя за перыяд з пачатку года да справаздачнага перыяду ўключна, і дзялення атрыманай сумы на колькасць мінулых месяцаў, за якія вызначана сярэдняя колькасць работнікаў (інвалідаў);

сярэдняя колькасць работнікаў (інвалідаў) за кожны месяц вызначаецца як падлічаная ў парадку, устаноўленым Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь, спісачная колькасць работнікаў у сярэднім за месяц (за выключэннем работнікаў, якія знаходзяцца ў водпусках па цяжарнасці і родах, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзіцяці ва ўзросце да трох месяцаў або прызначэннем іх апекунамі, па доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад трох да шаснаццаці гадоў); сярэдняя колькасць працуючых па сумяшчальніцтве з месцам асноўнай працы ў іншых наймальнікаў; сярэдняя колькасць асоб, якія выконвалі працу па грамадзянска-прававых дагаворах (у тым ліку заключаных з юрыдычнымі асобамі, калі прадметам дагавору з'яўляецца аказанне паслугі па даванні, найме работнікаў);

разлік колькасці работнікаў праводзіцца ў цэлым па арганізацыі, уключаючы філіялы.

Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца на ўсіх плацельшчыкаў, якія рэалізуюць тавары, набытыя ў плацельшчыкаў, указаных у частцы першай гэтага падпункта. Падставай для прымянення пакупніком вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць служыць указаны прадаўцом у першасных уліковых дакументах, якія прымяняюцца пры адгрузцы тавараў, запіс «Вызваленне згодна з падпунктам 1.16 пункта 1 артыкула 118 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь»;

1.17. каштоўных металаў і каштоўных камянёў, а таксама выкананых прац (аказаных паслуг) пры:

1.17.1. здачы (пастаўцы) каштоўных металаў і каштоўных камянёў, у тым ліку ў выглядзе лому і адходаў, якія змяшчаюць спадарожныя кампаненты (за выключэннем каштоўных металаў, указаных у абзацы другім падпункта 2.28 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса), у Дзяржфонд, а таксама пры рэалізацыі каштоўных металаў Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь;

1.17.2. рэалізацыі вырабленых айчыннымі алмазаапрацоўчымі арганізацыямі брыльянтаў, не замацаваных у ювелірных і іншых бытавых вырабах, пры наяўнасці сертыфіката (атэстата) на кожны камень, выдадзенага ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.17.3. перапрацоўцы лому і адходаў, залічаных у фонд перапрацоўкі Дзяржфонду, для наступнай пастаўкі атрыманых каштоўных металаў у Дзяржфонд;

1.17.4. арганізацыі скупкі каштоўных металаў і каштоўных камянёў у фізічных асоб для дзяржаўных патрэб;

1.17.5. рэалізацыі арганізацыямі банкам, паміж банкамі, банкамі арганізацыям і фізічным асобам банкаўскіх і мерных зліткаў з каштоўных металаў, зліткавых (інвестыцыйных) манет з каштоўных металаў;

1.17.6. рэалізацыі арганізацыямі банкам, паміж банкамі, банкамі арганізацыям і фізічным асобам брыльянтаў, якія маюць выдадзены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь атэстат якасці на брыльянт;

1.18. тавараў магазінамі бяспошліннага гандлю:

1.18.1. у зоне мытнага кантролю;

1.18.2. пад мытным кантролем для замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў, прыраўнаваных да іх прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый, консульскіх устаноў;

1.19. пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва арганізацыямі, іх адасобленымі падраздзяленнямі, якія ажыццяўляюць санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва, па пераліку такіх арганізацый, іх адасобленых падраздзяленняў, які зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.20. тавараў (прац, паслуг), якія вырабляюцца (выконваюцца, аказваюцца) папраўчымі ўстановамі крымінальна-выканаўчай сістэмы і лячэбна-працоўнымі прафілакторыямі.

Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца на ўсіх плацельшчыкаў, якія рэалізуюць тавары, выробленыя плацельшчыкамі, указанымі ў частцы першай гэтага падпункта. Падставай для прымянення пакупніком вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць служыць указаны прадаўцом у першасных уліковых дакументах, якія прымяняюцца пры адгрузцы тавараў, запіс «Вызваленне згодна з падпунктам 1.20 пункта 1 артыкула 118 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь»;

1.21. паслуг, якія аказваюцца фізічным асобам:

1.21.1. па дастаўцы пенсій і іншых сацыяльных выплат.

Да паслуг па дастаўцы фізічным асобам пенсій і іншых сацыяльных выплат адносіцца выдача (уручэнне) фізічным асобам пенсій і іншых сацыяльных выплат:

па ведамасцях (спісах) органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне;

шляхам перасылкі і выплаты пенсійных сум і іншых сацыяльных выплат грашовымі пераводамі, адпраўку якіх робіць орган, што прызначае (выплачвае) пенсію і іншую сацыяльную выплату, або праз адпаведныя падраздзяленні банкаў;

1.21.2. па прыёме падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і іх дастаўцы.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца пры аказанні паслуг, указаных у частцы першай гэтага падпункта, індывідуальным прадпрымальнікам;

1.22. паслуг паштовай сувязі па перасылцы пасылак і (ці) грашовых пераводаў, прынятых ад фізічных асоб аператарамі паштовай сувязі для дастаўкі (уручэння) адрасату.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца пры аказанні паслуг, указаных у частцы першай гэтага падпункта, індывідуальным прадпрымальнікам;

1.23. навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх, вопытна-тэхналагічных прац, зарэгістраваных у дзяржаўным рэестры навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх, вопытна-тэхналагічных прац у парадку, які вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

1.24. цвёрдага паліва фізічным асобам для камунальна-бытавога спажывання і палівазабеспячальным арганізацыям для продажу фізічным асобам.

Для мэт гэтага падпункта пад цвёрдым палівам разумеюцца паліўныя брыкеты на аснове торфу, торф кускавы, вугаль, за выключэннем вугалю драўнянага, дровы, якія выкарыстоўваюцца фізічнымі асобамі для камунальна-бытавога спажывання;

1.25. жыллёва-камунальных і эксплуатацыйных паслуг, якія аказваюцца фізічным асобам, па пераліку такіх паслуг, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

1.26. прац (паслуг), якія выконваюцца (аказваюцца) фізічным асобам, што ажыццяўляюць вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі. Для мэт гэтага падпункта пад працамі (паслугамі), якія выконваюцца (аказваюцца) фізічным асобам, што ажыццяўляюць вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі, разумеюцца:

1.26.1. працы па апрацоўцы сельскагаспадарчых культур:

узворванне, пласкарэзная апрацоўка, культывацыя, дыскаванне, баранаванне глебы;

унясенне ў глебу мінеральных, арганічных угнаенняў, торфу, пестыцыдаў, вапнавых матэрыялаў;

сяўба, пасадка, міжрадная апрацоўка сельскагаспадарчых культур;

1.26.2. механізаваныя працы па ўборцы і дапрацоўцы ўраджаю:

скошванне, падбор валкоў і абмалот, уборка прамым камбайнаваннем, размол зерневых і зернебабовых культур, кукурузы;

скошванне траў і іншых сельскагаспадарчых культур, варушэнне, абкладанне, стварэнне ўзбуйненых валкоў сена, саломы, падбор і звалаканне коп, сціртаванне сена, саломы;

скошванне бацвіння, уборка, пагрузка бульбы, кармавых караняплодаў, цукровага бурака, агародніны і іншых культур;

транспарціроўка сельскагаспадарчай прадукцыі з палёў да месцаў захоўвання;

1.26.3. іншыя працы (паслугі):

сепарыраванне малака;

забой жывёлы;

штучнае асемяненне жывёл;

выпас жывёлы;

нарыхтоўка, распілоўка, калонне і складаванне дроў;

аўтатранспартныя паслугі па дастаўцы пячнога паліва;

паслугі гужавога транспарту;

рамонт гаспадарчых пабудоў;

1.27. паслуг, якія спадарожнічаюць атрыманню адукацыі.

Для мэт гэтага падпункта да паслуг, якія спадарожнічаюць атрыманню адукацыі, адносяцца:

1.27.1. правядзенне рэпетыцыйнага тэсціравання;

1.27.2. прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні;

1.27.3. правядзенне папярэдняй экспертызы кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі) і разгляд кваліфікацыйнай навуковай працы (дысертацыі) саветам па абароне дысертацый;

1.27.4. рэпетытарства (кансультатыўныя паслугі па асобных навучальных прадметах (прадметах), навучальных дысцыплінах (дысцыплінах), адукацыйных галінах, тэмах, у тым ліку дапамога ў падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання);

1.28. платных паслуг у сферы адукацыі.

Для мэт гэтага пункта да платных паслуг у сферы адукацыі адносяцца:

1.28.1. рэалізацыя адукацыйных праграм дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, пасляўніверсітэцкай адукацыі;

1.28.2. рэалізацыя адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

1.28.3. рэалізацыя адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых (за выключэннем адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыі, тэматычныя семінары, практыкумы, трэнінгі, афіцэрскія курсы і іншыя віды навучальных курсаў), адукацыйнай праграмы ўдасканальвання магчымасцей і здольнасцей асобы, што рэалізуюцца іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць);

1.28.4. правядзенне паўторнай бягучай і падагульняльнай атэстацыі на платнай аснове;

1.28.5. правядзенне лабараторных прац і практычных заняткаў са студэнтамі (курсантамі) і навучэнцамі па-за навучальнай групай;

1.29. паслуг, якія аказваюцца Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і звязаны з атэстацыяй навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, прысваеннем вучоных званняў, настрыфікацыяй (прыраўноўваннем) дакументаў аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў, выдадзеных у замежных дзяржавах, пераатэстацыяй асоб, якія маюць вучоныя ступені і вучоныя званні замежных дзяржаў, пазбаўленнем (аднаўленнем) вучоных ступеняў і вучоных званняў;

1.30. паслуг па падрыхтоўцы клінічных ардынатараў;

1.31. тавараў (прац, паслуг), вырабленых (выкананых, аказаных) навучэнцамі і прадугледжаных навучальна-праграмнай дакументацыяй, планам выхаваўчай працы навучальнай установы, праграмамі выхавання пры ажыццяўленні навучальнымі ўстановамі відаў дзейнасці па пераліку, які зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Для мэт гэтага падпункта і пункта 50 артыкула 208 гэтага Кодэкса пад таварамі разумеецца прадукцыя, вырабленая навучэнцамі ў працэсе навучання і (ці) выхавання;

1.32. паслуг гідаў-перакладчыкаў, экскурсаводаў, якія аказваюцца ў межах Рэспублікі Беларусь, а таксама наступных турыстычных паслуг па арганізацыі:

1.32.1. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь экскурсійнага абслугоўвання:

паслуг па падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні экскурсій;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі і забеспячэнні харчаваннем экскурсантаў;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі перавозак экскурсантаў рознымі відамі транспарту;

1.32.2. падарожжаў турыстаў у межах Рэспублікі Беларусь:

паслуг турагентаў і тураператараў па арганізацыі комплекснага турыстычнага абслугоўвання;

паслуг турагентаў і тураператараў, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі размяшчэння, харчавання турыстаў;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі перавозак турыстаў рознымі відамі транспарту;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі спартыўных, пазнавальных, аздараўленчых, экскурсійных, культурна-відовішчных мерапрыемстваў у адпаведнасці з праграмай турыстычнага падарожжа;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, турыстычных інфармацыйных;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па браніраванні і (ці) продажы месцаў у транспартных сродках, рэстаранах, месцах часовага пражывання, пракату аўтамабіляў;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па афармленні выязных дакументаў на маршруты турыстычнага падарожжа па зарубежных краінах (паслугі візавай падтрымкі, паслугі па дастаўцы дакументаў у консульскія ўстановы, паслугі па медыцынскім страхаванні турыстаў);

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі сустрэч турыстаў у аэрапорце, уключаючы браніраванне VIP-залы, паслугі суправаджальнай асобы;

паслуг, якія аказваюцца ў складзе туру, па арганізацыі палявання і рыбалкі;

1.33. аб'ектаў жыллёвага фонду, не завершаных будаўніцтвам аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва;

1.34. прац па будаўніцтве і рамонце аб'ектаў жыллёвага фонду, гаражоў і аўтамабільных стаянак па пераліку такіх прац, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

1.35. прац па будаўніцтве, утрыманні і рамонце аб'ектаў агульнага карыстання садаводчых суполак.

Для мэт гэтага падпункта:

1.35.1. да прац па будаўніцтве, утрыманні і рамонце аб'ектаў агульнага карыстання садаводчых суполак адносяцца:

праектна-пошукавыя працы, якія выконваюцца па дагаворах падраду (субпадраду);

адвод зямельных участкаў для будаўніцтва, падрыхтоўка тэрыторыі будаўніцтва;

правядзенне дзяржаўнай экспертызы праектна-каштарыснай дакументацыі;

будаўнічыя, іншыя спецыяльныя мантажныя і пусканаладачныя працы, якія выконваюцца на аб'ектах садаводчых суполак па дагаворах падраду (субпадраду), у тым ліку пры правядзенні бягучага рамонту;

добраўпарадкаванне і азеляненне, якое ажыццяўляецца ў межах зямельных участкаў агульнага карыстання садаводчых суполак;

даванне будаўнічых машын і механізмаў для выканання будаўнічых, іншых спецыяльных мантажных і пусканаладачных прац;

ажыццяўленне функцый аўтарскага нагляду, тэхнічнага нагляду, заказчыка, забудоўшчыка;

1.35.2. пад аб'ектамі агульнага карыстання садаводчых суполак разумеюцца размешчаныя на зямельных участках агульнага карыстання садаводчых суполак дарогі, паветраныя і кабельныя лініі электраперадачы, трансфарматарныя падстанцыі, водаправоды, воданапорныя вежы, пляцоўкі для часовага захоўвання адходаў, агульныя вароты і платы, іншыя аб'екты, неабходныя для вядзення калектыўнага садаводства;

1.36. нанава пабудаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь гаражоў, машына-месцаў і аўтамабільных стаянак (доляў у праве ўласнасці на аўтамабільную стаянку) забудоўшчыкам, заказчыкам, гаражным кааператывам, кааператывам, які ажыццяўляе эксплуатацыю аўтамабільных стаянак;

1.37. банкамі Рэспублікі Беларусь, нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь аперацый па:

1.37.1. даванні крэдытаў (пазык), гарантый ці іншых спосабаў забеспячэння выканання абавязацельстваў па крэдытах, уключаючы кіраванне (абслугоўванне) крэдытамі ці гарантыямі па крэдытах.

Да абаротаў па даванні крэдытаў (пазык) адносяцца:

аперацыі па даванні, пераводзе ў іншы банк, кіраванні (абслугоўванні), вяртанні крэдытаў (пазык), уключаючы аперацыі па афармленні паручыцельстваў, закладаў і іншых спосабаў забеспячэння выканання абавязацельстваў па крэдытах (пазыках);

фінансаванне пад уступку грашовага патрабавання (факторынг);

акцэпт вэксаля, продаж вэксаля з адтэрміноўкай аплаты;

авердрафт па рахунках кліентаў, уключаючы рахункі банкаў;

размяшчэнне грашовых сродкаў у банках у форме ўкладаў (дэпазітаў), дэпаніраванне грашовых сродкаў у фондзе абавязковых рэзерваў, які размяшчаецца ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, рэшта па карэспандэнцкім рахунку, іншым рахункам банка;

усе віды ўзнагарод, атрыманых ад указаных аперацый (працэнты, уключаючы працэнты ў павышаным памеры, камісійная ўзнагарода, плата, дысконт, няўстойкі (штрафы, пені) і інш.).

Да аперацый па даванні гарантый па крэдытах адносіцца выдача банкамі паручыцельстваў, банкаўскіх гарантый, звязаных з прыняццем на сябе абавязацельстваў перад крэдыторамі кліента банка. Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца на ўсе сумы разлікаў па гэтых аперацыях, уключаючы сумы атрыманай узнагароды;

1.37.2. вядзенні бягучых (разліковых) банкаўскіх рахункаў, укладных (дэпазітных) ці іншых рахункаў, а таксама аперацый, непасрэдна звязаных з грашовымі пераводамі, даўгавымі абавязацельствамі.

Да ўказаных абаротаў адносяцца сумы:

ад разліковага і (ці) касавага абслугоўвання кліентаў у выглядзе камісійных, а таксама расходаў, якія кампенсуюцца кліентамі, банкам па правядзенні аперацый. Пры гэтым кліентамі нароўні з іншымі выступаюць іншыя банкі, а таксама іх філіялы;

за адкрыццё, вядзенне і закрыццё рахункаў;

за перавод (адпраўленне) і залічэнне грашовых сродкаў, перасылку плацежных інструкцый, адкліканне (ануляванне), змяненне, прыпыненне выканання плацежных інструкцый;

за пені па не аплачаных у тэрмін дакументах;

за пошукі сум, якія не паступілі па прызначэнні;

за перадачу, у тым ліку па электроннай сувязі, выпісак, даведак, дублікатаў па рахунках;

ад устаноўкі і (ці) абслугоўвання сістэм электроннага дакументаабароту паміж банкам і кліентамі, сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання;

ад выканання комплексу аперацый з банкаўскімі гарантыямі, акрэдытывамі, плацежнымі інструкцыямі ў замежнай валюце, інкаса;

ад ажыццяўлення дэпазітарнай дзейнасці;

ад ажыццяўлення аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі, за выключэннем пакрыцця кошту загатовак банкаўскіх плацежных картак;

ад ажыццяўлення аперацый з электроннымі грашамі, за выключэннем пакрыцця кошту электронных кашалькоў у выпадках, калі ў якасці электронных кашалькоў выкарыстоўваюцца загатоўкі банкаўскіх плацежных картак з магнітнай паласой і (ці) мікрапрацэсарам, іншыя аналагічныя праграмна-тэхнічныя прылады, якія адносяцца да матэрыяльных носьбітаў інфармацыі;

1.37.3. абарачэнні беларускіх рублёў ці замежнай валюты, калі такія аперацыі не ажыццяўляюцца ў мэтах нумізматыкі, не звязаны з рэалізацыяй замежнай валюты Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь ці банку іншай дзяржавы арганізацыяй, якая вырабіла яе, і не з'яўляюцца прадметам паслуг па захоўванні, перавозцы ці інкасацыі беларускіх рублёў і замежнай валюты. Да ўказаных абаротаў адносяцца:

аперацыі па абмене замежнай валюты на беларускія рублі і абмене беларускіх рублёў на замежную валюту (купля-продаж замежнай валюты), у тым ліку тэрміновыя здзелкі;

аперацыі па абмене аднаго віду замежнай валюты на іншы від замежнай валюты (канверсія замежнай валюты), у тым ліку тэрміновыя здзелкі;

здзелкі з форвардными і ф'ючарснымі кантрактамі, апцыёнамі і іншымі фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак;

прыём і выдача грашовых сродкаў, плацежных інструкцый у замежнай валюце;

аперацыі па аплаце (пакупцы) і продажы плацежных інструкцый у замежнай валюце;

продаж наяўных грашовых сродкаў банкам;

размен (абмен) замежнай валюты;

прыём на інкаса наяўнай замежнай валюты;

пералік наяўных грашовых сродкаў у беларускіх рублях і (ці) замежнай валюце.

Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца на сумы аплаты кошту паслуг, камісійных узнагарод і іншых банкаўскіх даходаў па аперацыях, указаных у гэтым падпункце, а таксама курсавыя розніцы па гэтых аперацыях;

1.37.4. ажыццяўленні правоў патрабавання па крэдытных дагаворах на падставе дагавораў цэсіі (уступкі патрабавання);

1.37.5. рэалізацыі адкрытаму акцыянернаму таварыству «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» аперацый па кіраванні крэдытамі (абслугоўванні крэдытаў), а таксама перадачы актываў адкрытаму акцыянернаму таварыству «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», уключаючы сумы ўзнагарод, якія атрымліваюцца адкрытым акцыянерным грамадствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» ад указаных аперацый.

Для мэт гэтага падпункта пад актывамі разумеюцца крэдыты, выдадзеныя банкамі на падставе актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і набытыя адкрытым акцыянерным грамадствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» у банкаў у адпаведнасці з пералікамі такіх крэдытаў і парадкам, вызначанымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ці Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.38. адкрытым акцыянерным таварыствам «Беларуская валютна-фондавая біржа» (далей у гэтым падпункце – Біржа) аперацый па:

адкрыцці і вядзенні рахункаў удзельнікаў таргоў і (ці) клірынгу (у тым ліку гандлёвых рахункаў удзельнікаў таргоў), адкрыццё якіх непасрэдна звязана з правядзеннем разлікаў па біржавых таргах і аперацыямі, якія ажыццяўляюцца Біржай;

правядзенні разлікаў у безнаяўнай форме праз карэспандэнцкія і іншыя рахункі, якія адкрываюцца Біржай у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, банках Рэспублікі Беларусь і банках-нерэзідэнтах, уключаючы правядзенне валютна-абменных аперацый, у тым ліку на ўласных таргах, непасрэдна звязаных з ажыццяўленнем клірынгу і разлікаў.

Да такіх аперацый адносяцца:

ажыццяўленне клірынгавай дзейнасці (правядзенне клірынгу), якая ўключае вызначэнне падлеглых выкананню абавязацельстваў па здзейсненых біржавых здзелках, у тым ліку ў выніку ажыццяўлення нэттынгу, падрыхтоўка дакументаў (інфармацыі), якія з'яўляюцца падставай для спынення і (ці) выканання такіх абавязацельстваў, збор, зверка, карэкціроўка інфармацыі па здзелках, падрыхтоўка разліковых дакументаў па іх для забеспячэння разлікаў па перадачы каштоўных папер і грашовых сродкаў;

вядзенне рахункаў удзельнікаў таргоў і (ці) клірынгу;

правядзенне аперацый (перавод (адпраўленне), залічэнне грашовых сродкаў па выніках клірынгу і (ці) на падставе распараджэнняў удзельнікаў таргоў і (ці) клірынгу і разлікаў);

перасылка разліковых дакументаў;

адкліканне (ануляванне), змяненне, прыпыненне выканання плацежных інструкцый;

налічэнне пеняў па не аплачаных у тэрмін дакументах;

пошук сум, якія не паступілі па прызначэнні;

перадача, у тым ліку па электроннай сувязі, выпісак (дублікатаў выпісак), даведак па рахунках;

выкананне комплексу аперацый з дакументамі ў беларускіх рублях і замежнай валюце;

улік сродкаў, якія будуць выкарыстоўвацца для давання забеспячэння выканання абавязацельстваў па здзейсненых здзелках на біржавых таргах;

улік узносаў удзельнікаў таргоў і (ці) клірынгу, а таксама выкарыстанне і размяшчэнне сродкаў гарантыйных фондаў ад свайго імя на рахунках, уключаючы рахункі па ўкладах (дэпазітах), у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, банках Рэспублікі Беларусь і банках-нерэзідэнтах, у дзяржаўныя каштоўныя паперы Рэспублікі Беларусь, каштоўныя паперы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, аблігацыі банкаў у парадку, вызначаным па ўзгадненні з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь;

арганізацыя (ажыццяўленне) біржавога гандлю фінансавымі актывамі, у тым ліку валютнымі каштоўнасцямі і эмісійнымі каштоўнымі паперамі, за выключэннем акцый закрытых акцыянерных таварыстваў, уключаючы правядзенне лістынгу;

рэгістрацыя інфармацыі аб здзелках, здзейсненых на неарганізаваным рынку.

Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць распаўсюджваецца на ўсе сумы даходаў, атрыманыя ад указаных аперацый (камісійная ўзнагарода, плата і іншыя аналагічныя віды даходаў), а таксама на курсавыя розніцы па гэтых аперацыях;

1.39. адкрытаму акцыянернаму таварыству «Агенцтва па кіраванні актывамі» аперацый па:

1.39.1. рэалізацыі банкамі і адкрытым акцыянерным таварыствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» паслуг па абслугоўванні крэдытаў;

1.39.2. перадачы банкамі і адкрытым акцыянерным таварыствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» актываў згодна з пералікам, які зацвярджаюць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь;

1.39.3. перадачы адкрытым акцыянерным таварыствам «Белаграпрамбанк» у бязвыплатнае карыстанне маёмасці і правоў на выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

1.39.4. бязвыплатнай перадачы банкамі і адкрытым акцыянерным таварыствам «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» маёмасці, у тым ліку маёмасных правоў, па дагаворах давання бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі;

1.40. паслуг па страхаванні (сустрахаванні, перастрахаванні).

Для мэт гэтага падпункта да абаротаў па рэалізацыі паслуг па страхаванні (сустрахаванні, перастрахаванні) адносяцца:

1.40.1. страхавыя ўзносы (прэміі) па дагаворах страхавання (сустрахавання, перастрахавання);

1.40.2. вяртанне страхавых рэзерваў, сфарміраваных у папярэднія перыяды;

1.40.3. камісійныя ўзнагароды па дагаворах сустрахавання, перастрахавання і камісіі з прыбытку, якія выплачваюцца перастрахоўшчыкамі перастрахавальнікам за даванне магчымасці ўдзельнічаць у дагаворы перастрахавання і абачлівае вядзенне справы;

1.40.4. пакрыццё долі страт па рызыках, перададзеных у перастрахаванне, а таксама па рызыках, перададзеных перастрахоўшчыкамі ў далейшае (наступнае) перастрахаванне;

1.40.5. вяртанне выплачанага страхавога пакрыцця і страхавога забеспячэння;

1.40.6. рэалізацыя права патрабавання страхавальніка па дагаворах маёмаснага страхавання і страхавання адказнасці да асобы, адказнай за страты, кампенсаваныя ў выніку страхавання, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам;

1.40.7. працэнты, налічаныя цэдэнтам на карысць перастрахоўшчыка на дэпо прэмій, па рызыках, прынятых у перастрахаванне;

1.40.8. камісійная ўзнагарода, якая выплачваецца страхоўшчыкам страхоўшчыку, які кампенсаваў шкоду пацярпеламу па дагаворы абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў;

1.40.9. камісійная ўзнагарода, якая атрымліваецца страхавымі брокерамі ад страхавых арганізацый за аказаныя ім пасрэдніцкія паслугі па страхаванні;

1.41. прац (паслуг) у галіне касмічнай дзейнасці. Для мэт гэтага  падпункта да прац (паслуг) у галіне касмічнай дзейнасці адносяцца:

працы (паслугі), якія выконваюцца (аказваюцца) з выкарыстаннем тэхнікі, што знаходзіцца непасрэдна ў касмічнай прасторы, у тым ліку кіруецца з паверхні і (ці) з атмасферы Зямлі;

працы (паслугі) па даследаванні касмічнай прасторы, назіранні за аб'ектамі і з'явамі ў касмічнай прасторы, у тым ліку з паверхні і (ці) з атмасферы Зямлі;

падрыхтоўчыя і (ці) дапаможныя (спадарожныя) наземныя працы (паслугі), тэхналагічна абумоўленыя (неабходныя) і неразрыўна звязаныя з выкананнем прац (аказаннем паслуг) па даследаванні касмічнай прасторы і (ці) выкананнем прац (аказаннем паслуг) з выкарыстаннем тэхнікі, якая знаходзіцца непасрэдна ў касмічнай прасторы;

працы (паслугі) па эксплуатацыі наземных сродкаў кіравання беларускага касмічнага апарату дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з распазнаваннем 1 метр і наземных сродкаў прыёму з гэтага касмічнага апарату.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі прац (паслуг) у адпаведнасці з часткай першай гэтага  падпункта з'яўляецца заключэнне Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое пацвярджае, што выкананыя працы (аказаныя паслугі) адносяцца да прац (паслуг), указаных у частцы першай гэтага  падпункта;

1.42. прац (паслуг), якія выконваюцца (аказваюцца) фізічным асобам, па ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур у адносінах да нерухомай маёмасці;

1.43. фізічным асобам паслуг у галіне фатаграфіі, цырульняў, лазняў і душавых, па мыцці і хімічнай чыстцы, па рамонце гадзіннікаў, па вытворчасці і рамонце адзення і абутку, па рамонце і тэхнічным абслугоўванні бытавых прыбораў, прадметаў асабістага карыстання;

1.44. тавараў уласнай вытворчасці прадаўцом – падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь згодна з дагаворам куплі-продажу з лізінгадавальнікам – падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, які набывае гэтыя тавары ва ўласнасць для іх наступнай перадачы па дагаворы міжнароднага лізінгу за межы Рэспублікі Беларусь з правам выкупу (далей у гэтым падпункце – лізінгадавальнік).

Умовай прымянення вызвалення, прадугледжанага часткай першай гэтага  падпункта, з'яўляецца наяўнасць у прадаўца – падатковага рэзідэнта Рэспублікі Беларусь наступных дакументаў:

дагавора куплі-продажу, заключанага з лізінгадавальнікам, у якім павінна быць указана, што тавар набываецца для яго перадачы па дагаворы міжнароднага лізінгу за межы Рэспублікі Беларусь з правам выкупу;

дакумента аб прыналежнасці тавару да прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку;

таварасуправаджальных дакументаў, якія пацвярджаюць факт адгрузкі прадаўцом тавару лізінгадавальніку;

копіі дагавору міжнароднага лізінгу, які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу і яго вываз за межы Рэспублікі Беларусь;

таварасуправаджальных дакументаў (іх копій) з адзнакай лізінгаатрымальніка, які не з'яўляецца падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, аб атрыманні прадмета лізінгу, якія пацвярджаюць вываз прадмета лізінгу за межы Рэспублікі Беларусь (патрабуюцца ў наяўнасці пры вывазе прадмета лізінгу ў дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза);

пацвярджэння аб вывазе прадмета лізінгу за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, атрыманага ад лізінгадавальніка (далей для мэт гэтага падпункта – пацвярджэнне аб вывазе).

Пацвярджэнне аб вывазе патрабуецца ў наяўнасці пры вывазе прадмета лізінгу ў дзяржавы, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза, у наступным выглядзе ў залежнасці ад прыменена лізінгадавальнікам формы мытнага дэклараванне тавараў:

у выглядзе копіі засведчанай асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа дэкларацыі на тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту з адзнакай мытнага органа «Тавар вывезены» і ўказаннем даты пастаўлення такой адзнакі – пры ажыццяўленні лізінгадавальнікам дэклараванне мытным органам тавараў у пісьмовай форме;

у выглядзе копіі знешняй падачы дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту, з указаннем даты дазволу на выбыццё тавараў за межы мытнай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь – пры ажыццяўленні лізінгадавальнікам дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента.

Пацвярджэнне аб вывазе завяраецца подпісам кіраўніка юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца лізінгадавальнікам, або ўпаўнаважанай ім асобы.

Для пацвярджэння абгрунтаванасці прымянення вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць, прадугледжанага часткай першай гэтага падпункта, прадавец – падатковы рэзідэнт Рэспублікі Беларусь падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі яго на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць рэестр дакументаў, якія пацвярджаюць рэалізацыю тавараў уласнай вытворчасці і іх вываз за межы Рэспублікі Беларусь па дагаворы міжнароднага лізінгу з правам выкупу па ўстаноўленай форме.

Дакументальнае пацвярджэнне абгрунтаванасці прымянення вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць, прадугледжанага часткай першай гэтага падпункта, праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты адгрузкі тавару ўласнай вытворчасці лізінгадавальніку (далей у гэтым падпункце – устаноўлены тэрмін).

Пры наяўнасці дагавору куплі-продажу з лізінгадавальнікам адлюстраванне абаротаў па рэалізацыі тавараў лізінгадавальніку (далей у гэтым падпункце – абароты па рэалізацыі тавараў) праводзіцца прадаўцом – падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у адносінах да ўстаноўленага тэрміну ў наступным парадку.

Пры адсутнасці дакументаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, да падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, у якім не скончыўся ўстаноўлены тэрмін, абароты па рэалізацыі тавараў могуць у ёй не адлюстроўвацца.

Пры наяўнасці дакументаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, абароты па рэалізацыі тавараў з прымяненнем устаноўленага часткай першай гэтага падпункта вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведных дакументаў, або таго справаздачнага перыяду, у якім атрыманы адпаведныя дакументы.

Пры адсутнасці дакументаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, да падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін, абароты па рэалізацыі тавараў адлюстроўваюцца без прымянення ўстаноўленага часткай першай гэтага падпункта

вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін.

Пры атрыманні дакументаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, пасля сканчэння ўстаноўленага тэрміну і пасля адлюстравання абаротаў па рэалізацыі тавараў у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абароты па рэалізацыі гэтых тавараў з прымяненнем устаноўленага часткай першай гэтага падпункта вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць адлюстроўваюцца (з адначасовым змяншэннем раней адлюстраваных абаротаў па гэтых таварах і карэкціроўкай падатковых вылікаў) у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведных дакументаў, або таго справаздачнага перыяду, у якім гэтыя дакументы атрыманы.

Палажэнні часткі адзінаццатай гэтага падпункта не прымяняюцца пасля сканчэння больш чым трох гадоў з дня надыходу тэрміну выплаты падатку на дабаўленую вартасць у сувязі з адсутнасцю дакументаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, у адпаведнасці з часткай дзясятай гэтага падпункта;

1.45. маёмасных правоў на вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, селекцыйныя дасягненні, тапалогіі інтэгральных мікрасхем, сакрэты вытворчасці (ноу-хау);

1.46. плацежнымі агентамі адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы паслуг па прыёме ад фізічных асоб:

плацяжоў за тавары, працы, паслугі, іншых плацяжоў, якія вынікаюць з грамадзянска-прававых адносін, ахвяраванняў на дабрачынныя рахункі;

падаткаў, збораў (пошлін), пеняў, штрафаў і іншых выплат у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

1.47. лізінгадавальнікамі аперацый па перадачы прызначаных для пражывання фізічных асоб кватэр у шматкватэрных ці блакіраваных жылых дамах, аднакватэрных жылых дамоў у якасці прадмета лізінгу лізінгаатрымальнікам па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць вяртанне прадмета лізінгу пасля завяршэння прадугледжанага гэтым дагаворам тэрміну часовага валодання і карыстання прадметам лізінгу;

1.48. маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, звесткі аб якіх змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, а таксама матэрыяльных аб'ектаў, якія адносяцца да гэтых правоў, калі рэалізацыя маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці адначасова суправаджаецца перадачай такіх аб'ектаў.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, а таксама абаротаў па рэалізацыі матэрыяльных аб'ектаў, якія адносяцца да гэтых правоў, у адпаведнасці з часткай першай гэтага падпункта з'яўляецца выкананне наступных патрабаванняў:

звесткі аб нумары і даце рэгістрацыі правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, найменне гэтых вынікаў, якія змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, указваюцца ў дагаворах, якія прадугледжваюць перадачу маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці іх уладальнікам іншай асобе ці даванне праваўладальнікам іншай асобе права на выкарыстанне вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці;

ажыццяўляецца вядзенне раздзельнага ўліку абаротаў па рэалізацыі маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці і матэрыяльных аб'ектаў, якія адносяцца да гэтых правоў, а таксама размеркаванне падатковых вылікаў, якія адносяцца да ўказаных абаротаў па рэалізацыі, метадам раздзельнага ўліку;

1.49. лізінгадавальнікамі аперацый па перадачы прадмета лізінгу фізічным асобам – лізінгаатрымальнікам па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу. Да ўказаных абаротаў адносяцца сумы лізінгавых выплат у частцы ўзнагароды (даходу) лізінгадавальніка і інвестыцыйных расходаў лізінгадавальніка, за выключэннем інвестыцыйных расходаў, якія кампенсуюцца ў кошце прадмета лізінгу.

Умовай прымянення вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленага часткай першай гэтага  падпункта, з'яўляецца наяўнасць у лізінгадавальніка наступных дакументаў:

дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, заключанага з фізічнай асобай – лізінгаатрымальнікам.

Для мэт гэтага  падпункта пад фізічнымі асобамі разумеюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

акта прыёмкі-перадачы прадмета лізінгу;

копіі пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь ці іншага дакумента, які змяшчае ўказанне на грамадзянства Рэспублікі Беларусь, – для грамадзян Рэспублікі Беларусь, копіі віду на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь – для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства.

У выпадку датэрміновага скасавання па патрабаванні аднаго з бакоў дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), не завершанага выкупам прадмета лізінгу, карэкціроўка абароту па рэалізацыі лізінгадавальнікам аперацый па перадачы прадмета лізінгу, па якім лізінгадавальнікам прыменена вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з часткай першай гэтага  падпункта, не праводзіцца.

На сумы павелічэння падатковай базы, указаныя ў падпунктах 4.1 і 4.2 пункта 4 артыкула 120 гэтага  Кодэкса, вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленае часткай першай гэтага  падпункта:

не распаўсюджваецца, калі абароты па перадачы прадмета лізінгу ў частцы лізінгавых выплат, якія кампенсуюць кошт прадмета лізінгу, не падлягаюць вызваленню ад падатку на дабаўленую вартасць;

распаўсюджваецца, калі абароты па перадачы прадмета лізінгу ў частцы лізінгавых выплат, якія кампенсуюць кошт прадмета лізінгу, падлягаюць вызваленню ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.50. камерцыйнымі арганізацыямі, уключанымі Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у рэестр мікрафінансавых арганізацый, аперацый па рэгулярным даванні мікрапазык фізічным асобам пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання;

1.51. прац (паслуг), звязаных з прадстаўленнем інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у рамках дасудовага ўрэгулявання спрэчак, у міжнародных арбітражах і замежных судовых органах па спрэчках паміж замежнымі інвестарамі і Рэспублікай Беларусь;

1.52. прац (паслуг), звязаных з эмісіяй, размяшчэннем, абарачэннем, пагашэннем дзяржаўных доўгатэрміновых аблігацый Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі даўгавымі абавязацельствамі, што фарміруюць знешні дзяржаўны доўг, з улікам правоў на такія аблігацыі;

1.53. да 31 снежня 2019 года прац па тэхнічнай інвентарызацыі (праверцы характарыстык) прыналежных юрыдычным асобам незарэгістраваных  эксплуатаваных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў і землеўпарадкавальных прац у адносінах да зямельных участкаў, на якіх такія аб'екты размешчаны.

Для мэт гэтага  падпункта пад эксплуатаванымі капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), ізаляванымі памяшканнямі, машына-месцамі разумеюцца адпаведныя аб'екты нерухомай маёмасці, якія выкарыстоўваліся да 8 мая 2003 года.

2. Сумы павелічэння падатковай базы, указаныя ў пункце 4 артыкула 120 гэтага  Кодэкса, вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць, калі яны атрыманы (належаць да атрымання) па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, абароты па рэалізацыі якіх вызвалены ад падаткаабкладання згодна з пунктам 1 гэтага  артыкула (за выключэннем абаротаў, указаных у частцы першай падпункта 1.49 пункта 1 гэтага  артыкула).

3. Плацельшчык у адносінах да абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), правоў на аб'екты прамысловай уласнасці, маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных

правоў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, мае права адмовіцца ад вызвалення ад падаткаабкладання такіх абаротаў, падаўшы адпаведную заяву ў падатковы орган.

Такая адмова магчымая толькі ў адносінах да ўсіх абаротаў па рэалізацыі плацельшчыка, прадугледжаных адным ці некалькімі падпунктамі пункта 1 гэтага артыкула.

Не дапускаецца адмова ад вызвалення ад падаткаабкладання на тэрмін меншы за адзін падатковы перыяд.

**Артыкул 119. Вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць тавараў пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь**

1. Вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь:

1.1. транспартныя сродкі, якія ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, пры дапамозе якіх ажыццяўляюцца міжнародныя перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу, а таксама прадметы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і падрыхтоўкі, паліва, харчаванне і іншая маёмасць, неабходныя для эксплуатацыі транспартных сродкаў на час руху ў дарозе, у пунктах прамежкавага прыпынку ці набытыя за мяжой у сувязі з ліквідацыяй аварыі (паломкі) гэтых транспартных сродкаў;

1.2. тавары, якія падлягаюць накіраванню ва ўласнасць дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.3. беларускія рублі, замежная валюта, у прыватнасці банкноты і манеты, якія з'яўляюцца законным сродкам плацяжу, а таксама каштоўныя паперы, акцызныя маркі, маркі мытнага кантролю, маркі пошлін і збораў, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.4. тэхнічныя сродкі, якія не могуць быць выкарыстаны інакш чым для прафілактыкі інваліднасці і (ці) рэабілітацыі інвалідаў пры наяўнасці заключэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь аб тым, што да ўказаных тэхнічных сродкаў адносяцца наступныя тавары, якія ўвозяцца (увезены):

1.4.1. сурдатэхнічныя сродкі:

сігналізатары гуку светлавыя і вібрацыйныя;

вібратактыльныя прылады;

слыхамаўленчыя трэнажоры;

медыяпрадукцыя (відэафільмы з субтытрамі);

сурдатэхнічныя прыборы для кампенсацыі страты слыху;

электрычныя гукаўзмацняльныя камплекты, гукаўзмацняльная апаратура індывідуальнага і калектыўнага карыстання, спецыяльна прызначаныя для навучання глухіх і слабабачачых;

прыборы «бачнага маўлення» і іншыя індыкатары гукаў мовы для глухіх;

тэхнічныя сродкі, якія прымяняюцца глухімі ў быце (тэлефонныя апараты для глухаватых і глухіх (апараты з узмацняльнікамі, з «бягучым радком», «тэлеаўтографы», будзільнікі для глухіх);

1.4.2. тыфлатэхнічныя сродкі:

тэхнічныя сродкі, спецыяльна прызначаныя для арыентавання невідушчых у прасторы;

прыборы, грыфелі, электронныя і механічныя пішучыя машынкі і папера, спецыяльна прызначаная для пісьма рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля;

літаратура, якая выдаецца рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля, а таксама з узбуйненым шрыфтам;

тэхнічныя сродкі, якія прымяняюцца невідушчымі ў быце (аптычныя, спецыяльныя прылады для чытання «гаворачай кнігі»);

электронна-аптычныя тэхнічныя сродкі для карэкціроўкі слабабачання;

праграмнае забеспячэнне, тэхнічныя сродкі, спецыяльна прызначаныя для палягчэння працы невідушчых на персанальных электронна-вылічальных машынах;

1.4.3. цацкі і гульні, спецыяльна прызначаныя для невідушчых;

1.4.4. тэхнічныя сродкі для рэабілітацыі слепаглухіх;

1.4.5. спецыяльныя бытавыя прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца інвалідамі для надзявання адзення, абутку, адчынення дзвярэй, карыстання ключамі і іншага, а таксама для самаабслугоўвання на кухні (для абірання і рэзкі прадуктаў);

1.4.6. спецыялізаваныя прыстасаванні для абсталявання працоўных месцаў інвалідаў;

1.4.7. спецыяльнае трэнажорнае і спартыўнае абсталяванне для інвалідаў;

1.4.8. пад'ёмнікі рознага прызначэння для абслугоўвання інвалідаў;

1.5. лекавыя сродкі, медыцынскія вырабы і пратэзна-артапедычныя вырабы, а таксама сыравіна, матэрыялы для іх вырабу, камплектуючыя вырабы для іх вытворчасці, паўфабрыкаты да іх па пераліку, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, калі яны ўключаны ў Дзяржаўны рэестр лекавых сродкаў Рэспублікі Беларусь ці Дзяржаўны рэестр вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі Рэспублікі Беларусь або ў адносінах да такіх тавараў ёсць заключэнне Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь аб тым, што тавары, якія ўвозяцца (увезены), адносяцца да лекавых сродкаў, медыцынскіх вырабаў і пратэзна-артапедычных вырабаў ці да сыравіны, матэрыялаў для іх вырабу, камплектуючых вырабаў для іх вытворчасці, паўфабрыкатаў да іх;

1.6. насенне, якое ўвозіцца для навуковых мэт і дзяржаўнага гатункавыпрабавання.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць насення, указанага ў частцы першай гэтага падпункта, з'яўляюцца заключэнне дзяржаўнай установы «Дзяржаўная інспекцыя па выпрабаванні і ахове гатункаў раслін» аб прызначэнні насення, якое ўвозіцца, для дзяржаўнага сортавыпрабавання ці заключэнне Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі аб прызначэнні насення, якое ўвозіцца, для навуковых мэт;

1.7. носьбіты экзэмпляраў фільмаў, культурныя каштоўнасці, якія ўвозяцца арганізацыямі культуры.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'ўляецца заключэнне Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб аднясенні тавараў, якія ўвозяцца, да носьбітаў экзэмпляраў фільмаў ці культурных каштоўнасцей;

1.8. усе віды друкаваных выданняў, якія атрымліваюцца дзяржаўнымі бібліятэкамі і музеямі па міжнародным кнігаабмене, а таксама кіна- і відэатворы, якія ўвозяцца дзяржаўнымі кіна- і відэаарганізацыямі ў мэтах ажыццяўлення міжнародных некамерцыйных абменаў;

1.9. каштоўныя металы, каштоўныя камяні і вырабы (часткі вырабаў) з іх (акрамя ювелірных вырабаў), а таксама канцэнтраты і іншыя прамысловыя прадукты, лом і адходы, якія змяшчаюць каштоўныя і каляровыя металы, што ўвозяцца для папаўнення Дзяржфонда, пры наяўнасці адпаведнага пацвярджэння Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ці Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (для каштоўных металаў у выглядзе банкаўскіх зліткаў, якія ўвозяцца для папаўнення залатога запасу Дзяржфонда);

1.10. банкаўскія і мерныя злiткі з каштоўных металаў, якія ўвозяцца банкамі;

1.11. тавары, якія ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і прызначаны для афіцыйнага карыстання дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі замежных дзяржаў ці для асабістага карыстання дыпламатычным і (ці) адміністрацыйна-тэхнічным персаналам гэтых прадстаўніцтваў і ўстаноў, уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі (калі яны не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь), прадстаўніцтвамі і органамі міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, а таксама дыпламатычная пошта і консульская валіза;

1.12. тавары, якія атрымліваюцца (атрыманы) у якасці замежнай бязвыплатнай дапамогі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.13. тавары, якія атрымліваюцца (атрыманы) у якасці міжнароднай тэхнічнай дапамогі і (ці) набытыя за кошт сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі, прызначаныя для мэт, вызначаных праектам (праграмай) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, у парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.14. абсталяванне, прыборы, матэрыялы і камплектуючыя вырабы, прызначаныя для выканання навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных прац, якія

ўвозяцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь у парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.15. тавары, якія ўвозяцца арганізацыямі, што ажыццяўляюць вытворчасць лазерна-аптычнай тэхнікі, прымяняюцца такімі арганізацыямі ў складзе лазерна-аптычнай тэхнікі і не выраблююцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама абсталяванне і аснастка, якія выкарыстоўваюцца імі для вытворчасці лазерна-аптычнай тэхнікі.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць тавараў, абсталявання і аснасткі, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца заключэнне аб тым, што яны неабходныя для вытворчасці лазерна-аптычнай тэхнікі, якое выдае Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь у парадку і па форме, што вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.16. устаноўкі, камплектуючыя і запасныя часткі да іх па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі.

Падставай для вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца заключэнне аб аднясенні тавараў, якія ўвозяцца, да ўстановак, камплектуючых і запасных частак да іх па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі, якое выдае Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь у парадку і па форме, што вызначыў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.17. тэхналагічнае абсталяванне і запасныя часткі да яго, прызначаныя для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, якія фінансуюцца за кошт знешніх дзяржаўных пазык (крэдытаў) у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.18. тэхналагічнае абсталяванне, камплектуючыя і (ці) запасныя часткі да яго, якія ўвозяцца рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій у парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.19. тэхналагічнае абсталяванне (камплектуючыя і (ці) запасныя часткі да яго) для выкарыстання яго на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у рамках заключаных інвестыцыйных дагавораў паміж інвестарам і Рэспублікай Беларусь у парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.20. іншыя тавары ў парадку і на ўмовах, якія вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

2. Тавары, указаныя ў падпунктах 1.2, 1.3, 1.5, частцы першай падпункта 1.6, частцы першай падпункта 1.7, падпунктах 1.8–1.10, 1.12, частцы першай падпункта 1.15 і частцы першай падпункта 1.16 пункта 1 гэтага артыкула, змешчаныя пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання з выкарыстаннем ільгот па падатку на дабаўленую вартасць, лічацца выпушчанымі без абмежаванняў па карыстанні і (ці) распараджэнні гэтымі таварамі.

Абмежаванні па карыстанні і (ці) распараджэнні таварамі, указанымі ў падпунктах 1.13, 1.14, 1.17–1.19 пункта 1 гэтага артыкула, дзейнічаюць да выкарыстання і спажывання тавараў у мэтах, якія адпавядаюць умовам давання льгот, але не больш за пяць гадоў з дня выпуску тавараў у адпаведнасці з мытнай працэдурай выпуску для ўнутранага спажывання, што пацвярджаецца падачай мытнаму органу справаздачы плацельшчыка ў парадку і па формах, устаноўленых Дзяржаўным мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь.

Тавары, указаныя ў падпункце 1.4 пункта 1 гэтага артыкула, увезеныя з выкарыстаннем ільгот па падатку на дабаўленую вартасць, павінны выкарыстоўвацца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у мэтах прафілактыкі інваліднасці і (ці) рэабілітацыі інвалідаў. Пры нямэтавым выкарыстанні гэтых тавараў або іх вывазе за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без выкарыстання ва ўказаных мэтах падатак на дабаўленую вартасць выплачваецца (спаганяецца) у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 120. Падатковая база падатку на дабаўленую вартасць**

1. Падатковая база пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў вызначаецца як кошт гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, падлічаны зыходзячы з цэн (тарыфаў) на тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы з улікам акцызаў (для падакцызных тавараў) без уключэння ў іх падатку на дабаўленую вартасць.

2. Палажэнні пункта 1 гэтага артыкула распаўсюджваюцца на абароты па рэалізацыі:

2.1. набытых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

2.2. вырабленых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

2.3. тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў.

3. Падатковая база вызначаецца:

зыходзячы з усіх паступленняў плацельшчыка, атрыманых ім у грашовай, натуральнай і іншых формах ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

у залежнасці ад асаблівасцей рэалізацыі вырабленых ці набытых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

4. Падатковая база павялічваецца на сумы, фактычна атрыманыя (належныя да атрымання):

4.1. за рэалізаваныя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы звыш цаны іх рэалізацыі або інакш звязаныя з аплатай рэалізаваных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

4.2. у выглядзе санкцый за парушэнне пакупнікамі (заказчыкамі) умоў дагавораў;

4.3. у выглядзе дадатковай выгады за рэалізаваныя камісіянерам тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы на ўмовах больш выгадных, чым тыя, якія былі ўказаны камітэнтам.

Падатковая база павялічваецца ў камісіянера ў частцы дадатковай выгады, належнай камісіянеру, у камітэнта – у частцы дадатковай выгады, належнай камітэнту;

4.4. у выглядзе працэнтаў (платы) за карыстанне камерцыйнай пазыкай, дадзенай прадаўцамі тавараў (прац, паслуг) у выглядзе адтэрміноўкі ці растэрміноўкі аплаты адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг).

5. Пры вызначэнні падатковай базы не ўлічваюцца атрыманыя плацельшчыкам сродкі, не звязаныя з разлікамі па аплаце тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у тым ліку:

5.1. сродкі, якія пералічваюцца галаўной арганізацыяй адасобленым падраздзяленням, якія ўваходзяць у яе склад, а таксама гэтымі адасобленымі падраздзяленнямі адно аднаму, з цэнтралізаваных фінансавых фондаў (рэзерваў) у якасці паўторнага пераразмеркавання прыбытку;

5.2. дывідэнды і прыраўнаваныя да іх даходы;

5.3. сродкі, пералічаныя арганізацыі, у тым ліку дзяржаўнаму аб'яднанню, аб'яднанню, асацыяцыі, а таксама выканаўчаму органу акцыянернага таварыства арганізацыямі (даччынымі і залежнымі таварыствамі), адасобленымі структурнымі падраздзяленнямі за кошт прыбытку, які застаецца ў іх распараджэнні:

пры ўмове, што яны трацяцца па зацверджаным каштарысе для ажыццяўлення цэнтралізаваных функцый па кіраванні ўсімі арганізацыямі (даччынымі і залежнымі таварыствамі), адасобленымі структурнымі падраздзяленнямі, якія ўваходзяць у склад арганізацыі, у тым ліку дзяржаўнага аб'яднання, аб'яднання, акцыянернага таварыства, асацыяцыі;

для фарміравання цэнтралізаваных фінансавых фондаў (рэзерваў);

5.4. сродкі рэзервовага і іншых фондаў, якія перадаюцца ў межах адной юрыдычнай асобы;

5.5. сродкі, якія паступілі з бюджэту або з бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні, за выключэннем сродкаў, якія паступаюць з бюджэту або з бюджэтаў указаных фондаў у якасці аплаты за рэалізаваныя плацельшчыкам тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы.

6. Пры рэалізацыі за замежную валюту:

6.1. тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па дагаворах, якія прадугледжваюць разлікі ў замежнай валюце, для вызначэння падатковай базы (за выключэннем падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу) пералічэнне замежнай валюты ў беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

6.2. тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па дагаворах, якія прадугледжваюць разлікі ў замежнай валюце, на ўмовах папярэдняй аплаты, авансу, задатку для вызначэння падатковай базы (за выключэннем падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу) пералічэнне замежнай валюты ў беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на:

дату атрымання папярэдняй аплаты, авансу, задатку, – у частцы кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, роўнай суме папярэдняй аплаты, авансу, задатку;

момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у астатняй частцы кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

7. Па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце па афіцыйным курсе беларускага рубля ў адносінах да замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату аплаты, падатковая база пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу):

вызначаецца ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы;

вызначаецца ў падлеглай аплаце суме ў беларускіх рублях – у выпадку, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы папярэднічае моманту фактычнай рэалізацыі ці супадае з ім;

не павялічваецца (не памяншаецца) на суму розніц, якія былі атрыманы з 1 студзеня 2018 года і ўзнікаюць у сувязі са змяненнем афіцыйнага курса беларускага рубля ў адносінах да замежнай валюты, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, з моманту фактычнай рэалізацыі да моманту вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы – у выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы.

Для мэт гэтага пункта:

пад датай вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы разумеецца дата, указаная ў абзацы першым часткі першай гэтага пункта, а ў выпадку спынення абавязацельства на іншых падставах – дата спынення абавязацельства (поўнасцю ці ў адпаведнай частцы);

у выпадку атрымання аплаты ў беларускіх рублях часткамі (спыненне абавязацельстваў у адпаведнай частцы) сума ў замежнай валюце прымаецца ў памеры, зыходзячы з эквіваленту якога згодна з дагаворам праведзена аплата (спынена абавязацельства) у адпаведнай частцы.

8. Па дагаворах, у якія сума абавязацельстваў выражана ў беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце па вызначаных заканадаўствам або пагадненнем бакоў курсе замежнай валюты ці даце вызначэння велічыні абавязацельства, адрозным ад курса ці даты, указаных у частцы першай пункта 7 гэтага артыкула, падатковая база пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу) вызначаецца:

у беларускіх рублях па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства;

у падлеглай аплаце суме ў беларускіх рублях – у выпадку, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства папярэднічае моманту фактычнай рэалізацыі ці супадае з ім.

У выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства, падатковая база, вызначаная ў адпаведнасці з абзацам другім часткі першай гэтага пункта:

павялічваецца (памяншаецца) на суму розніцы, якая ўзнікае паміж падлеглай аплаце сумай у беларускіх рублях і сумамі падатковай базы, вызначанай у адпаведнасці з абзацам другім часткі першай гэтага пункта, і розніц, указаных у абзацы трэцім гэтай часткі;

не павялічваецца (не памяншаецца) на суму розніц, якія былі атрыманы з 1 студзеня 2018 года і ўзнікаюць у сувязі са змяненнем афіцыйнага курса беларускага рубля ў адносінах да замежнай валюты, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, з моманту фактычнай рэалізацыі да моманту вызначэння велічыні абавязацельства.

Павелічэнне (змяншэнне) падатковай базы на суму розніцы, якая ўзнікае згодна з абзацам другім часткі другой гэтага пункта, праводзіцца на дату паступлення аплаты за тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, а ў выпадку спынення абавязацельства на іншых падставах – на дату спынення абавязацельстваў (поўнасцю ці ў адпаведнай частцы).

Змяншэнне падатковай базы на суму розніцы, якая ўзнікае згодна з абзацам другім часткі другой гэтага пункта, праводзіцца на падставе выстаўленага пакупніку дадатковага электроннага рахунка-фактуры, падпісанага пакупніком электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўлены прадаўцом электронны рахунак-фактура быў падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам.

Калі дадатковы электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам не пазней за дату падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае дата, указаная ў частцы трэцяй гэтага пункта, то падатковая база памяншаецца за ўказаны справаздачны перыяд.

Калі дадатковы электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам пасля падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае дата, указаная ў частцы трэцяй гэтага пункта, то падатковая база памяншаецца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць:

або таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе пасля падпісання пакупніком дадатковага электроннага рахунка-фактуры;

або таго справаздачнага перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы электронны рахунак-фактура.

У адносінах да розніцы, якая ўзнікае згодна з абзацам другім часткі другой гэтага пункта ў падатковым перыядзе, які папярэднічае падатковаму перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы электронны рахунак-фактура, змяненні ў частцы змяншэння падатковай базы прадавец мае права ўнесці ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць за такі папярэдні падатковы перыяд.

Для мэт гэтага пункта:

пад датай вызначэння велічыні абавязацельства разумеецца дата, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам або пагадненнем бакоў вызначаецца падлеглая аплаце сума ў беларускіх рублях па абавязацельстве па дагаворы, выражаным у беларускіх рублях у суме, эквівалентнай суме ў замежнай валюце;

у выпадку атрымання аплаты ў беларускіх рублях часткамі (спынення абавязацельстваў у адпаведнай частцы) сума ў замежнай валюце прымаецца ў памеры, зыходзячы з эквіваленту якога згодна з дагаворам праведзена аплата (спынена абавязацельства) у адпаведнай частцы.

9. Па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў замежнай валюце эквівалентна суме ў іншай замежнай валюце, падатковая база пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу) вызначаецца ў беларускіх рублях шляхам пераліку:

сумы ў іншай замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства;

падлеглай аплаце сумы ў замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у выпадку, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства папярэднічае моманту фактычнай рэалізацыі ці супадае з ім.

У выпадку, калі момант фактычнай рэалізацыі папярэднічаў даце вызначэння велічыні абавязацельства, падатковая база павялічваецца (памяншаецца) на суму розніцы, якая ўзнікае паміж сумай у беларускіх рублях, падлічанай шляхам пераліку падлеглай уплаце сумы ў замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, і сумай падатковай базы ў беларускіх рублях, вызначанай на момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Афіцыйны курс Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь для пераліку падлеглай аплаце сумы ў замежнай валюце прымаецца і павелічэнне (памяншэнне) падатковай базы на суму розніцы праводзіцца на дату паступлення платы за тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, а ў выпадку спынення абавязацельства на іншых падставах – на дату спынення абавязацельстваў (поўнасцю ці ў адпаведнай частцы).

Змяншэнне падатковай базы прадаўцом ажыццяўляецца на падставе выстаўленага пакупніку дадатковага электроннага рахунка-фактуры, падпісанага пакупніком электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўлены прадаўцом электронны рахунак-фактура быў падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам.

Калі дадатковы электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам не пазней за дату падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае ўказаная ў частцы трэцяй гэтага пункта дата, то падатковая база памяншаецца за ўказаны справаздачны перыяд.

Калі дадатковы электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам пасля падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае ўказаная ў частцы трэцяй гэтага пункта дата, то падатковая база памяншаецца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць:

або таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе пасля падпісання пакупніком дадатковага электроннага рахунка-фактуры;

або таго справаздачнага перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы электронны рахунак-фактура.

У адносінах да розніцы, якая ўзнікае згодна з часткай другой гэтага пункта ў падатковым перыядзе, які папярэднічае падатковаму перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы электронны рахунак-фактура, змяненні ў частцы змяншэння падатковай базы прадавец мае права ўнесці ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць за такі папярэдні падатковы перыяд.

Для мэт гэтага пункта:

пад датай вызначэння велічыні абавязацельства разумеецца дата, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам ці пагадненнем бакоў вызначаецца падлеглая аплаце сума ў замежнай валюце па абавязацельстве па дагаворы, выражаным у замежнай валюце ў суме, эквівалентнай суме ў іншай замежнай валюце;

у выпадку атрымання аплаты ў замежнай валюце часткамі (спынення абавязацельстваў у адпаведнай частцы) сума ў іншай замежнай валюце прымаецца ў памеры, зыходзячы з эквіваленту якога згодна з дагаворам праведзена аплата (спынена абавязацельства) у адпаведнай частцы.

10. Падатковая база пры перадачы лізінгадавальнікам прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку вызначаецца як сума лізінгавых выплат.

Пры выкупе прадмета лізінгу лізінгаатрымальнікам у падатковую базу ўключаецца таксама сума выкупнога кошту прадмета лізінгу.

Па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў замежнай валюце (у беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце ці ў замежнай валюце эквівалентна суме ў іншай замежнай валюце):

для вызначэння падатковай базы ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу пералік замежнай валюты (іншай замежнай валюты) у беларускія рублі праводзіцца пры надыходзе моманту фактычнай рэалізацыі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты (іншай замежнай валюты), устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

падатковая база ў частцы ўзнагароды (даходу) лізінгадавальніка і інвестыцыйных расходаў лізінгадавальніка, за выключэннем інвестыцыйных расходаў, якія кампенсуюцца ў кошце прадмета лізінгу, вызначаецца ў парадку, устаноўленым пунктамі 6–9 гэтага артыкула.

Пры падаткаабкладанні плацельшчыкам абаротаў па пакрыцці ў адпаведнасці з падпунктам 9.3 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса ў падатковую базу:

лізінгадавальніка ўключаецца падлеглы пакрыццю лізінгаатрымальнікам кошт набытых лізінгадавальнікам прац (паслуг), звязаных з фінансавай арэндай (лізінгам), не ўключаны ў суму лізінгавай выплаты;

лізінгаатрымальніка ўключаецца падлеглы пакрыццю лізінгадавальнікам кошт набытых лізінгаатрымальнікам прац (паслуг), звязаных з фінансавай арэндай (лізінгам).

11. Падатковая база пры здачы арэндадаўцам аб'екта арэнды арандатару вызначаецца як сума арэнднай платы.

Пры выкупе аб'екта арэнды арандатарам у падатковую базу ўключаецца таксама сума выкупной цаны аб'екта арэнды.

Пры падаткаабкладанні плацельшчыкам абаротаў па пакрыцці ў адпаведнасці з падпунктам 9.3 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса ў падатковую базу:

арэндадаўца ўключаецца падлеглы пакрыццю арандатарам кошт набытых арэндадаўцам прац (паслуг), звязаных з арэндай, не ўключаны ў суму арэнднай платы;

арандатара ўключаецца падлеглы пакрыццю арэндадаўцам кошт набытых арандатарам прац (паслуг), звязаных з арэндай.

12. Падатковая база пры даванні пазыкадавальнікам маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне пазыкаатрымальніку вызначаецца як:

падлеглыя пакрыццю пазыкадавальніку сумы налічанай амартызацыі, зямельнага падатку ці арэнднай платы за зямельны ўчастак, падатку на нерухомасць (калі абавязак іх пакрыцця пазыкадавальніку не прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь);

падлеглы пакрыццю пазыкадавальніку кошт расходаў на ўтрыманне маёмасці і (ці) іншых расходаў, звязаных з маёмасцю (у тым ліку расходаў на эксплуатацыю, рамонт маёмасці, затрат на камунальныя паслугі), за выключэннем кошту набытых пазыкадавальнікам прац (паслуг), звязаных з маёмасцю, і расходаў, указаных у абзацы другім гэтай часткі.

Пры падаткаабкладанні плацельшчыкам абаротаў па пакрыцці ў адпаведнасці з падпунктам 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса ў падатковую базу пазыкадавальніка ўключаецца падлеглы пакрыццю пазыкаатрымальнікам кошт:

набытых пазыкадавальнікам прац (паслуг) па ўтрыманні маёмасці;

іншых набытых пазыкадавальнікам прац (паслуг), звязаных з маёмасцю, у тым ліку расходаў на эксплуатацыю, рамонт маёмасці, затрат на камунальныя паслугі.

13. Пры рэалізацыі асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, асобных прадметаў у складзе абаротных сродкаў і маёмасці, якая ўлічваецца ў складзе пазаабаротных актываў, па цэнах ніжэй за астаткавы кошт, пры рэалізацыі набытых на баку тавараў, маёмасных правоў па цэнах ніжэй за цану набыцця падатковая база вызначаецца зыходзячы з цаны іх рэалізацыі.

Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) уласнай вытворчасці, маёмасных правоў па цэнах ніжэй за іх сабекошт падатковая база вызначаецца зыходзячы з цаны рэалізацыі такіх тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

14. Пры бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, выробленых (выкананых, аказаных) плацельшчыкам, падатковая база вызначаецца зыходзячы з сабекошту такіх тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Пры бязвыплатнай перадачы набытых тавараў падатковая база вызначаецца зыходзячы з цаны іх набыцця.

Пры бязвыплатнай перадачы аб'ектаў асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, асобных прадметаў у складзе абаротных сродкаў і маёмасці, якая ўлічваецца ў складзе пазаабаротных актываў, падатковая база вызначаецца зыходзячы з іх астаткавага кошту.

Астаткавы кошт і цана набыцця прымаюцца на дату бязвыплатнай перадачы з улікам пераацэнак (уцэнак), якія праводзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

15. Пры іншым выбыцці ў магазінах бяспошліннага гандлю тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, падатковая база вызначаецца зыходзячы з цаны іх набыцця без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

16. Падатковая база пры перадачы маёмасных правоў вызначаецца з улікам наступных асаблівасцей:

16.1. пры ўступцы права патрабавання першапачатковым крэдыторам, якая паходзіць з дагавораў, накіраваных на рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, падатковая база вызначаецца як сума перавышэння памеру абавязацельстваў па такіх дагаворах;

16.2. пры ўступцы права патрабавання новым крэдыторам, які атрымаў грашовае патрабаванне, што вынікае з дагавору, накіраванага на рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), падатковая база вызначаецца як сума перавышэння даходу, атрыманага новым крэдыторам пры наступнай уступцы права патрабавання ці пры спыненні адпаведнага абавязацельства, над расходамі на набыццё ўказанага патрабавання;

16.3. пры перадачы маёмасных правоў плацельшчыкамі, у тым ліку ўдзельнікамі долевага будаўніцтва, на аб'екты нерухомасці, доляў у праве ўласнасці на аб'екты нерухомасці, гаражы і месцы аўтамабільных стаянак падатковая база вызначаецца як станоўчая розніца паміж коштам, па якім перадаюцца маёмасныя правы (долі ў праве ўласнасці) з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і расходамі на набыццё гэтых правоў (доляў у праве ўласнасці) з улікам падатку на дабаўленую вартасць;

16.4. пры набыцці грашовага патрабавання ў трэціх асоб падатковая база вызначаецца як сума перавышэння даходу, атрыманага ад даўжніка і (ці) пры наступнай уступцы, над расходамі на набыццё гэтага патрабавання;

16.5. пры перадачы маёмасных правоў, звязаных з правам заключэння дагавору, падатковая база вызначаецца як кошт такога права без уключэння ў яе падатку на дабаўленую вартасць.

17. Падатковая база пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па тэрміновых здзелках, якія прадугледжваюць пастаўку тавараў, маёмасных правоў, выкананне прац, аказанне паслуг пасля сканчэння ўстаноўленага дагаворам тэрміну па ўказанай непасрэдна ў гэтым дагаворы цане, вызначаецца зыходзячы з указанай непасрэдна ў дагаворы цаны тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, павялічанай на кошт адпаведных форвардных і ф'ючарсных кантрактаў, апцыёнаў і іншых фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак.

18. Падатковая база пры рэалізацыі прадпрыемства ў цэлым як маёмаснага комплексу вызначаецца асобна па кожным з відаў маёмасці гэтага прадпрыемства.

У выпадку, калі кошт, па якім прадпрыемства ў цэлым як маёмасны комплекс рэалізаваны, ніжэйшы (вышэйшы) за балансавы кошт рэалізаванай маёмасці, для вызначэння падатковай базы падатку на дабаўленую вартасць па кожным відзе маёмасці прымяняецца папраўчы каэфіцыент, разлічаны як адносіны кошту рэалізацыі прадпрыемства да балансавага кошту маёмасці, якая ўваходзіць у склад гэтага прадпрыемства.

19. Падатковая база пры рэалізацыі маёмасці даўжніка ў рамках выканаўчага вядзення, уключаючы перадачу маёмасці даўжніка спагнальніку, вызначаецца даўжніком:

пры рэалізацыі маёмасці даўжніка пакупніку – як сума грашовых сродкаў ад рэалізацыі маёмасці даўжніка, якая падлягае залічэнню на рахунак органа прымусовага выканання;

пры пакіданні маёмасці даўжніка за спагнальнікам – як вызначаны ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 года «Аб выканаўчым вядзенні» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 15.11.2016, 2/2437) кошт маёмасці даўжніка, па якім яна пакідаецца за спагнальнікам.

20. Падатковая база пры рэалізацыі па фіксаваных рознічных цэнах, якія ўключаюць падатак на дабаўленую вартасць:

набытых (увезеных) тавараў вызначаецца як станоўчая розніца паміж цаной рэалізацыі і цаной набыцця гэтых тавараў. Пры гэтым цэны набыцця і рэалізацыі вызначаюцца з улікам падатку на дабаўленую вартасць;

выраблены тавараў вызначаецца як кошт гэтых тавараў, падлічаны зыходзячы з фіксаваных рознічных цэн, якія ўключаюць падатак на дабаўленую вартасць.

Палажэнні абзаца другога часткі першай гэтага пункта не прымяняюцца пры рэалізацыі набытых (увезеных) тавараў, падлік падатку на дабаўленую вартасць па якіх праводзіцца ў адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта прымяняюцца таксама пры рэалізацыі тавараў па фіксаваных рознічных цэнах без падатку на дабаўленую вартасць у выпадку, калі абароты па рэалізацыі такіх тавараў вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

21. Па таварах, якія рэалізуюцца па свабодных і рэгуляваных (фіксаваных) рознічных цэнах плацельшчыкамі, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль і грамадскае харчаванне, атрымліваюць па гэтых таварах даход у выглядзе розніцы ў цэнах, нацэнак, надбавак і вылічваюць падатак на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса, падатковай базай з'яўляецца кошт рэалізаваных тавараў (з улікам усіх падаткаў, збораў (пошлін) і іншых выплат у бюджэт або бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія спаганяюцца пры рэалізацыі тавараў).

22. Падатковая база пры рэалізацыі набытых пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва, бланкаў працоўных кніжак і (ці) укладышаў да іх вызначаецца як станоўчая розніца паміж цаной рэалізацыі і цаной набыцця гэтых пуцёвак, бланкаў. Пры гэтым цэны набыцця і рэалізацыі вызначаюцца з улікам падатку на дабаўленую вартасць.

23. Падатковая база пры адгрузцы (вяртанні) тары, якая прызнана зваротнай тарай згодна з падпунктам 1.1.7 пункта 1 артыкула 115 гэтага Кодэкса, вызначаецца:

прадаўцом тавару як кошт такой тары пры яе адгрузцы пакупніку тавару;

пакупніком тавару як кошт такой тары пры яе вяртанні прадаўцу тавару.

24. Падатковая база пры перадачы тавараў па дагаворы пазыкі ў выглядзе рэчаў вызначаецца як кошт тавараў, якія перадаюцца, прадугледжаны дагаворам, пры адсутнасці кошту ў дагаворы – як кошт, указаны ў таварасуправаджальных дакументах, а пры адсутнасці кошту ў дагаворы і таварасуправаджальных дакументах – як кошт тавараў, адлюстраваны ў бухгалтарскім уліку.

25. Падатковая база па аперацыях па даванні камерцыйнымі арганізацыямі, уключанымі ў рэестр мікрафінансавых арганізацый, мікрапазык фізічным асобам пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, вызначаецца як сума даходаў (працэнтаў і іншых даходаў), звязаных з даваннем такіх пазык.

26. Падатковая база пры рэалізацыі прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) вызначаецца як кошт апрацоўкі, перапрацоўкі ці іншай трансфармацыі ўказанай сыравіны (матэрыялаў) без уключэння ў яе падатку на дабаўленую вартасць.

Сума акцызаў, падлічаная (падлеглая падліку) плацельшчыкам, які вырабляе падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны, не ўключаецца ў падатковую базу пры рэалізацыі ім прац па вытворчасці падакцызных тавараў з давальніцкай сыравіны.

Пры наяўнасці абаротаў па рэалізацыі прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), якія рэалізуюцца іх уласнікам у розныя дзяржавы (уключаючы Рэспубліку Беларусь), падатковая база для прымянення адпаведных ставак падатку на дабаўленую вартасць вызначаецца прапарцыянальна аб'ёму (колькасці) адгружаных тавараў.

27. Падатковая база пры кантрактнай вытворчасці тытунёвых вырабаў вызначаецца па выбары арганізацыі-вытворцы ў адным з наступных парадкаў:

як кошт прац па вытворчасці ўказаных тытунёвых вырабаў з улікам кошту матэрыялаў арганізацыі-вытворцы, уключаючы сумы акцызаў, падлічаныя арганізацыяй-вытворцам тытунёвых вырабаў, без уключэння ў яго падатку на дабаўленую вартасць;

у парадку, устаноўленым пунктам 26 гэтага артыкула.

Выбраны арганізацыяй-вытворцам парадак вызначэння падатковай базы адлюстроўваецца ў яе ўліковай палітыцы і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

28. Падатковая база пры рэалізацыі прадукцыі, вырабленай з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, вызначаецца як кошт прадукцыі з улікам кошту выкарыстаных у вытворчасці каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

29. Падатковая база пры ажыццяўленні пасрэдніцкай дзейнасці вызначаецца як сума, атрыманая (падлеглая да атрымання) у выглядзе ўзнагарод па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах.

30. Падатковая база па паслугах транспартнай экспедыцыі вызначаецца як сума, атрыманая (падлеглая да атрымання) у выглядзе ўзнагароды экспедытара па дагаворы транспартнай экспедыцыі.

Узнагарода вызначаецца як сума, атрыманая (падлеглая да атрымання) ад кліента за аказаныя яму паслугі за вылікам кампенсаваных кліентам сродкаў, пералічаных (падлеглых пераліку) перавозчыкам і іншым арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам, якія аказваюць паслугі, указаныя ў дагаворы транспартнай экспедыцыі.

Палажэнні гэтага пункта распаўсюджваюцца таксама на выпадкі, калі ў адпаведнасці з дагаворам транспартнай экспедыцыі абавязкі экспедытара выконваюцца перавозчыкам.

31. Падатковую база пры рэалізацыі паслуг па даверным кіраванні маёмасцю, аказаных даручальніку (выгаданабытчыку), даверны кіраўнік вызначае як суму ўзнагароды, атрыманую (падлеглую да атрымання) ім па дагаворы давернага кіравання маёмасцю.

Падатковую базу пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у ходзе давернага кіравання маёмасцю па дагаворы давернага кіравання маёмасцю ў інтарэсах даручальніка ці ўказанай ім асобы (выгаданабытчыка) вызначае даверны кіраўнік з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтым артыкулам.

32. Падатковая база пры рэалізацыі генпадрадчыкамі будаўнічых і (ці) праектных прац, выкананых з удзелам субпадрадчыкаў, вызначаецца як кошт прац згодна з дагаворам, заключаным паміж заказчыкам і генпадрадчыкам.

33. Падатковая база заказчыкамі (забудоўшчыкамі) пры будаўніцтве аб'ектаў, якія не паступаюць у далейшым ва ўласнасць (карыстанне) заказчыка (забудоўшчыка), вызначаецца:

33.1. пры вядзенні будаўніцтва за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў – як кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка), вызначаны зыходзячы з аб'ёму сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне заказчыка (забудоўшчыка) праектна-каштарыснай дакументацыяй на будаўніцтва аб'екта з улікам падатку на дабаўленую вартасць;

33.2. пры вядзенні будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў):

33.2.1. у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, – як кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка), вызначаны зыходзячы з аб'ёму сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне заказчыка (забудоўшчыка) праектна-каштарыснай дакументацыяй на будаўніцтва аб'екта з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і разлічаны прапарцыянальна долі ўдзелу дольшчыка ў будаўніцтве аб'екта, і сума прыбытку заказчыка (забудоўшчыка), прадугледжаная дагаворам з дольшчыкам.

Пры гэтым сума выгады заказчыка (забудоўшчыка), якая ўтварылася ў выніку зніжэння фактычнага кошту аб'екта долевага будаўніцтва ў адносінах да цаны аб'екта долевага будаўніцтва (цаны дагавору):

уключаецца ў падатковую базу падатку на дабаўленую вартасць як кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка), калі дагаворам з дольшчыкам вызначана ўключэнне такой сумы ў кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка);

павялічвае падатковую базу падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 4.1 пункта 4 гэтага артыкула, калі дагаворам з дольшчыкам не вызначана ўключэнне такой сумы ў кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка);

33.2.2. у іншых выпадках – як узнагарода, якая вызначаецца ў выглядзе розніцы паміж сумай сродкаў з улікам падатку на дабаўленую вартасць, належнай да атрымання па дагаворы з трэцяй асобай (у тым ліку з дольшчыкам), і сумай фактычна праведзеных затрат з улікам

падатку на дабаўленую вартасць па будаўніцтве аб'екта, які даводзіцца на долю трэцяй асобы (у тым ліку дольшчыка), але не менш чым кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка), вызначаны выходзячы з аб'ёму сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне заказчыка (забудоўшчыка) праектна-каштарыснай дакументацыяй на будаўніцтва аб'екта з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і разлічаны прапарцыянальна долі ўдзелу трэцяй асобы (у тым ліку дольшчыка) у будаўніцтве аб'екта;

33.2.3. з выкарыстаннем тавараў (прац, паслуг), выробленых (выкананых, аказаных) уласнымі сіламі заказчыка (забудоўшчыка), – як кошт такіх тавараў (прац, паслуг), уключаны ў кошт будаўніцтва.

34. Пры вызначэнні падатковай базы па паслугах міжнароднай сувязі не ўлічваюцца сумы, атрыманыя арганізацыямі сувязі ад рэалізацыі ўказаных паслуг замежным адміністрацыям сувязі, прызначаным аператарам паштовай сувязі, кампаніям ці прызнаным эксплуатацыйным арганізацыям.

35. Падатковая база па перавозках дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» вызначаецца без уліку разлікаў паміж юрыдычнымі асобамі, якія ўваходзяць у зводны баланс асноўнай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка».

36. Пры рэалізацыі па рэгуляваных заканадаўствам тарыфах паслуг па перавозцы пасажыраў усімі відамі транспарту ў рэгулярных зносінах, па якіх пакрыццё часткі затрат па аказанні такіх паслуг (уключаючы даванне льготы па праездзе асобным катэгорыям грамадзян у адпаведнасці з заканадаўствам) праводзіцца за кошт субсідый, падатковая база вызначаецца як кошт гэтых паслуг без уліку дадзеных субсідый на пакрыццё ўказаных затрат.

37. Пры рэалізацыі па падпісцы друкаваных сродкаў масавай інфармацыі юрыдычнымі асобамі, на якія ўскладзены функцыі рэдакцый друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, падатковая база вызначаецца як падпісны кошт тыражу гэтых друкаваных сродкаў масавай інфармацыі за вылікам сум, якія застаюцца на рахунках:

арганізацый сувязі ў лік аплаты аказаных імі паслуг сувязі згодна з устаноўленымі тарыфамі пры рэалізацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі па падпісцы, паслуг па афармленні падпіскі і выдачы друкаваных сродкаў масавай інфармацыі праз гандлёвую сетку гэтых арганізацый;

арганізацый, задзейнічаных у працэсе рэалізацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі па падпісцы, у лік аплаты іх расходаў.

38. Падатковая база пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы, пры якой праводзяцца падлік і выплата падатку на дабаўленую вартасць (прымяняецца вызваленне ад падаткаабкладання) у адпаведнасці з часткай другой падпункта 2.9 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса, вызначаецца як кошт перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, указаны ў першасных уліковых дакументах, без уключэння ў яго падатку на дабаўленую вартасць.

У выпадку змяншэння (павелічэння) кошту ўказаных у частцы першай гэтага пункта тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў пасля сканчэння справаздачнага перыяду, у якім тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы былі перададзены (выкананы, аказаны) у межах адной юрыдычнай асобы, падатковая база памяншаецца (павялічваецца) на суму розніцы, якая ўзнікае паміж зменeным і папярэднім коштам перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у тым справаздачным перыядзе, у якім зменшаны (павялічаны) кошт раней перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Змяншэнне падатковай базы ажыццяўляецца на падставе выстаўленага боку, які атрымлівае, дадатковага электроннага рахунка-фактуры, падпісанага бокам, які атрымлівае, электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўлены бокам, які перадае, электронны рахунак-фактура быў падпісаны бокам, які атрымлівае, электронным лічбавым подпісам.

Адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць сумы змяншэння падатковай базы ў адносінах да даты падпісання бокам, якая атрымлівае, электронным лічбавым подпісам дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага бокам, які перадае, праводзіцца ў парадку, аналагічным парадку, устаноўленаму пунктам 4 артыкула 129 гэтага Кодэкса.

39. Пры рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў з арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, падатковая база вызначаецца як кошт гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Падатковая база вызначаецца асобна пры здзяйсненні кожнай аперацыі па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з улікам палажэнняў гэтай главы і павялічваецца на сумы, указаныя ў пункце 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

Падатковая база вызначаецца арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і набываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы ў замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, а пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў – арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на аснове такіх дагавораў, заключаных з указанымі замежнымі арганізацыямі.

Пры рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, падатковая база прызнаецца роўнай нулю, калі пры ўвозе гэтых тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь аплачаны падатак на дабаўленую вартасць, за выключэннем падатку на дабаўленую вартасць, заплачанага пры змяшчэнні тавараў пад мытную працэдуру часовага ўвозу (допуску).

**Артыкул 121. Вызначэнне моманту фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў вызначаецца як дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, які прыпадае на справаздачны перыяд, незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх, калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой.

2. Днём адгрузкі тавараў прызнаюцца:

дата іх водпуску пакупніку (атрымальніку ці арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), якая ажыццяўляе перавозку (экспедзіраванне) тавару, ці арганізацыі сувязі), калі прадавец не ажыццяўляе дастаўку (транспарціроўку) тавараў або не робіць затрат па іх дастаўцы (транспарціроўцы);

дата, якая вызначаецца ў адпаведнасці з уліковай палітыкай арганізацыі (рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка), але не пазней за дату пачатку іх транспарціроўкі – у іншых выпадках.

3. Пры рэалізацыі тавараў па рознічных цэнах у рознічным гандлі і (ці) грамадскім харчаванні з выкарыстаннем касавага абсталявання, якая ажыццяўляецца на працягу змены, што пачынаецца ў адзін каляндарны дзень і заканчваецца на іншы каляндарны дзень, датай адгрузкі тавараў, рэалізаваных на іншы каляндарны дзень, з'яўляецца дата адкрыцця гэтай змены, якая адлюстроўваецца ў сутачнай (зменнай) справаздачы (Z-справаздачы), якая фарміруецца такім касавым абсталяваннем.

4. Днём адгрузкі тары, якая прызнана зваротнай тарай згодна з часткай другой падпункта 1.1.7 пункта 1 артыкула 115 гэтага Кодэкса, прызнаецца:

прадаўцом тавару – дата яе адгрузкі пакупніку тавару, якая вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула;

пакупніком тавару – дата яе звароту прадаўцу тавару, якая вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула.

5. Пры перадачы тавараў у рамках дагавору пазыкі ў выглядзе рэчаў момантам іх фактычнай рэалізацыі прызнаецца:

пазыкадаўцам – дата іх адгрузкі пазычальніку, якая вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула;

пазычальнікам – дата іх звароту пазыкадаўцу, якая вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула.

6. Днём выканання прац (аказання паслуг), калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, прызнаецца дата перадачы выкананых прац (аказаных паслуг) у адпаведнасці з:

афармленымі першаснымі ўліковымі дакументамі (прыёма-здатачнымі актамі ці іншымі аналагічнымі дакументамі);

іншымі дакументамі, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам першасныя ўліковыя дакументы не афармляюцца.

Пры аказанні паслугі, вынікі якой заказчык можа выкарыстоўваць па меры яе ажыццяўлення на працягу тэрміну дзеяння дагавору, заключанага выканаўцам і заказчыкам у пісьмовай форме, днём аказання паслугі прызнаецца:

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і апошні дзень аказання паслугі, калі тэрмін дзеяння дагавору перавышае адзін месяц;

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і (ці) дзень завяршэння аказання паслугі, калі тэрмін дзеяння дагавору не перавышае адзін месяц.

Пры выкананні працы (аказанні паслугі), вынік якой не можа быць выкарыстаны заказчыкам да завяршэння выканання працы (аказання паслугі), днём выканання працы (аказання паслугі) прызнаецца:

дзень завяршэння выканання працы (аказання паслугі), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дзень завяршэння прыёмкі працы (паслугі), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дата складання першаснага ўліковага дакумента – у выпадках, не ўказаных у абзацах другім і трэцім гэтай часткі.

7. Днём выканання будаўнічых, навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных (тэхналагічных) прац прызнаецца апошні дзень месяца выканання прац. Пры непадпісанні прымаючым бокам актаў выкананых прац за справаздачны месяц да 10-га дня (уключна) месяца, які ідзе следам за справаздачным, днём выканання будаўнічых, навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных (тэхналагічных) прац прызнаецца дзень падпісання прымаючым бокам актаў выкананых прац.

Днём выканання будаўнічых прац, кошт якіх у адпаведнасці з заканадаўствам выражаны ў замежнай валюце, выкананых у месяцы прыёмкі аб'екта будаўніцтва ў эксплуатацыю, прызнаецца дзень падпісання акта бокам, які прымае, калі гэты дзень папярэднічае дню зацвярджэння акта прыёмкі аб'екта будаўніцтва ў эксплуатацыю.

8. Днём перадачы маёмасных правоў па выбары плацельшчыка прызнаецца:

або апошні каляндарны дзень кожнага месяца, да якога адносіцца перадача маёмаснага права, а калі перадача маёмасных правоў завяршаецца да заканчэння месяца – апошні дзень такой перадачы;

або дзень перадачы маёмаснага права, які афармляецца першасным уліковым дакументам.

9. Пры перадачы прадмета лізінгу ў фінансавую арэнду (лізінг) днём перадачы прызнаецца:

у частцы выплаты, заплачанай лізінгаатрымальнікам да пачатку тэрміну часовага валодання і карыстання прадметам лізінгу, – дзень фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку. Гэта палажэнне прымяняецца, калі ўся сума ўказанай выплаты прызнаецца ў адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу) першай лізінгавай выплатай;

у частцы лізінгавых выплат – апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца лізінгавая выплата па такой перадачы, але не раней за дату фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

у частцы выкупнога кошту, калі дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу) прадугледжаны выкуп прадмета лізінгу, – дата надыходу тэрміну пагашэння выкупнога кошту, устаноўленая дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу).

10. Пры здачы аб'екта арэнды ў арэнду днём здачы прызнаецца апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца арэндная плата па такой здачы, але не раней за дату фактычнай перадачы аб'екта арэнды арандатару.

У выпадку, калі канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, перавышае адзін каляндарны месяц і (ці) дагаворам не ўстаноўлены канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, момантам здачы аб'екта ў арэнду прызнаецца:

апошні дзень кожнага месяца на працягу ўстаноўленага дагаворам тэрміну арэнды;

дзень завяршэння тэрміну арэнды, які прыпадае на апошні месяц устаноўленага дагаворам тэрміну арэнды (калі тэрмін арэнды завяршаецца не ў апошні дзень апошняга месяца тэрміну арэнды).

11. Пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне днём перадачы прызнаецца апошні дзень кожнага месяца, да якога адносяцца расходы на ўтрыманне маёмасці, якія прад'яўляюцца пазыкаатрымальніку да пакрыцця, і (ці) іншыя расходы, звязаныя з маёмасцю.

12. Днём адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца па выбары плацельшчыка адна з наступных дат:

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе;

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камісіянерам, паверанымі ці іншай аналагічнай асобай пакупніку, заказчыку з улікам палажэнняў пункта 2 гэтага артыкула.

Выбраны плацельшчыкам парадак вызначэння дня адгрузкі (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка) і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

13. Днём аказання турыстычных паслуг прызнаецца апошні дзень тура.

14. Днём аказання санаторна-курортных і аздараўленчых паслуг, якія аказваюцца санаторна-курортнымі і аздараўленчымі арганізацыямі (іх адасобленымі падраздзяленнямі), па іх выбары прызнаецца адзін з наступных дзён:

апошні дзень тэрміну дзеяння пуцёўкі;

апошні дзень справаздачнага перыяду, у якім пачата дзеянне пуцёўкі (у частцы дзён яе дзеяння, якія прыпадаюць на гэты справаздачны перыяд), і апошні дзень тэрміну дзеяння пуцёўкі (у частцы дзён дзеяння пуцёўкі, якія прыпадаюць на справаздачны перыяд, у якім спыняецца яе дзеянне).

Выбраны арганізацыяй парадак вызначэння дня аказання такіх паслуг адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

15. Днём аказання паслуг пры перавозцы пасажыраў, багажу (грузабагажу), пошты транспартам агульнага карыстання прызнаецца дзень афармлення праязных (перавозачных) дакументаў пасажырам, уладальнікам багажу (грузабагажу), пошты або дзень пачатку ажыццяўлення перавозкі пасажыраў, багажу (грузабагажу), пошты.

Днём аказання паслуг па перавозцы грузаў чыгуначным транспартам прызнаецца:

дата выдачы груза грузаатрымальніку пры перавозцы ва ўнутрырэспубліканскіх зносінах і перавозцы з-за межаў Рэспублікі Беларусь;

дата перадачы груза арганізацыям чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў пры перавозцы за межы Рэспублікі Беларусь або транзітам праз яе тэрыторыю.

16. Днём аказання паслуг пры перавозцы грузу (грузаў) аўтамабільным транспартам па адной заяўцы заказчыка, па адным дагаворы, заказе-даручэнні ці іншым аналагічным

дакуменце (па адным даручэнні экспедытару – у выпадку, калі перавозчык таксама выконвае функцыі экспедытара) з дастаўкай грузу (грузаў) у:

16.1. адно месца разгрузкі – прызнаецца дата атрымання грузу (грузаў) грузаатрымальнікам ці іншай упаўнаважанай на атрыманне грузу (грузаў) асобай;

16.2. некалькі месцаў разгрузкі – прызнаецца дата атрымання грузу (грузаў) грузаатрымальнікам ці іншай упаўнаважанай на атрыманне грузу (грузаў) асобай у апошнім (канчатковым) пункце разгрузкі.

17. Днём аказання паслуг сувязі прызнаецца апошні дзень месяца аказання паслуг сувязі.

18. Днём аказання паслуг па транспарціроўцы газу і нафты прызнаецца апошні дзень месяца аказання паслуг.

19. Днём аказання паслуг у сферы адукацыі пры тэрміне атрымання адукацыі большым за трыццаць каляндарных дзён прызнаецца апошні дзень кожнага месяца аказання такіх паслуг, а калі аказанне паслуг завяршаецца да заканчэння месяца – апошні дзень аказання паслуг.

20. Днём аказання медыцынскіх паслуг пры перыядзе медыцынскага назірання і аказання медыцынскай дапамогі пацыенту ў арганізацыі аховы здароўя большым за трыццаць каляндарных дзён прызнаецца апошні дзень кожнага месяца аказання такіх паслуг, а калі аказанне паслуг завяршаецца да заканчэння месяца – апошні дзень аказання паслуг.

21. Пры бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў момантам іх фактычнай рэалізацыі прызнаецца адпаведна:

дата адгрузкі тавараў, якая вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула;

дата выканання прац (аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, якая вызначаецца ў адпаведнасці з гэтым артыкулам.

Пры абмене таварамі (працамі, паслугамі), маёмаснымі правамі момантам іх фактычнай рэалізацыі прызнаецца дзень абмену. Днём абмену прызнаецца дата здзяйснення кожнай адгрузкі тавару (выканання працы, аказання паслугі), перадачы маёмаснага права, якая вызначаецца ў адпаведнасці з гэтым артыкулам.

Пры натуральнай аплаце працы таварамі (працамі, паслугамі) момантам іх фактычнай рэалізацыі прызнаецца дзень аплаты.

22. Момантам фактычнай рэалізацыі прыроднага і сціснутага газу, электрычнай і цеплавой энергіі прызнаецца па выбары плацельшчыка адна з наступных дат:

дзень залічэння грашовых сродкаў ад іх пакупніка на рахунак плацельшчыка, які прыпадае на справаздачны перыяд;

дзень, вызначаны ў парадку, устаноўленым адпаведна пунктамі 2 і 6 гэтага артыкула.

Выбраны плацельшчыкам парадак вызначэння моманту фактычнай рэалізацыі адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

Палажэнні гэтага пункта распаўсюджваюцца таксама на сумы, атрыманыя ў выглядзе санкцый за парушэнне пакупнікамі (заказчыкамі) умоў дагавораў.

23. Момантам фактычнай рэалізацыі прац пры кантрактнай вытворчасці тытунёвых вырабаў прызнаецца дзень адгрузкі (перадачы) тытунёвых вырабаў заказчыку і (ці) іншым асобам, які вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула.

24. Момантам фактычнай рэалізацыі прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) для нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь прызнаецца дзень адгрузкі (перадачы) тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), які вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула.

25. Момантам фактычнай рэалізацыі пры перадачы прадмета закладу заклададавальнікам закладатрымальніку прызнаецца дзень перадачы прадмета закладу закладатрымальніку (крэдытору), які вызначаецца згодна з пунктам 2 гэтага артыкула, пры невыкананні ці неналежным выкананні забяспечанага закладам абавязацельства.

26. Момантам фактычнай рэалізацыі пры іншым выбыцці тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю ў магазінах бяспошліннага гандлю, прызнаецца дзень складання звяральнай ведамасці ці іншага дакумента, які пацвярджае іх іншае выбыццё.

27. Момантам фактычнай рэалізацыі для аперацый па даванні камерцыйнымі арганізацыямі, уключанымі ў рэестр мікрафінансавых арганізацый, мікрапазык фізічным асобам пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, прызнаецца дзень выдачы закладнога білета, а ў выпадку прадаўжэння тэрміну пазыкі – дата прадаўжэння тэрміну пазыкі, якая ўказваецца ў закладным білеце.

28. Момантам фактычнай рэалізацыі ў адносінах да сум:

28.1. розніцы, якая ўзнікае ў адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 8 і часткай другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса, прызнаецца дзень яе атрымання;

28.2. якія павялічваюць падатковую базу ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса, прызнаецца па выбары плацельшчыка (за выключэннем банкаў) адзін з наступных дзён:

дзень іх атрымання;

дзень адлюстравання гэтых сум у бухгалтарскім уліку.

Выбраны плацельшчыкам (за выключэннем банкаў) парадак вызначэння моманту фактычнай рэалізацыі адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

29. Момантам фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, прызнаецца, за выключэннем выпадку, устаноўленага часткай другога гэтага пункта, дзень аплаты, уключаючы авансавую выплату, або дзень іншага спынення абавязацельстваў пакупнікамі (заказчыкамі) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Гэта палажэнне прымяняецца таксама ў адносінах да сум павелічэння падатковай базы, якая вызначаецца згодна з пунктам 39 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

Момантам фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, на аснове дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў з арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, прызнаецца дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў пакупнікам (заказчыкам) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх. Гэта палажэнне прымяняецца таксама плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 4 артыкула 114 гэтага Кодэкса.

Для мэт гэтага пункта вылічэнне сум падаткаў пакупніком (заказчыкам), які прызнаецца падатковым агентам у Рэспубліцы Беларусь, не з'яўляецца спыненнем абавязацельстваў перад замежнай арганізацыяй, якая не знаходзіцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 122. Стаўкі падатку на дабаўленую вартасць**

1. Стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў устанаўліваецца пры:

1.1. рэалізацыі тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру экспарту, пры ўмове дакументальнага пацвярджэння фактычнага вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым артыкулам 123 гэтага Кодэкса;

1.2. рэалізацыі тавараў, вывезеных (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза (у тым ліку тавараў, вывезеных па дагаворах міжнароднага лізінгу, дагаворах пазыкі, дагаворах (кантрактах) на выраб тавараў), пры ўмове дакументальнага пацвярджэння фактычнага вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым артыкулам 124 гэтага Кодэкса;

1.3. рэалізацыі экспартуемых прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) пры ўмове дакументальнага пацвярджэння фактычнага вывазу такіх тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым артыкулам 125 гэтага Кодэкса.

Да экспартуемых прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў, адносяцца працы па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), выкананыя плацельшчыкам уласнымі сіламі (поўнасцю ці часткова) для замежных арганізацый ці фізічнай асобы;

1.4. рэалізацыі прац (паслуг) па суправаджэнні, пагрузцы, перагрузцы і іншых падобных прац (паслуг), непасрэдна звязаных з рэалізацыяй тавараў, указаных у падпунктах 1.1 і 1.2 гэтага пункта.

Да прац (паслуг), указаных у частцы першай гэтага падпункта, адносяцца працы (паслугі):

па суправаджэнні тавараў, уключаючы паслугі па ахове;

па пагрузцы, разгрузцы і перагрузцы (акрамя трубаправоднага транспарту) тавараў;

па захоўванні тавараў;

мытных прадстаўнікоў;

1.5. рэалізацыі экспартуемых транспартных паслуг, уключаючы транзітныя перавозкі;

1.6. рэалізацыі прац (паслуг) па рамонце, мадэрнізацыі, пераабсталяванні паветраных суднаў і іх рухавікоў, адзінак чыгуначнага рухомага саставу, якія выконваюцца для замежных арганізацый ці фізічных асоб;

1.7. рэалізацыі прац (паслуг), якія выконваюцца (аказваюцца) дзяржаўным аб'яднаннем «Беларуская чыгунка» арганізацыям чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў, па:

даванні ў карыстанне грузавых вагонаў, кантэйнераў, цялежак, рэфрыжэратарных вагонаў;

перастаноўцы пасажырскіх вагонаў на колавыя пары іншай каляі;

працы лакаматываў і лакаматыўных брыгад;

1.8. рэалізацыі паслуг, якія аказваюцца непасрэдна ў аэрапортах Рэспублікі Беларусь і паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, па абслугоўванні, уключаючы аэранавігацыйнае абслугоўванне, паветраных суднаў, якія выконваюць міжнародныя палёты і (ці) міжнародныя паветраныя перавозкі, па пераліку такіх паслуг, што зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.9. рэалізацыі бункернага паліва для запраўкі паветраных судоў замежных авіякампаній, якія выконваюць міжнародныя палёты і (ці) міжнародныя паветраныя перавозкі.

Для мэт гэтага падпункта:

бункерным палівам прызнаецца паліва, якое выкарыстоўваецца для запраўкі паветраных суднаў;

замежнай авіякампаніяй прызнаецца авіякампанія замежнай дзяржавы, у тым ліку дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

1.10. рэалізацыі тавараў уласнай вытворчасці ўладальніку магазіна бяспошліннага гандлю для іх наступнай рэалізацыі ў магазінах бяспошліннага гандлю.

Для мэт гэтага падпункта таварамі ўласнай вытворчасці прызнаюцца тавары, дата адгрузкі якіх прыпадае на перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, які быў выдадзены плацельшчыку ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку і пацвярджае прыналежнасць гэтых тавараў да прадукцыі ўласнай вытворчасці.

Палажэнні гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на рэалізацыю тавараў уладальніку магазіна бяспошліннага гандлю па дагаворах камісіі, даручэння ці іншым аналагічным грамадзянска-прававым дагаворам;

1.11. рэалізацыі тавараў у рознічным гандлі праз магазіны фізічным асобам, якія не маюць пастаяннага месца жыхарства ў дзяржаве – члене Еўразійскага эканамічнага саюза (далей у гэтым падпункце і артыкуле 144 гэтага Кодэкса – замежныя асобы), у выпадку вывазу замежнымі асобамі тавараў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза на працягу трох месяцаў з дня набыцця тавараў.

Пацвярджэннем пастаяннага месца жыхарства замежнай асобы за межамі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза з'яўляецца сапраўдны пашпарт ці іншы дакумент, які

яго замяняе, прызначаны для выезду за мяжу і выдадзены адпаведным органам дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці або звычайнага месца жыхарства замежнай асобы ці міжнароднай арганізацыяй (далей – дакумент для выезду за мяжу).

Замежныя грамадзяне, якія маюць грамадзянства (падданства) дзвюх і больш дзяржаў, лічацца ў Рэспубліцы Беларусь грамадзянамі (падданымі) той дзяржавы, па дакументах для выезду за мяжу якой яны ўехалі ў Рэспубліку Беларусь.

Стаўку падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, маюць права прымяняць плацельшчыкі пры захаванні ў сукупнасці наступных умоў:

тавары рэалізуюцца ў рознічным гандлі замежным асобам праз магазіны;

пры наяўнасці дакументальнага пацвярджэння вывазу замежнымі асобамі тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, атрыманага ў адпаведнасці з часткай чацвёртай пункта 4 артыкула 144 гэтага Кодэкса на працягу 12 месяцаў з дня рэалізацыі тавару замежнай асобе. Рэестр дакументальных пацвярджэнняў вывазу тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза падаецца па ўстаноўленай форме адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць, у якой адлюстраваны абарот па рэалізацыі тавараў замежным асобам па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў;

пры наяўнасці дагавора на аказанне паслуг па вяртанні падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, заключанага з арганізацыямі, якія маюць права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам.

Для мэт гэтага падпункта і артыкула 144 гэтага Кодэкса арганізацыяй, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, з'яўляецца арганізацыя, якая была ўключана ў пералік такіх арганізацый, што вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, і адпавядае патрабаванням, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Калі плацельшчык, які рэалізаваў у рознічным гандлі замежнай асобе тавары праз магазіны, да падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім рэалізаваны тавар, не мае дакументальнага пацвярджэння вывазу замежнай асобай тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, то абарот па рэалізацыі такога тавару падлягае адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць з прымяненнем стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленай пунктам 3 гэтага артыкула, без прымянення асаблівасцей падліку падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленых пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса.

Пры атрыманні плацельшчыкам дакументальнага пацвярджэння вывазу замежнай асобай тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза пасля адлюстравання абароту па рэалізацыі такога тавару ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абарот па рэалізацыі тавару, указанага ў частцы першай гэтага падпункта, з прымяненнем стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў адлюстроўваецца (з аднachасовым змяншэннем раней адлюстраваных абаротаў па гэтых таварах) у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем дакументальнага пацвярджэння вывазу замежнай асобай тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, або таго справаздачнага перыяду, у якім яно атрымана;

1.12. рэалізацыі прац (паслуг) па рамонце, тэхнічным абслугоўванні зарэгістраваных у замежных дзяржавах транспартных сродкаў, якія выконваюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аўтарызаванымі сэрвіснымі цэнтрамі для замежных арганізацый ці фізічных асоб, за выключэннем грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Палажэнне гэтага падпункта прымяняецца да прац (паслуг), выкананых (аказаных) з 1 студзеня 2015 года да 1 студзеня 2021 года;

1.13. павелічэнні падатковай базы пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), указаных у падпунктах 1.1–1.12 гэтага пункта, на сумы, указаныя ў пункце 4, абзацы другім часткі другой пункта 8 і частцы другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

2. Стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры дзесяць (10) працэнтаў устанаўліваецца пры:

2.1. рэалізацыі выробленай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пры ўвозе і (ці) рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь выробленай на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза:

прадукцыі раслінаводства (за выключэннем кветкаводства, дэкаратыўных раслін);

дзікарослых ягад, арэхаў і іншых пладоў, грыбоў, іншай дзікарослай прадукцыі;

прадукцыі пчалаводства;

прадукцыі жывёлагадоўлі (за выключэннем пушніны);

прадукцыі рыбаводства;

2.2. увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і (ці) рэалізацыі харчовых тавараў і тавараў для дзяцей па пераліку, зацверджаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Для пацвярджэння аднясення тавараў да харчовых тавараў, у адносінах да якіх можа прымяняцца стаўка падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленая абзацам першым гэтага пункта, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь на падставе зваротаў зацікаўленых разглядае пытанні аднясення асобных тавараў да харчовых тавараў, уключаных у пералік, які зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, і выдае адпаведнае заключэнне;

2.3. павелічэнні падатковай базы пры рэалізацыі тавараў, указаных у падпунктах 2.1 і 2.2 гэтага пункта, на сумы, указаныя ў пункце 4, абзацы другім часткі другой пункта 8 і частцы другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

3. Стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры дваццаць (20) працэнтаў устанаўліваецца пры:

3.1. рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), не ўказаных у пунктах 1, 2 і 4 гэтага артыкула, а таксама пры рэалізацыі (перадачы) маёмасных правоў;

3.2. увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў, не ўказаных у падпункце 2.2 пункта 2 гэтага артыкула;

3.3. іншым выбыцці тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю ў магазінах бяспошліннага гандлю;

3.4. павелічэнні падатковай базы пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, указаных у падпунктах 3.1 і 3.3 гэтага пункта, на сумы, указаныя ў пункце 4, абзацы другім часткі другой пункта 8 і частцы другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

3.5. рэалізацыі паслуг у электроннай форме.

4. Стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры дваццаць пяць (25) працэнтаў устанаўліваецца пры:

рэалізацыі паслуг электрасувязі;

павелічэнні падатковай базы пры рэалізацыі паслуг электрасувязі на сумы, указаныя ў пункце 4, абзацы другім часткі другой пункта 8 і частцы другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

5. Для пацвярджэння абгрунтаванасці прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў у адносінах да аперацый па рэалізацыі ўказаных у пункце 1 гэтага артыкула тавараў (прац, паслуг), якія былі ажыццёўлены рэарганізаванай арганізацыяй і па якіх на момант завяршэння рэарганізацыі не прыменена стаўка падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, праваправаемнік (праваправаемнікі) падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік дакументы, у тым ліку з рэквізітамі рэарганізаванай арганізацыі, якія пацвярджаюць абгрунтаванасць прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў па такіх аперацыях.

Адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі тавараў (экспартуемых прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны), указаных у частцы першай гэтага пункта, праводзіць праваправаемнік (праваправаемнікі) у парадку, вызначаным падпунктамі 5.1–5.4 пункта 5 артыкула 123 гэтага Кодэкса, у адносінах да тэрміну, устаноўленага заканадаўствам для пацвярджэння фактычнага вывазу тавараў за межы Рэспублікі Беларусь.

6. Абароты па рэалізацыі тавараў, месцам рэалізацыі якіх прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, у адносінах да якіх падпунктамі 1.1 і 1.2 пункта 1 гэтага артыкула

ўстаноўлена прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, у выпадку непацвярджэння іх фактычнага вывазу за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:

абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы, устаноўленай пунктам 3 гэтага артыкула, калі іншае не вызначана ў гэтым пункце;

абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы, устаноўленай пунктам 2 гэтага артыкула, – у адносінах да тавараў, указаных у пункце 2 гэтага артыкула;

вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у парадку, устаноўленым артыкулам 118 гэтага Кодэкса, – у адносінах да тавараў, указаных у артыкуле 118 гэтага Кодэкса.

Адлюстраванне ўказаных у частцы першай гэтага пункта абаротаў па рэалізацыі тавараў у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца ў парадку, устаноўленым падпунктамі 5.1–5.4 пункта 5 артыкула 123 гэтага Кодэкса, у адносінах да тэрміну, устаноўленага заканадаўствам для пацвярджэння фактычнага вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

7. Па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), месцам рэалізацыі якіх прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь і ў адносінах да якіх у адпаведнасці з артыкуламі 123–126 гэтага Кодэкса ёсць падставы для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, плацельшчыкі могуць прымяніць:

стаўку падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленую пунктам 3 гэтага артыкула;

стаўку падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленую пунктам 2 гэтага артыкула, – у адносінах да тавараў, указаных у пункце 2 гэтага артыкула;

вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць у парадку, устаноўленым артыкулам 118 гэтага Кодэкса, – у адносінах да тавараў, указаных у артыкуле 118 гэтага Кодэкса.

8. Па абаротах па рэалізацыі тавараў, указаных у пункце 2 гэтага артыкула, плацельшчыкі могуць прымяніць стаўку падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленую пунктам 3 гэтага артыкула.

9. Плацельшчыкі маюць права прымяніць стаўку падатку на дабаўленую вартасць, указаную ў пункце 3 гэтага артыкула, па:

9.1. абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія вызваляюцца ад падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам;

9.2. абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь (уключаючы абароты па рэалізацыі тавараў насельніцтву на выстаўках-кірмашах, якія праводзяцца на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза);

9.3. не прызнаных аб'ектамі падаткаабкладання ў адпаведнасці з падпунктам 2.12.2 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса абаротах па пакрыцці:

арэндадаўцу (лізінгадавальніку) арандатарам (лізінгаатрымальнікам) кошту набытых прац (паслуг), звязаных з арэндай (фінансавай арэндай (лізінгам)), не ўключанага ў суму арэнднай платы (лізінгавай выплаты);

арандатару (лізінгаатрымальніку) арэндадаўцам (лізінгадавальнікам) кошту набытых прац (паслуг), звязаных з арэндай (фінансавай арэндай (лізінгам)).

Выбар указанага парадку падаткаабкладання адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка) і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

Палажэнні гэтага падпункта плацельшчыкі маюць права прымяніць таксама ў адносінах да дагавораў найму жылога памяшкання;

9.4. не прызнаных аб'ектамі падаткаабкладання ў адпаведнасці з падпунктам 2.20.2 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса абаротах па перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне.

Да абаротаў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, адносяцца падлеглыя пакрыццю пазыкадавальніку яго расходы ў выглядзе:

кошту набытых ім прац (паслуг) па ўтрыманні маёмасці;

іншых набытых ім прац (паслуг), звязаных з маёмасцю, у тым ліку расходаў на эксплуатацыю, рамонт маёмасці, затрат на камунальныя паслугі.

Выбар указанага парадку падаткаабкладання адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка) і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

Палажэнні гэтага падпункта плацельшчыкі маюць права прымяніць таксама ў адносінах да дагавораў бязвыплатнага карыстання, па якіх абавязак пакрыцця пазыкадавальніку расходаў, указаных у частцы другой гэтага падпункта, не прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 123. Парадак дакументальнага пацвярджэння вывазу за межы Рэспублікі Беларусь тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру экспарту**

1. Пры рэалізацыі тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру экспарту, дакументальным пацвярджэннем фактычнага вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з мэтай іх пастаяннага размяшчэння (акрамя вывазу тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза) з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка:

1.1. кантракта, заключанага плацельшчыкам з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай, на падставе якога рэалізуюцца тавары;

1.2. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку ажыццяўлення плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме.

Пацвярджэнне аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку выдаецца мытнымі органамі і падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць у выглядзе:

або копіі засведчанай асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа дэкларацыі на тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту з адзнакай мытнага органа «Тавар вывезены» і ўказаннем даты выдачы пацвярджэння;

або засведчанага асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа спецыяльнага рэестра вывезеных тавараў з адзнакай мытнага органа «Тавар вывезены» і ўказаннем даты выдачы пацвярджэння;

1.3. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку ажыццяўлення плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента.

Інфармацыя аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць у выглядзе рэестра электронных мытных дэкларацый на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту, па ўстаноўленай форме з указаннем:

нумароў электронных мытных дэкларацый;

кода мытнай працэдуры;

даты дазволу на выбыццё тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза;

сумы абароту па рэалізацыі тавараў.

Указаны рэестр запаўняецца ва ўстаноўленым парадку.

2. Пры наяўнасці акалічнасцей, якія ўказваюць на недакладнасць пададзеных у адпаведнасці з гэтым артыкулам дакументаў, пацвярджэнне аб вывазе тавараў выдаецца па запытах падатковых органаў мытным органам, які ажыццявіў выпуск тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

3. Пры рэалізацыі тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру экспарту, праз пасрэдніка дакументальным пацвярджэннем фактычнага вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з мэтай іх пастаяннага размяшчэння (акрамя вывазу тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза) з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка:

3.1. дагавора з пасрэднікам.

Для мэт гэтага пункта пад пасрэднікам разумеюцца арганізацыя, індывідуальны прадпрымальнік, якія аказваюць паслугі па заключэнні кантрактаў або заключылі ад імя ці па даручэнні плацельшчыка кантракт з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай, у тым ліку якія праводзяць мытнае дэклараванне тавараў, што вывозяцца;

3.2. копіі кантракта, заключанага пасрэднікам з замежнымі арганізацыямі ці фізічнай асобай, на падставе якога рэалізуюцца тавары;

3.3. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме.

Пацвярджэнне аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку выдаецца мытнымі органамі і падаецца ў падатковы орган плацельшчыкам у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

3.4. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента.

Інфармацыя аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

4. Пры рэалізацыі тавараў праз паштовую перасылку, а таксама пры рэалізацыі тавараў, якія перамяшчаюцца па сістэме магістральных трубаправодаў ці па лініях электраперадачы, для пацвярджэння вывазу тавараў за межы Рэспублікі Беларусь з мэтай іх пастаяннага размяшчэння (акрамя вывазу тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза) плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць:

4.1. копію кантракта, заключанага плацельшчыкам з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай, на падставе якога рэалізуюцца тавары;

4.2. у выпадку ажыццяўлення плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме:

або копію дэкларацыі на тавары з адзнакай мытнага органа аб выпуску тавараў у адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту;

або спецыяльны рэестр вывезеных тавараў з указаннем нумара дэкларацыі на тавары і даты выпуску тавару ў адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту, засведчаны подпісам кіраўніка арганізацыі (упаўнаважанай ім асобы), подпісам індывідуальнага прадпрымальніка;

4.3. у выпадку ажыццяўлення плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента – спецыяльны рэестр вывезеных тавараў з указаннем нумара дэкларацыі на тавары і даты выпуску тавару ў адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту, засведчаны подпісам кіраўніка арганізацыі (упаўнаважанай ім асобы), подпісам індывідуальнага прадпрымальніка;

4.4. выдадзеную аператарам паштовай сувязі квітанцыю аб прыёме да перасылкі рэгістраванага паштовага адпраўлення, якое змяшчае тавар для перасылкі пакупніку, – пры рэалізацыі тавару праз паштовую перасылку;

4.5. копіі актаў прыёму-здачы тавараў – пры рэалізацыі тавараў, якія перамяшчаюцца па сістэме магістральных трубаправодаў ці па лініях электраперадачы.

5. Дакументальнае пацвярджэнне вывазу тавараў за межы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з пунктамі 1, 3 і 4 гэтага артыкула праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці дзён з даты выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай. Пры гэтым адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі тавараў праводзіцца ў адносінах да ўказанага тэрміну ў наступным парадку:

5.1. пры адсутнасці дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў, да падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, у якім не скончыўся ўстаноўлены тэрмін, абароты па рэалізацыі тавараў не адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

5.2. пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў, абароты па рэалізацыі тавараў адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць:

або таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведнага дакументальнага пацвярджэння;

або таго справаздачнага перыяду, у якім атрымана адпаведнае дакументальнае пацвярджэнне;

5.3. пры адсутнасці дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў, да падачы ў падатковы орган падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін, абароты па рэалізацыі тавараў адлюстроўваюцца без прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін;

5.4. пры атрыманні дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў, пасля сканчэння ўстаноўленага тэрміну і пасля адлюстравання абаротаў па рэалізацыі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абароты па рэалізацыі тавараў з прымяненнем стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў адлюстроўваюцца (з аднačасовым змяншэннем раней адлюстраваных абаротаў па гэтых таварах) у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць:

або таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведнага дакументальнага пацвярджэння;

або таго справаздачнага перыяду, у якім атрымана адпаведнае дакументальнае пацвярджэнне.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца пасля сканчэння больш чым трох гадоў з дня надыходу тэрміну выплаты падатку на дабаўленую вартасць у сувязі з адсутнасцю дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў, у адпаведнасці з падпунктам 5.3 гэтага пункта.

6. Для пацвярджэння вывазу з Рэспублікі Беларусь за межы Расійскай Федэрацыі пушніна-футравай сыравіны, рэалізаванай у выніку правядзення таргоў, з мэтай яе пастаяннага размяшчэння (акрамя зваротнага ўвозу пушніна-футравай сыравіны ў Рэспубліку Беларусь) плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік:

дагавор камісіі, даручэння і іншы аналагічны грамадзянска-прававы дагавор з падаткаплацельшчыкам Расійскай Федэрацыі;

таварна-транспартную накладную, якая пацвярджае вываз пушніна-футравай сыравіны з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі падаткаплацельшчыку Расійскай Федэрацыі;

зводную даведку (расшыфроўку графы 2 мытных дэкларацый на экспарт пушніна-футравай сыравіны), якая выдаецца падаткаплацельшчыкам Расійскай Федэрацыі;

рэестр рахункаў, які выдаецца падаткаплацельшчыкам Расійскай Федэрацыі для плацельшчыка Рэспублікі Беларусь, у якім указаны пакупнікі пушніна-футравай сыравіны;

мытную дэкларацыю, засведчаную мытнымі органамі Расійскай Федэрацыі, якая пацвярджае вываз пушніна-футравай сыравіны з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі з мэтай яе пастаяннага размяшчэння (акрамя зваротнага ўвозу пушніна-футравай сыравіны ў Рэспубліку Беларусь).

Дакументальнае пацвярджэнне вывазу з Рэспублікі Беларусь за межы Расійскай Федэрацыі пушніна-футравай сыравіны ў адпаведнасці з гэтым пунктам праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці дзён з даты правядзення таргоў. Пры гэтым адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі пушніна-футравай сыравіны праводзіцца ў адносінах да ўказанага тэрміну ў парадку, устаноўленым падпунктамі 5.1–5.4 пункта 5 гэтага артыкула.

**Артыкул 124. Парадак дакументальнага пацвярджэння вывазу тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза**

1. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі падаткаплацельшчыкам дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ці падаткаплацельшчыкам дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза, тавараў, вывезеных (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза (у тым ліку тавараў, вывезеных па дагаворах міжнароднага лізінгу, дагаворах пазыкі, дагаворах (кантрактах) на выраб тавараў), з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

1.1. дагавора (кантракта), на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя тавараў; дагавора міжнароднага лізінгу, які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу і пераход права ўласнасці на тавары (прадметы лізінгу) да лізінгаатрымальніка; дагавора (кантракта), які прадугледжвае даванне пазыкі ў выглядзе рэчаў; дагавора (кантракта) на выраб тавараў (за выключэннем вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў));

1.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза.

Наяўнасць транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў не патрабуецца, калі для асобных відаў перамяшчэння, у тым ліку перамяшчэння тавараў без выкарыстання транспартных сродкаў, афармленне гэтых дакументаў не прадугледжана заканадаўствам.

Пры вывазе на тэрыторыю дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза тавараў з мэтай часовага захоўвання, удзелу ў выстаўках-кірмашах па дагаворах, заключаных плацельшчыкам з пакупнікамі да вывазу тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, патрабуецца наяўнасць у плацельшчыка таксама транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку (перадачу) тавараў пакупнікам.

Пры перамяшчэнні тавараў па сістэме магістральных трубаправодаў ці па лініях электраперадачы патрабуецца наяўнасць у плацельшчыка актаў прыёму-здачы тавараў;

1.3. заявы аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, складзенай па форме, зацверджанай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, з адзнакай падатковага органа дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на тэрыторыю якой увезены тавары, аб выплаце ўскосных падаткаў (вызваленні ад падаткаабкладання ці іншым парадку выканання падатковых абавязацельстваў) (далей у гэтым артыкуле – заява аб увозе тавараў) або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў.

Плацельшчык у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць падае:

або заяву аб увозе тавараў;

або па ўстаноўленай форме пералік заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, запоўнены ва ўстаноўленым парадку.

2. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі арганізацыямі і (ці) індывідуальнымі прадпрымальнікамі Рэспублікі Беларусь на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў (далей у гэтым пункце – камітэнт) праз арганізацыі і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь (далей у гэтым пункце – камісіянер) тавараў, вывезеных (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза, з'яўляецца наяўнасць у камітэнта наступных дакументаў:

2.1. дагавора камісіі, даручэння ці іншага аналагічнага грамадзянска-прававога дагавору;

2.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў камісіянеру, і копій транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў пакупнікам;

2.3. заявы аб увозе тавараў або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў (падаецца камітэнтам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць).

3. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі арганізацыямі і (ці) індывідуальнымі прадпрымальнікамі Рэспублікі

Беларусь на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў (далей у гэтым пункце – камітэнт) праз замежныя арганізацыі і (ці) фізічных асоб, якія з'яўляюцца падаткаплацельшчыкамі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза (далей у гэтым пункце – камісіянер), тавараў, вывезеных (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза ў мэтах іх наступнай рэалізацыі ў межах або за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, з'яўляецца наяўнасць у камітэнта:

3.1. дагавора камісіі, даручэння ці іншага аналагічнага грамадзянска-прававога дагавора;

3.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў камісіянеру;

3.3. мытнай дэкларацыі, афармленай камісіянерам і засведчанай мытным органам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, якая пацвярджае вываз тавараў з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза ў мэтах іх пастаяннага размяшчэння.

Мытная дэкларацыя падаецца камітэнтам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць у выпадку, калі вываз тавараў ажыццяўляецца ў дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза ў мэтах іх далейшай рэалізацыі камісіянерам за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза пры ўмове, што заканадаўствам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза выплата падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не ўскладзена на камісіянера, паверанага ці агента;

3.4. заявы аб увозе тавараў або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў (падаецца камітэнтам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць у выпадку, калі заканадаўствам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза выплата падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ускладзена на камісіянера, паверанага (агента) або пакупніка).

4. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі замежным арганізацыям і фізічным асобам тавараў, вывезеных (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза і змешчаных на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза пад мытную працэдуру свабоднай мытнай зоны або пад мытную працэдуру свабоднага склада, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

4.1. дагавора (кантракта), на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя тавараў;

4.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

4.3. засведчанай мытным органам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза копіі мытнай дэкларацыі, у адпаведнасці з якой тавары на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза змешчаны пад мытную працэдуру свабоднай мытнай зоны або пад мытную працэдуру свабоднага склада.

Такую мытную дэкларацыю плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць.

5. Дакументальнае пацвярджэнне фактычнага вывазу тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў адпаведнасці з пунктамі 1–4 гэтага артыкула праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты адгрузкі гэтых тавараў. Пры гэтым адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі тавараў праводзіцца ў адносінах да ўказанага тэрміну ў парадку, устаноўленым падпунктамі 5.1–5.4 пункта 5 артыкула 123 гэтага Кодэкса.

Пры рэалізацыі тавараў на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў для адліку тэрміну, устаноўленага гэтым пунктам, днём адгрузкі тавараў прызнаецца дата адгрузкі тавараў камісіянерам, паверыным ці іншай аналагічнай асобай пакупніку.

**Артыкул 125. Парадак дакументальнага пацвярджэння вывазу за межы Рэспублікі Беларусь тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў)**

1. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі экспартуемых прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

1.1. дагавора (кантракта), заключанага з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай;

1.2. дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне плацельшчыкам гэтых прац уласнымі сіламі (поўнасцю ці часткова) для замежных арганізацый ці фізічнай асобы;

1.3. у выпадку прыцягнення плацельшчыкам беларускіх падрадчыкаў для выканання экспартуемых прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў):

1.3.1. дагавора падраду, заключанага плацельшчыкам з беларускім падрадчыкам;

1.3.2. дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне прац беларускім падрадчыкам па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў);

1.4. у выпадку вывазу тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), у дзяржавы, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза:

1.4.1. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку дэклараванні мытным органам тавараў у пісьмовай форме.

Пацвярджэнне аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку выдаецца мытнымі органамі і падаецца ў падатковы орган плацельшчыкам у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 123 гэтага Кодэкса;

1.4.2. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выпадку дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента.

Інфармацыя аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у такім выпадку падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 123 гэтага Кодэкса;

1.5. у выпадку вывазу тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза:

1.5.1. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

1.5.2. заявы аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, складзенай па форме, зацверджанай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, з адзнакай падатковага органа дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на тэрыторыю якой увезены тавары, аб выплаце ўскосных падаткаў (вызваленні ад падаткаабкладання ці іншым парадку выканання падатковых абавязацельстваў) (далей у гэтым артыкуле – заява аб увозе тавараў) або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў.

Заява аб увозе тавараў або пералік заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць.

У выпадку вывазу тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза і змяшчэння іх на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза пад мытную працэдуру свабоднай мытнай зоны або пад мытную працэдуру свабоднага склада плацельшчык замест заявы аб увозе тавараў (пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў) падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць засведчаную мытным органам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза копію мытнай дэкларацыі, у адпаведнасці з якой тавары, выробленыя з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), змешчаны на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза пад мытную працэдуру свабоднай мытнай зоны або пад мытную працэдуру свабоднага склада.

2. Дакументальнае пацвярджэнне фактычнага вывазу тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты:

выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай – у выпадку вывазу тавараў, выраблених з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), у дзяржавы, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза;

адгрузкі тавараў – у выпадку вывазу тавараў, выраблених з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

Пры гэтым адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны праводзіцца ў адносінах да ўказанага тэрміну ў парадку, установленым падпунктамі 5.1–5.4 пункта 5 артыкула 123 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 126. Парадак пацвярджэння абгрунтаванасці прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў у асобных выпадках**

1. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі ўказаных у падпункце 1.4 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса прац (паслуг) па суправаджэнні, пагрузцы, перагрузцы і іншых падобных прац (паслуг), непасрэдна звязаных з рэалізацыяй тавараў, указаных у падпунктах 1.1 і 1.2 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца падача плацельшчыкам у падатковы орган па месцы яго пастаноўкі на ўлік копій наступных дакументаў:

1.1. дагавораў (кантрактаў) на выкананне (аказанне) указаных прац (паслуг), заключаных як з замежнымі, так і з беларускімі арганізацыямі;

1.2. дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне (аказанне) гэтых прац (паслуг), з указаннем у іх:

рэквізітаў дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту, даты дазволу на выбыццё тавараў за межы мытнай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента);

даты пастаўлення мытным органам на дэкларацыі на тавары адзнакі «Тавар вывезены», засведчанай асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа (пры ажыццяўленні дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме);

рэквізітаў транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў аб перавозцы тавараў, якія вывозяцца, на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза (у адносінах да тавараў, якія вывозяцца на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза).

2. Да экспартуемых транспартных паслуг, якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў, адносяцца паслугі транспартнай экспедыцыі, паслугі па перамяшчэнні грузаў, пасажыраў і багажу аўтамабільным, паветраным, чыгуначным, марскім, рачным і іншымі відамі транспарту (камбінацыяй гэтых відаў транспарту), грузабагажу чыгуначным транспартам за межы або за межамі Рэспублікі Беларусь, з-за яе межаў, а таксама транзітам праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, уключаючы частковае аказанне гэтых паслуг на яе тэрыторыі.

Да экспартуемых транспартных паслуг не адносяцца:

агенцкія (пасрэдніцкія) паслугі па афармленні і (ці) рэалізацыі білетаў на праезд пасажыраў, на падставе якіх аказваюцца экспартуемыя транспартныя паслугі;

паслугі, не прадугледжаныя дагаворам транспартнай экспедыцыі і не падлеглыя (падлеглыя) пакрыццю экспедытару кліентам, а таксама паслугі, прадугледжаныя дагаворам транспартнай экспедыцыі і не падлеглыя пакрыццю экспедытару кліентам. Палажэнні гэтага абзаца распаўсюджваюцца таксама на выпадкі, калі ў адпаведнасці з дагаворам транспартнай экспедыцыі абавязкі экспедытара выконваюцца перавозчыкам.

Экспартуемыя транспартныя паслугі абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў пры афармленні іх міжнароднымі транспартнымі ці таварна-транспартнымі дакументамі або іншымі міжнароднымі дакументамі. Гэта палажэнне распаўсюджваецца таксама на аформленыя бланкамі міжнародных і міждзяржаўных зносін

паслугі, якія аказваюцца па перавозцы грузаў чыгуначным транспартам, які рухаецца прызначэннем на станцыі (парты) замежных дзяржаў.

Для мэт гэтага пункта міжнароднымі транспартнымі дакументамі пры выкананні аўтамабільнай перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах прызнаюцца:

дазвол на выкананне міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах, які выдае Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь;

расклад руху транспартных сродкаў па маршруце міжнародных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах, зацверджаны Міністэрствам транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь.

Пры рэалізацыі дзяржаўным аб'яднаннем «Беларуская чыгунка» экспартуемых транспартных паслуг па перавозцы пасажыраў, багажу, грузабагажу чыгуначным транспартам міжнароднымі транспартнымі дакументамі прызнаюцца бухгалтарскія выпіскі (плацежныя (сальдавыя) ведамасці), прадугледжаныя дагаворамі, заключанымі дзяржаўным аб'яднаннем «Беларуская чыгунка» з арганізацыямі чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў.

Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі экспартуемых транспартных паслуг з'яўляецца падача плацельшчыкам у падатковы орган інфармацыі шляхам накіравання ва ўстаноўленым артыкулам 131 гэтага Кодэкса парадку электроннага рахунка-фактуры з указаннем у ім наступных звестак:

даты і нумара дагавора, які прадугледжвае аказанне экспартуемых транспартных паслуг (для экспедытараў – даты і нумара дагавора транспартнай экспедыцыі);

даты і нумара міжнароднага транспартнага (таварна-транспартнага дакумента) ці іншага міжнароднага дакумента (для экспедытара – даты нумара заяўкі (задання ці іншага дакумента));

маршруту перавозкі грузаў, пасажыраў, багажу, грузабагажу (для экспедытараў – маршруту экспедзіравання грузаў).

3. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі прац (паслуг) па рамонце, мадэрнізацыі, пераабсталяванні паветраных суднаў і іх рухавікоў, адзінак чыгуначнага рухомага саставу, якія выконваюцца (аказваюцца) для замежных арганізацый ці фізічных асоб, з'яўляецца падача плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік копій наступных дакументаў:

дагавора (кантракта), заключанага з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай;

дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне (аказанне) прац (паслуг) па рамонце, мадэрнізацыі, пераабсталяванні паветраных суднаў і іх рухавікоў, адзінак чыгуначнага рухомага саставу.

Для мэт падпункта 1.6 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса і гэтага пункта да адзінак чыгуначнага рухомага саставу адносяцца асобныя аб'екты чыгуначнага рухомага саставу, указаныя ў пункце 3 артыкула 117 гэтага Кодэкса.

4. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі прац (паслуг), указаных у падпункце 1.7 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца наяўнасць у дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» наступных дакументаў:

дагавора (пагаднення) з арганізацыямі чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў;

разліковай ведамасці, складзенай з арганізацыямі чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў;

цягніковай перадатачнай (вагоннай) ведамасці (пры разліках з арганізацыямі чыгуначнага транспарту агульнага карыстання сумежных замежных дзяржаў за паслугі па даванні ў карыстанне грузавых, рэфрыжэратарных вагонаў, кантэйнераў, цялежак);

журнала перастаўленых вагонаў (пры рэалізацыі прац (паслуг) па перастаноўцы пасажырскіх вагонаў на цялежкі іншай каляі);

маршруту машыніста (пры рэалізацыі прац (паслуг) па працы лакаматываў і лакаматыўных брыгад);

рэестра дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне (аказанне) арганізацыям чыгуначнага транспарту агульнага карыстання замежных дзяржаў прац (паслуг) па даванні ў карыстанне вагонаў, кантэйнераў, цялежак, рэфрыжэратарных вагонаў, па перастаноўцы пасажырскіх вагонаў на колавыя пары іншай каляі, па працы лакаматываў і лакаматыўных брыгад (запаўняецца ва ўстаноўленым парадку і падаецца па ўстаноўленай форме дзяржаўным аб'яднаннем «Беларуская чыгунка» ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць).

5. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі паслуг, указаных у падпункце 1.8 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

дагавора (пагаднення), на падставе якога ажыццяўляецца аказанне паслуг;

дакументаў, якія пацвярджаюць аказанне паслуг;

рэестра дакументаў, якія пацвярджаюць аказанне паслуг па абслугоўванні паветраных суднаў, што выконваюць міжнародныя палёты і (ці) міжнародныя паветраныя перавозкі, з указаннем найменняў такіх паслуг (запаўняецца ва ўстаноўленым парадку і падаецца плацельшчыкам па ўстаноўленай форме ў падатковы орган па месцы яго пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць).

6. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі бункернага паліва, указанага ў падпункце 1.9 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

6.1. дагавора з замежнай авіякампаніяй, які прадугледжвае і (ці) уключае рэалізацыю бункернага паліва, – пры ажыццяўленні рэгулярных рэйсаў;

6.2. заяўкі замежнай авіякампаніі і (ці) дагавора (пагаднення) з замежнай авіякампаніяй – пры ажыццяўленні нерэгулярных рэйсаў.

Пры гэтым у заяўцы павінны быць указаны наступныя звесткі:

найменне авіякампаніі з указаннем замежнай дзяржавы, у якой яна зарэгістравана;

меркаваная колькасць бункернага паліва, патрэбнага для запраўкі паветранага судна;

дата меркаванай пасадкі паветранага судна.

Пры пасадцы замежнага паветранага судна з прычыны форс-мажорных абставін заяўка, прадугледжаная гэтым падпунктам, не запаўняецца.

Для мэт гэтага пункта:

рэгулярным рэйсам прызнаецца рэйс паветранага судна, які выконваецца па маршруце ў адпаведнасці з установленым раскладам;

нерэгулярным рэйсам прызнаецца рэйс, які не падпадае пад азначэнне рэгулярнага рэйса;

6.3. патрабавання на запраўку замежнага паветранага судна, у якім павінны быць указаны наступныя звесткі:

найменне замежнай авіякампаніі;

колькасць запраўленага бункернага паліва;

дата запраўкі замежнага паветранага судна;

подпісы камандзіра замежнага паветранага судна ці прадстаўніка замежнай авіякампаніі і супрацоўніка адпаведнай службы плацельшчыка, які ажыццявіў запраўку;

6.4. дакументаў, якія пацвярджаюць запраўку замежнага паветранага судна бункерным палівам;

6.5. заключэння ўпаўнаважанага органа ў сферы грамадзянскай авіяцыі, які пацвярджае факт ажыццяўлення паветраным суднам замежнай авіякампаніі міжнароднага палёту і (ці) міжнароднай паветранай перавозкі, а таксама колькасць і кошт рэалізаванага бункернага паліва (па авіякампаніях), па форме, што зацвярджае Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь, якое плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы яго пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць.

7. Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі ўладальніку магазіна бяспошліннага гандлю тавараў уласнай вытворчасці, указаных у падпункце 1.10 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

7.1. дагавора куплі-продажу, заключанага ім з уладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю, уключаным у рэестр уладальнікаў магазінаў бяспошліннага гандлю;

7.2. таварна-транспартнай накладной, якая пацвярджае адгрузку ім тавараў уласнай вытворчасці ўладальніку магазіна бяспошліннага гандлю, з указаннем стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў;

7.3. копій дэкларацый на тавары ўласнай вытворчасці, змешчаныя пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, або копій знешняй падачы дэкларацый на тавары ўласнай вытворчасці, змешчаныя пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, калі такія дэкларацыі былі пададзены ў мытны орган уладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю ў выглядзе электроннага дакумента.

Указаныя копіі дакументаў зацвярджаюцца подпісам кіраўніка юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца ўладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю, або ўпаўнаважанай ім асобы;

7.4. сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку;

7.5. рэестра дакументаў, якія пацвярджаюць рэалізацыю тавараў уласнай вытворчасці ўладальніку магазіна бяспошліннага гандлю (запаўняецца ва ўстаноўленым парадку і падаецца плацельшчыкам па ўстаноўленай форме ў падатковы орган па месцы яго пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць).

8. Для мэт падпункта 1.12 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса і гэтага пункта:

пад аўтарызаваным сэрвісным цэнтрам разумеецца юрыдычная асоба Рэспублікі Беларусь, якая заключыла з заводам-вырабляльнікам транспартных сродкаў ці яго афіцыйным прадстаўніком дагавор (кантракт), які прадугледжвае права гарантыйнага абслугоўвання (рамонту) транспартных сродкаў, або дагавор аб сэрвісным партнёрстве (сэрвісны дагавор);

да транспартных сродкаў адносяцца зарэгістраваныя ў замежных дзяржавах транспартныя сродкі:

катэгорыі M3 – транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для перавозкі пасажыраў і маюць апрача месца вадзіцеля больш за восем месцаў для сядзення, тэхнічна дапушчальная максімальная маса якіх перавышае 5 тон;

катэгорыі N2 – транспартныя сродкі, прызначаныя для перавозкі грузаў, якія маюць тэхнічна дапушчальную максімальную масу большую за 3,5 тоны, але не большую за 12 тон;

катэгорыі N3 – транспартныя сродкі, прызначаныя для перавозкі грузаў, якія маюць тэхнічна дапушчальную максімальную масу большую за 12 тон;

катэгорыі O3 – прычэпы, тэхнічна дапушчальная максімальная маса якіх большая за 3,5 тоны, але не большая за 10 тон;

катэгорыі O4 – прычэпы, тэхнічна дапушчальная максімальная маса якіх большая за 10 тон.

Падставай для прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў пры рэалізацыі прац (паслуг), указаных у падпункце 1.12 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка наступных дакументаў:

дагавора (кантракта) з заводам-вырабляльнікам транспартных сродкаў ці яго афіцыйным прадстаўніком, які прадугледжвае права гарантыйнага абслугоўвання (рамонту) транспартных сродкаў, або дагавора аб сэрвісным партнёрстве (сэрвіснага дагавора);

дагавора (кантракта), заключанага плацельшчыкам са страхавой арганізацыяй або з замежнай арганізацыяй ці фізічнай асобай, за выключэннем грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, на выкананне прац (аказанне паслуг) па рамонце, тэхнічным абслугоўванні зарэгістраванага ў замежнай дзяржаве транспартнага сродку;

дакумента, паводле якога пашкоджаны транспартны сродак замежнай арганізацыі ці фізічнай асобы, за выключэннем грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, накіраваны страхавой арганізацыяй плацельшчыку для выканання аднаўленчага рамонту;

копіі пасведчання аб рэгістрацыі ў замежнай дзяржаве транспартнага сродку ці іншага рэгістрацыйнага дакумента замежнай дзяржавы на транспартны сродак;

дакумента, які пацвярджае факт выканання прац (аказання паслуг) плацельшчыкам па рамонце, тэхнічным абслугоўванні зарэгістраванага ў замежнай дзяржаве транспартнага сродку, які адносіцца да катэгорыі M3, N2, N3, O3 ці O4;

рэестра дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне прац (аказанне паслуг) па рамонце, тэхнічным абслугоўванні зарэгістраваных у замежных дзяржавах транспартных сродкаў (запаўняецца ва ўстаноўленым парадку і падаецца плацельшчыкам па ўстаноўленай форме ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць).

**Артыкул 127. Падатковы і справаздачны перыяды падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Падатковым перыядам падатку на дабаўленую вартасць прызнаецца каляндарны год.

2. Справаздачным перыядам падатку на дабаўленую вартасць прызнаецца:

2.1. каляндарны месяц – для плацельшчыкаў, якія рэалізуюць паслугі электрасувязі;

2.2. каляндарны квартал – па перавозках для дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка»;

2.3. каляндарны месяц ці каляндарны квартал – па выбары дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» ў выпадках, не прадугледжаных падпунктам 2.2 гэтага пункта;

2.4. каляндарны месяц ці каляндарны квартал – па выбары плацельшчыкаў, за выключэннем плацельшчыкаў, указаных у падпунктах 2.1–2.3 гэтага пункта.

3. Плацельшчыкі, якія абралі ў адпаведнасці з падпунктамі 2.3 і 2.4 пункта 2 гэтага артыкула справаздачным перыядам падатку на дабаўленую вартасць каляндарны квартал, інфармуюць аб прынятым рашэнні падатковыя органы па месцы пастаноўкі на ўлік:

3.1. шляхам пастаўлення адпаведнай адзнакі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць, якая падаецца:

3.1.1. за мінулы падатковы перыяд не пазней за 20-га студзеня бягучага падатковага перыяду.

Пасля 20-га студзеня бягучага падатковага перыяду пастаўленне такой адзнакі можа быць праведзена (анулявана) толькі аднаразова шляхам падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць з унесенымі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі за мінулы падатковы перыяд не пазней за 20-га лютага бягучага падатковага перыяду;

3.1.2. не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за абраным справаздачным перыядам, у якім узнік аб'ект падаткаабкладання, – пры адсутнасці падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за мінулы падатковы перыяд і ўзнікненні аб'екта падаткаабкладання ў бягучым падатковым перыядзе, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам і пунктам 4 гэтага артыкула;

3.2. па ўстаноўленай форме не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам іх дзяржаўнай рэгістрацыі, – для нанава зарэгістраваных індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый, створаных нанава, у тым ліку ў выніку рэарганізацыі ў форме вылучэння, раздзялення ці зліцця;

3.3. па ўстаноўленай форме не пазней за дзесяць рабочых дзён з дня стварэння філіяла, які падлягае пастаноўцы на ўлік у падатковым органе, – для юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь, якія абралі справаздачным перыядам падатку на дабаўленую вартасць каляндарны квартал і стварылі філіялы, якія выконваюць падатковыя абавязацельствы гэтых юрыдычных асоб згодна з пунктам 3 артыкула 14 гэтага Кодэкса.

Гэтае палажэнне распаўсюджваецца таксама на выпадкі ўзнікнення акалічнасці, у сувязі з якой узнікае абавязак філіяла юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь па выкананні падатковых абавязацельстваў гэтай юрыдычнай асобы.

4. Арганізацыі і (ці) індывідуальныя прадпрымальнікі, якія перайшлі на прымяненне асаблівага рэжыму падаткаабкладання з выплатай падатку на дабаўленую вартасць або на агульны парадак падаткаабкладання з выплатай падатку на дабаўленую вартасць, прызнаюцца абраўшымі справаздачным перыядам падатку на дабаўленую вартасць каляндарны:

квартал, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам;

месяц, калі за месяц, з якога ажыццёўлены такі пераход, імі ва ўстаноўлены тэрмін пададзена падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць з адлюстраваннем абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

5. Прынятае плацельшчыкам рашэнне аб выбары справаздачнага перыяду (каляндарны месяц ці каляндарны квартал) змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

Пры гэтым арганізацыя, рэарганізаваная ў форме пераўтварэння, і арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку яе рэарганізацыі ў форме пераўтварэння, прызнаецца адным і тым жа плацельшчыкам.

Філіялы юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь, якія выконваюць падатковыя абавязацельствы гэтай юрыдычнай асобы згодна з пунктам 3 артыкула 14 гэтага Кодэкса, прымяняюць той жа справаздачны перыяд падатку на дабаўленую вартасць, што і юрыдычная асоба Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 128. Парадак падліку падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў агульная сума падатку на дабаўленую вартасць вылічваецца:

нарастаючым вынікам з пачатку падатковага перыяду пасля сканчэння кожнага справаздачнага перыяду;

па ўсіх абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць (за выключэннем вызваленых ад падаткаабкладання), момант фактычнай рэалізацыі якіх прыпадае на адпаведны справаздачны перыяд, і па ўсіх змяненнях падатковай базы (за выключэннем вызваленай ад падаткаабкладання) у адпаведным справаздачным перыядзе.

Агульная вылічаная сума падатку на дабаўленую вартасць па выніках справаздачнага перыяду па ўсіх аперацыях па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і ўсіх змяненнях падатковай базы ў справаздачным перыядзе вызначаецца шляхам складання сум, вылічаных асобна па кожнай аперацыі ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

2. Сума падатку на дабаўленую вартасць, вылічаная з абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў вызначаецца як здабытак падатковай базы і працэнта падатковай стаўкі па наступнай формуле:

$$ПДВ_{выл} = ПБ \times Ст,$$

дзе: $ПДВ_{выл}$ – вылічаная сума падатку;

ПБ – падатковая база;

Ст – устаноўленая стаўка падатку.

У асобных выпадках, калі вылічаная сума падатку на дабаўленую вартасць павінна вызначацца разліковым метадам, яе сума разлічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі, падзелены на памер падатковай стаўкі, павялічанай на 100, па наступнай формуле:

$$ПДВ_{выл} = ПБ \times Ст / (100 + Ст),$$

дзе: $ПДВ_{выл}$ – вылічаная сума падатку;

ПБ – падатковая база;

Ст – устаноўленая стаўка падатку.

Да асобных выпадкаў адносіцца ў тым ліку падлік падатку на дабаўленую вартасць:

з сум павелічэння падатковай базы;

пры рэалізацыі тавараў, маёмасных правоў, падатковая база па якіх вызначаецца як станоўчая розніца паміж цаной іх рэалізацыі і цаной іх набыцця;

пры рэалізацыі асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, асобных прадметаў у складзе абаротных сродкаў і маёмасці, якая ўлічваецца ў складзе пазаабаротных актываў, па цэнах ніжэйшых за іх астаткавы кошт;

пры рэалізацыі набытых на баку тавараў, маёмасных правоў па цэнах ніжэйшых за цану іх набыцця;

пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) уласнай вытворчасці, маёмасных правоў па цэнах ніжэйшых за іх сабекошт;

пры рэалізацыі маёмасці даўжніка ў рамках выканаўчага вядзення, уключаючы перадачу маёмасці даўжніка спагнальніку;

пры неабгрунтаваным прымяненні вызвалення ад падаткаабкладання;

пры непацвярджэнні абгрунтаванасці прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў.

3. Сума падатку на дабаўленую вартасць, вылічаная:

у адпаведнасці з гэтым артыкулам, прад'яўляецца плацельшчыкам пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў пакупніку гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у парадку, устаноўленым артыкулам 130 гэтага Кодэкса;

з сум павелічэння падатковай базы згодна з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса, не прад'яўляецца плацельшчыкам пакупніку тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

У выпадку вылучэння прадаўцом у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах падатку на дабаўленую вартасць у суме меншай, чым устаноўлена ў гэтай главе, вылічэнне і выплата падатку на дабаўленую вартасць праводзяцца прадаўцом па адпаведнай стаўцы, устаноўленай артыкулам 122 гэтага Кодэкса пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

4. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, акрамя асобных катэгорый плацельшчыкаў, указаных у пункце 1 артыкула 385 і пункце 1 артыкула 386 гэтага Кодэкса, пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, абавязаны, за выключэннем выпадку, устаноўленага часткай другой гэтага пункта, вылічыць па ўстаноўленых стаўках і заплаціць у бюджэт суму падатку на дабаўленую вартасць незалежна ад таго, ці з'яўляюцца яны плацельшчыкамі па сваёй дзейнасці.

Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на аснове такіх дагавораў, акрамя асобных катэгорый плацельшчыкаў, указаных у пункце 1 артыкула 385 і пункце 1 артыкула 386 гэтага Кодэкса, заключаных з указанымі замежнымі арганізацыямі, абавязаны вылічыць па ўстаноўленых стаўках і заплаціць у бюджэт суму падатку на дабаўленую вартасць незалежна ад таго, ці з'яўляюцца яны плацельшчыкамі па сваёй дзейнасці. Гэта палажэнне распаўсюджваецца і на плацельшчыкаў, указаных у пункце 4 артыкула 114 гэтага Кодэкса.

Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, сума падатку на дабаўленую вартасць вылічваецца асобна па кожнай аперацыі па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула.

5. Плацельшчыкі, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль і (ці) грамадскае харчаванне і атрымліваюць даход у выглядзе розніцы ў цэнах, нацэнак, надбавак па таварах, якія рэалізуюцца па свабодных і рэгуляваных (фіксаваных) рознічных цэнах, могуць праводзіць вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць зыходзячы з падатковай базы і долі сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах, якія ёсць у каляндарным месяцы, у кошце гэтых тавараў (з улікам усіх падаткаў, збораў (пошлін) і іншых выплат у бюджэт або бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія спаганяюцца пры рэалізацыі тавараў), уключаючы тавары, вызваленыя ад падатку на дабаўленую вартасць.

Разлік падатку на дабаўленую вартасць зыходзячы з падатковай базы і долі сумы падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў па рознічных цэнах запаўняецца па ўстаноўленай форме і ва ўстаноўленым парадку.

При адсутнасці асобнага ўліку сум падатку на дабаўленую вартасць, уключаных у цану тавару, а таксама асобнага ўліку абаротаў па рэалізацыі тавараў, якія абкладаюцца па розных падатковых стаўках, вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў па рознічных цэнах праводзіцца па стаўцы, указанай у пункце 3 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

6. Пры змяненні парадку вылічэння падатку на дабаўленую вартасць (змяненні складу плацельшчыкаў, аб'ектаў падаткаабкладання, падатковай базы, моманту фактычнай рэалізацыі, ставак, парадку прымянення вызвалення ад падаткаабкладання) новы парадак вылічэння прымяняецца:

у адносінах да адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў, перададзеных з моманту змянення парадку падліку падатку на дабаўленую вартасць;

у адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, што рэалізуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, момант фактычнай рэалізацыі якіх надышоў з моманту змянення парадку падліку падатку на дабаўленую вартасць;

у адносінах да аб'ектаў арэнды (прадметаў лізінгу), момант здачы (перадачы) якіх у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), які вызначаецца ў адпаведнасці з пунктамі 9 і 10 артыкула 121 гэтага Кодэкса, надышоў з моманту змянення парадку падліку падатку на дабаўленую вартасць;

у адносінах да сум, якія павялічваюць падатковую базу ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса, адлюстраванне якіх праведзена ў бухгалтарскім уліку з моманту змянення парадку падліку падатку на дабаўленую вартасць.

**Артыкул 129. Парадак карэкціроўкі абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць) у асобных выпадках**

1. Пры змяненні памеру абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у бок змяншэння (павелічэння) пасля таго, як надышоў момант іх фактычнай рэалізацыі, у прадаўцоў на суму абароту па рэалізацыі гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў памяншаецца (павялічваецца) абарот па рэалізацыі таго справаздачнага перыяду, які вызначаны ў адпаведнасці з пунктамі 2–5 гэтага артыкула, у выпадках:

поўнага ці частковага вяртання пакупніком прадаўцу тавараў. Гэта палажэнне не прымяняецца ў адносінах да тавараў, вернутых іх прадаўцу для рамонту ці замены, калі не мяняецца іх кошт;

адмовы ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў;

змяншэння (павелічэння) кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

2. У прадаўцоў павялічваюцца абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў таго справаздачнага перыяду, у якім прадавец і пакупнік узгаднілі ва ўстаноўленым парадку павелічэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

3. У прадаўцоў памяншаюцца абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі выконваюцца ў сукупнасці наступныя ўмовы:

пакупніком праведзена вяртанне тавараў, прадаўцом і пакупніком узгоднены ва ўстаноўленым парадку адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў, змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

выстаўлены прадаўцом дадатковы (выпраўлены) электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўлены прадаўцом электронны рахунак-фактура быў падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам. Выкананне гэтай умовы не распаўсюджваецца на здзелкі з падаткаплацельшчыкамі замежных дзяржаў.

4. Адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць сумы змяншэння абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адносінах да даты падпісання пакупніком электронным лічбавым подпісам дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага прадаўцом, праводзіцца ў наступным парадку, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 5 гэтага артыкула:

4.1. пры непадпісанні пакупніком дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры да падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую

вартасць за той справаздачны перыяд, на які прыпадаюць устаноўленыя пунктам 1 гэтага артыкула выпадкі, абароты па рэалізацыі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць прадаўца не памяншаюцца;

4.2. пры падпісанні пакупніком дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры да падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, на які прыпадаюць устаноўленыя пунктам 1 гэтага артыкула выпадкі, абароты па рэалізацыі памяншаюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць прадаўца:

або таго справаздачнага перыяду, на які прыпадаюць устаноўленыя пунктам 1 гэтага артыкула выпадкі;

або таго справаздачнага перыяду, у якім пакупнік падпісаў дадатковы (выпраўлены) электронны рахунак-фактура;

4.3. пры падпісанні пакупніком дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры пасля падачы прадаўцом падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, на які прыпадаюць устаноўленыя пунктам 1 гэтага артыкула выпадкі, абароты па рэалізацыі памяншаюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць прадаўца:

або таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за падпісаннем пакупніком дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры;

або таго справаздачнага перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы (выпраўлены) электронны рахунак-фактура;

4.4. у адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены ў падатковым перыядзе, што папярэднічае падатковаму перыяду, у якім падпісаны пакупніком дадатковы (выпраўлены) электронны рахунак-фактура, змяненні ў частцы змяншэння абаротаў па рэалізацыі прадавец мае права ўнесці ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць за такі папярэдні падатковы перыяд.

5. У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены ў перыяд прымянення прадаўцом асаблівага рэжыму падаткаабкладання без выплаты падатку на дабаўленую вартасць і абарот па рэалізацыі якіх улічваўся ім пры вызначэнні падатковай базы ў падатковым перыядзе, што папярэднічае падатковаму перыяду, у якім праведзены вяртанне пакупніком прадаўцу тавараў (адмова ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, змяненні ў частцы карэкціроўкі абаротаў па рэалізацыі, устаноўленай пунктам 1 гэтага артыкула, уносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць за такі папярэдні падатковы перыяд пры выкананні ў сукупнасці ўмоў, вызначаных пунктам 3 гэтага артыкула.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта падлягаюць прымяненню таксама прадаўцом – індывідуальным прадпрымальнікам, які не з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у тым перыядзе, у якім праведзены вяртанне тавараў, адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў ці змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

6. У выпадку ўцэнкі і (ці) спісання не рэалізаваных па рознічных цэнах юрыдычнымі асобамі, што ажыццяўляюць гандаль на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і арганізацыямі сувязі ва ўстаноўленыя дагаворам тэрміны тыражоў перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, якія ў адпаведнасці з умовамі дагавору не падлягаюць вяртанню і разлікі за якія не праводзяцца, на суму абароту па рэалізацыі гэтых перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі ў юрыдычных асоб, на якіх ускладзены функцыі рэдакцый друкаваных сродкаў масавай інфармацыі (прадаўцоў), памяншаюцца абароты па рэалізацыі, калі выконваюцца ў сукупнасці наступныя ўмовы:

праведзены ўцэнка і (ці) спісанне не рэалізаваных па рознічных цэнах перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі;

выстаўлены прадаўцом дадатковы (выпраўлены) электронны рахунак-фактура падпісаны пакупніком (юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе гандаль на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і арганізацыя сувязі) электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўлены прадаўцом электронны рахунак-фактура быў падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам.

Адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць сумы змяншэння абароту па рэалізацыі перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі ў адносінах да даты падпісання пакупніком электронным лічбавым подпісам дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага прадаўцом, праводзіцца ў парадку, установленым пунктам 4 гэтага артыкула.

7. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, залішне прад'яўленыя прадаўцом у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах, у тым ліку ў сувязі з наданнем нарматыўным прававым актам зваротнай сілы:

7.1. падлягаюць падліку і выплаце ў бюджэт гэтым прадаўцом, калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 7.2 гэтага пункта;

7.2. не падлягаюць падліку і выплаце ў бюджэт гэтым прадаўцом, калі:

7.2.1. залішне прад'яўленая сума падатку на дабаўленую вартасць, у тым ліку ў сувязі з наданнем нарматыўным прававым актам зваротнай сілы, выпраўлена на падставе ў сукупнасці наступных дакументаў:

актаў зверкі разлікаў, падпісаных прадаўцом і пакупніком;

дадатковых (выпраўленых) электронных рахункаў-фактур, выстаўленых прадаўцом і падпісаных пакупніком электронным лічбавым подпісам, калі раней выстаўленыя прадаўцом электронныя рахункі-фактуры былі падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам;

7.2.2. пакупніком тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх прадаўцом залішне прад'яўлена сума падатку на дабаўленую вартасць, у тым ліку ў сувязі з наданнем нарматыўных прававых актах зваротнай сілы, з'яўляецца:

падаткаплацельшчык замежнай дзяржавы;

фізічная асоба Рэспублікі Беларусь, якая не выступае індывідуальным прадпрымальнікам на момант набыцця тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Адлюстраванне прадаўцом у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць сумы змяншэння вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць у адносінах да даты падпісання пакупніком электронным лічбавым подпісам дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага прадаўцом, і да даты падпісання акта зверкі разлікаў праводзіцца ў парадку, аналагічным парадку, установленаму пунктам 4 гэтага артыкула.

8. Палажэнні пункта 7 гэтага артыкула:

8.1. распаўсюджваюцца таксама на:

8.1.1. камісіянераў (паверанных) і іншых аналагічных асоб, якія набываюць тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў і залішне прад'яўляюць сумы падатку на дабаўленую вартасць да пакрыцця камітэнтам (давернікам) і іншым аналагічным асобам;

8.1.2. арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання без выплаты падатку на дабаўленую вартасць і якія прад'яўляюць сумы падатку на дабаўленую вартасць;

8.1.3. індывідуальных прадпрымальнікаў, якія не з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і залішне прад'яўляюць сумы падатку на дабаўленую вартасць;

8.1.4. абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць або не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам, па якіх прадаўцом прад'яўлена сума падатку на дабаўленую вартасць пакупнікам;

8.1.5. абароты па вяртанні пакупніком прадаўцу тары, прызнанай зваротнай згодна з часткай другой падпункта 1.1.7 пункта 1 артыкула 115 гэтага Кодэкса;

8.2. не прымяняюцца:

8.2.1. пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы ў выпадках, калі па іх не праводзіцца вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць;

8.2.2. пакупніком пры вяртанні тавару па цане набыцця з падаткам на дабаўленую вартасць прадаўцу тавару.

**Артыкул 130. Сума падатку на дабаўленую вартасць, якая прад'яўляецца плацельшчыкам пакупніку тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па свабодных адпускных цэнах (з улікам акцызаў для падакцызных тавараў) ці тарыфах плацельшчык у цане (тарыфе) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў абавязаны прад'явіць пакупніку гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў адпаведную суму падатку на дабаўленую вартасць.

Гэта палажэнне не прымяняецца пры рэалізацыі плацельшчыкам тавараў па рознічных цэнах, калі ў гэтыя цэны ўжо ўключаны падатак на дабаўленую вартасць.

2. Сума падатку на дабаўленую вартасць, якая прад'яўляецца плацельшчыкам пакупніку тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вызначаецца па кожным відзе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

3. У электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых (разліковых) дакументах адпаведныя сума і стаўка падатку на дабаўленую вартасць вылучаюцца асобным радком.

4. Пры рэалізацыі тавараў па рознічных цэнах, якія ўключаюць падатак на дабаўленую вартасць, плацельшчыкі, якія рэалізуюць такія тавары, па патрабаванні пакупнікоў абавязаны ўказваць фактычную стаўку падатку на дабаўленую вартасць, па якой абкладаецца гэты тавар, і суму падатку на дабаўленую вартасць:

у першасных уліковых дакументах на адгрузку тавараў у выпадку, калі рэалізацыя тавараў ажыццяўляецца без выкарыстання касавага абсталявання;

у плацежных дакументах, якія фарміруюцца касавым абсталяваннем, калі ў такіх дакументах стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць указаны ў якасці рэквізіту плацежнага дакумента;

шляхам вылучэння фактычнай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, па якой абкладаецца гэты тавар, і сумы падатку на дабаўленую вартасць з засведчаннем штампам (ёсць права – пячаткай) прадаўца і подпісам кіраўніка ці галоўнага бухгалтара арганізацыі-прадаўца (асобы, ім упаўнаважанай) або індывідуальнага прадпрымальніка-прадаўца (асобы, ім упаўнаважанай) – у выпадках, калі ў плацежных дакументах, якія фарміруюцца касавым абсталяваннем, стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць не ўказаны ў якасці рэквізіту плацежнага дакумента.

Плацельшчыкі, якія вылічаюць падатак на дабаўленую вартасць з прымяненнем асаблівасцей, устаноўленых пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса, замест фактычнай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, па якой абкладаецца гэты тавар, маюць права ўказваць суму і стаўку падатку на дабаўленую вартасць з разліку, які ёсць на пачатак бягучага месяца:

у першасных уліковых дакументах на адгрузку тавараў у выпадках, калі рэалізацыя тавараў ажыццяўляецца без выкарыстання касавага абсталявання;

шляхам вылучэння стаўкі падатку на дабаўленую вартасць і сумы падатку на дабаўленую вартасць з засведчаннем штампам (ёсць права – пячаткай) прадаўца і подпісам кіраўніка ці галоўнага бухгалтара арганізацыі-прадаўца (асобы, ім упаўнаважанай) – у выпадку, калі ў плацежных дакументах, якія фарміруюцца касавым абсталяваннем, стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць не ўказаны ў якасці рэквізіту плацежнага дакумента.

5. Плацельшчыкі, якім даручана рэалізацыя маёмасці, адчужанай у выніку рэквізіцыі, канфіскацыі, па судовай пастанове ў парадку спагнання падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў, штрафаў за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў і (ці) злачынстваў шляхам накіравання спагнання на маёмасць па абавязацельствах уласніка, у дакументах для пакупнікоў маюць права ўказваць самастойна вылучаныя з цаны рэалізацыі сумы падатку на дабаўленую вартасць і па патрабаванні пакупнікоў абавязаны выставіць электронны рахунак-фактуру.

Самастойнае вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць у дакументах і іх указанне ў электронным рахунку-фактуры праводзяцца па той стаўцы, па якой абкладаецца рэалізацыя такой маёмасці.

6. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі па вызваленых ад падатку на дабаўленую вартасць і (ці) не прызнаных аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выкарыстоўваюць агульны парадак падаткаабкладання без выплаты падатку на дабаўленую вартасць, а таксама арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання без выплаты падатку на дабаўленую вартасць, пры рэалізацыі (адгрузцы) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў:

падатак на дабаўленую вартасць не вылічваюць;

электронныя рахункі-фактуры выстаўляюць (накіроўваюць) у выпадках, устаноўленых артыкулам 131 гэтага Кодэкса;

першасныя ўліковыя дакументы, якія прымяняюцца пры рэалізацыі (адгрузцы) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, складаюць (выпісваюць) без вылучэння сум падатку на дабаўленую вартасць і прад'яўлення гэтых сум пакупніку. Пры гэтым ва ўказаных дакументах робіцца запіс ці ставіцца штамп «Без ПДВ», а пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), указаных у падпунктах 1.16 і 1.20 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса, робіцца адпаведны запіс.

7. Вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць удзельнікам (членам) арганізацый пры прад'яўленні да пакрыцця ў адпаведнасці з падпунктам 2.12.1 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса кошту набытых (выкананых, аказаных) прац (паслуг) праводзіцца пры ўказанні ў электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах такім арганізацыям сум падатку на дабаўленую вартасць прадаўцамі гэтых прац (паслуг).

8. Вылучэнне арэндадаўцам (лізінгадавальнікам) арандатару (лізінгаатрымальніку), а таксама арандатарам (лізінгаатрымальнікам) арэндадаўцу (лізінгадавальніку) сум падатку на дабаўленую вартасць пры прад'яўленні да пакрыцця кошту набытых прац (паслуг) у адпаведнасці з падпунктам 2.12.2 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса праводзіцца:

пры ўказанні адпаведна арэндадаўцу (лізінгадавальніку), а таксама арандатару (лізінгаатрымальніку) гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць прадаўцамі такіх прац (паслуг) у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах;

пры падліку падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 9.3 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

Вылучэнне пазыкадавальнікам пазыкаатрымальніку сум падатку на дабаўленую вартасць пры прад'яўленні да пакрыцця кошту набытых прац (паслуг) у адпаведнасці з падпунктам 2.20.2 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса праводзіцца:

пры ўказанні адпаведна пазыкадавальніку гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць прадаўцамі такіх прац (паслуг) у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах;

пры вылічэнні падатку на дабаўленую вартасць пазыкадавальнікам у адпаведнасці з падпунктам 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

9. Пры рэалізацыі камісіянерам (паверанным) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў пакупніку вылучаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя:

камітэнтам (давернікам) у выпадку, калі камітэнт (давернік) з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь, пры ўмове ўказання камітэнтам (давернікам) гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць для камісіянераў (паверанных) у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах камітэнта (даверніка);

камісіянерам (паверанным) у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах камітэнтаў (давернікаў), месцам рэалізацыі якіх прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выстаўлення камісіянерам (паверанным) электронных рахункаў-фактур пакупнікам на падставе электроннага рахунка-фактуры, накіраванага камісіянерам (паверанным) згодна з падпунктам 8.7 пункта 8 ці падпунктам 9.1 пункта 9 артыкула 131 гэтага Кодэкса.

10. Вылучэнне прадаўцом тавараў сум падатку на дабаўленую вартасць пры прад'яўленні да пакрыцця кошту набытых паслуг у адпаведнасці з падпунктам 2.12.3 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса праводзіцца пры ўказанні прадаўцу тавараў гэтых сум падатку на дабаўленую

вартасць плацельшчыкамі, якія аказваюць гэтыя паслугі, у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах.

11. Вылучэнне экспедытарам кліенту па дагаворы транспартнай экспедыцыі сум падатку на дабаўленую вартасць па расходах, якія кампенсуюцца кліентам у адпаведнасці з падпунктам 2.12.5 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса, праводзіцца пры ўказанні ў электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах экспедытару гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць прадаўцамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія адносяцца да такіх расходаў.

12. Пры вядзенні заказчыкам (забудоўшчыкам) будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў) і перадачы трэцяй асобе (у тым ліку дольшчыку) пасля заканчэння будаўніцтва фактычна праведзеных затрат па будаўніцтве аб'екта заказчыкам (забудоўшчыкам) у межах сумы дагавору з трэцяй асобай (у тым ліку дольшчыкам) вылучаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, набытых (увезеных), праведзеных (выкананых, аказаных) заказчыкам (забудоўшчыкам) для вядзення будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў), якія не з'яўляюцца ўкладаннямі ў доўгатэрміновыя актывы заказчыка (забудоўшчыка).

Вылучэнне заказчыкам (забудоўшчыкам) сум падатку на дабаўленую вартасць трэцяй асобе (у тым ліку дольшчыку) праводзіцца пры:

указанні заказчыку (забудоўшчыку) гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах прадаўцамі такіх тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

выплаце гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць заказчыкам (забудоўшчыкам) пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

вылічэнні заказчыкам (забудоўшчыкам) і пералічэнні ў бюджэт гэтых сум падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса ў выпадку набыцця тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь;

вылічэнні заказчыкам (забудоўшчыкам) падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), праведзеных (выкананых, аказаных) заказчыкам (забудоўшчыкам) уласнымі сіламі пры вядзенні заказчыкам (забудоўшчыкам) будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў).

13. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у ходзе davернага кіравання маёмасцю згодна з дагаворам давернага кіравання маёмасцю ў інтарэсах даручальніка ці ўказанай ім асобы (выгаданабытчыка) даверны кіраўнік у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах, якія прымяняюцца пры рэалізацыі (адгрузцы) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, прад'яўляе да аплаты пакупніку адпаведную суму падатку на дабаўленую вартасць у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

**Артыкул 131. Электронны рахунак-фактура**

1. Электронны рахунак-фактура з'яўляецца абавязковым электронным дакументам для ўсіх плацельшчыкаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, які служыць падставай для прыняцця плацельшчыкам да выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у парадку, устаноўленым гэтай главой.

Стварэнне (у тым ліку запаўненне), выстаўленне (накіраванне), атрыманне, падпісанне і захоўванне электроннага рахунка-фактуры ажыццяўляецца ва ўстаноўленым парадку.

Электронны дакументаабарот электронных рахункаў-фактур паміж прадаўцамі і пакупнікамі ажыццяўляецца з выкарыстаннем Партала электронных рахункаў-фактур (далей у гэтай главе – Партал), які з'яўляецца інфармацыйным рэсурсам Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Электронны рахунак-фактура па ўстаноўленым форме і фармаце ствараецца плацельшчыкам непасрэдна на Партале або загружаецца ў выглядзе файла XML-фармату, падрыхтаванага плацельшчыкам. Электронны рахунак-фактура з'яўляецца крыніцай звестак аб падлічаных і (ці) падлеглых выліку сумах падатку на дабаўленую вартасць, якія падаюцца ў падатковыя органы.

Кошт тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і сума падатку на дабаўленую вартасць у электронным рахунку-фактуры ўказваюцца ў нацыянальнай валюце Рэспублікі Беларусь.

2. Плацельшчыкі, указаныя ў абзацах другім – чацвёртым артыкула 112 гэтага Кодэкса, абавязаны стварыць электронныя рахункі-фактуры, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, у тым ліку:

2.1. па абаротах пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць;

2.2. па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, але падлягаюць адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

2.3. пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

2.4. пры вылічэнні падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса пры рэалізацыі на тэрыторыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь;

2.5. пры перадачы падатковых вылікаў у адпаведнасці з артыкулам 133 гэтага Кодэкса;

2.6. пры прад'яўленні (вылучэнні) сум падатку на дабаўленую вартасць пакупнікам тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у парадку, установленым артыкулам 130 гэтага Кодэкса;

2.7. у іншых выпадках, установленых гэтым артыкулам.

3. Электронны рахунак-фактура не ствараецца:

3.1. банкамі Рэспублікі Беларусь, нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь пры рэалізацыі аперацый, указаных у падпункце 1.37 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса;

3.2. плацельшчыкамі, указанымі ў артыкуле 385 гэтага Кодэкса, пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

3.3. плацельшчыкамі, указанымі ў артыкуле 386 гэтага Кодэкса, пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у выпадку выканання імі ўмоў, установленых указаным артыкулам;

3.4. сялянскімі (фермерскімі) гаспадаркамі, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць згодна з пунктам 1 артыкула 384 гэтага Кодэкса, у частцы дзейнасці па вытворчасці прадукцыі раслінаводства (акрамя кветак і дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушнога звераводства), рыбаводства і пчалаводства;

3.5. пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія не з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Гэта палажэнне не прымяняецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі з 1-га чысла месяца, у якім яны прызнаны плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

3.6. пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў, якія вызваляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам ад падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі ці падатковымі органамі пры ўвозе тавараў;

3.7. пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў;

3.8. па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 17 і 18 гэтага артыкула) і не падлягаюць адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

3.9. пры рэалізацыі паслуг па страхаванні (сустрахаванні, перастрахаванні), указаных у падпункце 1.40 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса;

3.10. пры рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, тавараў (прац, паслуг),

маёмасных правоў, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

3.11. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, падатковая база па якіх у адпаведнасці з заканадаўствам прызнаецца роўнай нулю (роўная нулю);

3.12. пры рэалізацыі паслуг у электроннай форме замежнымі арганізацыямі, якія аказваюць паслугі ў электроннай форме для фізічных асоб;

3.13. пры рэалізацыі паслуг па перавозцы паміж юрыдычнымі асобамі, якія ўваходзяць у зводны баланс асноўнай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка», якія не ўключаюцца ў падатковую базу ў адпаведнасці з пунктам 35 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

3.14. пры бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, абароты па перадачы якіх не прызнаюцца рэалізацыяй ці аб'ектам падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам, але адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць згодна з падпунктам 4.1.2 пункта 4 артыкула 134 гэтага Кодэкса.

4. Плацельшчык, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 3 гэтага артыкула, абавязаны ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам, у адносінах да кожнага абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў выставіць пакупніку тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або ў выпадках, устаноўленых гэтым артыкулам, накіраваць на Партал электронны рахунак-фактуру.

5. Электронны рахунак-фактура выстаўляецца не раней за дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, які вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса, і не пазней за 10-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, на які прыпадае:

дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены гэтым артыкулам;

момант фактычнай рэалізацыі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), маёмасных правоў – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць палажэнні пункта 1 артыкула 140 гэтага Кодэкса.

У выпадку, калі пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага часткай першай гэтага пункта:

не надышоў момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, то электронны рахунак-фактура выстаўляецца не пазней за тры рабочыя дні з даты надыходу моманту фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

адсутнічаюць звесткі, якія пацвярджаюць надыход моманту фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, ці аформленыя ва ўстаноўленым парадку першасныя ўліковыя дакументы, то электронны рахунак-фактура выстаўляецца не пазней за тры рабочыя дні адпаведна з даты атрымання звестак ці афармлення ва ўстаноўленым парадку першасных уліковых дакументаў, якія пацвярджаюць надыход моманту фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

6. Пакупнікі, што набываюць тавары па рознічных цэнах у прадаўцоў, якія ўказалі ў першасных уліковых дакументах стаўку і суму падатку на дабаўленую вартасць згодна з пунктам 4 артыкула 130 гэтага Кодэкса, маюць права заявіць у адвольнай форме патрабаванне аб выстаўленні на іх адрас прадаўцамі гэтых тавараў электронных рахункаў-фактур, калі з даты выпіскі першасных уліковых дакументаў, указаных у пункце 4 артыкула 130 гэтага Кодэкса, не скончылася трыццаць каляндарных дзён.

Пакупнікі, якія набываюць тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы праз падсправаздачных асоб у прадаўцоў, якія ўказалі ў плацежных дакументах, што фарміруюцца касавым абсталяваннем, у дакументах, якія прымяняюцца пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, стаўку і суму падатку на дабаўленую вартасць, маюць права заявіць у адвольнай форме патрабаванне аб выстаўленні на іх адрас прадаўцамі гэтых тавараў (прац, паслуг) электронных рахункаў-фактур, калі з даты выпіскі (выдачы) указаных у гэтай частцы дакументаў не скончылася трыццаць каляндарных дзён.

Прадаўцы абавязаны выставіць электронныя рахункі-фактуры ўказаным у частках першай і другой гэтага пункта пакупнікам не пазней за 10-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім прадавец атрымаў патрабаванне аб выстаўленні электронных рахункаў-фактур,

заяўленае пакупніком у тэрмін, устаноўлены адпаведна часткамі першай і другой гэтага пункта. У электронных рахунках-фактурах указваюцца стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць зыходзячы з дакументаў, указаных адпаведна ў частках першай і другой гэтага пункта.

Пры неаднаразовай выпісцы (выдачы) прадаўцом на працягу каляндарнага месяца дакументаў на адрас аднаго пакупніка, па якіх у адпаведнасці з часткай другой гэтага артыкула пакупніком, які набываў тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы праз падсправаздачных асоб, заяўлена патрабаванне аб выстаўленні электронных рахункаў-фактур, дапускаюцца стварэнне і выстаўленне прадаўцом аднаго агульнага электроннага рахунка-фактуры на адрас такога пакупніка.

7. Па дзейнасці арганізацыі, якая рэарганізуецца ў форме зліцця, далучэння, раздзялення электронны рахунак-фактура выстаўляецца (накіроўваецца) такой арганізацыяй, якая рэарганізуецца, не пазней за дату яе рэарганізацыі.

Па дзейнасці арганізацыі, якая ліквідуецца, (індывідуальнага прадпрымальніка, які спыняе дзейнасць) электронны рахунак-фактура выстаўляецца (накіроўваецца) такой арганізацыяй (такім індывідуальным прадпрымальнікам) не пазней за дзесяць рабочых дзён да дня падачы ёю (ім) у рэгіструючы орган ліквідацыйнага балансу (паведамлення аб завяршэнні працэсу спынення дзейнасці).

У выпадку прыняцця арганізацыяй рашэння аб ліквідацыі свайго філіяла, які выконвае падатковыя абавязкі такой арганізацыі, а таксама пры ўзнікненні акалічнасці, у сувязі з якой спыняецца абавязак філіяла па выкананні падатковых абавязацельстваў гэтай арганізацыі, электронны рахунак-фактура выстаўляецца (накіроўваецца) такім філіялам не пазней за дату яго ліквідацыі (дату ўзнікнення такой акалічнасці).

Пакупнікі, указаныя ў частках першай – трэцяй гэтага пункта, якія набывалі тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, па якіх электронныя рахункі-фактуры не атрыманы да прыняцця рашэння аб іх ліквідацыі (рэарганізацыі, спыненні дзейнасці), абавязаны заявіць у адвольнай форме патрабаванне аб выстаўленні на іх адрас прадаўцамі гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў электронных рахункаў-фактур з указаннем у такім патрабаванні даты іх ліквідацыі (рэарганізацыі, спынення дзейнасці). Прадаўцы абавязаны выставіць электронныя рахункі-фактуры такім пакупнікам да даты ліквідацыі (рэарганізацыі, спынення дзейнасці), указанай у атрыманым патрабаванні аб выстаўленні імі электронных рахункаў-фактур.

Пад датай рэарганізацыі для мэт гэтага пункта разумеецца дата, на якую прыпадае адпаведна:

дата ўнясення ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб спыненні дзейнасці далучанай арганізацыі;

дата дзяржаўнай рэгістрацыі створаных нанава арганізацый у выніку рэарганізацыі ў форме зліцця, раздзялення.

8. Электронны рахунак-фактура, калі абавязак яго стварэння ўзнікае ў плацельшчыка, які з'яўляецца прадаўцом, ствараецца і накіроўваецца на Партал (без неабходнасці яго выстаўлення пакупніку) у адносінах да кожнага абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім надышоў момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам), пры:

8.1. рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, абароты па рэалізацыі якіх вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

Пры рэалізацыі тавараў, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць, вылік сум падатку на дабаўленую вартасць па якіх праводзіцца ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з падпунктам 27.5 пункта 27 артыкула 133 гэтага Кодэкса, накіраванне плацельшчыкам на Партал электроннага рахунка-фактуры ажыццяўляецца ў адносінах да тэрмінаў, вызначаных часткамі дзясятай і адзінаццатай падпункта 1.44 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса, але не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за сканчэннем справаздачнага перыяду, за які абароты па рэалізацыі адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

8.2. рэалізацыі экспартуемых транспартных паслуг, абароты па рэалізацыі якіх абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў у адпаведнасці з падпунктам 1.5 пункта 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса;

8.3. рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў падаткаплацельшчыкам замежных дзяржаў.

Пры вывазе тавараў (уключаючы выраблены з давальніцкай сыравіны і матэрыялаў), якія абкладаюцца па стаўцы падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, накіраванне плацельшчыкам на Партал электроннага рахунка-фактуры ажыццяўляецца ў адносінах да тэрмінаў, вызначаных пунктам 5 артыкула 123 гэтага Кодэкса, але не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за сканчэннем справаздачнага перыяду, за які абароты па рэалізацыі адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць.

Пры рэалізацыі тавараў, што не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, вылік сум падатку на дабаўленую вартасць па якіх праводзіцца ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з падпунктамі 27.7 і 27.8 пункта 27 артыкула 133 гэтага Кодэкса, плацельшчык накіроўвае электронны рахунак-фактуру на Партал у адносінах да тэрмінаў, вызначаных адпаведна часткай пятай падпункта 27.7, часткамі сёмай – дзявятай падпункта 27.8 пункта 27 артыкула 133 гэтага Кодэкса, але не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за сканчэннем справаздачнага перыяду, за які абароты па рэалізацыі адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

8.4. рэалізацыі тавараў, (прац, паслуг), маёмасных правоў:

калегіі адвакатаў;

адвакацкім бюро;

Беларускай натарыяльнай палаце і яе арганізацыйным структурам;

Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь і яго структурным падраздзяленням;

8.5. рэалізацыі прац (паслуг), маёмасных правоў пакупнікам, з якімі ёсць пісьмовая згода аб тым, што электронныя рахункі-фактуры па набытых імі працах (паслугах), маёмасных правах не выстаўляюцца на іх адрас.

Для мэт гэтага падпункта да такіх пакупнікоў адносяцца:

індывідуальныя прадпрымальнікі, якія не з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

арганізацыі і (ці) індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання без вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць;

сялянскія (фермерскія) гаспадаркі, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць згодна з пунктам 1 артыкула 384 гэтага Кодэкса, у частцы дзейнасці па вытворчасці прадукцыі раслінаводства (акрамя кветак і дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушнога звераводства), рыбаводства і пчалаводства;

8.6. рэалізацыі паслуг заказчыка (забудоўшчыка) у выпадках, калі ўзнагарода, якая вызначаецца ў выглядзе розніцы паміж сумай сродкаў з улікам падатку на дабаўленую вартасць, належнай да атрымання па дагаворы з трэцяй асобай (у тым ліку з дольшчыкам), і сумай фактычна праведзеных затрат з улікам падатку на дабаўленую вартасць па будаўніцтве аб'екта, якія даводзяцца на долю трэцяй асобы (у тым ліку дольшчыка), адсутнічае, а падатковая база заказчыка (забудоўшчыка) вызначаецца як кошт паслуг заказчыка (забудоўшчыка), вызначаны зыходзячы з аб'ёму сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне заказчыка (забудоўшчыка) праектна-каштарыснай дакументацыяй на будаўніцтва аб'екта з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і разлічаны прапарцыянальна долі ўдзелу трэцяй асобы (у тым ліку дольшчыка) у будаўніцтве аб'екта;

8.7. адгрузцы тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), перадачы маёмасных правоў пакупнікам (заказчыкам) і вылічэнні падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса пры ажыццяўленні дзейнасці на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, заключаных з замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і

рэалізуюць тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на аснове такіх дагавораў.

Электронны рахунак-фактура ствараецца па кожнай аперацыі па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і накіроўваецца плацельшчыкам на Партал не пазней за 20-е число месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім надышоў момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, які вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 29 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

Палажэнні гэтага падпункта падлягаюць прымяненню таксама плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 4 артыкула 114 гэтага Кодэкса;

8.8. рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў пакупнікам – фізічным асобам Рэспублікі Беларусь, якія не выступаюць індывідуальнымі прадпрымальнікамі на момант набыцця тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, за выключэннем:

тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры набыцці якіх указаная ў абзацы першым часткі першай гэтага падпункта фізічная асоба Рэспублікі Беларусь выступала ў якасці падсправаздачнай асобы пакупніка і пакупніком заяўлена патрабаванне аб выстаўленні электроннага рахунка-фактуры на яго адрас згодна з пунктам 6 гэтага артыкула;

тавараў, па якіх прадаўцом вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асаблівасцямі, устаноўленымі пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса.

Па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, плацельшчык па выніках справаздачнага перыяду стварае адзін агульны электронны рахунак-фактура, які накіроўвае на Партал не пазней за 20-е число месяца, што ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам, і ў якім указвае:

агульную суму абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за справаздачны перыяд і агульную суму вылічанага падатку на дабаўленую вартасць (у выпадку, калі плацельшчык не выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні);

агульную суму абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), які вызваляецца ад падаткаабкладання, за справаздачны перыяд (пры яго наяўнасці);

розніцу, якая ўзнікае за справаздачны перыяд паміж агульнай сумай абароту па рэалізацыі і агульнай сумай абароту па рэалізацыі, на якую плацельшчык выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні, а таксама розніцу, якая ўзнікае за справаздачны перыяд паміж агульнай сумай вылічанага падатку на дабаўленую вартасць і агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, на якую плацельшчык выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні;

8.9. рэалізацыі фізічным асобам Рэспублікі Беларусь, якія не выступаюць індывідуальнымі прадпрымальнікамі, тавараў, па якім вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асаблівасцямі, устаноўленымі пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса, за выключэннем тавараў, пры набыцці якіх указаная фізічная асоба выступала ў якасці падсправаздачнай асобы пакупніка і пакупніком заяўлена патрабаванне аб выстаўленні электроннага рахунка-фактуры на яго адрас згодна з пунктам 6 гэтага артыкула.

Па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, плацельшчык па выніках справаздачнага перыяду стварае адзін агульны электронны рахунак-фактура, які накіроўвае на Партал не пазней за 20-е число месяца, што ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам, і ў якім указвае:

агульную суму абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за справаздачны перыяд і агульную суму вылічанага падатку на дабаўленую вартасць (у выпадку, калі плацельшчык не выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні);

розніцу, якая ўзнікае за справаздачны перыяд паміж агульнай сумай абароту па рэалізацыі і агульнай сумай абароту па рэалізацыі, на якую плацельшчык выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні, а таксама розніцу, якая ўзнікае за справаздачны перыяд паміж агульнай сумай вылічанага падатку на дабаўленую вартасць і

агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, на якую плацельшчык выставіў электронныя рахункі-фактуры на адрас пакупнікоў па іх патрабаванні;

8.10. павелічэнні падатковай базы на сумы, фактычна атрыманыя (належныя да атрымання), у адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

9. Электронны рахунак-фактура, калі абавязак яго стварэння ўзнікае ў плацельшчыка, які з'яўляецца пакупніком, ствараецца і накіроўваецца на Партал пры:

9.1. набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, і вылічэнні падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса.

Электронны рахунак-фактура ствараецца па кожнай аперацыі па набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і накіроўваецца плацельшчыкам на Партал не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім у адпаведнасці з пунктам 29 артыкула 121 гэтага Кодэкса надышоў момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў замежнай арганізацыяй, якая не знаходзіцца на ўліку ў падатковым органе Рэспублікі Беларусь;

9.2. увозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

Электронны рахунак-фактура накіроўваецца на Партал не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам прыняцця на ўлік імпартаваных тавараў, пры выкананні ў сукупнасці наступных умоў:

праведзена выплата (залік) падатку на дабаўленую вартасць ва ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін;

пададзена ў падатковы орган заява аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, складзеная па форме, зацверджанай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь (далей у гэтым артыкуле – заява аб увозе тавараў).

Пры выплаце (заліку) падатку на дабаўленую вартасць з парушэннем устаноўленага заканадаўствам тэрміну электронны рахунак-фактура ствараецца і накіроўваецца на Партал не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім выкананы ў сукупнасці наступныя ўмовы:

праведзена канчатковая выплата (залік) належнай сумы падатку на дабаўленую вартасць;

пададзена ў падатковы орган заява аб увозе тавараў.

Дапускаецца стварэнне аднаго электроннага рахунка-фактуры пры ўвозе тавараў па некалькіх таварасуправаджальных дакументах ад аднаго прадаўца, калі такія тавары прыняты на ўлік адной датай па адным транспартным дакуменце і адлюстраваны ў адной заяве аб увозе тавараў;

9.3. увозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Электронны рахунак-фактура ствараецца і накіроўваецца на Партал:

не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім ажыццёўлены выпуск тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай, пры выкананні ў сукупнасці наступных умоў: праведзена выплата сумы падатку на дабаўленую вартасць і пададзена ў мытны орган дэкларацыя на тавары, якая пацвярджае выпуск тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім праведзена выплата падатку на дабаўленую вартасць, калі яна праведзена пасля падачы ў мытны орган дэкларацыі на тавары, якая пацвярджае выпуск тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім пададзена ў мытны орган дэкларацыя на тавары, калі яна пададзена пасля выплаты падатку на дабаўленую вартасць і выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

10. У выпадку выяўлення ў раней выстаўленым (накіраваным) электронным рахунку-фактуры непаўнаты звестак ці памылак, якія патрабуюць анулявання ўказанага рахунка-фактуры, плацельшчыкам:

10.1. або анулюецца раней выстаўлены (накіраваны) электронны рахунак-фактура.

Калі раней выстаўлены электронны рахунак-фактура быў падпісаны электронным лічбавым подпісам пакупніка, то ён анулюецца пры наяўнасці згоды пакупніка, якая выказваецца падпісаннем згоды электронным лічбавым подпісам пакупніка;

10.2. або выстаўляецца (накіроўваецца) выпраўлены электронны рахунак-фактура, якім анулюецца раней выстаўлены (накіраваны) электронны рахунак-фактура.

Выпраўлены электронны рахунак-фактура павінен змяшчаць:

новыя паказчыкі, неабходныя для вылічэння падатку на дабаўленую вартасць, уключаючы нулявыя;

спасылку на нумар раней выстаўленага (накіраванага) электроннага рахунка-фактуры, які анулюецца.

Калі раней выстаўлены электронны рахунак-фактура быў падпісаны электронным лічбавым подпісам пакупніка, то ён анулюецца пры наяўнасці згоды пакупніка, якая выказваецца падпісаннем электронным лічбавым подпісам пакупніка выпраўленага электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага прадаўцом.

11. У выпадку неабходнасці карэкціроўкі паказчыкаў раней выстаўленага (накіраванага) электроннага рахунка-фактуры, якая не патрабуе анулявання паказчыкаў раней выстаўленага (накіраванага) электроннага рахунка-фактуры, плацельшчык выстаўляе (накіроўвае) дадатковы электронны рахунак-фактуру, які павінен змяшчаць спасылку на нумар раней выстаўленага (накіраванага) электроннага рахунка-фактуры.

Выстаўленне (накіраванне) дадатковага электроннага рахунка-фактуры ажыццяўляецца ў наступных выпадках:

пры змяншэнні (павелічэнні) кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы выпадкі ўцэнкі і (ці) спісання, прадугледжаныя пунктам 6 артыкула 129 гэтага Кодэкса;

пры частковым ці поўным вяртанні пакупнікам прадаўцу тавараў (частковай ці поўнай адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў;

пры павелічэнні падатковай базы на сумы, фактычна атрыманыя (належныя да атрымання), у адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

пры павелічэнні (змяншэнні) падатковай базы ў адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 8, часткай другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

пры карэкціроўцы прадаўцом вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з пунктам 7 артыкула 129 гэтага Кодэкса;

пры ўзнікненні падстаў прымянення вызвалення ад падаткаабкладання, стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) і (ці) дзесяць (10) працэнтаў у adносінах да абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх раней быў вылічаны падатак на дабаўленую вартасць у большай суме па стаўках у памеры дваццаць (20) ці дзесяць (10) працэнтаў адпаведна.

Пры складанні дадатковага электроннага рахунка-фактуры ўказваюцца розніца паміж першапачатковай падатковай базай і падатковай базай пасля карэкціроўкі, а таксама сума падатку на дабаўленую вартасць, якая адносіцца да гэтай розніцы:

са станоўчымі значэннямі – у выпадку карэкціроўкі падатковай базы ў бок павелічэння;

з адмоўнымі значэннямі – у выпадку карэкціроўкі падатковай базы ў бок змяншэння.

12. У адносінах да аперацый, па якіх плацельшчыкам стварае адзін агульны электронны рахунак-фактуру ў адпаведнасці з падпунктам 8.9 пункта 8 гэтага артыкула, дадатковы электронны рахунак-фактура не выстаўляецца пры:

змяншэнні (павелічэнні) кошту тавараў (прац, паслуг);

частковым або поўным вяртанні пакупнікам прадаўцу тавараў (частковай або поўнай адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг);

пры павелічэнні падатковай базы на сумы, фактычна атрыманыя (належныя да атрымання).

Павелічэнне (змяншэнне) падатковай базы і сум падатку на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца ў агульным электронным рахунку-фактуры, што выстаўляецца за справаздачны перыяд, у якім ажыццяўляюцца змяншэнне (павелічэнне) кошты тавараў (прац,

паслуг), частковае або поўнае вяртанне пакупніком прадаўцу тавараў (частковая або поўная адмова ад выкананых прац, аказаных паслуг).

13. Выстаўленне (накіраванне) дадатковага электроннага рахунка-фактуры, які можа не змяшчаць спасылку на нумар раней выстаўленага (накіраванага) электроннага рахунка-фактуры, дапускаецца ў наступных выпадках:

13.1. пры павелічэнні (змяншэнні) падатковай базы ў адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 8, часткай другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

Дапускаецца выстаўленне такога дадатковага электроннага рахунка-фактуры ў цэлым за месяц у рамках аднаго дагавору з пакупніком, але асобна на сумы павелічэння і на сумы змяншэння;

13.2. пры павелічэнні падатковай базы ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

Дапускаецца накіраванне такога дадатковага электроннага рахунка-фактуры ў цэлым за месяц у адносінах да ўсіх пакупнікоў;

13.3. на адмоўную суму індэксацыі пры рэалізацыі прыроднага газу, электрычнай і цеплавой энергіі, якая прад'яўляецца:

газазабяспечвальнымі і энергагазабяспечвальнымі арганізацыямі, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз», дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга»;

адкрытым акцыянерным таварыствам «Газпрам трансгаз Беларусь».

14. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў выстаўленне электронных рахункаў-фактур ажыццяўляецца камісіянерам (паввераным) і іншай аналагічнай асобай:

14.1. пакупніку ў частцы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, рэалізаваных яму, на падставе звестак з электронных рахункаў-фактур, выстаўленых камісіянеру (паверанаму) і іншай аналагічнай асобе камітэнтам (даверанікам) і іншай аналагічнай асобай, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь.

У гэтым выпадку сума падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, адлюстраваная ў электронным рахунку-фактуры, выстаўленым камісіянеру (паверанаму) і іншай аналагічнай асобе камітэнтам (даверанікам) і іншай аналагічнай асобай, адлюстроўваецца ў электронным рахунку-фактуры, які выстаўляецца камісіянерам (паввераным) і іншай аналагічнай асобай пакупніку;

14.2. камітэнту (даверніку) і іншай аналагічнай асобе ў частцы сумы ўзнагароды, атрыманай (належнай да атрымання) камісіянерам (паввераным) і іншай аналагічнай асобай, якая з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь.

15. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, на падставе дагавораў камісіі (даручэння) і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў:

падлічаныя камісіянерам (паввераным) і іншай аналагічнай асобай у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса сумы падатку на дабаўленую вартасць прад'яўляюцца ў электронным рахунку-фактуры, які выстаўляецца пакупніку, на падставе электроннага рахунка-фактуры, які накіроўваецца ім на Партал у адпаведнасці з падпунктам 8.7 пункта 8 і (ці) падпунктам 9.1 пункта 9 гэтага артыкула;

электронныя рахункі-фактуры выстаўляе камісіянер (паввераны) і іншая аналагічная асобай, якая з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь, на Партал у частцы атрыманых ім (належных да атрымання) сум узнагароды па дагаворы камісіі (даручэння) і іншым аналагічным грамадзянска-прававым дагаворы з замежнай арганізацыяй, якая не знаходзіцца на ўліку ў падатковым органе Рэспублікі Беларусь.

16. Пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў электронны рахунак-фактуру камітэнту (даверніку) і іншай аналагічнай асобе выстаўляе камісіянер (паввераны) і

іншая аналагічная асоба на падставе звестак з электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага камісіянеру (паверанаму) і іншай аналагічнай асобе прадаўцом тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, які з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь. У гэтым выпадку сума падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, адлюстраваная ў электронным рахунку-фактуры, выстаўленым камісіянерам (паверанным) і іншай аналагічнай асобай камітэнту (даверніку) і іншай аналагічнай асобе, указваецца з электроннага рахунка-фактуры прадаўца, выстаўленага камісіянеру (паверанаму) і іншай аналагічнай асобе.

Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў, якія набываюцца ў рамках выканання дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, заплачаныя камісіянерам (паверанным) і іншай аналагічнай асобай пры ўвозе тавараў сумы падатку на дабаўленую вартасць прад'яўляюцца камісіянерам (паверанным) і іншай аналагічнай асобай у электронным рахунку-фактуры, які выстаўляецца камітэнту (даверніку) і іншай аналагічнай асобе.

Выстаўленне электронных рахункаў-фактур ажыццяўляецца камісіянерам (паверанным) і іншай аналагічнай асобай камітэнту (даверніку) і іншай аналагічнай асобай у частцы сумы ўзнагароды, атрыманай (належнай да атрымання) камісіянерам (паверанным) і іншай аналагічнай асобай, якая з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь.

17. Пры набыцці пакупнікамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія пры пакрыцці іх кошту не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з палажэннямі падпункта 2.12 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса, выстаўленне электроннага рахунка-фактуры асобам, якія кампенсуюць кошт такіх набытых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, ажыццяўляецца пакупніком на падставе даных электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага пакупніку прадаўцом тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, які з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь.

У гэтым выпадку сума падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, адлюстраваная ў электронным рахунку-фактуры, выстаўленым згодна з пунктамі 7, 8, 10 і 11 артыкула 130 гэтага Кодэкса пакупніком асобам, якія кампенсуюць кошт набытых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, указваецца з электроннага рахунка-фактуры прадаўца тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Пры падаткаабкладанні плацельшчыкам абаротаў па пакрыцці ў адпаведнасці з падпунктамі 9.3 і 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса:

палажэнні гэтага пункта не прымяняюцца;

выстаўленне электронных рахункаў-фактур ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам як пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

18. Пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў заказчыкам (забудоўшчыкам) будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў) і перадачы трэцяй асобе (у тым ліку дольшчыку) пасля заканчэння будаўніцтва фактычна праведзеных затрат па будаўніцтве аб'екта выстаўленне электроннага рахунка-фактуры трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам) ажыццяўляецца заказчыкам (забудоўшчыкам) на падставе звестак з электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага заказчыку (забудоўшчыку) прадаўцом тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, які з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь. У гэтым выпадку сума падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, адлюстраваная ў электронным рахунку-фактуры, выстаўленым заказчыкам (забудоўшчыкам) трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам), указваецца з электроннага рахунка-фактуры прадаўца тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, вылічаныя заказчыкам (забудоўшчыкам) у адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса сумы падатку на дабаўленую вартасць прад'яўляюцца заказчыкам

(забудоўшчыкам) у электронным рахунку-фактуры, які выстаўляецца трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам), на падставе электроннага рахунка-фактуры, які накіроўваецца на Партал у адпаведнасці з падпунктам 8.7 пункта 8 і (ці) падпунктам 9.1 пункта 9 гэтага артыкула.

Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў, якія набываюцца ў рамках выканання дагавораў будаўніцтва ў інтарэсах трэціх асоб (у тым ліку дольшчыкаў), і перадачы трэцяй асобе (у тым ліку дольшчыку) пасля заканчэння будаўніцтва фактычна праведзеных затрат па будаўніцтве аб'екта заплачаныя заказчыкам (забудоўшчыкам) пры ўвозе тавараў сумы падатку на дабаўленую вартасць прад'яўляюцца заказчыкам (забудоўшчыкам) у электронным рахунку-фактуры, які выстаўляецца трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам).

Заказчыкам (забудоўшчыкам), які з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь, трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам) выстаўляецца электронны рахунак-фактура на абароты па рэалізацыі паслуг заказчыка (забудоўшчыка), па якіх падатковая база вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 33 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

19. Пры рэалізацыі паслуг транспартнай экспедыцыі экспедытар выстаўляе кліенту электронны рахунак-фактуру зыходзячы з памеру ўзнагароды, які вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 30 артыкула 120 гэтага Кодэкса.

Электронны рахунак-фактуру ў адносінах да расходаў на прыцягненне перавозчыкаў і іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць паслугі, указаныя ў дагаворы транспартнай экспедыцыі, але не ўключаныя ў памер узнагароды экспедытара, экспедытар выстаўляе кліенту ў адпаведнасці з палажэннямі пункта 17 гэтага артыкула асобна ад электроннага рахунка-фактуры, які экспедытар выстаўляе кліенту ў адносінах да сваёй узнагароды.

20. Філіялы юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь, якія выконваюць падатковыя абавязацельствы гэтых юрыдычных асоб у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 14 гэтага Кодэкса, выстаўляюць (накіроўваюць) электронныя рахункі-фактуры ў парадку, устаноўленым:

20.1. пунктам 21 гэтага артыкула, – у выпадку перадачы падатковых вылікаў у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь у парадку, прадугледжаным пунктам 25 артыкула 133 гэтага Кодэкса;

20.2. гэтым артыкулам для плацельшчыкаў, – у іншых выпадках, у тым ліку ў выпадку вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць (прымянення вызвалення ад падаткаабкладання ў адпаведнасці з часткай другой падпункта 2.9 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь.

21. Пры перадачы падатковых вылікаў у парадку, прадугледжаным пунктам 25 артыкула 133 гэтага Кодэкса і (ці) Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, атрымальніку падатковых вылікаў бок, які перадае, выстаўляе электронны рахунак-фактуру, у якім указваюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія перадаюцца.

На суму падатковых вылікаў, якія перадаюцца ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, у боку, які перадае, памяншаецца агульная сума падатковых вылікаў.

22. Пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў удзельнік простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці), які выконвае падатковае абавязацельства гэтай суполкі (ці) даверны кіраўнік, які з'яўляецца плацельшчыкам, выстаўленне (накіраванне) электронных рахункаў-фактур у адносінах да абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія адносяцца да дзейнасці простай суполкі (удзельнікаў дагавора аб сумеснай дзейнасці) і (ці) даверных кіраўнікоў, ажыццяўляюць у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

23. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі (далей у гэтым пункце – рэдакцыя), мае права ствараць адзін электронны рахунак-фактуру за каляндарны месяц па рэалізаваных за каляндарны месяц (мінімальны падпісны перыяд) праз аператара паштовай сувязі па падпісцы друкаваных сродках масавай інфармацыі, які:

23.1. накіроўваецца на Партал (без неабходнасці яго выстаўлення аператару паштовай сувязі) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за справаздачным перыядам, у частцы

друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, перададзеных рэдакцыяй на адрас аператара паштовай сувязі для рэалізацыі падпісчыкам:

падаткаплацельшчыкам замежных дзяржаў;

фізічным асобам, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі;

23.2. выстаўляецца аператару паштовай сувязі ў тэрмін, устаноўлены пунктам 5 гэтага артыкула, у частцы друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, перададзеных рэдакцыяй на адрас аператара паштовай сувязі для рэалізацыі падпісчыкам, за выключэннем падпісчыкаў, указаных у падпункце 23.1 гэтага пункта.

24. У выпадку немагчымасці выстаўлення (накіравання) электронных рахункаў-фактур у сувязі з недаступнасцю Партала (у тым ліку з-за адсутнасці электрасілкавання і (ці) выхаду са строю абсталявання (яго часткі) Партала), недастатковасцю рэсурсаў Партала, недаступнасцю і (ці) адсутнасцю каналаў сувязі з Парталам, уключаючы недастатковасць шырыні каналаў сувязі з Парталам, плацельшчык абавязаны не пазней за пяць рабочых дзён з дня аднаўлення працаздольнасці Партала выставіць (накіраваць) электронны рахунак-фактуру ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага артыкула.

**Артыкул 132. Падатковыя вылікі**

1. Падатковымі вылікамі, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 2 гэтага артыкула, прызнаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць:

1.1. прад'яўленыя прадаўцамі, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і з'яўляюцца плацельшчыкамі, да аплаты плацельшчыку пры набыцці ім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

1.2. заплачаныя плацельшчыкам пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

1.3. заплачаныя ў бюджэт пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

2. Падатковымі вылікамі для індывідуальных прадпрымальнікаў прызнаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, за выключэннем сум падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, выкарыстаных для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

3. Сумай падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленай пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, прызнаецца сума падатку на дабаўленую вартасць:

вылучаная прадаўцом пакупніку ў электронных рахунках-фактурах;

падлічаная і заплачаная ў бюджэт пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

Сумай падатку на дабаўленую вартасць, заплачанай пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, прызнаецца:

сума падатку на дабаўленую вартасць, заплачаная ў бюджэт пры выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

сума падатку на дабаўленую вартасць, вылічаная і заплачаная ў бюджэт пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

4. Калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой, вылікам падлягаюць прад'яўленыя плацельшчыку сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў незалежна ад даты правядзення разлікаў за тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, якія набываюцца, або заплачаныя плацельшчыкам пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь пасля іх адлюстравання ў бухгалтарскім уліку і кнізе пакупак у выпадку, калі кнігу пакупак вядзе плацельшчык.

Вядзенне кнігі пакупак устанаўліваецца ўліковай палітыкай арганізацыі. Кніга пакупак вядзецца па ўстаноўленай форме і запаўняецца ва ўстаноўленым парадку.

Арганізацыя мае права на працягу падатковага перыяду прадугледзець ва ўліковай палітыцы вядзенне кнігі пакупак. У гэтым выпадку вядзенне кнігі пакупак ажыццяўляецца да заканчэння адпаведнага падатковага перыяду.

5. Падатковыя вылікі праводзяцца:

5.1. пры набыцці плацельшчыкам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў – на падставе электронных рахункаў-фактур, атрыманых ад прадаўцоў гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры ўмове падпісання плацельшчыкам электронных рахункаў-фактур электронным лічбавым подпісам;

5.2. пры набыцці плацельшчыкам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, – на падставе наступных дакументаў:

падатковых дэкларацый (разлікаў) па падатку на дабаўленую вартасць;

электронных рахункаў-фактур, накіраваных плацельшчыкам на Партал;

5.3. пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (акрамя ўвозу тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза) – на падставе наступных дакументаў:

дэкларацый на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

дакументаў (іх копій), якія пацвярджаюць факт выплаты падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

электронных рахункаў-фактур, накіраваных плацельшчыкам на Партал;

5.4. пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза – на падставе наступных дакументаў:

падатковых дэкларацый (разлікаў) па падатку на дабаўленую вартасць;

дакументаў, якія пацвярджаюць факт выплаты падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

электронных рахункаў-фактур, накіраваных плацельшчыкам на Партал;

5.5. пры набыцці транспартных паслуг па перавозцы пасажыраў і багажу – на падставе электронных рахункаў-фактур, атрыманых ад прадаўцоў гэтых паслуг, пры ўмове падпісання плацельшчыкам электронных рахункаў-фактур электронным лічбавым подпісам;

5.6. пры набыцці па падпісцы друкаваных сродкаў масавай інфармацыі – на падставе электронных рахункаў-фактур, атрыманых ад прадаўцоў, пры ўмове іх падпісання плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам;

5.7. пры арэндзе (фінансавай арэндзе (лізінгу)) аб'ектаў арэнды (прадметаў лізінгу) – на падставе электронных рахункаў-фактур, атрыманых ад арэндадаўца (лізінгадавальніка), пры ўмове іх падпісання арандатарам (лізінгаатрымальнікам) электронным лічбавым подпісам;

5.8. па таварах, набытых па рознічных цэнах з выкарыстаннем касавага абсталявання, – на падставе наступных дакументаў:

плацежных дакументаў, якія фарміруюцца касавым абсталяваннем, калі ў такіх дакументах стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць указаны ў якасці рэквізіту плацежнага дакумента;

плацежных дакументаў, якія фарміруюцца касавым абсталяваннем, у якіх плацельшчыкам, які рэалізуе тавары па рознічных цэнах, стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць па патрабаванні пакупніка вылучаны ў парадку, устаноўленым пунктам 4 артыкула 130 гэтага Кодэкса, – у выпадку, калі ў такіх дакументах стаўка і сума падатку на дабаўленую вартасць не ўказаны ў якасці рэквізіту плацежнага дакумента;

электронных рахункаў-фактур, атрыманых ад прадаўцоў, пры ўмове іх падпісання плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам.

6. Прад'яўленыя плацельшчыку сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў прызнаюцца падатковым вылікам у тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае найбольш позняя з наступных дат:

дата адлюстравання прад'яўленай сумы падатку на дабаўленую вартасць у бухгалтарскім уліку па набытых, у тым ліку па бязвыплатна атрыманых, таварах (працах, паслугах), маёмасных правах;

дата адлюстравання сумы падатку на дабаўленую вартасць у кнізе пакупак, калі вядзенне кнігі пакупак ажыццяўляецца плацельшчыкам;

дата падпісання плацельшчыкам электронна-лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры, які з'яўляецца падставай для выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, або адна з дат, выбраных плацельшчыкам згодна з часткай другой гэтага пункта.

Пры падпісанні плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам электронных рахункаў-фактур:

не пазней за дату падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім выкананы ўмовы, устаноўленыя гэтым артыкулам для ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, плацельшчык мае права зрабіць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць за ўказаны справаздачны перыяд пры ўмове, што дата здзяйснення аперацыі ў электронным рахунку-фактуры прыпадае на гэты ж справаздачны перыяд;

пасля падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім выкананы ўмовы, устаноўленыя гэтым артыкулам для ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, і дата здзяйснення аперацыі ў электронным рахунку-фактуры прыпадае на гэты ж справаздачны перыяд, плацельшчык мае права зрабіць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, тэрмін падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за які ідзе следам за падпісаннем плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам электронных рахункаў-фактур.

7. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, заплачаныя пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, прызнаюцца падатковым вылікам у тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае найбольш позняя з наступных дат:

дата прыняцця да ўліку ўвезеных тавараў;

апошні дзень месяца, за які пададзена падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць з адлюстраваннем сумы падатку на дабаўленую вартасць, падлічанай пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

дата выплаты падатку на дабаўленую вартасць у бюджэт ці іншая дата, выбраная плацельшчыкам згодна з часткай другой гэтага пункта;

дата адлюстравання сумы падатку на дабаўленую вартасць у бухгалтарскім уліку;

дата адлюстравання сумы падатку на дабаўленую вартасць у кнізе пакупак, калі вядзенне кнігі пакупак ажыццяўляецца плацельшчыкам;

дата накіравання плацельшчыкам электроннага рахунка-фактуры, які з'яўляецца падставай для выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, на Партал ці іншая дата, выбраная плацельшчыкам згодна з часткай другой гэтага пункта.

Пры адлюстраванні ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, і яе выплаце ў бюджэт ва ўстаноўленыя тэрміны плацельшчык мае права зрабіць вылік сумы падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, на які прыпадае дата прыняцця тавараў да ўліку, калі не пазней за дату падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за гэты справаздачны перыяд:

указаная сума падатку на дабаўленую вартасць выплачана ў бюджэт;

электронны рахунак-фактура накіраваны на Партал.

8. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, заплачаныя пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза, прызнаюцца падатковым вылікам у тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае найбольш позняя з наступных дат:

дата прыняцця да ўліку ўвезеных тавараў;

дата падачы дэкларацыі на тавары;

дата выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

дата выплаты падатку на дабаўленую вартасць у бюджэт;

дата выстаўлення электроннага рахунка-фактуры на Партал ці іншая дата, выбраная плацельшчыкам згодна з часткай другой гэтага пункта.

Пры выстаўленні плацельшчыкам электроннага рахунка-фактуры на Партал не пазней за дату падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім выкананы ўмовы, устаноўленыя гэтым артыкулам для ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, плацельшчык мае права правесці вылік сум падатку на дабаўленую вартасць за ўказаны справаздачны перыяд пры ўмове, што дата здзяйснення аперацыі ў электронным рахунку-фактуры прыпадае на гэты ж справаздачны перыяд.

9. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя плацельшчыкам пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, прызнаюцца заплачанымі ў бюджэт у 22-е чысло месяца падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, за які ў адпаведнасці з артыкулам 114 гэтага Кодэкса вылічаны сумы падатку на дабаўленую вартасць па такіх таварах (працах, паслугах), маёмасных правах.

10. Палажэнні гэтага артыкула і артыкула 133 гэтага Кодэкса, якія вызначаюць парадак прымянення падатковых вылікаў:

10.1. па дагаворах арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), прымяняюцца таксама ў адносінах да дагавораў найму жылога памяшкання і бязвыплатнага карыстання;

10.2. камітэнтамі і (ці) давернікамі, прымяняюцца таксама для кансігнантаў і іншых аналагічных асоб;

10.3. камісіянерамі і (ці) паверанымі, прымяняюцца таксама кансігнатарамі і іншымі аналагічнымі асобамі.

11. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы, могуць без іх адлюстравання на рахунках уліку падатку на дабаўленую вартасць адносіцца плацельшчыкамі на павелічэнне кошту гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

12. Арганізацыі, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (у тым ліку замежныя арганізацыі і акрэдытаваныя ва ўстаноўленым парадку прадстаўніцтвы замежных арганізацый), сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, адносяць на павелічэнне кошту гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

13. Плацельшчыкі, якія рэалізуюць набытыя тавары, абароты па рэалізацыі якіх вызвалены ад падаткаабкладання, сумы падатку на дабаўленую вартасць, заплачаныя пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, адносяць на павелічэнне кошту тавараў на дату прыняцця тавараў на ўлік.

14. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія не прызнаюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання без вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць, адносяць на павелічэнне кошту набытых (увезеных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў сумы падатку на дабаўленую вартасць:

заплачаныя імі пры ўвозе тавараў;

прад'яўленыя ім пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

заплачаныя імі ў бюджэт пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

Гэта палажэнне распаўсюджваецца таксама на арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, указаных у частцы першай гэтага пункта, у выпадку, калі пры рэалізацыі (адгрузцы) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў імі залішне прад'яўлены і вылічаны

падатак на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 7.1 пункта 7 артыкула 129 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 133. Парадак прымянення падатковых вылікаў**

1. Вылік сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца нарастаючым вынікам:

1.1. у межах сум падатку на дабаўленую вартасць, вылічаных па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 1.2 гэтага пункта;

1.2. у поўным аб'ёме незалежна ад сум падатку на дабаўленую вартасць, вылічаных па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у выпадках, устаноўленых пунктам 27 гэтага артыкула, і ў выпадках, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Сумы падатку на дабаўленую вартасць не ўключаюцца ў затраты плацельшчыка, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых пунктам 3 гэтага артыкула.

3. Уключаюцца ў затраты плацельшчыка, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (за выключэннем асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў), працах, паслугах, маёмасных правах, выкарыстаных для вытворчасці і (ці) рэалізацыі:

3.1. тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, абароты па рэалізацыі якіх вызвалены ад падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Палажэнні гэтага падпункта прымяняюцца таксама сялянскімі (фермерскімі) гаспадаркамі, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць згодна з пунктам 1 артыкула 384 гэтага Кодэкса, у частцы дзейнасці па вытворчасці прадукцыі раслінаводства (акрамя кветак і дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушнога звераводства), рыбаводства і пчалаводства;

3.2. тавараў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, уключаючы тавары, што рэалізуюцца насельніцтву на выстаўках-кірмашах, якія праводзяцца на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца ў адносінах да абаротаў па рэалізацыі:

тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў арганізацыямі (філіяламі юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь), зарэгістраванымі ў якасці плацельшчыкаў за межамі Рэспублікі Беларусь;

тавараў, указаных у частцы першай падпункта 27.7 і (ці) частцы першай падпункта 27.8 пункта 27 гэтага артыкула, вылік сум падатку на дабаўленую вартасць па якіх праведзены ў поўным аб'ёме.

4. Сумы падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі, указаных у падпункце 3.1 і частцы першай падпункта 3.2 пункта 3 гэтага артыкула, вызначаюцца ў парадку, устаноўленым артыкулам 134 гэтага Кодэкса.

5. Вызначэнне сум падатку на дабаўленую вартасць, што падлягаюць выліку па набытых (увезеных) асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, праводзіцца зыходзячы з сум падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да іх поўнага кошту.

6. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да затрат:

6.1. на павелічэнне кошту раней прынятых на ўлік асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, могуць прымацца да выліку ў парадку, устаноўленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых асноўных сродках і нематэрыяльных актывах.

Сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да затрат, панесеных плацельшчыкам да пачатку рэканструкцыі (мадэрнізацыі) раней прынятых на ўлік аб'ектаў асноўных сродкаў, і з’яўляюцца ўкладаннямі ў доўгатэрміновыя актывы плацельшчыка, могуць прымацца да выліку ў парадку, устаноўленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых асноўных сродках, з даты пачатку будаўніцтва (па мадэрнізацыі – з даты пачатку мадэрнізацыі);

6.2. па стварэнні (будаванні, будаўніцтве, вырабе) плацельшчыкам аб'ектаў асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, могуць прымацца да выліку ў парадку, устаноўленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых асноўных сродках і нематэрыяльных актывах.

Пры гэтым сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да затрат, панесеных плацельшчыкам да пачатку будаўніцтва створаных аб'ектаў асноўных сродкаў, і з'яўляюцца ўкладаннямі ў доўгатэрміновыя актывы плацельшчыка, могуць прымацца да выліку ў парадку, установленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых асноўных сродках, з даты пачатку будаўніцтва;

6.3. па стварэнні плацельшчыкам бязвыплатна перададзеных ва ўласнасць дзяржавы аб'ектаў інжынернай, транспартнай, сацыяльнай інфраструктуры і іх добраўпарадкавання, завершаных будаўніцтвам, але не зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку ў якасці аб'ектаў нерухомай маёмасці, прымаюцца да выліку ў парадку, установленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых таварах (працах, паслугах), маёмасных правах.

7. Пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадметаў лізінгу па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп прадмета лізінгу, сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя ў частцы кантрактнага кошту прадмета лізінгу, прымаюцца да выліку:

у парадку, установленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых асноўных сродках;

зыходзячы з даты атрымання прадмета лізінгу, якая вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 9 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

8. Вылік сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца ў адносінах да:

тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру часовага ўвозу (допуску), – асобай, якая ажыццявіла ўвоз тавару, у парадку, установленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па набытых таварах (працах, паслугах);

аплачаных пры ўвозе аб'ектаў арэнды (прадметаў лізінгу), набытых арэндадаўцам (лізінгадавальнікам) за межамі Рэспублікі Беларусь, – арэндадаўцам (лізінгадавальнікам).

Пры набыцці аб'ектаў арэнды (прадметаў лізінгу) у замежных арганізацый і замежных грамадзян заплачаныя арандатарам (лізінгаатрымальнікам) пры ўвозе аб'ектаў арэнды (прадметаў лізінгу) сумы падатку на дабаўленую вартасць падлягаюць выліку ў арандатара (лізінгаатрымальніка) пасля атрымання аб'екта арэнды (прадметаў лізінгу).

9. Пры набыцці плацельшчыкам тавараў за межамі Рэспублікі Беларусь, па якіх ажыццяўляецца мытны кантроль і выплата падатку на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца ў замежнай валюце, падлеглая выліку сума падатку на дабаўленую вартасць вызначаецца на падставе электроннага рахунка-фактуры, накіраванага плацельшчыкам на Партал і складзенага ў беларускіх рублях зыходзячы з афіцыйнага курса беларускага рубля ў адносінах да адпаведнай замежнай валюты, установленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

10. Пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у прадаўцоў, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь, за замежную валюту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па дагаворах, якія прадугледжваюць разлікі ў замежнай валюце, падлеглая выліку сума падатку на дабаўленую вартасць вызначаецца ў суме падатку на дабаўленую вартасць у беларускіх рублях, указанай у электронным рахунку-фактуры, выстаўленым прадаўцом пакупніку.

11. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, заплачаныя ў бюджэт пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь:

за замежную валюту, падлягаюць выліку зыходзячы з сумы падатку на дабаўленую вартасць у беларускіх рублях, пералічанай зыходзячы з афіцыйнага курса Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, установленага на дзень аплаты, уключаючы авансавы плацеж, або іншага спынення абавязацельстваў пакупнікамі (заказчыкамі) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, і ўказанай у электронным рахунку-фактуры, накіраваным пакупніком на Партал;

падлягаюць выліку ў справаздачным перыядзе, які ідзе следам за перыядам іх вылічэння, у парадку, установленым для выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленых пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

12. Падлеглыя выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць вызначаюцца пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у прадаўцоў, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць у Рэспубліцы Беларусь, тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана:

у беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце, – у суме падатку на дабаўленую вартасць у беларускіх рублях, указанай у электронных рахунках-фактурах (дадатковых электронных рахунках-фактурах), выстаўленых прадаўцом пакупніку;

у замежнай валюце эквівалентна суме ў іншай замежнай валюце, – у суме падатку на дабаўленую вартасць у беларускіх рублях, указанай у электронных рахунках-фактурах (дадатковых электронных рахунках-фактурах), выстаўленых прадаўцом пакупніку.

На суму розніцы (станоўчай ці адмоўнай), указанай у дадатковых электронных рахунках-фактурах, праводзіцца карэкціроўка падатковых вылікаў за справаздачны перыяд, у якім дадатковыя электронныя рахункі-фактуры падпісаны пакупніком электронным лічбавым подпісам, або за справаздачны перыяд, выбраны пакупніком згодна з часткай трэцяй гэтага пункта.

Пры падпісанні пакупніком электронным лічбавым подпісам дадатковых электронных рахункаў-фактур:

не пазней за дату падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае ўказаная ў дадатковым электронным рахунку-фактуры дата здзяйснення аперацыі, пакупнік мае права павялічыць (зменшыць) падатковыя вылікі за гэты справаздачны перыяд;

пасля падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, на які прыпадае ўказаная ў дадатковым электронным рахунку-фактуры дата здзяйснення аперацыі, пакупнік мае права павялічыць (зменшыць) падатковыя вылікі за той справаздачны перыяд, тэрмін падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за які ідзе следам за падпісаннем плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам дадатковых электронных рахункаў-фактур.

13. Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў у якасці давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія спаганяюцца мытнымі органамі і заплачаны плацельшчыкам па даручэнні замежнай арганізацыі (фізічнай асобы) – заказчыка прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў), падлягаюць выліку ў плацельшчыка пасля іх выплаты ў бюджэт Рэспублікі Беларусь пры ўмове, што ўказаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць не падлягаюць пакрыццю заказчыкам.

14. Пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў камісіянерам (павераным), іншай аналагічнай асобай па даручэнні камітэнта (даверніка), іншай аналагічнай асобы вылучаныя прадаўцом сумы падатку на дабаўленую вартасць падлягаюць выліку камітэнтам (давернікам).

Пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь па даручэнні камітэнта (даверніка), іншай аналагічнай асобы заплачаныя камісіянерам (паверанымі), іншай аналагічнай асобай сумы падатку на дабаўленую вартасць падлягаюць выліку камітэнтам (давернікам), іншай аналагічнай асобай пасля іх выплаты ў бюджэт.

Указаныя ў частках першай і другой гэтага пункта сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку камітэнтам (давернікам), іншай аналагічнай асобай на падставе электронных рахункаў-фактур, якія выстаўляюцца камісіянерам (паверанымі), іншай аналагічнай асобай у адпаведнасці з пунктам 16 артыкула 131 гэтага Кодэкса.

15. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія адносяцца да абаротаў па бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, падлягаюць выліку ў парадку, устаноўленым для выліку падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія абкладаюцца па стаўцы ў памеры дваццаць (20) працэнтаў, незалежна ад таго, ці абкладаецца гэта бязвыплатная перадача падаткам на дабаўленую вартасць.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта не прымяняюцца:

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да затрат па стварэнні бязвыплатна перададзеных ва ўласнасць дзяржавы аб'ектаў інжынернай, транспартнай, сацыяльнай інфраструктуры і іх добраўпарадкавання, завершаных будаўніцтвам, але не зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку ў якасці аб'ектаў нерухомай маёмасці;

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія бязвыплатна перадаюцца ў межах адной юрыдычнай асобы;

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць па маёмасці, якая бязвыплатна перадаецца арганізацыяй яе правапераемніку (правапераемнікам) пры рэарганізацыі гэтай арганізацыі;

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць па маёмасці, якая перадаецца ў якасці ўкладаў у статутныя фонды камерцыйных арганізацый;

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да кошту маёмасці, што перадаецца арганізацыяй яе ўдзельніку (акцыянеру) у памеры, які не перавышае яго ўкладу ў статутны фонд гэтай арганізацыі, пры яе ліквідацыі або пры выхадзе (выключэнні) удзельніка са складу ўдзельнікаў арганізацыі, а таксама не перавышае часткі яго ўкладу ў статутны фонд гэтай арганізацыі пры змяншэнні памеру статутнага фонду;

у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць, не падлеглых выліку згодна з абзацам трэцім падпункта 24.9 пункта 24 артыкула 133 гэтага Кодэкса;

у выпадку аднясення сум падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленых пры набыцці або заплачаных пры ўвозе бязвыплатна перададзеных (выкананых, аказаных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, на павелічэнне іх кошту ці за кошт бязвыплатна атрыманых сродкаў бюджэту (бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў);

у выпадку набыцця бязвыплатна перададзеных (выкананых, аказаных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры якім сумы падатку на дабаўленую вартасць не прад'яўляліся плацельшчыку прадаўцамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці не выплачваліся плацельшчыкам пры ўвозе тавараў.

16. Для мэт вызначэння сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выліку ў парадку, устаноўленым часткай першай пункта 15 гэтага артыкула, плацельшчык у тым падатковым перыядзе, у якім бязвыплатна перададзены (выкананы, аказаны) тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, мае права прымяніць па выбары адзін з метадаў размеркавання падатковых вылікаў:

16.1. метад раздзельнага ўліку (без абавязковага ўказання прынятага рашэння аб выбары гэтага метаду ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка)), вызначыўшы ўказаную суму:

або як фактычна прад'яўленыя сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) бязвыплатна перададзеных (выкананых, аказаных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

або як падатковыя вылікі, роўныя 20 працэнтам ад кошту бязвыплатна перададзеных (выкананых, аказаных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

16.2. метад удзельнай вагі, уключыўшы аперацыі па бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у тым ліку не прызнаныя рэалізацыяй ці аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам, у агульную суму абароту па рэалізацыі згодна з падпунктам 4.1.2 пункта 4 артыкула 134 гэтага Кодэкса.

17. У выпадку вяртання мытнымі органамі плацельшчыку сум падатку на дабаўленую вартасць, раней заплачаных пры ўвозе тавараў і адлюстраваных у складзе падатковых вылікаў, праводзіцца змяншэнне сум падатковых вылікаў у тым справаздачным перыядзе, у якім праведзена вяртанне сум падатку на дабаўленую вартасць.

Пры падачы плацельшчыкам падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць з унесенымі зменамі і (ці) дапаўненнямі на змяншэнне сумы падатку на дабаўленую вартасць, падлічанай раней пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, на сумы падатку на дабаўленую вартасць, раней заплачаныя

пры ўвозе тавараў і адлюстраваныя ў складзе падатковых вылікаў, праводзіцца змяншэнне сум падатковых вылікаў у тым справаздачным перыядзе:

у якім праведзена вяртанне тавараў, – у выпадку вяртання раней увезеных тавараў, калі іншае не ўстаноўлена ў частцы трэцяй гэтага пункта;

за які пададзена падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць з унесенымі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі на змяншэнне сумы падатку на дабаўленую вартасць, падлічанай раней пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, – у іншых выпадках.

Пры вяртанні тавараў, раней увезеных з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, для іх рамонту ці замены:

падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць з унесенымі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі на змяншэнне сумы падатку на дабаўленую вартасць, падлічанай раней пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, не падаецца;

на сумы падатку на дабаўленую вартасць, раней заплачаныя пры ўвозе тавараў, якія вяртаюцца, і адлюстраваныя ў складзе падатковых вылікаў, змяншэнне сум падатковых вылікаў не праводзіцца.

18. Пры змяненні памеру прад'яўленай сумы падатку на дабаўленую вартасць у бок змяншэння ці ў бок павелічэння ў пакупнікоў праводзіцца адпаведная карэкціроўка падатковых вылікаў у наступных выпадках:

поўнае ці частковае вяртанне пакупніком прадаўцу тавараў. Гэтае палажэнне не прымяняецца ў адносінах да тавараў, вернутых іх прадаўцу для рамонту ці замены, калі не мяняецца іх кошт;

адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў;

змяншэнне (павелічэнне) кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Карэкціроўка падатковых вылікаў праводзіцца:

у бок змяншэння ў тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае праведзенае пакупніком вяртанне тавараў, узгодненыя прадаўцом і пакупніком ва ўстаноўленым парадку адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў, змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

у бок павелічэння ў тым справаздачным перыядзе, у якім у сукупнасці выконваюцца ўмовы згодна з абзацам другім гэтай часткі і ўмовы ажыццяўлення падатковых вылікаў па падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з артыкулам 132 гэтага Кодэкса і гэтым артыкулам пасля падпісання пакупніком электронным лічбавым подпісам дадатковага (выпраўленага) электроннага рахунка-фактуры, выстаўленага прадаўцом.

19. Палажэнні пункта 18 гэтага артыкула падлягаюць прымяненню таксама пакупніком, які выкарыстоўвае асаблівы рэжым падаткаабкладання без выплаты падатку на дабаўленую вартасць у перыяд вяртання тавараў (адмовы ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці змяншэння кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры іх набыцці, улічваліся ім раней у складзе падатковых вылікаў у падатковым перыядзе, што папярэднічае падатковаму перыяду, у якім праведзены:

вяртанне пакупнікам прадаўцу тавараў;

адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), маёмасных правоў;

змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта падлягаюць прымяненню таксама пакупнікам – індывідуальным прадпрымальнікам, які не з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у тым перыядзе, у якім праведзены вяртанне тавараў, адмова ад выкананых прац (аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў ці змяншэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

20. У выпадку ўцэнкі і (ці) спісання не рэалізаваных па розначных цэнах юрыдычнымі асобамі, якія ажыццяўляюць гандаль на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і арганізацыямі сувязі ва ўстаноўленыя дагаворам тэрміны тыражоў перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, якія ў адпаведнасці з умовамі дагавору не падлягаюць вяртанню і разлікі за якія

не праводзяцца, памяншаюцца падатковыя вылікі юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць гандаль на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і арганізацый сувязі ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены ўцэнка і (ці) спісанне не рэалізаваных па рознічных цэнах перыядычных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі.

21. У выпадку змяншэння (павелічэння) кошту ўказаных у частцы першай пункта 38 артыкула 120 гэтага Кодэкса тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў пасля сканчэння справаздачнага перыяду, у якім тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы былі атрыманы (выкананы, аказаны) у межах адной юрыдычнай асобы, праводзіцца адпаведная карэкціроўка падатковых вылікаў на суму розніцы, якая ўзнікае паміж змененым і папярэднім коштам атрыманых тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў.

Карэкціроўка падатковых вылікаў праводзіцца ў парадку, устаноўленым часткай другой пункта 18 гэтага артыкула.

22. Пакупнікі, што набывалі тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, па якіх прадаўцом няправільна ўказана сума падатку на дабаўленую вартасць (залішне прад'яўлена, у тым ліку ў сувязі з наданнем нарматыўным прававым актам зваротнай сілы, або прад'яўлена ў суме меншай, чым устаноўлена ў гэтай главе), прымаюць да выліку ў парадку, устаноўленым артыкулам 132 гэтага Кодэкса і гэтым артыкулам, суму падатку на дабаўленую вартасць, вылучаную прадаўцом у электронных рахунках-фактурах і першасных уліковых дакументах, за выключэннем выпраўлення ўказаных сум падатку на дабаўленую вартасць у бок змяншэння на падставе актаў зверкі разлікаў, падпісаных прадаўцом і пакупніком.

Змяншэнне пакупніком сум падатковых вылікаў праводзіцца ў месяцы падпісання акта зверкі разлікаў паміж прадаўцом і пакупніком.

23. Падатковыя вылікі падлягаюць змяншэнню індывідуальным прадпрымальнікам на сумы падатку на дабаўленую вартасць, прынятыя ім раней да выліку па таварах (працах, паслугах), уключаючы асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы, маёмасных правах, выкарыстаных для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, а індывідуальным прадпрымальнікам, які знаходзіцца ў працэсе спынення дзейнасці, – таксама па таварах, уключаючы асноўныя сродкі, што застаюцца ва ўласнасці на дату падачы ў рэгіструючы орган заявы аб спыненні дзейнасці.

Змяншэнне падатковых вылікаў праводзіцца індывідуальным прадпрымальнікам:

на сумы падатку на дабаўленую вартасць у памеры, раней прынятым да выліку, а ў адносінах да асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў – у памеры сумы, прапарцыянальнай астаткаваму кошту без уліку пераацэнкі;

у тым справаздачным перыядзе, у якім тавары (працы, паслугі), у тым ліку асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы, маёмасныя правы выкарыстаны для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, а па таварах, уключаючы асноўныя сродкі, якія застаюцца ва ўласнасці на дату падачы ў рэгіструючы орган заявы аб спыненні дзейнасці, – у справаздачным перыядзе, у якім прынята рашэнне аб спыненні прадпрымальніцкай дзейнасці. Змяншэнне падатковых вылікаў па таварах, уключаючы асноўныя сродкі, якія застаюцца ва ўласнасці на дату падачы ў рэгіструючы орган заявы аб спыненні дзейнасці, адлюстроўваецца індывідуальным прадпрымальнікам у падатковай дэкларацыі (разліку), якая падаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі абзаца другога часткі першай пункта 1 артыкула 44 гэтага Кодэкса.

Палажэнні гэтага пункта падлягаюць прымяненню таксама індывідуальным прадпрымальнікам, які не з'яўляецца плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у перыяд выкарыстання тавараў (прац, паслуг), у тым ліку асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, маёмасных правоў для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, і (ці) у перыяд спынення прадпрымальніцкай дзейнасці, калі сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры іх набыцці або ўвозе, улічваліся ім раней у складзе падатковых вылікаў у справаздачным (падатковым) перыядзе, які папярэднічае справаздачнаму (падатковаму) перыяду, у якім праведзены ўказаныя дзеянні.

24. Не падлягаюць выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць:

24.1. уключаныя ў затраты плацельшчыка:

24.1.1. якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

24.1.2. пры рэалізацыі і (ці) пагашэнні каштоўных папер, указаныя ў артыкуле 179 гэтага Кодэкса;

24.2. не адлюстраваныя плацельшчыкам у:

24.2.1. кнізе пакупак, у выпадку, калі вядзенне кнігі пакупак ажыццяўляецца плацельшчыкам;

24.2.2. бухгалтарскім уліку;

24.2.3. кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання;

24.2.4. уліку даходаў і расходаў індывідуальных прадпрымальнікаў;

24.3. аднесеныя на павелічэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (уключаючы асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы);

24.4. прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за кошт

бязвыплатна атрыманых сродкаў бюджэту або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў. Указаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць адносяцца за кошт гэтых крыніц або на павелічэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца, калі:

атрыманыя з указаных крыніц сродкі ўключаны (падлягаюць уключэнню) у падатковую базу;

набыццё (увоз) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў праведзена за кошт сум субсідый, дадзеных з бюджэту ў сувязі з прымяненнем плацельшчыкам цэн, якія вызначаюцца (рэгулююцца) заканадаўствам, ці льгот, дадзеных асобным катэгорыям грамадзян у адпаведнасці з заканадаўствам, за выключэннем сум субсідый, указаных у пункце 36 артыкула 120 гэтага Кодэкса;

24.5. у замежных арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць праз пастаяннае прадстаўніцтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, фактычна прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе):

тавараў, якія перадаюцца ў межах адной замежнай юрыдычнай асобы за межы Рэспублікі Беларусь;

тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, выкарыстаных для вытворчасці (стварэння) тавараў, якія перадаюцца ў межах адной замежнай юрыдычнай асобы за межы Рэспублікі Беларусь.

Пры немагчымасці вызначэння фактычна прад'яўленых пры набыцці (заплачаных пры ўвозе) сум падатку на дабаўленую вартасць па аперацыях, прадугледжаных часткай першай гэтага падпункта, або пры перадачы тавараў у межах адной замежнай юрыдычнай асобы, сумы падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе якіх яшчэ не заплачаны, выліку не падлягаюць падатковыя вылікі, роўныя 20 працэнтам ад кошту тавараў, якія перадаюцца.

На суму, указаную ў частцы другой гэтага падпункта, у боку, які перадае, памяншаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

24.6. у арганізацый, якія вядуць лясную гаспадарку, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за кошт сродкаў прамысловай вытворчасці і перададзеныя на вядзенне лясной гаспадаркі.

Указаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць адносяцца на расходы па каштарысе на вядзенне лясной гаспадаркі;

24.7. у экспедытара, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў:

не прызнаных пры пакрыцці кліентам іх кошту аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 2.12.5 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса;

выкарыстаных для кліента пры выкананні абавязкаў па дагаворы транспартнай экспедыцыі і кошт якіх не падлягае пакрыццю экспедытару кліентам;

24.8. прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не прызнаюцца пры пакрыцці іх кошту аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктамі 2.12.2 і (ці) 2.20.2 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса.

Пры падаткаабкладанні плацельшчыкам у адпаведнасці з падпунктамі 9.3 і (ці) 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса абаротаў па пакрыцці кошту набытых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў:

палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца;

сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры іх набыцці, прызнаюцца падатковымі вылікамі ў парадку, устаноўленым артыкулам 132 гэтага Кодэкса;

24.9. прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не прызнаюцца:

пры пакрыцці іх кошту аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктамі 2.12.1, 2.12.3 і 2.12.4, 2.12.6 і 2.12.7 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса;

аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктамі 2.5.5, 2.6, 2.8, 2.15, 2.22 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса;

24.10. заплачаныя камісіянерам (паверанным), іншай аналагічнай асобай у бюджэт пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, у выпадку пакрыцця ім дадзеных сум падатку на дабаўленую вартасць камітэнтам (давернікам), іншай аналагічнай асобай.

Палажэнні гэтага падпункта распаўсюджваюцца таксама на арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, указаных у пункце 4 артыкула 114 гэтага Кодэкса;

24.11. прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, звязаных з атрыманнем даходаў (выручкі) у частцы ажыццяўлення:

латарэйнай дзейнасці;

дзейнасці па правядзенні электронных інтэрактыўных гульняў;

дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу;

дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

дзейнасці па аказанні арганізацыямі, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак, паслуг па тэхнічным абслугоўванні і (ці) рамонце аўтамотатранспартных сродкаў і іх кампанентаў, абароты па рэалізацыі якіх не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць згодна з часткай першай пункта 7 артыкула 378 гэтага Кодэкса;

дзейнасці па здзяйсненні ініцыяваных фізічнымі і юрыдычнымі асобамі аперацый з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі (дзейнасці на пазабіржавым рынку Форэкс);

дзейнасці, па якой выплачваецца адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб.

Для мэт вызначэння не падлеглых выліку сум падатку на дабаўленую вартасць па таварах, у тым ліку асноўных сродках і нематэрыяльных актывах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца:

непасрэдна для мэт ажыццяўлення дзейнасці, указанай у частцы першай гэтага падпункта, – прымаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць прамым падлікам;

адначасова для мэт ажыццяўлення дзейнасці, указанай у частцы першай гэтага падпункта, і для мэт вытворчасці і (ці) рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, абароты па рэалізацыі якіх прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, – сумы падатку на дабаўленую вартасць размяркоўваюцца нарастаючым вынікам паміж указанымі відамі дзейнасці прапарцыянальна выручцы (даходу), атрыманай па

адпаведнай дзейнасці, ці іншаму крытэрыю размеркавання, які вызначаецца плацельшчыкам згодна з уліковай палітыкай арганізацыі (рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка);

24.12. падлеглыя перадачы заказчыкам (забудоўшчыкам) трэцім асобам (у тым ліку дольшчыкам) у адпаведнасці з пунктам 12 артыкула 130 гэтага Кодэкса.

Пры вядзенні будаўніцтва да прыцягнення трэцяй асобы (у тым ліку дольшчыка) сумы падатку на дабаўленую вартасць, раней прынятыя да выліку заказчыкам (забудоўшчыкам) па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія не з'яўляюцца ўкладаннямі ў доўгатэрміновыя актывы заказчыка (забудоўшчыка), падлягаюць аднаўленню заказчыкам (забудоўшчыкам) на дату заключэння дагавору з трэцяй асобай (у тым ліку дольшчыкам);

24.13. па таварах (працах, паслугах), уключаючы асноўныя сродкі і нематэрыяльныя актывы, маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

24.14. у індывідуальных прадпрымальнікаў, якія перасталі прызнавацца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і не прынятыя да выліку ў справаздачным перыядзе, у якім яны прызнаваліся плацельшчыкамі. Указаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць адносяцца на павелічэнне кошту набытых (увезеных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

24.15. па таварах у выпадку іх пашкоджання, страты, за выключэннем:

пашкоджання, страты тавараў у сувязі з надзвычайнымі акалічнасцямі: пажар, аварыя, стыхійнае бедства, дарожна-транспартнае здарэнне;

падзяжу (гібелі) жывёл з-за ўзнікнення заразнай (небяспечнай) хваробы жывёл, пры якой устанаўліваецца каранцін у парадку, установленым заканадаўствам;

пашкоджання, страты асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў.

Для мэт прымянення гэтага падпункта пад:

пашкоджаннем тавару разумеецца пагаршэнне ўсіх ці асобных якасцей (уласцівасцей) тавару, у выніку якога гэты тавар не можа быць выкарыстаны для мэт рэалізацыі і (ці) у вытворчасці прадукцыі (выкананні прац, аказанні паслуг);

стратай тавару разумеецца страта (у тым ліку недастача, раскраданне, бой) тавару пры яго трыманні, транспарціроўцы і (ці) рэалізацыі, у тым ліку звыш нормаў натуральнага змяншэння (страт, бою), устаноўленых заканадаўствам, а пры іх адсутнасці – звыш нормаў, устаноўленых кіраўніком па ўзгадненні з уласнікам, агульным сходам удзельнікаў, членаў спажывецкага таварыства, упаўнаважаных ці асобай, імі ўпаўнаважанай. Пры адсутнасці ўстаноўленых нормаў такія страты тавару прызнаюцца звышнарматыўнымі.

Падатковыя вылікі плацельшчыка падлягаюць змяншэнню на сумы падатку на дабаўленую вартасць, прынятыя ім раней да выліку па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта.

Падатковыя вылікі плацельшчыка падлягаюць змяншэнню на падатковыя вылікі, роўныя 20 працэнтам ад кошту ўказаных у частцы першай гэтага падпункта тавараў, пры немагчымасці:

вызначэння памеру раней прынятай да выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць;

выяўленні факта здзяйснення аперацый, указаных у частцы шостай гэтага падпункта.

Змяншэнне падатковых вылікаў праводзіцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім адбыліся пашкоджанне, страта тавараў. Дата пашкоджання, страты тавараў вызначаецца як дата складання дакумента, які пацвярджае пашкоджанне, страту тавараў. Калі пашкоджанне, страта тавараў выяўлены пры правядзенні інвентарызацыі, то змяншэнне падатковых вылікаў праводзіцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім выніка інвентарызацыі падлягаюць адлюстраванню ва ўліку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Падатковыя вылікі плацельшчыка не падлягаюць змяншэнню ў выпадку:

аднясення сум падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленых пры набыцці або заплачаных пры ўвозе ўказаных у частцы першай гэтага падпункта тавараў, на павелічэнне іх

кошту ці за кошт бязвыплатна атрыманых сродкаў бюджэту (бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў);

уключэння сум падатку на дабаўленую вартасць па ўказаных у частцы першай гэтага падпункта таварах у затраты плацельшчыка, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

набыцця (стварэння) указаных у частцы першай гэтага падпункта тавараў, пры якім сумы падатку на дабаўленую вартасць не прад'яўляліся плацельшчыку прадаўцамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці не выплачваліся плацельшчыкам пры ўвозе тавараў;

24.16. прад'яўленыя пакупніку пры набыцці або заплачаныя ім пры ўвозе:

тавараў, падатковая база пры рэалізацыі якіх вызначаецца пакупніком як станоўчая розніца паміж цаной рэалізацыі і цаной набыцця гэтых тавараў;

маёмасных правоў, падатковая база пры перадачы якіх вызначаецца як станоўчая розніца паміж коштам, па якім перадаюцца маёмасныя правы з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і расходамі на іх набыццё з улікам падатку на дабаўленую вартасць.

25. Падатковыя вылікі, якія падлягаюць перадачы атрымальніку пры перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вызначаюцца ў наступным парадку:

25.1. фактычныя сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія перадаюцца, або заплачаныя пры ўвозе тавараў, якія перадаюцца, ці фактычна прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, выкарыстаных пры вытворчасці (стварэнні, выкананні, аказанні) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія перадаюцца:

25.1.1. могуць перадавацца пры перадачы ў межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў іх атрымальніку.

Пры перадачы ў межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры якой у адпаведнасці з часткай другой падпункта 2.9 пункта 2 артыкула 115 гэтага Кодэкса праводзяцца вылічэнне і выплата падатку на дабаўленую вартасць (прымяняецца вызваленне ад падаткаабкладання), перадача падатковых вылікаў атрымальніку тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў не праводзіцца;

25.1.2. перадаюцца пры перадачы ў рамках дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці):

тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у якасці ўкладу ўдзельніка дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці) у агульную справу (за выключэннем тавараў, якія адчужаюцца па ўмовах указанага дагавору іншаму ўдзельніку);

тавараў пры падзеле тавараў, якія знаходзіліся ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці);

расходаў, якія кампенсуюцца ўдзельніку ў адпаведнасці з дагаворам простай суполкі асобай, якая ажыццяўляе вядзенне агульных спраў;

25.2. пры немагчымасці вызначэння фактычна прад'яўленых пры набыцці (заплачаных пры ўвозе) сум падатку на дабаўленую вартасць па аперацыях, прадугледжаных падпунктам 25.1 гэтага пункта, або пры перадачы тавараў, сумы падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе якіх яшчэ не аплачаны, перадаюцца (а ў выпадку, прадугледжаным падпунктам 25.1.1 гэтага пункта, могуць перадавацца) падатковыя вылікі, роўныя 20 працэнтам ад кошту тавараў, якія перадаюцца (прац, якія выконваюцца, паслуг, якія аказваюцца), маёмасных правоў.

У гэтым выпадку на суму, указаную ў частцы першай гэтага падпункта, у боку, які перадае, памяншаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

25.3. перадача падатковых вылікаў у межах адной юрыдычнай асобы, якая праводзіцца ў адпаведнасці з падпунктамі 25.1.1 і 25.2 гэтага пункта, павінна быць ажыццёўлена ў тым жа справаздачным перыядзе, у якім была ажыццёўлена перадача тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь;

25.4. пры спыненні дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці) перадачы ўдзельнікам (удзельніку) гэтай суполкі падлягаюць сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і

не прынятыя да выліку да спынення дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці);

25.5. пры прыняцці юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь рашэння аб ліквідацыі свайго філіяла, які выконвае падатковыя абавязкі гэтай юрыдычнай асобы, а таксама пры ўзнікненні акалічнасці, у сувязі з якой спыняецца абавязак філіяла юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь па выкананні падатковых абавязацельстваў гэтай юрыдычнай асобы, перадачы філіялам у межах адной юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь падлягаюць сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і не прынятыя да выліку адпаведна да яго ліквідацыі (узнікнення такой акалічнасці);

25.6. пры рэарганізацыі арганізацыі перадачы правапераемніку (правапераемнікам) такой арганізацыі ў адпаведнасці з перадатачным актам ці раздзяляльным балансам падлягаюць сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і не прынятыя да выліку да рэарганізацыі арганізацыі;

25.7. падатковыя вылікі юрыдычных асоб, якія ўваходзяць у зводны баланс асноўнай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка», падлягаюць перадачы дзяржаўнаму аб'яднанню «Беларуская чыгунка» для ўключэння ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць па перавозках і вызначаюцца ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

26. Плацельшчыкі маюць права самастойна вылучыць для выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць:

26.1. пры набыцці тавараў па фіксаваных рознічных цэнах плацельшчыкамі:

якія выкарыстоўваюць гэтыя тавары ў вытворчасці і рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

якія вылічваюць падатак на дабаўленую вартасць з улікам асаблівасцей, устаноўленых пунктам 5 артыкула 128 гэтага Кодэкса.

Самастойнае вылучэнне для выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца:

на падставе падпісанага электронным лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры;

зыходзячы з цаны набыцця тавараў па фіксаваных рознічных цэнах і стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, якая прымяняецца пры іх рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

26.2. пры адмове плацельшчыка ад вызвалення ад падаткаабкладання абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або пры адмене раней устаноўленага вызвалення ад падаткаабкладання.

Вылучэнне сумы падатку на дабаўленую вартасць для выліку ажыццяўляецца з астаткаў тавараў (за выключэннем асноўных сродкаў), якія ёсць на дату адмовы ад вызвалення ад падаткаабкладання або на дату адмены раней устаноўленага вызвалення ад падаткаабкладання:

на падставе падпісанага электронным лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры;

шляхам самастойнага вылучэння для выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленых пры набыцці або заплачаных пры ўвозе гэтых тавараў і аднесеных на павелічэнне іх кошту ці ўключаных у затраты плацельшчыка, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія прызнаюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, маюць права з кошту астаткаў тавараў (за выключэннем асноўных сродкаў), якія ёсць на 1-е чысло месяца, з якога яны прызнаюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, на падставе падпісанага электронным лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры вылучыць па даных інвентарызацыі тавараў сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя пры набыцці або заплачаныя пры ўвозе гэтых тавараў, з адлюстраваннем гэтых сум ва ўліку даходаў і расходаў індывідуальнага прадпрымальніка;

26.3. пры пераходзе з асаблівага рэжыму падаткаабкладання без вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць на агульны парадак падаткаабкладання ці на асаблівы рэжым падаткаабкладання з вылічэннем і выплатай падатку на дабаўленую вартасць.

Вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць для выліку ажыццяўляецца з астаткаў тавараў (за выключэннем асноўных сродкаў), якія ёсць на дату пераходу:

на падставе падпісанага электронным лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры;

шляхам самастойнага вылучэння для выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленых пры набыцці або заплачаных пры ўвозе гэтых тавараў і аднесеных на павелічэнне іх кошту;

26.4. пры рэалізацыі арганізацыямі, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (у тым ліку замежнымі арганізацыямі і акрэдытаванымі ва ўстаноўленым парадку прадстаўніцтвамі замежных арганізацый), набытых (увезеных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх сума падатку на дабаўленую вартасць была аднесена на павелічэнне іх кошту ў адпаведнасці з пунктам 12 артыкула 132 гэтага Кодэкса.

Вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць указанымі арганізацыямі ажыццяўляецца:

на падставе падпісанага электронным лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры;

разліковым шляхам зыходзячы з цаны набыцця тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і астаткавага кошту асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў з улікам падатку на дабаўленую вартасць і стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, якая прымянялася пры іх набыцці (увозе).

Вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца, калі пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ажыццяўляецца вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць па стаўках, установленых пунктамі 2 і 3 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

Вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць не праводзіцца, калі ўказаныя арганізацыі рэалізуюць тавары, набытыя імі ў прадаўцоў, якія вызначылі падатковую базу пры рэалізацыі гэтых тавараў як станоўчую розніцу паміж цаной рэалізацыі і цаной іх набыцця;

26.5. калі ім даручана рэалізацыя маёмасці, адчужанай у выніку рэквізіцыі, канфіскацыі, па судовай пастанове ў парадку спагнання падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў, штрафаў за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў і (ці) злачынстваў шляхам накіравання спагнання на маёмасць па абавязацельствах уласніка, – пры набыцці гэтай маёмасці для ўласных патрэб.

Самастойнае вылучэнне сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца па той падатковай стаўцы, па якой абкладаецца рэалізацыя такой маёмасці.

27. Вылік сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца ў поўным аб'ёме:

27.1. па таварах (працах, паслугах), пры рэалізацыі якіх падаткаабкладанне падаткам на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў, – пры наяўнасці ў плацельшчыка (у выпадках, установленых падпунктам 1.11 пункта 1, пунктам 5 артыкула 122, артыкуламі 123–126 гэтага Кодэкса, – пры падачы плацельшчыкам у падатковы орган па месцу пастаноўкі на ўлік) дакументаў, прадугледжаных падпунктам 1.11 пункта 1, пунктам 5 артыкула 122, артыкуламі 123–126 гэтага Кодэкса;

27.2. па таварах, пры рэалізацыі якіх падаткаабкладанне падаткам на дабаўленую вартасць ажыццяўляецца па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў;

27.3. у плацельшчыкаў, якія знаходзяцца ў працэсе ліквідацыі (спынення дзейнасці – для індывідуальных прадпрымальнікаў), працэдуры ліквідацыйнага вядзення – для плацельшчыка, прызнанага ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь эканамічна неплацежаздольным (банкрутам);

27.4. у замежных арганізацый:

якія ажыццяўляюць дзейнасць праз пастаяннае прадстаўніцтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – пры спыненні такой дзейнасці;

якія адкрылі прадстаўніцтва ў парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, – пры спыненні дзейнасці такога прадстаўніцтва;

якія знаходзяцца на ўліку ў падатковым органе Рэспублікі Беларусь у сувязі з набыццём права ўласнасці, іншых правоў на нерухомую маёмасць, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – пасля адчужэння ўсіх такіх аб'ектаў нерухомай маёмасці;

27.5. па таварах, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 1.44 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса;

27.6. па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, па якіх на пачатак падатковага перыяду ёсць сумы падатку на дабаўленую вартасць, не прынятыя да выліку ў мінулым падатковым перыядзе, калі такія сумы падатку на дабаўленую вартасць у бягучым падатковым перыядзе прымаюцца да выліку роўнымі долямі ў кожным справаздачным перыядзе па адной дванаццатай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны месяц) ці па адной чацвёртай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны квартал) згодна з пунктам 8 артыкула 134 гэтага Кодэкса;

27.7. па таварах, адгружаных пакупнікам – замежным арганізацыям і (ці) фізічным асобам з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежных дзяржаў і (ці) з выставак-кірмашоў, якія праводзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаў, калі адначасова выконваюцца наступныя ўмовы:

такія тавары былі вывезены з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту;

дагаворы заключаны плацельшчыкам з пакупнікамі – замежнымі арганізацыямі і (ці) фізічнымі асобамі пасля вывазу тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Умовай ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка:

дагавора, які прадугледжвае захоўванне тавараў на тэрыторыі замежнай дзяржавы і (ці) удзел тавараў у выстаўках-кірмашах, што праводзяцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы, і заключаны плацельшчыкам з замежнай арганізацыяй ці замежнай фізічнай асобай (падаткаплацельшчыкамі замежнай дзяржавы), якія аказваюць паслугі па захоўванні тавараў і (ці) арганізацыі ўдзелу плацельшчыка ў выстаўцы-кірмашы;

мытнай дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту;

мытнай дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай часовага вывазу (калі тавары, вывезеныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту, спачатку былі змешчаны пад мытную працэдуру часовага вывазу);

дагавора плацельшчыка з пакупніком – замежнай арганізацыяй і (ці) замежнай фізічнай асобай, на падставе якога рэалізуецца тавар плацельшчыка, які адгружаецца з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежнай дзяржавы ці з выстаўкі-кірмашу, што праводзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы;

дакументаў, якія пацвярджаюць водпуск (адгрузку) тавараў плацельшчыка пакупніку – замежнай арганізацыі і (ці) замежнай фізічнай асобе з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежнай дзяржавы ці з выстаўкі-кірмашу, што праводзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы;

таварнай накладной, выпісанай плацельшчыкам на адрас пакупніка – замежнай арганізацыі і (ці) замежнай фізічнай асобы.

Для пацвярджэння абгрунтаванасці ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы яго пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць наступныя дакументы:

спецыяльны рэестр мытных дэкларацый на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту, з адзнакай мытнага органа Рэспублікі Беларусь «Тавар вывезены» і датай пастаўлення такой адзнакі, засведчаны асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа Рэспублікі Беларусь (падаецца плацельшчыкам, які ажыццяўляе дэклараванне мытным органам тавараў у пісьмовай форме);

рэестр дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў за межы Рэспублікі Беларусь і іх рэалізацыю з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежных дзяржаў і (ці) з выставак-кірмашоў, якія праводзяцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы, па ўстаноўленай форме. Указаны рэестр запаўняецца ва ўстаноўленым парадку.

Абароты па рэалізацыі тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, у мэтах размеркавання агульнай сумы падатковых вылікаў згодна з артыкулам 134 гэтага Кодэкса

падлягаюць адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць.

Днём адгрузкі тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, прызнаецца дата водпуску (адгрузкі) тавараў плацельшчыка пакупніку з месцаў захоўвання, з выстаўкі-кірмашу на тэрыторыі замежных дзяржаў;

27.8. па таварах, адгружаных пакупнікам, якія з'яўляюцца падаткаплацельшчыкамі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, з месцаў захоўвання на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, з выставак-кірмашоў, якія праводзяцца на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, калі адначасова выконваюцца наступныя ўмовы:

такія тавары былі вывезены з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у мэтах іх наступнай рэалізацыі (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь);

дагаворы заключаны плацельшчыкам з пакупнікамі, якія з'яўляюцца падаткаплацельшчыкам дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, пасля вывазу тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Умовай ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка:

дагавора, які прадугледжвае захоўванне тавараў на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза і (ці) удзел тавараў у выстаўках-кірмашах, што праводзяцца на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, і заключаны плацельшчыкам з падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, які аказвае паслугу па захоўванні тавараў і (ці) паслугу па арганізацыі ўдзелу плацельшчыка ў выстаўцы-кірмашы;

транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

дагавора плацельшчыка з пакупніком, які з'яўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на падставе якога рэалізуецца тавар плацельшчыка, які адгружаецца з месцаў захоўвання на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза ці з выстаўкі-кірмашу, што праводзіцца на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

дакументаў, якія пацвярджаюць водпуск (адгрузку) тавараў плацельшчыка пакупніку, які з'яўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, з месцаў захоўвання на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза ці з выстаўкі-кірмашу, што праводзіцца на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

таварнай накладной, выпісанай плацельшчыкам на адрас пакупніка, які з'яўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

заявы аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, складзенай па форме, зацверджанай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, з адзнакай падатковага органа дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на тэрыторыю якой увезены тавары, аб выплаце ўскосных падаткаў (вызваленні ад падаткаабкладання ці іншым парадку выканання падатковых абавязацельстваў) (далей у гэтым падпункце – заява аб увозе тавараў), або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў.

Для пацвярджэння абгрунтаванасці ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі яго на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць:

заяву аб увозе тавараў або пералік заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў;

рэестр дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў за межы Рэспублікі Беларусь і іх рэалізацыю з месцаў захоўвання, з выставак-кірмашоў на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза па ўстаноўленай форме. Указаны рэестр запаўняецца ва ўстаноўленым парадку.

Дакументальнае пацвярджэнне абгрунтаванасці выліку сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме па таварах, указаных у частцы першай гэтага падпункта, праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты водпуску (адгрузкі) тавараў пакупніку, які з'яўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, з месцаў захоўвання на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза ці з выстаўкі-кірмашу, што праводзіцца на тэрыторыі дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза.

Абароты па рэалізацыі тавараў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, у мэтах размеркавання агульнай сумы падатковых вылікаў згодна з артыкулам 134 гэтага Кодэкса падлягаюць адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць у наступным парадку.

Пры адсутнасці дакументаў, якія абгрунтоўваюць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме, і надыходзе даты падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць на працягу ўстаноўленага тэрміну абароты па рэалізацыі тавараў не адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць.

Пры наяўнасці дакументаў, якія абгрунтоўваюць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме, абароты па рэалізацыі тавараў адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведных дакументаў, або таго справаздачнага перыяду, у якім атрыманы адпаведныя дакументы.

Пры адсутнасці дакументаў, якія абгрунтоўваюць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць у поўным аб'ёме, да падачы ў падатковы орган падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, у якім скончыўся тэрмін, устаноўлены часткай чацвёртай гэтага падпункта, абароты па рэалізацыі тавараў адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, у якім скончыўся тэрмін, устаноўлены часткай чацвёртай гэтага падпункта, з уключэннем сум падатку на дабаўленую вартасць у затраты плацельшчыка, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

Пры атрыманні дакументаў пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага часткай чацвёртай гэтага падпункта, і пасля адлюстравання абаротаў па рэалізацыі тавараў у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць вылік сум падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца ў поўным аб'ёме ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго справаздачнага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем дакументаў, або таго справаздачнага перыяду, у якім атрыманы дакументы.

28. Пры змяненні парадку прымянення падатковых вылікаў новы парадак вылікаў дзейнічае ў адносінах да:

тавараў, апрыходаваных з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў;

тавараў, увезеных з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў. Дата ўвозу вызначаецца па даце выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

тавараў, набытых у дзяржавах – членах Еўразійскага эканамічнага саюза, з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў. Дата набыцця вызначаецца па даце прыняцця на ўлік тавараў;

прац і паслуг, атрыманых з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў;

маёмасных правоў, атрыманых з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў;

тавараў, указаных у падпункце 24.15 пункта 24 гэтага артыкула, сапсаваных, страчаных з моманту змянення парадку прымянення падатковых вылікаў. Дата пашкоджання, страты ўказаных тавараў вызначаецца па даце складання дакумента, які пацвярджае пашкоджанне, страту тавараў.

**Артыкул 134. Парадак вызначэння сум падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца на пэўную суму абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Метады размеркавання падатковых вылікаў**

1. Пры рэалізацыі плацельшчыкам тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, падатковыя вылікі па якіх праводзяцца ў розным парадку, размеркаванне агульнай сумы падатковых вылікаў паміж гэтымі абаротамі праводзіцца двума метадамі (метадам удзельнай вагі ці метадам раздзельнага ўліку), калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой.

2. Прымяненне аднаго з двух метадаў размеркавання падатковых вылікаў у адносінах да падатковых вылікаў па вызначаных плацельшчыкам відах дзейнасці (аперацыях) (метаду ўдзельнай вагі ці метаду раздзельнага ўліку) праводзіцца як мінімум на працягу аднаго каляндарнага года і зацвярджаецца ўліковай палітыкай арганізацыі (рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка).

Пры адсутнасці ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка) указання аб метадзе размеркавання падатковых вылікаў, які прымяняецца, усе падатковыя вылікі размяркоўваюцца метадам удзельнай вагі.

У выпадку вядзення плацельшчыкам кнігі пакупак у размеркаванні ўдзельнічаюць сумы падатку на дабаўленую вартасць, адлюстраваныя ў кнізе пакупак.

3. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца метадам удзельнай вагі на пэўную суму абароту па рэалізацыі, вызначаюцца нарастаючым вынікам з пачатку года па наступнай формуле:

| | |
|---|---|
| $ПДВ_{аб/пэўн} = ПДВ_{выл}$ x | $Аб_{пэўн}$, |
| | $Аб_{аг}$ |

дзе: $ПДВ_{аб/пэўн}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць, якая адносіцца метадам удзельнай вагі на пэўную суму абароту па рэалізацыі;

$ПДВ_{выл}$ – агульная сума падатковых вылікаў з улікам праведзеных карэкціровак. Для мэт пункта 3 артыкула 133 гэтага Кодэкса з агульнай сумы падатковых вылікаў выключаюцца сумы падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах;

$Аб_{пэўн}$ – пэўная сума абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

$АБ_{аг}$ – агульная сума абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Працэнт удзельнай вагі разлічваецца з дакладнасцю не меншай чым чатыры знакі пасля коскі.

Сумай абароту прызнаюцца сума падатковай базы і падатку на дабаўленую вартасць, вылічанага ад гэтай падатковай базы, а таксама сума павелічэння (змяншэння) падатковай базы.

У агульную суму абароту не ўключаюцца аперацыі па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў арганізацыямі (філіяламі юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь), зарэгістраванымі ў якасці плацельшчыкаў падаткаў замежнай дзяржавы.

4. Для мэт пункта 3 гэтага артыкула пры вызначэнні працэнта ўдзельнай вагі, які прымаецца для размеркавання падатковых вылікаў метадам удзельнай вагі:

4.1. у суму абароту ўключаюцца:

4.1.1. аперацыі па рэалізацыі тавараў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь (уключаючы аперацыі па рэалізацыі тавараў насельніцтву на выстаўках-кірмашах, якія праводзяцца на тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза);

4.1.2. для мэт пункта 15 артыкула 133 гэтага Кодэкса – аперацыі па бязвыплатнай перадачы тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не прызнаюцца рэалізацыяй ці аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

4.2. з сумы абароту выключаюцца падатковая база і сума падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, набытых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у замежных арганізацый, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь;

4.3. у суму абароту не ўключаюцца:

4.3.1. аперацыі па рэалізацыі тавараў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, пры ўмове, што гэтыя тавары набыты на тэрыторыі замежнай дзяржавы і пры іх рэалізацыі не праведзена вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць у бюджэт Рэспублікі Беларусь;

4.3.2. аперацыі па рэалізацыі прац (паслуг), маёмасных правоў, месцам рэалізацыі якіх не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі па такіх аперацыях плацельшчыкам не праведзена вылічэнне падатку на дабаўленую вартасць у бюджэт Рэспублікі Беларусь.

5. Сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўках у памеры нуль (0) працэнтаў і (ці) дзесяць (10) працэнтаў, вызначаецца нарастаючым вынікам з пачатку года па наступных формулах:

$ПДВ_{ас/0} = ПДВ_{ас} \times Аб_{0} / Аб_{аг}$;

$ПДВ_{ас/10} = ПДВ_{ас} \times Аб_{10} / Аб_{аг}$,

дзе: $ПДВ_{ас/0}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў;

$ПДВ_{ас/10}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў;

$ПДВ_{ас}$ – сумы падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах;

$Аб_{0}$ – абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў;

$Аб_{10}$ – абароты па рэалізацыі тавараў, якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў;

$Аб_{аг}$ – агульная сума абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Агульная сума абароту і працэнт удзельнай вагі вызначаюцца ў парадку, устаноўленым пунктамі 3 і 4 гэтага артыкула.

6. Сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх дадзены падатковы крэдыт і (ці) вызваленне ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць, вызначаецца нарастаючым вынікам з пачатку года па наступных формулах:

$ПДВ_{ас/кр} = ПДВ_{ас} \times Аб_{кр} / Аб_{аг}$;

$ПДВ_{ас/выпл} = ПДВ_{ас} \times Аб_{выпл} / Аб_{аг}$,

дзе: $ПДВ_{ас/кр}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх дадзены падатковы крэдыт;

$ПДВ_{ас/выпл}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх дадзена вызваленне ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць;

$ПДВ_{ас}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах;

$Аб_{кр}$ – абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх дадзены падатковы крэдыт;

$Аб_{выпл}$ – абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх дадзена вызваленне ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць;

$Аб_{аг}$ – агульная сума абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Агульная сума абароту і працэнт удзельнай вагі вызначаюцца ў парадку, устаноўленым пунктамі 3 і 4 гэтага артыкула.

7. Пры размеркаванні падатковых вылікаў метадам удзельнай вагі ў размеркаванні не ўдзельнічаюць падатковыя вылікі мінулага падатковага перыяду, калі гэта прадугледжана ўліковай палітыкай арганізацыі (рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка).

У іншым выпадку падатковыя вылікі мінулага падатковага перыяду падлягаюць размеркаванню метадам удзельнай вагі ў парадку, устаноўленым гэтай главой.

Палажэнні гэтага пункта не прымяняюцца ў адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць мінулага падатковага перыяду, якія размяркоўваліся ў мінулым падатковым перыядзе метадам раздзельнага ўліку.

8. Падатковыя вылікі мінулага падатковага перыяду па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах плацельшчык мае права ў бягучым падатковым перыядзе:

або размеркаваць у парадку, вызначаным пунктамі 3, 5 і 6 гэтага артыкула (пры наяўнасці абаротаў па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вылік па якіх праводзіцца ў розным парадку);

або прыняць да выліку роўнымі долямі ў кожным справаздачным перыядзе па адной дванаццатай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны месяц) ці па адной чацвёртай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны квартал). Выбраны плацельшчыкам парадак выліку роўнымі долямі адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка) і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

9. Сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца метадам раздзельнага ўліку на вызначаныя плацельшчыкам віды дзейнасці (аперацыі па рэалізацыі), вызначаюцца ў залежнасці ад напрамкаў выкарыстання набытых (увезеных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў для мэт вызначаных абаротаў па рэалізацыі, якія абкладаюцца ў розным парадку пры ажыццяўленні вызначаных плацельшчыкам відаў дзейнасці (аперацый па рэалізацыі).

Вызначэнне падатковых вылікаў метадам раздзельнага ўліку прадугледжвае наяўнасць на рахунках бухгалтарскага ўліку (ва ўліку даходаў і расходаў індывідуальнага прадпрымальніка, у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання) і ў кнізе пакупак, калі яе вядзенне ажыццяўляецца плацельшчыкам, інфармацыі аб сумах падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх указаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць у аднолькавым парадку:

або прымаюцца да выліку ў межах сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

або прымаюцца да выліку ў поўным аб'ёме незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

або ўключаюцца ў затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

або адносяцца на павелічэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

10. Пры размеркаванні сум падатку на дабаўленую вартасць метадам раздзельнага ўліку:

10.1. сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку (або ў межах вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць, або ў поўным аб'ёме незалежна ад вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць) у памеры сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая прызнаецца падатковым вылікам і ўлічана асобна, па набытых (увезеных) таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца (прызначаны для выкарыстання) для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку (або ў межах падлічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць, або ў поўным аб'ёме незалежна ад вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць).

Для мэт гэтага падпункта, калі іншае не ўстаноўлена актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дапускаецца ўнутры аднаго віду дзейнасці размеркаванне метадам удзельнай вагі сум падатку на дабаўленую вартасць, якія прызнаюцца падатковымі вылікамі і ўлічаны асобна, паміж абаротамі па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку ў межах вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць, і абаротамі па рэалізацыі, па

якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку ў поўным аб'ёме незалежна ад вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць.

Пры змяненні напрамку выкарыстання (прызначэння для выкарыстання) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў не для мэт абаротаў па рэалізацыі, сумы падатку на дабаўленую вартасць па якіх прымаюцца да выліку, праводзіцца прамым падлікам адпаведная карэкціроўка сум падатку на дабаўленую вартасць для мэт іншага абароту па рэалізацыі, сумы падатку на дабаўленую вартасць па якім выліку не падлягаюць;

10.2. сумы падатку на дабаўленую вартасць уключаюцца ў выдаткі, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні (адносяцца на павелічэнне кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў), у памеры сумы падатку на дабаўленую вартасць, не падлеглай выліку і ўлічанай асобна, па набытых (увезеных) таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца (прызначаны для выкарыстання) для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць.

Пры змяненні напрамку выкарыстання (прызначэння для выкарыстання) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў не для мэт абаротаў па рэалізацыі, сумы падатку на дабаўленую вартасць па якіх выліку не падлягаюць, праводзіцца прамым падлікам адпаведная карэкціроўка сум падатку на дабаўленую вартасць для мэт іншага абароту па рэалізацыі, сумы падатку на дабаўленую вартасць па якім прымаюцца да выліку.

Для мэт гэтага падпункта дапускаецца ўнутры аднаго віду дзейнасці размеркаванне метадам удзельнай вагі сум падатку на дабаўленую вартасць, якія прызнаюцца падатковымі вылікамі і ўлічаны асобна, паміж абаротамі па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку, і абаротамі па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць;

10.3. улічаныя асобна сумы падатку на дабаўленую вартасць па набытых (увезеных) таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія выкарыстоўваюцца (прызначаны для выкарыстання) адначасова для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць, і для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку, размяркоўваюцца паміж указанымі абаротамі па рэалізацыі па наступных формулах:

$$ПДВ_{аб/затр} = ПДВ_{выл} \times \frac{Аб_{затр}}{Аб_{аг}};$$

$$ПДВ_{аб/выл} = ПДВ_{выл} - ПДВ_{аб/затр},$$

дзе: $ПДВ_{аб/затр}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць і ўключаюцца ў затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

$ПДВ_{выл}$ – сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія прызнаюцца падатковымі вылікамі і ўлічаны асобна, па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах:

якія выкарыстоўваюцца адначасова для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць, і для мэт абаротаў па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку;

напрамак выкарыстання якіх пры іх набыцці (апрыходаванні) яшчэ невядомы;

$Аб_{затр}$ – абароты па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць выліку не падлягаюць і ўключаюцца ў затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

$Аб_{аг}$ – агульная сума абароту па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якая складаецца з сум абаротаў, паміж якімі праводзіцца размеркаванне падатковых вылікаў;

$ПДВ_{аб/выл}$ – сума падатку на дабаўленую вартасць, якая адносіцца на абароты па рэалізацыі, па якіх сумы падатку на дабаўленую вартасць прымаюцца да выліку.

11. Заказчыкі (забудоўшчыкі) пры вядзенні будаўніцтва аб'ектаў нерухомасці, якія ўключаюць у тым ліку аб'екты, што вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у

адпаведнасці з заканадаўствам (далей у гэтым пункце – аб'екты нерухомасці), у інтарэсах дольшчыкаў сумы падатку на дабаўленую вартасць па падлеглых перадачы дольшчыкам фактычных затратах па будаўніцтве ў частцы набытых (увезеных) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў улічваюць метадам раздзельнага ўліку з улікам наступных асаблівасцей.

Сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца на падлеглыя перадачы дольшчыку затраты на будаўніцтва аб'екта нерухомасці, улічваюцца асобна ў памеры сумы падатку на дабаўленую вартасць па набытых (увезеных) таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія прама выкарыстоўваюцца (прама прызначаны для выкарыстання) на будаўніцтва аб'ектаў нерухомасці.

Сумы падатку на дабаўленую вартасць па набытых (увезеных) таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, што выкарыстоўваюцца (прызначаны для выкарыстання) на будаўніцтва памяшканняў аб'екта нерухомасці, затраты на якія падлягаюць перадачы дольшчыкам, вызначаюцца зыходзячы з долі плошчы такіх памяшканняў у агульнай плошчы аб'екта нерухомасці па праектна-каштарыснай дакументацыі. Пры гэтым працэнт указанай долі вызначаецца нарастаючым вынікам за ўвесь перыяд будаўніцтва да моманту прыёмкі аб'екта нерухомасці ў эксплуатацыю і разлічваецца з дакладнасцю не меншай за чатыры знакі пасля коскі.

Сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), выкарыстаных для будаўніцтва аб'ектаў нерухомасці ў інтарэсах дольшчыкаў, у частцы затрат па праведзеных (выкананых, аказаных) таварах (працах, паслугах) уласнымі сіламі, заказчыкі (забудоўшчыкі) маюць права ўлічваць метадам раздзельнага ўліку за ўвесь перыяд будаўніцтва да моманту прыёмкі аб'екта нерухомасці ў эксплуатацыю ў аналагічным парадку, устаноўленым гэтым пунктам, пры ўказанні выбранага метаду ва ўліковай палітыцы арганізацыі (рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка).

Пры змяненні паказчыкаў праектна-каштарыснай дакументацыі аб долі плошчаў, іх прызначэнні і (ці) пры змяненні плошчаў памяшканняў аб'екта нерухомасці, затраты на якія падлягаюць перадачы дольшчыкам, праводзіцца адпаведная карэкціроўка ўлічаных асобна па аб'екце нерухомасці (па плошчах аб'ектаў нерухомасці) сум падатку на дабаўленую вартасць у мэтах вызначэння сум падатку на дабаўленую вартасць, не падлеглых выліку.

12. Метадам раздзельнага ўліку падлягаюць размеркаванню:

правапераемнікам сумы падатку на дабаўленую вартасць, атрыманыя ім ад рэарганізаванай арганізацыі ў адпаведнасці з перадатачным актам ці раздзяляльным балансам пры рэарганізацыі арганізацыі;

сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, пры пакрыцці кошту якіх плацельшчыкам праводзіцца падаткаабкладанне ў адпаведнасці з падпунктамі 9.3 і (ці) 9.4 пункта 9 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 135. Сума падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выплаце ў бюджэт

1. Сума падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выплаце ў бюджэт, вызначаецца як розніца паміж агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, падлічанай па выніках справаздачнага перыяду, і сумамі падатковых вылікаў.

2. Сумы падатку на дабаўленую вартасць аднімаюцца плацельшчыкамі з вылічанай сумы падатку на дабаўленую вартасць у наступнай чарговасці:

у першую чаргу – сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, за выключэннем асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, якія падлягаюць выліку ў межах сум падатку на дабаўленую вартасць, вылічаных па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

у другую чаргу – сумы падатку на дабаўленую вартасць па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якія падлягаюць выліку ў межах сум падатку на дабаўленую вартасць, вылічаных па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Указаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць аднімаюцца ў суме, якая не перавышае розніцу паміж сумай

падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі, і сумамі падатку на дабаўленую вартасць, якія аднімаюцца ў першую чаргу;

у трэццю чаргу – незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах, якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў;

у чацвёртую чаргу – незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры нуль (0) працэнтаў;

у пятую чаргу – незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах, якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 1.44 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса;

у шостую чаргу – незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы падатку на дабаўленую вартасць мінулага падатковага перыяду па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, калі такія сумы падатку на дабаўленую вартасць у бягучым падатковым перыядзе прымаюцца да выліку роўнымі долямі ў кожным справаздачным перыядзе па адной дванаццатай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны месяц) ці па адной чацвёртай (калі справаздачным перыядам прызнаецца каляндарны квартал) у адпаведнасці з пунктам 8 артыкула 134 гэтага Кодэкса;

у сёмую чаргу – незалежна ад сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы падатку на дабаўленую вартасць па таварах, указаных у частцы першай падпункта 27.7 і (ці) частцы першай падпункта 27.8 пункта 27 артыкула 133 гэтага Кодэкса, пры пацвярджэнні абгрунтаванасці ажыццяўлення выліку ў поўным аб'ёме.

3. Калі сума падатковых вылікаў згодна з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на дабаўленую вартасць:

не перавышае агульную суму падатку на дабаўленую вартасць, вылічаную па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, то атрыманая станоўчая розніца з'яўляецца сумай падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выплаце ў бюджэт;

перавышае агульную суму падатку на дабаўленую вартасць, вылічаную па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, то атрыманая адмоўная розніца падлягае заліку і вяртанню плацельшчыку ў парадку, устаноўленым артыкулам 137 гэтага Кодэкса. Пры гэтым вяртанне розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, праводзіцца без налічэння пені.

**Артыкул 136. Парадак, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і выплаты падатку на дабаўленую вартасць**

1. Плацельшчыкі падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць не пазней за 20-е число месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

2. Выплата падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца не пазней за 22-е число месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

3. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) па перавозках і выплаты падатку на дабаўленую вартасць дзяржаўным аб'яднаннем «Беларуская чыгунка» ўстанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

4. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць па абаротах, якія ўзнікаюць у сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю ў інтарэсах даручальніка ці ўказанай ім асобы (выгаданабытчыка), складаецца і падаецца даверным кіраўніком асобна ад дэкларацыі па іншай дзейнасці, якую ён ажыццяўляе, з улікам асаблівасцей, устаноўленых часткай другой гэтага пункта і артыкулам 40 гэтага Кодэкса.

Пры ажыццяўленні давернага кіравання па некалькіх дагаворах давернага кіравання маёмасцю даверны кіраўнік складае і падае адзіную падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць.

5. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць па абаротах, якія ўзнікаюць у сувязі з дзейнасцю простай суполкі (сумеснай дзейнасці) складаецца і падаецца ўдзельнікам простай суполкі, які выконвае падатковае абавязацельства гэтай суполкі ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 14 гэтага Кодэкса, асобна ад дэкларацыі па іншай дзейнасці, якую яна ажыццяўляе.

6. Замежная арганізацыя, якая знаходзіцца на ўліку ў некалькіх падатковых органах Рэспублікі Беларусь у сувязі з ажыццяўленнем на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзейнасці, якая прызнаецца ў адпаведнасці з артыкулам 180 гэтага Кодэкса дзейнасцю праз пастаяннае прадстаўніцтва, самастойна выбірае пастаяннае прадстаўніцтва, па месцы размяшчэння якога яна будзе ў цэлым па ўсіх аб'ектах падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, якія адносяцца да ўсіх яе пастаянных прадстаўніцтваў, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаваць у падатковы орган падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць.

Аб сваім выбары, указаным у частцы першай гэтага пункта, замежная арганізацыя паведамляе кожнаму падатковаму органу Рэспублікі Беларусь, у якім яна знаходзіцца на ўліку. Паведамленне ажыццяўляецца па ўстаноўленай форме на папяровым носьбіце ці па ўстаноўленых фарматах у выглядзе электроннага дакумента (далей у гэтым пункце – паведамленне) у тэрмін не пазней за дзесяць рабочых дзён з даты падачы ў падатковы орган у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 70 гэтага Кодэкса паведамлення аб ажыццяўленні дзейнасці праз пастаяннае прадстаўніцтва.

Прынятае замежнай арганізацыяй рашэнне аб выбары, указаным у частцы першай гэтага пункта, змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае, за выключэннем выпадкаў:

уключэння ў Дзяржаўны рэестр плацельшчыкаў (іншых абавязаных асоб) другога і наступных яе пастаянных прадстаўніцтваў у Рэспубліцы Беларусь;

спынення замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, па месцы размяшчэння якога ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта ажыццяўлялася падача падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць.

У выпадку, указаным у абзацы другім часткі трэцяй гэтага пункта, новае паведамленне падаецца ў падатковыя органы не пазней за пяць рабочых дзён да надыходу чарговага падатковага перыяду па падатку на дабаўленую вартасць.

У выпадку, указаным у абзацы трэцім часткі трэцяй гэтага пункта, новае паведамленне падаецца ў падатковыя органы не пазней за пяць рабочых дзён да надыходу найбліжэйшага ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць.

**Артыкул 137. Парадак заліку і вяртання розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Розніца паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, вылічаная па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтым артыкуле – сума перавышэння падатку на дабаўленую вартасць), вяртаецца шляхам правядзення заліку і (ці) вяртання ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

Сума перавышэння падатку на дабаўленую вартасць вяртаецца ў беларускіх рублях без налічэння працэнтаў на гэту суму.

2. Рашэнне аб вяртанні (адмове (поўнасцю ці часткова) у вяртанні) розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай падатку на дабаўленую вартасць, вылічанай па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтым артыкуле – рашэнне), прымае падатковы орган па ўстаноўленай форме пры наяўнасці ў падатковым органе падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць не пазней за два рабочыя дні з дня

падачы плацельшчыкам у падатковы орган у пісьмовай форме заявы аб вяртанні сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць (далей – заява аб вяртанні), а пры падачы такой заявы ў электроннай форме – з дня перадачы ў асабісты кабінет плацельшчыка пацвярджэння аб яе прыёме, а пры правядзенні праверкі – не пазней за два рабочыя дні з дня заканчэння праверкі.

Заява аб вяртанні падаецца плацельшчыкам па ўстаноўленай форме.

Падатковы орган мае права па ўласнай ініцыятыве або па ініцыятыве плацельшчыка правесці ва ўстаноўленым парадку выязную праверку абгрунтаванасці вяртання сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, прызначэнне якой ажыццяўляецца не пазней за два рабочыя дні з дня падачы плацельшчыкам заявы аб вяртанні. Тэрмін правядзення такой праверкі не павінен перавышаць пятнаццаць рабочых дзён, а пры наяўнасці ў плацельшчыка ў перыядзе, які правяраецца, абаротаў па рэалізацыі экспартуемых нафтапрадуктаў – пяць рабочых дзён з дня падачы плацельшчыкам заявы аб вяртанні.

3. У выпадку, калі плацельшчык знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі (спынення дзейнасці), рашэнне прымае падатковы орган не пазней за два рабочыя дні з дня заканчэння выязной праверкі. Прызначэнне такой праверкі ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, але не пазней за пятнаццаць рабочых дзён з дня падачы плацельшчыкам заявы аб вяртанні і пры наяўнасці ў падатковым органе падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць, у якой адлюстраваны вылік сум падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктам 27.3 пункта 27 артыкула 133 гэтага Кодэкса.

4. Залік сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца на працягу трыццаці каляндарных дзён, а пры наяўнасці ў плацельшчыка абаротаў па рэалізацыі экспартуемых нафтапрадуктаў у перыядзе, за які ажыццяўляецца вяртанне, – на працягу дзесяці рабочых дзён з дня прыняцця падатковым органам рашэння ў наступнай чарговасці на кошт:

выплаты бягучых плацяжоў па падатках, зборах (пошлінах) і іншых плацяжах у бюджэт, кантроль за якімі ўскладзены на падатковыя органы;

пагашэння запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), іншых плацяжах у бюджэт, кантроль за якімі ўскладзены на падатковыя органы, пенях і накладзеных падатковымі органамі штрафах.

Залік сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца падатковым органам не пазней за тры рабочыя дні з дня, які ідзе следам за днём прыняцця рашэння.

Залік сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць на кошт падатку на дабаўленую вартасць, які падлягае выплаце па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, ажыццяўляецца з выкарыстаннем праграмных і тэхнічных сродкаў без прыняцця рашэння.

Пры наяўнасці ў плацельшчыка ў перыядзе, указаным у абзацы першым часткі першай гэтага пункта, невыкананага падатковага абавязацельства, нявыплаты пеняў, накладзеных падатковымі органамі штрафаў, у тым ліку іншых плацяжоў у бюджэт, кантроль за якімі ўскладзены на падатковыя органы, падатковым органам самастойна праводзіцца залік сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць на працягу трох рабочых дзён з дня, які ідзе следам за днём узнікнення такой запазычанасці.

5. Сума, якая засталася пасля правядзення заліку, праведзенага ў адпаведнасці з пунктам 4 гэтага артыкула, падлягае вяртанню плацельшчыку з бюджэту не пазней за пяць рабочых дзён з дня заканчэння тэрміну, устаноўленага для правядзення такога заліку пры адсутнасці ў плацельшчыка нявыкананага абавязацельства перад рэспубліканскім і (ці) мясцовымі бюджэтамі па бюджэтных пазыках, бюджэтных узычках, працэнтах па бюджэтных узычках, пені, налічанай за нясвоечасовае вяртанне бюджэтных пазык, бюджэтных узычак, па выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, працэнтах і пенях па іх і іншых плацяжах у бюджэт.

Ва ўказаным у частцы першай гэтага пункта перыядзе плацельшчык мае права падаць у падатковы орган заяву аб заліку сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць у кошт выканання падатковага абавязацельства іншай асобы, выплаты налічаных такой асобе пеняў

пры адсутнасці ў плацельшчыка запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), пенях і плацяжах, пералічаных у частцы першай гэтага пункта.

Падатковы орган па ўстаноўленай форме паведамляе плацельшчыку і іншай асобе аб праведзеным заліку або аб адмове ў яго правядзенні не пазней за тры рабочыя дні з дня прыняцця адпаведнага рашэння, прынятага па выніках разгляду яго заявы.

Пры наяўнасці ў плацельшчыка запазычанасці па плацяжах, пералічаных у частцы першай гэтага пункта, Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ці мясцовы фінансавы орган залічвае суму перавышэння падатку на дабаўленую вартасць у кошт выканання нявыкананага абавязацельства ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

6. Рашэнне, прынятае падатковым органам па заяве аб вяртанні ў перыяд правядзення залікаў па папярэдніх рашэннях, прымаецца да выканання пры поўным заліку сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць па папярэдніх рашэннях або пасля сканчэння трыццаці каляндарных дзён, а пры наяўнасці ў плацельшчыка абаротаў па рэалізацыі экспартуемых нафтапрадуктаў у перыядзе, за які ажыццяўляецца вяртанне, – не пазней за дзесяць рабочых дзён з дня прыняцця папярэдняга рашэння.

7. Калі праверкай або ў сувязі з падачай падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць з унесенымі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі выяўлены факт неабгрунтавана прад'яўленай плацельшчыкам да заліку, вяртання сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, падатковым органам па ўстаноўленай форме выносіцца рашэнне аб ануляванні (поўнасцю або часткова) рашэння, прынятага ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, не пазней за пяць рабочых дзён з дня выяўлення такога факта або з дня заканчэння праверкі. Рашэнне аб ануляванні накіроўваецца плацельшчыку не пазней за пяць дзён з дня яго прыняцця.

Падатковы орган не пазней за два рабочыя дні, якія ідуць следам за днём вынясення рашэння аб ануляванні, ажыццяўляе:

у першую чаргу – адмену раней праведзеных у адпаведнасці з часткай першай пункта 4 гэтага артыкула залікаў у паслядоўнасці заяўленых плацельшчыкам да заліку сум перавышэння падатку на дабаўленую вартасць у заяве аб вяртанні, пададзенай у адпаведнасці з часткай першай пункта 2 гэтага артыкула;

у другую чаргу – адмену заліку ў кошт пагашэння запазычанасці, якая ўтварылася, па падатках, зборах (пошлінах), пенях і іншых выплатах у бюджэт, кантроль за якімі ўскладзены на падатковыя органы, у тым ліку накладзеных падатковымі органамі штрафах, праведзенага ў адпаведнасці з часткай чацвёртай пункта 4 гэтага артыкула;

у трэцюю чаргу – адмену вяртання з бюджэту сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, якая засталася пасля правядзення заліку.

8. Плацельшчык абавязаны заплаціць у бюджэт суму перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, неабгрунтавана вернутую з бюджэту.

Падатковыя органы пры прымяненні спосабаў забеспячэння выплаты сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, неабгрунтавана вернутай з бюджэту, і налічаных на гэту суму пеняў, а таксама пры спагнанні сумы перавышэння падатку на дабаўленую вартасць і пеняў карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, устаноўленыя для прымянення спосабаў забеспячэння выканання падатковых абавязацельстваў, выплаты пеняў і спагнання падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў.

Пені на суму перавышэння падатку на дабаўленую вартасць, неабгрунтавана вернутую з бюджэту, налічваюцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, за кожны каляндарны дзень карыстання, пачынаючы з з дня, які ідзе следам за днём залічэння грашовых сродкаў на рахунак плацельшчыка ў банку, уключаючы дзень іх выплаты (спагнання) у бюджэт.

**Артыкул 138. Асаблівасці падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, якія спаганяецца мытнымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь**

1. Пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, за выключэннем увозу з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, і надыходзе іншых

акалічнасцей, з наяўнасцю якіх мытнае заканадаўства і (ці) акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь звязваюць узнікненне абавязку па выплаце падатку на дабаўленую вартасць, падатак на дабаўленую вартасць спаганяюць мытныя органы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, мытным заканадаўствам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Падатковая база падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (калі іншае не ўстаноўлена мытным заканадаўствам), вызначаецца як сума:

іх мытнага кошту;

падлеглых выплаце сум мытных пошлін, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта;

падлеглых выплаце сум акцызаў (па падакцызных таварах), калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта.

Пры змяшчэнні тавараў пад мытныя працэдуры, іншыя чым мытная працэдура выпуску для ўнутранага спажывання, умоўна вылічаныя сумы мытных пошлін, акцызаў, якія падлягалі б уплаце пры змяшчэнні тавараў, якія ўвозяцца, пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання, уключаюцца ў падатковую базу для вылічэння падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі органамі.

3. У выпадку выплаты і (ці) спагнання сум мытных пошлін, акцызаў у адносінах да тавараў, змешчаных пад адпаведныя мытныя працэдуры з выкарыстаннем падатковых ільгот па выплаце мытных пошлін, акцызаў, спалучаных з абмежаваннямі па карыстанні і распараджэнні гэтымі таварамі, пералічэнне падатковай базы падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі органамі, у сувязі з выплатай (спагнаннем) указаных сум мытных пошлін, акцызаў не праводзіцца, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Узнікненне, спыненне абавязку па выплаце падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, парадак і тэрмін яго выплаты вызначаюцца ў адпаведнасці з мытным заканадаўствам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

5. Сума падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяюць мытныя органы пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, што падлягае выплаце ў бюджэт, вызначаецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

6. Асаблівасці вылічэння сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выплаце ў бюджэт пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, у залежнасці ад мытнай працэдуры ўстанаўліваюцца мытным заканадаўствам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

7. Парадак і тэрміны выплаты падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца мытнымі органамі, устанаўліваюцца мытным заканадаўствам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 139. Асаблівасці падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць, які спаганяецца падатковымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь**

1. Пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падатковыя органы спаганяюць падатак на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

2. Пры змяненні парадку вылічэння падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца падатковымі органамі пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза (змяненні падатковай базы, ставак, парадку прымянення вызвалення ад падаткаабкладання), новы парадак вылічэння прымяняецца ў адносінах да тавараў, прынятых на ўлік з моманту змянення парадку вылічэння падатку на дабаўленую вартасць.

3. Вылічэнне і выплата падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца падатковымі органамі, праводзіць камісіянер, паверaны ці іншая аналагічная асоба-плацельшчык пры:

увозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў;

перадачы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь камітэнтам, давернікам ці іншай аналагічнай асобай, якая з'яўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, тавараў, раней увезеных з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, па якіх падатак на дабаўленую вартасць не быў выплачаны (калі такія тавары будуць рэалізаваны праз камісіянера, паверанага ці іншую аналагічную асобу).

4. Падатковая база для мэт вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца падатковымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза:

можа адлюстроўвацца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго месяца, тэрмін падачы якой ідзе следам за датай адгрузкі тавараў, указаных у пункце 3 гэтага артыкула, пакупнікам, або таго месяца, у якім гэтыя тавары прыняты да бухгалтарскага ўліку ў камісіянера, паверанага ці іншай аналагічнай асобы. Гэта палажэнне прымяняецца, калі гэтыя тавары адгружаны камісіянерам, паверaным ці іншай аналагічнай асобай пакупнікам у месяцы, які ідзе следам за месяцам прыняцця іх да бухгалтарскага ўліку;

адлюстроўваецца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго месяца, у якім прыняты да бухгалтарскага ўліку ў камісіянера, паверанага ці іншай аналагічнай асобы тавары, указаныя ў абзацы другім пункта 3 гэтага артыкула, калі гэтыя тавары набывае камісіянер, паверaны ці іншая аналагічная асоба для камітэнта, даверніка ці іншай аналагічнай асобы;

можа адлюстроўвацца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць таго месяца, тэрмін падачы якой ідзе следам за датай прыняцця да бухгалтарскага ўліку фактычна ўвезеных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, або таго месяца, у якім у сувязі з умовамі знешнегандлёвага дагавору тавары прыняты да бухгалтарскага ўліку. Гэта палажэнне прымяняецца, калі такое прыняцце да бухгалтарскага ўліку тавараў папярэднічае іх фактычнаму ўвозу на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

5. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць запаўняецца без нарастаючага выніку з пачатку года ў цэлым па ўсіх таварах, увезеных у справаздачным перыядзе (месяцы) на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, спагнанне падатку на дабаўленую вартасць па якіх ажыццяўляюць падатковыя органы.

Справаздачным перыядам падатку на дабаўленую вартасць з'яўляецца месяц, у якім плацельшчык адлюстраваў атрыманне тавараў (прадуктаў перапрацоўкі) на рахунках бухгалтарскага ўліку (для індывідуальных прадпрымальнікаў – у даных уліку даходаў (расходаў) і гаспадарчых аперацый, для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання і вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, – у даных гэтай кнігі).

**Артыкул 140. Асаблівасці вылічэння і прыняцця да выліку сум падатку на дабаўленую вартасць арганізацыямі, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, і індывідуальнымі прадпрымальнікамі**

1. Арганізацыі – плацельшчыкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, якія выкарыстоўваюць гэты асаблівы рэжым падаткаабкладання з выплатай падатку на дабаўленую вартасць і вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 333 гэтага Кодэкса (далей у гэтым артыкуле – плацельшчыкі спрошчанай сістэмы), і індывідуальныя прадпрымальнікі момант фактычнай рэалізацыі адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў вызначаюць, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, як той, які прыпадае на справаздачны перыяд:

дзень залічэння грашовых сродкаў ад пакупніка (заказчыка) на рахунак плацельшчыка, але не пазней за шэсцьдзясят дзён з дня адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў;

у выпадку рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за наяўныя грашовыя сродкі – дзень паступлення ўказаных грашовых сродкаў у касу плацельшчыка, але не пазней за шэсцьдзясят дзён з дня адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў;

дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, у адносінах да якіх аплата паступіла да гэтага дня (ажыццёўлена папярэдняя аплата, атрымана авансавая выплата, задатак).

2. Для мэт пункта 1 гэтага артыкула:

2.1. днём залічэння грашовых сродкаў:

2.1.1. па дагаворы фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынгу) прызнаецца дата аплаты фактарам грашовых патрабаванняў без права рэгрэсу. Днём залічэння грашовых сродкаў па такім дагаворы, калі ўмовамі выплаты прадугледжана права рэгрэсу, прызнаецца дата пагашэння ўступленага грашовага патрабавання плацельшчыкам (даўжніком).

Палажэнні гэтага падпункта прымяняюць таксама камітэнты (давернікі) пры спыненні абавязацельстваў пакупнікамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў перад камісіянерамі (паверанымі);

2.1.2. па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, па якіх перададзены і атрыманы правы патрабавання, пераведзены доўг, праведзены залік узаемных патрабаванняў, прызнаецца дата перадачы права патрабавання, дата пераводу доўгу, дата заліку ўзаемных патрабаванняў.

Камітэнты (давернікі) таксама прымяняюць палажэнні гэтага падпункта пры спыненні абавязацельстваў пакупнікамі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў перад камісіянерамі (паверанымі);

2.1.3. на рахунак камітэнта (даверніка) ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца дата залічэння грашовых сродкаў на рахунак камісіянера (паveранага), а ў выпадку, калі дагаворам прадугледжана, што грашовыя сродкі за рэалізаваныя камісіянерам (паверaным) тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы залічваюцца на рахунак камітэнта (даверніка), – дата залічэння грашовых сродкаў на рахунак камітэнта (даверніка);

2.2. дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, дзень здачы аб'екта ў арэнду, дзень перадачы прадмета лізінгу ў фінансавую арэнду (лізінг), дзень давання маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса;

2.3. момант фактычнай рэалізацыі пры бязвыплатнай перадачы тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), маёмасных правоў, пры абмене таварамі (працамі, паслугамі), маёмаснымі правамі, пры перадачы тавараў у рамках дагавора пазыкі ў выглядзе рэчаў, пры натуральнай аплаце працы таварамі (працамі, паслугамі), пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь, пры рэалізацыі прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны (матэрыялаў) для нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь, пры перадачы прадмета закладу заклададавальнікам закладатрымальніку, пры рэалізацыі прыроднага і сціснутага газу, электрычнай і цеплавой энергіі вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса.

3. Індывідуальныя прадпрымальнікі маюць права вызначаць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса.

Выбраны індывідуальнымі прадпрымальнікамі, указанымі ў частцы першай гэтага пункта, метад вызначэння моманту фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса ўстанаўліваецца пісьмовым рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка па ўсіх абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і змяненню на працягу падатковага перыяду не падлягае.

4. Для мэт пунктаў 1 і 3 гэтага артыкула момантам фактычнай рэалізацыі ў адносінах да сум:

розніцы, якая ўзнікае ў адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 8 і часткай другой пункта 9 артыкула 120 гэтага Кодэкса, прызнаецца дзень яе атрымання;

якія павялічваюць падатковую базу ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 120 гэтага Кодэкса, прызнаецца дзень іх атрымання.

5. У плацельшчыкаў спрошчанай сістэмы і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, вылікам падлягаюць фактычна заплачаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або заплачаныя пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь пасля іх адлюстравання ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання (ва ўліку даходаў і расходаў індывідуальных прадпрымальнікаў), калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, на падставе дакументаў, указаных у пункце 5 артыкула 132 гэтага Кодэкса.

6. Для мэт пункта 5 гэтага артыкула прад'яўленыя прадаўцом сумы падатку на дабаўленую вартасць прызнаюцца фактычна заплачанымі:

6.1. пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, па якіх перададзены і атрыманы правы патрабавання, пераведзены доўг, праведзены залік узаемных патрабаванняў, а таксама разлікі за якія праведзены трэцімі асобамі, – адпаведна на дату перадачы і атрымання права патрабавання, дату пераводу доўгу, дату заліку ўзаемных патрабаванняў, дату пагашэння доўгу перад прадаўцом трэцімі асобамі;

6.2. пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў камісіянерам (паверанным) па даручэнні камітэнта (даверніка) – на дату ажыццяўлення разліку з прадаўцом;

6.3. пры частковай аплаце тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія набываюцца, – у памеры сумы падатку на дабаўленую вартасць, вызначанай як здабытак долі сумы падатку на дабаўленую вартасць у кошце набытага тавару (працы, паслугі), маёмаснага права і сумы іх частковай аплаты.

7. Палажэнні пункта 25, падпунктаў 26.2 і 26.4 пункта 26 артыкула 133 гэтага Кодэкса прымяняюцца плацельшчыкамі спрошчанай сістэмы і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, у адносінах да сум падатку на дабаўленую вартасць, фактычна заплачаных пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

9. У індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса, вылікам у адпаведнасці з артыкуламі 132 і 133 гэтага Кодэкса падлягаюць прад'яўленыя сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў незалежна ад даты правядзення разлікаў за тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, якія набываюцца, або заплачаныя пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь пасля іх адлюстравання ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання (ва ўліку даходаў і расходаў індывідуальных прадпрымальнікаў) на падставе дакументаў, указаных у пункце 5 артыкула 132 гэтага Кодэкса.

10. У плацельшчыкаў спрошчанай сістэмы і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, фактычна заплачаныя сумы падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (у індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса – прад'яўленыя сумы падатку на дабаўленую вартасць) прызнаюцца падатковым вылікам у тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае найбольш позняя з наступных дат:

дата адлюстравання фактычна заплачаных сум падатку на дабаўленую вартасць у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання (ва ўліку даходаў і расходаў

індывідуальных прадпрымальнікаў), – для плацельшчыкаў спрошчанай сістэмы і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула;

дата адлюстравання прад'яўленай сумы падатку на дабаўленую вартасць у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання (ва ўліку даходаў і расходаў індывідуальных прадпрымальнікаў), – для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вызначаюць момант фактычнай рэалізацыі ў адпаведнасці з артыкулам 121 гэтага Кодэкса;

дата падпісання плацельшчыкам электронна-лічбавым подпісам электроннага рахунка-фактуры, які з'яўляецца падставай для выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, або адна з дат, выбраных плацельшчыкам згодна з часткай другой гэтага пункта.

Пры падпісанні плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам электронных рахункаў-фактур:

не пазней за дату падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім выкананы ўмовы, устаноўленыя гэтым артыкулам для ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, плацельшчык мае права правесці вылік сум падатку на дабаўленую вартасць за ўказаны справаздачны перыяд пры ўмове, што дата здзяйснення аперацыі ў электронным рахунку-фактуры прыпадае на гэты ж справаздачны перыяд;

пасля падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за справаздачны перыяд, у якім выкананы ўмовы, устаноўленыя гэтым артыкулам для ажыццяўлення выліку сум падатку на дабаўленую вартасць, і дата здзяйснення аперацыі ў электронным рахунку-фактуры прыпадае на гэты ж справаздачны перыяд, плацельшчык мае права правесці вылік сум падатку на дабаўленую вартасць за той справаздачны перыяд, тэрмін падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць за які ідзе следам за падпісаннем плацельшчыкам электронным лічбавым подпісам электронных рахункаў-фактур.

**Артыкул 141. Асаблівасці вылічэння і выплаты падатку на дабаўленую вартасць пры аказанні замежнымі арганізацыямі паслуг у электроннай форме для фізічных асоб**

1. Замежныя арганізацыі пры рэалізацыі фізічным асобам, указаным у пункце 2 гэтага артыкула (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам), паслуг у электроннай форме, месцам рэалізацыі якіх згодна з падпунктам 1.5 пункта 1 артыкула 117 гэтага Кодэкса прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, праводзяць вылічэнне і выплату падатку на дабаўленую вартасць, падачу падатковай дэкларацыі (разліку) у падатковы орган Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, калі абавязак па вылічэнні і выплаце падатку на дабаўленую вартасць ускладзены на іншых абавязаных асоб, указаных у пунктах 3 і 4 гэтага артыкула.

2. Фізічная асоба (у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік) прызнаецца асобай, якая набывае паслугі ў электроннай форме, месцам рэалізацыі якіх прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, калі выконваецца хаця б адна з указаных ніжэй умоў:

месцам фактычнага знаходжання фізічнай асобы (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка) з'яўляецца Рэспубліка Беларусь;

месцам знаходжання банка, у якім адкрыты рахунак, што выкарыстоўваецца фізічнай асобай (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам) для аплаты паслуг, ці аператара электронных грашовых сродкаў, праз які фізічная асоба (у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік) аплачвае паслугі, з'яўляецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь;

сеткавы (IP) адрас абсталявання, выкарыстанага фізічнай асобай (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам) пры набыцці паслуг у электроннай форме, зарэгістраваны ў Рэспубліцы Беларусь (адносіцца да адраснай прасторы Рэспублікі Беларусь);

міжнародны код краіны тэлефоннага нумара, які выкарыстоўваецца фізічнай асобай (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам) для набыцця ці аплаты паслуг, прысвоены Рэспубліцы Беларусь.

3. Пры аказанні замежнымі арганізацыямі паслуг у электроннай форме фізічным асобам (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам), якія набываюць паслугі ў электроннай форме ў Рэспубліцы Беларусь, пры пасрэдніцтве беларускіх арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, пастаянных прадстаўніцтваў замежных арганізацый, якія знаходзяцца на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь і ўдзельнічаюць у разліках непасрэдна з такімі фізічнымі асобамі (у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі) за ўказаныя паслугі на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў з замежнымі арганізацыямі, якія аказваюць такія паслугі, вылічэнне і выплата падатку на дабаўленую вартасць праводзяцца ўказанымі пасрэднікамі ў парадку, устаноўленым пунктам 3 артыкула 114 гэтага Кодэкса.

4. Пры аказанні замежнымі арганізацыямі паслуг у электроннай форме фізічным асобам (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам), якія набываюць паслугі ў электроннай форме ў Рэспубліцы Беларусь, калі ў разліках удзельнічаюць некалькі замежных арганізацый, указаных у абзацы трэцім падпункта 2.12 пункта 2 артыкула 13 гэтага Кодэкса, асобай, абавязанай вылічыць і заплаціць падатак на дабаўленую вартасць, прызнаецца той з замежных пасрэднікаў у разліках, які непасрэдна ўдзельнічае ў разліках з указанымі фізічнымі асобамі, незалежна ад наяўнасці ў яго дагавору з замежнай арганізацыяй, якая аказвае паслугі ў электроннай форме фізічным асобам (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам) у Рэспубліцы Беларусь.

5. Пры рэалізацыі паслуг у электроннай форме замежнымі арганізацыямі, якія аказваюць паслугі ў электроннай форме для фізічных асоб, у тым ліку на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, падатковая база вызначаецца як кошт гэтых паслуг з улікам сумы падатку на дабаўленую вартасць.

Пры вызначэнні падатковай базы пры рэалізацыі паслуг, указаных у частцы першай гэтага пункта, за замежную валюту пералічэнне замежнай валюты ў беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на момант фактычнай рэалізацыі ўказаных паслуг.

У выпадку адмовы фізічнай асобай (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам), які набывае паслугі ў электроннай форме, ад аказаных паслуг ці змяншэння (павелічэння) кошту паслуг падатковая база падлягае адпаведнай карэкціроўцы ў тым падатковым перыядзе, у якім мела месца адмова ад аказаных паслуг ці праведзена змяншэнне (павелічэнне) кошту паслуг.

6. Момантам фактычнай рэалізацыі замежнымі арганізацыямі паслуг у электроннай форме фізічным асобам (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам) прызнаецца апошні дзень падатковага перыяду, на які прыпадае дзень аплаты, уключаючы авансавы плацеж, або дзень іншага спынення абавязацельстваў фізічнымі асобамі (у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі).

7. Падатковым перыядам падатку на дабаўленую вартасць для замежных арганізацый, якія аказваюць паслугі ў электроннай форме для фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў), прызнаецца каляндарны квартал.

8. Пры рэалізацыі замежнымі арганізацыямі, якія аказваюць паслугі ў электроннай форме для фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў), паслуг у электроннай форме сума падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае вылічэнню і выплаце, вызначаецца як здабытак падатковай базы, вызначанай у парадку, устаноўленым пунктам 5 гэтага артыкула, і падатковай стаўкі, устаноўленай пунктам 3 артыкула 122 гэтага Кодэкса, падзелены на памер падатковай стаўкі, павялічанай на 100.

9. Не падлягаюць выліку і не памяншаюць суму падатку на дабаўленую вартасць, вылічаную замежнай арганізацыяй пры рэалізацыі паслуг у электроннай форме фізічным асобам (у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам), сумы падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленыя ёй пры набыцці (заплачаныя пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

10. Замежныя арганізацыі, якія аказваюць паслугі ў электроннай форме для фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў), падаюць у інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па горадзе Мінску праз асабісты кабінет плацельшчыка

ў электроннай форме па ўстаноўленых форме і фармаце не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам:

або падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на дабаўленую вартасць у выглядзе электроннага дакумента;

або інфармацыю, якая змяшчае звесткі па абаротах па рэалізацыі паслуг і вылічаную суму падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае выплаце.

Выплата падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

**Артыкул 142. Вяртанне (пакрыццё) сум падатку на дабаўленую вартасць дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам замежных дзяржаў, а таксама іх персаналу (уключаючы членаў іх сямей)**

1. Вяртанне (пакрыццё) сум падатку на дабаўленую вартасць дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам замежных дзяржаў праводзіцца штоквартальна з улікам палажэнняў гэтага артыкула ў адносінах да:

абаротаў па рэалізацыі ім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг) і даванні ім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'екта арэнды для іх афіцыйнай дзейнасці;

абаротаў па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг) для асабістага карыстання дыпламатычнага і (ці) адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу гэтых прадстаўніцтваў і ўстаноў (уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі).

2. Вяртанне (пакрыццё) сум падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) і па даванні аб'екта арэнды, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, праводзіцца, калі ў адносінах да дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь, дыпламатычнага і (ці) адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу гэтых прадстаўніцтваў і ўстаноў (уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі):

аналагічны парадак устаноўлены заканадаўствам адпаведнай замежнай дзяржавы;

аналагічная норма прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Пералік такіх замежных дзяржаў вызначае Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым у мэтах рэалізацыі прынцыпу ўзаемнасці могуць устанаўлівацца абмежаванні па памерах і ўмовах вяртання (пакрыцця) падатку на дабаўленую вартасць.

3. Для пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць, заплачанага пры набыцці тавараў (прац, паслуг), атрыманні ў часовае валоданне і карыстанне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'екта арэнды для афіцыйнай дзейнасці дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы штоквартальна падаецца афіцыйны ліст (нота) дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы замежнай дзяржавы (засведчаны пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго наступных дакументаў:

разліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая кампенсуецца з бюджэту дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам замежных дзяржаў, па ўстаноўленай форме і запоўненага ва ўстаноўленым парадку;

дагавораў (копій дагавораў, засведчаных пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) на набыццё тавараў (прац, паслуг), здачу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'ектаў у арэнду, заключаных дыпламатычным прадстаўніцтвам ці консульскай установай замежнай дзяржавы. Дагаворы (іх засведчаныя копіі) падаюцца ў падатковы орган пры іх наяўнасці. Засведчаныя копіі дагавораў застаюцца ў падатковым органе, і ў далейшым іх паўторнай падачы ў падатковы орган не патрабуецца;

атрыманых ад плацельшчыка падатку на дабаўленую вартасць, які знаходзіцца на ўліку ў падатковым органе Рэспублікі Беларусь, першасных уліковых дакументаў (копій такіх першасных уліковых дакументаў, засведчаных пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае), у якіх вылучана сума падатку на дабаўленую вартасць;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату дыпламатычным прадстаўніцтвам ці консульскай установай замежнай дзяржавы тавараў (прац, паслуг), выплату арэнднай платы, або пагаднення (копіі пагаднення, засведчанай пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) аб даванні ўзамен выканання абавязацельства адступнога.

4. Для пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), якія набываюцца для асабістага карыстання дыпламатычным і (ці) адміністрацыйна-тэхнічным персаналам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў (уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі), у падатковы орган штоквартальна падаецца афіцыйны ліст (нота) дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы замежнай дзяржавы (засведчаны пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго наступных дакументаў:

разліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая кампенсуецца з бюджэту дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам замежных дзяржаў;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату дыпламатычным і (ці) адміністрацыйна-тэхнічным персаналам дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў (уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі) адпаведных тавараў (прац, паслуг), выплату арэнднай платы, або пагаднення (копіі пагаднення, засведчанай пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) аб даванні ўзамен выканання абавязацельства адступнога.

5. Калі ў дакументах, якія пацвярджаюць аплату (выплату), прадугледжаных гэтым артыкулам, адсутнічае вылучаная асобным радком сума падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленая прадаўцом – плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем плацельшчыка падатку на дабаўленую вартасць, які выкарыстоўвае вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам), то падатковы орган пры наяўнасці найменняў тавараў (прац, паслуг) у такіх дакументах вызначае суму падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае пакрыццю, разліковым метадам як здабытак аплачанага кошту тавараў (прац, паслуг) і адпаведнай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленай пунктамі 2–4 артыкула 122 гэтага Кодэкса, падзеленай на памер падатковай стаўкі, павялічанай на 100.

6. Пакрыццё падатку на дабаўленую вартасць з улікам палажэнняў гэтага артыкула праводзіцца на падставе дакументаў, указаных у абзацах чацвёртым і пятым пункта 3 і абзацы трэцім пункта 4 гэтага артыкула, складзеных (выдадзеных) не раней пачатку дванаццацімесячнага перыяду, які папярэднічае пачатку квартала, у якім пададзены прадугледжаны гэтым артыкулам афіцыйны ліст (нота) дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы замежнай дзяржавы.

7. На працягу аднаго месяца з дня падачы афіцыйнага ліста (ноты) дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы замежнай дзяржавы (засведчанага пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго ўказаных у гэтым артыкуле дакументаў падатковы орган правярае іх і пакрывае падатак на дабаўленую вартасць або прымае рашэнне аб адмове ў правядзенні пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць.

Рашэнне аб адмове ў правядзенні пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць падатковы орган накіроўвае дыпламатычнаму прадстаўніцтву ці консульскай установе замежнай дзяржавы на працягу двух рабочых дзён з дня яго прыняцця.

8. Прадугледжанае гэтым артыкулам пакрыццё падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца на рахункі, указаныя ў афіцыйным лісце (ноце) дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы замежнай дзяржавы (засведчаным пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці ўстановы або асобы, якая яго замяшчае).

**Артыкул 143. Вяртанне (пакрыццё) сум падатку на дабаўленую вартасць прадстаўніцтвам і органам міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, а таксама іх супрацоўнікам**

1. Вяртанне (пакрыццё) сум падатку на дабаўленую вартасць прадстаўніцтвам і органам міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў праводзіцца штоквартальна з улікам палажэнняў гэтага артыкула ў адносінах да:

абаротаў па рэалізацыі ім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг) і даванні ім на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'екта арэнды для іх афіцыйнай дзейнасці,

абаротаў па рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў (прац, паслуг) для асабістага карыстання супрацоўнікаў гэтых прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

2. Пералік прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацвярджае Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

3. Для пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць, заплачанага пры набыцці тавараў (прац, паслуг), атрыманні ў часовае валоданне і карыстанне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'екта арэнды для афіцыйнай дзейнасці прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння штоквартальна падаецца афіцыйны ліст (нота) прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння (засведчаны пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго наступных дакументаў:

разліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая кампенсуецца з бюджэту прадстаўніцтвам і органам міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, форма і парадак запаўнення якога зацвярджаюцца Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

дагавораў (копій дагавораў, засведчаных пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) на набыццё тавараў (прац, паслуг), даванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'ектаў у арэнду, заключаных прадстаўніцтвам ці органам міжнароднай арганізацыі і міждзяржаўнага ўтварэння. Дагаворы (іх засведчаныя копіі) падаюцца ў падатковы орган пры іх наяўнасці. Засведчаныя копіі дагавораў застаюцца ў падатковым органе, і ў далейшым іх паўторнай падачы ў падатковы орган не патрабуецца;

атрыманых ад плацельшчыка падатку на дабаўленую вартасць, які знаходзіцца на ўліку ў падатковым органе Рэспублікі Беларусь, першасных уліковых дакументаў (копій такіх першасных уліковых дакументаў, засведчаных пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае), у якіх вылучана сума падатку на дабаўленую вартасць;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату прадстаўніцтвам ці органам міжнароднай арганізацыі і міждзяржаўнага ўтварэння тавараў (прац, паслуг), выплату арэнднай платы, або пагаднення (копіі пагаднення, засведчанай пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) аб даванні ўзамен выканання абавязацельства адступнога.

4. Для пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), якія набываюцца для асабістага карыстання супрацоўнікамі прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, у падатковы орган штоквартальна падаецца афіцыйны ліст (нота) прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння (засведчаны пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго наступных дакументаў:

разліку сумы падатку на дабаўленую вартасць, якая кампенсуецца з бюджэту прадстаўніцтвам і органам міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў;

дакументаў, што пацвярджаюць фактычную аплату супрацоўнікамі прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый, міждзяржаўных утварэнняў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, адпаведных тавараў (прац, паслуг), выплату арэнднай

платы, або пагаднення (копіі пагаднення, засведчанай пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) аб даванні ўзамен выканання абавязацельства адступнога.

5. Калі ў дакументах, якія пацвярджаюць аплату (выплату), прадугледжаных гэтым артыкулам, адсутнічае вылучаная асобным радком сума падатку на дабаўленую вартасць, прад'яўленая прадаўцом – плацельшчыкам падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем плацельшчыка падатку на дабаўленую вартасць, які выкарыстоўвае вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам), падатковы орган пры наяўнасці найменняў тавараў (прац, паслуг) у такіх дакументах вызначае суму падатку, якая падлягае пакрыццю, разліковым метадам як здабытак аплачанага кошту тавараў (прац, паслуг) і адпаведнай стаўкі падатку на дабаўленую вартасць, устаноўленай пунктамі 2–4 артыкула 122 гэтага Кодэкса, падзеленай на памер падатковай стаўкі, павялічанай на 100.

6. Пакрыццё падатку на дабаўленую вартасць з улікам палажэнняў гэтага артыкула праводзіцца на падставе дакументаў, указаных у абзацах чацвёртым і пятым пункта 3 і абзацы трэцім пункта 4 гэтага артыкула, складзеных (выдадзеных) не раней пачатку дванаццацімесячнага перыяду, які папярэднічае пачатку квартала, у якім пададзены прадугледжаны гэтым артыкулам афіцыйны ліст (нота) прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння.

7. На працягу аднаго месяца з дня падачы афіцыйнага ліста (ноты) прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння (засведчанага пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае) з прыкладаннем да яго ўказаных у гэтым артыкуле дакументаў падатковы орган правярае іх і пакрывае падатак на дабаўленую вартасць або прымае рашэнне аб адмове ў правядзенні пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць.

Рашэнне аб адмове ў правядзенні пакрыцця падатку на дабаўленую вартасць падатковы орган накіроўвае прадстаўніцтву ці органу міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння на працягу двух рабочых дзён з дня яго прыняцця.

8. Прадугледжанае гэтым артыкулам пакрыццё падатку на дабаўленую вартасць праводзіцца на рахункі, указаныя ў афіцыйным лісце (ноце) прадстаўніцтва ці органа міжнароднай арганізацыі або міждзяржаўнага ўтварэння (засведчаным пячаткай і подпісам кіраўніка гэтага прадстаўніцтва ці органа або асобы, якая яго замяшчае).

**Артыкул 144. Умовы, парадак і тэрміны вяртання падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам пры набыцці тавараў у рознічным гандлі праз магазіны**

1. Замежныя асобы пры набыцці ў рознічным гандлі праз магазіны тавараў, кошт якіх па плацежным (плацежных) дакуменце (дакументах), які (якія) пацвярджае (пацвярджаюць) аплату тавараў (далей у гэтым артыкуле – плацежны дакумент), перавышае суму 80 беларускіх рублёў (з улікам падатку на дабаўленую вартасць), на працягу аднаго дня ў магазіне плацельшчыка, які заключыў з арганізацыяй, што мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, дагавор на аказанне паслуг па вяртанні падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам (далей у гэтым артыкуле – дагавор на аказанне паслуг), мае права атрымаць у памеры, тэрміны і парадку, якія вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, вяртанне сумы падатку на дабаўленую вартасць у выпадку вывазу такіх тавараў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза на працягу трох месяцаў з дня іх набыцця.

2. Вяртанне падатку на дабаўленую вартасць не праводзіцца па таварах:

якія вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

абароты па рэалізацыі якіх на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вызваляюцца ад падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

якія абкладаюцца падаткам на дабаўленую вартасць па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 122 гэтага Кодэкса;

якія прызнаюцца падакцызнымі ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса.

3. Падатак на дабаўленую вартасць падлягае вяртанню замежнай асобе арганізацыяй, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам і заключыла дагавор на аказанне паслуг з плацельшчыкам, які рэалізаваў замежнай асобе ў рознічным гандлі тавар праз магазін, пасля падачы замежнай асобай на яе адрас пацвярджэння вывазу тавараў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Пацвярджэннем вывазу замежнай асобай за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза тавараў, рэалізаваных у рознічным гандлі праз магазіны, з'яўляецца афармлены ў магазіне плацельшчыка чэк спецыяльнай формы – «Чэк на вяртанне ПДВ», які змяшчае абавязковыя рэквізіты, прадугледжаныя гэтым артыкулам, адзнаку мытнага органа дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, якая пацвярджае перамяшчэнне тавараў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза, разам з прымацаваным да яго плацежным дакументам магазіна, які пацвярджае аплату за вывезены тавар, у якім указваюцца стаўкі і сумы падатку на дабаўленую вартасць (далей у гэтым артыкуле – пацвярджэнне аб вывазе тавару). Парадак выдачы пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і (ці) актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза. Пацвярджэнне аб вывазе тавару павінна быць прад'яўлена арганізацыі, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, на працягу шасці месяцаў з даты вывазу тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Чэк на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць складаецца ў двух экзэмплярах і павінен змяшчаць наступныя абавязковыя рэквізіты на рускай і англійскай мовах (першы экзэмпляр выдаецца замежнай асобе, другі захоўваецца ў плацельшчыка, які рэалізаваў у рознічным гандлі тавары праз магазін):

найменне дакумента («Чэк на вяртанне ПДВ»), яго нумар і дату складання;

найменне, адрас месца знаходжання і ўліковы нумар плацельшчыка, які рэалізаваў тавар праз магазін;

найменне, адрас месца знаходжання і ўліковы нумар плацельшчыка – арганізацыі, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць) пакупніка – замежнай асобы, рэквізіты яго дакумента для выезду за мяжу, указанне дзяржавы яго пастаяннага месца жыхарства;

найменне і колькасць набытага тавару;

суму пакупкі з падаткам на дабаўленую вартасць і без падатку на дабаўленую вартасць па плацежным дакуменце магазіна;

стаўку падатку на дабаўленую вартасць у памеры дваццаць (20) працэнтаў і суму падатку на дабаўленую вартасць па плацежным дакуменце магазіна;

суму падатку на дабаўленую вартасць, якая падлягае вяртанню замежнай асобе арганізацыяй, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам;

нумар плацежнага дакумента магазіна, які пацвярджае рэалізацыю тавару, указанага ў чэку на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць;

подпіс асобы, якая аформіла чэк на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць.

4. Замежная асоба падае пацвярджэнне аб вывазе тавару на адрас арганізацыі, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, у парадку, устаноўленым гэтай арганізацыяй.

Арганізацыя, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам і ажыццявіла вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежнай асобе, прад'яўляе да пакрыцця суму падатку на дабаўленую вартасць плацельшчыку, які рэалізаваў замежнай асобе тавар праз магазін, з якім у яе заключаны дагавор на аказанне паслуг. Інфармацыя аб плацельшчыках, з якімі арганізацыя, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, заключыла дагавор на аказанне паслуг, а таксама аб сумах падатку на дабаўленую вартасць, вернутых замежным асобам, штомесяц падаецца такой арганізацыяй

у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік па форме і ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Прад’яўленая для пакрыцця сума падатку на дабаўленую вартасць, па якой было ажыццёўлена вяртанне замежнай асобе, указваецца ў акце на пакрыццё сум падатку на дабаўленую вартасць, які складаецца па ўстаноўленай форме і запаўняецца ва ўстаноўленым парадку арганізацыяй, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам. Акт на пакрыццё сум падатку на дабаўленую вартасць у двух экзэмплярах да 15-га чысла кожнага месяца накіроўваецца для падпісання плацельшчыку, які рэалізаваў замежнай асобе тавар праз магазін і ўказаны ў пацвярджэнні аб вывазе тавару. Да акта на пакрыццё сум падатку на дабаўленую вартасць дадаюцца арыгіналы пацвярджэння аб вывазе тавару, калі іншае не ўстаноўлена Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Акт на пакрыццё сум падатку на дабаўленую вартасць, падпісаны бакамі дагавора на аказанне паслуг, з'яўляецца для плацельшчыка, які рэалізаваў замежнай асобе тавар праз магазін, дакументальным пацвярджэннем вывазу тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Плацельшчык, які рэалізаваў замежнай асобе тавар праз магазін, на працягу сямі рабочых дзён пасля падпісання акта на пакрыццё сум падатку на дабаўленую вартасць, што з'яўляецца дакументальным пацвярджэннем вывазу тавару за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза (калі іншы тэрмін не ўстаноўлены ў дагаворы на аказанне паслуг), пералічвае на рахунак арганізацыі, якая мае права на вяртанне падатку на дабаўленую вартасць замежным асобам, адкрыты ў банку Рэспублікі Беларусь, прад'яўленыя для пакрыцця сумы падатку на дабаўленую вартасць.

## ГЛАВА 15
## АКЦЫЗЫ

### Артыкул 145. Плацельшчыкі акцызаў

Плацельшчыкамі акцызаў (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца:

арганізацыі з улікам асаблівасцей, устаноўленых артыкулам 146 гэтага Кодэкса;

індывідуальныя прадпрымальнікі з улікам асаблівасцей, устаноўленых артыкулам 146 гэтага Кодэкса;

фізічныя асобы, на якіх у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і (ці) мытным заканадаўствам ускладзены абавязак па выплаце акцызаў, якія спаганяюцца пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 146. Асаблівасці прызнання плацельшчыкамі асобных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў

1. Пры вытворчасці падакцызных тавараў плацельшчыкамі прызнаюцца:

1.1. арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць вытворчасць падакцызных тавараў з любога віду сыравіны (давальніцкага ці ўласнага) і (ці) з выкарыстаннем падакцызных тавараў.

Да вытворчасці падакцызных тавараў адносяцца таксама:

разліў падакцызнай алкагольнай прадукцыі і піва, які ажыццяўляецца як частка агульнага працэсу вытворчасці гэтых падакцызных тавараў у адпаведнасці з патрабаваннямі дзяржаўных стандартаў і (ці) іншых тэхнічных прававых актаў, якія рэгламентуюць працэс вытворчасці ўказаных падакцызных тавараў і зацверджаны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

любыя віды змешвання тавараў (у тым ліку настойвання алкагольнай прадукцыі) у месцах іх захоўвання і рэалізацыі (за выключэннем алкагольнай прадукцыі, якая рэалізуецца па рознічных цэнах, выраблена шляхам змешвання і (ці) настойвання алкагольнай прадукцыі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць грамадскае харчаванне), у выніку якога атрымліваецца падакцызны тавар;

1.2. юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць кантрактную вытворчасць тытунёвых вырабаў.

2. Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах плацельшчыкамі прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўвозяць падакцызныя тавары.

3. Пры рэалізацыі ўвезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах плацельшчыкамі прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якім даручана рэалізацыя падакцызных тавараў.

4. Пры рэалізацыі (перадачы) газу вуглевадароднага звадкаванага і газу прыроднага паліўнага кампрыміраванага для запраўкі транспартных сродкаў (уключаючы ўласныя транспартныя сродкі) праз аўтазаправачныя станцыі, а таксама з выкарыстаннем паліўна-раздатачнага абсталявання плацельшчыкамі прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць такую рэалізацыю (перадачу).

5. Пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні дызельнага паліва, набытага (атрыманага) для вытворчасці дызельнага паліва з метылавымі эфірамі тлустых кіслот, плацельшчыкамі прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія дапусцілі такое нямэтавае выкарыстанне (рэалізацыю, перадачу).

6. Плацельшчыкамі прызнаюцца юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні:

спірту этылавага сырцу з харчовай сыравіны, набытай (атрыманай) для вытворчасці спірту этылавага рэктыфікаванага;

спірту этылавага рэктыфікаванага з харчовай сыравіны, набытай (атрыманай) для вытворчасці алкагольнай прадукцыі, воцату і слабаалкагольных напояў;

спірту, набытага (атрыманага) для вытворчасці лекавых сродкаў, ветэрынарных прэпаратаў;

спіртазмяшчальнай прадукцыі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш, набытай (атрыманай) для вытворчасці безалкагольных напояў.

**Артыкул 147. Аб'екты падаткаабкладання акцызамі**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання акцызамі прызнаюцца:

1.1. падакцызныя тавары, якія вырабляюцца плацельшчыкамі і рэалізуюцца (перадаюцца) імі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.2. падакцызныя тавары, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, і (ці) узнікненне іншых акалічнасцей, з наяўнасцю якіх гэты Кодэкс, іншыя акты падатковага і мытнага заканадаўства, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, у тым ліку акты, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, звязваюць узнікненне абавязку па выплаце акцызаў;

1.3. падакцызныя тавары, увезеныя на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, пры іх рэалізацыі (перадачы).

Падакцызныя тавары, увезеныя на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, у адносінах да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання акцызамі пры рэалізацыі (перадачы), калі пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гэтых падакцызных тавараў праведзена выплата акцызаў або прыменена вызваленне ад акцызаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

Факт выплаты акцызаў або прымянення вызвалення ад акцызаў у адпаведнасці з заканадаўствам пацвярджаецца:

падатковым органам Рэспублікі Беларусь – у адносінах да падакцызных тавараў, якія ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, за выключэннем увозу падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь;

мытным органам Рэспублікі Беларусь – у адносінах да падакцызных тавараў, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў іншых, чым дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама пры ўвозе з тэрыторыі дзяржаў – членаў

Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь;

1.4. падакцызныя тавары, указаныя ў падпункце 1.13 пункта 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса, якія рэалізуюцца (перадаюцца) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь плацельшчыкамі, вызначанымі пунктам 4 артыкула 146 гэтага Кодэкса;

1.5. падакцызныя тавары, указаныя ў падпунктах 1.1, 1.6 і 1.10 пункта 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса, выкарыстаныя (рэалізаваныя, перададзеныя) не па мэтавым прызначэнні плацельшчыкамі, вызначанымі пунктамі 5 і 6 артыкула 146 гэтага Кодэкса.

2. Для мэт гэтай главы рэалізацыяй (перадачай) падакцызных тавараў прызнаюцца таксама:

2.1. бязвыплатная перадача падакцызных тавараў;

2.2. абмен з удзелам падакцызных тавараў;

2.3. перадача (рэалізацыя) падакцызных тавараў плацельшчыкам сваім работнікам;

2.4. перадача падакцызных тавараў у якасці прадметаў закладу заклададавальнікам закладатрымальніку (крэдытору) пры невыкананні ці неналежным выкананні забяспечанага закладам абавязацельства;

2.5. перадача падакцызных тавараў па пагадненні аб даванні адступнога ці навацыі, па дагаворы пазыкі;

2.6. перадача плацельшчыкам выробленых ім падакцызных тавараў з мэтай выкарыстання для ўласных патрэб.

Для мэт гэтай главы пад выкарыстаннем падакцызных тавараў для ўласных патрэб разумеецца:

любое выкарыстанне плацельшчыкам падакцызных тавараў у вытворчых і невытворчых мэтах;

іншае выбыццё падакцызных тавараў, у тым ліку ўключэнне кошту гэтых падакцызных тавараў у затраты плацельшчыка па вытворчасці і рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і (ці) у пазарэалізацыйныя расходы пры падліку падатку на прыбытак для арганізацый (падаходнага падатку з фізічных асоб – для індывідуальных прадпрымальнікаў), а таксама за кошт іншых крыніц;

фактычныя страты падакцызных тавараў пры захоўванні, перамяшчэнні і транспарціроўцы звыш нормаў натуральнага змяншэння, устаноўленых заканадаўствам.

Не з'яўляюцца выкарыстаннем падакцызных тавараў для ўласных патрэб фактычныя страты падакцызных тавараў пры захоўванні, перамяшчэнні і транспарціроўцы ў межах нормаў натуральнага змяншэння, устаноўленых заканадаўствам, а пры іх адсутнасці – у межах нормаў, устаноўленых кіраўніком па ўзгадненні з уласнікам, агульным сходам удзельнікаў, членаў спажывецкага таварыства, упаўнаважаных ці асобай, імі ўпаўнаважанай.

Пры гэтым пад натуральным змяншэннем разумеюцца страты (змяншэнне колькасці прадукцыі пры захаванні якасці ў межах патрабаванняў нарматыўных прававых актаў), якія з'яўляюцца вынікам натуральнага змянення фізічна-хімічных уласцівасцей і (ці) уздзеяння метэаралагічных фактараў. Да натуральнага змяншэння не адносяцца тэхналагічныя страты і страты ад браку, страты, выкліканыя парушэннем патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў, правілаў перавозкі грузаў, недасканаласцю сродкаў абароны тавараў ад страт і станам тэхналагічнага абсталявання, якое прымяняецца, а таксама страты з прычыны пашкоджання тары і змянення якасці прадукцыі;

2.7. перадача арганізацыяй выробленых ёй падакцызных тавараў свайму адасобленаму падраздзяленню для вытворчасці іншых падакцызных ці непадакцызных тавараў;

2.8. перадача плацельшчыкам выробленых ім падакцызных тавараў у якасці сыравіны (матэрыялаў) на перапрацоўку на давальніцкіх умовах;

2.9. перадача плацельшчыкам выробленых ім падакцызных тавараў у якасці ўзносу (укладу) у статутны фонд арганізацый, а таксама ў якасці ўкладу па дагаворы простай суполкі (дагаворы аб сумеснай дзейнасці);

2.10. перадача арганізацыяй выробленых ёй падакцызных тавараў свайму ўдзельніку (яго правапераемніку ці спадкаемцу) пры выхадзе (выбыцці) яго з арганізацыі;

2.11. перадача падакцызных тавараў, выробленых у рамках дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці), удзельніку (яго правапераемніку ці спадкаемцу) указанага дагавора пры вылучэнні яго долі з маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў дагавора, ці падзеле такой маёмасці;

2.12. перадача плацельшчыкам выробленых ім з давальніцкай сыравіны падакцызных тавараў уладальніку (уласніку) указанай сыравіны або іншым асобам.

Давальніцкай сыравінай прызнаюцца сыравіна, матэрыялы, прадукцыя, якія перадаюцца іх уладальнікамі (уласнікамі) без аплаты іншым арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для вытворчасці падакцызных тавараў шляхам перапрацоўкі (дапрацоўкі), уключаючы разліў. Давальніцкай сыравінай не з'яўляюцца набытыя і (ці) выробленыя сыравіна, матэрыялы, прадукцыя, кошт якіх улічаны арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам у кошце прац (паслуг) па вытворчасці падакцызных тавараў з давальніцкай сыравіны;

2.13. адгрузка (перадача) плацельшчыкам выробленых ім пры кантрактнай вытворчасці тытунёвых вырабаў заказчыку і (ці) іншым асобам.

**Артыкул 148. Падатковая база акцызаў**

1. Падатковая база ў залежнасці ад устаноўленай у адносінах да падакцызных тавараў ставак акцызаў вызначаецца:

1.1. пры рэалізацыі (перадачы) выробленых (у тым ліку з давальніцкай сыравіны) плацельшчыкам падакцызных тавараў:

як аб'ём рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў у натуральным выяўленні – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў;

як кошт рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў, які вызначаецца зыходзячы з адпускных цэн без уліку акцызаў, – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў.

Падатковая база вызначаецца асобна па кожным відзе рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў;

1.2. пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, спагнанне акцызаў па якіх ажыццяўляецца падатковымі органамі:

як аб'ём падакцызных тавараў у натуральным выяўленні – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў;

як кошт падакцызных тавараў – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў;

1.3. пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, спагнанне акцызаў па якіх ажыццяўляецца мытнымі органамі:

як аб'ём падакцызных тавараў у натуральным выяўленні – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў;

як мытны кошт падакцызных тавараў, павялічаны на падлеглыя выплаце сумы мытных пошлін, – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў;

1.4. пры рэалізацыі (перадачы) увезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў:

як аб'ём падакцызных тавараў у натуральным выяўленні – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, увезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь без выплаты акцызаў;

як кошт падакцызных тавараў, вылічаны зыходзячы з цэн, якія прымяняюцца, без уліку акцызаў, – па падакцызных таварах, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў;

1.5. пры рэалізацыі (перадачы) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь плацельшчыкамі, вызначанымі пунктам 4 артыкула 146 гэтага Кодэкса, набытых (увезеных) падакцызных тавараў, указаных у падпункце 1.13 пункта 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса, – як аб'ём падакцызных тавараў у натуральным выяўленні па набытых (увезеных) без выплаты акцызаў падакцызных таварах;

1.6. пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні плацельшчыкамі, вызначанымі пунктамі 5 і 6 артыкула 146 гэтага Кодэкса, набытых (атрыманых) падакцызных тавараў, указаных у падпунктах 1.1, 1.6 і 1.10 пункта 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса, – як аб'ём падакцызных тавараў у натуральным выяўленні па набытых (атрыманых) з нулявой стаўкай акцызаў (без акцызаў) падакцызных таварах.

2. Пры рэалізацыі (перадачы) увезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, па цэнах без уліку акцызаў, ніжэйшых за іх мытны кошт, павялічанага на падлеглую выплаце суму мытных пошлін, падатковая база вызначаецца зыходзячы з мытнага кошту, павялічанага на падлеглыя выплаце сумы мытных пошлін.

Пры рэалізацыі (перадачы) увезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, па цэнах без уліку акцызаў, ніжэйшых за цану іх набыцця падатковая база вызначаецца зыходзячы з цаны набыцця.

3. Пры вызначэнні падатковай базы пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, кошт гэтых падакцызных тавараў, аплачаны (падлеглы аплаце) у замежнай валюце, вызначаецца ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў.

**Артыкул 149. Вызначэнне моманту фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў**

1. Момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў вызначаецца як дзень адгрузкі (перадачы) (у тым ліку адасобленаму падраздзяленню плацельшчыка) падакцызных тавараў, які прыпадае на падатковы перыяд.

Днём адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў прызнаецца дата іх водпуску, ажыццёўленага ва ўстаноўленым парадку.

Днём адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца дата адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў іх уласнікам, праваўладальнікам камісіянеру (паверанаму) або дата адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў камісіянерам (паверaным) пакупніку.

2. Плацельшчыкі пры рэалізацыі (перадачы) алкагольнай прадукцыі, слабаалкагольных напояў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнта і меншай за 7 працэнтаў (слабаалкагольных натуральных напояў, іншых слабаалкагольных напояў), віна з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў, сідраў (за выключэннем фруктова-ягадных) і (ці) піва маюць права вызначаць момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў па меры іх аплаты.

Метад вызначэння моманту фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў устанаўліваецца ўліковай палітыкай з улікам патрабаванняў, прадугледжаных часткамі трэцяй і чацвёртай гэтага пункта, і не падлягае змяненню на працягу каляндарнага года.

У выпадку рэалізацыі плацельшчыкамі права на вызначэнне моманту фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў па меры іх аплаты момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў вызначаецца як дзень, які прыпадае на падатковы перыяд:

дзень залічэння грашовых сродкаў на рахунак плацельшчыка, але не пазней за шэсцьдзясят дзён з дня адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў;

у выпадку рэалізацыі падакцызных тавараў за наяўныя грашовыя сродкі – дзень паступлення ўказаных грашовых сродкаў у касу плацельшчыка, але не пазней за шэсцьдзясят дзён з дня адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў.

Днём залічэння грашовых сродкаў на рахунак плацельшчыка пры рэалізацыі падакцызных тавараў на аснове дагавораў даручэння, камісіі і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца дзень залічэння грашовых сродкаў на рахунак камісіянера (паверанага), а ў выпадку, калі дагаворам прадугледжана, што грашовыя сродкі за рэалізаваныя камісіянерам (паверaным) падакцызныя тавары залічваюцца на рахунак плацельшчыка, – дзень залічэння грашовых сродкаў непасрэдна на рахунак плацельшчыка.

3. Пры бязвыплатнай перадачы падакцызных тавараў, рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў плацельшчыкам сваім работнікам, абмене з удзелам падакцызных тавараў, перадачы падакцызных тавараў па пагадненні аб даванні адступнога ці навацыі, па дагаворы пазыкі момант фактычнай рэалізацыі падакцызных тавараў вызначаецца як адпаведна дзень такой перадачы, абмену, які прыпадае на падатковы перыяд.

Днём абмену прызнаецца дата здзяйснення кожнай адгрузкі падакцызных тавараў.

4. Пры выкарыстанні падакцызных тавараў для ўласных патрэб момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) вызначаецца як дзень складання першаснага ўліковага дакумента, які прыпадае на падатковы перыяд, а пры адсутнасці першаснага ўліковага дакумента – дзень складання іншага дакумента, які пацвярджае выкарыстанне падакцызных тавараў для ўласных патрэб, уключаючы водпуск у вытворчасць тавараў (прац, паслуг) і іншае выбыццё.

5. Пры выкарыстанні падакцызных тавараў для вытворчасці іншых падакцызных ці непадакцызных тавараў момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) вызначаецца як дзень перадачы ў вытворчасць такіх падакцызных тавараў, які прыпадае на падатковы перыяд.

6. Момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, выраблены з давальніцкай сыравіны, вызначаецца як дзень адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў, які прыпадае на падатковы перыяд:

6.1. у адпаведнасці з афармленымі дакументамі па распараджэнні ўласніка гэтых тавараў;

6.2. у адпаведнасці з афармленымі дакументамі пры выкананні дагавору пазыкі;

6.3. у адпаведнасці з афармленымі дакументамі перапрацоўшчыку гэтых тавараў пры аплаце падакцызнымі таварамі паслуг па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны;

6.4. пры змяненні ўласніка падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны.

7. Пры кантрактнай вытворчасці тытунёвых вырабаў момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) вызначаецца як дзень адгрузкі (перадачы) выробленых тытунёвых вырабаў заказчыку і (ці) іншым асобам, які прыпадае на падатковы перыяд.

8. Пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) падакцызных тавараў не па мэтавым прызначэнні момант фактычнай рэалізацыі (перадачы) вызначаецца як дзень складання першаснага ўліковага дакумента, які прыпадае на падатковы перыяд, а пры адсутнасці першаснага ўліковага дакумента – дзень складання іншага дакумента, які пацвярджае выкарыстанне (рэалізацыю, перадачу) падакцызных тавараў не па мэтавым прызначэнні.

**Артыкул 150. Падакцызныя тавары**

1. Падакцызнымі таварамі прызнаюцца:

1.1. спірт;

1.2. алкагольная прадукцыя;

1.3. слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнта і меншай за 7 працэнтаў (слабаалкагольныя натуральныя напоі, іншыя слабаалкагольныя напоі), віна з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў.

Для мэт гэтай главы прызнаюцца:

слабаалкагольнымі натуральнымі напоямі – слабаалкагольныя напоі, якія змяшчаюць этылавы спірт толькі эндагеннага паходжання, выробленыя без выкарыстання кансервантаў (за выключэннем сарбінавай кіслаты і яе соляў), падсаладзільнікаў, штучных і ідэнтычных натуральным араматызатараў, сінтэтычных і штучных фарбавальнікаў;

іншымі слабаалкагольнымі напоямі – слабаалкагольныя напоі, за выключэннем слабаалкагольных натуральных напояў;

1.4. піва, піўны кактэйль.

Для мэт гэтай главы піўным кактэйлем прызнаецца прадукт, выраблены шляхам купажыравання піва ці спецыяльнага піва і іншых кампанентаў без дадавання этылавага рэктыфікаванага спірту з харчовай сыравіны, з колькасцю піва ў гатовым піўным кактэйлі не менш чым 50 працэнтаў;

1.5. сідры;

1.6. харчовая спіртазмяшчальная прадукцыя ў выглядзе раствораў, эмульсій, суспензій, выробленых з выкарыстаннем этылавага спірту;

1.7. нехарчовая спіртазмяшчальная прадукцыя ў выглядзе раствораў, эмульсій, суспензій, выробленых з выкарыстаннем этылавага спірту з усіх відаў сыравіны, іншых спіртазмяшчальных прадуктаў;

1.8. тытунёвыя вырабы;

1.9. аўтамабільны бензін;

1.10. дызельнае паліва;

1.11. дызельнае паліва з метылавымі эфірамі тлустых кіслот;

1.12. суднавае паліва;

1.13. газ вуглевадародны звадкаваны і газ прыродны паліўны кампрыміраваны пры іх выкарыстанні ў якасці аўтамабільнага паліва;

1.14. маслы маторныя, уключаючы маслы (вадкасці), прызначаныя для прамыўкі (ачысткі ад адкладанняў) масленых сістэм рухавікоў унутранага згарання.

2. Не прызнаюцца падакцызнымі таварамі:

2.1. спіртазмяшчальныя растворы з дэнатуруючымі дабаўкамі, кампанентамі, якія змяняюць арганалептычныя ўласцівасці этылавага спірту, дазволенымі да прымянення ў Рэспубліцы Беларусь;

2.2. спіртазмяшчальныя лекавыя сродкі, дазволеныя да прамысловай вытворчасці, рэалізацыі і медыцынскага прымянення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

2.3. спіртазмяшчальныя лекавыя сродкі, якія вырабляюцца ў аптэках па індывідуальных прызначэннях (рэцэптах) урача ці патрабаваннях (заяўках) арганізацыі аховы здароўя, уключаючы гамеапатычныя лекавыя сродкі;

2.4. спіртазмяшчальныя сродкі і прэпараты ветэрынарнага прызначэння, дапушчаныя да вытворчасці і (ці) прымянення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

2.5. спіртазмяшчальныя парфумерна-касметычныя сродкі;

2.6. пабочныя прадукты і спіртазмяшчальныя адходы, якія ўтвараюцца ў адпаведнасці з тэхналагічным працэсам пры вытворчасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь этылавага спірту, алкагольнай прадукцыі;

2.7. каньячны і пладовы спірт, вінаматэрыялы, зерневы дыстылят.

Для мэт гэтай главы прызнаюцца:

каньячным спіртам – вінны дыстылят з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 55 да 70 працэнтаў, які вырабляецца фракцыйнай перагонкай каньячнага вінаматэрыялу, увозіцца ў ёмістасцях не меншых за 200 літраў, для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі або рэалізуецца (перадаецца) для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі;

пладовым спіртам – дыстылят з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 52 да 86 працэнтаў, які вырабляецца ў выніку перагонкі (рэктыфікацыі) пладовага вінаматэрыялу, зброджанага пладова-ягаднага соку, зброджаных пладова-ягадных жамерын, дражджавых і гушчавых асадкаў, пладовага спірту-сырцу, увозіцца ў ёмістасцях не меншых за 200 літраў, для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі або рэалізуецца (перадаецца) для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі;

вінаматэрыяламі – вінаробная прадукцыя, якая ўвозіцца ў аўтадарожных ці чыгуначных цыстэрнах ёмістасцю не меншай чым 1000 дэкалітраў, для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі ці для разліву ў спажывецкую тару (упакоўку) пасля выканання ўстаноўленых тэхналагічных аперацый або рэалізуецца (перадаецца) для выкарыстання ў якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі ці для разліву ў спажывецкую тару (упакоўку) пасля выканання ўстаноўленых тэхналагічных аперацый;

зерневым дыстылятам – дыстылят, атрыманы шляхам адна- ці шматразовай перагонкі зброджанага сусла са збожжа злакавых культур (жыта, пшаніца, трыцікале) і (ці) прыгатаванага

з яго соладу да мацунку не большага за 94,8 працэнта, які выкарыстоўваецца або рэалізуецца (перадаецца) у якасці сыравіны пры вырабе алкагольнай прадукцыі;

2.8. дэзынфекавальныя сродкі;

2.9. тавары бытавой хіміі;

2.10. газ вуглевадародны звадкаваны і газ прыродны паліўны кампрымiраваны пры іх увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

2.11. тытунь, які выкарыстоўваецца ў якасці сыравіны для вытворчасці тытунёвых вырабаў.

3. Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны канцэрн па нафце і хіміі, Беларускі дзяржаўны канцэрн харчовай прамысловасці ў межах сваёй кампетэнцыі разглядаюць звароты зацікаўленых па пытаннях аднясення асобных тавараў да падакцызных і (ці) да тавараў, якія не прызнаюцца падакцызнымі, і выдаюць ім адпаведныя заключэнні.

**Артыкул 151. Вызваленне ад акцызаў пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў**

1. Вызваляюцца ад акцызаў:

1.1. спірт пры яго рэалізацыі (перадачы) для вытворчасці лекавых сродкаў, ветэрынарных прэпаратаў юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, якім дазволена іх вытворчасць;

1.2. падакцызныя тавары ўласнай вытворчасці, якія рэалізуюцца ўладальнікам магазінаў бяспошліннага гандлю для іх наступнай рэалізацыі ў такіх магазінах: алкагольныя напоі, слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнта і меншай за 7 працэнтаў, віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў, піва, піўныя кактэйлі, сідры, тытунёвыя вырабы;

1.3. канфіскаваныя па прыгаворы (пастанове) суда або накіраваныя ў даход дзяржавы іншым спосабам падакцызныя тавары, у тым ліку падакцызныя тавары, змешчаныя пад мытную працэдуру адмовы на карысць дзяржавы, якія падлягаюць рэалізацыі (перадачы), прамысловай перапрацоўцы, у тым ліку ўтылізацыі, пры іх рэалізацыі (перадачы);

1.4. падакцызныя тавары пры рэалізацыі ў магазінах бяспошліннага гандлю, а таксама ў магазінах бяспошліннага гандлю для дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў;

1.5. пры рэалізацыі (перадачы) падакцызныя тавары, змешчаныя пад мытную працэдуру экспарту, рээкспарту, а таксама вывезеныя (без абавязацельстваў аб зваротным увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза, пры ўмове пацвярджэння фактычнага вывазу падакцызных тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Дзеянне гэтага падпункта не распаўсюджваецца на рэалізацыю (перадачу) падакцызных тавараў, якія вывозяцца за межы Рэспублікі Беларусь па тавараабменных (бартэрных) аперацыях (акрамя вывазу падакцызных тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза).

2. Падставай для вызвалення ад акцызаў падакцызных тавараў, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

2.1. дагавора куплі-продажу, заключанага ім з уладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю, уключаным у рэестр уладальнікаў магазінаў бяспошліннага гандлю;

2.2. таварна-транспартнай накладной, якая пацвярджае адгрузку ім тавараў уласнай вытворчасці ўладальніку магазіна бяспошліннага гандлю;

2.3. копій дэкларацый на тавары ўласнай вытворчасці, змешчаныя пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, ці копій знешняй падачы дэкларацый на тавары ўласнай вытворчасці, змешчаныя пад мытную працэдуру бяспошліннага гандлю, калі такія дэкларацыі былі пададзены ў мытны орган уладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю ў выглядзе электроннага дакумента.

Указаныя копіі дакументаў засведчваюцца подпісам кіраўніка юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца ўладальнікам магазіна бяспошліннага гандлю, ці ўпаўнаважанай ім асобы;

2.4. сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку;

2.5. рэестра дакументаў, о пацвярджаюць рэалізацыю тавараў уласнай вытворчасці ўладальнікам магазінаў бяспошліннага гандлю, па ўстаноўленай форме, які падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах.

**Артыкул 152. Парадак дакументальнага пацвярджэння фактычнага вывазу за межы Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, змешчаных пад мытную працэдуру экспарту, рээкспарту**

1. Пацвярджэннем фактычнага вывазу падакцызных тавараў за межы Рэспублікі Беларусь з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

1.1. кантракта плацельшчыка, заключанага з нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя (перадача) падакцызных тавараў;

1.2. пацвярджэння аб вывазе падакцызных тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме).

Такое пацвярджэнне выдаюць мытныя органы ў выглядзе:

або копіі засведчанай асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа дэкларацыі на тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай экспарту, рээкспарту, а таксама з адзнакай мытнага органа «Тавар вывезены» і ўказаннем даты выдачы пацвярджэння;

або засведчанага асабістай нумарной пячаткай службовай асобы мытнага органа спецыяльнага рэестра вывезеных падакцызных тавараў з адзнакай мытнага органа «Тавар вывезены» і ўказаннем даты выдачы пацвярджэння.

Выдадзенае мытным органам пацвярджэнне плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах;

1.3. інфармацыі аб пацвярджэнні фактычнага вывазу падакцызных тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента).

Такую інфармацыю плацельшчык падае ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах у выглядзе рэестра электронных мытных дэкларацый на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з мытнай працэдурай экспарту, рээкспарту, па ўстаноўленай форме з указаннем даты дазволу на выбыццё тавару з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

2. Пацвярджэннем фактычнага вывазу падакцызных тавараў за межы Рэспублікі Беларусь праз арганізацыю ці індывідуальнага прадпрымальніка, якія аказваюць паслугі па заключэнні кантрактаў або заключылі ад імя ці па даручэнні плацельшчыка кантракт з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай, у тым ліку праводзяць мытнае дэкларaванне падакцызных тавараў, што вывозяцца (далей для мэт гэтага артыкула – пасрэднік), з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

2.1. дагавора з пасрэднікам;

2.2. копіі кантракта пасрэдніка з замежнымі арганізацыяй ці фізічнай асобай, на падставе якога рэалізуюцца падакцызныя тавары;

2.3. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у пісьмовай форме).

Такое пацвярджэнне выдаецца мытнымі органамі і падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

2.4. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэкларавання мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента).

Такая інфармацыя падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

3. Пацвярджэннем фактычнага вывазу за межы Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

3.1. кантракта на вытворчасць падакцызнай прадукцыі з давальніцкай сыравіны;

3.2. копіі кантракта ўласніка давальніцкай сыравіны, заключанага з нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, на пастаўку падакцызных тавараў, выробленых з гэтай сыравіны, за межы Рэспублікі Беларусь;

3.3. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у пісьмовай форме).

Такое пацвярджэнне выдаецца мытнымі органамі і падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

3.4. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента).

Такая інфармацыя падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

4. Пацвярджэннем фактычнага вывазу за межы Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны і рэалізаваных уласнікам праз пасрэдніка, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

4.1. кантракта на вытворчасць падакцызнай прадукцыі з давальніцкай сыравіны;

4.2. копіі кантракта ўласніка давальніцкай сыравіны з пасрэднікам;

4.3. копіі кантракта пасрэдніка, заключанага з нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, на пастаўку падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны, за межы Рэспублікі Беларусь;

4.4. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у пісьмовай форме).

Такое пацвярджэнне выдаецца мытнымі органамі і падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

4.5. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента).

Такая інфармацыя падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

5. Пацвярджэннем фактычнага вывазу за межы Рэспублікі Беларусь тытунёвых вырабаў, выробленых пры кантрактнай вытворчасці, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

5.1. дагавора на кантрактную вытворчасць тытунёвых вырабаў;

5.2. копіі дагавора (кантракта) арганізацыі – заказчыка тытунёвых вырабаў, заключанага з нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на пастаўку тытунёвых вырабаў, выробленых пры кантрактнай вытворчасці, за межы Рэспублікі Беларусь;

5.3. пацвярджэння аб вывазе тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у пісьмовай форме).

Такое пацвярджэнне выдаецца мытнымі органамі і падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

5.4. інфармацыі аб пацвярджэнні вывазу тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ажыццяўленні плацельшчыкам дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента).

Такая інфармацыя падаецца плацельшчыкам у падатковы орган у парадку, устаноўленым падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

6. Пры наяўнасці акалічнасцей, якія ўказваюць на недакладнасць дакументаў, пададзеных у адпаведнасці з пунктамі 1–5 гэтага артыкула, пацвярджэнне аб фактычным вывазе тавараў выдаецца па запыце падатковага органа тым мытным органам, які ажыццявіў выпуск тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

7. Дакументальнае пацвярджэнне фактычнага вывазу падакцызных тавараў (уключаючы выраблены з давальніцкай сыравіны) за межы Рэспублікі Беларусь праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці дзён з даты выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай. Пры надыходзе на працягу гэтага тэрміну даты падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах такія аб'ёмы рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў у падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах не адлюстроўваюцца.

Пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць фактычны вываз падакцызных тавараў за межы Рэспублікі Беларусь, такія аб'ёмы рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах таго падатковага перыяду, тэрмін падачы якой ідзе следам за атрыманнем адпаведнага дакументальнага пацвярджэння, або таго падатковага перыяду, у якім атрыманы дакументы.

Пры адсутнасці дакументаў, якія пацвярджаюць фактычны вываз падакцызных тавараў за межы Рэспублікі Беларусь, да падачы ў падатковы орган падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах таго падатковага перыяду, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін, такія аб'ёмы рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў адлюстроўваюцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах таго падатковага перыяду, у якім скончыўся ўстаноўлены тэрмін.

Пры атрыманні дакументаў, якія пацвярджаюць фактычны вываз падакцызных тавараў за межы Рэспублікі Беларусь, па якіх вылічаныя сумы акцызаў адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах, пасля сканчэння ста васьмідзесяці дзён з даты выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай плацельшчыкам у падатковы орган падаецца падатковая дэкларацыя (разлік) па акцызах з унесенымі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі за падатковы перыяд, у якім скончыліся сто восемдзесят дзён з даты выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай.

8. Пры рэалізацыі (перадачы) тытунёвых вырабаў пункты 3 і 5 гэтага артыкула прымяняюцца пры ўмове адгрузкі тытунёвых вырабаў за межы Рэспублікі Беларусь плацельшчыкамі акцызаў.

**Артыкул 153. Парадак дакументальнага пацвярджэння фактычнага вывазу тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза**

1. Пацвярджэннем фактычнага вывазу падакцызных тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

1.1. дагавора (кантракта), на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя падакцызных тавараў;

1.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, пры перамяшчэнні падакцызных тавараў па сістэме магістральных трубаправодаў – актаў прыёму-здачы тавараў;

1.3. заявы аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў, складзенай па форме, зацверджанай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, з адзнакай падатковага органа дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на тэрыторыю якой увезены тавары, аб выплаце ўскосных падаткаў (вызваленні ад падаткаабкладання ці іншым парадку выканання падатковых абавязацельстваў) (далей у гэтым артыкуле – заява аб увозе тавараў) або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў па ўстаноўленай форме.

Заява аб увозе тавараў або пералік заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах.

2. Пацвярджэннем фактычнага вывазу падакцызных тавараў плацельшчыкам у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў (далей – камітэнт) праз арганізацыі і (ці) фізічных асоб (далей – камісіянер) з'яўляецца наяўнасць у камітэнта ў сукупнасці наступных дакументаў:

2.1. дагавора камісіі, даручэння ці іншага аналагічнага дагавора;

2.2. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку падакцызных тавараў камісіянеру, і копій транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў пакупнікам;

2.3. заявы аб увозе тавараў або пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў (падаецца камітэнтам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах).

3. Пацвярджэннем фактычнага вывазу ў дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, выработаных з давальніцкай сыравіны, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

3.1. дагавора (кантракта) на вытворчасць падакцызнай прадукцыі з давальніцкай сыравіны;

3.2. копіі дагавора (кантракта) уласніка давальніцкай сыравіны, заключанага з рэзідэнтам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза на пастаўку падакцызных тавараў, выработаных з гэтай сыравіны, з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

3.3. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў ці копій транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне падакцызных тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, а пры перамяшчэнні падакцызных тавараў па сістэме магістральных трубаправодаў – актаў прыёму-здачы тавараў;

3.4. пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў або копіі заявы аб увозе тавараў (падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах).

4. Пацвярджэннем фактычнага вывазу ў дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, выработаных з давальніцкай сыравіны і рэалізаваных уласнікам праз камісіянера, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

4.1. дагавора (кантракта) на вытворчасць падакцызнай прадукцыі з давальніцкай сыравіны;

4.2. копіі дагавора (кантракта) уласніка давальніцкай сыравіны з камісіянерам;

4.3. копіі дагавора (кантракта) камісіянера, заключанага з рэзідэнтам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, на пастаўку падакцызных тавараў, выработаных з давальніцкай сыравіны, з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

4.4. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў (іх копій), якія пацвярджаюць перамяшчэнне падакцызных тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза, а пры перамяшчэнні падакцызных тавараў па сістэме магістральных трубаправодаў – актаў прыёму-здачы тавараў;

4.5. пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў або копіі заявы аб увозе тавараў (падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах).

5. Пацвярджэннем фактычнага вывазу ў дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза тытунёвых вырабаў, выработаных пры кантрактнай вытворчасці, з'яўляецца наяўнасць у плацельшчыка ў сукупнасці наступных дакументаў:

5.1. дагавора на кантрактную вытворчасць тытунёвых вырабаў;

5.2. копіі дагавора (кантракта) арганізацыі – заказчыка тытунёвых вырабаў, заключанага з рэзідэнтам дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза на пастаўку тытунёвых вырабаў, выработаных пры кантрактнай вытворчасці, з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

5.3. транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тытунёвых вырабаў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю іншай дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза;

5.4. пераліку заяў аб увозе тавараў і выплаце ўскосных падаткаў або заявы аб увозе (падаецца плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па акцызах).

6. Пры адгрузцы (перадачы) тытунёвых вырабаў палажэнні пунктаў 3 і 5 гэтага артыкула прымяняюцца пры ўмове адгрузкі (перадачы) тытунёвых вырабаў за межы Рэспублікі Беларусь плацельшчыкамі акцызаў.

7. Дакументальнае пацвярджэнне фактычнага вывазу падакцызных тавараў з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў адпаведнасці з гэтым артыкулам праводзіцца на працягу ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты адгрузкі (перадачы) падакцызных тавараў, уключаючы вырабленыя з давальніцкай сыравіны, а таксама пры кантрактнай вытворчасці тытунёвых вырабаў. Адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах аб'ёмаў рэалізаваных (перададзеных) падакцызных тавараў праводзіцца ў адносінах да ўказанага тэрміну ў парадку, вызначаным пунктам 7 артыкула 152 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 154. Вызваленне ад акцызаў пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь**

Вызваляюцца ад акцызаў пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь:

падакцызныя тавары, указаныя ў падпунктах 1.9–1.12 пункта 1 артыкула 150 гэтага Кодэкса, якія ўвозіцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, запраўка якімі ў бак і (ці) іншыя ёмістасці транспартнага сродку праведзена за межамі Рэспублікі Беларусь у аб'ёмах, прадугледжаных заводам – вытворцам транспартнага сродку;

падакцызныя тавары, якія перамяшчаюцца транзітам і ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

падакцызныя тавары, якія падлягаюць накіраванню ў даход дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

падакцызныя тавары, якія ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, прызначаны для афіцыйнага карыстання дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі замежных дзяржаў, прадстаўніцтвамі і органамі міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў ці для асабістага карыстання дыпламатычнага і (ці) адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу гэтых прадстаўніцтваў, устаноў і органаў, уключаючы членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі (калі яны не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь), дыпламатычная пошта і консульская валіза;

іншыя падакцызныя тавары ў парадку і на ўмовах, якія вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 155. Стаўкі акцызаў**

1. У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць адзіныя стаўкі акцызаў як для падакцызных тавараў, вырабленых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і для падакцызных тавараў, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і (ці) рэалізуюцца (перадаюцца) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Стаўкі акцызаў могуць устанаўлівацца:

у абсалютнай суме на фізічную адзінку вымярэння падакцызных тавараў (цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі);

у працэнтах ад кошту падакцызных тавараў ці мытнага кошту падакцызных тавараў, павялічанага на падлеглыя выплаце сумы мытных пошлін (працэнтныя (адвалорныя) стаўкі).

3. Стаўкі акцызаў па падакцызных таварах устанаўліваюцца згодна з дадаткам 1 да гэтага Кодэкса.

4. На спірт, спіртазмяшчальную прадукцыю і дызельнае паліва стаўкі акцызаў дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад мэт іх далейшага выкарыстання.

**Артыкул 156. Асаблівасці прымянення ставак акцызаў на цыгарэты з фільтрам і парадак паведамлення плацельшчыкам аб максімальных рознічных цэнах на цыгарэты з фільтрам і іх адпаведнасці цэнавым групам**

1. Стаўкі акцызаў на цыгарэты з фільтрам прымяняюцца на падставе заяўленых плацельшчыкам максімальных рознічных цэн за адзін пачак па кожнай марцы (кожным

найменні) цыгарэт з фільтрам і іх адпаведнасці адной з трох цэнавых груп, вызначаных падпунктам 9.5 пункта 9 дадатку 1 да гэтага Кодэкса (далей у гэтай главе – цэнавыя групы).

Максімальныя рознічныя цэны за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам і адпаведнасць гэтых цэн адной з трох цэнавых груп, а таксама дата пачатку іх прымянення заяўляюцца плацельшчыкам у паведамленні аб максімальнай рознічнай цане цыгарэт з фільтрам (далей – паведамленне) па ўстаноўленай форме.

Для мэт гэтай главы пад маркай (найменнем) цыгарэт з фільтрам разумеецца асартыментная пазіцыя ўказаных цыгарэт, якая адрозніваецца ад іншых марак (найменняў) адным ці некалькімі з наступных прыкмет: індывідуалізаваным знакам (назвай), прысвоеным вытворцам ці ліцэнзіярам, рэцэптурай, памерамі, упакоўкай.

2. У мэтах прымянення ставак акцызаў у адносінах да цыгарэт з фільтрам, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і (ці) вырабляюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, плацельшчык абавязаны падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне не пазней чым за дзесяць каляндарных дзён да пачатку каляндарнага месяца, пачынаючы з якога ўказаныя ў паведамленні максімальныя рознічныя цэны будуць прымяняцца. Паведамленне падаецца ў электроннай форме.

Заяўленыя плацельшчыкам у паведамленні максімальныя рознічныя цэны за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам адной з трох цэнавых груп прымяняюцца з 1-га чысла каляндарнага месяца, які ідзе следам за днём падачы паведамлення, і дзейнічаюць не менш за адзін каляндарны месяц.

Пры змяненні максімальнай рознічнай цаны за адзін пачак цыгарэт і (ці) яе адпаведнасці адной з трох цэнавых груп як на ўсе маркі (найменні), так і на адну ці некалькі марак (найменняў) цыгарэт з фільтрам плацельшчык абавязаны падаць новае паведамленне ў парадку, устаноўленым часткай першай гэтага пункта. Указаныя ў новым паведамленні максімальныя рознічныя цэны і іх адпаведнасць адной з трох цэнавых груп прымяняюцца з 1-га чысла каляндарнага месяца, які ідзе следам за днём падачы гэтага паведамлення, але не раней за сканчэнне мінімальнага тэрміну дзеяння максімальных рознічных цэн, устаноўленага часткай другой гэтага пункта.

Новае паведамленне не падаецца пры змяненні адпаведнасці максімальнай рознічнай цаны за пачак цыгарэт адной з трох цэнавых груп, вытворчасць і (ці) увоз якіх не ажыццяўляюцца.

3. Падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік плацельшчыка на працягу аднаго рабочага дня пасля падачы плацельшчыкам паведамлення накіроўвае звесткі аб максімальных рознічных цэнах за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам і іх адпаведнасці адной з трох цэнавых груп у Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь не пазней за тры рабочыя дні пасля паступлення паведамлення ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік плацельшчыка:

інфармуе Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь аб заяўленых плацельшчыкам максімальных рознічных цэнах за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, і адпаведнасці гэтых цэн адной з трох цэнавых груп, а таксама аб даце пачатку прымянення гэтых цэн;

размяшчае на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь у сетцы Інтэрнэт інфармацыю аб заяўленых плацельшчыкам максімальных рознічных цэнах за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам і адпаведнасці гэтых цэн адной з трох цэнавых груп, а таксама аб даце пачатку іх прымянення.

Інфармацыя аб заяўленых плацельшчыкамі максімальных рознічных цэнах за адзін пачак па кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам і адпаведнасці гэтых цэн адной з трох цэнавых груп знаходзіцца на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь у сетцы Інтэрнэт на працягу трох гадоў пасля сканчэння года, у якім яны заяўлены або зменены.

4. Вылічэнне і выплата акцызаў, якія спаганяюцца мытнымі органамі, у адносінах да цыгарэт з фільтрам праводзяцца на падставе максімальных рознічных цэн за адзін пачак па

кожнай марцы (кожным найменні) цыгарэт з фільтрам і адпаведнасці гэтых цэн адной з трох цэнавых груп, заяўленых плацельшчыкам у паведамленні, інфармацыя аб якім пададзена Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь у Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 3 гэтага артыкула.

Для мэт вылічэння акцызаў, якія спаганяюцца органамі, у адносінах да цыгарэт з фільтрам прымяняюцца стаўкі акцызаў у залежнасці ад установленай плацельшчыкам на гэту марку (гэта найменне) цыгарэт з фільтрам максімальнай рознічнай цаны за адзін пачак на дзень рэгістрацыі мытнай дэкларацыі мытным органам (пры ўвозе тавараў з дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза) або на дзень накіравання мытнаму органу паведамлення аб паступленні тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь (пры ўвозе тавараў з дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза), і адпаведнасці гэтай цаны адной з цэнавых груп.

5. Стаўкі акцызаў на цыгарэты з фільтрам прымяняюцца па самой высокай (трэцяй) цэнавай групе ў наступных выпадках:

пры непадачы плацельшчыкам паведамлення ў парадку, установленым часткай першай пункта 2 гэтага артыкула;

пры адсутнасці ў мытных органах інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, якая падаецца ў адпаведнасці з абзацам другім часткі другой пункта 3 гэтага артыкула, аб максімальных рознічных цэнах як на ўсе маркі (найменні), так і на адну ці некалькі марак (найменняў) цыгарэт з фільтрам на такія маркі (найменні) цыгарэт з фільтрам.

6. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі пры ажыццяўленні рознічнага гандлю цыгарэтамі з фільтрам рэалізуюць такія цыгарэты па цэнах, якія не перавышаюць заяўленыя плацельшчыкамі ў паведамленні.

**Артыкул 157. Асаблівасці прымянення ставак акцызаў для спіртоў, спіртазмяшчальнай прадукцыі і дызельнага паліва пры іх выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні**

1. Сума акцызаў падлягае вылічэнню і выплаце атрымальнікам спірту – юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь па стаўцы, установленай падпунктам 1.1 пункта 1 дадатку 1 да гэтага Кодэкса, пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні:

спірту этылавага сырцу з харчовай сыравіны, набытай (атрыманай) для вытворчасці спірту этылавага рэктыфікаванага;

спірту этылавага рэктыфікаванага з харчовай сыравіны, набытай (атрыманай) для вытворчасці алкагольнай прадукцыі, воцату і слабаалкагольных напояў;

спірту, набытага (атрыманага) для вытворчасці лекавых сродкаў, ветэрынарных прэпаратаў.

2. Сума акцызаў падлягае вылічэнню і выплаце атрымальнікам спіртазмяшчальнай прадукцыі – юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь па стаўцы, установленай падпунктам 8.1 пункта 8 дадатку 1 да гэтага Кодэкса, пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні спіртазмяшчальнай прадукцыі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш, набытай (атрыманай) для вытворчасці безалкагольных напояў.

3. Сума акцызаў падлягае вылічэнню і выплаце атрымальнікам дызельнага паліва – арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам па стаўках, установленых падпунктам 11.1 пункта 11 дадатку 1 да гэтага Кодэкса, пры выкарыстанні (рэалізацыі, перадачы) не па мэтавым прызначэнні дызельнага паліва, набытага (атрыманага) для вытворчасці дызельнага паліва з метылавымі эфірамі тлустых кіслот.

**Артыкул 158. Падатковы перыяд акцызаў**

Падатковым перыядам акцызаў прызнаецца каляндарны месяц.

**Артыкул 159. Падатковыя вылікі**

1. Агульная сума акцызаў, вызначаная ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 160 гэтага Кодэкса, змяншаецца на ўстаноўленыя гэтым артыкулам падатковыя вылікі.

2. Падатковымі вылікамі прызнаюцца сумы акцызаў:

2.1. заплачаныя пры набыцці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў, выкарыстаных для вытворчасці іншых падакцызных тавараў;

2.2. заплачаныя пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, пры наступнай рэалізацыі такіх падакцызных тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Вылік указаных сум акцызаў праводзіцца ў межах сум акцызаў, вылічаных пры рэалізацыі гэтых падакцызных тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Пры рэалізацыі (перадачы) некалькіх відаў падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, сумы акцызаў, якія падлягаюць выліку, вызначаюцца асобна па кожным відзе рэалізаванага (перададзенага) падакцызнага тавару.

3. У мэтах гэтай главы сумай акцызаў, заплачанай пры:

3.1. увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, прызнаецца сума акцызаў, якая спаганяецца пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

3.2. набыцці падакцызных тавараў, прызнаецца:

сума акцызаў, прад'яўленая (указаная) прадаўцом або ўласнікам давальніцкай сыравіны ў першасных уліковых дакументах у адпаведнасці з артыкулам 160 гэтага Кодэкса;

сума акцызаў, вылічаная плацельшчыкам пры выкарыстанні падакцызных тавараў для ўласных патрэб;

сума акцызаў, вылічаная перапрацоўшчыкам (плацельшчыкам) і атрыманая ўласнікам давальніцкай сыравіны пры атрыманні падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны.

4. Сумы акцызаў падлягаюць выліку незалежна ад даты правядзення разлікаў пры набыцці (атрыманні), увозе падакцызных тавараў пасля іх адлюстравання ў бухгалтарскім уліку і выкарыстання набытых (атрыманых), увезеных падакцызных тавараў для вытворчасці і рэалізацыі (перадачы) іншых падакцызных тавараў.

Прыняцце да выліку сум акцызаў праводзіцца плацельшчыкам у тым падатковым перыядзе, у якім набытыя (атрыманыя), увезеныя падакцызныя тавары выкарыстаны для вытворчасці іншых падакцызных тавараў і ажыццёўлена фактычная рэалізацыя (перадача) выробленых падакцызных тавараў.

5. Сумы акцызаў па падакцызных таварах, выкарыстаных для вытворчасці іншых падакцызных тавараў, вызначаюцца прапарцыянальна:

кошту падакцызных тавараў, выкарыстаных у якасці сыравіны (без акцызаў), уключанага ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю падакцызных тавараў і кошту (без акцызаў) агульнага аб'ёму наяўных у гэтым перыядзе падакцызных тавараў, што выкарыстоўваюцца ў якасці сыравіны;

аб'ёму падакцызных тавараў, выкарыстаных у якасці сыравіны, на якія ўстаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, кошт якіх уключаны ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю падакцызных тавараў у справаздачным месяцы, і агульнаму аб'ёму падакцызных тавараў, што выкарыстоўваюцца ў якасці сыравіны, на якія ўстаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, прынятых у вытворчасць;

аб'ёму адгружаных (перададзеных) падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны, і агульнаму аб'ёму падакцызных тавараў, выробленых з давальніцкай сыравіны, адгружанай (перададзенай) яго ўласнікам у мэтах вытворчасці падакцызных тавараў. Падставай для ажыццяўлення выліку ў плацельшчыка з'яўляецца наяўнасць першасных уліковых дакументаў, указаных у частцы першай пункта 9 артыкула 160 гэтага Кодэкса, з указаннем уласнікам давальніцкай сыравіны адпаведных сум акцызаў.

У выпадку выкарыстання плацельшчыкам у падатковым перыядзе набытых (атрыманых) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (увезеных на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў для вытворчасці адначасова падакцызных і непадакцызных тавараў парадак вызначэння сумы вылікаў, якая адносіцца да падакцызных тавараў, выкарыстаных для вытворчасці падакцызных тавараў, які прымяняецца на працягу каляндарнага года, зацвярджаецца ўліковай палітыкай арганізацыі, рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка.

6. Не падлягаюць выліку (вяртанню) сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (атрыманні), увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў:

6.1. уключаныя ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю (перадачы) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або аднесеныя на павелічэнне кошту набытых (атрыманых, увезеных) падакцызных тавараў;

6.2. заплачаныя па падакцызных таварах, перададзеных удзельнікам дагавора простай суполкі ў якасці ўкладу ў агульную справу, а таксама заплачаныя ўдзельнікам дагавора простай суполкі, які ажыццяўляе вядзенне агульных спраў, пры падзеле падакцызных тавараў, якія знаходзіліся ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў дагавора простай суполкі;

6.3. не ўказаныя ў першасных уліковых дакументах у адпаведнасці з артыкулам 160 гэтага Кодэкса;

6.4. заплачаныя па падакцызных таварах, прызначаных для выкарыстання ў вытворчасці іншых падакцызных тавараў, у выпадку іх беззваротнай страты ў працэсе вытворчасці, захоўвання, перамяшчэння і (ці) наступнай тэхналагічнай апрацоўкі.

7. Пры змяненні парадку прымянення падатковых вылікаў новы парадак вылікаў дзейнічае ў адносінах да падакцызных тавараў:

увезеных, з дня змянення парадку прымянення падатковых вылікаў. Дата ўвозу вызначаецца па даце выпуску падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай;

набытых у дзяржавах – членах Еўразійскага эканамічнага саюза, з дня змянення парадку прымянення падатковых вылікаў. Дата набыцця вызначаецца па даце прыняцця на ўлік падакцызных тавараў;

апрыходаваных, з дня змянення парадку прымянення падатковых вылікаў.

**Артыкул 160. Парадак вылічэння акцызаў пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў. Сума акцызаў, якая падлягае выплаце ў бюджэт. Сума акцызаў, якая прад'яўляецца плацельшчыкам да аплаты пакупніку падакцызных тавараў**

1. Сума акцызаў вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі акцызаў.

2. Агульная сума акцызаў, якая ўстанаўліваецца па выніках падатковага перыяду па ўсіх аперацыях па рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, вызначаецца шляхам складання сум, вылічаных у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула для кожнага віду падакцызнага тавару.

3. Сума акцызаў, якая падлягае выплаце плацельшчыкам у бюджэт, вызначаецца як розніца паміж агульнай сумай акцызаў, вылічанай па выніках падатковага перыяду, і сумай падатковых вылікаў, якія ўстаноўлены артыкулам 159 гэтага Кодэкса і прыпадаюць на гэты падатковы перыяд.

Калі сума падатковых вылікаў у якім-небудзь падатковым перыядзе перавышае суму акцызаў, вылічаную па рэалізаваных (перададзеных) падакцызных таварах, плацельшчык у гэтым падатковым перыядзе акцызы не плаціць, а розніца паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай акцызаў, вылічанай па выніках падатковага перыяду, падлягае ўключэнню ў склад пазарэалізацыйных расходаў або вяртанню плацельшчыку ў парадку, устаноўленым гэтай главой. Пры гэтым вяртанне розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай акцызаў, вылічанай па выніках падатковага перыяду, праводзіцца без налічэння пені.

4. Вызваленні ад падаткаабкладання акцызамі, нулявыя або іншыя стаўкі акцызаў, выключэнні з пераліку падакцызных тавараў прымяняюцца па падакцызных таварах, адгружаных (перададзеных), з дня ўстанаўлення гэтых вызваленняў, нулявых або іншых ставак акцызаў, выключэнняў.

Пры змяненні парадку вылічэння акцызаў (змяненні складу плацельшчыкаў, аб'ектаў падаткаабкладання, падатковай базы, моманту фактычнай рэалізацыі, ставак, парадку прымянення вызвалення ад акцызаў), уключэнні тавараў у пералік падакцызных тавараў новы парадак вылічэння прымяняецца па падакцызных таварах, адгружаных (перададзеных) з моманту змянення парадку падліку акцызаў, уключэння тавараў у пералік падакцызных тавараў.

5. Плацельшчык абавязаны прад'явіць да аплаты пакупніку падакцызных тавараў (уласніку давальніцкай сыравіны) адпаведную суму акцызаў. У першасных уліковых дакументах адпаведная сума акцызаў указваецца асобным радком.

6. Пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, якія ў адпаведнасці з гэтай главой вызвалены ад падаткаабкладання акцызамі, першасныя ўліковыя дакументы складаюцца без вылучэння сум акцызаў і ў іх робіцца запіс ці ставіцца штамп «Без акцызаў».

Пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, якія ў адпаведнасці з часткай другой падпункта 1.3 пункта 1 артыкула 147 гэтага Кодэкса не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання акцызамі, плацельшчыкам у першасных уліковых дакументах указваюцца сумы акцызаў, заплачаныя ім пры ўвозе гэтых падакцызных тавараў.

7. Пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў па рознічных цэнах сума акцызаў уключаецца ў цэны падакцызных тавараў. Пры гэтым на ярлыках падакцызных тавараў і цэнніках, якія выстаўляюцца прадаўцамі, а таксама на чэках і іншых дакументах, якія выдаюцца пакупніку, сума акцызаў не ўказваецца.

8. Няправільна ўказаная сума акцызаў (уключаючы неўказанне сумы акцызаў або нездзяйсненне запісу ці непастаўленне штампа «Без акцызаў») у першасных уліковых дакументах выпраўляецца на падставе акта зверкі разлікаў паміж прадаўцом (пастаўшчыком) і пакупніком (атрымальнікам) падакцызных тавараў.

9. Пры перадачы падакцызных тавараў у якасці давальніцкай сыравіны для вытворчасці падакцызных тавараў перапрацоўшчыку (плацельшчыку) уласнікам давальніцкай сыравіны ў першасных уліковых дакументах указваюцца сумы акцызаў, заплачаныя (кампенсаваныя) уласнікам пры набыцці (атрыманні, увозе) давальніцкай сыравіны.

Сума акцызаў, вылічаная плацельшчыкам, які вырабляе падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны, не ўключаецца ў цану (тарыф) прац па вытворчасці падакцызных тавараў з давальніцкай сыравіны і прад'яўляецца ўласніку давальніцкай сыравіны ў дакументах пры перадачы падакцызных тавараў для рэалізацыі права ўласніка давальніцкай сыравіны на вылік у выпадку выкарыстання атрыманых падакцызных тавараў для вытворчасці іншых падакцызных тавараў.

Сума акцызаў, якая вызначаецца як станоўчая розніца паміж сумай акцызаў, вылічанай плацельшчыкам пры адгрузцы (перадачы) выробленых з давальніцкай сыравіны падакцызных тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і сумай акцызаў, якая падлягае выліку ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 159 гэтага Кодэкса, прад'яўляецца плацельшчыкам уласніку давальніцкай сыравіны ў першасных уліковых дакументах да пакрыцця.

Сума акцызаў, якая вызначаецца як адмоўная розніца паміж сумай акцызаў, вылічанай плацельшчыкам пры адгрузцы (перадачы) выробленых з давальніцкай сыравіны падакцызных тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і сумай акцызаў, якая падлягае выліку ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 159 гэтага Кодэкса, прад'яўляецца плацельшчыкам уласніку давальніцкай сыравіны ў першасных уліковых дакументах для ўключэння ўласнікам давальніцкай сыравіны ў склад пазарэалізацыйных расходаў.

10. Пры перадачы арганізацыяй падакцызных тавараў паміж філіяламі для вытворчасці падакцызных тавараў у першасных уліковых дакументах указваюцца сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (увозе) падакцызных тавараў, якія перадаюцца, а ў выпадку, калі перадаюцца падакцызныя тавары ўласнай вытворчасці, – сумы акцызаў, вылічаныя пры такой перадачы. Аналагічны парадак прымяняецца пры перадачы падакцызных тавараў у якасці ўкладу ўдзельніка дагавора простай суполкі ў агульную справу, а таксама пры падзеле падакцызных тавараў, якія знаходзіліся ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў дагавора простай суполкі.

11. Пры перадачы камісіянерам (паверaным) падакцызных тавараў, набытых (увезеных) для камітэнтаў (давернікаў), у першасных уліковых дакументах указваюцца сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (атрыманні, увозе) гэтых падакцызных тавараў.

Пры перадачы камісіянерам (паверaным) падакцызных тавараў, атрыманых пры набыцці прац па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны, у першасных уліковых дакументах

указваюцца сумы акцызаў, прад'яўленыя вытворцам падакцызных тавараў з давальніцкай сыравіны і падлеглыя пакрыццю камісіянерам (паверaным).

Пры перадачы камітэнтамі (давернікамі) падакцызных тавараў камісіянерам (паверaным) для іх рэалізацыі ў першасных уліковых дакументах указваюцца сумы акцызаў, заплачаныя пры ўвозе гэтых падакцызных тавараў або вылічаныя пры вытворчасці падакцызных тавараў.

Камісіянерам (паверaным) пры рэалізацыі падакцызных тавараў, атрыманых ад камітэнта (даверніка), у першасных уліковых дакументах указваецца пакупнікам сума акцызаў у памеры не большым за суму акцызаў, указаную камітэнтам (давернікам) у адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага пункта.

12. Сума акцызаў, залішне прад'яўленая ў першасных уліковых дакументах прадаўцом пакупнікам падакцызных тавараў (уласніку тавараў, выраблених з давальніцкай сыравіны), падлягае вылічэнню і выплаце ў бюджэт гэтым прадаўцом, за выключэннем выпраўлення залішне прад'яўленай сумы акцызаў на падставе актаў зверкі разлікаў, падпісаных прадаўцом і пакупніком (уласнікам тавараў, выраблених з давальніцкай сыравіны). У выпадку вылучэння ў першасных уліковых дакументах акцызаў у суме меншай, чым устаноўлена гэтай главой, вылічэнне і выплата акцызаў праводзяцца плацельшчыкам па ўстаноўленых стаўках акцызаў на такія падакцызныя тавары.

Плацельшчыкі акцызаў, якія набывалі (атрымлівалі) падакцызныя тавары, па якіх прадаўцом была няправільна ўказана ці залішне прад'яўлена сума акцызаў, прымаюць да выліку ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 159 гэтага Кодэкса суму акцызаў, вылучаную прадаўцом у першасных уліковых дакументах, за выключэннем выпраўлення ўказаных сум акцызаў на падставе актаў зверкі разлікаў, падпісаных прадаўцом і пакупніком.

Плацельшчыкі акцызаў, якія няправільна вылучылі ў першасных уліковых дакументах суму акцызаў пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў у сувязі з наданнем нарматыўным прававым актам зваротнай сілы, а таксама плацельшчыкі акцызаў, якія набывалі (атрымлівалі) у іх гэтыя падакцызныя тавары, адпаведна вылічваюць і выплачваюць у бюджэт, прымаюць да выліку ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 159 гэтага Кодэкса суму акцызаў, вылучаную прадаўцом у першасных уліковых дакументах пры рэалізацыі (перадачы) падакцызных тавараў, за выключэннем выпраўлення сумы акцызаў на падставе актаў зверкі разлікаў, падпісаных прадаўцом і пакупніком.

Карэкціроўка прадаўцом вылічанай сумы акцызаў, а пакупніком – сум падатковых вылікаў праводзіцца ў месяцы, у якім прадаўцом была няправільна ўказана ці залішне прад'яўлена сума акцызаў, а пакупніком гэта сума акцызаў прынята да выліку.

Гэты пункт распаўсюджваецца таксама на:

камісіянераў (паверaных), якія набываюць (атрымліваюць) падакцызныя тавары (працы па вытворчасці тавараў з давальніцкай сыравіны) на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў і прад'яўляюць сумы акцызаў да пакрыцця камітэнтам (давернікам), а таксама рэалізуюць падакцызныя тавары;

камітэнтаў (давернікаў), якія перадалі падакцызныя тавары камісіянерам (паверaным) для рэалізацыі;

плацельшчыкаў, у якіх рэалізацыя (перадача) падакцызных тавараў вызваляецца ад акцызаў;

арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія не з'яўляюцца плацельшчыкамі акцызаў;

уласнікаў давальніцкай падакцызнай сыравіны ў адносінах да залішне ўказаных сум акцызаў у першасных уліковых дакументах, што складаюцца пры перадачы ўказанай сыравіны плацельшчыку, які вырабляе падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны;

уласнікаў давальніцкай падакцызнай сыравіны ў адносінах да залішне ўказаных сум акцызаў у першасных уліковых дакументах, якія складаюцца пры атрыманні ад перапрацоўшчыка (плацельшчыка) падакцызнага тавару, выраблeнага з указанай сыравіны;

плацельшчыкаў, якія вырабляюць падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны;

філіялы арганізацыі ў адносінах да залішне ўказаных сум акцызаў у першасных уліковых дакументах, якія складаюцца пры перадачы падакцызных тавараў паміж гэтымі філіяламі;

удзельнікаў дагавора простай суполкі, якія перадаюць падакцызныя тавары ў якасці ўкладу ў агульную справу, а таксама на ўдзельніка дагавора простай суполкі, які ажыццяўляе вядзенне агульных спраў, пры падзеле падакцызных тавараў, якія знаходзіліся ў агульнай уласнасці ўдзельнікаў дагавора простай суполкі, у адносінах да залішне ўказаных сум акцызаў у першасных уліковых дакументах, якія складаюцца пры перадачы падакцызных тавараў у якасці ўкладу ў агульную справу, ажыццяўленні падзелу падакцызных тавараў.

13. У выпадку вяртання падакцызных тавараў, па якіх акцызы вылічаны і заплачаны, заплачаныя сумы акцызаў па гэтых таварах выключаюцца з сум, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт за той падатковы перыяд, у якім мела месца вяртанне падакцызных тавараў.

**Артыкул 161. Сума акцызаў, якая падлягае выліку ў поўным аб'ёме (вяртанню)**

1. Сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (атрыманні), увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, выкарыстаных у вытворчасці іншых падакцызных тавараў, вывезеных за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падлягаюць выліку ў поўным аб'ёме (вяртанню). Вылік такіх сум акцызаў ажыццяўляецца ў асоб, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі акцызаў, пры наяўнасці ў плацельшчыка (пры падачы плацельшчыкам у падатковы орган па месцу пастаноўкі на ўлік ва ўстаноўленых выпадках) дакументаў, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 артыкула 152 і пунктамі 1 і 2 артыкула 153 гэтага Кодэкса.

Пры гэтым выліку ў поўным аб'ёме (вяртанню) падлягаюць сумы акцызаў, заплачаныя па падакцызных таварах, выкарыстаных у якасці сыравіны, кошт якіх фактычна аднесены (спісаны) на сабекошт вывезеных падакцызных тавараў.

2. Сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (атрыманні), увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, выкарыстаных у якасці давальніцкай сыравіны для вытворчасці іншых падакцызных тавараў, вывезеных за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падлягаюць выліку ў поўным аб'ёме (вяртанню). Вылік такіх сум акцызаў ажыццяўляецца ў асоб, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі акцызаў, вырабляюць падакцызныя тавары з давальніцкай сыравіны, пры наяўнасці ў плацельшчыка (пры падачы плацельшчыкам у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік ва ўстаноўленых выпадках) дакументаў, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 артыкула 152 і пунктамі 3 і 4 артыкула 153 гэтага Кодэкса.

Пры гэтым выліку ў поўным аб'ёме (вяртанню) падлягаюць сумы акцызаў, прад'яўленыя ўладальнікамі (уласнікамі) падакцызных тавараў у адпаведнасці з пунктам 9 артыкула 160 гэтага Кодэкса. Такія сумы акцызаў падлягаюць перадачы (заліку) уладальнікам (уласнікам) указанай сыравіны для пакрыцця іх расходаў на выплату (пакрыццё) сум акцызаў пры набыцці (атрыманні), увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў.

3. Вяртанне ўказанай плацельшчыкам у падатковай дэкларацыі (разліку) па акцызах розніцы паміж сумай падатковых вылікаў, якія падлягаюць выліку ў поўным аб'ёме, і агульнай сумай акцызаў, вылічанай па выніках падатковага перыяду, ажыццяўляецца падатковым органам па месцы пастаноўкі плацельшчыка на ўлік у парадку, установленым артыкулам 66 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 162. Парадак вылічэння акцызаў, якія спаганяюцца мытнымі органамі. Сума акцызаў, якая падлягае выплаце ў бюджэт, і тэрмін яе выплаты**

1. Падлеглая выплаце ў бюджэт сума акцызаў, якая спаганяецца мытнымі органамі пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі акцызаў.

2. Мытным заканадаўствам у залежнасці ад мытнай працэдуры ўстанаўліваюцца асаблівасці вылічэння сум акцызаў, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт і спаганяюцца мытнымі органамі пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, за выключэннем увозу з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь.

3. Пры ўвозе з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, акцызы вылічваюцца плацельшчыкам акцызаў самастойна з прымяненнем дакумента «Разлік акцызаў, якія падлягаюць выплаце», форму і парадак запаўнення якога вызначае Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь (за выключэннем выпадку вынясення мытным органам

рашэння аб спагнанні акцызаў, пры якім вылічэнне падлеглых выплаце акцызаў праводзіцца мытным органам).

Вылічэнне сум падлеглых выплаце акцызаў праводзіцца ў беларускіх рублях.

У выпадках, калі для вылічэння акцызаў, а таксама вызначэння мытнага кошту тавараў патрабуецца правесці пералік замежнай валюты ў беларускія рублі, прымяняецца афіцыйны курс Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўлены на дзень, указаны ў частках другой і трэцяй пункта 4 гэтага артыкула.

4. Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, прамаркіраваных акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, абавязак па выплаце акцызаў:

узнікае ў асобы, якая набыла акцызныя маркі Рэспублікі Беларусь для маркіроўкі тавараў, якія ўвозяцца і падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, з моманту ўвозу такіх тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

спыняецца ў выпадках, устаноўленых пунктам 2 артыкула 54 Мытнага кодэкса Еўразійскага эканамічнага саюза;

падлягае выкананню да або адначасова з паведамленнем мытнаму органу, які выдаў акцызныя маркі Рэспублікі Беларусь, аб паступленні тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, і месцы іх размяшчэння для правядзення кантролю за захаваннем правілаў маркіроўкі і іншых патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам.

Для вылічэння акцызаў прымяняюцца заканадаўчыя акты, якія рэгулююць пытанні падаткаабкладання і дзейнічаюць на дзень накіравання мытнаму органу паведамлення аб паступленні тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь.

Пры непаведамленні мытнаму органу, які выдаў акцызныя маркі Рэспублікі Беларусь, аб паступленні тавараў, што падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь і ўвозяцца з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, выкарыстанні і (ці) распараджэнні імі да правядзення мытнымі органамі кантролю за захаваннем правілаў маркіроўкі і іншых патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам, абавязак па выплаце акцызаў падлягае выкананню ў дзень выкарыстання тавараў і (ці) распараджэння імі, а калі гэты дзень не вызначаны, у дзень выяўлення фактаў выкарыстання і (ці) распараджэння такімі таварамі ў памерах, якія адпавядаюць сумам акцызаў, што падлягалі б выплаце пры змяшчэнні такіх тавараў пад мытную працэдуру для ўнутранага спажывання, вылічаным на дзень выкарыстання і (ці) распараджэння імі, а калі гэты дзень не вызначаны, на дзень выяўлення фактаў выкарыстання і (ці) распараджэння такімі таварамі.

5. Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, без нанесеных акцызных марак Рэспублікі Беларусь узнікненне, спыненне і тэрмін выканання абавязку па выплаце акцызаў вызначаюцца ў парадку, устаноўленым артыкулам 56 Мытнага кодэкса Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Артыкул 163. Тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і выплаты акцызаў**

1. Плацельшчыкі штомесяц падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

2. Выплата акцызаў праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

3. Парадак і тэрміны выплаты акцызаў, што спаганяюцца мытнымі органамі пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, за выключэннем увозу з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, вызначаюцца мытным заканадаўствам.

4. Пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, акцызы выплачваюцца на рахункі па ўліку сродкаў рэспубліканскага бюджэту, адкрытыя ў адпаведнасці з заканадаўствам для мытных органаў,

упаўнаважаных Дзяржаўным мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю акцызных марак, у тэрміны, устаноўленыя абзацам чацвёртым часткі першай пункта 4 артыкула 162 гэтага Кодэкса.

Разлік акцызаў, якія падлягаюць выплаце, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць факт выплаты акцызаў, падаюцца мытнаму органу адначасова з паведамленнем мытнаму органу аб паступленні тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 164. Уключэнне сум акцызаў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або аднясенне іх на павелічэнне кошту падакцызных тавараў**

1. Сума акцызаў, заплачаная пры набыцці (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў, якія выкарыстоўваюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пры вытворчасці і (ці) рэалізацыі прадукцыі, тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), уключаецца ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў або адносіцца на павелічэнне кошту ўказаных падакцызных тавараў, за выключэннем сум акцызаў, заплачаных:

1.1. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пры набыцці (атрыманні) падакцызных тавараў (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў), выкарыстаных пры вытворчасці іншых падакцызных тавараў;

1.2. пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь падакцызных тавараў, у адносінах да якіх устаноўлены працэнтныя (адвалорныя) стаўкі акцызаў, – у выпадку іх наступнай рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Сума акцызаў, заплачаная ўласнікам давальніцкай сыравіны пры набыцці (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) такой сыравіны, выкарыстанай пры вытворчасці непадакцызных тавараў, уключаецца ўласнікам давальніцкай сыравіны ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю гэтых непадакцызных тавараў або адносіцца на павелічэнне кошту ўказаных падакцызных тавараў.

Вылічаная сума акцызаў, прад'яўленая перапрацоўшчыкам (плацельшчыкам) уласніку давальніцкай сыравіны, уключаецца ўласнікам давальніцкай сыравіны ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю падакцызных тавараў, выробленых з указанай сыравіны, за выключэннем выпадкаў выкарыстання (перадачы) уласнікам давальніцкай сыравіны такіх падакцызных тавараў для далейшай вытворчасці іншых падакцызных тавараў, або адносіцца на павелічэнне кошту ўказаных падакцызных тавараў.

3. Разлік сумы акцызаў, якая падлягае ўключэнню ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, праводзіцца метадам удзельнай вагі ці метадам раздзельнага ўліку напрамку выкарыстання падакцызных тавараў.

Пры метадзе ўдзельнай вагі ўключэнне сум акцызаў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў праводзіцца прапарцыянальна кошту падакцызных тавараў, выкарыстаных пры вытворчасці тавараў (пры ўстаноўленай працэнтнай (адвалорнай) стаўцы акцызаў), ці аб'ёму падакцызных тавараў (пры ўстаноўленай цвёрдай (спецыфічнай) стаўцы акцызаў), выкарыстаных пры вытворчасці тавараў.

Пры метадзе раздзельнага ўліку напрамку выкарыстання падакцызных тавараў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў уключаецца сума акцызаў, фактычна заплачаная пры набыцці (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў, выкарыстаных пры вытворчасці тавараў.

Прыменены на працягу каляндарнага года метад разліку сум акцызаў зацвярджаецца ўліковай палітыкай арганізацыі, рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка. Пры адсутнасці ва ўліковай палітыцы арганізацыі, рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка ўказання аб прыменёным метадзе разліку сум акцызаў уключэнне сум акцызаў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў праводзіцца метадам удзельнай вагі.

4. Плацельшчык мае права ўключаць сумы акцызаў, заплачаныя пры набыцці (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў, выкарыстаных пры вытворчасці іншых падакцызных тавараў, у затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю выробленых падакцызных тавараў або адносіць на павелічэнне кошту ўказаных падакцызных тавараў.

Пры аднясенні сум акцызаў, заплачаных пры набыцці (увозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь) падакцызных тавараў, на павелічэнне кошту ўказаных падакцызных тавараў, такія сумы акцызаў не ўдзельнічаюць у размеркаванні сум акцызаў у парадку, прадугледжаным пунктам 3 гэтага артыкула.

**Артыкул 165. Асаблівасці спагнання акцызаў пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь**

1. Пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, за выключэннем увозу з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, і надыходзе іншых акалічнасцей, з наяўнасцю якіх мытнае заканадаўства звязвае ўзнікненне абавязку па выплаце акцызаў, а таксама пры ўвозе з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, акцызы спаганяюцца мытнымі органамі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і (ці) мытным заканадаўствам.

2. Пры ўвозе падакцызных тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, за выключэннем падакцызных тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, падатковыя органы спаганяюць акцызы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі падатковага заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

## ГЛАВА 16
## ПАДАТАК НА ПРЫБЫТАК

**Артыкул 166. Плацельшчыкі падатку на прыбытак**

Плацельшчыкамі падатку на прыбытак (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі.

**Артыкул 167. Аб'ект падаткаабкладання падаткам на прыбытак**

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаткам на прыбытак прызнаюцца валавы прыбытак, а таксама дывідэнды і прыраўнаваныя да іх даходы (далей у гэтай главе – дывідэнды), налічаныя беларускімі арганізацыямі.

Да прыраўнаваных да дывідэндаў даходаў адносіцца любы даход, налічаны ўнітарным прадпрыемствам уласніку яго маёмасці – юрыдычнай асобе Рэспублікі Беларусь.

2. Валавым прыбыткам у мэтах гэтай главы прызнаецца:

для беларускіх арганізацый (за выключэннем банкаў) – сума прыбытку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў;

для банкаў – сума прыбытку ад дзейнасці банкаў, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, з улікам палажэнняў гэтай главы;

для замежных арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, – сума прыбытку замежнай арганізацыі, атрыманая праз пастаяннае прадстаўніцтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў.

Валавы прыбытак вызначаецца з улікам карэкціровак, якія праводзяцца ў адпаведнасці з палажэннямі главы 11 гэтага Кодэкса.

3. Пры вызначэнні валавога прыбытку філіяламі, якія выконваюць падатковыя абавязацельствы юрыдычнай асобы, улічваецца сума прыбытку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў, ад дзейнасці ўказаных філіялаў.

4. Валавы прыбытак беларускай арганізацыі вылічваецца з улікам прыбытку (страты) ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў, ад дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку ад дзейнасці, па якой яна зарэгістравана ў якасці плацельшчыка падаткаў замежнай дзяржавы.

5. Плацельшчыкі, якія выкарыстоўваюць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам асаблівыя рэжымы падаткаабкладання, пры вызначэнні валавога прыбытку не ўлічваюць даходы і расходы, што адносяцца да такіх рэжымаў.

Пры пераходзе з асаблівага рэжыму падаткаабкладання на агульны парадак падаткаабкладання ў мэтах вызначэння валавога прыбытку прымаюцца затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, панесеныя ў перыяд прымянення асаблівага рэжыму падаткаабкладання, але адносяцца да выручкі, атрыманай у перыяд прымянення агульнага парадку падаткаабкладання.

6. Пры вызначэнні валавога прыбытку не ўлічваюцца грашовыя сродкі ці маёмасць, атрыманыя арганізацыяй ад удзельнікаў (акцыянераў) у якасці ўзносаў (укладаў) у яе статутны фонд у памерах, прадугледжаных статутам (для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавору, – устаноўчым дагаворам).

7. Станоўчая розніца паміж ацэначным коштам маёмасці, якая перадаецца плацельшчыкам у якасці неграшовага ўзносу (укладу) у статутны фонд іншага плацельшчыка, і балансавым коштам (астаткавым коштам – для асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя каштоўнасці) гэтай маёмасці ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку плацельшчыка, які перадае гэту маёмасць.

Адмоўная розніца паміж ацэначным коштам маёмасці, якая перадаецца плацельшчыкам у якасці неграшовага ўзносу ў статутны фонд іншага плацельшчыка, і балансавым коштам (астаткавым коштам – для асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя каштоўнасці) гэтай маёмасці не ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку плацельшчыка, які перадае гэту маёмасць.

8. Калі сума грашовых сродкаў або затрат на вытворчасць або набыццё тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг), маёмасных правоў ці астаткавы кошт асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, якія перадаюцца ў абмен на выкупленыя арганізацыяй акцыі ўласнай эмісіі, долі (часткі долей) у статутных фондах, паі (часткі паёў), перавышаюць намінальны кошт указаных акцый, першапачатковы кошт долей, паёў (іх частак), такая розніца не ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку плацельшчыка, які перадае грашовыя сродкі, маёмасць наўзамен выкупленых акцый уласнай эмісіі, долей (частак долей) у статутных фондах, паёў (частак паёў).

9. Страты ўдзельнікаў (акцыянераў) ліквідаваных ці рэарганізаваных плацельшчыкаў, якія ўтварыліся ў сувязі з такой ліквідацыяй ці рэарганізацыяй, пры вызначэнні валавога прыбытку гэтых удзельнікаў (акцыянераў) не ўлічваюцца.

10. Страты беларускіх арганізацый, рэарганізаваных у форме далучэння, зліцця, раздзялення, вылучэння, атрыманыя імі ў час ажыццяўлення дзейнасці да гэтай рэарганізацыі, не ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку плацельшчыка, да якога былі далучаны гэтыя арганізацыі, а таксама валавога прыбытку плацельшчыкаў, якія нанава ўзніклі ў выніку рэарганізацыі.

Страты філіялаў, ліквідаваных у выніку змянення структуры юрыдычных асоб, атрыманыя імі ў час ажыццяўлення дзейнасці да гэтай ліквідацыі, не ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку арганізацыі, якой былі ліквідаваны гэтыя філіялы.

11. Не з'яўляюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на прыбытак:

11.1. даходы, якія атрымліваюць эмітэнты ад размяшчэння акцый;

11.2. прыбытак ад адчужэння маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры якім атрыманыя грашовыя сродкі падлягаюць накіраванню ў бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, якія рэгулююць парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, і (ці) на мэты, вызначаныя гэтымі актамі заканадаўства, або падлягаюць размеркаванню згодна з указанымі актамі заканадаўства;

11.3. прыбытак ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу даўжніка ў працэдуры конкурснага вядзення;

11.4. прыбытак дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, якія фінансуюцца з бюджэту, ад рэалізацыі вырабаў, выробленых у рамках лячэбна-працоўнай дзейнасці і на занятках у гуртках па інтарэсах, а таксама пры правядзенні мерапрыемстваў па развіцці даступных працоўных навыкаў інвалідаў;

11.5. даходы ад ацэнкі каштоўных папер па справядлівым кошце.

12. Страты ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, прыбытак ад рэалізацыі якіх у адпаведнасці з гэтым артыкулам і іншымі заканадаўчымі актамі не з'яўляецца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на прыбытак, пры падаткаабкладанні не ўлічваюцца.

13. Адмоўная розніца паміж даходамі і расходамі па аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, якія не абарачаюцца на арганізаваным рынку каштоўных папер, базавым актывам якіх выступае замежная валюта, правы (патрабаванні) па якіх спынены шляхам узаемазаліку (частковага ўзаемазаліку) патрабаванняў, пры падаткаабкладанні прыбытку не ўлічваецца.

**Артыкул 168. Прыбытак (страта) ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў**

1. Прыбытак (страта) ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад іх рэалізацыі на аплатнай аснове, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі, і затратамі, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам.

У выручку не ўключаецца кошт бязвыплатна перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы затраты на іх бязвыплатную перадачу.

2. Прыбытак (страта) ад рэалізацыі асноўных сродкаў вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад іх рэалізацыі на аплатнай аснове, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі, і іх астаткавым коштам, а таксама затратамі па іх рэалізацыі.

Прыбытак (страта) ад рэалізацыі нематэрыяльных актываў вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад іх рэалізацыі на аплатнай аснове, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі, і іх астаткавым коштам, а таксама затратамі па іх рэалізацыі.

3. Прыбытак (страта) ад адчужэння ўдзельнікам долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад яе (яго) рэалізацыі на аплатнай аснове і сумай узносу (укладу) гэтага ўдзельніка ў статутны фонд арганізацыі або фактычна праведзеных (аплачаных) удзельнікам расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паю) арганізацыі, вылічаных у выпадку адчужэння часткі долі (часткі паю) зыходзячы з удзельнай вагі адчужальнай часткі долі (часткі паю) у долі ў статутным фондзе (паі) гэтага ўдзельніка.

Пры гэтым сума ўкладу ці расходы на набыццё долі ў статутным фондзе (паю) арганізацыі падлягаюць памнажэнню на адносіны афіцыйных курсаў беларускага рубля, устаноўленых Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у адносінах да долара ЗША на дату прызнання выручкі і на дату фактычнага ўнясення ўкладу або фактычнага ажыццяўлення (аплаты) расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паю) арганізацыі.

Пры падаткаабкладанні прыбытку ад рэалізацыі на аплатнай аснове долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі ў якасці расходаў таксама ўлічваюцца сумы, указаныя ў падпункце 3.3 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

4. Прыбытак (страта) ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу (за выключэннем рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу ўласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства (установы)) вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад яго рэалізацыі на аплатнай аснове, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі, і розніцай паміж актывамі і абавязацельствамі, якія вызначаюцца па перадатачным акце, а таксама расходамі, звязанымі з рэалізацыяй прадпрыемства як маёмаснага комплексу.

Прыбытак (страта) ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу ўласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства (установы) вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж выручкай ад яго рэалізацыі на аплатнай аснове, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія падлічваюцца з выручкі, сумай яго ўкладу ў статутны фонд унітарнага прадпрыемства ці сумай фактычна праведзеных ім расходаў на набыццё прадпрыемства як маёмаснага комплексу, а таксама сумай грашовых сродкаў і (ці) коштам іншай маёмасці, раней перададзеных унітарнаму прадпрыемству (установе) у гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне, і расходамі, звязанымі з рэалізацыяй прадпрыемства як маёмаснага комплексу.

Пры гэтым памер выручкі ад рэалізацыі на аплатнай аснове прадпрыемства як маёмаснага комплексу і сума ўкладу ў статутны фонд унітарнага прадпрыемства ці фактычна праведзеныя ўласнікам маёмасці расходы на набыццё прадпрыемства як маёмаснага комплексу, а таксама сума грашовых сродкаў і (ці) кошт іншай маёмасці, раней перададзеных унітарнаму прадпрыемству (установе) у гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне, падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату прызнання выручкі і на дату фактычнага ўнясення ўкладу ў статутны фонд ці ажыццяўлення расходаў на набыццё прадпрыемства як маёмаснага комплексу, а таксама на дату перадачы грашовых сродкаў і (ці) іншай маёмасці ўнітарнаму прадпрыемству (установе) у гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне.

5. Для мэт гэтай главы ў адносінах да рэалізацыі іншых актываў прымяняюцца палажэнні, устаноўленыя для рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой.

6. Да даходаў ад аперацый з фінансавымі інструментамі, акрамя ўказаных у артыкуле 179 гэтага Кодэкса, адносяцца даходы ад ацэнкі фінансавых інструментаў па амартызаваным кошце (за выключэннем сумы аднаўлення абясцэнення).

7. Выручка ад рэалізацыі на аплатнай аснове тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў адлюстроўваецца на дату прызнання яе ў бухгалтарскім уліку незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх з захаваннем прынцыпу (метаду) налічэння ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, з улікам палажэнняў гэтага пункта.

Па дагаворах, у якія сума абавязацельстваў выражана ў беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце, выручка ад рэалізацыі на аплатнай аснове тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў прымаецца ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату прызнання яе ў бухгалтарскім уліку, а ў выпадках, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства папярэднічае даце выканання абавязацельстваў па аплаце ці супадае з гэтай датай, – у падлеглай аплаце суме ў беларускіх рублях.

Пад датай вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы разумеецца дата, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам ці пагадненнем бакоў вызначаецца падлеглая аплаце сума ў беларускіх рублях па абавязацельствах па дагаворы, выражаных у беларускіх рублях у суме, эквівалентнай суме ў замежнай валюце.

Дата адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў вызначаецца ў адпаведнасці з уліковай палітыкай арганізацыі, але не можа быць пазнейшай за:

дату іх водпуску пакупніку (атрымальніку ці арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), якая ажыццяўляе перавозку (экспедзіраванне) тавараў, ці арганізацыі сувязі), калі прадавец не ажыццяўляе дастаўку (транспарціроўку) тавараў або не праводзіць затрат па дастаўцы (транспарціроўцы);

у іншых выпадках найбольш раннюю з наступных дат: дату перадачы пакупніку (атрымальніку) або дату перадачы арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), якія ажыццяўляюць перавозку (экспедзіраванне) тавараў, аплату паслуг якой праводзіць пакупнік.

Пры рэалізацыі тавараў па рознічных цэнах у рознічным гандлі і (ці) грамадскім харчаванні дата адлюстравання выручкі вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

8. Датай адлюстравання выручкі ад выканання прац, аказання паслуг прызнаецца дата яе прызнання ў бухгалтарскім уліку.

9. Датай перадачы маёмасных правоў прызнаецца дзень, вызначаны ў адпаведнасці з пунктам 8 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

10. Датай адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных праў камітэнтам (давернікам) пры іх рэалізацыі па адпаведных дагаворах прызнаецца па выбары плацельшчыка адна з наступных дат:

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе;

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камісіянерам, паверанымі ці іншай аналагічнай асобай пакупніку, заказчыку.

Выбраны плацельшчыкам парадак вызначэння дня адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў адлюстроўваецца ва ўліковай палітыцы арганізацыі і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

11. Датай адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў, перадачы маёмасных праў даручальнікам пры іх рэалізацыі даверным кіраўніком прызнаецца дата адгрузкі тавараў, перадачы маёмасных правоў даверным кіраўніком пакупніку.

12. Датай налічэння дывідэндаў з'яўляецца дата прыняцця рашэння аб размеркаванні прыбытку шляхам абвяшчэння і выплаты дывідэндаў, а па прыраўнаваных да іх даходах, налічаных унітарнымі прадпрыемствамі, – дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку абавязацельстваў па выплаце (перадачы) такіх даходаў.

13. У выпадку вяртання пакупніком (заказчыкам) прадаўцу (выканаўцу) тавараў (адмовы ад выкананых прац, аказаных паслуг, маёмасных правоў) ці змяншэння (павелічэння) кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у прадаўца (выканаўцы) падлягаюць карэкціроўцы выручка і (ці) адпаведныя ёй затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, у тым справаздачным перыядзе, у якім мела месца вяртанне тавараў (адмова ад выкананых прац, аказаных паслуг, маёмасных правоў) ці праведзена змяншэнне (павелічэнне) кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а ў пакупніка (заказчыка) у гэтым справаздачным перыядзе праводзіцца адпаведная карэкціроўка затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

У выпадку скасавання (спынення) дагавора арэнды (лізінгу) ці змяншэння (павелічэння) арэнднай платы (лізінгавай выплаты) у арэндадаўца (лізінгадавальніка) падлягаюць карэкціроўцы пазарэалізацыйныя даходы і (ці) пазарэалізацыйныя расходы ў тым справаздачным перыядзе, у якім мела месца скасаванне (спыненне) дагавору арэнды (лізінгу) ці праведзена змяншэнне (павелічэнне) арэнднай платы (лізінгавай выплаты), а ў арандатара (лізінгаатрымальніка) у гэтым справаздачным перыядзе праводзіцца адпаведная карэкціроўка затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

Палажэнні частак першай і другой гэтага пункта не прымяняюцца і праводзіцца карэкціроўка выручкі, затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, пазарэалізацыйных даходаў і (ці) пазарэалізацыйных расходаў адпаведна за той справаздачны перыяд, у якім яны былі ўключаны ў падатковую базу:

пры вяртанні тавараў (адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг, маёмасных правоў) ці змяншэнні кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, прыбытак ад рэалізацыі якіх у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь вызваляецца ад падаткаабкладання падаткам на прыбытак (ад выплаты падатку на прыбытак) ці абкладаецца падаткам на прыбытак па паніжанай стаўцы;

плацельшчыкамі, у якіх рэалізацыя тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, у адносінах да якіх праводзяцца вяртанне (адмова) ці змяншэнне кошту, арэнднай платы (лізінгавага плацяжу), не ўлічваліся для мэт вылічэння падатку на прыбытак у сувязі з прымяненнем асаблівага рэжыму падаткаабкладання;

пры вяртанні тавараў (адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці змяншэнні кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, скасаванні (спыненні) дагавора арэнды (лізінгу) ці змяншэнні (павелічэнні) арэнднай платы (лізінгавага плацяжу), калі прычынай іх ажыццяўлення з'яўляецца патрабаванне (паведамленне, ініцыятыва) трэціх асоб, а не пагадненне бакоў.

У выпадку вяртання пакупніком (заказчыкам) прадаўцу (выканаўцу) тавараў (адмовы ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці змяншэння (павелічэння) кошту

тавараў (прац, паслуг), скасавання (спынення) дагавора арэнды (лізінгу) ці змяншэння (павелічэння) арэнднай платы (лізінгавага плацяжу) у перыяд прымянення арганізацыяй асаблівага рэжыму падаткаабкладання, у якім выручка ад іх рэалізацыі (пазарэалізацыйныя даходы) улічвалася (улічваліся) ёю пры вылічэнні падатковай базы падатку на прыбытак у каляндарным годзе, які папярэднічае году, у якім праведзены вяртанне (адмова), скасаванне (спыненне) ці змяншэнне (павелічэнне) кошту, арэнднай платы (лізінгавага плацяжу), змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на прыбытак за апошні справаздачны перыяд такога папярэдняга каляндарнага года.

У выпадку вяртання пакупніком (заказчыкам) прадаўцу (выканаўцу) тавараў (адмовы ад выкананых прац, аказаных паслуг, маёмасных правоў) ці змяншэння (павелічэння) кошту тавараў (прац, паслуг), скасавання (спынення) дагавора арэнды (лізінгу) ці змяншэння (павелічэння) арэнднай платы (лізінгавага плацяжу) у перыяд прымянення арганізацыяй адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, у якім выручка ад іх рэалізацыі (пазарэалізацыйныя даходы) улічвалася (улічваліся) ёю пры вылічэнні падатковай базы падатку на прыбытак у каляндарным годзе, у якім праведзены вяртанне (адмова), скасаванне (спыненне) ці змяншэнне (павелічэнне) кошту, арэнднай платы (лізінгавага плацяжу), змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на прыбытак за той справаздачны перыяд, у якім выручка ад іх рэалізацыі (пазарэалізацыйныя даходы) улічвалася (улічваліся) пры вылічэнні падатковай базы падатку на прыбытак.

**Артыкул 169. Затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні**

1. Затратамі, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, прызнаюцца эканамічна абгрунтаваныя затраты, якія вызначаюцца на падставе дакументаў бухгалтарскага ўліку (пры неабходнасці праз правядзенне разліковых карэкціровак да даных бухгалтарскага ўліку ў рамках вядзення падатковага ўліку), калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам і (ці) заканадаўствам.

Да затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, адносяцца:

затраты на вытворчасць і рэалізацыю затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтай главе – затраты па вытворчасці і рэалізацыі);

затраты, якія нарміруюцца.

2. Пры вызначэнні валавога прыбытку філіяламі прымаюцца затраты па дзейнасці гэтых філіялаў, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні.

Пры прыняцці беларускай арганізацыяй рашэння аб перадачы затрат, звязаных з кіраваннем арганізацыяй, філіялам у якасці затрат у апошніх прымаюцца затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, размеркаваныя паміж усімі філіяламі незалежна ад вынікаў іх фінансава-гаспадарчай дзейнасці прапарцыянальна крытэрыю, вызначанаму ўліковай палітыкай арганізацыі.

3. Затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, да якога яны адносяцца (прынцып налічэння), незалежна ад часу (тэрміну) выплаты (папярэдняя ці наступная).

Пры вызначэнні прыбытку ад рэалізацыі выраблених тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), а таксама набытых тавараў прымаюцца затраты, якія адносяцца на фактычна рэалізаваныя тавары (працы, паслугі), разлічаныя на аснове даных бухгалтарскага ўліку, калі такое размеркаванне прадугледжана заканадаўствам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці.

4. Эканамічна абгрунтаванымі затратамі не могуць быць прызнаны расходы пры наяўнасці хаця б аднаго з наступных крытэрыяў:

4.1. фактычна не паступіў тавар (нематэрыяльныя актывы), не выкананы працы, не аказаны паслугі, не перададзены маёмасныя правы;

4.2. працы выкананы, паслугі аказаны індывідуальным прадпрымальнікам, які з'яўляецца адначасова асобай, што знаходзіцца ў працоўных адносінах з плацельшчыкам, і выкананне такіх прац, аказанне такіх паслуг адносяцца да працоўных абавязкаў такой асобы;

4.3. працы выкананы, паслугі аказаны плацельшчыку (за выключэннем акцыянернага таварыства) арганізацыяй (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), якая з'яўляецца заснавальнікам (удзельнікам) плацельшчыка або ў адносінах да якой плацельшчык з'яўляецца

заснавальнікам (удзельнікам), калі выкананне такіх прац, аказанне такіх паслуг адносяцца да абавязкаў работніка, які знаходзіцца з плацельшчыкам у працоўных адносінах.

Палажэнні гэтага падпункта не падлягаюць прымяненню пры выкананні прац, аказанні паслуг плацельшчыку арганізацыяй у выпадку, калі такія плацельшчык і арганізацыя з'яўляюцца ўдзельнікамі аднаго холдынгу.

**Артыкул 170. Затраты на вытворчасць і рэалізацыю**

1. Затраты на вытворчасць і рэалізацыю ўяўляюць сабой вартасную ацэнку выкарыстаных у працэсе вытворчасці і рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў прыродных рэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі, асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, працоўных рэсурсаў і іншых расходаў на іх вытворчасць і рэалізацыю, якія адлюстроўваюцца ў бухгалтарскім уліку.

2. Затраты на вытворчасць і рэалізацыю прымаюцца з улікам наступных асаблівасцей:

2.1. затраты на набыццё (у тым ліку шляхам стварэння) аб'ектаў асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці і знаходзяцца ў эксплуатацыі, адлюстроўваюцца праз налічэнне амартызацыі. Асноўныя сродкі, якія знаходзяцца ў прастоі (у тым ліку ў сувязі з правядзеннем рамонту) працягласцю да трох месяцаў, запасе, прыраўноўваюцца да асноўных сродкаў, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі;

2.2. плацельшчык мае права прымяніць інвестыцыйны вылік і ўключыць яго ў склад затрат па вытворчасці і рэалізацыі ў парадку, устаноўленым гэтым падпунктам.

Для мэт гэтай главы інвестыцыйным вылікам прызнаецца сума, вылічаная ад першапачатковага кошту асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама ад сфарміраванага ў бухгалтарскім уліку кошту ўкладанняў у асноўныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, у сувязі з іх рэканструкцыяй, мадэрнізацыяй, рэстаўрацыяй (далей у гэтым падпункце – кошт укладанняў у рэканструкцыю) у наступных межах:

па будынках, збудаваннях і перадатачных прыладах, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, і кошце ўкладанняў у іх рэканструкцыю – не больш за пятнаццаць працэнтаў першапачатковага кошту (кошту ўкладанняў у іх рэканструкцыю);

па машынах і абсталяванні, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, і кошце ўкладанняў у іх рэканструкцыю, па транспартных сродках (за выключэннем легкавых аўтамабіляў, акрамя тых, якія адносяцца да спецыяльных, а таксама выкарыстоўваюцца для аказання паслуг таксі) і кошце ўкладанняў у іх рэканструкцыю – не больш за трыццаць працэнтаў першапачатковага кошту (кошце ўкладанняў у іх рэканструкцыю).

Сума інвестыцыйнага выліку ўключаецца ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю ў справаздачным перыядзе, на які прыпадае месяц:

з якога ў адпаведнасці з заканадаўствам пачата налічэнне амартызацыі асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, указаных у частцы другой гэтага падпункта;

у якім кошт укладанняў у рэканструкцыю павялічыў у бухгалтарскім уліку першапачатковы (пераацэнены) кошт асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

У адносінах да аднаго і таго ж аб'екта асноўных сродкаў, які выкарыстоўваецца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, інвестыцыйны вылік можа быць прыменены плацельшчыкам паўторна толькі ў адносінах да кошту ўкладанняў у рэканструкцыю, раней не прынятага для разліку інвестыцыйнага выліку.

Для мэт вызначэння інвестыцыйнага выліку па асноўных сродках, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці:

да будынкаў адносяцца асноўныя сродкі (іх часткі), вызначаныя ў якасці будынкаў заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе нарматыўныя тэрміны службы асноўных сродкаў, за выключэннем будынкаў жылых аб'ектаў (акрамя інтэрнатаў), будынкаў культурна-забаўляльных (начных) клубаў, будынкаў, якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення дзейнасці

ў сферы ігральнага бізнесу, будынкаў гасцініц і іншых будынкаў для кароткатэрміновага пражывання (акрамя тых, якія адносяцца да аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу), будынкаў зборна-разборных і перасовачных;

да перадатачных прылад адносяцца асноўныя сродкі (іх часткі), вызначаныя ў якасці перадатачных прылад заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе нарматыўныя тэрміны службы асноўных сродкаў;

да збудаванняў адносяцца асноўныя сродкі (іх часткі), вызначаныя ў якасці збудаванняў заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе нарматыўныя тэрміны службы асноўных сродкаў, за выключэннем збудаванняў месцаў адпачынку і заапаркаў, збудаванняў для стаянкі ці паркоўкі аўтамабіляў;

да машын і абсталявання, транспартных сродкаў адносяцца асноўныя сродкі, вызначаныя ў якасці машын і абсталявання, транспартных сродкаў заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе нарматыўныя тэрміны службы асноўных сродкаў;

да кошту ўкладанняў у рэканструкцыю адносяцца фактычныя затраты, звязаныя з рэканструкцыяй (мадэрнізацыяй, рэстаўрацыяй) будынкаў, збудаванняў, перадатачных прылад, машын і абсталявання, транспартных сродкаў, якія павялічылі ў бухгалтарскім уліку першапачатковы кошт гэтых асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

Палажэнні гэтага падпункта не падлягаюць прымяненню:

да першапачатковага кошту асноўных сродкаў, прынятых плацельшчыкам да бухгалтарскага ўліку ў якасці аб'екта па дагаворах арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), іншага аплатнага ці бязвыплатнага карыстання, давернага кіравання, у якасці ўзносу (укладу) у статутны фонд (простая суполка);

да першапачатковага кошту асноўных сродкаў, атрыманых бязвыплатна або першапачатковы кошт якіх сфарміраваны (поўнасцю ці часткова) за кошт бязвыплатна прынятых затрат, праведзеных пры стварэнні аб'ектаў;

да першапачатковага кошту асноўных сродкаў, набытых за кошт сродкаў, якія бязвыплатна паступаюць у рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюджэту Саюзнай дзяржавы;

да першапачатковага кошту асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца (поўнасцю ці часткова) ці прызначаны для выкарыстання (поўнасцю ці часткова) у дзейнасці, па якой арганізацыя не плаціць падатак на прыбытак у сувязі з прымяненнем асаблівых рэжымаў падаткаабкладання;

да кошту ўкладанняў у рэканструкцыю па асноўных сродках, прынятых плацельшчыкам у якасці аб'екта па дагаворах давернага кіравання;

да кошту ўкладанняў у рэканструкцыю, ажыццёўленых за падлік сродкаў, якія бязвыплатна паступаюць у рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюджэту Саюзнай дзяржавы;

да кошту ўкладанняў у рэканструкцыю па асноўных сродках, якія выкарыстоўваюцца (поўнасцю ці часткова) або прызначаны для выкарыстання (поўнасцю ці часткова) у дзейнасці, па якой арганізацыя не плаціць падатак на прыбытак у сувязі з прымяненнем асаблівых рэжымаў падаткаабкладання;

2.3. калі вынікам выканання навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных прац, зарэгістраваных у дзяржаўным рэестры навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных прац у парадку, які вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, не стала стварэнне амартызуемай маёмасці, расходы на такія працы могуць быць прыняты ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю з прымяненнем павышальнага каэфіцыента да 1,5 уключна;

2.4. працэнты за карыстанне крэдытамі, пазыкамі, якія прызнаюцца ў бухгалтарскім уліку расходамі, прымаюцца ў якасці затрат па вытворчасці і рэалізацыі, за выключэннем працэнтаў

па крэдытах, пазыках, якія адносяцца на кошт інвестыцыйных актываў у адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама працэнтаў па пратэрмінаваных выплатах па асноўным доўгу па пазыках і крэдытах;

2.5. абавязковыя страхавыя ўзносы ў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь і па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, налічаныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, якія адносяцца да затрат, што ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, а таксама выплаты работнікам і іншым асобам па грамадзянска-прававых дагаворах, прадметам якіх з'яўляецца выкананне прац (аказанне паслуг), прымаюцца ў якасці затрат па вытворчасці і рэалізацыі;

2.6. расходы, звязаныя з купляй замежнай валюты, у суме розніцы паміж курсам куплі і афіцыйным курсам беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант куплі, для правядзення разлікаў:

за сыравіну, матэрыялы, тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, нематэрыяльныя актывы;

па службовых камандзіроўках за мяжу;

па падатках, зборах і іншых выплатах у бюджэт ці пазабюджэтныя фонды замежных дзяржаў у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў;

па стварэнні (набыцці) інвестыцыйных актываў;

па аплаце іншых расходаў, якія ўключаюцца ў склад затрат па вытворчасці і рэалізацыі, па выкарыстаных для іх набыцця і аплаты, а таксама для выплаты заработнай платы пазыках, крэдытах і выплаце працэнтаў па іх;

2.7. у якасці затрат па аперацыях з фінансавымі інструментамі, акрамя ўказаных у артыкуле 179 гэтага Кодэкса, прымаюцца расходы ад ацэнкі фінансавых інструментаў па амартызаваным кошце, за выключэннем сумы абясцэнення;

2.8. асобныя віды затрат могуць адлюстроўвацца шляхам стварэння ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, рэзерваў будучых расходаў.

**Артыкул 171. Затраты, якія нарміруюцца**

1. Да затрат, якія нарміруюцца, адносяцца наступныя віды затрат:

1.1. камандзіровачныя расходы (расходы на службовыя камандзіроўкі) у межах нормаў, устаноўленых заканадаўствам;

1.2. затраты на аплату кошту паліўна-энергетычных рэсурсаў, зрасходаваных у межах нормаў, устаноўленых у адпаведнасці з заканадаўствам.

Пры адсутнасці такіх нормаў для механічных транспартных сродкаў затраты прымаюцца ў межах нормаў расходу паліва, устаноўленых іх заводам-вырабляльнікам, а пры адсутнасці гэтакіх – у межах нормаў, устаноўленых кіраўніком арганізацыі. Нормы, устаноўленыя кіраўніком арганізацыі, дзейнічаюць да моманту зацвярджэння нарматыўным прававым актам ва ўстаноўленым парадку нормаў для адпаведнага механічнага транспартнага сродку, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам. Пры адсутнасці ўстаноўленых нормаў расходу паліўна-энергетычных рэсурсаў затраты на аплату іх кошту прызнаюцца звышнарматыўнымі;

1.3. страты ад недастачы і (ці) пашкоджання пры захоўванні, транспарціроўцы і (ці) рэалізацыі тавараў, запасаў у межах нормаў натуральнага змяншэння, а таксама нормаў страт (бою), устаноўленых заканадаўствам, а пры іх адсутнасці – у межах нормаў, устаноўленых кіраўніком па ўзгадненні з уласнікам, агульным сходам удзельнікаў, членаў спажывецкага таварыства, упаўнаважаных ці асобай, імі ўпаўнаважанай. Пры адсутнасці ўстаноўленых нормаў такія недастачы і (ці) пашкоджанні тавараў прызнаюцца звышнарматыўнымі;

1.4. расходы на кіраўніцкія паслугі, якія аказваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, а таксама арганізацыямі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання, у межах сумы, разлічанай зыходзячы з каэфіцыента суадносін сярэдняй заработнай платы кіраўнікоў арганізацый і сярэдняй заработнай платы па арганізацыі ў цэлым, вызначанага ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўствам;

1.5. затраты па кантраляванай запазычанасці ў межах, разлічаных у адпаведнасці з артыкулам 172 гэтага Кодэкса;

1.6. для арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, за выключэннем арганізацый сістэмы Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь, – затраты на аплату накладных расходаў і тэхналагічных страт у межах нормаў і нарматываў, устаноўленых у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.7. іншыя затраты, вызначаныя пунктам 2 гэтага артыкула.

2. У склад іншых затрат уключаюцца:

2.1. выплаты фізічным асобам, якія працуюць у арганізацыях па працоўных дагаворах, у грашовай і натуральнай формах у выглядзе:

узнагарод па выніках працы за год, выплат, якія носяць характар узнагароды па выніках працы за год;

аднаразовых дапамог асобам, якія выходзяць на пенсію;

даплат, кампенсацый, дапамог, парадак выплаты якіх і іх мінімальны памер устаноўлены заканадаўствам і па якіх заканадаўствам дадзена права іх павышэння, у памерах, устаноўленых калектыўным дагаворам, пагадненнем, наймальнікам, якія перавышаюць мінімальны памер;

даплат, кампенсацый, дапамог, па якіх заканадаўствам дадзена права вызначэння памеру і парадку выплаты, у памерах, устаноўленых калектыўным дагаворам, пагадненнем, наймальнікам, у межах, устаноўленых заканадаўствам, пры іх наяўнасці;

аднаразовай выплаты (матэрыяльная дапамога, дапамога) на аздараўленне;

аплаты дадатковых водпускаў, абавязак давання якіх устаноўлены заканадаўствам. Гэта палажэнне распаўсюджваецца ў тым ліку на выплату ў адпаведнасці з заканадаўствам грашовай кампенсацыі за нявыкарыстаныя дні ўказаных дадатковых водпускаў;

2.2. расходы на добраўпарадкаванне населеных пунктаў і прылеглых тэрыторый, памятных месцаў;

2.3. расходы на правядзенне ў адпаведнасці з заканадаўствам з нагоды дзяржаўных свят, святочных дзён і памятных дат афіцыйных урачыстых мерапрыемстваў, ваенных парадаў, артылерыйскіх салютаў і феерверкаў;

2.4. узнагароды і (ці) расходы, якія кампенсуюцца, членам савета дырэктараў (наглядальнага савета), прадстаўнікам дзяржавы ў органах кіравання арганізацый, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам;

2.5. прадстаўніцкія расходы;

2.6. затраты на транспарціроўку (дастаўку) пакупнікоў (заказчыкаў) да гандлёвага аб'екта (месца выканання прац, аказання паслуг) і назад у напрамках, якія абслугоўваюцца пасажырскім транспартам агульнага карыстання;

2.7. кампенсацыя за выкарыстанне асабістых транспартных сродкаў, якая выплачваецца работнікам, праца якіх не носіць раз'язны характар, а таксама сумы арэнднай платы, якія выплачваюцца такім работнікам, што з'яўляюцца арэндадаўцамі асабістага транспартнага сродку;

2.8. членскія ўзносы (уступныя і іншыя) у аб'яднанні прадпрымальнікаў і наймальнікаў, саюзы, асацыяцыі;

2.9. працэнты па пратэрмінаваных выплатах па асноўным доўгу па пазыках і крэдытах.

3. Сукупны памер іншых затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, не можа перавышаць аднаго (1) працэнта выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і сум даходаў, указаных у падпункце 3.18 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, з улікам падатку на дабаўленую вартасць (для банкаў – ад сумы даходаў, якая вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 176 гэтага Кодэкса, за вылікам даходаў, якія адносяцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам да пазарэалізацыйных даходаў, акрамя сум даходаў, указаных у падпункце 3.18 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса).

**Артыкул 172. Парадак вызначэння затрат па кантраляванай запазычанасці**

1. Пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак за падатковы перыяд затраты і пазарэалізацыйныя расходы па відах прац, паслуг, маёмасных правоў і па іншых абавязацельствах, указаных у падпункце 2.3 пункта 2 гэтага артыкула (далей у гэтым артыкуле – працы (паслугі)), улічваюцца беларускай арганізацыяй зыходзячы з сум фактычна панесеных затрат і пазарэалізацыйных расходаў, калі іх памер не перавышае сум, разлічаных у

адпаведнасці з палажэннямі гэтага артыкула (далей у гэтай главе – сума гранічных затрат). Сума гранічных затрат падлягае вызначэнню, калі на апошні дзень падатковага перыяду ў беларускай арганізацыі маецца кантраляваная запазычанасць, сума якой у тры і больш разы (для беларускай арганізацыі, якая вырабляе ў падатковым перыядзе падакцызныя тавары, – больш чым у адзін раз) перавышае велічыню яе ўласнага капіталу.

Велічыня ўласнага капіталу падлягае вызначэнню па даных бухгалтарскага ўліку на апошні дзень падатковага перыяду і (ці) на дату складання ліквідацыйнага балансу (акта праверкі, у ходзе якой былі выяўлены акалічнасці, што з'яўляюцца падставай для ліквідацыі юрыдычнай асобы па рашэнні рэгіструючага органа) (далей у гэтым артыкуле – апошні дзень падатковага перыяду).

Калі велічыня ўласнага капіталу адмоўная ці роўная нулю (0), беларуская арганізацыя не мае права ўлічваць затраты і пазарэалізацыйныя расходы па кантраляванай запазычанасці пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак.

2. Для мэт гэтай главы:

2.1. пад кантраляванай запазычанасцю беларускай арганізацыі разумеецца запазычанасць па працах (паслугах) перад:

заснавальнікам (удзельнікам) беларускай арганізацыі, які валодае на апошні дзень адпаведнага падатковага перыяду прама і (ці) ускосна не менш чым 20 працэнтамі акцый (паёў, долей у статутным фондзе) гэтай арганізацыі (далей у гэтым артыкуле – заснавальнік (удзельнік)), і іншай яе ўзаемазалежнай асобай;

узаемазалежнай асобай заснавальніка (удзельніка) беларускай арганізацыі;

іншай асобай, якой заснавальнік (удзельнік) беларускай арганізацыі ці яго ўзаемазалежная асоба гарантавалі (абавязаліся) пагасіць запазычанасць беларускай арганізацыі па працах (паслугах).

Кантраляванай запазычанасцю беларускай арганізацыі не з'яўляецца даўгавое абавязацельства перад банкам, які не прызнаецца яе ўзаемазалежнай асобай;

2.2. пад уласным капіталам беларускай арганізацыі разумеецца розніца паміж сумай актываў і сумай усіх абавязацельстваў без уліку сумы абавязацельстваў па падатках, зборах (пошлінах), абавязковых страхавых узносах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, а таксама сумы падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў, па якіх дадзены адтэрміноўка і (ці) растэрміноўка выплаты, сумы бюджэтных пазык;

2.3. сума кантраляванай запазычанасці вызначаецца як сукупнасць сум запазычанасцей перад усімі асобамі, указанымі ў падпункце 2.1 гэтага пункта, па наступных відах прац (паслуг):

пазыковых сродках па крэдытах, пазыках (за выключэннем камерцыйных пазык) без уліку сумы запазычанасці па працэнтах па іх;

інжынірынгавых паслугах, маркетынгавых паслугах, кансультацыйных паслугах, паслугах па даванні інфармацыі, кіраўніцкіх паслугах, пасрэдніцкіх паслугах, паслугах па пошуку і (ці) падборы персаналу, найме персаналу, даванні персаналу для ажыццяўлення дзейнасці, узнагародзе за перадачу (даванне) маёмасных правоў у адносінах да аб'ектаў права прамысловай уласнасці;

няўстойках (штрафах, пенях), сумах, якія падлягаюць выплаце ў выніку прымянення іншых мер адказнасці, уключаючы пакрыццё страт, за парушэнне дагаворных абавязацельстваў.

Пры гэтым сума кантраляванай запазычанасці:

уключае сумы вартасных паказчыкаў кожнай гаспадарчай аперацыі, у выніку якой узнікае запазычанасць, а таксама сумы запазычанасці, не пагашанай на пачатак адпаведнага падатковага перыяду;

уключае сумы курсавых розніц, якія ўзнікаюць пры пераацэнцы абавязацельстваў у замежнай валюце, па суме кантраляванай запазычанасці;

2.4. каэфіцыент капіталізацыі разлічваецца па формуле:

К = (Кз / Ук) – для беларускіх арганізацый, якія вырабляюць падакцызныя тавары ў падатковым перыядзе,

К = (Кз / Ук) / 3 – для іншых беларускіх арганізацый,
дзе: Кз – кантраляваная запазычанасць у падатковым перыядзе перад усімі асобамі, указанымі ў падпункце 2.1 гэтага пункта;

Ук – уласны капітал беларускай арганізацыі;

2.5. для мэт гэтага артыкула да падакцызных тавараў адносяцца тавары, якія падлягаюць маркіроўцы акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, піва, піўны кактэйль, слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнта і меншай за 7 працэнтаў (слабаалкагольныя натуральныя напоі, іншыя слабаалкагольныя напоі), віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў.

3. Сумы гранічных затрат вызначаюцца шляхам дзялення падпадаючых пад дзеянне артыкулаў 169, 170 і 175 гэтага Кодэкса сум затрат і пазарэалізацыйных расходаў, указаных у абзацах трэцім і чацвёртым часткі першай падпункта 2.3 пункта 2 гэтага артыкула, па якіх узнікла кантраляваная запазычанасць, і працэнтаў за карыстанне пазыковымі сродкамі, па якіх узнікла кантраляваная запазычанасць, на каэфіцыент капіталізацыі.

4. Правілы, устаноўленыя гэтым артыкулам, не прымяняюцца банкамі, страхавымі арганізацыямі і арганізацыямі, у якіх сума арэнднай платы (лізінгавых выплат), атрыманая (належная да атрымання) у падатковым перыядзе, па стане на апошні дзень падатковага перыяду перавышае 50 працэнтаў агульнай выручкі арганізацыі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і даходаў ад аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці.

**Артыкул 173. Затраты, якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні**

1. Пры падаткаабкладанні не ўлічваюцца наступныя затраты:

1.1. на выкананне (аказанне) плацельшчыкам ці аплату прац (паслуг), не звязаных з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

1.2. на выкананне прац па будаўніцтве, абсталяванні, а таксама ўтрыманні (уключаючы затраты на ўсе віды рамонту), амартызацыйныя адлічэнні аб'ектаў, якія знаходзяцца на балансе арганізацыі і не ўдзельнічаюць у прадпрымальніцкай дзейнасці;

1.3. выплаты фізічным асобам, якія працуюць у арганізацыях па працоўных дагаворах, у грашовай і натуральнай формах:

не прадугледжаныя заканадаўствам;

звыш памераў, устаноўленых заканадаўствам;

прэміі, якія выплачваюцца за кошт сродкаў спецыяльнага прызначэння і мэтавых паступленняў, а таксама звыш памераў, прадугледжаных заканадаўствам і (ці) лакальнымі актамі;

матэрыяльная дапамога (у тым ліку бязвыплатная матэрыяльная дапамога работнікам для будаўніцтва або набыцця аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, а таксама для пагашэння крэдытаў, пазык, дадзеных на гэтыя мэты), выплата якой не прадугледжана заканадаўствам ці звыш памераў, устаноўленых заканадаўствам;

надбаўкі і даплаты да пенсій;

выплаты, што ажыццяўляюцца работнікам, якія навучаюцца, у памеры, які перавышае памер стыпендыі, што ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

кампенсацыйныя выплаты ў сувязі з павышэннем цэн, якія праводзяцца звыш памераў індэксацыі даходаў, прадугледжаных заканадаўствам;

кампенсацыя кошту харчавання на аб'ектах грамадскага харчавання, даванне яго бясплатна (акрамя спецыяльнага харчавання для асобных катэгорый фізічных асоб у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам);

аплата расходаў па найме жылых памяшканняў (за выключэннем фактычных расходаў па найме жылых памяшканняў для фізічных асоб, накіраваных беларускімі камерцыйнымі арганізацыямі для працы ў размешчаных за межамі Рэспублікі Беларусь структурных падраздзяленнях гэтых арганізацый, на аснове пацвярджальных дакументаў, але не больш за гранічныя нормы пакрыцця расходаў па найме жылога памяшкання ў суткі пры службовых камандзіроўках за мяжу, устаноўленыя заканадаўствам, калі іншае не ўстаноўлена Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь), пуцёвак на лячэнне і адпачынак, экскурсій і падарожжаў,

заняткаў у секцыях, гуртках, клубах, наведванняў культурна-відовішчных, спартыўных і спартыўна-масавых мерапрыемстваў, падпіскі на перыядычныя выданні, тавараў (прац, паслуг) для асабістага спажывання і іншыя аналагічныя выплаты і затраты;

1.4. расходы на харчаванне, арганізацыю вольнага часу, адпачынку, у тым ліку пры правядзенні рэкламных акцый, канферэнцый, семінараў, перамоў, навучання і іншых аналагічных мерапрыемстваў.

Палажэнні часткі першай гэтага падпункта не прымяняюцца ў выпадках, калі такія расходы:

адносяцца да прадстаўніцкіх расходаў;

уключаны ў кошт мерапрыемстваў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, і аплачваюцца іх удзельнікамі;

1.5. сумы налічаных арганізацыяй дывідэндаў і прыраўнаваных да іх даходаў;

1.6. пені, штрафы, іншыя санкцыі, якія пералічваюцца ў рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты ці ў бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой;

1.7. узносы (уклады) у статутныя фонды арганізацый;

1.8. на набыццё і (ці) стварэнне маёмасці, якая амартызуецца;

1.9. сумы амартызацыйных адлічэнняў па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якія не выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці і не знаходзяцца ў эксплуатацыі;

1.10. кошт маёмасці ці маёмасных правоў, перададзеных у якасці задатку, закладу;

1.11. праведзеныя за кошт сродкаў рэзерваў будучых расходаў, створаных плацельшчыкам ва ўстаноўленым парадку;

1.12. на набыццё праязных білетаў на транспарт агульнага карыстання для работнікаў, праца якіх мае раз'язны характар, калі гэтыя работнікі на час выканання службовых абавязкаў забяспечваюцца спецыяльным транспартам;

1.13. сумы ўцэнкі асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, абсталявання да ўстаноўкі, якая праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, і сумы абясцэнення асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, доўгатэрміновых актываў, прызначаных для рэалізацыі, і інвестыцыйнай нерухомасці;

1.14. сумы грашовых сродкаў або затрат на вытворчасць або набыццё (выкананне, аказанне) тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці астаткавы кошт асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, перададзеныя ў абмен на выкупленыя арганізацыяй акцыі ўласнай эмісіі, долі (часткі долей) у статутных фондах, паі (часткі паёў), якія перавышаюць намінальны кошт указаных акцый, першапачатковы кошт долей, паёў (іх частак);

1.15. расходы, звязаныя з купляй замежнай валюты, у суме розніцы паміж курсам куплі і афіцыйным курсам, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант куплі, за выключэннем расходаў, указаных у падпункце 2.6 пункта 2 артыкула 170 гэтага Кодэкса;

1.16. дадзеныя пазыкі, у тым ліку беспрацэнтныя;

1.17. страхавыя ўзносы па відах добраахвотнага страхавання, за выключэннем страхавых узносаў па пераліку відаў добраахвотнага страхавання і парадку, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і страхавых узносаў, прадугледжаных заканадаўствам (у тым ліку замежных дзяржаў), якія з'яўляюцца ўмовай ажыццяўлення дзейнасці арганізацыямі, што заплацілі гэтыя ўзносы;

1.18. сумы курсавых розніц, якія ўзнікаюць пры пераліку выражанага ў замежнай валюце і (ці) беларускіх рублях у суме, эквівалентнай пэўнай суме ў замежнай валюце, кошту актываў і абавязацельстваў, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якія ўзніклі ў сувязі з ажыццяўленнем затрат, што не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні згодна з гэтым артыкулам і іншымі палажэннямі заканадаўства;

1.19. затраты, звязаныя з бязвыплатнай перадачай тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў) у выглядзе затрат на іх вытворчасць (выкананне, аказанне) або набыццё, сум падатку на дабаўленую вартасць,

падлічанага па гэтай бязвыплатнай перадачы, а таксама затрат на такую бязвыплатную перадачу;

1.20. астаткавы кошт асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў пры іх бязвыплатнай перадачы, сумы падатку на дабаўленую вартасць, падлічанага па гэтай бязвыплатнай перадачы, а таксама затраты на такую бязвыплатную перадачу;

1.21. расходы ад ацэнкі каштоўных папер па справядлівым кошце;

1.22. іншыя затраты, не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Рашэнні аб уключэнні ў затраты, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, затрат, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, прымаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Затраты, указаныя ў гэтым артыкуле, і іншыя затраты, якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з заканадаўствам, не могуць быць уключаны ў склад пазарэалізацыйных расходаў, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 174. Пазарэалізацыйныя даходы**

1. Пазарэалізацыйнымі даходамі прызнаюцца даходы, атрыманыя плацельшчыкам пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці і непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

2. Пазарэалізацыйныя даходы вызначаюцца на падставе дакументаў бухгалтарскага і падатковага ўліку.

Дата адлюстравання пазарэалізацыйных даходаў вызначаецца плацельшчыкам на дату прызнання даходаў у бухгалтарскім уліку, а ў адносінах да даходаў, па якіх у пункце 3 гэтага артыкула ўказана дата іх адлюстравання, – на дату, указаную ў пункце 3 гэтага артыкула.

3. У склад пазарэалізацыйных даходаў уключаюцца:

3.1. дывідэнды ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь;

3.2. даходы ўдзельніка (акцыянера) арганізацыі ў грашовай ці натуральнай форме пры ліквідацыі арганізацыі, пры выхадзе (выключэнні) удзельніка са складу ўдзельнікаў арганізацыі ў памеры, які перавышае суму яго ўзносу (укладу) у статутны фонд або фактычна праведзеных (аплачаных) удзельнікам (акцыянерам) расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацыі. Памер даходаў удзельніка (акцыянера) і сума яго ўзносу (укладу) ці расходы на набыццё долі ў статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацыі падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату прызнання ў бухгалтарскім уліку даходаў і на дату фактычнага ўнясення ўзносу (укладу) або фактычнага ажыццяўлення (аплаты) расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацыі.

Пры вызначэнні даходу ўдзельніка (акцыянера) арганізацыі ў грашовай ці натуральнай форме пры ліквідацыі арганізацыі, пры выхадзе (выключэнні) удзельніка са складу ўдзельнікаў арганізацыі ў якасці расходаў улічваюцца таксама сумы, указаныя ў падпункце 3.3 гэтага пункта, без пераліку ў долары ЗША, прадугледжанага часткай першай гэтага падпункта;

3.3. даходы ўдзельніка (акцыянера) арганізацыі ў выглядзе кошту долі ў статутным фондзе (кошту паю, намінальнага кошту акцый) гэтай арганізацыі, а таксама ў выглядзе павелічэння намінальнага кошту акцый, праведзенага за кошт уласнага капіталу арганізацыі, у выпадку змянення працэнтнай долі ў статутным фондзе арганізацыі хаця б аднаго з удзельнікаў (акцыянераў) больш чым на 0,01 працэнта.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату прыняцця рашэння аб размеркаванні (пераразмеркаванні) долей у статутным фондзе (паёў, акцый), павелічэнні намінальнага кошту акцый;

3.4. даходы ў выглядзе працэнтаў за даванне ў карыстанне грашовых сродкаў арганізацыі (уключаючы працэнты ад размяшчэння сродкаў ва ўклады (дэпазіты)), працэнтаў за карыстанне банкам грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца на банкаўскім рахунку;

3.5. сумы няўстоек (штрафаў, пеняў), сумы, належныя да атрымання ў выніку прымянення іншых мер адказнасці за парушэнне абавязацельстваў.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату, вызначаную плацельшчыкам (за выключэннем банкаў) у адпаведнасці з яго ўліковай палітыкай, але не пазней за дату іх атрымання;

3.6. паступленні ў лік пакрыцця шкоды ў натуры, страт, у тым ліку ўпушчанай выгады.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення незалежна ад спосабу пакрыцця шкоды ў натуры, страт (уключаючы аплату запазычанасці перад трэцімі асобамі, залік сустрэчных аднародных патрабаванняў і іншыя спосабы);

3.7. кошт бязвыплатна атрыманых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, сумы бязвыплатна атрыманых грашовых сродкаў. Пры гэтым да бязвыплатна атрыманых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, бязвыплатна атрыманых грашовых сродкаў адносяцца ў тым ліку атрыманыя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, іншыя актывы ў выпадку вызвалення ад абавязку іх аплаты, атрыманыя грашовыя сродкі ў выпадку вызвалення ад абавязку іх вяртання (за выключэннем выпадкаў, устаноўленых падпунктам 3.12 гэтага пункта), а таксама сумы замежнай бязвыплатнай ці міжнароднай тэхнічнай дапамогі, не вызваленай ад падаткаабкладання ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення (дату вызвалення ад абавязку аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, дату вызвалення ад абавязку вяртання грашовых сродкаў), за выключэннем даходаў, указаных у частцы трэцяй гэтага падпункта.

Даходы ў выглядзе кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, грашовых сродкаў, атрыманых у якасці замежнай бязвыплатнай дапамогі і не вызваленых ад падаткаабкладання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, адлюстроўваюцца на дату выдачы пасведчання аб рэгістрацыі замежнай бязвыплатнай дапамогі;

3.8. сумы ў пагашэнне дэбіторскай запазычанасці пасля сканчэння тэрмінаў іскавай даўнасці, а таксама сумы ў пагашэнне дэбіторскай запазычанасці, немагчымай (нерэальнай) для спагнання. Немагчымай (нерэальнай) для спагнання прызнаюцца дэбіторская запазычанасць ліквідаваных арганізацый і спыніўшых дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама запазычанасць памерлых фізічных асоб і фізічных асоб, аб'яўленых памерлымі, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення незалежна ад спосабу пагашэння запазычанасці (залік сустрэчных аднародных патрабаванняў, выкананне абавязацельства трэцяй асобе і інш.);

3.9. сумы крэдыторскай запазычанасці, па якой скончыліся тэрміны іскавай даўнасці;

3.10. сумы крэдыторскай запазычанасці пры ліквідацыі юрыдычнай асобы.

Такія даходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае:

найбольш ранняя з наступных дат: дата падачы падатковай дэкларацыі (разліку) ці апошні дзень тэрміну падачы падатковай дэкларацыі (разліку), устаноўленага артыкулам 44 гэтага Кодэкса;

дата складання акта праверкі, у ходзе якой былі выяўлены акалічнасці, якія з'яўляюцца падставай для ліквідацыі юрыдычнай асобы па рашэнні рэгіструючага органа, – пры ліквідацыі юрыдычнай асобы па рашэнні рэгіструючага органа ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.11. сумы крэдыторскай запазычанасці пры ліквідацыі, спыненні дзейнасці і (ці) смерці (абвяшчэнні памерлым) крэдытора.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату выключэння крэдытора з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (замежнай арганізацыі і замежнага індывідуальнага прадпрымальніка – з гандлёвага рэгістра ці іншай аналагічнай сістэмы ўліку і ідэнтыфікацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў краіны іх заснавання) і (ці) смерці фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, або абвяшчэння фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, памерлай, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Сумы крэдыторскай запазычанасці ў сувязі са смерцю (абвяшчэннем памерлым) крэдытора банкам адлюстроўваюцца на дату прызнання такога даходу ў бухгалтарскім уліку ў адпаведнасці з заканадаўствам;

3.12. сумы змяншэння крэдыторскай запазычанасці (павелічэння дэбіторскай запазычанасці) па няўстойках (штрафах, пенях) і іншых мерах адказнасці за парушэнне абавязацельстваў пры заключэнні міравога пагаднення, пагаднення аб прымірэнні, медыятыўнага пагаднення пры ўмове, што раней указаныя сумы былі ўключаны ў склад пазарэалізацыйных расходаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім уступаюць у сілу міравое пагадненне, пагадненне аб прымірэнні ці заключаецца медыятыўнае пагадненне;

3.13. кошт прынятай да ўліку маёмасці, якая аказалася ў лішку па выніках інвентарызацыі.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату апрыходавання маёмасці ў бухгалтарскім уліку плацельшчыка;

3.14. плата за ўдзел у таргах (тэндары).

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення;

3.15. станоўчая розніца, якая ўзнікае паміж коштам маёмасці, атрыманай (перададзенай) у пазыку, і коштам маёмасці, перададзенай (атрыманай) пры пагашэнні гэтай пазыкі, за выключэннем пагашэння жыллёвых аблігацый.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату апрыходавання (спісання) маёмасці ў бухгалтарскім уліку плацельшчыка;

3.16. сумы падатку на дабаўленую вартасць, раней уключаныя ў склад пазарэалізацыйных расходаў у сувязі з адсутнасцю дакументаў, якія абгрунтоўваюць:

3.16.1. прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты:

адгрузкі тавараў (уключаючы выробленыя з давальніцкай сыравіны і матэрыялаў) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза, у выпадку наступнага паступлення такіх дакументаў. Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў;

афармлення дэкларацыі на тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай (для плацельшчыкаў, якія ажыццяўляюць дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента, – з даты ўнясення ў інфармацыйную сістэму мытных органаў звестак аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай) у выпадку наступнага паступлення такіх дакументаў. Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў;

правядзення таргоў па рэалізацыі пушніна-футравай сыравіны, якая вывозіцца з Рэспублікі Беларусь за межы Расійскай Федэрацыі, у выпадку наступнага паступлення такіх дакументаў. Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў;

3.16.2. вызваленне ад абкладання падаткам на дабаўленую вартасць, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты адгрузкі лізінгадавальніку тавараў, указаных у падпункце 1.44 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса, у выпадку наступнага паступлення такіх дакументаў. Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць вызваленне ад абкладання падаткам на дабаўленую вартасць;

3.17. сумы акцызаў, раней уключаныя ў склад пазарэалізацыйных расходаў у сувязі з адсутнасцю дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне вызвалення ад акцызаў, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты:

адгрузкі падакцызных тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза, у выпадку наступнага паступлення гэтых дакументаў. Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне вызвалення ад акцызаў;

афармлення дэкларацыі на падакцызныя тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай (для плацельшчыкаў, якія ажыццяўляюць дэклараванне мытным органам падакцызных тавараў у выглядзе электроннага дакумента, – з даты ўнясення ў інфармацыйную сістэму мытных органаў звестак аб выпуску

падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай), у выпадку наступнага паступлення гэтых дакументаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату паступлення дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне вызвалення ад акцызаў;

3.18. даходы ад аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае выкарыстанне маёмасці.

Такія даходы адлюстроўваюцца на адпаведны дзень здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае выкарыстанне маёмасці, вызначаны ў адпаведнасці з пунктамі 9–11 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

Даходы ад аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае выкарыстанне маёмасці вызначаюцца ў суме арэнднай платы (лізінгавых плацяжоў), якая ўключае суму ўзнагароды арэндадаўца (лізінгадавальніка), платы за карыстанне маёмасцю наймадаўцу (наймальніку па дагаворы паднайму) і кампенсуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ці дагаворам расходаў арэндадаўца (лізінгадавальніка), а таксама ў суме расходаў арэндадаўца (лізінгадавальніка), наймадаўца (наймальніка па дагаворы паднайму), пазыкадавальніка, не ўключаных у склад арэнднай платы (лізінгавых плацяжоў), платы за карыстанне маёмасцю адпаведна, але падлеглых пакрыццю ў адпаведнасці з умовамі дагавора, за выключэннем сум пакрыцця, указаных у падпункце 4.18 пункта 4 гэтага артыкула;

3.19. кошт тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы грашовых сродкаў, выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні, якія атрыманы ў рамках замежнай бязвыплатнай дапамогі, міжнароднай тэхнічнай дапамогі, мэтавага фінансавання (за выключэннем бюджэтных сродкаў).

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату выкарыстання не па мэтавым прызначэнні тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці грашовых сродкаў або на дату парушэння ўмоў, на якіх даваліся адпаведныя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы ці грашовыя сродкі;

3.20. курсавыя розніцы, якія ўзнікаюць пры пераліку выражанага ў замежнай валюце і (ці) беларускіх рублях у суме, эквівалентнай пэўнай суме ў замежнай валюце, кошту актываў і абавязацельстваў, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (за выключэннем тых, якія ўзнікаюць у атрымальнікаў замежнай бязвыплатнай дапамогі пры пераліку ў беларускія рублі кошту актываў і абавязацельстваў, звязаных з атрыманнем і выкарыстаннем замежнай бязвыплатнай дапамогі, выражанай у замежнай валюце, пры мэтавым выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі);

3.21. станоўчыя розніцы, якія ўзнікаюць пры пагашэнні дэбіторскай ці крэдыторскай запазычанасці, у тым ліку ў сувязі з атрыманнем аплаты ў суме, якая перавышае суму выручкі і (ці) пазарэалізацыйных даходаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату пагашэння дэбіторскай ці крэдыторскай запазычанасці;

3.22. даходы ў выглядзе зніжэння ці анулявання адлічэнняў у рэзервы, расходы на фарміраванне якіх былі прызнаны ў папярэдніх справаздачных перыядах у складзе пазарэалізацыйных расходаў ці ў затратах, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні;

3.23. даходы арганізацыі па дагаворы давернага кіравання маёмасцю, у якім яна ўказана ў якасці выгаданабытчыка.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення;

3.24. сродкі, якія бязвыплатна паступілі ў рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага ці мясцовых бюджэтаў або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюджэту Саюзнай дзяржавы ў справаздачных перыядах, якія ідуць следам за перыядамі, у якія расходы, пакрытыя такімі сродкамі, былі ўлічаны пры падаткаабкладанні.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення, уключаючы залік сустрэчных аднародных патрабаванняў, выкананне абавязацельства трэцяй асобе і інш.;

3.25. даходы пакупніка (заказчыка) у суме прэмій, бонусаў, дадзеных прадаўцом (выканаўцам, падрадчыкам) да цаны (кошту), указанай у дагаворы, пасля выканання

пакупніком (заказчыкам) умоў (у тым ліку аб'ёму пакупак ці заказаў), вызначаных дагаворам у якасці абавязковых для атрымання такіх прэмій, бонусаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення, уключаючы залік сустрэчных аднародных патрабаванняў, выкананне абавязацельства трэцяй асобе і інш.;

3.26. даходы ад продажу замежнай валюты ў суме станоўчай розніцы, якія ўтварыліся з прычыны адхілення курса продажу замежнай валюты ад афіцыйнага курса, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату продажу;

3.27. даходы ад абмену аднаго віду замежнай валюты на іншы від замежнай валюты (канверсія замежнай валюты) у выглядзе станоўчай розніцы паміж сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курса набытай замежнай валюты і яе колькасці, і сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курса рэалізаванай замежнай валюты і яе колькасці;

3.28. сумы інвестыцыйнага выліку (яго часткі), вылічанага ад першапачатковага кошту асноўных сродкаў (іх частак), якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці (кошту ўкладанняў у рэканструкцыю), уключаныя ў склад затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, у адпаведнасці з падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 170 гэтага Кодэкса, калі раней чым пасля сканчэння трох гадоў з моманту іх прыняцця да бухгалтарскага ўліку (павелічэння першапачатковага кошту асноўных сродкаў на кошт укладанняў у рэканструкцыю):

адбываецца адчужэнне;

адбываецца перадача ў арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, давернае кіраванне;

ажыццяўляецца іх выкарыстанне ў дзейнасці, па якой плацельшчык не плаціць падатак на прыбытак у сувязі з прымяненнем асаблівых рэжымаў падаткаабкладання;

паступае кампенсацыя (поўнасцю ці часткова) расходаў на набыццё (стварэнні) асноўных сродкаў ці кошту ўкладанняў у рэканструкцыю за кошт сродкаў, якія бязвыплатна паступаюць у рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў ці бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, бюджэту Саюзнай дзяржавы, інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Такія даходы адлюстроўваюцца адпаведна на дату адчужэння, перадачы ў арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, давернае кіраванне, атрымання кампенсацыі, а таксама на дату, якая непасрэдна папярэднічае даце пачатку выкарыстання ў дзейнасці, па якой плацельшчык не плаціць падатак на прыбытак у сувязі з прымяненнем асаблівых рэжымаў падаткаабкладання.

Частка інвестыцыйнага выліку, якая адносіцца на частку першапачатковага кошту аб'екта асноўных сродкаў (кошту ўкладанняў у рэканструкцыю), вызначаецца прапарцыянальна ўдзельнай вазе гэтай часткі першапачатковага кошту аб'екта асноўных сродкаў (кошту ўкладанняў у рэканструкцыю) у агульным першапачатковым кошце (агульным кошце ўкладанняў у рэканструкцыю);

3.29. грашовыя сродкі, атрыманыя рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі, якія ажыццяўляюць размеркаванне газападобнага паліва па трубаправодах і яго продаж або вытворчасць, перадачу і размеркаванне электрычнай энергіі, ад рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць аналагічны від дзейнасці, пры размеркаванні сродкаў у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, у межах аднаго ўласніка ва ўмовах устанаўлення адзіных у Рэспубліцы Беларусь дыферэнцыраваных па групах спажыўцоў цэн на прыродны газ або тарыфаў на электрычную энергію.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення;

3.30. даходы плацельшчыка па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі, у якіх ён указаны ў якасці даручальніка.

Такія даходы вызначаюцца як сума прыбытку, атрыманага па такім дагаворы, разлічаная даверным кіраўніком на аснове даных бухгалтарскага ўліку аперацый давернага кіравання ў

парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і адлюстроўваюцца на дату іх паступлення;

3.31. даходы плацельшчыка па дагаворы давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання, у якім ён указаны ў якасці даручальніка.

Такія даходы вызначаюцца як станоўчая розніца паміж коштам долі даручальніка ў маёмасці фонду на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яго долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання і коштам гэтай долі даручальніка на дату перадачы грашовых сродкаў і (ці) каштоўных папер у фонд і адлюстроўваюцца на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яго долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання;

3.32. даходы ад продажу банкам банкаўскіх і мерных зліткаў з каштоўных металаў, зліткавых (інвестыцыйных) манет з каштоўных металаў у суме станоўчай розніцы паміж цаной продажу і цаной набыцця;

3.33. розніца паміж сумай, атрыманай (належнай да атрымання) эмітэнтам пры размяшчэнні жыллёвых аблігацый, і сумай, выплачанай (належнай да выплаты) пры пагашэнні эмітэнтам жыллёвых аблігацый (уключаючы датэрміновы выкуп).

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату пагашэння (датэрміновага выкупу) жыллёвых аблігацый;

3.34. сумы праведзенай ва ўстаноўленым парадку даацэнкі тавараў у рознічным гандлі і грамадскім харчаванні да цэн на тавар, якія нанава паступіў;

3.35. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якія адносяцца на расходы, указаныя ў падпункце 3.27 пункта 3 артыкула 175 гэтага Кодэкса.

Такія даходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, за які гэтыя сумы адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

3.36. сума арэнднай платы, належная да выплаты фізічнай асобе – арэндадаўцу, у тым ліку індывідуальнаму прадпрымальніку, якая з'яўляецца непагашанай запазычанасцю пасля сканчэння 12 месяцаў з моманту яе ўзнікнення.

Такія даходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае дзень, што ідзе следам за днём, у якім заканчваюцца 12 месяцаў з моманту ўзнікнення запазычанасці па арэнднай плаце;

3.37. даходы арганізацый ад дамоў састарэлых і інвалідаў, аб'ектаў жыллёвага фонду, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту, якія знаходзяцца на іх балансе, за выключэннем даходаў, указаных у падпункце 3.18 гэтага пункта. Гэта палажэнне не прымяняецца ў адносінах да даходаў, атрыманых пры выкарыстанні ўказаных аб'ектаў выключна ў прадпрымальніцкай дзейнасці;

3.38. сумы крэдыторскай запазычанасці ўнітарнага прадпрыемства перад уласнікам яго маёмасці, па якой юрыдычная асоба вызвалена ад выканання абавязацельстваў, і раней гэтыя сумы былі ўключаны ў склад затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, ці пазарэалізацыйных расходаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату вызвалення ад выканання абавязацельстваў;

3.39. сумы падаткаў, збораў (пошлін), іншых выплат у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, вернутыя як залішне заплачаныя, а таксама залішне спагнаныя, якія раней былі ўлічаны ў складзе затрат па вытворчасці і рэалізацыі ці пазарэалізацыйных расходаў.

Такія даходы адлюстроўваюцца не пазней за дату іх атрымання;

3.40. грашовыя сродкі, а таксама іншыя віды даходу (залік сустрэчных аднародных патрабаванняў, выкананне абавязацельства трэцяй асобе і інш.), якія паступілі ў лік раней уключаных сум у склад затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, і (ці) пазарэалізацыйных расходаў;

3.41. даходы ад змянення справядлівага кошту інструментаў і аб'ектаў хеджыравання, якія прызнаюцца гэтакімі ў бухгалтарскім уліку, у тым ліку ад аперацый з форварднымі і ф'ючарснымі кантрактамі, апцыёнамі і іншымі вытворнымі фінансавымі інструментамі, за выключэннем указаных у падпункце 3.42 гэтага пункта;

3.42. даходы юрыдычных асоб – кліентаў суб'ектаў рынку беспаставачных пазабіржавых фінансавых інструментаў, атрыманых у падатковым (справаздачным) перыядзе па аперацыях з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі ў выглядзе налічаных станоўчых розніц цэн базавых актываў па здзейсненых аперацыях з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі, а таксама іншыя сумы сродкаў, у адносінах да якіх у кліента ўзнікае права іх атрымаць па пагадненні аб здзяйсненні аперацый з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі;

3.43. іншыя даходы плацельшчыка пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Такія даходы адлюстроўваюцца не пазней за дату іх атрымання.

4. У склад пазарэалізацыйных даходаў не ўключаюцца:

4.1. бязвыплатныя сродкі, якія паступаюць у рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, інвестыцыйных фондаў, сфармаваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, бюджэту Саюзнай дзяржавы і выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні, за выключэннем сродкаў, указаных у падпункце 3.24 пункта 3 гэтага артыкула. Пры гэтым расходы арганізацый, пакрытыя за кошт гэтых сродкаў, не ўлічваюцца пры вызначэнні прыбытку, які абкладаецца падаткам;

4.2. у бюджэтных арганізацый, грамадскіх і рэлігійных арганізацый (аб'яднанняў), рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, іншых некамерцыйных арганізацый, створаных у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь:

4.2.1. уступныя, паявыя і членскія ўзносы ў памерах, прадугледжаных статутамі і (ці) установчымі дагаворамі;

4.2.2. грашовыя сродкі, атрыманыя ад удзельнікаў (членаў) у парадку будучага фінансавання і (ці) у парадку пакрыцця расходаў на набыццё і (ці) выкананне (аказанне) прац (паслуг) для гэтых удзельнікаў (з улікам кошту тавараў, уключанага ў кошт указаных прац (паслуг), звязаных з утрыманнем і эксплуатацыяй нерухомай маёмасці);

4.2.3. тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, грашовыя сродкі, бязвыплатна атрыманыя, пры ўмове выкарыстання гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных праў, грашовых сродкаў па мэтавым прызначэнні, а ў выпадку, калі бок, які перадае, не вызначыў мэтавае прызначэнне, – на выкананне задач, вызначаных статутамі і (ці) установчымі дагаворамі ўказаных арганізацый, аб'яднанняў;

4.2.4. даходы ў выглядзе працэнтаў ад захоўвання грашовых сродкаў, указаных у падпунктах 4.2.1–4.2.3 гэтага пункта, на бягучых (разліковых) або іншых банкаўскіх рахунках, а таксама ад размяшчэння гэтых грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты).

Пры гэтым расходы арганізацый, пакрытыя за кошт указаных у падпунктах 4.2.1–4.2.4 часткі першай гэтага падпункта сродкаў, не ўлічваюцца пры вызначэнні прыбытку, які абкладаецца падаткам;

4.3. сродкі, атрыманыя плацельшчыкамі ў парадку долевага ўдзелу ў будаўніцтве жылля, утрыманні аб'ектаў невытворчай сферы і выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні;

4.4. у дзяржаўных аб'яднанняў, якія з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, створаных па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама па іх даручэнні (дазволе) рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання або па рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання, – сумы сродкаў, якія пералічваюцца на іх утрыманне з прыбытку (даходу), які застаецца пасля падаткаабкладання, дзяржаўнымі і іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ўваходзяць у гэтыя дзяржаўныя аб'яднанні, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

4.5. сумы сродкаў, якія паступілі ад унітарных прадпрыемстваў, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца спажывецкія таварыствы і іх саюзы, з прыбытку, які застаецца пасля падаткаабкладання, на фінансаванне ўтрымання апарату кіравання спажывецкіх таварыстваў і іх саюзаў;

4.6. сродкі, якія паступаюць у фонды развіцця свабодных эканамічных зон;

4.7. дывідэнды, атрыманыя плацельшчыкамі ад беларускіх арганізацый;

4.8. тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, грашовыя сродкі, бязвыплатна атрыманыя:

4.8.1. правапераемнікам (правапераемнікамі) арганізацыі пры яе рэарганізацыі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

4.8.2. Рэспублікай Беларусь ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, у тым ліку ў асобе дзяржаўных органаў і спецыяльна ўпаўнаважаных юрыдычных асоб і фізічных асоб;

4.8.3. дзяржаўнымі арганізацыямі пры бязвыплатнай перадачы маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, па рашэнні ўласніка або ўпаўнаважанага ім органа (арганізацыі);

4.8.4. пры бязвыплатнай перадачы ў межах аднаго ўласніка па яго рашэнні ці рашэнні ўпаўнаважанага ім органа;

4.8.5. арганізацыямі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалаводства, пры ўмове іх выкарыстання гэтымі арганізацыямі для ажыццяўлення дзейнасці гэтымі ж арганізацыямі па вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалаводства;

4.8.6. у якасці замежнай бязвыплатнай дапамогі ці міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым палажэнні падпунктаў 4.2.3 і 4.2.4 гэтага пункта не прымяняюцца, а расходы, пакрытыя за кошт гэтых сродкаў, не ўлічваюцца пры вызначэнні прыбытку, які абкладаецца падаткам;

4.9. кошт невыкарыстоўваемай дзяржаўнай маёмасці, якая знаходзілася ў рэспубліканскай і камунальнай уласнасці і бязвыплатна атрыманая арганізацыямі ва ўласнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

4.10. на працягу тэрміну дзеяння дагавора давернага кіравання маёмасцю маёмасць даручальніка, перададзеная давернаму кіраўніку;

4.11. маёмасць, якая належыць на праве ўласнасці даручальніку і вяртаецца даверным кіраўніком пры спыненні давернага кіравання, а таксама даходы, атрыманыя даручальнікам па дагаворы давернага кіравання маёмасцю, па якіх падаткаабкладанне праведзена даручальнікам у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

4.12. у венчурных арганізацый, Беларускага інавацыйнага фонду (далей у гэтай главе – Белінфонд) сумы атрыманых ад інавацыйных арганізацый даходаў у выглядзе працэнтаў за даванне ў карыстанне грашовых сродкаў на фінансаванне венчурных праектаў. Гэта палажэнне прымяняецца венчурнымі арганізацыямі, Белінфондам у выпадку, калі доля выручкі інавацыйнай арганізацыі ад рэалізацыі высокатэхналагічных тавараў (прац, паслуг), якія адносяцца да гэтай катэгорыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якая вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку года, складае не менш за 50 працэнтаў у агульным аб'ёме выручкі такой інавацыйнай арганізацыі.

Пры невыкананні ўказанай умовы падатак на прыбытак падлягае ўнясенню ў бюджэт з выплатай пені ў памеры, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, за перыяд неабгрунтаванага прымянення льготы да дня выплаты падатку.

Пад інавацыйнай арганізацыяй у мэтах гэтай главы разумеецца арганізацыя, якая ажыццяўляе інавацыйную дзейнасць і (ці) вырабляе высокатэхналагічныя тавары (працы, паслугі);

4.13. у эксплуатацыйных арганізацый сумы затрат, праведзеных пры стварэнні аб'ектаў інжынернай, транспартнай, сацыяльнай інфраструктуры і іх добраўпарадкавання, прынятых у дзяржаўную ўласнасць пры бязвыплатнай перадачы гэтых аб'ектаў інвестарамі (заказчыкамі, забудоўшчыкамі) у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

4.14. у эксплуатацыйных арганізацый кошт бязвыплатна атрыманых тавараў (прац, паслуг) пры рэканструкцыі, рамонце (пакрыцці кошту рэканструкцыі, рамонту) аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры, якія з'яўляюцца ўласнасцю дзяржавы і знаходзяцца ў іх на праве гаспадарчага вядзення;

4.15. кошт бязвыплатна атрыманых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, сумы бязвыплатна атрыманых грашовых сродкаў для будоўлі і (ці) рэканструкцыі аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння пры ўмове іх выкарыстання па мэтавым прызначэнні;

4.16. кошт бязвыплатна атрыманых маёмасных правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, звесткі аб якіх змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, а таксама кошт бязвыплатна атрыманых матэрыяльных аб'ектаў, якія адносяцца да гэтых правоў, калі бязвыплатнае атрыманне маёмасных правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці адначасова суправаджаецца перадачай такіх аб'ектаў.

Падставай для неўключэння ў склад пазарэалізацыйных даходаў кошту маёмасных правоў і матэрыяльных аб'ектаў, указаных у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца ўказанне ў дагаворах, якія прадугледжваюць перадачу маёмасных правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці іх уладальнікам іншай асобе ці даванне праваўладальнікам іншай асобе права на выкарыстанне вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, звестак аб нумары і даце рэгістрацыі правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, найменне гэтых вынікаў, якія змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на выніκі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці;

4.17. сумы даацэнкі асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, абсталявання да ўстаноўкі, якая праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і сумы аднаўлення абясцэнення асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, доўгатэрміновых актываў, прызначаных для рэалізацыі, і інвестыцыйнай нерухомасці;

4.18. сумы расходаў, якія кампенсуюцца пазыкадавальніку пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, звязаны з перадачай у такое карыстанне і ўзнікаюць у сувязі з набыццём камунальных і (ці) іншых прац (паслуг) па ўтрыманні і (ці) эксплуатацыі гэтай маёмасці, а таксама расходаў, абавязак пакрыцця пазыкадавальніку якіх прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (за выключэннем сум расходаў, якія адносяцца да прац (паслуг), выкананых (аказаных) пазыкадавальнікам уласнымі сіламі). Пры гэтым расходы арганізацый, пакрытыя за кошт гэтых сродкаў, не ўлічваюцца пры вызначэнні прыбытку, які абкладаецца падаткам;

4.19. сродкі, якія паступаюць плацельшчыку і (ці) яго крэдыторам ад асоб, якія нясуць субсідыярную адказнасць па абавязацельствах гэтага плацельшчыка, у парадку прыцягнення такіх асоб да субсідыярнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

4.20. сродкі, якія паступілі плацельшчыку, прызнаныя згодна з уступіўшым у законную сілу прыгаворам суда даходам фізічнай асобы;

4.21. у навуковай арганізацыі – выканаўцы, вызначанага па дагаворы з дзяржаўным заказчыкам уладальнікам маёмасных правоў на выніκі навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных прац, зарэгістраваных у парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, кошт ацэнкі такіх правоў. Пры гэтым сумы амартызацыйных адлічэнняў па такіх нематэрыяльных актывах не ўлічваюцца пры вызначэнні прыбытку, які абкладаецца падаткам;

4.22. сумы запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), штрафах, пенях перад рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі, дзяржаўнымі пазабюджэтнымі фондамі, ад выканання якой плацельшчык вызвалены поўнасцю ці часткова ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 175. Пазарэалізацыйныя расходы**

1. Пазарэалізацыйнымі расходамі прызнаюцца расходы, затраты, страты, праведзеныя плацельшчыкам для ажыццяўлення сваёй дзейнасці і непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

2. Пазарэалізацыйныя расходы вызначаюцца на падставе дакументаў бухгалтарскага ўліку (пры неабходнасці праз правядзенне разліковых карэкціровак да даных бухгалтарскага ўліку ў рамках вядзення падатковага ўліку) з улікам палажэнняў артыкула 172 гэтага Кодэкса.

Дата адлюстравання пазарэалізацыйных расходаў вызначаецца плацельшчыкам на дату прызнання расходаў у бухгалтарскім уліку, а ў адносінах да расходаў, па якіх у пункце 3 гэтага артыкула ўказана дата іх адлюстравання, – на дату, указаную ў пункце 3 гэтага артыкула.

3. У склад пазарэалізацыйных расходаў уключаюцца:

3.1. сумы няўстоек (штрафаў, пеняў), сумы, якія падлягаюць выплаце ў выніку прымянення іншых мер адказнасці за парушэнне абавязацельстваў (за выключэннем абавязацельстваў, прадугледжаных заключанымі з Рэспублікай Беларусь інвестыцыйнымі дагаворамі).

Гэта палажэнне не прымяняецца ў адносінах да расходаў, указаных у падпункце 1.6 пункта 1 артыкула 173 гэтага Кодэкса.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату, вызначаную плацельшчыкам (за выключэннем банкаў) у адпаведнасці з яго ўліковай палітыкай, але не раней за дату іх прызнання ў бухгалтарскім уліку;

3.2. судовыя расходы;

3.3. расходы на правядзенне сходаў удзельнікаў (акцыянераў) арганізацыі, у прыватнасці расходы, звязаныя з арэндай капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, падрыхтоўкай і рассылкай неабходных для правядзення сходаў дакументаў, іншыя расходы, непасрэдна звязаныя з правядзеннем такіх сходаў;

3.4. сумы падаткаў, збораў і іншых абавязковых выплат, утрыманых і (ці) заплачаных у бюджэт ці пазабюджэтныя фонды замежных дзяржаў у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў (за выключэннем падаткаў, збораў, у адносінах да якіх прадугледжана ліквідацыя двайнога падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і (ці) міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама падаткаў, збораў, уключаных беларускай арганізацыяй у выручку (даход) згодна з заканадаўствам замежнай дзяржавы пры выкананні ёю абавязацельстваў плацельшчыка замежнай дзяржавы ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі гэтай замежнай дзяржавы), пры наяўнасці даведкі, засведчанай падатковым органам (іншай кампетэнтнай службай дзяржавы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў), ці іншага дакумента, які пацвярджае выплату (утрыманне) падаткаў, збораў і іншых абавязковых выплат у замежнай дзяржаве.

Такія сумы падаткаў, збораў і іншых абавязковых выплат адлюстроўваюцца на дату іх выплаты (пералічэння) у замежнай дзяржаве;

3.5. не прынятыя да выліку сумы падатку на дабаўленую вартасць пры спісанні крэдыторскай запазычанасці ў склад пазарэалізацыйных даходаў у плацельшчыкаў, якія вызначалі да 1 студзеня 2013 года выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па меры аплаты адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату ўключэння ў склад пазарэалізацыйных даходаў сум крэдыторскай запазычанасці;

3.6. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя пры адсутнасці дакументаў, якія абгрунтоўваюць:

3.6.1. прымяненне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры нуль (0) працэнтаў, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты:

адгрузкі тавараў (уключаючы выробленыя з давальніцкай сыравіны і матэрыялаў) у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза. Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

афармлення дэкларацыі на тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай (для плацельшчыкаў, якія ажыццяўляюць дэклараванне мытным органам тавараў у выглядзе электроннага дакумента, – з даты ўнясення ў інфармацыйную сістэму мытных органаў звестак аб выпуску тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай). Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

правядзення таргоў па рэалізацыі пушніна-футравай сыравіны, якая вывозіцца з Рэспублікі Беларусь за межы Расійскай Федэрацыі. Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

3.6.2. вызваленне ад абкладання падаткам на дабаўленую вартасць, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты адгрузкі лізінгадавальніку тавараў, указаных у падпункце 1.44 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса.

Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

3.7. сумы акцызаў, вылічаныя пры адсутнасці дакументаў, якія абгрунтоўваюць прымяненне вызвалення ад акцызаў, пасля сканчэння ста васьмідзесяці каляндарных дзён з даты:

адгрузкі падакцызных тавараў у дзяржавы – члены Еўразійскага эканамічнага саюза. Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

афармлення дэкларацыі на падакцызныя тавары з адзнакамі мытнага органа аб выпуску падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай (для плацельшчыкаў, якія ажыццяўляюць дэклараванне мытным органам падакцызных тавараў у выглядзе электроннага дакумента, – з даты ўнясення ў інфармацыйную сістэму мытных органаў звестак аб выпуску падакцызных тавараў у адпаведнасці з заяўленай мытнай працэдурай). Такія расходы адлюстроўваюцца на сто восемдзесят першы дзень з указанай даты;

3.8. расходы на ўтрыманне асноўных сродкаў (аб'ектаў), якія знаходзяцца на кансервацыі, ажыццёўленай у адпаведнасці з заканадаўствам;

3.9. расходы на ўтрыманне мабілізацыйных магутнасцей і аб'ектаў грамадзянскай абароны, а таксама расходы на правядзенне мерапрыемстваў грамадзянскай абароны;

3.10. расходы па ануляваных вытворчых заказах, а таксама вытворчасцях, якія не далі прадукцыі;

3.11. некампенсаваныя страты ад спынення вытворчасці, прастояў па ўнутрывытворчых і знешніх прычынах, калі іх вінаватыя асобы не выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату складання ўпаўнаважанымі органамі дакументаў, якія пацвярджаюць, што вінаватыя асобы не былі выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх;

3.12. страты ад аперацый з тарай;

3.13. расходы на пакрыццё шкоды ў натуры, страт (у тым ліку ўпушчанай выгады), за выключэннем расходаў, указаных у падпункце 3.1 гэтага пункта, калі вінаватыя асобы не выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату складання ўпаўнаважанымі органамі дакументаў, якія пацвярджаюць, што вінаватыя асобы не былі выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх;

3.14. некампенсаваныя сумы недастач, страт і (ці) пашкоджання маёмасці, у тым ліку тых, якія адбыліся звыш устаноўленых нормаў натуральнага змяншэння, а таксама нормаў страт (бою), панесеныя страты, калі вінаватыя асобы не былі выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх, за выключэннем выпадкаў, калі судом адмоўлена ў спагнанні з-за залежных ад арганізацыі прычын.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату складання праваахоўнымі органамі і (ці) судом дакументаў, якія пацвярджаюць, што вінаватыя асобы не былі выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх;

3.15. некампенсаваныя іншымі асобамі расходы на ўдзел у таргах (тэндарах) у форме конкурсу ці аўкцыёну, якія не прывялі да заключэння дагавору, а таксама ў выпадках, калі таргі (тэндары) прызнаны несапраўднымі ці тымі, якія не адбыліся.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату правядзення таргоў (тэндараў), па выніках якіх дагаворы не былі заключаны, а таксама на дату прызнання таргоў (тэндараў) несапраўднымі ці тымі, якія не адбыліся;

3.16. расходы на ліквідацыю, спісанне асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, якія выводзяцца з эксплуатацыі (уключаючы сумы неданалічанай у адпаведнасці з устаноўленым

тэрмінам карыснага выкарыстання амартызацыі, расходы на дэмантаж, разборку, вываз дэмантаванай, разабранай маёмасці);

3.17. расходы на ліквідацыю і (ці) праведзенае ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, спісанне іншай маёмасці (уключаючы яе кошт), не ўказанай у падпункце 3.16 гэтага пункта, у тым ліку аб'ектаў незавершанага будаўніцтва, маёмасці, мантаж якой не завершаны;

3.18. некампенсаваныя страты і расходы ў сувязі з надзвычайнымі акалічнасцямі (пажар, аварыя, стыхійнае бедства, дарожна-транспартнае здарэнне, вінаватыя асобы якога не выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх), уключаючы расходы, звязаныя з прадухіленнем ці ліквідацыяй наступстваў такіх надзвычайных акалічнасцей;

3.19. расходы на здачу ў арэнду (перадачу ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне маёмасці.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату адлюстравання адпаведных даходаў ад здачы маёмасці ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, якія ўлічваюцца ў парадку, вызначаным падпунктам 3.18 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Склад расходаў на здачу маёмасці ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне вызначаецца з улікам палажэнняў артыкулаў 169–171 гэтага Кодэкса;

3.20. адмоўная розніца, якая ўзнікае паміж коштам маёмасці, перададзенай (атрыманай) у пазыку, і коштам маёмасці, атрыманай (перададзенай) пры пагашэнні гэтай пазыкі. Такія расходы адлюстроўваюцца на дату апрыходавання (спісання) маёмасці ў бухгалтарскім уліку плацельшчыка;

3.21. адмоўная розніца паміж балансавым коштам актываў, якія перадаюцца спецыяльнай фінансавай арганізацыі ў рамках аперацыі сек’юрытызацыі, і сумай сродкаў, якія паступаюць ад спецыяльнай фінансавай арганізацыі па дагаворах уступкі правоў (патрабаванняў);

3.22. страты ад спісання дэбіторскай запазычанасці, па якой скончыўся:

тэрмін іскавай даўнасці;

тэрмін даўнасці для падачы выканаўчых дакументаў да выканання ў выпадку вяртання спагнальніку выканаўчага дакумента, па якім спагнанне не праведзена або праведзена часткова ў сувязі з адсутнасцю ў даўжніка грашовых сродкаў на рахунках у банках і іншай маёмасці, пры наяўнасці дакумента аб немагчымасці спагнання запазычанасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату, якая ідзе следам за днём сканчэння такіх тэрмінаў;

3.23. страты ад спісання дэбіторскай запазычанасці, немагчымай (нерэальнай) для спагнання.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату выключэння дэбітора з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (замежнай арганізацыі і замежнага індывідуальнага прадпрымальніка – з гандлёвага рэгістра ці іншай аналагічнай сістэмы ўліку і ідэнтыфікацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў краіны іх заснавання) і (ці) смерці фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, або абвяшчэння фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, памерлай, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Страты ад спісання дэбіторскай запазычанасці ў сувязі са смерцю (абвяшчэннем памерлым) крэдытора банкам адлюстроўваюцца на дату прызнання такога расходу ў бухгалтарскім уліку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца ў выпадку выключэння дэбітора з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (замежнай арганізацыі – з гандлёвага рэгістра ці іншай аналагічнай сістэмы ўліку і ідэнтыфікацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў краіны іх заснавання) у сувязі з рэарганізацыяй шляхам далучэння;

3.24. сумы дэбіторскай запазычанасці пры ліквідацыі юрыдычнай асобы.

Такія расходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае:

найбольш ранняя з наступных дат: дата падачы падатковай дэкларацыі (разліку) ці апошні дзень тэрміну падачы падатковай дэкларацыі, устаноўленай артыкулам 44 гэтага Кодэкса;

дата складання акта праверкі, у ходзе якой былі выяўлены акалічнасці, якія з'яўляюцца падставай для ліквідацыі юрыдычнай асобы па рашэнні рэгіструючага органа, – пры ліквідацыі юрыдычнай асобы па рашэнні рэгіструючага органа ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.25. сумы змяншэння дэбіторскай запазычанасці (павелічэння крэдыторскай запазычанасці) па няўстойках (штрафах, пенях) і іншых мерах адказнасці за парушэнне абавязацельстваў пры заключэнні міравога пагаднення, пагаднення аб прымірэнні, медыятыўнага пагаднення пры ўмове, што раней указаныя сумы былі ўключаны ў склад пазарэалізацыйных даходаў.

Такія расходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім уступаюць у сілу міравое пагадненне, пагадненне аб прымірэнні ці заключаецца медыятыўнае пагадненне;

3.26. курсавыя розніцы, якія ўзнікаюць пры пераліку выражанага ў замежнай валюце і (ці) беларускіх рублях у суме, эквівалентнай пэўнай суме ў замежнай валюце, кошту актываў і абавязацельстваў, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, за выключэннем указаных у падпункце 1.18 пункта 1 артыкула 173 гэтага Кодэкса і ўзнікшых у атрымальнікаў замежнай бязвыплатнай дапамогі пры пераліку ў беларускія рублі кошту актываў і абавязацельстваў, звязаных з атрыманнем і выкарыстаннем замежнай бязвыплатнай дапамогі, выражанай у замежнай валюце, пры мэтавым выкарыстанні замежнай бязвыплатнай дапамогі;

3.27. адмоўныя розніцы, якія ўзнікаюць у сувязі з пагашэннем дэбіторскай ці крэдыторскай запазычанасці, у тым ліку ў сувязі з атрыманнем аплаты ў суме меншай, чым сума выручкі (пазарэалізацыйных даходаў).

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату пагашэння дэбіторскай ці крэдыторскай запазычанасці;

3.28. расходы плацельшчыкаў на ўтрыманне і эксплуатацыю дамоў састарэлых і інвалідаў, аб'ектаў жыллёвага фонду, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту, якія знаходзяцца на іх балансе, за выключэннем расходаў, указаных у падпункце 3.19 гэтага пункта.

Пры гэтым расходы ўлічваюцца ў парадку, устаноўленым гэтай главой. Гэта палажэнне прымяняецца таксама ў адносінах да расходаў на гэтыя мэты пры долевым удзеле арганізацый ва ўтрыманні і эксплуатацыі ўказаных аб'ектаў і не прымяняецца пры іх выкарыстанні выключна ў прадпрымальніцкай дзейнасці;

3.29. сумы прэмій, бонусаў, дадзеных пры выкананні пакупніком (заказчыкам) умоў (у тым ліку аб'ёму пакупак ці заказаў), вызначаных дагаворам у якасці абавязковых для давання такіх прэмій, бонусаў.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату іх пералічэння, уключаючы залік сустрэчных аднародных патрабаванняў, выкананне абавязацельства трэцяй асобе і іншыя спосабы;

3.30. страты ад продажу замежнай валюты ў суме адмоўнай розніцы, якая ўтварылася з прычынай адхілення курса продажу замежнай валюты ад афіцыйнага курса, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату продажу;

3.31. страта ад абмену аднаго віду замежнай валюты на іншы від замежнай валюты (канверсія замежнай валюты) у выглядзе адмоўнай розніцы паміж сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курса набытай замежнай валюты і яе колькасці, і сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курса рэалізаванай замежнай валюты і яе колькасці;

3.32. кошт прац (паслуг), выкананых (аказаных) па выніках афармлення кантрольнага заказу на выкананне прац (аказанне паслуг);

3.33. грашовыя сродкі, пералічаныя рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі, якія ажыццяўляюць размеркаванне газападобнага паліва па трубаправодах і яго продаж або вытворчасць, перадачу і размеркаванне электрычнай энергіі, рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам, якія ажыццяўляюць аналагічны від дзейнасці, пры размеркаванні сродкаў у

парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, у межах аднаго ўласніка ва ўмовах устанаўлення адзіных у Рэспубліцы Беларусь дыферэнцыраваных па групах спажыўцоў цэн на прыродны газ або тарыфаў на электрычную энергію.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату іх ажыццяўлення;

3.34. абавязковыя страхавыя ўзносы ў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь і па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, налічаныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, за выключэннем указаных у падпункце 2.5 пункта 2 артыкула 170 гэтага Кодэкса ці ўключаных у першапачатковы кошт актываў, якія амартызуюцца;

3.35. адлічэнні ў рэзервы для пакрыцця магчымых страт па мікрапазыках, якія падлягаюць рэзерваванню ў адпаведнасці з заканадаўствам;

3.36. расходы плацельшчыка па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі, у якіх ён указаны ў якасці даручальніка.

Такія расходы вызначаюцца як сума страты, атрыманай па такім дагаворы, разлічаная даверным кіраўніком на аснове даных бухгалтарскага ўліку аперацый давернага кіравання ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, і адлюстроўваюцца на дату вяртання грашовых сродкаў і (ці) каштоўных папер з давернага кіравання. Для мэт гэтай главы такія расходы ўлічваюцца ў тым ліку даручальнікамі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання;

3.37. сумы ўзнагароды давернага кіраўніка па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі ў выпадку, калі гэта ўзнагарода не ўтрымліваецца даверным кіраўніком са сродкаў даручальніка, якія знаходзяцца ў даверным кіраванні, а выплачваецца даручальнікам самастойна. Для мэт гэтай главы такія расходы ўлічваюцца ў тым ліку даручальнікамі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання;

3.38. расходы плацельшчыка па дагаворы давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання, у якім ён указаны ў якасці даручальніка.

Такія расходы вызначаюцца як адмоўная розніца паміж коштам долі даручальніка ў маёмасці фонду на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яго долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання і коштам гэтай долі даручальніка на дату перадачы грашовых сродкаў і (ці) каштоўных папер у фонд.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яго долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання. Для мэт гэтай главы такія расходы ўлічваюцца ў тым ліку даручальнікамі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання;

3.39. сумы грашовых сродкаў, утрыманых на карысць фонду банкаўскага кіравання пры датэрміновым выкупе даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання долевага сертыфіката (яго долі).

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату датэрміновага выкупу долевага сертыфіката (яго долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання. Для мэт гэтай главы такія расходы ўлічваюцца ў тым ліку даручальнікамі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання;

3.40. затраты, праведзеныя заказчыкам, забудоўшчыкам, дольшчыкам пры будоўлі (пакрыцці кошту будоўлі) аб'ектаў, завершаных будаўніцтвам, але не зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку ў якасці аб'ектаў нерухомай маёмасці, аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры і іх добраўпарадкавання, бязвыплатна перададзеных ва ўласнасць дзяржавы;

3.41. затраты, праведзеныя заказчыкам, забудоўшчыкам, дольшчыкам, якія складаюць кошт бязвыплатна выкананых прац (аказаных паслуг, перададзеных тавараў) пры рэканструкцыі, рамонце (пакрыцці рэканструкцыі, рамонту) аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы, у сувязі з будоўляй аб'ектаў будаўніцтва;

3.42. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, з даходаў, указаных у артыкуле 174 гэтага Кодэкса.

Такія расходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, за які гэтыя сумы адлюстраваны ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на дабаўленую вартасць;

3.43. сумы праведзенай ва ўстаноўленым парадку ўцэнкі тавараў у рознічным гандлі і грамадскім харчаванні да цэн на тавар, які нанава паступіў, а таксама сумы зніжэння цэн на тавары з тэрмінам прыдатнасці і (ці) тэрмінам захоўвання, тэрмінам службы, які канчаецца, тавары, якія карыстаюцца абмежаваным попытам у насельніцтва, што праводзіцца за кошт змяншэння пакупнога кошту (у выпадках, калі памеру гандлёвай надбаўкі недастаткова);

3.44. страты ад продажу банкам банкаўскіх і мерных зліткаў з каштоўных металаў, зліткавых (інвестыцыйных) манет з каштоўных металаў у суме адмоўнай розніцы паміж цаной продажу і цаной набыцця. Гэта палажэнне прымяняюць у тым ліку плацельшчыкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак;

3.45. сума арэнднай платы, фактычна заплачаная (залічаная шляхам правядзення заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў) на карысць фізічнай асобы – арэндадаўца, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, і раней аднесеная ў склад пазарэалізацыйных даходаў у адпаведнасці з падпунктам 3.36 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Такія расходы адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, на які прыпадае дата выплаты грашовых сродкаў на карысць фізічнай асобы – арэндадаўца, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, а ў выпадку, калі запазычанасць перад такой фізічнай асобай пагашаецца шляхам заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў, – дата заліку;

3.46. розніца паміж сумай, атрыманай (належнай да атрымання) эмітэнтам пры размяшчэнні жыллёвых аблігацый, і сумай, выплачанай (належнай да выплаты) пры пагашэнні эмітэнтам жыллёвых аблігацый (уключаючы датэрміновы выкуп).

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату пагашэння (датэрміновага выкупу) жыллёвых аблігацый;

3.47. сумы мытных пошлін, падаткаў, спецыяльных, антыдэмпінгавых, кампенсацыйных пошлін, пені, заплачаных мытнымі прадстаўнікамі пры выкананні салідарнага абавязку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Такія расходы адлюстроўваюцца не раней за дату іх фактычнага ажыццяўлення (узнікнення);

3.48. рэзервы па сумніўных даўгах, створаныя па выніках праведзенай на апошняе чысло справаздачнага (падатковага) перыяду інвентарызацыі дэбіторскай запазычанасці, не пагашанай ва ўстаноўлены тэрмін, якая ўзнікла ў сувязі з рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, нематэрыяльных актываў, але не большыя за пяць (5) працэнтаў выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, нематэрыяльных актываў з улікам падатку на дабаўленую вартасць, і вылічаныя наступным чынам:

па сумніўнай запазычанасці з тэрмінам узнікнення большым за дзевяноста каляндарных дзён – у суму рэзерву, які ствараецца, уключаецца поўная сума выяўленай на падставе інвентарызацыі запазычанасці;

па сумніўнай запазычанасці з тэрмінам узнікнення ад сарока пяці да дзевяноста каляндарных дзён (уключна) – у суму рэзерву ўключаецца пяцьдзесят (50) працэнтаў ад сумы, выяўленай на падставе інвентарызацыі запазычанасці;

па сумніўнай запазычанасці з тэрмінам узнікнення да 45 каляндарных дзён – сума выяўленай на падставе інвентарызацыі запазычанасці не павялічвае суму рэзерву, які ствараецца;

3.49. расходы ад змянення справядлівага кошту інструментаў і аб'ектаў хеджыравання, якія прызнаюцца гэтакімі ў бухгалтарскім уліку, у тым ліку расходы на аперацыі з форварднымі і ф'ючарснымі кантрактамі, апцыёнамі і іншымі вытворнымі фінансавымі інструментамі, а таксама камісійны збор, заплачаны арганізатару таргоў, за выключэннем указаных у падпункце 3.50 гэтага пункта;

3.50. расходы юрыдычных асоб – кліентаў суб'ектаў рынку беспаставачных пазабіржавых фінансавых інструментаў, панесеныя ў падатковым (справаздачным) перыядзе па аперацыях з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі ў выглядзе налічаных адмоўных розніц цэн базавых актываў па здзейсненых аперацыях з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі, а таксама іншыя сумы сродкаў, у адносінах да якіх у кліента ўзнікае абавязак іх заплаціць па пагадненні аб здзяйсненні аперацый з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі. У выпадку перавышэння пазарэалізацыйных расходаў юрыдычных асоб – кліентаў суб'ектаў рынку беспаставачных пазабіржавых фінансавых інструментаў па аперацыях з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі над пазарэалізацыйнымі даходамі па такіх аперацыях у падатковым (справаздачным) перыядзе сума такога перавышэння не ўлічваецца пры вылічэнні валавога прыбытку;

3.51. сумы страт, недастач і (ці) пашкоджання маёмасці, а таксама панесеных страт, пакрыццё па якіх улічана ў складзе пазарэалізацыйных даходаў у адпаведнасці з падпунктамі 3.5 і 3.6 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса ў памеры фактычных расходаў, але не больш за суму ўлічанага пакрыцця.

Гэта палажэнне не прымяняецца ў адносінах да расходаў, указаных у падпункце 1.6 пункта 1 артыкула 173 гэтага Кодэкса.

Такія расходы адлюстроўваюцца на дату паступлення пакрыцця ўказаных расходаў (страт), але не раней за іх фактычнае ажыццяўленне;

3.52. іншыя расходы, затраты, страты плацельшчыка пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Такія расходы адлюстроўваюцца не раней за дату іх фактычнага ажыццяўлення (узнікнення).

**Артыкул 176. Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку банкамі**

1. Прыбытак (страта) ад дзейнасці банкаў (валавы прыбытак) вызначаецца як станоўчая (адмоўная) розніца паміж сумамі даходаў і расходаў банкаў з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтым артыкулам.

2. Пры вызначэнні валавога прыбытку банка ўлічваюцца даходы і расходы на аперацыі паміж філіяламі, якія выконваюць ва ўстаноўленым парадку падатковыя абавязацельствы гэтага банка, а таксама даходы і расходы ад дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку па дзейнасці, па якой банк зарэгістраваны ў якасці плацельшчыка падаткаў замежнай дзяржавы.

Расходы банкаў, якія адносяцца да справаздачнага перыяду, пацвярджаюцца першаснымі ўліковымі дакументамі, што паступілі пасля сканчэння гэтага перыяду, адлюстроўваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім паступілі першасныя ўліковыя дакументы, за выключэннем тых, што паступілі пасля сканчэння падатковага перыяду. Расходы банкаў, якія адносяцца да падатковага перыяду, пацвярджаюцца першаснымі ўліковымі дакументамі, якія паступілі пасля сканчэння падатковага перыяду, адлюстроўваюцца ў тым падатковым перыядзе, да якога яны адносяцца.

Валавы прыбытак філіяламі банка, якія выконваюць ва ўстаноўленым парадку падатковыя абавязацельствы гэтага банка, вызначаецца ў адпаведнасці з гэтым артыкулам ад дзейнасці гэтых філіялаў.

3. Даходы і расходы банка ўлічваюцца на дату прызнання іх у бухгалтарскім уліку згодна з прынцыпам налічэння ў парадку, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, з улікам палажэнняў гэтага артыкула.

4. Даходы і расходы банка вызначаюцца, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, зыходзячы з цэн здзелак, якія карэкціруюцца ў выпадках, устаноўленых главой 11 гэтага Кодэкса.

5. Валавы прыбытак банка вызначаецца з улікам асаблівасцей, устаноўленых пунктамі 6–10 артыкула 167, пунктамі 3 і 4 артыкула 168, артыкуламі 178 і 179 гэтага Кодэкса.

6. У выпадках, указаных у пункце 13 артыкула 168 гэтага Кодэкса, карэкціроўка даходаў банка і (ці) адпаведных ім расходаў, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, праводзіцца ў

парадку, вызначаным указаным пунктам у адносінах да выручкі і (ці) затрат па вытворчасці і рэалізацыі.

7. Даходы банкаў для мэт гэтага артыкула ўключаюць у сябе даходы, якія адносяцца ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь да працэнтных даходаў, камісійных даходаў, іншых банкаўскіх даходаў, аперацыйных даходаў, змяншэння рэзерваў, паступленняў па раней спісаных даўгах.

8. Да даходаў, якія адносяцца да змяншэння рэзерваў у складзе даходаў банкаў, для мэт падаткаабкладання ўлічваюцца сумы змяншэння ці анулявання адлічэнняў у рэзервы, якія ствараюцца ў парадку, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь. Да такіх рэзерваў адносяцца:

спецыяльны рэзерв на пакрыццё магчымых страт па актывах, падвержаных крэдытнай рызыцы;

спецыяльны рэзерв на пакрыццё магчымых страт па аперацыях, не адлюстраваных на балансе;

рэзерв па налічаных і неатрыманых даходах.

9. Да пазарэалізацыйных даходаў банка адносяцца даходы, якія адносяцца да змяншэння рэзерваў, а таксама даходы, указаныя ў артыкуле 174 гэтага Кодэкса, за выключэннем падпунктаў 3.4, 3.26, 3.27 і 3.32 пункта 3 гэтага артыкула, якія ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку банка ў парадку, устаноўленым указаным артыкулам.

10. Расходы банкаў для мэт гэтага артыкула ўключаюць у сябе расходы, якія адносяцца ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь да працэнтных расходаў, камісійных расходаў, іншых банкаўскіх расходаў, аперацыйных расходаў, адлічэнняў у рэзервы, даўгоў, спісаных з балансу, а таксама інвестыцыйны вылік, які прымяняецца ў парадку, устаноўленым падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 170 гэтага Кодэкса.

11. Для мэт падаткаабкладання ў складзе расходаў банкаў улічваюцца сумы адлічэнняў у рэзервы, якія ствараюцца ў парадку, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь. Да такіх рэзерваў адносяцца:

спецыяльны рэзерв на пакрыццё магчымых страт па актывах, падвержаных крэдытнай рызыцы;

спецыяльны рэзерв на пакрыццё магчымых страт па аперацыях, не адлюстраваных на балансе;

рэзерв па налічаных і неатрыманых даходах.

12. Расходы банка, указаныя ў артыкулах 169–173 гэтага Кодэкса, улічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку банка ў парадку, устаноўленым указанымі артыкуламі.

13. Да пазарэалізацыйных расходаў банка адносяцца сумы адлічэнняў у рэзервы, якія ствараюцца ў парадку, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, а таксама расходы, указаныя ў артыкуле 175, за выключэннем падпунктаў 3.30, 3.31, 3.44 і 3.50 пункта 3 гэтага артыкула, якія ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку банка ў парадку, устаноўленым указаным артыкулам.

**Артыкул 177. Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку страхавымі арганізацыямі**

1. Валавы прыбытак страхавымі арганізацыямі вызначаецца з улікам асаблівасцей, выкладзеных у гэтым артыкуле.

2. Даходы страхавых арганізацый ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў уключаюць у сябе:

2.1. страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі) па дагаворах страхавання, сустрахавання, перастрахавання, зменшаныя на сумы вяртання страхавых узносаў (страхавых прэмій) па дагаворах страхавання, сустрахавання, перастрахавання ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам і (ці) умовамі такіх дагавораў. Пры гэтым страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі) па дагаворах сустрахавання ўключаюцца ў склад даходаў страхоўшчыка (сустрахоўшчыка) толькі ў памеры яго долі страхавой прэміі, устаноўленай у дагаворы сустрахавання;

2.2. сумы змянення страхавых рэзерваў (з улікам змянення долі перастрахоўшчыкаў у страхавых рэзервах) у бок змяншэння;

2.3. камісійныя ўзнагароды па дагаворах перастрахавання і камісіі з прыбытку, якія выплачваюцца перастрахоўшчыкамі перастрахавальнікам для заахвочвання за даванне магчымасці ўдзельнічаць у дагаворы перастрахавання і абачлівае вядзенне справы;

2.4. узнагароды сустрахоўшчыку па дагаворах сустрахавання;

2.5. сумы пакрыцця перастрахоўшчыкамі долі страхавых выплат па рызыках, перададзеных у перастрахаванне, а таксама па рызыках, перададзеных перастрахоўшчыкамі ў далейшае (наступнае) перастрахаванне;

2.6. сумы працэнтаў на дэпо прэмій па рызыках, прынятых у перастрахаванне;

2.7. даходы ад рэалізацыі перайшоўшага да страхоўшчыка ў адпаведнасці з заканадаўствам права патрабавання страхавальніка (выгаданабытчыка) да асоб, адказных за страты, кампенсаваныя ў выніку страхавання.

Такія даходы адлюстроўваюцца на дату іх паступлення незалежна ад спосабу пагашэння запазычанасці (уключаючы аплату запазычанасці перад трэцімі асобамі, залік сустрэчных патрабаванняў і іншыя спосабы);

2.8. сумы санкцый за невыкананне і (ці) неналежнае выкананне ўмоў дагавораў страхавання, заплачаныя даўжніком добраахвотна або па рашэнні суда;

2.9. узнагароды, атрыманыя страхоўшчыкам за дзейнасць па ацэнцы страхавой рызыкі і памеру ўрону, па ацэнцы і аглядзе рухомай і нерухомай маёмасці ў сувязі са страхаваннем і выдачы заключэнняў аб стане гэтай маёмасці, па арганізацыі давання паслуг тэхнічнага, медыцынскага і фінансавага характару іншаму страхоўшчыку або страхавальніку (застрахаванаму, пацярпеламу, а таксама іншай асобе, якая прэтэндуе на атрыманне страхавой выплаты) у мэтах выканання заключаных гэтымі асобамі дагавораў страхавання, па аказанні паслуг іншай страхавой арганізацыі ва ўстанаўленні прычын, характару ўрону пры надыходзе страхавога выпадку;

2.10. даходы ад размяшчэння страхавых рэзерваў і іншых сродкаў;

2.11. іншыя даходы.

3. Страхавыя рэзервы, рэшткі сродкаў фондаў папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў, якія перадаюцца адной страхавой арганізацыяй іншай адначасова з перадачай абавязацельстваў па дагаворах добраахвотнага страхавання, не ўлічваюцца ў складзе даходаў страхавой арганізацыі, якая прымае ўказаныя абавязацельствы.

4. У страхавых арганізацый у затратах, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, таксама ўлічваюцца:

4.1. сумы змянення страхавых рэзерваў (з улікам змянення долі перастрахоўшчыкаў у страхавых рэзервах) у бок павелічэння;

4.2. выплаты страхавога забеспячэння і страхавога пакрыцця па дагаворах страхавання, сустрахавання, перастрахавання, зменшаныя на сумы вяртання выплачанага страхавога пакрыцця і страхавога забеспячэння па дагаворах страхавання, сустрахавання і перастрахавання. Пры гэтым выплаты страхавога забеспячэння і страхавога пакрыцця па дагаворах сустрахавання ўключаюцца ў затраты страхоўшчыка (сустрахоўшчыка) толькі ў памеры яго долі, устаноўленай дагаворам сустрахавання;

4.3. сумы страхавых узносаў (страхавых прэмій) па рызыках, перададзеных у перастрахаванне, зменшаныя на сумы вяртання страхавых узносаў (страхавых прэмій) па дагаворах перастрахавання ў выпадку іх датэрміновага спынення;

4.4. камісійныя ўзнагароды па дагаворах перастрахавання і камісіі з прыбытку, якія выплачваюцца перастрахоўшчыкамі перастрахавальнікам для заахвочвання за даванне магчымасці ўдзельнічаць у дагаворы перастрахавання і абачлівае вядзенне справы, а таксама пакрыццё перастрахоўшчыку расходаў, звязаных з аказаннем паслуг па дагаворах перастрахавання;

4.5. сумы працэнтаў на дэпо прэмій па рызыках, перададзеных у перастрахаванне;

4.6. узнагароды сустрахоўшчыку па дагаворах сустрахавання і пакрыццё сустрахоўшчыку расходаў, звязаных з аказаннем паслуг па дагаворах сустрахавання;

4.7. сумы адлічэнняў у фонды папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў і гарантыйныя фонды, у тым ліку гарантыйныя фонды Беларускага бюро па транспартным страхаванні, у парадку і памерах, устаноўленых заканадаўствам;

4.8. сумы пакрыцця долі страхавых выплат па рызыках, прынятых у перастрахаванне;

4.9. расходы, звязаныя з размяшчэннем страхавых рэзерваў;

4.10. іншыя затраты на вядзенне справы, у тым ліку:

выплаты страхавым агентам і страхавым брокерам узнагарод за аказаныя паслугі ў памеры, устаноўленым Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь;

пакрыццё страхавым агентам расходаў на праезд, звязаны з вытворчай дзейнасцю, транспартам агульнага карыстання, за выключэннем аўтамабіляў-таксі, спецыяльнымі маршрутамі і ведамасным транспартам;

аплата паслуг арганізацый па выкананні імі пісьмовых даручэнняў работнікаў па пералічэнні страхавых узносаў з належнай ім заработнай платы шляхам безнаяўных разлікаў;

аплата паслуг кампетэнтных органаў і арганізацый па выдачы дакументаў, неабходных для выплаты страхавога забеспячэння і страхавога пакрыцця, а таксама паслуг арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прыцягваюцца для вызначэння рэчаіснага кошту (страхавога кошту) маёмасці, для ацэнкі страхавой рызыкі пры заключэнні дагавора страхавання, памеру страты ад страхавога выпадку і ўрэгулявання пытанняў страхавых выплат у якасці экспертаў, сюрвейераў, аварыйных камісараў;

плата за інкасацыю, перавозку наяўных грашовых сродкаў, плацежных інструкцый, каштоўных металаў і каштоўных камянёў і іншых каштоўнасцей;

расходы на выраб бланкаў страхавых полісаў (пасведчанняў, сертыфікатаў).

**Артыкул 178. Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку некаторымі катэгорыямі плацельшчыкаў**

1. Валавы прыбытак бюджэтных арганізацый вызначаецца як сума прыбытку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, атрыманага пры ажыццяўленні дзейнасці, якая прыносіць даходы, і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў. Выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, нематэрыяльных актываў вызначаецца ў адпаведнасці з нормамі артыкула 168 гэтага Кодэкса.

Пры вызначэнні валавога прыбытку ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта ўлічваюцца затраты і пазарэалізацыйныя расходы, якія адносяцца да дзейнасці, якая прыносіць даходы, з улікам абмежаванняў, устаноўленых артыкулам 173 гэтага Кодэкса.

2. Валавы прыбытак грамадскіх і рэлігійных арганізацый (аб'яднанняў), рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, іншых некамерцыйных арганізацый вызначаецца як сума прыбытку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, зменшаных на суму пазарэалізацыйных расходаў.

У выпадку неажыццяўлення вытворчасці і рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў указанымі ў частцы першай гэтага пункта арганізацыямі ўключаюцца ў склад пазарэалізацыйных расходаў на дату іх прызнання ў бухгалтарскім уліку панесеныя за кошт сродкаў, уключаных у склад пазарэалізацыйных даходаў:

расходы на набыццё (у тым ліку шляхам стварэння) аб'ектаў асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі, праз налічэнне амартызацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам. Асноўныя сродкі, якія знаходзяцца ў прастоі (у тым ліку ў сувязі з правядзеннем рамонту) працягласцю да трох месяцаў, запасе, прыраўноўваюцца да асноўных сродкаў, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі;

іншыя расходы з улікам абмежаванняў, устаноўленых артыкуламі 171 і 173 гэтага Кодэкса.

3. Пры вызначэнні валавога прыбытку простай суполкі не ўлічваюцца ўклады ўдзельнікаў простай суполкі ў гэту суполку.

Вызваленне ад падаткаабкладання падаткам на прыбытак пры падаткаабкладанні прыбытку простай суполкі не прымяняецца.

Пры вызначэнні валавога прыбытку ўдзельнікаў простай суполкі (за выключэннем укладаў у выглядзе прафесійных і іншых ведаў, навыкаў і ўменняў, а таксама дзелавой

рэпутацыі і дзелавых сувязяў) не ўлічваюцца даходы, атрыманыя гэтымі ўдзельнікамі пры вяртанні іх укладаў у гэту суполку, а таксама пры размеркаванні прыбытку простай суполкі, які застаецца пасля падаткаабкладання.

Страты простай суполкі пры вызначэнні валавога прыбытку ў яго ўдзельнікаў не ўлічваюцца.

Станоўчая розніца паміж ацэначным коштам маёмасці, якая перадаецца ўдзельнікам простай суполкі ў якасці неграшовага ўкладу ў гэту суполку, і астаткавым коштам гэтай маёмасці ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку ўдзельніка, які перадае гэту маёмасць.

Адмоўная розніца паміж ацэначным коштам маёмасці, якая перадаецца ўдзельнікам простай суполкі ў якасці неграшовага ўкладу ў гэту суполку, і астаткавым коштам гэтай маёмасці не ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку ўдзельніка, які перадае гэту маёмасць.

Удзельнік простай суполкі, які прызнаецца плацельшчыкам у адносінах да прыбытку гэтай суполкі, вядзе раздзельны ўлік выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, а таксама затрат, звязаных з дзейнасцю гэтай суполкі. Сумы выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, а таксама затрат, звязаных з дзейнасцю гэтай суполкі, у такога ўдзельніка не ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку, па якім ён прызнаецца самастойным плацельшчыкам.

4. Валавы прыбытак вызначаецца ў выглядзе перавышэння фактычна атрыманых на працягу падатковага перыяду даходаў над фактычна праведзенымі на працягу падатковага перыяду расходамі:

установамі адукацыі, якія з'яўляюцца бюджэтнымі арганізацыямі;

Дэпартаментам аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і яго падраздзяленнямі, а таксама арганізацыямі, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, – у частцы аказання ахоўных паслуг (прац) арганізацыям, якія не з'яўляюцца бюджэтнымі арганізацыямі.

Улік расходаў плацельшчыкамі, указанымі ў абзацы другім часткі першай гэтага пункта, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з расходнай часткай каштарысаў даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый, складзеных і зацверджаных у парадку, устаноўленым заканадаўствам, з улікам абмежаванняў, устаноўленых артыкулам 173 гэтага Кодэкса.

Улік расходаў плацельшчыкамі, указанымі ў абзацы трэцім часткі першай гэтага пункта, ажыццяўляецца па пераліку расходаў органаў унутраных спраў у адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь і каштарысам расходаў, уключаючы адлічэнні на ўтрыманне апарату Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, яго абласных (Мінскага гарадскога) кіраўніцтваў.

5. Валавы прыбытак у сувязі з выкананнем дагавора давернага кіравання маёмасцю даручальнік вызначае згодна з палажэннямі, устаноўленымі гэтай главой, з улікам наступных асаблівасцей:

выручка і пазарэалізацыйныя даходы, якія ўтвараюцца ў сувязі з выкананнем даверным кіраўніком дагавора давернага кіравання маёмасцю, з'яўляюцца выручкай і пазарэалізацыйнымі даходамі даручальніка, у тым ліку пры наяўнасці выгаданабытчыка;

затраты (расходы), звязаныя з выкананнем дагавора давернага кіравання маёмасцю, уключаючы вылічаны падатак на дабаўленую вартасць, амартызацыю маёмасці, а таксама ўзнагароду давернага кіраўніка, прызнаюцца затратамі (расходамі) даручальніка;

даверны кіраўнік штомесяц вызначае выручку, пазарэалізацыйныя даходы, затраты (расходы), якія ўтвараюцца ў сувязі з выкананнем ім дагавора давернага кіравання маёмасцю, і падае даручальніку звесткі аб іх разам з копіямі дакументаў (дагавораў, першасных уліковых дакументаў і іншых дакументаў), засведчанымі даверным кіраўніком, для іх уліку даручальнікам пры вызначэнні валавога прыбытку. Пры гэтым вызначэнне выручкі і пазарэалізацыйных даходаў і затрат (расходаў) даверным кіраўніком праводзіцца зыходзячы з уліковай палітыкі даручальніка. Даверны кіраўнік мае права не прымяняць нормы гэтага абзаца

ў выпадку, калі даходы (прыбытак) даручальнікаў не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на прыбытак згодна з дзейным заканадаўствам.

Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку, устаноўленыя гэтым пунктам, не распаўсюджваюцца на дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі, дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі і дагаворы давернага кіравання фондамі банкаўскага кіравання.

6. Даверны кіраўнік па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі вызначае на дату заканчэння дагавора давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагавора давернага кіравання каштоўнымі паперамі пазарэалізацыйныя даходы і пазарэалізацыйныя расходы даручальніка, якія ўтвараюцца ў сувязі з выкананнем ім дагавора давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагавора давернага кіравання каштоўнымі паперамі, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні валавога прыбытку даручальніка, і падае даручальніку звесткі аб іх для іх уліку даручальнікам пры вызначэнні валавога прыбытку.

7. Даверны кіраўнік фонду банкаўскага кіравання вызначае на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яго долі) пазарэалізацыйныя даходы і пазарэалізацыйныя расходы даручальніка, якія ўтвараюцца ў сувязі з выкананнем ім дагавора давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні валавога прыбытку даручальніка, і падае даручальніку звесткі аб іх для іх уліку даручальнікам пры вызначэнні валавога прыбытку.

8. Пры перадачы даверным кіраўніком даручальніку (выгаданабытчыку) каштоўных папер, набытых па дагаворы давернага кіравання, гэты даверны кіраўнік абавязаны выдаць пісьмовае пацвярджэнне аб перадачы даручальніку (выгаданабытчыку) такіх каштоўных папер з указаннем даты выбыцця каштоўных папер, іх колькасці і балансавага кошту, вызначанага на дату выбыцця.

Такое пісьмовае пацвярджэнне з'яўляецца дакументам, які пацвярджае фактычна праведзеныя і дакументальна пацверджаныя расходы, панесеныя даручальнікам (выгаданабытчыкам) для набыцця такіх каштоўных папер.

**Артыкул 179. Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку ад аперацый з каштоўнымі паперамі**

1. Пры вызначэнні валавога прыбытку ад аперацый з каштоўнымі паперамі арганізацыямі, акрамя банкаў (за выключэннем размяшчэння эмісійных каштоўных папер і выдачы вэксаляў):

даходы пры рэалізацыі каштоўных папер ці выбыцці на іншых падставах, устаноўленых заканадаўствам, а таксама пры іх пагашэнні ўлічваюцца (прымаюцца) зыходзячы з цаны рэалізацыі ці пагашэння каштоўных папер;

затраты пры рэалізацыі каштоўных папер, а таксама пры іх пагашэнні вызначаюцца зыходзячы з:

амартызаванага (без уліку абясцэнення) кошту каштоўных папер на дату іх рэалізацыі ці пагашэння – для каштоўных папер, якія ўлічваюцца па амартызаваным кошце;

цэны набыцця – для каштоўных папер, якія ўлічваюцца па справядлівым кошце;

расходаў на рэалізацыю каштоўных папер, уключаючы сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца на іх.

2. Пры вызначэнні банкамі валавога прыбытку ад аперацый з каштоўнымі паперамі (за выключэннем размяшчэння эмісійных каштоўных папер):

даходы ад рэалізацыі каштоўных папер ці пры выбыцці на іншых падставах, а таксама пры іх пагашэнні вызначаюцца зыходзячы з цаны рэалізацыі ці іншага выбыцця каштоўнай паперы (у тым ліку пагашэння), а таксама сумы назапашанага працэнтнага даходу, заплачанай плацельшчыку пакупніком, ці сумы працэнтнага даходу, выплачанай плацельшчыку эмітэнтам (у даходы плацельшчыка не ўключаюцца сумы працэнтнага даходу, раней улічаныя пры падаткаабкладанні);

затраты плацельшчыка пры рэалізацыі ці іншым выбыцці (у тым ліку пры пагашэнні ці частковым пагашэнні намінальнага кошту) каштоўных папер вызначаюцца зыходзячы з

расходаў на набыццё і рэалізацыю каштоўных папер, аплату паслуг арганізатара таргоў, дэпазітарыя, іншых прафесійных удзельнікаў рынку каштоўных папер, іншых прамых расходаў, якія непасрэдна адносяцца да аперацый з каштоўнымі паперамі, уключаючы сумы падатку на дабаўленую вартасць, якія адносяцца на іх, а таксама сумы назапашанага працэнтнага даходу, заплачанай плацельшчыкам прадаўцу каштоўнай паперы.

3. Даходы і расходы, звязаныя са здзяйсненнем здзелак РЭПО з каштоўнымі паперамі, вызначаюцца зыходзячы з працэнтных даходаў і расходаў па каштоўных паперах і пазыках, налічаных і адлюстраваных у бухгалтарскім уліку ў адпаведнасці з умовамі дагавораў і патрабаваннямі заканадаўства, якое рэгулюе пытанні бухгалтарскага ўліку.

4. Для мэт гэтай главы аперацыі эмітэнтаў з аблігацыямі ўласнай эмісіі прызнаюцца аперацыямі па прыцягненні ці вяртанні пазык.

**Артыкул 180. Пастаяннае прадстаўніцтва замежнай арганізацыі. Асаблівасці вызначэння валавога прыбытку замежнымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва**

1. Пастаянным прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі, размешчаным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прызнаюцца:

1.1. пастаяннае месца дзейнасці, праз якое замежная арганізацыя поўнасцю ці часткова ажыццяўляе прадпрымальніцкую і іншую дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем прадугледжанай абзацамі другім – пятым часткі першай пункта 5 гэтага артыкула;

1.2. арганізацыя ці фізічная асоба, якія ажыццяўляюць дзейнасць ад імя замежнай арганізацыі і (ці) у яе інтарэсах і (ці) маюць і выкарыстоўваюць паўнамоцтвы замежнай арганізацыі на заключэнне кантрактаў ці ўзгадненне іх істотных умоў.

Замежная арганізацыя не разглядаецца як арганізацыя, якая мае пастаяннае прадстаўніцтва, калі пры арганізацыі і ажыццяўленні дзейнасці ад імя замежнай арганізацыі і (ці) у яе інтарэсах арганізацыя ці фізічная асоба дзейнічаюць у рамках ажыццяўлення сваёй звычайнай дзейнасці.

Пад звычайнай дзейнасцю разумеецца дзейнасць, якая ажыццяўляецца самастойна і не падвяргаецца ўказанням ці кантролю з боку замежнай арганізацыі і пры ажыццяўленні якой прадпрымальніцкая рызыка за яе вынікі ляжыць на арганізацыі ці фізічнай асобе, а не на замежнай арганізацыі, якую яны прадстаўляюць.

2. Калі замежная арганізацыя ажыццяўляе прадпрымальніцкую і іншую дзейнасць, выкарыстоўваючы некалькі пастаянных месцаў дзейнасці, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у кожным з якіх выконваюцца пэўныя функцыі, накіраваныя на атрыманне агульнага выніку, прызнанне наяўнасці пастаяннага прадстаўніцтва замежнай арганізацыі праводзіцца падатковымі органамі з улікам дзейнасці ўсіх пастаянных месцаў дзейнасці замежнай арганізацыі, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Калі замежная арганізацыя выконвае працы і (ці) аказвае паслугі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, месца выканання прац, аказання паслуг замежнай арганізацыі з пачатку яго існавання прызнаецца пастаянным прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі пры ўмове, што ўказаная дзейнасць ажыццяўляецца на працягу ста васьмідзесяці дзён бесперапынна ці ў сукупнасці ў любым дванаццацімесячным перыядзе, які пачынаецца ці заканчваецца ў адпаведным падатковым перыядзе.

4. Будаўнічая пляцоўка, мантажны ці зборачны аб'ект з пачатку яе (яго) існавання прызнаюцца пастаянным прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі, калі такія пляцоўка ці аб'ект існуюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на працягу перыяду, які перавышае сто восемдзесят дзён у любым дванаццацімесячным перыядзе, што пачынаецца ці заканчваецца ў адпаведным падатковым перыядзе.

Да будаўнічай пляцоўкі, мантажнага ці зборачнага аб'екта замежнай арганізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь адносяцца месца будаўніцтва новых, рэканструкцыі (мадэрнізацыі), пашырэння, тэхнічнага перааснашчэння і (ці) рамонту існуючых аб'ектаў нерухомай маёмасці (за выключэннем паветраных і марскіх суднаў, суднаў унутранага плавання

і касмічных аб'ектаў), а таксама месца будаўніцтва і (ці) мантажу, рамонту, рэканструкцыі (мадэрнізацыі), пашырэння і (ці) тэхнічнага перааснашчэння збудаванняў, машын і абсталявання, функцыянаванне якіх патрабуе цвёрдага мацавання на падмурку ці да канструктыўных элементаў капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў).

У выпадку ажыццяўлення праектавання аб'екта іншымі замежнымі арганізацыямі за межамі Рэспублікі Беларусь у тэрмін існавання будаўнічай пляцоўкі не ўключаецца тэрмін выканання такіх прац.

У выпадку ажыццяўлення замежнай арганізацыяй праектавання аб'екта за межамі Рэспублікі Беларусь тэрмін выканання такіх прац і прыбытак ад іх выканання не ўключаюцца адпаведна ў тэрмін існавання пастаяннага прадстаўніцтва такой замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь і ў прыбытак ад ажыццяўлення дзейнасці праз яго.

Пры вызначэнні тэрміну існавання будаўнічай пляцоўкі, мантажнага ці зборачнага аб'екта час, затрачаны падрадчыкам на іншых будаўнічых пляцоўках і (ці) аб'ектах, якія не звязаны з будаўнічай пляцоўкай і (ці) аб'ектам, не ўлічваецца.

Пачаткам існавання будаўнічай пляцоўкі прызнаецца больш ранняя з наступных дат:

дата падпісання акта аб перадачы пляцоўкі падрадчыку (акта аб допуску персаналу субпадрадчыка для выканання яго часткі сумеснага аб'ёму прац);

дата фактычнага пачатку прац.

Заканчэннем існавання будаўнічай пляцоўкі з'яўляецца дата падпісання заказчыкам (забудоўшчыкам) акта здачы-прыёмкі прац (акта перадачы аб'екта) ці прадугледжанага дагаворам комплексу прац. Заканчэннем прац субпадрадчыка лічыцца дата падпісання акта здачы-прыёмкі прац генеральнаму падрадчыку. Калі акт здачы-прыёмкі не афармляўся ці працы фактычна скончыліся да ці пасля падпісання такога акта, будаўнічая пляцоўка лічыцца спыніўшай існаванне (працы субпадрадчыка лічацца закончанымі) на дату фактычнага заканчэння падрыхтоўчых, будаўнічых ці мантажных прац, якія ўваходзяць у аб'ём прац адпаведнай асобы на гэтай будаўнічай пляцоўцы.

5. Не прызнаецца пастаянным прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь месца, якое выкарыстоўваецца ёю выключна для адной ці некалькіх наступных мэт:

захоўванне, дэманстрацыя ці пастаўка тавараў. Пастаўкай лічацца дастаўка і адгрузка тавараў без іх рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва замежнай арганізацыі;

закупка тавараў, (прац, паслуг), маёмасных правоў для замежнай арганізацыі;

збор ці распаўсюджванне інфармацыі для замежнай арганізацыі;

ажыццяўленне іншых відаў дзейнасці, калі пры гэтым дзейнасць у цэлым носіць падрыхтоўчы ці дапаможны характар.

Указаныя ў частцы першай гэтага пункта віды дзейнасці не прыводзяць да ўтварэння пастаяннага прадстаўніцтва замежнай арганізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, нават калі яны ажыццяўляюцца праз пастаяннае месца дзейнасці замежнай арганізацыі, пры ўмове, што гэтыя віды дзейнасці асобна або ў сукупнасці носяць падрыхтоўчы ці дапаможны характар.

Віды дзейнасці замежнай арганізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь разглядаюцца як падрыхтоўчыя ці дапаможныя, калі яны носяць такі характар у адносінах да дзейнасці замежнай арганізацыі, за ажыццяўленне якой замежная арганізацыя атрымлівае выручку.

6. Увоз замежнай арганізацыяй у Рэспубліку Беларусь ці вываз з Рэспублікі Беларусь тавараў, іншае перамяшчэнне тавараў ці іншай маёмасці пры адсутнасці прыкмет пастаяннага прадстаўніцтва замежнай арганізацыі, вызначаных пунктам 1 гэтага артыкула, не прыводзяць да ўтварэння пастаяннага прадстаўніцтва гэтай замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

7. У выпадку, калі адной з крыніц валавога прыбытку замежнай арганізацыі з'яўляецца прыбытак ад яе дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва і гэты прыбытак не можа быць вызначаны зыходзячы з дакументальна пацверджанай выручкі за вылікам дакументальна пацверджаных затрат, валавы прыбытак, які падлягае падаткаабкладанню на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разлічваецца як здабытак валавога прыбытку замежнай арганізацыі і каэфіцыента, які дазваляе вызначыць удзельную вагу прыбытку, што падлягае падаткаабкладанню ў Рэспубліцы Беларусь.

Каэфіцыент вызначаецца як удзельная вага аднаго з паказчыкаў фінансава-гаспадарчай дзейнасці пастаяннага прадстаўніцтва замежнай арганізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, узгодненага замежнай арганізацыяй з падатковым органам, у агульным аб'ёме аналагічнага паказчыка замежнай арганізацыі (затраты рабочага часу, сумы панесеных расходаў ці атрыманай выручкі, адгружаная прадукцыя, выкананыя працы, аказаныя паслугі ці іншы паказчык, узгодненый з падатковым органам). На працягу падатковага перыяду не дапускаецца змяненне прынятага каэфіцыента вылічэння валавога прыбытку.

Калі валавы прыбытак замежнай арганізацыі, які падлягае падаткаабкладанню ў Рэспубліцы Беларусь, не можа быць разлічаны ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта (адсутнічаюць звесткі аб валавым прыбытку замежнай арганізацыі і (ці) даныя, неабходныя для разліку каэфіцыента), ён вызначаецца на падставе звестак аб плацельшчыках (іншых абавязаных асобах), якія ажыццяўляюць аналагічныя віды дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь ці ўпаўнаважаным ім органам.

8. Пры вызначэнні валавога прыбытку замежнай арганізацыі ў адпаведнасці з пунктам 7 гэтага артыкула перанос страт, устаноўлены заканадаўствам замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя, не змяншае валавы прыбытак замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, які падлягае падаткаабкладанню ў Рэспубліцы Беларусь.

9. У затраты на вытворчасць і рэалізацыю (пазарэалізацыйныя расходы) замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, акрамя затрат (пазарэалізацыйных расходаў), панесеных у Рэспубліцы Беларусь, уключаюцца таксама затраты (пазарэалізацыйныя расходы), панесеныя за межамі Рэспублікі Беларусь, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы ўлічваюцца ў ёй для мэт падаткаабкладання прыбытку і непасрэдна звязаны з ажыццяўленнем замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, уключаючы кіраўніцкія і агульнаадміністрацыйныя затраты, за выключэннем затрат (пазарэалізацыйных расходаў), якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні прыбытку ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (далей у гэтым артыкуле – замежныя затраты).

Пад кіраўніцкімі і агульнаадміністрацыйнымі затратамі, якія ўлічваюцца ў якасці замежных затрат пры падаткаабкладанні прыбытку ў Рэспубліцы Беларусь, разумеюцца затраты (пазарэалізацыйныя расходы), якія адносяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці да кіраўніцкіх расходаў, ускосных агульнагаспадарчых затрат і зыходзячы з палажэнняў гэтай главы могуць быць уключаны ў склад затрат (пазарэалізацыйных расходаў) (далей у гэтым артыкуле – кіраўніцкія і агульнаадміністрацыйныя замежныя затраты).

10. Замежныя затраты павінны быць пацверджаны адпаведным заключэннем аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя, якое падаецца падатковаму органу не пазней за тэрмін падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак за падатковы перыяд, да якога яны адносяцца.

Заключэнне аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя, якое пацвярджае замежныя затраты, можа давацца за справаздачныя перыяды падатку на прыбытак. Калі замежныя затраты пацверджаны заключэннямі аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя, складзенымі за першыя тры кварталы падатковага перыяду, то замежныя затраты, якія адносяцца да чацвёртага квартала падатковага перыяду, могуць быць пацверджаны такім заключэннем аналагічна за чацвёрты квартал без уключэння ў яго паказчыкаў за папярэднія кварталы падатковага перыяду, калі гэта не скажае агульную гадавую суму замежных затрат.

Не дапускаецца адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак, якая падаецца за падатковы перыяд, замежных затрат, не пацверджаных

заключэннем аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя.

11. У заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы звесткі аб замежных затратах павінны змяшчаць у тым ліку даныя аб сумах замежных затрат у замежнай валюце і беларускіх рублях, панесеных замежнай арганізацыяй для мэт ажыццяўлення дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, з разбіўкай па відах замежных затрат, а таксама аб датах іх прыняцця замежнай арганізацыяй да ўліку для мэт падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы.

12. Пералік замежных затрат у беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату прыняцця іх у замежнай дзяржаве да ўліку для мэт падаткаабкладання, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам.

Калі заканадаўствам замежнай дзяржавы не прадугледжаны вядзенне падатковага ўліку для мэт падаткаабкладання прыбытку (аб чым павінна быць указана ў заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы са спасылкай на акты заканадаўства замежнай дзяржавы) і (ці) прызнанне аб'ектам падаткаабкладання прыбытку, атрыманага замежнай арганізацыяй ад дзейнасці праз пастаяннае прадстаўніцтва, размешчанае ў Рэспубліцы Беларусь, то пералік замежных затрат у беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату прыняцця іх у замежнай дзяржаве да бухгалтарскага ўліку.

Калі ў адносінах да кіраўніцкіх і агульнаадміністрацыйных замежных затрат у заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя, адсутнічае інфармацыя аб даце прыняцця іх у замежнай дзяржаве да ўліку, аднак указаны месяцы, кварталы, у якіх яны панесены, то для мэт гэтага  пункта пералік кіраўніцкіх і агульнаадміністрацыйных замежных затрат у беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь:

на апошні дзень указанага ў частцы першай пункта 2 артыкула 185 гэтага Кодэкса справаздачнага перыяду, у якім яны былі прыняты ў замежнай дзяржаве да ўліку для мэт падаткаабкладання (пры гэтым сумы такіх затрат павінны быць указаны па каляндарных кварталах у заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы, рэзідэнтам якой з'яўляецца замежная арганізацыя);

на дату спынення замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз адпаведнае пастаяннае прадстаўніцтва, калі такія затраты прыпадаюць на каляндарны квартал, у якім замежнай арганізацыяй дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз адпаведнае пастаяннае прадстаўніцтва спынена.

13. Калі замежныя затраты з'яўляюцца часткай агульнай сумы затрат, панесеных замежнай арганізацыяй за межамі Рэспублікі Беларусь (затраты панесены не толькі для пастаяннага прадстаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь), у заключэнні аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) замежнай дзяржавы павінна быць указана, у якім памеры (частцы, працэнце) гэтыя затраты адносяцца да ажыццяўлення дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва і па якой прыкмеце вызначаецца гэты памер (частка, працэнт).

14. Пры ўключэнні ў валавы прыбытак замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, даходаў, з якіх у адпаведнасці з главой 17 гэтага  Кодэкса быў утрыманы і пералічаны ў бюджэт падатак на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, праз пастаяннае прадстаўніцтва, сума падатку на прыбытак, якая падлягае выплаце ў бюджэт, змяншаецца на суму ўтрыманага і пералічанага падатку на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь.

У выпадку, калі сума ўтрыманага ў падатковым перыядзе падатку на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, перавышае суму падатку на прыбытак за гэты перыяд, сума перавышэння заплачанага падатку на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, падлягае заліку ў лік будучых

плацяжоў замежнай арганізацыі, якая дзейнічаюць праз пастаяннае прадстаўніцтва, або вяртанню ёй у адпаведнасці з артыкулам 66 гэтага Кодэкса.

Дакументам, які пацвярджае пералічэнне ў бюджэт падатку на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца даведка аб выплаце падатку на даходы замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, якая выдаецца па ўстаноўленай форме падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік адпаведнага падатковага агента.

**Артыкул 181. Льготы па падатку на прыбытак**

Ад падаткаабкладання падаткам на прыбытак вызваляюцца:

1. прыбытак (у памеры не больш за 10 працэнтаў валавога прыбытку, вызначанага за падатковы перыяд, у якім перадаецца прыбытак), перададзены зарэгістраваным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь арганізацыям для будаўніцтва аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння, бюджэтным арганізацыям аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту, рэлігійным арганізацыям, установам сацыяльнага абслугоўвання, а таксама грамадскім аб'яднанням «Беларускае таварыства інвалідаў», «Беларускае таварыства глухіх», «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў», «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам», Беларускаму дзіцячаму фонду, Беларускаму дзіцячаму хоспісу, Беларускаму грамадскаму аб'яднанню ветэранаў, Беларускаму грамадскаму аб'яднанню стаміраваных, Міжнароднаму дабрачыннаму фонду дапамогі дзецям «Шанец», Міжнароднаму грамадскаму аб'яднанню «Разуменне», Беларускаму рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню інвалідаў «Рэабілітацыя», Міжнароднай грамадскай арганізацыі «SOS-Дзіцячыя вёскі», Беларускаму Таварыству Чырвонага Крыжа, грамадскаму аб'яднанню «Беларуская асацыяцыя мнагадзетных бацькоў», Міжнароднаму грамадскаму аб'яднанню «Узаемаразуменне», унітарным прадпрыемствам, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца гэтыя аб'яднанні, ці выкарыстаны на аплату рахункаў за набытыя і перададзеныя ўказаным арганізацыям тавары (выкананыя працы, аказаныя паслугі), маёмасныя правы;

2. прыбытак ад рэалізацыі вырабленых пратэзна-артапедычных вырабаў (у тым ліку стаматалагічных пратэзаў), сродкаў рэабілітацыі і абслугоўвання інвалідаў;

3. валавы прыбытак арганізацый крымінальна-выканаўчай сістэмы і лячэбна-працоўных прафілакторыяў;

4. валавы прыбытак (акрамя прыбытку, атрыманага ад гандлёва-закупачнай і пасрэдніцкай дзейнасці, а таксама даходаў ад здачы маёмасці ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне маёмасцю) арганізацый, якія выкарыстоўваюць працу інвалідаў, калі колькасць інвалідаў у іх у сярэднім за перыяд складае не менш за 50 працэнтаў ад колькасці работнікаў у сярэднім за гэты ж перыяд.

Пры гэтым колькасць работнікаў (інвалідаў) арганізацыі ў сярэднім за перыяд з пачатку года па справаздачны перыяд уключна вызначаецца ў парадку, устаноўленым часткай другой падпункта 1.16 пункта 1 артыкула 118 гэтага Кодэкса;

5. прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі вырабленых плацельшчыкам прадуктаў харчавання для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту;

6. прыбытак ад рэалізацыі вырабленых плацельшчыкам легкавых аўтамабіляў і аўтакампанентаў уласнай вытворчасці на працягу трох гадоў пачынаючы з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам уступлення ў сілу пагаднення аб умовах вытворчасці легкавых аўтамабіляў, заключанага ва ўстаноўленым парадку з Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Такое вызваленне ад падатку на прыбытак прымяняецца пры наяўнасці на апошні дзень падатковага перыяду адпаведнага сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, і спыняецца з дня спынення дзеяння ўказанага пагаднення;

7. прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі тавараў уласнай вытворчасці, якія з'яўляюцца інавацыйнымі ў адпаведнасці з пералікам, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь (далей у гэтым артыкуле – пералік інавацыйных тавараў).

Для мэт прымянення часткі першай гэтага падпункта да тавараў уласнай вытворчасці, якія з'яўляюцца інавацыйнымі ў адпаведнасці з пералікам інавацыйных тавараў, адносяцца тавары, якія адначасова адпавядаюць наступным умовам:

тавары выраблены ў перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, дата рэалізацыі якіх прыпадае на перыяд, на працягу якога такія тавары змяшчаюцца ў пераліку інавацыйных тавараў. Копія сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, падаецца арганізацыяй у падатковы орган па месцы пастаноўкі яе на ўлік;

тавары створаны з выкарыстаннем здольных да прававой аховы вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, якія не ўдзельнічалі ў вытворчасці тавару іншага наймення, раней уключанага ў пералік інавацыйных тавараў;

з 1-га числа месяца, у якім у бухгалтарскім уліку прызнана выручка ад першай рэалізацыі тавару, і да 1-га числа месяца, у якім ва ўстаноўленым парадку ў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь пададзены камплект заявачных дакументаў на ўключэнне тавару ў пералік інавацыйных тавараў, прайшло не больш за два гады;

тавары створаны з выкарыстаннем здольных да прававой аховы вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, на якія выдадзены патэнты (пасведчанні), з даты выдачы якіх прайшло не больш за тры гады (за выключэннем патэнта на вынаходства).

Для мэт прымянення гэтага падпункта тавар вызначаецца найменнем прадукцыі згодна з сертыфікатам прадукцыі ўласнай вытворчасці.

Арганізацыі вядуць раздзельны ўлік аб'ёмаў тавараў уласнай вытворчасці, выробленых у перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці;

8. прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі тавараў уласнай вытворчасці, якія з'яўляюцца высокатэхналагічнымі ў адпаведнасці з пералікам, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – пералік высокатэхналагічных тавараў), у выпадку, калі доля выручкі, атрыманая ад рэалізацыі такіх тавараў, складае больш за 50 працэнтаў агульнай сумы выручкі, атрыманай ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы даходы ад давання ў арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці.

Для мэт прымянення часткі першай гэтага падпункта і пункта 3 артыкула 184 гэтага Кодэкса:

да тавараў уласнай вытворчасці, якія з'яўляюцца высокатэхналагічнымі ў адпаведнасці з пералікам высокатэхналагічных тавараў, адносяцца тавары, выробленыя ў перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, дата рэалізацыі якіх прыпадае на перыяд, на працягу якога такія тавары змяшчаюцца ў пераліку высокатэхналагічных тавараў. Копія сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, падаецца арганізацыяй у падатковы орган па месцы пастаноўкі яе на ўлік;

арганізацыі вядуць раздзельны ўлік аб'ёмаў тавараў уласнай вытворчасці, выробленых у перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці;

9. прыбытак арганізацый культуры, атрыманы ад ажыццяўлення культурнай дзейнасці, накіраваны гэтымі арганізацыямі, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, на набыццё і рамонт асноўных сродкаў, набыццё маёмасных правоў на аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў, неабходных для ажыццяўлення культурнай дзейнасці;

10. прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, звесткі аб якіх змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, а таксама прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі матэрыяльных аб'ектаў, якія адносяцца да гэтых правоў, калі рэалізацыя маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці адначасова суправаджаецца перадачай такіх аб'ектаў.

Падставай для прымянення вызвалення з'яўляецца ўказанне ў дагаворах, якія прадугледжваюць перадачу маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці іх уладальнікам іншай асобе ці даванне праваўладальнікам іншай асобе права на

выкарыстанне вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, звестак аб нумары і даце рэгістрацыі правоў на выніcki навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, найменні гэтых вынікаў, якія змяшчаюцца ў дзяржаўным рэестры правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, а таксама вядзенне раздзельнага ўліку выручкі ад рэалізацыі маёмасных правоў на вынікі навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці і матэрыяльных аб'ектаў, затрат і сум, якія ўдзельнічаюць пры вызначэнні падатковай базы па ўказанай рэалізацыі;

11. прыбытак устаноў адукацыі ад дзейнасці, якая прыносіць даходы;

12. па аперацыях з каштоўнымі паперамі, указанымі ў частцы другой гэтага падпункта:

прыбытак і даходы, вызначаныя ў парадку, устаноўленым артыкулам 179 гэтага Кодэкса;

даходы ад ацэнкі па амартызаваным кошце (за выключэннем сумы аднаўлення абясцэнення).

Да каштоўных папер, прыбытак (даход) ад аперацый з якімі падлягае льгатаванню ў адпаведнасці з часткай першай гэтага падпункта, адносяцца:

дзяржаўныя каштоўныя паперы, якія эмітуюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь ад імя Рэспублікі Беларусь, за выключэннем дзяржаўных каштоўных папер, эмісія і размяшчэнне якіх ажыццяўляліся на знешніх фінансавых рынках, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі;

аблігацыі, якія эмітуе Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, і вэксалі, якія выдае Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, пры ажыццяўленні грашова-крэдытнага рэгулявання, у тым ліку ў мэтах фарміравання золатавалютных рэзерваў Рэспублікі Беларусь;

аблігацыі, якія эмітуюцца банкамі, што ва ўстаноўленым парадку прыцягваюць ва ўклады (дэпазіты) сродкаў фізічных асоб у беларускіх рублях, забяспечаныя абавязацельствамі па вяртанні асноўнай сумы доўгу і выплаце працэнтаў па дадзеных імі крэдытах на будаўніцтва, рэканструкцыю ці набыццё жылля пад заклад нерухомасці;

аблігацыі, якія эмітуюцца з 1 красавіка 2008 года па 1 студзеня 2015 года і з 1 ліпеня 2015 года юрыдычнымі асобамі, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з артыкулам 15 гэтага Кодэкса падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь;

аблігацыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

аблігацыі адкрытага акцыянернага таварыства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь»;

13. дывідэнды, налічаныя:

грамадскім аб'яднанням «Беларускае таварыства інвалідаў», «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» ўнітарнымі прадпрыемствамі, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца гэтыя аб'яднанні;

венчурным арганізацыям, Белінфонду інавацыйнымі арганізацыямі.

Палажэнне, прадугледжанае абзацам трэцім часткі першай гэтага падпункта, прымяняецца венчурнымі арганізацыямі, Белінфондам у выпадку, калі доля выручкі інавацыйнай арганізацыі ад рэалізацыі высокатэхналагічных тавараў (прац, паслуг), якія адносяцца да гэтай катэгорыі ў адпаведнасці з заканадаўствам, маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якая вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку года, складае не менш за 50 працэнтаў у агульным аб'ёме выручкі такой інавацыйнай арганізацыі.

Для мэт пацвярджэння падатковай ільготы інавацыйная арганізацыя падае ў падатковы орган па месцы яе пастаноўкі на ўлік заключэнне аб аднясенні тавараў (прац, паслуг) да высокатэхналагічных, выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, не пазней за тэрмін, устаноўлены для падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак па выніках мінулага каляндарнага года;

14. прыбытак ад давання ў карыстанне жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду.

**Артыкул 182. Падатковая база падатку на прыбытак**

1. Падатковая база падатку на прыбытак вызначаецца як грашовае выражэнне валавога прыбытку, які падлягае падаткаабкладанню.

2. Плацельшчыкі вядуць улік выручкі і затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, па аперацыях, прыбытак ад якіх вызваляецца ад падатку на прыбытак (у тым ліку з выкарыстаннем вызваленых сум падатку на прыбытак па мэтавым прызначэнні) ці падлягае

абкладанню падаткам на прыбытак па паніжаных падатковых стаўках, а таксама па аперацыях, па якіх у адпаведнасці з гэтай главой прадугледжаны адрозны ад агульнаўстаноўленага парадак уліку прыбытку (страт). Пры гэтым:

2.1. прамыя затраты, якія на падставе першасных уліковых дакументаў непасрэдна звязаны з той ці іншай аперацыяй, а таксама затраты, размеркаваныя ў парадку, вызначаным заканадаўствам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, адносяцца да адпаведнай аперацыі прамым падлікам без размеркавання;

2.2. ускосныя затраты (у тым ліку агульнавытворчыя, агульнагаспадарчыя расходы), за выключэннем затрат, размеркаваных у парадку, вызначаным заканадаўствам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, і ўлічаных у адпаведнасці з падпунктам 2.1 гэтага пункта, а таксама працэнты па крэдытах (пазыках) і інвестыцыйны вылік, якія на падставе першасных уліковых дакументаў непасрэдна не могуць быць аднесены да той ці іншай аперацыі, размяркоўваюцца паміж аперацыямі прапарцыянальна суме выручкі ад рэалізацыі тавараў, прац (паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, указаных у падпункце 3.18 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, зменшанай на сумы падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі, атрыманай па адпаведных аперацыях, ці прапарцыянальна іншаму крытэрыю размеркавання, вызначанаму згодна з уліковай палітыкай арганізацыі, прынятай для разліку сабекошту рэалізаванай прадукцыі (прац, паслуг). Такое размеркаванне ўскосных затрат праводзіцца нарастаючым вынікам з пачатку года.

3. Палажэнні падпункта 2.2 пункта 2 гэтага артыкула ў частцы парадку размеркавання затрат распаўсюджваюцца таксама на аперацыі, даходы ад якіх атрыманы пры прымяненні асаблівых рэжымаў падаткаабкладання і ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на прыбытак, а таксама пры ажыццяўленні замежнай арганізацыяй дзейнасці праз два і больш пастаянныя прадстаўніцтвы, размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

4. Арганізацыі, якія адлюстроўвалі выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па меры аплаты адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў для мэт вылічэння падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання і пачалі прымяняць у бягучым каляндарным годзе агульны парадак падаткаабкладання (адзіны падатак на даход, пастаўлены за абавязак), выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, адгружаных (выкананых, аказаных), перададзеных і не аплачаных да даты, з якой пачата прымяненне агульнага парадку падаткаабкладання (адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак), і пазарэалізацыйныя даходы, якія належалі да атрымання і не атрыманыя да гэтай даты, адлюстраванне якіх у адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса не прыпадае на ўказаную дату або пасля яе, улічваюць пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак па меры паступлення аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў, але не пазней за апошняе число бягучага каляндарнага года.

5. Пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак:

выручка (даход) беларускай арганізацыі ад дзейнасці (крыніц) за межамі Рэспублікі Беларусь прымаецца ў памеры да ўтрымання (выплаты) падаткаў (збораў, адлічэнняў) згодна з заканадаўствам замежнай дзяржавы;

з выручкі (даходу), указанай у абзацы другім гэтага пункта, падлягаюць выліку сумы падаткаў і збораў, уключаных беларускай арганізацыяй у выручку (даход), згодна з заканадаўствам замежнай дзяржавы;

затраты на вытворчасць і рэалізацыю і пазарэалізацыйныя расходы, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, праведзеныя ў сувязі з ажыццяўленнем дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь, прымаюцца беларускай арганізацыяй у адпаведнасці з гэтай главой.

6. Вылічэнне падатковай базы па дывідэндах, налічаных беларускімі арганізацыямі, праводзіцца па формуле:

$$ПБ = К \times (ДН – ДП),$$

дзе: ПБ – сума падатковай базы;

К – адносіны сумы дывідэндаў, належнай плацельшчыку, да агульнай сумы прыбытку, размеркаванага ў якасці дывідэндаў;

ДН – агульная сума прыбытку, размеркаванага ў якасці дывідэндаў;

ДП – сума дывідэндаў, атрыманая беларускай арганізацыяй, якая налічыла дывідэнды, у бягучым каляндарным годзе і (ці) у непасрэдна папярэднім каляндарным годзе, калі гэтыя сумы дывідэндаў раней не ўлічваліся такой арганізацыяй пры вызначэнні падатковай базы ў складзе паказчыка ДП і атрыманы не раней за 1 студзеня 2009 года. Пры гэтым дывідэнды, атрыманыя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, установленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх атрымання.

Пры вызначэнні падатковай базы значэнне паказчыка ДП улічваецца ў памеры, які не перавышае значэнне паказчыка ДН.

**Артыкул 183. Перанос страт на будучыню**

1. Беларуская арганізацыя мае права зменшыць падатковую базу на суму страты (сумы страт) па выніках папярэдняга падатковага перыяду (папярэдніх падатковых перыядаў), вызначанай у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула (ажыццявіць перанос страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду), у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам, пры наяўнасці ў яе па выніках гэтага папярэдняга падатковага перыяду (папярэдніх падатковых перыядаў) перавышэння агульнай сумы затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, астаткавага кошту асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў і пазарэалізацыйных расходаў над сумай выручкі і пазарэалізацыйных даходаў, зменшанай на суму падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі, і ў межах такога перавышэння, калі заканадаўчымі актамі для яе не ўстаноўлены парадак пакрыцця страт.

2. Для мэт гэтага артыкула пад стратай разумеецца перавышэнне агульнай сумы затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні (за выключэннем сумы прыменена на працягу падатковага перыяду інвестыцыйнага выліку), і пазарэалізацыйных расходаў, указаных у падпунктах 3.19, 3.26, 3.27, 3.40 і 3.41 пункта 3 артыкула 175 гэтага Кодэкса, над агульнай сумай выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў, указаных у падпунктах 3.18, 3.20, 3.21 і 3.35 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, зменшанай на суму падаткаў і збораў, якія выплачваюцца з выручкі і з пазарэалізацыйных даходаў, указаных у падпунктах 3.18, 3.20 і 3.21 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Указаныя выручка, затраты, пазарэалізацыйныя даходы і расходы:

вызначаюцца ў парадку, устаноўленым палажэннямі гэтага Кодэкса, якія прымяняюцца пры вылічэнні валавога прыбытку;

не ўключаюць выручку, затраты, пазарэалізацыйныя даходы і расходы па дзейнасці, падаткаабкладанне якой ажыццяўлялася адзіным падаткам для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, падаткам пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, падаткам на ігральны бізнес, падаткам на даходы ад латарэйнай дзейнасці, падаткам на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў, адзіным падаткам на даход, пастаўлены за абавязак, або зборам за паслугі ў сферы аграэкатурызму.

Пры гэтым сума страты (сумы страт) не ўключае суму страты (сумы страт), атрыманай:

ад дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь, па якой беларуская арганізацыя зарэгістравана ў якасці плацельшчыка падаткаў замежнай дзяржавы;

па выніках падатковага перыяду (перыядаў, часткі падатковага перыяду), у якім беларуская арганізацыя мела права прымяняць заканадаўства, якое ўстанаўлівае вызваленне ад падатку на прыбытак (права на нявыплату падатку на прыбытак) на працягу некалькіх падатковых перыядаў, вызначаных гэтым заканадаўствам.

Калі па выніках падатковага перыяду сума страты, вылічаная ў адпаведнасці з часткамі першай і другой гэтага пункта, перавышае агульную суму страты за гэты ж падатковы перыяд, вылічаную як розніца паміж агульнай сумай затрат, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, астаткавага кошту асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў і пазарэалізацыйных расходаў і сумай выручкі і пазарэалізацыйных даходаў, зменшанай на суму падаткаў і збораў, якія

вылічваюцца з выручкі, у якасці сумы страты, магчымай да пераносу на будучыню, прымаецца агульная сума страты.

3. Страты, вызначаныя ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, у частцы:

3.1. страт, атрыманых ад наступных груп аперацый, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой падпункта 3.2 гэтага пункта, пераносяцца на прыбытак бягучага падатковага перыяду, атрыманы ад гэтых жа груп аперацый:

першая група – аперацыі з фінансавымі інструментамі, каштоўнымі паперамі, уключаючы вытворныя каштоўныя паперы, на якія распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання, прадугледжаныя артыкулам 179 гэтага Кодэкса;

другая група – аперацыі па адчужэнні маёмасці, якая адносіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам да асноўных сродкаў (у тым ліку часткі капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), якая з'яўляецца асноўным сродкам), не завершаных будаўніцтвам аб'ектаў і іх частак, неўстаноўленага абсталявання і прадпрыемства як маёмаснага комплексу.

Страта (прыбытак), атрыманая ад кожнай з груп аперацый, указаных:

у абзацы другім часткі першай гэтага падпункта, вызначаецца як адмоўная (станоўчая) розніца паміж даходамі і расходамі па гэтых аперацыях, якія прымаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам для вызначэння валавога прыбытку;

у абзацы трэцім часткі першай гэтага падпункта, вызначаецца:

у адносінах да асноўных сродкаў (да часткі капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), якая з'яўляецца асноўным сродкам) – у адпаведнасці з палажэннем пункта 2 артыкула 168 гэтага Кодэкса;

у адносінах да не завершаных будаўніцтвам аб'ектаў і іх частак, неўстаноўленага абсталявання – як адмоўная (станоўчая) розніца паміж выручкай ад іх рэалізацыі, зменшанай на суму падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі, і затратамі па іх стварэнні (набыцці) і рэалізацыі;

у адносінах да прадпрыемства як маёмаснага комплексу – у адпаведнасці з палажэннем пункта 4 артыкула 168 гэтага Кодэкса.

Сума страт за падатковы перыяд па кожнай з груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай гэтага падпункта, падлягае пераносу на прыбытак бягучага падатковага перыяду зыходзячы з яе фактычнага памеру, калі іншае не ўстаноўлена часткай чацвёртай гэтага падпункта.

У выпадку, калі сума страт за падатковы перыяд па кожнай з груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай гэтага падпункта, або агульная сума страт за падатковы перыяд па ўсіх указаных групах аперацый, па якіх атрыманы страты, перавышае суму страты, вызначанай у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, за гэты падатковы перыяд, падлеглая пераносу на прыбытак бягучага падатковага перыяду сума страт:

вызначаецца па кожнай з груп аперацый як здабытак сумы страты, вызначанай у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, і ўдзельнай вагі сумы страты па кожнай з груп аперацый у агульнай суме страт па ўсіх групах аперацый, па якіх атрыманы страты, – калі страты атрыманы больш чым па адной групе аперацый;

прымаецца ў межах сумы страты, вызначанай у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, – калі страта атрымана па адной групе аперацый;

3.2. страт, якія засталіся пасля выключэння страт, атрыманых ад груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай падпункта 3.1 гэтага пункта, пераносяцца на прыбытак бягучага падатковага перыяду, незалежна ад якіх аперацый і відаў дзейнасці яна атрымана.

Палажэнні часткі першай гэтага падпункта распаўсюджваюцца на страты ад аперацый, якія адносяцца ў адпаведнасці з абзацам другім часткі першай падпункта 3.1 гэтага пункта да першай групы, атрыманыя беларускімі арганізацыямі, якія ажыццяўлялі прафесійную і біржавую дзейнасць па каштоўных паперах на падставе адпаведных спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), на дату здзяйснення гэтых аперацый.

4. Перанос страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду можа праводзіцца ў межах падатковай базы з улікам сумы прыбытку, якая вызваляецца ад падаткаабкладання падаткам на прыбытак.

У выпадку, калі сума прыбытку да падаткаабкладання за падатковы перыяд па кожнай з груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай падпункта 3.1 пункта 3 гэтага артыкула, або агульная сума прыбытку да падаткаабкладання за падатковы перыяд па ўсіх указаных групах аперацый, па якіх атрыманы прыбытак, перавышаюць падатковую базу, адлюстраваную ў падатковай дэкларацыі (разліку) за гэты падатковы перыяд, падатковая база бягучага падатковага перыяду, у межах якой можа праводзіцца перанос страт мінулых падатковых перыядаў:

вызначаецца па кожнай з груп аперацый як здабытак падатковай базы бягучага падатковага перыяду і ўдзельнай вагі прыбытку да падаткаабкладання па кожнай з груп аперацый у агульнай суме прыбытку да падаткаабкладання па ўсіх групах аперацый, па якіх атрыманы прыбытак, – калі прыбытак атрыманы больш чым па адной групе аперацый;

прымаецца ў межах падатковай базы бягучага падатковага перыяду – калі прыбытак атрыманы па адной групе аперацый.

Пры наяўнасці падатковай базы, якая абкладаецца па розных стаўках і (ці) льгатуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, перанос страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду праводзіцца ў наступнай чарговасці:

у першую чаргу пераносяцца сумы страт, вызначаныя ў адпаведнасці з падпунктам 3.1 пункта 3 гэтага артыкула (пры іх наяўнасці). Пры гэтым сума перанесенай страты па кожнай з груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай падпункта 3.1 пункта 3 гэтага артыкула, размяркоўваецца прапарцыянальна аднесеным да гэтай групы сумам падатковай базы, якія абкладаюцца па адпаведных стаўках і (ці) льгатуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

у другую чаргу пераносіцца сума страт, вызначаная ў адпаведнасці з падпунктам 3.2 пункта 3 гэтага артыкула. Пры гэтым указаная сума страт размяркоўваецца прапарцыянальна сумам падатковай базы, якія абкладаюцца па адпаведных стаўках і (ці) льгатуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

5. Беларуская арганізацыя мае права праводзіць перанос страты на прыбытак бягучага падатковага перыяду на працягу дзесяці гадоў, якія ідуць непасрэдна следам за тым падатковым перыядам, у якім атрымана гэта страта.

Страта, не перанесеная на наступны год, можа быць перанесена цалкам ці часткова на наступны год з наступных дзевяці гадоў.

Калі беларускай арганізацыяй атрыманы страты больш чым у адным падатковым перыядзе, перанос такіх страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду праводзіцца ў той чарговасці, у якой яны панесены.

Гэта чарговасць павінна захоўвацца пры пераносе страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду асобна па кожнай з груп аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай падпункта 3.1 пункта 3 гэтага артыкула, а таксама асобна па стратах, вызначаных у адпаведнасці з падпунктам 3.2 пункта 3 гэтага артыкула.

6. Беларуская арганізацыя мае права аднімаць з падатковай базы толькі тую суму страты (сумы страт), якая атрымана па выніках папярэдняга падатковага перыяду (папярэдніх падатковых перыядаў) па яе дзейнасці, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 8 гэтага артыкула.

Палажэнні гэтага артыкула распаўсюджваюцца на простыя суполкі (удзельнікаў дагавораў аб сумеснай дзейнасці), а таксама на філіялы з улікам палажэнняў пункта 9 гэтага артыкула.

7. Беларуская арганізацыя абавязана:

забяспечыць раздзельны ўлік выручкі, затрат, пазарэалізацыйных даходаў і расходаў:

па групах аперацый, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай падпункта 3.1 пункта 3 гэтага артыкула, як за падатковы перыяд, страты па выніках якога пераносяцца на прыбытак бягучага падатковага перыяду, так і за падатковы перыяд, на прыбытак якога пераносяцца страты;

па дзейнасці, вызначанай абзацам другім часткі трэцяй пункта 2 гэтага артыкула, за падатковы перыяд, страты па выніках якога пераносяцца на прыбытак бягучага падатковага перыяду;

за ўказаную ў абзацы трэцім часткі трэцяй пункта 2 гэтага артыкула частку падатковага перыяду, страты па выніках якога пераносяцца на прыбытак бягучага падатковага перыяду;

захоўваць дакументы (дагаворы, першасныя ўліковыя дакументы, рэгістры бухгалтарскага ўліку), якія пацвярджаюць аб'ём панесенай страты, на працягу ўсяго тэрміну, калі яна памяншае падатковую базу бягучага падатковага перыяду на сумы раней атрыманых страт, а таксама да завяршэння падатковым органам праверкі правільнасці вылічэння, своечасовасці і паўнаты выплаты падатку на прыбытак за перыяд, на працягу якога беларуская арганізацыя змяншала падатковую базу на суму страты (сумы страт) па выніках папярэдняга падатковага перыяду (папярэдніх падатковых перыядаў).

Пры адсутнасці раздзельнага ўліку, устаноўленага абзацамі другім – пятым часткі першай гэтага пункта, і (ці) дакументаў, указаных у абзацы шостым часткі першай гэтага пункта, беларуская арганізацыя не мае права праводзіць перанос страт на прыбытак бягучага падатковага перыяду.

У перыяд правядзення падатковым органам праверкі перанос страт, раней не перанесеных, у тым ліку ўстаноўленых і (ці) скарэкціраваных у бок павелічэння ў час праверкі, не праводзіцца.

Страты, не заяўленыя плацельшчыкам да пачатку праверкі (за выключэннем камеральнай), у тым ліку ўстаноўленыя і (ці) скарэкціраваныя ў бок павелічэння ў час праверкі, пераносу не падлягаюць.

Перанос страт, не заяўленых плацельшчыкам да пачатку камеральнай праверкі, можа быць праведзены плацельшчыкам у парадку, вызначаным гэтым артыкулам.

8. Пры рэарганізацыі беларускай арганізацыі ў форме пераўтварэння беларуская арганізацыя-правапераемнік мае права вылічыць з падатковай базы ў парадку і на ўмовах, устаноўленых гэтым артыкулам, суму страт, атрыманых рэарганізаванай арганізацыяй да рэарганізацыі.

Пры ліквідацыі беларускай арганізацыі такая арганізацыя мае права ажыццявіць перанос страт у парадку і на ўмовах, устаноўленых гэтым артыкулам, да сканчэння бягучага падатковага перыяду з адлюстраваннем сум перанесенай страты ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак, якая падаецца ў адпаведнасці з артыкулам 44 гэтага Кодэкса.

9. Беларуская арганізацыя, а таксама філіял мае права перанесці страту на прыбытак бягучага падатковага перыяду толькі ў частцы адпаведна сумы страты арганізацыі, вызначанай без уліку страт філіялаў, і сумы страты гэтага філіяла.

10. Беларуская арганізацыя мае права пачаць перанос страт пачынаючы са страт, атрыманых па выніках 2011 года.

**Артыкул 184. Стаўкі падатку на прыбытак**

1. Стаўка падатку на прыбытак устанаўліваецца ў памеры васемнаццаць (18) працэнтаў, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам і (ці) Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Навукова-тэхналагічныя паркі, цэнтры трансферу тэхналогій, рэзідэнты навукова-тэхналагічных паркаў плацяць падатак на прыбытак па стаўцы дзесяць (10) працэнтаў (за выключэннем падатку на прыбытак, які вылічваецца, утрымліваецца і пералічваецца пры выкананні абавязкаў падатковага агента).

Палажэнні часткі першай гэтага пункта прымяняюцца пры ўмове, калі дзейнасць навукова-тэхналагічных паркаў, цэнтраў трансферу тэхналогій адпавядае напрамкам дзейнасці, вызначаным заканадаўствам, а дзейнасць рэзідэнтаў навукова-тэхналагічных паркаў з'яўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам інавацыйнай.

Абгрунтаванасць прымянення на працягу падатковага перыяду стаўкі, указанай у частцы першай гэтага пункта, пацвярджаецца праз падачу ў інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па месцы пастаноўкі на ўлік штогод не пазней за ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак па выніках чацвёртага квартала мінулага падатковага перыяду пацвярджэння Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь аб захаванні навукова-тэхналагічнымі паркамі, цэнтрамі трансферу тэхналогій і рэзідэнтамі навукова-тэхналагічных паркаў умовы, прадугледжанай часткай другой гэтага пункта.

3. Прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі тавараў уласнай вытворчасці, уключаных у пералік высокатэхналагічных тавараў, абкладаецца падаткам на прыбытак па стаўцы ў памеры дзесяць (10) працэнтаў, за выключэннем выпадку, устаноўленага пунктам 8 артыкула 181 гэтага Кодэкса.

4. Банкі і страхавыя арганізацыі плацяць падатак на прыбытак па стаўцы ў памеры дваццаць пяць (25) працэнтаў.

5. Прыбытак камерцыйных арганізацый, уключаных у рэестр мікрафінансавых арганізацый, атрыманы ад рэгулярнага давання мікрапазык фізічным асобам пад заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, абкладаецца падаткам на прыбытак па стаўцы ў памеры дваццаць пяць (25) працэнтаў.

6. Стаўка падатку на прыбытак па дывідэндах, указаных у пункце 1 артыкула 167 і падпункце 3.1 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, а таксама па даходах заснавальнікаў (удзельнікаў, акцыянераў) у выглядзе курсавых розніц, якія ўзнікаюць пры пераацэнцы дэбіторскай запазычанасці па разліках з замежнымі арганізацыямі па належных ад іх дывідэндах, устанаўліваецца ў памеры дванаццаць (12) працэнтаў, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам.

7. Стаўка падатку на прыбытак па дывідэндах у выпадку, калі на працягу трох папярэдніх каляндарных гадоў паслядоўна прыбытак не размяркоўваўся паміж удзельнікамі (акцыянерамі) беларускай арганізацыі – рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, устанаўліваецца ў памеры шэсць (6) працэнтаў.

8. Стаўка падатку на прыбытак па дывідэндах у выпадку, калі на працягу пяці папярэдніх каляндарных гадоў паслядоўна прыбытак не размяркоўваўся паміж удзельнікамі (акцыянерамі) беларускай арганізацыі – рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, устанаўліваецца ў памеры нуль (0) працэнтаў.

**Артыкул 185. Падатковы і справаздачны перыяды падатку на прыбытак**

1. Падатковым перыядам падатку на прыбытак прызнаецца каляндарны год.

2. Справаздачным перыядам падатку на прыбытак прызнаецца каляндарны квартал, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта.

Справаздачным перыядам падатку на прыбытак з дывідэндаў, налічаных беларускімі арганізацыямі, прызнаецца каляндарны месяц.

**Артыкул 186. Парадак вылічэння падатку на прыбытак. Тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і выплаты падатку на прыбытак**

1. Сума падатку на прыбытак па выніках справаздачнага перыяду вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку падатковага перыяду як здабытак падатковай базы, зменшанай на суму прыбытку, які вызваляецца ад падаткаабкладання, а па выніках чацвёртага квартала таксама на суму страт, якая пераносіцца на прыбытак гэтага справаздачнага перыяду ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 183 гэтага Кодэкса, і падатковай стаўкі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам.

Плацельшчык мае права зменшыць указаную суму падатку на прыбытак у выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам, у прыватнасці пры прымяненні льгот, якія прадугледжваюць вызваленне ад выплаты падатку на прыбытак, пры заліку заплачанага ў замежнай дзяржаве падатку на прыбытак (даход), а таксама пры надыходзе акалічнасцей, прадугледжаных пунктам 14 артыкула 180 гэтага Кодэкса.

2. Пры ліквідацыі плацельшчыка падатак на прыбытак выплачваецца зыходзячы з фактычнага валавога прыбытку плацельшчыка.

Пры спыненні дзейнасці плацельшчыка ў выніку рэарганізацыі (за выключэннем рэарганізацыі ў форме пераўтварэння) падатак на прыбытак выплачваецца зыходзячы з фактычнага валавога прыбытку такога плацельшчыка за перыяд да рэарганізацыі.

Пры ліквідацыі філіяла, у тым ліку ў выніку змянення структуры юрыдычнай асобы, падатак на прыбытак выплачваецца зыходзячы з фактычнага валавога прыбытку філіяла за перыяд да яго ліквідацыі. Гэта палажэнне распаўсюджваецца таксама на выпадкі ўзнікнення акалічнасці, у сувязі з якой спыняецца абавязак філіяла па выкананні падатковых абавязацельстваў гэтай юрыдычнай асобы.

Пры спыненні замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва падатак на прыбытак выплачваецца зыходзячы з фактычнага валавога прыбытку такога плацельшчыка.

3. Дэпартаментам аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і яго падраздзяленнямі, а таксама арганізацыямі, якія знаходзяцца ў яго вядзенні:

у частцы аказання ахоўных паслуг (прац) арганізацыям, якія не з'яўляюцца бюджэтнымі арганізацыямі, сума падатку на прыбытак з валавога прыбытку вылічваецца як здабытак падатковай базы, якая вызначаецца з улікам асаблівасцей, устаноўленых пунктам 4 артыкула 178 гэтага Кодэкса і (ці) Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і падатковай стаўкі;

па іншай дзейнасці вылічэнне падатку на прыбытак праводзіцца ў адпаведнасці з палажэннямі пункта 1 гэтага артыкула.

4. Сума падатку на прыбытак з дывідэндаў вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі, утрымліваецца і пералічваецца ў бюджэт беларускімі арганізацыямі, якія налічылі дывідэнды.

Такія беларускія арганізацыі прызнаюцца падатковымі агентамі, маюць правы і нясуць абавязкі, устаноўленыя артыкулам 23 гэтага Кодэкса.

5. Падатак на прыбытак замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, вылічваецца непасрэдна плацельшчыкам.

6. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на прыбытак па выніках мінулага справаздачнага перыяду, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам, падаецца ў падатковыя органы не пазней за 20-е число месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам, незалежна ад наяўнасці або адсутнасці аб'ектаў падаткаабкладання. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на прыбытак за чацвёрты квартал падатковага перыяду падаецца ў тэрмін, устаноўлены пунктам 7 гэтага артыкула.

Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на прыбытак з дывідэндаў, налічаных беларускімі арганізацыямі, падаецца ў падатковыя органы не пазней за 20-е число месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім былі налічаны дывідэнды.

Не патрабуецца падача падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак за мінулы справаздачны перыяд:

бюджэтнымі арганізацыямі, грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі (аб'яднаннямі), рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі некамерцыйнымі арганізацыямі, за выключэннем спажывецкіх таварыстваў і іх саюзаў, якія з'яўляюцца суб'ектамі гандлю;

арганізацыямі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання, пры адсутнасці сум, якія ўдзельнічаюць пры вызначэнні падатковай базы па падатку на прыбытак;

Дэпартаментам аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і яго падраздзяленнямі, а таксама арганізацыямі, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні.

7. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на прыбытак па выніках мінулага падатковага перыяду падаецца ў падатковыя органы не пазней за 20 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, незалежна ад наяўнасці або адсутнасці аб'ектаў падаткаабкладання.

Не патрабуецца падача падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак:

бюджэтнымі арганізацыямі, грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі (аб'яднаннямі), рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі некамерцыйнымі арганізацыямі, за выключэннем спажывецкіх таварыстваў і іх саюзаў, якія з'яўляюцца суб'ектамі гандлю, пры адсутнасці па выніках мінулага каляндарнага года валавога прыбытку (страты);

арганізацыямі, якія выкарыстоўваюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання, пры адсутнасці сум, якія ўдзельнічаюць пры вызначэнні падатковай базы па падатку на прыбытак.

8. Замежная арганізацыя, якая адкрыла прадстаўніцтва, не пазней за 20 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, падае ў падатковы орган копію пісьмовай справаздачы аб дзейнасці прадстаўніцтва замежнай арганізацыі, складзенай у адпаведнасці з заканадаўствам.

Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на прыбытак падаецца ў падатковы орган па месцы знаходжання прадстаўніцтва замежнай арганізацыі, а таксама ў падатковы орган па кожным месцы ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці праз пастаяннае прадстаўніцтва (без дубліравання паказчыкаў, якія ўдзельнічаюць у вызначэнні прыбытку да падаткаабкладання).

9. Выплата падатку на прыбытак праводзіцца:

9.1. на працягу падатковага перыяду па выніках мінулага справаздачнага перыяду – не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

Выплата падатку на прыбытак за чацвёрты квартал падатковага перыяду праводзіцца не пазней за 22 снежня гэтага перыяду ў памеры двух трацей сумы падатку на прыбытак, вылічанай зыходзячы з сумы падатку на прыбытак за трэці квартал падатковага перыяду з наступным пераразлікам у цэлым за падатковы перыяд і вылічэннем сумы падатку на прыбытак да даплаты ці змяншэння не пазней за 22 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам;

9.2. па дывідэндах, налічаных беларускімі арганізацыямі, падатковымі агентамі не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім былі налічаны дывідэнды;

9.3. па выніках мінулага падатковага перыяду – не пазней за 22 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

10. Выплата падатку на прыбытак бюджэтнымі арганізацыямі, грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі (аб'яднаннямі), рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі некамерцыйнымі арганізацыямі, за выключэннем спажывецкіх таварыстваў і іх саюзаў, якія з'яўляюцца суб'ектамі гандлю, праводзіцца не пазней за 22 сакавіка года, што ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

Выплата падатку на прыбытак Дэпартаментам аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і яго падраздзяленнямі, а таксама арганізацыямі, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, праводзіцца не пазней за 22 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

11. Выплата падатку на прыбытак па зводным балансе асноўнай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» праводзіцца ў цэнтралізаваным парадку.

Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і выплаты падатку на прыбытак па зводным балансе асноўнай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

12. Сума заплачанага ў бюджэт падатку на прыбытак замежнай арганізацыяй пацвярджаецца даведкай, якая выдаецца падатковым органам па месцы знаходжання пастаяннага прадстаўніцтва замежнай арганізацыі па ўстаноўленай форме.

**Артыкул 187. Спецыяльныя палажэнні. Ліквідацыя двайнога падаткаабкладання**

1. Фактычна заплачаныя (утрыманыя) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку на прыбытак (даход) у адносінах да даходу, атрыманага ў гэтай замежнай дзяржаве, залічваюцца беларускай арганізацыяй пры выплаце падатку на прыбытак у Рэспубліцы Беларусь у парадку і памерах, устаноўленых гэтым артыкулам.

2. Даходам, атрыманым у замежнай дзяржаве, прызнаецца даход (выручка) беларускай арганізацыі, які ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы, а пры наяўнасці міжнароднага дагавору Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання – у адпаведнасці з яго палажэннямі абкладаецца падаткам на прыбытак (даход) у замежнай дзяржаве.

3. Заплачаная (утрыманая) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сума падатку на прыбытак (даход) пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўнясення падатку ў бюджэт замежнай дзяржавы.

4. Залік ажыццяўляецца ў тым падатковым перыядзе, у якім беларускай арганізацыяй пададзена ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік даведка (іншы дакумент) падатковага органа (іншай кампетэнтнай службы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў) замежнай

дзяржавы, якая пацвярджае факт выплаты гэтай сумы падатку ў гэтай дзяржаве, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта.

Калі даведка пададзена да ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну падачы ў Рэспубліцы Беларусь падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак па выніках мінулага падатковага перыяду, то падлеглая заліку сума падатку адлюстроўваецца ў ёй або ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на прыбытак таго справаздачнага перыяду, у якім такая даведка пададзена.

5. У даведцы, якая пацвярджае выплату падатку на прыбытак (даход) у замежнай дзяржаве, павінны быць указаны найменне плацельшчыка, назва падатку, дата выплаты падатку і перыяд, за які выплачваўся падатак, назва, памер аб'екта падаткаабкладання (падатковай базы), стаўка падатку і сума падатку, залічанага ў бюджэт замежнай дзяржавы.

Для ажыццяўлення заліку можа быць таксама пададзена даведка (іншы дакумент) па форме, устаноўленай падатковым органам (іншай кампетэнтнай службай, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў) замежнай дзяржавы, калі яна пацвярджае суму заплачанага падатку на прыбытак (даход) у гэтай дзяржаве.

6. Залік сумы падатку на прыбытак (даход), заплачанай (утрыманай) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання ў адносінах да даходу, атрыманага ў замежнай дзяржаве:

праводзіцца ў межах заплачанай (якая плаціцца) у Рэспубліцы Беларусь сумы падатку на прыбытак у адносінах да гэтага даходу;

не можа перавышаць суму падатку на прыбытак, заплачаны ў адносінах да гэтага даходу за каляндарны год, у якім ён атрыманы;

не можа перавышаць суму падатку на прыбытак, належную да выплаты ў адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання (пры яго наяўнасці).

7. Факт пастаяннага месцазнаходжання беларускай арганізацыі для мэт прымянення міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сведчыцца даведкай.

Даведка выдаецца па ўстаноўленай форме падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік беларускай арганізацыі на падставе яе звароту, які змяшчае найменне дзяржавы, для падачы ў падатковыя (фінансавыя) органы якой прызначана даведка, від і суму атрыманага (меркаванага да атрымання) даходу ад крыніц у замежнай дзяржаве.

Палажэнні гэтага пункта прымяняюцца таксама пры засведчанні даведкі па форме, устаноўленай у замежнай дзяржаве.

Пры звароце ў падатковы орган за засведчаннем даведкі па форме, устаноўленай у замежнай дзяржаве, прызначанай для вяртання (заліку) беларускай арганізацыі раней утрыманага з яе даходаў (заплачанага ёю) падатку ў замежнай дзяржаве, у заяве, якая падаецца для атрымання даведкі, плацельшчыкам указваюцца від і памер даходу, атрыманага ад крыніц у замежнай дзяржаве.

## ГЛАВА 17
## ПАДАТАК НА ДАХОДЫ ЗАМЕЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ЯКІЯ НЕ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ ПРАЗ ПАСТАЯННАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА

### Артыкул 188. Плацельшчыкі падатку на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва

Плацельшчыкамі падатку на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва (далей у гэтай главе – плацельшчыкі), прызнаюцца замежныя і міжнародныя арганізацыі, што ў тым ліку не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, але атрымліваюць даходы з крыніц у Рэспубліцы Беларусь (далей у гэтай главе – замежныя арганізацыі).

**Артыкул 189. Аб'ект падаткаабкладання падаткам на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва**

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаткам на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва (далей у гэтай главе – падатак на даходы), прызнаюцца наступныя даходы, атрыманыя плацельшчыкам ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь:

1.1. плата за перавозку, фрахт, дэмерэдж і іншыя плацяжы, якія ўзнікаюць пры перавозках, у сувязі з ажыццяўленнем міжнародных перавозак (за выключэннем перавозкі пасажыраў у міжнародных перавозках, платы за перавозку, фрахту, дыспачу, дэмерэджу, якія ўзнікаюць у сувязі з ажыццяўленнем міжнародных перавозак грузаў марскім транспартам), а таксама плацяжы за аказанне транспартна-экспедыцыйных паслуг (за выключэннем паслуг у галіне транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці пры арганізацыі міжнародных перавозак грузаў марскім транспартам).

Для мэт гэтай главы міжнароднай прызнаецца перавозка, пры ажыццяўленні якой хаця б адзін з пунктаў транспарціроўкі (адпраўкі ці прызначэння) знаходзіцца ў замежнай дзяржаве;

1.2. даходы ад даўгавых абавязацельстваў любога віду незалежна ад спосабу іх афармлення, у тым ліку:

1.2.1. даходы па крэдытах, пазыках;

1.2.2. даходы па каштоўных паперах, умовамі эмісіі якіх прадугледжана атрыманне даходаў у выглядзе працэнтаў (дысконту);

1.2.3. даходы ад карыстання часова свабоднымі сродкамі на рахунках у банках Рэспублікі Беларусь.

Да даходаў ад даўгавых абавязацельстваў пры пагашэнні абавязацельства, якое ўзнікла ў сувязі з адкрыццём акрэдытыва, адносяцца прызначаныя фінансуючым банкам працэнты (камісія) за адтэрміноўку пакрыцця;

1.3. роялці.

Да даходаў у выглядзе роялці адносяцца ўзнагарода за выкарыстанне маёмасных правоў ці даванне права карыстання маёмаснымі правамі на аб'екты аўтарскага права, уключаючы творы літаратуры (да якіх для мэт падаткаабкладання адносяцца ў тым ліку камп'ютарныя праграмы), мастацтва, навукі, іншыя творы, якія адносяцца да аб'екта аўтарскага права, на аб'екты сумежных правоў, уключаючы выкананне фанаграмы, перадачы арганізацый эфірнага і кабельнага вяшчання, а таксама плата за ліцэнзію, патэнт, таварны знак, знак абслугоўвання, фірменнае найменне, чарцёж, карысную мадэль, схему, формулу, прамысловы ўзор ці працэс або за інфармацыю адносна прамысловага, камерцыйнага ці навуковага вопыту (у тым ліку ноу-хау), за выкарыстанне маёмасці (да якой для мэт падаткаабкладання падаткам на даходы адносіцца ў тым ліку любога віду абсталяванне, уключаючы транспартныя сродкі) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або даванне права карыстання такой маёмасцю, акрамя плацяжоў па арэндзе міжнародных (кантынентальных і міжкантынентальных) каналаў і сетак электрасувязі;

1.4. дывідэнды і прыраўнаваныя да іх даходы (далей у гэтай главе – дывідэнды);

1.5. даходы ад рэалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тавараў на ўмовах дагавораў даручэння, камісіі і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў;

1.6. даходы ад арганізацыі і правядзення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь культурна-відовішчных мерапрыемстваў і (ці) удзелу ў іх, а таксама ад працы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь атракцыёнаў і звярынцаў;

1.7. даходы ў выглядзе няўстоек (штрафаў, пеняў) і іншых відаў санкцый за парушэнне ўмоў дагавораў;

1.8. даходы ад выканання навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх прац, распрацоўкі канструктарскай і тэхналагічнай дакументацыі на даследчыя ўзоры (даследчую партыю) тавараў, ад вырабу і выпрабавання даследчых узораў (даследчай партыі) тавараў;

1.9. даходы ад давання гарантыі і (ці) паручыцельства;

1.10. даходы ад давання дыскавай прасторы і (ці) канала сувязі для размяшчэння інфармацыі на серверы і паслуг па іх тэхнічным абслугоўванні;

1.11. даходы ад адчужэння:

1.11.1. нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.11.2. прадпрыемства (яго часткі) як маёмаснага комплексу, якое знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, уласнікам якога з'яўляецца замежная арганізацыя;

1.11.3. каштоўных папер на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (акрамя акцый) і (ці) іх пагашэння.

Палажэнні гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на даходы ад адчужэння каштоўных папер па здзелках, якія здзяйсняюцца на фондавых біржах, што прызнаюцца гэтакімі ў адпаведнасці з заканадаўствам замежных дзяржаў, якія не ўваходзяць у пералік афшорных зон, зацверджаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.11.4. долей у статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або іх часткі;

1.12. даходы ад выканання прац, аказання паслуг:

1.12.1. кансультацыйных, бухгалтарскіх, аўдытарскіх, маркетынгавых, юрыдычных, інжынірынгавых (за выключэннем даходаў ад паслуг, якія аказваюцца беларускім арганізацыям і беларускім індывідуальным прадпрымальнікам у мэтах пацвярджэння адпаведнасці працэсу вытворчасці, прадукцыі, іншых аб'ектаў патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі і (ці) патрабаванням, устаноўленым заканадаўствам замежнай дзяржавы ці міжнароднымі стандартамі);

1.12.2. па даверным кіраванні нерухомай маёмасцю, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.12.3. кур'ерскіх;

1.12.4. пасрэдніцкіх. Палажэнні гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на даходы, атрыманыя замежнымі арганізацыямі за даванне паслуг па браніраванні перавозак пасажыраў у міжнародных перавозках, месцаў пражывання, агенцкіх паслуг па браніраванні, афармленні і (ці) рэалізацыі перавозак пасажыраў у міжнародных перавозках, падбору маршруту перавозкі пасажыраў у міжнародных перавозках;

1.12.5. кіраўніцкіх;

1.12.6. па пошуку і (ці) падборы персаналу, найме персаналу, а таксама па даванні персаналу для ажыццяўлення дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь;

1.12.7. у сферы адукацыі;

1.12.8. па захоўванні маёмасці;

1.12.9. па страхаванні (сустрахаванні, перастрахаванні), за выключэннем даходаў (узнагарод, ганарараў), якія выплачваюцца замежным арганізацыям за ўрэгуляванне страхавых выпадкаў па страхавых сертыфікатах, якія сведчаць дагавор страхавання «Зялёная карта», а таксама даходаў ад аказання паслуг у галіне страхавання ў сувязі з ажыццяўленнем міжнародных перавозак грузаў марскім транспартам;

1.12.10. па рэкламе (за выключэннем даходаў, якія выплачваюцца замежным арганізацыям, звязаных з удзелам беларускіх арганізацый і беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў у выстаўках і кірмашах у замежных дзяржавах, незалежна ад таго, ці праводзіцца выплата даходаў непасрэдна ўдзельнікам выставак і кірмашоў ці праз іншую арганізацыю ці індывідуальнага прадпрымальніка);

1.12.11. па ўстаноўцы, наладцы, абследаванні, абслугоўванні, вымярэнні, тэсціраванні ліній, механізмаў, абсталявання, прыбораў, прыстасаванняў, збудаванняў, нематэрыяльных актываў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (за выключэннем даходаў, якія атрымліваюцца ад навучання, правядзення кансультацый і (ці) аказання паслуг па ўстаноўцы, наладцы, абследаванні, вымярэнні і тэсціраванні ліній, механізмаў, абсталявання, прыбораў, прыстасаванняў і збудаванняў, якія з'яўляюцца неад'емнай умовай знешнегандлёвага дагавора на іх набыццё ва ўласнасць (у часовае карыстанне));

1.12.12. па суправаджэнні і ахове грузаў (за выключэннем даходаў ад паслуг па абавязковым суправаджэнні і ахове грузаў, прадугледжаным заканадаўствам дзяржавы, па тэрыторыі якой перамяшчаецца груз, якія аказваюцца арганізацыямі замежнай дзяржавы, заканадаўствам якой устаноўлены патрабаванні па такім абавязковым суправаджэнні і ахове);

1.13. даходы ад нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, перададзенай у давернае кіраванне;

1.14. даходы ад дзейнасці па апрацоўцы даных і размяшчэнні інфармацыі (паслугі па апрацоўцы даных, вэб-хостынг (уключаючы комплексныя паслугі па размяшчэнні і кіраванні вэб-сайтамі), комплексныя паслугі па апрацоўцы даных і складанні на аснове гэтых даных спецыялізаваных справаздач, паслугі па ўводзе і апрацоўцы даных, уключаючы паслугі па кіраванні базамі даных, паслугі па захоўванні даных, забеспячэнне доступу да баз даных, даванне месца і часу для рэкламы ў сетцы Інтэрнэт), а таксама даходы ад дзейнасці вэб-парталаў па функцыянаванні вэб-сайтаў, якія выкарыстоўваюць пошукавыя сістэмы ў мэтах стварэння і вядзення шырокіх баз даных інтэрнэт-адрасоў і зместу ў фармаце, які забяспечвае лёгкі пошук інфармацыі. Палажэнні гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на даходы, атрыманыя ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь замежнымі арганізацыямі ад аказання рэпазітарных паслуг, паслуг аўтаматызаванай сістэмы міжбанкаўскіх разлікаў, міжнародных плацежных сістэм, міжнародных тэлекамунікацыйных сістэм перадачы інфармацыі і (ці) здзяйснення плацяжоў.

2. У выпадку ўключэння ў дагавор, заключаны з замежнай арганізацыяй, палажэнняў, якія прадугледжваюць выплату гэтай ці іншай замежнай арганізацыі кампенсацыі за ажыццяўленне відаў дзейнасці, даванне правоў, даходы ад ажыццяўлення ці давання якіх прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на даходы, сумы такой кампенсацыі (за выключэннем платы за перавозку, страхаванне, калі яны ўключаны ў кошт знешнегандлёвага дагавору куплі-продажы тавару) падлягаюць абкладанню падаткам на даходы ў парадку і па стаўках, устаноўленых гэтай главой для адпаведных відаў даходаў.

3. Даходамі ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь прызнаюцца даходы (у тым ліку авансавыя выплаты), якія налічаюцца (выплачваюцца) замежнай арганізацыі:

3.1. юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь (за выключэннем даходаў, якія налічаюцца (выплачваюцца) філіяламі, прадстаўніцтвамі ці іншымі адасобленымі падраздзяленнямі юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь, размешчанымі за межамі Рэспублікі Беларусь і зарэгістраванымі ў якасці плацельшчыкаў замежных дзяржаў);

3.2. беларускім індывідуальным прадпрымальнікам;

3.3. фізічнай асобай – пры выплаце замежнай арганізацыі, якая не ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, даходаў, указаных у падпунктах 1.2.1, 1.11 і 1.13 пункта 1 гэтага артыкула;

3.4. замежнай арганізацыяй, якая адкрыла ў Рэспубліцы Беларусь сваё прадстаўніцтва і (ці) ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, – калі ўзнікненне гэтых даходаў мае адносіны да гэтага прадстаўніцтва і (ці) пастаяннага прадстаўніцтва;

3.5. замежнай арганізацыяй, не ўказанай у падпункце 3.4 гэтага пункта, ад:

3.5.1. адчужэння нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ці яе часткі;

3.5.2. адчужэння долей у статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або іх часткі;

3.5.3. здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), наём, іншае карыстанне маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці перамешчана на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь у сувязі з такой перадачай у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), наём, іншае карыстанне;

3.5.4. нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, перададзенай у давернае кіраванне;

3.5.5. аказання паслуг па даверным кіраванні нерухомай маёмасцю, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3.5.6. выкарыстання ці давання права карыстання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь маёмаснымі правамі на творы літаратуры, мастацтва, навукі, камп'ютарныя праграмы, іншыя творы, якія адносяцца да аб'екта аўтарскага і (ці) сумежнага права;

3.5.7. аперацый з каштоўнымі паперамі, якія рэалізуюцца (пагашаюцца) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3.5.8. арганізацыі і правядзення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь культурна-відовішчных мерапрыемстваў і (ці) удзелу ў іх, а таксама працы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь атракцыёнаў і звярынцаў.

**Артыкул 190. Падатковая база падатку на даходы**

1. Падатковая база падатку на даходы вызначаецца:

1.1. як агульная сума даходаў за вылікам дакументальна пацверджаных затрат:

1.1.1. па даходах за выкарыстанне маёмасці або даванне права карыстання маёмасцю, указанай у падпункце 1.3 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у суме пакрыцця кошту такой маёмасці, якая адносіцца на налічаную суму даходу, затрат па яе страхаванні, выплаце банку, ураду замежнай дзяржавы ці Пастаяннаму Камітэту Саюзнай дзяржавы працэнтаў за крэдыт, атрыманы на набыццё маёмасці. Калі ўмовы дагавора аб выкарыстанні маёмасці, а таксама мытныя дэкларацыі з інвойсамі, таварна-транспартныя накладныя ці іншыя дакументы не дазваляюць вылучыць у складзе належнага замежнай арганізацыі даходу суму пакрыцця кошту аб'екта маёмасці, якая выкарыстоўваецца, падатковая база падатку на даходы вызначаецца зыходзячы з налічанай сумы даходу за вылікам дакументальна пацверджаных затрат па выплаце банку, ураду замежнай дзяржавы, Пастаяннаму Камітэту Саюзнай дзяржавы працэнтаў за крэдыт, атрыманы на набыццё маёмасці, а таксама па страхаванні маёмасці. Пры падачы ў падатковы орган дакументаў, якія пацвярджаюць суму затрат замежнай арганізацыі па пакрыцці кошту аб'екта арэнды (найму, лізінгу) маёмасці па кожным факце налічэння плацяжу, падатак вылічваецца ў адпаведнасці з палажэннямі гэтага падпункта.

Сума пакрыцця кошту маёмасці, які адносіцца на налічаную суму даходу ад давання права карыстання нерухомай маёмасцю, якая прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, вызначаецца:

як сума пакрыцця кошту прадмета лізінгу ў частцы, уключанай у адпаведны бягучы лізінгавы плацеж, без падатку на дабаўленую вартасць – пры выкананні дагавора фінансавай арэнды (лізінгу, сублізінгу);

як сума арэнднай платы, якая адносіцца на частку дадзенай падатковым агентам у субарэнду маёмасці і заплачана ў падатковым перыядзе, за які падлягае вылічэнню падатак на даходы ў адносінах да даходаў ад давання права карыстання такой маёмасцю, – пры выкананні дагавора арэнды;

як сума амартызацыйных адлічэнняў па такой маёмасці, разлічаных у памеры і парадку, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (разлік амартызацыйных адлічэнняў прыводзіцца ў даведцы адвольнай формы, якая падаецца разам з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на даходы), – пры выкананні дагавора арэнды (у частцы маёмасці, не перададзенай на працягу падатковага перыяду падатковым агентам у субарэнду), іншых дагавораў аб даванні права карыстання такой маёмасцю;

1.1.2. па даходах, указаных у падпункце 1.5 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у суме цаны набыцця тавару (затрат на яго вытворчасць), улічанай у таварасуправаджальных дакументах.

Пры гэтым для мэт вылічэння падатку на даходы цана набыцця тавару (затраты на яго вытворчасць) пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы. Затраты прымаюцца толькі ў частцы, якая адносіцца на фактычна рэалізаваныя тавары, у тым ліку з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь за яе межы. Калі ўмовы дагавораў даручэння, камісіі і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, а таксама мытныя дэкларацыі з інвойсамі, таварна-транспартныя накладныя ці іншыя дакументы не дазваляюць вызначыць цану набыцця тавару, які рэалізуецца (затрат на яго вытворчасць), у сувязі з неўказаннем памеру ўзнагароды замежнай арганізацыі, падатковая база падатку на

даходы вызначаецца зыходзячы з налічанай сумы даходу за вылікам затрат, пацверджаных дакументальна.

Пры падачы ў падатковы орган дакументаў, якія пацвярджаюць цану набыцця (затраты на вытворчасць) тавару, які рэалізуецца, падатак вылічваецца ў адпаведнасці з палажэннямі гэтага падпункта;

1.1.3. па даходах, указаных у падпункце 1.6 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у суме затрат на кармленне жывёл у час знаходжання звярынцаў і цыркаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама аплату ветэрынарных паслуг, транспарціроўку і арэндную плату беларускім арганізацыям і (ці) беларускім індывідуальным прадпрымальнікам;

1.1.4. па даходах, указаных у падпункце 1.11 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса:

пры адчужэнні нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – у суме затрат, панесеных на набыццё, будаўніцтва нерухомай маёмасці, за вылікам амартызацыйных адлічэнняў, разлічаных у памеры і парадку, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (разлік амартызацыі прыводзіцца ў даведцы адвольнай формы, якая падаецца разам з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па падатку на даходы).

Для мэт вызначэння сум падатковай базы:

сума даходу замежнай арганізацыі і сума яе затрат, панесеных на набыццё, будаўніцтва нерухомай маёмасці, падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату налічэння даходу, на дату прыняцця такога аб'екта да ўліку, на даты, вызначаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для прыняцця да ўліку амартызацыйных адлічэнняў;

сума падатковай базы, вызначаная ў доларах ЗША, пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы;

пры адчужэнні прадпрыемства як маёмаснага комплексу, уласнікам якога з'яўляецца замежная арганізацыя, ці яго часткі – у суме затрат на набыццё такога прадпрыемства, ці долей у яго статутным фондзе (паёў, акцый), ці на ўзнос (уклад) у яго статутны фонд, які адносіцца на адчужальную частку.

Для мэт вызначэння сум падатковай базы:

сума даходу замежнай арганізацыі і сума панесеных ёю затрат падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату налічэння даходаў і на дату аплаты набыцця такога прадпрыемства, долей у прадпрыемстве ці дату фактычнага ўнясення ўзносу (укладу) у статутны фонд або фактычнага ажыццяўлення (аплаты) расходаў на набыццё такога прадпрыемства ці долі ў яго статутным фондзе (паёў, акцый);

сума падатковай базы, вызначаная ў доларах ЗША, пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы;

пры адчужэнні, пагашэнні каштоўных папер (акрамя акцый) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь – у суме затрат на набыццё каштоўных папер і іх адчужэнне. Пры гэтым затраты на набыццё каштоўных папер (акрамя акцый), панесеныя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўзнікнення абавязацельства па выплаце падатку на даходы;

пры адчужэнні заснавальнікам, удзельнікам беларускай арганізацыі долі ў статутным фондзе (паю, акцый) арганізацыі – у суме фактычна праведзенага (аплачанага) узносу (укладу) у статутны фонд такой арганізацыі ці ў суме затрат на набыццё долі (паю, акцый);

пры адчужэнні заснавальнікам, удзельнікам беларускай арганізацыі часткі долі ў статутным фондзе (часткі паю) арганізацыі – у суме затрат, вылічаных як здабытак удзельнай вагі адчужальнай часткі долі (часткі паю) у долі (паі) гэтага заснавальніка, удзельніка ў статутным фондзе арганізацыі і сумы ажыццёўленых заснавальнікам, удзельнікам арганізацыі затрат на ўзнос (уклад) у статутны фонд ці на набыццё долі (паю).

Для мэт вызначэння сум падатковай базы:

сума даходу замежнай арганізацыі і сума яе ўзносу (укладу) ці сума расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паёў, акцый) беларускай арганізацыі падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату налічэння даходаў і на дату фактычнага ўнясення ўзносу (укладу) або фактычнага ажыццяўлення (аплаты) расходаў на набыццё долі ў статутным фондзе (паёў, акцый) арганізацый;

сума падатковай базы, вызначаная ў доларах ЗША, пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы;

1.1.5. па даходах, указаных у падпункце 1.12.9 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у суме:

камісійнай (брокерскай) узнагароды за паслугі беларускага страхоўшчыка ці сустрахоўшчыка;

заплачанага страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння па дагаворы сустрахавання пры надыходзе страхавога выпадку;

заплачанага пакрыцця долі страт па дагаворы перастрахавання пры надыходзе страхавога выпадку;

выплачанай страхавой арганізацыяй рэспублікі Беларусь замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе ўрэгуляванне страт па страхавым выпадку, якое праводзіцца за межамі Рэспублікі Беларусь, у якасці пакрыцця панесеных замежнай арганізацыяй затрат, звязаных з афармленнем дакументаў па страхавым выпадку і вызначэннем памеру шкоды;

1.1.6. па даходах, указаных у падпункце 1.13 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у суме ўзнагароды давернаму кіраўніку, калі выплата такой узнагароды прадугледжана дагаворам давернага кіравання, а таксама ў суме падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем яго сум, якія адносяцца на ўказаныя ў падпункце 1.11 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса даходы замежнай арганізацыі), вылічанага за адпаведны падатковы перыяд падатку на даходы даверным кіраўніком у сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю, атрыманай у давернае кіраванне ў інтарэсах адпаведнай замежнай арганізацыі – даручальніка (выгаданабытчыка);

1.2. па даходах, указаных у падпункце 1.4 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, – у парадку, устаноўленым пунктам 6 артыкула 182 гэтага Кодэкса;

1.3. як агульная сума даходаў – па іншых даходах, указаных у пункце 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса.

2. Затраты замежнай арганізацыі ўлічваюцца пры вылічэнні падатку на даходы, калі да даты налічэння (выплаты) даходаў у распараджэнні падатковага агента, які ўтрымлівае падатак на даходы з такіх даходаў у адпаведнасці з гэтай главой, маюцца пададзеныя гэтай замежнай арганізацыяй дакументальна пацверджаныя даныя аб такіх затратах.

**Артыкул 191. Вызначэнне даты ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы**

1. У мэтах гэтай главы дата ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы вызначаецца як дзень налічэння замежнай арганізацыі даходу (плацяжу), які прыпадае на падатковы перыяд.

2. Днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам, прызнаецца найбольш ранняя з наступных дат:

2.1. дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку (але не пазней за дату, калі такое адлюстраванне павінна быць праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам) факта выканання замежнай арганізацыяй прац, аказання паслуг, набыцця ў замежнай арганізацыі нерухомай маёмасці, набыцця прадпрыемства як маёмаснага комплексу (яго часткі), якое належыць замежнай арганізацыі, набыцця долі (паю, акцый), якая належыць замежнай арганізацыі як удзельніку арганізацыі, або яе часткі, прызнання няўстойкі (штрафу, пені) і іншых відаў санкцый за парушэнне ўмоў дагавораў;

2.2. дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку (але не пазней за дату, калі такое адлюстраванне павінна быць праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам) абавязацельстваў перад замежнай арганізацыяй па выплаце даходаў у выглядзе дывідэндаў, даходаў ад даўгавых

абавязацельстваў, за выключэннем даходаў ад даўгавых абавязацельстваў па дадзеных крэдытах, пазыках, роялці, аперацый па рэалізацыі (пагашэнні) каштоўных папер (акрамя акцый), рэалізацыі тавараў на ўмовах дагавораў даручэння, камісіі і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў;

2.3. дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку (але не пазней за дату, калі такое адлюстраванне павінна быць праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам) факта выплаты падатковым агентам даходу замежнай арганізацыі (факта ажыццяўлення выплаты, перадачы маёмасці, маёмасных правоў, правядзення заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў у залежнасці ад устаноўленай бакамі дагавора формы разліку).

3. Днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі ад даўгавых абавязацельстваў па крэдытах, пазыках, а таксама ад даўгавых абавязацельстваў па каштоўных паперах, умовамі эмісіі якіх прадугледжана атрыманне даходаў у выглядзе працэнтаў (дысконту), прызнаецца па выбары падатковага агента адна з наступных дат:

3.1. дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку (але не пазней за дату, калі такое адлюстраванне павінна быць праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам) абавязацельстваў перад замежнай арганізацыяй па выплаце такога даходу;

3.2. дата адлюстравання ў бухгалтарскім уліку (але не пазней за дату, калі такое адлюстраванне павінна быць праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам) факта выплаты падатковым агентам даходу замежнай арганізацыі (факта ажыццяўлення выплаты, перадачы маёмасці, маёмасных правоў, правядзення заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў у залежнасці ад устаноўленай бакамі дагавора формы разліку).

Падатковыя агенты, якія абралі днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі ад даўгавых абавязацельстваў па крэдытах, пазыках дату адлюстравання ў бухгалтарскім уліку факта выплаты даходу, робяць адпаведную адзнаку ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы, у якой у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта адлюстраваны гэты від даходу замежнай арганізацыі.

Падатковыя агенты, якія абралі днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі ад даўгавых абавязацельстваў па каштоўных паперах, умовамі эмісіі якіх прадугледжана атрыманне даходаў у выглядзе працэнтаў (дысконту), дату адлюстравання ў бухгалтарскім уліку факта выплаты даходу, робяць адпаведную адзнаку ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы, у якой у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта адлюстраваны гэты від даходу замежнай арганізацыі.

Прынятыя падатковым агентам рашэнні аб выбары дня налічэння ўказаных у гэтым пункце відаў даходаў замежнай арганізацыі афармляюцца ў пісьмовай форме і змяненню на працягу бягучага каляндарнага года не падлягаюць.

4. Днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі падатковымі агентамі, якія выкарыстоўваюць дадзенае ім заканадаўчымі актамі права не весці бухгалтарскі ўлік, прызнаецца дата выплаты даходу замежнай арганізацыі (ажыццяўлення плацяжу, перадачы маёмасці, маёмасных правоў, правядзення заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў у залежнасці ад устаноўленай бакамі дагавора формы разліку).

5. Днём налічэння даходу (плацяжу), указанага ў падпункце 3.5 пункта 3 артыкула 189 гэтага Кодэкса, замежнай арганізацыяй, якая не мае адкрытага ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўніцтва і (ці) пастаяннага прадстаўніцтва, якія налічваюць і (ці) выплачваюць яго іншай замежнай арганізацыі, прызнаецца найбольш ранняя з наступных дат:

5.1. дата здзяйснення гаспадарчай аперацыі, з якой звязана атрыманне даходу, які прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на даходы;

5.2. дата выплаты даходу замежнай арганізацыі (факта ажыццяўлення выплаты, перадачы маёмасці, маёмасных правоў, правядзення заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў у залежнасці ад устаноўленай бакамі дагавора формы разліку).

6. У выпадку выплаты, спісання з рахункаў юрыдычных асоб ці індывідуальных прадпрымальнікаў грашовых сродкаў, належных замежнай арганізацыі ў выглядзе даходаў, якія прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на даходы, на падставе судовай пастановы, днём налічэння даходу (плацяжу) замежнай арганізацыі прызнаецца дата адлюстравання ў

бухгалтарскім уліку фактычнага выканання рашэння суда, калі раней даход (плацеж) не быў адлюстраваны ва ўстаноўленым парадку ў бухгалтарскім уліку.

7. У выпадку выплаты даходаў ад давання гарантыі (па банкаўскай гарантыі) днём налічэння плацяжу (даходу) з'яўляецца дата, калі банкам-рэзідэнтам было атрымана паведамленне аб неабходнасці пералічыць (паведамленне аб будучым спісанні з рахунку) узнагароду за дадзеную гарантыю банку-нерэзідэнту ці замежнай нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі, калі дата пералічэння (спісання з рахунку) грашовых сродкаў не з'яўляецца больш ранняй.

**Артыкул 192. Стаўкі падатку на даходы**

1. Стаўкі падатку на даходы ўстанаўліваюцца ў наступных памерах:

1.1. нуль (0) працэнтаў па даходах:

ад даўгавых абавязацельстваў па дадзеных крэдытах, пазыках Рэспубліцы Беларусь ці Ураду Рэспублікі Беларусь, а таксама рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь пад дзяржаўныя гарантыі ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

ад даўгавых абавязацельстваў па крэдытах, пазыках, дадзеных беларускім арганізацыям за кошт грашовых сродкаў, атрыманых ад размяшчэння аблігацый, якія эмітуюцца замежнымі арганізацыямі ў мэтах накіравання такіх сродкаў беларускім арганізацыям у выглядзе крэдытаў, пазык;

ад даўгавых абавязацельстваў па аблігацыях беларускіх арганізацый, эмітаваных з 1 красавіка 2008 года па 1 студзеня 2015 года і з 1 ліпеня 2015 года, а таксама ад іх адчужэння і (ці) іх пагашэння, калі іншае не ўстаноўлена абзацам пятым гэтага падпункта;

ад даўгавых абавязацельстваў па размешчаных за межамі Рэспублікі Беларусь аблігацыях адкрытага акцыянернага таварыства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», а таксама ад іх адчужэння і (ці) іх пагашэння;

ад даўгавых абавязацельстваў па дзяржаўных каштоўных паперах Рэспублікі Беларусь, каштоўных паперах Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, аблігацыях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама ад іх адчужэння і (ці) іх пагашэння;

у выглядзе кампенсацый (пакрыцця выдаткаў), камісій, выплата якіх замежным банкам прадугледжана дагаворамі па даванні крэдытаў, пазык, указаных у абзацах другім і трэцім гэтага падпункта;

ад выканання прац (аказання паслуг), звязаных з:

эмісіяй, размяшчэннем, абарачэннем, пагашэннем дзяржаўных доўгатэрміновых аблігацый Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі даўгавымі абавязацельствамі, што фарміруюць знешні дзяржаўны доўг, аблігацый мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і аблігацый беларускіх арганізацый, адкрытага акцыянернага грамадства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», улікам правоў на такія аблігацыі;

прадстаўленнем інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у рамках дасудовага ўрэгулявання спрэчак, у міжнародных арбітражах і замежных судовых органах па спрэчках паміж замежнымі арганізацыямі (замежнымі грамадзянамі) і Рэспублікай Беларусь;

ад здачы марскіх суднаў у арэнду суб'ектам гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь для ажыццяўлення імі дзейнасці па эксплуатацыі такіх марскіх суднаў;

ад аказання суб'ектам гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь паслуг па навучанні работнікаў у галіне эксплуатацыі марскіх суднаў;

1.2. шэсць (6) працэнтаў – па даходах, указаных у падпункце 1.1 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса;

1.3. дзесяць (10) працэнтаў – па даходах, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, за выключэннем даходаў, указаных у абзацах другім – шостым падпункта 1.1 гэтага пункта;

1.4. дванаццаць (12) працэнтаў – па даходах, указаных у падпунктах 1.4 і 1.11.4 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса;

1.5. пятнаццаць (15) працэнтаў – па іншых даходах, указаных у пункце 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса.

2. Умовай прымянення стаўкі падатку на даходы ў памеры нуль (0) працэнтаў для даходаў, указаных у абзацах трэцім і чацвёртым падпункта 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, з'яўляецца падача падатковым агентам у падатковы орган дакументаў, звестак (інфармацыі), якія пацвярджаюць:

на каляндарны год ці іншы перыяд, на які прыпадае дзень налічэння падатковым агентам даходу (плацяжу), пастаяннае месцазнаходжанне замежнай арганізацыі, якая з'яўляецца эмітэнтам аблігацый, ці замежнай арганізацыі, упаўнаважанай на атрыманне даходаў, якія падлягаюць выплаце па аблігацыях, у дзяржаве, з якой Рэспубліка Беларусь прымяняе міжнародны дагавор, які прадугледжвае абмен інфармацыяй па падатковых пытаннях;

праходжанне аблігацыяй працэдуры лістынгу і (ці) допуску да абарачэння на біржы, уключанай у пералік біржаў, што забяспечваюць належную ідэнтыфікацыю сапраўдных уладальнікаў арганізацый – эмітэнтаў каштоўных папер, які вызначаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь. Факты, указаныя ў гэтым абзацы, пацвярджае падатковы агент на падставе звестак, атрыманых ад адпаведнай біржы, і (ці) іншых дакументаў, якія адносяцца да выпуску аблігацый, і (ці) на падставе звестак з агульнадаступных крыніц інфармацыі.

3. Палажэнні абзацаў адзінаццатага і дванаццатага падпункта 1.1 пункта 1 гэтага артыкула прымяняюцца, калі плацельшчыкам з'яўляецца замежная арганізацыя, якая не дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, з'яўляецца рэзідэнтам дзяржавы, з якой Рэспубліка Беларусь не заключыла міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання.

**Артыкул 193. Падатковы перыяд падатку на даходы. Парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і выплаты падатку на даходы**

1. Падатковым перыядам падатку на даходы прызнаецца квартал, на які прыпадае дата ўзнікнення абавязацельства па выплаце падатку на даходы, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам.

2. Сума падатку на даходы вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

3. Падатак на даходы вылічваецца і пералічваецца ў бюджэт юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія налічваюць і (ці) выплачваюць даход замежнай арганізацыі, якая не ажыццяўляе дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва. Указаныя юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі прызнаюцца падатковымі агентамі і маюць правы, нясуць абавязкі, устаноўленыя артыкулам 23 гэтага Кодэкса.

Фізічныя асобы вылічваюць і ўтрымліваюць падатак на даходы пры выплаце замежным арганізацыям, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, даходаў, указаных у падпунктах 1.2.1, 1.11 і 1.13 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса. Фізічныя асобы прызнаюцца падатковымі агентамі ў адносінах да такіх даходаў замежных арганізацый.

Падатак на даходы па даходзе, указаным у падпункце 1.2.1 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, вылічваецца і ўтрымліваецца фізічнай асобай, якая на момант выплаты даходу прызнаецца падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з артыкулам 17 гэтага Кодэкса і палажэннямі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Для мэт гэтага артыкула пад выплатай даходу разумеюцца любая форма разлікаў ці любы спосаб спынення абавязацельства па выплаце даходу.

4. Падатковы агент не ўтрымлівае падатак на даходы і не падае падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на даходы, калі да надыходу тэрміну выканання абавязацельства па ўтрыманні і пералічэнні ў бюджэт падатку на даходы ён атрымаў пацвярджэнне ўстаноўленай формы аб ажыццяўленні замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, выдадзенае падатковым органам Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым часткамі другой і трэцяй гэтага пункта.

Падатковы орган Рэспублікі Беларусь пацвярджае ажыццяўленне замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва ў выпадку

атрымання ад такой арганізацыі паведамлення ўстаноўленай формы, у якім указваюцца ўліковы нумар плацельшчыка і адрас месца знаходжання падатковага агента, від даходу, а таксама звесткі аб тым, што гэты від даходу з'яўляецца даходам (выручкай) такой арганізацыі ад дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва.

Калі даныя падатковых дэкларацый (разлікаў), пададзеных замежнай арганізацыяй, указанай у частцы другой гэтага пункта, у бягучым каляндарным годзе, а таксама іншыя звесткі, якія мае падатковы орган, сведчаць аб ажыццяўленні ёю дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, падатковы орган не пазней за два рабочыя дні пасля атрымання паведамлення, указанага ў частцы другой гэтага пункта, накіроўвае адзін экзэмпляр пацвярджэння аб ажыццяўленні замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента, а другі экзэмпляр – падатковаму агенту. Пры гэтым у пацвярджэнні ўказваюцца найменне і ўліковы нумар плацельшчыка, адрас месца знаходжання падатковага агента, а таксама замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва. Пацвярджэнне сапраўднае да заканчэння каляндарнага года, у якім яно выдадзена, калі падатковы орган не адкліча яго з-за спынення замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва. Падатковыя органы паведамляюць падатковаму агенту аб адкліканні пацвярджэння не пазней за рабочы дзень, які ідзе следам за днём такога адклікання.

Калі даныя падатковых дэкларацый (разлікаў), пададзеных замежнай арганізацыяй, указанай у частцы другой гэтага пункта, у бягучым каляндарным годзе, а таксама іншыя звесткі, якія мае падатковы орган, не сведчаць аб ажыццяўленні замежнай арганізацыяй дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, падатковы орган не пазней за два рабочыя дні пасля атрымання паведамлення, указанага ў частцы другой гэтага пункта, інфармуе аб гэтым замежную арганізацыю.

Пацвярджэнне і паведамленне, указаныя ў частках першай і другой гэтага пункта, накіроўваюцца ў электроннай форме.

5. Калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам, падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на даходы падаецца падатковым агентам не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, у падатковы орган па месцы сваёй пастаноўкі на ўлік.

Фізічная асоба, замежная арганізацыя (за выключэннем замежнай арганізацыі, указанай у падпункце 3.4 пункта 3 артыкула 189 гэтага Кодэкса), якія налічваюць і (ці) выплачваюць замежнай арганізацыі, якая не дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, даход (даходы), указаны (указаныя) у падпунктах 1.11.1, 1.11.2 і 1.11.4 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на даходы падаюць у падатковы орган адпаведна па месцы знаходжання нерухомай маёмасці, якая адчужаецца, месцы пастаноўкі на ўлік арганізацыі, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, доля ў статутным фондзе (паі, акцыі) якой (часткі долі, паю) адчужаецца, не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

Падатак на даходы пералічваецца ў бюджэт не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, калі іншы тэрмін не прадугледжаны гэтым артыкулам.

6. Замежная арганізацыя, якая не дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, атрымлівае даходы ад арганізацыі і правядзення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь культурна-відовішчных мерапрыемстваў, атракцыёнаў і звярынцаў (за выключэннем выпадкаў ажыццяўлення ўказанай дзейнасці па дагаворах з юрыдычнымі асобамі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь, якія прызнаюцца падатковымі агентамі, якія прадугледжваюць паступленне выручкі на рахункі такіх агентаў), выплачвае падатак на даходы самастойна. Падача падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы і выплата падатку на даходы праводзяцца такой замежнай арганізацыяй у падатковыя органы па месцы правядзення названых мерапрыемстваў пры правядзенні:

культурна-відовішчных мерапрыемстваў – не пазней за першы рабочы дзень, які ідзе следам за днём правядзення кожнага з культурна-відовішчных мерапрыемстваў;

атракцыёнаў і звярынцаў – не пазней за рабочы дзень, які ідзе следам за днём правядзення апошняга з такіх мерапрыемстваў.

Фізічныя асобы, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што выплачваюць замежнай арганізацыі даходы, указаныя ў падпунктах 1.2.1, 1.11 і 1.13 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса, маюць права выбраць падатковым перыядам падатку на даходы каляндарны квартал або каляндарны год, на якія прыпадае дата ўзнікнення абавязацельства па выплаце падатку на даходы.

Фізічныя асобы, якія выбралі падатковым перыядам па падатку на даходы каляндарны квартал, інфармуюць аб прынятым рашэнні падатковыя органы па месцы пастаноўкі на ўлік шляхам пастаўлення адпаведнай адзнакі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы, што падаецца за падатковы перыяд, у якім першы раз у каляндарным годзе ўзнікае аб'ект падаткаабкладання падаткам на даходы.

Прынятае рашэнне аб выбары падатковага перыяду (каляндарны квартал ці каляндарны год) змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае.

7. Замежныя арганізацыі, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, што аб'ядналі свае грашовыя сродкі для наступнага давання крэдыту беларускай арганізацыі банкам Рэспублікі Беларусь (банкам-агентам) – удзельнікам кансарцыяльнага крэдытнага дагавора, плацяць падатак на даходы, атрыманыя з крыніц у Рэспубліцы Беларусь, праз падатковага агента (банк-агент).

Удзельнікі кансарцыяльнага крэдытнага дагавора, не ўказаныя ў частцы першай гэтага пункта, выконваюць падатковыя абавязацельствы самастойна пасля размеркавання даходу паміж усімі яго ўдзельнікамі.

8. Перамена асоб у абавязацельстве па крэдытным дагаворы, дагаворы пазыкі не цягне за сабой змянення абавязацельстваў па падатку на даходы замежнай арганізацыі – першапачатковага крэдытора.

**Артыкул 194. Спецыяльныя палажэнні. Ліквідацыя двайнога падаткаабкладання**

1. Для мэт прымянення палажэнняў міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання замежная арганізацыя падае ва ўстаноўленым парадку пацвярджэнне таго, што яна мае пастаяннае месцазнаходжанне ў той замежнай дзяржаве, з якой маецца міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання (далей у гэтым артыкуле – пацвярджэнне), якое павінна быць засведчана кампетэнтным органам адпаведнай замежнай дзяржавы.

Калі ўмовай (адной з умоў) прымянення льготы па падатку на даход у адпаведнасці з палажэннямі міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання і (ці) заканадаўствам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца атрыманне даходу з крыніцы ў Рэспубліцы Беларусь яго фактычным уладальнікам (далей – ільгота па даходзе фактычнага ўладальніка), у замежнай арганізацыі ў дапаўненне да пацвярджэння могуць быць запытаны дакументы, указаныя ў пункце 3 гэтага артыкула.

Пацвярджэнне можа падавацца ў падатковы орган як да выплаты падатку на даходы, так і пасля гэтай выплаты. Пацвярджэнне можа быць пададзена ў выглядзе электроннага дакумента. У гэтым выпадку яно накіроўваецца ў падатковы орган у якасці дадатку да падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы, калі падатковы агент падае такую падатковую дэкларацыю (разлік) у электронным выглядзе, або да пісьма падатковага агента, складзенага ў выглядзе электроннага дакумента.

Пацвярджэнне падаецца ў падатковы орган штогод і сапраўднае на працягу каляндарнага года, у якім яно выдадзена, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам.

Калі кампетэнтны орган замежнай дзяржавы ўказаў перыяд дзеяння пацвярджэння, то яно прымяняецца на працягу ўказанага ў ім перыяду.

У выпадку адсутнасці ў падатковым органе пацвярджэння, выдадзенага на бягучы каляндарны год, і пры наяўнасці такога дакумента, засведчанага ў чацвёртым квартале бягучага

каляндарнага года, ён прымяняецца ў якасці пацвярджэння на бягучы каляндарны год або на перыяд, указаны ў ім.

Пацвярджэнне, выдадзенае без указання перыяду яго дзеяння, можа прымяняцца:

на наступны каляндарны год, калі яно засведчана ў чацвёртым квартале бягучага года кампетэнтным органам дзяржавы пастаяннага месцазнаходжання замежнай арганізацыі і ў падатковым органе маецца дакумент, які з'яўляецца пацвярджэннем на бягучы каляндарны год;

на працягу бягучага і двух наступных за годам яго выдачы каляндарных гадоў, калі ва ўказаны перыяд замежная арганізацыя не змяніла дзяржаву свайго пастаяннага месцазнаходжання, указаную ў дагаворы, заключаным з падатковым агентам, які прадугледжвае выплату даходу, у адносінах да якога падатковым агентам у першы каляндарны год ва ўстаноўленым парадку былі прыменены палажэнні міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання. Для пацвярджэння абгрунтаванасці прымянення ў наступныя два каляндарныя гады пацвярджэння падатковы орган мае права запытаць у падатковага агента дагавор (яго копію), а таксама дакументы (іх копіі), якія пацвярджаюць выплату даходу замежнай арганізацыі па рэквізітах, указаных у дагаворы.

Для мэт гэтага  артыкула бягучым каляндарным годам з'яўляецца год, у якім выдадзена пацвярджэнне.

Пры падачы ў падатковы орган пацвярджэння да ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну падачы падатковай дэкларацыі (разліку), у якой падлягае адлюстраванню даход (плацеж), у адносінах да якога міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання прадугледжаны іншыя палажэнні, чым тыя, якія ўстаноўлены гэтай главой, у адносінах да такога даходу (плацяжу) падатковы агент не ўтрымлівае і не пералічвае ў бюджэт падатак на даходы ці ўтрымлівае і пералічвае ў бюджэт падатак на даходы па паніжаных стаўках, устаноўленых такім міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Падача пацвярджэння ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента з'яўляецца падставай для неўтрымання падатку на даходы ці ўтрымання падатку на даходы па паніжаных стаўках з улікам палажэнняў адпаведнага міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 4 гэтага  артыкула.

Пры непадачы ў падатковы орган пацвярджэння падатак на даходы ўтрымліваецца і пералічваецца ў бюджэт ва ўстаноўленым парадку.

Раней утрыманы (заплачаны) падатак на даходы, у адносінах да якога міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання прадугледжаны іншыя палажэнні, чым тыя, якія ўстаноўлены гэтай главой, залічвае (вяртае) падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента. Заява аб заліку (вяртанні) падатку падаецца ва ўстаноўленых гэтым Кодэксам выпадках падатковым агентам з дадаваннем да яго пацвярджэння, а таксама, калі гэта будзе вызначана пісьмовым патрабаваннем падатковага органа, копіі дагавора (ці іншага дакумента), у адпаведнасці з якім выплачваўся даход (плацеж) замежнай арганізацыі, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам.

Пры налічэнні (выплаце) даходаў (плацяжоў) замежным арганізацыям, пастаяннае месцазнаходжанне якіх пацвярджаецца звесткамі міжнароднага даведніка «The Bankers Almanac» (выдавецтва Reed Business Information), міжнароднага каталога «BIC Directory» (выданне S.W.I.F.T., Customer Operations Services, 1 Av., Adele, 1310 La Hulpe, Belgium), міжнароднага электроннага каталога «Bankers World Online» (SWIFTREF) ці міжнароднага даведніка «Airline Coding Directory» (выданне «International Air Transport Association», Montreal – Geneva), а таксама цэнтральным (нацыянальным) банкам замежных дзяржаў, органам дзяржаўнага кіравання і (ці) мясцовым органам улады гэтых дзяржаў пацвярджэнне не падаецца.

Калі падаткаабкладанне замежнай арганізацыі ажыццяўляецца ў дзяржаве, у якой зарэгістравана замежная арганізацыя, шляхам падаткаабкладання даходаў удзельнікаў, якія ўваходзяць у яе склад (далей у гэтым пункце – удзельнікі), то палажэнні міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання прымяняюцца ў частцы даходу кожнага з удзельнікаў, у адносінах да якіх пададзены пацвярджэнні.

Сума даходу ўдзельніка (удзельнікаў) павінна быць пацверджана шляхам падачы замежнай арганізацыяй самастойна, або праз удзельніка, або праз падатковага агента ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента наступных дакументаў:

спіса ўсіх удзельнікаў на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы, засведчанага службовай асобай замежнай арганізацыі, або графічнага вобраза такога спіса, калі спіс удзельнікаў размешчаны на сайце кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы ці замежнай арганізацыі ў сетцы Інтэрнэт;

заключэння аўдытарскай арганізацыі (аўдытара) або падатковага органа замежнай дзяржавы, якое пацвярджае на дату ўзнікнення абавязацельстваў па выплаце падатку на даходы суму даходу ўдзельніка (удзельнікаў).

Палажэнні абзаца трэцяга часткі пятнаццатай гэтага пункта не прымяняюцца, калі ўсе ўдзельнікі замежнай арганізацыі, указанай у частцы чатырнаццатай гэтага пункта, маюць пастаяннае месцазнаходжанне ў адной дзяржаве.

Палажэнні часткі пятнаццатай гэтага пункта не прымяняюцца, калі ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента замежнай арганізацыяй, удзельнікам ці падатковым агентам пададзена выпіска з акта заканадаўства замежнай дзяржавы, згодна з якім у склад замежнай арганізацыі могуць уваходзіць толькі партнёры, якія маюць пастаяннае месцазнаходжанне ў дзяржаве, у якой зарэгістравана замежная арганізацыя.

2. Замежная арганізацыя прызнаецца маючай статус фактычнага ўладальніка даходу, калі яна ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з атрыманнем з крыніц у Рэспубліцы Беларусь даходу, у адносінах да якога яна прэтэндуе на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка, з'яўляецца непасрэдным выгаданабытчыкам такога даходу, мае права самастойна карыстацца і (ці) распараджацца гэтым даходам па сваім меркаванні. Пры вызначэнні статусу замежнай арганізацыі ў якасці фактычнага ўладальніка даходу ўлічваюцца функцыі, якія выконваюцца ёю ў мэтах атрымання такога даходу, наяўныя паўнамоцтвы і прынятыя рызыкі.

Для вызначэння статусу фактычнага ўладальніка даходу могуць быць улічаны дадатковыя падставы, у тым ліку пры правядзенні ўзаемапагаджальнай працэдуры Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь з падатковым органам замежнай дзяржавы ў рамках міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання.

Замежная арганізацыя не разглядаецца ў якасці фактычнага ўладальніка даходу, калі ў мэтах яго атрымання яна ажыццяўляе выключна пасрэдніцкія функцыі ў інтарэсах іншай асобы, не прымае на сябе рызыкі, ці ў яе адсутнічае эканамічная сувязь з даходам, які атрымліваецца, і (ці) яе права карыстацца і (ці) распараджацца даходам абмежавана дагаворнымі ці іншымі абавязацельствамі па выплаце (перадачы) даходу (у поўным аб'ёме ці не менш чым 60 працэнтаў ад такога даходу) ва ўстаноўленыя тэрміны (але не пазней за дванаццаць месяцаў пасля атрымання выплачанага даходу) на карысць падатковага рэзідэнта замежнай дзяржавы, які пры непасрэдным атрыманні такога даходу не меў бы права на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка згодна з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання і (ці) заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ці меў бы права на прымяненне менш спрыяльных палажэнняў міжнароднага дагавора.

3. Пры ўзнікненні ў падатковага агента, які налічае (выплачвае) замежнай арганізацыі даход, на падставе дакументаў, якія ёсць у яго, сумнення ў тым, што ў адпаведнасці з палажэннямі, прадугледжанымі пунктам 2 гэтага артыкула, замежная арганізацыя з'яўляецца фактычным уладальнікам даходу ў мэтах атрымання льготы па даходзе фактычнага ўладальніка (далей – абгрунтаванае сумненне), ён мае права запытаць у такой замежнай арганізацыі дакументы (інфармацыю) для пацвярджэння яе статусу.

У якасці дакументаў (інфармацыі), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, у замежнай арганізацыі могуць быць запытаны:

дакументы (інфармацыя), якія пацвярджаюць наяўнасць у яе неабмежаванага права карыстацца і (ці) распараджацца даходам, у адносінах да якога яна прэтэндуе на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка, адсутнасць абавязацельстваў перад трэцімі асобамі (месцам падатковага рэзідэнцтва якіх з'яўляюцца дзяржава, з якой адсутнічае міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання, ці дзяржава, палажэнні міжнароднага

дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання з якой змяшчаюць менш ільготныя ўмовы), якія абмяжоўваюць яе права на карыстанне і (ці) распараджэнне такім даходам у мэтах ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці;

дакументы (інфармацыя), якія пацвярджаюць ажыццяўленне замежнай арганізацыяй у дзяржаве, падатковым рэзідэнтам якой яна з'яўляецца, прадпрымальніцкай і (ці) іншай дзейнасці.

Апрача дакументаў (інфармацыі), указаных у частцы другой гэтага пункта, замежная арганізацыя мае права падаць пацвярджэнне падатковага органа замежнай дзяржавы аб тым, што яна з'яўляецца фактычным уладальнікам даходу, а таксама іншыя дакументы (інфармацыю) як абгрунтаванне свайго права на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка, пацвярджэнне ў адносінах да замежнай арганізацыі, вызначанай абзацам пятым часткі першай пункта 4 гэтага артыкула.

4. Калі да ўстаноўленага гэтым Кодэксам тэрміну падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы за падатковы перыяд, на які прыпадае дата ўзнікнення абавязацельства па выплаце падатку на даходы, у адносінах да якога замежная арганізацыя прэтэндуе на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка, замежная арганізацыя, у якой у сувязі з узнікненнем абгрунтаваных сумненняў запытаны дакументы (інфармацыя), якія пацвярджаюць яе статус фактычнага ўладальніка даходу:

не падасць запытаныя не пазней чым за дзевяноста дзён да дня падачы ўказанай падатковай дэкларацыі (разліку) дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, падатковы агент не прымяняе льготу па даходзе фактычнага ўладальніка (аб чым у падатковай дэкларацыі (разліку) робіцца адпаведная адзнака) і падае ў падатковы орган разам з такой падатковай дэкларацыяй (разлікам) дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць яго абгрунтаванае сумненне, і копію запыту;

не падасць дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу (калі запыт быў накіраваны пазней за тэрмін, указаны ў абзацы другім часткі першай гэтага пункта), падатковы агент прымяняе льготу па даходзе фактычнага ўладальніка (аб чым у падатковай дэкларацыі (разліку) робіцца адпаведная адзнака) і падае ў падатковы орган разам з такой падатковай дэкларацыяй (разлікам) дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць яго абгрунтаванае сумненне, і копію запыту;

падасць дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, з якіх вынікае, што правы на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка, прадугледжаную адпаведным міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання:

адсутнічаюць у яе як у атрымальніка даходу, аднак пададзены звесткі аб іншай замежнай арганізацыі, якая з'яўляецца фактычным уладальнікам даходу, то можа быць прыменена льгота ў памеры, прадугледжаным у адносінах да адпаведнага віду даходу міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання з замежнай дзяржавай, у якой гэта іншая замежная арганізацыя мае пастаяннае месцазнаходжанне (аб чым у падатковай дэкларацыі (разліку) робіцца адпаведная адзнака). Палажэнні гэтага абзаца прымяняюцца пры ўмове падачы ў падатковы орган падатковым агентам разам з падатковай дэкларацыяй:

пацвярджэння пастаяннага месцазнаходжання ў адносінах да гэтай іншай замежнай арганізацыі;

засведчаных замежнай арганізацыяй (атрымальнікам даходу, які з'яўляецца яго фактычным уладальнікам) копій дагаворных і (ці) іншых дакументаў, якія маюць юрыдычную сілу, што пацвярджаюць наяўнасць паміж такімі замежнымі арганізацыямі абавязацельстваў у адносінах да такога даходу;

адсутнічаюць у яе і не пададзены звесткі аб іншай замежнай арганізацыі, якая з'яўляецца фактычным уладальнікам даходу, падатковы агент пералічвае ў бюджэт падатак на даходы без прымянення льготы па даходзе фактычнага ўладальніка (аб чым у падатковай дэкларацыі (разліку) робіцца адпаведная адзнака) і падае ў падатковы орган разам з такой падатковай дэкларацыяй (разлікам) дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць яго абгрунтаванае сумненне, і пададзеныя замежнай арганізацыяй дакументы (інфармацыю), якія пацвярджаюць

статус фактычнага ўладальніка даходу, на падставе якіх падатковым агентам была зроблена выснова аб адсутнасці ў замежнай арганізацыі права на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка.

Пры падачы замежнай арганізацыяй дакументаў (інфармацыі), якая пацвярджае яе статус фактычнага ўладальніка даходу, пасля дня падачы падатковай дэкларацыі (разліку), указанай у абзацы першым часткі першай гэтага пункта, вяртанне (залік) падатку на даходы праводзіцца падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента ў беларускіх рублях пасля падачы падатковым агентам заявы аб вяртанні (заліку) падатку разам з дакументамі (інфармацыяй), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, пададзенымі замежнай арганізацыяй, і пацвярджэннем (калі яно не было пададзена раней). Падатковы агент падае ўказаныя дакументы, калі з пададзеных на падставе запыту дакументаў вынікае, што ў замежнай арганізацыі маюцца фактычныя правы на льготу па даходзе фактычнага ўладальніка.

5. Калі замежная арганізацыя не згодная з дзеяннямі падатковага агента па ўтрыманні падатку на даход без прымянення льготы па даходзе фактычнага ўладальніка, яна мае права звярнуцца ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента, падаўшы заяву аб вяртанні (заліку) падатку на даходы, копіі пададзеных падатковаму агенту дакументаў (інфармацыі), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, і, калі не былі пададзены раней, пацвярджэнне і копію дагавора (ці іншага дакумента), у адпаведнасці з якім налічваўся (выплачваўся) даход (плацеж) замежнай арганізацыі.

Калі пададзеныя дакументы (інфармацыя) пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, падатковы орган:

на працягу трох рабочых дзён з дня накіравання замежнай арганізацыі адказу паведамляе падатковаму агенту аб гэтым, а таксама аб неабходнасці падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на даходы са змяненнямі і дапаўненнямі на працягу пяці рабочых дзён з дня накіравання паведамлення;

вяртае (залічвае) падатак на даходы ў агульнаўстаноўленым парадку.

Для пацвярджэння акалічнасцей, указаных у пададзеных замежнай арганізацыяй дакументах (інфармацыі), якія пацвярджаюць статус фактычнага ўладальніка даходу, падатковы орган мае права накіраваць запыт у падатковы і (ці) іншыя кампетэнтныя органы замежнай дзяржавы.

# ГЛАВА 18
# ПАДАХОДНЫ ПАДАТАК З ФІЗІЧНЫХ АСОБ

**Артыкул 195. Плацельшчыкі падаходнага падатку з фізічных асоб**

Плацельшчыкамі падаходнага падатку з фізічных асоб (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца фізічныя асобы.

Для мэт гэтай главы і главы 33 гэтага Кодэкса выкарыстоўваюцца наступныя паняцці і тэрміны:

замежны банк – банк або нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя з месцазнаходжаннем за межамі Рэспублікі Беларусь, створаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы;

асобы, якія знаходзяцца ў адносінах блізкай роднасці, – бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удочароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, прадзед, прабабка, праўнукі, сужэнцы;

асобы, якія знаходзяцца ў адносінах сваяцтва, – блізкія сваякі іншага сужэнца, у тым ліку памерлага;

месца асноўнай працы – арганізацыя ці індывідуальны прадпрымальнік, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права заключэння і спынення працоўнага дагавора і ў якіх вядзецца працоўная кніжка работніка, а таксама арганізацыі, якімі ў адпаведнасці з заканадаўствам ажыццяўляюцца абавязковае прыцягненне да працы ці працоўная тэрапія (рэабілітацыя) фізічных асоб, тэрытарыяльныя калегіі адвакатаў (для адвакатаў, якія ажыццяўляюць адвакацкую дзейнасць у юрыдычнай кансультацыі) і адвакацкія бюро (для адвакатаў, якія з'яўляюцца яго заснавальнікамі (удзельнікамі)), тэрытарыяльныя натарыяльныя палаты (для натарыусаў, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльных канторах);

месца асноўнай службы – арганізацыя, у якой плацельшчык у адпаведнасці з заканадаўствам праходзіць ваенную службу, службу ў органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, органах унутраных спраў, Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь і органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

месца асноўнага навучання – установа адукацыі, арганізацыя, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы паслявузаўскай адукацыі, у якіх плацельшчык атрымлівае ў дзённай форме атрымання адукацыі асноўную адукацыю;

натарыусы – натарыусы, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро.

**Артыкул 196. Аб'ект падаткаабкладання падаходным падаткам з фізічных асоб**

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаходным падаткам з фізічных асоб прызнаюцца даходы, атрыманыя плацельшчыкамі:

1.1. ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь і (ці) ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь, – для фізічных асоб, якія прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з артыкулам 17 гэтага Кодэкса (далей – падатковыя рэзідэнты Рэспублікі Беларусь);

1.2. ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, – для фізічных асоб, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь.

2. Аб'ектам падаткаабкладання падаходным падаткам з фізічных асоб не прызнаюцца даходы, атрыманыя плацельшчыкамі:

2.1. ад аперацый, звязаных з маёмаснымі і немаёмаснымі адносінамі фізічных асоб, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам паміж сабой у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага, за выключэннем даходаў, атрыманых указанымі фізічнымі асобамі па заключаных паміж імі працоўных дагаворах,

дагаворах куплі-продажу і (ці) іншых грамадзянска-прававых дагаворах, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

2.2. у памеры аплаты арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі расходаў на правядзенне прэзентацый, юбілеяў, банкетаў, нарад, семінараў, конкурсаў прафесійнага майстэрства, культурных, прадстаўніцкіх мерапрыемстваў, звязаных з дзейнасцю, якая ажыццяўляецца імі;

2.3. у выглядзе матэрыяльнага забеспячэння, у памеры аплаты ці пакрыцця арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі расходаў на правядзенне спартыўных ці спартыўна-масавых мерапрыемстваў (за выключэннем даходаў у выглядзе прызоў, узнагарод трэнерам, суддзям па спорце, а таксама іншым фізічным асобам, якія прыцягваюцца для правядзення такіх мерапрыемстваў па грамадзянска-прававых дагаворах);

2.4. у памеры кошту набытай арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі бутыліраванай вады, у памеры кошту падораных жывых кветак, а таксама сродкаў індывідуальнай абароны, змывальных і абясшкоджвальных сродкаў, выдадзеных плацельшчыку, ці кампенсацыі ў памеры кошту такіх сродкаў, набытых плацельшчыкам за свой кошт, у памеры кошту спартыўнай формы, уніформы, фірменнага адзення, якія выдаюцца ў часовае карыстанне, спецыяльнай амуніцыі, у тым ліку той, якая выдаецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь работнікам інкасацыі;

2.5. у памеры закладнога кошту здадзенай тары, за выключэннем выпадкаў, калі збор (нарыхтоўка) і наступная здача тары праводзяцца ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

2.6. асобамі, якія прычынілі шкоду, у памеры пакрыцця такой шкоды іншымі асобамі, абавязанымі яго кампенсаваць у адпаведнасці з заканадаўствам, калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой;

2.7. у памеры аплаты кошту медыцынскіх паслуг ці пакрыцця расходаў на аплату такіх паслуг у выпадку атрымання плацельшчыкам калецтва ці іншага пашкоджання здароўя па віне іншых асоб, у тым ліку ў выніку проціпраўных дзеянняў, надзвычайнага і (ці) дарожна-транспартнага здарэнняў;

2.8. у памеры аплаты кошту транспартных паслуг па перавозцы да месца працы (службы, навучання) і назад, а таксама пры выкананні плацельшчыкамі працоўных абавязкаў, праведзенай за кошт сродкаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца для плацельшчыкаў месцам асноўнай працы (службы, навучання);

2.9. у памеры перавышэння памераў платы за паслугі ў сферы адукацыі, якія аказваюцца ўстановай адукацыі, над фактычна ўнесенай сумай платы за адпаведныя паслугі ў гэтай установе адукацыі;

2.10. у памеры кошту абавязковых ці пазачарговых медыцынскіх аглядаў работнікаў, якія праводзяцца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, аплачанага ці кампенсаванага за кошт сродкаў арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка;

2.11. у памеры кошту медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца арганізацыямі аховы здароўя ці іншымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць медыцынскую дзейнасць у парадку, устаноўленым заканадаўствам, і ўтрымліваюцца за кошт сродкаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца для такога плацельшчыка месцам асноўнай працы (службы, навучання);

2.12. у памеры кошту паслуг па запрашэнні на працу, пражыванні і рэгістрацыі, аплачаных за кошт сродкаў арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка, калі на

арганізацыю ці індывідуальнага прадпрымальніка ў адпаведнасці з заканадаўствам ускладзены абавязак па выкананні такіх расходаў;

2.13. у памеры кошту навучання, у тым ліку перападрыхтоўкі, прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі, стажыроўкі, звязанага з дзейнасцю, якая ажыццяўляецца плацельшчыкам у арганізацыі ці ў індывідуальнага прадпрымальніка, што з'яўляюцца для яго месцам асноўнай працы (службы, навучання), і аплачанага за кошт сродкаў такой арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка ці за кошт сродкаў бюджэту;

2.14. у памеры аплаты арганізацыяй кошту навучання, у тым ліку прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі, стажыроўкі, члена органа кіравання арганізацыі, члена прафсаюзнай арганізацыі, звязанага адпаведна з дзейнасцю органа кіравання арганізацыі, дзейнасцю прафсаюзнай арганізацыі;

2.15. у выглядзе выплат, якія праводзяцца арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам і кампенсуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прызначаных для пакрыцця расходаў на ліквідацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

2.16. у выглядзе перавышэння памераў платы за карыстанне жылымі памяшканнямі і за жыллёва-камунальныя паслугі, што ўстанаўліваюцца для насельніцтва, якое пражывае ў жылых дамах дзяржаўнага і прыватнага жыллёвых фондаў, над фактычна ўнесенай сумай такой платы з улікам ільгот, устаноўленых заканадаўствам;

2.17. у памеры платы, якая праводзіцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, за карыстанне дадзеным на перыяд праходжання альтэрнатыўнай службы памяшканнем і за жыллёва-камунальныя паслугі;

2.18. у памеры аплаты ці пакрыцця наймальнікам (паднаймальнікам), арандатарам (субарандатарам) жылога і (ці) нежылога памяшканняў кошту жыллёва-камунальных і (ці) іншых паслуг, калі абавязак па аплаце ці пакрыцці такіх паслуг ускладзены на наймальніка (паднаймальніка), арандатара (субарандатара) адпаведным дагаворам найму (паднайму), арэнды (субарэнды) жылога і (ці) нежылога памяшканняў;

2.19. у памеры кошту тавараў (прац, паслуг), раздадзеных (выкананых, аказаных) у рамках правядзення рэкламы і рэкламных акцый, калі па ўмовах іх правядзення адсутнічаюць звесткі аб атрымальніках такіх тавараў (прац, паслуг);

2.20. у памеры сум, атрыманых пад заклад маёмасці ў арганізацыях, у тым ліку ламбардах, і не вернутых у тэрміны, устаноўленыя дагаворам закладу;

2.21. у грашовай ці натуральнай форме ад іншай асобы для выканання яго даручэння па ажыццяўленні якіх-небудзь разлікаў, аплаты на яго карысць ці на карысць трэціх асоб за тавары (працы, паслугі) або па перадачы трэцім асобам атрыманых сродкаў і выкананні абавязацельстваў, у тым ліку падатковых;

2.22. у грашовай ці натуральнай форме як пагашэнне абавязацельстваў па дагаворы пазыкі без уліку працэнтаў, прадугледжаных такім дагаворам (далей – пагашэнне абавязацельстваў у частцы асноўнай сумы доўгу). Пры даванні плацельшчыкам па дагаворы пазыкі грашовых сродкаў у замежнай валюце і пагашэнні абавязацельстваў у частцы асноўнай сумы доўгу ў беларускіх рублях (іншай валюце) памер даходу, які не прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання, вызначаецца шляхам пералічэння сумы перададзеных ці атрыманых па дагаворы пазыкі грашовых сродкаў у замежнай валюце ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату пагашэння абавязацельстваў;

2.23. у памеры кошту агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія аказваюцца бясплатна і фінансуюцца з бюджэту, а таксама за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання;

2.24. у памеры расходаў, аплачаных ці кампенсаваных прымаючым бокам, у тым ліку сутачных, харчавання, пражывання, праезду, пры:

накіраванні ў службовую камандзіроўку;

выкананні функцый члена органа кіравання арганізацыі;

прыцягненні для ўдзелу ў правядзенні веснавых палявых прац, уборцы ўраджаю і нарыхтоўцы кармоў;

2.25. у выглядзе бясплатна дадзеных жылых памяшканняў на ўмовах і ў парадку, устаноўленых заканадаўчымі актамі;

2.26. удзельнікамі дагавора простай суполкі пры вяртанні іх укладаў у агульную справу, а таксама пры размеркаванні прыбытку простай суполкі пасля яго падаткаабкладання;

2.27. у выглядзе сум, якія атрымліваюцца ад здачы ўнаём (паднаём) жылых памяшканняў, уласнікамі (наймальнікамі) якіх з'яўляюцца асобы, абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, па дагаворах найму (паднайму), якія заключаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і пералічваюцца ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца заканадаўствам, на пагашэнне ўказанымі асобамі расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

2.28. у памеры дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, дзяржаўных сацыяльных ільгот і сацыяльнай падтрымкі, якія аказваюцца ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

2.29. ваеннаслужачымі, асобамі радавога і начальніцкага складу Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь (далей – органы фінансавых расследаванняў), органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях (далей у гэтай главе – ваеннаслужачыя), за выключэннем ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, курсантаў устаноў адукацыі, якія рыхтуюць кадры па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) для Узброеных сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, і членамі іх сямей у памеры аплаты за кошт сродкаў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – дзяржаўныя органы, у якіх прадугледжана ваенная служба) праезду і перавозкі ўласнай маёмасці вагой да 10 тон пры пераводзе або звальненні з ваеннай службы, службы ў Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органах унутраных спраў, фінансавых расследаванняў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях (далей у гэтай главе – ваенная служба) у запас (адстаўку) у выпадках, звязаных з пераездам у іншую мясцовасць;

2.30. ваеннаслужачымі, якія займаюць пасады ў органах міждзяржаўных утварэнняў і ў міжнародных арганізацыях, што знаходзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаў, і членамі іх сямей, а таксама курсантамі і слухачамі, магістрантамі, ад'юнктамі, дактарантамі, ардынатарамі, суіскальнікамі (далей – слухачы), якія праходзяць навучанне, не звязанае са службовай камандзіроўкай за мяжу, у арганізацыях замежных дзяржаў па накіраванні дзяржаўных органаў, у якія прадугледжана ваенная служба, у выглядзе пакрыцця адзін раз на год за кошт сродкаў дадзеных дзяржаўных органаў расходаў на праезд чыгуначным

(акрамя спальных вагонаў), паветраным і аўтамабільным транспартам да месца навучання, а таксама ў водпуск да месца жыхарства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і назад;

2.31. асобнымі катэгорыямі ваеннаслужачых, пракурорскіх работнікаў, якія вызначаюцца кіраўнікамі адпаведных дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, і органаў пракуратуры ў памеры кошту праязных дакументаў (білетаў) на праезд усімі відамі транспарту агульнага карыстання (акрамя аўтамабіляў-таксі) у межах Рэспублікі Беларусь, неабходных для выканання службовых абавязкаў і набытых за кошт сродкаў гэтых дзяржаўных органаў;

2.32. ваеннаслужачымі, якія атрымалі раненне (траўму, кантузію), калецтва ці захворванне пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, у перыяд іх амбулаторнага лячэння ў сувязі з гэтым раненнем (траўмай, кантузіяй), калецтвам ці захворваннем у памеры кошту лекавага забеспячэння, якое ажыццяўляецца за кошт сродкаў адпаведных дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў, які зацвярджае Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

2.33. ад ажыццяўлення відаў дзейнасці, у адносінах да якіх у адпаведнасці з гэтым Кодэксам прымяняюцца асаблівыя рэжымы падаткаабкладання;

2.34. у выглядзе кошту дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, што знаходзілася ў рэспубліканскай ці камунальнай уласнасці і бязвыплатна атрымана індывідуальным прадпрымальнікам ва ўласнасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

2.35. у памеры кампенсацыі ці пакрыцця ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ці заканадаўствам замежных дзяржаў судовых расходаў, маральнай шкоды, пакрыцця шкоды ў натуры ці пакрыцця прычыненых страт у межах рэальнага ўрону, у тым ліку праіндэксаваных;

2.36. у выглядзе сум грашовых сродкаў, якія кампенсуюцца банкамі ў выніку здзяйснення аперацый, не санкцыяніраваных трымальнікамі банкаўскіх плацежных картак;

2.37. у выглядзе кошту паляпшэння маёмасці, якая знаходзілася ў карыстанні іншых асоб і вернута яе ўласніку, у выпадках, калі паляпшэнне з’явілася следствам рамонту, правядзенне якога было абумоўлена надзвычайнымі акалічнасцямі (пажар, аварыя, стыхійнае бедства, дарожна-транспартнае здарэнне і іншыя аналагічныя акалічнасці, у тым ліку форс-мажорныя), – пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць факт здзяйснення ўказаных падзей, супастаўнасці іх наступстваў і праведзеных паляпшэнняў;

2.38. у памеры, які не перавышае:

суму ўкладу ў статутны фонд арганізацыі ці суму фактычна праведзеных расходаў на набыццё долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі, – заснавальнікам (удзельнікам) арганізацыі, за выключэннем акцыянернага таварыства, пры яе ліквідацыі, выхадзе (выключэнні) удзельніка са складу ўдзельнікаў арганізацыі, адчужэнні ўдзельнікам долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі;

суму фактычна праведзеных расходаў на набыццё акцый акцыянернага таварыства, – удзельнікам акцыянернага таварыства пры ліквідацыі такога таварыства;

суму ўкладу ў статутны фонд унітарнага прадпрыемства ці суму фактычна праведзеных расходаў на набыццё прадпрыемства як маёмаснага комплексу, – уласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства пры адчужэнні прадпрыемства як маёмаснага комплексу;

суму грашовых сродкаў і (ці) кошт маёмасці (долі ў праве ўласнасці на маёмасць), перададзеных унітарнаму прадпрыемству ў гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне, – уласнікам маёмасці гэтага ўнітарнага прадпрыемства пры адабранні ім у такога прадпрыемства грашовых сродкаў і (ці) маёмасці (долі ў праве ўласнасці на маёмасць).

Пры гэтым сума ўкладу заснавальніка (удзельніка) у статутны фонд арганізацыі, фактычна праведзеныя ім у беларускіх рублях расходы на набыццё долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі, на набыццё акцый акцыянернага таварыства, на набыццё прадпрыемства як маёмаснага комплексу, а таксама грашовыя сродкі ці кошт маёмасці, перададзеныя ўласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства ў гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне такой арганізацыі (далей у гэтым артыкуле – расходы), падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату:

унясення ўкладу ў статутны фонд арганізацыі;

перадачы грашовых сродкаў ці маёмасці ўласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства ў гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне такому прадпрыемству;

фактычнага ажыццяўлення расходаў.

Вызначаныя ў доларах ЗША расходы пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання даходу.

Калі курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўнясення ўзносу (укладу) у статутны фонд арганізацыі, перадачы грашовых сродкаў ці маёмасці ўласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства ў гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне такому прадпрыемству ці на дату фактычнага ажыццяўлення іншых расходаў, большы за курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання заснавальнікам (удзельнікам) арганізацыі, уласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства даходу, то пералік, указаны ў частках другой і трэцяй гэтага падпункта, не праводзіцца.

Расходы, праведзеныя заснавальнікам (удзельнікам) арганізацыі, уласнікам маёмасці ўнітарнага прадпрыемства ў замежнай валюце, падлягаюць пераліку ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання ім даходу.

**Артыкул 197. Даходы, атрыманыя ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь**

1. Да даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, адносяцца:

1.1. дывідэнды і працэнты, атрыманыя ад беларускай арганізацыі, а таксама працэнты, атрыманыя ад беларускага індывідуальнага прадпрымальніка ці замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва;

1.2. страхавое пакрыццё і (ці) забеспячэнне пры надыходзе страхавога выпадку, атрыманыя ад беларускай страхавой арганізацыі і (ці) ад замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва;

1.3. даходы, атрыманыя ад выкарыстання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

1.4. даходы, атрыманыя ад здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) ці іншага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, уключаючы кошт паляпшэння маёмасці, якая знаходзілася ў карыстанні іншых асоб і вернута яе ўласніку;

1.5. даходы, атрыманыя ад адчужэння:

1.5.1. нерухомай маёмасці, у тым ліку прадпрыемства як маёмаснага комплексу (яго часткі), якое знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.5.2. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь акцый ці іншых каштоўных папер, долей заснавальнікаў (удзельнікаў) у статутным фондзе, паёў у маёмасці замежных арганізацый або іх часткі;

1.5.3. акцый ці іншых каштоўных папер, долей заснавальнікаў (удзельнікаў) у статутным фондзе, паёў у маёмасці беларускіх арганізацый або іх часткі;

1.5.4. правоў патрабавання да беларускай арганізацыі ці замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва;

1.5.5. іншай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.6. узнагароды за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў, выкананую працу, аказаную паслугу, здзяйсненне дзеяння (бяздзейнасць), якія атрымліваюцца плацельшчыкамі ад беларускіх арганізацый, беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, адвакатаў, замежных арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, прадстаўніцтваў замежных арганізацый, адкрытых у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, незалежна ад месца, дзе фактычна выконваліся ўскладзеныя на гэтых плацельшчыкаў абавязкі ці адкуль праводзіліся выплаты гэтых узнагарод;

1.7. пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя аналагічныя выплаты, атрыманыя плацельшчыкам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

1.8. даходы, атрыманыя ад выкарыстання любых транспартных сродкаў, марскіх, паветраных суднаў, суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання ў сувязі з перавозкамі ў Рэспубліку Беларусь і (ці) з Рэспублікі Беларусь ці ў яе межах, а таксама штрафы і іншыя санкцыі за прастой (затрымку) такіх транспартных сродкаў і суднаў у пунктах пагрузкі (выгрузкі) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.9. даходы, атрыманыя ад выкарыстання трубаправодаў, ліній электраперадачы, аб'ектаў электрасувязі і іншых сродкаў сувязі, уключаючы камп'ютарныя сеткі, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.10. іншыя даходы, якія атрымлівае плацельшчык ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь.

2. Для мэт гэтай главы не адносяцца да даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, даходы фізічнай асобы, атрыманыя ёй у выніку правядзення знешнегандлёвых аперацый, звязаных з увозам тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і (ці) набыццём тавараў (прац, паслуг) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Палажэнні гэтага пункта прымяняюцца ў выпадку, калі месцам рэалізацыі ўвезеных і (ці) набытых тавараў (прац, паслуг) не прызнаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 198. Даходы, атрыманыя ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь

Да даходаў, атрыманых ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь, адносяцца:

1. дывідэнды і працэнты, атрыманыя ад замежнай арганізацыі (за выключэннем працэнтаў, атрыманых ад замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва), а таксама працэнты, атрыманыя ад замежнага індывідуальнага прадпрымальніка;

2. страхавое пакрыццё і (ці) забеспячэнне пры надыходзе страхавога выпадку, атрыманыя ад замежнай страхавой арганізацыі (за выключэннем замежнай страхавой арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва);

3. даходы, атрыманыя ад выкарыстання за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

4. даходы, атрыманыя ад здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) ці ад іншага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, уключаючы кошт паляпшэння маёмасці, якая знаходзілася ў карыстанні іншых асоб і вернута яе ўласніку;

5. даходы, атрыманыя ад адчужэння:

5.1. нерухомай маёмасці, у тым ліку прадпрыемства як маёмаснага комплексу (яго часткі), якое знаходзіцца за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

5.2. за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь акцый ці іншых каштоўных папер, долей заснавальнікаў (удзельнікаў) у статутным фондзе, паёў у маёмасці замежных арганізацый або іх часткі;

5.3. правоў патрабавання да замежнай арганізацыі (за выключэннем правоў патрабавання да замежнай арганізацыі, якая дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва);

5.4. іншай маёмасці, якая знаходзіцца за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

6. узнагароды за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў, выкананую працу, аказаную паслугу, здзяйсненне дзеяння (бяздзейнасць), якія атрымліваюць плацельшчыкі ад замежных арганізацый (акрамя даходаў, якія атрымліваюцца ад замежных арганізацый, што дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, прадстаўніцтваў замежных арганізацый, адкрытых у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь), замежных індывідуальных прадпрымальнікаў, прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, незалежна ад месца, дзе фактычна выконваліся ўскладзеныя на гэтых плацельшчыкаў абавязкі;

7. пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя аналагічныя выплаты, атрыманыя плацельшчыкам у адпаведнасці з заканадаўствам замежных дзяржаў;

8. даходы, атрыманыя ад выкарыстання любых транспартных сродкаў, марскіх, паветраных суднаў, суднаў унутранага плавання, суднаў змешанага (рака – мора) плавання, а таксама штрафы і іншыя санкцыі за прастой (затрымку) такіх транспартных сродкаў у пунктах пагрузкі (выгрузкі), за выключэннем даходаў, прадугледжаных падпунктам 1.8 пункта 1 артыкула 197 гэтага Кодэкса;

9. іншыя даходы, якія атрымлівае плацельшчык ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 199. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб

1. Пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб улічваюцца ўсе даходы плацельшчыка, атрыманыя ім як у грашовай, так і ў натуральнай формах.

Калі з даходу плацельшчыка па яго распараджэнні, па рашэнні суда ці іншых органаў праводзяцца якія-небудзь утрыманні, такія ўтрыманні не змяншаюць падатковую базу падаходнага падатку з фізічных асоб.

2. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца асобна па кожным відзе даходаў, у адносінах да якіх устаноўлены розныя падатковыя стаўкі.

3. Для даходаў, у адносінах да якіх стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб устаноўлены пунктам 1 артыкула 214 гэтага Кодэкса і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца за кожны каляндарны месяц падатковага перыяду як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, зменшаных на суму падатковых вылікаў, якія прымяняюцца паслядоўна ў адпаведнасці з артыкуламі 209–212 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

Пры гэтым падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі, фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, па дагаворах давернага кіравання грашовымі сродкамі і ад удзелу ў фондах банкаўскага кіравання вызначаецца асобна ад іншых відаў даходаў, якія выплачваюцца плацельшчыку па месцы асноўнай працы.

4. Для даходаў, у адносінах да якіх стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб установлены падпунктам 3.1 пункта 3 артыкула 214 гэтага Кодэкса і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, зменшаных на суму расходаў, прадугледжаных артыкулам 205 гэтага Кодэкса, і на суму падатковых вылікаў, якія прымяняюцца паслядоўна ў адпаведнасці з артыкуламі 209–211 гэтага Кодэкса.

5. Для даходаў, указаных у частцы першай пункта 2 артыкула 224 гэтага Кодэкса, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца за кожны каляндарны месяц падатковага перыяду як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, зменшаных на суму падатковых вылікаў, якія прымяняюцца ў адпаведнасці з артыкулам 209 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, установленых гэтай главой.

6. Для даходаў, у адносінах да якіх стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб установлены пунктам 2 артыкула 214 гэтага Кодэкса, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню. Пры гэтым падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкуламі 209–211 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

7. Для даходаў, у адносінах да якіх стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб установлена пунктам 4 артыкула 214 гэтага Кодэкса, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню. Пры гэтым падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкуламі 209–211 гэтага Кодэкса, і вызваленне ад падаходнага падатку з фізічных асоб, прадугледжанае часткай першай пункта 23 артыкула 208 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

8. Для даходаў, вылічаных у адпаведнасці з заканадаўствам падатковым органам зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як грашовае выражэнне сумы такога перавышэння. Пры гэтым падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкуламі 209–212 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

9. Для даходаў у выглядзе працэнтаў па ашчадных сертыфікатах, банкаўскіх укладах (дэпазітах), грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку ў банках, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца асобна ад іншых даходаў плацельшчыка як грашовае выражэнне такіх даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, зменшаных на суму падатковых вылікаў, установленых артыкуламі 210 і 211 гэтага Кодэкса. Пры гэтым падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкулам 209 гэтага Кодэкса, і вызваленне ад падаходнага падатку з фізічных асоб, прадугледжанае пунктам 23 артыкула 208 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

10. Для даходаў у выглядзе дывідэндаў, якія выплачвае беларуская арганізацыя, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца ў парадку, установленым пунктам 6 артыкула 182 гэтага Кодэкса і пунктам 3 гэтага артыкула.

11. Даходы плацельшчыка, атрыманыя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, установленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання даходаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам.

У выпадку атрымання індывідуальным прадпрымальнікам у замежнай валюце папярэдняй аплаты, авансу, задатку пералічванне замежнай валюты ў беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, установленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на:

дату атрымання папярэдняй аплаты, авансу, задатку, – у частцы кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, роўнай суме папярэдняй аплаты, авансу, задатку;

дату фактычнага атрымання даходу ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у астатняй частцы кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Расходы плацельшчыка, праведзеныя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага ажыццяўлення расходаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой.

У выпадку пералічэння індывідуальным прадпрымальнікам папярэдняй аплаты, авансу, задатку пералічванне замежнай валюты ў беларускія рублі праводзіцца па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на:

дату пералічэння папярэдняй аплаты, авансу, задатку, – у частцы расходаў, роўных суме папярэдняй аплаты, авансу, задатку;

дату прызнання расходаў, якая вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 205 гэтага Кодэкса, – у астатняй частцы расходаў.

12. Для даходаў, у адносінах да якіх стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб устаноўлены падпунктам 3.3 пункта 3 артыкула 214 гэтага Кодэкса, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як грашовае выражэнне такіх даходаў. Пры гэтым не прымяняюцца падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкуламі 209–211 гэтага Кодэкса, і не ўлічваюцца расходы, прадугледжаныя артыкулам 205 гэтага Кодэкса.

## Артыкул 200. Асаблівасці вызначэння падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб пры атрыманні даходаў у натуральнай форме

1. Пры атрыманні плацельшчыкам ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў даходу ў натуральнай форме ў выглядзе тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца як кошт (з улікам падатку на дабаўленую вартасць, а для падакцызных тавараў – і акцызаў) гэтых тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці, вылічаны зыходзячы з рэгуляваных цэн (тарыфаў). Пры адсутнасці такіх цэн (тарыфаў) падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі самастойна (з улікам падатку на дабаўленую вартасць, а для падакцызных тавараў – і акцызаў), але павінна быць не меншая, чым кошт тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці, вызначаны ў адпаведнасці з часткай другой гэтага пункта.

Пры атрыманні плацельшчыкам ад фізічных асоб даходу ў натуральнай форме ў выглядзе тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці па дагаворах, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца ў адносінах да:

капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, машына-месцаў, долей у праве ўласнасці на ўказаную маёмасць – у памеры ацэначнага кошту, вызначанага на дату атрымання даходу тэрытарыяльнымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. Пры адсутнасці такога кошту – у памеры кошту, вызначанага ў парадку, устаноўленым заканадаўствам для вылічэння падатку на нерухомасць з фізічных асоб;

акцый – у памеры іх намінальнага кошту;

долей у статутных фондах арганізацый – у памеры часткі кошту чыстых актываў арганізацыі, прапарцыянальнай памеру долі фізічнай асобы ў статутным фондзе арганізацыі;

паёў у вытворчых кааператывах – у памеры кошту паю;

прадпрыемства як маёмаснага комплексу – па балансавым кошце маёмасці прадпрыемства;

зямельных участкаў – па іх кадастравым кошце;

іншых тавараў (прац, паслуг), маёмасці – па цане (тарыфе) на ідэнтычныя тавары (працы, паслугі), маёмасць на падставе звестак вытворцаў, выканаўцаў, суб'ектаў гандлю аб цэнах (тарыфах) на тавары (працы, паслугі), маёмасць, якія змяшчаюцца ў спецыяльных айчынных і замежных даведніках, каталогах, перыядычных выданнях, інфармацыйных матэрыялах суб'ектаў гандлю (у тым ліку размешчаных на сайтах у сетцы Інтэрнэт). Пры наяўнасці дзвюх і больш крыніц інфармацыі, якія змяшчаюць звесткі аб цэнах (тарыфах) на ідэнтычныя тавары (працы, паслугі), маёмасць, падатковая база вызначаецца зыходзячы са звестак аб найменшай цане (тарыфе).

У выпадку адсутнасці ва ўказаных крыніцах інфармацыі аб цане (тарыфе) на ідэнтычныя тавары (працы, паслугі), маёмасць падатковая база вызначаецца па цане (тарыфе) на аднародныя тавары (працы, паслугі), маёмасць.

Пры вызначэнні цэн (тарыфаў) на ідэнтычныя ці аднародныя тавары (працы, паслугі), маёмасць прымаюцца пад увагу здзелкі, якія прадугледжваюць грашовую форму выканання абавязацельстваў, паміж асобамі, якія не з'яўляюцца ўзаемазалежнымі. Здзелкі паміж узаемазалежнымі асобамі могуць прымацца ва ўвагу толькі ў тых выпадках, калі наяўнасць адносін паміж гэтымі асобамі не паўплывала на ўмовы такіх здзелак.

2. Да даходаў, атрыманых плацельшчыкам у натуральнай форме, у тым ліку адносяцца:

2.1. аплата (поўнасцю ці часткова) за яго арганізацыямі ці фізічнымі асобамі тавараў (прац, паслуг), маёмасці ці маёмасных правоў, у тым ліку жыллёва-камунальных паслуг, харчавання, адпачынку, навучання ў інтарэсах плацельшчыка;

2.2. атрыманыя плацельшчыкам тавары, выкананыя ў яго інтарэсах працы, аказаныя паслугі на бязвыплатнай аснове;

2.3. аплата працы ў натуральнай форме.

**Артыкул 201. Асаблівасці вызначэння падатковай базы па даходах, атрыманых па дагаворах страхавання**

1. Пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб не ўлічваюцца даходы, атрыманыя ў выглядзе:

1.1. страхавога пакрыцця і (ці) страхавога забеспячэння ў сувязі з надыходам адпаведных страхавых выпадкаў:

1.1.1. па дагаворах абавязковага страхавання, якое ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.1.2. па дагаворах добраахвотнага страхавання, па якіх страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі) уносіліся плацельшчыкам і іншымі фізічнымі асобамі;

1.1.3. па дагаворах страхавання, па якіх аплата ўзносаў за плацельшчыка ажыццяўлялася за кошт сродкаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прызнаюцца падатковымі агентамі;

1.1.4. па дагаворах добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і хвароб на час паездкі за мяжу, добраахвотнага доўгатэрміновага (на тэрмін, не меншы за тры гады) страхавання жыцця, добраахвотнага доўгатэрміновага (на тэрмін, не меншы за тры гады) страхавання дадатковых пенсій, а таксама па дагаворах добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў (калі такія дагаворы заключаны на тэрмін, не меншы за адзін год);

1.1.5. па дагаворах страхавання, заключаных за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць страхавыя выплаты як пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю, здароўю ці маёмасці фізічнай асобы, атрыманыя пацярпелай асобай і (ці) асобамі,

якія знаходзяцца з ёй у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага;

1.1.6. па дагаворах добраахвотнага страхавання адказнасці за прычыненне шкоды (у выпадку прычынення шкоды жыццю, здароўю ці маёмасці фізічнай асобы асобай, чыя адказнасць застрахавана);

1.2. часткі даходу ад ажыццяўлення інвестыцый страхоўшчыкам, які выплачваецца ў дапаўненне да страхавой выплаты па дагаворах страхавання жыцця і дагаворах страхавання дадатковых пенсій;

1.3. кампенсаваных страхоўшчыкамі расходаў плацельшчыка-страхавальніка, праведзеных у сувязі з расследаваннем акалічнасцей надыходу страхавога выпадку, вызначэннем памераў шкоды, судовых расходаў, а таксама іншых расходаў, праведзеных у адпаведнасці з заканадаўствам і ўмовамі дагавораў страхавання;

1.4. страхавых узносаў (страхавых прэмій), аплачаных за кошт сродкаў наймальнікаў:

па дагаворах добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і хвароб на час паездкі работніка за мяжу пры накіраванні яго ў службовую камандзіроўку. Палажэнні гэтага абзаца прымяняюцца таксама ў адносінах да дагавораў добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і хвароб на час паездкі за мяжу, якія заключаюцца на карысць работнікаў, праца якіх мае рухомы і раз'язны характар;

па дагаворах абавязковага страхавання.

2. Сумы страхавых узносаў (страхавых прэмій), унесеных за плацельшчыкаў арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія прызнаюцца падатковымі агентамі, па дагаворах страхавання, падлягаюць падаткаабкладанню ў парадку, устаноўленым артыкулам 216 гэтага Кодэкса, а сумы страхавых узносаў (страхавых прэмій), унесеных за плацельшчыкаў іншымі фізічнымі асобамі, – у парадку, устаноўленым артыкулам 219 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 202. Асаблівасці вызначэння падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак**

1. Пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак улічваюцца падлеглыя падаткаабкладанню даходы, атрыманыя па такіх аперацыях.

2. Даходамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі прызнаюцца:

даходы ад рэалізацыі, пагашэння каштоўных папер;

даходы ў выглядзе працэнта (купона, дысконту), атрыманыя па каштоўных паперах.

Даходамі па аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак прызнаюцца даходы ад рэалізацыі фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак і іншыя даходы па іх, у тым ліку атрыманыя сумы варыяцыйнай маржы і прэмій.

Даходамі па аперацыях з базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак прызнаюцца даходы, атрыманыя ад пастаўкі базіснага актыву пры выкананні такіх здзелак.

3. Даходы па аперацыях з базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак уключаюцца:

у даходы па аперацыях з каштоўнымі паперамі, калі базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак з'яўляюцца каштоўныя паперы;

у даходы па аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, калі базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак з'яўляюцца іншыя фінансавыя інструменты тэрміновых здзелак;

у іншыя даходы плацельшчыка, калі базісным актывам фінансавага інструменту тэрміновых здзелак не з'яўляюцца каштоўныя паперы ці фінансавыя інструменты тэрміновых здзелак.

4. Расходамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак прызнаюцца фактычна праведзеныя і дакументальна пацверджаныя расходы, звязаныя:

з набыццём, рэалізацыяй, пагашэннем і захоўваннем каштоўных папер;

са здзяйсненнем аперацый з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак;

з выкананнем і спыненнем абавязацельстваў па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак.

Да такіх расходаў адносяцца:

сумы, якія выплачваюцца эмітэнту каштоўных папер як аплата размешчаных (выдадзеных) каштоўных папер;

сумы, якія выплачваюцца па здзелках з каштоўнымі паперамі, у тым ліку накіраваныя на набыццё такіх папер;

перыядычныя ці разавыя выплаты, прадугледжаныя ўмовамі фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, у тым ліку заплачаныя сумы варыяцыйнай маржы і прэмій;

аплата паслуг, якія аказваюцца прафесійнымі ўдзельнікамі рынку каштоўных папер, а таксама пакрыццё панесеных імі расходаў, у тым ліку камісійная ўзнагарода, аплата паслуг дэпазітарыяў, аперацый па рэгістрацыі пакупніка (прадаўца) на біржы з прысваеннем яму ўнікальнага рэгістрацыйнага кода, паслуг па рэзерваванні грашовых і іншых сродкаў забеспячэння выканання біржавых здзелак пры набыцці каштоўных папер і фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, пакрыццё біржавога збору;

іншыя расходы, непасрэдна звязаныя з аперацыямі з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак.

Сумы, заплачаныя плацельшчыкам за набыццё базіснага актыву фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, у тым ліку для яго пастаўкі пры выкананні такога інструменту, прызнаюцца расходамі пры пастаўцы (наступнай рэалізацыі) базіснага актыву.

Калі каштоўныя паперы былі набыты ва ўласнасць на бязвыплатнай аснове ці з частковай аплатай, то пры падаткаабкладанні даходаў па аперацыях па рэалізацыі, пагашэнні каштоўных папер у склад дакументальна пацверджаных расходаў на набыццё гэтых каштоўных папер таксама ўключаюцца сумы, з якіх быў вылічаны і аплачаны падаходны падатак з фізічных асоб пры набыцці такіх каштоўных папер, а таксама сумы, не падлеглыя падаткаабкладанню, якія не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання ў адпаведнасці з дзейным на момант набыцця гэтых каштоўных папер заканадаўствам.

Калі расходы плацельшчыка на набыццё, рэалізацыю, пагашэнне і захоўванне каштоўных папер не могуць быць аднесены непасрэдна да расходаў на набыццё, рэалізацыю, пагашэнне і захоўванне канкрэтных каштоўных папер, то ўказаныя расходы размяркоўваюцца прапарцыянальна долі вартаснай ацэнкі адпаведных каштоўных папер у агульнай вартаснай ацэнцы каштоўных папер. Пры гэтым вартасная ацэнка каштоўных папер вызначаецца зыходзячы з цаны набыцця такіх каштоўных папер.

5. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі па даходах, атрыманых плацельшчыкам ад беларускай арганізацыі ці беларускага індывідуальнага прадпрымальніка, вызначаецца як грашовае выражэнне даходаў, атрыманых па аперацыях з каштоўнымі паперамі, зменшаных на суму фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў на набыццё, рэалізацыю, пагашэнне і захоўванне гэтых каштоўных папер.

Пры гэтым дакументальна пацверджаныя расходы на набыццё каштоўных папер, праведзеныя ў беларускіх рублях, падлягаюць пераліку ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень ажыццяўлення такіх расходаў. Вызначаныя ў доларах ЗША расходы пералічваюцца ў беларускія рублі па

афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання плацельшчыкам даходаў па аперацыях па рэалізацыі, пагашэнні такіх каштоўных папер.

Калі курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень ажыццяўлення расходаў на набыццё каштоўных папер, большы за курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень атрымання плацельшчыкам даходаў па аперацыях па рэалізацыі, пагашэнні такіх каштоўных папер, то ўказаны ў частцы другой гэтага пункта пералік не праводзіцца.

Па выбары плацельшчыка замест фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў на набыццё, рэалізацыю, пагашэнне і захоўванне каштоўных папер падатковая база па падаходным падатку з фізічных асоб можа быць зменшана на падатковы вылік у памеры 20 працэнтаў даходаў, атрыманых па аперацыях з каштоўнымі паперамі. Пры гэтым расходы, пацверджаныя дакументальна, не могуць улічвацца адначасова з прымяненнем такога выліку.

6. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак па дагаворах, заключаных з беларускімі арганізацыямі, беларускімі індывідуальнымі прадпрымальнікамі, вызначаецца як грашовае выражэнне даходаў, атрыманых па аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, зменшаных на суму фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў на аперацыі з фінансавымі інструментамі тэрміновыя здзелкі.

7. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, якія ажыццяўляюцца даверным кіраўніком, вызначаецца асобна па кожным дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі ў парадку, устаноўленым пунктамі 1–6 гэтага артыкула, з улікам наступных асаблівасцей:

у расходы плацельшчыка ўключаюцца таксама сумы, заплачаныя даручальнікам і (ці) выгаданабытчыкам давернаму кіраўніку ў выглядзе ўзнагароды і кампенсацыі праведзеных ім расходаў, ажыццёўленых па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак;

у выпадку, калі пры ажыццяўленні давернага кіравання ажыццяўляюцца аперацыі з каштоўнымі паперамі, а таксама ўзнікаюць іншыя віды даходаў, падатковая база вызначаецца асобна па кожным відзе даходу. Пры гэтым расходы, якія не могуць быць непасрэдна аднесены на змяншэнне даходу па аперацыях з каштоўнымі паперамі ці на змяншэнне адпаведнага віду даходу, размяркоўваюцца прапарцыянальна долі кожнага віду даходу ў агульнай суме даходаў пры даверным кіраванні.

8. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак па дагаворах, заключаных з замежнай арганізацыяй (за выключэннем замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва) ці замежным індывідуальным прадпрымальнікам (далей у гэтым артыкуле – замежная арганізацыя), вызначаецца як грашовае выражэнне даходаў ад аперацый з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, зменшаных на суму фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў у памеры:

кошту набыцця каштоўных папер, перададзеных плацельшчыкам замежнай арганізацыі на падставе заключанага з такой арганізацыяй дагавора;

грашовых сродкаў, перададзеных плацельшчыкам замежнай арганізацыі для ажыццяўлення ў адпаведнасці з дагаворам аперацый з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак.

Пры гэтым падатковая база па падаходным падатку з фізічных асоб вызначаецца на дату фактычнай выплаты даходу замежнай арганізацыяй плацельшчыку асобна па кожным дагаворы, заключаным з такой арганізацыяй, і па ўсёй сукупнасці аперацый, здзейсненых у рамках такога дагавора.

Калі ў падатковым перыядзе пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб расходы не ўлічваліся ці былі ўлічаны не поўнасцю, то нявыкарыстаная сума расходаў пераносіцца на наступныя падатковыя перыяды да поўнага яе выкарыстання.

Пры атрыманні плацельшчыкам ад замежнай арганізацыі даходу ў выглядзе каштоўных папер, набытых на падставе заключанага дагавора, памер даходу вызначаецца як кошт перададзеных каштоўных папер, указаны ў дакументах ці інфармацыі, дадзеных плацельшчыку замежнай арганізацыяй.

Пры адсутнасці ў плацельшчыка ўказаных дакументаў ці інфармацыі аб кошце каштоўных папер памер атрыманага даходу вызначаецца як рыначны кошт каштоўных папер, які склаўся на дзень іх перадачы плацельшчыку ці па яго даручэнні трэцім асобам. Пры наяўнасці дзвюх і больш крыніц інфармацыі, якія змяшчаюць звесткі аб рыначным кошце каштоўных папер, памер даходу вызначаецца зыходзячы з мінімальнага рыначнага кошту такіх каштоўных папер.

Інфармацыя падатковага органа аб памеры рыначнага кошту каштоўных папер, з якога быў аплачаны падаходны падатак з фізічных асоб, прызнаецца дакументам, які пацвярджае расходы плацельшчыка на набыццё такіх каштоўных папер.

9. Расходы, указаныя ў пунктах 5–8 гэтага артыкула, улічваюцца на дату выплаты даходу плацельшчыку:

на працягу падатковага перыяду – падатковым агентам;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковым органам пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, якія падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з артыкулам 219 гэтага Кодэкса.

10. Дакументальна пацверджаныя расходы, праведзеныя ў замежнай валюце, падлягаюць пераліку ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання плацельшчыкам даходаў.

**Артыкул 203. Асаблівасці вызначэння падатковай базы пры атрыманні даходаў па аперацыях давернага кіравання грашовымі сродкамі**

1. Для мэт гэтага артыкула плацельшчыкам падаходнага падатку з фізічных асоб прызнаецца фізічная асоба, якая выступае ў якасці даручальніка і (ці) выгаданабытчыка па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і атрымала даход у адпаведнасці з такім дагаворам.

2. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па даходах, атрыманых плацельшчыкам па аперацыях давернага кіравання грашовымі сродкамі, вызначаецца асобна па кожным дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і ўяўляе сабой даход у выглядзе прыбытку, атрыманага па такім дагаворы ў суме, вызначанай даверным кіраўніком на аснове даных бухгалтарскага ўліку аперацый давернага кіравання ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, якая выплачваецца плацельшчыку.

Пры гэтым падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб па даходах, атрыманых плацельшчыкам па аперацыях давернага кіравання грашовымі сродкамі, змяншаецца на суму фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, кампенсаваных (панесеных) даручальнікам і (ці) выгаданабытчыкам і звязаных з аперацыямі, якія здзяйсняе даверны кіраўнік па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі.

Дакументальна пацверджаныя расходы, праведзеныя ў замежнай валюце, падлягаюць пераліку ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання плацельшчыкам даходаў па аперацыях давернага кіравання грашовымі сродкамі.

Дакументы, якія пацвярджаюць фактычна праведзеныя даручальнікам і (ці) выгаданабытчыкам расходы, павінны змяшчаць інфармацыю аб прозвішчы, уласным імені, імені па бацьку (калі гэтакае ёсць) даручальніка і (ці) выгаданабытчыка, суме і даце аплаты, прызначэнні плацяжу, калі такія патрабаванні прадугледжаны заканадаўствам, якое рэгулюе парадак афармлення ўказаных дакументаў. У выпадку, калі дакументы не змяшчаюць гэтых рэквізітаў, да іх дадаецца інфармацыя атрымальніка плацяжу, якая змяшчае адсутныя звесткі.

Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца на дату фактычнай выплаты даходу плацельшчыку даверным кіраўніком па аперацыях давернага кіравання грашовымі сродкамі.

3. Пры перадачы даверным кіраўніком плацельшчыку каштоўных папер, набытых па дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі, гэты даверны кіраўнік абавязаны выдаць пісьмовае пацвярджэнне аб перадачы плацельшчыку такіх каштоўных папер з указаннем даты выбыцця каштоўных папер, іх колькасці і балансавага кошту, вызначанага на дату выбыцця.

Такое пісьмовае пацвярджэнне з'яўляецца дакументам, які пацвярджае фактычна праведзеныя і дакументальна пацверджаныя расходы, праведзеныя плацельшчыкам пры набыцці такіх каштоўных папер.

4. Пры атрыманні даходаў па дагаворах давернага кіравання грашовымі сродкамі, заключаных плацельшчыкам з даверным кіраўніком – замежнай арганізацыяй (за выключэннем замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва), падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб вызначаецца ў парадку, устаноўленым пунктам 8 артыкула 202 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 204. Асаблівасці вызначэння падатковай базы пры атрыманні даходаў ад удзелу ў фондах банкаўскага кіравання**

1. Для мэт гэтага артыкула плацельшчыкам падаходнага падатку з фізічных асоб прызнаецца фізічная асоба, якая выступае ў якасці даручальніка і (ці) выгаданабытчыка па дагаворы давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання і атрымала даход у адпаведнасці з такім дагаворам.

2. Падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб ад удзелу ў фондзе банкаўскага кіравання вызначаецца як розніца паміж даходам плацельшчыка ад удзелу ў фондзе банкаўскага кіравання і фактычна праведзенымі і дакументальна пацверджанымі расходамі даручальніка і (ці) выгаданабытчыка, звязанымі з удзелам такой асобы ў фондзе банкаўскага кіравання.

Даходам фізічнай асобы ад удзелу ў фондзе банкаўскага кіравання прызнаецца кошт долі фізічнай асобы ў маёмасці фонду на дату выкупу (датэрміновага выкупу) долевага сертыфіката (яе долі) даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання, разлічаны ў парадку, вызначаным дагаворам давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання.

Да расходаў, звязаных з удзелам фізічнай асобы ў фондзе банкаўскага кіравання, адносяцца:

кошт долі, якая выкупляецца, фізічнай асобы ў маёмасці фонду банкаўскага кіравання на дату перадачы грашовых сродкаў і (ці) каштоўных папер у фонд банкаўскага кіравання;

сума грашовых сродкаў, утрыманых на карысць фонду банкаўскага кіравання пры датэрміновым выкупе даверным кіраўніком фондам банкаўскага кіравання долевага сертыфіката (яе долі).

Дакументальна пацверджаныя расходы фізічнай асобы ад удзелу ў фондзе банкаўскага кіравання, праведзеныя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату выплаты даходаў ад удзелу ў фондзе банкаўскага кіравання.

**Артыкул 205. Асаблівасці вызначэння падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна**

1. Пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб у адносінах да даходаў, атрыманых ад прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, улічваюцца даходы, атрыманыя ад ажыццяўлення такой дзейнасці.

2. Даходамі індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, адвакатаў ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна прызнаюцца:

выручка, атрыманая ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтым артыкуле – даходы ад рэалізацыі), зменшаная на суму падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі;

пазарэалізацыйныя даходы, зменшаныя на суму падаткаў і збораў, якія вылічваюцца з выручкі.

3. Даходы ад рэалізацыі ўлічваюцца:

3.1. індывідуальнымі прадпрымальнікамі па іх выбары:

па меры аплаты адгружаных тавараў, выкананых прац, аказаных паслуг, перададзеных маёмасных правоў (далей у гэтай главе – прынцып аплаты);

па меры адгрузкі тавараў, выканання прац, аказання паслуг, перадачы маёмасных правоў незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх (далей у гэтай главе – прынцып налічэння).

Выбраны індывідуальным прадпрымальнікам прынцып уліку даходаў ад рэалізацыі ўстанаўліваецца пісьмовым рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка па ўсіх аперацыях па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і змяненню на працягу падатковага перыяду не падлягае;

3.2. натарыусамі і адвакатамі – па прынцыпе аплаты.

4. Да даходаў ад рэалізацыі адносяцца:

4.1. выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

4.2. даходы па аперацыях з каштоўнымі паперамі і аперацыях з фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 202 гэтага Кодэкса;

4.3. кошт тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, атрыманых у натуральнай форме за рэалізаваныя тавары (за выключэннем атрыманых у рамках выканання тавараабменных дагавораў), выкананыя працы, аказаныя паслугі, перададзеныя маёмасныя правы;

4.4. кошт (уліковая цана) адгружаных індывідуальным прадпрымальнікам тавараў у рамках выканання тавараабменных дагавораў;

4.5. кошт адгружаных індывідуальным прадпрымальнікам тавараў, выкананых прац, аказаных паслуг, перададзеных маёмасных правоў пры спыненні абавязацельства перад індывідуальным прадпрымальнікам па выплаце (выдачы) яму даходу, у тым ліку ў выніку даравання доўгу, уступкі індывідуальным прадпрымальнікам права патрабавання іншай асобе, за выключэннем спынення абавязацельства ў выніку прызнання запазычанасці немагчымай (нерэальнай) для спагнання. Немагчымай (нерэальнай) для спагнання

запазычанасцю прызнаецца запазычанасць перад індывідуальным прадпрымальнікам ліквідаваных юрыдычных асоб і спыніўшых дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў, у адносінах да якіх у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў змяшчаецца запіс аб іх выключэнні з яго;

4.6. кошт выбылых тавараў (звыш нормаў натуральнага змяншэння), асноўных сродкаў, маёмасных правоў на іншых падставах, не звязаных з выбыццём у выніку рэалізацыі, абмену і бязвыплатнай перадачы, а таксама ў сувязі з надзвычайнымі акалічнасцямі (пажар, аварыя, стыхійнае бедства, дарожна-транспартнае здарэнне і іншыя аналагічныя акалічнасці, у тым ліку форс-мажорныя);

4.7. іншыя даходы, звязаныя з рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

5. У даходы ад рэалізацыі ўключаюцца даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у перыядзе, у якім індывідуальны прадпрымальнік прызнаваўся плацельшчыкам падаходнага падатку з фізічных асоб.

6. Даходы ад рэалізацыі вызначаюцца зыходзячы з агульнага кошту рэалізаваных тавараў, выкананых прац, аказаных паслуг, перададзеных маёмасных правоў з улікам наступных асаблівасцей:

6.1. даход ад рэалізацыі камітэнта (даверніка) пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах вызначаецца як кошт рэалізаваных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў з улікам сумы ўзнагароды камісіянера (даверніка), утрыманай камісіянерам (давернікам) з сумы грашовых сродкаў, атрыманых ад выканання такіх дагавораў;

6.2. даходы ад ажыццяўлення пасрэдніцкай дзейнасці вызначаюцца ў камісіянера, паверанага і іншай аналагічнай асобы як сума ўзнагароды па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах, а таксама дадатковай выгады;

6.3. даходы, атрыманыя ад аказання даручальніку (выгаданабытчыку) паслуг па даверным кіраванні маёмасцю, вызначаюцца як сума атрыманай (належнай да атрымання) даверным кіраўніком узнагароды па дагаворы давернага кіравання маёмасцю;

6.4. даходы ад аказання паслуг транспартнай экспедыцыі вызначаюцца ў экспедытара як сума ўзнагароды па дагаворах транспартнай экспедыцыі, а таксама дадатковай выгады;

6.5. даходы, атрыманыя пры іншым выбыцці тавараў, указаных у падпункце 4.6 пункта 4 гэтага артыкула, на якія заканадаўствам устаноўлены рэгуляваныя цэны, вызначаюцца як розніца паміж рознічнай і адпускной цэнамі (або цаной набыцця) гэтых тавараў. Пры адсутнасці рэгуляваных рознічных цэн даходы вызначаюцца як розніца паміж цэнамі (максімальнымі рознічнымі цэнамі) на ідэнтычныя тавары і адпускнымі цэнамі (або цэнамі набыцця) гэтых тавараў;

6.6. даход натарыусаў вызначаецца як натарыяльны тарыф, які збіраецца натарыусамі за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў і аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару;

6.7. даходы, атрыманыя ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці (крыніц) за межамі Рэспублікі Беларусь, прымаюцца ў памеры да ўтрымання (выплаты) падаткаў (збораў, адлічэнняў) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы.

7. У выпадках вяртання тавараў (адмовы ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці суразмернага змяншэння цаны тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў даход ад рэалізацыі змяншаецца ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены вяртанне тавараў (адмова ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці суразмернае змяншэнне цаны тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Палажэнні часткі першай гэтага падпункта не прымяняюцца пры вяртанні тавараў (адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг), маёмасных правоў ці змяншэнні кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі даход ад рэалізацыі такіх тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў:

вызвалены ад падаходнага падатку з фізічных асоб;

абкладаецца падаходным падаткам з фізічных асоб па паніжанай стаўцы;

не ўлічваўся пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб у сувязі з прымяненнем асаблівага рэжыму падаткаабкладання.

8. Пазарэалізацыйнымі даходамі прызнаюцца даходы, атрыманыя ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

9. Да пазарэалізацыйных даходаў адносяцца:

9.1. сумы няўстоек (штрафаў, пеняў), сумы, атрыманыя (належныя да атрымання) у выніку прымянення іншых мер адказнасці, у тым ліку ў выніку пакрыцця страт, за парушэнне дагаворных абавязацельстваў, а таксама паступленні ў кошт пакрыцця шкоды ў натуры, страт, у тым ліку ўпушчанай выгады, не звязаныя з парушэннем дагаворных абавязацельстваў, у памерах, якія перавышаюць памеры шкоды ў натуры ці страт, у тым ліку ўпушчанай выгады;

9.2. даходы ў выглядзе працэнтаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку ў банках, што выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна;

9.3. станоўчыя розніцы, якія ўзнікаюць пры пераацэнцы маёмасці (грашовых сродкаў на валютных рахунках у банках, у касах) у замежнай валюце пры змяненні Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь курсаў замежных валют на дату здзяйснення аперацыі;

9.4. даходы ад продажу замежнай валюты ў суме станоўчай розніцы, якія ўтварыліся з прычыны адхілення курсу продажу замежнай валюты ад афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату продажу;

9.5. даходы ад абмену аднаго віду замежнай валюты на іншы від замежнай валюты (канверсія замежнай валюты) у выглядзе станоўчай розніцы паміж сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курсу набытай замежнай валюты і яе колькасці, і сумай, атрыманай як здабытак устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату канверсіі афіцыйнага курсу рэалізаванай замежнай валюты і яе колькасці;

9.6. даходы ад аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці;

9.7. кошт лішкаў маёмасці, выяўленых пры інвентарызацыі;

9.8. кошт маёмасці, атрыманай на зваротнай ці ўмоўна зваротнай аснове (у тым ліку ў адпаведнасці з дагаворамі пазыкі, задатку), не вернутай ва ўстаноўлены тэрмін ці пры спыненні прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, а таксама маёмасці, атрыманай на іншых умовах, пры наяўнасці не выкананых плацельшчыкам абавязацельстваў пасля сканчэння тэрмінаў іскавай даўнасці ці пры спыненні прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна.

Пры вяртанні такой маёмасці пазарэалізацыйныя даходы змяншаюцца на кошт вернутай маёмасці ў тым справаздачным перыядзе, у якім кошт гэтай маёмасці быў уключаны ў склад пазарэалізацыйных даходаў;

9.9. станоўчая розніца, якая ўзнікае паміж коштам маёмасці, атрыманай (перададзенай) у пазыку, і коштам маёмасці, перададзенай (атрыманай) пры пагашэнні гэтай пазыкі. Кошт атрыманай (перададзенай) маёмасці па дагаворы пазыкі вызначаецца з улікам палажэнняў артыкула 200 гэтага Кодэкса;

9.10. сума бязвыплатна атрыманых грашовых сродкаў, кошт бязвыплатна атрыманых тавараў, маёмасных правоў, прац (паслуг), выкананых (аказаных) на бязвыплатнай аснове ў інтарэсах індывідуальнага прадпрымальніка, натарыуса, адваката;

9.11. сродкі, якія бязвыплатна паступілі ў рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага ці мясцовага бюджэтаў або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, бюджэту Саюзнай дзяржавы ў справаздачных перыядах, якія ідуць следам за перыядамі, у якіх расходы, пакрытыя такімі сродкамі, былі ўлічаны пры падаткаабкладанні;

9.12. іншыя даходы, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

10. Індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія плацяць падаходны падатак з фізічных асоб разам з прымяненнем асаблівых рэжымаў падаткаабкладання, якія не прадугледжваюць выплату падаходнага падатку з фізічных асоб, пазарэалізацыйныя даходы, якія абкладаюцца падаходным падаткам з фізічных асоб (пры немагчымасці іх аднясення да канкрэтнага рэжыму падаткаабкладання), вызначаюцца зыходзячы з долі даходаў ад рэалізацыі, якія абкладаюцца падаходным падаткам з фізічных асоб, у агульнай суме даходаў такіх індывідуальных прадпрымальнікаў у адпаведным падатковым перыядзе.

11. Да даходаў ад рэалізацыі і пазарэалізацыйных даходаў не адносяцца:

11.1. сумы грашовых сродкаў, якія паступілі (належныя) плацельшчыкам:

камісіянерам (паверанным) для пакрыцця іх расходаў на выкананне камісійнага або іншага аналагічнага даручэння, якія падлягаюць пакрыццю камітэнтамі (давернікамі) і не пакрываюцца ўзнагародай камісіянераў (паверанных);

арэндадаўцам (лізінгадавальнікам) для пакрыцця іх расходаў, звязаных з арэндай (фінансавай арэндай (лізінгам)), не ўключаных у суму арэнднай платы (лізінгавага плацяжу) і накіраваных (падлеглых накіраванню) трэцім асобам;

прадаўцам для пакрыцця пакупнікамі тавараў кошту набытых паслуг па дастаўцы (транспарціроўцы) тавараў, не ўключаных у кошт гэтых тавараў;

ад фізічных асоб, з якімі заключаны працоўныя ці грамадзянска-прававыя дагаворы, пры пакрыцці імі кошту прац (паслуг), аплачаных у інтарэсах такіх асоб плацельшчыкамі;

экспедытарам на пакрыццё кліентамі ў адпаведнасці з дагаворам транспартнай экспедыцыі іх расходаў, звязаных з набыццём тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не пакрываюцца ўзнагародай экспедытара;

11.2. кошт тавараў, перададзеных па дагаворы пазыкі;

11.3. даходы, указаныя ў пункце 2 артыкула 196 гэтага Кодэкса;

11.4. сродкі, якія бязвыплатна паступілі ў рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага ці мясцовага бюджэтаў або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, бюджэту Саюзнай дзяржавы і выкарыстаны па мэтавым прызначэнні, за выключэннем сродкаў, указаных у падпункце 9.11 пункта 9 гэтага артыкула;

11.5. на працягу тэрміну дзеяння дагавора давернага кіравання маёмасцю маёмасць даручальніка, перададзеная індывідуальнаму прадпрымальніку – давернаму кіраўніку;

11.6. дапамогі па часовай непрацаздольнасці (у тым ліку дапамогі па догляду за хворым дзіцём), якія выплачваюцца індывідуальным прадпрымальнікам (натарыусам, адвакатам) са сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

12. Даходы ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна ўлічваюцца пры вызначэнні падатковай базы на дату іх фактычнага атрымання, якая вызначаецца:

12.1. у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 213 гэтага Кодэкса – для натарыусаў, адвакатаў, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе аплаты;

12.2. у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса – для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе налічэння.

13. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія змянілі прынцып уліку даходаў ад рэалізацыі з прынцыпу аплаты на прынцып налічэння, даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, адгружаных (выкананых, аказаных), перададзеных і не аплачаных да 1 студзеня года, з якога зменены прынцып уліку даходаў ад рэалізацыі, і пазарэалізацыйныя даходы, якія належалі да атрымання і не атрыманыя да гэтай даты, дата фактычнага атрымання якіх у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса не прыпадае на ўказаную дату або прыпадае пасля яе, вызначаюць:

на дату паступлення аплаты (фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў) – у выпадку паступлення аплаты (атрымання пазарэалізацыйных даходаў) на працягу падатковага перыяду, у якім зменены прынцып уліку даходаў ад рэалізацыі;

на апошняе чысло падатковага перыяду, у якім зменены прынцып уліку даходаў ад рэалізацыі, – у іншых выпадках.

14. Расходамі індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, адвакатаў прызнаюцца дакументальна пацверджаныя расходы, праведзеныя плацельшчыкамі і звязаныя з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна.

Расходы вызначаюцца плацельшчыкамі самастойна ў парадку, прадугледжаным гэтым артыкулам.

15. Дакументамі, якія пацвярджаюць расходы плацельшчыкаў, прызнаюцца:

складзеныя ў адпаведнасці з заканадаўствам першасныя ўліковыя дакументы, уключаныя ў пералік, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, формы якіх устанаўліваюцца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі, вызначанымі ў гэтым пераліку, уключаючы складзеныя ў выглядзе электронных дакументаў, створаных у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

іншыя складзеныя ў адпаведнасці з часткай другой гэтага пункта і іншым заканадаўствам першасныя ўліковыя дакументы і (ці) іншыя дакументы, якія пацвярджаюць праведзеныя расходы.

Першасныя ўліковыя дакументы павінны змяшчаць наступныя абавязковыя рэквізіты:

найменне дакумента, дату яго складання;

найменне арганізацыі, прозвішча і ініцыялы індывідуальнага прадпрымальніка, які з'яўляецца ўдзельнікам гаспадарчай аперацыі;

змест і падставу здзяйснення гаспадарчай аперацыі, яе ацэнку ў натуральных і вартасных паказчыках (ці ў вартасных паказчыках);

прозвішчы, ініцыялы, подпісы і пасады (пры іх наяўнасці) асоб, адказных за здзяйсненне гаспадарчай аперацыі і (ці) правільнасць яе афармлення.

Дакументамі, якія пацвярджаюць расходы плацельшчыкаў за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прызнаюцца дакументы, выпісаныя пастаўшчыком тавараў (прац, паслуг).

16. Расходы, часткова звязаныя з ажыццяўленнем індывідуальнымі прадпрымальнікамі, натарыусамі, адвакатамі адпаведна прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, выключаюцца з падлеглых падаткаабкладанню даходаў толькі ў частцы, якая непасрэдна звязана з іх прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасцю, адвакацкай дзейнасцю індывідуальна.

17. Даацэнка (пераацэнка) кошту набытых матэрыяльных каштоўнасцей можа быць праведзена індывідуальнымі прадпрымальнікамі, натарыусамі, адвакатамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

18. Да расходаў, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні даходаў ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, адносяцца:

расходы на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтай главе – расходы на вытворчасць і рэалізацыю);

пазарэалізацыйныя расходы.

Расходы па вытворчасці і рэалізацыі групуюцца па наступных элементах:

матэрыяльныя расходы;

расходы на аплату працы;

амартызацыйныя адлічэнні ад кошту амартызуемай маёмасці (асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў), якая выкарыстоўваецца ў прадпрымальніцкай дзейнасці;

расходы на сацыяльныя патрэбы;

іншыя расходы.

19. Калі расходы на вытворчасць і рэалізацыю могуць быць аднесены адначасова да некалькіх элементаў расходаў, плацельшчык мае права самастойна вызначыць, да якога непасрэдна элемента ён аднясе такія расходы.

20. Расходы на вытворчасць і рэалізацыю ўяўляюць сабой вартасную ацэнку выкарыстаных у працэсе вытворчасці і рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў прыродных рэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі, асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, працоўных рэсурсаў і іншых расходаў на іх вытворчасць і рэалізацыю, пацверджаныя дакументальна.

21. Да матэрыяльных расходаў адносяцца наступныя расходы:

21.1. на набыццё тавараў, прызначаных для наступнай рэалізацыі, сыравіны і (ці) матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры вытворчасці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг) і (ці) утвараюць іх аснову або з'яўляюцца неабходным кампанентам пры вытворчасці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг).

Такія расходы:

вызначаюцца зыходзячы з цэн набыцця тавараў, сыравіны, матэрыялаў і ўлічваюцца ў складзе расходаў у частцы, якая адносіцца на фактычна рэалізаваныя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, у тым перыядзе, у якім атрыманы даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

змяншаюцца на кошт зваротнай тары па цане яе выкарыстання ці рэалізацыі, калі кошт зваротнай тары, прынятай ад пастаўшчыка, уключаны ў цану гэтых тавараў, сыравіны, матэрыялаў. Аднясенне тары да зваротнай ці незваротнай вызначаецца ўмовамі дагавору на набыццё таварна-матэрыяльных каштоўнасцей.

Расходы, звязаныя з набыццём тавараў, сыравіны, матэрыялаў (камісійныя ўзнагароды, мытныя пошліны і зборы, расходы на транспарціроўку, захоўванне і іншыя расходы, звязаныя з набыццём тавараў, сыравіны, матэрыялаў), улічваюцца ў складзе расходаў у памеры іх фактычнай аплаты ў перыядзе, у якім яны праведзены, або ў справаздачным (падатковым) перыядзе, у якім атрыманы даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць рознічны і (ці) аптовы гандаль, маюць права вызначаць расходы на набыццё тавараў, якія рэалізуюцца, з прымяненнем паказчыка сярэдняга працэнта гандлёвых надбавак або з прымяненнем сярэдняга працэнта пакупнога кошту тавараў у кошце рэалізаваных тавараў у парадку, устаноўленым Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

21.2. на набыццё матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца:

для ўпакоўкі і іншай падрыхтоўкі (уключаючы перадпродажную падрыхтоўку) выробленых тавараў (прац, паслуг) і (ці) тавараў (прац, паслуг), якія рэалізуюцца. Такія расходы вызначаюцца зыходзячы з цэн набыцця матэрыялаў і ўлічваюцца ў складзе расходаў у частцы, якая адносіцца на фактычна рэалізаваныя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, у тым перыядзе, у якім атрыманы даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

на іншыя вытворчыя і гаспадарчыя патрэбы (утрыманне, эксплуатацыю асноўных сродкаў, правядзенне выпрабаванняў, кантролю і іншыя падобныя мэты). Кошт такіх матэрыялаў улічваецца ў складзе матэрыяльных расходаў па меры іх выкарыстання;

21.3. на набыццё камплектуючых вырабаў, якія падвяргаюцца мантажу, і (ці) паўфабрыкатаў, якія падвяргаюцца дадатковай апрацоўцы. Такія расходы вызначаюцца зыходзячы з цэн набыцця камплектуючых вырабаў, паўфабрыкатаў і ўлічваюцца ў складзе расходаў у частцы, якая адносіцца на фактычна рэалізаваныя тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы, у тым перыядзе, у якім атрыманы даходы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

21.4. на набыццё інструментаў, прыстасаванняў, інвентару, прыбораў, лабараторнага абсталявання, спецадзення і іншай маёмасці, якая не з'яўляецца амартызуемай маёмасцю. Кошт такой маёмасці ўключаецца ў склад матэрыяльных расходаў у поўнай суме па меры ўводу яе ў эксплуатацыю ці ў парадку, устаноўленым рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка;

21.5. на набыццё паліва, вады і ўсіх відаў энергіі, якія расходуюцца на тэхналагічныя мэты, выраб (у тым ліку самім плацельшчыкам для вытворчых патрэб) усіх відаў энергіі, ацяпленне будынкаў, іншыя вытворчыя і гаспадарчыя патрэбы і на трансфармацыю і перадачу энергіі. Такія расходы ўлічваюцца ў складзе матэрыяльных расходаў па меры іх зрасходавання з улікам палажэнняў часткі другой гэтага падпункта.

Кошт паліва для механічных транспартных сродкаў, машын, механізмаў і абсталявання ўключаецца ў склад расходаў у межах нормаў, устаноўленых у адпаведнасці з заканадаўствам. Пры адсутнасці такіх нормаў кошт паліва ўключаецца ў склад расходаў па нормах, устаноўленых тэхнічнай дакументацыяй завода-вырабляльніка, а пры адсутнасці і гэтакіх – у межах нормаў, устаноўленых плацельшчыкам. Нормы, устаноўленыя плацельшчыкам, дзейнічаюць да заканчэння каляндарнага года, у якім нормы зацверджаны ў нарматыўным прававым акце ва ўстаноўленым парадку;

21.6. на аплату прац (паслуг) вытворчага характару, якія выконваюцца (аказваюцца) арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Такія расходы ўлічваюцца ў складзе матэрыяльных расходаў па меры іх ажыццяўлення.

Да прац (паслуг) вытворчага характару адносяцца:

ажыццяўленне асобных аперацый па вытворчасці тавараў, выкананні прац, аказанні паслуг, апрацоўцы сыравіны (матэрыялаў), кантроль за выкананнем устаноўленых тэхналагічных працэсаў, рамонт і тэхнічнае абслугоўванне асноўных сродкаў і іншыя падобныя працы (паслугі);

транспартныя, транспартна-экспедыцыйныя паслугі па перавозцы грузаў, у прыватнасці перамяшчэнне сыравіны (матэрыялаў), інструментаў, дэталяў, нарыхтовак, іншых відаў грузаў з месцаў іх захоўвання (складоў) у цэхі (аддзяленні), дастаўка гатовай прадукцыі ў адпаведнасці з умовамі дагавораў;

21.7. звязаныя з утрыманнем і эксплуатацыяй асноўных сродкаў і іншай маёмасці, у тым ліку прыродаахоўнага прызначэння (ачышчальныя збудаванні, попелаўлоўнікі, фільтры, іншыя аб'екты, расходы на захаванне адходаў, набыццё паслуг арганізацый па прыёме, захоўванні і знішчэнні адходаў, ачысткі сцёкавых вод). Такія расходы ўлічваюцца ў складзе матэрыяльных расходаў па меры іх ажыццяўлення;

21.8. страты ад недастачы і (ці) пашкоджання пры захоўванні і транспарціроўцы таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, якія вызначаюцца ў межах нормаў натуральнага змяншэння, устаноўленых заканадаўствам;

21.9. іншыя матэрыяльныя расходы, звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Такія расходы ўлічваюцца ў складзе матэрыяльных расходаў па меры іх ажыццяўлення.

22. Матэрыяльныя расходы змяншаюцца на кошт зваротных адходаў.

Да зваротных адходаў адносяцца рэшткі сыравіны (матэрыялаў), паўфабрыкатаў, цепланасіцеляў і іншых відаў матэрыяльных рэсурсаў, якія ўтварыліся ў працэсе вытворчасці тавараў (выканання прац, аказання паслуг), часткова страцілі спажывецкія якасці зыходных рэсурсаў (хімічныя ці фізічныя ўласцівасці) і ў выніку гэтага выкарыстоўваюцца з павышанымі расходамі (паніжаным выхадам прадукцыі) ці не выкарыстоўваюцца па прамым прызначэнні.

Зваротныя адходы ацэньваюцца ў наступным парадку:

па паніжанай цане зыходнага матэрыяльнага рэсурсу (па цане магчымага выкарыстання) – калі гэтыя адходы могуць быць выкарыстаны для асноўнай ці дапаможнай вытворчасці;

па цане рэалізацыі – калі гэтыя адходы рэалізуюцца.

23. Да расходаў на аплату працы адносяцца ўзнагароды работнікам за выкананне імі працоўных ці іншых абавязкаў, уключаючы грашовыя ўзнагароды і надбаўкі за асаблівыя ўмовы працы, выплаты стымуляцыйнага і кампенсацыйнага характару, прадугледжаныя заканадаўствам, працоўнымі дагаворамі (кантрактамі), а таксама ўзнагароды работнікам за выкананыя імі працы, аказаныя паслугі па заключаных з плацельшчыкамі дагаворах грамадзянска-прававога характару.

Расходы на аплату працы вызначаюцца зыходзячы з сумы налічаных работнікам даходаў.

24. Да амартызацыйных адлічэнняў ад кошту амартызуемай маёмасці (асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў), якая выкарыстоўваецца ў прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, адносяцца сумы амартызацыйных адлічэнняў па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, праведзеных у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Сумы амартызацыйных адлічэнняў, вылічаныя па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якія выкарыстоўваюцца як для асабістых патрэб, так і для прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, улічваюцца ў складзе расходаў прапарцыянальна перыяду выкарыстання асноўных сродкаў і нематэрыяльных актываў (па аўтатранспартных сродках – прапарцыянальна прабегу, непасрэдна звязанаму з прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасцю, адвакацкай дзейнасцю індывідуальна) для атрымання даходу ў справаздачным перыядзе, у якім праведзены такія расходы.

25. Пры рэалізацыі асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, асобных прадметаў у складзе абаротных сродкаў у расходы ўключаюцца астаткавы кошт амартызуемай маёмасці, які вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама затраты на рэалізацыю асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, асобных прадметаў у складзе абаротных сродкаў.

26. Да расходаў на сацыяльныя патрэбы адносяцца абавязковыя страхавыя ўзносы ў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам. Такія расходы ўлічваюцца ў памеры іх фактычнай выплаты плацельшчыкам.

Пры наяўнасці запазычанасці па выплаце страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь расходы на яе пагашэнне ўлічваюцца ў складзе расходаў у межах фактычна пагашанай запазычанасці і ў тых справаздачных перыядах, у якіх плацельшчык пагашае ўказаную запазычанасць.

27. Да іншых расходаў адносяцца:

27.1. членскія ўзносы натарыусаў у Беларускую натарыяльную палату на ўтрыманне Беларускай натарыяльнай палаты, тэрытарыяльных натарыяльных палат і выкананне ўскладзеных на іх задач і функцый, а таксама членскія ўзносы (уступныя і іншыя) у

аб'яднанні прадпрымальнікаў і наймальнікаў (саюзы, асацыяцыі) з улікам асаблівасцей, прадугледжаных часткай другой гэтага падпункта.

Членскія ўзносы (уступныя і іншыя) у аб'яднанні прадпрымальнікаў і наймальнікаў (саюзы, асацыяцыі) уключаюцца ў склад расходаў з улікам палажэнняў пункта 29 гэтага артыкула;

27.2. расходы на рамонт і тэхнічнае абслугоўванне асноўных сродкаў, уключаючы расходы на набыццё таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, якія выкарыстоўваюцца для рамонту і тэхнічнага абслугоўвання асноўных сродкаў, праведзеных уласнымі сіламі плацельшчыка.

Расходы на рамонт і тэхнічнае абслугоўванне асноўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца як для асабістых патрэб, так і для прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, улічваюцца ў складзе іншых расходаў прапарцыянальна перыяду выкарыстання асноўных сродкаў (па аўтатранспартных сродках – прапарцыянальна прабегу) для атрымання даходу ў справаздачным перыядзе, у якім праведзены такія расходы.

Расходы на спісанне аўтамабільных шын улічваюцца на падставе іх кошту, нормаў зносу аўтамабільных шын, разлічаных у адпаведнасці з заканадаўствам зыходзячы з эксплуатацыйных нормаў прабегу аўтамабільных шын, і фактычнага прабегу аўтамабіля ў адпаведным справаздачным (падатковым) перыядзе;

27.3. расходы на паслугі сувязі;

27.4. сумы зямельнага падатку, падатку на нерухомасць, збораў (пошлін) у памеры іх фактычнай выплаты плацельшчыкам.

Пры наяўнасці запазычанасці па выплаце падаткаў, збораў (пошлін) расходы на яе пагашэнне ўлічваюцца ў складзе расходаў у межах фактычна пагашанай запазычанасці і ў тых справаздачных перыядах, у якіх плацельшчык пагашае ўказаную запазычанасць;

27.5. расходы на службовыя камандзіроўкі, уключаючы расходы ў выглядзе сутачных у межах нормаў.

Расходы на службовыя камандзіроўкі ў замежнай валюце, праведзеныя накіраваным у службовую камандзіроўку за мяжу работнікам за кошт выдадзенага плацельшчыкам авансу, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату складання авансавай справаздачы. Пры пакрыцці плацельшчыкам указаных расходаў работніку пасля складання авансавай справаздачы такія расходы пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх пакрыцця, але не пазней за трыццаць дзён з дня падачы работнікам авансавай справаздачы;

27.6. іншыя расходы, звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй і не ўказаныя ў пунктах 21, 23, 24 і 26 гэтага артыкула.

28. У склад пазарэалізацыйных расходаў уключаюцца расходы ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў. Да пазарэалізацыйных расходаў адносяцца:

28.1. сумы няўстоек (штрафаў, пеняў), сумы, заплачаныя ў выніку прымянення іншых мер адказнасці, у тым ліку ў выніку пакрыцця страт, за парушэнне дагаворных абавязацельстваў, а таксама сумы пакрыцця страт, у тым ліку рэальнага ўрону, не звязаных з парушэннем дагаворных абавязацельстваў, калі вінаватыя асобы не выяўлены ці суд адмовіў у спагнанні з іх;

28.2. адмоўныя розніцы, якія ўзнікаюць пры пераацэнцы маёмасці (грашовых сродкаў на валютных рахунках у банках, у касах) у замежнай валюце пры змяненні Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь курсаў замежных валют на дату здзяйснення аперацыі;

28.3. расходы, звязаныя з продажам (пакупкай) замежнай валюты, у суме розніцы паміж афіцыйным курсам, установленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на момант продажу (пакупкі), і курсам продажу (пакупкі);

28.4. судовыя расходы;

28.5. страты і расходы ў сувязі з надзвычайнымі акалічнасцямі гаспадарчай дзейнасці (пажар, аварыя, стыхійнае бедства, дарожна-транспартнае здарэнне, страты ад спынення вытворчасці і іншыя аналагічныя акалічнасці, у тым ліку форс-мажорныя), уключаючы расходы, звязаныя з прадухіленнем ці ліквідацыяй наступстваў такіх надзвычайных акалічнасцей;

28.6. расходы на здачу ў арэнду (перадачу ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці. Такія расходы ўлічваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім атрыманы даходы ад здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці;

28.7. сумы падаткаў, збораў і іншых абавязковых адлічэнняў, утрыманых і (ці) заплачаных у бюджэт ці пазабюджэтныя фонды замежных дзяржаў у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў (за выключэннем падаткаў і збораў, у адносінах да якіх прадугледжана ліквідацыя двайнога падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам і (ці) міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь), пры наяўнасці даведкі, засведчанай падатковым органам (іншай кампетэнтнай службай дзяржавы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў), ці іншых дакументаў, якія пацвярджаюць выплату (утрыманне) падаткаў, збораў і іншых абавязковых адлічэнняў у замежнай дзяржаве. Такія сумы падаткаў, збораў і іншых абавязковых адлічэнняў улічваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім яны выплачаны (утрыманы) у замежнай дзяржаве;

28.8. працэнты па пратэрмінаваных выплатах па пазыках і крэдытах з улікам палажэнняў, прадугледжаных пунктам 29 гэтага артыкула;

28.9. расходы, не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, але звязаныя са спецыфікай прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца, улічваюцца ў складзе расходаў пасля іх пісьмовага ўзгаднення падатковымі органамі;

28.10. іншыя расходы плацельшчыка пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, непасрэдна не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

29. Сукупны памер расходаў на членскія ўзносы (уступныя і іншыя) у аб'яднанні прадпрымальнікаў і наймальнікаў (саюзы, асацыяцыі), якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, працэнты па пратэрмінаваных выплатах па пазыках і крэдытах не могуць перавышаць 0,5 працэнта даходаў ад рэалізацыі.

30. Сумы расходаў падлягаюць выключэнню ў межах даходаў, атрыманых у справаздачным (падатковым) перыядзе, калі іншае не прадугледжана гэтым пунктам.

Сума перавышэння ў падатковым перыядзе расходаў плацельшчыка над сумай даходаў, атрыманых у гэтым падатковым перыядзе, пераносіцца на наступныя падатковыя перыяды да поўнага яе выкарыстання ў частцы расходаў на дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка (рэгістрацыю натарыяльнага бюро, адваката), адкрыццё рахункаў у банках, арэнду нерухомай маёмасці, атрыманне спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), кваліфікацыйных атэстатаў, пасведчанняў аб атэстацыі.

31. Пры падаткаабкладанні не ўлічваюцца наступныя расходы:

31.1. расходы, не пацверджаныя дакументамі;

31.2. у парадку папярэдняй аплаты плацельшчыкам тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

31.3. у пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык, атрыманых плацельшчыкам;

31.4. дадзеныя плацельшчыкам пазыкі;

31.5. кампенсаваныя ў адпаведнасці з заканадаўствам іншымі асобамі:

па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах на карысць камітэнта (даверніка);

арэндадаўцам, звязаныя з арэндай памяшканняў, якія не ўключаюцца ў суму арэнднай платы;

31.6. на выплату пеняў, а таксама штрафаў і (ці) санкцый, якія накладаюцца (налічваюцца) за парушэнне заканадаўства;

31.7. панесеныя звыш нормаў, устаноўленых гэтай главой;

31.8. на мэты, не звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, уключаючы расходы на арганізацыю адпачынку, забаў, вольнага часу;

31.9. на набыццё і (ці) стварэнне амартызуемай маёмасці, а таксама на правядзенне мадэрнізацыі, рэканструкцыі асноўных сродкаў;

31.10. кошт маёмасці ці маёмасных правоў, перададзеных у якасці задатку, закладу;

31.11. сумы амартызацыйных адлічэнняў па асноўных сродках і нематэрыяльных актывах, якія не выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, а таксама не знаходзяцца ў эксплуатацыі;

31.12. абавязковыя страхавыя ўзносы, якія выплачваюцца плацельшчыкам у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь з даходаў самога плацельшчыка, выплаты па ўсіх відах добраахвотнага страхавання, акрамя страхавых узносаў па пераліку відаў добраахвотнага страхавання, вызначаным для арганізацый Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

31.13. расходы на праезд у транспарце агульнага карыстання;

31.14. расходы, звязаныя з атрыманнем даходаў, якія вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб, за выключэннем расходаў, ажыццёўленых за кошт сродкаў, якія бязвыплатна паступілі ў рамках мэтавага фінансавання з рэспубліканскага ці мясцовага бюджэтаў або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, бюджэту Саюзнай дзяржавы ў справаздачных перыядах, якія ідуць следам за перыядамі, у якія расходы, пакрытыя такімі сродкамі, былі ўлічаны пры вызначэнні падатковай базы;

31.15. іншыя затраты, не звязаныя з вытворчасцю і рэалізацыяй тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

32. Рашэнне аб уключэнні ў расходы, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, расходаў, указаных у пункце 31 гэтага артыкула, прымае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

33. Расходы, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з палажэннямі пунктаў 21–30 гэтага артыкула, прызнаюцца ў наступным парадку:

33.1. натарыусамі, адвакатамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе аплаты, – у адпаведнасці з пунктам 34 гэтага артыкула;

33.2. індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе налічэння, – у адпаведнасці з пунктам 35 гэтага артыкула.

34. Натарыусы, адвакаты, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе аплаты, расходы, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з палажэннямі пунктаў 21–30 гэтага артыкула, прызнаюць расходамі пасля іх фактычнай аплаты, іншага спынення сустрэчнага абавязацельства перад прадаўцом.

Пры гэтым указаныя расходы ўлічваюцца ў складзе расходаў з улікам наступных асаблівасцей:

расходы на набыццё тавараў, прызначаных для наступнай рэалізацыі, сыравіны і (ці) матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры вытворчасці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг) і (ці) утвараюць іх аснову або з'яўляюцца неабходным кампанентам пры вытворчасці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), улічваюцца ў межах сум, аплачаных за ўказаныя тавары, сыравіну, матэрыялы. Пры гэтым сумы платы за ўказаныя тавары, сыравіну, матэрыялы змяншаюцца на кошт тавараў, сыравіны, матэрыялаў,

выкарыстаных індывідуальным прадпрымальнікам для патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці. Расходы на набыццё ўказаных тавараў, сыравіны, матэрыялаў, панесеныя пасля заканчэння падатковага перыяду, да якога яны адносяцца, падлягаюць выключэнню з даходаў у падатковым перыядзе, да якога яны адносяцца (у якім атрыманы даход);

расходы на аплату працы ўлічваюцца ў складзе расходаў на дату іх фактычнай выплаты, выдачы;

амартызацыя ўлічваецца ў складзе расходаў у сумах, налічаных за справаздачны (падатковы) перыяд.

35. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўлічваюць даходы ад рэалізацыі па прынцыпе налічэння, расходы, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні ў адпаведнасці з палажэннямі пунктаў 21–30 гэтага артыкула, прызнаюць расходамі ў тым справаздачным (падатковым) перыядзе, у якім атрыманы адпаведныя ім даходы, незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх.

Пры гэтым указаныя расходы ўлічваюцца ў складзе расходаў з улікам наступных асаблівасцей:

расходы, якія немагчыма суаднесці з даходамі пэўнага справаздачнага перыяду, улічваюцца ў складзе расходаў таго справаздачнага перыяду, у якім яны былі праведзены;

працы (паслугі) вытворчага характару ўлічваюцца на дату падпісання індывідуальным прадпрымальнікам акта прыёмкі-перадачы такіх прац (паслуг);

расходы на аплату працы ўлічваюцца штомесяц зыходзячы з сумы налічаных у адпаведнасці з пунктам 23 гэтага артыкула расходаў на аплату працы;

амартызацыя ўлічваецца ў складзе расходаў у сумах, налічаных за справаздачны (падатковы) перыяд;

расходы на рамонт асноўных сродкаў улічваюцца ў тым справаздачным перыядзе, у якім яны былі ажыццёўлены, па-за залежнасцю ад іх аплаты;

расходы на службовыя камандзіроўкі ўлічваюцца на дату складання авансавай справаздачы.

36. Замест праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, непасрэдна звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна, плацельшчыкі маюць права вызначыць расходы ў памеры дваццаць (20) працэнтаў агульнай сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення імі прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна. Пры вызначэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб такія расходы не могуць улічвацца адначасова з расходамі, пацверджанымі дакументальна.

37. Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты вызначаюць падатковую базу падаходнага падатку з фізічных асоб нарастаючым вынікам па выніках кожнага справаздачнага (падатковага) перыяду на аснове даных уліку даходаў і расходаў.

Разлік падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца ў падатковай дэкларацыі (разліку) за справаздачны (падатковы) перыяд.

38. Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты абавязаны весці ўлік даходаў і расходаў у парадку, устаноўленым Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 206. Асаблівасці падаткаабкладання даходаў асобных катэгорый грамадзян (падданых) замежных дзяржаў**

1. Вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб даходы грамадзян (падданых) замежных дзяржаў:

1.1. глаў, а таксама персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, якія маюць дыпламатычны ранг, членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі, калі яны не

з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, не звязаных з дыпламатычнай службай гэтых фізічных асоб;

1.2. адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў і членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі, калі яны не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ці не пражываюць у Рэспубліцы Беларусь пастаянна, за выключэннем даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, не звязаных з працай указаных фізічных асоб у гэтых прадстаўніцтвах;

1.3. абслуговага персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ці не пражываюць у Рэспубліцы Беларусь пастаянна, атрыманыя імі пры працы ў прадстаўніцтве замежнай дзяржавы;

1.4. консульскіх службовых асоб і консульскіх служачых консульскіх устаноў замежных дзяржаў, а таксама членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі, калі яны не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, не звязаных са службай указаных фізічных асоб у такіх консульскіх установах;

1.5. абслуговага персаналу консульскіх устаноў замежных дзяржаў, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ці не пражываюць у Рэспубліцы Беларусь пастаянна, атрыманыя імі пры працы ў такіх консульскіх установах;

1.6. прадстаўнікоў спецыяльных місій замежных дзяржаў і членаў дыпламатычнага персаналу такіх місій, за выключэннем даходаў, атрыманых ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, не звязаных са службай указаных фізічных асоб у такіх спецыяльных місіях;

1.7. супрацоўнікаў міжнародных арганізацый і іншых катэгорый грамадзян (падданых) замежных дзяржаў – у адпаведнасці з нормамі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

2. Даходы грамадзян (падданых) замежных дзяржаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб, калі заканадаўствам адпаведнай замежнай дзяржавы ўстаноўлены аналагічны парадак у адносінах да грамадзянам Рэспублікі Беларусь – глаў, персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь, якія маюць дыпламатычны ранг, консульскіх службовых асоб і консульскіх служачых консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэхнічнага і абслуговага персаналу такіх прадстаўніцтваў і ўстаноў Рэспублікі Беларусь, членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі (за выключэннем членаў сямей абслуговага персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь), прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у спецыяльных місіях і членаў дыпламатычнага персаналу такіх місій або калі такое палажэнне прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Пералік міжнародных арганізацый, замежных дзяржаў, у адносінах да адпаведна супрацоўнікаў ці грамадзян (падданых) якіх прымяняюцца палажэнні гэтага артыкула, вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 207. Падатковы і справаздачны перыяды падаходнага падатку з фізічных асоб**

Падатковым перыядам падаходнага падатку з фізічных асоб прызнаецца каляндарны год.

Справаздачнымі перыядамі падаходнага падатку з фізічных асоб для індывідуальных прадпрымальнікаў (натарыусаў, адвакатаў) прызнаюцца квартал, паўгоддзе, дзевяць месяцаў каляндарнага года і каляндарны год.

**Артыкул 208. Даходы, якія вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб**

Вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб наступныя даходы:

1. дапамогі па дзяржаўным сацыяльным страхаванні і дзяржаўным сацыяльным забеспячэнні і надбаўкі да іх, акрамя дапамог па часовай непрацаздольнасці (у тым ліку дапамог па доглядзе за хворым дзіцём), дапамогі па беспрацоўі, субсідыі для кампенсацыі расходаў беспрацоўных у сувязі з арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці, якія выплачваюцца са сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, дапамогі, якія выплачваюцца са сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў;

2. грашовыя сродкі, якія аднаразова выплачваюцца ў безнаяўным парадку сем'ям пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) трэцяга ці наступных дзяцей;

3. пенсіі, якія атрымліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ці заканадаўствам замежных дзяржаў, штомесячныя грашовыя забеспячэнні асобным дзяржаўным служачым, якія прызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

4. усе віды прадугледжаных заканадаўчымі актамі, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь кампенсацый (за выключэннем кампенсацыі за нявыкарыстаны працоўны водпуск, кампенсацыі за знос транспартных сродкаў, абсталявання, інструментаў і прыстасаванняў, якія належаць плацельшчыку), у тым ліку звязаных:

з бясплатным даваннем жылых памяшканняў і жыллёва-камунальных паслуг, паліва ці адпаведнага грашовага пакрыцця;

з аплатай кошту і (ці) выдачай належнага натуральнага забеспячэння, а таксама з выплатай грашовых сродкаў наўзамен гэтага забеспячэння;

з атрыманнем выхадных дапамог у сувязі са спыненнем працоўных дагавораў (кантрактаў). Такія дапамогі вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб, калі яны выплачваюцца ў выпадках, для якіх заканадаўчымі актамі ўстаноўлены мінімальныя гарантаваныя памеры такіх выплат, і ў сумах, якія не перавышаюць гэтыя ўстаноўленыя мінімальныя гарантаваныя памеры. Атрыманыя плацельшчыкамі ў сувязі з іх выхадам на пенсію выхадныя дапамогі, якія выплачваюцца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных калектыўным дагаворам, пагадненнем, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у памеры, які не перавышае дзевяць сярэднямесячных заработных плат плацельшчыка;

з гібеллю, устанаўленнем інваліднасці, звязанай з выкананнем службовых абавязкаў ці ўзніклай у выніку ранення, кантузіі, калецтва ваеннаслужачых ці дзяржаўных служачых пры выкананні імі сваіх службовых абавязкаў;

з пакрыццём у парадку і памерах, устаноўленых заканадаўствам, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь расходаў, звязаных з іх парламенцкай дзейнасцю;

з пакрыццём расходаў, звязаных з выкананнем плацельшчыкам працоўных абавязкаў (уключаючы пакрыццё расходаў, якое выплачваецца ў сувязі з пераездам на працу ў іншую мясцовасць, пакрыццё расходаў пры службовых камандзіроўках з улікам нормаў часткі трэцяй гэтага пункта);

з пакрыццём расходаў па найме ці паднайме жылых памяшканняў, пражыванні ў гасцініцах ва ўстаноўленых заканадаўствам памерах за кошт сродкаў адпаведных дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, органаў пракуратуры, Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь ваеннаслужачым, у тым ліку займаючым пасады ў органах міждзяржаўных утварэнняў і міжнародных арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаў, слухачам, якія праходзяць навучанне, не звязанае са службовай камандзіроўкай за мяжу, у арганізацыях замежных дзяржаў па накіраванні дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, а таксама пракурорскім работнікам і службовым асобам мытных органаў, прызначаным у парадку

пераводу ў іншую мясцовасць на пасады намесніка Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь, начальніка кіраўніцтва Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка, начальніка мытні ці яго намесніка, начальніка мытнага паста ці аператыўна-пошукавага аддзела мытні, якія карыстаюцца жылымі памяшканнямі па дагаворы найму ці паднайму, пражываюць у гасцініцах.

Пры ўстанаўленні ў адпаведнасці з заканадаўствам гранічных памераў ці нормаў выплаты кампенсацый даходы плацельшчыка, указаныя ў частцы першай гэтага пункта, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у межах такіх памераў ці нормаў.

Пры аплаце плацельшчыку расходаў на службовыя камандзіроўкі як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і за яе межы вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб:

сутачныя, якія выплачваюцца ў межах нормаў, устаноўленых заканадаўствам;

фактычна праведзеныя і дакументальна пацверджаныя расходы па праездзе да месца службовай камандзіроўкі і назад, па найме жылога памяшкання. Пры непадачы плацельшчыкам дакументаў, якія пацвярджаюць аплату ўказаных расходаў, сумы такой аплаты вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у межах нормаў (памераў), устаноўленых заканадаўствам;

іншыя расходы на службовыя камандзіроўкі, праведзеныя з дазволу ці ведама арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка, што прызнаюцца месцам асноўнай працы (службы) плацельшчыка, якія аплачваюцца ці кампенсуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Аналагічны парадак падаткаабкладання прымяняецца да ўказаных у частцы трэцяй гэтага пункта выплат, якія праводзяцца:

членам органа кіравання арганізацыі ў сувязі з выкананнем імі функцый членаў;

плацельшчыкам не па месцы асноўнай працы (службы, навучання), у тым ліку пры выкананні імі прац (аказанні паслуг) па грамадзянска-прававых дагаворах, калі такія выплаты прадугледжаны ўказанымі дагаворамі;

5. даходы, якія атрымліваюць ваеннаслужачыя ў выглядзе надбавак за асаблівыя ўмовы службы, палявых, устаноўленых заканадаўствам, а таксама грашовай узнагароды за баявое дзяжурства, дзяжурства ў сутачным нарадзе, каравуле, скачкі з парашутам, лётныя выпрабаванні авіяцыйнай тэхнікі, размініраванне мясцовасці і абясшкоджванне выбухованебяспечных прадметаў, вадалазныя працы, хімічныя, дазіметрычныя і іншыя аварыйна-выратавальныя працы, працы ў ізалюючых процівагазах;

6. даходы (у тым ліку ў выглядзе сярэдняга заробку (грашовага забеспячэння), якія атрымліваюцца за здачу крыві, яе кампанентаў, іншыя віды донарства, здачу матчынага малака ў парадку і памерах, прадугледжаных заканадаўствам;

7. узнагароды, якія атрымліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам пацыентамі за ўдзел у правядзенні клінічных выпрабаванняў лекавых сродкаў;

8. аліменты, якія атрымліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і (ці) заканадаўствам замежных дзяржаў;

9. дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь;

10. штомесячныя грашовыя выплаты плацельшчыкам, якія маюць ганаровыя званні «Народны артыст СССР», «Народны артыст РСФСР», «Народны артыст Расійскай Федэрацыі», «Народны артыст Беларускай ССР», «Народны артыст Беларусі», «Народны архітэктар СССР», «Народны ўрач СССР», «Народны ўрач Беларускай ССР», «Народны ўрач Беларусі», «Народны пісьменнік Беларусі», «Народны паэт Беларусі», «Народны мастак СССР», «Народны мастак РСФСР», «Народны мастак Расійскай Федэрацыі», «Народны мастак Беларускай ССР», «Народны мастак Беларусі», «Народны настаўнік СССР», «Народны настаўнік Беларускай ССР», «Народны настаўнік Беларусі», у памерах, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (ці) Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

11. сумы матэрыяльнай дапамогі, што аказваецца арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія прызнаюцца месцам асноўнай працы (службы, навучання) памерлага работніка (ваеннаслужачага, навучэнца), у тым ліку тых, якія раней працавалі (служылі, навучаліся) у гэтых арганізацыях ці ў гэтых індывідуальных прадпрымальнікаў, асобам, якія знаходзяцца з памерлым работнікам (ваеннаслужачым, навучэнцам) у адносінах блізкай роднасці, а таксама работнікам (ваеннаслужачым, навучэнцам), у тым ліку тых, якія раней працавалі (служылі, навучаліся) у гэтых арганізацыях ці ў гэтых індывідуальных прадпрымальнікаў, у сувязі са смерцю асоб, якія знаходзяцца з работнікам (ваеннаслужачым, навучэнцам) у адносінах блізкай роднасці;

12. сумы матэрыяльнай дапамогі, якая аказваецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

13. кошт пуцёвак, за выключэннем турыстычных, у санаторна-курортныя і аздараўленчыя ўстановы, аплачаныя за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання, а таксама сродкаў бюджэту;

14. кошт пуцёвак у санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі Рэспублікі Беларусь, набытых для дзяцей ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, аплачаных ці кампенсаваных за кошт сродкаў беларускіх арганізацый ці беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў у межах 833 беларускіх рублёў на кожнае дзіця ад кожнай крыніцы на працягу падатковага перыяду;

15. стыпендыі навучэнцаў, надбаўкі да стыпендый за поспехі ў навучанні, навуковай і грамадскай працы, даплаты да стыпендый, матэрыяльная дапамога навучэнцам, які выплачваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў, бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, арганізацый спажывецкай кааперацыі;

16. стыпендыі, якія заснуюваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама заахвочванні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў;

17. даходы ў выглядзе аплаты працы і іншыя сумы ў замежнай валюце, якія атрымліваюцца за працу за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ад дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб па пераліку, які зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

18. сумы аплаты працы грамадзян Рэспублікі Беларусь, накіраваных на працу за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання ў органы інтэграцыі, у тым ліку ў органы Саюзнай дзяржавы, Эканамічны Суд Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Выканаўчы камітэт Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міжпарламенцкую Асамблею дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

19. даходы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства і (ці) жывёлагадоўлі, вырашчанай (вырабленай) плацельшчыкам і (ці) асобамі, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага, на зямельным участку, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і дадзены яму і (ці) такім асобам для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аднакватэрнага жылога дома, зарэгістраванай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй кватэры ў блакіраваным жылым доме, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, агародніцтва, касьбы і выпасу сельскагаспадарчых жывёл, садаводства, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага зямельнага надзелу (далей у гэтай главе – зямельны ўчастак, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь).

Для мэт гэтага пункта:

да прадукцыі раслінаводства адносяцца агародніна і садавіна (у тым ліку ў перапрацаваным выглядзе), іншая прадукцыя раслінаводства (за выключэннем дэкаратыўных раслін і прадукцыі кветкаводства, іх насення і расады);

да прадукцыі жывёлагадоўлі адносяцца малочныя і кісламалочныя прадукты (у тым ліку ў перапрацаваным выглядзе), прадукцыя пчалаводства, іншая прадукцыя жывёлагадоўлі (акрамя пушніны), атрыманая ад хатніх жывёл (буйная рагатая жывёла, свінні, коні, авечкі, козы, трусы, сельскагаспадарчая птушка) як у жывым выглядзе, так і прадуктамі забою ў сырым ці перапрацаваным выглядзе.

Указаныя даходы вызваляюцца ад падаткаабкладання на падставе даведкі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якая пацвярджае, што прадукцыя, якая рэалізуецца, выраблена плацельшчыкам і (ці) асобамі, указанымі ў частцы першай гэтага пункта, на зямельным участку, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых часткай сёмай гэтага пункта.

Пры гэтым даходы, атрыманыя ад рэалізацыі прадукцыі пчалаводства, выробленай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, вызваляюцца ад падаткаабкладання пры ўмове, што разам з такой даведкай або замест яе (у выпадку, калі пчальнік размешчаны не на тых зямельных участках, якія ва ўстаноўленым парадку дадзены плацельшчыку, які рэалізуе вырабленую яе прадукцыю пчалаводства) плацельшчык падае ветэрынарна-санітарны пашпарт пчальніка, выдадзены на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і (ці) пасведчанне, аформленае на падставе гэтага пашпарта.

Пры адсутнасці даведкі, указанай у частцы трэцяй гэтага пункта, вызваленне ад падаходнага падатку з фізічных асоб даецца на падставе інфармацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якая пацвярджае, што рэалізаваная прадукцыя выраблена плацельшчыкам і (ці) асобамі, указанымі ў частцы першай гэтага пункта, на зямельным участку, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Форму даведкі, указанай у частцы трэцяй гэтага пункта, і парадак яе выдачы ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пры рэалізацыі плацельшчыкам прадукцыі раслінаводства нарыхтоўчым арганізацыям спажывецкай кааперацыі і (ці) іншым арганізацыям, індывідуальным прадпрымальнікам такія даходы вызваляюцца ад падаткаабкладання без давання такім арганізацыям, індывідуальным прадпрымальнікам даведкі, указанай у частцы трэцяй гэтага пункта;

20. даходы, якія атрымліваюцца ад:

рэалізацыі фізічным асобам, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, лекавых раслін, ягад, грыбоў, арэхаў і іншай дзікараслай прадукцыі;

збору і здачы лекавай расліннай сыравіны, дзікарослых ягад, арэхаў і іншых пладоў, грыбоў, іншай дзікараслай прадукцыі арганізацыям і (ці) індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць у парадку, устаноўленым заканадаўствам, дзейнасць па прамысловай нарыхтоўцы (закупцы) указанай прадукцыі;

21. даходы, якія атрымліваюцца ад фізічных асоб у выглядзе спадчыны, за выключэннем узнагарод, якія выплачваюцца спадчыннікам (праваперaемнікам) аўтараў твораў навукі, літаратуры, мастацтва, вынаходстваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, а таксама спадчыннікам асоб, якія з'яўляліся суб'ектамі сумежных правоў;

22. даходы ў памеры, які не перавышае 6569 беларускіх рублёў, у суме ад усіх крыніц на працягу падатковага перыяду, атрыманыя ад фізічных асоб па дагаворах, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці:

у выніку дарэння;

у выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна;

23. даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагародамі за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў, у тым ліку ў выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, аплаты кошту пуцёвак (за выключэннем даходаў, указаных у пунктах 14, 29 і 30 гэтага артыкула), атрыманыя ад:

арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца месцам асноўнай працы (службы, навучання), у тым ліку атрыманыя пенсіянерамі, якія раней працавалі ў гэтых арганізацыях і ў індывідуальных прадпрымальнікаў, – у памеры, які не перавышае 1984 беларускія рублі, ад кожнай крыніцы на працягу падатковага перыяду. Палажэнні гэтага абзаца не прымяняюцца ў адносінах да даходаў, указаных у пункце 24 гэтага артыкула;

іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, за выключэннем даходаў, указаных у пункце 38 гэтага артыкула, – у памеры, які не перавышае 131 беларускі рубель, ад кожнай крыніцы на працягу падатковага перыяду.

Даходы, атрыманыя плацельшчыкам у выглядзе ўзнагароды адначасова на двух падставах – за выкананне працоўных абавязкаў і ў сувязі з дзяржаўнымі святамі, святочнымі днямі, памятнымі і юбілейнымі датамі фізічных асоб і арганізацый, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у памерах, прадугледжаных гэтым пунктам;

24. даходы ў выглядзе аплаты страхавых паслуг страхавых арганізацый Рэспублікі Беларусь, у тым ліку па дагаворах добраахвотнага страхавання жыцця, дадатковай пенсіі, медыцынскіх расходаў, якія атрымліваюцца ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што з'яўляюцца месцам асноўнай працы (службы, навучання), у тым ліку пенсіянерамі, якія раней працавалі ў гэтых арганізацыях і ў гэтых індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама ад прафсаюзных арганізацый членамі такіх арганізацый, у памеры, які не перавышае 3398 беларускіх рублёў, ад кожнай крыніцы на працягу падатковага перыяду;

25. прызы, атрыманыя спартсменамі ў сувязі з удзелам у міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтвах, а таксама пераможцамі (прызёрамі) рэспубліканскіх спаборніцтваў, – у памерах, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ці Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

26. грашовыя прэміі, якія выплачваюцца пераможцам штогадовых спаборніцтваў за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю зерневых і зернебабовых раслін пры правядзенні фестываляў-кірмашоў працаўнікоў сяла «Дажынкі», а таксама пераможцам сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла», – у памерах, устаноўленых заканадаўствам;

27. грашовыя прэміі, атрыманыя пераможцамі рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года», у памерах, устаноўленых заканадаўствам, а таксама прызы, атрыманыя ўдзельнікамі гэтага рэспубліканскага конкурсу;

28. грашовая ўзнагарода і прызы, атрыманыя пераможцам рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь», у памерах, устаноўленых заканадаўствам, а таксама прызы, атрыманыя ўдзельнікамі гэтага рэспубліканскага конкурсу;

29. бязвыплатная (спонсарская) дапамога, а таксама залічаныя на дабрачынны рахунак, адкрыты ў банку, ахвяраванні, атрыманыя інвалідамі, дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, у памеры, што не перавышае 13 128 беларускіх рублёў у суме ад усіх крыніц на працягу падатковага перыяду;

30. бязвыплатная (спонсарская) дапамога, матэрыяльная ці іншая дапамога, а таксама залічаныя на дабрачынны рахунак, адкрыты ў банку, ахвяраванні, атрыманыя:

плацельшчыкамі, якія маюць патрэбу ў атрыманні медыцынскай дапамогі, у тым ліку правядзенні аперацый, пры наяўнасці адпаведнага пацвярджэння, якое выдаецца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

плацельшчыкамі ў сувязі з надзвычайнымі сітуацыямі прыроднага і (ці) тэхнагеннага характару пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць факт іх здзяйснення;

31. узнагароды, атрыманыя за перадачу ў дзяржаўную ўласнасць скарбаў;

32. даходы ў выглядзе выйгрышаў па ўсіх відах латарэй, па электронных інтэрактыўных гульнях, атрыманыя ад арганізацый, якія ажыццяўляюць у парадку, устаноўленым заканадаўствам, адпаведна латарэйную дзейнасць ці дзейнасць па арганізацыі і правядзенні інтэрактыўных гульняў;

33. даходы, атрыманыя:

па дзяржаўных каштоўных паперах былога СССР і Рэспублікі Беларусь;

па аблігацыях Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, якія эмітуюцца пры ажыццяўленні грашова-крэдытнага рэгулявання, у тым ліку ў мэтах фарміравання золатавалютных рэзерваў Рэспублікі Беларусь;

ад рэалізацыі (пагашэння) аблігацый мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (у тым ліку ў перыяд іх звароту);

ад рэалізацыі (пагашэння) аблігацый банкаў, адкрытага акцыянернага грамадства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» (у тым ліку ў перыяд іх абарачэння);

даручальнікам і (ці) выгаданабытчыкам пасля заканчэння тэрміну дзеяння ці скасавання дагавора давернага кіравання грашовымі сродкамі, у адпаведнасці з якім грашовыя сродкі перадаюцца для інвеставання ў дзяржаўныя каштоўныя паперы, якія эмітуюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь ад імя Рэспублікі Беларусь, аблігацыі, якія эмітуюцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, і вэксалі, якія выдаюцца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, пры ажыццяўленні грашова-крэдытнага рэгулявання, у тым ліку ў мэтах фарміравання золатавалютных рэзерваў Рэспублікі Беларусь, аблігацыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, каштоўныя паперы, якія эмітуюцца юрыдычнымі асобамі, што прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, і знаходзіліся ў такім даверным кіраванні не менш чым тры гады;

34. даходы, атрыманыя ад рэалізацыі (пагашэння) аблігацый, эмітаваных з 1 красавіка 2008 года юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, не ўказанымі ў пункце 33 гэтага артыкула, акрамя даходаў, атрыманых ад рэалізацыі (пагашэння) такіх аблігацый фізічнымі асобамі, у суме даходу, які перавышае даход, вызначаны на ўзроўні стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, што дзейнічае на дату прыняцця рашэння аб выпуску аблігацый, павялічанай на 5 працэнтных пунктаў, па аблігацыях, эмітаваных у беларускіх рублях, і 12 працэнтаў гадавых па аблігацыях, эмітаваных у замежнай валюце.

Да фізічных асоб, указаных у частцы першай гэтага падпункта, адносяцца:

удзельнікі, уласнікі маёмасці юрыдычных асоб, якія ажыццявілі эмісію аблігацый;

фізічныя асобы, якія знаходзяцца ў шлюбных адносінах, адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва з удзельнікамі, уласнікамі маёмасці юрыдычных асоб, што ажыццявілі эмісію аблігацый;

удзельнікі, уласнікі маёмасці юрыдычных асоб, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі, уласнікамі маёмасці юрыдычнай асобы, што ажыццявіла эмісію аблігацый;

35. даходы, атрыманыя ад рэалізацыі доляў у статутным фондзе беларускіх арганізацый, якія належаць плацельшчыку бесперапынна не менш чым тры гады, а таксама акцый беларускіх арганізацый, адчужальных не раней за тры гады з даты набыцця.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта прымяняюцца ў адносінах да доляў у статутным фондзе, набытых плацельшчыкам пачынаючы з 1 студзеня 2014 года;

36. даходы ў выглядзе працэнтаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку ў банках, за выключэннем такіх банкаўскіх рахункаў, якія выкарыстоўваюцца плацельшчыкамі пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці ці для залічэння сум задатку (закладу) пры аплатным адчужэнні маёмасці, калі выконваецца хаця б адна з указаных ніжэй умоў:

такія даходы налічаны па працэнтнай стаўцы, якая не перавышае памер працэнтнай стаўкі па банкаўскім укладзе (дэпазіце) да запатрабавання;

фактычны тэрмін размяшчэння грашовых сродкаў на рахунку банкаўскага ўкладу (дэпазіту), бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку ў беларускіх рублях складае не менш за адзін год, а ў замежнай валюце – не менш за два гады.

Для мэт гэтай главы пад фактычным тэрмінам размяшчэння грашовых сродкаў на ўказаных рахунках разумеецца тэрмін знаходжання грашовых сродкаў на гэтых рахунках з даты ўнясення грашовых сродкаў на рахунак да даты іх зняцця (вяртання). Пры гэтым пад пачаткам тэрміну размяшчэння грашовых сродкаў разумеецца дата ўнясення плацельшчыкам кожнай грашовай сумы на рахунак (першапачатковага ўзносу, дадатковага ўзносу), пад заканчэннем тэрміну – дата зняцця плацельшчыкам грашовай сумы з рахунку (частковага зняцця ці поўнага вяртання).

Для мэт прымянення палажэнняў часткі першай гэтага пункта залічэнне на банкаўскі ўклад (дэпазіт), бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак працэнтаў, налічаных на грашовыя сродкі, тэрмін фактычнага размяшчэння якіх на такіх рахунках у беларускіх рублях складае не менш за адзін год, а ў замежнай валюце – не менш за два гады, не адносіцца да размяшчэння грашовых сродкаў, не з'яўляецца фактычнай выплатай працэнтаў і не ўплывае на вызначэнне тэрміну фактычнага размяшчэння грашовых сродкаў на такіх рахунках.

Палажэнні гэтага пункта прымяняюцца ў адносінах да даходаў у выглядзе працэнтаў, атрыманых па банкаўскіх укладах (дэпазітах), грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку, у адпаведнасці з дагаворамі, заключанымі з 1 красавіка 2016 года;

37. даходы ў выглядзе працэнтаў па ашчадных сертыфікатах, калі выконваецца хаця б адна з указаных ніжэй умоў:

такія даходы налічаны па працэнтнай стаўцы, якая не перавышае памер працэнтнай стаўкі па банкаўскім укладзе (дэпазіце) да запатрабавання;

ашчадны сертыфікат прад'яўлены да аплаты не раней за год да сканчэння тэрміну яго абарачэння;

38. даходы, якія не з'яўляюцца ўзнагародамі за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў (за выключэннем даходаў, указаных у пункце 24 гэтага артыкула), якія атрымліваюцца ад прафсаюзных арганізацый членамі такіх арганізацый, у тым ліку ў выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, аплаты кошту пуцёвак (за выключэннем даходаў, указаных у пунктах 14, 29 і 30 гэтага артыкула), у памеры, які не перавышае 397 беларускіх рублёў, ад кожнай прафсаюзнай арганізацыі на працягу падатковага перыяду.

Даходы, атрыманыя ад прафсаюзных арганізацый членамі такіх арганізацый у выглядзе ўзнагароды адначасова на двух падставах – за добрасумленны і актыўны ўдзел у дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі і ў сувязі з дзяржаўнымі святамі, святочнымі днямі, памятнымі і юбілейнымі датамі фізічных асоб і арганізацый, вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у памеры, прадугледжаным гэтым пунктам;

39. субсідыі, фінансавая падтрымка дзяржавы і фінансавая дапамога дзяржавы, якія даюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі фізічным асобам пры будаўніцтве (рэканструкцыі) ці набыцці жылых памяшканняў;

40. узносы, якія вяртаюцца плацельшчыкам у парадку, устаноўленым заканадаўствам, пры спыненні будаўніцтва капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, машына-месцаў або ў выпадку патаннення будаўніцтва, вяртання залішне заплачаных узносаў, а таксама вяртальныя паявыя ўзносы ў выпадку выбыцця плацельшчыкаў з членаў арганізацый забудоўшчыкаў, гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, спажывецкіх кааператываў па газіфікацыі эксплуатаванага жыллёвага фонду;

41. кошт форменнага адзення, якое выдаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

42. даходы ад здачы арганізацыям ці індывідуальным прадпрымальнікам другаснай сыравіны па пераліку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

43. даходы ад рэалізацыі каштоўных металаў і каштоўных камянёў у любым выглядзе і стане ў скупачных пунктах арганізацый, якія ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, скупляе каштоўныя металы і каштоўныя камяні, а таксама ад рэалізацыі каштоўных металаў у выглядзе банкаўскіх і мерных зліткаў, манет, каштоўных камянёў Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь, банкам, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на банкаўскую дзейнасць, які дае права на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый па куплі-продажу каштоўных металаў і (ці) каштоўных камянёў;

44. даходы (акрамя даходаў, атрыманых плацельшчыкамі ад аплатнага адчужэння маёмасці ў сувязі з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці), атрыманыя плацельшчыкамі – падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь ад аплатнага адчужэння, калі іншае не прадугледжана абзацам другім гэтай часткі:

на працягу пяці гадоў (у тым ліку шляхам продажу, мены, рэнты) адной не завершанай будаўніцтвам капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), размешчанай на зямельным участку, дадзеным для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садаводства, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу, аднаго жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), адной кватэры, адной дачы, аднаго садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), аднаго гаража, аднаго машына-месца, аднаго зямельнага ўчастка, якія належаць ім на праве ўласнасці (долі ў праве ўласнасці на ўказаную маёмасць). Падлік пяцігадовага тэрміну праводзіцца з даты апошняга аплатнага адчужэння маёмасці, якая адносіцца да аднаго віду. Падаткаабкладанне даходаў, атрыманых ад аплатнага адчужэння маёмасці, якая адносіцца да аднаго віду, ажыццяўляецца пачынаючы з другога аплатнага адчужэння такога віду маёмасці. Пры адчужэнні на працягу аднаго дня дзвюх і больш адзінак маёмасці, якая адносіцца да аднаго віду, права вызначэння чарговасці здзяйснення здзелак даецца плацельшчыку. Палажэнні гэтага абзаца таксама распаўсюджваюцца на даходы, што атрымліваюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, ад аплатнага адчужэння ўказанай маёмасці;

на працягу каляндарнага года аднаго аўтамабіля, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3500 кілаграмаў і колькасць сядзячых месцаў якога, апрача сядзення вадзіцеля, не перавышае восем, ці іншага механічнага транспартнага сродку. Пры адчужэнні на працягу аднаго дня двух і больш механічных транспартных сродкаў права вызначэння чарговасці здзяйснення здзелак даецца плацельшчыку. Падаткаабкладанне даходаў ад адчужэння механічнага транспартнага сродку ажыццяўляецца пачынаючы з другога адчужэння такога транспартнага сродку;

іншай маёмасці, якая належыць фізічным асобам на праве ўласнасці. Да іншай маёмасці не адносяцца каштоўныя паперы і фінансавыя інструменты тэрміновых здзелак, аб'екты нерухомай маёмасці, не ўказаныя ў абзацы другім гэтай часткі, маёмасныя правы, долі, паі (часткі долі, паю) у арганізацыях, а таксама маёмасць, якая раней выкарыстоўвалася плацельшчыкам у прадпрымальніцкай дзейнасці ў якасці асноўных сродкаў, і маёмасць, указаная ў пункце 19 гэтага артыкула;

маёмасці, атрыманай плацельшчыкам у спадчыну, незалежна ад парадку, прадугледжанага абзацамі другім – чацвёртым гэтай часткі.

Для мэт гэтага пункта і артыкула 211 гэтага Кодэкса датай аплатнага адчужэння маёмасці прызнаецца дата падпісання дагавора адчужэння маёмасці.

Пры вызначэнні чарговасці адчужэння маёмасці для выканання ўмоў, прадугледжаных абзацамі другім і трэцім часткі першай гэтага пункта, не ўлічваюцца:

здзелкі аплатнага адчужэння маёмасці, атрыманай плацельшчыкам у спадчыну;

здзелкі аплатнага адчужэння маёмасці, заключаныя плацельшчыкам з асобамі, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага, за выключэннем дагавораў куплі-продажу і (ці) іншых грамадзянска-прававых дагавораў, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

Для мэт гэтага пункта не прызнаецца аплатным адчужэннем маёмасці спыненне права ўласнасці ў выпадку прымусовага адабрання ва ўласніка маёмасці ў выніку:

накіравання спагнання на маёмасць па абавязацельствах;

адчужэння маёмасці, якая паводле акта заканадаўства не можа належаць гэтай асобе;

адчужэння нерухомай маёмасці ў сувязі з адабраннем зямельнага ўчастка;

выкупу культурных каштоўнасцей, якія ўтрымліваюцца безгаспадарча;

рэквізіцыі;

канфіскацыі;

перадачы па рашэнні суда адным з удзельнікаў долі ў праве ўласнасці на маёмасць іншым удзельнікам долевай уласнасці;

адчужэння маёмасці ў выпадку страты ўласнікам нерухомасці права карыстання зямельным участкам;

нацыяналізацыі;

адабрання зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб;

45. даходы ад рэалізацыі маёмасці, атрыманай плацельшчыкамі ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь у кошт аплаты працы (грашовага забеспячэння), у межах памераў заработнай платы (грашовага забеспячэння), пацверджаных даведкай аб памеры заработнай платы (грашовага забеспячэння), якая выдаецца арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам, якія з’яўляюцца месцам асноўнай працы (службы), з указаннем наймення, колькасці (аб'ёму) і кошту маёмасці, перададзенай фізічнай асобе ў кошт аплаты працы;

46. даходы, атрыманыя плацельшчыкам, які мае права на сацыяльны падатковы вылік у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 210 гэтага Кодэкса, у выглядзе безнаяўнай аплаты арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам кошту навучання плацельшчыка ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў выглядзе расходаў на пагашэнне (вяртанне) крэдытаў (уключаючы працэнты па іх) банкаў, фактычна зрасходаваных плацельшчыкам на атрыманне адукацыі. Такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб пры падачы плацельшчыкам арганізацыі ці індывідуальнаму прадпрымальніку дакументаў, якія пацвярджаюць права на вылік;

47. грашовае забеспячэнне (утрыманне), якое атрымліваюць па месцы службы жанчыны з ліку асоб ваеннаслужачых, за перыяд іх знаходжання ў сацыяльным водпуску па цяжарнасці і родах;

48. грашовае забеспячэнне, сутачныя і іншыя сумы, якія атрымліваюць па месцы службы (збораў) ваеннаслужачыя тэрміновай ваеннай службы і ваеннаабавязаныя, прызванымі на ваенныя і спецыяльныя зборы, грашовае забеспячэнне, харчовае і рэчавае забеспячэнне фізічных асоб, якія навучаюцца ў суворaўскіх, кадэцкіх вучылішчах і спецыялізаваных ліцэях, і выхаванцаў воінскіх частак па нормах, устаноўленых заканадаўствам, штомесячнае грашовае ўтрыманне, якое выплачваецца грамадзянам, што праходзяць альтэрнатыўную службу;

49. кошт аб'ёму ўтрымання з забеспячэннем атрымальніка рэнты па дагаворы пажыццёвага ўтрымання з забеспячэннем;

50. даходы, атрыманыя навучэнцамі, якія атрымліваюць агульную сярэднюю, прафесіянальна-тэхнічную, спецыяльную адукацыю, ад рэалізацыі выраблены тавараў (выканання прац, аказання паслуг), прадугледжаных навучальна-праграмнай дакументацыяй, планам выхаваўчай працы навучальнай установы, праграмамі выхавання;

51. даходы, атрыманыя за працу ў складзе студэнцкіх атрадаў, сфарміраваных у парадку, устаноўленым заканадаўствам, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

52. даходы, атрыманыя ад здачы ўнаём (паднаём) жылых памяшканняў маладым спецыялістам, маладым рабочым (служачым). Такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб на працягу ўстаноўленых заканадаўствам тэрмінаў абавязковай працы (службы) па размеркаванні маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых).

Для мэт гэтага артыкула да маладых спецыялістаў, маладых рабочых (служачых) адносяцца выпускнікі, якім месца працы (службы) дадзена шляхам размеркавання, выпускнікі, накіраваныя на працу (службу) у адпаведнасці з дагаворам аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага), а таксама ў адпаведнасці з кантрактам аб праходжанні ваеннай службы на пасадах афіцэрскага складу пасля заканчэння ваенных навучальных устаноў;

53. даходы, якія атрымліваюцца са сродкаў замежнай бязвыплатнай дапамогі (у тым ліку даходы, якія атрымліваюцца дзецьмі і асобамі, якія суправаджаюць іх, у сувязі з аздараўленнем дзяцей за мяжой) ці міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

54. даходы ў выглядзе штомесячных грашовых выплат бацькам-выхавальнікам, апекунам (папячыцелям), прыёмным бацькам дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках), апякунскіх сем'ях і прыёмных сем'ях, сем'ям, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей, што выплачваюцца ў парадку і памерах, прадугледжаных заканадаўствам;

55. даходы ў выглядзе грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры;

56. кошт жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонду, якія займаюцца па дагаворы найму ваеннаслужачымі, уключаючы звольненых з ваеннай службы, суддзямі і пракурорскімі работнікамі, якія маюць дваццаць і больш каляндарных гадоў выслугі на ваеннай службе, за выключэннем перыядаў навучання ў ваенных навучальных установах, установах адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, і (ці) стажу працы ў якасці суддзі, дзяржаўнага арбітра, стажора суддзі, пракурорскага работніка (за выключэннем жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, службовых жылых памяшканняў, жылых памяшканняў спецыяльнага службовага жыллёвага фонду, спецыяльных жылых памяшканняў, жылых памяшканняў у інтэрнатах), якія бязвыплатна перадаюцца ва ўласнасць гэтых ваеннаслужачых, суддзяў і пракурорскіх работнікаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

57. даходы, атрыманыя плацельшчыкамі – індывідуальнымі прадпрымальнікамі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) у аб'ектах прыдарожнага сэрвісу на працягу пяці гадоў з даты ўводу ў эксплуатацыю такіх аб'ектаў;

58. даходы, налічаныя за дзень правядзення рэспубліканскага суботніка і пералічаныя наймальнікамі ва ўстаноўленым парадку;

59. даходы адвакатаў, якія ажыццяўляюць адвакацкую дзейнасць у адвакацкім утварэнні ў форме юрыдычнай кансультацыі або ў форме адвакацкага бюро, атрыманыя

ад ажыццяўлення такой дзейнасці і накіраваныя імі на аплату ўзносаў на ўтрыманне тэрытарыяльных калегій адвакатаў, членамі якіх яны з'яўляюцца;

60. даходы натарыусаў, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльных канторах, атрыманыя ад ажыццяўлення натарыяльнай дзейнасці і накіраваныя імі на аплату ўзносаў, неабходных для ўтрымання Беларускай натарыяльнай палаты, яе арганізацыйных структур і выканання ўскладзеных на іх задач і функцый;

61. даходы ў памеры намінальнага кошту жыллёвых аблігацый і працэнтнага даходу па іх (калі выплата працэнтнага даходу прадугледжана ўмовамі эмісіі), атрыманыя ад арганізацыі – эмітэнта гэтых аблігацый пры іх пагашэнні (датэрміновым пагашэнні), а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных як аплата кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый, ці скасавання такога дагавора да сканчэння тэрміну яго выканання, у тым ліку праіндэксаваныя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

62. даходы, атрыманыя дзецьмі ва ўзросце ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў за выкананую працу ў перыяд знаходжання ў лагерах працы і адпачынку, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам;

63. да 31 снежня 2019 года даходы, атрыманыя па заключаных з суб'ектамі рынку беспаставачных пазабіржавых фінансавых інструментаў пагадненнях аб здзяйсненні аперацый з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі;

64. да 31 снежня 2020 года даходы ў выглядзе працэнтаў па дагаворах пазыкі, у тым ліку мікрапазыкі, іншых дагаворах, якія прадугледжваюць аналагічныя ўмовы перадачы ва ўласнасць грашовых сродкаў, заключаных фізічнымі асобамі са спажывецкімі кааператывамі фінансавай узаемадапамогі, членамі якіх яны з'яўляюцца, пры фактычным тэрміне такіх дагавораў не менш чым адзін год;

65. даходы фізічных асоб, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, ад выканання прац (аказання паслуг), звязаных з эмісіяй, размяшчэннем, абарачэннем, пагашэннем дзяржаўных доўгатэрміновых аблігацый Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі даўгавымі абавязацельствамі, што фарміруюць знешні дзяржаўны доўг, з улікам правоў на такія аблігацыі, а таксама з прадстаўленнем інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у рамках дасудовага ўрэгулявання спрэчак, у міжнародных арбітражах і замежных судовых органах па спрэчках паміж замежнымі інвестарамі і Рэспублікай Беларусь.

**Артыкул 209. Стандартныя падатковыя вылікі**

1. Пры вызначэнні памеру падатковай базы ў адпаведнасці з пунктамі 3–5 артыкула 199 гэтага Кодэкса плацельшчык мае права на атрыманне наступных стандартных падатковых вылікаў:

1.1. у памеры 110 беларускіх рублёў на месяц пры атрыманні даходу, які падлягае падаткаабкладанню, у суме, якая не перавышае 665 беларускіх рублёў на месяц;

1.2. у памеры 32 беларускіх рублёў на месяц на дзіця да васямнаццаці гадоў і (ці) кожнага ўтрыманца.

Утрыманцамі для мэт гэтага артыкула прызнаюцца:

фізічныя асобы, якія знаходзяцца ў водпуску для догляду за дзіцём ці фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць догляд за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў – для мужа (жонкі), а пры яго (яе) адсутнасці – для фізічнай асобы, ва ўстаноўленым парадку прызнанай бацькам (маці) дзіцяці, з даходаў якой па рашэнні суда ці распараджэнні фізічнай асобы ўтрымліваюцца сумы на забеспячэнне гэтага ўтрыманца ў памеры не меншым чым прадугледжаны для спагнання аліментаў. У выпадку, калі ў водпуску па доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў пры наяўнасці бацькоў (аднаго з

ix) знаходзіцца фізічная асоба з ліку асоб, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, якая не з'яўляецца бацькам (маці) дзіцяці і не мае жонкі (мужа), яна прызнаецца ўтрыманцам для аднаго з бацькоў дзіцяці;

навучэнцы, старэйшыя за васямнаццаць гадоў, якія атрымліваюць у дзённай форме атрымання адукацыі агульную сярэднюю, спецыяльную, першую прафесіянальна-тэхнічную, першую сярэднюю спецыяльную, першую вышэйшую адукацыю, – для іх бацькоў;

непаўналетнія, над якімі ўстаноўлены апека ці папячыцельства, – для апекуноў ці папячыцеляў гэтых непаўналетніх;

інваліды I і II групы, старэйшыя за васямнаццаць гадоў, – для іх бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), мужа (жонкі), апекуна ці папячыцеля.

Стандартны падатковы вылік, устаноўлены гэтым падпунктам, даецца з месяца нараджэння (усынаўлення, удачарэння) дзіцяці, уступлення ў сілу рашэння суда аб аднаўленні ў бацькоўскіх правах, аб вяртанні дзіцяці бацькам, аб адмене рашэння аб прызнанні адсутным без вестак або аб абвяшчэнні памерлым бацькі (маці) дзіцяці, устанаўлення апекі, папячыцельства ці з'яўлення ўтрыманца і захоўваецца да канца месяца, у якім:

дзіця дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту;

навучэнцамі спынены адукацыйныя адносіны з установамі адукацыі;

фізічная асоба перастала быць утрыманцам;

надышла смерць дзіцяці ці ўтрыманца;

спынены апека, папячыцельства;

уступіла ў сілу рашэнне суда аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў, аб адабранні дзіцяці і перадачы яго на апеку органаў апекі і папячыцельства, аб адмене ўсынаўлення (удачарэння) дзіцяці.

Стандартны падатковы вылік даецца абодвум бацькам, бацькам-выхавальнікам у дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках), прыёмнаму бацьку (маці), удаве (удаўцу), адзінокаму бацьку (маці), апекуну ці папячыцелю, на ўтрыманні якіх знаходзяцца дзіця і (ці) утрыманец.

Удаве (удаўцу), адзінокаму бацьку (маці), прыёмнаму бацьку (маці), апекуну ці папячыцелю стандартны падатковы вылік даецца ў памеры 61 беларускага рубля на месяц на кожнае дзіця да васямнаццаці гадоў і (ці) кожнага ўтрыманца.

Адзінокімі бацькамі прызнаюцца:

маці, якая не знаходзіцца ў шлюбе і мае дзіця, звесткі аб бацьку якога запісаны ў запісе акта аб нараджэнні дзіцяці па ўказанні маці ці па ўказанні іншай асобы, якая падала заяву аб рэгістрацыі нараджэння;

бацька (маці), калі маці (бацька) дзіцяці памерлі, пазбаўлены бацькоўскіх правоў, прызнаны адсутнымі без вестак, аб'яўлены памерлымі;

усынавіцель (удачарыцель), які не знаходзіцца ў шлюбе.

Даванне стандартнага падатковага выліку ў памеры 61 беларускага рубля на месяц удаве (удаўцу), адзінокаму бацьку (маці) спыняецца з месяца:

усынаўлення (удачарэння) дзіцяці пры іх узяцці шлюбу;

уступлення ў сілу рашэння суда аб аднаўленні ў бацькоўскіх правах, аб адмене рашэння аб прызнанні адсутным без вестак або аб абвяшчэнні памерлым бацькі (маці) дзіцяці.

Бацькам, якія маюць двух і больш дзяцей ва ўзросце да васямнаццаці гадоў ці дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, стандартны падатковы вылік даецца ў памеры 61 беларускага рубля на месяц на кожнае дзіця.

Стандартны падатковы вылік, устаноўлены гэтым падпунктам, даецца плацельшчыкам, якія адносяцца да дзвюх і больш катэгорый, у памеры, які не перавышае 61 беларускі рубель на месяц, на кожнае дзіця і (ці) кожнага ўтрыманца;

1.3. у памеры 155 беларускіх рублёў на месяц для наступных катэгорый плацельшчыкаў:

фізічных асоб, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, інвалідаў, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь калецтва ці захворвання, якія выклікалі інваліднасць, з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, іншымі радыяцыйнымі аварыямі;

фізічных асоб, якія прымалі ўдзел у працах па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у 1986–1987 гадах у зоне эвакуацыі (адчужэння) ці занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых працах на Чарнобыльскай АЭС (у тым ліку часова накіраваныя і камандзіраваныя), уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутыя да выканання прац, звязаных з ліквідацыяй наступстваў гэтай катастрофы, а таксама ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў іншых радыяцыйных аварый, указаных у падпунктах 3.1–3.4 пункта 3 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 17, 2/1561);

фізічных асоб – Герояў Сацыялістычнай Працы, Герояў Савецкага Саюза, Герояў Беларусі, поўных кавалераў ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны;

фізічных асоб – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асоб, якія маюць права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 года «Аб ветэранах» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 15, ст. 249; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2001 г., № 67, 2/787);

фізічных асоб – інвалідаў I і II групы незалежна ад прычын інваліднасці, інвалідаў з дзяцінства, дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў.

Стандартны падатковы вылік, устаноўлены гэтым падпунктам, даецца плацельшчыкам, якія адносяцца да дзвюх і больш катэгорый, у памеры, які не перавышае 155 беларускіх рублёў на месяц.

2. Устаноўленыя ў гэтым артыкуле стандартныя падатковыя вылікі даюцца плацельшчыку падатковым агентам, які з'яўляецца для яго месцам асноўнай працы (службы, навучання).

Пры адсутнасці месца асноўнай працы (службы, навучання) стандартныя падатковыя вылікі даюцца плацельшчыку па іх пісьмовай заяве пры прад'яўленні працоўнай кніжкі, а пры адсутнасці працоўнай кніжкі – па пісьмовай заяве плацельшчыка з указаннем прычыны яе адсутнасці:

на працягу падатковага перыяду – падатковым агентам;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковым органам па даходах, якія падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 219 гэтага Кодэкса.

Пры гэтым пры адсутнасці месца асноўнай працы (службы, навучання) стандартныя падатковыя вылікі даюцца па выбары плацельшчыка толькі адным падатковым агентам або падатковым органам.

Стандартныя падатковыя вылікі даюцца ў памерах, якія дзейнічалі ў месяцы, за які вылічваецца падаходны падатак з фізічных асоб.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты, якія не маюць на працягу справаздачнага (падатковага) перыяду (яго часткі) месца асноўнай працы (службы, навучання), прымяняюць стандартныя падатковыя вылікі пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў, атрыманых адпаведна ад ажыццяўлення

прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца індывідуальна, за тыя каляндарныя месяцы справаздачнага (падатковага) перыяду, у якія ў індывідуальнага прадпрымальніка, натарыуса, адваката адсутнічала месца асноўнай працы (службы, навучання), зыходзячы з устаноўленых памераў, якія адносяцца на кожны месяц справаздачнага (падатковага) перыяду. Пры гэтым стандартны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, прымяняецца пры ўмове, што памер даходаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, зменшаных на суму расходаў, прадугледжаных артыкулам 205 гэтага Кодэкса, не перавышае ў адпаведным каляндарным квартале 1994 беларускія рублі.

3. Стандартны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

звестак, якія ёсць у падатковага агента, аб наяўнасці ў плацельшчыка дзіцяці (дзяцей), а пры адсутнасці такіх звестак – копіі пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), або выканаўчага дакумента на спагнанне сродкаў на ўтрыманне дзіцяці (дзяцей), або заявы плацельшчыка на вылічэнне аліментаў у добраахвотным парадку – для бацькоў непаўналетніх;

даведкі аб знаходжанні фізічнай асобы ў водпуску для догляду за дзіцём ва ўзросце да трох гадоў або рашэння камісіі па прызначэнні дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, і дапамог па часовай непрацаздольнасці аб прызначэнні дапамогі па доглядзе за дзіцём ва ўзросце да трох гадоў, даведкі аб памеры дапамогі на дзяцей і перыядзе яе выплаты з указаннем звестак аб фізічнай асобе, якая ажыццяўляе догляд за дзіцём ва ўзросце да трох гадоў, – для мужа (жонкі), а пры яго (яе) адсутнасці – для фізічнай асобы, ва ўстаноўленым парадку прызнанай бацькам (маці) дзіцяці, з даходаў якога па рашэнні суда ці па распараджэнні фізічнай асобы ўтрымліваюцца сумы на забеспячэнне гэтага ўтрыманца ў памеры, не меншым за прадугледжаны для спагнання аліментаў;

даведкі (яе копіі) аб тым, што асоба, старэйшая за васямнаццаць гадоў, з'яўляецца (з'яўлялася) навучэнцам і атрымлівае (атрымлівала) у дзённай форме атрымання адукацыі агульную сярэднюю, спецыяльную, першую прафесіянальна-тэхнічную, першую сярэднюю спецыяльную ці першую вышэйшую адукацыю, з указаннем у ёй перыяду, на працягу якога гэта асоба з'яўляецца (з'яўлялася) навучэнцам, – для бацькоў гэтай асобы;

копіі пасведчання дзіцяці-інваліда – для бацькоў дзіцяці;

копій пасведчання інваліда, пасведчання аб заключэнні шлюбу, пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), іншых дакументаў, якія пацвярджаюць ступень блізкай роднасці, выпіскі з рашэння органаў апекі і папячыцельства – для бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), мужа (жонкі), апекуноў ці папячыцеляў інвалідаў I і II групы;

копіі рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні) дзіцяці (дзяцей) – для ўсынавіцеляў (удачарыцеляў);

копіі выпіскі з рашэння органаў апекі і папячыцельства – для апекуноў і папячыцеляў;

копіі выпіскі з рашэння органаў апекі і папячыцельства або копіі дагавора аб умовах выхавання і ўтрымання дзяцей, копіі пасведчання на права прадстаўлення інтарэсаў выхаванцаў – для бацькоў-выхавальнікаў у дзіцячых дамах сямейнага тыпу;

копіі дагавора аб перадачы дзіцяці на выхаванне ў сям'ю, пасведчання (яго копіі) устаноўленага ўзору – для прыёмных бацькоў;

даведкі, якая выдаецца органам, што рэгіструе акты грамадзянскага стану, якая змяшчае звесткі з запісу акта аб нараджэнні дзіцяці аб тым, што звесткі аб бацьку запісаны па ўказанні маці ці па ўказанні іншай асобы, якая падала заяву аб рэгістрацыі нараджэння, – для адзінокіх бацькоў;

копіі пасведчання аб смерці мужа (жонкі), бацькі (маці) дзіцяці – для ўдоў (удаўцоў), адзінокіх бацькоў;

выпіскі (яе копіі) з працоўнай кніжкі або даведкі аб месцы працы, службы і займанай пасадзе – для бацькоў-выхавальнікаў у дзіцячых вёсках (гарадках);

копіі рашэння суда аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў, аб адмене ўсынаўлення (удачарэння) – для адзінокіх бацькоў, калі бацька (маці) пазбаўлены бацькоўскіх правоў або перасталі быць бацькам (маці) з прычыны адмены факта ўсынаўлення (удачарэння);

копіі рашэння суда аб адсутнасці без вестак, аб абвяшчэнні памерлым мужа (жонкі), бацькі (маці) дзіцяці – для адзінокіх бацькоў.

4. Стандартны падатковы вылік, установлены падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

пасведчання пацярпелага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, якое дае права на льготы ў адпаведнасці з артыкуламі 18 ці 19 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый»;

кніжак Герояў Сацыялістычнай Працы, Герояў Савецкага Саюза, пасведчання да звання «Герой Беларусі», ордэнскіх кніжак, для поўных кавалераў ордэнаў Айчыны – пасведчання да ордэна Айчыны, а пры адсутнасці гэтых дакументаў – даведкі ваеннага камісарыята, якая пацвярджае ўказаныя званні (узнагароджанне ордэнамі);

пасведчання адзінага ўзору, устаноўленага для кожнай катэгорыі асоб Урадам СССР да 1 студзеня 1992 года або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь; пасведчання інваліда Айчыннай вайны; пасведчання інваліда аб праве на льготы; пасведчання аб праве на льготы; пенсійнага пасведчання з запісам «Ветэран Вялікай Айчыннай вайны»; пасведчання ўдзельніка вайны; пасведчання аб праве на льготы; «Пасведчання інваліда»; пасведчання інваліда; пасведчання інваліда баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; пасведчання ветэрана баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; іншыя пасведчанні;

«Пасведчання інваліда», «Удостоверения инвалида», пасведчання інваліда, у якіх змяшчаюцца даныя аб прызначэнні яго ўладальніку адпаведнай групы інваліднасці.

5. Дакументы, якія з'яўляюцца падставай для давання стандартных падатковых вылікаў, пададзеныя падатковаму агенту ці падатковаму органу ў папярэднім падатковым перыядзе, у наступныя падатковыя перыяды паўторна гэтаму падатковаму агенту ці падатковаму органу не падаюцца.

Індывідуальны прадпрымальнік (натарыус, адвакат) падае дакументы, якія пацвярджаюць права на прымяненне стандартных падатковых вылікаў, у падатковы орган пры падачы падатковай дэкларацыі (разліку) за першы справаздачны перыяд падатковага перыяду, у якім прымяняюцца такія падатковыя вылікі.

**Артыкул 210. Сацыяльныя падатковыя вылікі**

1. Пры вызначэнні памеру падатковай базы ў адпаведнасці з пунктамі 3, 4 і 9 артыкула 199 гэтага Кодэкса плацельшчык мае права на атрыманне наступных сацыяльных падатковых вылікаў:

1.1. у суме, заплачанай плацельшчыкам на працягу падатковага перыяду за сваё навучанне ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь пры атрыманні першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай ці першай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, а таксама на пагашэнне (вяртанне) крэдытаў банкаў, пазык, атрыманых ад беларускіх арганізацый ці беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў (уключаючы працэнты па іх, за выключэннем працэнтаў, заплачаных за нясвоечасовае пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык і (ці) за нясвоечасовую выплату працэнтаў па крэдытах, пазыках), фактычна зрасходаваных ім на атрыманне першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай ці першай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

Выліку падлягаюць таксама сумы, заплачаныя плацельшчыкам за навучанне асоб, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці (плацельшчыкам-апекуном, плацельшчыкам-папячыцелем – за навучанне сваіх падапечных, у тым ліку былых падапечных, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту), ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь пры атрыманні імі першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай ці першай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, і сумы расходаў, праведзеных указаным плацельшчыкам па пагашэнні (вяртанні) крэдытаў банкаў, пазык, атрыманых ад беларускіх арганізацый ці беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў (уключаючы працэнты па іх, за выключэннем працэнтаў, заплачаных за нясвоечасовае пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык і (ці) нясвоечасовую выплату працэнтаў па крэдытах, пазыках), фактычна зрасходаваных ім на атрыманне першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай ці першай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі гэтымі асобамі. Пры гэтым права на прымяненне сацыяльнага падатковага выліку маюць маці і бацька незалежна ад таго, кім з іх ажыццёўлены гэтыя расходы;

1.2. у суме, заплачанай плацельшчыкам страхавым арганізацыям Рэспублікі Беларусь (кампенсаванай плацельшчыкам падатковаму агенту) у якасці страхавых узносаў па дагаворах добраахвотнага страхавання жыцця і дадатковай пенсіі, заключаных на тэрмін, не меншы за тры гады, а таксама па дагаворах добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў (далей у гэтым артыкуле – дагавор добраахвотнага страхавання).

Выліку падлягаюць таксама сумы, заплачаныя плацельшчыкам страхавым арганізацыям Рэспублікі Беларусь (кампенсаваныя плацельшчыкам падатковаму агенту) у якасці страхавых узносаў па дагаворах добраахвотнага страхавання, заключаных ім у інтарэсах асоб, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці (плацельшчыкам-апекуном, плацельшчыкам-папячыцелем – за сваіх падапечных, у тым ліку былых падапечных, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту).

2. Устаноўленыя гэтым артыкулам сацыяльныя падатковыя вылікі даюць плацельшчыкам:

на працягу падатковага перыяду – падатковы агент;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковыя органы па даходах, якія падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 219 гэтага Кодэкса.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты, якія не маюць на працягу справаздачнага ці падатковага перыяду месца асноўнай працы (службы, навучання), прымяняюць сацыяльныя падатковыя вылікі пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб за справаздачны ці падатковы перыяд з даходаў, атрыманых адпаведна ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца індывідуальна.

3. Сацыяльны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

даведкі (яе копіі) установы адукацыі Рэспублікі Беларусь, якая пацвярджае, што плацельшчык ці яго блізкі сваяк, яго падапечны з'яўляецца (з'яўляўся) навучэнцам установы адукацыі і атрымлівае (атрымліваў) першую вышэйшую, першую сярэднюю спецыяльную ці першую прафесіянальна-тэхнічную адукацыю, з указаннем перыяду атрымання адукацыі;

копіі дагавора аб падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага) на платнай аснове, заключанага з установай адукацыі Рэспублікі Беларусь;

копіі загада (выпіскі з яго) кіраўніка ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь аб кошце навучання (яго змяненні) за адпаведны перыяд навучання – у выпадку адсутнасці кошту навучання ў дагаворы аб падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага) на платнай аснове;

копій пасведчання аб заключэнні шлюбу, пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), дакументаў, якія пацвярджаюць ступень блізкай роднасці, выпіскі з рашэння органаў апекі і папячыцельства – пры ажыццяўленні расходаў на атрыманне адукацыі адпаведна асоб, якія знаходзяцца ў адносінах блізкай роднасці, падапечных, у тым ліку тых, якія былі раней падапечнымі;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату паслуг у сферы адукацыі, пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык (уключаючы працэнты па іх);

копіі крэдытнага дагавора – пры атрыманні крэдытаў банкаў на аплату першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай ці першай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі;

копіі дагавора пазыкі – пры атрыманні пазыковых сродкаў ад беларускіх арганізацый ці беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў;

даведкі аб даходах фізічных асоб па ўстаноўленай форме, іншых дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне даходу, – пры даванні сацыяльнага падатковага выліку падатковым органам.

4. Сацыяльны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

копіі дагавора страхавання;

копіі страхавога поліса (пасведчання, сертыфіката);

копіі паведамлення (апавяшчэння) страхавой арганізацыі Рэспублікі Беларусь аб заключэнні дагавора страхавання – пры заключэнні плацельшчыкам дагавора страхавання шляхам абмену адпаведнымі дакументамі са страхавой арганізацыяй Рэспублікі Беларусь;

копіі дагавора страхавання, заключанага ў форме электроннага дакумента, або дакумента на папяровым носьбіце, ідэнтычнага па змесце дагавору страхавання, заключанаму ў форме электроннага дакумента, – пры заключэнні плацельшчыкам дагавора страхавання ў форме электроннага дакумента са страхавой арганізацыяй Рэспублікі Беларусь;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату ці пакрыццё страхавых узносаў;

копій пасведчання аб заключэнні шлюбу, пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), дакументаў, якія пацвярджаюць ступень блізкай роднасці, выпіскі з рашэння органаў апекі і папячыцельства – пры ажыццяўленні расходаў на страхаванне адпаведна асоб, якія знаходзяцца ў адносінах блізкай роднасці, падапечных, у тым ліку тых, якія былі раней падапечнымі;

даведкі аб даходах фізічных асоб па ўстаноўленай форме, іншых дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне даходу, – пры даванні сацыяльнага падатковага выліку падатковым органам.

5. Дакументы, якія пацвярджаюць фактычную аплату паслуг у сферы адукацыі, пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык (уключаючы працэнты па іх), аплату ці пакрыццё страхавых узносаў, павінны змяшчаць інфармацыю аб прозвішчы, імені, імені па бацьку (калі гэтакае ёсць) плацельшчыка, або асобы, атрыманне адукацыі якой аплаціў плацельшчык, або асобы, за якую праведзена аплата ці пакрыццё страхавых узносаў, суме і даце аплаты ці пакрыцця, прызначэнні плацяжу, калі такія патрабаванні прадугледжаны заканадаўствам, які рэгулюе парадак афармлення ўказаных дакументаў. У выпадку, калі дакументы не змяшчаюць указаных рэквізітаў, да іх дадаецца інфармацыя атрымальніка плацяжу, якая змяшчае адсутныя звесткі.

6. Падатковаму агенту ці падатковаму органу могуць быць пададзены копіі дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату паслуг у сферы адукацыі, пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык (уключаючы працэнты па іх), аплату ці пакрыццё страхавых узносаў (далей у гэтым пункце – дакументы на аплату). У гэтым выпадку падатковым агентам ці падатковым органам пададзеныя копіі дакументаў звяраюцца з іх арыгіналамі,

аб чым робіцца адпаведная адзнака на копіях дакументаў, а на арыгіналах гэтых дакументаў – адзнака аб суме дадзенага сацыяльнага падатковага выліку.

Дакументы, якія з'яўляюцца падставай для давання сацыяльных падатковых вылікаў, за выключэннем дакументаў на аплату, пададзеныя падатковаму агенту ці падатковаму органу ў папярэднім падатковым перыядзе, у наступныя падатковыя перыяды паўторна гэтым падатковаму агенту ці падатковаму органу не падаюцца.

У выпадку страты плацельшчыкам дакументаў на аплату падатковаму агенту ці падатковаму органу падаецца пісьмовае пацвярджэнне атрымальніка грашовых сродкаў аб паступленні такіх сродкаў з указаннем прозвішча, імені, імені па бацьку (калі гэтакае ёсць) плацельшчыка, або асобы, атрыманне адукацыі якой аплаціў плацельшчык, або асобы, за якую праведзена аплата ці пакрыццё страхавых узносаў, суме і даце аплаты ці пакрыцця, прызначэнні плацяжу.

7. Калі ў падатковым перыядзе сацыяльныя падатковыя вылікі плацельшчыку не даваліся ці былі дадзены не ў поўным аб'ёме, то нявыкарыстаныя сумы пераносяцца на наступныя падатковыя перыяды да поўнага іх выкарыстання.

### Артыкул 211. Маёмасныя падатковыя вылікі

1. Пры вызначэнні памеру падатковай базы ў адпаведнасці з пунктамі 3, 4 і 9 артыкула 199 гэтага Кодэкса плацельшчык мае права на атрыманне наступных маёмасных падатковых вылікаў:

1.1. у суме фактычна праведзеных плацельшчыкам і членамі яго сям'і (мужам (жонкай), іх дзецьмі і іншымі асобамі, прызнанымі ў судовым парадку членамі сям'і плацельшчыка), якія знаходзяцца на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ці знаходзіліся на такім уліку на момант заключэння крэдытнага дагавора ці дагавора пазыкі, расходаў на будаўніцтва, у тым ліку шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, або набыццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, у тым ліку ў адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, а таксама на пагашэнне (вяртанне) крэдытаў банкаў, пазык, атрыманых ад беларускіх арганізацый ці беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў (уключаючы працэнты па іх, за выключэннем працэнтаў, заплачаных за нясвоечасовае пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык і (ці) за нясвоечасовую выплату працэнтаў па крэдытах, пазыках), фактычна зрасходаваных імі на будаўніцтва, набыццё жыллёвых аблігацый або набыццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аднакватэрнага жылога дома ці кватэры.

Для мэт прымянення гэтага выліку будаўніцтвам прызнаецца будаўнічая дзейнасць па ўзвядзенні, рэканструкцыі аб'екта, якая ўключае выкананне арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, падрыхтоўку дазвольнай і праектнай дакументацыі на ўзвядзенне, рэканструкцыю аб'екта, выкананне будаўнічых, спецыяльных, мантажных і пусканаладачных прац, у тым ліку мантаж і ўстаноўку сістэм, якія забяспечваюць функцыянаванне аб'екта (электрычных, водаправодных сістэм, сістэм вода-, газазабеспячэння, каналізацыі, сістэм ацяплення).

Права на маёмасны падатковы вылік маюць плацельшчыкі і члены іх сямей, якія знаходзяцца на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ці знаходзіліся на такім уліку на момант заключэння крэдытнага дагавора ці дагавора пазыкі ў мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, іншых дзяржаўных органах і іншых дзяржаўных арганізацыях, арганізацыях недзяржаўнай формы ўласнасці, у выпадку, калі яны былі прызнаны асобамі, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на падставах, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Пры рэканструкцыі аб'екта нерухомасці права на маёмасны падатковы вылік маюць плацельшчыкі і члены іх сямей, якія ажыццявілі на падставе дагавора будаўнічага падраду рэканструкцыю аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, пры ўмове, што ў выніку такой рэканструкцыі такія асобы губляюць падставы для прызнання іх асобамі, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Пры будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома ці кватэры з прыцягненнем забудоўшчыка і (ці) падрадчыка фактычна праведзеныя плацельшчыкамі і членамі іх сямей расходы на такое будаўніцтва падлягаюць выліку ў межах кошту будаўніцтва аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, цаны аб'екта долевага будаўніцтва кватэры, указаных у дагаворы аб будаўніцтве, а пры будаўніцтве кватэры ў складзе жыллёва-будаўнічага кааператыва без заключэння дагавора аб будаўніцтве – у межах кошту будаўніцтва кватэры, указанай у даведцы (яе копіі), якая выдаецца такімі кааператывамі.

Пры будаўніцтве кватэры шляхам набыцця жыллёвых аблігацый фактычна праведзеныя плацельшчыкамі і членамі іх сямей расходы на такое будаўніцтва падлягаюць выліку ў межах памеру грашовых сродкаў, якія падлягаюць унясенню як аплата кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, указанага ў дагаворы, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый.

Пры будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, якое плацельшчык ажыццяўляе без прыцягнення забудоўшчыка ці падрадчыка, расходы на такое будаўніцтва падлягаюць выліку ў межах кошту будаўніцтва, указанага такім плацельшчыкам у заяве, якая падаецца падатковаму агенту ці падатковаму органу. Расходы на такое будаўніцтва, панесеныя плацельшчыкам пасля прыняцця рашэння аб зацвярджэнні акта прыёмкі аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў эксплуатацыю, не падлягаюць маёмаснаму падатковаму выліку. Выпіска (яе копія) з рашэння (загада, пастановы, распараджэння) асобы (органа), які прызначыў прыёмачную камісію, аб зацвярджэнні акта прыёмкі аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў эксплуатацыю падаецца плацельшчыкам падатковаму агенту ці падатковаму органу не пазней за адзін месяц пасля прыёму такога жылога дома ці кватэры ў эксплуатацыю.

Пры набыцці аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, фактычна праведзеныя расходы на такое набыццё падлягаюць выліку ў межах аплаты кошту прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, указанага ў дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу).

Маёмасны падатковы вылік у суме расходаў, накіраваных на будаўніцтва аднакватэрнага жылога дома, даецца пасля атрымання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі зямельнага ўчастка і правоў на яго, ці дзяржаўнага акта на права прыватнай уласнасці, пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання, ці дагавора арэнды зямельнага ўчастка, дадзенага для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома.

Маёмасны падатковы вылік у суме расходаў на набыццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аднакватэрнага жылога дома ці кватэры даецца пасля дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на аднакватэрны жылы дом ці кватэру, а ў выпадку набыцця жылля па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу) такі вылік даецца пасля падпісання акта прыёмкі-перадачы прадмета лізінгу.

У склад фактычна праведзеных расходаў на будаўніцтва або набыццё аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ўключаюцца ў тым ліку:

расходы на набыццё аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

расходы на працы, звязаныя з унутраным адстройваннем аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, – пры будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

расходы на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі;

расходы на набыццё будаўнічых і апрацоўчых матэрыялаў;

расходы на газіфікацыю аднакватэрнага жылога дома, у тым ліку расходы на аплату кошту праектавання і будаўніцтва газаправода-адводу і ўнутрыдомавай сістэмы газазабеспячэння;

расходы на набыццё жыллёвых аблігацый;

расходы на аплату лізінгавых плацяжоў у адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, у частцы аплаты кошту прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры.

Пры набыцці аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў агульную долевую ўласнасць памер маёмаснага падатковага выліку размяркоўваецца паміж удзельнікамі агульнай долевай уласнасці прапарцыянальна іх долі.

Пры набыцці аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў агульную сумесную ўласнасць памер маёмаснага падатковага выліку размяркоўваецца паміж удзельнікамі агульнай сумеснай уласнасці ў адпаведнасці з іх пісьмовай заявай.

У выпадку атрымання (частковага атрымання) плацельшчыкам маёмаснага падатковага выліку такі плацельшчык не мае права атрымаць вылік у адносінах да іншай кватэры ці іншага аднакватэрнага жылога дома.

Калі ў падатковым перыядзе маёмасны падатковы вылік плацельшчыку не даваўся ці такі вылік быў дадзены не ў поўным аб'ёме, то нявыкарыстаная сума пераносіцца на наступныя падатковыя перыяды да поўнага яе выкарыстання.

Маёмасны падатковы вылік, прадугледжаны гэтым падпунктам, даецца плацельшчыку:

на працягу падатковага перыяду – падатковым агентам;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковым органам па даходах, якія падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 219 гэтага Кодэкса.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты, якія не маюць на працягу справаздачнага ці падатковага перыяду месца асноўнай працы (службы, навучання), прымяняюць маёмасны падатковы вылік пры падліку падаходнага падатку з фізічных асоб за справаздачны ці падатковы перыяд з даходаў, атрыманых адпаведна ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца індывідуальна;

1.2. у суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, звязаных з набыццём ці адчужэннем аплатна адчужальнай маёмасці (за выключэннем каштоўных папер і фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак, долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі, прадпрыемства як маёмаснага комплексу).

У склад расходаў, звязаных з набыццём аплатна адчужальнай маёмасці ці яе адчужэннем, уключаюцца ў тым ліку:

расходы на будаўніцтва маёмасці, у тым ліку шляхам набыцця жыллёвых аблігацый;

расходы на набыццё маёмасці, у тым ліку ў адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу;

расходы на пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне крэдытам, пазыкай), выкарыстаных на будаўніцтва ці набыццё адчужальнай маёмасці (у памеры не большым за фактычна пагашаную запазычанасць па крэдыце, пазыцы не пазней за дзень адчужэння маёмасці);

расходы на мадэрнізацыю ці рэканструкцыю капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) пры наяўнасці атрыманага ва ўстаноўленым парадку дазволу на правядзенне будаўнічых прац, пераабсталяванне транспартных сродкаў, замену нумарных агрэгатаў транспартных сродкаў пры ўнясенні адпаведных змяненняў у рэгістрацыйныя дакументы;

расходы на выплату дзяржаўных пошлін, мытных пошлін і мытных збораў, утылізацыйнага збору, консульскага збору, натарыяльнага тарыфу, аплату паслуг

прававога і тэхнічнага характару ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, камісійных узнагарод пры здзяйсненні здзелкі, аплату рыэлтарскіх паслуг, расходы на рэкламу адчужальнай маёмасці пры ўмове, што абавязкі па нясенні такіх расходаў ускладзены заканадаўствам або дагаворам на плацельшчыка, які атрымаў даход.

У склад расходаў, звязаных з набыццём аплатна адчужальнай маёмасці ці яе адчужэннем, калі маёмасць набывалася ва ўласнасць з частковай аплатай або на бязвыплатнай аснове, уключаюцца таксама сумы, з якіх быў вылічаны і аплачаны падаходны падатак з фізічных асоб пры набыцці такой маёмасці, а таксама сумы, якія не падлягаюць падаткаабкладанню ці не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічала на момант набыцця капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), у тым ліку незавершаных будаўніцтвам, гаражоў, машына-месцаў, зямельных участкаў, механічных транспартных сродкаў (долей у праве ўласнасці на ўказаную маёмасць).

Расходамі на прыватызацыю жылога памяшкання, яго часткі бязвыплатна (з улікам ці без уліку жыллёвай квоты, сумы квот) прызнаюцца ацэначны кошт гэтай маёмасці, вызначаны на дату адчужэння жылога памяшкання, яго часткі тэрытарыяльнымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, а пры адсутнасці такога кошту – кошт, вызначаны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам для вылічэння падатку на нерухомасць з фізічных асоб.

Расходы, звязаныя з набыццём аплатна адчужальнай маёмасці ці яе адчужэннем і праведзеныя ў беларускіх рублях, падлягаюць пералічванню ў долары ЗША па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень ажыццяўлення такіх расходаў. Вызначаныя ў доларах ЗША расходы пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання даходаў ад аплатнага адчужэння маёмасці.

Калі курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень ажыццяўлення такіх расходаў, большы за курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, устаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання даходаў ад аплатнага адчужэння маёмасці, то пералічванне, указанае ў частцы пятай гэтага падпункта, не праводзіцца.

Расходы, звязаныя з набыццём аплатна адчужальнай маёмасці і (ці) яе адчужэннем і праведзеныя ў замежнай валюце, падлягаюць пералічванню ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання плацельшчыкам даходаў ад аплатнага адчужэння маёмасці.

Пры аплатным адчужэнні маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці, памер маёмаснага падатковага выліку размяркоўваецца паміж удзельнікамі агульнай долевай уласнасці прапарцыянальна іх долі.

Пры атрыманні даходу ў выглядзе частковай аплаты маёмасці расходы, звязаныя з набыццём такой маёмасці, выключаюцца прапарцыянальна памеру частковай аплаты маёмасці.

Замест атрымання маёмаснага падатковага выліку ў суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, звязаных з набыццём ці адчужэннем аплатна адчужальнай маёмасці, плацельшчыкі маюць права на атрыманне маёмаснага падатковага выліку ў памеры дваццаць (20) працэнтаў сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад адчужэння такой маёмасці.

Пры вызначэнні падатковай базы падатковы вылік у памеры фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, звязаных з набыццём аплатна адчужальнай

маёмасці ці яе адчужэннем, не можа давацца адначасова з падатковым вылікам у памеры дваццаць (20) працэнтаў сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад аплатнага адчужэння маёмасці.

Палажэнні гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на даходы, атрыманыя плацельшчыкам ад аплатнага адчужэння маёмасці ў сувязі з ажыццяўленнем ім прадпрымальніцкай дзейнасці, за выключэннем выпадкаў атрымання ўказаных даходаў пасля спынення такой дзейнасці і выключэння плацельшчыка з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Маёмасны падатковы вылік, прадугледжаны гэтым падпунктам, даецца на выбар плацельшчыка:

на працягу падатковага перыяду – падатковым агентам у памеры дваццаць (20) працэнтаў сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад аплатнага адчужэння маёмасці;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковым органам пры падачы плацельшчыкам падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку з фізічных асоб і дакументаў, якія пацвярджаюць права на атрыманне выліку. Падатковым органам вылік даецца на выбар плацельшчыка ў суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў ці ў памеры дваццаць (20) працэнтаў сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад аплатнага адчужэння маёмасці.

2. Маёмасны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

даведкі (яе копіі) мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ці іншага дзяржаўнага органа і іншых дзяржаўных арганізацый, арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці па месцы працы (службы), якія пацвярджаюць, што плацельшчык і члены яго сем'і знаходзяцца на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ці знаходзіліся на такім уліку на момант заключэння крэдытнага дагавора ці дагавора пазыкі. Форму даведкі зацвярджае Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь;

выпіскі (яе копіі) з рашэння агульнага сходу членаў арганізацыі забудоўшчыкаў (сходу ўпаўнаважаных) аб уключэнні плацельшчыка ці члена яго сям'і, які знаходзіцца на ўліку асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у склад жыллёва-будаўнічага кааператыва – пры будаўніцтве кватэр у складзе жыллёва-будаўнічага кааператыва;

копіі дагавора аб будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, а пры будаўніцтве кватэры ў складзе жыллёва-будаўнічага кааператыва без заключэння дагавора на будаўніцтва – даведкі (яе копіі) аб кошце будаўніцтва кватэры, якая выдаецца такімі кааператывамі;

рашэння (яго копіі) мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або іншага дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, якія прынялі плацельшчыка ці члена яго сям'і на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аб зняцці з такога ўліку ў сувязі з ажыццёўленай рэканструкцыяй аднакватэрнага жылога дома ці кватэры – у выпадку ажыццяўлення рэканструкцыі аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

копіі дагавора будаўнічага падраду на рэканструкцыю аднакватэрнага жылога дома ці кватэры – у выпадку ажыццяўлення рэканструкцыі аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

копій дакументаў, якія пацвярджаюць рэгістрацыю права ўласнасці на аднакватэрны жылы дом ці кватэру, дагавора куплі-продажу аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, – пры набыцці аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату тавараў (прац, паслуг);

копіі крэдытнага дагавора – пры атрыманні плацельшчыкам у банках крэдытаў на будаўніцтва або набыццё на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, а таксама на набыццё жыллёвых аблігацый;

копіі пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі зямельнага ўчастка і правоў на яго, ці дзяржаўнага акта на права прыватнай уласнасці, пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання, ці дагавора арэнды зямельнага ўчастка, дадзенага для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, – пры будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома;

копіі дагавора на набыццё тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг) – пры будаўніцтве аднакватэрнага жылога дома. Пры набыцці такіх тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг) у фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, у дагаворы павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), месца жыхарства, серыя і нумар дакумента, які сведчыць асабістыя якасці такой фізічнай асобы;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычнае пагашэнне (вяртанне) крэдытаў, пазык (уключаючы працэнты па іх), выплату паявых узносаў;

копіі дагавора пазыкі – пры атрыманні пазыковых сродкаў ад беларускіх арганізацый і (ці) беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў;

копій пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), пасведчання аб заключэнні шлюбу, аб скасаванні шлюбу, рашэння суда – пры атрыманні маёмаснага падатковага выліку членамі сям'і;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату кошту набыцця аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

копіі дагавора, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычныя расходы на набыццё жыллёвых аблігацый;

копіі дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

копіі акта прыёмкі-перадачы прадмета лізінгу – пры набыцці аднакватэрнага жылога дома ці кватэры ў адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу;

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату лізінгавых выплат у адпаведнасці з дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, з указаннем у іх сумы аплаты часткі кошту прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

даведкі аб даходах фізічных асоб па ўстаноўленай форме, іншых дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне даходу, – пры даванні маёмаснага падатковага выліку падатковым органам.

3. Маёмасны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, даецца на падставе наступных дакументаў:

копіі крэдытнага дагавора ці дагавора пазыкі – пры набыцці аплатна адчужальнай маёмасці за кошт крэдытных ці пазыковых сродкаў;

копіі дагавора куплі-продажу ці дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, – пры набыцці аплатна адчужальнай маёмасці;

копіі дагавора аб будаўніцтве – пры ажыццяўленні расходаў на будаўніцтва аплатна адчужальных аднакватэрнага жылога дома ці кватэры;

копіі дагавора на набыццё тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг);

дакументаў, якія пацвярджаюць фактычную аплату кошту набыцця аплатна адчужанай маёмасці;

даведкі аб даходах фізічных асоб па ўстаноўленай форме, іншых дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне даходу, – пры даванні маёмаснага падатковага выліку падатковым органам.

Пры набыцці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг) у фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, у дагаворы павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), месца жыхарства, серыя і нумар дакумента, які сведчыць асабістыя якасці такой фізічнай асобы.

Пры адсутнасці ў плацельшчыка дакументаў, якія пацвярджаюць фактычна праведзеныя расходы на набыццё аплатна адчужанай маёмасці, падатковы вылік можа быць дадзены на падставе наяўных у падатковым органе звестак, пададзеных дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

4. Дакументы, якія пацвярджаюць фактычную аплату расходаў на будаўніцтва і (ці) набыццё аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, пагашэнне (вяртанне) крэдытаў банкаў, пазык (уключаючы працэнты па іх), аплату кошту набыцця аплатна адчужанай маёмасці (далей у гэтым пункце – дакументы на аплату), павінны змяшчаць інфармацыю аб прозвішчы, імені, імені па бацьку (калі гэтакае ёсць) плацельшчыка, суме і даце аплаты, прызначэнні плацяжу, калі такія патрабаванні прадугледжаны заканадаўствам, якое рэгулюе парадак афармлення ўказаных дакументаў. У выпадку, калі дакументы на аплату не змяшчаюць указаных рэквізітаў, да іх дадаецца інфармацыя атрымальніка плацяжу, якая змяшчае адсутныя звесткі.

Падатковаму агенту ці падатковаму органу могуць быць пададзены копіі дакументаў аб аплаце. У гэтым выпадку падатковы агент ці падатковы орган звярае пададзеныя копіі з арыгіналамі, аб чым робіцца адпаведная адзнака на копіях дакументаў, а на арыгіналах гэтых дакументаў – адзнака аб суме дадзенага маёмаснага падатковага выліку.

У выпадку страты плацельшчыкам дакументаў на аплату падатковаму агенту ці падатковаму органу падаецца пісьмовае пацвярджэнне атрымальніка грашовых сродкаў аб паступленні такіх сродкаў з указаннем прозвішча, імені, імені па бацьку (калі гэтакае ёсць) плацельшчыка, сумы і даты аплаты, прызначэння плацяжу.

Дакументы, якія з'яўляюцца падставай для атрымання маёмасных падатковых вылікаў, за выключэннем дакументаў на аплату, пададзеныя падатковаму агенту ці падатковаму органу ў папярэднім падатковым перыядзе, у наступныя падатковыя перыяды паўторна гэтым  падатковаму агенту ці падатковаму органу не падаюцца.

**Артыкул 212. Прафесійныя падатковыя вылікі**

Пры вызначэнні памеру падатковай базы ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 199 гэтага Кодэкса права на атрыманне прафесійных падатковых вылікаў маюць наступныя катэгорыі плацельшчыкаў:

1. плацельшчыкі, якія атрымалі аўтарскія ўзнагароды ці ўзнагароды за стварэнне, выкананне ці іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, узнагароды аўтарам вынаходстваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці (за выключэннем такіх даходаў, атрыманых імі ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці), – у адносінах да такіх даходаў у суме фактычна праведзеных імі і дакументальна пацверджаных расходаў.

У склад фактычна праведзеных расходаў, звязаных з атрыманнем узнагароды па выніках інтэлектуальнай дзейнасці, у тым ліку ўключаюцца расходы на:

набыццё сыравіны, матэрыялаў, гатовых вырабаў і паўфабрыкатаў (за вылікам кошту зваротных адходаў), выкарыстаных пры стварэнні вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці;

аплату паліва і энергіі ўсіх відаў, выкарыстаных пры стварэнні вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці;

плату за карыстанне памяшканнямі, якія адносяцца да творчых майстэрань (або іншымі аналагічнымі памяшканнямі), аплату жыллёва-камунальных паслуг, а таксама плату за пажарную і вартавую ахову такіх майстэрань, уключаючы плату за ўсталяванне ахоўнай сігналізацыі;

аплату выкананых арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і фізічнымі асобамі прац і паслуг, звязаных з атрыманнем узнагароды па выніках інтэлектуальнай дзейнасці;

сумы, накіраваныя на пагашэнне (вяртанне) крэдыту і (ці) пазыкі (уключаючы выплату налічаных працэнтаў за карыстанне крэдытам і (ці) пазыкай), выкарыстаных на аплату расходаў, звязаных з атрыманнем узнагароды па выніках інтэлектуальнай дзейнасці (у памеры не большым за фактычна пагашаную запазычанасць па крэдыце і (ці) пазыцы не пазней за дзень атрымання даходу);

рэкламу.

З сумы ўзнагароды па выніках інтэлектуальнай дзейнасці, атрыманай суаўтарамі, расходы выключаюцца прапарцыянальна даходу кожнага аўтара.

Замест атрымання прафесійнага падатковага выліку ў суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў плацельшчык мае права прымяніць прафесійны падатковы вылік у наступных памерах:

дваццаць (20) працэнтаў сумы налічанага даходу – па літаратурных творах; драматычных і музычна-драматычных творах, творах харэаграфіі, пантамімы і іншых сцэнарных творах; картах, планах, эскізах, ілюстрацыях і пластычных творах, якія адносяцца да геаграфіі, картаграфіі і іншых навук; камп'ютарных праграмах; творах навукі; вытворных творах; састаўных творах;

трыццаць (30) працэнтаў сумы налічанага даходу – па аўдыявізуальных творах; творах архітэктуры, горадабудаўніцтва і садова-паркавага мастацтва; фатаграфічных творах, у тым ліку творах, атрыманых спосабамі, аналагічнымі фатаграфіі; вынаходствах, карысных мадэлях, прамысловых узорах і іншых выніках інтэлектуальнай дзейнасці, не ўказаных у абзацах другім і чацвёртым гэтай часткі;

сорак (40) працэнтаў сумы налічанага даходу – па музычных творах з тэкстам ці без тэксту; творах выяўленчага мастацтва; творах прыкладнога мастацтва.

Пры вызначэнні падатковай базы падатковы вылік у памеры фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў не можа давацца адначасова з падатковым вылікам у межах нарматываў, установленых гэтым артыкулам.

Прафесійны падатковы вылік даецца на выбар плацельшчыка:

на працягу падатковага перыяду – падатковым агентам у межах адпаведных нарматываў, установленых гэтым пунктам;

пасля заканчэння падатковага перыяду – падатковым органам пры падачы плацельшчыкам падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку з фізічных асоб і дакументаў, якія пацвярджаюць права на атрыманне такога выліку. Падатковы орган дае прафесійны падатковы вылік на выбар плацельшчыка ў суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў ці ў межах адпаведных нарматываў, установленых гэтым пунктам.

Прафесійны падатковы вылік у суме фактычна праведзеных плацельшчыкам расходаў, звязаных з атрыманнем узнагарод па выніках інтэлектуальнай дзейнасці, даецца на падставе наступных дакументаў:

копіі крэдытнага дагавора ці дагавора пазыкі – пры ажыццяўленні расходаў за кошт крэдытных ці пазыковых сродкаў;

копіі дагавора на набыццё тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг);

дакументаў на аплату расходаў, звязаных з атрыманнем узнагароды па выніках інтэлектуальнай дзейнасці;

даведкі аб даходах фізічных асоб па ўстаноўленай форме, іншых дакументаў, якія пацвярджаюць атрыманне даходу, – пры даванні прафесійнага падатковага выліку падатковым органам.

Пры набыцці тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг) у фізічнай асобы, якая не выступае пры заключэнні дагавору ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, у дагаворы павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), месца жыхарства, серыя і нумар дакумента, які сведчыць асабістыя якасці такой фізічнай асобы;

2. плацельшчыкі – спартсмены і іх трэнеры, якія атрымліваюць даходы ад асабістай дзейнасці за ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, пры ўмове, што такая дзейнасць ажыццяўляецца плацельшчыкамі не ў рамках каманднага ўдзелу (за выключэннем даходаў, атрыманых пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці), – у адносінах да такіх даходаў у суме фактычна праведзеных імі і дакументальна пацверджаных расходаў, непасрэдна звязаных з ажыццяўленнем такой дзейнасці:

на аплату праезду да месца спартыўных спаборніцтваў і назад;

на пражыванне ў перыяд удзелу ў спартыўных спаборніцтвах;

на аплату кошту спартыўнай амуніцыі, абсталявання, спартыўнай і параднай формы;

на аплату фармакалагічных і аднаўленчых сродкаў, медыцынскіх вырабаў, вітамінных бялкова-глюкозных прэпаратаў.

Замест атрымання прафесійнага падатковага выліку ў суме фактычна праведзеных і дакументальна пацверджаных расходаў, звязаных з удзелам плацельшчыка ў спартыўных спаборніцтвах пры ажыццяўленні ім асабістай дзейнасці, ён мае права на атрыманне прафесійнага падатковага выліку ў памеры дваццаць (20) працэнтаў сумы падлеглых падаткаабкладанню даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення такой дзейнасці.

Прафесійны падатковы вылік, устаноўлены гэтым пунктам, даецца пасля заканчэння падатковага перыяду падатковым органам пры падачы плацельшчыкам падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку з фізічных асоб і дакументаў, якія пацвярджаюць права на атрыманне такога выліку.

**Артыкул 213. Дата фактычнага атрымання даходу**

1. У мэтах гэтай главы дата фактычнага атрымання даходу вызначаецца ў адносінах да даходаў плацельшчыка, не звязаных з ажыццяўленнем ім прадпрымальніцкай дзейнасці, як:

1.1. дзень выплаты даходу, у тым ліку залічэння даходу на рахункі плацельшчыка ў банках (замежных банках) або па яго даручэнні на рахункі трэціх асоб, а таксама дзень залічэння электронных грошай у электронны кашалёк плацельшчыка або па яго даручэнні ў электронны кашалёк трэціх асоб – пры атрыманні даходаў у грашовай форме, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам;

1.2. дзень перадачы даходаў у натуральнай форме – пры атрыманні даходаў у натуральнай форме, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам;

1.3. дзень, які ідзе следам за днём, устаноўленым для вяртання маёмасці, – пры невяртанні маёмасці, атрыманай на зваротнай ці ўмоўна зваротнай аснове, у тым ліку ў адпаведнасці з дагаворамі пазыкі, задатку.

Палажэнні гэтага падпункта не прымяняюцца ў выпадках, устаноўленых артыкулам 220 гэтага Кодэкса;

1.4. дзень спынення абавязацельства перад плацельшчыкам па выплаце яму даходу – пры спыненні такога абавязацельства, у тым ліку шляхам заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў, даравання доўгу, уступкі права патрабавання іншай асобе;

1.5. дзень, які ідзе следам за днём сканчэння тэрмінаў іскавай даўнасці па выкананні абавязацельстваў, пры наяўнасці ў плацельшчыка невыкананых абавязацельстваў:

па аплаце выкананых у яго інтарэсах прац (аказаных яму паслуг);

пры атрыманні маёмасці, за выключэннем выпадкаў атрымання такой маёмасці на зваротнай ці ўмоўна зваротнай аснове;

1.6. дзень складання авансавай справаздачы аб зрасходаваных сумах у службовай камандзіроўцы;

1.7. першы дзень месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім скончыўся ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін для прыняцця арганізацыяй ці індывідуальным прадпрымальнікам распараджэння аб вылічэнні ў плацельшчыка сум запазычанасці як пагашэнне незрасходаванага і своечасова не вернутага авансу, – пры невяртанні ва ўстаноўлены тэрмін грашовых сродкаў, перададзеных пад справаздачу на аплату расходаў на службовыя камандзіроўкі ці іншых расходаў такіх арганізацый ці індывідуальных прадпрымальнікаў, за выключэннем выпадку, указанага ў падпункце 1.6 гэтага пункта;

1.8. дзень выплаты даходу плацельшчыку – у выпадках прыняцця рашэння аб размеркаванні (пераразмеркаванні) доляў у статутным фондзе (паёў, акцый), павелічэння намінальнага кошту акцый;

1.9. дзень прыняцця падатковым агентам рашэння аб размеркаванні прыбытку шляхам абвяшчэння і выплаты дывідэндаў і даходаў, прыраўнаваных да дывідэндаў, – для даходаў у выглядзе дывідэндаў і прыраўнаваных да іх даходаў;

1.10. дзень складання акта камеральнай праверкі па пытанні выканання заканадаўства аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў – для даходаў, вылічаных у адпаведнасці з заканадаўствам падатковым органам зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі;

1.11. дзень прыбыцця плацельшчыка на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, а пры адсутнасці такога прыбыцця на працягу адпаведнага падатковага перыяду – апошні рабочы дзень гэтага падатковага перыяду – пры немагчымасці вызначэння даты фактычнага атрымання даходу ад крыніц за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.12. апошні дзень месяца, а ў выпадку спынення працоўных адносін да сканчэння каляндарнага месяца – апошні дзень працы, за які плацельшчыку быў налічаны даход, – пры атрыманні даходаў у выглядзе аплаты працы за выкананне працоўных абавязкаў у адпаведнасці з працоўным дагаворам (кантрактам).

2. У мэтах гэтай главы дата фактычнага атрымання даходу вызначаецца ў адносінах да даходаў плацельшчыка, атрыманых ім ад занятку прадпрымальніцкай дзейнасцю, пры ўліку такіх даходаў па прынцыпе аплаты як дзень:

2.1. залічэння даходу на рахункі плацельшчыка ў банках (замежных банках) або па іх даручэнні на рахункі трэціх асоб;

2.2. залічэння электронных грошай у электронны кашалёк плацельшчыка або па яго даручэнні ў электронны кашалёк трэціх асоб;

2.3. атрымання даходу ў выглядзе наяўных грашовых сродкаў;

2.4. атрымання тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў – пры аплаце ў натуральнай форме;

2.5. адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), здачы аб'екта ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), перадачы маёмасных правоў з улікам асаблівасцей, пералічаных у падпунктах 2.5.1–2.5.8 гэтага пункта, – пры атрыманні плацельшчыкам грашовых сродкаў у выглядзе папярэдняй аплаты (авансу, задатку). Пры гэтым:

2.5.1. днём адгрузкі тавараў прызнаюцца дата іх водпуску пакупніку, а ў выпадках, калі прадавец не ажыццяўляе дастаўку (транспарціроўку) тавараў або не праводзіць затрат па іх дастаўцы (транспарціроўцы), – атрымальніку ці арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), якая ажыццяўляе перавозку (экспедзіраванне) тавару, ці арганізацыі сувязі;

2.5.2. днём выканання прац (аказання паслуг), калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам, прызнаецца дата перадачы выкананых прац (аказаных паслуг) у адпаведнасці з афармленымі дакументамі (прыёма-здатачнымі актамі ці іншымі аналагічнымі дакументамі).

Пры аказанні паслугі, вынікі якой заказчык можа выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці па меры яе аказання на працягу тэрміну дзеяння дагавора, заключанага выканаўцам і заказчыкам у пісьмовай форме, днём аказання паслугі прызнаецца:

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і апошні дзень аказання паслугі – калі тэрмін дзеяння дагавора перавышае адзін месяц;

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і (ці) дзень завяршэння аказання паслугі – калі тэрмін дзеяння дагавора не перавышае адзін месяц.

Пры выкананні працы (этапу працы) (аказанні паслугі (этапу паслугі)), вынік якой не можа быць выкарыстаны заказчыкам да завяршэння выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)), за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўствам, днём выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)) прызнаецца:

дзень завяршэння выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дзень завяршэння прыёмкі працы (этапу працы) (паслугі (этапу паслугі)), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дата складання першаснага ўліковага дакумента ці іншага дакумента, які пацвярджае выкананне прац (аказанне паслуг), – у выпадках, не ўказаных у абзацах другім – трэцім гэтай часткі;

2.5.3. днём перадачы маёмасных правоў па выбары плацельшчыка прызнаецца:

або апошні каляндарны дзень кожнага месяца, да якога адносіцца перадача маёмаснага права, а калі перадача маёмасных правоў завяршаецца да заканчэння месяца – апошні дзень такой перадачы;

або дзень перадачы маёмаснага права, які афармляецца першасным уліковым дакументам;

2.5.4. днём перадачы прадмета лізінгу ў фінансавую арэнду (лізінг) прызнаецца:

у частцы лізінгавых плацяжоў – апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца лізінгавы плацеж па такой перадачы, але не раней за дату фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

у частцы плацяжоў, якія падлягаюць выплаце лізінгаатрымальнікам лізінгадавальніку да пачатку тэрміну часовага валодання і карыстання прадметам лізінгу, – дзень фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

у частцы выкупнога кошту, калі дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу) прадугледжаны выкуп прадмета лізінгу, – дата надыходу тэрміну пагашэння выкупнога кошту, устаноўленая дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу);

2.5.5. днём здачы маёмасці ў арэнду прызнаецца апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца арэндная плата па такой здачы, але не раней за дату фактычнай перадачы аб'екта арэнды арандатару.

У выпадку, калі канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, перавышае адзін каляндарны месяц і (ці) дагаворам не ўстаноўлены канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, днём здачы аб'екта ў арэнду прызнаецца:

апошні дзень кожнага месяца на працягу ўстаноўленага дагаворам тэрміну арэнды;

дзень завяршэння тэрміну арэнды, які прыпадае на апошні месяц устаноўленага дагаворам тэрміну арэнды (калі тэрмін арэнды завяршаецца не ў апошні дзень апошняга месяца тэрміну арэнды);

2.5.6. днём адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камітэнтам (давернікам), іншай аналагічнай асобай на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца па выбары індывідуальнага прадпрымальніка адна з наступных дат:

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе;

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камісіянерам, паверанымі ці іншай аналагічнай асобай пакупніку, заказчыку з улікам палажэнняў падпункта 2.5.1 гэтага пункта.

Выбраны індывідуальным прадпрымальнікам парадак вызначэння дня адгрузкі (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў адлюстроўваецца ў рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае;

2.5.7. днём адгрузкі тавараў, перадачы маёмасных правоў даручальнікам пры іх рэалізацыі даверным кіраўніком прызнаецца дата адгрузкі, перадачы маёмасных правоў даверным кіраўніком пакупніку;

2.5.8. днём адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг) пры іх рэалізацыі з выкарыстаннем касавага абсталявання, якая ажыццяўляецца на працягу змены, што пачынаецца ў адзін каляндарны дзень і заканчваецца на іншы каляндарны дзень, з'яўляецца дата адкрыцця гэтай змены, якая адлюстроўваецца ў сутачнай (зменнай) справаздачы (Z-справаздачы), што фарміруецца такім касавым абсталяваннем;

2.6. які ідзе следам за днём, устаноўленым для вяртання маёмасці, – пры невяртанні маёмасці, атрыманай на зваротнай ці ўмоўна зваротнай аснове, у тым ліку ў адпаведнасці з дагаворамі пазыкі, задатку;

2.7. спынення абавязацельства перад плацельшчыкам па выплаце яму даходу – пры спыненні такога абавязацельства, у тым ліку шляхам заліку сустрэчных аднародных патрабаванняў, даравання доўгу, уступкі права патрабавання іншай асобе;

2.8. падачы ў рэгіструючы орган заявы аб спыненні прадпрымальніцкай дзейнасці – пры наяўнасці не выкананых абавязацельстваў па дагаворах, звязаных з ажыццяўленнем такой дзейнасці;

2.9. адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў – пры абмене таварамі (працамі, паслугамі), маёмаснымі правамі;

2.10. складання дакумента, які пацвярджае выбыццё тавараў, – пры выбыцці тавараў (звыш нормаў натуральнага змяншэння) на падставах, не звязаных з іх рэалізацыяй, абменам і бязвыплатнай перадачай, ці ў сувязі з надзвычайнымі акалічнасцямі;

2.11. складання справаздачы камісіянера, але не пазней за дзень фактычнага пералічэння (перадачы) камітэнту ці па яго даручэнні трэцім асобам грашовых сродкаў, атрыманых ад выканання дагавора камісіі, – пры ўтрыманні камісіянерам сваёй узнагароды з сумы грашовых сродкаў, якія паступілі ад выканання дагавора камісіі;

2.12. які ідзе следам за днём сканчэння тэрміну іскавай даўнасці па выкананні абавязацельства па пастаўцы тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), перадачы маёмасных правоў, – пры атрыманні плацельшчыкам грашовых сродкаў у выглядзе папярэдняй аплаты (авансу, задатку) і невыкананні ім абавязацельстваў па пастаўцы такіх тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), перадачы маёмасных правоў;

2.13. які ідзе следам за днём унясення ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб выключэнні з указанага рэгістра

юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка, ад якіх плацельшчык атрымаў папярэднюю аплату (аванс, задатак) і не выканаў абавязацельствы па пастаўцы тавараў (выкананні прац, аказанні паслуг), перадачы маёмасных правоў.

3. У мэтах гэтай главы дата фактычнага атрымання даходу вызначаецца ў адносінах да даходаў плацельшчыка, атрыманых ім ад займання прадпрымальніцкай дзейнасцю, пры ўліку такіх даходаў па прынцыпе налічэння як дзень адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), здачы аб'екта ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), перадачы маёмасных правоў з улікам асаблівасцей, пералічаных у падпунктах 2.6, 2.8, 2.10, 2.12 і 2.13 пункта 2 гэтага артыкула. Пры гэтым:

3.1. днём адгрузкі тавараў прызнаецца дата іх водпуску пакупніку, а ў выпадках, калі прадавец не ажыццяўляе дастаўку (транспарціроўку) тавараў або не праводзіць затрат па іх дастаўцы (транспарціроўцы), – атрымальніку ці арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), якая ажыццяўляе перавозку (экспедзіраванне) тавару, ці арганізацыі сувязі;

3.2. днём выканання прац (аказання паслуг), калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам, прызнаецца дата перадачы выкананых прац (аказаных паслуг) у адпаведнасці з афармленымі дакументамі (прыёма-здатачнымі актамі ці іншымі аналагічнымі дакументамі).

Пры аказанні паслугі, вынікі якой заказчык можа выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці па меры яе аказання на працягу тэрміну дзеяння дагавора, заключанага выканаўцам і заказчыкам у пісьмовай форме, днём аказання паслугі прызнаецца:

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і апошні дзень аказання паслугі – калі тэрмін дзеяння дагавора перавышае адзін месяц;

апошні каляндарны дзень кожнага месяца аказання паслугі і (ці) дзень завяршэння аказання паслугі – калі тэрмін дзеяння дагавора не перавышае адзін месяц.

Пры выкананні працы (этапу працы) (аказанні паслугі (этапу паслугі)), вынік якой не можа быць выкарыстаны заказчыкам да завяршэння выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)), за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўствам, днём выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)) прызнаецца:

дзень завяршэння выканання працы (этапу працы) (аказання паслугі (этапу паслугі)), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дзень завяршэння прыёмкі працы (этапу працы) (паслугі (этапу паслугі)), указаны ў першасным уліковым дакуменце, калі ўказанне гэтай даты ў першасным уліковым дакуменце прадугледжана дагаворам, заключаным падрадчыкам (выканаўцам) і заказчыкам у пісьмовай форме;

дата складання першаснага ўліковага дакумента ці іншага дакумента, які пацвярджае выкананне прац (аказанне паслуг), – у выпадках, не ўказаных у абзацах другім – трэцім гэтай часткі;

3.3. днём адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг) пры іх рэалізацыі з выкарыстаннем касавага абсталявання, якая ажыццяўляецца на працягу змены, што пачынаецца ў адзін каляндарны дзень і заканчваецца на іншы каляндарны дзень, з'яўляецца дата адкрыцця гэтай змены, якая адлюстроўваецца ў сутачнай (зменнай) справаздачы (Z-справаздачы), што фарміруецца такім касавым абсталяваннем;

3.4. днём здачы маёмасці ў арэнду прызнаецца апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца арэндная плата па такой здачы, але не раней за дату фактычнай перадачы аб'екта арэнды арандатару.

У выпадку, калі канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, перавышае адзін каляндарны месяц і (ці) дагаворам не ўстаноўлены канкрэтны перыяд, да якога адносіцца арэндная плата, днём здачы аб'екта ў арэнду прызнаецца:

апошні дзень кожнага месяца на працягу ўстаноўленага дагаворам тэрміну арэнды;

дзень завяршэння тэрміну арэнды, які прыпадае на апошні месяц установленага дагаворам тэрміну арэнды (калі тэрмін арэнды завяршаецца не ў апошні дзень апошняга месяца тэрміну арэнды);

3.5. днём перадачы прадмета лізінгу ў фінансавую арэнду (лізінг) прызнаецца:

у частцы лізінгавых плацяжоў – апошні дзень кожнага месяца, да якога адносіцца лізінгавы плацеж па такой перадачы, але не раней за дату фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

у частцы плацяжоў, якія падлягаюць выплаце лізінгаатрымальнікам лізінгадавальніку да пачатку тэрміну часовага валодання і карыстання прадметам лізінгу, – дзень фактычнай перадачы прадмета лізінгу лізінгаатрымальніку;

у частцы выкупнога кошту, калі дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу) прадугледжаны выкуп прадмета лізінгу, – дата надыходу тэрміну пагашэння выкупнога кошту, устаноўленая дагаворам фінансавай арэнды (лізінгу);

3.6. днём перадачы маёмасных правоў па выбары індывідуальнага прадпрымальніка прызнаецца:

або апошні каляндарны дзень кожнага месяца, да якога адносіцца перадача маёмаснага права, а калі перадача маёмасных правоў завяршаецца да заканчэння месяца – апошні дзень такой перадачы;

або дзень перадачы маёмаснага права, які афармляецца першасным уліковым дакументам;

3.7. днём адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камітэнтам (давернікам), іншай аналагічнай асобай на аснове дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца па выбары індывідуальнага прадпрымальніка адна з наступных дат:

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў іх уласнікам, праваўладальнікам камісіянеру, паверанаму ці іншай аналагічнай асобе;

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камісіянерам, павераным ці іншай аналагічнай асобай пакупніку, заказчыку з улікам палажэнняў падпункта 3.1 гэтага пункта.

Выбраны індывідуальным прадпрымальнікам парадак вызначэння дня адгрузкі (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў адлюстроўваецца ў рашэнні індывідуальнага прадпрымальніка і змяненню на працягу бягучага падатковага перыяду не падлягае;

3.8. днём адгрузкі тавараў, перадачы маёмасных правоў даручальнікам пры іх рэалізацыі даверным кіраўніком прызнаецца дата адгрузкі, перадачы маёмасных правоў даверным кіраўніком пакупніку;

3.9. датай фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў прызнаецца:

дата падпісання бакамі акта прыёму-перадачы маёмасці (прыёма-здатачнага акта прац, паслуг ці іншага аналагічнага дакумента) – для даходаў у выглядзе бязвыплатна атрыманай маёмасці (прац, паслуг);

дата паступлення грашовых сродкаў на рахункі індывідуальнага прадпрымальніка ў банках, у касу – для даходаў у выглядзе бязвыплатна атрыманых грашовых сродкаў, у выглядзе працэнтаў за карыстанне банкам грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца на рахунку;

дата ўступлення ў законную сілу рашэння суда – па даходах у выглядзе штрафаў, пеняў і (ці) іншых санкцый за парушэнне дагаворных ці даўгавых абавязацельстваў, а таксама ў выглядзе сум пакрыцця страт (урону) за парушэнне дагаворных ці даўгавых абавязацельстваў;

дата продажу (пакупкі, канверсіі) замежнай валюты – для даходаў у выглядзе станоўчай розніцы, якая ўтвараецца з прычыны адхілення курсу продажу (пакупкі, канверсіі) замежнай валюты ад афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату продажу (пакупкі, канверсіі);

дата, не пазнейшая за дату іх атрымання, – па іншых даходах.

4. Пры вызначэнні даты фактычнага атрымання даходу ў адносінах да асобных даходаў плацельшчыка, за выключэннем даходаў, атрыманых ад займання прадпрымальніцкай, натарыяльнай, адвакацкай дзейнасцю, улічваюцца наступныя асаблівасці:

даходы за перыяд знаходжання плацельшчыка ў водпуску, дапамогі па часовай непрацаздольнасці, пераразлікі даходаў за выкананне працоўных ці іншых абавязкаў, якія былі налічаны ў адным месяцы, але адносяцца на іншыя месяцы, у тым ліку папярэдняга ці наступнага каляндарнага года, уключаюцца ў даходы месяца, за які яны налічаны;

даходы, якія выплачваюцца паводле рашэння суда, за выключэннем даходаў, указаных у абзацы другім гэтага пункта, а таксама даходы, якія выплачваюцца ў выглядзе індэксацыі грашовых даходаў, у выглядзе прэмій і іншых узнагарод, даходы па дагаворах грамадзянска-прававога характару ўключаюцца ў даходы таго месяца, у якім ажыццяўляецца іх налічэнне, незалежна ад таго, за якія перыяды часу такія сумы выплачваюцца.

**Артыкул 214. Стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб**

1. Стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб устанаўліваецца ў памеры трынаццаць (13) працэнтаў, калі іншае не вызначана гэтым артыкулам.

2. Стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб у адносінах да даходаў, атрыманых плацельшчыкамі ад здачы фізічным асобам у арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – здача фізічным асобам у арэнду жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў), устанаўліваюцца ў фіксаваных сумах згодна з дадаткам 2 да гэтага Кодэкса.

Палажэнні гэтага пункта не прымяняюцца ў адносінах да даходаў, атрыманых плацельшчыкамі ад ажыццяўлення імі прадпрымальніцкай дзейнасці ці ад індывідуальных прадпрымальнікаў у выніку заключэння з імі дагавораў арэнды (субарэнды), найму (паднайму) жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў.

Абласныя (Мінскія гарадскія) Саветы дэпутатаў маюць права змяншаць (не больш чым у два разы) памер ставак падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах у залежнасці ад катэгорыі населенага пункта, у якім знаходзяцца жылое і (ці) нежылое памяшканні, машына-месца, а таксама ад месца знаходжання гэтых памяшканняў, машына-месца ў межах населенага пункта.

3. Стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб устанаўліваецца ў памеры шаснаццаць (16) працэнтаў у адносінах да даходаў:

3.1. якія атрымліваюць індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакатамі ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна;

3.2. вылічаных у адпаведнасці з заканадаўствам падатковым органам зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі;

3.3. якія атрымліваюць фізічныя асобы, што ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі ў парушэнне патрабаванняў заканадаўчых актаў, ад ажыццяўлення такой дзейнасці.

4. Стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб устанаўліваецца ў памеры чатыры (4) працэнты ў адносінах да даходаў у выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак), атрыманых плацельшчыкамі ад арганізатараў азартных гульняў – юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь.

5. Стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб устанаўліваецца ў памеры шэсць (6) працэнтаў у адносінах да даходаў у выглядзе дывідэндаў пры ўмове, калі на працягу трох папярэдніх каляндарных гадоў паслядоўна прыбытак не размяркоўваўся паміж удзельнікамі (акцыянерамі) беларускай арганізацыі – рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь.

6. Стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб устанаўліваецца ў памеры нуль (0) працэнтаў у адносінах да даходаў у выглядзе дывідэндаў пры ўмове, калі на працягу пяці папярэдніх каляндарных гадоў паслядоўна прыбытак не размяркоўваўся паміж удзельнікамі (акцыянерамі) беларускай арганізацыі – рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 215. Парадак вылічэння падаходнага падатку з фізічных асоб

Сума падаходнага падатку з фізічных асоб вылічваецца:

па даходах ад здачы фізічным асобам жылых і нежылых памяшканняў, машына-месцаў – зыходзячы з памеру фіксаваных сум падаходнага падатку з фізічных асоб;

па іншых даходах – як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

### Артыкул 216. Асаблівасці вылічэння, парадак і тэрміны выплаты падаходнага падатку з фізічных асоб падатковымі агентамі

1. Беларускія арганізацыі, беларускія індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты, замежныя арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, прадстаўніцтвы замежных арганізацый, адкрытыя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, тэрытарыяльныя натарыяльныя палаты, ад якіх плацельшчык атрымаў даходы, прызнаюцца падатковымі агентамі, маюць правы і нясуць абавязкі, устаноўленыя артыкулам 23 гэтага Кодэкса і гэтай главой.

2. Вылічэнне і выплата падаходнага падатку з фізічных асоб праводзяцца ў адносінах да даходаў плацельшчыка, крыніцай якіх з'яўляецца падатковы агент, за выключэннем:

даходаў індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, адвакатаў ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай, натарыяльнай дзейнасці, адвакацкай дзейнасці індывідуальна;

даходаў ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства, вырашчанай плацельшчыкам і (ці) асобамі, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага, на зямельным участку, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія выплачваюцца плацельшчыку нарыхтоўчымі арганізацыямі спажывецкай кааперацыі ці іншымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі;

даходаў, якія выплачваюцца плацельшчыку – падатковаму рэзідэнту Рэспублікі Беларусь пры выплаце яму даходаў за набыццё наступнай маёмасці:

не завершанай будаўніцтвам капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), размешчанай на зямельным участку, дадзеным для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садаводства, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), кватэры, дачы, садовага доміка з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), гаража, машына-месца, зямельнага ўчастка, долі ў праве ўласнасці на ўказаную маёмасць;

аўтамабіля, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3500 кілаграмаў і колькасць сядзячых месцаў якога, апрача сядзення вадзіцеля, не перавышае васьмі, ці іншага механічнага транспартнага сродку;

пазык і крэдытаў, выдадзеных беларускімі арганізацыямі ці беларускімі індывідуальнымі прадпрымальнікамі асобам, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў, прадугледжаных падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 210 і падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 211 гэтага Кодэкса;

мікрапазык, якія даюцца мікрафінансавымі арганізацыямі фізічным асобам у парадку, прадугледжаным заканадаўствам;

камерцыйных пазык;

крэдытаў, якія выдаюцца банкамі.

3. Вылічэнне падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца падатковым агентам без уліку даходаў, атрыманых плацельшчыкам ад іншых падатковых агентаў, і ўтрыманых іншымі падатковымі агентамі сум падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Падатковыя агенты абавязаны ўтрымаць вылічаную суму падаходнага падатку з фізічных асоб непасрэдна з даходаў плацельшчыка пры іх фактычнай выплаце з улікам асаблівасцей, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 224 гэтага Кодэкса.

Утрыманне ў плацельшчыка вылічанай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца падатковым агентам за кошт любых грашовых сродкаў, якія фактычна выплачваюцца плацельшчыку або па яго даручэнні трэцім асобам.

Абавязак па ўтрыманні падаходнага падатку з фізічных асоб не распаўсюджваецца на выпадкі выплаты даходаў у выглядзе аплаты працы за першую палову месяца, прэмій, аплаты расходаў на службовыя камандзіроўкі, звыш устаноўленых памераў.

5. Пры выяўленні факта неўтрымання (няпоўнага ўтрымання) падаходнага падатку з фізічных асоб падатковы агент абавязаны ўтрымаць такі падатак з любых грашовых сродкаў пры іх фактычнай выплаце плацельшчыку або па яго даручэнні трэцім асобам. Утрыманне праводзіцца, калі з дня выплаты такіх даходаў не скончылася пяць гадоў.

Пры немагчымасці ўтрымання падаходнага падатку з фізічных асоб па прычыне адсутнасці выплат плацельшчыку ў грашовай форме (у тым ліку з прычыны спынення працоўнага дагавора (кантракта), скасавання грамадзянска-прававога дагавора) падатковы агент абавязаны ў трыццацідзённы тэрмін з дня выяўлення факта неўтрымання (няпоўнага ўтрымання) падаходнага падатку з фізічных асоб накіраваць плацельшчыку і ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік плацельшчыка паведамленне аб немагчымасці ўтрымання падаходнага падатку з фізічных асоб (далей у гэтым пункце – паведамленне).

У паведамленні ўказваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), серыя і нумар дакумента, які сведчыць асобу, месца жыхарства плацельшчыка, від і памер выплачанага даходу, з якога не ўтрыманы падаходны падатак з фізічных асоб, сума дадзеных ільгот і вылікаў, сума неўтрыманага (не поўнасцю ўтрыманага) падаходнага падатку з фізічных асоб.

Падатковы орган на працягу пяці рабочых дзён з дня атрымання паведамлення ўручае плацельшчыку паведамленне на аплату падаходнага падатку з фізічных асоб па ўстаноўленай форме. Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца плацельшчыкам у трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння яму падатковым органам паведамлення.

Падатковы орган на працягу пяці рабочых дзён з дня аплаты плацельшчыкам падаходнага падатку з фізічных асоб накіроўвае паведамленне аб даце аплаты і суме заплачанага ім падатку падатковаму агенту, які накіраваў паведамленне і заплаціў такі падатак.

Паведамленне падатковага органа з'яўляецца падставай для вяртання ва ўстаноўленым парадку падатковаму агенту падаходнага падатку з фізічных асоб у

выпадках аплаты ім не ўтрыманага з даходаў плацельшчыка падаходнага падатку з фізічных асоб за кошт уласных сродкаў.

6. Падатковыя агенты абавязаны пералічваць у бюджэт сумы вылічанага і ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб:

не пазней за дзень фактычнага атрымання ў банку наяўных грашовых сродкаў на выплату плацельшчыку даходаў ці дзень пералічэння такіх даходаў з рахункаў падатковых агентаў у банках на рахункі плацельшчыка або па яго даручэнні на рахункі трэціх асоб у банках (замежных банках);

не пазней за дзень, які ідзе следам за днём фактычнай выплаты даходу плацельшчыку з касы падатковага агента;

не пазней за дзень, які ідзе следам за днём фактычнага ўтрымання вылічаных сум падаходнага падатку з фізічных асоб, – для даходаў, атрыманых плацельшчыкам у натуральнай форме;

не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім падатковыя агенты – арганізатары азартных гульняў выплацілі плацельшчыкам даходы ў выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак);

не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім падатковыя агенты – банкі выплацілі плацельшчыкам даходы ў выглядзе працэнтаў па ашчадных сертыфікатах, банкаўскіх укладах (дэпазітах), па грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку;

не пазней за тры рабочыя дні з дня фактычнага атрымання ў банку наяўных грашовых сродкаў на выплату даходаў, указаных у частцы першай пункта 2 артыкула 224 гэтага Кодэкса, ці дня пералічэння такіх даходаў з рахункаў падатковых агентаў у банках на рахункі плацельшчыка або па яго даручэнні на рахункі трэціх асоб у банках (замежных банках) падатковымі агентамі – беларускімі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы дзейнасць, што прызнаецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і (ці) заканадаўствам гэтай замежнай дзяржавы дзейнасцю праз пастаяннае прадстаўніцтва, і знаходзяцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковым органе ўказанай замежнай дзяржавы.

7. Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб за кошт сродкаў падатковых агентаў не дапускаецца, за выключэннем наступных выпадкаў:

пры выяўленні падатковым органам факта невыканання ці выканання не ў поўным аб'ёме падатковым агентам ва ўстаноўлены тэрмін абавязку па ўтрыманні ў плацельшчыка і (ці) пералічэнні ў бюджэт вылічанай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб;

пры выдачы фізічным асобам пазык, крэдытаў. Аплата падатку праводзіцца не пазней за дзень, які ідзе следам за днём выдачы пазыкі, крэдыту;

пры немагчымасці ўтрымаць вылічаную суму падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў плацельшчыкаў, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, – грамадзян (падданых) замежнай дзяржавы і асоб без грамадзянства (падданства). Аплата падатку праводзіцца не пазней за дзень, які ідзе следам за днём выплаты даходу;

пры непадачы беларускай арганізацыяй, якая ажыццяўляе на тэрыторыі замежнай дзяржавы дзейнасць, што прызнаецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і (ці) заканадаўствам гэтай замежнай дзяржавы дзейнасцю праз пастаяннае прадстаўніцтва, і знаходзіцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковым органе ўказанай замежнай дзяржавы, у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік ва ўстаноўлены тэрмін дакументаў, указаных у частцы шостай пункта 2 артыкула 224 гэтага Кодэкса. Аплата падатку праводзіцца не пазней за 10 студзеня другога года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

8. Падатковыя агенты абавязаны падаваць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік звесткі аб даходах, за выключэннем даходаў у выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак), выплачаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:

грамадзянам (падданым) замежных дзяржаў, асобам без грамадзянства (падданства);

фізічным асобам у выглядзе вяртання ўзносаў, у тым ліку праіндэксаваных у парадку, устаноўленым заканадаўствам, пры спыненні імі будаўніцтва кватэр і (ці) аднакватэрных жылых дамоў або ў выпадку патаннення будаўніцтва, вяртання залішне заплачаных узносаў, а таксама пры іх выбыцці з членаў арганізацый забудоўшчыкаў да завяршэння будаўніцтва;

фізічным асобам у выглядзе вяртання страхавых узносаў пры скасаванні да сканчэння трохгадовага перыяду дагавораў добраахвотнага страхавання жыцця і дадатковай пенсіі, якія заключаліся тэрмінам на тры і больш гады;

фізічным асобам пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый грашовымі сродкамі, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных як аплата кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца будаўніцтва жылога памяшкання для ўладальніка жыллёвых аблігацый, ці скасавання такога дагавора да сканчэння тэрміну яго выканання;

фізічным асобам за набытую ў іх прадукцыю раслінаводства, указаную ў частках першай і другой пункта 19 артыкула 208 гэтага Кодэкса, у парадку, прадугледжаным часткай сёмай пункта 19 артыкула 208 гэтага Кодэкса, калі памер выплачанага такім фізічным асобам даходу перавысіў 2412 беларускіх рублёў у дзень.

Падатковыя агенты, якія далі плацельшчыкам стандартныя падатковыя вылікі ў парадку, прадугледжаным часткай другой пункта 2 артыкула 209 гэтага Кодэкса, накіроўваюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік такіх падатковых агентаў інфармацыю аб даванні ўказаных вылікаў.

Звесткі, указаныя ў гэтым пункце, падаюцца штогод не пазней за 1 красавіка года, які ідзе следам за мінулым каляндарным годам, у электронным выглядзе ў парадку і па форме, зацверджаных Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

9. Арганізацыя ці індывідуальны прадпрымальнік, якія скасавалі з плацельшчыкам дагавор фінансавай арэнды (лізінгу), што прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры і не завяршыўся такім выкупам, ці ўнеслі ў такі дагавор змяненні, якія выключаюць умову выкупу прадмета лізінгу, абавязаны падаць у падатковы орган інфармацыю з указаннем прычыны і даты скасавання ці змянення такога дагавора – на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня скасавання такога дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) ці ўнясення ў яго гэтых змяненняў.

10. Арганізатары азартных гульняў – юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь вядуць улік даходаў, выплачаных у выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак), і ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб па кожным плацельшчыку. Улік пералічанага ў бюджэт падаходнага падатку з фізічных асоб з такіх даходаў вядзецца ў цэлым па ўсіх плацельшчыках за месяц.

### Артыкул 217. Асаблівасці вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб беларускімі індывідуальнымі прадпрымальнікамі натарыусамі, адвакатамі

1. Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты самастойна вылічваюць падаходны падатак з фізічных асоб.

Падаходны падатак з фізічных асоб вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку падатковага перыяду пасля сканчэння кожнага справаздачнага перыяду па ўсіх аперацыях

па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і ўсіх змяненнях падатковай базы ў адпаведным справаздачным перыядзе.

2. У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены ў перыяд прымянення індывідуальным прадпрымальнікам асаблівых рэжымаў падаткаабкладання і даходы, атрыманыя ад рэалізацыі якіх, улічваліся ім пры вылічэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб, змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падаходным падатку за апошні справаздачны перыяд таго каляндарнага года, у якім пры вылічэнні падатковай базы падаходнага падатку з фізічных асоб улічаны даходы, атрыманыя ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

3. Індывідуальныя прадпрымальнікі, натарыусы, адвакаты падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

4. Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

### Артыкул 218. Асаблівасці вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў плацельшчыкаў, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь

1. Вылічэнне і аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у адпаведнасці з гэтым артыкулам праводзяцца з даходаў плацельшчыкаў, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, атрыманых ад:

фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, за рэалізаваныя імі тавары (працы, паслугі), іншую маёмасць, калі іншае не прадугледжана главой 33 гэтага Кодэкса;

замежных арганізацый (акрамя даходаў, атрыманых ад прадстаўніцтваў замежных арганізацый, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), замежных індывідуальных прадпрымальнікаў, прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь, прадстаўніцтваў і органаў міждзяржаўных утварэнняў, якія знаходзяцца на тэрыторыях замежных дзяржаў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установаў замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь, пры атрыманні ад такіх асоб даходаў, пералічаных у падпунктах 1.3–1.5 пункта 1 артыкула 197 гэтага Кодэкса.

2. Плацельшчыкі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, да пачатку рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці, здачы ў арэнду ці іншага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаюць у падатковы орган па месцы меркаванага атрымання даходаў падатковую дэкларацыю (разлік) па форме, якую зацвярджае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, з указаннем меркаванага даходу, які вызначаецца зыходзячы з агульнага кошту тавараў, іншай маёмасці, якія рэалізуюцца, прац, якія выконваюцца (паслуг, што аказваюцца), агульнай сумы плацяжоў згодна з дагаворам арэнды ці іншага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага пункта.

Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб ажыццяўляецца плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 1 гэтага артыкула, па месцы атрымання меркаванага даходу да пачатку рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), іншай маёмасці (за выключэннем нерухомай), здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) ці іншага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, на падставе паведамлення падатковага органа.

Пры рэалізацыі нерухомай маёмасці падача падатковай дэкларацыі (разліку), указанай у частцы першай гэтага пункта, ажыццяўляецца плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 1 гэтага артыкула, па месцы знаходжання нерухомай маёмасці. Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб ажыццяўляецца на падставе паведамлення падатковага органа на працягу пяці рабочых дзён з дня атрымання такога паведамлення.

3. Пры спыненні атрымання даходаў падатковы орган разлічвае падаходны падатак з фізічных асоб зыходзячы з фактычна атрыманых даходаў на падставе падатковай дэкларацыі (разліку), якая падаецца плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 1 гэтага артыкула, на працягу пяці рабочых дзён з дня спынення атрымання імі даходаў.

Сума падаходнага падатку з фізічных асоб, вылічаная падатковым органам зыходзячы з меркаванага даходу і заплачаная ў бюджэт плацельшчыкам, залічваецца ў кошт аплаты сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, вылічанай зыходзячы з фактычна атрыманых даходаў.

4. Сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, вылічаныя падатковым органам зыходзячы з фактычна атрыманых даходаў на падставе адпаведнай падатковай дэкларацыі (разліку) і падлеглых даплаце ў бюджэт, выплачваюцца плацельшчыкамі, указанымі ў пункце 1 гэтага артыкула, на працягу пяці рабочых дзён з дня атрымання паведамлення падатковага органа.

5. Пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб у адпаведнасці з гэтым артыкулам:

палажэнні пунктаў 19 і 44 артыкула 208 гэтага Кодэкса не прымяняюцца. Палажэнні гэтага абзаца не распаўсюджваюцца на даходы, што атрымліваюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія не прызнаюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, і вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб у адпаведнасці з абзацам другім часткі першай пункта 44 артыкула 208 гэтага Кодэкса;

плацельшчыкі маюць права прымяніць маёмасны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 211 гэтага Кодэкса, пры атрыманні даходаў ад аплатнага адчужэння нерухомай маёмасці.

### Артыкул 219. Асаблівасці вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб у адносінах да асобных даходаў

1. Вылічэнне і аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у адпаведнасці з гэтым артыкулам праводзяцца ў адносінах да падлеглых падаткаабкладанню:

1.1. даходаў, атрыманых ад фізічных асоб і арганізацый, якія не прызнаюцца падатковымі агентамі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 218 гэтага Кодэкса;

1.2. даходаў (за выключэннем даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці плацельшчыкам – індывідуальным прадпрымальнікам), атрыманых фізічнымі асобамі – падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь;

1.3. даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці пасля выключэння плацельшчыка – індывідуальнага прадпрымальніка з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

1.4. даходаў, атрыманых ад фізічных асоб па дагаворах, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, у выніку дарэння ці ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна ў памеры, які перавышае мяжу, устаноўленую пунктам 22 артыкула 208 гэтага Кодэкса;

1.5. даходаў у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, а таксама залічаных на дабрачынны рахунак, адкрыты ў банку, ахвяраванняў, атрыманых інвалідамі, дзецьмі-

сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, у памеры, які перавышае ўстаноўлены пунктам 29 артыкула 208 гэтага Кодэкса;

1.6. даходаў у выглядзе страхавых узносаў, вернутых пры скасаванні да сканчэння трохгадовага перыяду дагавораў добраахвотнага страхавання жыцця і дадатковай пенсіі, якія заключаліся тэрмінам на тры і больш гады, – у выпадку атрымання ў адносінах да сум такіх узносаў сацыяльнага падатковага выліку, устаноўленага падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 210 гэтага Кодэкса;

1.7. асобных даходаў, у адносінах да якіх плацельшчыку быў дадзены маёмасны падатковы вылік, устаноўлены падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 211 гэтага Кодэкса:

у выглядзе вяртання ўзносаў пры спыненні будаўніцтва кватэр і (ці) аднакватэрных жылых дамоў або ў выпадку патаннення будаўніцтва, вяртання залішне заплачаных узносаў, а таксама пры выбыцці з членаў арганізацый забудоўшчыкаў да завяршэння будаўніцтва;

у памеры намінальнага кошту жыллёвых аблігацый і працэнтнага даходу, атрыманага ад арганізацыі – эмітэнта гэтых аблігацый пры іх пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) грашовымі сродкамі, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый;

у выглядзе лізінгавых выплат, заплачаных па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу – аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, у выпадках, калі такі дагавор не завяршыўся выкупам маёмасці ці ў дагавор былі ўнесены змяненні, якія выключаюць умову выкупу прадмета лізінгу.

2. Плацельшчыкі, якія атрымалі даходы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, абавязаны падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб у парадку, устаноўленым артыкулам 222 гэтага Кодэкса.

Вылічэнне падаходнага падатку з фізічных асоб з такіх даходаў праводзіць падатковы орган.

Плацельшчык аплачвае падаходны падатак з фізічных асоб не пазней за 1 чэрвеня года, які ідзе следам за справаздачным падатковым перыядам, на падставе паведамлення падатковага органа.

Паведамленне па ўстаноўленай форме ўручаецца фізічнай асобе (яго прадстаўніку) не пазней за 30 красавіка года, які ідзе следам за справаздачным падатковым перыядам.

3. Аплата плацельшчыкам падаходнага падатку з фізічных асоб па даходах, вылічаных у адпаведнасці з заканадаўствам зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі, праводзіцца ў трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння акта камеральнай праверкі.

### Артыкул 220. Асаблівасці вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў

1. Вылічэнне і аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у адпаведнасці з гэтым артыкулам праводзяцца ў адносінах да падлеглых падаткаабкладанню даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў, атрыманых ад:

1.1. беларускіх арганізацый і беларускіх індывідуальных прадпрымальнікаў;

1.2. фізічных асоб па дагаворах, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, ад замежных арганізацый, якія не дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, і замежных індывідуальных прадпрымальнікаў, калі такія пазыкі, крэдыты:

падлягаюць указанню ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці, пададзенай плацельшчыкам па патрабаванні падатковага органа (далей у гэтым артыкуле – дэкларацыя аб даходах і маёмасці);

указаны ў тлумачэннях аб крыніцах даходаў, пададзеных плацельшчыкам па патрабаванні падатковага органа пры ажыццяўленні кантролю ў сферы дэкларавання даходаў і маёмасці (далей у гэтым артыкуле – тлумачэнні).

2. З даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў, указаных у падпункце 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, падатковыя агенты вылічваюць падаходны падатак з фізічных асоб у парадку, устаноўленым артыкулам 216 гэтага Кодэкса.

Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца падатковым агентам за кошт уласных сродкаў не пазней за дзень, які ідзе следам за днём выдачы фізічнай асобе пазыкі, крэдыту.

Па меры пагашэння фізічнай асобай пазыкі, крэдыту раней заплачаная сума падатку ў памеры, прапарцыянальным пагашанай запазычанасці па адпаведным дагаворы, падлягае вяртанню падатковаму агенту, які заплаціў падатак.

3. З даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, падаходны падатак з фізічных асоб вылічваюць падатковыя органы. Пры гэтым для мэт падаткаабкладання датай фактычнага атрымання ўказаных даходаў прызнаецца дзень падачы плацельшчыкам па патрабаванні падатковага органа дэкларацыі аб даходах і маёмасці або тлумачэнняў.

Падатковы орган не вылічвае падатак з даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў, калі такія пазыкі, крэдыты:

поўнасцю (часткова) пагашаны (вернуты) і плацельшчыкам у падатковы орган пададзены дакументы, якія пацвярджаюць факт поўнага (частковага) пагашэння (вяртання) пазык, крэдытаў. Пры частковым пагашэнні (вяртанні) пазык, крэдытаў падатак вылічваецца з непагашанай (нявернутай) сумы такіх пазык, крэдытаў;

атрыманы ад асоб, якія знаходзяцца з фізічнай асобай у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва;

атрыманы беларускімі індывідуальнымі прадпрымальнікамі, натарыусамі, адвакатамі пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай, натарыяльнай, адвакацкай дзейнасці.

Вылічэнне падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў праводзіцца падатковым органам у трыццацідзённы тэрмін з дня падачы плацельшчыкам дэкларацыі аб даходах і маёмасці або тлумачэнняў. Пры гэтым падатковыя вылікі, прадугледжаныя артыкуламі 209–212 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

Аплата падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў у выглядзе пазык, крэдытаў праводзіцца плацельшчыкам на падставе паведамлення падатковага органа ўстаноўленай формы ў трыццацідзённы тэрмін з дня яго ўручэння.

Пры поўным пагашэнні (вяртанні) пазык, крэдытаў заплачаны падаходны падатак з фізічных асоб падлягае заліку (вяртанню) плацельшчыку. Пры гэтым пры пагашэнні (вяртанні) пазык, крэдытаў за кошт грашовых сродкаў, атрыманых на зваротнай ці ўмоўна зваротнай аснове ад асоб, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 гэтага артыкула, пераразлік падаходнага падатку з фізічных асоб падатковым органам не праводзіцца і падатак заліку (вяртанню) не падлягае.

**Артыкул 221. Асаблівасці вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах**

1. Вылічэнне і аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах плацельшчыкамі, якія атрымліваюць даходы ад здачы фізічным асобам у арэнду жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў праводзяцца:

1.1. па стаўках, устаноўленых згодна з дадаткам 2 да гэтага Кодэкса, з улікам рашэнняў абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў дэпутатаў, прынятых у адпаведнасці з часткай трэцяй пункта 2 артыкула 214 гэтага Кодэкса, для той катэгорыі населенага пункта, на тэрыторыі якога знаходзяцца жылое і (ці) нежылое памяшканні, машына-месца, якія здаюцца фізічным асобам у арэнду;

1.2. штомесяц не пазней за 1-е чысло месяца, за які ажыццяўляецца аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах. Пры змяненні памераў ставак падлеглы аплаце падаходны падатак з фізічных асоб у фіксаваных сумах пералічваецца з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім адбылося змяненне.

Пры заключэнні плацельшчыкамі дагавора арэнды жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў упершыню ў падатковым перыядзе вылічэнне і аплата падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах імі праводзяцца не пазней за рабочы дзень, які ідзе следам за ўстаноўленым у дагаворы тэрмінам фактычнага давання ў арэнду фізічным асобам жылога і (ці) нежылога памяшканняў, машына-месца.

2. Пры атрыманні даходаў ад здачы фізічным асобам жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў на працягу месяца (першае атрыманне даходаў пасля заключэння дагавора або атрыманне такіх даходаў пасля аднаўлення дзеяння дагавора), а таксама ў выпадку спынення атрымання такіх даходаў на працягу месяца вылічэнне падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах за гэты месяц праводзіцца прапарцыянальна колькасці дзён здачы фізічным асобам у арэнду жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў ва ўказаным месяцы.

3. Пры ўказанні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці або тлумачэннях, пададзеных па патрабаванні падатковага органа, у якасці крыніц, за кошт якіх была набыта маёмасць, даходаў, атрыманых ад здачы фізічным асобам у арэнду жылых і (ці) нежылых памяшканняў, машына-месцаў, у памерах, якія перавышаюць дзесяцікратны памер заплачанага за пэўны перыяд падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах, плацельшчык даплачвае падаходны падатак з фізічных асоб у памеры дзесяць (10) працэнтаў ад сумы такога перавышэння.

Вылічэнне сумы даплаты падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца падатковым органам не пазней за дзень, які ідзе следам за днём завяршэння камеральнай праверкі па пытанні захавання заканадаўства аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў.

Даплата падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца ў трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння плацельшчыку – фізічнай асобе паведамлення падатковага органа.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце лістом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

**Артыкул 222. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб. Паведамленне падатковага органа**

1. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб (далей у гэтым пункце – падатковая дэкларацыя) падаецца плацельшчыкамі ў адносінах да даходаў, указаных у артыкуле 219 гэтага Кодэкса, не пазней за 31 сакавіка года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам.

Да падатковай дэкларацыі дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць права на:

атрыманне падатковых вылікаў;

залік падатку, заплачанага ў замежнай дзяржаве з даходу, указанага ў падатковай дэкларацыі;

іншыя дакументы.

2. Асобы, на якіх не ўскладзены абавязак падаваць падатковую дэкларацыю, маюць права падаць такую дэкларацыю, у тым ліку з мэтай атрымання падатковых вылікаў.

3. Не падлягаюць указанню ў падатковай дэкларацыі даходы, якія поўнасцю вызваляюцца ад падаходнага падатку з фізічных асоб, якія вызваляюцца ад гэтага падатку ў межах памераў, устаноўленых артыкулам 208 гэтага Кодэкса, а таксама ўказаныя ў артыкуле 220 гэтага Кодэкса.

4. Форму падатковай дэкларацыі і парадак яе запаўнення ўстанаўлівае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

5. Фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, – грамадзяне Рэспублікі Беларусь пры выездзе з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь за яе межы на пастаяннае месца жыхарства абавязаны падаць падатковую дэкларацыю аб указаных у артыкуле 219 гэтага Кодэкса даходах за перыяд з 1 студзеня бягучага каляндарнага года па дзень падачы падатковай дэкларацыі і аплаціць падаходны падатак з фізічных асоб на падставе паведамлення падатковага органа.

Пры атрыманні ўказаных даходаў пасля падачы падатковай дэкларацыі такія фізічныя асобы абавязаны падаць падатковую дэкларацыю за перыяд з дня, які ідзе следам за днём падачы папярэдняй падатковай дэкларацыі, па дзень падачы такой дэкларацыі і аплаціць падаходны падатак з фізічных асоб на падставе паведамлення падатковага органа.

Падаходны падатак з фізічных асоб аплачваецца не пазней за пятнаццаць дзён з дня ўручэння паведамлення, але не пазней за дзень выезду на пастаяннае месца жыхарства за межы Рэспублікі Беларусь.

6. Паведамленне ўручаецца плацельшчыку асабіста пад подпіс, шляхам накіравання яго па пошце або з яго згоды праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам. Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце лістом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

Улік паведамленняў вядзецца ў рэестры па форме, якую зацвярджае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 223. Парадак заліку ці вяртання залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб, а таксама заплачанага ці спагнанага за кошт сродкаў падатковага агента**

1. Залішне ўтрыманы падаходны падатак з фізічных асоб падлягае заліку ў кошт будучых плацяжоў плацельшчыка, выканання яго падатковага абавязацельства па такім падатку або вяртанню плацельшчыку.

Залік ці вяртанне залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб могуць быць праведзены не пазней за пяць год з дня аплаты ў бюджэт такога падатку.

Залік залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб у кошт будучых плацяжоў плацельшчыка праводзіцца падатковым агентам самастойна шляхам змяншэння сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, якая падлягае ўтрыманню з даходаў, што выплачваюцца такому плацельшчыку.

Пры выяўленні падатковым агентам факта наяўнасці ў плацельшчыка нявыкананага падатковага абавязацельства па падаходным падатку з фізічных асоб падатковы агент самастойна робіць залік залішне ўтрыманай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб у кошт выканання такога абавязацельства.

Вяртанне плацельшчыку залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб праводзіцца падатковым агентам за кошт агульнай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, якая падлягае пералічэнню ў бюджэт у кошт будучых плацяжоў як па ўказаным плацельшчыку, так і па іншых плацельшчыках.

Падатковы агент мае права вярнуць плацельшчыку залішне ўтрыманы падаходны падатак з фізічных асоб за кошт уласных сродкаў.

У выпадках, калі ў падатковага агента адсутнічаюць выплаты даходаў плацельшчыкам (у тым ліку з прычыны спынення працоўнага дагавора (кантракта), скасавання грамадзянска-прававога дагавора) або падатковы агент не ажыццяўляе фінансава-гаспадарчую дзейнасць, залішне ўтрыманы падаходны падатак з фізічных асоб

плацельшчыку вяртае падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковага агента на падставе заявы плацельшчыка.

Вяртанне плацельшчыку залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб можа быць праведзена не пазней за пяць гадоў з дня яго аплаты ў бюджэт.

Падатковы орган не пазней за тры рабочыя дні з дня падачы плацельшчыкам заявы выпатрабуе ў падатковага агента дакументы, якія пацвярджаюць факт залішняга ўтрымання і пералічэння ў бюджэт падаходнага падатку з фізічных асоб з даходаў плацельшчыка.

Падатковы агент у сямідзённы тэрмін з дня атрымання звароту падатковага органа падае ў падатковы орган дакументы, указаныя ў частцы дзявятай гэтага пункта. Вяртанне плацельшчыку залішне ўтрыманага падатку праводзіцца падатковым органам не пазней за пятнаццаць рабочых дзён з дня падачы заявы плацельшчыкам.

У выпадках, калі па выніках разгляду заявы плацельшчыка факт залішняга ўтрымання падаходнага падатку з фізічных асоб не пацверджаны або падатковым агентам не пададзены дакументы, указаныя ў частцы дзявятай гэтага пункта, кіраўнік (яго намеснік) падатковага органа не пазней за пятнаццаць рабочых дзён з дня падачы заявы плацельшчыкам прымае рашэнне аб адмове ў правядзенні такога вяртання.

2. Падатковы агент мае права на залік ці вяртанне падаходнага падатку з фізічных асоб пры аплаце такога падатку ці яго спагнанні за кошт уласных сродкаў падатковага агента, калі:

плацельшчык правёў вяртанне (поўнасцю ці часткова) выдадзеных яму падатковым агентам пазык, крэдытаў, з якіх падаходны падатак з фізічных асоб быў аплачаны за кошт сродкаў падатковага агента. Пры частковым вяртанні плацельшчыкам пазыкі, крэдыту падатак падлягае вяртанню ў памеры, прапарцыянальным суме вернутай пазыкі, крэдыту;

плацельшчык аплаціў у бюджэт падаходны падатак з фізічных асоб, аплачаны за яго падатковым агентам ці спагнаны за кошт сродкаў падатковага агента;

вяртанне плацельшчыку залішне ўтрыманага падаходнага падатку з фізічных асоб было праведзена за кошт сродкаў падатковага агента.

3. Вяртанне падатковаму агенту падаходнага падатку з фізічных асоб, аплачанага ці спагнанага за кошт сродкаў падатковага агента, праводзіцца:

падатковым агентам самастойна за кошт агульнай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, якая падлягае пералічэнню ў бюджэт;

падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік у парадку, устаноўленым пунктам 5 артыкула 66 гэтага Кодэкса, пры падачы падатковым агентам дакументаў, якія пацвярджаюць яго права на вяртанне падатку.

### Артыкул 224. Спецыяльныя палажэнні. Ліквідацыя двайнога падаткаабкладання

1. Фактычна аплачаныя (утрыманыя) плацельшчыкам, які з'яўляецца падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых у гэтай замежнай дзяржаве, падлягаюць заліку пры аплаце падаходнага падатку з фізічных асоб у Рэспубліцы Беларусь, за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон – дзяржаў (тэрыторый), у якіх дзейнічае льготны падатковы рэжым і (ці) не прадугледжваюцца раскрыццё і даванне інфармацыі аб фінансавых аперацыях, па пераліку гэтых афшорных зон – дзяржаў (тэрыторый), які вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь для мэт прымянення афшорнага збору.

Для правядзення заліку плацельшчык абавязаны падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік дакументы аб атрыманым даходзе і аб аплаце ім падатку ў замежнай

дзяржаве, пацверджаныя падатковым ці іншым кампетэнтным органам гэтай замежнай дзяржавы.

Па пісьмовай заяве плацельшчыка залік можа быць праведзены падатковым органам на падставе дакументаў аб атрыманым плацельшчыкам даходзе і аб аплаце ім падатку ў замежнай дзяржаве, пацверджаных крыніцай выплаты даходу. Правядзенне заліку на падставе такіх дакументаў не вызваляе плацельшчыка ад абавязку падаць у падатковы орган дакументы, указаныя ў частцы другой гэтага пункта. У выпадку непадачы плацельшчыкам дакументаў аб атрыманым даходзе і аб аплаце ім падатку ў замежнай дзяржаве, пацверджаных падатковым ці іншым кампетэнтным органам гэтай замежнай дзяржавы, на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падаходны падатак з фізічных асоб падлягае пераразліку і даплаце ў бюджэт з налічэннем пені.

Вылічэнне падлеглых заліку сум падатку, аплачаных (утрыманых) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы, з даходаў, атрыманых у гэтай замежнай дзяржаве, праводзіцца асобна па кожным даходзе ў межах сум падатку, аплачаных (утрыманых) з такога даходу, але не больш за суму падаходнага падатку з фізічных асоб, падлічаную з указанага даходу ў адпаведнасці з гэтай главой.

Палажэнні гэтага пункта не распаўсюджваюцца на фактычна аплачаныя (утрыманыя) плацельшчыкам – індывідуальным прадпрымальнікам, які з'яўляецца падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых у гэтай замежнай дзяржаве ў сувязі з ажыццяўленнем ім прадпрымальніцкай дзейнасці.

2. Фактычна аплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходу, атрыманага плацельшчыкам – падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ад беларускай арганізацыі, якая ажыццяўляе на тэрыторыі замежнай дзяржавы дзейнасць, што прызнаецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і (ці) заканадаўствам гэтай замежнай дзяржавы дзейнасцю праз пастаяннае прадстаўніцтва, і знаходзіцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковым органе ўказанай замежнай дзяржавы (далей у гэтым пункце – беларуская арганізацыя), залічваюцца беларускай арганізацыяй пры аплаце падаходнага падатку з фізічных асоб у Рэспубліцы Беларусь у парадку і памеры, прадугледжаных гэтым пунктам.

Даходам, указаным у частцы першай гэтага пункта, прызнаецца атрыманы плацельшчыкам даход, які ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання падлягае падаткаабкладанню.

Аплачаная ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сума падатку з даходу, указанага ў частцы першай гэтага пункта, пералічаная ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля да адпаведнай замежнай валюты, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на апошні дзень месяца, за які плацельшчыку быў налічаны такі даход, залічваецца беларускай арганізацыяй у кошт аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб у Рэспубліцы Беларусь. Такі залік праводзіцца ў межах вылічанай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб з даходу, указанага ў частцы першай гэтага пункта, і не можа перавышаць суму падатку, заплачанага з такога даходу ў бюджэт замежнай дзяржавы.

Залік праводзіць беларуская арганізацыя на падставе разліковых дакументаў, якія пацвярджаюць пералічэнне падатку ў бюджэт замежнай дзяржавы, з дадаваннем да іх рэестра плацельшчыкаў, з даходаў якіх быў аплачаны падатак. У гэтым рэестры ўказваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць) плацельшчыка, сума налічанага даходу і аплачанага ў бюджэт замежнай дзяржавы падатку ў замежнай валюце.

Залік, указаны ў частцы трэцяй гэтага пункта, праводзіцца беларускай арганізацыяй у тэрміны, устаноўленыя абзацам сёмым пункта 6 артыкула 216 гэтага Кодэкса.

Беларуская арганізацыя, якая праводзіла залік, указаны ў частцы трэцяй гэтага пункта, абавязана не пазней за 31 снежня года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік дакументы, якія пацвярджаюць пастаноўку на ўлік у падатковым органе замежнай дзяржавы ў якасці пастаяннага прадстаўніцтва, якое ажыццяўляе на тэрыторыі такой замежнай дзяржавы дзейнасць, што прызнаецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і (ці) заканадаўствам гэтай замежнай дзяржавы дзейнасцю праз пастаяннае прадстаўніцтва, і дакументы аб сумах выплачаных кожнаму плацельшчыку даходаў і аплачаных з іх у бюджэт замежнай дзяржавы сумах падатку, пацверджаныя падатковым ці іншым кампетэнтным органам гэтай замежнай дзяржавы.

У выпадку непадачы беларускай арганізацыяй у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік ва ўстаноўлены тэрмін дакументаў, указаных у частцы шостай гэтага пункта, такая арганізацыя абавязана не пазней за 10 студзеня другога года, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, аплаціць за кошт уласных сродкаў у бюджэт суму падаходнага падатку з фізічных асоб, раней залічаную ў адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага пункта.

3. Фактычна аплачаныя (утрыманыя) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку на даход у адносінах да даходу, атрыманага ў гэтай замежнай дзяржаве ў сувязі з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці, залічваюцца плацельшчыку – індывідуальнаму прадпрымальніку пры аплаце падаходнага падатку з фізічных асоб у Рэспубліцы Беларусь у парадку і памерах, устаноўленых гэтым пунктам.

Аплачаная (утрыманая) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сума падатку на даход пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўнясення падатку ў бюджэт замежнай дзяржавы.

Залік ажыццяўляецца ў тым справаздачным (падатковым) перыядзе, у якім індывідуальны прадпрымальнік падаў у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік даведка (іншы дакумент) падатковага органа (іншай кампетэнтнай службы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў) замежнай дзяржавы, якая пацвярджае факт аплаты гэтай сумы падатку ў гэтай дзяржаве. Пры гэтым падлеглая заліку сума падатку адлюстроўваецца ў падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку таго справаздачнага (падатковага) перыяду, у якім такая даведка (іншы дакумент) пададзена.

У даведцы, якая пацвярджае аплату падатку на даход у замежнай дзяржаве, павінны быць указаны найменне плацельшчыка, назва падатку, дата аплаты падатку і перыяд, за які выплачваўся падатак, назва, памер аб'екта падаткаабкладання (падатковай базы), стаўка падатку і сума падатку, залічанага ў бюджэт замежнай дзяржавы.

Залік сумы падатку на даход, аплачанай (утрыманай) у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання ў адносінах да даходу, атрыманага ў замежнай дзяржаве:

праводзіцца ў межах аплачанай (якая аплачваецца) у Рэспубліцы Беларусь сумы падаходнага падатку з фізічных асоб у адносінах да гэтага даходу;

не можа перавышаць суму падаходнага падатку з фізічных асоб, належную да аплаты ў адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання (пры яго наяўнасці).

4. Для мэт прымянення палажэнняў міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання плацельшчык падае падатковаму агенту ці ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік пацвярджэнне таго, што ён з'яўляецца рэзідэнтам

замежнай дзяржавы, з якой ёсць міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання, выдадзенае (засведчанае) упаўнаважаным органам замежнай дзяржавы (далей у гэтым артыкуле – пацвярджэнне).

Пацвярджэнне можа падавацца падатковаму агенту ці ў падатковы орган як да, так і пасля аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб. Пацвярджэнне можа быць пададзена ў выглядзе электроннага дакумента.

Пацвярджэнне сапраўднае на працягу каляндарнага года, у якім яно выдадзена (засведчана), або на працягу ўказанага ў ім перыяду, калі іншае не прадугледжана часткай чацвёртай гэтага пункта.

Пры наяўнасці прынятага падатковым агентам ці падатковым органам пацвярджэння на бягучы каляндарны год такое пацвярджэнне, выдадзенае (засведчанае) у снежні бягучага года без указання перыяду, на які яно сапраўднае, прымаецца ў якасці пацвярджэння на наступны каляндарны год.

Для мэт гэтага артыкула бягучым каляндарным годам з'яўляецца год, у якім выдадзена (засведчана) пацвярджэнне.

Пры падачы падатковаму агенту пацвярджэння да даты выплаты даходу, у адносінах да якога міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання прадугледжаны іншыя палажэнні, чым тыя, якія ўстаноўлены гэтай главой, у адносінах да такога даходу падатковым агентам падаходны падатак з фізічных асоб не ўтрымліваецца і не пералічваецца ў бюджэт або ўтрымліваецца і пералічваецца ў бюджэт па паніжаных падатковых стаўках, устаноўленых такім міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Калі на працягу падатковага перыяду выплата даходаў плацельшчыку праводзіцца некалькімі падатковымі агентамі, плацельшчык падае кожнаму падатковаму агенту пацвярджэнне і яго копію (а ў выпадку падачы пацвярджэння на замежнай мове – пераклад на беларускую ці рускую мову ў парадку, устаноўленым пунктам 4 артыкула 22 гэтага Кодэкса, і яго копію). Падатковы агент вяртае плацельшчыку арыгіналы пададзеных дакументаў пасля іх зверкі з копіямі.

Пры непадачы падатковаму агенту пацвярджэння падаходны падатак з фізічных асоб утрымліваецца і пералічваецца ў бюджэт ва ўстаноўленым парадку.

Падача пацвярджэння ў падатковы орган з'яўляецца падставай для вызвалення ад аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб ці аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб па паніжаных стаўках.

Вяртанне ці залік раней аплачанага (утрыманага) падаходнага падатку з фізічных асоб, у адносінах да якога міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання прадугледжаны іншыя палажэнні, чым тыя, якія ўстаноўлены гэтай главой, ажыццяўляюцца падатковым органам ці падатковым агентам у беларускіх рублях пасля падачы плацельшчыкам пацвярджэння і заявы аб вяртанні ці заліку падатку.

5. Факт пацвярджэння пастаяннага месцазнаходжання фізічнай асобы ў Рэспубліцы Беларусь для мэт прымянення міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сведчыцца даведкай па форме, устаноўленай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

6. У мэтах ліквідацыі двайнога падаткаабкладання даходаў, што атрымліваюць фізічныя асобы, якія не прызнаюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, з крыніц у Рэспубліцы Беларусь, падатковыя органы выдаюць даведку аб аплаце (утрыманні) падаходнага падатку па форме, устаноўленай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 19
## ПАДАТАК НА НЕРУХОМАСЦЬ

### Артыкул 225. Плацельшчыкі падатку на нерухомасць

Плацельшчыкамі падатку на нерухомасць прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, у тым ліку зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, з улікам асаблівасцей, устаноўленых артыкулам 226 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 226. Асаблівасці прызнання плацельшчыкамі падатку на нерухомасць асобных арганізацый і фізічных асоб

1. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятых арганізацыямі:

у фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як фінансавы лізінг, у беларускіх арганізацый, плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя, у якой такія капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі знаходзяцца на балансе па ўмовах дагавора фінансавай арэнды (лізінгу);

у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне ў фізічных асоб (як прызнаных, так і не прызнаных падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь), плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя-арандатар (лізінгаатрымальнік, пазыкаатрымальнік);

у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне ў замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя-арандатар (лізінгаатрымальнік, пазыкаатрымальнік), за выключэннем выпадку, указанага ў частцы другой гэтага пункта.

Па збудаваннях магістральнага трубаправоднага транспарту, нафтаправодаў, газаправодаў, тэхналагічных газаправодаў і адводаў, а таксама станцыях, сховішчах, устаноўках, іншых аб'ектах падаткаабкладання, якія забяспечваюць функцыянаванне збудаванняў магістральнага трубаправоднага транспарту, нафтаправодаў, газаправодаў, тэхналагічных газаправодаў і адводаў, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і перададзеных замежнай арганізацыяй у арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае валоданне (карыстанне), плацельшчыкам прызнаецца гэта замежная арганізацыя.

2. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, замацаваных уласнікам на праве гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання за арганізацыяй, плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя, за якой замацаваны на праве гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі.

3. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, стварэнне, змяненне якіх ці ўзнікненне, пераход правоў уласнасці, гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання на якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі, да дзяржаўнай рэгістрацыі іх стварэння, змянення ці ўзнікнення, пераходу на іх правоў уласнасці, гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя, у якой такія капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі знаходзяцца на ўліку (на бухгалтарскім уліку ці на ўліку ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання).

4. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, іх частках, перададзеных у бязвыплатнае карыстанне акцыянерным таварыствам, створаным у працэсе пераўтварэння арэндных, калектыўных (народных), дзяржаўных, дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў, плацельшчыкамі прызнаюцца арганізацыі-пазыкаатрымальнікі.

5. Плацельшчыкамі падатку на нерухомасць не прызнаюцца бюджэтныя арганізацыі, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых часткай другой гэтага пункта.

Пры здачы бюджэтнымі арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак такія капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі падлягаюць падаткаабкладанню падаткам на нерухомасць у парадку, устаноўленым гэтай главой, акрамя выпадкаў здачы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне:

бюджэтным арганізацыям;

арганізацыям, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферах адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту і атрымліваюць субсідыі з бюджэту;

арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі харчавання выхаванцаў, навучэнцаў, курсантаў і студэнтаў ва ўстановах адукацыі;

арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама для падрыхтоўкі спартсменаў-навучэнцаў у спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах;

дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам;

спецыялізаваным навучальна-спартыўным установам прафсаюзаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання;

навуковым арганізацыям;

навукова-тэхналагічным паркам;

цэнтрам трансферу тэхналогій;

арганізацыям культуры.

6. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятых фізічнай асобай, якая выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, у фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як фінансавы лізінг, у арганізацыі, калі па ўмовах дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) гэтыя аб'екты не знаходзяцца на балансе арганізацыі-лізінгадавальніка, плацельшчыкам прызнаецца такая фізічная асоба – лізінгаатрымальнік.

7. Па аднакватэрных жылых дамах ці кватэрах, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятых фізічнай асобай, якая не выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, у фінансавую арэнду (лізінг) па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, плацельшчыкам прызнаецца такая фізічная асоба – лізінгаатрымальнік.

**Артыкул 227. Аб'екты падаткаабкладання падаткам на нерухомасць**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый, за выключэннем аб'ектаў, пералічаных у пункце 2 гэтага артыкула, прызнаюцца:

1.1. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія з'яўляюцца ўласнасцю ці знаходзяцца ў гаспадарчым вядзенні ці ў аператыўным кіраванні арганізацый;

1.2. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятыя ў фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як фінансавы лізінг, арганізацыямі ў беларускіх арганізацый, у выпадку, калі па ўмовах дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) гэтыя аб'екты не знаходзяцца на балансе арганізацый-лізінгадавальнікаў;

1.3. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятыя арганізацыямі ў арэнду (фінансавую арэнду

(лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне ў фізічных асоб (як прызнаных, так і не прызнаных падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь);

1.4. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятыя арганізацыямі ў арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне ў замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва;

1.5. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія знаходзяцца на ўліку (на бухгалтарскім уліку ці на ўліку ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), стварэнне, змяненне якіх ці ўзнікненне, пераход правоў уласнасці, гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання на якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі, да дзяржаўнай рэгістрацыі іх стварэння, змянення ці ўзнікнення, пераходу на іх правоў уласнасці, гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання;

1.6. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, атрыманыя ў бязвыплатнае карыстанне акцыянернымі таварыствамі, створанымі ў працэсе пераўтварэння арэндных, калектыўных (народных), дзяржаўных, дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў.

2. Не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый:

2.1. культавыя капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі рэлігійных арганізацый (аб'яднанняў), зарэгістраваных у адпаведнасці з заканадаўствам;

2.2. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам як будынкі мабільныя (у тым ліку зборна-разборныя і перасовачныя) для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў;

2.3. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў як збудаванні і перадатачныя прылады і не ўлічваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам у бухгалтарскім уліку ў складзе аб'ектаў асноўных сродкаў і даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, па правілах, устаноўленых у адносінах да асноўных сродкаў, якія знаходзяцца на балансе, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы);

2.4. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, набытыя за кошт сродкаў, атрыманых у выглядзе міжнароднай тэхнічнай дапамогі і (ці) капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, атрыманыя ў выглядзе міжнароднай тэхнічнай дапамогі на тэрмін іх выкарыстання ў мэтах непасрэднага ажыццяўлення такой дапамогі;

2.5. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія з'яўляюцца аб'ектамі агульнага карыстання садаводчых суполак, набытыя (створаныя) за кошт узносаў іх членаў, а таксама ў працэсе ажыццяўлення сваёй дзейнасці.

3. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у плацельшчыкаў – фізічных асоб за выключэннем аб'ектаў, пералічаных у пункце 4 гэтага артыкула, прызнаюцца размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:

3.1. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія належаць фізічным асобам на праве ўласнасці ці прынятыя па спадчыне, долі ў праве ўласнасці ці долі ў спадчыне на ўказаную маёмасць;

3.2. не завершаныя будаўніцтвам капітальныя пабудовы;

3.3. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, узятыя фізічнай асобай, што выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, у фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як

фінансавы лізінг, у арганізацыі, калі па ўмовах дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) гэтыя аб'екты не знаходзяцца на балансе арганізацыі-лізінгадавальніка;

3.4. аднакватэрныя жылыя дамы ці кватэры, узятыя фізічнай асобай, якая не выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, у фінансавую арэнду (лізінг) па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу.

4. Не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у плацельшчыкаў – фізічных асоб капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі:

4.1. самавольна пабудаваныя, за выключэннем выпадкаў, калі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі прынята рашэнне аб працягу будаўніцтва ці аб прыняцці пабудовы ў эксплуатацыю і яе дзяржаўнай рэгістрацыі ў тэрытарыяльных арганізацыях па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй з даваннем пры неабходнасці зямельнага ўчастка асобе, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва;

4.2. якія знаходзяцца ў аварыйным стане, заключэнне аб стане якіх атрымана ад спецыялізаванай арганізацыі, атэставанай на правядзенне абследаванняў будынкаў і збудаванняў, або мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і эксплуатацыя якіх спынена;

4.3. прызнаныя безгаспадарнымі ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі;

4.4. перададзеныя арганізацыям у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне;

4.5. замацаваныя фізічнай асобай – уласнікам на праве гаспадарчага вядзення за арганізацыяй.

5. Для мэт гэтай главы выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны і іх азначэнні:

5.1. жылое памяшканне ў шматкватэрным ці блакіраваным жылым доме – кватэра, пакой, прызначаныя для пражывання фізічных асоб;

сельская мясцовасць – тэрыторыя, якая ўваходзіць у пpасторавыя межы сельскіх Саветаў, за выключэннем тэрыторый пасёлкаў гарадскога тыпу і гарадоў раённага падпарадкавання;

5.2. пры вылічэнні падатку на нерухомасць плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальная пабудова (будынак, збудаванне) – аб'ект, які класіфікуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў як будынак, збудаванне ці перадатачная прылада;

5.3. пры вылічэнні падатку на нерухомасць плацельшчыкам – фізічным асобам:

капітальная пабудова (будынак, збудаванне) – жылы дом, жылое памяшканне ў шматкватэрным ці блакіраваным жылым доме, садовы домік, дача, гараж, іншыя будынак і збудаванне, машына-месца;

мнагадзетная сям'я – сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш непаўналетніх дзяцей;

не завершаная будаўніцтвам капітальная пабудова – будынак, збудаванне, якія маюць падмурак, сцены, дах (калі згодна з праектнай дакументацыяй на будаўніцтва, рэканструкцыю аб'екта і (ці) прызначэннем капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) іх будаўніцтва мяркуецца) і будаўніцтва якіх дазволена ў адпаведнасці з заканадаўствам, але не завершана (будаўніцтва якіх працягваецца, прыпынена, спынена ці закансервавана) ці будаўніцтва якіх завершана, але такія аб'екты не зарэгістраваны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

**Артыкул 228. Льготы па падатку на нерухомасць**

1. Вызваляюцца ад падатку на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый:

1.1. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі дзяржаўнага жыллёвага фонду і жыллёвага фонду арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці (за выключэннем аднакватэрных жылых дамоў, жылых памяшканняў у шматкватэрных і (ці) блакіраваных жылых дамах, якія знаходзяцца ва ўласнасці, гаспадарчым вядзенні ці аператыўным кіраванні арганізацый і не выкарыстоўваюцца для пражывання фізічнымі асобамі);

1.2. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам як будынкі для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў і выкарыстоўваюцца ў сферах адукацыі і аховы здароўя;

1.3. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, уключаныя ў рэестр фізкультурна-спартыўных збудаванняў;

1.4. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі арганізацый культуры, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый;

1.5. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі арганізацый грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў», грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх» і грамадскага аб'яднання «Беларускае суполка інвалідаў па зроку», а таксама адасобленых падраздзяленняў гэтых арганізацый пры ўмове, калі колькасць інвалідаў ва ўказаных арганізацыях ці іх адасобленых падраздзяленнях складае не менш за 50 працэнтаў ад спісачнай колькасці ў сярэднім за перыяд.

Для мэт гэтага падпункта:

колькасць работнікаў (інвалідаў) арганізацыі вызначаецца ў сярэднім за папярэдні падатковы перыяд шляхам падсумоўвання сярэдняй колькасці работнікаў (інвалідаў) за ўсе месяцы папярэдняга падатковага перыяду і дзялення атрыманай сумы на колькасць месяцаў, за якія вызначана сярэдняя колькасць работнікаў (інвалідаў);

сярэдняя колькасць работнікаў (інвалідаў) за кожны месяц вызначаецца як падлічаная ў парадку, устаноўленым Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь, спісачная колькасць работнікаў у сярэднім за месяц (за выключэннем работнікаў, якія знаходзяцца ў водпусках па цяжарнасці і родах, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзіцяці ва ўзросце да трох месяцаў або прызначэннем іх апекунамі, доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад трох да шаснаццаці гадоў), сярэдняя колькасць працуючых па сумяшчальніцтве з месцам асноўнай працы ў іншых наймальнікаў, сярэдняя колькасць асоб, якія выконвалі працу па грамадзянска-прававых дагаворах (у тым ліку заключаных з юрыдычнымі асобамі, калі прадметам дагавора з'яўляецца аказанне паслугі па даванні, найме работнікаў);

разлік колькасці работнікаў праводзіцца ў цэлым па арганізацыі, уключаючы яе філіялы, прадстаўніцтвы і іншыя адасобленыя падраздзяленні;

1.6. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта»;

1.7. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), закансерваваныя ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

1.8. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, прызначаныя для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі па пераліку, зацверджаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

1.9. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія прызнаюцца ва ўстаноўленым парадку матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, па пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выканання іх уласнікамі (уладальнікамі) заканадаўства аб культуры, за

выключэннем капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія выкарыстоўваюцца арганізацыямі для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, у тым ліку для размяшчэння органаў кіравання, бухгалтарскіх і іншых службаў гэтых арганізацый, акрамя капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) бюджэтных арганізацый і некамерцыйных арганізацый культуры;

1.10. аўтамабільныя дарогі агульнага карыстання (уключаючы земляное палатно з водаадводнымі збудаваннямі, дарожнае адзенне, штучныя збудаванні, тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху, інжынернае абсталяванне і добраўпарадкаванне, абаронныя збудаванні), а таксама размешчаныя на іх аб'екты дарожнага сэрвісу;

1.11. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі сельскагаспадарчага прызначэння, якія выкарыстоўваюцца (прызначаны для выкарыстання) арганізацыямі для вытворчасці прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, рыбаводства і пчалаводства;

1.12. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі войскаў стратэгічнага прызначэння Расійскай Федэрацыі, часова дыслацыраваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.13. упершыню ўведзеныя ў дзеянне капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі на працягу аднаго года з даты іх прыёмкі ў эксплуатацыю ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.14. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія адносяцца да аб'ектаў добраўпарадкавання гарадоў, пасёлкаў гарадскога тыпу і іншых населеных пунктаў, якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў бюджэту;

1.15. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, у тым ліку прызначаныя для захоўвання адпаведнай маёмасці, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія выкарыстоўваюцца выключна для грамадзянскай абароны;

1.16. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі арганізацый спажывецкай кааперацыі, якія адносяцца да гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання і размешчаны ў сельскай мясцовасці;

1.17. да 1 студзеня 2020 года капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі навуковых арганізацый і навукова-тэхналагічных паркаў.

Для мэт гэтай главы пад навуковай арганізацыяй разумеецца арганізацыя, якая прайшла ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку акрэдытацыю навуковай арганізацыі, асноўным відам дзейнасці якой з'яўляюцца навуковыя даследаванні і распрацоўкі.

Асноўны від дзейнасці вызначаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, для мэт збору і падачы статыстычных даных;

1.18. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія належаць на праве ўласнасці грамадскаму аб'яднанню «Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь»;

1.19. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі ў плацельшчыкаў падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, якія з'яўляюцца рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі, а таксама арганізацыйнымі структурамі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь», створанымі ў выглядзе юрыдычных асоб;

1.20. да 1 студзеня 2020 года капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя імі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне навуковым арганізацыям і навукова-тэхналагічным паркам.

2. Пры даванні арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, вызваленых ад падатку на нерухомасць у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, за выключэннем капітальных

пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, вызваленых ад падатку на нерухомасць у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула, права на прымяненне льгот па падатку на нерухомасць у адносінах да такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак губляецца, за выключэннем выпадкаў, пералічаных у частцы другой гэтага пункта.

Права на прымяненне льгот па падатку на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый не губляецца ў адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія даюцца ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне:

бюджэтным арганізацыям;

арганізацыям, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту і атрымліваюць субсідыі з бюджэту;

установамі адукацыі спажывецкай кааперацыі – арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі харчавання выхаванцаў, навучэнцаў і студэнтаў ва ўстановах адукацыі;

установамі адукацыі, якія фінансуюцца з бюджэту, – арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама для падрыхтоўкі спартсменаў-навучэнцаў у спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах;

Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і яго структурнымі падраздзяленнямі;

калегіямі адвакатаў;

дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам;

спецыялізаваным навучальна-спартыўным установам прафсаюзаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання;

навуковым арганізацыям;

навукова-тэхналагічным паркам;

цэнтрам трансферу тэхналогій;

навукова-тэхналагічнымі паркамі – іх рэзідэнтам;

арганізацыям культуры.

3. Вызваленне ад падатку на нерухомасць пры аплаце падатку на нерухомасць простая суполка не прымяняе.

4. Вызваляюцца ад падатку на нерухомасць у плацельшчыкаў – фізічных асоб:

4.1. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія прызнаюцца ва ўстаноўленым парадку матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, па пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выканання іх уласнікамі (уладальнікамі) заканадаўства аб культуры;

4.2. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, закансерваваныя ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

4.3. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, за выключэннем жылых памяшканняў, указаных у падпункце 4.4 гэтага пункта, якія належаць:

4.3.1. членам мнагадзетных сямей;

4.3.2. ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы;

4.3.3. фізічным асобам, якія праходзяць альтэрнатыўную службу;

4.3.4. удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і іншым асобам, якія маюць права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах»;

4.4. адно жылое памяшканне ў шматкватэрным ці ў блакіраваным жылым доме, якое належыць фізічнай асобе на праве ўласнасці ці прынята ім у спадчыну, доля ў праве ўласнасці ці доля ў спадчыне на ўказаную маёмасць. Пры наяўнасці ў фізічнай асобы двух і больш такіх жылых памяшканняў, долей у праве ўласнасці ці долей у спадчыне на

ўказаную маёмасць вызваленню ад падатку на нерухомасць падлягае толькі адзін аб'ект падаткаабкладання па выбары фізічнай асобы на падставе паведамлення, пададзенага ёй у падатковы орган.

Жылыя памяшканні ў шматкватэрным ці ў блакіраваным жылым доме, долі ў праве ўласнасці ці долі ў спадчыне на ўказаную маёмасць, якія належаць членам мнагадзетнай сям'і, вызваляюцца ад падатку на нерухомасць незалежна ад палажэнняў часткі першай гэтага падпункта;

4.5. жылыя дамы з нежылымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), якія знаходзяцца ва ўласнасці, прынятыя ў спадчыну, долі ў праве ўласнасці ці долі ў спадчыне на ўказаную маёмасць, якія належаць:

асобе, якая мае права на пенсію па ўзросце;

інваліду I і II групы;

непаўналетняму дзіцяці;

асобе, прызнанай недзеяздольнай.

Вызваленне ад аплаты падатку на нерухомасць даецца пры ўмове адсутнасці рэгістрацыі працаздольных асоб у капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), указаных у частцы першай гэтага падпункта.

Не ўлічваюцца ў складзе працаздольных асоб пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў і (ці) звестак:

асобы, якія маюць права на пенсію па ўзросце;

інваліды I і II групы;

непаўналетнія дзеці;

ваеннаслужачыя тэрміновай ваеннай службы;

асобы, якія праходзяць альтэрнатыўную службу;

асобы, якія адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі;

асобы, указаныя ў падпункце 4.7 гэтага пункта.

Для мэт гэтага падпункта рэгістрацыяй прызнаецца рэгістрацыя фізічных асоб па месцы жыхарства ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

4.6. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, за выключэннем указаных у падпунктах 4.4 і 4.5 гэтага пункта, якія належаць:

асобе, якая мае права на пенсію па ўзросце;

інваліду I і II групы;

непаўналетняму дзіцяці;

асобе, прызнанай недзеяздольнай;

4.7. капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, размешчаныя ў сельскай мясцовасці, што належаць фізічнай асобе, якая зарэгістравана па месцы жыхарства ў сельскай мясцовасці і працуе:

у арганізацыі (яе структурных ці адасобленых падраздзяленнях), размешчанай у сельскай мясцовасці, якая ажыццяўляе сельскагаспадарчую вытворчасць;

у філіяле ці іншым адасобленым падраздзяленні арганізацыі, якая вырабляе сельскагаспадарчую прадукцыю і набыла ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі, у выніку рэарганізацыі, набыцця (бязвыплатнай перадачы) прадпрыемства як маёмаснага комплексу правы і абавязкі стратных сельскагаспадарчых арганізацый;

у арганізацыі (яе структурным ці адасобленым падраздзяленні) аховы здароўя, культуры, ва ўстанове (яе структурным ці адасобленым падраздзяленні) адукацыі і сацыяльнай абароны, размешчаных у сельскай мясцовасці.

Пенсіянеры, якія раней працавалі ў арганізацыях (іх структурных ці адасобленых падраздзяленнях), указаных у частцы першай гэтага падпункта, вызваляюцца ад аплаты падатку на нерухомасць у адносінах да размешчаных у сельскай мясцовасці капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак.

5. Вызваленне ад падатку на нерухомасць, прадугледжанае пунктам 4 гэтага артыкула, не распаўсюджваецца на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, калі яны прызначаны і (ці) выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Артыкул 229. Падатковая база падатку на нерухомасць**

1. Падатковая база падатку на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый вызначаецца зыходзячы з наяўнасці на 1 студзеня каляндарнага года:

капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія ўлічваюцца ў бухгалтарскім уліку ў складзе аб'ектаў асноўных сродкаў і даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы (якія ўлічваюцца ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, у адпаведнасці з падпунктам 3.8 пункта 3 артыкула 333 гэтага Кодэкса па правілах, устаноўленых у адносінах да асноўных сродкаў, даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, якія знаходзяцца на балансе) па астаткавым кошце;

іншых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак па іх кошце, адлюстраваным у бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання).

2. Падатковая база падатку на нерухомасць у плацельшчыкаў-арганізацый у адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ўзятых арганізацыямі ў арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне ў фізічных асоб, вызначаецца зыходзячы з кошту такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, указанага ў дагаворах арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), іншага аплатнага ці бязвыплатнага карыстання, але не менш чым кошт гэтых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, вызначаны зыходзячы з іх ацэнкі:

2.1. па ацэначным кошце капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, вызначаным тэрытарыяльнымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй па зваротах уласнікаў на 1 студзеня бягучага года;

2.2. указанай у заключэнні аб ацэнцы (па рыначным кошце) капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на 1 студзеня бягучага года, выдадзеным ацэншчыкам (індывідуальным прадпрымальнікам або работнікам індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы), які мае пасведчанне аб атэстацыі ацэншчыка;

2.3. праведзенай у іншым парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Падатковая база падатку на нерухомасць плацельшчыкам – фізічным асобам у адносінах да аб'ектаў падаткаабкладання вызначаецца зыходзячы з іх кошту, вызначанага ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 230. Стаўкі падатку на нерухомасць**

1. Гадавая стаўка падатку на нерухомасць устанаўліваецца ў наступных памерах:

1.1. для плацельшчыкаў-арганізацый:

адзін (1) працэнт – у адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, за выключэннем указаных у абзацах трэцім – сёмым гэтага пункта;

нуль цэлых адна дзясятая (0,1) працэнта – у адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак для гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садаводчых суполак, жыллёва-

будаўнічых, спажывецкіх кааператываў, суполак уласнікаў, створаных для абслугоўвання жылых дамоў, у частцы, якая адносіцца на грамадзян – членаў кааператываў, суполак;

нуль цэлых дзве дзясятыя (0,2) працэнта – у адносінах да ўзведзеных пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на працягу другога года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых чатыры дзясятыя (0,4) працэнта – у адносінах да ўзведзеных пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на працягу трэцяга года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых шэсць дзясятых (0,6) працэнта – у адносінах да ўзведзеных пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на працягу чацвёртага года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых восем дзясятых (0,8) працэнта – у адносінах да ўзведзеных пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на працягу пятага года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

1.2. для плацельшчыкаў – фізічных асоб:

нуль цэлых дзве дзясятыя (0,2) працэнта – у адносінах да жылых памяшканняў у шматкватэрных ці блакіраваных жылых дамах для плацельшчыкаў – фізічных асоб, якія маюць два і больш жылыя памяшканні ў шматкватэрных і (ці) блакіраваных жылых дамах на праве ўласнасці, прынятыя ў спадчыну, долі ў праве ўласнасці ці долі ў спадчыне на ўказаную маёмасць;

нуль цэлых адна дзясятая (0,1) працэнта – у адносінах да іншых аб'ектаў падаткаабкладання.

2. Абласныя Саветы дэпутатаў ці па іх даручэнні мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню і Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў (далей у гэтай главе – мясцовыя Саветы дэпутатаў) маюць права павялічваць (памяншаць) стаўкі падатку на нерухомасць асобным катэгорыям плацельшчыкаў:

на 2019 год – не больш чым у два з паловай разы;

на 2020 год і наступныя гады – не больш чым у два разы.

3. Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб павелічэнні ставак падатку на нерухомасць, прынятыя ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на:

арганізацыі, якім рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зменены ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін аплаты падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў;

газазабяспечвальныя і энергазабяспечвальныя арганізацыі, якія аказваюць паслугі насельніцтву па газа- і электразабеспячэнні;

унітарныя прадпрыемствы грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў і ўстановы грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў;

арганізацыі, прызнаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь эканамічна неплацежаздольнымі (банкрутамі), у працэдуры ліквідацыйнага вядзення;

капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, у адносінах да якіх прымяняюцца стаўкі, устаноўленыя абзацамі чацвёртым – сёмым падпункта 1.1 пункта 1 гэтага артыкула.

4. Падатак на нерухомасць вылічваецца па стаўцы, павялічанай (зменшанай) у адпаведнасці з рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў па месцы знаходжання аб'ектаў падаткаабкладання.

У плацельшчыкаў-арганізацый месцам знаходжання капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных адначасова на тэрыторыі некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак ці некалькіх эканамічна-планіровачных зон у межах адной адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі (прылады электраперадачы і сувязі, трубаправоды, газаправоды і іншыя аб'екты), прызнаецца месца знаходжання арганізацый ці іх філіялаў, прадстаўніцтваў і іншых адасобленых падраздзяленняў, у якіх аб'екты ўлічваюцца па даных бухгалтарскага ўліку, а ў выпадку знаходжання аб'ектаў у эксплуатацыі (на абслугоўванні) у філіялах, прадстаўніцтвах і іншых падраздзяленнях, якія не маюць асобнага балансу, – месца знаходжання такіх філіялаў, прадстаўніцтваў і іншых адасобленых падраздзяленняў.

Месцам знаходжання аб'ектаў, указаных у частцы другой гэтага пункта, плацельшчыкамі па якіх з'яўляюцца замежныя арганізацыі, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, і беларускія арганізацыі, што вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, прызнаецца месца пастаноўкі такіх арганізацый на ўлік у падатковых органах Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 231. Падатковы перыяд падатку на нерухомасць**

Падатковым перыядам па падатку на нерухомасць прызнаецца каляндарны год.

**Артыкул 232. Парадак вылічэння падатку на нерухомасць**

1. Гадавая сума падатку на нерухомасць вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

2. Вылічэнне падатку на нерухомасць плацельшчыкамі-арганізацыямі па стаўках, устаноўленых у абзацах чацвёртым – сёмым падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 230 гэтага Кодэкса, праводзіцца з 1-га чысла першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата сканчэння гадавога, двухгадовага, трохгадовага ці чатырохгадовага перыяду адпаведна з даты прыёмкі ў эксплуатацыю ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, узведзеных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак.

3. Вылічэнне падатку на нерухомасць па стаўках, павялічаных (зменшаных) у адпаведнасці з рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў, прынятымі ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 230 гэтага Кодэкса, праводзіцца з 1 студзеня года, які ідзе следам за годам, у якім адпаведнае рашэнне прынята.

4. Пры набыцці плацельшчыкамі-арганізацыямі на працягу падатковага перыяду капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак або ўзнікненні капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, а таксама пры прызнанні плацельшчыкамі падатку на нерухомасць асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, на падставах, указаных у артыкуле 226 гэтага Кодэкса, вылічэнне і аплата падатку на нерухомасць па набытых або ўзніклых капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, а таксама пры прызнанні плацельшчыкамі падатку на нерухомасць асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, праводзяцца з 1-га чысла першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мелі месца такія набыццё, узнікненне ці прызнанне арганізацый плацельшчыкамі падатку на нерухомасць.

Пры гэтым гадавая сума падатку на нерухомасць павялічваецца на сумы падатку на нерухомасць, вылічаныя зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), набытых або ўзніклых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, а таксама зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), капітальных пабудоў

(будынкаў, збудаванняў), іх частак пры прызнанні плацельшчыкамі падатку на нерухомасць асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, на 1-е чысло першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мелі месца такія набыццё, узнікненне ці прызнанне арганізацый плацельшчыкамі падатку на нерухомасць, і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, што засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

5. Па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, якія выбываюць у плацельшчыкаў-арганізацый на працягу падатковага перыяду, а таксама ў сувязі са стратай асобнымі арганізацыямі, у тым ліку бюджэтнымі, на працягу падатковага перыяду статусу плацельшчыка падатку на нерухомасць, набытага на падставах, вызначаных артыкулам 226 гэтага Кодэкса, вылічэнне падатку на нерухомасць па ўказаных капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках і ва ўказаных арганізацый спыняецца з 1-га чысла першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мелі месца такія выбыццё і страта арганізацыямі статусу плацельшчыка падатку на нерухомасць.

6. Па аднакватэрных жылых дамах ці кватэрах, перададзеных на працягу падатковага перыяду плацельшчыкам-арганізацыяй (лізінгадавальнікам) па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп прадмета лізінгу, фізічнай асобе (лізінгаатрымальніку), што не выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, вылічэнне падатку на нерухомасць спыняецца з 1-га чысла першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мела месца такая перадача.

У выпадках, калі на працягу падатковага перыяду дагавор, указаны ў частцы першай гэтага пункта, касуецца без завяршэння выкупам або калі ў такі дагавор уносяцца змяненні, якія выключаюць умову выкупу прадмета лізінгу, арганізацыя (лізінгадавальнік) прызнаецца плацельшчыкам падатку на нерухомасць у адносінах да аднакватэрных жылых дамоў і кватэр з 1-га чысла першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім скасаваны дагавор фінансавай арэнды (лізінгу) або ў якім унесены змяненні ў дагавор фінансавай арэнды (лізінгу), што выключаюць умову выкупу прадмета лізінгу. Пры гэтым гадавая сума падатку на нерухомасць павялічваецца на сумы падатку на нерухомасць, вылічаныя зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), на 1 студзеня падатковага перыяду (пры ўзнікненні на працягу падатковага перыяду аб'ектаў падаткаабкладання на іншую дату – на 1-е чысло першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім мела месца ўзнікненне аб'ектаў падаткаабкладання) і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

7. Пры ўзнікненні ў плацельшчыкаў-арганізацый на працягу падатковага перыяду права на прымяненне падатковай ільготы па падатку на нерухомасць ільгота даецца з квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім узнікла права на льготу, а пры страце на працягу года права на льготу — вылічэнне і аплата падатку на нерухомасць праводзяцца пачынаючы з квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім такое права страчана. Пры гэтым кварталам, у якім страчана права на льготу, з'яўляецца квартал, на які прыпадае апошні дзень дзеяння льготы.

Пры ўзнікненні ў плацельшчыкаў-арганізацый на працягу падатковага перыяду права на вызваленне ад падатку на нерухомасць гадавая сума падатку на нерухомасць змяншаецца на сумы падатку на нерухомасць, вылічаныя зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на

1 студзеня падатковага перыяду (пры ўзнікненні на працягу падатковага перыяду аб'ектаў падаткаабкладання на іншую дату – на 1-е чысло першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мела месца ўзнікненне аб'ектаў падаткаабкладання) і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

Пры страце права на вызваленне ад падатку на нерухомасць гадавая сума падатку на нерухомасць павялічваецца на сумы падатку на нерухомасць, вылічаныя зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на 1 студзеня бягучага падатковага перыяду (пры ўзнікненні на працягу падатковага перыяду аб'ектаў падаткаабкладання на іншую дату – на 1-е чысло першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім мела месца ўзнікненне аб'ектаў падаткаабкладання) і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

8. Новы зарэгістраваны плацельшчык-арганізацыя ў бягучым падатковым перыядзе вылічвае падатак на нерухомасць з 1-га чысла першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі, зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку (у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на 1-е чысло першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі, і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

9. Пры пераходзе арганізацыяй, якая выкарыстоўвае асаблівы рэжым падаткаабкладання, што не прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, на працягу падатковага перыяду на агульны парадак падаткаабкладання або на асаблівы рэжым падаткаабкладання, які прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, з 1-га чысла першага месяца квартала вылічэнне падатку на нерухомасць праводзіцца з 1-га чысла першага месяца квартала, з якога арганізацыя перайшла на прымяненне агульнага парадку падаткаабкладання або асаблівы рэжым падаткаабкладання, што прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку, капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на гэту дату і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

Пры пераходзе арганізацыяй, якая выкарыстоўвае асаблівы рэжым падаткаабкладання, што не прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, на працягу падатковага перыяду на агульны парадак падаткаабкладання або на асаблівы рэжым падаткаабкладання, які прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, з іншай даты вылічэнне падатку на нерухомасць праводзіцца з 1-га чысла першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, у якім арганізацыя пачала прымяняць агульны парадак падаткаабкладання або асаблівы рэжым падаткаабкладання, які прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, зыходзячы з астаткавага кошту ці кошту, адлюстраванага ў бухгалтарскім уліку, капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак на гэту дату і стаўкі падатку на нерухомасць, якая разлічваецца на падставе гадавой стаўкі прапарцыянальна колькасці поўных кварталаў, якія засталіся да заканчэння бягучага падатковага перыяду.

10. Вылічэнне плацельшчыкамі-арганізацыямі падатку на нерухомасць па маёмасці, якая аказалася ў лішку па выніках інвентарызацыі і прызнаецца для мэт вылічэння падатку на нерухомасць капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі, праводзіцца пачынаючы з 1-га чысла першага месяца квартала, што ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата набыцця, атрымання ці стварэння такой маёмасці, пацверджаная дакументальна, але не раней за 1-е чысло першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата пачатку падліку трохгадовага перыяду, што папярэднічае даце выяўлення па выніках інвентарызацыі лішкаў адпаведных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак.

Пры адсутнасці магчымасці пацвердзіць дакументальна дату набыцця, атрымання ці стварэння капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія аказаліся ў лішку па выніках інвентарызацыі, вылічэнне падатку на нерухомасць арганізацыямі па такіх аб'ектах праводзіцца з 1-га чысла першага месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, на які прыпадае дата пачатку падліку трохгадовага перыяду, што папярэднічае даце выяўлення па выніках інвентарызацыі лішкаў адпаведных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак.

11. Падатак на нерухомасць плацельшчыкам – фізічным асобам падатковы орган вылічвае асобна па кожным аб'екце падаткаабкладання, які належыць плацельшчыку – фізічнай асобе.

12. Падставамі для вылічэння падатку на нерухомасць плацельшчыкам – фізічным асобам з'яўляюцца:

звесткі, пададзеныя ў падатковыя органы ў адпаведнасці з артыкулам 85 гэтага Кодэкса;

звесткі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб прыёмцы ў эксплуатацыю фінансаваных фізічнымі асобамі закончаных узвядзеннем аднакватэрных жылых дамоў, кватэр у блакіраваных жылых дамах, нежылых пабудоў;

звесткі дачных і гаражных кааператываў аб прыёмцы ў эксплуатацыю дач і гаражоў, закончаных узвядзеннем;

звесткі садаводчых суполак аб закончаных узвядзеннем садовых доміках, у адносінах да якіх імі выдадзена даведка для дзяржаўнай рэгістрацыі;

копіі актаў прыёму-перадачы з дадаваннем дагавораў фінансавай арэнды (лізінгу), якія прадугледжваюць выкуп аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, заключаных арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі з фізічнымі асобамі;

копіі актаў прыёму-перадачы з дадаваннем дагавораў фінансавай арэнды (лізінгу), згодна з якімі фізічным асобам, што выступаюць пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, дадзены капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі ў фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як фінансавы лізінг, калі па ўмовах дагавораў фінансавай арэнды (лізінгу) гэтыя аб'екты не знаходзяцца на балансе арганізацый-лізінгадавальнікаў;

копіі актаў прыёму-перадачы з дадаваннем дагавораў, згодна з якімі капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі перададзены фізічнай асобай арганізацыям у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне;

іншыя дакументы ці звесткі, пададзеныя плацельшчыкам, дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

13. Пры ўзнікненні ў плацельшчыка – фізічнай асобы на працягу падатковага перыяду аб'екта падаткаабкладання падатак на нерухомасць такой фізічнай асобе вылічваецца падатковым органам з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім:

узнікла права ўласнасці на аб'ект падаткаабкладання;

адкрыта спадчына на аб'ект падаткаабкладання;

набыта (атрымана, узведзена) капітальная пабудова (будынак, збудаванне), яе частка, не завершаныя будаўніцтвам;

атрымана ад арганізацыі (лізінгадавальніка) па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу) фізічнай асобай (лізінгаатрымальнікам), які выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, капітальная пабудова (будынак, збудаванне), яе частка;

атрыманы ў фінансавую арэнду (лізінг) ад арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка (лізінгадавальнікаў) па дагаворы фінансавай арэнды (лізінгу) фізічнай асобай (лізінгадавальнікам), які не выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, аднакватэрны жылы дом ці кватэра;

спынена права гаспадарчага вядзення ці аператыўнага кіравання, спынены ці скасаваны дагавор арэнды, іншага аплатнага ці бязвыплатнага карыстання ў адносінах да капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), яе часткі, раней перададзеных фізічнай асобай арганізацыі.

Для мэт гэтай главы датай перадачы аб'екта падаткаабкладання ў фінансавую арэнду (лізінг) прызнаецца дата складання акта прыёмкі-перадачы прадмета лізінгу.

14. Вылічэнне падатку на нерухомасць плацельшчыку – фізічнай асобе спыняецца з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім:

спынена права ўласнасці на аб'ект падаткаабкладання;

зарэгістравана права ўласнасці на аб'ект падаткаабкладання, прыняты ў спадчыну, закончаны ўзвядзеннем ці прыняты ў эксплуатацыю;

скасаваны дагавор фінансавай арэнды (лізінгу), заключаны паміж арганізацыяй і фізічнай асобай, якая выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка;

скасаваны дагавор фінансавай арэнды (лізінгу), які не завяршыўся выкупам аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, ці ў такі дагавор унесены змяненні, якія выключаюць умову выкупу фізічнай асобай, якая не выступае пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, такога прадмета лізінгу ў арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка;

аб'ект падаткаабкладання перададзены ўласнікам у гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне, арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне арганізацыі;

надышла смерць фізічнай асобы, якой належаў аб'ект падаткаабкладання, ці такая асоба была аб'яўлена памерлай.

15. Пры ўзнікненні ў плацельшчыка – фізічнай асобы права на прымяненне падатковай ільготы па падатку на нерухомасць ільгота даецца з 1-га чысла месяца, у якім узнікла права на льготу, а пры страце права на льготу аплата падатку на нерухомасць праводзіцца пачынаючы з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім такое права страчана.

Льготу па падатку на нерухомасць дае падатковы орган на падставе пададзеных плацельшчыкам дакументаў, якія пацвярджаюць права на такое вызваленне, а таксама на падставе звестак, якія ёсць у падатковым органе, пададзеных дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі ці іншымі асобамі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

У выпадку, указаным у падпункце 4.4 пункта 4 артыкула 228 гэтага Кодэкса, плацельшчыкі – фізічныя асобы падаюць у падатковы орган паведамленне ўстаноўленай формы.

У паведамленні ўказваюцца ўсе прыналежныя плацельшчыку – фізічнай асобе жылыя памяшканні ў шматкватэрных ці блакіраваных жылых дамах, долі ў праве ўласнасці ці долі ў спадчыне на ўказаную маёмасць, а таксама аб'ект падаткаабкладання, выбраны для вызвалення ад падатку на нерухомасць, і яго месцазнаходжанне.

Пры непадачы такога паведамлення падатковая льгота даецца ў адносінах да аднаго аб'екта падаткаабкладання, набытага (атрыманага) плацельшчыкам раней за іншыя.

16. У выпадку, калі аб'ект падаткаабкладання знаходзіцца:

у агульнай долевай уласнасці – падатак на нерухомасць фізічным асобам вылічваецца кожнаму з удзельнікаў долевай уласнасці прапарцыянальна яго долі ў праве ўласнасці на такі аб'ект падаткаабкладання;

у агульнай сумеснай уласнасці – падатак на нерухомасць вылічваецца фізічнай асобе, на якую афармлена пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ці іншыя дакументы, якія пацвярджаюць дзяржаўную рэгістрацыю, узнікненне права ўласнасці на такую маёмасць.

Калі права ўласнасці на аб'ект падаткаабкладання ва ўстаноўленым парадку не зарэгістравана, падатак на нерухомасць вылічваецца фізічнай асобе, у чыім валоданні, карыстанні ці ўласнасці знаходзіцца зямельны ўчастак, на якім размешчаны такі аб'ект падаткаабкладання.

17. У выпадку, калі за папярэднія падатковыя перыяды плацельшчыку – фізічнай асобе не быў вылічаны падатак на нерухомасць, вылічэнне такога падатку дапускаецца не больш чым за тры каляндарныя гады, якія папярэднічаюць году, у якім праводзіцца такое вылічэнне.

18. Арганізацыі ці індывідуальныя прадпрымальнікі падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік копіі наступных дакументаў:

акта прыёмкі-перадачы з дадаваннем дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), згодна з якім арганізацыяй даюцца фізічным асобам, якія выступаюць пры заключэнні дагавора ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі ў фінансавую арэнду (лізінг), якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам як фінансавы лізінг, калі па ўмовах дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) гэтыя аб'екты не знаходзяцца на балансе арганізацый-лізінгадавальнікаў, – на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня складання такога акта, а таксама скасавання дагавора фінансавай арэнды (лізінгу);

акта прыёмкі-перадачы з дадаваннем дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), яе часткі, іншага аплатнага ці бязвыплатнага карыстання, заключанага арганізацыяй з фізічнай асобай, – на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня складання такога акта, а таксама скасавання дагавора арэнды;

акта прыёмкі-перадачы з дадаваннем дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп фізічнай асобай аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, у выпадку заключэння такога дагавора, а таксама дагавора фінансавай арэнды (лізінгу), які прадугледжвае выкуп фізічнай асобай аднакватэрнага жылога дома ці кватэры, калі такі дагавор не завяршыўся выкупам прадмета лізінгу ці ва ўказаны дагавор былі ўнесены змяненні, якія выключаюць умову выкупу прадмета лізінгу, – на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня складання такога акта, скасавання дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) ці ўнясення ў яго ўказаных змяненняў.

19. Штогод не пазней за 1 сакавіка ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падаюцца па ўстаноўленай форме звесткі аб:

прынятых у эксплуатацыю гаражах, закончаных узвядзеннем, – гаражнымі кааператывамі;

прынятых у эксплуатацыю дачах, закончаных узвядзеннем, – дачнымі кааператывамі;

прынятых у эксплуатацыю фінансаваных фізічнымі асобамі закончаных узвядзеннем аднакватэрных жылых дамах, кватэрах у блакіраваных жылых дамах – мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

закончаных узвядзеннем садовых доміках – садаводчымі суполкамі.

Звесткі, указаныя ў частцы першай гэтага падпункта, падаюцца ў адносінах да аб'ектаў нерухомасці, прынятых у эксплуатацыю ці закончаных узвядзеннем пачынаючы з 1 студзеня 2019 года.

**Артыкул 233. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты падатку на нерухомасць**

1. Плацельшчыкі-арганізацыі не пазней за 20 сакавіка бягучага падатковага перыяду падаюць у падатковыя органы па месцы пастаноўкі на ўлік падатковыя дэкларацыі (разлікі) па падатку на нерухомасць.

2. Плацельшчыкамі-арганізацыямі, на якія распаўсюджваюцца палажэнні пунктаў 4–8 і часткі другой пункта 9 артыкула 232 гэтага Кодэкса, адпаведныя змяненні і дапаўненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на нерухомасць не пазней за 20-е чысло трэцяга месяца квартала, які ідзе следам за кварталам, у якім мелі месца акалічнасці, указаныя ў пунктах 4–8 і частцы другой пункта 9 артыкула 232 гэтага Кодэкса адпаведна.

Плацельшчыкамі-арганізацыямі, на якія распаўсюджваюцца палажэнні часткі першай пункта 9 артыкула 232 гэтага Кодэкса, падатковыя дэкларацыі (разлікі) па падатку на нерухомасць падаюцца не пазней за 20-е чысло трэцяга месяца квартала, з якога меў месца пераход з асаблівага рэжыму падаткаабкладання, што не прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць, на агульны парадак падаткаабкладання або на асаблівы рэжым падаткаабкладання, што прадугледжвае вылічэнне і аплату падатку на нерухомасць.

3. Падатак на нерухомасць аплачваюць плацельшчыкі-арганізацыі па іх выбары адзін раз на год у памеры вылічанай гадавой сумы падатку не пазней за 22 сакавіка падатковага перыяду ці штоквартальна не пазней за 22-е чысло трэцяга месяца кожнага квартала ў памеры адной чацвёртай вылічанай гадавой сумы падатку.

4. Плацельшчык – фізічная асоба выплачвае падатак на нерухомасць на падставе паведамлення падатковага органа ўстаноўленай формы, якое штогод уручаецца такому плацельшчыку не пазней за 1 верасня.

У выпадку набыцця (атрымання, узвядзення) плацельшчыкам – фізічнай асобай аб'екта падаткаабкладання пасля сканчэння ўказанага тэрміну ўручэння паведамлення паведамленне ўручаецца ў трыццацідзённы тэрмін з дня атрымання падатковым органам адпаведных звестак аб аб'екце падаткаабкладання.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце пісьмом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

5. Аплата падатку на нерухомасць плацельшчыкамі – фізічнымі асобамі праводзіцца:

штогод не пазней за 15 лістапада – за бягучы падатковы перыяд. У выпадку ўручэння падатковымі органамі паведамлення пасля сканчэння ўказанага тэрміну аплаты падатак падлягае аплаце не пазней за трыццаць каляндарных дзён з дня ўручэння паведамлення плацельшчыку;

на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня ўручэння паведамлення плацельшчыку – фізічнай асобе – за папярэднія падатковыя перыяды.

6. Аплата плацельшчыкамі – фізічнымі асобамі падатку на нерухомасць з кошту гаражоў, машына-месцаў, размешчаных у гаражных кааператывах і кааператывах, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садовых домікаў, дач і іншых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных у садаводчых суполках, дачных кааператывах, можа праводзіцца шляхам унясення сум падатку на нерухомасць гаражным кааператывам і кааператывам, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садаводчым суполкам, дачным кааператывам, якія прымаюць сумы падатку на нерухомасць і пералічваюць іх у бюджэт.

Гаражныя кааператывы і кааператывы, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садаводчыя суполкі, дачныя кааператывы падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік не пазней за 16 лістапада бягучага года звесткі аб

прынятых ад плацельшчыкаў – фізічных асоб сумах падатку на нерухомасць па форме, устаноўленай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, з дадаваннем плацежных інструкцый (іх копій) аб пералічэнні прынятых грашовых сродкаў у бюджэт.

**Артыкул 234. Уключэнне сум падатку на нерухомасць у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў склад пазарэалізацыйных расходаў**

Сумы падатку на нерухомасць уключаюцца плацельшчыкамі-арганізацыямі, за выключэннем бюджэтных арганізацый, у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, акрамя сум падатку на нерухомасць, якія кампенсуюцца пазыкаатрымальнікам пазыкадавальніку, абавязак пакрыцця якіх прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Бюджэтныя арганізацыі ў выпадку прызнання іх плацельшчыкамі ў адпаведнасці з часткай другой пункта 5 артыкула 226 гэтага Кодэкса ўключаюць сумы падатку на нерухомасць у склад пазарэалізацыйных расходаў.

**Артыкул 235. Спецыяльныя палажэнні. Ліквідацыя двайнога падаткаабкладання**

1. Фактычна заплачаная ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання сума падатку на нерухомасць у адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных у замежнай дзяржаве, пералічаная ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату ўнясення падатку ў бюджэт замежнай дзяржавы, залічваецца беларускай арганізацыяй пры аплаце ў Рэспубліцы Беларусь падатку на нерухомасць пры падачы ў падатковы орган па месцы яе пастаноўкі на ўлік даведкі (іншага дакумента) падатковага органа (іншай кампетэнтнай службы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў) замежнай дзяржавы, якая пацвярджае аплату падатку на нерухомасць у гэтай дзяржаве ў тым справаздачным перыядзе, у якім пададзена такая даведка.

2. Даведка, якая пацвярджае аплату падатку на нерухомасць у замежнай дзяржаве, павінна змяшчаць рэквізіты з найменнем плацельшчыка, назвай падатку, датай аплаты падатку і перыядам, за які аплачваўся падатак, назвай, памерам аб'екта падаткаабкладання (падатковай базы), стаўкай падатку і сумай залічанага ў бюджэт замежнай дзяржавы падатку. Для ажыццяўлення заліку можа быць таксама пададзены дакумент па форме, устаноўленай падатковым органам (іншай кампетэнтнай службай, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў) замежнай дзяржавы, калі ён пацвярджае суму заплачанага падатку на нерухомасць у гэтай дзяржаве.

3. Залік сумы падатку на нерухомасць, заплачанай у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы і (ці) міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання ў адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных у замежнай дзяржаве, праводзіцца беларускай арганізацыяй у межах заплачанай (якая аплачваецца) ёю ў Рэспубліцы Беларусь сумы падатку на нерухомасць у адносінах да гэтых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак за перыяд, за які была аплачана ў замежнай дзяржаве прад'яўленая да заліку сума падатку на нерухомасць.

4. Пры наяўнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання залік праводзіцца толькі ў адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія падлягаюць падаткаабкладанню ў замежнай дзяржаве ў адпаведнасці з палажэннямі такога дагавора.

## ГЛАВА 20
## ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК

**Артыкул 236. Плацельшчыкі зямельнага падатку**

Плацельшчыкамі зямельнага падатку прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, у тым ліку зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, з улікам асаблівасцей, устаноўленых артыкулам 237 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 237. Асаблівасці прызнання плацельшчыкамі асобных арганізацый і фізічных асоб**

1. Плацельшчыкамі зямельнага падатку не прызнаюцца бюджэтныя арганізацыі, за выключэннем выпадку, устаноўленага часткай другой гэтага пункта.

Пры здачы бюджэтнымі арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на зямельных участках (частках зямельных участкаў), якія знаходзяцца ў пастаянным ці ў часовым карыстанні бюджэтных арганізацый, такія зямельныя ўчасткі (часткі зямельных участкаў) падлягаюць падаткаабкладанню зямельным падаткам у парадку, устаноўленым гэтай главой, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых часткамі трэцяй і чацвёртай гэтага пункта.

Бюджэтныя арганізацыі не прызнаюцца плацельшчыкамі зямельнага падатку ў адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ўказанымі бюджэтнымі арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне:

бюджэтным арганізацыям;

арганізацыям, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферах адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту і атрымліваюць субсідыі з бюджэту;

арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі харчавання выхаванцаў, навучэнцаў, курсантаў і студэнтаў ва ўстановах адукацыі;

арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама для падрыхтоўкі спартсменаў-навучэнцаў у спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах;

дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам;

спецыялізаваным навучальна-спартыўным установам прафсаюзаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання;

навуковым арганізацыям;

навукова-тэхналагічным паркам;

цэнтрам трансферу тэхналогій;

арганізацыям культуры.

Бюджэтныя арганізацыі не прызнаюцца плацельшчыкамі зямельнага падатку ў адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ўказанымі бюджэтнымі арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, у выпадку, калі дата перадачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак і дата іх вяртання бюджэтнай арганізацыі (арэндадаўцу, пазыкадавальніку) прыпадаюць на адзін і той жа каляндарны месяц.

2. Плацельшчыкам зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, дадзеныя фізічным асобам для вядзення сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, прызнаецца сялянская (фермерская) гаспадарка.

3. Адсутнасць у арганізацый і фізічных асоб дакументаў, якія сведчаць права на зямельныя ўчасткі, або адсутнасць дзяржаўнай рэгістрацыі правоў прыватнай уласнасці, пастаяннага ці часовага карыстання, пажыццёвага валодання зямельнымі ўчасткамі, якое атрымліваецца ў спадчыну, не з'яўляюцца падставай для непрызнання гэтых арганізацый і фізічных асоб плацельшчыкамі за зямельныя ўчасткі, у адносінах да якіх у адпаведнасці з

заканадаўствам яны маюць права ажыццяўляць карыстанне ці якімі яны фактычна карыстаюцца.

**Артыкул 238. Аб'екты падаткаабкладання зямельным падаткам**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання зямельным падаткам прызнаюцца размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь зямельныя ўчасткі і долі ў праве на іх (далей – зямельныя ўчасткі):

якія належаць арганізацыям на праве прыватнай уласнасці, пастаяннага ці часовага карыстання;

якія належаць фізічным асобам на праве прыватнай уласнасці, пажыццёвага валодання, якое атрымліваецца ў спадчыну, ці часовага карыстання, а таксама прынятыя імі ў спадчыну;

іншыя зямельныя ўчасткі, у адносінах да якіх у адпаведнасці з заканадаўствам плацельшчыкі маюць права ажыццяўляць карыстанне;

дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя.

2. Аб'ектамі падаткаабкладання зямельным падаткам не прызнаюцца:

землі агульнага карыстання населеных пунктаў;

зямельныя ўчасткі, занятыя могілкамі;

землі ляснога фонду (за выключэннем сельскагаспадарчых зямель і зямель, занятых капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі і іншымі аб'ектамі, не звязанымі з вядзеннем лясной гаспадаркі);

землі воднага фонду (за выключэннем сельскагаспадарчых зямель, зямель, на якія ажыццяўляецца прадпрымальніцкая дзейнасць, і зямель, занятых капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі і іншымі аб'ектамі);

землі запасу;

зямельныя ўчасткі агульнага карыстання садаводчых суполак, дачных кааператываў;

зямельныя ўчасткі рэлігійных арганізацый (аб'яднанняў), зарэгістраваных у адпаведнасці з заканадаўствам;

землі запаведнікаў, нацыянальных і дэндралагічных паркаў, батанічных садоў (акрамя сельскагаспадарчых зямель, якія ўваходзяць у іх склад);

зямельная паласа, якая праходзіць непасрэдна ўздоўж дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь па сушы, а пры неабходнасці – па беразе беларускай часткі вод пагранічнай ракі, возера ці іншага воднага аб'екта і прызначана для адзначэння і ўтрымання дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, будаўніцтва інжынерна-тэхнічных збудаванняў, ліній сувязі і камунікацый, размяшчэння тэхнікі і ўзбраення;

землі сельскагаспадарчага прызначэння ў частцы зямель пад драўнінна-хмызняковай расліннасцю (насаджэннямі), якая не ўваходзіць у лясны фонд, і ў частцы зямель пад балотамі.

3. Для мэт гэтай главы выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны і іх азначэнні:

капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) у плацельшчыкаў-арганізацый – аб'екты, якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў як будынкі, збудаванні ці перадатачныя прылады;

капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) у плацельшчыкаў – фізічных асоб – жылы дом, жылое памяшканне ў шматкватэрным ці блакіраваным жылым доме, садовы домік, дача, гараж, іншыя будынкі і збудаванні, машына-месца;

мнагадзетная сям'я – сям'я, у якой на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш непаўналетніх дзяцей;

аб'екты прыдарожнага сэрвісу – капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, размешчаныя на прыдарожнай паласе (у кантраляванай зоне) рэспубліканскіх

аўтамабільных дарог, а таксама размешчаныя на зямельным участку, частка якога знаходзіцца на прыдарожнай паласе (у кантраляванай зоне), а іншая частка непасрэдна прымыкае да прыдарожнай паласы (кантраляванай зоны) рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, і прызначаныя для абслугоўвання ўдзельнікаў дарожнага руху на шляху руху (матэлі, хосталы, гасцініцы, кемпінгі, станцыі тэхнічнага абслугоўвання, гандлёвыя аб'екты і аб'екты грамадскага харчавання, адмывальні, стаянкі, якія ахоўваюцца, стаянкі для аўтафургонаў і аўтапрычэпаў для жылля), за выключэннем аб'ектаў, размешчаных на зямельных участках, дадзеных для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аўтазаправачных станцый;

паласа адводу аўтамабільнай дарогі агульнага карыстання – зямельныя ўчасткі (незалежна ад катэгорыі зямель), якія прызначаны для размяшчэння канструктыўных элементаў аўтамабільнай дарогі агульнага карыстання, дарожных збудаванняў, іншых аб'ектаў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і на якіх размяшчаюцца ці могуць размяшчацца аб'екты дарожнага сэрвісу;

паласа адводу чыгуначных шляхоў агульнага карыстання – зямельныя ўчасткі, дадзеныя ва ўстаноўленым парадку арганізацыям чыгуначнага транспарту агульнага карыстання для размяшчэння чыгуначных шляхоў агульнага карыстання, абаронных насаджэнняў уздоўж чыгуначных шляхоў агульнага карыстання і лінейна-пуцявых будынкаў і збудаванняў, прызначаных для эксплуатацыі чыгуначных шляхоў агульнага карыстання.

**Артыкул 239. Льготы па зямельным падатку**

1. Вызваляюцца ад зямельнага падатку ў плацельшчыкаў-арганізацый:

1.1. зямельныя ўчасткі, занятыя матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, уключанымі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, па пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выканання іх уласнікамі абавязацельстваў, абумоўленых заканадаўствам аб культуры, за выключэннем зямельных участкаў, занятых капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), якія выкарыстоўваюцца арганізацыямі для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, у тым ліку для размяшчэння органаў кіравання, бухгалтарскіх і іншых службаў гэтых арганізацый, акрамя зямельных участкаў бюджэтных арганізацый і некамерцыйных арганізацый культуры;

1.2. доследныя палі, якія выкарыстоўваюцца для навуковай дзейнасці;

1.3. зямельныя ўчасткі, занятыя аўтамабільнымі дарогамі агульнага карыстання, чыгуначнымі і трамвайнымі шляхамі агульнага карыстання (уключаючы земляное палатно, верхнюю будову шляху, штучныя збудаванні), паласа адводу аўтамабільных дарог агульнага карыстання, чыгуначных шляхоў агульнага карыстання, а таксама зямельныя ўчасткі, якія даюцца арганізацыям для будаўніцтва (рэканструкцыі) аўтамабільных дарог агульнага карыстання, чыгуначных і трамвайных шляхоў агульнага карыстання на перыяд з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

у якім плацельшчык мае права карыстацца зямельным участкам у адпаведнасці з заканадаўствам (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага падпункта, не патрабуецца), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

на які прыпадае пачатак выканання праектных прац (у выпадку, калі будаўніцтва (рэканструкцыя) аб'ектаў ажыццяўляецца на зямельным участку, дадзеным раней для іншых мэт), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

1.4. зямельныя ўчасткі, дадзеныя дзяржаўным эксплуатацыйна-будаўнічым арганізацыям і занятыя прыбярэжнымі палосамі, якія з'яўляюцца прыроднымі тэрыторыямі, што падлягаюць спецыяльнай ахове;

1.5. зямельныя ўчасткі, перададзеныя арганізацыям па будаўніцтве і эксплуатацыі водагаспадарчых сістэм на перыяд правядзення будаўнічых і рамонтна-эксплуатацыйных прац;

1.6. зямельныя ўчасткі арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферах адукацыі і аховы здароўя і атрымліваюць субсідыі з бюджэту;

1.7. зямельныя ўчасткі (часткі зямельных участкаў) арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі з бюджэту, занятыя капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі, уключанымі ў рэестр фізкультурна-спартыўных збудаванняў;

1.8. зямельныя ўчасткі арганізацый Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якія дзейнічаюць у сферах адукацыі і аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, дадзеныя ім у карыстанне для ажыццяўлення статутнай дзейнасці;

1.9. зямельныя ўчасткі арганізацый культуры, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый;

1.10. зямельныя ўчасткі дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ;

1.11. зямельныя ўчасткі аэраклубаў, якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў бюджэту, а таксама зямельныя ўчасткі, занятыя аэрадромамі, пасадачнымі пляцоўкамі, аэрапортамі і аб'ектамі адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху;

1.12. землі сельскагаспадарчага прызначэння, землі іншых катэгорый зямель, дадзеныя для вядзення сельскай гаспадаркі, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню, на якіх уведзены абмежаванні па вядзенні сельскай гаспадаркі, а таксама землі, на якія размешчаны пахаванні радыеактыўных адходаў, забруджаных радыенуклідамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама іншых адходаў, прадуктаў, матэрыялаў і іншых рэчываў, забруджаных радыенуклідамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

1.13. зямельныя ўчасткі арганізацый, занятыя фізкультурна-спартыўнымі збудаваннямі, якія з'яўляюцца асноўнымі базамі падрыхтоўкі нацыянальных і зборных камандаў Рэспублікі Беларусь па відах спорту;

1.14. зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў карыстанне рэспубліканскім унітарным вытворчым прадпрыемствам папраўчых устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы і лячэбна-працоўных прафілакторыяў;

1.15. зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў карыстанне ўстановам адукацыі спажывецкай кааперацыі;

1.16. зямельныя ўчасткі, якія даюцца для будаўніцтва жылых дамоў арганізацыям, за выключэннем плошчаў зямельнага ўчастка, якія прыпадаюць на ўбудаваную, прыбудаваную, убудавана-прыбудаваную нежылую частку дома ў адпаведнасці з праектнай дакументацыяй на ўзвядзенне аб'екта, каштарысам (каштарыснай дакументацыяй), – на перыяд з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прынясця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

у якім плацельшчык мае права ажыццяўляць карыстанне зямельным участкам у адпаведнасці з заканадаўствам (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага падпункта, не патрабуецца), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

на які прыпадае пачатак выканання праектных прац (у выпадку, калі будаўніцтва (рэканструкцыя) аб'ектаў ажыццяўляецца на зямельным участку, дадзеным раней для іншых мэт), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

1.17. зямельныя ўчасткі, занятыя аб'ектамі асноўных сродкаў, якія ўдзельнічаюць у вытворчасці або прыёме (атрыманні), пераўтварэнні, акумуліраванні і (ці) перадачы электрычнай энергіі, якая выпрацоўваецца аднаўляльнымі крыніцамі энергіі, зямельныя ўчасткі, занятыя вадасховішчамі і берагаўмацавальнымі збудаваннямі, гідраэлектрастанцыямі, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці энергіі, а таксама зямельныя ўчасткі, якія даюцца для будаўніцтва, рэканструкцыі такіх аб'ектаў асноўных сродкаў, на перыяд з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

у якім плацельшчык мае права ажыццяўляць карыстанне зямельным участкам у адпаведнасці з заканадаўствам (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага падпункта, не патрабуецца), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

на які прыпадае пачатак выканання праектных прац (у выпадку, калі будаўніцтва (рэканструкцыя) аб'ектаў ажыццяўляецца на зямельным участку, дадзеным раней для іншых мэт), па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

1.18. зямельныя ўчасткі грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў, іх унітарных прадпрыемстваў і ўстаноў, занятыя аб'ектамі аховы здароўя, турызму, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага абслугоўвання, адукацыі, культуры і мастацтва, якія належаць ім;

1.19. зямельныя ўчасткі, дадзеныя арганізацыям для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання жылых дамоў, будаўніцтва і (ці) эксплуатацыі гаражоў, аўтамабільных стаянак для захоўвання транспартных сродкаў фізічных асоб, у частцы плошчы зямельнага ўчастка, якая прыпадае на плошчу ўказаных аб'ектаў, што належаць фізічным асобам, указаным у падпунктах 7.2.1–7.2.4, 7.5 пункта 7 гэтага артыкула, а таксама якая прыпадае на плошчу ўказаных аб'ектаў, што належаць асобам, якія маюць права на пенсію па ўзросце, інвалідам I і II групы, непаўналетнім дзецям і асобам, прызнаным недзеяздольнымі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных часткай другога гэтага падпункта.

Зямельныя ўчасткі, дадзеныя арганізацыям для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання жылых дамоў, вызваляюцца ад зямельнага падатку ў частцы плошчы зямельнага ўчастка, якая даводзіцца на плошчу жылых памяшканняў, што належаць асобам, якія маюць права на пенсію па ўзросце, інвалідам I і II групы, непаўналетнім дзецям і асобам, прызнаным недзеяздольнымі, пры адсутнасці рэгістрацыі ў гэтых жылых памяшканнях, якія належаць такім асобам і размешчаны ў гэтых жылых дамах, працаздольных асоб;

1.20. зямельныя ўчасткі арганізацый спажывецкай каапераціі, размешчаныя ў сельскай мясцовасці і занятыя гандлёвымі аб'ектамі і аб'ектамі грамадскага харчавання;

1.21. зямельныя ўчасткі, занятыя жылымі пасёлкамі «SOS-Дзіцячая вёска» і дзіцячымі дамамі сямейнага тыпу;

1.22. да 1 студзеня 2020 года зямельныя ўчасткі навуковых арганізацый і навукова-тэхналагічных паркаў.

Для мэт гэтай главы тэрмін «навуковая арганізацыя» разумеецца ў значэнні, якое выкарыстоўваецца для мэт главы 19 гэтага Кодэкса;

1.23. зямельныя ўчасткі, якія даюцца для будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу і інжынернай інфраструктуры да іх, – на працягу перыяду выканання праектных прац і будаўнічых прац, якія ажыццяўляюцца ў межах устаноўленай нарматыўнай працягласці будаўніцтва, вызначанай у праектнай дакументацыі, а таксама зямельныя ўчасткі, занятыя

аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу, – на працягу двух гадоў з даты прыёмкі такіх аб'ектаў у эксплуатацыю;

1.24. зямельныя ўчасткі, дадзеныя камунальным унітарным прадпрыемствам па капітальным будаўніцтве, іншым дзяржаўным арганізацыям ці арганізацыям з доляй дзяржавы ў статутным фондзе большай за 50 працэнтаў, для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных і шматкватэрных жылых дамоў па дзяржаўным заказе;

1.25. зямельныя ўчасткі, дадзеныя грамадскаму аб'яднанню «Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь»;

1.26. зямельныя ўчасткі, забраныя з зямель ляснога фонду для пашырэння на вышыню драўнінна-хмызняковай расліннасці прасек паветраных ліній электраперадачы ў кожны бок ад крайніх правадоў, па пераліках, зацверджаных дзяржаўным вытворчым аб'яднаннем электраэнергетыкі «Белэнерга» па ўзгадненні з Міністэрствам лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь;

1.27. зямельныя ўчасткі, якія даюцца арганізацыям, што ажыццяўляюць за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў будаўніцтва аб'ектаў, уключаных у дзяржаўную інвестыцыйную праграму, а таксама ў інвестыцыйныя праграмы абласцей і горада Мінска, – на перыяд з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак, у тым ліку з улікам тэрмінаў яго прадаўжэння з прычыны прыпынення фінансавання ці кансервацыі, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

у якім плацельшчык мае права карыстацца зямельным участкам у адпаведнасці з заканадаўствам (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага падпункта, не патрабуецца), у тым ліку з улікам тэрмінаў яго прадаўжэння з прычыны прыпынення фінансавання ці кансервацыі, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

на які прыпадае пачатак выканання праектных прац (у выпадку, калі будаўніцтва (рэканструкцыя) аб'ектаў ажыццяўляецца на зямельным участку, дадзеным раней для іншых мэт), у тым ліку з улікам тэрмінаў яго прадаўжэння з прычыны прыпынення фінансавання ці кансервацыі, па месяц уключна, на які прыпадае дата прыёмкі аб'ектаў у эксплуатацыю;

1.28. сельскагаспадарчыя землі сельскагаспадарчага прызначэння (ворныя землі, абложныя землі, землі пад пастаяннымі культурамі, лугавыя землі), плацельшчыкамі зямельнага падатку за якія з'яўляюцца арганізацыі, што прымяняюць падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання. Льготу, прадугледжаную гэтым падпунктам, прымяняюць сялянскія (фермерскія) гаспадаркі незалежна ад палажэнняў падпункта 2.1 пункта 2 гэтага артыкула;

1.29. зямельныя ўчасткі плацельшчыкаў падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, якія з'яўляюцца рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі, а таксама арганізацыйнымі структурамі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь», створанымі ў выглядзе юрыдычных асоб;

1.30. зямельныя ўчасткі (часткі зямельных участкаў), на якіх размешчаны ўпершыню ўведзеныя ў дзеянне капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі на працягу аднаго года з даты іх прыёмкі ў эксплуатацыю ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.31. да 1 студзеня 2020 года зямельныя ўчасткі (часткі зямельных участкаў), на якія размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя імі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне навуковым арганізацыям і навукова-тэхналагічным паркам.

2. Вызваленне ад зямельнага падатку, прадугледжанае пунктам 1 гэтага артыкула, не распаўсюджваецца на зямельныя ўчасткі:

2.1. якія належаць фізічным асобам, калі гэтыя ўчасткі дадзены ім для вядзення сялянскай (фермерскай) гаспадаркі;

2.2. дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя.

3. Пры здачы плацельшчыкамі-арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на зямельных участках (частках зямельных участкаў), вызваленых ад зямельнага падатку, права на прымяненне льгот па зямельным падатку ў адносінах да такіх зямельных участкаў (частак зямельных участкаў) губляецца, за выключэннем выпадкаў, пералічаных у частцы другой гэтага пункта.

Права на прымяненне льгот па зямельным падатку ў плацельшчыкаў-арганізацый не губляецца ў адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ўказанымі плацельшчыкамі-арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне:

бюджэтным арганізацыям;

арганізацыям, якія дзейнічаюць у сферах адукацыі, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту і атрымліваюць субсідыі з бюджэту;

спецыялізаваным навучальна-спартыўным установам прафсаюзаў, якія фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання;

дыпламатычным прадстаўніцтвам і консульскім установам;

арганізацыям, фізкультурна-спартыўныя збудаванні якіх з'яўляюцца асноўнымі базамі падрыхтоўкі нацыянальных і зборных камандаў Рэспублікі Беларусь па відах спорту;

установамі адукацыі спажывецкай кааперацыі – арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі харчавання выхаванцаў, навучэнцаў і студэнтаў ва ўстановах адукацыі;

навуковым арганізацыям;

навукова-тэхналагічным паркам;

цэнтрам трансферу тэхналогій;

арганізацыям культуры;

Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і яго структурнымі падраздзяленнямі;

калегіямі адвакатаў;

навукова-тэхналагічнымі паркамі – іх рэзідэнтам.

4. Пры здачы плацельшчыкам-арганізацыяй у арэнду зямельных участкаў, дадзеных на праве прыватнай уласнасці і вызваленых ад зямельнага падатку, права на прымяненне льгот па зямельным падатку ў адносінах да такіх зямельных участкаў губляецца.

5. Падлеглая аплаце плацельшчыкамі-арганізацыямі сума зямельнага падатку змяншаецца на суму зямельнага падатку, вылічаную прапарцыянальна ўдзельнай вазе выручкі, атрыманай ад выканання прац па будаўніцтве (рэканструкцыі) жылля і рэканструкцыі аб'ектаў пад жылыя памяшканні, у агульным аб'ёме выручкі, атрыманай ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за мінулы квартал без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

6. Сума зямельнага падатку, якая падлягае аплаце плацельшчыкамі-арганізацыямі, што ажыццяўляюць збор, сартаванне (раздзяленне па відах), падрыхтоўку да выкарыстання адходаў, змяншаецца на суму зямельнага падатку, вылічаную прапарцыянальна ўдзельнай вазе выручкі, атрыманай ад рэалізацыі адходаў (за выключэннем адходаў, вытворцам якіх з'яўляецца гэта арганізацыя) арганізацыям, якія

ажыццяўляюць абясшкоджванне ці выкарыстанне адходаў, у агульным аб'ёме выручкі, атрыманай ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў за мінулы квартал, без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

Вылічэнне сумы зямельнага падатку ў парадку, устаноўленым у частцы першай гэтага пункта, праводзіцца пры ўмове рэгістрацыі арганізацыі дзяржаўнай установай «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» у рэестры арганізацый, якія ажыццяўляюць збор, сартаванне, падрыхтоўку да выкарыстання адходаў, парадак вядзення якога ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

7. Вызваляюцца ад зямельнага падатку зямельныя ўчасткі, якія належаць плацельшчыкам – фізічным асобам:

7.1. зямельныя ўчасткі, занятыя матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, уключанымі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, па пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выканання іх уласнікамі абавязацельстваў, абумоўленых заканадаўствам аб культуры;

7.2. зямельныя ўчасткі, дадзеныя:

7.2.1. членам мнагадзетных сямей;

7.2.2. ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы;

7.2.3. фізічным асобам, якія праходзяць альтэрнатыўную службу;

7.2.4. удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і іншым асобам, якія маюць права на льготнае падаткаабкладанне ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах»;

7.3. зямельныя ўчасткі, дадзеныя для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, агародніцтва, калектыўнага садаводства, касьбы, выпасу сельскагаспадарчых жывёл, дачнага і гаражнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзелу, для традыцыйных народных промыслаў (рамёстваў), будаўніцтва (устаноўкі) часовых індывідуальных гаражоў:

асобам, якія маюць права на пенсію па ўзросце;

інвалідам I і II групы;

непаўналетнім дзецям;

асобам, прызнаным недзеяздольнымі;

7.4. зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аднакватэрнага, блакіраванага жылога дома ці абслугоўвання зарэгістраваных арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі кватэр у блакіраваным жылым доме:

асобе, якая мае права на пенсію па ўзросце;

інваліду I ці II групы;

непаўналетняму дзіцяці;

асобе, прызнанай недзеяздольнай.

Вызваленне ад аплаты зямельнага падатку даецца пры ўмове адсутнасці рэгістрацыі працаздольных асоб у жылых дамах ці кватэрах у блакіраваных жылых дамах, размешчаных на зямельных участках, указаных у частцы першай гэтага падпункта.

Не ўлічваюцца ў складзе працаздольных асоб пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў і (ці) звестак:

ваеннаслужачыя тэрміновай ваеннай службы;

асобы, якія праходзяць альтэрнатыўную службу;

асобы, якія адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі;

асобы, указаныя ў падпункце 4.7 пункта 4 артыкула 228 гэтага Кодэкса.

Для мэт гэтага падпункта рэгістрацыяй прызнаецца рэгістрацыя фізічных асоб па месцы жыхарства ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

7.5. зямельныя ўчасткі, размешчаныя на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення ці ў зоне з правам на адсяленне;

7.6. зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу і інжынернай інфраструктуры да іх, – на працягу перыяду правядзення праектных прац і будаўнічых прац, якія ажыццяўляюцца ў межах тэрмінаў, вызначаных у праектнай дакументацыі, а таксама зямельныя ўчасткі, занятыя аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу, – на працягу двух гадоў з даты ўводу такіх аб'ектаў у эксплуатацыю.

8. Вызваленне ад зямельнага падатку, прадугледжанае пунктам 7 гэтага артыкула, не распаўсюджваецца на зямельныя ўчасткі:

8.1. дадзеныя фізічным асобам, калі такія ўчасткі заняты капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), якія прызначаны і (ці) выкарыстоўваюцца для прадпрымальніцкай дзейнасці;

8.2. дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя.

**Артыкул 240. Падатковая база зямельнага падатку**

1. Падатковая база зямельнага падатку вызначаецца ў памеры кадастравага кошту зямельнага ўчастка, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым артыкулам.

2. Кадастравы кошт зямельнага ўчастка вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель і залежыць ад яго функцыянальнага выкарыстання (віду ацэначнай зоны).

3. Функцыянальнае выкарыстанне зямельнага ўчастка (від ацэначнай зоны) вызначаецца ў адпаведнасці з дадаткам 5 да гэтага Кодэкса на падставе мэтавага прызначэння гэтага ўчастка, устаноўленага мясцовым выканаўчым камітэтам.

4. Падатковая база зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі прамысловасці, транспарту, сувязі, энергетыкі, абароны і іншага прызначэння, размешчаныя за межамі населеных пунктаў, дадзеныя юрыдычным асобам ці індывідуальным прадпрымальнікам з зямель ляснога фонду для будаўніцтва і абслугоўвання лінейных аб'ектаў (газаправоды, нафтаправоды, паветраныя і кабельныя лініі электраперадачы і сувязі і іншае), а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, вызначаецца ў памеры кадастравага кошту зямель ляснога фонду, устаноўленага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. Падатковая база зямельнага падатку вызначаецца ў беларускіх рублях на 1 студзеня каляндарнага года, за які праводзіцца вылічэнне зямельнага падатку, у адносінах да:

5.1. зямельнага ўчастка, дадзенага для адной мэты, – у памеры яго кадастравага кошту;

5.2. зямельнага ўчастка, дадзенага для некалькіх мэт, для якіх у дадатку 6 да гэтага Кодэкса прадугледжаны розныя стаўкі зямельнага падатку, – у памеры сумы кадастравага кошту, вызначанага зыходзячы з плошчаў, якія адносяцца на адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне зямельнага ўчастка;

5.3. зямельнага ўчастка, дадзенага для некалькіх мэт, якія адпавядаюць розным відам функцыянальнага выкарыстання зямельных участкаў і ў адносінах да якіх у дадатку 6 да гэтага Кодэкса прадугледжаны розныя стаўкі зямельнага падатку, – у памеры сумы кадастравага кошту, вызначанага зыходзячы з плошчаў, якія адносяцца на адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне зямельнага ўчастка;

5.4. долі ў праве на зямельны ўчастак, дадзены для адной мэты, – у памеры кадастравага кошту зямельнага ўчастка, які адпавядае долі ў праве на зямельны ўчастак.

6. Плошча зямельнага ўчастка ўстанаўліваецца ў якасці падатковай базы для:

6.1. зямель сельскагаспадарчага прызначэння;

6.2. зямельных участкаў, якія выкарыстоўваюцца для здабычы торфу на паліва і ўгнаенні і сапрапеляў на ўгнаенні;

6.3. зямельных участкаў, якія ўваходзяць у склад зямель ляснога фонду і дадзеных для выкарыстання ў сельскагаспадарчых мэтах;

6.4. зямельных участкаў, якія ўваходзяць у склад зямель воднага фонду і дадзеных для выкарыстання ў сельскагаспадарчых мэтах, а таксама для рыбаразвядзення і акліматызацыі рыбы;

6.5. зямельных участкаў грамадска-дзелавой зоны для размяшчэння аўтамабільных запраўчных і газанапаўняльных станцый пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 7770 беларускіх рублёў за гектар;

6.6. зямельных участкаў грамадска-дзелавой зоны для размяшчэння аўтамабільных рынкаў, ігральных устаноў пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 5180 беларускіх рублёў за гектар;

6.7. зямельных участкаў грамадска-дзелавой зоны, за выключэннем указаных у падпунктах 6.5 і 6.6 гэтага пункта, пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 28 253 беларускіх рублёў за гектар;

6.8. зямельных участкаў вытворчай зоны пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 14 126 беларускіх рублёў за гектар;

6.9. зямельных участкаў рэкрэацыйнай зоны пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 15 539 беларускіх рублёў за гектар;

6.10. зямельных участкаў жылой шматкватэрнай зоны пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 41 440 беларускіх рублёў за гектар;

6.11. зямельных участкаў жылой сядзібнай зоны пры кадастравым кошце такіх зямельных участкаў меншым за 20 720 беларускіх рублёў за гектар.

7. Падатковая база зямельнага падатку ў адносінах да зямельных участкаў, указаных у падпунктах 6.5–6.11 пункта 6 гэтага артыкула, вызначаецца для:

зямельнага ўчастка, дадзенага для некалькіх мэт, – у памеры плошчы, вызначанай зыходзячы з плошчаў, якія адносяцца на адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне зямельнага ўчастка;

зямельнага ўчастка, дадзенага для некалькіх мэт, якія адпавядаюць розным відам функцыянальнага выкарыстання зямельных участкаў і ў адносінах да якіх прадугледжаны розныя стаўкі зямельнага падатку, – у памеры плошчы, вызначанай зыходзячы з плошчаў, якія адносяцца на адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне зямельнага ўчастка;

долі ў праве на зямельны ўчастак, дадзены для адной мэты, – у памеры плошчы зямельнага ўчастка, якая адпавядае долі ў праве на зямельны ўчастак.

8. Плошча частак зямельнага ўчастка, якія адносяцца на адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне, па якіх прадугледжаны розныя стаўкі зямельнага падатку, разлічваецца шляхам дзялення агульнай плошчы зямельнага ўчастка на агульную плошчу ўсіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на гэтым зямельным участку, і памнажэння на агульную плошчу капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак з адпаведным функцыянальным выкарыстаннем, па якім устаноўлена асобная стаўка падатку.

**Артыкул 241. Стаўкі зямельнага падатку**

1. Стаўкі зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі, па якіх у якасці падатковай базы зямельнага падатку прымяняецца кадастравы кошт, устанаўліваюцца ў памерах згодна з дадаткам 6 да гэтага Кодэкса.

2. Стаўкі зямельнага падатку на сельскагаспадарчыя землі сельскагаспадарчага прызначэння (ворныя землі, абложныя землі, землі пад пастаяннымі культурамі, лугавыя землі) пры наяўнасці кадастравай ацэнкі ўстанаўліваюцца згодна з дадаткам 3 да гэтага Кодэкса.

3. Стаўка зямельнага падатку на землі сельскагаспадарчага прызначэння, занятыя капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі і іншымі аб'ектамі,

устанаўліваецца ў памеры нуль цэлых восемдзесят восем сотых (0,88) беларускага рубля за гектар.

4. Стаўкі зямельнага падатку на землі сельскагаспадарчага прызначэння, па якіх адсутнічае кадастравая ацэнка, устанаўліваюцца ў адпаведнасці з сярэдняй стаўкай зямельнага падатку па раёнах Рэспублікі Беларусь згодна з дадаткам 4 да гэтага Кодэкса.

5. Стаўкі зямельнага падатку ў памерах, якія адпавядаюць стаўкам зямельнага падатку, вызначанага ў парадку, прадугледжаным пунктам 4 гэтага артыкула, устанаўліваюцца на:

5.1. зямельныя ўчасткі, дадзеныя для здабычы торфу на паліва і ўгнаенні і сапрапеляў на ўгнаенні;

5.2. сельскагаспадарчыя землі, якія ўваходзяць у склад зямель ляснога фонду;

5.3. сельскагаспадарчыя землі, якія ўваходзяць у склад зямель воднага фонду;

5.4. зямельныя ўчасткі, якія ўваходзяць у склад зямель воднага фонду і дадзены для рыбаразвядзення і акліматызацыі рыбы.

6. Стаўкі зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі, па якіх у якасці падатковай базы зямельнага падатку прымяняецца плошча зямельных участкаў, за выключэннем зямель і зямельных участкаў, указаных у пунктах 2–5 гэтага артыкула, устанаўліваюцца:

6.1. для грамадска-дзелавой, вытворчай і рэкрэацыйнай зон – у памеры сто пяцьдзесят пяць цэлых трыццаць дзевяць сотых (155,39) беларускага рубля за гектар;

6.2. для жылой шматкватэрнай зоны – у памеры дзесяць цэлых трыццаць шэсць сотых (10,36) беларускага рубля за гектар;

6.3. для жылой сядзібнай зоны – у памеры дваццаць цэлых семдзесят дзве сотыя (20,72) беларускага рубля за гектар.

7. Стаўкі зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі, якія ўваходзяць у склад зямель лясного фонду і заняты капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі і іншымі аб'ектамі, не звязанымі з вядзеннем лясной гаспадаркі, а таксама на зямельныя ўчасткі, якія ўваходзяць у склад зямель воднага фонду, выкарыстоўваюцца для прадпрымальніцкай дзейнасці і заняты капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), іх часткамі і іншымі аб'ектамі, устанаўліваюцца ў парадку, вызначаным гэтым артыкулам для зямельных участкаў вытворчай зоны.

8. Пры адсутнасці кадастравага кошту зямельных участкаў, дадзеных фізічным асобам у садаводчых суполках і дачных кааператывах, размешчаных за межамі населеных пунктаў, для вядзення калектыўнага садаводства і дачнага будаўніцтва, стаўкі зямельнага падатку на такія зямельныя ўчасткі ўстанаўліваюцца згодна з дадаткам 4 да гэтага Кодэкса, павялічаныя на каэфіцыент 1,6.

9. На зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя, прымяняюцца стаўкі зямельнага падатку па фактычным функцыянальным выкарыстанні. Аплата зямельнага падатку не ўзаконьвае самавольна заняты зямельны ўчастак.

10. Абласныя Саветы дэпутатаў ці па іх даручэнні мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню і Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў (далей у гэтай главе – мясцовыя Саветы дэпутатаў) маюць права павялічваць (змяншаць) стаўкі зямельнага падатку асобным катэгорыям плацельшчыкаў:

на 2019 год – не больш чым у два з паловай разы;

на 2020 год і наступныя гады – не больш чым у два разы.

11. Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб павелічэнні ставак зямельнага падатку, прынятыя ў адпаведнасці з пунктам 10 гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на:

арганізацыі, якім рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зменены ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін аплаты падаткаў, збораў (пошлін) і пеняў;

газазабяспечвальныя і энергазабяспечвальныя арганізацыі, якія аказваюць паслугі насельніцтву па газа- і электразабеспячэнні;

унітарныя прадпрыемствы грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў і ўстановы грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў;

арганізацыі, прызнаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь эканамічна неплацежаздольнымі (банкрутамі), у працэдуры ліквідацыйнага вядзення;

зямельныя ўчасткі (часткі зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, у адносінах да якіх прымяняюцца каэфіцыенты, устаноўленыя ў пункце 12 гэтага артыкула.

12. Да гадавой стаўкі зямельнага падатку ўстанаўліваюцца каэфіцыенты ў наступных памерах:

нуль цэлых дзве дзясятыя (0,2) – у адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны ўзведзеныя пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, на працягу другога года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых чатыры дзясятыя (0,4) – у адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны ўзведзеныя пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, на працягу трэцяга года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых шэсць дзясятых (0,6) – у адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны ўзведзеныя пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, на працягу чацвёртага года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю;

нуль цэлых восем дзясятых (0,8) – у адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны ўзведзеныя пасля 1 студзеня 2019 года плацельшчыкамі-арганізацыямі капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі на працягу пятага года (дванаццаці месяцаў) з даты прыёмкі такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у эксплуатацыю.

13. Зямельны падатак вылічваецца па стаўцы, павялічанай (зменшанай) у адпаведнасці з рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў па месцы знаходжання аб'ектаў падаткаабкладання.

**Артыкул 242. Падатковы перыяд зямельнага падатку**

Падатковым перыядам зямельнага падатку прызнаецца каляндарны год.

**Артыкул 243. Парадак вылічэння зямельнага падатку**

1. Гадавая сума зямельнага падатку вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

2. Вылічэнне зямельнага падатку па стаўках, павялічаных (зменшаных) у адпаведнасці з рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў, прынятымі ў адпаведнасці з пунктам 10 артыкула 241 гэтага Кодэкса, праводзіцца з 1 студзеня года, які ідзе следам за годам, у якім адпаведнае рашэнне прынята.

3. Падставамі для вылічэння зямельнага падатку з'яўляюцца:

рашэнне ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак, дзяржаўны акт на зямельны ўчастак, пасведчанне на права часовага карыстання зямельным участкам, пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

звесткі аб зямельных участках, якія належаць плацельшчыкам на праве прыватнай уласнасці, пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання, пастаяннага ці часовага карыстання, а таксама аб зямельных участках, якімі плацельшчыкі ў адпаведнасці з заканадаўствам маюць права карыстацца (у тым ліку звесткі, якія змяшчаюцца ў зямельна-інфармацыйнай сістэме, у рэгістры кошту зямель, зямельных участкаў дзяржаўнага зямельнага кадастру, звесткі аб зямельных участках (плошча, функцыянальнае выкарыстанне, мэтавае прызначэнне і кадастравы кошт зямельнага ўчастка на 1 студзеня падатковага перыяду)), а таксама звесткі аб прынятых рашэннях, якія з'яўляюцца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак, якія падаюцца ў падатковыя органы структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых камітэтаў па землеўпарадкаванні;

звесткі, пададзеныя ў падатковыя органы ў адпаведнасці з артыкулам 85 гэтага Кодэкса;

звесткі аб зямельных участках, дадзеных фізічным асобам у садаводчых суполках ці дачных кааператывах;

іншыя дакументы ці звесткі, пададзеныя плацельшчыкам, дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і іншымі асобамі, у тым ліку дакументы, якія дазваляюць вызначыць даныя зямельнага ўчастка (плошча, катэгорыя, функцыянальнае выкарыстанне, кадастравы кошт зямельнага ўчастка), пры наяўнасці такіх дакументаў і адсутнасці дакументаў, указаных у абзацы другім гэтага пункта;

фактычнае выкарыстанне плацельшчыкам зямельных участкаў, дадзеных у часовае карыстанне і своечасова не вернутых, самавольна занятых, уключаючы выпадкі такога выкарыстання, выяўленыя ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі, звесткі аб якіх падаюцца падатковым органам структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых органаў па землеўпарадкаванні.

Звесткі аб дадзеных у часовае карыстанне і своечасова не вернутых зямельных участках, самавольна занятых, падаюцца структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых органаў па землеўпарадкаванні падатковым органам па месцы знаходжання гэтых зямельных участкаў у электронным выглядзе ў парадку і па форме, зацверджаных Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь, у дзесяцідзённы тэрмін з дня ўступлення ў законную сілу пастановы ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа па справе аб адпаведным правапарушэнні.

4. Зямельны падатак вылічваецца пачынаючы з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак;

дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на зямельны ўчастак, правоў пастаяннага ці часовага карыстання зямельным участкам, права пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання або дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу такіх правоў (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага пункта, не патрабуецца);

адкрыцця спадчыны на зямельны ўчастак;

узнікнення ў адпаведнасці з заканадаўствам права карыстацца зямельным участкам (пры адсутнасці акалічнасцей, указаных у абзацах другім – чацвёртым гэтага пункта).

5. Вылічэнне зямельнага падатку спыняецца з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім:

упаўнаважаным дзяржаўным органам прынята рашэнне аб адабранні зямельнага ўчастка;

ажыццёўлены дзяржаўная рэгістрацыя спынення права ўласнасці на зямельны ўчастак, правоў пастаяннага ці часовага карыстання зямельным участкам, права пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання або дзяржаўная рэгістрацыя пераходу такіх правоў (у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнне, указанае ў абзацы другім гэтага пункта, не патрабуецца);

страчана ў адпаведнасці з заканадаўствам права карыстацца зямельным участкам (пры адсутнасці акалічнасцей, указаных у абзацах другім і трэцім гэтага пункта);

надышла смерць фізічнай асобы, якой належаў зямельны ўчастак, ці такая асоба была аб'яўлена памерлай.

6. Зямельны падатак за зямельны ўчастак, дадзены ў часовае карыстанне і своечасова не вернуты ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна заняты, вылічваецца з 1-га чысла месяца, з якога зямельны ўчастак выкарыстоўваўся з парушэннем устаноўленага парадку, па апошняе чысло месяца ўключна, у якім указаныя парушэнні ліквідаваны.

7. Пры пераходзе арганізацыяй, якая прымяняе асаблівы рэжым падаткаабкладання, што не прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку, на агульны парадак падаткаабкладання або на асаблівы рэжым падаткаабкладання, які прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку, вылічэнне зямельнага падатку праводзіцца з 1-га чысла месяца, з якога арганізацыя пачала прымяняць агульны парадак падаткаабкладання або асаблівы рэжым падаткаабкладання, які прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку.

Пры пераходзе арганізацыяй, якая выкарыстоўвае агульны парадак падаткаабкладання або асаблівы рэжым падаткаабкладання, што прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку, на асаблівы рэжым падаткаабкладання, які не прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку, вылічэнне зямельнага падатку плацельшчыкамі-арганізацыямі спыняецца з 1-га чысла месяца, з якога арганізацыяй пачаў прымяняцца асаблівы рэжым падаткаабкладання, які не прадугледжвае вылічэнне і аплату зямельнага падатку.

8. Пры прызнанні бюджэтных арганізацый плацельшчыкамі зямельнага падатку на падставах, указаных у частцы другой пункта 1 артыкула 237 гэтага Кодэкса, зямельны падатак такімі бюджэтнымі арганізацыямі вылічваецца ў адносінах да зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам перадачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне такіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) іх частак.

Пры здачы бюджэтнымі арганізацыямі ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на зямельных участках (частках зямельных участкаў) бюджэтных арганізацый, вылічэнне зямельнага падатку па такіх зямельных участках праводзіцца бюджэтнымі арганізацыямі прапарцыянальна плошчам капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, перададзеных у арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне.

Зямельны падатак бюджэтнымі арганізацыямі спыняе вылічвацца з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, вернуты арандатарам (пазыкаатрымальнікам) бюджэтнай арганізацыі.

9. Вызваленне ад зямельнага падатку ў плацельшчыкаў-арганізацый даецца з 1-га чысла месяца, у якім узнікла права на льготу. Пры страце на працягу каляндарнага года права на льготу зямельны падатак вылічваецца пачынаючы з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам страты гэтага права. Пры гэтым месяцам, у якім страчана права на льготу, з'яўляецца месяц, на які прыпадае апошні дзень дзеяння льготы.

Пры здачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на зямельных участках (частках зямельных участкаў), у адносінах да якіх прымяняецца вызваленне ад зямельнага падатку, арганізацыя вылічваюць зямельны падатак па такіх зямельных участках прапарцыянальна плошчам капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, перададзеных у арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне.

Пры здачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), у адносінах да якіх прымяняецца вызваленне ад зямельнага падатку, арганізацыі вылічваюць зямельны падатку па такіх зямельных участках зыходзячы з плошчаў такіх зямельных участкаў, перададзеных у арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне.

10. За зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія знаходзяцца ў карыстанні некалькіх плацельшчыкаў-арганізацый, зямельны падатак вылічваецца асобна па кожным плацельшчыку прапарцыянальна плошчы аб'екта нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца ў карыстанні кожнага з плацельшчыкаў.

За зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія знаходзяцца ў агульнай долевай уласнасці некалькіх плацельшчыкаў-арганізацый, зямельны падатак вылічваецца па кожным з гэтых плацельшчыкаў прапарцыянальна іх долі ў праве ўласнасці на гэтыя аб'екты нерухомай маёмасці.

11. Пры вылічэнні зямельнага падатку арганізацыямі, што вядуць лясную гаспадарку, з плошчы, якая абкладаецца зямельным падаткам, выключаюцца плошчы службовых зямельных надзелаў, дадзеных фізічным асобам па рашэнні раённых выканаўчых і распарадчых органаў.

12. Сумы зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання жылых дамоў, якія падлягаюць аплаце ў бюджэт арганізацыямі забудоўшчыкаў, арганізацыямі, якія маюць ва ўласнасці або валоданні, карыстанні жылыя памяшканні дзяржаўнага і (ці) прыватнага жыллёвых фондаў, у тым ліку жыллёва-будаўнічымі кааперативамі, жыллёвымі кааператывамі, арганізацыямі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, суполкамі ўласнікаў, кампенсуюцца плацельшчыкам наймальнікамі (паднаймальнікамі), арандатарамі, уласнікамі жылых памяшканняў, нежылых памяшканняў у гэтых жылых дамах, карыстальнікамі або ўласнікамі машына-месцаў, за выключэннем фізічных асоб, указаных у падпунктах 7.2.1–7.2.4 і 7.5 пункта 7 артыкула 239 гэтага Кодэкса, а таксама асоб, якія маюць права на пенсію па ўзросце, інвалідаў I і II групы, непаўналетніх дзяцей і асоб, прызнаных недзеяздольнымі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных часткай другой падпункта 1.19 пункта 1 артыкула 239 гэтага Кодэкса.

Пры адсутнасці органаў кіравання арганізацый, указаных у частцы першай гэтага пункта, або пры іх бяздзейнасці вылічэнне і пералічэнне ў бюджэт зямельнага падатку праводзіць упаўнаважаная асоба па кіраванні агульнай маёмасцю (далей – упаўнаважаная асоба).

Сумы зямельнага падатку вылічваюць упаўнаважаныя асобы на падставе звестак (плошча, кадастравы кошт зямельнага ўчастка, дадзенага плацельшчыку), якія падаюцца ім падатковымі органамі па форме, зацверджанай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Упаўнаважаныя асобы аплачваюць зямельны падатак у тэрміны, устаноўленыя падпунктам 6.1 пункта 6 артыкула 244 гэтага Кодэкса, у памеры фактычна атрыманых сум ад наймальнікаў ці ўласнікаў жылых памяшканняў, нежылых памяшканняў, машына-месцаў у жылых дамах.

Парадак пакрыцця сум зямельнага падатку, а таксама спагнання запазычанасці з наймальнікаў ці ўласнікаў жылых памяшканняў, нежылых памяшканняў, машына-месцаў па пакрыцці сум зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, занятыя жылымі дамамі, вызначае Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Сумы зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, дадзеныя для будаўніцтва і (ці) эксплуатацыі гаражоў, аўтамабільных стаянак для захоўвання транспартных сродкаў, якія падлягаюць аплаце ў бюджэт гаражнымі кааператывамі, кааператывамі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, кампенсуюцца плацельшчыкам членамі гаражных кааператываў ці кааператываў, што ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, якія з'яўляюцца карыстальнікамі або ўласнікамі гаражоў ці машына-месцаў, за выключэннем фізічных асоб, указаных у падпунктах 7.2.1–7.2.4 і 7.5 пункта 7 артыкула 239 гэтага Кодэкса, а таксама асоб, якія маюць права на пенсію па ўзросце, інвалідаў I і II групы, непаўналетніх дзяцей і асоб, прызнаных недзеяздольнымі.

13. Вызначэнне плошчы зямельных участкаў, якая адносіцца на фізічных асоб, указаных у частцы першай падпункта 1.19 пункта 1 артыкула 239 гэтага Кодэкса, праводзіцца шляхам памнажэння:

агульнай плошчы зямельнага ўчастка, на якім размешчаны жылы дом, на ўдзельную вагу плошчаў, якія належаць такім фізічным асобам, у агульнай плошчы ўсіх жылых памяшканняў гэтага жылога дома;

агульнай плошчы зямельнага ўчастка на ўдзельную вагу плошчаў гаражоў, машына-месцаў, якія належаць такім фізічным асобам, у агульнай плошчы ўсіх гаражоў, машына-месцаў.

14. Арганізацыі разлічваюць плошчу зямельнага ўчастка (часткі зямельнага ўчастка), якая адносіцца на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, указаныя ў падпунктах 1.1, 1.3, 1.4, 1.11, 1.13, 1.17, 1.18, 1.20, 1.21, 1.23 пункта 1 артыкула 239 гэтага Кодэкса, і вызваляецца ад зямельнага падатку, шляхам дзялення агульнай плошчы зямельнага ўчастка на агульную плошчу ўсіх капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на гэтым зямельным участку, і памнажэння на агульную плошчу капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у частцы плошчы, адносна якой зямельны ўчастак вызваляецца ад зямельнага падатку.

15. Зямельны падатак вылічваецца падатковым органам асобна па кожным зямельным участку, які належыць плацельшчыку – фізічнай асобе.

16. Пры ўзнікненні ў плацельшчыка – фізічнай асобы права на прымяненне падатковай ільготы па зямельным падатку льгота даецца з 1-га чысла месяца, у якім узнікла права на льготу, а пры страце права на льготу аплата зямельнага падатку праводзіцца пачынаючы з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім такое права страчана.

Льгота па зямельным падатку даецца падатковым органам на падставе пададзеных плацельшчыкам дакументаў, якія пацвярджаюць права на такую льготу, а таксама на падставе звестак, якія ёсць у падатковым органе, пададзеных дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі ці іншымі асобамі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

17. У выпадку, калі зямельны ўчастак знаходзіцца:

у агульнай долевай уласнасці фізічных асоб – зямельны падатак вылічваецца кожнаму з удзельнікаў долевай уласнасці прапарцыянальна яго долі ў праве ўласнасці на такі зямельны ўчастак;

у агульнай сумеснай уласнасці фізічных асоб – зямельны падатак вылічваецца фізічнай асобе, на якую афармлена пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ці іншы

дакумент, які пацвярджае дзяржаўную рэгістрацыю, узнікненне права ўласнасці на такую маёмасць.

18. У выпадку, калі за папярэднія падатковыя перыяды плацельшчыку – фізічнай асобе не быў вылічаны зямельны падатак, вылічэнне такога падатку праводзіцца не больш чым за тры каляндарныя гады, якія папярэднічаюць году, у якім праводзіцца такое вылічэнне.

19. У падатковы орган па месцы знаходжання зямельных участкаў падаюцца:

19.1. не пазней за 1 сакавіка бягучага падатковага перыяду наяўныя па стане на 1 студзеня падатковага перыяду:

звесткі аб зямельных участках, якія належаць плацельшчыкам на праве прыватнай уласнасці, пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання, пастаяннага ці часовага карыстання, а таксама аб зямельных участках, у адносінах да якіх плацельшчыкі ў адпаведнасці з заканадаўствам маюць права ажыццяўляць карыстанне, – структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых камітэтаў па землеўпарадкаванні. Звесткі падаюцца ў электронным выглядзе ў парадку і па форме, зацверджаных Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь;

звесткі аб зямельных участках, дадзеных фізічным асобам у садаводчых суполках ці дачных кааператывах, – садаводчымі суполкамі і дачнымі кааператывамі. Звесткі падаюцца ў парадку і па форме, зацверджаных Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

19.2. штоквартальна, не пазней за 15-е чысло месяца, які ідзе следам за справаздачным кварталам, звесткі аб прынятых рашэннях, якія з'яўляюцца падставамі для ўзнікнення, спынення ці пераходу правоў на зямельны ўчастак, – структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых камітэтаў па землеўпарадкаванні. Звесткі падаюцца ў электронным выглядзе ў парадку і па форме, зацверджаных Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 244. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты зямельнага падатку**

1. Плацельшчыкі-арганізацыі не пазней за 20 лютага бягучага падатковага перыяду падаюць у падатковыя органы па месцы пастаноўкі на ўлік падатковыя дэкларацыі (разлікі) па зямельным падатку зыходзячы з наяўнасці на 1 студзеня каляндарнага года аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам.

2. Пры прыняцці ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; пры ўзнікненні аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам; пры прызнанні плацельшчыкамі зямельнага падатку асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, і (ці) пры страце права на прымяненне льготы па зямельным падатку ў бягучым падатковым перыядзе (за выключэннем прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; узнікнення аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам; прызнання плацельшчыкамі зямельнага падатку асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, страты права на прымяненне льготы па зямельным падатку ў снежні бягучага падатковага перыяду) арганізацыямі-плацельшчыкамі падатковая дэкларацыя (разлік) па зямельным падатку падаецца або адпаведныя змяненні і дапаўненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па зямельным падатку не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім упаўнаважаны дзяржаўны орган прыняў рашэнне, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; узнік аб'ект падаткаабкладання

зямельным падаткам; арганізацыя, у тым ліку бюджэтная, прызнана плацельшчыкам зямельнага падатку і (ці) страчана права на прымяненне льготы па зямельным падатку.

Пры гэтым зямельны падатак за зямельныя ўчасткі, па якіх у бягучым падатковым перыядзе ўзніклі падставы для вылічэння зямельнага падатку, вылічваецца за колькасць поўных месяцаў, што засталіся да заканчэння падатковага перыяду, у якім узніклі падставы для вылічэння зямельнага падатку.

Плацельшчыкі-арганізацыі, на якія распаўсюджваюцца палажэнні пункта 6 артыкула 243 гэтага Кодэкса, падаюць падатковую дэкларацыю (разлік) па зямельным падатку не пазней за 20-е число месяца, што ідзе следам за месяцам, з якога зямельныя ўчасткі выкарыстоўваліся з парушэннем устаноўленага парадку.

3. Па зямельных участках, дадзеных садаводчым суполкам з (пасля) 1 жніўня, падатковыя дэкларацыі (разлікі) па зямельным падатку падаюцца ў падатковыя органы не пазней за 20 снежня бягучага года.

4. Плацельшчыкі-арганізацыі, на якія распаўсюджваюцца палажэнні абзаца трэцяга часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 артыкула 347 гэтага Кодэкса, падаюць падатковую дэкларацыю (разлік) па зямельным падатку не пазней за 20 студзеня года, што ідзе следам за каляндарным годам, указаным у абзацы трэцім часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 артыкула 347 гэтага Кодэкса.

5. З падатковай дэкларацыяй (разлікам) па зямельным падатку плацельшчыкі-арганізацыі падаюць у падатковыя органы:

5.1. звесткі аб перадачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, размешчаных на зямельных участках, дадзеных бюджэтным арганізацыям, і на зямельных участках, у адносінах да якіх прымяняецца льгота па зямельным падатку ў выглядзе вызвалення, па форме, зацверджанай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

5.2. звесткі аб перадачы ў арэнду зямельных участкаў, у адносінах да якіх прымяняецца льгота па зямельным падатку ў выглядзе вызвалення, па форме, зацверджанай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

5.3. звесткі аб фізічных асобах, якія маюць права на льготы па зямельным падатку ў адпаведнасці з падпунктамі 7.2.1–7.2.4, 7.4 і 7.5 пункта 7 артыкула 239 гэтага Кодэкса, па форме, зацверджанай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

6. Аплата зямельнага падатку праводзіцца:

6.1. арганізацыямі (за выключэннем садаводчых суполак):

па іх выбары без змянення на працягу падатковага перыяду адзін раз у год у памеры вылічанай сумы за год – не пазней за 22 лютага бягучага года ці штоквартальна не пазней за 22-е число другога месяца кожнага квартала – у памеры адной чацвёртай гадавой сумы зямельнага падатку;

за землі сельскагаспадарчага прызначэння – па іх выбары без змянення на працягу падатковага перыяду адзін раз у год у памеры вылічанай сумы за год не пазней за 15 красавіка бягучага года, ці не пазней за 15 красавіка, 15 ліпеня, 15 верасня, 15 лістапада – у памеры адной чацвёртай гадавой сумы зямельнага падатку, ці ў тэрміны, устаноўленыя абзацам другім гэтай часткі;

пры прыняцці ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; пры ўзнікненні аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам; пры прызнанні плацельшчыкамі зямельнага падатку асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, і (ці) пры страце права на прымяненне льготы па зямельным падатку ў бягучым падатковым перыядзе (за выключэннем прыняцця ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; узнікнення аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам; прызнання плацельшчыкамі зямельнага падатку

асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, страты права на прымяненне льготы па зямельным падатку ў лістападзе і снежні бягучага падатковага перыяду) аплата зямельнага падатку праводзіцца не пазней за дату, якая адпавядае бліжэйшаму заканадаўча ўстаноўленаму тэрміну аплаты, што ідзе следам за ўстаноўленай пунктам 2 гэтага артыкула датай падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па зямельным падатку ці ўнясення змяненняў і дапаўненняў у падатковую дэкларацыю (разлік) па зямельным падатку;

пры прыняцці ўпаўнаважаным дзяржаўным органам рашэння, якое з'яўляецца падставай для ўзнікнення ці пераходу права на зямельны ўчастак; пры ўзнікненні аб'ектаў падаткаабкладання зямельным падаткам; пры прызнанні плацельшчыкамі зямельнага падатку асобных арганізацый, у тым ліку бюджэтных, і (ці) пры страце права на прымяненне льготы па зямельным падатку ў лістападзе бягучага падатковага перыяду аплата зямельнага падатку праводзіцца не пазней за 22 снежня бягучага падатковага перыяду;

на якія распаўсюджваюцца палажэнні пункта 6 артыкула 243 гэтага Кодэкса, – не пазней за дату, якая адпавядае найбліжэйшаму заканадаўча ўстаноўленаму тэрміну аплаты пасля тэрміну падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па зямельным падатку ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула;

на якія распаўсюджваюцца палажэнні абзаца трэцяга часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 артыкула 347 гэтага Кодэкса, – не пазней за 22 студзеня года, які ідзе следам за каляндарным годам, указаным у абзацы трэцім часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 артыкула 347 гэтага Кодэкса;

6.2. садаводчымі суполкамі:

штогод не пазней за 22 жніўня;

за зямельныя ўчасткі, дадзеныя з (пасля) 1 жніўня, – не пазней за 22 снежня.

7. Плацельшчык – фізічная асоба аплачвае зямельны падатак на падставе паведамлення падатковага органа ўстаноўленай формы, якое штогод уручаецца плацельшчыку не пазней за 1 верасня. Паведамленні падатковага органа на аплату падатку за зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя, уручаюцца фізічным асобам у трыццацідзённы тэрмін з дня атрымання звестак, якія падаюцца структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых камітэтаў па землеўпарадкаванні ў адпаведнасці з часткай другой пункта 3 артыкула 243 гэтага Кодэкса.

У выпадку набыцця (атрымання) плацельшчыкам – фізічнай асобай аб'екта падаткаабкладання пасля сканчэння ўказанага тэрміну ўручэння паведамлення паведамленне ўручаецца ў трыццацідзённы тэрмін з дня атрымання падатковым органам адпаведных звестак аб аб'екце падаткаабкладання.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце пісьмом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

8. Аплата зямельнага падатку плацельшчыкам – фізічнай асобай праводзіцца:

8.1. штогод не пазней за 15 лістапада – за бягучы падатковы перыяд. У выпадку ўручэння падатковымі органамі паведамлення пасля сканчэння ўказанага тэрміну аплаты падатак падлягае аплаце не пазней за трыццаць каляндарных дзён з дня ўручэння паведамлення плацельшчыку;

8.2. на працягу трыццаці каляндарных дзён з дня ўручэння паведамлення плацельшчыку пры прад'яўленні да аплаты падатку:

за папярэднія падатковыя перыяды;

за дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя зямельныя ўчасткі.

9. Аплата фізічнай асобай зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, размешчаныя ў гаражных кааператывах і кааператывах, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, у садаводчых суполках ці дачных кааператывах, можа праводзіцца шляхам унясення сум зямельнага падатку гаражным кааператывам і кааператывам, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садаводчым суполкам ці дачным кааператывам, якія ажыццяўляюць прыём сум зямельнага падатку і іх пералічэнне ў бюджэт.

Гаражныя кааператывы і кааператывы, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, садаводчыя суполкі, дачныя кааператывы падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік не пазней за 16 лістапада бягучага года звесткі аб прынятых ад фізічных асоб сумах зямельнага падатку па форме, устаноўленай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, з дадаваннем плацежных інструкцый (іх копій) аб пералічэнні прынятых грашовых сродкаў у бюджэт.

**Артыкул 245. Уключэнне сум зямельнага падатку ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў склад пазарэалізацыйных расходаў**

1. Сумы зямельнага падатку ўключаюцца арганізацыямі (акрамя бюджэтных арганізацый) у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі іншае не прадугледжана пунктам 3 гэтага артыкула.

2. Бюджэтныя арганізацыі ў выпадку здачы ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак сумы зямельнага падатку ў частцы зямельных участкаў (частак зямельных участкаў), на якіх размешчаны капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя ў арэнду, іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, уключаюць у склад пазарэалізацыйных расходаў.

3. Не ўключаюцца ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў сумы зямельнага падатку:

3.1. якія кампенсуюцца плацельшчыкам у адпаведнасці з пунктам 12 артыкула 243 гэтага Кодэкса;

3.2. якія кампенсуюцца пазыкаатрымальнікам пазыкадавальніку, абавязак пакрыцця якіх прадугледжаны актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

3.3. які падлягаюць у адпаведнасці з заканадаўствам уключэнню ў кошт аб'ектаў незавершанага будаўніцтва;

3.4. вылічаныя на зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя.

## ГЛАВА 21
## ЭКАЛАГІЧНЫ ПАДАТАК

**Артыкул 246. Плацельшчыкі экалагічнага падатку**

1. Плацельшчыкамі экалагічнага падатку прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі (далей у гэтай главе – плацельшчыкі).

2. Плацельшчыкамі за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў вытворчасці прызнаюцца ўласнікі адходаў вытворчасці.

3. Плацельшчыкамі не прызнаюцца бюджэтныя арганізацыі, за выключэннем бюджэтных арганізацый, якія прызнаюцца плацельшчыкамі за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў вытворчасці ў выпадках набыцця імі права ўласнасці на адходы вытворчасці на падставе здзелкі аб адчужэнні адходаў ці здзяйснення іншых дзеянняў, якія сведчаць аб накіраванні іншым спосабам адходаў ва ўласнасць, у мэтах наступнага пахавання.

**Артыкул 247. Аб'екты падаткаабкладання экалагічным падаткам**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання экалагічным падаткам прызнаюцца:

1.1. выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, указаныя ў дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ці комплексных прыродаахоўных дазволах;

1.2. скіданне сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе на падставе дазволаў на спецыяльнае водакарыстанне ці комплексных прыродаахоўных дазволаў;

1.3. захоўванне адходаў вытворчасці;

1.4. пахаванне адходаў вытворчасці.

2. Аб'ектамі падаткаабкладання экалагічным падаткам не прызнаюцца:

2.1. выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, указаныя ў дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ці комплексных прыродаахоўных дазволах, пры агульных сумарных аб'ёмах выкідаў у цэлым па плацельшчыку тры тоны ў год і менш;

2.2. скіданне сцёкавых вод, якія адводзяцца ў навакольнае асяроддзе праз сістэму дажджавой каналізацыі з тэрыторыі, на якой яны ўтварыліся ў выніку выпадзення атмасферных ападкаў і раставання снегу;

2.3. скіданне сцёкавых вод, якія ўтвараюцца пры паліўцы і мыцці дарожных пакрыццяў (палівамыйныя працы) на тэрыторыі населеных пунктаў, скіданне сцёкавых вод ад апаражнення чаш фантанаў;

2.4. захоўванне адходаў вытворчасці на аб'ектах абясшкоджвання і (ці) выкарыстання такіх адходаў, прызначаных да абясшкоджвання і (ці) выкарыстання, у колькасці, якая адпавядае тэхналагічнаму рэгламенту гэтых аб'ектаў;

2.5. захоўванне адходаў вытворчасці, прызначаных для пахавання, абясшкоджвання і (ці) выкарыстання, у мэтах назапашвання колькасці адходаў вытворчасці, неабходнай для перавозкі адной транспартнай адзінкай на аб'екты пахавання, абясшкоджвання і (ці) выкарыстання такіх адходаў;

2.6. захоўванне і пахаванне радыеактыўных адыходаў, забруджаных радыенуклідамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а таксама іншых адходаў, прадуктаў, матэрыялаў і іншых рэчываў, забруджаных радыенуклідамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

2.7. захоўванне ва ўстаноўленым парадку выведзенага з эксплуатацыі абсталявання, матэрыялаў і адходаў вытворчасці, якія змяшчаюць поліхлараваныя біфенілы;

2.8. пахаванне адходаў вытворчасці, падобных да адходаў жыццядзейнасці насельніцтва, пры агульным аб'ёме пахавання адходаў вытворчасці пяцьдзясят і менш тон у год.

**Артыкул 248. Падатковая база экалагічнага падатку**

Падатковая база экалагічнага падатку вызначаецца як фактычныя аб'ёмы:

выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, указаных у дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ці комплексных прыродаахоўных дазволах;

скідання сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе на падставе дазволаў на спецыяльнае водакарыстанне ці комплексных прыродаахоўных дазволаў;

адходаў вытворчасці, якія падлягаюць захоўванню;

адходаў вытворчасці, якія падлягаюць пахаванню.

**Артыкул 249. Стаўкі экалагічнага падатку**

1. Стаўкі экалагічнага падатку ўстанаўліваюцца ў памерах згодна за дадаткамі 7–9 да гэтага Кодэкса.

2. Да ставак экалагічнага падатку, указаных у дадатках 7–9 да гэтага Кодэкса, прымяняюцца наступныя каэфіцыенты:

2.1. за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, якія ўтвараюцца пры згаранні паліва для задавальнення цеплаэнергетычных патрэб насельніцтва, – 0,27.

Для мэт гэтай главы пад выкідамі забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, якія ўтвараюцца пры згаранні паліва для задавальнення цеплаэнергетычных патрэб насельніцтва, разумеюцца выкіды ад згарання паліва, пры якім выпрацоўваецца электрычная энергія, якая адпускаецца насельніцтву для мэт асвятлення, сілкавання электрабытавых прыбораў і стацыянарных электрапліт, а таксама цеплавая энергія, якая адпускаецца насельніцтву для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння, у тым ліку для аб'ектаў аховы здароўя, турызму, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага абслугоўвання, адукацыі, культуры і мастацтва, якія забяспечваюць сацыяльна-бытавыя патрэбы насельніцтва.

Каэфіцыент, указаны ў частцы першай гэтага падпункта, не прымяняецца да ставак экалагічнага падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, якія ўтвараюцца пры цеплаэнергазабеспячэнні тэхналагічных працэсаў уласнай вытворчасці;

2.2. за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, за скіданне сцёкавых вод, за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці плацельшчыкамі, якія атрымалі экалагічны сертыфікат адпаведнасці, на працягу трох гадоў з дня атрымання гэтага сертыфіката – 0,9.

Прымяненне гэтага каэфіцыента да ставак экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў ажыццяўляецца ўладальнікамі гэтых аб'ектаў у выпадку прад'яўлення ім уласнікамі адходаў вытворчасці экалагічнага сертыфіката адпаведнасці;

2.3. за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, якія ўтвараюцца пры выкарыстанні RDF-паліва – 0,64;

2.4. за скіданне сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе для ўладальнікаў камунальнай і ведамаснай каналізацыі (скіданне ад насельніцтва), для рыбаводных арганізацый і сажалкавых гаспадарак (скіданне з сажалак) – 0,006.

Для мэт гэтай главы да скідання сцёкавых вод уладальнікамі камунальнай і ведамаснай каналізацыі (скіданне ад насельніцтва) адносяцца скіданне сцёкавых вод ад насельніцтва, якое пражывае ў жылых дамах, а таксама скіданне сцёкавых вод ад аб'ектаў аховы здароўя, турызму, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага абслугоўвання, адукацыі, культуры і мастацтва, якія забяспечваюць сацыяльна-бытавыя патрэбы насельніцтва;

2.5. за скіданне сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты цеплаэлектрастанцыямі, якія выкарыстоўваюць у працы:

неаднаўляльныя крыніцы энергіі, ахаладжэнне кандэнсатараў турбін якіх ажыццяўляецца па праматочнай схеме, – 0,5;

аднаўляльныя крыніцы энергіі, ахаладжэнне кандэнсатараў турбін якіх ажыццяўляецца па праматочнай схеме, – 0,2.

**Артыкул 250. Падатковы перыяд экалагічнага падатку**

Падатковым перыядам экалагічнага падатку прызнаецца каляндарны квартал.

**Артыкул 251. Парадак вылічэння экалагічнага падатку**

1. Сума экалагічнага падатку вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

2. Пры разліку фактычных аб'ёмаў выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра праводзіцца падсумоўванне аб'ёмаў выкідаў па класах небяспекі рэчываў (групы рэчываў), указаных у дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ці комплексных прыродаахоўных дазволах, без разбіўкі на асобныя рэчывы.

3. Сума экалагічнага падатку можа вылічвацца плацельшчыкамі зыходзячы з устаноўленых гадавых аб'ёмаў выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, скідання сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе, захоўвання, указаных у дазволах на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, спецыяльнае водакарыстанне,

захоўванне ці ў комплексных прыродаахоўных дазволах (далей – гадавы аб'ём), і адпаведных ставак экалагічнага падатку.

4. Экалагічны падатак за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў вылічваецца ўладальнікамі аб'ектаў пахавання адходаў і прад'яўляецца імі ўласнікам адходаў вытворчасці дадаткова да тарыфаў за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў.

5. Вылічаная сума экалагічнага падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра змяншаецца плацельшчыкам штоквартальна (у памеры не большым за вылічаную суму экалагічнага падатку, за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ва ўказаны перыяд) на суму праведзеных расходаў на фінансаванне капітальных укладанняў (за выключэннем капітальных укладанняў, якія фінансуюцца з бюджэту) у будаўніцтва і (ці) рэканструкцыю газаачышчальных установак, установак па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі, а таксама ў стварэнне аўтаматызаваных сістэм кантролю за выкідамі забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра.

Вылічаная сума экалагічнага падатку за скіданне сцёкавых вод змяншаецца плацельшчыкам штоквартальна (у памеры не большым за вылічаную суму экалагічнага падатку за скіданне сцёкавых вод ва ўказаны перыяд) на суму праведзеных расходаў на фінансаванне капітальных укладанняў (за выключэннем капітальных укладанняў, якія фінансуюцца з бюджэту) у будаўніцтва і (ці) рэканструкцыю збудаванняў, установак і (ці) прылад, прызначаных для выдалення са сцёкавых вод забруджвальных рэчываў, апрацоўкі асадку і выпуску ачышчаных сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты.

Вылічаная сума экалагічнага падатку за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці змяншаецца плацельшчыкам штоквартальна (у памеры не большым за вылічаную суму экалагічнага падатку за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці ва ўказаны перыяд) на суму праведзеных расходаў на фінансаванне капітальных укладанняў (за выключэннем капітальных укладанняў, якія фінансуюцца з бюджэту) у будаўніцтва і (ці) рэканструкцыю ўласнікамі адходаў аб'ектаў захоўвання, аб'ектаў пахавання, аб'ектаў абясшкоджвання і (ці) аб'ектаў па выкарыстанні адходаў.

**Артыкул 252. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты экалагічнага падатку**

1. Плацельшчыкі штоквартальна падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

Падатковыя дэкларацыі (разлікі) за захоўванне адходаў вытворчасці на аб'ектах захоўвання адходаў падаюцца плацельшчыкамі – уладальнікамі аб'ектаў захоўвання адходаў у падатковы орган не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за справаздачным кварталам, у якім узнікла падатковае абавязацельства па экалагічным падатку.

Падатковыя дэкларацыі (разлікі) за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адыходаў падаюцца ў падатковы орган у парадку і тэрміны, устаноўленыя часткай першай гэтага пункта, уладальнікамі аб'ектаў пахавання адходаў.

2. Аплата экалагічнага падатку праводзіцца штоквартальна не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

Выкананне падатковага абавязацельства плацельшчыка за пахаванне адходаў вытворчасці на аб'ектах пахавання адходаў вытворчасці ўскладаецца на ўладальнікаў аб'ектаў пахавання адходаў вытворчасці ў межах сум экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці, якія паступілі ад уласнікаў адходаў вытворчасці.

Пералічэнне ўласнікамі адходаў вытворчасці экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці ўладальнікам аб'ектаў пахавання адходаў праводзіцца асобнай

плацежнай інструкцыяй непасрэдна ў момант аплаты паслуг па пахаванні адходаў, але не пазней за 10-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

У выпадку неператічэння ўласнікамі адходаў вытворчасці ў тэрмін, указаны ў частцы трэцяй гэтага пункта, сум экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці:

для кожнага ўласніка адходаў вытворчасці, які дапусціў парушэнне, указанае ў абзацы першым гэтай часткі, уладальнікі аб'ектаў пахавання адходаў вытворчасці на суму, што адпавядае двайному памеру не пералічанага ў тэрмін экалагічнага падатку, павялічваюць суму вылічанага экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці;

уласнікі адходаў вытворчасці робяць пералічэнне ўладальнікам аб'ектаў пахавання адходаў вытворчасці экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці ў суме, якая адпавядае трайному памеру не пералічанага ў тэрмін экалагічнага падатку;

пасля складання для пацвярджэння запазычанасці актаў зверкі разлікаў з плацельшчыкамі – уладальнікамі аб'ектаў пахавання адходаў вытворчасці ў парадку і тэрміны, устаноўленыя для падачы падатковай дэкларацыі (разліку), у падатковыя органы па месцы пастаноўкі на ўлік па кожным уласніку адходаў вытворчасці падаюцца паведамленні аб запазычанасці па аплаце сум экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці па ўстаноўленай форме на папяровым носьбіце ці па ўстаноўленых фарматах у выглядзе электроннага дакумента. Форму і фарматы паведамленняў, а таксама парадак іх падачы ў падатковы орган устанаўлівае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

падатковыя органы спаганяюць сумы экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці з уласнікаў адходаў вытворчасці.

3. Плацельшчыкі, якія вылічваюць экалагічны падатак у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 251 гэтага Кодэкса, падаюць у падатковы орган падатковыя дэкларацыі (разлікі):

3.1. не пазней за 20 красавіка каляндарнага года зыходзячы з устаноўленага гадавога аб'ёму.

Аплата экалагічнага падатку праводзіцца па выбары плацельшчыка адзін раз на год у памеры вылічанай сумы за год не пазней за 22 красавіка каляндарнага года ці штоквартальна не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за справаздачным кварталам, у памеры адной чацвёртай вылічанай сумы экалагічнага падатку;

3.2. не пазней за 20 лютага года, які ідзе следам за мінулым годам, на падставе фактычных гадавых аб'ёмаў выкідаў у атмасфернае паветра забруджвальных рэчываў, скідання сцёкавых вод, захоўвання і пахавання адходаў і не пазней за 22 лютага года, які ідзе следам за мінулым, праводзяць даплату экалагічнага падатку. У выпадку, калі ўказаныя аб'ёмы не перавышаюць устаноўленых гадавых аб'ёмаў, залішне заплачаныя сумы экалагічнага падатку падлягаюць заліку або вяртанню плацельшчыкам у парадку, устаноўленым артыкулам 66 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 253. Уключэнне сум экалагічнага падатку ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы экалагічнага падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, скіданне сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе, захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці ўключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі — у расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 22
## ПАДАТАК ЗА ЗДАБЫЧУ (АДАБРАННЕ) ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ

**Артыкул 254. Плацельшчыкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

1. Плацельшчыкамі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі (далей у гэтай главе – плацельшчыкі).

2. Плацельшчыкамі не прызнаюцца бюджэтныя арганізацыі.

**Артыкул 255. Аб'екты падаткаабкладання падаткам за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаткам за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў прызнаецца здабыча (адабранне) наступных прыродных рэсурсаў:

1.1. пяску, які выкарыстоўваецца ў якасці фармовачнага, для вытворчасці шкла, фарфора-фаянсавых вырабаў, вогнетрывалых матэрыялаў, цэменту;

1.2. пясчана-гравійна-валуннага матэрыялу;

1.3. каменя будаўнічага, абліцовачнага;

1.4. вады (паверхневай і падземнай);

1.5. мінеральных вод, мінералізаваных прамысловых вод;

1.6. пяску;

1.7. гліны, супеску, суглінку і трэпелу;

1.8. бентанітавых глін;

1.9. калійных соляў (у пераліку на аксід калію), каменнай солі;

1.10. нафты і газавага кандэнсату;

1.11. мелу, мергелю, вапняку і даламіту;

1.12. гіпсу;

1.13. жалезных руд;

1.14. торфу вільготнасцю 40 працэнтаў;

1.15. сапрапеляў вільготнасцю 60 працэнтаў;

1.16. моранага дубу;

1.17. бурштыну;

1.18. золата;

1.19. вінаграднага смаўжа;

1.20. лічынак хіранамід;

1.21. зялёнай жабы (сажалкавай, ядомай, азёрнай);

1.22. гадзюкі звычайнай;

1.23. бурага вугалю (у пераліку на ўмоўнае паліва);

1.24. гаручых сланцаў (у пераліку на ўмоўнае паліва);

1.25. даўгапальцага (вузкапальцага) рака.

2. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў не прызнаюцца:

2.1. здабыча нафтавага спадарожнага газу;

2.2. здабыча карысных выкапняў, якія застаюцца ў раскрыўных, змяшчальных (разубожвальных) пародах, у адвалах ці адходах перапрацоўчых вытворчасцей, а таксама карысных выкапняў, якія складаюць нарматыўныя страты;

2.3. адабранне карысных выкапняў з нетраў пры будаўніцтве падземных частак наземных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) і іншых аб'ектаў будаўніцтва, не звязанае са здабычай карысных выкапняў, у тым ліку іх адабранне са дна вадаёмаў пры вытворчасці днопаглыбных прац;

2.4. здабыча пяску і пясчана-гравійна-валуннага матэрыялу, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці прац па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС;

2.5. здабыча вод радовішчаў карысных выкапняў;

2.6. здабыча (адабранне) вод для ліквідацыі надзвычайных сітуацый і (ці) іх наступстваў;

2.7. здабыча падземных вод з кантрольных і рэзервовых свідравін пры правядзенні планавага кантролю за іх эксплуатацыяй, са свідравін загараджальнага дрэнажу, прызначаных для абароны падземных вод ад забруджвання ў раёне размяшчэння месцаў захоўвання буйнатанажных адходаў;

2.8. здабыча падземных вод, якія выкарыстоўваюцца для атрымання геатэрмальнай энергіі.

**Артыкул 256. Падатковая база падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

Падатковая база падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў, за выключэннем калійных соляў, вызначаецца як фактычны аб'ём здабытых (адабраных) прыродных рэсурсаў.

Падатковая база падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да калійных соляў вызначаецца:

як фактычны аб'ём здабытых (адабраных) калійных соляў (у мэтах прымянення стаўкі падатку, устаноўленай у цвёрдай суме);

як здабытак фактычнага аб'ёму рэалізацыі калійных угнаенняў і сярэднеўзважанай цаны рэалізацыі 1 тоны калійных угнаенняў за межы Рэспублікі Беларусь (у мэтах прымянення стаўкі падатку, устаноўленай у працэнтных адносінах).

**Артыкул 257. Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў, за выключэннем ставак падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да нафты і калійных соляў, устанаўліваюцца ў памерах згодна з дадаткам 10 да гэтага Кодэкса.

Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да нафты ўстанаўліваюцца зыходзячы з сярэдняга за мінулы падатковы перыяд узроўню цэн на нафту гатунку «Юралс» на сусветных рынках нафтавай сыравіны згодна з дадаткам 11 да гэтага Кодэкса.

Для мэт гэтай главы пад сярэднім за мінулы падатковы перыяд узроўнем цэн на нафту гатунку «Юралс» на сусветных рынках нафтавай сыравіны разумеецца сума сярэдніх арыфметычных цэн куплі і продажу на сусветных рынках нафтавай сыравіны (міжземнаморскім і ратэрдамскім) за ўсе дні таргоў, падзеленая на колькасць дзён таргоў у адпаведным падатковым перыядзе.

Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да калійных соляў устанаўліваюцца ў наступных памерах:

пяць цэлых чатыры сотых (5,04) беларускага рубля за здабычу (адабранне) 1 тоны калійных соляў (у пераліку на аксід калію) (далей у гэтай главе – спецыфічная стаўка);

дванаццаць (12) працэнтаў (далей у гэтай главе – адвалорная стаўка) ад сярэднеўзважанай цаны калійных угнаенняў на ўнутраным рынку і пры экспарце (далей у гэтай главе – сярэднеўзважаная цана).

**Артыкул 258. Падатковы перыяд падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

Падатковым перыядам падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў, за выключэннем падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да нафты і падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да калійных соляў, прызнаецца каляндарны квартал.

Падатковым перыядам падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да нафты і падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да калійных соляў прызнаецца каляндарны месяц.

**Артыкул 259. Парадак вылічэння падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў**

1. Сума падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі з улікам асаблівасцей, устаноўленых часткамі другой – шостай гэтага пункта.

Сума падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да калійных соляў вылічваецца шляхам складання здабытку фактычнага аб'ёму здабычы (адабрання) калійных соляў (у пераліку на аксід калію) і спецыфічнай стаўкі са здабыткам фактычнага аб'ёму рэалізацыі калійных угнаенняў, сярэднеўзважанай цаны, адвалорнай стаўкі.

Сярэднеўзважаная цана разлічваецца плацельшчыкам, які ажыццяўляе здабычу калійных соляў і рэалізацыю калійных угнаенняў, у беларускіх рублях за 1 тону фізічнай вагі калійных угнаенняў як адносіны аб'ёмаў іх рэалізацыі ў вартасным выяўленні да агульнага аб'ёму рэалізаваных калійных угнаенняў у натуральным выяўленні па формуле:

$$P = \frac{S_{pq} + S_{p1q1} +/- S_{p'q'} +/- S_{p1'q1'}}{S_q + S_{q1} +/- S_{q'} +/- S_{q1'}},$$

дзе: P – сярэднеўзважаная цана;

$S_{pq}$ – кошт калійных угнаенняў, рэалізаваных за межы Рэспублікі Беларусь плацельшчыкам у мінулым падатковым перыядзе, у беларускіх рублях;

$S_{p1q1}$ – кошт калійных угнаенняў, рэалізаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь плацельшчыкам у мінулым падатковым перыядзе, у беларускіх рублях;

$S_{p'q'}$ – розніца паміж коштам калійных угнаенняў, рэалізаваных за межы Рэспублікі Беларусь, прадстаўленым у папярэднія падатковыя перыяды, і іх удакладненым коштам у адпаведным падатковым перыядзе, у беларускіх рублях;

$S_{p1'q1'}$ – розніца паміж коштам калійных угнаенняў, рэалізаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прадстаўленым у папярэднія падатковыя перыяды, і іх удакладненым коштам у адпаведным падатковым перыядзе, у беларускіх рублях;

$S_q$ – аб'ём калійных угнаенняў, рэалізаваных за межы Рэспублікі Беларусь плацельшчыкам у мінулым падатковым перыядзе, у тонах;

$S_{q1}$ – аб'ём калійных угнаенняў, рэалізаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь плацельшчыкам у мінулым падатковым перыядзе, у тонах;

$S_{q'}$ – розніца паміж аб'ёмам калійных угнаенняў, рэалізаваных за межы Рэспублікі Беларусь, прадстаўленым у папярэднія падатковыя перыяды, і іх удакладненым аб'ёмам у адпаведным падатковым перыядзе, у тонах;

$S_{q1'}$ – розніца паміж аб'ёмам калійных угнаенняў, рэалізаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прадстаўленым у папярэднія падатковыя перыяды, і іх удакладненым аб'ёмам у адпаведным падатковым перыядзе, у тонах.

Вартаснае выяўленне аб'ёмаў калійных угнаенняў, рэалізаваных за межы Рэспублікі Беларусь, вызначаецца на ўмовах пастаўкі, прыведзеных да ўмоў FCA (пастаўка ажыццяўляецца ў памяшканні прадаўца) у адпаведнасці з Міжнароднымі правіламі тлумачэння гандлёвых тэрмінаў (Інкатэрмс 2010).

Для вызначэння кошту калійных угнаенняў у беларускіх рублях замежная валюта пералічваецца па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на апошняе чысло мінулага падатковага перыяду.

Вартаснае выяўленне аб'ёмаў калійных угнаенняў, рэалізаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прымяняецца без уліку падатку на дабаўленую вартасць.

2. Сума падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў, за выключэннем падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да нафты і калійных соляў, можа вылічвацца плацельшчыкамі зыходзячы з аб'ёмаў здабычы (адабрання) прыродных рэсурсаў, указаных у дакументах, на падставе якіх ажыццяўляецца іх здабыча (адабранне), і адпаведных ставак падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў.

**Артыкул 260. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты экалагічнага падатку**

1. Плацельшчыкі пасля сканчэння падатковага перыяду падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

2. Аплата падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў праводзіцца пасля сканчэння падатковага перыяду не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

3. Плацельшчыкі, якія вылічваюць падатак за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 259 гэтага Кодэкса, падаюць у падатковы орган падатковыя дэкларацыі (разлікі):

3.1. не пазней за 20 красавіка каляндарнага года зыходзячы з аб'ёмаў здабычы (адабрання) прыродных рэсурсаў, указаных у дакументах, на падставе якіх ажыццяўляецца іх здабыча (адабранне).

Падатак за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў аплачваецца штоквартальна не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за справаздачным кварталам, у памеры адной чацвёртай вылічанай сумы падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў;

3.2. не пазней за 20 лютага года, які ідзе следам за мінулым годам, на падставе фактычных гадавых аб'ёмаў здабычы (адабрання) прыродных рэсурсаў і не пазней за 22 лютага года, які ідзе следам за мінулым, праводзяць даплату падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў. Залішне заплачаныя сумы падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў падлягаюць заліку або вяртанню плацельшчыкам у парадку, устаноўленым артыкулам 66 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 261. Уключэнне сум падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў уключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 23
## АФШОРНЫ ЗБОР

**Артыкул 262. Плацельшчыкі афшорнага збору**

Плацельшчыкамі афшорнага збору прызнаюцца беларускія арганізацыі і беларускія індывідуальныя прадпрымальнікі (далей у гэтай главе – рэзідэнты Рэспублікі Беларусь).

**Артыкул 263. Аб'ект абкладання, падатковая база і стаўка афшорнага збору**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання афшорным зборам з'яўляюцца:

1.1. пералічэнне грашовых сродкаў рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерэзідэнту Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванаму ў афшорнай зоне, іншай асобе па абавязацельстве

перад гэтым нерэзідэнтам ці на рахунак, адкрыты ў афшорнай зоне, калі іншае не ўстаноўлена гэтым артыкулам;

1.2. выкананне абавязацельства ў неграшовай форме перад нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваным у афшорнай зоне, акрамя выпадкаў выканання нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь сустрэчнага абавязацельства шляхам пералічэння на рахунак рэзідэнта Рэспублікі Беларусь грашовых сродкаў;

1.3. пераход у адпаведнасці з заканадаўствам маёмасных правоў і (ці) абавязкаў у сувязі з переменай асоб у абавязацельстве, бакамі якога выступаюць рэзідэнт Рэспублікі Беларусь і нерэзідэнт Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваны ў афшорнай зоне.

2. Не з'яўляюцца аб'ектамі абкладання афшорным зборам:

2.1. пералічэнне грашовых сродкаў дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь перад міжнароднымі арганізацыямі па міжнародных дагаворах, а таксама:

кампаніі «STANDARD AND POOR'S FINANCIAL SERVICES LLC» (штат Дэлавэр, Злучаныя Штаты Амерыкі);

кампаніі «BLOOMBERG FINANCE L. P.» (штат Дэлавэр, Злучаныя Штаты Амерыкі);

2.2. выкананне абавязацельстваў у неграшовай форме перад нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і пераход абавязкаў у сувязі з пераменай асоб у абавязацельстве, бакамі якога выступаюць рэзідэнт Рэспублікі Беларусь і нерэзідэнт Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваны ў афшорнай зоне, па абавязацельствах, пералічэнне грашовых сродкаў па якіх не з'яўляецца аб'ектам абкладання афшорным зборам у адпаведнасці з падпунктам 2.1 гэтага пункта.

3. Пералік афшорных зон – дзяржаў (тэрыторый), у якія дзейнічае льготны падатковы рэжым і (ці) не прадугледжваецца раскрыццё і даванне інфармацыі аб фінансавых аперацыях, вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 264. Льготы па афшорным зборы**

1. Вызваляецца ад абкладання афшорным зборам пералічэнне грашовых сродкаў:

1.1. дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь перад міжнароднымі арганізацыямі па міжнародных дагаворах;

1.2. у мэтах вяртання плацельшчыкамі грашовых сродкаў, атрыманых ад нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь у якасці крэдытаў і пазык, працэнтаў за карыстанне імі, а таксама раней атрыманых ад нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь грашовых сродкаў на іншых падставах у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ці дагаворам;

1.3. па дагаворах марской перавозкі грузаў і па дагаворах транспартнай экспедыцыі пры арганізацыі міжнародных перавозак грузаў марскім транспартам;

1.4. якія накіроўваюцца банкамі Рэспублікі Беларусь:

на карысць нерэзідэнтаў – уладальнікаў міжнародных сістэм разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак VISA, MasterCard і American Express, якія зарэгістраваны ў афшорных зонах і (ці) маюць рахункі ў гэтых зонах, у адпаведнасці з заключанымі дагаворамі з указанымі нерэзідэнтамі (узносы, ліцэнзійныя выплаты, гарантыйны дэпазіт, плацяжы за аказанне паслуг па падрыхтоўцы, даванні і сертыфікацыі праграмна-тэхнічных сродкаў, іншыя плацяжы, звязаныя з удзелам у такіх сістэмах разлікаў);

пры ажыццяўленні ад свайго імя банкаўскіх аперацый у адпаведнасці з дагаворамі, заключанымі гэтымі банкамі з нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, якія зарэгістраваны ў афшорных зонах і (ці) маюць рахункі ў гэтых зонах;

1.5. прафесійнымі ўдзельнікамі рынку каштоўных папер нерэзідэнтам, указаным у абзацах другім і трэцім падпункта 2.1 пункта 2 артыкула 263 гэтага Кодэкса;

1.6. у іншых выпадках паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Вызваляюцца ад афшорнага збору выкананне абавязацельстваў у неграшовай форме перад нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і пераход абавязкаў у сувязі з пераменай асоб у абавязацельстве, бакамі якога выступаюць плацельшчык і нерэзідэнт Рэспублікі Беларусь, зарэгістраваны ў афшорнай зоне, па абавязацельствах, пералічэнне грашовых сродкаў па якіх вызваляецца ад афшорнага збору ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула.

**Артыкул 265. Падатковая база афшорнага збору**

1. Падатковая база афшорнага збору вызначаецца:

пры пералічэнні грашовых сродкаў – зыходзячы з сумы грашовых сродкаў, якія пералічваюцца;

пры выкананні абавязацельства ў неграшовай форме або пераходзе ў адпаведнасці з заканадаўствам маёмасных правоў і (ці) абавязкаў у сувязі з пераменай асоб у абавязацельствах – зыходзячы з цаны дагавора, з якога вынікаюць указаныя абавязацельствы, з улікам палажэнняў пункта 2 гэтага артыкула.

2. Калі абавязацельства ў неграшовай форме выконваецца паэтапна, падатковая база вызначаецца зыходзячы з аб'ёму выкананага рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абавязацельства.

Пры пераходзе ў адпаведнасці з заканадаўствам маёмасных правоў і (ці) абавязкаў у сувязі з пераменай асоб у абавязацельстве падатковая база вызначаецца зыходзячы з перададзенага аб'ёму маёмасных правоў і (ці) абавязкаў.

**Артыкул 266. Стаўкі афшорнага збору**

Стаўка афшорнага збору ўстанаўліваецца ў памеры пятнаццаць (15) працэнтаў.

**Артыкул 267. Падатковы перыяд афшорнага збору. Парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты афшорнага збору**

1. Падатковым перыядам афшорнага збору з'яўляецца каляндарны месяц.

2. Сума афшорнага збору вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі афшорнага збору.

3. Падатковая дэкларацыя (разлік) па афшорным зборы падаецца не пазней за 20-е число месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

4. Афшорны збор аплачваецца плацельшчыкам да пералічэння грашовых сродкаў у беларускіх рублях па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх пералічэння, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага пункта.

У выпадках, указаных у частцы другой пункта 6 гэтага артыкула, афшорны збор выплачваецца плацельшчыкамі не пазней за 22-е число месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім ажыццёўлена:

пацверджанае выпіскай банка пералічэнне грашовых сродкаў з выкарыстаннем афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх пералічэння;

утрыманне (вылік) грашовых сродкаў з даходу плацельшчыка.

5. Пры выкананні абавязацельстваў у неграшовай форме або пераходзе ў адпаведнасці з заканадаўствам маёмасных правоў і (ці) абавязкаў у сувязі з пераменай асоб у абавязацельствах афшорны збор выплачваецца не пазней за дзень, які ідзе следам за днём выканання абавязацельстваў ці перамены асоб у абавязацельствах, у беларускіх рублях па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна

на дату выканання гэтых абавязацельстваў рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, на дату перамены асоб у абавязацельствах.

У выпадку, калі плацельшчык-даўжнік не апавешчаны на дзень перамены асоб у абавязацельствах аб пераходзе да іншай асобы правоў крэдытора, афшорны збор выплачваецца не пазней за дзень, які ідзе следам за днём, калі даўжнік быў пісьмова апавешчаны аб пераходзе правоў, які адбыўся, а пры выкананні абавязацельства да такога паведамлення – не пазней за дзень выканання абавязацельства з улікам афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна на дату паведамлення і дату выканання абавязацельства.

Пры спыненні абавязацельстваў залікам сустрэчных аднародных патрабаванняў або шляхам утрымання (выліку) грашовых сродкаў з даходу плацельшчыка афшорны збор выплачваецца не пазней за дзень, які ідзе следам за днём правядзення адпаведна заліку, утрымання (выліку) з даходу плацельшчыка, з улікам афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату заліку або ўтрымання (выліку).

6. Банкі пераводзяць грашовыя сродкі, пры пералічэнні якіх падлягае аплаце афшорны збор, толькі пасля аплаты рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь афшорнага збору.

Патрабаванні часткі першай гэтага пункта не распаўсюджваюцца на:

пералічэнне грашовых сродкаў на карысць нерэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванага ў афшорнай зоне, ці на рахунак, адкрыты ў афшорнай зоне з выкарыстаннем карпаратыўных банкаўскіх плацежных картак пры службовых камандзіроўках работнікаў плацельшчыка;

пералічэнне грашовых сродкаў у рамках выканаўчага вядзення органамі прымусовага выканання Рэспублікі Беларусь на карысць нерэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванага ў афшорнай зоне, іншай асобе па абавязацельстве перад гэтым нерэзідэнтам ці на рахунак, адкрыты ў афшорнай зоне;

пералічэнне грашовых сродкаў на карысць нерэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванага ў афшорнай зоне, ці на рахунак, адкрыты ў афшорнай зоне, па акрэдытыўных здзелках;

пералічэнне грашовых сродкаў на карысць нерэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зарэгістраванага ў афшорнай зоне, ці на рахунак, адкрыты ў афшорнай зоне шляхам утрымання (выліку) нерэзідэнтам грашовых сродкаў з даходу плацельшчыка.

### Артыкул 268. Уключэнне сум афшорнага збору ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб

Сумы афшорнага збору ўключаюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь – арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь – індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 24
## ГЕРБАВЫ ЗБОР

### Артыкул 269. Плацельшчыкі гербавага збору

Плацельшчыкамі гербавага збору (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы.

### Артыкул 270. Аб'екты абкладання гербавым зборам

1. Аб'ектамі абкладання гербавым зборам прызнаюцца:

передача і атрыманне простых і пераводных вэксаляў, іх копій і экзэмпляраў пераводных вэксаляў у мэтах змянення права ўласнасці ці іншых рэчавых правоў на іх, у тым ліку пры выдачы, індасаванні, аваліраванні простых і пераводных вэксаляў, іх копій і экзэмпляраў пераводных вэксаляў;

прад'яўленне да аплаты складзенага (выдадзенага), індасаванага ці аваліраванага ў Рэспубліцы Беларусь простага ці пераводнага вэксаля, яго копіі і экзэмпляра пераводнага вэксаля, інфармацыя аб якіх не пададзена ў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер».

2. Не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання гербавым зборам передача і атрыманне вэксаляў, прадугледжаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2015 г. № 69 «Аб выкарыстанні вэксаляў» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.02.2015, 1/15635), а таксама іх копій і экзэмпляраў пераводных вэксаляў у мэтах змянення права ўласнасці ці іншых рэчавых правоў на іх, якія ажыццяўляюцца банкамі, юрыдычнымі асобамі, што ажыццяўляюць улік такіх вэксаляў, а таксама юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія атрымалі вэксаль у якасці выканання абавязацельстваў па знешнегандлёвым абароце, што прадугледжвае экспарт, пры ўмове падачы інфармацыі аб такіх здзейсненых аперацыях (у тым ліку аб перадачы такога вэксаля нерэзідэнту ў якасці выканання абавязацельстваў па знешнегандлёвым дагаворы, які прадугледжвае імпарт) у рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер» у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 271. Падатковая база гербавага збору**

Падатковая база гербавага збору вызначаецца як вэксальная сума, у межах якой плацельшчык адказвае па вэксалі, а ў выпадках прад'яўлення да аплаты ўказаных у пункце 2 артыкула 270 гэтага Кодэкса вэксаля, яго копіі і экзэмпляра пераводнага вэксаля – як сума, прад'яўленая да аплаты.

Пры немагчымасці вызначэння вэксальнай сумы, у межах якой плацельшчык адказвае па вэксалі, падатковая база вызначаецца з найбольшай сумы, пазначанай у вэксалі.

**Артыкул 272. Стаўкі гербавага збору**

Стаўкі гербавага збору ўстанаўліваюцца ў памерах:

пятнаццаць (15) працэнтаў – пры перадачы міжнародным арганізацыям, замежным дзяржаўным органам і арганізацыям, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства і атрыманні ад іх простых і пераводных вэксаляў;

дваццаць (20) працэнтаў – пры выдачы копій простых і пераводных вэксаляў, экзэмпляраў пераводных вэксаляў;

дваццаць пяць (25) працэнтаў – у адносінах да складзенага (выдадзенага), індасаванага ці аваліраванага ў Рэспубліцы Беларусь простага ці пераводнага вэксаля, яго копіі і экзэмпляра пераводнага вэксаля, інфармацыя аб якіх не пададзена ў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Рэспубліканскі цэнтральны дэпазітарый каштоўных папер»;

нуль цэлых адна дзясятая (0,1) працэнта – у выпадках, не ўказаных у абзацах другім – чацвёртым гэтага артыкула.

**Артыкул 273. Парадак вылічэння і тэрміны аплаты гербавага збору**

1. Сума гербавага збору вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі гербавага збору.

2. Аплата гербавага збору праводзіцца ў тэрмін не пазней за рабочы дзень, які ідзе следам за днём выдачы, аваліравання ці прад'яўлення да аплаты, передачы і атрымання простых і пераводных вэксаляў, іх копій і экзэмпляраў пераводных вэксаляў.

**Артыкул 274. Уключэнне сум гербавага збору ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы гербавага збору ўключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 25
## КОНСУЛЬСКІ ЗБОР

**Артыкул 275. Плацельшчыкі консульскага збору**

Плацельшчыкамі консульскага збору (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, якія звяртаюцца за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў, уключаючы даванне пэўных правоў ці выдачу асобных дакументаў, у дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – замежустановы), а таксама галоўнае консульскае кіраўніцтва і консульскія пункты Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 276. Аб'екты абкладання консульскім зборам**

Аб'ектамі абкладання консульскім зборам прызнаюцца:

разгляд хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь;

разгляд заяў аб афармленні дакументаў для выезду з Рэспублікі Беларусь і (ці) уезду ў Рэспубліку Беларусь;

пастаноўка на консульскі ўлік;

разгляд заяў па пытаннях грамадзянства Рэспублікі Беларусь, афармлення пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія выехалі з Рэспублікі Беларусь для часовага знаходжання за межамі Рэспублікі Беларусь, афармлення пастаяннага пражывання ў Рэспубліцы Беларусь замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства;

здзяйсненне дзеянняў, звязаных з рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану;

здзяйсненне натарыяльных дзеянняў;

легалізацыя дакументаў;

пастаўленне апастыля;

выпатрабаванне дакументаў;

выдача даведак.

**Артыкул 277. Льготы па консульскім зборы**

1. Вызваляюцца ад консульскага збору:

1.1. уладальнікі замежных дыпламатычных і службовых (афіцыйных) пашпартоў, а таксама іншыя асобы, за якімі Рэспублікай Беларусь прызнаецца дыпламатычны або афіцыйны статус, асобы, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, а таксама асобы,

іх блізкія сваякі і муж (жонка), якія накіроўваюцца ў Рэспубліку Беларусь у сувязі са смерцю ці цяжкай хваробай блізкіх сваякоў, мужа (жонкі), – за разгляд хадайніцтваў аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь;

1.2. асобы, якія дастаўляюць замежную бязвыплатную дапамогу ў выглядзе маёмасці, аказваюць замежную бязвыплатную дапамогу ў выглядзе грашовых сродкаў, кіраўнікі замежных дабрачынных арганізацый, якія прыбываюць у Рэспубліку Беларусь для правядзення перагавораў аб даванні замежнай бязвыплатнай дапамогі, аб арганізацыі аздараўлення дзяцей і аб рэалізацыі іншых гуманітарных праграм, а таксама асобы, якія ажыццяўляюць працы на бязвыплатнай аснове (валанцёры), – за разгляд хадайніцтваў аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь па заяўках Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў;

1.3. замежныя грамадзяне, якія прыбываюць у Рэспубліку Беларусь па пытаннях арганізацыі лячэння дзяцей за межамі Рэспублікі Беларусь, – за разгляд хадайніцтваў аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь па заяўках Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, а таксама Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

1.4. замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, – за разгляд заявы аб выдачы дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь;

1.5. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ці замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якім дадзены статус бежанца, дадатковая абарона ці сховішча ў Рэспубліцы Беларусь, якія дэпартуюцца, выдвараюцца ў Рэспубліку Беларусь ці выдаюцца Рэспубліцы Беларусь, або з'яўляюцца ахвярамі гандлю людзьмі, або не маюць сродкаў для аплаты консульскага збору, або не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, – за выдачу пасведчання на вяртанне;

1.6. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, – за пастаноўку на консульскі ўлік грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, выдачу (абмен) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь, разгляд заявы аб афармленні пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які выехаў з Рэспублікі Беларусь для часовага знаходжання за межамі Рэспублікі Беларусь;

1.7. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія часова знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, – за пастаноўку на консульскі ўлік;

1.8. законныя прадстаўнікі непаўналетніх грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца дзецьмі-сіротамі ці дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, і знаходзяцца ў дамах дзіцяці, сацыяльна-педагагічных установах, школах-інтэрнатах для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дапаможных школах-інтэрнатах, спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах, спецыяльных навучальна-выхаваўчых установах, спецыяльных лячэбна-выхаваўчых установах і іншых установах, якія забяспечваюць умовы для пражывання і ўтрымання дзяцей, установах прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх сем'ях, прыёмных сем'ях, – за засведчанне згоды на выезд непаўналетняга за межы Рэспублікі Беларусь для аздараўлення;

1.9. фізічныя асобы:

1.9.1. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на маёмасць асоб, якія загінулі пры ажыццяўленні службовай дзейнасці, выкананні службовых абавязкаў ці выкананні

працы, іншых дзяржаўных ці грамадскіх абавязкаў або пры выкананні доўгу грамадзяніна па выратаванні чалавечага жыцця, ахове дзяржаўнай уласнасці і правапарадку;

1.9.2. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на жылы дом, кватэру ці пай (узнос) у жыллёва-будаўнічым кааператыве ці іншай арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў, калі яны пастаянна пражывалі на дзень смерці спадчынадаўца і працягваюць пражываць у гэтым доме, кватэры пасля смерці спадчынадаўца або з'яўляюцца непаўналетнімі дзецьмі спадчынадаўца ці асобамі з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

1.9.3. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на ўклады (дэпазіты), грашовыя сродкі, якія захоўваюцца на банкаўскіх рахунках у банках, сумы страхавых выплат па дагаворах асабістага і маёмаснага страхавання, аблігацыі дзяржаўных пазык, сумы заработнай платы, недаатрыманыя пенсіі, сумы аўтарскай узнагароды і ўзнагароды за стварэнне і выкарыстанне аб'ектаў права прамысловай уласнасці і рацыяналізатарскіх прапаноў;

1.9.4. за засведчанне дагавораў дарэння (ахвяравання) маёмасці на карысць дзяржавы;

1.9.5. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё»;

1.9.6. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на сумы страхавога пакрыцця па абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці перавозчыка перад пасажырамі;

1.9.7. за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на жылыя дамы, якія знаходзяцца ў сельскім населеным пункце, а таксама ў гарадах раённага падпарадкавання ці пасёлках гарадскога тыпу (для спадчыннікаў па законе першай чаргі), калі яны перасяляюцца ў гэтыя дамы на пастаяннае жыхарства;

1.9.8. за здзяйсненне выканаўчых надпісаў аб спагнанні налічанай, але не выплачанай ім заработнай платы;

1.10. фізічныя асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі з прычыны душэўнай хваробы ці прыдуркаватасці, над якімі ўстаноўлена апека ў адпаведнасці з заканадаўствам, – за выдачу пасведчанняў аб праве на спадчыну на маёмасць;

1.11. Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаныя медалём «За абарону Ленінграда», асобы, узнагароджаныя знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда», грамадзяне, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, інваліды, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь калецтва ці захворвання, што прывялі да інваліднасці, з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, іншымі радыяцыйнымі аварыямі, а таксама грамадзяне, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў):

1.11.1. за засведчанне ўсіх відаў аднабаковых здзелак;

1.11.2. за засведчанне факта знаходжання грамадзяніна ў жывых;

1.12. члены сямей ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія загінулі ці памерлі з прычыны раненняў, кантузій, калецтваў, захворванняў, атрыманых у перыяд баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) пры выкананні воінскага ці службовага доўгу ў Афганістане або ў іншых дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні (а таксама прапаўшых без вестак у раёнах вядзення баявых дзеянняў), ці пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў), акрамя выпадкаў, калі гібель (смерць) надышла ў выніку проціпраўных дзеянняў, па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення, членашкодніцтва ці самагубства, калі яно не было выклікана хваравітым станам ці давядзеннем да самагубства, – за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну на маёмасць зніклых без вестак асоб;

1.13. спадчыннікі асоб, якія былі застрахаваны ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, – за выдачу пасведчання аб праве на спадчыну на сумы страхавога забеспячэння;

1.14. спадчыннікі ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія прапалі без вестак у перыяд баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ваеннаслужачых, якія прапалі без вестак у раёнах вядзення баявых дзеянняў у Афганістане або іншых дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні, – за выдачу пасведчання аб праве на спадчыну на маёмасць прапаўшых без вестак асоб;

1.15. непаўналетнія грамадзяне, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, інваліды I і II групы – за выдачу ім пасведчанняў аб праве на спадчыну.

2. Наяўнасць падстаў для прымянення льгот па консульскім зборы вызначаецца на момант звароту плацельшчыка ў замежустанову за выкананнем юрыдычна значных дзеянняў, уключаючы даванне пэўных правоў ці выдачу асобных дакументаў.

3. Вызваленне грамадзян Рэспублікі Беларусь ад консульскага збору за выкананне дзеянняў, звязаных з рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану, ажыццяўляецца ў выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для вызвалення ад дзяржаўнай пошліны за выкананне аналагічных дзеянняў.

4. Вызваляюцца ад консульскага збору плацельшчыкі за паўторнае выкананне юрыдычна значных дзеянняў, якія з'яўляюцца аб'ектамі абкладання консульскім зборам, у сувязі з допушчанымі пры іх выкананні памылкамі (у тым ліку недакладнасцямі ў выдадзеных, засведчаных, абмененых дакументах (іх дублікатах) ці непаўнатой звестак у іх) па віне замежустановы, галоўнага консульскага кіраўніцтва, консульскага пункта Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый, міжведамасных і іншых камісій, да кампетэнцыі якіх адносіцца выкананне такіх юрыдычна значных дзеянняў.

**Артыкул 278. Стаўкі консульскага збору**

1. Стаўкі консульскага збору ўстанаўліваюцца згодна з дадаткам 12 да гэтага Кодэкса.

2. За разгляд замежустановамі хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь у тэрміновым парадку (на працягу двух рабочых дзён), за выкананне імі іншых консульскіх дзеянняў па-за службовымі памяшканнямі ў дзень, які прызнаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь выхадным днём і (ці) нерабочым дзяржаўным святам (нерабочым святочным днём), прымяняюцца стаўкі консульскага збору, павялічаныя на сто (100) працэнтаў (за выключэннем выдачы пасведчанняў на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь).

3. За разгляд галоўным консульскім кіраўніцтвам і консульскімі пунктамі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь хадайніцтваў аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, у дзяржавах грамадзянскай

прыналежнасці ці звычайнага месца жыхарства якіх адсутнічаюць замежустановы, прымяняюцца стаўкі консульскага збору, павялічаныя на пяцьдзясят (50) працэнтаў.

4. За разгляд галоўным консульскім кіраўніцтвам і консульскімі пунктамі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь хадайніцтваў аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, у дзяржавах грамадзянскай прыналежнасці ці звычайнага месца жыхарства якіх ёсць замежустановы, прымяняюцца стаўкі консульскага збору, павялічаныя на дзвесце (200) працэнтаў.

5. З улікам інтарэсу Рэспублікі Беларусь і на падставе прынцыпу ўзаемнасці ў адносінах з замежнымі дзяржавамі па асобных консульскіх дзеяннях рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па прапановах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь могуць устанаўлівацца стаўкі консульскага збору, адрознага ад прадугледжанага пунктам 1 гэтага артыкула.

6. За здзяйсненне ўсіх відаў натарыяльных дзеянняў прымяняюцца стаўкі консульскага збору ў памеры пяцьдзясят (50) працэнтаў ад устаноўленай стаўкі пры звароце за іх здзяйсненнем грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца пенсіянерамі (па прад'яўленні пацвярджальных дакументаў, выдадзеных кампетэнтнымі органамі Рэспублікі Беларусь), інвалідамі, а таксама законных прадстаўнікоў асоб, прызнаных ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі, якія дзейнічаюць ад іх імя і ў іх інтарэсах (за выключэннем натарыяльных дзеянняў, за здзяйсненне якіх прадугледжана іх поўнае вызваленне ад консульскага збору).

**Артыкул 279. Тэрміны і парадак аплаты консульскага збору**

1. Консульскі збор аплачваецца да здзяйснення консульскага дзеяння па стаўках, устаноўленых на момант звароту ў замежустанову, галоўнае консульскае кіраўніцтва ці консульскі пункт Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь:

1.1. за разгляд хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь і здзяйсненне іншых консульскіх дзеянняў у замежустановах – у еўра, доларах ЗША або валюце дзяржавы знаходжання замежустановы:

па афіцыйным курсе, устаноўленым нацыянальным (цэнтральным) банкам дзяржавы знаходжання замежустановы або іншым дзяржаўным органам (арганізацыяй), упаўнаважаным у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання замежустановы ўстанаўліваць афіцыйныя курсы валют, на дзень аплаты;

па курсе банка, у якім абслугоўваюцца рахункі замежустановы, на дзень аплаты – у выпадку, калі нацыянальны (цэнтральны) банк або іншы дзяржаўны орган (арганізацыя), упаўнаважаны ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання замежустановы ўстанаўліваць афіцыйныя курсы валют, у дзяржаве знаходжання замежустановы адсутнічае або не ўстанаўлівае курсы валют і (ці) не ажыццяўляе іх публікацыю;

па апошнім апублікаваным курсе валюты – у выпадку, калі афіцыйны курс валюты, устаноўлены нацыянальным (цэнтральным) банкам дзяржавы знаходжання замежустановы або іншым дзяржаўным органам (арганізацыяй), упаўнаважаным у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання замежустановы ўстанаўліваць афіцыйныя курсы валют, або курс валюты банка, у якім абслугоўваюцца рахункі замежустановы, на дзень аплаты не апублікаваны;

1.2. за разгляд хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь у галоўным консульскім кіраўніцтве і консульскіх пунктах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь – у еўра або доларах ЗША ў суме, вызначанай з выкарыстаннем крос-курсу, разлічанага на аснове афіцыйных курсаў беларускага рубля ў адносінах да адпаведных замежных валют, устаноўленых Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень аплаты;

1.3. за здзяйсненне іншых дзеянняў, якія прызнаюцца аб'ектамі абкладання консульскім зборам, у галоўным консульскім кіраўніцтве і консульскіх пунктах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь – у беларускіх рублях.

2. Пры пераліку ставак консульскага збору з еўра ў долары ЗША ці іншую валюту дзяржавы знаходжання замежустановы сума консульскага збору вызначаецца ў цэлых адзінках з акругленнем апошняй значнай лічбы да нуля (0) ці пяці (5) у бок павелічэння.

3. Неаплата консульскага збору з'яўляецца падставай для адмовы ў здзяйсненні дзеянняў, якія прызнаюцца аб'ектамі абкладання консульскім зборам.

**Артыкул 280. Асаблівасці аплаты консульскага збору за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў**

За здзяйсненне натарыяльных дзеянняў консульскі збор аплачваецца з улікам наступных асаблівасцей:

пры выдачы некальнім спадчыннікам аднаго пасведчання аб праве на спадчыну з указаннем у ім долі кожнага консульскі збор аплачваецца як за выдачу аднаго дакумента і размяркоўваецца паміж спадчыннікамі ў роўных долях. Пры гэтым для вылічэння консульскага збору прымяняюцца:

стаўка консульскага збору ў залежнасці ад чарговасці заклікання да наследавання, калі спадчыннікі адносяцца да адной чаргі наследавання;

найбольшая стаўка консульскага збору ў залежнасці ад чарговасці заклікання да наследавання, калі спадчыннікі адносяцца да розных чэргаў наследавання;

пры прыняцці ў дэпазіт грашовых сум і каштоўных папер консульскі збор аплачваецца ў адзінарным памеры за аднаразовае пералічэнне грашовых сум і каштоўных папер. Прыём у дэпазіт грашовых сум і каштоўных папер адбываецца пасля аплаты консульскага збору. У выпадку неаплаты консульскага збору неабходна паведаміць адпраўніку, што дакумент, які пацвярджае аплату консульскага збору, павінен быць пададзены на працягу месяца з дня паступлення грашовых сум і каштоўных папер на рахунак замежустановы, у іншым выпадку грашовыя сумы і каштоўныя паперы падлягаюць вяртанню.

**Артыкул 281. Асаблівасці вяртання, заліку консульскага збору**

1. Аплачаны консульскі збор падлягае вяртанню часткова ці поўнасцю ў выпадках, калі:

1.1. консульскі збор унесены ў большым памеры, чым патрабуецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

1.2. асоба, якая аплаціла консульскі збор, вызвалена ад консульскага збору або адмаўляецца ад здзяйснення дзеяння, якое прызнаецца аб'ектам абкладання консульскім зборам, да звароту ў замежустанову, галоўнае консульскае кіраўніцтва ці консульскія пункты Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь або да здзяйснення такога дзеяння;

1.3. акты грамадзянскага стану, натарыяльна засведчаныя дагаворы, пасведчанні аб праве на спадчыну і іншыя дакументы, у адносінах да якіх былі здзейснены дзеянні, што з'яўляюцца аб'ектамі абкладання консульскім зборам, прызнаны судом несапраўднымі;

1.4. консульскі збор аплачаны памылкова.

2. Вяртанне консульскага збору праводзіцца замежустановай, на рахунак якой паступіў консульскі збор, па пісьмовай заяве плацельшчыка ў той жа валюце, у якой была ажыццёўлена яго аплата, на працягу аднаго месяца з дня падачы такой заявы і пры адсутнасці ў плацельшчыка нявыкананых абавязацельстваў па аплаце консульскага збору.

Вяртанне консульскага збору, які паступіў у рэспубліканскі бюджэт на рахунак, адкрыты для залічэння плацяжоў, праводзіцца падатковым органам па пісьмовай заяве

плацельшчыка ў той жа валюце, у якой была ажыццёўлена яго аплата, на працягу аднаго месяца з дня падачы такой заявы і пры адсутнасці ў плацельшчыка нявыкананых абавязацельстваў па аплаце консульскага збору.

3. Залішне аплачаная сума консульскага збору па пісьмовай заяве плацельшчыка можа быць накіравана ў кошт аплаты іншых (наступных) дзеянняў, якія прызнаюцца аб'ектамі абкладання консульскім зборам.

**Артыкул 282. Уключэнне сум консульскага збору ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы консульскага збору ўключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі — у расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 26
## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПОШЛІНА

**Артыкул 283. Плацельшчыкі дзяржаўнай пошліны**

Плацельшчыкамі дзяржаўнай пошліны прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, якія:

звяртаюцца за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў, уключаючы даванне пэўных правоў ці выдачу асобных дакументаў (далей у гэтай главе – юрыдычна значныя дзеянні), у спецыяльна ўпаўнаважаныя на тое дзяржаўныя органы, іншыя ўпаўнаважаныя арганізацыі, да службовых асоб (далей у гэтай главе – органы, якія спаганяюць дзяржаўную пошліну);

выступаюць адказчыкамі (даўжнікамі) у судах, калі пры гэтым судовая пастанова вынесена не на іх карысць, а ісцец (спагнаннік) вызвалены ад дзяржаўнай пошліны ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 284. Аб'екты абкладання дзяржаўнай пошлінай**

1. Аб'ектамі абкладання дзяржаўнай пошлінай, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 2 гэтага артыкула, прызнаюцца:

1.1. разгляд судамі:

іскавых і іншых заяў, скаргаў;

апеляцыйных і касацыйных скаргаў;

наглядных скаргаў і скаргаў у парадку нагляду (далей – наглядныя скаргі);

скаргаў на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях;

хадайніцтваў аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, іншага пастаяннага арбітражнага органа, хадайніцтваў аб забеспячэнні іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом (далей – хадайніцтва);

1.2. выдача судамі дублікатаў, копій дакументаў;

1.3. разгляд судовай калегіяй па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь іскавых заяў і скаргаў, выдача гэтай калегіяй копій дакументаў;

1.4. разгляд органамі пракуратуры наглядных скаргаў на судовыя пастановы, скаргаў на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, выдача органамі пракуратуры копій дакументаў;

1.5. натарыяльныя і іншыя дзеянні, якія здзяйсняюцца ўпаўнаважанай службовай асобай мясцовага выканаўчага і распарадчага органа;

1.6. засведчанне рэгістратарамі рэспубліканскай і тэрытарыяльных арганізацый па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй дакументаў, якія з'яўляюцца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі з нерухомай маёмасцю, выдача гэтымі рэгістратарамі дублікатаў засведчаных дакументаў;

1.7. здзяйсненне дзеянняў, звязаных з рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану;

1.8. выдача (абмен), засведчанне дакументаў, неабходных для выезду з Рэспублікі Беларусь і (ці) уезду ў Рэспубліку Беларусь, выдача (абмен) ці прадаўжэнне тэрміну дзеяння дакументаў, звязаных са знаходжаннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь, разгляд пытанняў, звязаных з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь;

1.9. дзяржаўная рэгістрацыя камерцыйных і некамерцыйных арганізацый (за выключэннем указаных у падпунктах 1.11–1.14 гэтага пункта), змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у іх статуты (устаноўчы дагавор – для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора), выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.10. дзяржаўная рэгістрацыя індывідуальнага прадпрымальніка, змяненняў, унесеных у пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.11. дзяржаўная рэгістрацыя калегіі адвакатаў, адвакацкага бюро, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у іх статуты, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.12. дзяржаўная рэгістрацыя палітычнай партыі, прафесійнага саюза, іншага грамадскага аб'яднання, за выключэннем указанага ў падпункце 1.13 гэтага пункта, іх саюзаў (асацыяцый), іх сімволікі, пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, пастаянна дзейнага трацейскага суда, арганізацыі, якая забяспечвае правядзенне медыяцыі, створанай у якасці некамерцыйнай арганізацыі, Палаты падатковых кансультантаў, Беларускай натарыяльнай палаты, фонду, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у іх статуты, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі, выдача дубліката статута з адзнакамі аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі, прафесійнага саюза, іншага грамадскага аб'яднання, іх саюзаў (асацыяцый), пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці некамерцыйнай арганізацыі, Беларускай натарыяльнай палаты, фонду;

1.13. дзяржаўная рэгістрацыя рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання, яго сімволікі, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.14. дзяржаўная рэгістрацыя, пастаноўка на ўлік арганізацыйнай структуры палітычнай партыі, прафесійнага саюза, рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання, іншага грамадскага аб'яднання, пастаноўка на ўлік арганізацыі, якая забяспечвае правядзенне медыяцыі, створанай у якасці адасобленага падраздзялення юрыдычнай асобы;

1.15. пастаноўка на ўлік пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці адасобленага падраздзялення (падраздзялення) юрыдычнай асобы, а таксама выдача дубліката пасведчання аб пастаноўцы на ўлік;

1.16. выдача пасведчання кіраўніка некамерцыйнай арганізацыі;

1.17. дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) сродку масавай інфармацыі, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.18. дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) выдаўца, вырабляльніка і распаўсюджвальніка друкаваных выданняў, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.19. дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тытунёвых вырабаў, алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.20. дзяржаўная рэгістрацыя (пацвярджэнне дзяржаўнай рэгістрацыі) лекавага сродку, біямедыцынскага клетачнага прадукту, дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) медыцынскага вырабу, дзяржаўная рэгістрацыя фармацэўтычнай субстанцыі, ветэрынарнага прэпарата, прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыйнага пасведчання ветэрынарнага прэпарата;

1.21. дзяржаўная рэгістрацыя выпуску (дадатковага выпуску) эмісійных каштоўных папер, унясенне змяненняў у Дзяржаўны рэестр каштоўных папер, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

1.22. дзяржаўная рэгістрацыя марскога судна, судна змешанага (рака – мора) плавання, судна ўнутранага плавання, дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, ці на долю ў ім, дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, у тым ліку іпатэкі, якія падлягаюць унясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь ці суднавую кнігу, выдача дубліката дакумента, які пацвярджае факт дзяржаўнай рэгістрацыі судна;

1.23. дзяржаўная рэгістрацыя і класіфікацыя маламернага судна, дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, якія падлягаюць унясенню ў суднавую кнігу для маламернага судна, выдача (абмен) пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам, магутнасць рухавіка якога перавышае 3,7 кВт (пяць конскіх сіл), міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам, выдача дубліката такога пасведчання, а таксама дубліката суднавага білета;

1.24. дзяржаўная рэгістрацыя грамадзянскага паветранага судна, аэрадрома грамадзянскай авіяцыі, сертыфікацыя ў грамадзянскай авіяцыі;

1.25. дзяржаўная рэгістрацыя эксперыментальнага паветранага судна, аэрадрома эксперыментальнай авіяцыі, сертыфікацыя ў эксперыментальнай авіяцыі;

1.26. юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй і ўлікам транспартных сродкаў (за выключэннем указаных у падпункце 1.28 гэтага пункта), выдача дакументаў (дублікатаў) у адносінах да такіх транспартных сродкаў;

1.27. выдача вадзіцельскага пасведчання на права кіравання механічным транспартным сродкам адпаведнай катэгорыі, падкатэгорыі (далей – вадзіцельскае пасведчанне), яго дубліката, абмен вадзіцельскага пасведчання, а таксама вадзіцельскага пасведчання ўзору Міністэрства ўнутраных спраў СССР, часовага дазволу на права кіравання механічным транспартным сродкам;

1.28. юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй і ўлікам колавых трактароў, прычэпаў да іх, самаходных машын, выдача (абмен) дакументаў (дублікатаў) у адносінах да такіх транспартных сродкаў, унясенне змяненняў у такія дакументы;

1.29. выдача пасведчання трактарыста-машыніста адпаведнай катэгорыі з талонам да яго (далей – пасведчанне трактарыста-машыніста), абмен пасведчання трактарыста-машыніста, а таксама пасведчання трактарыста-машыніста (з катэгорыямі), выдадзенага на тэрыторыі рэспублік былога СССР, выдача іх дублікатаў, выдача новага талона да пасведчання трактарыста-машыніста, часовага дазволу на права кіравання колавым

трактарам, самаходнай машынай, тэхнічнага талона на колавы трактар, прычэп да яго, самаходную машыну юрыдычнай асобы і індывідуальнага прадпрымальніка;

1.30. прыём кваліфікацыйных экзаменаў на права кіравання механічным транспартным сродкам, колавым трактарам, самаходнай машынай;

1.31. правядзенне дзяржаўнага тэхнічнага агляду колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны і тэхнічнай экспертызы самаробнага трактара, малагабарытнага трактара, мотаблока, прычэпа да іх;

1.32. узгадненне маршруту перавозкі небяспечных грузаў;

1.33. рэгістрацыя ў якасці рэзідэнта свабоднай эканамічнай зоны;

1.34. выдача дазволу на адкрыццё прадстаўніцтва замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь, прадаўжэнне тэрміну дзеяння такога дазволу;

1.35. выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці (у тым ліку звязанай са спецыфічнымі таварамі (працамі, паслугамі)), унясенне ў яго змяненняў і (ці) дапаўненняў, выдача яго (яго) дубліката, прадаўжэнне тэрміну дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), які выдаецца на ажыццяўленне відаў дзейнасці, звязаных са спецыфічнымі таварамі (працамі, паслугамі);

1.36. выдача пасведчання на права ажыццяўлення знешнегандлёвай дзейнасці ў адносінах да спецыфічных тавараў (прац, паслуг), яго пераафармленне;

1.37. выдача разавых і генеральных ліцэнзій на ўвоз (імпарт) прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вываз (экспарт) спецыфічных тавараў (прац, паслуг);

1.38. выдача разавых ліцэнзій на рэімпарт, увоз на перапрацоўку, часовы ўвоз прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, на рээкспарт, вываз на перапрацоўку, часовы вываз, у тым ліку ў выпадку здачы ў арэнду, спецыфічных тавараў (прац, паслуг), унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у ліцэнзію, выдача дубліката ліцэнзіі, выдача імпартнага сертыфіката і яго дубліката, а таксама ліцэнзіі на аказанне пасрэдніцкіх паслуг юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, звязаных з перамяшчэннем спецыфічных тавараў з адной замежнай дзяржавы ў іншую;

1.39. выдача ліцэнзіі на ўвоз (вываз) хімікатаў, якія падпадаюць пад рэжым кантролю ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб забароне распрацоўкі, вытворчасці, назапашвання і прымянення хімічнай зброі і аб яго знішчэнні ад 13 студзеня 1993 года, унясенне ў яе змяненняў і (ці) дапаўненняў, прадаўжэнне тэрміну яе дзеяння, выдача яе дубліката;

1.40. выдача (афармленне) ліцэнзіі на экспарт і (ці) імпарт тавараў, выдача яе дубліката;

1.41. выдача заключэнняў (дазвольных дакументаў) на ўвоз і (ці) вываз небяспечных адходаў;

1.42. выдача заключэння (дазвольнага дакумента) на вываз культурных каштоўнасцей ці пісьмовага паведамлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб тым, што заключэнне (дазвольны дакумент) на вываз адпаведных культурных каштоўнасцей не патрабуецца;

1.43. выдача дазволаў на набыццё, захоўванне ці захоўванне і нашэнне зброі, сертыфікатаў адпаведнасці зброі і боепрыпасаў, прадаўжэнне тэрміну іх дзеяння;

1.44. уключэнне звестак аб службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасах у Дзяржаўны кадастр службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасаў;

1.45. выдача заключэння (дазвольнага дакумента) на часовы ўвоз і часовы вываз паляўнічай зброі і боепрыпасаў да яго замежнымі грамадзянамі для ўдзелу ў паляванні;

1.46. выдача пропускаў на права ўезду (уваходу), часовага знаходжання, перамяшчэння ў пагранічнай зоне замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, выдача пропускаў на права ўезду

(уваходу), часовага знаходжання, перамяшчэння ў пагранічнай паласе, выдача пропускаў на права пазачарговага ўезду на тэрыторыю аўтадарожных пунктаў пропуску праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь;

1.47. выдача (афармленне) дакументаў, якія сведчаць права карыстання, права арэнды, права пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання зямельным участкам, права прыватнай уласнасці на зямельны ўчастак;

1.48. выдача сертыфіката імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць», пераафармленне імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», «Маёмасць»;

1.49. даванне права на паляванне;

1.50. даванне інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь ці суднавай кнізе, рэестры спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), Дзяржаўным рэестры грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры палітычных партый, саюзаў (асацыяцый) палітычных партый, рэестрах мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры прафесійных саюзаў, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў, рэестрах тэрытарыяльных прафесійных саюзаў, прафесійных саюзаў арганізацый, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў;

1.51. даванне персанальных даных фізічных асоб, у тым ліку абязлічаных, з рэгістра насельніцтва;

1.52. выдзяленне рэсурсу нумарацыі, узгадненне перадачы рэсурсу нумарацыі;

1.53. пастаўленне апастыля на афіцыйным дакуменце, складзеным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.54. рэгістрацыя па месцы жыхарства ці месцы знаходжання грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

1.55. узгадненне правілаў страхавання па добраахвотных відах страхавання, а таксама змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў іх;

1.56. дзяржаўная рэгістрацыя рэкламнай гульні;

1.57. выдача пасведчання аб рэгістрацыі электроннай інтэрактыўнай гульні, яго дубліката;

1.58. выдача пасведчання аб рэгістрацыі латарэі, выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі латарэі;

1.59. выдача пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.60. выдача пасведчання на ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці, унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у яго, выдача яго дубліката;

1.61. выдача сертыфіката прафесійнага бухгалтара, сертыфіката прафесійнага бухгалтара банка, унясенне ў іх змяненняў і (ці) дапаўненняў, выдача іх дублікатаў;

1.62. выдача кваліфікацыйнага атэстата аўдытара, унясенне ў яго змяненняў і (ці) дапаўненняў, выдача яго дубліката;

1.63. выдача пасведчання аб атэстацыі ацэншчыка, унясенне ў яго змяненняў і (ці) дапаўненняў, прадаўжэнне тэрміну дзеяння пасведчання аб атэстацыі ацэншчыка, выдача яго дубліката;

1.64. атэстацыя з выдачай пасведчання эксперта ў галіне прамысловай бяспекі;

1.65. атэстацыя спецыялістаў рынку каштоўных папер, а таксама часовага (антыкрызіснага) кіраўніка (далей – атэстацыя спецыялістаў), пераатэстацыя спецыялістаў (паўторнае праходжанне атэстацыі), унясенне змяненняў у атэстацыйны дакумент і прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння, выдача дубліката атэстацыйнага дакумента;

1.66. прыём кваліфікацыйнага экзамену ў фізічных асоб, якія прэтэндуюць на атрыманне кваліфікацыйнага атэстата падатковага кансультанта;

1.67. разгляд заявы аб заключэнні пагаднення аб цэнаўтварэнні для мэт падаткаабкладання;

1.68. выдача дазволу на праезд аўтамабільных транспартных сродкаў Рэспублікі Беларусь па тэрыторыях замежных дзяржаў;

1.69. выдача дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху;

1.70. даванне органам прымусовага выканання звестак аб выканаўчых вядзеннях, распачатых у адносінах да даўжнікоў, выдача, у тым ліку паўторная, органамі прымусовага выканання копій дакументаў, якія знаходзяцца ў выканаўчым вядзенні;

1.71. выдача дазволаў на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, захоўванне і пахаванне адходаў вытворчасці, спецыяльнае водакарыстанне, комплекснага прыродаахоўнага дазволу;

1.72. унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на спецыяльнае водакарыстанне, комплексны прыродаахоўны дазвол, прадаўжэнне тэрміну іх дзеяння, выдача дублікатаў такіх дазволаў, унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на захоўванне і пахаванне адходаў вытворчасці, выдача дубліката такога дазволу, унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння.

2. Аб'ектамі абкладання дзяржаўнай пошлінай не прызнаюцца:

2.1. выдача дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь, а таксама галоўным консульскім кіраўніцтвам і консульскімі пунктамі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дакументаў і здзяйсненне імі юрыдычна значных дзеянняў, за якія ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам збіраецца консульскі збор;

2.2. разгляд іскавых заяў аб ліквідацыі арганізацый (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка), прызнанні несапраўднай дзяржаўнай рэгістрацыі створанай арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), а таксама апеляцыйных, касацыйных і наглядных скаргаў па такіх справах.

**Артыкул 285. Льготы па дзяржаўнай пошліне**

1. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны пры звароце ў суд:

1.1. істцы (спагнаннікі, заяўнікі) за разгляд:

1.1.1. іскавых заяў аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў;

1.1.2. іскавых заяў, заяў аб распачынанні загаднага вядзення аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.3. іскавых заяў аб дазволе выезду з Рэспублікі Беларусь непаўналетняга грамадзяніна Рэспублікі Беларусь без згоды іншага законнага прадстаўніка;

1.1.4. іскавых заяў аб пакрыцці маёмаснай шкоды (кампенсацыі маральнай шкоды), прычыненай жыццю ці здароўю фізічнай асобы, у тым ліку іскавых заяў аб пакрыцці (кампенсацыі) шкоды ў выніку смерці карміцеля, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.5. іскавых заяў, у тым ліку пададзеных у крымінальным працэсе, аб пакрыцці маёмаснай шкоды (кампенсацыі маральнай шкоды), прычыненай злачынствам ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане несвядомасці, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.6. іскавых заяў аб пакрыцці ўрону, прычыненага пры афармленні дакументаў для прызначэння і пераразліку пенсій;

1.1.7. іскавых заяў аб спагнанні сум у пакрыццё шкоды, страт, прычыненых правапарушэннямі лясной, паляўнічай гаспадаркам, якія фінансуюцца за кошт

рэспубліканскага бюджэту, а таксама няўстоек (штрафаў, пеняў) за парушэнне заканадаўства аб выкарыстанні, ахове, абароне і ўзнаўленні лясоў;

1.1.8. іскавых заяў да падатковых, мытных, фінансавых органаў, Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і яго органаў аб спагнанні на іх карысць сум з бюджэту, а таксама апеляцыйных, касацыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.9. іскавых заяў аб парушэнні іх правоў, прадугледжаных заканадаўствам аб абароне правоў спажыўцоў, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.10. іскавых заяў аб пакрыцці ў бюджэт сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі, спецыяліста, рабочага, служачага;

1.1.11. іскавых заяў, заяў і скаргаў у сувязі з заключэннем, выкананнем ці спыненнем дагавораў стварэння аб'ектаў долевага жыллёвага будаўніцтва, дагавораў будаўніцтва жылых памяшканняў у складзе арганізацый забудоўшчыкаў, дагавораў (пагадненняў), якія прадугледжваюць абавязацельства забудоўшчыка, што з'яўляецца эмітэнтам жыллёвых аблігацый, па будаўніцтве жылых памяшканняў уладальнікам жыллёвых аблігацый ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, а таксама апеляцыйных, касацыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.1.12. заяў аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным ці недзеяздольным;

1.1.13. заяў у абарону правоў і законных інтарэсаў іншых асоб у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам;

1.1.14. заяў аб прызнанні несапраўднай дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты юрыдычных асоб (устаноўчыя дагаворы – для камерцыйных арганізацый, якія дзейнічаюць толькі на падставе ўстаноўчых дагавораў), і змяненняў, унесеных у пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў;

1.2. істцы (рэабілітаваныя фізічныя асобы, члены іх сямей, якія адносяцца да кола асоб, што забяспечваюцца пенсіяй з прычыны страты карміцеля, і спадчыннікі па законе першай чаргі) за разгляд іскавых заяў аб аднаўленні ў правах і пакрыцці шкоды;

1.3. фізічныя асобы за разгляд:

1.3.1. іскавых заяў, якія падаюцца для ўстанаўлення права на наследаванне жылога дома, кватэры (іх частак) ці паю (узносу) у жыллёва-будаўнічым кааператыве ці іншай арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў, калі яны пражывалі на дзень смерці спадчынадаўца і працягваюць пражываць у гэтым доме (кватэры) пасля яго смерці;

1.3.2. заяў аб выяўленні факта атрымання заработнай платы за канкрэтны перыяд у пэўным памеры;

1.3.3. скаргаў аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе зняволення пад варту, хатняга арышту, а таксама аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту;

1.3.4. апеляцыйных скаргаў па справах аб скасаванні шлюбу, акрамя раздзелу маёмасці;

1.4. фізічныя асобы, якія выконваюць працу па грамадзянска-прававых дагаворах, за разгляд іскавых заяў аб спагнанні платы за выкананую працу, аказаную паслугу, створаны аб'ект інтэлектуальнай уласнасці;

1.5. удзельнікі і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў за разгляд іскавых заяў немаёмаснага характару, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.6. бацькі, абавязаныя кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей, за разгляд іскавых заяў аб аднаўленні іх у бацькоўскіх правах;

1.7. адвакаты, незалежна ад арганізацыйнай формы ажыццяўлення імі адвакацкай дзейнасці, за разгляд пададзеных імі ад свайго імя апеляцыйных і наглядных скаргаў па

крымінальных справах, за выдачу судом копій прыгавораў, прысудаў і пастаноў па крымінальных справах;

1.8. арганізацыі і фізічныя асобы за разгляд:

1.8.1. скаргаў на дзеянні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, а таксама на рашэнне органаў, якія ўтварылі адпаведную камісію, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

1.8.2. скаргі на пастанову аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні, вынесеную пасля заканчэння падрыхтоўкі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні да разгляду;

1.8.3. скаргі на судовую пастанову аб спыненні вядзення па грамадзянскай справе (за выключэннем выпадкаў спынення вядзення па справе ў сувязі з зацвярджэннем міравога пагаднення) ці пакіданні іскавай заявы (заявы, скаргі) па грамадзянскай справе без разгляду, а таксама прыватнай скаргі на прысуд суда;

1.8.4. заявы аб пераглядзе (аднаўленні) справы з-за акалічнасцей, якія адкрыліся нанава;

1.9. арганізацыі і фізічныя асобы за выдачу копій дакументаў, якія знаходзяцца ў разгледжанай па сутнасці справе аб спагнанні аліментаў і справе аб спагнанні расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

1.10. спагнальнікі расходаў на ўтрыманне дзяцей за разгляд іскавых заяў аб прызнанні бацькоў, абавязаных кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей, памерлымі ці адсутнымі без вестак, аб змяншэнні памеру расходаў на ўтрыманне дзяцей, якія падлягаюць спагнанню з бацькоў, абавязаных кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей, або аб вызваленні такіх бацькоў ад аплаты запазычанасці па ўказаных расходах;

1.11. лячэбна-працоўныя прафілакторыі за разгляд заяў аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, іскавых заяў аб спагнанні з грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, расходаў на яго ўтрыманне, вышук, пакрыццё прычыненага ім урону і іншых затрат, якія падлягаюць пакрыццю гэтай катэгорыяй асоб, а таксама апеляцыйныя і наглядныя скаргі па такіх справах;

1.12. дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя за разгляд заяў аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні асобы, якая мае захворванні, што ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, а таксама апеляцыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.13. газазабяспечвальныя арганізацыі і арганізацыі тарфяной прамысловасці, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз», энергазабяспечвальныя арганізацыі, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» за разгляд:

1.13.1. іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці за пастаўленыя газ, паліўныя брыкеты, цеплавую і электрычную энергію, а таксама няўстойкі (штрафу, пені) і працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі, звязаных з такой запазычанасцю ці з парушэннем правілаў карыстання энергіяй;

1.13.2. заяў аб распачынанні загаднага вядзення аб спагнанні запазычанасці, якая ўтварылася ў сувязі з утрыманнем памяшканняў, што выкарыстоўваюцца арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, за пастаўленыя ім газ, цеплавую энергію праз далучаную сетку (ацяпленне), электраэнергію па дагаворы энергазабеспячэння, а таксама

няўстойкі (штрафу, пені) і працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі, звязаных з такой запазычанасцю;

1.14. адкрытае акцыянернае таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь» за разгляд іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці, страт і штрафных санкцый з арганізацый, што ўдзельнічаюць у разліках за імпартаваны ў Рэспубліку Беларусь прыродны газ, якія ажыццяўляюцца адкрытым акцыянерным таварыствам «Газпрам трансгаз Беларусь», аб спагнанні запазычанасці, страт і няўстойкі (штрафу, пені) з арганізацый за пастаўлены ім прыродны газ, а таксама іскавых заяў, звязаных з нясвоечасовым пералічэннем банкамі свабодна канверсоўнай валюты і расійскіх рублёў для разлікаў за імпартаваны ў Рэспубліку Беларусь прыродны газ, а таксама апеляцыйных, касацыйных і наглядных скаргаў па такіх справах;

1.15. арганізацыі, якія даюць у доўгатэрміновую арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)) сельскагаспадарчую тэхніку, набытую за кошт сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, крэдытаў, якія пагашаюцца за кошт сродкаў гэтага фонду, за разгляд іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці па выкананні дагавораў доўгатэрміновай арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу));

1.16. арганізацыі дзяржаўнай дарожнай гаспадаркі за разгляд іскавых заяў, заяў аб распачынанні загаднага вядзення аб спагнанні платы за праезд і штрафаў за парушэнне парадку праезду цяжкіх і буйнагабарытных транспартных сродкаў па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання і аб пакрыцці шкоды, прычыненай аб'ектам дзяржаўнай дарожнай гаспадаркі;

1.17. арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, а таксама арганізацыі, якія налічваюць плату за жыллёва-камунальныя паслугі за разгляд:

іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці па плаце за карыстанне жылым памяшканнем, за жыллёва-камунальныя паслугі, па пакрыцці сум падаткаў і арэнднай платы за зямлю, няўстойкі (штрафу, пені), звязанай з такой запазычанасцю;

іскавых заяў, заяў аб распачынанні загаднага вядзення аб спагнанні запазычанасці па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі, паслугі па цеплазабеспячэнні, гарачым і халодным водазабеспячэнні, водаадвядзенні (каналізацыі), абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, няўстойкі (штрафу, пені), звязанай з такой запазычанасцю;

1.18. арганізацыі, якія ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне ліфтаў, за разгляд іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці, якая ўтварылася па дагаворах на тэхнічнае абслугоўванне і рамонт ліфтаў і сродкаў дыспетчарскага кантролю, на перыядычны тэхнічны агляд ліфтаў, на дыспетчарскі кантроль за працай ліфтаў, няўстойкі (штрафу, пені), звязанай з такой запазычанасцю;

1.19. юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца камерцыйнымі арганізацыямі (за выключэннем унітарных прадпрыемстваў, заснаваных на праве аператыўнага кіравання (казённых прадпрыемстваў)), а таксама з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у форме спажывецкіх кааператываў, дабрачынных ці іншых фондаў, і індывідуальныя прадпрымальнікі за разгляд заяў аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве);

1.20. юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія знаходзяцца ў працэдуры эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), за разгляд у працэсе вядзення па справе аб іх эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) іскавых заяў, заяў і скаргаў у суды;

1.21. адміністрацыі свабодных эканамічных зон за разгляд апеляцыйных скаргаў на судовыя пастановы, звязаныя з абскарджаннем рашэння адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны аб страце статусу рэзідэнта свабоднай эканамічнай зоны;

1.22. камісіі па справах непаўналетніх за разгляд заяў аб змяшчэнні непаўналетніх у спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы, спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб пераводзе непаўналетніх са спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў у спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб спыненні знаходжання непаўналетніх ва ўказаных установах да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў іх, аб прадаўжэнні гэтага тэрміну;

1.23. Беларускі дзяржаўны канцэрн па нафце і хіміі за разгляд іскавых заяў аб спыненні дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі);

1.24. дзяржаўная ўстанова «Транспартная інспекцыя Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь» за разгляд іскавых заяў, а таксама заяў аб распачынанні загаднага вядзення па справах, звязаных з кантролем за выкананнем вытворцамі транспартных прац і паслуг заканадаўства ў галіне транспартнай дзейнасці, выкананнем карыстальнікамі платнай аўтамабільнай дарогі ўстаноўленага заканадаўствам парадку спагнання платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах Рэспублікі Беларусь;

1.25. дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці» за разгляд іскавых заяў аб абароне правоў аўтараў і іншых уладальнікаў аўтарскага правы і сумежных правоў, якія даручылі гэтай установе ажыццяўленне і абарону гэтых правоў на падставе заключаных з ёй дагавораў;

1.26. адкрытае акцыянернае таварыства «Агенцтва па кіраванні актывамі» за разгляд іскавых заяў аб спагнанні запазычанасці па крэдытах, а таксама аб абароне правоў і законных інтарэсаў гэтага таварыства, звязаных з набыццём актываў;

1.27. адпаведныя органы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь за разгляд іскавых заяў аб спагнанні няправільна выплачаных дзяржаўных дапамог і пенсій;

1.28. арганізацыі, якія вядуць лясную гаспадарку, за разгляд іскавых заяў аб спагнанні кошту незаконна здабытай драўніны і іншай лясной прадукцыі, а таксама прадукцыі палявання пры немагчымасці іх канфіскацыі, іншых заяў і скаргаў, звязаных з выкарыстаннем, аховай, абаронай і ўзнаўленнем лясоў, вядзеннем паляўнічай гаспадаркі.

2. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны:

2.1. фізічныя асобы па судовых справах, звязаных:

2.1.1. з разглядам індывідуальных працоўных спрэчак;

2.1.2. з прызнаннем заключаным грамадзянска-прававога дагавора, прадметам якога з'яўляецца выкананне прац (аказанне паслуг) ці стварэнне аб'екта інтэлектуальнай уласнасці;

2.1.3. з абаронай права ўласнасці або іншых рэчавых правоў пры адабранні зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб і зносе аб'ектаў нерухомай маёмасці;

2.2. арганізацыі і фізічныя асобы па судовых справах, звязаных:

2.2.1. з пакрыццём шкоды, прычыненай фізічнай асобе ў выніку незаконнага асуджэння, прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння, прыцягнення ў якасці абвінавачанага, затрымання, утрымання пад вартай, хатняга арышту, прымянення падпіскі аб нявыездзе і належных паводзінах, часовага адхілення ад пасады, змяшчэння ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) установу, незаконнага накладання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, папраўчых прац;

2.2.2. са страхаваннем у Рэспубліцы Беларусь і дзяржаўным рэгуляваннем страхавой дзейнасці, а таксама за выдачу судом копій дакументаў па такіх справах;

2.3. дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Дзяржаўнаму камітэту па маёмасці Рэспублікі Беларусь, і іх даччыныя прадпрыемствы па судовых справах, звязаных з зямельнымі адносінамі, геадэзіяй, картаграфіяй, дзяржаўнай рэгістрацыяй нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, кіраваннем, распараджэннем, прыватызацыяй,

ацэнкай і ўлікам маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, а таксама з вядзеннем адпаведных кадастраў, рэгістраў і рэестраў;

2.4. арганізацыі, падпарадкаваныя Міністэрству па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, якія забяспечваюць захаванасць дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву, па судовых справах аб спагнанні запазычанасці, няўстойкі (штрафу, пеняў), працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі і страт, звязаных з невыкананнем і (ці) неналежным выкананнем абавязацельстваў па матэрыяльных каштоўнасцях дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў;

2.5. арганізацыі, упаўнаважаныя заканадаўчымі актамі ці нарматыўнымі прававымі актамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь на ажыццяўленне кантролю (нагляду), па судовых справах, звязаных з разглядам заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці суб'екта (яго цэхаў, вытворчых участкаў), аб'екта будаўніцтва, абсталявання, якія правяраюцца;

2.6. Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчая камісія па судовых справах аб спагнанні панесеных імі расходаў на кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў выпадках, прадугледжаных законам;

2.7. унутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь па судовых справах, а таксама за выдачу судом дублікатаў і копій дакументаў;

2.8. адміністратар даходаў бюджэту, які прызнаецца гэтакім у адпаведнасці з заканадаўствам, па судовых справах аб спагнанні неаплачаных (не поўнасцю аплачаных) сум падаткаў, збораў (пошлін) і іншых падатковых даходаў, а таксама непадатковых даходаў, замацаваных за ім заканадаўствам;

2.9. фізічныя асобы і арганізацыі пры апеляцыйным абскарджанні судовых пастаноў па крымінальных справах.

3. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны за падачу звестак аб выканаўчых вядзеннях, распачатых у адносінах да даўжнікоў, пры звароце ў органы прымусовага выканання:

натарыусы;

спагнannікі па выканаўчых вядзеннях аб спагнанні аліментаў, расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна, па патрабаваннях работнікаў, якія вынікаюць з працоўных праваадносін.

4. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны пры здзяйсненні натарыяльных дзеянняў:

4.1. фізічныя асобы:

4.1.1. за засведчанне завяшчанняў маёмасці на карысць дзяржавы;

4.1.2. за засведчанне даверанасцей на атрыманне пенсій, дапамог, аліментаў, у тым ліку ў натуральнай форме, кампенсацыйных выплат па ўкладах і аблігацыях мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 года на набыццё тавараў працяглага карыстання і распараджэнне гэтымі выплатамі;

4.1.3. за сведчанне правільнасці копій дакументаў і выпісак з іх, неабходных для далучэння да спадчынных спраў, на імя непаўналетніх;

4.2. рэабілітаваныя фізічныя асобы, члены іх сямей, якія адносяцца да кола асоб, што забяспечваюцца пенсіяй з прычыны страты карміцеля, і спадчыннікі па законе першай чаргі за ўсе здзейсненыя дзеянні, звязаныя з рэабілітацыяй і пакрыццём шкоды;

4.3. фізічныя асобы, якія прымалі ўдзел у працах па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у 1986–1987 гадах у зоне эвакуацыі (адчужэння) ці занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых працах на Чарнобыльскай АЭС (у тым ліку часова накіраваныя ці камандзіраваныя), уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутых да выканання прац,

звязаных з ліквідацыяй наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, за сведчанне правільнасці копій дакументаў, неабходных для давання льгот;

4.4. законныя прадстаўнікі непаўналетніх грамадзян Рэспублікі Беларусь за засведчанне згоды на выезд з Рэспублікі Беларусь непаўналетняга;

4.5. Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях г. Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда», асобы, узнагароджаныя знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда», фізічныя асобы, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, інваліды, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь калецтва ці захворвання, якія прывялі да інваліднасці, з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, іншымі радыяцыйнымі аварыямі, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў):

4.5.1. за засведчанне ўсіх відаў аднабаковых здзелак;

4.5.2. за сведчанне правільнасці копій дакументаў аб раненні і хваробе, звязанай з раненнем, а таксама копій дакументаў па справах аб даванні льгот;

4.6. члены сямей ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія загінулі ці памерлі з прычыны раненняў, кантузій, калецтваў, захворванняў, атрыманых у перыяд баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) пры выкананні воінскага ці службовага доўгу ў Афганістане або ў іншых дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні (а таксама прапалі без вестак у раёнах вядзення баявых дзеянняў), ці пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў), акрамя выпадкаў, калі гібель (смерць) надышла ў выніку проціпраўных дзеянняў, па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення, членашкодніцтва ці самагубства, калі яно не было выклікана хваравітым станам ці давядзеннем да самагубства, за сведчанне правільнасці копій паведамленняў воінскіх частак аб забітых ці зніклых без вестак ваеннаслужачых і партызанах, копій дакументаў па справах аб даванні льгот;

4.7. мнагадзетная маці за сведчанне правільнасці копій дакументаў па справе аб яе ўзнагароджанні;

4.8. грамадскае аб'яднанне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, у якім не менш чым дзве трэці ад агульнай колькасці членаў складаюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, за сведчанне сапраўднасці подпісаў службовых асоб на картцы для падачы ў банк.

5. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў органах, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану:

5.1. плацельшчыкі:

5.1.1. за рэгістрацыю нараджэння, усынаўлення (удачарэння), устанаўлення мацярынства і (ці) бацькоўства, смерці;

5.1.2. за выдачу пасведчанняў аб нараджэнні ў сувязі з унясеннем змяненняў, дапаўненняў у запіс акта аб нараджэнні ў выпадку рэгістрацыі ўстанаўлення мацярынства і (ці) бацькоўства, усынаўлення (удачарэння) і ў сувязі з аднаўленнем запісу акта аб нараджэнні пры змяненні месца нараджэння ўсыноўленага (удачаронай), а таксама за

выдачу пасведчанняў аб смерці ў сувязі з унясеннем змяненняў, дапаўненняў і выпраўленняў у запіс акта аб смерці;

5.2. фізічныя асобы за выдачу паўторных пасведчанняў аб смерці ваеннаслужачых, грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, і ваенных будаўнікоў, якія загінулі ў перыяд праходжання ваеннай, альтэрнатыўнай службы ў мірны час;

5.3. рэабілітаваныя фізічныя асобы, члены іх сямей, якія адносяцца да кола асоб, што забяспечваюцца пенсіяй з прычыны страты карміцеля, і спадчыннікі па законе першай чаргі за выдачу дакументаў, звязаных з рэабілітацыяй;

5.4. інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны за выдачу ім пасведчанняў у сувязі са змяненнем, дапаўненнем, выпраўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану, складзеных на гэтых асоб, а таксама ў сувязі з аднаўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану ў адносінах да гэтых асоб;

5.5. Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, фізічныя асобы, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, інваліды, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь калецтва ці захворвання, якія прывялі да інваліднасці, з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, іншымі радыяцыйнымі аварыямі, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў), за выдачу паўторных пасведчанняў аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану;

5.6. апекуны, папячыцелі, дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, установы прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, камісіі па справах непаўналетніх за выдачу паўторных пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей-сірот ці дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, аб смерці бацькоў дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

6. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў архівах органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, галоўных кіраўніцтваў юстыцыі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў:

6.1. фізічныя асобы за выдачу паўторных пасведчанняў аб смерці ваеннаслужачых, грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, і ваенных будаўнікоў, якія загінулі ў перыяд праходжання ваеннай, альтэрнатыўнай службы ў мірны час;

6.2. Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, фізічныя асобы, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый, інваліды, у адносінах да якіх выяўлена прычынная сувязь калецтва ці захворвання, якія прывялі да інваліднасці, з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, іншымі радыяцыйнымі аварыямі, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, у тым ліку звольненыя ў запас (адстаўку), з ліку ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых

расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія сталі інвалідамі з прычыны ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў), за выдачу паўторных пасведчанняў аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану;

6.3. апекуны, папячыцелі, дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, установы прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, камісіі па справах непаўналетніх за выдачу паўторных пасведчанняў аб нараджэнні дзяцей-сірот ці дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, аб смерці бацькоў дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў;

6.4. рэабілітаваныя фізічныя асобы, члены іх сямей, якія адносяцца да кола асоб, што забяспечваюцца пенсіяй з прычыны страты карміцеля, і спадчыннікі па законе першай чаргі за выдачу дакументаў, звязаных з рэабілітацыяй.

7. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны за рэгістрацыю па месцы жыхарства і (ці) месцы знаходжання:

7.1. фізічныя асобы за рэгістрацыю па месцы знаходжання ў памяшканнях для часовага пражывання;

7.2. непаўналетнія за рэгістрацыю па месцы жыхарства ці месцы знаходжання;

7.3. фізічныя асобы, якія пражываюць у дзяржаўных стацыянарных арганізацыях сацыяльнага абслугоўвання, за рэгістрацыю па месцы жыхарства ці месцы знаходжання;

7.4. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, прызыве, праходзяць альтэрнатыўную службу, службу ў рэзерве, знаходзяцца на ваенных ці спецыяльных зборах, за рэгістрацыю па месцы знаходжання;

7.5. фізічныя асобы, асуджаныя да арышту, абмежавання волі (за выключэннем асоб, якія адбываюць пакаранне па месцы жыхарства), пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, за рэгістрацыю па месцы адбывання пакарання.

8. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў органах пракуратуры:

8.1. істцы за разгляд наглядных скаргаў на судовыя пастановы па справах аб спагнанні аліментаў ці расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

8.2. фізічныя асобы за разгляд наглядных скаргаў на судовыя пастановы па справах, звязаных:

8.2.1. з разглядам індывідуальных працоўных спрэчак;

8.2.2. з абаронай правоў уласнасці або іншых рэчавых правоў пры адабранні зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб і зносе аб'ектаў нерухомай маёмасці;

8.3. інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў за разгляд наглядных скаргаў на судовыя пастановы па іскавых заявах немаёмаснага характару;

8.4. арганізацыі і фізічныя асобы за разгляд наглядных скаргаў:

8.4.1. па справах, звязаных з заключэннем, выкананнем ці спыненнем дагавораў стварэння аб'ектаў долевага жыллёвага будаўніцтва, дагавораў будаўніцтва жылых памяшканняў у складзе арганізацый забудоўшчыкаў, дагавораў (пагадненняў), якія прадугледжваюць абавязацельствы забудоўшчыка, які з'яўляецца эмітэнтам жыллёвых аблігацый, па будаўніцтве жылых памяшканняў уладальнікам жыллёвых аблігацый ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

8.4.2. па справах, звязаных са страхаваннем у Рэспубліцы Беларусь і дзяржаўным рэгуляваннем страхавой дзейнасці, а таксама за выдачу копій дакументаў па такіх спрэчках;

8.4.3. аб спыненні вядзення па справе (за выключэннем выпадкаў спынення вядзення па справе ў сувязі з зацвярджэннем міравога пагаднення або пагаднення аб прымірэнні) ці пакіданні іскавай заявы (заявы, скаргі) без разгляду;

8.5. адвакаты за разгляд наглядных скаргаў на прыгаворы судоў у частцы асуджэння ці апраўдання.

9. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў органах, якія выдаюць дакументы, неабходныя для выезду з Рэспублікі Беларусь і (ці) уезду ў Рэспубліку Беларусь:

9.1. грамадзяне Рэспублікі Беларусь за выдачу (абмен) ім дыпламатычнага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і службовага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

9.2. грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, за выдачу (абмен) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

9.3. работнікі дзяржаўных органаў (арганізацый), камандзіраваныя на судны для выканання службовых заданняў, навучэнцы, які атрымліваюць сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю па марскіх спецыяльнасцях, за выдачу (абмен) нацыянальнага пасведчання асобы марака Рэспублікі Беларусь;

9.4. замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія дэпартуюцца ці высылаюцца з Рэспублікі Беларусь або выдаюцца замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, за выдачу праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь ці візы для выезду з Рэспублікі Беларусь;

9.5. законныя прадстаўнікі непаўналетніх грамадзян Рэспублікі Беларусь за засведчанне згоды:

9.5.1. на выезд з Рэспублікі Беларусь непаўналетняга;

9.5.2. на выдачу пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для пастаяннага пражывання (афармленне пастаяннага пражывання) за межамі Рэспублікі Беларусь непаўналетняму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які не дасягнуў чатырнаццацігадовага ўзросту;

9.6. асобы, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту:

9.6.1. грамадзяне Рэспублікі Беларусь за выдачу (абмен) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, акрамя выпадкаў абмену пашпарта для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, праз дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь;

9.6.2. замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якім дадзены статус бежанца, дадатковая абарона ці сховішча ў Рэспубліцы Беларусь, за выдачу (абмен) праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь;

9.6.3. замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства за выдачу візы для выезду з Рэспублікі Беларусь;

9.6.4. замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова ці пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, за выдачу візы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь, у тым ліку двухразовай ці шматразовай.

10. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны пры здзяйсненні іншых юрыдычна значных дзеянняў:

10.1. камерцыйная арганізацыя, якая ствараецца ў выглядзе адкрытага акцыянернага таварыства ў працэсе раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці за яе дзяржаўную рэгістрацыю;

10.2. фізічная асоба, якая знаходзіцца на ўліку ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўнага, фізічная асоба, якая атрымлівае ў дзённай форме атрымання адукацыі агульную сярэднюю, спецыяльную, прафесіянальна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю, фізічная асоба, якая атрымала ў дзённай форме атрымання адукацыі ўказаную адукацыю, на працягу года пасля яе атрымання, за яе дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка;

10.3. арганізацыі і фізічныя асобы за дзяржаўную рэгістрацыю суб'ектаў гаспадарання ў выпадку падачы ў рэгіструючы орган дакументаў у электронным выглядзе пры дапамозе вэб-партала Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

10.4. плацельшчыкі за дзяржаўную рэгістрацыю змяненняў і (ці) дапаўненняў у іх статуты (устаноўчыя дагаворы – для камерцыйных арганізацый, якія дзейнічаюць толькі на падставе ўстаноўчых дагавораў) і змяненняў, унесеных у пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў, у выпадку змянення заканадаўства, згодна з якім патрабуецца ўнясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у гэтыя дакументы;

10.5. сродак масавай інфармацыі, а таксама выдавец, вырабляльнік і распаўсюджвальнік друкаваных выданняў за перарэгістрацыю ў сувязі са змяненнем заканадаўства;

10.6. палітычныя партыі, прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні, іх саюзы (асацыяцыі), рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні за іх перарэгістрацыю і перарэгістрацыю іх сімволікі ў сувязі са змяненнем заканадаўства;

10.7. рэспубліканскія і мясцовыя моладзевыя і дзіцячыя грамадскія аб'яднанні, грамадскія аб'яднанні ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, іх саюзы (асацыяцыі) за іх дзяржаўную рэгістрацыю, дзяржаўную рэгістрацыю іх сімволікі, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у іх статуты, выдачу дубліката пасведчання іх дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама дубліката статута з адзнакамі аб іх дзяржаўнай рэгістрацыі, дзяржаўную рэгістрацыю, пастаноўку на ўлік іх арганізацыйных структур;

10.8. міжнародны фонд за дзяржаўную рэгістрацыю змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут фонду ў сувязі са стварэннем прадстаўніцтваў і (ці) філіялаў на тэрыторыі адной ці некалькіх замежных дзяржаў на працягу шасці месяцаў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўказанага фонду;

10.9. рэспубліканскі фонд за дзяржаўную рэгістрацыю змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут фонду ў сувязі са стварэннем прадстаўніцтваў і (ці) філіялаў у абласцях і горадзе Мінску на працягу шасці месяцаў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі ўказанага фонду;

10.10. арганізацыі Рэспублікі Беларусь, якія маюць спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на фармацэўтычную дзейнасць, за дзяржаўную рэгістрацыю фармацэўтычных субстанцый замежнай вытворчасці;

10.11. арганізацыі:

10.11.1. за дзяржаўную рэгістрацыю выпуску (дадатковага выпуску) акцый, якія эмітуюцца пры раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, рэарганізацыі сельскагаспадарчых арганізацый, а таксама пры аказанні дзяржаўнай падтрымкі;

10.11.2. за дзяржаўную рэгістрацыю выпуску (дадатковага выпуску) акцый акцыянернага таварыства, якія перадаюцца ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, а таксама ўнясенне змяненняў у Дзяржаўны рэестр каштоўных папер у выпадку павелічэння намінальнага кошту акцый, якія знаходзяцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

10.12. фізічная асоба, якая атрымлівае агульную сярэднюю адукацыю, за прыём экзаменаў на права кіравання колавым трактарам, самаходнай машынай і выдачу пасведчання трактарыста-машыніста з талонам да яго;

10.13. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якая прыбыла ў Рэспубліку Беларусь у мэтах турызму, за рэгістрацыю ў Рэспубліцы Беларусь;

10.14. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якая хадайнічае аб даванні статусу бежанца, дадатковай абароны ці сховішча ў Рэспубліцы Беларусь:

10.14.1. за рэгістрацыю ці прадаўжэнне тэрміну часовага знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь;

10.14.2. за выдачу дазволу на часовае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь;

10.15. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якая часова знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, за рэгістрацыю:

у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь, у гасцініцах, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, суб'ектам аграэкатурызму;

у Рэспубліцы Беларусь у электроннай форме праз адзіны партал электронных паслуг;

10.16. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь і з'яўляюцца гасцямі акрэдытаваных у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь глаў і супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў (у выпадку пражывання гасцей у рэзідэнцыях глаў ці памяшканнях названых прадстаўніцтваў, устаноў, органаў або ў жылых памяшканнях, якія займаюцца іх супрацоўнікамі), за рэгістрацыю ў Рэспубліцы Беларусь;

10.17. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь і з'яўляюцца гасцямі акрэдытаваных у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь глаў і супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, прадстаўніцтваў і органаў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, за прадаўжэнне тэрміну часовага знаходжання (рэгістрацыі) у Рэспубліцы Беларусь;

10.18. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якім дадзены статус бежанца ў Рэспубліцы Беларусь, за выдачу (абмен) пасведчання бежанца ў Рэспубліцы Беларусь;

10.19. замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, за рэгістрацыю, прадаўжэнне тэрміну часовага знаходжання (рэгістрацыі) у Рэспубліцы Беларусь, за выдачу дазволу на часовае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, за выдачу дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама за выдачу (абмен) віду на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

10.20. плацельшчык за ўнясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) у сувязі са змяненнем заканадаўства;

10.21. арганізацыя за пераафармленне пасведчання на права ажыццяўлення знешнегандлёвай дзейнасці ў адносінах да спецыфічных тавараў (прац, паслуг) у выпадку змянення заканадаўства;

10.22. арганізацыя за выдачу ліцэнзіі на ўвоз (імпарт) прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вываз (экспарт) спецыфічных тавараў (прац, паслуг) у выпадку:

10.22.1. увозу прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вывазу спецыфічных тавараў (прац, паслуг) па рэкламацыйных актах да кантрактаў (дагавораў), дазволеных да рэалізацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

10.22.2. увозу прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, закупленых за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

10.22.3. увозу прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вывазу спецыфічных тавараў (прац, паслуг) па міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, калі гэтымі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь прадугледжана ліцэнзаванне;

10.23. наступныя катэгорыі плацельшчыкаў за выдачу пропускаў на права пазачарговага ўезду на тэрыторыю аўтадарожных пунктаў пропуску праз дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь:

10.23.1. работнік дзяржаўнага органа ці іншай дзяржаўнай арганізацыі, які накіроўваецца ў службовую камандзіроўку за мяжу ў адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

10.23.2. работнік арганізацыі Рэспублікі Беларусь у сувязі з аказаннем бязвыплатнай (спонсарскай) і іншай дапамогі Рэспубліцы Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы (па хадайніцтве зацікаўленага рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, якое падаецца ў Дзяржаўны пагранічны камітэт Рэспублікі Беларусь);

10.23.3. плацельшчык, які не з'яўляецца падатковым рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадпрымальніцкую дзейнасць, а таксама дзейнасць, звязаную з рэалізацыяй функцый прадстаўніцтва замежнай ці міжнароднай арганізацыі па аздараўленні дзяцей за мяжой, ці аказвае міжнародную тэхнічную, замежную бязвыплатную і іншую дапамогу Рэспубліцы Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы, юрыдычнай асобе ці грамадзяніну Рэспублікі Беларусь (па хадайніцтве Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь ці Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у адносінах да дзейнасці, звязанай з аздараўленнем дзяцей за мяжой ці аказаннем замежнай бязвыплатнай дапамогі, якое падаецца ў Дзяржаўны пагранічны камітэт Рэспублікі Беларусь);

10.24. фізічная асоба па запытах аб даванні інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама ў рэестры спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), аб суб'ектах прадпрымальніцкай дзейнасці, якія ажыццяўляюць дзейнасць, звязаную з працаўладкаваннем грамадзян Рэспублікі Беларусь за мяжой, зборам і распаўсюджваннем (у тым ліку ў сетцы Інтэрнэт) інфармацыі аб фізічных асобах у мэтах іх знаёмства, дзейнасць па аказанні псіхалагічнай дапамогі, а таксама па запытах аб даванні інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, у мэтах абароны правоў спажыўцоў, налічэння пенсій, сацыяльных дапамог і іншых сацыяльных выплат;

10.25. дзяржаўная арганізацыя, падпарадкаваная (падсправаздачная) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь ці падначаленая Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, арганізацыя па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, а таксама натарыус – па запытах аб даванні інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, рэестры спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь ці суднавай кнізе, Дзяржаўным рэестры грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры палітычных партый, саюзаў (асацыяцый) палітычных партый, рэестрах мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры прафесійных саюзаў, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў, рэестрах тэрытарыяльных прафесійных саюзаў, прафесійных саюзаў арганізацый, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў;

10.26. арганізацыя, якая налічвае плату за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылым памяшканнем, за выключэннем газа- і энергазабяспечвальных арганізацый, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз» і дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга», арганізацыя, якая прызначае і выплачвае дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, а таксама часовы (антыкрызісны) кіраўнік, прызначаны судом для ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў у працэдурах эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), па запытах аб даванні інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў і неабходная для выканання ўскладзеных на іх заканадаўчымі актамі абавязкаў;

10.27. арганізацыя і натарыус за даванне персанальных даных фізічных асоб, у тым ліку абязлічаных, з рэгістра насельніцтва, калі выкарыстанне такіх персанальных даных фізічных асоб неабходнае для выканання задач, якія ўваходзяць у іх кампетэнцыю, вызначаную заканадаўствам;

10.28. фізічная асоба за даванне персанальных даных фізічных асоб з рэгістра насельніцтва адзін раз у межах каляндарнага года;

10.29. рэзідэнт свабоднай эканамічнай зоны за выдачу замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства, якія прыцягваюцца рэзідэнтам свабоднай эканамічнай зоны для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны, спецыяльнага дазволу на права займання працоўнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь;

10.30. наступныя катэгорыі плацельшчыкаў за выдачу пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:

10.30.1. арганізатар культурна-відовішчнага мерапрыемства з удзелам толькі беларускіх выканаўцаў;

10.30.2. дзяржаўная арганізацыя культуры пры ўмове фінансавання арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства поўнасцю або часткова за кошт сродкаў бюджэту;

10.31. судовыя выканаўцы ў выпадку прымусовага выканання судовай пастановы аб прызнанні за Рэспублікай Беларусь і (ці) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай правоў на акцыі, якія падлягаюць эмісіі і перадачы ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь і (ці) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, прынятай у мэтах аднаўлення правоў Рэспублікі Беларусь і (ці) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, за дзяржаўную рэгістрацыю змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты акцыянерных таварыстваў, створаных у працэсе пераўтварэння арэндных, калектыўных (народных), дзяржаўных, дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў і прыватызацыі арэндных прадпрыемстваў, а таксама за дзяржаўную рэгістрацыю дадатковага выпуску акцый, якія перадаюцца ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь ці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

10.32. плацельшчык за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ў адносінах да транспартных сродкаў, спецыяльна абсталяваных для выкарыстання інвалідамі, а таксама транспартных сродкаў, атрыманых (набытых) праз органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічала раней;

10.33. арганізацыі за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ў адносінах да транспартных сродкаў:

якія выкарыстоўваюцца для аказання медыцынскай дапамогі, у тым ліку хуткай медыцынскай дапамогі;

прызначаных для забеспячэння сацыяльнага абслугоўвання і давання сацыяльных паслуг непрацаздольным і іншым катэгорыям грамадзян, што знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, і на якіх у адпаведнасці з заканадаўствам нанесены надпіс «Сацыяльная служба»;

войскаў і воінскіх фарміраванняў;

10.34. перавозчыкі, уключаныя ў пералікі аўтамабільных перавозчыкаў, абавязаных выконваць аўтамабільныя перавозкі транспартам агульнага карыстання, за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ў адносінах да транспарту агульнага карыстання;

10.35. арганізацыі за выдачу (афармленне) дакументаў, якія сведчаць права на зямельныя ўчасткі, на якіх размешчаны незарэгістраваныя эксплуатуемыя капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), ізаляваныя памяшканні, машына-месцы.

11. Льготы па дзяржаўнай пошліне, устаноўленыя пунктамі 1–10 гэтага артыкула, прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 12 гэтага артыкула.

12. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя дзяржаўныя органы і органы дзяржаўнага кіравання, іх структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы і тэрытарыяльныя органы, суды, органы пракуратуры, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы (іх структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы), судовыя выканаўцы:

па судовых справах;

за разгляд судамі іскавых заяў (заяў), якія падаюцца такімі органамі ў абарону правоў і законных інтарэсаў іншых асоб у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам;

пры звароце ў органы, якія спаганяюць дзяржаўную пошліну, за здзяйсненнем іншых юрыдычна значных дзеянняў, якія з'яўляюцца аб'ектамі абкладання дзяржаўнай пошлінай.

13. Льготы па дзяржаўнай пошліне, устаноўленыя пунктам 1 гэтага артыкула, даюцца плацельшчыкам, указаным у абзацы другім артыкула 283 гэтага Кодэкса.

14. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны плацельшчыкі за здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў, якія з'яўляюцца аб'ектамі абкладання дзяржаўнай пошлінай, у сувязі са змяненнем межаў (перайменаваннем) населеных пунктаў і (ці) іх састаўных частак.

15. Вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны плацельшчыкі за паўторнае здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў, якія з'яўляюцца аб'ектамі абкладання дзяржаўнай пошлінай, у сувязі з дапушчанымі пры іх здзяйсненні памылкамі (у тым ліку недакладнасцямі ў выдадзеных (афармленых, пераафармленых, засведчаных, абмененых) дакументах (іх дублікатах) ці непаўнатой звестак у іх) у выніку дзеянняў органа, які спаганяе дзяржаўную пошліну.

16. Іншыя катэгорыі плацельшчыкаў вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў выпадках, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

17. Вызваленне ад дзяржаўнай пошліны за разгляд судом іскавых заяў, заяў і скаргаў не цягне за сабой вызвалення ад дзяржаўнай пошліны за разгляд судом апеляцыйных, касацыйных і наглядных скаргаў, скаргаў па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама ад дзяржаўнай пошліны, абавязак аплаціць у бюджэт якую ўзнікае па выніках разгляду справы.

18. Вызваленне ад дзяржаўнай пошліны па судовых справах азначае, што плацельшчыкі, якім такая льгота дадзена, не плацяць яе ў бюджэт як пры звароце ў суд з іскавымі заявамі, іншымі заявамі, скаргамі і хадайніцтвамі, апеляцыйнымі, касацыйнымі і наглязнымі скаргамі, скаргамі па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, так і ў тым выпадку, калі абавязак па аплаце дзяржаўнай пошліны ў бюджэт узнікае па выніках разгляду справы.

**Артыкул 286. Стаўкі дзяржаўнай пошліны**

1. Стаўкі дзяржаўнай пошліны ўстанаўліваюцца ў памерах згодна з дадаткамі 13–22 да гэтага Кодэкса.

2. Стаўкі дзяржаўнай пошліны прымяняюцца ў памеры 50 працэнтаў ад устаноўленай стаўкі:

2.1. за дзяржаўную рэгістрацыю транспартнага сродку, у тым ліку колавага трактара, прычэпа да іх, а таксама самаходнай машыны, з выдачай рэгістрацыйнага знака, які быў у выкарыстанні і выдаецца паўторна;

2.2. за разгляд эканамічным судом іскавай заявы пры наяўнасці ўзгодненага бакамі хадайніцтва аб правядзенні прымірыцельнай працэдуры;

2.3. за выдачу пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянерам, інвалідам;

2.4. пенсіянерамі, інвалідамі, а таксама законнымі прадстаўнікамі асоб, прызнаных ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі, якія дзейнічаюць ад іх імя і ў іх інтарэсах, пры іх звароце:

за здзяйсненнем усіх відаў натарыяльных дзеянняў (за выключэннем натарыяльных дзеянняў, за здзяйсненне якіх прадугледжана іх поўнае вызваленне ад дзяржаўнай пошліны);

за засведчаннем рэгістратарам рэспубліканскай ці тэрытарыяльнай арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй дакументаў, якія з'яўляюцца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі з нерухомай маёмасцю, і (ці) за выдачай гэтым рэгістратарам дублікатаў засведчаных дакументаў.

Палажэнні абзаца другога часткі першай гэтага падпункта прымяняюцца, калі:

дакумент засведчваецца ад імя пенсіянера, інваліда, асобы, прызнанай ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнай, ці выдаецца на іх імя, сведчыцца правільнасць копіі (выпіскі) дакумента, выдадзенага на іх імя;

на дакуменце сведчыцца сапраўднасць подпісу пенсіянера, інваліда, законнага прадстаўніка асобы, прызнанай ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнай, які дзейнічае ад яе імя і ў яе інтарэсах.

Палажэнні абзаца трэцяга часткі першай гэтага падпункта прымяняюцца, калі засведчваецца дакумент, які з'яўляецца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі з нерухомай маёмасцю, з якога вынікае волевыяўленне пенсіянера, інваліда, а таксама законнага прадстаўніка асобы, прызнанай ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнай, які дзейнічае ад яе імя і ў яе інтарэсах, выдаецца на іх імя дублікат такога дакумента;

2.5. за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху ў адносінах да транспартнага сродку, уласнікам якога з'яўляецца ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід I ці II групы, пры наяўнасці медыцынскай даведкі аб стане здароўя, якая пацвярджае іх прыдатнасць да кіравання механічнымі транспартнымі сродкамі, самаходнымі машынамі, маторнымі маламернымі суднамі, магутнасць рухавіка якіх перавышае 3,7 кВт (5 конскіх сіл) (за выключэннем выпадкаў, пры якіх прадугледжана іх поўнае вызваленне ад дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху).

3. За выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху дзяржаўная пошліна аплачваецца па стаўцы, павялічанай на каэфіцыент 2, у адносінах да транспартных сродкаў, для якіх тэрмін дзеяння дазволу на допуск да ўдзелу ў дарожным руху ўстаноўлены на два гады.

**Артыкул 287. Тэрміны і парадак аплаты дзяржаўнай пошліны**

1. Дзяржаўная пошліна аплачваецца, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 2 гэтага артыкула:

1.1. пры звароце за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў – да падачы заявы, скаргі, хадайніцтва і (ці) іншых дакументаў на здзяйсненне такіх дзеянняў;

1.2. пры звароце за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам з'яўляюцца адміністрацыйнымі працэдурамі, – да звароту за ажыццяўленнем адпаведнай адміністрацыйнай працэдуры;

1.3. пры звароце за выдачай дакументаў (іх копій, дублікатаў) – да выдачы дакументаў (іх копій, дублікатаў).

2. Дзяржаўная пошліна аплачваецца:

2.1. пры звароце за здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў – да здзяйснення натарыяльнага дзеяння;

2.2. за рэгістрацыю перамены прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), за выдачу пасведчанняў у сувязі са змяненнем, дапаўненнем, выпраўленнем і аднаўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану, а таксама за выдачу паўторных пасведчанняў аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану – пры выдачы адпаведных пасведчанняў;

2.3. за выдачу генеральных ліцэнзій на ўвоз (імпарт) прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вываз (экспарт) спецыфічных тавараў (прац, паслуг) – пры рэгістрацыі ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце Рэспублікі Беларусь кожнага кантракта (дагавора) і (ці) дадатковага пагаднення да яго пад генеральную ліцэнзію;

2.4. за ўнясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у пералік банкаўскіх аперацый, указаны ў спецыяльным дазволе (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, за выдачу дазволаў на адкрыццё, прадаўжэнне тэрміну дзейнасці прадстаўніцтва замежнага банка – пасля прыняцця Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь адпаведна рашэння аб унясенні змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці (да выдачы ўказанага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), афармленага на новым бланку), рашэння аб выдачы дазволу на адкрыццё, прадаўжэнне тэрміну дзейнасці прадстаўніцтва замежнага банка;

2.5. за дзяржаўную рэгістрацыю (пацвярджэнне дзяржаўнай рэгістрацыі) лекавага сродку, біямедыцынскага клетачнага прадукту, за дзяржаўную рэгістрацыю (перарэгістрацыю) медыцынскага вырабу, за дзяржаўную рэгістрацыю фармацэўтычнай субстанцыі, ветэрынарнага прэпарата – пасля прыняцця рашэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі (перарэгістрацыі), пацвярджэнні дзяржаўнай рэгістрацыі гэтых тавараў да выдачы рэгістрацыйнага пасведчання;

2.6. за даванне права на паляванне – да пачатку палявання;

2.7. за выдачу пропуску на права ўезду (уваходу), часовага знаходжання, перамяшчэння ў пагранічнай зоне замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, выдачу пропуску на права ўезду (уваходу), часовага знаходжання, перамяшчэння ў пагранічнай паласе – пасля прыняцця органамі пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь рашэння аб выдачы пропуску;

2.8. плацельшчыкамі, указанымі ў абзацы трэцім артыкула 283 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, указаным у абзацы другім падпункта 1.26 пункта 1 артыкула

288 гэтага Кодэкса, – на працягу дзесяці рабочых дзён з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда.

3. Дзяржаўная пошліна аплачваецца па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, установленых на дзень звароту за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў у органы, якія спаганяюць дзяржаўную пошліну, калі іншае не ўстаноўлена пунктамі 4 і 7 гэтага артыкула.

Для мэт прымянення гэтай главы днём звароту за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў прызнаюцца дзень паступлення іскавай заявы, заявы, скаргі, хадайніцтва ці іншых дакументаў на здзяйсненне такіх дзеянняў у органы, якія спаганяюць дзяржаўную пошліну, а пры адпраўленні іх праз аддзяленне паштовай сувязі – дзень адпраўлення.

У выпадку змянення стаўкі дзяржаўнай пошліны і (ці) памеру базавай велічыні ў час здзяйснення юрыдычна значнага дзеяння даплата дзяржаўнай пошліны не праводзіцца.

Калі дзяржаўная пошліна за здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў аплачана менш за ўстаноўлены памер, праводзіцца даплата па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, установленых на дзень звароту, а ў выпадку, прадугледжаным часткай першай пункта 7 гэтага артыкула, – на дзень даплаты дзяржаўнай пошліны да ўстаноўленага памеру.

4. Дзяржаўная пошліна аплачваецца па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, установленых на дату:

4.1. рэгістрацыі ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце Рэспублікі Беларусь кожнага кантракта (дагавора) і (ці) дадатковага пагаднення да яго пад генеральную ліцэнзію – за выдачу генеральных ліцэнзій на ўвоз (імпарт) прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вываз (экспарт) спецыфічных тавараў (прац, паслуг);

4.2. прыняцця Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь рашэння аб унясенні змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці (да выдачы ўказанага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), афармленага на новым бланку), рашэння аб выдачы дазволу на адкрыццё, прадаўжэнне тэрміну дзейнасці прадстаўніцтва замежнага банка – за ўнясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у пералік банкаўскіх аперацый, указаны ў спецыяльным дазволе (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, за выдачу дазволаў на адкрыццё, прадаўжэнне тэрміну дзейнасці прадстаўніцтва замежнага банка;

4.3. дзяржаўнай рэгістрацыі, пацвярджэння дзяржаўнай рэгістрацыі, перарэгістрацыі адпаведна – за дзяржаўную рэгістрацыю (пацвярджэнне дзяржаўнай рэгістрацыі) лекавага сродку, біямедыцынскага клетачнага прадукту, за дзяржаўную рэгістрацыю (перарэгістрацыю) медыцынскага вырабу, за дзяржаўную рэгістрацыю фармацэўтычнай субстанцыі, ветэрынарнага прэпарата;

4.4. аплаты – за даванне права на паляванне.

Дзяржаўная пошліна, аплачаная за даванне права на паляванне пры выдачы дзяржаўнага пасведчання на права палявання, пацвярджае права на паляванне на працягу дванаццаці месяцаў з дня яе аплаты. За даванне права на паляванне ў наступныя гады дзяржаўная пошліна пацвярджае права на паляванне на працягу дванаццаці месяцаў з дня аплаты дзяржаўнай пошліны.

5. У выпадку, калі за здзяйсненнем аднаго юрыдычна значнага дзеяння аднначасова звярнуліся некалькі плацельшчыкаў, якія не маюць права на льготы па

дзяржаўнай пошліне, дзяржаўная пошліна падлягае аплаце імі ў роўных долях, калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем паміж імі.

У выпадку, калі сярод плацельшчыкаў, якія адначасова звярнуліся за здзяйсненнем аднаго юрыдычна значнага дзеяння, адзін плацельшчык (некалькі плацельшчыкаў) поўнасцю вызвалены (вызваленыя) ад дзяржаўнай пошліны, дзяржаўная пошліна аплачваецца плацельшчыкам, які не мае права на льготу па дзяржаўнай пошліне, у поўным памеры. Калі плацельшчыкаў, якія не маюць правы на льготу па дзяржаўнай пошліне, некалькі, дзяржаўная пошліна аплачваецца імі ў поўным памеры ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта.

У выпадку, калі сярод плацельшчыкаў, якія адначасова звярнуліся за здзяйсненнем аднаго юрыдычна значнага дзеяння, адзін плацельшчык (некалькі плацельшчыкаў) часткова вызвалены (вызваленыя) ад дзяржаўнай пошліны, ільгота па дзяржаўнай пошліне даецца яму (ім) у частцы той долі, якая належала б яму (ім) да аплаты пры адсутнасці права на льготу па дзяржаўнай пошліне. Да поўнага памеру дзяржаўнай пошліны, устаноўленага за здзяйсненне гэтага юрыдычна значнага дзеяння, дзяржаўная пошліна аплачваецца плацельшчыкам, які не мае права на льготу па дзяржаўнай пошліне. Калі плацельшчыкаў, якія не маюць права на льготу па дзяржаўнай пошліне, некалькі, дзяржаўная пошліна аплачваецца імі да поўнага памеру, устаноўленага за здзяйсненне гэтага юрыдычна значнага дзеяння, у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта.

6. Факт аплаты дзяржаўнай пошліны шляхам унясення наяўных грашовых сродкаў пацвярджаецца квітанцыяй банка, арганізацыі сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Пры неабходнасці па просьбе плацельшчыка квітанцыя вяртаецца плацельшчыку. У органе, які спаганяе дзяржаўную пошліну, застаецца копія квітанцыі, адпаведнасць якой арыгіналу засведчваецца подпісам службовай асобы органа, які спаганяе дзяржаўную пошліну, з указаннем яе пасады, прозвішча і ініцыялаў. На квітанцыі робіцца адзнака аб даце яе падачы ў орган, што спаганяе дзяржаўную пошліну, якая засведчваецца таксама подпісам службовай асобы органа, які спаганяе дзяржаўную пошліну, з указаннем яе пасады, прозвішча і ініцыялаў.

Факт аплаты дзяржаўнай пошліны шляхам пералічэння сумы дзяржаўнай пошліны з рахунку плацельшчыка пацвярджаецца дадатковым экзэмплярам плацежнай інструкцыі, экзэмплярам плацежнай інструкцыі, складзенымі на папяровым носьбіце пры ажыццяўленні электронных плацяжоў, з адзнакай банка аб іх выкананні. Пры гэтым у адзнацы банка павінны змяшчацца дата выканання плацежнай інструкцыі, арыгінальны штамп банка і подпіс адказнага выканаўцы.

Факт аплаты дзяржаўнай пошліны пры правядзенні падатковым органам заліку падатку, збору (пошліны) у кошт падлеглай аплаце суме дзяржаўнай пошліны пацвярджаецца арыгіналам пісьма падатковага органа аб праведзеным заліку, падпісанага кіраўніком (намеснікам кіраўніка) падатковага органа і засведчанага гербавай пячаткай падатковага органа.

Факт аплаты дзяржаўнай пошліны пры дапамозе сістэмы АРІП пацвярджаецца наяўнасцю ў сістэме АРІП інфармацыі, якая пацвярджае залічэнне дзяржаўнай пошліны. Плацельшчык абавязаны пры звароце ў орган, які спаганяе дзяржаўную пошліну, паведаміць уліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы.

Плацежныя інструкцыі або іх копіі, якія пацвярджаюць аплату дзяржаўнай пошліны, захоўваюцца ў органах, што спаганяюць дзяржаўную пошліну, і пры

наяўнасці заяў, скаргаў ці іншых дакументаў, па якіх аплачана дзяржаўная пошліна, далучаюцца да іх.

Плацежныя інструкцыі або іх копіі, якія пацвярджаюць аплату дзяржаўнай пошліны за дзеянні, што здзяйсняюцца падраздзяленнямі па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў па выдачы (абмене) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і віду на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, захоўваюцца ў такіх падраздзяленнях асобна ад дакументаў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна.

У выпадку, калі плацельшчык вызваляецца ад дзяржаўнай пошліны, аб гэтым робіцца адзнака на адпаведных дакументах з указаннем, на падставе якога заканадаўчага акта і (ці) іншага прававога акта (іх канкрэтнага структурнага элемента) плацельшчык вызваляецца ад дзяржаўнай пошліны.

7. Дзяржаўная пошліна можа аплачвацца ў замежнай валюце плацельшчыкамі, якія не з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленых на дзень аплаты, і афіцыйнага курсу, устаноўленага Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень аплаты.

Пацвярджэннем фактычнага залічэння ў рэспубліканскі бюджэт дзяржаўнай пошліны, заплачанай плацельшчыкамі, якія не з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца даведка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па горадзе Мінску, якая накіроўваецца ў орган, што спаганяе дзяржаўную пошліну, на працягу пяці рабочых дзён пасля залічэння дзяржаўнай пошліны ў бюджэт.

8. Дзяржаўная пошліна за выдачу дазволу на праезд аўтамабільных транспартных сродкаў Рэспублікі Беларусь па тэрыторыях замежных дзяржаў аплачваецца ў беларускіх рублях шляхам пералічэння грашовых сродкаў у безнаяўным парадку або наяўнымі грашовымі сродкамі праз касу банка.

**Артыкул 288. Асаблівасці вылічэння і аплаты дзяржаўнай пошліны пры звароце ў суды**

1. Па справах, якія разглядаюцца ў судах, дзяржаўная пошліна вылічваецца і аплачваецца з улікам наступных асаблівасцей:

1.1. па іскавай заяве, якая змяшчае патрабаванні як маёмаснага, так і немаёмаснага характару, адначасова аплачваюцца дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў маёмаснага характару, і дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў немаёмаснага характару;

1.2. па іскавай заяве (заяве, скарзе), якая змяшчае некалькі самастойных патрабаванняў, дзяржаўная пошліна аплачваецца за кожнае патрабаванне паасобку;

1.3. па іскавай заяве, якую падаюць некалькі істцоў сумесна, дзяржаўная пошліна вылічваецца ад агульнай сумы іску і аплачваецца істцамі прапарцыянальна долі заяўленых імі патрабаванняў;

1.4. па іскавай заяве, якую падае адзін ісцец да некалькіх адказчыкаў, а таксама пры аб'яднанні судом у адно вядзенне некалькіх аднародных патрабаванняў дзяржаўная пошліна вылічваецца ад агульнай сумы іску;

1.5. у выпадку вылучэння судом аднаго ці некалькіх з аб’яднаных іскавых патрабаванняў у асобнае вядзенне дзяржаўная пошліна, аплачаная пры звароце ў суд з іскавай заявай, не пералічваецца і не вяртаецца. Па вылучаным асобна вядзенні дзяржаўная пошліна паўторна не аплачваецца;

1.6. у выпадках аб'яднання судом некалькіх аднародных спраў у адну справу або вылучэнні аднаго ці некалькіх аб’яднаных патрабаванняў у асобную справу (справы)

дзяржаўная пошліна, аплачаная пры звароце ў суд з іскавай заявай (заявай), паўторна не аплачваецца і пераразліку не падлягае;

1.7. пры павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў праводзіцца даплата дзяржаўнай пошліны ў адпаведнасці з павелічэннем цаны іску па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленых на дзень звароту ў суд з заявай аб павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў, а ў выпадку, прадугледжаным часткай першай пункта 7 артыкула 287 гэтага Кодэкса, – на дзень даплаты дзяржаўнай пошліны да ўстаноўленага памеру;

1.8. па сустрэчнай іскавай заяве, а таксама па іскавых заявах трэціх асоб, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні адносна прадмета спрэчкі, дзяржаўная пошліна аплачваецца на агульных падставах.

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, уступаюць у справу па сваёй ініцыятыве або прыцягнутыя да ўдзелу ў справе па ініцыятыве суда ці па хадайніцтве бакоў, дзяржаўную пошліну не аплачваюць. Пры звароце такіх асоб за здзяйсненнем іншых працэсуальных дзеянняў, за якія аплачваецца дзяржаўная пошліна, дзяржаўная пошліна аплачваецца на агульных падставах;

1.9. пры замене па судовай пастанове выбылага боку яго правапераемнікам дзяржаўную пошліну аплачвае такі правапераемнік, калі яе не аплаціў выбылы бок;

1.10. па паўторна пададзенай іскавай заяве, заяве, хадайніцтве, скарзе, якія раней былі пакінуты без разгляду, дзяржаўная пошліна аплачваецца на агульных падставах. Калі ў сувязі з пакіданнем указаных дакументаў без разгляду дзяржаўная пошліна падлягала вяртанню, але не была вернута, да дакумента, які паўторна падаецца, можа быць прыкладзены першапачатковы дакумент аб аплаце дзяржаўнай пошліны, калі не скончылася пяць гадоў з дня яе аплаты;

1.11. па іскавай заяве аб спагнанні аліментаў дзяржаўная пошліна вылічваецца ад сукупнай сумы аліментаў, а калі тэрмін, за які спагнаны аліменты, перавышае дванаццаць месяцаў – ад сумы аліментаў за дванаццаць месяцаў. Сума аліментаў вызначаецца з сярэднямесячнага заробку (даходу) адказчыка па апошнім месцы працы. У даведцы аб сярэднямесячным заробку адказчыка павінны быць адлюстраваны выплаты за кожны месяц працы за апошні год ці фактычна адпрацаваныя месяцы, калі адказчык прапрацаваў няпоўны год, з якіх утрымліваюцца аліменты, за вылікам падаходнага падатку з фізічных асоб, і звесткі аб праведзенай у адпаведнасці з заканадаўствам індэксацыі гэтых выплат на дзень разгляду справы;

1.12. па іскавых заявах аб вызваленні ад аплаты запазычанасці па аліментах, іх змяншэнні ці павелічэнні дзяржаўная пошліна вылічваецца зыходзячы з сумы, на якую змяншаюцца, павялічваюцца ці спыняюцца плацяжы, але не больш чым за адзін год;

1.13. пры выдачы копіі рашэння суда аб скасаванні шлюбу сума дзяржаўнай пошліны, якая падлягае аплаце адным ці абодвума сужэнцамі, вылічваецца судом пры вынясенні рашэння аб скасаванні шлюбу ў межах ставак, устаноўленых у дадатку 13 да гэтага Кодэкса.

Пры скасаванні шлюбу дзяржаўная пошліна аплачваецца сужэнцам-істцом у выпадку, калі іншы сужэнец:

прызнаны ва ўстаноўленым парадку адсутным без вестак;

прызнаны ва ўстаноўленым парадку недзеяздольным з прычыны душэўнай хваробы ці прыдуркаватасці;

асуджаны за ўчыненне злачынства да пазбаўлення волі на тэрмін не меншы за тры гады;

1.14. па іскавай заяве аб скасаванні шлюбу з адначасовым падзелам сумесна нажытай маёмасці сужэнцаў адначасова аплачваюцца дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў аб скасаванні шлюбу, і дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў маёмаснага характару;

1.15. па іскавай заяве аб выпатрабаванні спадчыннікам належнай яму долі маёмасці дзяржаўная пошліна вылічваецца ў наступным парадку:

калі пасведчанне аб праве на спадчыну не выдадзена – зыходзячы з агульнага кошту маёмасці і аплачваецца кожным спадчыннікам прапарцыянальна прысуджанай яму долі. Пры гэтым улічваецца сума дзяржаўнай пошліны, аплачаная істцом пры звароце ў суд за разгляд іскавай заявы;

калі пасведчанне аб праве на спадчыну выдадзена – у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 дадатку 13 да гэтага Кодэкса і размяркоўваецца паміж бакамі ў адпаведнасці з грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам;

1.16. па іскавай заяве аб прызнанні члена (былога члена) сям'і ўласніка жылога памяшкання (наймальніка, члена арганізацыі забудоўшчыкаў) асобай, якая страціла права валодання і карыстання жылым памяшканнем, па іскавай заяве аб устанаўленні парадку карыстання жылым памяшканнем, што знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці, па іскавай заяве аб устанаўленні парадку карыстання жылым памяшканнем, дадзеным члену арганізацыі забудоўшчыкаў, які не з'яўляецца ўласнікам жылога памяшкання, і аб вызначэнні памеру ўдзелу ў расходах на ўтрыманне такіх памяшканняў дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўцы, устаноўленай у падпункце 2.5 пункта 2 дадатку 13 да гэтага Кодэкса;

1.17. па іскавай заяве аб тэрміновых, бестэрміновых і пажыццёвых плацяжах ці выдачах па іншых катэгорыях спраў. У прыватнасці, у іску аб пакрыцці шкоды, прычыненай калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя ці смерцю карміцеля, цана іску для вылічэння дзяржаўнай пошліны вызначаецца зыходзячы з сукупнасці плацяжоў за тры гады, а ў іску аб змяншэнні, павелічэнні і спыненні такіх плацяжоў – сумай, на якую памяншаюцца, павялічваюцца ці спыняюцца астатнія плацяжы ці выдачы, але не больш чым за адзін год;

1.18. па іскавай заяве аб праве ўласнасці на капітальную пабудову (будынак, збудаванне), незавершаную закансерваваную капітальную пабудову, ізаляванае памяшканне, машына-месца, зямельны ўчастак, якія належаць фізічным асобам на праве ўласнасці, дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўцы, устаноўленай падпунктам 1.1 пункта 1 дадатку 13 да гэтага Кодэкса. Цана іску вызначаецца зыходзячы з ацэначнага кошту капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), незавершанай закансерваванай капітальнай пабудовы, ізаляванага памяшкання, машына-месца, якая вызначаецца тэрытарыяльнымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, а таксама з кадастравага кошту зямельнага ўчастка;

1.19. пры вылічэнні памеру дзяржаўнай пошліны па касацыйнай ці наглядной скарзе на рашэнне суда па іску аб праве ўласнасці на маёмасць, аб прызнанні права на долю ў маёмасці, аб выдзеле долі з агульнай маёмасці і аб выпатрабаванні спадчыннікамі належнай ім долі маёмасці, а таксама па іншых патрабаваннях маёмаснага характару цана іску вызначаецца зыходзячы з кошту маёмасці, якая выпатрабуецца, або яе долі на дату ўступлення ў законную сілу рашэння, якое

абскарджваецца, а па апеляцыйнай скарзе на такое рашэнне – на дзень вынясення судом рашэння, якое абскарджваецца;

1.20. па іскавай заяве аб кампенсацыі маральнай шкоды, а таксама па апеляцыйнай ці нагляднай скарзе па такой справе дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўках, устаноўленых для іскавых заяў немаёмаснага характару;

1.21. па іскавай заяве аб вызваленні маёмасці ад арышту (выключэнні з вопісу) у выпадку, калі пытанне аб вызваленні маёмасці ад арышту (выключэнні з вопісу) не звязана з выпатрабаваннем маёмасці, а таксама з прызнаннем (устанаўленнем) права ўласнасці на яго, дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўках, устаноўленых для іскавых заяў немаёмаснага характару;

1.22. па іскавай заяве, у якой аб'яднаны звязаныя паміж сабой патрабаванні аб прызнанні права ўласнасці на маёмасць і аб вызваленні маёмасці ад арышту (выключэнні з вопісу), адначасова аплачваюцца дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў маёмаснага характару, і дзяржаўная пошліна, устаноўленая для іскавых заяў немаёмаснага характару;

1.23. па іскавай заяве, якая змяшчае патрабаванні аб прызнанні здзелкі несапраўднай (выяўленні факта мізэрнасці здзелкі) і прымяненні наступстваў яе несапраўднасці, дзяржаўная пошліна аплачваецца асобна за кожнае патрабаванне, пры гэтым за патрабаванне аб прымяненні наступстваў несапраўднасці (мізэрнасці) здзелкі аплачваецца дзяржаўная пошліна ў залежнасці ад характару наступстваў, аб прымяненні якіх указана ў іскавай заяве;

1.24. па іскавай заяве аб прымусе да выканання абавязацельстваў аб перадачы маёмасці, аб устанаўленні права ўласнасці на маёмасць дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўках, устаноўленых падпунктам 1.1 пункта 1 дадатку 13 і падпунктам 1.1 пункта 1 дадатку 15 да гэтага Кодэкса;

1.25. пры абскарджанні пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні аб накладанні асноўнага і дадатковага адміністрацыйных спагнанняў дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўцы, устаноўленай для асноўнага спагнання;

1.26. дзяржаўная пошліна, ад якой істец быў вызвалены, калі іншае не прадугледжана пунктам 18 артыкула 285 гэтага Кодэкса, спаганяецца па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленай на дзень звароту істца з іскавай заявай у суд:

пры адмове ў задавальненні іску – з істца;

пры задавальненні іску – з адказчыка.

Пры гэтым калі іск задаволены часткова, то дзяржаўная пошліна спаганяецца з істца прапарцыянальна памеру задаволеных іскавых патрабаванняў, а з адказчыка – прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у задавальненні якой істцу адмоўлена.

Гэта правіла прымяняецца пры спагнанні дзяржаўнай пошліны па выніках разгляду справы незалежна ад віду вядзення, у рамках якога яна была разгледжана;

1.27. калі істец (заяўнік), вызвалены ад дзяржаўнай пошліны, пасля распачынання вядзення па справе, але да яе разгляду па сутнасці падаў заяву аб вяртанні іску (заявы, скаргі) або адмовіўся ад іску (заявы, скаргі) і адмова прынята судом, а адказчык не патрабуе разбору справы па сутнасці, дзяржаўная пошліна не спаганяецца;

1.28. у выпадку, калі цана іску выражана ў замежнай валюце, для мэт вылічэння дзяржаўнай пошліны цана іску пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе

беларускага рубля, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у адносінах да адпаведнай замежнай валюты на дзень звароту ў суд, а ў выпадку, прадугледжаным часткай першай пункта 7 артыкула 287 гэтага Кодэкса, – на дзень аплаты дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленым памеры.

2. Пры недасягненні прымірэння ў прымірыцельнай працэдуры ў судзе па ўсіх ці асобных патрабаваннях і працягу вядзення па справе дзяржаўная пошліна аплачваецца істцом у памеры, устаноўленым гэтым Кодэксам, зыходзячы з сумы заяўленых патрабаванняў, якія падлягаюць разгляду ў судзе. Пры гэтым улічваецца сума дзяржаўнай пошліны, аплачаная істцом пры звароце ў суд за разгляд іскавай заявы ў адпаведнасці з падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса.

Калі памер дзяржаўнай пошліны, аплачанай у адпаведнасці з падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса, перавышае памер дзяржаўнай пошліны, якая падлягае аплаце ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, вяртанне дзяржаўнай пошліны не праводзіцца.

У выпадку аплаты дзяржаўнай пошліны ў адпаведнасці з падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса і невыканання добраахвотна пагаднення аб прымірэнні з боку, які не выканаў пагадненне аб прымірэнні, суд спаганяе ў бюджэт суму дзяржаўнай пошліны ў памеры, устаноўленым падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса.

3. Сума дзяржаўнай пошліны, вернутая істцу ў адпаведнасці з падпунктам 4.2.5 або падпунктам 4.3 пункта 4 артыкула 292 гэтага Кодэкса, спаганяецца судом у бюджэт з боку, які не выканаў добраахвотна міравое пагадненне ці пагадненне аб прымірэнні.

### Артыкул 289. Асаблівасці аплаты дзяржаўнай пошліны пры звароце ў судовую калегію па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная пошліна за разгляд іскавых заяў і скаргаў, у тым ліку наглядных, судовай калегіяй па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аплачваецца:

фізічнымі асобамі, якія маюць пастаяннае месца жыхарства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і юрыдычнымі асобамі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі і маюць пастаяннае месца знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – у беларускіх рублях па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленых на дзень аплаты;

фізічнымі, юрыдычнымі асобамі і арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, не ўказанымі ў абзацы другім гэтага артыкула, – у замежнай валюце па стаўцы і (ці) зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленых на дзень аплаты, і па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень аплаты.

### Артыкул 290. Асаблівасці аплаты дзяржаўнай пошліны за здзяйсненне іншых юрыдычна значных дзеянняў

1. Скарга, за якую не аплачана ці не поўнасцю аплачана дзяржаўная пошліна, пададзеная ў органы пракуратуры, вяртаецца асобе, якая яе падала, у пяцідзённы тэрмін з дня яе паступлення з растлумачэннем неабходнасці аплаты або даплаты дзяржаўнай пошліны.

2. Пры абскарджанні ў орган пракуратуры пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні аб накладанні асноўнага і дадатковага

адміністрацыйных спагнанняў дзяржаўная пошліна вылічваецца па стаўцы, устаноўленай для асноўнага спагнання.

3. Пры засведчанні згод ад імя некалькіх асоб, выказаных на адным дакуменце, дзяржаўная пошліна аплачваецца як за здзяйсненне аднаго натарыяльнага дзеяння.

4. Дзяржаўная пошліна за выдачу пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь спаганяецца аднаразова па ўстаноўленай стаўцы пры правядзенні:

некалькіх культурна-відовішчных мерапрыемстваў у залежнасці ад найбольшай праектнай умяшчальнасці сцэнічнай пляцоўкі, на якой плануецца правядзенне аднаго з гэтых мерапрыемстваў, а пры яе адсутнасці – у залежнасці ад найбольшай колькасці ўваходных білетаў, якая плануецца да рэалізацыі пры правядзенні аднаго з гэтых мерапрыемстваў;

некалькіх культурна-відовішчных мерапрыемстваў на сцэнічных пляцоўках, ці ў спецыяльна не прызначаных для гэтых мэт месцах пад адкрытым небам, ці ў памяшканні пры адсутнасці праектнай умяшчальнасці і рэалізацыі ўваходных білетаў.

Пад праектнай умяшчальнасцю для мэт спагнання дзяржаўнай пошліны разумеецца агульная колькасць сядзячых месцаў, прызначаных для гледачоў.

**Артыкул 291. Дадатковыя падставы для вызвалення ад дзяржаўнай пошліны фізічных асоб**

1. Мясцовыя Саветы дэпутатаў ці па іх даручэнні выканаўчыя і распарадчыя органы (далей у гэтым артыкуле – органы мясцовага кіравання і самакіравання) маюць права поўнасцю ці часткова вызваляць ад дзяржаўнай пошліны, якая залічваецца ў мясцовы бюджэт, фізічных асоб, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, па аб'ектах абкладання дзяржаўнай пошлінай, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

2. Суд (суддзя), за выключэннем судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска) і іх суддзяў, мае права поўнасцю ці часткова вызваліць ад дзяржаўнай пошліны пры звароце ў суд фізічных асоб, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, па аб'ектах абкладання дзяржаўнай пошлінай, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

3. Пракурор, які мае права прынясення нагляднага пратэсту, мае права поўнасцю ці часткова вызваліць фізічную асобу, якая знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, ад дзяржаўнай пошліны пры звароце такой асобы ў органы пракуратуры з наглядной скаргай на судовую пастанову па справе, не звязанай з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

4. Адмова ў вызваленні ад дзяржаўнай пошліны на стадыі прыняцця судом да свайго вядзення іскавай заявы, іншай заявы або скаргі не перашкаджае рашэнню гэтага пытання органамі мясцовага кіравання і самакіравання.

Суд (суддзя), за выключэннем эканамічнага суда і яго суддзяў, пракурор пры наяўнасці ўстаноўленых заканадаўчымі актамі падстаў мае права вызваліць фізічную асобу ад дзяржаўнай пошліны пры адмове ў гэтым органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

5. Фізічная асоба не можа быць вызвалена ад дзяржаўнай пошліны, спагнанай па рашэнні суда, якое ўступіла ў законную сілу.

6. Вызваленні ад дзяржаўнай пошліны, дадзеныя фізічнай асобе ў адпаведнасці з пунктамі 1–3 гэтага артыкула на адной і той жа падставе і па тым жа аб'екце

абкладання дзяржаўнай пошлінай, не падсумоўваюцца, а прымяняецца найбольшае вызваленне з дадзеных.

**Артыкул 292. Асаблівасці вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны**

1. Вяртанне ці залік плацельшчыку дзяржаўнай пошліны праводзяцца ў адпаведнасці з артыкулам 66 гэтага Кодэкса з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтым артыкулам.

2. Вяртанне ці залік плацельшчыку поўнасцю аплачанай сумы дзяржаўнай пошліны праводзяцца, калі:

2.1. дзяржаўная пошліна не павінна была аплачвацца;

2.2. плацельшчык, які аплаціў дзяржаўную пошліну, адмаўляецца ад здзяйснення юрыдычна значнага дзеяння да яго здзяйснення ці да звароту ў адпаведны орган, які спаганяе дзяржаўную пошліну;

2.3. плацельшчыку адмоўлена ў здзяйсненні юрыдычна значнага дзеяння, якое з'яўляецца аб'ектам абкладання дзяржаўнай пошлінай;

2.4. суд адмовіў у прыняцці іскавай заявы, заявы, хадайніцтва, скаргі ці іскавая заява, заява, хадайніцтва, скарга вернуты, адменены прысуд аб судовым загадзе або суд адмовіў у вынясенні прысуду аб судовым загадзе на ўсю суму заяўленых патрабаванняў, за выключэннем выпадкаў адмовы ў сувязі з поўным выкананнем абавязацельства пасля распачынання загаднага вядзення;

2.5. вядзенне па справе спынена ў сувязі з непадведамнасцю справы суду, заява пакінута без разгляду ў сувязі з невыкананнем устаноўленага парадку дасудовага ўрэгулявання спрэчкі, заявай патрабавання, якое ў адпаведнасці з заканадаўчым актам павінна быць разгледжана ў справе аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве), падачай у суд пагаднення аб прымяненні медыяцыі, падачай заявы недзеяздольнай фізічнай асобай ці знаходжаннем на разглядзе ў іншым судзе спрэчкі паміж тымі ж асобамі аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах;

2.6. адменена ва ўстаноўленым парадку выкананае рашэнне суда ў частцы спагнання дзяржаўнай пошліны і справа не накіравана на новы разгляд у суд першай, апеляцыйнай ці касацыйнай інстанцыі;

2.7. дакументы (здзелкі), за выдачу (засведчанне) якіх аплачана дзяржаўная пошліна, прызнаны судом несапраўднымі;

2.8. справа аб адміністрацыйным правапарушэнні спынена на падставах, прадугледжаных пунктамі 1, 2, 5, 6, 9 і 10 часткі 1 артыкула 9.6 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, за выключэннем выпадку, калі асоба добраахвотна агаварыла сябе ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння.

3. Плацельшчыку вяртаецца ці залічваецца часткова заплачаная сума дзяржаўнай пошліны, калі:

3.1. дзяржаўная пошліна аплачана ў большым памеры;

3.2. у працэсе разгляду судом справы зменшана цана іску, з якой была аплачана дзяржаўная пошліна;

3.3. судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічны суд вобласці (горада Мінска) накіравалі іскавую заяву (заяву) на разгляд іншага эканамічнага суда, у якім прадугледжаны больш нізкія стаўкі дзяржаўнай пошліны.

4. Плацельшчыку вяртаецца ці залічваецца:

4.1. 90 працэнтаў аплачанай дзяржаўнай пошліны пры адмове ў выдачы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці;

4.2. 50 працэнтаў аплачанай дзяржаўнай пошліны пры:

4.2.1. неажыццяўленні або адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацый, указаных у падпунктах 1.9, 1.11–1.14 пункта 1 артыкула 284 гэтага Кодэкса, ці індывідуальнага прадпрымальніка, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты юрыдычных асоб (установчыя дагаворы – для камерцыйных арганізацый, якія дзейнічаюць толькі на падставе ўстаноўчых дагавораў), пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў;

4.2.2. адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі (перарэгістрацыі) асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тытунёвых вырабаў, алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту;

4.2.3. адмове ў выдачы пасведчання аб рэгістрацыі электроннай інтэрактыўнай гульні;

4.2.4. адкліканні заявы аб заключэнні пагаднення аб цэнаўтварэнні для мэт падаткаабкладання да прыняцця Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь рашэння па іх;

4.2.5. дасягненні прымірэння ў прымірыцельнай працэдуры ў судзе па ўсіх патрабаваннях і аплаце дзяржаўнай пошліны без уліку падпункта 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса.

У выпадку аплаты дзяржаўнай пошліны без уліку падпункта 2.2 пункта 2 артыкула 286 гэтага Кодэкса і дасягнення прымірэння ў прымірыцельнай працэдуры ў судзе па асобных патрабаваннях плацельшчыку ад 50 працэнтаў аплачанай дзяржаўнай пошліны праводзяцца вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны ў суме, прапарцыянальнай памеру патрабаванняў, па якіх дасягнута прымірэнне;

4.2.6. дасягненні прымірэння ў судзе і (ці) адмове істца ад іску, за выключэннем судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), па ўсіх патрабаваннях.

Пры спыненні судовага вядзення па частцы патрабаванняў у сувязі з зацвярджэннем міравога пагаднення бакоў і (ці) адмовай істца ад іску вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны праводзяцца прапарцыянальна памеру патрабаванняў, па якіх дасягнута прымірэнне і (ці) судом прынята адмова істца ад іску;

4.3. 25 працэнтаў аплачанай дзяржаўнай пошліны ў выпадку, калі пры разглядзе гаспадарчай (эканамічнай) спрэчкі бакамі заключана міравое пагадненне па ўсіх заяўленых патрабаваннях у цэлым. Пры заключэнні міравога пагаднення адносна часткі заяўленых патрабаванняў плацельшчыку ад 25 працэнтаў аплачанай дзяржаўнай пошліны праводзяцца вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны прапарцыянальна памеру патрабаванняў, па якіх заключана міравое пагадненне.

5. Плацельшчык дзяржаўнай пошліны мае права на залік залішне аплачанай (спагнанай) сумы дзяржаўнай пошліны ў кошт будучых плацяжоў і (ці) выканання падатковага абавязацельства па аплаце іншых падаткаў, збораў (пошлін), пеняў.

6. Вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны праводзяцца на падставе заявы плацельшчыка.

Заява аб вяртанні ці заліку залішне аплачанай сумы дзяржаўнай пошліны можа быць пададзена плацельшчыкам у падатковы орган не пазней за пяць гадоў з дня яе аплаты ці з дня прыняцця судом рашэння аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

Вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам, праводзяцца на падставе:

арыгіналаў дакументаў, якія пацвярджаюць аплату дзяржаўнай пошліны, у выпадку, калі дзяржаўная пошліна падлягае вяртанню ці заліку ў поўным памеры, а ў выпадку, калі яна падлягае вяртанню ці заліку часткова, – копій указаных арыгіналаў дакументаў;

дакументаў, у якіх указваюцца акалічнасці, якія з'яўляюцца падставай для поўнага ці частковага вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, што выдаюцца органамі, якія бяруць дзяржаўную пошліну, а ў выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, аплачанай пры звароце ў суд, – прысуду, пастановы ці даведкі суда.

У выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны плацельшчыку дакументы, указаныя ў абзацы трэцім часткі трэцяй гэтага пункта, запытваюцца падатковымі органамі ці плацельшчык мае права пры падачы заявы падаць іх самастойна.

Вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны, аплачанай плацельшчыкамі за юрыдычна значныя дзеянні пры дапамозе сістэмы АРІП, ажыццяўляюцца на падставе дакументаў, якія выдаюцца органамі, што спаганяюць дзяржаўную пошліну, у якіх указваюцца дата аплаты дзяржаўнай пошліны і акалічнасці, якія з'яўляюцца падставай для поўнага ці частковага вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, а ў выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, аплачанай пры звароце ў суд, – на падставе прысуду, пастановы ці даведкі суда, у якіх указваецца дата аплаты дзяржаўнай пошліны.

У выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, аплачанай пры дапамозе сістэмы АРІП, плацельшчыку – фізічнай асобе дакументы, указаныя ў частцы пятай гэтага пункта, запытваюцца падатковымі органамі ці фізічная асоба мае права пры падачы заявы падаць іх самастойна.

7. Вяртанне ці залік дзяржаўнай пошліны, якая паступіла ў рэспубліканскі бюджэт ад плацельшчыкаў, якія не з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, праводзяцца інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па горадзе Мінску ў той валюце, у якой дзяржаўная пошліна была аплачана, на падставе:

заявы плацельшчыка;

дакументаў, у якіх указваюцца акалічнасці, што з'яўляюцца падставай для поўнага ці частковага вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, якія выдаюцца органамі, што спаганяюць дзяржаўную пошліну, а ў выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны, аплачанай пры звароце ў суд, – прысуду, пастановы ці даведкі суда.

У выпадках вяртання ці заліку дзяржаўнай пошліны плацельшчыку дакументы, указаныя ў абзацы трэцім часткі першай гэтага пункта, запытваюцца інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па горадзе Мінску або плацельшчык мае права пры падачы заявы падаць іх самастойна.

8. Залішне аплачаная (спагнаная) дзяржаўная пошліна, калі яе аплата (спагнанне) праведзена ў выніку няправільнага прымянення органам, які спаганяе дзяржаўную пошліну, нормаў заканадаўства або дапушчанай ім арыфметычнай памылкі, падлягае вяртанню ці заліку з налічэннем на яе працэнтаў па стаўцы, роўнай 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, якая дзейнічала на дзень вяртання ці заліку плацельшчыку гэтай сумы, за кожны дзень пачынаючы з дня, які ідзе следам за днём аплаты дзяржаўнай пошліны, па дзень прыняцця рашэння аб вяртанні ці заліку плацельшчыку залішне аплачанай (спагнанай) сумы дзяржаўнай пошліны.

**Артыкул 293. Уключэнне дзяржаўнай пошліны ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб. Адказнасць за правільнасць спагнання дзяржаўнай пошліны**

1. Сумы дзяржаўнай пошліны ўключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі — у расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

2. Адказнасць за правільнасць спагнання дзяржаўнай пошліны нясуць службовыя асобы органаў, якія спаганяюць дзяржаўную пошліну.

## ГЛАВА 27
## ПАТЭНТНЫЯ ПОШЛІНЫ

**Артыкул 294. Плацельшчыкі патэнтных пошлін**

Плацельшчыкамі патэнтных пошлін (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, якія ва ўстаноўленым парадку звяртаюцца ў дзяржаўную ўстанову «Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці» (далей у гэтай главе і дадатку 23 да гэтага Кодэкса – Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці) за здзяйсненнем юрыдычна значных дзеянняў.

**Артыкул 295. Аб'екты абкладання патэнтнымі пошлінамі і стаўкі патэнтных пошлін**

Аб'ектамі абкладання патэнтнымі пошлінамі прызнаюцца юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з:

1. прававой аховай вынаходстваў, у тым ліку:

1.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства;

1.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка;

1.3. аднаўленне права канвенцыйнага прыярытэту па заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства па хадайніцтве заяўніка;

1.4. падача еўразійскай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, праверка яе на адпаведнасць патрабаванням экспертызы па фармальных прыкметах і перасылка ў Еўразійскае патэнтнае ведамства;

1.5. публікацыя звестак аб заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства, якая прайшла папярэднюю экспертызу са станоўчым вынікам, да сканчэння васямнаццаці месяцаў з даты паступлення заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства;

1.6. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства;

1.7. унясенне змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства па ініцыятыве заяўніка ці па запыце экспертызы, якія прадугледжваюць уключэнне ў формулу пунктаў, што адсутнічаюць у першапачаткова пададзенай і прынятай да разгляду формуле, уключэнне пунктаў у формулу пасля падачы хадайніцтва аб правядзенні патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства;

1.8. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка, за выключэннем выпадкаў, указаных у падпункце 1.7 гэтага пункта;

1.9. пераўтварэнне заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства ў заяўку на выдачу патэнта на карысную мадэль;

1.10. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

1.11. правядзенне паўторнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства;

1.12. рэгістрацыя вынаходства ў Дзяржаўным рэестры вынаходстваў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на вынаходства;

1.13. падтрыманне ў сіле патэнта на вынаходства за кожны год яго дзеяння пачынаючы з трэцяга года з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці;

1.14. падтрыманне ў сіле еўразійскага патэнта на вынаходства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.15. перасылка заявачных дакументаў міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі, падпісаным у г. Вашынгтоне 19 чэрвеня 1970 года (далей у гэтай главе і дадатку 23 да гэтага Кодэкса – Дагавор аб патэнтнай кааперацыі), у Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці;

1.16. нясвоечасовае ўступленне на нацыянальную стадыю па віне заяўніка міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі;

1.17. перавод на нацыянальную стадыю міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі;

1.18. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на вынаходства;

1.19. аднаўленне дзеяння патэнта на вынаходства;

2. прававой ахоўвай карысных мадэляў, у тым ліку:

2.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль;

2.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка;

2.3. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка;

2.4. пераўтварэнне заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль у заяўку на выдачу патэнта на вынаходства;

2.5. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на карысную мадэль за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

2.6. рэгістрацыя карыснай мадэлі ў Дзяржаўным рэестры карысных мадэляў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на карысную мадэль;

2.7. падтрыманне ў сіле патэнта на карысную мадэль за кожны год яго дзеяння пачынаючы з першага года з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці;

2.8. нясвоечасовае ўступленне на нацыянальную стадыю па віне заяўніка міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі;

2.9. перавод на нацыянальную стадыю міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі;

2.10. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на карысную мадэль;

2.11. аднаўленне дзеяння патэнта на карысную мадэль;

2.12. правядзенне праверкі карыснай мадэлі на адпаведнасць умовам патэнтаздольнасці;

3. прававой аховай прамысловых узораў, у тым ліку:

3.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор;

3.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка;

3.3. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка;

3.4. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на прамысловы ўзор за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

3.5. рэгістрацыя прамысловага ўзору ў Дзяржаўным рэестры прамысловых узораў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на прамысловы ўзор;

3.6. падтрыманне ў сіле патэнта на прамысловы ўзор за кожны год яго дзеяння пачынаючы з першага года з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці;

3.7. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на прамысловы ўзор;

3.8. аднаўленне дзеяння патэнта на прамысловы ўзор;

4. прававой аховай гатункаў раслін, у тым ліку:

4.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны;

4.2. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка;

4.3. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на гатунак расліны за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

4.4. змяненне наймення гатунку расліны па ініцыятыве заяўніка;

4.5. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны без прад’яўлення заяўнікам вынікаў выпрабаванняў гатунку расліны;

4.6. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны з прад’яўленнем заяўнікам вынікаў выпрабаванняў гатунку расліны;

4.7. рэгістрацыя гатунку расліны ў Дзяржаўным рэестры гатункаў ахоўных раслін Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на гатунак расліны і пасведчання селекцыянера;

4.8. падтрыманне ў сіле патэнта на гатунак расліны;

5. прававой аховай таварных знакаў і знакаў абслугоўвання (далей у гэтай главе і дадатку 23 да гэтага Кодэкса – таварны знак), у тым ліку:

5.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака;

5.2. правядзенне экспертызы заяўленага знака;

5.3. падача заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака ў адпаведнасці з Мадрыдскім пагадненнем аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў ад 14 красавіка 1891 года (далей у гэтай главе і дадатку 23 да гэтага Кодэкса – Мадрыдскае пагадненне) і Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў ад 28 чэрвеня 1989 года (далей у гэтай главе і дадатку 23 да гэтага Кодэкса – Пратакол да Мадрыдскага пагаднення), праверка і перасылка гэтай заяўкі ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці;

5.4. падача заявы аб наступным указанні, праверка і перасылка наступнага ўказання ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці ў адпаведнасці з Мадрыдскім пагадненнем і Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення;

5.5. падача заявы аб замене нацыянальнай рэгістрацыі таварнага знака міжнароднай рэгістрацыяй таварнага знака (артыкул 4bis Мадрыдскага пагаднення і Пратакола да Мадрыдскага пагаднення);

5.6. хадайніцтва аб рэгістрацыі таварнага знака ў адпаведнасці з Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення;

5.7. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага знака, зарэгістраванага ў адпаведнасці з Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення;

5.8. падача заявы аб унясенні па ініцыятыве заяўніка змяненняў у матэрыялы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака;

5.9. падача заявы аб вылучэнні заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака;

5.10. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт папярэдняй экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю таварнага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

5.11. падача заявы аб пераўтварэнні заяўкі на рэгістрацыю калектыўнага знака ў заяўку на рэгістрацыю таварнага знака;

5.12. правядзенне паўторнай экспертызы заяўленага знака;

5.13. прадаўжэнне тэрміну падачы хадайніцтва аб правядзенні паўторнай экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

5.14. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

5.15. рэгістрацыя таварнага знака ў Дзяржаўным рэестры таварных знакаў і знакаў абслугоўвання Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на таварны знак;

5.16. рэгістрацыя калектыўнага знака ў Дзяржаўным рэестры таварных знакаў і знакаў абслугоўвання Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на калектыўны знак;

5.17. падача заявы аб пераўтварэнні калектыўнага знака ў таварны знак адной з асоб, якія мелі права на яго выкарыстанне;

5.18. падача заявы аб раздзяленні рэгістрацыі таварнага знака шляхам размеркавання тавараў, у адносінах да якіх зарэгістраваны таварны знак;

5.19. падача заявы аб раздзяленні міжнароднай рэгістрацыі таварнага знака ў адпаведнасці з Правілам 27bis Агульнай інструкцыі да Мадрыдскага пагаднення аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў і Пратакола да гэтага пагаднення, праверка і перасылка гэтай заявы ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці;

5.20. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага знака;

5.21. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі калектыўнага знака;

5.22. даванне шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння скончанага тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага (калектыўнага) знака;

5.23. падача заявы аб прызнанні таварнага знака ці знака, які выкарыстоўваецца ў якасці таварнага знака, агульнавядомым у Рэспубліцы Беларусь таварным знакам;

5.24. унясенне звестак, якія датычацца агульнавядомага ў Рэспубліцы Беларусь таварнага знака, у пералік агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў і выдача пасведчання на агульнавядомы ў Рэспубліцы Беларусь таварны знак;

5.25. падача заявы аб спыненні прававой аховы агульнавядомага ў Рэспубліцы Беларусь таварнага знака;

6. прававой аховай найменняў месцаў паходжання тавараў і (ці) даваннем права карыстання найменнямі месцаў паходжання тавараў, у тым ліку:

6.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўкі на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару;

6.2. падача заявы аб унясенні па ініцыятыве заяўніка змяненняў у матэрыялы заяўкі на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўкі на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару;

6.3. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт папярэдняй экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўцы на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

6.4. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

6.5. рэгістрацыя наймення месца паходжання тавару ў Дзяржаўным рэестры найменняў месцаў паходжання тавараў Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару;

6.6. прадаўжэнне тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару;

6.7. даванне шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння скончанага тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару;

7. прававой аховай тапалогій інтэгральных мікрасхем, у тым ліку:

7.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на рэгістрацыю тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы;

7.2. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы за кожны месяц прадаўжэння, аб якім хадайнічаюць;

7.3. рэгістрацыя тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы ў Дзяржаўным рэестры тапалогій інтэгральных мікрасхем Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы;

8. іншымі юрыдычна значнымі дзеяннямі ў адносінах да аб'ектаў права прамысловай уласнасці, у тым ліку:

8.1. унясенне змяненняў, выпраўленняў у дзяржаўныя рэестры аб'ектаў права прамысловай уласнасці, пералік агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў, Дзяржаўны рэестр ліцэнзійных дагавораў, дагавораў уступкі і дагавораў закладу правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны рэестр дагавораў комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) Рэспублікі Беларусь, ахоўныя дакументы на аб'екты права прамысловай уласнасці (патэнты, пасведчанні) і пасведчанні селекцыянера;

8.2. выдача дублікатаў ахоўных дакументаў на аб'екты права прамысловай уласнасці (патэнты, пасведчанні) і пасведчанняў селекцыянера;

8.3. разгляд заявы аб рэгістрацыі ліцэнзійнага дагавора, дагавора ўступкі выключнага права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор, гатунак расліны, таварны знак, тапалогію інтэгральнай мікрасхемы, дагавора аб закладзе маёмасных правоў, якія засведчваюцца пасведчаннем на таварны знак;

8.4. разгляд заявы аб рэгістрацыі дагавора комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу);

8.5. разгляд заявы аб рэгістрацыі змяненняў у ліцэнзійны дагавор, дагавор уступкі выключнага права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор,

гатунак расліны, таварны знак, тапалогію інтэгральнай мікрасхемы, дагавор аб закладзе маёмасных правоў, якія засведчваюцца пасведчаннем на таварны знак, дагавор комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу), скасаванні дагавора комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу);

8.6. падача для афіцыйнага апублікавання заявы аб даванні любой асобе права на выкарыстанне аб'екта права прамысловай уласнасці (адкрытая ліцэнзія) ці спыненні дзеяння адкрытай ліцэнзіі;

8.7. падача ў Апеляцыйны савет пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці скаргаў, пярэчанняў і заяў;

8.8. даванне па хадайніцтве выпісак з дзяржаўных рэестраў аб'ектаў права прамысловай уласнасці, пераліку агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў, Дзяржаўнага рэестра ліцэнзійных дагавораў, дагавораў уступкі і дагавораў закладу правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага рэестра дагавораў комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) Рэспублікі Беларусь;

8.9. падача хадайніцтва аб аднаўленні прапушчаных заяўнікам тэрмінаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

9. дзейнасцю патэнтных паверaных, у тым ліку:

9.1. падача заявы аб атэстацыі кандыдата ў патэнтныя паверaныя;

9.2. правядзенне кваліфікацыйнага экзамену;

9.3. паўторнае правядзенне кваліфікацыйнага экзамену ці яго часткі;

9.4. рэгістрацыя патэнтнага паверaнага і выдача пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверaнага;

9.5. падача заявы аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверaнага;

9.6. падача заявы аб унясенні змяненняў, выпраўленняў у Дзяржаўны рэестр патэнтных паверaных Рэспублікі Беларусь;

9.7. выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверaнага;

9.8. даванне па хадайніцтве выпісак з Дзяржаўнага рэестра патэнтных паверaных Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 296. Вызваленне ад патэнтных пошлін**

1. Вызваляюцца ад патэнтных пошлін (за выключэннем юрыдычна значных дзеянняў, за здзяйсненне якіх спаганяецца патэнтная пошліна ў адпаведнасці з пунктамі 5, 6, падпунктамі 8.1–8.5, 8.7–8.9 пункта 8 і пунктам 9 дадатку 23 да гэтага Кодэкса) плацельшчыкі – фізічныя асобы:

Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, Героі Беларусі, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, Айчыны;

ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, члены сямей загінулых (памерлых) пры выкананні воінскіх (службовых) абавязкаў, указаныя ў статьях 2–4 і 22 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах»;

удзельнікі ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

інваліды I групы.

Льготы па патэнтных пошлінах, прадугледжаныя гэтым пунктам, даюцца толькі асобам, якія маюць права на такія льготы, пры ўмове, што яны з'яўляюцца адзіным аўтарам, які просіць патэнт (пасведчанне) на сваё імя, або адзіным

патэнтаўладальнікам (уладальнікам выключнага права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы), які з'яўляецца адзіным аўтарам. У выпадку, калі патэнт (пасведчанне) на сваё імя просіцца некалькімі асобамі або некалькі асоб з'яўляюцца патэнтаўладальнікамі (уладальнікамі выключнага права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы), указаныя льготы даюцца пры ўмове, што патэнт (пасведчанне) на сваё імя просіцца ўсімі аўтарамі або ўсе аўтары з'яўляюцца патэнтаўладальнікамі (уладальнікамі выключнага права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы) і кожны з іх мае права на аналагічныя льготы.

2. Вызваляюцца ад патэнтных пошлін:

2.1. рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, суды, праваахоўныя, падатковыя, мытныя органы – за даванне па хадайніцтве выпісак з дзяржаўных рэестраў аб'ектаў права прамысловай уласнасці, пераліку агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў, Дзяржаўнага рэестра ліцэнзійных дагавораў, дагавораў уступкі і дагавораў закладу правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага рэестра дагавораў комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) Рэспублікі Беларусь, а таксама выпісак з Дзяржаўнага рэестра патэнтных паверанных Рэспублікі Беларусь;

2.2. плацельшчыкі – за здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў, звязаных з выпраўленнем памылак, дапушчаных Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці.

Палажэнні часткі першай гэтага падпункта не прымяняюцца ў выпадку, калі такія памылкі дапушчаны на падставе няпоўнай ці недакладнай інфармацыі, пададзенай плацельшчыкам;

2.3. плацельшчыкі – за падтрыманне ў сіле на працягу першых пяці гадоў дзеяння патэнта на вынаходства, якое з'яўляецца вынікам навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці і створана поўнасцю ці часткова за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў, у тым ліку дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, а таксама дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, за выключэннем плацельшчыкаў, выключнае права на вынаходства якім перайшло па дагаворы.

Для атрымання льготы, прадугледжанай часткай першай гэтага падпункта, у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці падаецца пісьмо з подпісам кіраўніка арганізацыі, што з'яўляецца дзяржаўным заказчыкам ці выканаўцам навукова-даследчай працы, якое змяшчае інфармацыю, якая пацвярджае, што вынаходства з'яўляецца вынікам навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці і створана поўнасцю ці часткова за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў, у тым ліку дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, а таксама дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

3. Пры наяўнасці ў плацельшчыка права на выкарыстанне адначасова некалькіх ільгот па патэнтных пошлінах, устаноўленых гэтым артыкулам, у адносінах да аднаго і таго ж аб'екта абкладання патэнтнымі пошлінамі плацельшчык мае права выкарыстаць толькі адну з іх па сваім выбары.

**Артыкул 297. Стаўкі патэнтных пошлін**

1. Стаўкі патэнтных пошлін устанаўліваюцца ў памерах згодна з дадаткам 23 да гэтага Кодэкса.

2. Плацельшчыкі – фізічныя асобы пры выкананні ўмовы, прадугледжанай часткай другой пункта 1 артыкула 296 гэтага Кодэкса, аплачваюць 25 працэнтаў ад устаноўленага памеру патэнтных пошлін (за выключэннем юрыдычна значных дзеянняў, за здзяйсненне якіх спаганяецца патэнтная пошліна ў адпаведнасці з

падпунктамі 1.4 і 1.15 пункта 1, падпунктам 2.12 пункта 2, пунктамі 5, 6, падпунктамі 8.1–8.5, 8.7–8.9 пункта 8 і пунктам 9 дадатку 23 да гэтага Кодэкса).

3. Патэнтныя пошліны за здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў, прадугледжаных падпунктамі 1.1, 1.5–1.13, 1.17–1.19 пункта 1 дадатку 23 да гэтага Кодэкса, аплачваюцца арганізацыямі, акрэдытаванымі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у якасці навуковых, у памеры 25 працэнтаў ад устаноўленага памеру патэнтных пошлін.

4. Патэнтныя пошліны аплачваюцца ў памеры 50 працэнтаў ад устаноўленага памеру патэнтных пошлін:

за правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства пры наяўнасці ў гэтай заяўцы справаздачы аб пошуку ці заключэння экспертызы, падрыхтаваных адным з міжнародных органаў у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі, або справаздачы аб пошуку, падрыхтаванай міжнародным пошукавым органам па першай заяўцы пры наяўнасці ўказання на просьбу прыярытэту па даце яе падачы;

пры апублікаванні заявы аб адкрытай ліцэнзіі пачынаючы з года, які ідзе следам за годам яе публікацыі.

5. Патэнтныя пошліны, стаўкі якіх прадугледжаны падпунктамі 1.1 і 1.4 пункта 1, падпунктам 2.1 пункта 2, падпунктам 3.1 пункта 3, падпунктам 4.1 пункта 4, падпунктам 5.1 пункта 5, падпунктам 6.1 пункта 6 і падпунктам 7.1 пункта 7 дадатку 23 да гэтага Кодэкса, аплачваюцца ў памеры 85 працэнтаў ад устаноўленага памеру патэнтных пошлін у выпадку падачы заяўкі праз сістэму электроннай падачы заявак на выдачу ахоўных дакументаў на аб'екты права прамысловай уласнасці.

6. Прадугледжаныя гэтым артыкулам стаўкі патэнтных пошлін не падсумоўваюцца.

**Артыкул 298. Парадак вылічэння і тэрміны аплаты патэнтных пошлін**

1. Патэнтныя пошліны аплачваюць плацельшчыкі і (ці) іншыя асобы па іх даручэнні:

рэзідэнты Рэспублікі Беларусь – у беларускіх рублях па стаўках, устаноўленых у базавых велічынях на дату ажыццяўлення плацяжу;

асобы, якія не з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, – у замежнай валюце (долары ЗША, еўра, швейцарскія франкі, расійскія рублі), калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, у суме, вызначанай па стаўках, устаноўленых у базавых велічынях на дату ажыццяўлення плацяжу, з выкарыстаннем афіцыйных курсаў беларускага рубля ў адносінах да адпаведных замежных валют, устаноўленых Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень аплаты.

У выпадку, калі плацельшчыкамі з'яўляюцца адначасова плацельшчыкі – рэзідэнты Рэспублікі Беларусь і плацельшчыкі, якія не з'яўляюцца падатковымі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, патэнтная пошліна аплачваецца ў роўных долях у адпаведнасці з парадкам, устаноўленым часткай першай гэтага пункта.

2. Патэнтавыя пошліны выплачваюцца шляхам пералічэння грашовых сум на бягучы (разліковы) рахунак Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці з наступным залічэннем іх у рэспубліканскі бюджэт.

3. Дакументам, які пацвярджае дзень і факт аплаты патэнтнай пошліны, з'яўляецца плацежная інструкцыя (яе копія) з адзнакай банка аб выкананні. У

выпадку падачы заяўкі праз сістэму электроннай падачы заявак на выдачу ахоўных дакументаў на аб'екты права прамысловай уласнасці такім дакументам з'яўляецца плацежная інструкцыя (яе копія) з адзнакай банка аб выкананні ў выглядзе электроннага дакумента.

Дакумент, які пацвярджае аплату патэнтнай пошліны, падаецца ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці пры звароце за здзяйсненнем юрыдычна значнага дзеяння, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўствам.

Дакументы, якія пацвярджаюць аплату патэнтнай пошліны, павінны адносіцца толькі да аднаго юрыдычна значнага дзеяння, за якое праводзіцца гэта аплата, змяшчаць назву гэтага юрыдычна значнага дзеяння, рэгістрацыйны нумар заяўкі (ахоўнага дакумента). У выпадку адсутнасці рэгістрацыйнага нумара заяўкі (ахоўнага дакумента) дадаткова ўказваюцца назва вынаходства, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору, тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы, найменне гатунку расліны, сціслае апісанне таварнага знака ці заяўленае найменне месца паходжання тавару, а таксама звесткі аб заяўніку.

4. Даплата патэнтнай пошліны праводзіцца ў выпадку падачы заяўкі ці іншых дакументаў у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці пасля сканчэння двухмесячнага тэрміну з даты аплаты патэнтнай пошліны ў сувязі з павелічэннем памеру базавай велічыні ва ўказаны перыяд.

Калі памер аплачанай патэнтнай пошліны не адпавядае ўстаноўленаму, даплата гэтай пошліны можа быць праведзена ў двухмесячны тэрмін з дня паведамлення аб неабходнасці такой даплаты.

5. Аплачаная патэнтная пошліна звароту не падлягае, за выключэннем выпадкаў, калі аплата была праведзена ў памеры, які перавышае ўстаноўлены, ці калі юрыдычна значнае дзеянне, прадугледжанае артыкулам 295 гэтага Кодэкса, за якое была аплачана пошліна, не здзяйснялася.

У выпадках, указаных у частцы першай гэтага пункта, па заяве плацельшчыка (асобы, якая дзейнічае па яе даручэнні, у тым ліку патэнтнага павераната), пададзенай у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці да сканчэння пяці гадоў з дня аплаты патэнтнай пошліны, сродкі, якія паступілі пры аплаце патэнтнай пошліны, ці залішне аплачаная сума патэнтнай пошліны вяртаюцца Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці або залічваюцца ім у кошт аплаты плацельшчыкам іншых патэнтных пошлін. Адпаведнасць сродкаў, якія паступілі пры аплаце патэнтнай пошліны за юрыдычна значнае дзеянне, што не здзяйснялася, ці залішне заплачанай сумы патэнтнай пошліны ўстаноўленаму памеру вызначаецца на дату паступлення заявы аб заліку.

6. Аплата патэнтных пошлін ажыццяўляецца па аб'ектах абкладання, указаных у:

6.1. падпунктах 1.1 і 1.4 пункта 1, падпункце 2.1 пункта 2, падпункце 3.1 пункта 3 і падпункце 6.1 пункта 6 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заяўкі ці на працягу двух месяцаў з даты яе паступлення ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці;

6.2. падпункце 1.2 пункта 1, падпункце 2.2 пункта 2 і падпункце 3.2 пункта 3 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заяўкі на выдачу патэнта з просьбай канвенцыйнага прыярытэту ці на працягу двух месяцаў з даты паступлення ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці заяўкі на выдачу патэнта з просьбай канвенцыйнага прыярытэту;

6.3. падпункце 1.3 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб аднаўленні права канвенцыйнага прыярытэту;

6.4. падпункце 1.5 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб публікацыі звестак;

6.5. падпункце 1.6 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб правядзенні патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта.

Пры аплаце патэнтнай пошліны ў памеры меншым за ўстаноўлены, і непадачы дакумента, які пацвярджае даплату патэнтнай пошліны, хадайніцтва аб правядзенні патэнтнай экспертызы заяўкі, якая змяшчае адзін пункт формулы вынаходства, лічыцца непаданым, а экспертыза заяўкі, якая ўключае некалькі пунктаў формулы вынаходства, праводзіцца ў адносінах да тых пунктаў формулы, якія выбраны заяўнікам або пры адсутнасці такога выбару ўказаны першымі, пры ўмове іх аплаты;

6.6. падпункце 1.7 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы дадатковых матэрыялаў ці на працягу двух месяцаў з даты апавяшчэння заяўніка;

6.7. падпункце 1.9 пункта 1, падпункце 2.4 пункта 2 і падпункце 5.11 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва (заявы) аб пераўтварэнні заяўкі;

6.8. падпункце 1.10 пункта 1, падпункце 2.5 пункта 2, падпункце 3.4 пункта 3, падпункце 4.3 пункта 4 і падпункце 7.2 пункта 7 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб прадаўжэнні тэрміну адказу на запыт экспертызы;

6.9. падпункце 1.11 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб правядзенні паўторнай экспертызы;

6.10. падпункце 1.12 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трох месяцаў з даты накіравання заяўніку рашэння аб выдачы патэнта. Патэнтная пошліна можа быць аплачана пасля сканчэння ўказанага тэрміну, але не пазней за шэсць месяцаў з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў;

6.11. падпунктах 1.13 і 1.14 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – за кожны год дзеяння патэнта пачынаючы з трэцяга года з даты падачы заяўкі ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці.

Адначасова з аплатай патэнтнай пошліны за рэгістрацыю вынаходства і выдачу патэнта павінна быць аплачана патэнтная пошліна за падтрыманне патэнта ў сіле за кожны мінулы (які аплачваецца) год дзеяння патэнта і за чарговы (які пачаўся на дату аплаты) год дзеяння патэнта.

Патэнтная пошліна за адпаведныя гады падтрымання патэнта ў сіле можа быць аплачана пасля сканчэння ўказанага ў падпункце 6.10 гэтага пункта трохмесячнага тэрміну, але не пазней за шэсць месяцаў з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў. Патэнтная пошліна за кожны наступны год дзеяння патэнта аплачваецца на працягу бягучага аплачанага года дзеяння гэтага патэнта. Патэнтная пошліна за любы год дзеяння патэнта можа быць аплачана на працягу шасці месяцаў з дня надыходу чарговага неаплачанага года дзеяння патэнта. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў;

6.12. падпункце 1.15 пункта 1 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу аднаго месяца з даты атрымання міжнароднай заяўкі;

6.13. падпункце 1.16 пункта 1 і падпункце 2.8 пункта 2 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб аднаўленні права на міжнародную заяўку;

6.14. падпункце 1.17 пункта 1 і падпункце 2.9 пункта 2 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трыццаці аднаго месяца з даты прыярытэту міжнароднай заяўкі ці не пазней за два месяцы з даты сканчэння гэтага тэрміну;

6.15. падпункце 1.18 пункта 1, падпункце 2.10 пункта 2 і падпункце 3.7 пункта 3 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння патэнта;

6.16. падпункце 1.19 пункта 1, падпункце 2.11 пункта 2 і падпункце 3.8 пункта 3 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб аднаўленні дзеяння патэнта;

6.17. падпункце 2.12 пункта 2 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб праверцы карыснай мадэлі на адпаведнасць умовам патэнтаздольнасці;

6.18. падпункце 1.8 пункта 1, падпункце 2.3 пункта 2, падпункце 3.3 пункта 3, падпункце 4.2 пункта 4, падпункце 5.8 пункта 5, падпункце 6.2 пункта 6 і падпункце 8.1 пункта 8 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва (заявы) аб унясенні змяненняў у матэрыялы заяўкі, дзяржаўныя рэестры аб'ектаў права прамысловай уласнасці і ахоўныя дакументы (патэнты, пасведчанні) і пасведчанні селекцыянера;

6.19. падпункце 2.6 пункта 2, падпункце 3.5 пункта 3, падпункце 4.7 пункта 4 і падпункце 7.3 пункта 7 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трох месяцаў з даты накіравання заяўніку рашэння аб выдачы патэнта (пасведчання).

Патэнтная пошліна можа быць аплачана пасля сканчэння ўказанага тэрміну, але не пазней за шэсць месяцаў з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў.

Аплата патэнтнай пошліны за падтрыманне патэнта ў сіле за кожны мінулы год дзеяння патэнта (які аплачваецца) і чарговы (які пачаўся на дату прыняцця рашэння аб выдачы патэнта) год дзеяння патэнта павінна быць праведзена адначасова з аплатай патэнтнай пошліны за выдачу патэнта;

6.20. падпункце 2.7 пункта 2, падпункце 3.6 пункта 3 і падпункце 4.8 пункта 4 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – за першы год дзеяння патэнта адначасова з аплатай патэнтнай пошліны за рэгістрацыю і выдачу патэнта на працягу трох месяцаў з даты накіравання заяўніку рашэння аб выдачы патэнта. Патэнтная пошліна можа быць аплачана пасля сканчэння гэтага тэрміну, але не пазней за шэсць месяцаў з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў.

Патэнтная пошліна за кожны наступны год дзеяння патэнта можа быць аплачана на працягу бягучага аплачанага года дзеяння гэтага патэнта. Патэнтная пошліна за любы год дзеяння патэнта можа быць аплачана на працягу шасці месяцаў з дня надыходу чарговага неаплачанага года дзеяння патэнта. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў;

6.21. падпункце 4.1 пункта 4, падпункце 5.3 пункта 5 і падпункце 7.1 пункта 7 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заяўкі;

6.22. падпункце 4.4 пункта 4 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб змяненні наймення гатунку расліны да прыняцця рашэння аб выдачы патэнта;

6.23. падпункце 4.5 пункта 4 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – пасля атрымання вынікаў папярэдняй экспертызы;

6.24. падпункце 4.6 пункта 4 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – пасля атрымання вынікаў папярэдняй экспертызы і да падачы вынікаў выпрабаванняў;

6.25. падпунктах 5.1 і 5.2 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заяўкі або на працягу двух месяцаў з даты паступлення заяўкі ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці;

6.26. падпункце 5.4 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб наступным указанні;

6.27. падпункце 5.5 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб замене нацыянальнай рэгістрацыі;

6.28. падпунктах 5.6 і 5.7 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – у парадку і тэрміны, вызначаныя Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення;

6.29. падпункце 5.9 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб вылучэнні заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака;

6.30. падпунктах 5.10 і 5.14 пункта 5, падпунктах 6.3 і 6.4 пункта 6 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб прадаўжэнні тэрміну адказу на запыт экспертызы;

6.31. падпункце 5.12 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб правядзенні паўторнай экспертызы;

6.32. падпункце 5.13 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб прадаўжэнні тэрміну падачы хадайніцтва аб правядзенні паўторнай экспертызы;

6.33. падпунктах 5.15 і 5.16 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трох месяцаў з даты накіравання заяўніку рашэння экспертызы аб рэгістрацыі таварнага (калектыўнага) знака. Патэнтная пошліна можа быць аплачана пасля сканчэння гэтага тэрміну, але не пазней за тры месяцы з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў;

6.34. падпункце 5.17 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб пераўтварэнні калектыўнага знака ў таварны знак;

6.35. падпункце 5.18 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб раздзяленні рэгістрацыі таварнага знака шляхам размеркавання тавараў, у адносінах да якіх зарэгістраваны таварны знак;

6.36. падпункце 5.19 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб раздзяленні міжнароднай рэгістрацыі таварнага знака ў адпаведнасці з Правілам 27bis Агульнай інструкцыі да Мадрыдскага пагаднення аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў і Пратакола да гэтага пагаднення;

6.37. падпунктах 5.20 і 5.21 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага (калектыўнага) знака;

6.38. падпункце 5.22 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб даванні шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння скончанага тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага (калектыўнага) знака на працягу шасці месяцаў з даты сканчэння апошняга года дзеяння рэгістрацыі;

6.39. падпункце 5.23 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб прызнанні таварнага знака ці знака, які выкарыстоўваецца ў якасці таварнага знака, агульнавядомым у Рэспубліцы Беларусь таварным знакам;

6.40. падпункце 5.24 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трох месяцаў з даты прыняцця рашэння аб прызнанні таварнага знака ці знака, які выкарыстоўваецца ў якасці таварнага знака, агульнавядомым у Рэспубліцы Беларусь таварным знакам;

6.41. падпункце 5.25 пункта 5 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб спыненні прававой аховы агульнавядомага ў Рэспубліцы Беларусь таварнага знака;

6.42. падпункце 6.5 пункта 6 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – на працягу трох месяцаў з даты накіравання заяўніку рашэння экспертызы аб рэгістрацыі наймення месца паходжання тавару і даванні права карыстання ім, аб даванні права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару. Патэнтная пошліна можа быць аплачана пасля сканчэння гэтага тэрміну, але не пазней за тры месяцы з дня яго сканчэння. У гэтым выпадку стаўка патэнтнай пошліны павялічваецца на 50 працэнтаў;

6.43. падпункце 6.6 пункта 6 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы заявы аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару на працягу апошняга года дзеяння пасведчання;

6.44. падпункце 6.7 пункта 6 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб даванні шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння скончанага тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару на працягу шасці месяцаў з даты сканчэння апошняга года дзеяння пасведчання;

6.45. падпунктах 8.2–8.6 пункта 8 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы адпаведнай заявы;

6.46. падпункце 8.7 пункта 8 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы ў Апеляцыйны савет пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці скаргаў, пярэчанняў і заяў;

6.47. падпункце 8.8 пункта 8 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб даванні выпіскі;

6.48. падпункце 8.9 пункта 8 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну;

6.49. падпунктах 9.1, 9.4–9.8 пункта 9 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да падачы адпаведных заяў, хадайніцтваў, звязаных з дзейнасцю патэнтных паверaных;

6.50. падпункце 9.2 пункта 9 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да правядзення кваліфікацыйнага экзамену;

6.51. падпункце 9.3 пункта 9 артыкула 295 гэтага Кодэкса, – да паўторнага правядзення кваліфікацыйнага экзамену ці яго часткі.

**Артыкул 299. Уключэнне патэнтных пошлін у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы патэнтных пошлін уключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальныя прадпрымальнікі — у расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## ГЛАВА 28
## УТЫЛІЗАЦЫЙНЫ ЗБОР

**Артыкул 300. Плацельшчыкі ўтылізацыйнага збору. Асаблівасці прызнання плацельшчыкамі асобных арганізацый і фізічных асоб**

Плацельшчыкамі ўтылізацыйнага збору прызнаюцца арганізацыі і фізічныя асобы, уключаючы індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку ўказаныя асобы,

якія прымяняюць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання (далей у гэтай главе – плацельшчык).

Плацельшчыкам прызнаецца арганізацыя ці фізічная асоба, які набывае ва ўласнасць, гаспадарчае вядзенне ці аператыўнае кіраванне транспартны сродак, указаны ў падпунктах 1.3–1.5 пункта 1 артыкула 301 і падпункце 1.2 пункта 1 артыкула 302 гэтага Кодэкса, у адносінах да якіх утылізацыйны збор не быў аплачаны пры ўвозе.

**Артыкул 301. Аб'екты абкладання ўтылізацыйным зборам**

1. Аб'ектам абкладання ўтылізацыйным зборам, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 4 гэтага артыкула, прызнаецца транспартны сродак:

1.1. зроблены (выраблены) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, які адчужаецца або выкарыстоўваецца вытворцам (вырабляльнікам) для ўласных патрэб;

1.2. дабудаваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на базе шасі, дадзенага заказчыкам, калі ў выніку такой дабудоўкі вытворца (вырабляльнік) ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку прысвоіў завершанаму вырабам транспартнаму сродку ідэнтыфікацыйны нумар (VIN);

1.3. які ўвозіцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь у якасці тавару для асабістага карыстання, выпускаецца (выпушчаны) у свабоднае абарачэнне;

1.4. які ўвозіцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь і змяшчаецца пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання;

1.5. увезены ў Рэспубліку Беларусь з тэрыторый дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Для мэт гэтай главы да транспартнага сродку не адносіцца шасі, якое ўяўляе сабой прыладу на колавым ходзе, не прызначанае для эксплуатацыі ў якасці транспартнага сродку і не мае хаця б адной з наступных састаўных частак: кабіны, рухавіка, кузава.

3. Віды і катэгорыі транспартных сродкаў, якія з'яўляюцца аб'ектамі абкладання ўтылізацыйным зборам, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

4. Аб'ектам абкладання ўтылізацыйным зборам у Рэспубліцы Беларусь не прызнаецца транспартны сродак:

4.1. зроблены (выраблены) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, які адчужаецца вытворцам (вырабляльнікам) за межы Рэспублікі Беларусь;

4.2. пераабсталяваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на базе транспартнага сродку, раней зарэгістраванага ў Рэспубліцы Беларусь.

Для мэт гэтай главы пад пераабсталяваным транспартным сродкам разумеецца транспартны сродак, у канструкцыю якога ўнесены не прадугледжаныя нарматыўна-тэхнічнай дакументацыяй вытворцы (вырабляльніка) змяненні вагавых, габарытных і іншых параметраў і якому пры гэтым юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку прысвоены ідэнтыфікацыйны нумар (VIN);

4.3. пераабсталяваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на базе транспартнага сродку, раней увезенага на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, у адносінах да якога быў аплачаны ўтылізацыйны збор у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

4.4. дабудаваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на базе шасі, калі ў адносінах да такога шасі ў Рэспубліцы Беларусь аплачаны ўтылізацыйны збор;

4.5. дабудаваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на базе шасі, які адгружаецца (перадаецца) вытворцам (вырабляльнікам) за межы Рэспублікі Беларусь заказчыку, месцам знаходжання (месцам жыхарства) якога не з'яўляецца Рэспубліка

Беларусь, або адчужаецца за межы Рэспублікі Беларусь заказчыкам, месцам знаходжання (месцам жыхарства) якога з'яўляецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь;

4.6. зарэгістраваны да 1 сакавіка 2014 года на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

4.7. выпушчаны ў свабоднае абарачэнне або змешчаны пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання ў адпаведнасці з мытнымі дэкларацыямі, зарэгістраванымі да 1 сакавіка 2014 года.

**Артыкул 302. Льготы па ўтылізацыйным зборы**

1. Ад утылізацыйнага збору вызваляюцца транспартныя сродкі:

1.1. якія ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь у якасці замежнай бязвыплатнай ці міжнароднай тэхнічнай дапамогі;

1.2. якія ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь і прызначаны для афіцыйнага карыстання дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, консульскімі ўстановамі, іншымі афіцыйнымі прадстаўніцтвамі замежных дзяржаў, міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі ўтварэннямі, іх прадстаўніцтвамі і органамі або для асабістага карыстання супрацоўнікамі такіх прадстаўніцтваў, устаноў, арганізацый і ўтварэнняў, іх прадстаўніцтваў і органаў і членамі іх сямей, калі яны не пражываюць у Рэспубліцы Беларусь пастаяннае і не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь;

1.3. зробленыя (выробленыя) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь арганізацыямі, якія прынялі на сябе ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, абавязацельства забяспечыць наступнае бяспечнае абыходжанне з адходамі, якія ўтварыліся ў выніку страты транспартнымі сродкамі сваіх спажывецкіх уласцівасцей, за выключэннем адчужаных за межы Рэспублікі Беларусь, якія пасля ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь;

1.4. якія ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь і змяшчаюцца (змешчаны) пад мытную працэдуру адмовы на карысць дзяржавы, за выключэннем транспартных сродкаў, выпушчаных у свабоднае абарачэнне або змешчаных пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання, у адносінах да якіх утылізацыйны збор быў аплачаны ва ўстаноўленым парадку;

1.5. якія ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь і накіраваны ва ўласнасць (даход) дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам, за выключэннем транспартных сродкаў, выпушчаных у свабоднае абарачэнне або змешчаных пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання, у адносінах да якіх утылізацыйны збор быў аплачаны ва ўстаноўленым парадку;

1.6. якія ўвозяцца (увезены) у Рэспубліку Беларусь і знаходзяцца пад мытным кантролем, на якія накіравана спагнанне ў мэтах пагашэння неаплачаных мытных плацяжоў, спецыяльных, антыдэмпінгавых, кампенсацыйных пошлін, пеняў і (ці) працэнтаў, іншых плацяжоў, спагнанне якіх ускладзена на мытныя органы;

1.7. прызначаныя для выкарыстання ў мэтах забеспячэння нацыянальнай бяспекі, абароны, праваахоўнай дзейнасці, папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, набыццё якіх ажыццяўляецца Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Службай бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, Дэпартаментам фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным

мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь, за выключэннем транспартных сродкаў, выпушчаных у свабоднае абарачэнне або змешчаных пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання, у адносінах да якіх утылізацыйны збор быў аплачаны ва ўстаноўленым парадку;

1.8. затрыманыя мытнымі органамі пры правядзенні мытнага кантролю і не запатрабаваныя ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам;

1.9. у іншых выпадках, якія вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

2. Пералік дакументаў, якія пацвярджаюць права на льготы па ўтылізацыйным зборы, указаныя ў падпунктах 1.1–1.8 пункта 1 гэтага артыкула, устанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 303. Падатковая база ўтылізацыйнага збору**

Падатковай базай утылізацыйнага збору прызнаецца адзінка транспартнага сродку, які прызнаецца аб'ектам абкладання ўтылізацыйным зборам.

**Артыкул 304. Стаўкі ўтылізацыйнага збору**

Стаўкі ўтылізацыйнага збору ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 305. Падатковы перыяд утылізацыйнага збору**

Падатковым перыядам утылізацыйнага збору прызнаецца квартал, на які прыпадае дата ўзнікнення абавязацельства па аплаце ўтылізацыйнага збору.

Дата ўзнікнення абавязацельства па аплаце ўтылізацыйнага збору вызначаецца як дзень, на які прыпадае падатковы перыяд, у якім у плацельшчыка ўзнік аб'ект абкладання ўтылізацыйным зборам.

**Артыкул 306. Парадак вылічэння, парадак і тэрміны аплаты ўтылізацыйнага збору. Органы, якія кантралююць аплату ўтылізацыйнага збору**

1. Утылізацыйны збор вылічваецца зыходзячы з падатковай базы і стаўкі ўтылізацыйнага збору па кожнай адзінцы транспартнага сродку, у адносінах да якога ў плацельшчыка ўзнік у падатковым перыядзе аб'ект абкладання ўтылізацыйным зборам.

2. Утылізацыйны збор аплачваецца аднаразова за кожны транспартны сродак у наступныя тэрміны:

2.1. не пазней да два рабочыя дні, якія ідуць следам за днём адгрузкі (перадачы) транспартнага сродку, указанага ў падпунктах 1.1 і 1.2 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса.

Пры гэтым днём адгрузкі (перадачы) транспартнага сродку прызнаецца:

пры адгрузцы (перадачы) транспартнага сродку пакупніку (атрымальніку, перавозчыку), заказчыку – дата адгрузкі (перадачы) транспартнага сродку;

у іншых выпадках – дата афармлення вытворцам (выраблялльнікам) дакумента, які пацвярджае вытворчасць (выраб) транспартнага сродку ў Рэспубліцы Беларусь.

Плацежная інструкцыя на аплату ўтылізацыйнага збору афармляецца па кожным транспартным сродку, указаным у падпунктах 1.1 ці 1.2 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, і засведчваецца адзнакай банка, якая пацвярджае яго аплату;

2.2. да выпуску транспартнага сродку, указанага ў падпункце 1.3 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, у свабоднае абарачэнне ці змяшчэння транспартнага

сродку, указанага ў падпункце 1.4 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання;

2.3. да дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь транспартнага сродку, калі ўтылізацыйны збор аплачваецца:

у адносінах да транспартнага сродку, указанага ў падпункце 1.5 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса;

плацельшчыкам, указаным у частцы другой артыкула 300 гэтага Кодэкса.

3. Падатковая дэкларацыя (разлік) па ўтылізацыйным зборы ў адносінах да транспартнага сродку, указанага ў падпунктах 1.1 і 1.2 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, падаецца ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік:

не пазней за два рабочыя дні, якія ідуць следам за апошнім днём тэрміну аплаты, указанага ў падпункце 2.1 пункта 2 гэтага артыкула, – у частцы разліку сумы ўтылізацыйнага збору, якая падлягае аплаце;

да 20-га чысла месяца, які ідзе следам за падатковым перыядам, – у частцы разліку сумы ўтылізацыйнага збору па транспартным сродкам, якія вызваляюцца ад утылізацыйнага збору.

4. Разлік утылізацыйнага збору падаецца ў мытню:

4.1. у якой ажыццяўляецца дэкларaванне транспартнага сродку, указанага ў падпунктах 1.3 ці 1.4 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, да або адначасова з падачай мытнай дэкларацыі (за выключэннем выпадку, указанага ў абзацы другім падпункта 4.2 гэтага пункта);

4.2. упаўнаважаную Дзяржаўным мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь да дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь транспартнага сродку, калі ўтылізацыйны збор аплачваецца:

у адносінах да транспартнага сродку, указанага ў падпункце 1.5 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса;

плацельшчыкам, указаным у частцы другой артыкула 300 гэтага Кодэкса.

5. Дзяржаўным мытным камітэтам Рэспублікі Беларусь у адносінах да транспартных сродкаў, указаных у падпунктах 1.3–1.5 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса, вызначаюцца форма, парадак запаўнення, падачы, рэгістрацыі, унясення змяненняў і анулявання дакумента, які адлюстроўвае вылічэнне і аплату ўтылізацыйнага збору (далей у гэтым артыкуле – разлік утылізацыйнага збору), структура і фармат яго падачы ў выглядзе электроннага дакумента і яго электроннай копіі, дакументы, якія падаюцца разам з разлікам утылізацыйнага збору.

6. Аплату ўтылізацыйнага збору кантралююць:

падатковыя органы – у адносінах да транспартных сродкаў, указаных у падпунктах 1.1 і 1.2 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса;

мытныя органы ў адносінах да транспартных сродкаў, указаных у падпунктах 1.3–1.5 пункта 1 артыкула 301 гэтага Кодэкса.

7. Растлумачваць плацельшчыкам пытанні, звязаныя з прымяненнем гэтай главы, абавязаны падатковыя і мытныя органы ў межах сваёй кампетэнцыі.

**Артыкул 307. Уключэнне сум утылізацыйнага збору ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

1. Аплачаная сума ўтылізацыйнага збору:

падлягае аднясенню на павелічэнне кошту транспартнага сродку пры прыняцці гэтага транспартнага сродку плацельшчыкам, які яго ўвёз (зрабіў, вырабіў), да

бухгалтарскага ўліку (пры прыняцці індывідуальным прадпрымальнікам да ўліку) у якасці асноўнага сродку;

уключаецца ў склад затрат на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, расходаў, якія ўлічваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб (далей у гэтым артыкуле – затраты) пры прыняцці да бухгалтарскага ўліку (пры прыняцці індывідуальным прадпрымальнікам да ўліку) у іншых выпадках;

уключаецца ў склад расходаў, звязаных з набыццём аплатна адчужальнай маёмасці, пры даванні фізічнай асобе, якая аплаціла ўтылізацыйны збор, маёмаснага падатковага выліку па падаходным падатку з фізічных асоб.

2. Аплачаная сума ўтылізацыйнага збору не ўлічваецца ў складзе затрат плацельшчыка, якому затраты на іх аплату падлягаюць пакрыццю ў адпаведнасці з заканадаўствам. Пры гэтым указаная сума падлягае ўключэнню ў склад затрат плацельшчыкам, які правёў такое пакрыццё, а ў адносінах да транспартных сродкаў, указаных у абзацы другім пункта 1 гэтага артыкула, падлягае аднясенню на павелічэнне іх кошту.

# РАЗДЗЕЛ VI
# МЯСЦОВЫЯ ПАДАТКІ І ЗБОРЫ

## ГЛАВА 29
## ПАДАТАК ЗА ВАЛОДАННЕ САБАКАМІ

### Артыкул 308. Плацельшчыкі падатку за валоданне сабакамі

Плацельшчыкамі падатку за валоданне сабакамі прызнаюцца фізічныя асобы.

### Артыкул 309. Аб'ект падаткаабкладання, падатковая база падатку за валоданне сабакамі

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаткам за валоданне сабакамі прызнаецца валоданне сабакамі ва ўзросце трох месяцаў і больш.

2. Падатковая база падатку за валоданне сабакамі вызначаецца як колькасць сабак ва ўзросце трох месяцаў і больш на 1-е чысло першага месяца падатковага перыяду.

### Артыкул 310. Стаўкі падатку за валоданне сабакамі

1. Стаўка падатку за валоданне сабакамі ўстанаўліваецца за падатковы перыяд у памеры:

1,5 базавай велічыні – за пароды сабак, уключаныя ў пералік патэнцыяльна небяспечных парод сабак;

0,3 базавай велічыні – у іншых выпадках.

2. Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў, мясцовыя Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню маюць права змяншаць (не больш чым у два разы) стаўкі падатку за валоданне сабакамі.

### Артыкул 311. Падатковы перыяд падатку за валоданне сабакамі

Падатковым перыядам падатку за валоданне сабакамі прызнаецца каляндарны квартал.

### Артыкул 312. Парадак вылічэння, парадак і тэрміны аплаты падатку за валоданне сабакамі

1. Сума падатку за валоданне сабакамі вылічваецца як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі.

Пры вылічэнні сумы падатку за валоданне сабакамі прымаецца памер базавай велічыні, устаноўлены на 1-е чысло першага месяца падатковага перыяду.

2. Плацельшчыкі аплачваюць падатак за валоданне сабакамі шляхам унясення сум падатку арганізацыям, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, адначасова з унясеннем платы за карыстанне жылым памяшканнем (платы за жыллёва-камунальныя паслугі).

Арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, праводзяць прыём сум падатку за валоданне сабакамі і іх пералічэнне ў бюджэт не пазней за 27-е чысло месяца, што ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, а таксама падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік інфармацыю аб пералічэнні падатку за валоданне сабакамі ў адвольнай форме не пазней за 30-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

3. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку за валоданне сабакамі не падаецца.

## ГЛАВА 30
## КУРОРТНЫ ЗБОР

### Артыкул 313. Плацельшчыкі курортнага збору

Плацельшчыкамі курортнага збору прызнаюцца фізічныя асобы, за выключэннем:

асоб, якія накіроўваюцца на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне бясплатна за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

асоб, якія накіроўваюцца на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне ў рамках страхавых выплат па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў (уключаючы суправаджальных асоб);

дзяцей, якія накіроўваюцца ў аздараўленчыя (спартыўна-аздараўленчыя) лагеры па пуцёўках, кошт якіх патаннены за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ці рэспубліканскага бюджэту.

### Артыкул 314. Аб'ект абкладання

1. Аб'ектам абкладання курортным зборам прызнаецца знаходжанне (пражыванне не менш за суткі) фізічнай асобы ў размешчаных на тэрыторыі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь:

санаторна-курортных арганізацыях;

прафілакторыях, аздараўленчых цэнтрах (комплексах), адукацыйна-аздараўленчых цэнтрах, аздараўленчых лагерах, спартыўна-аздараўленчых лагерах, дамах (базах) адпачынку, пансіянатах (далей у гэтай главе – аздараўленчыя арганізацыі).

2. Не прызнаецца аб'ектам абкладання курортным зборам знаходжанне фізічнай асобы ў санаторна-курортных ці аздараўленчых арганізацыях у сувязі з:

удзелам у семінарах, канферэнцыях і іншых аналагічных мерапрыемствах, для правядзення якіх выкарыстоўваецца тэрыторыя санаторна-курортнай ці

аздараўленчай арганізацыі на падставе дагавораў, заключаных арганізацыямі – арганізатарамі такіх мерапрыемстваў;

пражываннем у час знаходжання ў службовай камандзіроўцы;

выкананнем фізічнымі асобамі, якія пражываюць у санаторна-курортных ці аздараўленчых арганізацыях, службовых абавязкаў – у частцы кошту паслуг па пражыванні і харчаванні.

**Артыкул 315. Падатковая база**

1. Падатковая база курортнага збору вызначаецца як кошт пуцёўкі ў санаторна-курортную ці аздараўленчую арганізацыю, а калі пуцёўка не афармляецца – як кошт паслуг па пражыванні, а таксама аказаных паслуг па харчаванні, медыцынскіх і аздараўленчых паслуг.

2. Пры вызначэнні падатковай базы курортнага збору не ўлічваецца кошт платных паслуг, якія аказваюцца фізічным асобам пры наведванні санаторна-курортнай ці аздараўленчай арганізацыі без пражывання.

3. У выпадках, калі абарот па рэалізацыі санаторна-курортных і (ці) аздараўленчых паслуг абкладаецца падаткам на дабаўленую вартасць, падатковая база курортнага збору вызначаецца зыходзячы з кошту ўказаных паслуг, які ўключае падатак на дабаўленую вартасць.

4. Пры частковай аплаце кошту пуцёўкі за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і рэспубліканскага бюджэту (за выключэннем пуцёвак у аздараўленчыя ці спартыўна-аздараўленчыя лагеры), сродкаў абавязковага страхавання ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў падатковай базай з'яўляецца кошт пуцёўкі, які аплачваецца фізічнымі асобамі за кошт уласных сродкаў.

**Артыкул 316. Стаўкі курортнага збору**

1. Стаўкі курортнага збору ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад віду санаторна-курортнай ці аздараўленчай арганізацыі і не могуць перавышаць пяць (5) працэнтаў.

2. Пры адсутнасці рашэння Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, якое ўстанаўлівае стаўку курортнага збору на тэрыторыі раёна (населенага пункта), стаўка лічыцца роўнай нулю.

**Артыкул 317. Падатковы перыяд курортнага збору**

Падатковым перыядам курортнага збору прызнаецца каляндарны квартал.

**Артыкул 318. Парадак вылічэння курортнага збору**

1. Сума курортнага збору вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі курортнага збору.

2. Падатковая дэкларацыя (разлік) па курортным зборы не падаецца.

**Артыкул 319. Тэрміны аплаты курортнага збору**

1. Плацельшчыкі аплачваюць курортны збор шляхам унясення сум збору санаторна-курортным ці аздараўленчым арганізацыям, якія ажыццяўляюць прыём сум курортнага збору і іх пералічэнне ў бюджэт не пазней за 22-е чысло месяца, што ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

Санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі не пазней за 25-е число месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам, падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік інфармацыю аб пералічэнні курортнага збору ў адвольнай форме.

2. Плацельшчык уносіць сумы курортнага збору санаторна-курортнай ці аздараўленчай арганізацыі не пазней за апошнія суткі знаходжання фізічнай асобы ў такой арганізацыі зыходзячы са стаўкі курортнага збору, якая дзейнічае на дату ўнясення сум гэтага збору. Спагнанне курортнага збору да моманту прыбыцця фізічнай асобы ў санаторна-курортную ці аздараўленчую арганізацыі не праводзіцца.

3. У выпадках няпоўнага выкарыстання санаторна-курортных і аздараўленчых паслуг, якія аказваюцца згодна з набытай пуцёўкай, ці датэрміновага выезду фізічнай асобы з санаторна-курортнай ці аздараўленчай арганізацыі вяртанне раней аплачанай сумы (яе часткі) курортнага збору не праводзіцца.

## ГЛАВА 31
## ЗБОР З НАРЫХТОЎШЧЫКАЎ

### Артыкул 320. Плацельшчыкі збору з нарыхтоўшчыкаў

Плацельшчыкамі збору з нарыхтоўшчыкаў (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі.

### Артыкул 321. Аб'ект абкладання, падатковая база і стаўкі збору з нарыхтоўшчыкаў

1. Аб'ектам абкладання зборам з нарыхтоўшчыкаў прызнаецца ажыццяўленне прамысловай нарыхтоўкі (закупкі) дзікарослых раслін (іх частак), грыбоў, тэхнічнай і лекавай сыравіны расліннага паходжання ў мэтах іх прамысловай перапрацоўкі ці рэалізацыі, за выключэннем іх нарыхтоўкі, пры якой плацельшчыкам унесена плата за пабочнае лясное карыстанне або прыменена вызваленне ад указанай платы.

2. Падатковая база збору з нарыхтоўшчыкаў вызначаецца як кошт аб'ёму нарыхтоўкі (закупкі), вызначаны зыходзячы з нарыхтоўчых (закупачных) цэн.

3. Стаўкі збору з нарыхтоўшчыкаў устанаўліваюцца ў памеры, які не перавышае пяць (5) працэнтаў.

### Артыкул 322. Падатковы перыяд збору з нарыхтоўшчыкаў. Парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты збору з нарыхтоўшчыкаў

1. Падатковым перыядам збору з нарыхтоўшчыкаў прызнаецца каляндарны квартал.

2. Сума збору з нарыхтоўшчыкаў вызначаецца як здабытак падатковай базы і стаўкі збору з нарыхтоўшчыкаў.

3. Плацельшчыкі штоквартальна падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е число месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

4. Аплата збору з нарыхтоўшчыкаў праводзіцца штоквартальна не пазней за 22-е число месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

**Артыкул 323. Уключэнне збору з нарыхтоўшчыкаў у затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а таксама ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб**

Сумы збору з нарыхтоўшчыкаў уключаюцца арганізацыямі ў затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў расходы, якія ўлічваюцца пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб.

## РАЗДЗЕЛ VII
## АСАБЛІВЫЯ РЭЖЫМЫ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

## ГЛАВА 32
## ПАДАТАК ПРЫ СПРОШЧАНАЙ СІСТЭМЕ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

**Артыкул 324. Плацельшчыкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання**

1. Плацельшчыкамі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца перайшоўшыя ў парадку, устаноўленым артыкулам 327 гэтага Кодэкса, на прымяненне падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання (далей – спрошчаная сістэма) або пачаўшыя яго прымяненне ў парадку і на ўмовах, устаноўленых пунктамі 3 і 4 артыкула 327 гэтага Кодэкса:

1.1. арганізацыі, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь (далей у гэтай главе – арганізацыі);

1.2. індывідуальныя прадпрымальнікі;

1.3. натарыусы, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, адвакаты.

2. Не маюць права прымяняць спрошчаную сістэму:

2.1. арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі:

2.1.1. якія вырабляюць падакцызныя тавары;

2.1.2. якія рэалізуюць (у тым ліку па дагаворах камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах) ювелірныя і іншыя бытавыя вырабы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў;

2.1.3. якія рэалізуюць маёмасныя правы на сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, прац ці паслуг (фірменныя найменні, таварныя знакі і знакі абслугоўвання, геаграфічныя ўказанні і іншае);

2.1.4. якія з'яўляюцца рэзідэнтамі свабодных (асаблівых) эканамічных зон, спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал», Парка высокіх тэхналогій, Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»;

2.1.5. якія здаюць у арэнду (перадаюць у фінансавую арэнду (лізінг)), даюць у іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія не знаходзяцца ў іх на праве ўласнасці (агульнай уласнасці), гаспадарчага вядзення, аператыўнага кіравання, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)), даванне ў іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне маёмасці, якая з'яўляецца агульнай уласнасцю, асобай, якая кіруе гэтай маёмасцю, або садаводчай суполкай (гаражным кааператывам, дачным кааператывам, кааператывам, які ажыццяўляе эксплуатацыю

аўтамабільных стаянак), не пазбаўляе такія асобу, суполку (кааператыў) права прымянення спрошчанай сістэмы.

Палажэнні часткі першай гэтага падпункта не распаўсюджваюцца на арганізацыі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ў якасці навукова-тэхналагічных паркаў, інкубатараў малога прадпрымальніцтва;

2.1.6. якія з'яўляюцца ўдзельнікамі дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці);

2.1.7. якія ажыццяўляюць аперацыі (дзейнасць) з лічбавымі знакамі (токенамі) па іх набыцці (здабычы, атрыманні), адчужэнні (перадачы, размяшчэнні, выкарыстанні), іншыя чым адчужэнне (набыццё) лічбавых знакаў (токенаў) за беларускія рублі, замежную валюту, электронныя грошы і абмен іх на іншыя лічбавыя знакі (токены);

2.2. арганізацыі, якія ажыццяўляюць:

2.2.1. латарэйную дзейнасць (арганізатары латарэі);

2.2.2. дзейнасць па арганізацыі і правядзенні электронных інтэрактыўных гульняў;

2.2.3. дзейнасць у сферы ігральнага бізнесу;

2.2.4. рыэлтарскую дзейнасць;

2.2.5. страхавую дзейнасць (страхавыя арганізацыі (страхоўшчыкі)), пасрэдніцкую дзейнасць па страхаванні (страхавыя брокеры, страхавыя агенты);

2.2.6. банкаўскую дзейнасць (банкі);

2.3. арганізацыі, якія з'яўляюцца:

2.3.1. прафесійнымі ўдзельнікамі рынку каштоўных папер;

2.3.2. удзельнікамі холдынгу;

2.3.3. мікрафінансавымі арганізацыямі;

2.3.4. інвестыцыйнымі фондамі, спецыялізаванымі дэпазітарыямі інвестыцыйнага фонду, якія кіруюць арганізацыямі інвестыцыйнага фонду;

2.3.5. плацельшчыкамі адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі або адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак;

2.4. унітарныя прадпрыемствы (за выключэннем унітарных прадпрыемстваў некамерцыйных арганізацый Рэспублікі Беларусь), уласнікам маёмасці якіх з'яўляюцца юрыдычная асоба, Рэспубліка Беларусь або яе адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка;

2.5. камерцыйныя арганізацыі, больш за 25 працэнтаў акцый (долей у статутным фондзе) якіх належыць:

адной ці ў сукупнасці некалькім іншым арганізацыям (за выключэннем некамерцыйных арганізацый Рэспублікі Беларусь);

Рэспубліцы Беларусь і (ці) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы (адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам).

3. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі прызнаюцца арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, указанымі ў падпунктах 2.1.2, 2.1.3, 2.1.5 і 2.1.6 пункта 2 гэтага артыкула, на працягу тэрміну дзеяння адпаведнага дагавора, а таксама пасля сканчэння гэтага тэрміну да дня (уключна), у якім меў месца апошні факт атрымання выручкі (даходу) па ўказаным дагаворы, які вызначаецца ў адпаведнасці з абзацамі другім – шостым часткі трэцяй пункта 15 артыкула 328 гэтага Кодэкса.

4. Калі арганізацыя і індывідуальны прадпрымальнік спыняе прымяненне спрошчанай сістэмы ў каляндарным годзе з месяца іншага, чым студзень, яны не маюць права ў наступным каляндарным годзе прымяняць спрошчаную сістэму.

**Артыкул 325. Аб'ект падаткаабкладання падаткам пры спрошчанай сістэме**

Аб'ектам падаткаабкладання падаткам пры спрошчанай сістэме прызнаецца валавая выручка.

**Артыкул 326. Агульныя ўмовы прымянення спрошчанай сістэмы**

1. Падатак пры спрошчанай сістэме:

1.1. замяняе для арганізацый, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму:

1.1.1. падатак на прыбытак (за выключэннем падатку на прыбытак, які вылічваецца, утрымліваецца і пералічваецца ў бюджэт пры выкананні абавязкаў падатковага агента), калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падатку на прыбытак у адносінах да:

дывідэндаў, а таксама прыраўнаваных да дывідэндаў даходаў, якія прызнаюцца гэтакімі ў адпаведнасці з часткай другой пункта 1 артыкула 167 гэтага Кодэкса;

даходаў, указаных у падпунктах 3.2, 3.3, 3.30, 3.31 і 3.32 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса;

розніцы, якая ўлічваецца пры вызначэнні валавога прыбытку ў адпаведнасці з часткай першай пункта 7 артыкула 167 гэтага Кодэкса;

прыбытку ад рэалізацыі (пагашэння) каштоўных папер;

прыбытку ад адчужэння долі (часткі долі) у статутным фондзе (пая (часткі пая)) арганізацыі;

прыбытку ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу;

1.1.2. падатак на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім з пачатку года па справаздачны перыяд уключна не перавышае 50 чалавек і памер яе валавой выручкі нарастаючым вынікам з пачатку года складае не больш за 1 337 415 беларускіх рублёў;

1.1.3. падатак на нерухомасць, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падатку на нерухомасць:

па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, здадзеных у арэнду (перададзеных у фінансавую арэнду (лізінг)), дадзеных у іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне;

па ўсіх аб'ектах падаткаабкладання гэтым падаткам арганізацыямі, у якіх агульная плошча капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія знаходзяцца ва ўласнасці, гаспадарчым вядзенні, аператыўным кіраванні, а таксама ў карыстанні ў выпадках, указаных у частцы першай пункта 1 і пункце 4 артыкула 226 гэтага Кодэкса, і капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, указаных як аб'ект падаткаабкладання падаткам на нерухомасць у падпункце 1.5 пункта 1 артыкула 227 гэтага Кодэкса, перавышае 1000 квадратных метраў.

Для вызначэння агульнай плошчы:

не прымаюцца капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія не з'яўляюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць згодна з пунктам 2 артыкула 227 гэтага Кодэкса;

не прымаюцца капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам для мэт вызначэння нарматыўных тэрмінаў службы асноўных сродкаў як перадатачныя прылады і збудаванні (акрамя аўтамабільных стаянак, парковак, паркінгаў, у тым ліку машына-месцаў);

прымаюцца капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі незалежна ад таго, што яны здадзены арганізацыяй у арэнду (перададзены ў фінансавую арэнду (лізінг)), дадзены ў іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне, давернае кіраванне (у тым ліку з прыцягненнем для такой перадачы камісіянера (паверанага) і іншай аналагічнай асобы, якія дзейнічаюць на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў);

не прымаюцца наяўныя ў арганізацыі на праве ўласнасці капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, перададзеныя іншай арганізацыі ў гаспадарчае вядзенне, аператыўнае кіраванне;

капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія маюць больш за адзін паверх (узровень), падсумоўваецца плошча кожнага паверха (узроўню).

Пры павелічэнні (змяншэнні) агульнай плошчы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак да памеру, які перавышае (не перавышае) 1000 квадратных метраў, а таксама пры здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)), даванні ў іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне (пры спыненні арэнды (фінансавай арэнды (лізінгу)), іншага аплатнага ці бязвыплатнага карыстання) капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак прымяняецца парадак вылічэння і аплаты падатку на нерухомасць, падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на нерухомасць, устаноўлены пунктамі 4 і 5 артыкула 232 і часткай першай пункта 2 артыкула 233 гэтага Кодэкса;

1.2. замяняе для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму:

1.2.1. падаходны падатак з фізічных асоб у адносінах да атрыманых гэтымі індывідуальнымі прадпрымальнікамі даходаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падаходнага падатку з фізічных асоб індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія з'яўляюцца адначасова:

фізічнымі асобамі – удзельнікамі, уласнікамі маёмасці камерцыйных арганізацый (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), – у адносінах да даходаў, якія атрымліваюцца ад гэтых камерцыйных арганізацый;

сужэнцамі, бацькамі (усынавіцелямі, удачарыцелямі), дзецьмі (у тым ліку ўсыноўленымі, удачаронымі) удзельнікаў, уласнікаў маёмасці камерцыйных арганізацый (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), – у адносінах да даходаў, якія атрымліваюцца ад гэтых камерцыйных арганізацый;

1.2.2. падатак на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падатку на дабаўленую вартасць індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў выпадках, устаноўленых артыкулам 113 гэтага Кодэкса, па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў камерцыйным арганізацыям (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), удзельнікамі, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца гэтыя індывідуальныя прадпрымальнікі, іх сужэнцы, бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя);

1.2.3. падатак на нерухомасць, калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падатку на нерухомасць для індывідуальных прадпрымальнікаў:

па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, якія прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць згодна з пунктам 3 артыкула 227 гэтага Кодэкса, здадзеных у арэнду (перададзеных у фінансавую арэнду (лізінг)), дадзеных у іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне;

па капітальных пабудовах (будынках, збудаваннях), іх частках, якія прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на нерухомасць згодна з пунктам 3 артыкула 227 гэтага Кодэкса, калі агульная плошча ўсіх, у тым ліку здадзеных у арэнду (перададзеных у фінансавую арэнду (лізінг)), такіх аб'ектаў нерухомасці, якія выкарыстоўваюцца імі ў прадпрымальніцкай дзейнасці з прымяненнем спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, перавышае 1000 квадратных метраў.

Індывідуальны прадпрымальнік абавязаны падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік:

паведамленне аб выкарыстанні ў прадпрымальніцкай дзейнасці ў падатковым перыядзе капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак;

паведамленне аб павелічэнні (змяншэнні) у падатковым перыядзе плошчы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, ці спыненні іх выкарыстання ў такой дзейнасці.

Паведамленне падаецца:

штогод не пазней за 20 красавіка – пры выкарыстанні капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у прадпрымальніцкай дзейнасці пачынаючы з першага квартала бягучага падатковага перыяду;

не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за кварталам, у якім у падатковым перыядзе было пачата выкарыстанне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, у прадпрымальніцкай дзейнасці;

не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за кварталам, у якім у падатковым перыядзе адбылося павелічэнне (змяншэнне) плошчы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія выкарыстоўваюцца ў прадпрымальніцкай дзейнасці, ці было спынена іх выкарыстанне ў такой дзейнасці.

У паведамленні ўказваюцца ўсе капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх часткі, якія выкарыстоўваюцца індывідуальным прадпрымальнікам у прадпрымальніцкай дзейнасці, іх месцазнаходжанне, плошча, а таксама меркаваны перыяд іх выкарыстання.

У выпадку спынення выкарыстання ў прадпрымальніцкай дзейнасці капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак у адносінах да такіх аб'ектаў у паведамленні ўказваюцца іх месцазнаходжанне, плошча, а таксама дата, з якой спынена іх выкарыстанне ў прадпрымальніцкай дзейнасці;

1.3. замяняе для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму:

1.3.1. экалагічны падатак, за выключэннем экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці ў выпадку набыцця імі права ўласнасці на адходы вытворчасці на падставе здзелкі аб адчужэнні адходаў ці здзяйснення іншых дзеянняў, якія сведчаць аб накіраванні іншым спосабам адходаў ва ўласнасць, у мэтах наступнага пахавання. Пры гэтым вылічэнне і аплата экалагічнага падатку праводзяцца ў адносінах да адходаў, набытых указанымі спосабамі;

1.3.2. збор з нарыхтоўшчыкаў.

2. Палажэнні падпунктаў 1.1.2 і 1.2.2 пункта 1 гэтага артыкула не вызваляюць арганізацыі і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму, ад вылічэння і аплаты:

падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

падатку на дабаўленую вартасць па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, што рэалізуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, якія не дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва і не знаходзяцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь;

падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія ўзнікаюць у давернага кіраўніка ў сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю па дагаворы давернага кіравання маёмасцю ў інтарэсах даручальніка (выгаданабытчыка).

3. Плацельшчыкі, на якіх распаўсюджваюцца палажэнні падпунктаў 1.1.2 і 1.2.2 пункта 1 гэтага артыкула, што ўстанаўліваюць прымяненне спрошчанай сістэмы без вылічэння і аплаты падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтай главе – спрошчаная сістэма без аплаты падатку на дабаўленую вартасць), маюць права прымяняць спрошчаную сістэму з вылічэннем і аплатай падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтай главе – спрошчаная сістэма з аплатай падатку на дабаўленую вартасць).

Пры гэтым падатак на дабаўленую вартасць аплачваецца да заканчэння падатковага перыяду ў адносінах да ўсіх аб'ектаў падаткаабкладання гэтым падаткам.

Плацельшчыкамі, якія прымяняюць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць, такое прымяненне спыняецца і прымяненне спрошчанай сістэмы з аплатай падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з часткамі першай і другой гэтага пункта пачынаецца з месяца, што ідзе следам за справаздачным перыядам, у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку пры спрошчанай сістэме за які адлюстравана рашэнне аб пераходзе на прымяненне спрошчанай сістэмы з аплатай падатку на дабаўленую вартасць.

Адлюстраванне такога рашэння можа быць праведзена (анулявана) шляхам унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў ва ўказаную падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за кварталам, з першага месяца якога згодна з часткай трэцяй гэтага пункта пачынаецца прымяненне спрошчанай сістэмы з аплатай падатку на дабаўленую вартасць.

4. Плацельшчыкі, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем арганізацый, указаных у частцы другой гэтага пункта), маюць права перайсці на прымяненне спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з падпунктамі 1.1.2 і 1.2.2 пункта 1 гэтага артыкула з пачатку новага каляндарнага года.

Указанае права не распаўсюджваецца на арганізацыі, у якіх за папярэдні каляндарны год колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім з пачатку года па апошні справаздачны перыяд уключна і (ці) валавая выручка нарастаючым вынікам з пачатку года перавысілі іх гранічныя велічыні, якія дзейнічалі ў такім годзе для прымянення спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць.

Прымяненне спрошчанай сістэмы з аплатай падатку на дабаўленую вартасць спыняецца і прымяненне спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую

вартасць у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта праводзіцца з пачатку каляндарнага года, што ідзе следам за падатковым перыядам, у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку пры спрошчанай сістэме за апошні справаздачны перыяд якога адлюстравана рашэнне аб пераходзе на прымяненне спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць.

Адлюстраванне такога рашэння можа быць праведзена (анулявана) шляхам унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў ва ўказаную падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-га красавіка каляндарнага года, з пачатку якога згодна з часткай трэцяй гэтага пункта пачынаецца прымяненне спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць.

5. Для мэт гэтай главы:

колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім з пачатку года па справаздачны перыяд уключна (у сярэднім за перыяд) вызначаецца шляхам падсумоўвання сярэдняй колькасці работнікаў за ўсе месяцы, мінулыя з пачатку каляндарнага года па справаздачны перыяд уключна (за перыяд), і дзялення атрыманай сумы на колькасць мінулых месяцаў, за якія вызначана сярэдняя колькасць работнікаў. Пры гэтым у разліку не ўдзельнічаюць месяцы, што папярэднічаюць месяцу, у якім ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыі;

сярэдняя колькасць работнікаў за кожны месяц вызначаецца шляхам падсумоўвання вылічаных за гэты месяц у парадку, устаноўленым Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь:

спісачнай колькасці работнікаў арганізацыі ў сярэднім за месяц (за выключэннем работнікаў, якія знаходзяцца ў водпусках па цяжарнасці і родах, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзіцяці ва ўзросце да трох месяцаў або прызначэннем іх апекунамі, па доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад трох да шаснаццаці гадоў);

сярэдняй колькасці працуючых па сумяшчальніцтве з месцам асноўнай працы ў іншых наймальнікаў;

сярэдняй колькасці асоб, якія выконвалі працу па грамадзянска-прававых дагаворах (у тым ліку заключаных з юрыдычнымі асобамі ў выпадку, калі прадметам дагавору з'яўляецца аказанне паслугі па даванні, найме работнікаў);

колькасць работнікаў разлічваецца ў цэлым па арганізацыі;

валавая выручка вызначаецца зыходзячы з парадку, які дзейнічае для мэт падатку пры спрошчанай сістэме ў годзе, да якога адносіцца валавая выручка;

здача ў арэнду (даванне ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці прызнаецца паслугай;

капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) вызначаюцца арганізацыямі ў адпаведнасці з падпунктам 5.2 пункта 5 артыкула 227 гэтага Кодэкса;

капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) вызначаюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў адпаведнасці з падпунктам 5.3 пункта 5 артыкула 227 гэтага Кодэкса.

6. У адносінах да палажэнняў пунктаў 2–4 артыкула 324, пунктаў 3 і 4 гэтага артыкула, пунктаў 5–7 артыкула 327 і артыкула 333 гэтага Кодэкса, а таксама для разліку ў мэтах гэтай главы колькасці работнікаў арганізацыі і яе валавой выручкі арганізацыя, рэарганізаваная ў форме пераўтварэння, і арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку яе рэарганізацыі, прызнаюцца адной і той жа арганізацыяй.

7. Палажэнні, устаноўленыя гэтай главой для індывідуальных прадпрымальнікаў, прымяняюцца да натарыусаў, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, і адвакатаў, калі іншае не прадугледжана пунктам 3 артыкула 327 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 327. Парадак і ўмовы пачатку і спынення прымянення спрошчанай сістэмы**

1. Спрошчаная сістэма прымяняецца з пачатку каляндарнага года, калі іншае не ўстаноўлена пунктамі 3 і 4 гэтага артыкула.

2. Перайсці на прымяненне спрошчанай сістэмы маюць права:

арганізацыі, у якіх колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім за першыя дзевяць месяцаў года, што папярэднічае каляндарнаму году, у якім яны прэтэндуюць пачаць прымяненне спрошчанай сістэмы, не перавышае 100 чалавек і валавая выручка нарастаючым вынікам за гэтыя дзевяць месяцаў складае не больш за 1 465 565 беларускіх рублёў;

індывідуальныя прадпрымальнікі, у якіх валавая выручка нарастаючым вынікам за першыя дзевяць месяцаў года, што папярэднічае каляндарнаму году, у якім яны прэтэндуюць пачаць прымяненне спрошчанай сістэмы, складае не больш за 315 000 беларускіх рублёў.

Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выказалі жаданне перайсці на спрошчаную сістэму, павінны з 1 кастрычніка па 31 снежня года, што папярэднічае каляндарнаму году, у якім яны прэтэндуюць пачаць прымяненне спрошчанай сістэмы, падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне аб пераходзе на спрошчаную сістэму па ўстаноўленай форме.

3. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі (натарыусы, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, адвакаты), якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю (рэгістрацыю натарыяльнага бюро, адваката) у годзе, у якім яны прэтэндуюць на прымяненне спрошчанай сістэмы, маюць права прымяняць спрошчаную сістэму пачынаючы з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі (рэгістрацыі натарыяльнага бюро, адваката), калі спісачная колькасць работнікаў арганізацыі не перавышае 100 чалавек.

Для прымянення спрошчанай сістэмы ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі (натарыусы, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, адвакаты) павінны на працягу дваццаці рабочых дзён з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі (рэгістрацыі натарыяльнага бюро, адваката) падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне аб пераходзе на спрошчаную сістэму па ўстаноўленай форме.

4. Арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку рэарганізацыі ў форме пераўтварэння, мае права прымяняць спрошчаную сістэму з даты ўнясення ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў статут (устаноўчы дагавор) юрыдычнай асобы ў сувязі з рэарганізацыяй у форме пераўтварэння (далей у гэтым пункце – дата пераўтварэння), пры ўмове, калі:

рэарганізаваная арганізацыя мела права прымяняць і прымяняла спрошчаную сістэму на дзень, які непасрэдна папярэднічае даце пераўтварэння;

дата пераўтварэння не супадае з днём, пачынаючы з якога ў адпаведнасці з пунктам 6 гэтага артыкула прымяненне спрошчанай сістэмы рэарганізаванай арганізацыяй павінна было спыніцца.

Пры гэтым арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку рэарганізацыі ў форме пераўтварэння, не мае права да заканчэння падатковага перыяду прымяняць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць пры наяўнасці адной з наступных акалічнасцей:

рэарганізаваная арганізацыя прымяняла спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць на дзень, які непасрэдна папярэднічае даце пераўтварэння;

у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 326 гэтага Кодэкса і (ці) падпунктам 6.3.3 пункта 6 гэтага артыкула прымяненне спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць рэарганізаванай арганізацыяй павінна было спыніцца пачынаючы з дня, які супадае з датай пераўтварэння.

5. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія паведамілі ва ўстаноўленым парадку падатковаму органу аб пераходзе на прымяненне спрошчанай сістэмы, маюць права адмовіцца ад яе прымянення ў цэлым за падатковы перыяд, калі пададуць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне аб адмове ад прымянення спрошчанай сістэмы па ўстаноўленай форме да:

20 лютага года, што ідзе следам за годам, у якім у адпаведнасці з часткай другой пункта 2 гэтага артыкула пададзена паведамленне аб пераходзе на спрошчаную сістэму;

20-га числа месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім у адпаведнасці з часткай другой пункта 3 гэтага артыкула пададзена паведамленне аб пераходзе на спрошчаную сістэму.

6. Прымяненне плацельшчыкамі спрошчанай сістэмы спыняецца і яны ажыццяўляюць вылічэнне і аплату падаткаў, збораў у агульным парадку пачынаючы:

6.1. з месяца, у якім яны могуць быць прызнаны арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, указанымі ў пункце 2 артыкула 324 гэтага Кодэкса. Для мэт гэтага падпункта ўлічваецца палажэнне пункта 3 артыкула 324 гэтага Кодэкса;

6.2. з месяца, які ідзе следам за справаздачным перыядам, у падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку пры спрошчанай сістэме за які адлюстравана рашэнне аб адмове ад прымянення спрошчанай сістэмы.

Адлюстраванне такога рашэння можа быць праведзена (анулявана) шляхам унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў ва ўказаную падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за:

месяцам, з якога згодна з часткай першай гэтага падпункта спыняецца прымяненне спрошчанай сістэмы, – калі справаздачным перыядам па падатку пры спрошчанай сістэме для плацельшчыка з'яўляецца месяц;

кварталам, з першага месяца якога згодна з часткай першай гэтага падпункта спыняецца прымяненне спрошчанай сістэмы, – калі справаздачным перыядам па падатку пры спрошчанай сістэме для плацельшчыка з'яўляецца квартал;

6.3. з месяца, які ідзе следам за справаздачным перыядам, у якім:

6.3.1. колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім з пачатку года па справаздачны перыяд уключна перавысіла 100 чалавек;

6.3.2. валавая выручка арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў нарастаючым вынікам на працягу каляндарнага года перавысіла адпаведна 1 949 208 і 420 000 беларускіх рублёў;

6.3.3. пры прымяненні спрошчанай сістэмы без аплаты падатку на дабаўленую вартасць колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім з пачатку года па справаздачны перыяд уключна перавысіла 50 чалавек і (ці) валавая выручка арганізацыі

нарастаючым вынікам на працягу каляндарнага года склала больш за 1 337 415 беларускіх рублёў (далей у гэтым падпункце – справаздачны перыяд, у якім перавышаны колькасць работнікаў і (ці) валавая выручка).

Незалежна ад палажэння часткі першай гэтага падпункта прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання не спыняецца, калі ў парадку, вызначаным часткамі трэцяй і чацвёртай пункта 3 артыкула 326 гэтага Кодэкса, арганізацыя пачынае з месяца, што ідзе следам за справаздачным перыядам, у якім перавышаны колькасць работнікаў і (ці) валавая выручка, прымяненне спрошчанай сістэмы з аплатай падатку на дабаўленую вартасць.

7. У выпадку, калі памылкі, вынікам якіх з'яўляецца неправамернае прымяненне спрошчанай сістэмы, выяўлены пасля падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку пры спрошчанай сістэме за першы справаздачны перыяд падатковага перыяду, які ідзе следам за апошнім каляндарным годам неправамернага прымянення спрошчанай сістэмы, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі захоўваюць права прымяняць спрошчаную сістэму з 1 студзеня ўказанага падатковага перыяду і прызнаюцца перайшоўшымі на прымяненне спрошчанай сістэмы з гэтай даты.

Для мэт часткі першай гэтага пункта:

неправамерным прымяненнем спрошчанай сістэмы з'яўляецца прымяненне спрошчанай сістэмы арганізацыяй і індывідуальным прадпрымальнікам:

у перыяд, калі згодна з дзейнымі на працягу яго палажэннямі гэтага Кодэкса і (ці) іншых актаў заканадаўства яны не мелі права прымяняць спрошчаную сістэму;

у каляндарным годзе, што ідзе следам за годам, у якім прымяненне імі спрошчанай сістэмы спыняецца з месяца, іншага чым студзень;

каляндарным годам неправамернага прымянення спрошчанай сістэмы прызнаецца каляндарны год, у якім мела месца на працягу ўсяго года ці яго часткі неправамернае прымяненне спрошчанай сістэмы;

невыкананне ў каляндарным годзе неправамернага прымянення спрошчанай сістэмы патрабаванняў заканадаўства аб гранічнай велічыні валавой выручкі нарастаючым вынікам за дзевяць месяцаў, устаноўленай для пераходу на спрошчаную сістэму, і (ці) аб падачы ў падатковы орган паведамлення аб пераходзе на спрошчаную сістэму не з'яўляецца падставай для прызнання наступнага за ім года каляндарным годам неправамернага прымянення спрошчанай сістэмы;

падатковым перыядам, з 1 студзеня якога арганізацыя і індывідуальны прадпрымальнік захоўваюць права прымяняць спрошчаную сістэму і прызнаюцца перайшоўшымі на прымяненне спрошчанай сістэмы, не з'яўляецца падатковы перыяд, што ідзе следам за каляндарным годам, за які колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім за год і (ці) валавая выручка нарастаючым вынікам з пачатку года перавысілі іх гранічныя велічыні, якія дзейнічалі ў такім годзе для прымянення спрошчанай сістэмы.

Палажэнне часткі першай гэтага пункта адносіцца да памылак, якія выяўляюцца пачынаючы з 2019 года, незалежна ад таго, калі ў выніку такіх памылак мела месца неправамернае прымяненне спрошчанай сістэмы.

**Артыкул 328. Падатковая база падатку пры спрошчанай сістэме**

1. Падатковая база падатку пры спрошчанай сістэме вызначаецца як грашовае выражэнне валавой выручкі. Валавой выручкай у мэтах гэтай главы прызнаецца сума выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў.

2. У валавую выручку не ўключаюцца:

2.1. кошт бязвыплатна перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы затраты на іх бязвыплатную перадачу;

2.2. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя ад выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам (у тым ліку вылічаныя згодна з падпунктам 7.1 пункта 7 артыкула 129 гэтага Кодэкса ў сувязі з іх залішнім прад'яўленнем), за выключэннем сум падатку на дабаўленую вартасць, указаных у падпункце 3.6 пункта 3 артыкула 175 гэтага Кодэкса;

2.3. сумы падатку на дабаўленую вартасць (іншых падаткаў, аналагічных падатку на дабаўленую вартасць, такіх як падатак на тавары і паслугі, падатак з продажаў), аплачаныя (утрыманыя) у замежных дзяржавах у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў, пры наяўнасці даведкі, засведчанай падатковым органам замежнай дзяржавы (іншай кампетэнтнай службай замежнай дзяржавы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў), ці іншых дакументаў, якія пацвярджаюць аплату (утрыманне) падатку ў замежнай дзяржаве;

2.4. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя даверным кіраўніком у адпаведнасці з гэтым Кодэксам з выручкі ад аказання даручальніку паслуг па даверным кіраванні маёмасцю;

2.5. кошт маёмасці і правоў, атрыманых арганізацыяй ад заснавальнікаў (удзельнікаў, акцыянераў) у якасці ўзносу (укладу) у яе статутны фонд у памерах, прадугледжаных статутам (установчым дагаворам – для арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавору);

2.6. выручка арганізацыі ад рэалізацыі (пагашэння) каштоўных папер;

2.7. выручка арганізацыі ад адчужэння долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі;

2.8. выручка арганізацыі ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу;

2.9. выручка ад рэалізацыі банкам банкаўскіх і мерных зліткаў з каштоўных металаў, зліткавых (інвестыцыйных) манет з каштоўных металаў;

2.10. сумы сродкаў, бязвыплатна атрыманыя арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам у рамках мэтавага фінансавання з бюджэту, дзяржаўных пазабюджэтных фондаў або пазабюджэтных цэнтралізаваных інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з бюджэту Саюзнай дзяржавы і выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні (пры ўстанаўленні мэтавага прызначэння заканадаўствам ці ў адпаведнасці з ім), за выключэннем указаных сродкаў, якія пакрываюць затраты (расходы), улічаныя арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам пры вызначэнні адпаведна падатковай базы падатку на прыбытак, падаходнага падатку з фізічных асоб;

2.11. выручка ад адчужэння маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры якім атрыманыя грашовыя сродкі падлягаюць накіраванню ў бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, якія рэгулююць парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, і (ці) на мэты, вызначаныя гэтымі актамі заканадаўства, або падлягаюць размеркаванню згодна з указанымі актамі заканадаўства;

2.12. сумы, атрыманыя ў выглядзе пакрыцця суполцы ўласнікаў (арганізацыі забудоўшчыкаў, гаражнаму кааператыву, садаводчай суполцы, дачнаму кааператыву, кааператыву, які ажыццяўляе эксплуатацыю аўтамабільных стаянак) яго ўдзельнікамі (членамі) кошту тавараў (прац, паслуг), набытых для гэтых удзельнікаў (членаў) і звязаных з утрыманнем і эксплуатацыяй нерухомай маёмасці. Пры гэтым:

дадзенае палажэнне распаўсюджваецца таксама на ўдзельніка дагавора сумеснага домаўладання, якому даручана кіраванне нерухомай маёмасцю сумеснага домаўладання, кіраўніка нерухомай маёмасцю сумеснага домаўладання, арганізацыю, якая кіруе агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання;

да ўдзельнікаў (членаў), указаных у абзацы першым гэтага падпункта, адносяцца таксама арандатары (лізінгаатрымальнікі, наймальнікі) іх нерухомай маёмасці;

2.13. сумы, атрыманыя ў выглядзе пакрыцця абаненту субабанентамі кошту ўсіх відаў энергіі, газу, вады;

2.14. сумы расходаў, якія кампенсуюцца пазыкадавальніку пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, звязаны з гэтай маёмасцю і ўзнікаюць у сувязі з набыццём камунальных і іншых паслуг (прац), неабходных для ўтрымання і эксплуатацыі ўказанай маёмасці, а таксама расходаў, абавязак пакрыцця пазыкадавальніку якіх прадугледжаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (за выключэннем сум расходаў, якія адносяцца да паслуг (прац), аказаных (выкананых) пазыкадавальнікам);

2.15. пры здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) нерухомай маёмасці, здачы ў наём жылых памяшканняў – сума расходаў, якія кампенсуюцца арэндадаўцу (лізінгадавальніку, наймадаўцу), не ўключаных у арэндную плату (лізінгавы плацеж, плату за карыстанне жылым памяшканнем), якія звязаны з гэтай маёмасцю і ўзнікаюць у сувязі з набыццём камунальных і іншых паслуг (прац), неабходных для ўтрымання і эксплуатацыі ўказанай маёмасці (за выключэннем сум расходаў, якія адносяцца да паслуг (прац), аказаных (выкананых) арэндадаўцам (лізінгадавальнікам, наймадаўцам));

2.16. кошт матэрыяльных каштоўнасцей, якія застаюцца (атрыманы) у выніку ліквідацыі (разборкі, дэмантажу) асноўных сродкаў ці іншай маёмасці арганізацыі, у перыяд да рэалізацыі такіх каштоўнасцей;

2.17. даходы, якія атрымліваюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ад камерцыйных арганізацый (за выключэннем акцыянерных таварыстваў), удзельнікамі, уласнікамі маёмасці якіх з'яўляюцца гэтыя індывідуальныя прадпрымальнікі, іх сужэнцы, бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачароныя);

2.18. даходы індывідуальных прадпрымальнікаў, атрыманыя імі ў выглядзе страхавога пакрыцця і (ці) забеспячэння ў сувязі з надыходам адпаведных страхавых выпадкаў па дагаворах абавязковага страхавання, якое ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, і (ці) па дагаворах добраахвотнага страхавання, па якіх страхавыя ўзносы (страхавыя прэміі) уносілі індывідуальныя прадпрымальнікі за кошт уласных сродкаў;

2.19. выручка індывідуальных прадпрымальнікаў ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) пры ажыццяўленні дзейнасці, па якой выплачваецца адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб;

2.20. сумы, якія паступілі індывідуальнаму прадпрымальніку ад яго работнікаў для пакрыцця кошту прац (паслуг), набытых для іх індывідуальным прадпрымальнікам;

2.21. кошт тавараў, перададзеных індывідуальным прадпрымальнікам па дагаворы пазыкі;

2.22. даходы індывідуальных прадпрымальнікаў, указаныя ў пункце 2 артыкула 196 і падпункце 11.6 пункта 11 артыкула 205 гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана гэтай главой.

3. Выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў адлюстроўваецца:

арганізацыямі, якія вядуць бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць, – зыходзячы з даты прызнання выручкі (даходу) у бухгалтарскім уліку незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх з захаваннем прынцыпу (метаду) налічэння ў парадку, установленым заканадаўствам (далей у гэтай главе – прынцып налічэння);

арганізацыямі, якія вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 333 гэтага Кодэкса, – адпаведна з аплатай адгружаных тавараў, выкананых прац, аказаных паслуг, перададзеных маёмасных правоў (далей у гэтай главе – прынцып аплаты).

4. Выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў адлюстроўваецца:

4.1. індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія вядуць улік даходаў і расходаў у парадку, установленым Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, – па прынцыпе аплаты;

4.2. індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 333 гэтага Кодэкса, па выбары плацельшчыка:

4.2.1. па прынцыпе аплаты;

4.2.2. адпаведна з адгрузкай тавараў, выкананнем прац, аказаннем паслуг, перадачай маёмасных правоў незалежна ад даты правядзення разлікаў па іх (далей – прынцып адгрузкі).

Выбраны індывідуальным прадпрымальнікам прынцып адлюстравання выручкі ўстанаўліваецца пісьмовым рашэннем індывідуальнага прадпрымальніка па ўсіх аперацыях па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і змяненню на працягу падатковага перыяду не падлягае.

5. З улікам асаблівасцей дзейнасці асобных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў у выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў для мэт вызначэння падатковай базы і валавой выручкі ўключаюцца:

5.1. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці здзяйсненні іншых здзелак, іншых юрыдычна значных дзеянняў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, а таксама пры аказанні паслуг па дагаворах транспартнай экспедыцыі ў камісіянера (паверанага), іншай аналагічнай асобы і экспедытара – сума ўзнагароды, а таксама дадатковай выгады;

5.2. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў у камітэнта (даверніка), іншай аналагічнай асобы – кошт (цана), па якому рэалізаваны тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы;

5.3. пры здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, здачы ў наём жылых памяшканняў – сума арэнднай платы (лізінгавых плацяжоў, платы за карыстанне жылым памяшканнем), а таксама сума расходаў, якія кампенсуюцца, не ўключаных у арэндную плату (лізінгавы плацеж, плату за

карыстанне жылым памяшканнем), калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 2.15 пункта 2 гэтага артыкула;

5.4. пры выкананні праектных і будаўнічых прац – кошт праектных і будаўнічых прац, у тым ліку выкананых трэцімі асобамі, а таксама сумы, атрыманыя (належныя) у сувязі з расходамі, звязанымі з выкананнем указаных прац (у тым ліку з расходамі, абумоўленымі правядзеннем дзяржаўнай экспертызы праектнай дакументацыі), і не ўключаныя ў кошт такіх прац;

5.5. пры рэалізацыі турыстычных паслуг – кошт турыстычных паслуг, у тым ліку аказаных трэцімі асобамі;

5.6. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, грашовае абавязацельства па аплаце якіх выконваецца шляхам фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынга), – кошт (цана), па якім рэалізаваны тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы;

5.7. пры прымяненні спрошчанай сістэмы бюджэтнымі арганізацыямі – сума, атрыманая (належная) у сувязі з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці;

5.8. пры рэалізацыі паслуг па даверным кіраванні маёмасцю, аказаных даручальніку (выгаданабытчыку), – сума атрыманай давернай кіраўніком (належнай яму) узнагароды па дагаворы давернага кіравання маёмасцю;

5.9. сумы расходаў, якія кампенсуюцца пазыкадавальніку пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, за выключэннем сум расходаў, якія не ўключаюцца ў валавую выручку ў адпаведнасці з падпунктам 2.14 пункта 2 гэтага артыкула;

5.10. пры паступленні на рахункі юрыдычных асоб, на якіх ускладзены функцыі рэдакцыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, падпіснога кошту тыражу гэтых сродкаў масавай інфармацыі за вылікам сум аплаты паслуг сувязі, якія застаюцца на рахунках арганізацый сувязі, згодна з устаноўленымі тарыфамі (пры рэалізацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі па падпісцы), сум аплаты паслуг, аказаных арганізацыямі сувязі па афармленні падпіскі і выдачы друкаваных сродкаў масавай інфармацыі праз гандлёвую сетку гэтых арганізацый, сум аплаты расходаў арганізацый, задзейнічаных у працэсе рэалізацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі па падпісцы, – сума выручкі, якая паступіла (належная да паступлення) на рахункі гэтых юрыдычных асоб;

5.11. сумы, атрыманыя звыш цаны рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у тым ліку сумы пакрыцця расходаў, звязаных з рэалізацыяй тавараў (выкананнем прац, аказаннем паслуг), перадачай маёмасных правоў (уключаючы сумы пакрыцця пакупніком тавараў іх прадаўцу кошту набытых паслуг па дастаўцы (перавозцы) тавараў, не ўключаных у кошт гэтых тавараў), калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам і (ці) пунктам 2 гэтага артыкула;

5.12. пры прымяненні спрошчанай сістэмы падаткаабкладання натарыусамі, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльным бюро, – сума натарыяльнага тарыфу, які збіраецца натарыусамі за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў і аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару.

6. У выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў для мэт вызначэння падатковай базы і валавой выручкі індывідуальнымі прадпрымальнікамі ўключаюцца даходы, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым пунктам 11 артыкула 199 і пунктам 4 артыкула 205 гэтага Кодэкса для вызначэння даходаў, атрыманых ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, пры вылічэнні і

аплаце падаходнага падатку з фізічных асоб, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

7. Выручка арганізацый ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў:

7.1. па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце, вызначаецца:

у падлеглай аплаце суме ў беларускіх рублях – у выпадках, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы папярэднічае даце (супадае з датай) адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

у беларускіх рублях па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у іншых выпадках;

7.2. па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў замежнай валюце (акрамя дагавораў, указаных у падпункце 7.3 гэтага пункта), вызначаецца ў беларускіх рублях шляхам пералічвання замежнай валюты па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

7.3. па дагаворах, у якіх сума абавязацельстваў выражана ў замежнай валюце эквівалентна суме ў іншай замежнай валюце, вызначаецца ў беларускіх рублях:

шляхам пералічвання падлеглай аплаце сумы ў замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у выпадку, калі дата вызначэння велічыні абавязацельства папярэднічае даце (супадае з датай) адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

шляхам пералічвання сумы ў іншай замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – у іншых выпадках.

Для мэт гэтага артыкула пад датай вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворы разумеецца дата, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам ці пагадненнем бакоў вызначаюцца:

падлеглая аплаце сума ў беларускіх рублях па абавязацельствах па такім дагаворы, выражаных у беларускіх рублях у суме, эквівалентнай суме ў замежнай валюце;

падлеглая аплаце сума ў замежнай валюце па абавязацельствах, выражаных у замежнай валюце ў суме, эквівалентнай суме ў іншай замежнай валюце.

8. Да пазарэалізацыйных даходаў арганізацый адносяцца даходы, якія ўключаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у склад пазарэалізацыйных даходаў пры вылічэнні падатку на прыбытак, акрамя ўказаных у падпунктах 3.1–3.3, 3.18, 3.20, 3.30–3.32 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Пазарэалізацыйныя даходы, указаныя ў падпункце 3.36 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, не ўключаюцца ў падатковую базу падатку пры спрошчанай сістэме, калі сума арэнднай платы, згаданая ва ўказаным падпункце, не ўлічвалася ў складзе затрат (расходаў) пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак.

Для мэт гэтай главы кошт бязвыплатна атрыманых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, указаны ў падпункце 3.7 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса (за выключэннем кошту атрыманых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, іншых актываў, вызваленых у далейшым ад абавязку іх аплаты),

вызначаецца як іх кошт (з улікам прад'яўленага падатку на дабаўленую вартасць), указаны ў дакументах пры бязвыплатнай перадачы, але не меншы за кошт (суму), у памеры якога ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 200 гэтага Кодэкса вызначаецца падатковая база падаходнага падатку з фізічных асоб.

Пры вызначэнні арганізацыямі падатковай базы пазарэалізацыйныя даходы ў замежнай валюце пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх адлюстравання.

9. Для мэт гэтай главы ў пазарэалізацыйныя даходы, указаныя ў падпункце 3.21 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, у выпадку, калі дата адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (далей у гэтым пункце – выручка) папярэднічала даце вызначэння велічыні абавязацельства па дагаворах, у якіх:

9.1. сума абавязацельстваў выражаная ў беларускіх рублях эквівалентна суме ў замежнай валюце, уключаецца станоўчая розніца паміж падлеглай аплаце сумай у беларускіх рублях і сумай выручкі ў беларускіх рублях, вызначанай шляхам пералічвання сумы ў замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі.

Адлюстраванне ўказанай розніцы ў складзе пазарэалізацыйных даходаў праводзіцца на дату паступлення аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а ў выпадку спынення абавязацельстваў па такой аплаце на іншых падставах – на дату спынення абавязацельстваў (поўнасцю ці ў адпаведнай частцы).

У выпадку атрымання аплаты ў беларускіх рублях часткамі (спыненне абавязацельстваў у адпаведнай частцы) сума ў замежнай валюце для мэт гэтага падпункта прымаецца ў памеры, зыходзячы з эквіваленту якога згодна з дагаворам праведзена аплата (спынена абавязацельства) у адпаведнай частцы;

9.2. сума абавязацельстваў выражана ў замежнай валюце эквівалентна суме ў іншай замежнай валюце, уключаецца станоўчая розніца паміж сумай у беларускіх рублях, вылічанай шляхам пералічвання падлеглай аплаце сумы ў замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, і сумай выручкі ў беларускіх рублях, вызначанай шляхам пералічвання сумы ў іншай замежнай валюце па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, устаноўленым на дату адлюстравання выручкі.

Афіцыйны курс Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь для пералічвання падлеглай аплаце сумы ў замежнай валюце прымаецца і адлюстраванне ўказанай розніцы ў складзе пазарэалізацыйных даходаў праводзіцца на дату паступлення аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, а ў выпадку спынення абавязацельстваў па такой аплаце на іншых падставах – на дату спынення абавязацельстваў (поўнасцю ці ў адпаведнай частцы).

У выпадку атрымання аплаты ў замежнай валюце часткамі (спыненне абавязацельстваў у адпаведнай частцы) сума ў іншай замежнай валюце для мэт гэтага падпункта прымаецца ў памеры зыходзячы з эквіваленту якога згодна з дагаворам праведзена аплата (спынена абавязацельства) у адпаведнай частцы.

10. Да пазарэалізацыйных даходаў індывідуальных прадпрымальнікаў адносяцца даходы, якія ўключаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у склад пазарэалізацыйных даходаў пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб, акрамя ўказаных у падпунктах 9.3 і 9.6 пункта 9 артыкула 205 гэтага Кодэкса.

Пры вызначэнні індывідуальнымі прадпрымальнікамі падатковай базы пазарэалізацыйныя даходы ў замежнай валюце пералічваюцца ў беларускія рублі па

afіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату іх адлюстравання.

11. У валавую выручку арганізацый, якія прымяняюць спрошчаную сістэму, пры перадачы імі маёмасці ў давернае кіраванне ўключаецца сума выручкі і пазарэалізацыйных даходаў, якая ўтвараецца ў сувязі з выкананнем даверным кіраўніком дагавора давернага кіравання маёмасцю, за вылікам сумы вылічанага даверным кіраўніком падатку на дабаўленую вартасць, указанага ў абзацы чацвёртым пункта 2 артыкула 326 гэтага Кодэкса.

Даверны кіраўнік штомесяц вызначае выручку і пазарэалізацыйны даход, якія ўтвараюцца ў сувязі з выкананнем ім дагавора давернага кіравання маёмасцю, і падае даручальніку звесткі аб іх і суме падатку на дабаўленую вартасць, указанага ў абзацы чацвёртым пункта 2 артыкула 326 гэтага Кодэкса, разам з копіямі дакументаў (дагавораў, першасных уліковых дакументаў і іншых дакументаў), засведчанымі даверным кіраўніком, для іх уліку даручальнікам пры вызначэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме ў кожным справаздачным перыядзе.

Даверны кіраўнік вызначае выручку і пазарэалізацыйныя даходы даручальніка зыходзячы з парадку вызначэння валавой выручкі, які прымяняе даручальнік.

Палажэнні гэтага пункта не распаўсюджваюцца на дагаворы давернага кіравання грашовымі сродкамі і (ці) дагаворы давернага кіравання каштоўнымі паперамі, а таксама на дагаворы давернага кіравання фондам банкаўскага кіравання.

12. Пры павелічэнні кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем указаных у падпунктах 2.6–2.9 пункта 2 гэтага артыкула), праведзеным у перыяд прымянення спрошчанай сістэмы пасля даты адлюстравання выручкі ад іх рэалізацыі (у тым ліку калі адлюстраванне выручкі праведзена пры прымяненні агульнага парадку падаткаабкладання ці іншага асаблівага рэжыму падаткаабкладання), арганізацыя павялічвае валавую выручку ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзена ўказанае павелічэнне кошту.

У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены ў справаздачным перыядзе каляндарнага года, у якім плацельшчык прымяняе спрошчаную сістэму, і выручку ад рэалізацыі якіх ён улічваў пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме ў папярэднім справаздачным перыядзе таго ж каляндарнага года, суразмернае змяншэнне выручкі ад рэалізацыі гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ажыццяўляецца ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены ўказаныя вяртанне (адмова) ці змяншэнне кошту.

13. Сумы расходаў, якія кампенсуюцца і ўключаюцца ў падатковую базу ў адпаведнасці з падпунктамі 5.3 і 5.9 пункта 5 гэтага артыкула, улічваюцца ў складзе выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на дату паступлення пакрыцця гэтых расходаў (у тым ліку ў натуральнай форме) або на дату іншага спынення абавязацельства па пакрыцці ўказаных расходаў, у тым ліку ў выніку заліку, уступкі права патрабавання, пералічэння грашовых сродкаў на рахункі трэціх асоб.

У парадку, устаноўленым часткай першай гэтага пункта, праводзіцца таксама ўключэнне ў падатковую базу сум, указаных у падпункце 5.11 пункта 5 гэтага артыкула.

Дата адлюстравання выручкі, якая ўзнікае пры здачы ў наём жылых памяшканняў, вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі, вызначанымі гэтым артыкулам для здачы ў арэнду (перадачы фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці.

14. Арганізацыі, якія адлюстроўваюць выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па прынцыпе налічэння, вызначаюць:

дату адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адпаведнасці з пунктамі 7–11 артыкула 168 гэтага Кодэкса;

пазарэалізацыйныя даходы ў адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса, калі іншае не ўстаноўлена пунктамі 8 ці 9 гэтага артыкула.

Арганізацыі, якія змянілі прынцып адлюстравання выручкі з прынцыпу аплаты на прынцып налічэння, выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, адгружаных (выкананых, аказаных), перададзеных і не аплачаных да 1-га чысла месяца, з якога зменены прынцып адлюстравання выручкі, і пазарэалізацыйныя даходы, якія належалі да атрымання і не атрыманыя да гэтай даты, адлюстраванне якіх у адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса не прыпадае на ўказаную дату або пасля яе, адлюстроўваюць:

па меры паступлення аплаты (фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў) – у выпадку паступлення аплаты (атрымання пазарэалізацыйных даходаў) на працягу падатковага перыяду, у якім зменены прынцып адлюстравання выручкі;

на апошняе число падатковага перыяду, у якім зменены прынцып адлюстравання выручкі, – у іншых выпадках.

15. Для арганізацый, якія адлюстроўваюць выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па прынцыпе аплаты, датай адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў з'яўляецца:

дата аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, якія былі адгружаны (выкананы, аказаны), перададзены да дня або ў дзень аплаты;

дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў, у адносінах да якіх аплата паступіла да гэтай даты (ажыццёўлена папярэдняя аплата, атрыманы авансавы плацеж, задатак).

Датай адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (выканання прац, аказання паслуг) з выкарыстаннем касавага абсталявання, якая ажыццяўляецца на працягу змены, што пачынаецца ў адзін каляндарны дзень і заканчваецца на іншы каляндарны дзень, з'яўляецца дата адкрыцця гэтай змены, якая адлюстроўваецца ў сутачнай (зменнай) справаздачы (Z-справаздачы), што фарміруецца такім касавым абсталяваннем.

У арганізацыі, якая выкарыстоўвае спрошчаную сістэму, пад датай аплаты разумеецца, у прыватнасці:

дата залічэння грашовых сродкаў на яе рахункі ў банках (замежных банках) або па яе даручэнні на рахункі трэціх асоб;

дата паступлення грашовых сродкаў у касу;

дата залічэння электронных грошай у яе электронны кашалёк або па яе даручэнні ў электронны кашалёк трэціх асоб;

дата атрымання тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў – пры аплаце ў натуральнай форме;

дата спынення абавязацельства перад арганізацыяй па аплаце, у тым ліку ў выніку заліку, уступкі арганізацыяй права патрабавання іншай асобе.

Датай аплаты камітэнту (даверніку) пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на аснове дагавораў камісіі, даручэння або іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца дата залічэння грашовых сродкаў на рахунак камісіянера (паверанага), а ў выпадку, калі дагаворам прадугледжана, што грашовыя сродкі за рэалізаваныя камісіянерам (пaverаным) тавары (працы, паслугі),

маёмасныя правы залічваюцца на рахунак камітэнта (даверніка), – дата залічэння грашовых сродкаў на рахунак камітэнта (даверніка).

Датай аплаты даручальніку пры рэалізацыі тавараў, маёмасных правоў даверным кіраўніком прызнаецца адпаведна дата залічэння грашовых сродкаў на рахунак davernaga кіраўніка.

Датай аплаты па дагаворы фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынгу) прызнаецца дата аплаты фактарам грашовых патрабаванняў без права рэгрэсу. Датай аплаты па гэтым дагаворы, калі ўмовамі плацяжу прадугледжана права рэгрэсу, прызнаецца дата пагашэння ўступленага грашовага патрабавання плацельшчыкам (даўжніком).

Дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), у тым ліку здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, вызначаецца згодна з артыкулам 121 гэтага Кодэкса з улікам асаблівасцей, устаноўленых часткамі восьмай і дзявятай гэтага пункта.

Датай адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камітэнтам (davernікам) пры іх рэалізацыі на аснове дагавораў камісіі, даручэння або іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў прызнаецца адпаведна дата адгрузкі тавараў (выканання прац, аказання паслуг), перадачы маёмасных правоў камісіянерам (паверанымі) пакупніку.

Датай адгрузкі тавараў, перадачы маёмасных правоў даручальнікам пры іх рэалізацыі даверным кіраўніком прызнаецца дата адгрузкі тавараў, перадачы маёмасных правоў даверным кіраўніком пакупніку.

Дата перадачы маёмасных правоў вызначаецца згодна з пунктам 8 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

Арганізацыі, якія выкарыстоўваюць прынцып аплаты, адлюстроўваюць пазарэалізацыйныя даходы:

па якіх пунктам 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса вызначана дата іх адлюстравання, – на ўказаную ў гэтым пункце дату, калі іншае не ўстаноўлена абзацамі трэцім, пятым і шостым гэтай часткі;

указаныя ў падпункце 3.5 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, – на дату іх атрымання;

указаныя ў падпункце 3.9 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, – на дату, якая ідзе следам за днём сканчэння тэрміну іскавай даўнасці;

указаныя ў падпункце 3.15 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, – на дату пагашэння пазыкі;

указаныя ў пункце 9 гэтага артыкула, – на дату, вызначаную гэтым пунктам;

іншыя – на дату іх атрымання.

16. Дата адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў вызначаецца:

індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія адлюстроўваюць выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па прынцыпе аплаты, – у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 213 гэтага Кодэкса;

індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія адлюстроўваюць выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў па прынцыпе адгрузкі, – у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса.

17. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія змянілі прынцып адлюстравання выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў з прынцыпу аплаты на прынцып адгрузкі, выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных

правоў, адгружаных (выкананых, аказаных), перададзеных і не аплачаных да 1-га студзеня года, з якога зменены прынцып адлюстравання выручкі, і пазарэалізацыйныя даходы, якія належалі да атрымання і не атрыманыя да гэтай даты, адлюстраванне якіх у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса не прыпадае на ўказаную дату або прыпадае пасля яе, адлюстроўваюць:

па меры паступлення аплаты (фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў) – у выпадку паступлення аплаты (атрымання пазарэалізацыйных даходаў) на працягу падатковага перыяду, у якім зменены прынцып адлюстравання выручкі;

на апошняе чысло падатковага перыяду, у якім зменены прынцып адлюстравання выручкі, – у іншых выпадках.

### Артыкул 329. Стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме

1. Стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме ўстанаўліваюцца ў наступных памерах:

1.1. пяць (5) працэнтаў – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць, калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 1.3 гэтага пункта;

1.2. тры (3) працэнты – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць, калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 1.3 гэтага пункта;

1.3. шаснаццаць (16) працэнтаў – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў у адносінах да пазарэалізацыйных даходаў, указаных адпаведна ў падпункце 3.7 пункта 3 артыкула 174 і падпункце 9.10 пункта 9 артыкула 205 гэтага Кодэкса.

2. Калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула, пазарэалізацыйныя даходы арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў:

якія прымяняюць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць, абкладаюцца па стаўцы падатку пры спрошчанай сістэме, устаноўленай падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула;

якія прымяняюць спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць, абкладаюцца па стаўцы падатку пры спрошчанай сістэме, устаноўленай падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула.

Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі:

якія прымяняюць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць, не маюць права прымяняць стаўку падатку пры спрошчанай сістэме, устаноўленую падпунктам 1.2 пункта 1 гэтага артыкула;

якія прымяняюць спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць, не маюць права прымяняць стаўку падатку пры спрошчанай сістэме, устаноўленую падпунктам 1.1 пункта 1 гэтага артыкула.

### Артыкул 330. Падатковы і справаздачны перыяды падатку пры спрошчанай сістэме

1. Падатковым перыядам падатку пры спрошчанай сістэме прызнаецца каляндарны год.

2. Справаздачным перыядам па падатку пры спрошчанай сістэме прызнаецца:

каляндарны месяц – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму з аплатай падатку на дабаўленую вартасць штомесяц;

каляндарны квартал – для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму без аплаты падатку на дабаўленую вартасць або з аплатай падатку на дабаўленую вартасць штоквартальна.

## Артыкул 331. Парадак вылічэння падатку пры спрошчанай сістэме

1. Сума падатку пры спрошчанай сістэме вылічваецца нарастаючым вынікам з пачатку падатковага перыяду як здабытак падатковай базы і стаўкі падатку.

2. У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены:

2.1. у справаздачным перыядзе каляндарнага года, у якім плацельшчык прымяняе спрошчаную сістэму, і выручку ад рэалізацыі якіх ён улічваў пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме ў папярэднім каляндарным годзе, праводзіцца змяншэнне сумы падатку пры спрошчанай сістэме ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены вяртанне (адмова) ці змяншэнне кошту, на суму падатку пры спрошчанай сістэме, вылічаную:

зыходзячы з кошту (часткі кошту, на якую праведзена змяншэнне) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключанага ў падатковую базу падатку пры спрошчанай сістэме;

зыходзячы са стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме, прыменянай у адносінах да выручкі ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

за вылікам сумы падатку пры спрошчанай сістэме, не аплачанай у сувязі з прымяненнем плацельшчыкам ільготы, якая адносіцца на выручку ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – калі плацельшчык прымяняў ільготу па падатку пры спрошчанай сістэме ў каляндарным годзе, у якім у падатковай базе ўлічана такая выручка;

2.2. у перыяд прымянення арганізацыяй агульнага парадку падаткаабкладання ці адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і выручка ад рэалізацыі якіх улічвалася ёю пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме, змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку пры спрошчанай сістэме за апошні справаздачны перыяд таго каляндарнага года, у якім пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме ўлічана выручка ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

2.3. у перыяд прымянення індывідуальным прадпрымальнікам агульнага парадку падаткаабкладання ці адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб і выручка ад рэалізацыі якіх улічвалася ім пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме, змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку пры спрошчанай сістэме за апошні справаздачны перыяд таго каляндарнага года, у якім пры вылічэнні падатковай базы падатку пры спрошчанай сістэме ўлічана выручка ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

## Артыкул 332. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты падатку пры спрошчанай сістэме

1. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія прымяняюць спрошчаную сістэму, не пазней за 20-е чысло месяца, што ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам, падаюць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку пры спрошчанай сістэме.

2. Аплата падатку пры спрошчанай сістэме праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, што ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

**Артыкул 333. Улік і справаздачнасць пры прымяненні спрошчанай сістэмы**

1. Арганізацыі, якія прымяняюць спрошчаную сістэму, з колькасцю работнікаў у сярэднім за перыяд з пачатку года па справаздачны перыяд уключна не большай за 15 чалавек, памер валавой выручкі якіх нарастаючым вынікам з пачатку года не перавышае 738 000 беларускіх рублёў, і індывідуальныя прадпрымальнікі маюць права, калі іншае не прадугледжана пунктам 2 гэтага артыкула, з пачатку падатковага перыяду весці ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання.

2. Не маюць права весці ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання:

2.1. плацельшчыкі, абавязаныя ў адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пералічваць у бюджэт частку прыбытку (даходу);

2.2. плацельшчыкі, якія рэалізуюць інвестыцыйныя праекты ў адпаведнасці з заключанымі з Рэспублікай Беларусь інвестыцыйнымі дагаворамі;

2.3. арганізацыі:

2.3.1. пачынаючы з месяца, які ідзе следам за справаздачным перыядам, у якім колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім за перыяд з пачатку года па справаздачны перыяд уключна перавысіла 15 чалавек і (ці) валавая выручка арганізацыі нарастаючым вынікам з пачатку года склала больш за 738 000 беларускіх рублёў.

Пры гэтым пачынаючы з указанага месяца арганізацыі вядуць бухгалтарскі ўлік і складаюць бухгалтарскую (фінансавую) справаздачнасць на агульных падставах;

2.3.2. у каляндарным годзе, калі ў папярэднім яму каляндарным годзе колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім за каляндарны год і (ці) валавая выручка арганізацыі нарастаючым вынікам з пачатку года перавысілі іх гранічныя велічыні, якія дзейнічалі ў такім папярэднім годзе для вызначэння права весці ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання.

3. Улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, уключае ў сябе:

3.1. улік, неабходны для вызначэння выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў;

3.2. улік тавараў, у тым ліку сыравіны і матэрыялаў, асноўных сродкаў і іншай маёмасці, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза;

3.3. улік, неабходны для вылічэння і аплаты падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

3.4. улік, неабходны для выканання абавязкаў падатковых агентаў;

3.5. улік, неабходны для вылічэння і аплаты абавязковых страхавых узносаў і іншых плацяжоў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь;

3.6. улік расходаў, якія праводзяцца за кошт сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь;

3.7. спрошчаны ўлік кошту паёў членаў вытворчага кааператыва;

3.8. улік капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, якія знаходзяцца ва ўласнасці, гаспадарчым вядзенні, аператыўным кіраванні ці карыстанні, а таксама капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак, у адносінах да якіх вызначаная падпунктам 1.5 пункта 1 артыкула 227 гэтага Кодэкса дзяржаўная рэгістрацыя павінна быць ажыццёўлена, у перыяд да такой рэгістрацыі.

Улік маёмасці, указанай у частцы першай гэтага падпункта, праводзіцца арганізацыямі і ажыццяўляецца па правілах, устаноўленых заканадаўствам для арганізацый, якія вядуць бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць, у адносінах да асноўных сродкаў (даходных укладанняў у матэрыяльныя актывы, укладанняў у доўгатэрміновыя актывы, матэрыялаў, тавараў, гатовай прадукцыі), якія знаходзяцца ў іх на балансе, а таксама ў адносінах да маёмасці, якая знаходзіцца на забалансавых рахунках.

Пры гэтым у адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іх частак не прымяняюцца правілы, устаноўленыя заканадаўствам у адносінах да доўгатэрміновых актываў, прызначаных для рэалізацыі.

4. Форма кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, і парадак яе запаўнення ўстанаўліваюцца Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь.

Інфармацыя, якая змяшчаецца ў такой кнізе ўліку, выкарыстоўваецца:

пры аказанні арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам аўдытарскіх паслуг;

пры апублікаванні згодна з заканадаўчымі актамі справаздачнасці акцыянерных таварыстваў, таварыстваў з абмежаванай і дадатковай адказнасцю;

у іншых мэтах у адпаведнасці з заканадаўствам.

Выплата кошту пая ці выдача іншай маёмасці члену, які выходзіць са складу вытворчага кааператыва, што прымяняе спрошчаную сістэму і вядзе ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, праводзіцца пасля заканчэння фінансавага года без зацвярджэння бухгалтарскага балансу гэтага кааператыва.

5. Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія маюць права весці ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, замест уліку ў гэтай кнізе маюць права з пачатку падатковага перыяду весці адпаведна бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць і ўлік даходаў і расходаў на агульных падставах.

6. Вядзенне кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, не вызваляе плацельшчыкаў падатку пры спрошчанай сістэме ад складання і захоўвання першасных уліковых дакументаў.

Складанне першасных уліковых дакументаў арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, калі іншае для ўказаных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца:

арганізацыямі – па правілах, устаноўленых заканадаўствам для арганізацый, якія вядуць бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць;

індывідуальнымі прадпрымальнікамі – па правілах, устаноўленых заканадаўствам для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вядуць улік даходаў і расходаў.

Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія прымяняюць спрошчаную сістэму, пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) вядуць касавыя аперацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Для мэт гэтага Кодэкса пад уліковай палітыкай для арганізацый, якія вядуць улік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, што прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, разумеецца дакумент, зацверджаны загадам кіраўніка арганізацыі.

## ГЛАВА 33
## АДЗІНЫ ПАДАТАК З ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ І ІНШЫХ ФІЗІЧНЫХ АСОБ

### Артыкул 334. Плацельшчыкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб

Плацельшчыкамі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца:

індывідуальныя прадпрымальнікі;

фізічныя асобы, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць;

фізічныя асобы, не зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Да такіх плацельшчыкаў адносяцца фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць віды дзейнасці, што прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб (далей у гэтай главе – адзіны падатак) для плацельшчыкаў – індывідуальных прадпрымальнікаў.

### Артыкул 335. Тэрміны і іх азначэнні, якія выкарыстоўваюцца для мэт гэтай главы і дадатку 24 да гэтага Кодэкса

Для мэт гэтай главы і дадатку 24 да гэтага Кодэкса выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны і іх азначэнні:

аўтамототранспартныя сродкі – легкавыя аўтамабілі, матацыклы, квадрацыклы, снегаходы; мотаролеры, мапеды, мотавеласіпеды, мокікі, скутары і іншыя аналагічныя транспартныя сродкі, прычэпы і паўпрычэпы;

гатовая кулінарная прадукцыя – харчовыя прадукты ці спалучэнне прадуктаў, даведзеных да гатоўнасці прыёму іх у ежу;

абслугоўваючы аб'ект – транспартны сродак (пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, прадугледжаных падпунктам 1.1.4 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса), іншы аб'ект, які належыць плацельшчыку на праве ўласнасці, валодання, карыстання,

у якім аказваюцца паслугі (выконваюцца працы) спажыўцам, ажыццяўляецца прыём заказаў на аказанне паслуг (выкананне прац) спажыўцам;

спажывец – фізічная асоба, якая мае намер заказаць ці набыць або заказвае, набывае ці выкарыстоўвае тавары (працы, паслугі) выключна для асабістых, бытавых, сямейных і іншых патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання – даванне жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач па заключаных у каляндарным годзе двух і больш дагаворах, працягласць кожнага з якіх не перавышае пятнаццаць дзён;

рэпетытарства – кансультатыўныя паслугі па асобных навучальных прадметах (прадметах), навучальных дысцыплінах (дысцыплінах), адукацыйных галінах, тэмах, у тым ліку дапамога ў падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання.

**Артыкул 336. Агульныя ўмовы прымянення адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб**

1. Выплата адзінага падатку замяняе аплату:

1.1. падаходнага падатку з фізічных асоб па даходах, якія атрымліваюць плацельшчыкі пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, што прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам;

1.2. падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

1.3. экалагічнага падатку;

1.4. падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў;

1.5. мясцовых падаткаў і збораў, якія аплачваюцца пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, што прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам.

2. Палажэнні гэтай главы не прымяняюцца пры:

2.1. рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам, за выключэннем продажу тавараў, аднесеных да груп тавараў, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, пры ажыццяўленні рознічнага гандлю ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, а таксама пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) спажыўцам на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў;

2.2. ажыццяўленні дзейнасці ў рамках дагавора простай суполкі (дагавора аб сумеснай дзейнасці).

3. Пры ўказанні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці ці тлумачэннях, пададзеных па патрабаванні падатковага органа, у якасці крыніц, за кошт якіх была набыта маёмасць, даходаў, атрыманых ад дзейнасці, пры ажыццяўленні якой аплачваецца адзіны падатак, у памерах, якія перавышаюць дзесяцікратны памер аплачанага за пэўны перыяд адзінага падатку, плацельшчык даплачвае адзіны падатак у памеры 10 працэнтаў ад сумы такога перавышэння.

Падатковы орган вылічвае суму даплаты адзінага падатку не пазней за дзень, які ідзе следам за днём завяршэння камеральнай праверкі па пытанні выканання заканадаўства аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў.

Даплата адзінага падатку праводзіцца ў трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння плацельшчыку – фізічнай асобе паведамлення падатковага органа.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго ў пісьмовай ці электроннай форме.

4. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія аплачваюць адзіны падатак:

вядуць улік валавой выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), па якіх аплачваецца адзіны падатак, а таксама ўлік тавараў, у тым ліку сыравіны і матэрыялаў, асноўных сродкаў і іншай маёмасці, якія ўвозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Форму і парадак вядзення ўліку ўстанаўлівае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

выконваюць абавязкі падатковых агентаў, у тым ліку ўтрымліваюць пры выплаце заработнай платы і іншых даходаў з налічаных (пералічаных) сум падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

вылічваюць і пералічваюць у бюджэт падатак на дабаўленую вартасць у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, па таварах (працах, паслугах), маёмасных правах, якія рэалізуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь замежнымі арганізацыямі, што не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва і не знаходзяцца ў сувязі з гэтым на ўліку ў падатковых органах Рэспублікі Беларусь;

складаюць першасныя ўліковыя дакументы па правілах, устаноўленых заканадаўствам для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія вядуць улік даходаў і расходаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

5. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць віды дзейнасці, што з'яўляюцца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам, маюць права ў адносінах да такіх відаў дзейнасці прымяняць іншы парадак падаткаабкладання, прадугледжаны гэтым Кодэксам, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 2 артыкула 337 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 337. Аб'ект падаткаабкладання адзіным падаткам

1. Аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам для плацельшчыкаў – індывідуальных прадпрымальнікаў прызнаецца:

1.1. аказанне спажыўцам наступных паслуг (выкананне прац), у тым ліку ў выпадку іх аплаты за спажыўца арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі:

1.1.1. тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт матацыклаў;

1.1.2. рамонт прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў, вытворчасць адзення, вытворчасць абутку, вытворчасць гатовых тэкстыльных вырабаў, акрамя адзення, вытворчасць дываноў і дывановых вырабаў, мыццё, хімічная чыстка і афарбоўванне тэкстыльных і футравых вырабаў;

1.1.3. аказанне паслуг цырульнямі і салонамі прыгажосці;

1.1.4. дзейнасць таксі, дзейнасць іншага пасажырскага сухапутнага транспарту, не ўключанага ў іншыя групоўкі, дзейнасць пасажырскага рачнога транспарту, дзейнасць грузавога рачнога транспарту, дзейнасць грузавога аўтамабільнага транспарту;

1.1.5. агульнае будаўніцтва будынкаў, спецыяльныя будаўнічыя працы;

1.1.6. медыцынская, у тым ліку стаматалагічная, практыка, іншая дзейнасць па ахове здароўя;

1.1.7. дзейнасць па чыстцы і ўборцы, дзейнасць, якая спрыяе вырошчванню сельскагаспадарчых культур і гадоўлі жывёл, аказанне сацыяльных паслуг без забеспячэння пражывання;

1.1.8. даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання;

1.1.9. здача ў арэнду (субарэнду), наём (паднайманне) жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач, машына-месцаў (акрамя давання месцаў для кароткатэрміновага пражывання) (далей для мэт гэтай главы – здача ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў);

1.1.10. іншыя віды паслуг і прац, не названыя ў падпунктах 1.1.1–1.1.9 гэтага пункта.

Для мэт гэтай главы і дадатку 24 да гэтага Кодэкса да паслуг (прац), указаных у падпунктах 1.1.1–1.1.7 гэтага пункта, адносяцца паслугі (працы), якія аказваюцца (выконваюцца) спажыўцам па пераліку паслуг (прац), прадугледжаным АКРБ агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь 005-2011 «Віды эканамічнай дзейнасці» з улікам наступных асаблівасцей:

да паслуг (прац), указаных у падпункце 1.1.1 гэтага пункта, таксама адносяцца тэхнічнае абслугоўванне і рамонт матаролераў і мапедаў; паслугі па аднаўленні гумавых шын і пакрышак, паслугі па дыягнаставанні транспартных сродкаў, буксіроўка транспартных сродкаў, аказанне тэхнічнай дапамогі ў дарозе;

да паслуг (прац), указаных у падпункце 1.1.2 гэтага пункта, таксама адносяцца паслугі па рамонце ручнога электрычнага інструменту, ручнога пнеўматычнага і механізаванага інструменту, брызентаў і ветразяў;

да паслуг (прац), указаных у падпункце 1.1.3 гэтага пункта, таксама адносяцца паслугі па нанясенні татуіровкі, нацельнага жывапісу, перманентнага макіяжу, паслугі па пірсінгу;

да дзейнасці грузавога аўтамабільнага транспарту, указанай у падпункце 1.1.4 гэтага пункта, адносіцца толькі дзейнасць грузавога аўтамабільнага транспарту ў межах Рэспублікі Беларусь;

да паслуг (прац), указаных у падпункце 1.1.5 гэтага пункта, таксама адносяцца бурэнне вадзяных свідравін, прамочванне драўніны, вытворчасць драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных вырабаў, уключаючы мантаж і ўстаноўку вырабаў уласнай вытворчасці, вытворчасць з пластмасы і полівінілхларыду дзвярных створак і вушакоў, вокнаў і аконных шуфляд, жалюзі, уключаючы мантаж і ўстаноўку вырабаў уласнай вытворчасці;

да паслуг (прац), указаных у падпункце 1.1.7 гэтага пункта, таксама адносяцца рэпетытарства, мыццё і прасаванне пасцельнай бялізны і іншых рэчаў у хатніх гаспадарках грамадзян, закупка прадуктаў, мыццё посуду і прыгатаванне ежы ў хатніх гаспадарках грамадзян, унясенне платы са сродкаў асобы, якая абслугоўваецца, за карыстанне жылым памяшканнем і жыллёва-камунальныя паслугі, кашэнне траў на газонах, прыбіранне азяленёнай тэрыторыі ад лісця, скошанай травы і смецця, аказанне індывідуальных паслуг з дапамогай аўтаматаў для вымярэння росту, вагі, аказанне паслуг утрымання хатніх жывёл, іх дрэсіроўкі і догляду за імі;

1.2. рознічны гандаль таварамі, аднесенымі да наступных груп тавараў:

1.2.1. хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако і малочная прадукцыя;

1.2.2. агародніна, плады, ягады, кавуны, дыні, вінаград;

1.2.3. іншыя харчовыя тавары (за выключэннем піва, піўнога кактэйлю, алкагольных напояў);

1.2.4. аўтамотатранспартныя сродкі;

1.2.5. адзенне з натуральнай скуры (паліто, паўпаліто, курткі, блэйзары, жакеты, камізэлькі, пінжакі, плашчы, касцюмы), дываны і дывановыя вырабы, складаныя бытавыя электратавары (акрамя электрахаладзільнікаў бытавых і маразільнікаў, машын пральных бытавых);

1.2.6. іншыя непрадуктовыя тавары (за выключэннем ювелірных і іншых бытавых вырабаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, спецыфічных тавараў, тытунёвых вырабаў, нафтапрадуктаў праз аўтазаправачныя станцыі, каштоўных папер, газет і часопісаў, усіх відаў вырабаў з натуральнага футра, мэблі, электрахаладзільнікаў бытавых і маразільнікаў, машын пральных бытавых, тэлевізійных прыёмнікаў каляровага і чорна-белага адлюстравання, камп'ютараў бытавых персанальных, ноўтбукаў, іх складовых частак і вузлоў, электронных кніг, планшэтных камп'ютараў, мабільных тэлефонаў, запасных частак да аўтамабіляў);

1.3. ажыццяўленне грамадскага харчавання праз міні-кафэ, летнія і сезонныя кафэ (далей у гэтай главе і дадатку 24 да гэтага Кодэкса – аб'екты грамадскага харчавання) (за выключэннем продажу алкагольных напояў, піва, піўнога картэйлю і тытунёвых вырабаў).

2. Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць віды дзейнасці, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, і аплацілі за справаздачны перыяд бягучага падатковага перыяду адзіны падатак, абавязаны да заканчэння гэтага падатковага перыяду прымяняць парадак падаткаабкладання, устаноўлены гэтай главой.

3. Аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам для плацельшчыкаў – фізічных асоб, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, за выключэннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, прызнаецца:

3.1. рэалізацыя спажыўцам тавараў (прац, паслуг) пры ажыццяўленні наступных відаў дзейнасці:

3.1.1. рэалізацыя на гандлёвых месцах і (ці) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады, жывёл (за выключэннем кацянят і шчанят), выробленых гэтымі фізічнымі асобамі хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, гатовай кулінарнай прадукцыі;

3.1.2. рэалізацыя кацянят і шчанят пры ўмове ўтрымання хатняй жывёлы (кошкі, сабакі);

3.1.3. відэаздымка падзей;

3.1.4. дзейнасць акцёраў, танцораў, музыкаў, выканаўцаў гутарковага жанру, якія выступаюць індывідуальна, аказанне паслуг тамадой;

3.1.5. капіраванне, падрыхтоўка дакументаў і іншая спецыялізаваная офісная дзейнасць;

3.1.6. пісьмовы і вусны пераклад;

3.1.7. дзейнасць, звязаная з віншаваннем з днём нараджэння, Новым годам і іншымі святамі незалежна ад месца іх правядзення;

3.1.8. кашэнне траў на газонах, прыбіранне азяляненай тэрыторыі ад лісця, скошанай травы і смецця;

3.1.9. музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў;

3.1.10. нанясенне аквагрыму;

3.1.11. настройка музычных інструментаў;

3.1.12. аказанне паслуг па вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі, аказанне паслуг па драбленні зерня, выпас жывёлы;

3.1.13. цырульніцкія і касметычныя паслугі, а таксама паслугі манікюру і педыкюру;

3.1.14. аказанне паслуг, якія аказваюцца пры дапамозе аўтаматаў для вымярэння вагі, росту;

3.1.15. вытворчасць адзення (у тым ліку галаўных убораў) і абутку з матэрыялаў спажыўца;

3.1.16. працы і паслугі па дызайне інтэр'ераў, графічным дызайне, афармленні (упрыгажэнні) аўтамабіляў, унутранай прасторы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), памяшканняў, іншых месцаў, а таксама мадэліраванне прадметаў афармлення інтэр'ера, тэкстыльных вырабаў, мэблі, адзення і абутку, прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў;

3.1.17. распрацоўка вэб-сайтаў, устаноўка (настройка) камп'ютараў і праграмнага забеспячэння, аднаўленне камп'ютараў пасля збою, рамонт, тэхнічнае абслугоўванне камп'ютараў і перыферыйнага абсталявання, навучанне працы на персанальным камп'ютары;

3.1.18. распілоўка і колка дроў, пагрузка і разгрузка грузаў;

3.1.19. рамонт і аднаўленне, уключаючы перацяжку, хатняй мэблі з матэрыялаў спажыўца;

3.1.20. рамонт гадзіннікаў, абутку;

3.1.21. рамонт швейных, трыкатажных вырабаў і галаўных убораў, акрамя рамонту дываноў і дывановых вырабаў;

3.1.22. рэпетытарства;

3.1.23. зборка мэблі;

3.1.24. мыццё і прасаванне пасцельнай бялізны і іншых рэчаў у хатніх гаспадарках грамадзян, выгул хатніх жывёл і догляд за імі, закупка прадуктаў, мыццё посуду і прыгатаванне ежы ў хатніх гаспадарках грамадзян, унясенне платы са сродкаў асобы, якая абслугоўваецца, за карыстанне жылым памяшканнем і жыллёва-камунальныя паслугі;

3.1.25. упакоўка тавараў, дадзеных спажыўцом;

3.1.26. утрыманне, догляд і дрэсіроўка хатніх жывёл, акрамя сельскагаспадарчых жывёл;

3.1.27. догляд за дарослымі і дзецьмі;

3.1.28. фотаздымка, выраб фатаграфій;

3.1.29. чыстка і прыбіранне жылых памяшканняў;

3.1.30. тынкавальныя, малярскія, шкляныя працы, працы па майстраванні пакрыццяў падлогі і абліцоўванні сцен, абклейванне сцен шпалерамі, мураванне (рамонт) пячэй і камінаў;

3.2. даванне іншым фізічным асобам жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач, якія належаць на праве ўласнасці фізічнай асобе, для кароткатэрміновага пражывання.

4. Аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам для плацельшчыкаў – фізічных асоб, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, прызнаецца разавая рэалізацыя (не больш за пяць дзён у каляндарным месяцы), якая ажыццяўляецца па спецыяльных дазволах, што выдаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, на гандлёвых месцах і (ці) у

іншых установленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, прадукцыі раслінаводства і пчалаводства.

5. Аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам для плацельшчыкаў – фізічных асоб, не зарэгістраваных у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, прызнаецца ажыццяўленне відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 1.1–1.3 пункта 1 гэтага артыкула, у выпадках, прадугледжаных пунктам 41 артыкула 342 гэтага Кодэкса.

6. Для плацельшчыкаў – індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, не прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам рознічны гандаль (рэалізацыя) наступнай прадукцыяй:

6.1. лекавымі раслінамі, ягадамі, грыбамі, арэхамі, іншай дзікарослай прадукцыяй;

6.2. агароднінай і садавінай (у тым ліку ў перапрацаваным выглядзе), іншай прадукцыяй раслінаводства (за выключэннем прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады), малочнымі і кісламалочнымі прадуктамі (у тым ліку ў перапрацаваным выглядзе), прадукцыяй пчалаводства, іншай прадукцыяй жывёлагадоўлі (акрамя пушніны), атрыманай ад хатніх жывёл (буйная рагатая жывёла, свінні, коні, авечкі, козы, трусы, сельскагаспадарчая птушка), як у жывым выглядзе, так і прадуктамі забою ў сырым ці перапрацаваным выглядзе.

Падставай для непрызнання аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам рознічнага гандлю (рэалізацыі) прадукцыі, указанай у частцы першай гэтага падпункта, з'яўляецца падача плацельшчыкам даведкі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якая пацвярджае, што прадукцыя, якая рэалізуецца, выраблена плацельшчыкам і (ці) асобамі, якія знаходзяцца з ім у адносінах блізкай роднасці ці сваяцтва, апекуна, папячыцеля і падапечнага, на зямельным участку, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадзеным плацельшчыку і (ці) указаным асобам для будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аднакватэрнага жылога дома, зарэгістраванай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі кватэры ў блакіраваным жылым доме, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, касьбы і выпасу сельскагаспадарчых жывёл, садаводства, дачнага будаўніцтва, агародніцтва, у выглядзе службовага зямельнага надзелу. Форму даведкі і парадак яе выдачы ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Падставай для непрызнання аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам рэалізацыі прадукцыі пчалаводства, выробленай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца падача плацельшчыкам разам з даведкай, указанай у частцы другой гэтага падпункта, або замест яе (у выпадку, калі пчальнік размешчаны не на тых зямельных участках, што ва ўстаноўленым парадку дадзены плацельшчыку, які рэалізуе вырабленую ім прадукцыю пчалаводства) ветэрынарна-санітарнага пашпарта пчальніка, выдадзенага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і (ці) пасведчання, афармленага на падставе гэтага пашпарта.

Плацельшчыкі, якія рэалізуюць прадукцыю, указаную ў частцы першай гэтага падпункта, абавязаны захоўваць у месцах рэалізацыі гэтай прадукцыі дакументы, указаныя ў частках другой і трэцяй гэтага падпункта.

**Артыкул 338. Падатковая база адзінага падатку**

1. Падатковая база адзінага падатку вызначаецца плацельшчыкамі – індывідуальнымі прадпрымальнікамі зыходзячы з відаў дзейнасці, якія ажыццяўляюцца, і (ці) колькасці гандлёвых аб'ектаў, гандлёвых месцаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, абслугоўваючых аб'ектаў, валавой выручкі, а таксама працягласці справаздачнага перыяду.

2. Падатковая база адзінага падатку для плацельшчыкаў – фізічных асоб вызначаецца зыходзячы з відаў дзейнасці, якія ажыццяўляюцца, і (ці) колькасці жылых пакояў у жылых памяшканнях, якія здаюцца, колькасці садовых домікаў, дач, дадзеных для кароткатэрміновага пражывання, а таксама працягласці перыяду ажыццяўлення дзейнасці.

**Артыкул 339. Стаўкі адзінага падатку і парадак іх устанаўлення**

1. Стаўкі адзінага падатку ўстанаўліваюцца за месяц у памерах згодна з дадаткам 24 да гэтага Кодэкса.

2. Абласныя і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў маюць права зменшыць (не больш чым у два разы) устаноўленыя дадаткам 24 да гэтага Кодэкса стаўкі адзінага падатку ў залежнасці ад:

населенага пункта, у якім ажыццяўляецца дзейнасць плацельшчыкаў (горад Мінск, гарады абласнога, раённага падпарадкавання, пасёлкі гарадскога тыпу, сельскія населеныя пункты);

месца ажыццяўлення дзейнасці плацельшчыкаў у межах населенага пункта (цэнтр, ускраіна, транспартныя развязкі, аддаленасць гэтага месца ад прыпынкаў пасажырскага транспарту).

3. Пры змяненні ставак адзінага падатку змененыя стаўкі прымяняюцца пры вылічэнні сумы адзінага падатку, тэрмін аплаты якога надыходзіць пасля ўступлення ў сілу адпаведных рашэнняў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў.

**Артыкул 340. Льготы па адзіным падатку**

1. Стаўкі адзінага падатку зніжаюцца для:

1.1. фізічных асоб, упершыню зарэгістраваных у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, – на 25 працэнтаў у першыя тры месяцы пачынаючы з месяца, у якім індывідуальны прадпрымальнік пачаў прадпрымальніцкую дзейнасць, уключаючы апошні дзень месяца, у якім канчаецца права на льготу;

1.2. плацельшчыкаў – пенсіянераў па ўзросце – на 20 працэнтаў пачынаючы з месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім узнікла права на льготу на падставе пенсійнага пасведчання;

1.3. плацельшчыкаў-інвалідаў – на 20 працэнтаў пачынаючы з месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім узнікла права на льготу, на падставе пасведчання інваліда ці пенсійнага пасведчання, у якім указаны звесткі аб адпаведнай групе інваліднасці і тэрміне, на які яна ўстаноўлена;

1.4. плацельшчыкаў – бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў) у мнагадзетных сем'ях з трыма і больш дзецьмі ва ўзросце да васямнаццаці гадоў – на 20 працэнтаў пачынаючы з месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім узнікла права на льготу, уключаючы апошні дзень месяца, у якім страчана такое права, на падставе дакумента, які сведчыць асобу, і пасведчання мнагадзетнай сям'і;

1.5. плацельшчыкаў – бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, – на 20 працэнтаў пачынаючы з месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім узнікла права на льготу, уключаючы апошні дзень месяца, у якім дзіця-інвалід дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, на падставе дакумента, што сведчыць асобу, і пасведчання дзіцяці-інваліда;

1.6. плацельшчыкаў – бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы і выхоўваюць непаўналетніх дзяцей і (ці) дзяцей, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, – на 100 працэнтаў пачынаючы з месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім узнікла права на льготу, уключаючы апошні дзень месяца, у якім страчана такое права. Указаная льгота даецца пры ўмове, што жонка (муж) (пры яе (яго) наяўнасці) плацельшчыка таксама з'яўляецца інвалідам I ці II групы. Льгота даецца на падставе пасведчанняў інваліда ці пенсійных пасведчанняў, у якіх указаны звесткі аб адпаведнай групе інваліднасці, копіі пасведчання аб нараджэнні дзіцяці і (ці) даведкі (яе копіі) аб тым, што дзіця з'яўляецца навучэнцам і атрымлівае адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі.

2. Пры наяўнасці ў плацельшчыка права на зніжэнне ўстаноўленай стаўкі адзінага падатку адначасова на некалькіх падставах, указаных у падпунктах 1.1–1.5 пункта 1 гэтага артыкула, гэта стаўка паніжаецца на 45 працэнтаў.

3. Дакументы, якія пацвярджаюць права на льготу па адзіным падатку, падаюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па адзіным падатку за першы справаздачны перыяд падатковага перыяду, у якім падатковая льгота была першапачаткова выкарыстана, фізічнымі асобамі – адначасова з першым паведамленнем, якое падаецца ў падатковым перыядзе, у якім падатковая льгота была першапачаткова выкарыстана.

4. Пры ажыццяўленні індывідуальным прадпрымальнікам у справаздачным перыядзе відаў дзейнасці, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, ільготы, указаныя ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, прымяняюцца на выбар індывідуальнага прадпрымальніка ў адносінах да:

аднаго гандлёвага аб'екта, ці аднаго гандлёвага месца, ці аднаго аб'екта грамадскага харчавання, ці аднаго абслугоўваючага аб'екта – пры ажыццяўленні дзейнасці праз гандлёвыя аб'екты, гандлёвыя месцы, аб'екты грамадскага харчавання, абслугоўваючыя аб'екты;

аднаго з прадугледжаных падпунктамі 1.1–1.3 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса відаў дзейнасці – пры ажыццяўленні дзейнасці без выкарыстання гандлёвых аб'ектаў, гандлёвых месцаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, абслугоўваючых аб'ектаў.

5. Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы некалькіх відаў дзейнасці, прадугледжаных падпунктам 3.1 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, ільготы, указаныя ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, прымяняюцца ў адносінах да ўсіх відаў дзейнасці, прадугледжаных падпунктам 3.1 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса.

6. Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы дзейнасці па даванні належных яму на праве ўласнасці іншым фізічным асобам жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач для кароткатэрміновага пражывання льготы, указаныя ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, у адносінах да гэтага віду дзейнасці не прымяняюцца.

**Артыкул 341. Падатковы і справаздачны перыяды адзінага падатку**

Падатковым перыядам адзінага падатку прызнаецца каляндарны год.

Справаздачным перыядам адзінага падатку для індывідуальных прадпрымальнікаў прызнаецца каляндарны квартал, у якім ажыццяўляецца дзейнасць.

## Артыкул 342. Парадак вылічэння адзінага падатку. Тэрміны падачы паведамленняў, падатковых дэкларацый (разлікаў)

1. Індывідуальныя прадпрымальнікі самастойна вылічваюць суму адзінага падатку зыходзячы з падатковай базы і ставак падатку, устаноўленых у населеным пункце, у якім яны ажыццяўляюць дзейнасць, калі іншае не прадугледжана пунктам 2 гэтага артыкула.

Пад ажыццяўленнем дзейнасці ў мэтах гэтай главы разумеюцца дзеянні плацельшчыка, накіраваныя на рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), уключаючы прыняцце заказу на набыццё тавараў (выкананне прац, аказанне паслуг), а таксама іншыя аналагічныя дзеянні, накіраваныя на рэалізацыю тавараў (прац, паслуг).

2. Індывідуальныя прадпрымальнікі вылічваюць адзіны падатак зыходзячы з падатковай базы і ставак падатку, устаноўленых у населеным пункце па месцы пастаноўкі індывідуальных прадпрымальнікаў на ўлік у падатковым органе, пры ажыццяўленні:

відаў дзейнасці, указаных у падпункце 1.1.4 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса;

відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 1.1.7 і 1.1.10 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, якія ажыццяўляюцца ў дыстанцыйнай форме пры дапамозе сеткі Інтэрнэт;

рознічнага гандлю з выкарыстаннем сеткі Інтэрнэт праз інтэрнэт-магазіны таварамі, аднесенымі да груп тавараў, указаных у падпунктах 1.2.1–1.2.6 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса (далей для мэт гэтай главы – тавары).

3. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі, аднесенымі да розных груп тавараў, указаных у падпункце 1.2 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, аплата адзінага падатку праводзіцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі па тым відзе тавараў, па якім устаноўлена найбольш высокая стаўка адзінага падатку.

4. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі на некалькіх гандлёвых аб'ектах, на некалькіх гандлёвых месцах, а таксама пры ажыццяўленні грамадскага харчавання на некалькіх аб'ектах грамадскага харчавання адзіны падатак аплачваецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі па кожным гандлёвым аб'екце (аб'екце грамадскага харчавання), гандлёвым месцы, калі іншае не прадугледжана пунктам 5 гэтага артыкула.

Для мэт гэтай главы гандлёвы аўтамат адносіцца да гандлёвага аб'екта.

5. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі індывідуальным прадпрымальнікам, які не прыцягвае фізічных асоб да рэалізацыі тавараў, на гандлёвых месцах, а таксама ў развазным, разносным гандлі ў некалькіх населеных пунктах ці ў межах аднаго населенага пункта аплата адзінага падатку праводзіцца па найбольш высокай стаўцы адзінага падатку без уліку пункта 4 гэтага артыкула.

Для мэт гэтай главы да разноснага гандлю не адносіцца гандаль праз гандлёвыя аўтаматы.

6. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі на адным ці некалькіх гандлёвых аб'ектах, гандлёвых месцах, а таксама з выкарыстаннем сеткі Інтэрнэт праз інтэрнэт-магазіны адзіны падатак аплачваецца па гандлёвых аб'ектах, гандлёвых месцах, а таксама за рознічны гандаль з выкарыстаннем сеткі Інтэрнэт праз інтэрнэт-магазіны. За рознічны гандаль таварамі праз інтэрнэт-магазіны адзіны падатак аплачваецца ў памеры адной стаўкі гэтага падатку незалежна ад колькасці створаных і зарэгістраваных інтэрнэт-магазінаў.

7. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі на адным ці некалькіх гандлёвых аб'ектах, гандлёвых месцах, а таксама ў развазным і разносным гандлі аплата адзінага падатку праводзіцца па кожным гандлёвым аб'екце, гандлёвым месцы з улікам пункта 5 гэтага артыкула.

8. Пры рознічным гандлі ў справаздачным перыядзе таварамі на гандлёвых месцах, выстаўках-продажах, кірмашах, у развазным і разносным гандлі менш за пятнаццаць дзён у каляндарным месяцы адзіны падатак вылічваецца з прымяненнем каэфіцыента 0,5.

9. Пры рэалізацыі індывідуальным прадпрымальнікам у справаздачным перыядзе некалькіх відаў прац (паслуг) адзіны падатак аплачваецца па тым відзе прац (паслуг), па якім устаноўлена найбольш высокая стаўка адзінага падатку.

Палажэнні гэтага пункта не распаўсюджваюцца на даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання, а таксама на здачу ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў.

10. Пры рэалізацыі індывідуальным прадпрымальнікам у справаздачным перыядзе прац (паслуг), указаных у падпункце 1.1 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, у некалькіх абслугоўваючых аб'ектах адзіны падатак аплачваецца з улікам патрабаванняў пункта 9 гэтага артыкула па кожным абслугоўваючым аб'екце, калі іншае не прадугледжана пунктам 12 гэтага артыкула.

Палажэнні гэтага пункта не распаўсюджваюцца на даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання, а таксама на здачу ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў.

11. Пры ажыццяўленні індывідуальным прадпрымальнікам у справаздачным перыядзе давання месцаў для кароткатэрміновага пражывання ці здачы ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў адзіны падатак аплачваецца па кожным жылым пакоі, які здаецца, у кватэры, жылым доме, па кожным садовым доміку, па кожнай дачы, па кожным машына-месцы.

Пры даванні ў справаздачным перыядзе ў адным жылым доме, адной кватэры, у адным садовым доміку, у адной дачы месцаў для кароткатэрміновага пражывання і адначасовай здачы гэтага ж памяшкання ў арэнду (субарэнду), наём (паднайманне) адзіны падатак аплачваецца па тым відзе прац (паслуг), па якім устаноўлена найбольш высокая стаўка адзінага падатку з улікам палажэнняў часткі першай гэтага пункта.

12. Пры рэалізацыі індывідуальным прадпрымальнікам, які не прыцягвае фізічных асоб, у справаздачным перыядзе прац (паслуг) у некалькіх абслугоўваючых аб'ектах у некалькіх населеных пунктах ці ў некалькіх абслугоўваючых аб'ектах у межах аднаго населенага пункта адзіны падатак аплачваецца па найбольш высокай стаўцы адзінага падатку без уліку пункта 10 гэтага артыкула.

Палажэнні гэтага пункта не распаўсюджваюцца на даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання, а таксама здачу ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў.

13. Пры ажыццяўленні індывідуальным прадпрымальнікам у справаздачным перыядзе разам з відамі прац (паслуг), указанымі ў падпунктах 1.1.1–1.1.7 і 1.1.10 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, давання месцаў для кароткатэрміновага пражывання і (ці) здачы ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў адзіны падатак аплачваецца па відах дзейнасці, указаных у падпунктах 1.1.1–1.1.7 і 1.1.10 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, з улікам пунктаў 9, 10 і 12 гэтага

артыкула, а таксама за даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання і (ці) здачу ў арэнду памяшканняў, машына-месцаў з улікам пункта 11 гэтага артыкула.

14. Пры перавышэнні валавой выручкі над саракакратнай сумай адзінага падатку за адпаведны справаздачны перыяд без уліку нормаў пунктаў 1 і 2 артыкула 340 гэтага Кодэкса індывідуальныя прадпрымальнікі вылічваюць даплату адзінага падатку ў памеры 5 працэнтаў з сумы такога перавышэння.

15. У валавую выручку індывідуальнага прадпрымальніка ўключаюцца выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), якая вызначаецца як кошт перададзеных (адгружаных) на працягу справаздачнага перыяду тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), а таксама сума атрыманых на працягу справаздачнага перыяду пазарэалізацыйных даходаў, звязаных з ажыццяўленнем відаў дзейнасці, указаных у пункце 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса.

Для мэт гэтай главы тавары прызнаюцца адгружанымі, працы выкананымі, паслугі аказанымі на дату адпаведна перадачы (адгрузкі) тавараў, выканання прац, аказання паслуг.

16. Дата перадачы (адгрузкі) тавараў (выканання прац, аказання паслуг) вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса.

17. Пры выкананні прац (аказанні паслуг) выручка ад іх рэалізацыі вызначаецца як кошт выкананых прац (аказаных паслуг), прадугледжаная адпаведным дагаворам, іншым дакументам, які пацвярджае заключэнне дагавора.

18. У выручку за аказаныя паслугі не ўключаецца закладны кошт прадметаў пракату да сканчэння ўстаноўленага дагаворам тэрміну вяртання прадметаў пракату.

19. У выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) уключаецца выручка ад аказання арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам паслуг, звязаных з падтрымкай (прасоўваннем) электронных сэрвісаў, якія належаць такім арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам і выкарыстоўваюцца плацельшчыкамі – індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры аказанні спажыўцам паслуг (выкананні прац), указаных у падпунктах 1.1.1–1.1.10 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса.

20. Грашовыя сродкі, якія паступілі ў якасці авансу, задатку, папярэдняй аплаты, уключаюцца ў выручку на дату перадачы (адгрузкі) тавараў (выканання прац, аказання паслуг).

21. Выручка за рэалізаваныя тавары (выкананыя працы, аказаныя паслугі), атрыманая ў замежнай валюце, пералічваецца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату перадачы (адгрузкі) тавараў (выканання прац, аказання паслуг).

22. У выручку за аказаныя паслугі (выкананыя працы) уключаецца кошт аказаных паслуг (выкананых прац) на працягу справаздачнага перыяду ў выпадку іх аплаты за спажыўцоў арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

23. Пры вяртанні тавараў, адмове ад выкананых прац, аказаных паслуг ці суразмерным змяншэнні цаны тавараў (прац, паслуг) выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) змяншаецца ў тым справаздачным перыядзе, у якім перададзены (адгружаны) тавары (выкананы працы, аказаны паслугі).

24. Да пазарэалізацыйных даходаў адносяцца даходы, якія ўключаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у склад пазарэалізацыйных даходаў пры вылічэнні падаходнага падатку з фізічных асоб, акрамя ўказаных у падпункце 2.1 пункта 2 артыкула 196, падпунктах 9.3–9.7 пункта 9 артыкула 205 гэтага Кодэкса. Пазарэалізацыйныя даходы ўлічваюцца на дату іх фактычнага атрымання, вызначаную ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 213 гэтага Кодэкса.

25. Пазарэалізацыйныя даходы, атрыманыя індывідуальным прадпрымальнікам пры адначасовым прымяненні агульнага парадку падаткаабкладання ці падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання і адзінага падатку, пры немагчымасці іх аднясення да канкрэтнай сістэмы падаткаабкладання размяркоўваюцца прапарцыянальна суме выручкі, што падлягае падаткаабкладанню ў адпаведнасці з агульным парадкам падаткаабкладання ці падаткам пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, і суме выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), па якіх выплачваецца адзіны падатак.

26. Падатковая дэкларацыя (разлік) па адзіным падатку падаецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік не пазней за 1-е чысло справаздачнага перыяду.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія не ажыццяўляюць дзейнасць з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ў выпадках, прадугледжаных пунктам 8 гэтага артыкула, падаюць падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за рабочы дзень, што папярэднічае дню ажыццяўлення такой дзейнасці ў тым каляндарным месяцы, у якім іні ўпершыню ў справаздачным перыядзе ажыццяўляецца дзейнасць.

27. У выпадку, прадугледжаным пунктам 14 гэтага артыкула, падатковая дэкларацыя (разлік) падаецца:

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў першым квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 ліпеня бягучага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў другім квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 кастрычніка бягучага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў трэцім квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 студзеня наступнага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў чацвёртым квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 красавіка наступнага падатковага перыяду.

28. У падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку, якая падаецца ў адпаведнасці з абзацам другім часткі першай пункта 1 артыкула 44 гэтага Кодэкса, у выпадку, прадугледжаным пунктам 14 гэтага артыкула, індывідуальнымі прадпрымальнікамі ўказваецца валавая выручка:

за справаздачны перыяд, які папярэднічае справаздачнаму перыяду, на які прыпадае дзень падачы заявы аб спыненні дзейнасці;

за справаздачны перыяд, на які прыпадае дзень падачы заявы аб спыненні дзейнасці.

29. Пры змяненні ў справаздачным перыядзе ўмоў ажыццяўлення дзейнасці індывідуальнымі прадпрымальнікамі падатковая дэкларацыя (разлік) па адзіным падатку з унесенымі змяненнямі падаецца ў падатковыя органы не пазней за рабочы дзень, які папярэднічае дню змянення ўмоў дзейнасці.

30. Калі індывідуальны прадпрымальнік адначасова з падатковай дэкларацыяй (разлікам) па адзіным падатку падае заяву і дакументы, указаныя ў падпунктах 1.2, 1.3 і 1.5 пункта 1 артыкула 344 гэтага Кодэкса, ён мае права вылічыць адзіны падатак шляхам памнажэння сумы адзінага падатку, вылічанай за адпаведны месяц справаздачнага перыяду, на адносіны колькасці дзён гэтага месяца, на працягу якіх дзейнасць будзе ажыццяўляцца, да колькасці каляндарных дзён месяца, за які вылічваецца адзіны падатак.

Колькасць дзён месяца, на працягу якіх дзейнасць будзе ажыццяўляцца, вызначаецца як розніца паміж колькасцю каляндарных дзён месяца справаздачнага

перыяду і колькасцю дзён гэтага месяца, на працягу якіх дзейнасць не будзе ажыццяўляцца на падставах, прадугледжаных падпунктамі 1.2, 1.3 і 1.5 пункта 1 артыкула 344 гэтага Кодэкса.

31. Фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць віды дзейнасці, указаныя ў падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, да дня пачатку ажыццяўлення ў падатковым перыядзе дзейнасці, якая прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам, падаюць у падатковы орган пісьмовае паведамленне ці паведамленне праз асабісты кабінет плацельшчыка з указаннем відаў дзейнасці, якія яны мяркуюць ажыццяўляць, відаў тавараў, формы аказання паслуг, а таксама перыяду ажыццяўлення дзейнасці і месца ажыццяўлення дзейнасці.

Пад днём пачатку ажыццяўлення дзейнасці разумеецца дата, указаная фізічнай асобай у паведамленні для кожнага месяца, а пры адсутнасці такой даты – 1-е чысло кожнага месяца.

Пры даванні належных на праве ўласнасці фізічнай асобе іншым фізічным асобам жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач для кароткатэрміновага пражывання ў паведамленні дадаткова ўказваюцца інвентарны нумар па кожным аб'екце нерухомай маёмасці (кватэра, жылы дом, садовы домік, дача) на падставе пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі ці іншага дакумента, які змяшчае такія звесткі, а таксама колькасць жылых пакояў, што здаюцца ў кватэры, жылым доме.

32. Фізічныя асобы пры разавай рэалізацыі тавараў, указаных у пункце 4 артыкула 337 гэтага Кодэкса, а таксама пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, не маюць права прымяняць іншы парадак падаткаабкладання ў адносінах да гэтых відаў дзейнасці.

33. Для фізічных асоб адзіны падатак вылічваецца падатковымі органамі на падставе пададзенага гэтымі асобамі паведамлення зыходзячы з падатковай базы і ставак падатку, устаноўленых у населеным пункце, у якім такія асобы ажыццяўляюць дзейнасць, калі іншае не прадугледжана пунктам 34 гэтага артыкула.

34. Пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1.6, 3.1.17 і 3.1.22 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, у дыстанцыйнай форме пры дапамозе сеткі Інтэрнэт адзіны падатак вылічваецца падатковымі органамі зыходзячы з падатковай базы і ставак падатку, устаноўленых у населеным пункце па месцы пастаноўкі фізічнай асобы на ўлік у падатковым органе.

35. Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы некалькіх відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1.1–3.1.30 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, адзіны падатак аплачваецца па тым відзе дзейнасці, па якім устаноўлена найбольш высокая стаўка адзінага падатку.

36. Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы некалькіх відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1.1–3.1.30 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, у некалькіх населеных пунктах адзіны падатак аплачваецца па найбольш высокай стаўцы адзінага падатку.

37. Пры даванні фізічнай асобай у каляндарным месяцы іншым фізічным асобам належных ёй на праве ўласнасці жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач для кароткатэрміновага пражывання адзіны падатак аплачваецца па кожным жылым пакоі, які здаецца, у кватэры, жылым доме, па кожным садовым доміку, па кожнай дачы.

38. Пры разавай рэалізацыі тавараў, указаных у пункце 4 артыкула 337 гэтага Кодэкса, ці рэалізацыі тавараў, указаных у падпунктах 3.1.1 і 3.1.2 пункта 3 артыкула

337 гэтага Кодэкса, менш за пятнаццаць дзён у каляндарным месяцы на гандлёвых месцах і (ці) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах адзіны падатак вылічваецца з прымяненнем каэфіцыента 0,5, калі іншае не прадугледжана часткай другой гэтага пункта.

Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы разам з відамі дзейнасці, указанымі ў падпунктах 3.1.3–3.1.30 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, рэалізацыі тавараў, указаных у падпунктах 3.1.1 і 3.1.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, менш за пятнаццаць дзён у каляндарным месяцы палажэнні часткі першай гэтага пункта не прымяняюцца.

39. Пры ажыццяўленні фізічнай асобай у каляндарным месяцы разам з відамі дзейнасці, указанымі ў падпунктах 3.1.1–3.1.30 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, віду дзейнасці, указанага ў падпункце 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, адзіны падатак вылічваецца па відах дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1.1–3.1.30 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса з улікам пунктаў 35, 36 і 38 гэтага артыкула, а таксама за ажыццяўленне віду дзейнасці, указанага ў падпункце 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, з улікам пункта 37 гэтага артыкула.

40. Пры змяненні ў каляндарным месяцы ўмоў ажыццяўлення дзейнасці фізічныя асобы падаюць у падатковыя органы не пазней за дзень, які папярэднічае дню такіх змяненняў, пісьмовае паведамленне ці паведамленне праз асабісты кабінет плацельшчыка, у якім інфармуюць аб такіх змяненнях.

41. Для фізічных асоб пры выяўленні ўпершыню фактаў ажыццяўлення відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, без аплаты адзінага падатку ці фактаў ажыццяўлення відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 1.1–1.3 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, адзіны падатак вылічваецца падатковымі органамі зыходзячы з падатковай базы і ставак падатку, устаноўленых:

у населеным пункце, у якім ажыццяўляецца дзейнасць фізічнай асобай, – пры ажыццяўленні відаў дзейнасці (акрамя паслуг, прадугледжаных гэтай главой, якія ажыццяўляюцца ў дыстанцыйнай форме праз сетку Інтэрнэт), указаных у падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 і падпунктах 1.1.1–1.1.3, 1.1.5–1.1.10, 1.2 і 1.3 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса;

у населеным пункце па месцы жыхарства фізічнай асобы, за выключэннем замежнага грамадзяніна і асобы без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, – пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, указаных у падпункце 1.1.4 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, а таксама паслуг, прадугледжаных гэтай главой, якія ажыццяўляюцца ў дыстанцыйнай форме пры дапамозе сеткі Інтэрнэт;

у населеным пункце, у якім ажыццяўляецца дзейнасць замежным грамадзянінам і асобай без грамадзянства, што часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, – пры ажыццяўленні відаў дзейнасці, указаных у падпункце 1.1.4 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса.

Пры вылічэнні адзінага падатку ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта палажэнні пунктаў 1 і 2 артыкула 340 гэтага Кодэкса і пункта 38 гэтага артыкула не прымяняюцца.

42. Для фізічных асоб пры выяўленні паўторных фактаў ажыццяўлення відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 без аплаты адзінага падатку і (ці) падпунктах 1.1–1.3 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, адзіны

падатак вылічваецца падатковымі органамі з прымяненнем каэфіцыента 5 з улікам палажэнняў частак першай і другой пункта 41 гэтага артыкула.

43. Палажэнні пунктаў 41 і 42 гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на выпадкі ажыццяўлення фізічнымі асобамі відаў дзейнасці, указаных у падпунктах 1.1–1.3 пункта 1, падпунктах 3.1 і 3.2 пункта 3 артыкула 337 гэтага Кодэкса, у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў.

## Артыкул 343. Парадак і тэрміны аплаты (даплаты) адзінага падатку

1. Індывідуальны прадпрымальнік аплачвае адзіны падатак не пазней за 1-е чысло кожнага каляндарнага месяца, у якім ён ажыццяўляе дзейнасць, калі іншае не прадугледжана часткай другой гэтага пункта.

Адзіны падатак аплачваецца індывідуальным прадпрымальнікам, які не ажыццяўляе дзейнасць з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама ў выпадках, прадугледжаных пунктам 8 артыкула 342 гэтага Кодэкса, не пазней за рабочы дзень, які папярэднічае дню ажыццяўлення такой дзейнасці, у тым каляндарным месяцы, у якім ім упершыню ў справаздачным перыядзе ажыццяўляецца дзейнасць, а за іншыя месяцы ажыццяўлення дзейнасці – не пазней за 1-е чысло кожнага наступнага месяца ажыццяўлення дзейнасці ў справаздачным перыядзе.

2. Калі ў перыядзе, за які аплачаны адзіны падатак, мяняюцца ўмовы ажыццяўлення дзейнасці, індывідуальныя прадпрымальнікі не пазней за рабочы дзень, які папярэднічае дню такіх змяненняў, даплачваюць розніцу паміж сумай гэтага падатку, вылічанай зыходзячы з новых умоў, і аплачанай сумай адзінага падатку.

3. У выпадку, прадугледжаным пунктам 14 артыкула 342 гэтага Кодэкса, даплата адзінага падатку праводзіцца:

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў першым квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 ліпеня бягучага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў другім квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 кастрычніка бягучага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў трэцім квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 студзеня наступнага падатковага перыяду;

у адносінах да сумы перавышэння, якая ўтварылася ў чацвёртым квартале бягучага падатковага перыяду, – не пазней за 1 красавіка наступнага падатковага перыяду.

4. Адзіны падатак аплачваецца фізічнымі асобамі:

якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, – не пазней за дзень, што папярэднічае дню пачатку ажыццяўлення дзейнасці, якая прызнаецца аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам;

не зарэгістраванымі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, у выпадках, прадугледжаных пунктамі 41 і 42 артыкула 342 гэтага Кодэкса, – не пазней за дзень, які ідзе следам за днём уручэння такой фізічнай асобе паведамлення падатковага органа.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго ў пісьмовай ці электроннай форме.

5. Калі ў перыядзе, за які аплачаны фізічнай асобай адзіны падатак, мяняюцца ўмовы ажыццяўлення дзейнасці, падатковы орган на падставе паведамлення фізічнай

асобы вылічвае суму адзінага падатку, неабходнай да даплаты (да змяншэння), як розніцу паміж сумай адзінага падатку, вылічанай зыходзячы з новых умоў, і аплачанай раней сумай адзінага падатку.

Даплата адзінага падатку ў выпадках, прадугледжаных часткай першай гэтага пункта, праводзіцца фізічнай асобай не пазней за дзень, які папярэднічае дню змянення гэтых умоў.

6. Фізічныя асобы на дакуменце аб аплаце адзінага падатку ўказваюць від дзейнасці, від тавараў, якія рэалізуюцца, перыяд ажыццяўлення дзейнасці (пры рэалізацыі тавараў менш за пятнаццаць дзён у каляндарным месяцы – каляндарныя дні месяца), за які праведзена аплата адзінага падатку, месца ажыццяўлення дзейнасці.

7. Дакумент аб аплаце адзінага падатку ці копія дакумента аб аплаце адзінага падатку захоўваюцца ў гандлёвым, абслугоўваючым аб'екце, на гандлёвым месцы, у аб'екце грамадскага харчавання, іншых месцах ажыццяўлення дзейнасці і прад'яўляюцца па патрабаванні арганізацыі ці індывідуальнага прадпрымальніка, якія даюць аб'ект, гандлёвае месца, упаўнаважаных службовых асоб органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 344. Асаблівасці заліку і вяртання адзінага падатку**

1. Залік ці вяртанне адзінага падатку праводзяцца ў адпаведнасці з артыкуламі 47 і 66 гэтага Кодэкса ў выпадку:

1.1. часовай непрацаздольнасці плацельшчыка ці фізічнай асобы, якая прыцягваецца індывідуальным прадпрымальнікам па грамадзянска-прававым ці працоўным дагаворы, калі такая непрацаздольнасць выклікала спыненне працы гандлёвага (абслугоўваючага) аб'екта, гандлёвага месца, аб'екта грамадскага харчавання, а пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) па-за гандлёвым (абслугоўваючым) аб'ектам, гандлёвым месцам, аб'ектам грамадскага харчавання – спыненне дзейнасці, якая абкладаецца адзіным падаткам, – на падставе дакументаў, якія выдаюцца ўпаўнаважанымі органамі, ці іх копій, што пацвярджаюць непрацаздольнасць;

1.2. страты плацельшчыкам права карыстання гандлёвымі, абслугоўваючымі аб'ектамі, гандлёвымі месцамі, аб'ектамі грамадскага харчавання, асноўнымі сродкамі, у тым ліку памяшканнямі (будынкамі), якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення дзейнасці, – на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць гэту страту, ці іх копій;

1.3. неажыццяўлення дзейнасці з прычыны прыняцця дзяржаўнымі органамі рашэнняў, якія перашкаджаюць яе ажыццяўленню, за выключэннем выпадкаў, калі такія рашэнні выкліканы неправамернай дзейнасцю саміх індывідуальных прадпрымальнікаў, – на падставе рашэнняў гэтых органаў ці копій рашэнняў гэтых органаў ці іншых дакументаў;

1.4. неажыццяўлення дзейнасці ў выніку ўзнікнення надзвычайных сітуацый;

1.5. часовага (працягласцю не больш за трыццаць каляндарных дзён у годзе) неажыццяўлення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, гандлёвага аб'екта, аб'екта грамадскага харчавання, абслугоўваючага аб'екта – на падставе паведамлення індывідуальнага прадпрымальніка, якое падаецца ў падатковы орган не пазней за дзень, які папярэднічае дню часовага неажыццяўлення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, гандлёвага аб'екта, аб'екта грамадскага харчавання, абслугоўваючага аб'екта;

1.6. смерці, абвяшчэння памерлай фізічнай асобы пры адсутнасці запазычанасці ў такой асобы па выкананні падатковага абавязацельства, пеняў – на падставе копій дакументаў, якія пацвярджаюць шлюбныя, родносныя адносіны, і (ці) іншых дакументаў, якія пацвярджаюць, што грамадзянін з'яўляецца спадчыннікам, з прад'яўленнем арыгіналаў такіх дакументаў (у выпадках заліку ці вяртання адзінага падатку спадчынніку (спадчыннікам) памерлага, аб'яўленай памерлай фізічнай асобы).

2. Сума адзінага падатку, якая падлягае заліку ці вяртанню, вызначаецца шляхам памнажэння аплачанай за адзін месяц (дні месяца) сумы гэтага падатку на адносіны колькасці дзён, на працягу якіх дзейнасць не ажыццяўлялася на падставах, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, да колькасці дзён месяца, за якія быў аплачаны адзіны падатак.

Сума адзінага падатку, якая падлягае заліку ці вяртанню, вызначаецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі самастойна ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку.

Сума адзінага падатку, якая падлягае заліку ці вяртанню фізічнай асобе, вызначаецца падатковым органам на падставе пісьмовага паведамлення гэтай асобы і дададзеных да яго дакументаў, якія пацвярджаюць права на залік ці вяртанне адзінага падатку.

Сума адзінага падатку, якая падлягае заліку ці вяртанню спадчынніку, вызначаецца падатковым органам у парадку, прадугледжаным часткай першай гэтага пункта, прапарцыянальна памеру яго долі ў спадчыне на падставе пісьмовай заявы і дададзеных да яго дакументаў, якія пацвярджаюць права на залік ці вяртанне адзінага падатку.

3. Залік ці вяртанне адзінага падатку не праводзяцца пры выяўленні падатковымі органамі фактаў рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) плацельшчыкам у перыяд дзеяння акалічнасцей, якія з'яўляюцца падставай для яго заліку ці вяртання.

## ГЛАВА 34
## АДЗІНЫ ПАДАТАК ДЛЯ ВЫТВОРЦАЎ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРАДУКЦЫІ

### Артыкул 345. Плацельшчыкі адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі

1. Плацельшчыкамі адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца ўказаныя ў падпункце 2.1 пункта 2 артыкула 14 гэтага Кодэкса, якія перайшлі ў парадку, устаноўленым артыкулам 348 гэтага Кодэкса, на прымяненне адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі (далей у гэтай главе – адзіны падатак) або пачалі яго прымяненне ў парадку і на ўмовах, устаноўленых пунктамі 2–4 артыкула 348 гэтага Кодэкса:

арганізацыі, якія ажыццяўляюць вытворчасць (вытворчасць і перапрацоўку) сельскагаспадарчай прадукцыі і (ці) першасную перапрацоўку льну;

арганізацыі ў частцы дзейнасці іх філіялаў, якія выконваюць падатковыя абавязацельствы арганізацыі (далей у гэтай главе – філіял), калі гэтыя філіялы ажыццяўляюць вытворчасць (вытворчасць і перапрацоўку) сельскагаспадарчай прадукцыі і (ці) першасную перапрацоўку льну.

2. Не маюць права прымяняць адзіны падатак:

2.1. арганізацыі – плацельшчыкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання;

2.2. рэзідэнты свабодных (асаблівых) эканамічных зон, спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал», Парка высокіх тэхналогій, Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»;

2.3. арганізацыі ў перыяд прымянення адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак, і да канца каляндарнага года, у якім яго прымяненне спынена.

3. Арганізацыя не мае права прымяняць адзіны падатак у каляндарным годзе, калі за папярэдні яму каляндарны год працэнтная доля, вызначаная пунктам 1 артыкула 347 гэтага Кодэкса, не адпавядае памеру, указанаму ў гэтым пункце, калі іншае не ўстаноўлена пунктамі 2–4 артыкула 348 гэтага Кодэкса.

4. Калі прымяненне адзінага падатку арганізацыяй спыняецца ў бягучым каляндарным годзе (у тым ліку з пачатку года), яна не мае права ў гэтым каляндарным годзе прымяняць адзіны падатак.

**Артыкул 346. Аб'ект падаткаабкладання адзіным падаткам**

Аб'ектам падаткаабкладання адзіным падаткам прызнаецца валавая выручка.

**Артыкул 347. Агульныя ўмовы прымянення адзінага падатку**

1. Прымяняць адзіны падатак мае права:

1.1. арганізацыя, у якой за папярэдні каляндарны год сума выручкі ад рэалізацыі выробленых ёю сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі першаснай перапрацоўкі льну і выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, зробленай гэтай арганізацыяй з выробленай ёю сельскагаспадарчай прадукцыі, у частцы, якая адносіцца на такую сельскагаспадарчую прадукцыю, складае не менш за 50 працэнтаў агульнай сумы выручкі арганізацыі;

1.2. арганізацыя ў частцы дзейнасці філіяла, у якога за папярэдні каляндарны год сума выручкі ад рэалізацыі выробленых ім сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі першаснай перапрацоўкі льну і выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, зробленай гэтым філіялам з выробленай ім сельскагаспадарчай прадукцыі, у частцы, якая адносіцца на такую сельскагаспадарчую прадукцыю, складае не менш за 50 працэнтаў агульнай сумы выручкі філіяла.

2. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, зробленай арганізацыяй з выробленай ёю сельскагаспадарчай прадукцыі (далей у гэтай главе – прадукцыя перапрацоўкі арганізацыі), у частцы, якая адносіцца на такую сельскагаспадарчую прадукцыю, вызначаецца для мэт падпункта 1.1 пункта 1 гэтага артыкула як здабытак выручкі ад рэалізацыі прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі і ўдзельнай вагі кошту выробленай арганізацыяй сельскагаспадарчай прадукцыі, перададзенай у перапрацоўку, у затратах арганізацыі, якія адносяцца да вытворчасці прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі.

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, зробленай філіялам з выробленай ім сельскагаспадарчай прадукцыі (далей у гэтай главе – прадукцыя перапрацоўкі філіяла), у частцы, якая адносіцца на такую сельскагаспадарчую прадукцыю, вызначаецца для мэт падпункта 1.2 пункта 1 гэтага артыкула як здабытак выручкі ад рэалізацыі прадукцыі перапрацоўкі філіяла і ўдзельнай вагі кошту выробленай філіялам сельскагаспадарчай прадукцыі, перададзенай у перапрацоўку, у затратах філіяла, якія тычацца да вытворчасці прадукцыі перапрацоўкі філіяла.

3. Для мэт пунктаў 1 і 2 гэтага артыкула выручка ад рэалізацыі выробленай сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі першаснай перапрацоўкі льну, выручка ад

рэалізацыі прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі (прадукцыі перапрацоўкі філіяла) і агульная сума выручкі арганізацыі (філіяла):

за перыяд прымянення адзінага падатку, агульнага парадку падаткаабкладання або адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак, прымаюцца зыходзячы з парадку вызначэння выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і яе ўключэння ў валавую выручку, які дзейнічае для мэт вылічэння адзінага падатку ў такі перыяд;

за перыяд прымянення падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання прымаюцца зыходзячы з парадку вызначэння выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і яе ўключэння ў валавую выручку, які дзейнічае для мэт вылічэння падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання ў такі перыяд.

Пры разліку працэнтнай долі, вызначанай пунктам 1 гэтага артыкула, за каляндарны год, у якім на працягу ўсяго года ці яго часткі арганізацыя вяла ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, выручка за такі год ад рэалізацыі прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі (прадукцыі перапрацоўкі філіяла) удзельнічае толькі для мэт вылічэння агульнай сумы выручкі арганізацыі (філіяла).

Арганізацыя мае права прымяняць адзіны падатак у каляндарным годзе, які ідзе следам за каляндарным годам, у якім яна ўзнікла ў выніку рэарганізацыі ў форме пераўтварэння, калі сума выручак ад рэалізацыі прадукцыі, указанай у пункце 1 гэтага артыкула, выробленай ёю і рэарганізаванай арганізацыяй, складае не менш за 50 працэнтаў сумы выручкі, атрыманай шляхам складання агульных сум выручак абедзвюх арганізацый, за каляндарны год, у якім ажыццёўлена такая рэарганізацыя.

4. Звесткі аб памерах выручак, вызначаных пунктам 1 гэтага артыкула, і памеры працэнтнай долі, вылічанай у адпаведнасці з указаным пунктам, падаюць арганізацыі за кожны каляндарны год не пазней за 20 студзеня года, які ідзе следам за мінулым каляндарным годам, у складзе паказчыкаў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку.

5. Адзіны падатак замяняе для плацельшчыкаў:

5.1. падатак на прыбытак (за выключэннем падатку на прыбытак, які вылічваецца, утрымліваецца і які пералічваецца ў бюджэт пры выкананні абавязкаў падатковага агента), калі іншае не ўстаноўлена гэтым падпунктам.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты падатку на прыбытак у адносінах да:

дывідэндаў, а таксама прыраўнаваных да дывідэндаў даходаў, якія прызнаюцца гэтакімі ў адпаведнасці з часткай другой пункта 1 артыкула 167 гэтага Кодэкса;

даходаў, указаных у падпунктах 3.2, 3.3, 3.30–3.32 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса;

розніц, якія ўлічваюцца пры вызначэнні валавога прыбытку ў адпаведнасці з часткай першай пункта 7 артыкула 167 і часткай пятай пункта 3 артыкула 178 гэтага Кодэкса;

прыбытку ад рэалізацыі (пагашэння) каштоўных папер;

прыбытку ад адчужэння долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі;

прыбытку ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу;

5.2. падатак на нерухомасць;

5.3. зямельны падатак і арэндную плату за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і арэндадаўцамі якіх з'яўляюцца сельскія, пасялковыя,

раённыя, Мінскі гарадскі і гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчыя камітэты, адміністрацыі свабодных эканамічных зон (далей у гэтай главе – арэндная плата за зямлю), калі іншае не ўстаноўлена гэтай главой.

Захоўваецца агульны парадак вылічэння і аплаты:

зямельнага падатку за зямельныя ўчасткі, дадзеныя ў часовае карыстанне і своечасова не вернутыя ў адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятыя;

зямельнага падатку па ўсіх аб'ектах падаткаабкладання гэтым падаткам і арэнднай платы за зямлю па ўсіх зямельных участках за каляндарны год, за які працэнтная доля, вызначаная пунктам 1 гэтага артыкула, не адпавядае памеру, указанаму ў гэтай частцы;

5.4. экалагічны падатак, за выключэннем экалагічнага падатку за пахаванне адходаў вытворчасці ў выпадку набыцця імі права ўласнасці на адходы вытворчасці на падставе здзелкі аб адчужэнні адходаў ці здзяйснення іншых дзеянняў, якія сведчаць аб накіраванні іншым спосабам адходаў ва ўласнасць, у мэтах наступнага пахавання. Пры гэтым вылічэнне і аплата экалагічнага падатку праводзяцца ў адносінах да адходаў, набытых указанымі спосабамі;

5.5. збор з нарыхтоўшчыкаў.

6. Адзіны падатак для арганізацый, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі ў частцы дзейнасці філіялаў, не замяняе падаткі, збор і арэндную плату за зямлю, указаныя ў пункце 5 гэтага артыкула, у адносінах да дзейнасці, якая не з'яўляецца дзейнасцю гэтых філіялаў.

7. Для мэт гэтай главы:

7.1. сельскагаспадарчай прадукцыяй з'яўляецца:

прадукцыя раслінаводства, якая ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-2012 «Класіфікатар прадукцыі па відах эканамічнай дзейнасці» (далей у гэтым падпункце – класіфікатар) класіфікуецца ў групах 01.1–01.3 (за выключэннем прадукцыі кветкаводства і дэкаратыўных раслін);

прадукцыя жывёлагадоўлі, якая класіфікуецца ў адпаведнасці з класіфікатарам у групе 01.4;

прадукцыя рыбаводства, якая класіфікуецца ў адпаведнасці з класіфікатарам у групе 03.0 і атрымана ў выніку развядзення, гадавання і ўтрымання ў штучных умовах;

7.2. паслугі (працы), незалежна ад іх класіфікацыі, не з'яўляюцца сельскагаспадарчай прадукцыяй;

7.3. выробленай арганізацыяй (філіялам) сельскагаспадарчай прадукцыяй з'яўляецца сельскагаспадарчая прадукцыя:

вырашчаная гэтай арганізацыяй (гэтым філіялам);

атрыманая гэтай арганізацыяй (гэтым філіялам) ад прадукцыі жывёлагадоўлі ў працэсе ўтрымання ёю (ім) такой прадукцыі ў жывой вазе;

выробленая гэтай арганізацыяй (гэтым філіялам) з вырашчанай ёю (ім) сельскагаспадарчай прадукцыі;

7.4. вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, яе перапрацоўка і першасная перапрацоўка льну павінна ажыццяўляцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

7.5. у затратах арганізацыі (філіяла), якія адносяцца да вытворчасці прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі (прадукцыі перапрацоўкі філіяла), улічваюцца прамыя затраты, якія прама ўключаюцца ў сабекошт прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі (прадукцыі перапрацоўкі філіяла), і ўскосныя затраты, якія ўключаюцца ў сабекошт

прадукцыі перапрацоўкі арганізацыі (прадукцыі перапрацоўкі філіяла) па пэўнай базе размеркавання ў адпаведнасці з уліковай палітыкай арганізацыі;

7.6. вызначэнне долі і ўдзельнай вагі, устаноўленых пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, праводзіцца арганізацыяй (філіялам) за каляндарны год;

7.7. значэнні паказчыкаў арганізацыі і філіяла, якія ўдзельнічаюць у разліках у адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула, вызначаюцца на падставе даных бухгалтарскага ўліку нарастаючым вынікам з пачатку года ў цэлым адпаведна па арганізацыі і па філіяле, раздзельны ўлік якіх павінен быць забяспечаны гэтымі арганізацыяй і філіялам;

7.8. здача ў арэнду (перадача ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці прызнаецца паслугай;

7.9. пад агульнай сумай выручкі арганізацыі, агульнай сумай выручкі філіяла разумеецца сума выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вызначаная ў цэлым адпаведна па арганізацыі, філіяле.

8. Палажэнні пунктаў 1–3 і 7 гэтага артыкула прымяняюцца ў адносінах да 2018 года выключна для мэт вызначэння права арганізацыі прымяняць адзіны падатак у 2019 годзе.

Калі за 2018 год працэнтная доля, вызначаная для мэт прымянення адзінага падатку палажэннямі гэтага Кодэкса, якія дзейнічалі ў 2018 годзе, не адпавядае памеру, устаноўленаму такімі палажэннямі, арганізацыя:

па зямельных участках, зямельны падатак (арэндная плата за зямлю) за якія не спаганяўся ў сувязі з прымяненнем адзінага падатку, вылічвае зямельны падатак (арэндную плату за зямлю) за 2018 год, падае ў падатковы орган адпаведную падатковую дэкларацыю (разлік) па зямельным падатку (разлік сумы арэнднай платы за зямлю) за 2018 год не пазней за 20 студзеня 2019 года і праводзіць аплату зямельнага падатку (арэнднай платы за зямлю) не пазней за 22 студзеня 2019 года;

вылічвае адзіны падатак па стаўцы 3 працэнты зыходзячы з падатковай базы за 2018 год, адлюстроўвае яго ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку, якая падаецца ў падатковы орган не пазней за 20 студзеня 2019 года, і праводзіць аплату адзінага падатку не пазней за 22 студзеня 2019 года.

Палажэнні абзаца трэцяга часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 гэтага артыкула, абзаца трэцяга пункта 5 артыкула 348, пункта 2 артыкула 350 і пункта 3 артыкула 353 гэтага Кодэкса не прымяняюцца да ўказаных у іх падаткаў і арэнднай платы за зямлю, якія спаганяюцца за 2018 год.

### Артыкул 348. Парадак і ўмовы пачатку і спынення прымянення адзінага падатку

1. Арганізацыя, якая выказала жаданне перайсці на прымяненне адзінага падатку, павінна не пазней за 1-е чысло другога месяца квартала, з якога яна прэтэндуе пачаць прымяненне адзінага падатку, падаць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамленне аб пераходзе на адзіны падатак па ўстаноўленай форме, калі іншае не прадугледжана гэтым пунктам.

Арганізацыя, якая выказала жаданне перайсці на прымяненне адзінага падатку з 1 студзеня 2019 года, павінна не пазней за 20 лютага 2019 года паведаміць падатковаму органу па месцы пастаноўкі на ўлік у пісьмовай ці электроннай форме аб пераходзе на прымяненне адзінага падатку з 1 студзеня 2019 года з абавязковым указаннем за 2018 год сум выручак, вызначаных пунктам 1 артыкула 347 гэтага Кодэкса, і памеру працэнтнай долі, вылічанай у адпаведнасці з указаным пунктам.

2. Арганізацыі, якія прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю ў годзе, у якім яны прэтэндуюць на прымяненне адзінага падатку, маюць права прымяняць адзіны падатак у такім годзе пачынаючы з даты іх дзяржаўнай рэгістрацыі пры ўмове падачы ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік паведамлення аб пераходзе на адзіны падатак па ўстаноўленай форме, на працягу дваццаці рабочых дзён з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

3. У выпадку пастаноўкі на ўлік у падатковым органе філіяла па вытворчасці прадукцыі, указанай у пункце 1 артыкула 347 гэтага Кодэкса, арганізацыя мае права прымяняць адзіны падатак у частцы дзейнасці гэтага філіяла ў каляндарным годзе, на які прыпадае дата пастаноўкі яго на ўлік у падатковым органе, пачынаючы з указанай даты.

Палажэнне часткі першай гэтага пункта прымяняецца пры ўмове падачы ў падатковы орган па месцы пастаноўкі філіяла на ўлік паведамлення аб пераходзе на адзіны падатак па ўстаноўленай форме на працягу дваццаці рабочых дзён з дня пастаноўкі яго на ўлік у падатковым органе.

4. Арганізацыя, якая ўзнікла ў каляндарным годзе ў выніку рэарганізацыі ў форме пераўтварэння, мае права прымяняць адзіны падатак у такім годзе з даты ўнясення ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў статут (устаноўчы дагавор – для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора) юрыдычнай асобы ў сувязі з рэарганізацыяй у форме пераўтварэння, калі рэарганізаваная арганізацыя мела права прымяняць адзіны падатак і прымяняла яго на дзень, які непасрэдна папярэднічае ўказанай даце.

5. Пры неадпаведнасці за каляндарны год працэнтнай долі, вызначанай пунктам 1 артыкула 347 гэтага Кодэкса, памеру, указанаму ў гэтым пункце, арганізацыя, якая прымяняе адзіны падатак у такім годзе, абавязана:

спыніць прымяненне адзінага падатку з пачатку наступнага каляндарнага года;

вылічыць і аплаціць зямельны падатак і арэндную плату за зямлю, указаныя ў абзацы трэцім часткі другой падпункта 5.3 пункта 5 артыкула 347 гэтага Кодэкса, а таксама вылічыць і аплаціць адзіны падатак у парадку і тэрміны, устаноўленыя пунктам 2 артыкула 350 і пунктам 3 артыкула 353 гэтага Кодэкса.

6. У выпадку пераходу арганізацыі ў парадку, устаноўленым главой 32 гэтага Кодэкса, на прымяненне падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання прымяненне адзінага падатку спыняецца з пачатку каляндарнага года, з якога арганізацыя перайшла на прымяненне падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання і не адмовілася ад яго прымянення ў адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 327 гэтага Кодэкса.

7. У выпадку адмовы ад прымянення адзінага падатку па рашэнні арганізацыі прымяненне адзінага падатку спыняецца з месяца, які ідзе следам за справаздачным перыядам, у падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку за які адлюстравана рашэнне аб адмове ад прымянення адзінага падатку, калі іншае не прадугледжана часткай трэцяй гэтага пункта.

Адлюстраванне такога рашэння можа быць праведзена (анулявана) шляхам унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў ва ўказаную падатковую дэкларацыю (разлік) не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за:

месяцам, з якога згодна з часткай першай гэтага пункта спыняецца прымяненне адзінага падатку, – калі справаздачным перыядам па адзіным падатку для арганізацыі з'яўляецца месяц;

кварталам, з першага месяца якога згодна з часткай першай гэтага пункта спыняецца прымяненне адзінага падатку, – калі справаздачным перыядам па адзіным падатку для арганізацыі з'яўляецца квартал.

У выпадку, калі арганізацыя прыняла рашэнне аб адмове ад прымянення адзінага падатку з 1 студзеня 2019 года, прымяненне адзінага падатку спыняецца з указанай даты пры ўмове паведамлення арганізацыяй не пазней за 20 лютага 2019 года падатковаму органу па месцы пастаноўкі на ўлік у пісьмовай ці электроннай форме аб такім рашэнні.

8. У выпадку, калі памылкі, вынікам якіх з'яўляецца неправамернае прымяненне адзінага падатку, выяўлены пасля падачы падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку за першы справаздачны перыяд падатковага перыяду, які ідзе следам за апошнім каляндарным годам неправамернага прымянення адзінага падатку, арганізацыі захоўваюць права прымяняць адзіны падатак з 1 студзеня ўказанага падатковага перыяду і прызнаюцца перайшоўшымі на прымяненне адзінага падатку з гэтай даты.

Для мэт часткі першай гэтага пункта:

неправамерным прымяненнем адзінага падатку з'яўляецца прымяненне адзінага падатку арганізацыяй у перыяд, калі згодна з дзейнымі на працягу яго палажэннямі гэтага Кодэкса і (ці) іншых актаў заканадаўства яны не мелі правы прымяняць адзіны падатак;

каляндарным годам неправамернага прымянення адзінага падатку прызнаецца каляндарны год, у якім мела месца на працягу ўсяго года ці яго часткі неправамернае прымяненне адзінага падатку;

непадача ў падатковы орган паведамлення аб пераходзе на адзіны падатак не з'яўляецца падставай для прызнання каляндарнага года каляндарным годам неправамернага прымянення адзінага падатку, калі раней такое паведамленне падавалася ў адпаведнасці з заканадаўствам;

падатковым перыядам, з 1 студзеня якога арганізацыя захоўвае права прымяняць адзіны падатак і прызнаецца перайшоўшай на прымяненне адзінага падатку, не з'яўляецца падатковы перыяд, які ідзе следам за каляндарным годам, за які працэнтная доля, вызначаная для мэт прымянення адзінага падатку палажэннямі гэтага Кодэкса, якія дзейнічалі ў гэтым падатковым перыядзе, не адпавядае памеру, устаноўленаму такімі палажэннямі.

Палажэнні гэтага пункта адносяцца да памылак, якія выяўляюцца пачынаючы з 2019 года, незалежна ад таго, калі ў выніку такіх памылак мела месца неправамернае прымяненне адзінага падатку.

**Артыкул 349. Падатковая база адзінага падатку**

1. Падатковая база адзінага падатку вызначаецца як грашовае выражэнне валавой выручкі. Для мэт гэтай главы валавой выручкай прызнаецца сума выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў і пазарэалізацыйных даходаў.

2. У валавую выручку не ўключаюцца:

2.1. кошт жывёлы, выбракаванай з асноўнага статка і пастаўленай на адкорм;

2.2. сумы падатку на дабаўленую вартасць, вылічаныя ад выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам (у тым ліку вылічаныя згодна з падпунктам 7.1 пункта 7 артыкула 129 гэтага Кодэкса ў

сувязі з іх залішнім прад'яўленнем), за выключэннем сум падатку на дабаўленую вартасць, указаных у падпункце 3.6 пункта 3 артыкула 175 гэтага Кодэкса;

2.3. сумы падатку на дабаўленую вартасць (іншых падаткаў, аналагічных падатку на дабаўленую вартасць, такіх як падатак на тавары і паслугі, падатак з продажаў), аплачаныя (утрыманыя) у замежных дзяржавах у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў, пры наяўнасці даведкі, засведчанай падатковым органам замежнай дзяржавы (іншай кампетэнтнай службай замежнай дзяржавы, у функцыі якой уваходзіць спагнанне падаткаў), ці іншых дакументаў, якія пацвярджаюць аплату (утрыманне) падатку ў замежнай дзяржаве;

2.4. кошт бязвыплатна перададзеных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключаючы затраты на іх бязвыплатную перадачу;

2.5. кошт маёмасці і правоў, атрыманых арганізацыяй ад заснавальнікаў (удзельнікаў, акцыянераў) у якасці ўзносу (укладу) у яе статутны фонд у памерах, прадугледжаных статутам (устаноўчым дагаворам – для арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора);

2.6. выручка ад адчужэння долі (часткі долі) у статутным фондзе (паю (часткі паю)) арганізацыі;

2.7. выручка ад рэалізацыі (пагашэння) каштоўных папер;

2.8. выручка ад рэалізацыі прадпрыемства як маёмаснага комплексу;

2.9. выручка, атрыманая ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, у выпадку, калі арганізацыя з'яўляецца плацельшчыкам збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

2.10. даходы, указаныя ў падпунктах 3.1–3.3, 3.30–3.32 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса;

2.11. кошт матэрыяльных каштоўнасцей, якія застаюцца (атрыманы) у выніку ліквідацыі (разборкі, дэмантажу) асноўных сродкаў ці іншай маёмасці арганізацыі, у перыяд да рэалізацыі такіх каштоўнасцей;

2.12. сумы, атрыманыя ў выглядзе пакрыцця абаненту субабанентамі кошту ўсіх відаў энергіі, газу, вады;

2.13. сумы сродкаў, бязвыплатна атрыманыя арганізацыяй у рамках мэтавага фінансавання з бюджэту, дзяржаўных пазабюджэтных фондаў або пазабюджэтных цэнтралізаваных інвестыцыйных фондаў, сфарміраваных у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з бюджэту Саюзнай дзяржавы і выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні (пры ўстанаўленні мэтавага прызначэння заканадаўствам ці ў адпаведнасці з ім), за выключэннем указаных сродкаў, якія пакрываюць затраты (расходы), улічаныя ёю пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак;

2.14. выручка ад адчужэння маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры якім атрыманыя грашовыя сродкі падлягаюць накіраванню ў бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, якія рэгулююць парадак распараджэння дзяржаўнай маёмасцю, і (ці) на мэты, вызначаныя гэтымі актамі заканадаўства, або падлягаюць размеркаванню згодна з указанымі актамі заканадаўства;

2.15. сумы расходаў, якія кампенсуюцца пазыкадавальніку пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, звязаны з гэтай маёмасцю і ўзнікаюць у сувязі з набыццём камунальных і іншых паслуг (прац), неабходных для ўтрымання і эксплуатацыі ўказанай маёмасці, а таксама расходаў, абавязак пакрыцця пазыкадавальніку якіх прадугледжаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (за выключэннем сум расходаў, што адносяцца да паслуг (прац), аказаных (выкананых) пазыкадавальнікам);

2.16. пры здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) нерухомай маёмасці, здачы ў наём жылых памяшканняў – сума расходаў, якія кампенсуюцца арэндадаўцу (лізінгадавальніку, наймадаўцу, не ўключаны ў арэндную плату (лізінгавы плацеж, плату за карыстанне жылым памяшканнем), звязаны з гэтай маёмасцю і ўзнікаюць у сувязі з набыццём камунальных і іншых паслуг (прац), неабходных для ўтрымання і эксплуатацыі ўказанай маёмасці (за выключэннем сум расходаў, якія адносяцца да паслуг (прац), аказаных (выкананых) арэндадаўцам (лізінгадавальнікам, наймадаўцам));

2.17. выручка ад рэалізацыі банкам банкаўскіх і мерных зліткаў з каштоўных металаў, зліткавых (інвестыцыйных) манет з каштоўных металаў;

2.18. пазарэалізацыйныя даходы, указаныя ў падпункце 3.36 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса, калі сума арэнднай платы, згаданая ва ўказаным падпункце, не ўлічвалася ў складзе затрат (расходаў) пры вызначэнні падатковай базы падатку на прыбытак;

2.19. даходы, указаныя ў частцы першай пункта 7 артыкула 167 і частцы пятай пункта 3 артыкула 178 гэтага Кодэкса.

3. Выручка ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў для мэт гэтай главы вызначаецца ў парадку, устаноўленым пунктамі 7–11 артыкула 168 гэтага Кодэкса.

4. З улікам асаблівасцей дзейнасці асобных арганізацый у выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў для мэт гэтай главы ўключаюцца:

4.1. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ці здзяйсненні іншых здзелак, іншых юрыдычна значных дзеянняў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў у камісіянера (паверанага), іншай аналагічнай асобы – сума ўзнагароды, а таксама дадатковай выгады;

4.2. пры здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, здачы ў наём жылых памяшканняў – сума арэнднай платы (лізінгавых плацяжоў, платы за карыстанне жылым памяшканнем), а таксама сума расходаў, якія кампенсуюцца і не ўключаны ў арэндную плату (лізінгавы плацеж, плату за карыстанне жылым памяшканнем), калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 2.16 пункта 2 гэтага артыкула;

4.3. сумы, атрыманыя звыш цаны рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, у тым ліку сумы пакрыцця расходаў, звязаных з рэалізацыяй тавараў (выкананнем прац, аказаннем паслуг), перадачай маёмасных правоў (уключаючы сумы пакрыцця пакупніком тавараў іх прадаўцу кошту набытых паслуг па дастаўцы (перавозцы) тавараў, не ўключаных у кошт гэтых тавараў), калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам і пунктам 2 гэтага артыкула;

4.4. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на падставе дагавораў камісіі, даручэння і іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў у камітэнта (даверніка), іншай аналагічнай асобы – кошт (цана), па якой рэалізаваны тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы;

4.5. сумы расходаў, якія кампенсуюцца пазыкадавальніку пры перадачы маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, за выключэннем сум расходаў, якія не ўключаюцца ў валавую выручку ў адпаведнасці з падпунктам 2.15 пункта 2 гэтага артыкула;

4.6. пры рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, грашовае абавязацельства па аплаце якіх выконваецца шляхам фінансавання пад уступку

грашовага патрабавання (факторынгу), – кошт (цана), па якой рэалізаваны тавары (працы, паслугі), маёмасныя правы;

4.7. пры перадачы маёмасці ў давернае кіраванне – сума выручкі і пазарэалізацыйных даходаў, вызначаная ў парадку, устаноўленым пунктам 11 артыкула 328 гэтага Кодэкса.

5. Да пазарэалізацыйных даходаў адносяцца даходы, якія ўключаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у склад пазарэалізацыйных даходаў пры вылічэнні падатку на прыбытак, акрамя ўказаных у падпунктах 3.1–3.3, 3.18, 3.30–3.32 пункта 3 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Дата адлюстравання пазарэалізацыйных даходаў вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса.

6. Пры павелічэнні кошту тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (за выключэннем указаных у падпунктах 2.6–2.8 пункта 2 гэтага артыкула), праведзеным у перыяд прымянення адзінага падатку пасля даты адлюстравання выручкі ад іх рэалізацыі (у тым ліку калі адлюстраванне выручкі праведзена пры прымяненні агульнага парадку падаткаабкладання ці іншага асаблівага рэжыму падаткаабкладання), павелічэнне выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ажыццяўляецца ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзена ўказанае павелічэнне кошту.

У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены ў справаздачным перыядзе каляндарнага года, у якім прымяняецца адзіны падатак, і выручка ад рэалізацыі якіх улічвалася пры вылічэнні падатковай базы адзінага падатку ў папярэднім справаздачным перыядзе таго ж каляндарнага года, суразмернае змяншэнне выручкі ад рэалізацыі гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў ажыццяўляецца ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены ўказаныя вяртанне (адмова) ці змяншэнне кошту.

7. Сумы расходаў, якія кампенсуюцца і ўключаюцца ў падатковую базу ў адпаведнасці з падпунктамі 4.2 і 4.5 пункта 4 гэтага артыкула, улічваюцца ў складзе выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на дату паступлення пакрыцця гэтых расходаў (у тым ліку ў натуральнай форме) або на дату іншага спынення абавязацельства па пакрыцці ўказаных расходаў, у тым ліку ў выніку заліку, уступкі права патрабавання, пералічэння грашовых сродкаў на рахункі трэціх асоб.

У парадку, устаноўленым часткай першай гэтага пункта, праводзіцца таксама ўключэнне ў падатковую базу сум, указаных у падпункце 4.3 пункта 4 гэтага артыкула.

Дата адлюстравання выручкі, якая ўзнікае пры здачы ў наём жылых памяшканняў, вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі, вызначанымі для здачы ў арэнду (перадачы фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці.

8. Арганізацыі, якія адлюстроўвалі выручку па меры аплаты адгружаных тавараў (выкананых прац, аказаных паслуг), перададзеных маёмасных правоў для мэт вылічэння падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання і пачалі прымяняць у бягучым каляндарным годзе адзіны падатак, выручку ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, адгружаных (выкананых, аказаных), перададзеных і не аплачаных да даты, з якой пачата прымяненне адзінага падатку, і належныя да атрымання і не атрыманыя да гэтай даты пазарэалізацыйныя даходы, адлюстраванне

якіх у адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса не прыпадае на ўказаную дату або пасля яе, улічваюць пры вызначэнні падатковай базы адзінага падатку:

па меры паступлення аплаты тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў (фактычнага атрымання пазарэалізацыйных даходаў) – у выпадку паступлення аплаты (атрымання пазарэалізацыйных даходаў) на працягу каляндарнага года, у якім пачата прымяненне адзінага падатку;

на апошняе чысло каляндарнага года, у якім пачата прымяненне адзінага падатку, – у іншых выпадках.

9. Для арганізацыі, што прымяняе адзіны падатак у частцы дзейнасці філіяла, падатковая база вызначаецца зыходзячы з валавой выручкі філіяла, якая вызначаецца ў адпаведнасці з палажэннямі гэтага артыкула.

**Артыкул 350. Стаўка адзінага падатку**

1. Стаўка адзінага падатку ўстанаўліваецца ў памеры адзін (1) працэнт, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 2 гэтага артыкула.

2. Пры неадпаведнасці за каляндарны год працэнтнай долі, вызначанай пунктам 1 артыкула 347 гэтага Кодэкса, памеру, указанаму ў гэтым пункце, вылічэнне адзінага падатку праводзіцца па стаўцы тры (3) працэнты зыходзячы з падатковай базы адзінага падатку за каляндарны год, за які дапушчана ўказаная неадпаведнасць.

**Артыкул 351. Падатковы і справаздачны перыяды адзінага падатку**

1. Падатковым перыядам адзінага падатку прызнаецца каляндарны год.

2. Справаздачным перыядам адзінага падатку прызнаецца:

2.1. каляндарны месяц – для арганізацый, якія аплачваюць падатак на дабаўленую вартасць штомесяц;

2.2. каляндарны квартал – для арганізацый, якія аплачваюць падатак на дабаўленую вартасць штоквартальна.

**Артыкул 352. Парадак вылічэння адзінага падатку**

1. Сума адзінага падатку вылічваецца нарастаючым вынікам за час прымянення гэтага падатку ў падатковым перыядзе як здабытак падатковай базы і стаўкі адзінага падатку.

2. У адносінах да тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, вяртанне якіх (адмова ад якіх) ці змяншэнне кошту якіх праведзены:

2.1. у справаздачным перыядзе каляндарнага года, у якім прымяняецца адзіны падатак, і выручка ад рэалізацыі якіх улічвалася пры вылічэнні падатковай базы адзінага падатку ў папярэднім каляндарным годзе, праводзіцца змяншэнне сумы адзінага падатку ў тым справаздачным перыядзе, у якім праведзены вяртанне (адмова) ці змяншэнне кошту, на суму адзінага падатку, вылічаную:

зыходзячы з кошту (часткі кошту, на якую праведзена змяншэнне) гэтых тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, уключанага ў падатковую базу адзінага падатку;

зыходзячы са стаўкі адзінага падатку, прыменевай у адносінах да выручкі ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў;

за вылікам сумы адзінага падатку, якая не была аплачана ў сувязі з прымяненнем плацельшчыкам ільготы і адносіцца на выручку ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, – калі плацельшчык прымяняў ільготу па адзіным падатку ў каляндарным годзе, у якім у падатковай базе ўлічана такая выручка;

2.2. у перыяд прымянення агульнага парадку падаткаабкладання ці спрошчанай сістэмы падаткаабкладання і выручка ад рэалізацыі якіх улічвалася пры вылічэнні падатковай базы адзінага падатку, змяненні ўносяцца ў падатковую дэкларацыю (разлік) па адзіным падатку за апошні справаздачны перыяд таго каляндарнага года, у якім пры вылічэнні падатковай базы адзінага падатку ўлічана выручка ад рэалізацыі ўказаных тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў.

**Артыкул 353. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты адзінага падатку**

1. Плацельшчыкі падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю (разлік) па адзіным падатку не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

2. Аплата адзінага падатку праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым справаздачным перыядам.

3. Адзіны падатак, вылічаны ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 350 гэтага Кодэкса, падлягае:

адлюстраванню ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку, якая падаецца ў падатковыя органы не пазней за 20 студзеня года, што ідзе следам за каляндарным годам, за які дапушчана ўказаная неадпаведнасць;

аплаце не пазней за 22 студзеня года, што ідзе следам за каляндарным годам, за які дапушчана ўказаная неадпаведнасць.

## ГЛАВА 35
## ПАДАТАК НА ІГРАЛЬНЫ БІЗНЕС

**Артыкул 354. Плацельшчыкі падатку на ігральны бізнес**

Плацельшчыкамі падатку на ігральны бізнес (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі, указаныя ў падпункце 2.1 пункта 2 артыкула 14 гэтага Кодэкса.

Філіялы арганізацый-плацельшчыкаў не маюць права вылічваць сумы падатку на ігральны бізнес і выконваць падатковыя абавязацельствы гэтых арганізацый па падатку на ігральны бізнес.

**Артыкул 355. Агульныя ўмовы прымянення падатку на ігральны бізнес**

Даходы, атрыманыя плацельшчыкамі ад ажыццяўлення дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу, не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання:

падаткам на дабаўленую вартасць, за выключэннем гэтага падатку, які спаганяецца пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

падаткам на прыбытак.

**Артыкул 356. Аб'екты падаткаабкладання падаткам на ігральны бізнес**

1. Аб'ектамі падаткаабкладання падаткам на іґральны бізнес (далей у гэтай главе – аб'екты падаткаабкладання) прызнаюцца:

гульнявыя сталы;

гульнявыя аўтаматы;

касы таталізатараў;

касы букмекерскіх кантор;

станоўчая розніца паміж сумай прынятых ставак у азартных гульнях і сумай выплачаных выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак).

Для мэт гэтай главы пад розніцай паміж сумай прынятых ставак у азартных гульнях і сумай выплачаных выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак) разумеецца розніца паміж агульнай сумай грашовых сродкаў (электронных грошай), перададзеных (пералічаных, пераведзеных) для ўдзелу ў азартнай гульні арганізатару азартнай гульні*, і агульнай сумай выплачаных (пералічаных, пераведзеных) арганізатарам азартных гульняў грашовых сродкаў (электронных грошай) удзельнікам азартных гульняў, якая ўключае кошт перададзенай ім удзельнікам азартных гульняў у якасці выйгрышу іншай маёмасці.

Указаны ў частцы другой гэтага пункта кошт іншай маёмасці вызначаецца як кошт, па якім такая маёмасць у адпаведнасці з заканадаўствам адлюстроўвалася ў арганізатара азартных гульняў на рахунках бухгалтарскага ўліку, а пры наяўнасці амартызацыі па гэтай маёмасці – як астаткавы кошт.

---

* Уключаючы суму грашовых сродкаў, унесеных у купюрапрыёмнік гульнявога аўтамата.

2. Агульная колькасць аб'ектаў падаткаабкладання кожнага віду, за выключэннем указаных у абзацы шостым часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, да 1 красавіка 2019 года падлягае да іх устаноўкі (выкарыстання) абавязковай рэгістрацыі ў падатковых органах па месцы пастаноўкі на ўлік з выдачай пасведчання аб рэгістрацыі агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання (далей у гэтым артыкуле – пасведчанне) па пісьмовай заяве плацельшчыка.

У пасведчанні ўказваюцца колькасць аб'ектаў падаткаабкладання кожнага віду і іх месцазнаходжанне. Форму пасведчання зацвярджае Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Засведчаная падатковым органам копія пасведчання захоўваецца па месцы знаходжання аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у гэтым пасведчанні.

Забараняецца знаходжанне ў іґральнай установе аб'ектаў падаткаабкладання, якія не належаць плацельшчыку на праве ўласнасці (гаспадарчага вядзення) і (ці) не зарэгістраваных у падатковых органах, за выключэннем знаходжання ў ёй незарэгістраваных аб'ектаў падаткаабкладання ў выпадку прыняцця падатковым органам рашэння аб ануляванні пасведчання. Такія аб'екты могуць знаходзіцца ў іґральнай установе на працягу трыццаці дзён пасля атрымання паведамлення аб ануляванні пасведчання ў адпаведнасці з часткай пятнаццатай гэтага пункта.

Для рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання ў падатковы орган падаюцца наступныя дакументы:

пісьмовая заява плацельшчыка з указаннем адрасоў выкарыстання аб'ектаў падаткаабкладання;

пералік гульнявых аўтаматаў (для рэгістрацыі гульнявых аўтаматаў) па форме, зацверджанай Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь;

копіі дакументаў, якія пацвярджаюць права ўласнасці (гаспадарчага вядзення) плацельшчыка на аб'екты падаткаабкладання;

копія дагавора на тэхнічнае абслугоўванне гульнявых аўтаматаў;

копія дагавора даручэння, агенцкага дагавора ці іншых аналагічных дагавораў, якія прадугледжваюць прыём ставак у букмекерскіх гульнях і (ці) выплату выйгрышаў (вяртанне незгуляўшых ставак) (для рэгістрацыі кас букмекерскай канторы);

копія дакумента, які пацвярджае адкрыццё электроннага кашалька, на які прымаюцца стаўкі ў букмекерскай гульні, калі разлікі праводзяцца з выкарыстаннем плацежных сістэм (для рэгістрацыі кас букмекерскай канторы);

копія акта тэхнічнага агляду гульнявога аўтамата і копія дадатку да акта тэхнічнага агляду гульнявога аўтамата (для рэгістрацыі гульнявых аўтаматаў);

копія перадатачнага акта, у адпаведнасці з якім да новай узніклай юрыдычнай асобы пераходзяць правы і абавязкі рэарганізаванай юрыдычнай асобы (пры рэарганізацыі юрыдычнай асобы ў форме зліцця, далучэння ці пераўтварэння);

копія раздзяляльнага балансу, у адпаведнасці з якім да новай узніклай юрыдычнай асобы пераходзяць правы і абавязкі рэарганізаванай юрыдычнай асобы (пры рэарганізацыі юрыдычнай асобы ў форме раздзялення ці вылучэння);

копія вопісу дакументаў, пададзеных у орган ліцэнзавання для атрымання спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу (далей у гэтай главе – спецыяльны дазвол (ліцэнзія)) у сувязі з рэарганізацыяй юрыдычнай асобы, з адзнакай органа ліцэнзавання аб даце прыёму гэтых дакументаў у выпадку звароту такой юрыдычнай асобы для рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для падачы заявы для ўнясення змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) або атрымання новага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі).

Пры падачы ў падатковы орган копій дакументаў плацельшчык абавязаны прад'явіць іх арыгіналы ці натарыяльна засведчаныя копіі.

Падатковыя органы на працягу пяці рабочых дзён з даты падачы плацельшчыкам заявы аб рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання выдаюць плацельшчыку пасведчанне або пісьмова інфармуюць аб адмове ў рэгістрацыі з указаннем прычын адмовы.

Аб'екты падаткаабкладання лічацца зарэгістраванымі з даты выдачы пасведчання.

Падставамі для адмовы ў рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання з'яўляюцца:

адсутнасць у плацельшчыка спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), за выключэннем выпадку ажыццяўлення дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу на падставе раней выдадзенага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) рэарганізаванай юрыдычнай асобе;

неадпаведнасць заяўленых для рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання складаючым працам і паслугам, указаным у спецыяльным дазволе (ліцэнзіі);

наяўнасць у пададзеных дакументах неадпаведных рэчаіснасці звестак (інфармацыі);

неадпаведнасць адрасоў выкарыстання аб'ектаў падаткаабкладання, пералічаных у заяве плацельшчыка, месцу знаходжання ігральных устаноў, названых у спецыяльным дазволе (ліцэнзіі);

заява плацельшчыкам для рэгістрацыі гульнявога аўтамата, функцыянальныя і тэхнічныя характарыстыкі, а таксама праграмнае забеспячэнне якога не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі (далей – ТНПА), і (ці) мадэлі гэтага гульнявога аўтамата, уключанай у Дзяржаўны рэестр мадэляў гульнявых аўтаматаў,

дапушчаных да выкарыстання ў Рэспубліцы Беларусь (далей у гэтай главе – Дзяржаўны рээстр), калі неадпаведнасці выяўлены ў выніку тэхнічнага агляду гульнявога аўтамата;

заява плацельшчыкам для рэгістрацыі гульнявога аўтамата, мадэль якога не ўключана ў Дзяржаўны рээстр, і (ці) скончыўся тэрмін яе знаходжання ў Дзяржаўным рээстры.

Змяненне ў ігральнай установе агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання вырашаецца толькі пасля рэгістрацыі гэтага змянення ў падатковых органах.

Указанае ў частцы дзясятай гэтага пункта змяненне рэгіструецца ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання, за выключэннем выпадкаў змяншэння агульнай колькасці такіх аб'ектаў і перамяшчэння ў ігральных установах зарэгістраваных аб'ектаў падаткаабкладання без змянення іх агульнай колькасці, якія рэгіструюцца з выдачай новага пасведчання па заяве плацельшчыка на працягу пяці рабочых дзён з даты яе падачы.

Пры выдачы новага раней выдадзенае пасведчанне і яго копіі (за выключэннем копіі, пададзенай у таварыства з абмежаванай адказнасцю «Маніторынгавы цэнтр па ігральным бізнесе» (далей – маніторынгавы цэнтр)), засведчаныя падатковым органам, вяртаюцца плацельшчыкам у падатковы орган на працягу двух рабочых дзён пасля атрымання новага пасведчання.

Змяненне ў ігральнай установе агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання кожнага віду без іх рэгістрацыі ў падатковых органах, ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу пры адсутнасці рэгістрацыі агульнай колькасці гэтых аб'ектаў з'яўляюцца парушэннямі парадку рэгістрацыі аб'ектаў падаткаабкладання.

Ануляванне пасведчання ажыццяўляецца падатковымі органамі ў выпадку:

наяўнасці ў пададзеных плацельшчыкам дакументах не адпаведных рэчаіснасці звестак (інфармацыі);

непадачы ў падатковы орган у тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам, падатковай дэкларацыі (разліку) па падатку на ігральны бізнес пры наяўнасці зарэгістраваных аб'ектаў падаткаабкладання;

незвароту юрыдычнай асобы, якой дадзена права ажыццяўляць дзейнасць у сферы ігральнага бізнесу на падставе раней выдадзенага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) рэарганізаванай юрыдычнай асобе, у орган ліцэнзавання для ўнясення ў спецыяльны дазвол (ліцэнзію) змяненняў і (ці) дапаўненняў або для атрымання новага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) у месячны тэрмін з дня дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных ва ўстаноўчыя дакументы;

адмовы органа ліцэнзавання ў выдачы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) юрыдычнай асобе, якой у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права дзейнічаць у сферы ігральнага бізнесу на падставе раней выдадзенага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) рэарганізаванай юрыдычнай асобе;

спынення дзеяння ці анулявання спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі);

унясення ў спецыяльны дазвол (ліцэнзію) змяненняў у частцы выключэння з яго звестак аб адасобленых падраздзяленнях юрыдычнай асобы, у тым ліку філіялах, ігральных установах, і звестак аб складаючых від дзейнасці, які ліцэнзуецца, працах і (ці) паслугах;

неадпаведнасці функцыянальных і тэхнічных характарыстык канкрэтнага гульнявога аўтамата, яго праграмнага забеспячэння патрабаванням, устаноўленым ТНПА, а таксама мадэлі гэтага гульнявога аўтамата, уключанай у Дзяржаўны рэестр, выяўленай у выніку тэхнічнага агляду гульнявога аўтамата;

выключэння мадэлі гульнявога аўтамата з Дзяржаўнага рэестра і (ці) скантчэння тэрміну знаходжання мадэлі гульнявога аўтамата ў Дзяржаўным рэестры.

У рашэнні аб ануляванні пасведчання ўказваюцца дата яго анулявання – не раней за дату прыняцця рашэння – і падстава анулявання пасведчання. Рашэнне аб ануляванні пасведчання на падставах, прадугледжаных абзацамі пятым – дзявятым часткі чатырнаццатай гэтага пункта, прымаецца падатковым органам пасля сканчэння пяці рабочых дзён з дня:

атрымання плацельшчыкам інфармацыі аб спыненні дзеяння ці ануляванні спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі);

атрымання плацельшчыкам спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) з унесенымі змяненнямі ў частцы выключэння звестак аб адасобленых падраздзяленнях, у тым ліку філіялах, ігральных установах, і звестак аб складаючых від дзейнасці, які ліцэнзуецца, працах і (ці) паслугах і незвароту ў падатковы орган за рэгістрацыяй змяненняў агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання, калі такія змяненні неабходныя ў сувязі з унесенымі змяненнямі;

атрымання плацельшчыкам, якому гульнявыя аўтаматы належаць на праве ўласнасці (гаспадарчага вядзення), акта тэхнічнага агляду гульнявога аўтамата і незвароту ва ўстаноўленым парадку ў падатковы орган за рэгістрацыяй змяненняў агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання, якія прадугледжваюць зняцце з рэгістрацыі гульнявога аўтамата, функцыянальныя і тэхнічныя характарыстыкі якога не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым ТНПА, а таксама мадэлі гульнявога аўтамата, уключанай у Дзяржаўны рэестр, калі неадпаведнасці выяўлены ў выніку тэхнічнага агляду;

выключэння мадэлі гульнявога аўтамата з Дзяржаўнага рэестра і (ці) сканчэння тэрміну знаходжання мадэлі гульнявога аўтамата ў Дзяржаўным рэестры і незвароту плацельшчыка ва ўстаноўленым парадку ў падатковы орган за рэгістрацыяй змяненняў агульнай колькасці аб'ектаў падаткаабкладання, якія прадугледжваюць зняцце з рэгістрацыі гульнявога аўтамата;

атрымання плацельшчыкам паведамлення аб адмове органа ліцэнзавання ў выдачы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) юрыдычнай асобе, якой у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права дзейнічаць у сферы ігральнага бізнесу на падставе раней выдадзенага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі).

Падатковы орган на працягу трох рабочых дзён з дня прыняцця рашэння аб ануляванні пасведчання пісьмова апавяшчае плацельшчыка з указаннем падстаў анулявання. Плацельшчык не пазней за дзень, які ідзе следам за днём атрымання ва ўстаноўленым парадку паведамлення аб ануляванні пасведчання, абавязаны спыніць дзейнасць у сферы ігральнага бізнесу.

У выпадку анулявання пасведчання плацельшчык у пяцідзённы тэрмін, які вылічваецца з дня, што ідзе следам за днём атрымання ва ўстаноўленым парадку паведамлення аб ануляванні пасведчання, абавязаны вярнуць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік пасведчанне і яго копіі, засведчаныя падатковым органам (за выключэннем копіі, пададзенай у маніторынгавы цэнтр).

Ануляванне пасведчання не з'яўляецца падставай для заліку (вяртання) аплачанага падатку на ігральны бізнес.

Пры ліквідацыі фактаў, указаных у частцы чатырнаццатай гэтага пункта, плацельшчык можа звярнуцца ў падатковы орган за атрыманнем новага пасведчання ў парадку, устаноўленым часткамі першай – восьмай гэтага пункта.

3. Аб'екты падаткаабкладання, указаныя ў абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, з 1 красавіка 2019 года падлягаюць пастаноўцы на ўлік у спецыяльнай камп'ютарнай касавай сістэме, якая забяспечвае кантроль за абаротамі ў сферы ігральнага бізнесу (далей у гэтай главе – СККС), да іх выкарыстання для арганізацыі і (ці) правядзення азартных гульняў.

Улік у СККС аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, ажыццяўляе маніторынгавы цэнтр.

Маніторынгавы цэнтр ставіць на ўлік аб'ект падаткаабкладання, указаныя ў абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, у перыяд з 31 сакавіка 2019 года да 1 красавіка 2019 года ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Парадак пастаноўкі на ўлік аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, правы і абавязкі маніторынгавага цэнтра і арганізатараў азартных гульняў пры ажыццяўленні такога ўліку з 1 красавіка 2019 года вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 357. Падатковая база падатку на ігральны бізнес**

1. Падатковая база падатку на ігральны бізнес вызначаецца асобна па аб'ектах падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, і па аб'екце падаткаабкладання, указаным у абзацы шостым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса.

2. Да 1 красавіка 2019 года для аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, падатковая база падатку на ігральны бізнес вызначаецца як максімальная колькасць аб'ектаў падаткаабкладання, якія знаходзяцца ў ігральных установах на працягу падатковага перыяду.

3. З 1 красавіка 2019 года для аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, падатковая база падатку на ігральны бізнес вызначаецца як максімальная колькасць аб'ектаў падаткаабкладання, якія знаходзяцца на ўліку ў СККС на працягу падатковага перыяду.

У выпадку выкарыстання ў падатковым перыядзе для арганізацыі і (ці) правядзення азартных гульняў аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, якія не знаходзяцца на ўліку ў СККС, такія аб'екты ўключаюцца ў падатковую базу падатку на ігральны бізнес.

Падатковая база па аб'ектах падаткаабкладання, указаных у частцы другой гэтага пункта, вызначаецца як максімальная колькасць аб'ектаў падаткаабкладання, якія выкарыстоўваюцца ў падатковым перыядзе для арганізацыі і (ці) правядзення азартных гульняў і не знаходзяцца на ўліку ў СККС.

4. Для аб'екта падаткаабкладання, указанага ў абзацы шостым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, падатковая база падатку на ігральны бізнес вызначаецца як грашовае выражэнне станоўчай розніцы, якая ўтвараецца па ўсіх відах дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу на працягу падатковага перыяду, паміж сумай прынятых ставак у азартных гульнях і сумай выплачаных выйгрышаў (вернутых незгуляўшых ставак), зменшанае на суму падатку на ігральны бізнес, вылічаную за падатковы перыяд па ўсіх аб'ектах падаткаабкладання, указаных у абзацах другім – пятым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 358. Стаўкі і падатковы перыяд падатку на ігральны бізнес**

1. Стаўкі падатку на ігральны бізнес устанаўліваюцца ў наступных памерах на адзінку аб'екта падаткаабкладання:

сем тысяч сто сорак (7140) беларускіх рублёў – на гульнявы стол;

дзвесце сорак (240) беларускіх рублёў – на гульнявы аўтамат;

дзве тысячы дзвесце пяцьдзясят (2250) беларускіх рублёў – на касу таталізатара;

тысяча пяцьсот (1500) беларускіх рублёў – на касу букмекерскай канторы.

Пры наяўнасці ў гульнявога стала больш чым аднаго гульнявога поля стаўка падатку на ігральны бізнес павялічваецца кратна колькасці гульнявых палёў.

Пры выкарыстанні плацельшчыкамі гульнявога стала, падключанага да СККС, стаўка падатку на ігральны бізнес, указаная ў абзацы другім часткі першай гэтага пункта, змяншаецца на 50 працэнтаў.

Пры знаходжанні на ўліку ў СККС з 1 красавіка 2019 года гульнявога аўтамата, касы букмекерскай канторы, касы таталізатара, гульнявога стала ў падатковым перыядзе менш чым пятнаццаць каляндарных дзён* стаўка падатку на ігральны бізнес, устаноўленая на адзінку такога аб'екта падаткаабкладання ў адпаведнасці з часткамі першай – трэцяй гэтага пункта, змяншаецца на 50 працэнтаў.

З 1 красавіка 2019 года палажэнні частак трэцяй і чацвёртай гэтага пункта не прымяняюцца для аб'ектаў падаткаабкладання, указаных у частцы другой пункта 3 артыкула 357 гэтага Кодэкса.

Стаўка падатку на ігральны бізнес па аб'екце падаткаабкладання, указаным у абзацы шостым часткі першай пункта 1 артыкула 356 гэтага Кодэкса, устанаўліваецца ў памеры чатыры (4) працэнты.

---

* Уключаючы дзень пастаноўкі аб'екта падаткаабкладання падаткам на ігральны бізнес на ўлік у СККС і дзень зняцця гэтага аб'екта з уліку ў СККС.

2. Падатковым перыядам падатку на ігральны бізнес прызнаецца каляндарны месяц.

**Артыкул 359. Парадак вылічэння падатку на ігральны бізнес**

Суму падатку на ігральны бізнес плацельшчыкі вылічваюць самастойна як здабытак падатковай базы і падатковай стаўкі, устаноўленай на адпаведны аб'ект падаткаабкладання.

**Артыкул 360. Парадак і тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты падатку на ігральны бізнес**

1. Плацельшчыкі падаюць падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю (разлік) па падатку на ігральны бізнес не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

2. Аплата падатку на ігральны бізнес праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

## ГЛАВА 36
## ПАДАТАК НА ДАХОДЫ АД АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЛАТАРЭЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Артыкул 361. Плацельшчыкі падатку на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці**

Плацельшчыкамі падатку на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі, якія з'яўляюцца арганізатарамі латарэй.

### Артыкул 362. Аб'ект падаткаабкладання і агульныя ўмовы прымянення падатку на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці

1. Аб'ектам падаткаабкладання падаткам на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці (далей у гэтай главе – падатак на даходы) прызнаюцца даходы, атрыманыя ад арганізацыі і правядзення латарэй.

2. Плацельшчыкі вядуць улік даходаў і расходаў на кожную праведзеную латарэю.

3. Даходы ад арганізацыі і правядзення латарэй і абароты па рэалізацыі латарэйных білетаў (па прыёме латарэйных ставак) не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання адпаведна падаткам на прыбытак і падаткам на дабаўленую вартасць.

### Артыкул 363. Падатковая база падатку на даходы

Падатковая база падатку на даходы вызначаецца як розніца паміж сумай даходаў, атрыманых ад арганізацыі і правядзення латарэй, і сумай налічанага прызавога фонду латарэі.

Даходамі, атрыманымі ад арганізацыі і правядзення латарэй, прызнаецца агульная сума, выручаная ад рэалізацыі латарэйных білетаў (прыёму латарэйных ставак), вылічаная зыходзячы з колькасці рэалізаваных латарэйных білетаў (прынятых латарэйных ставак) і іх прадажнага кошту (кошту ўдзелу ў латарэі).

### Артыкул 364. Стаўка, падатковы перыяд, парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты падатку на даходы

1. Стаўка падатку на даходы ўстанаўліваецца ў памеры восем (8) працэнтаў.

2. Падатковым перыядам падатку на даходы прызнаецца каляндарны месяц.

3. Сума падатку на даходы вызначаецца як здабытак падатковай базы і стаўкі падатку.

4. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на даходы падаецца ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

5. Аплата падатку на даходы праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

## ГЛАВА 37
## ПАДАТАК НА ДАХОДЫ АД ПРАВЯДЗЕННЯ ЭЛЕКТРОННЫХ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ ГУЛЬНЯЎ

### Артыкул 365. Плацельшчыкі падатку на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў

Плацельшчыкамі падатку на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў (далей у гэтай главе – плацельшчыкі) прызнаюцца арганізацыі, якія з'яўляюцца арганізатарамі электронных інтэрактыўных гульняў.

### Артыкул 366. Агульныя ўмовы прымянення падатку на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў

1. Даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў і абаротаў па прыёме ставак па электронных інтэрактыўных гульнях не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання адпаведна падаткам на прыбытак і падаткам на дабаўленую вартасць.

2. Плацельшчыкі ўлічваюць даходы і расходы па кожнай праведзенай электроннай інтэрактыўнай гульні.

### Артыкул 367. Аб'ект падаткаабкладання і падатковая база падатку на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў

1. Аб'ектам падаткаабкладання падатку на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў (далей у гэтай главе – падатак на даходы) прызнаюцца даходы, атрыманыя ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў.

2. Падатковая база падатку на даходы вызначаецца як розніца паміж сумай даходаў, атрыманых ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў, і сумай сфарміраванага выйгрышнага фонду.

Пры вызначэнні падатковай базы падатку на даходы не ўлічваюцца ўласныя сродкі плацельшчыкаў, якія накіроўваюцца імі на павелічэнне выйгрышнага фонду.

### Артыкул 368. Стаўка, падатковы перыяд, парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты падатку на даходы

1. Стаўка падатку на даходы ўстанаўліваецца ў памеры восем (8) працэнтаў.

2. Падатковым перыядам падатку на даходы прызнаецца каляндарны месяц.

3. Сума падатку на даходы вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі падатку.

4. Падатковая дэкларацыя (разлік) па падатку на даходы падаецца ў падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

5. Аплата падатку на даходы праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

## ГЛАВА 38
## ЗБОР ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАМЕСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Артыкул 369. Плацельшчыкі збору за ажыццяўленне раменай дзейнасці

Плацельшчыкамі збору за ажыццяўленне раменай дзейнасці прызнаюцца фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць рамесную дзейнасць у парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 370. Агульныя ўмовы прымянення збору за ажыццяўленне раменай дзейнасці

Аплата збору за ажыццяўленне раменай дзейнасці (далей у гэтай главе – збор) замяняе аплату падаходнага падатку з фізічных асоб і адзінага падатку з

індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб у частцы даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення рамеснай дзейнасці.

### Артыкул 371. Аб'ект абкладання і стаўка збору за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці

1. Аб'ектам абкладання зборам прызнаецца ажыццяўленне відаў рамеснай дзейнасці, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Стаўка збору ўстанаўліваецца ў памеры адной базавай велічыні ў каляндарны год. Памер базавай велічыні вызначаецца на дату аплаты збору.

### Артыкул 372. Падатковы перыяд і тэрміны аплаты (даплаты) збору за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці

1. Падатковым перыядам збору прызнаецца каляндарны год.

2. Аплата збору праводзіцца:

за поўны наступны каляндарны год – не пазней за 28-е числo апошняга месяца бягучага каляндарнага года;

у іншых выпадках – да пачатку ажыццяўлення рамеснай дзейнасці.

У выпадку неажыццяўлення рамеснай дзейнасці на працягу падатковага перыяду аплачаная сума збору вяртанню (заліку) не падлягае.

3. Пры ўказанні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці ці тлумачэннях, пададзеных па патрабаванні падатковага органа, у якасці крыніц, за кошт якіх была набыта маёмасць, даходаў, атрыманых ад ажыццяўлення рамеснай дзейнасці, у памерах, якія перавышаюць сторазовы памер збору, аплачанага за падатковыя перыяды, у якія быў атрыманы такі даход, плацельшчыкам даплачвае збор у памеры 10 працэнтаў ад сумы такога перавышэння.

Сумы даплаты збору вылічвае падатковы орган не пазней дня, які ідзе следам за днём завяршэння камеральнай праверкі па пытанні выканання заканадаўства аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў.

Даплата збору праводзіцца ў трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння плацельшчыку паведамлення падатковага органа.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце лістом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

## ГЛАВА 39
## ЗБОР ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ПА АКАЗАННІ ПАСЛУГ У СФЕРЫ АГРАЭКАТУРЫЗМУ

### Артыкул 373. Плацельшчыкі збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму

Плацельшчыкамі збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму прызнаюцца ажыццяўляючыя дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму ў парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь:

фізічныя асобы;

сельскагаспадарчыя арганізацыі. Пры гэтым пад сельскагаспадарчымі арганізацыямі разумеюцца юрыдычныя асобы, асноўным відам дзейнасці якіх з'яўляюцца вытворчасць (вырошчванне) і (ці) перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, выручка ад рэалізацыі якой складае не менш за 50 працэнтаў ад агульнай сумы выручкі.

### Артыкул 374. Агульныя ўмовы прымянення збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму

1. Аплата збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму (далей у гэтай главе – збор):

1.1. замяняе аплату падаходнага падатку з фізічных асоб і адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб у частцы даходаў, атрыманых фізічнай асобай ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

1.2. замяняе аплату падатку на прыбытак, падатку на дабаўленую вартасць, адзінага падатку для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання ў частцы даходаў (прыбытку, выручкі), атрыманай сельскагаспадарчай арганізацыяй ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

1.3. не вызваляе сельскагаспадарчую арганізацыю ад абавязкаў падатковага агента, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі актамі падатковага заканадаўства.

2. Сельскагаспадарчая арганізацыя вядзе раздзельны ўлік выручкі, атрыманай ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, і выручкі, атрыманай ад рэалізацыі выробленай і перапрацаванай сельскагаспадарчай прадукцыі, выручкі (даходаў) ад іншых відаў гаспадарчай дзейнасці, не забароненых заканадаўствам.

Пры ажыццяўленні відаў дзейнасці (атрыманні даходаў), якія не адносяцца да аказання паслуг у сферы аграэкатурызму, сельскагаспадарчая арганізацыя плаціць па гэтых відах дзейнасці (даходах) падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі актамі падатковага заканадаўства. Расходы (затраты), панесеныя ў сувязі з ажыццяўленнем дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, не ўлічваюцца ў якасці гэтакіх або ў якасці сум, якія ўдзельнічаюць пры вызначэнні падатковай базы, пры вылічэнні падаткаў, збораў (пошлін).

3. Сельскагаспадарчая арганізацыя мае права прымяняць у бягучым падатковым перыядзе збор у выпадку, калі па выніках падатковага перыяду, які папярэднічае бягучаму падатковаму перыяду, яна адпавядае ўмове, указанай у абзацы трэцім артыкула 373 гэтага Кодэкса. Сельскагаспадарчая арганізацыя, якая прайшла дзяржаўную рэгістрацыю ў годзе, у якім яна прэтэндуе на прымяненне збору, мае права на яго прымяненне, калі ўказаная адпаведнасць захавана за перыяд з дня дзяржаўнай рэгістрацыі да 1-га чысла месяца, у якім аплачаны гэты збор. Сельскагаспадарчая арганізацыя, якая аплаціла збор у месяцы, у якім ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыі, мае права на яго прымяненне, калі такая адпаведнасць захавана за перыяд з даты дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыі да канца гэтага месяца.

### Артыкул 375. Аб'ект абкладання і стаўка збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму

1. Аб'ектам абкладання зборам прызнаецца ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму.

2. Стаўка збору ўстанаўліваецца ў памеры адной базавай велічыні ў каляндарны год. Памер базавай велічыні вызначаецца на дату аплаты збору.

### Артыкул 376. Падатковы перыяд збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму

Падатковым перыядам збору прызнаецца каляндарны год.

### Артыкул 377. Тэрміны аплаты (даплаты) збору за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму

1. Аплата збору праводзіцца:

за поўны наступны каляндарны год – не пазней за 28-е чысло апошняга месяца бягучага каляндарнага года;

у іншых выпадках – да пачатку ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму.

У выпадку спынення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму да сканчэння падатковага перыяду ці неажыццяўлення дзейнасці на працягу падатковага перыяду аплачаная сума збору вяртанню (заліку) не падлягае.

2. Даплата збору ў адпаведнасці з гэтым артыкулам праводзіцца, калі ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці ці тлумачэннях, пададзеных фізічнай асобай па патрабаванні падатковых органаў, у якасці крыніц даходаў, за кошт якіх была набыта маёмасць, былі заяўлены даходы, атрыманыя ёй ад ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму.

Пры гэтым даплата збору праводзіцца пры ўмове, калі памер даходаў, накіраваных на набыццё маёмасці, якая не выкарыстоўваецца пры ажыццяўленні дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, перавысіў сторазовы памер збору, заплачанага за тыя падатковыя перыяды, у якія быў атрыманы такі даход. Сума даплаты збору вылічваецца ў памеры 10 працэнтаў ад сумы такога перавышэння.

Падатковы орган вылічвае суму даплаты збору не пазней за дзень, які ідзе следам за днём завяршэння камеральнай праверкі па пытанні захавання заканадаўства аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці па патрабаванні падатковых органаў.

Даплата збору праводзіцца ў трыццацідзённы тэрмін з дня ўручэння плацельшчыку – фізічнай асобе паведамлення падатковага органа.

Паведамленне лічыцца ўручаным:

у дзень яго ўручэння асабіста плацельшчыку (яго прадстаўніку) пад подпіс;

пасля сканчэння дзесяці каляндарных дзён з дня накіравання яго па пошце лістом, адпраўкі праз асабісты кабінет плацельшчыка ці іншым электронным спосабам.

## ГЛАВА 40
## АДЗІНЫ ПАДАТАК НА ДАХОД, ПАСТАЎЛЕНЫ ЗА АБАВЯЗАК

### Артыкул 378. Плацельшчыкі адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак. Агульныя ўмовы прымянення адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак

1. Плацельшчыкамі адзінага падатку на даход, пастаўлены за абавязак (далей у гэтай главе – адзіны падатак), прызнаюцца арганізацыі, указаныя ў падпункце 2.1 пункта 2 артыкула 14 гэтага Кодэкса (далей у гэтай главе – арганізацыі), абавязаныя пачаць прымяненне адзінага падатку ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула і не спыніўшыя яго прымяненне ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула.

2. Пачаць прымяненне адзінага падатку абавязаныя арганізацыі:

2.1. якія ажыццяўляюць дзейнасць па аказанні паслуг па тэхнічным абслугоўванні і (ці) рамонце аўтамотатранспартных сродкаў і (ці) іх кампанентаў (далей у гэтай главе, калі не ўстаноўлена іншае, – паслугі па абслугоўванні і рамонце), у тым ліку раней спыніўшыя прымяненне адзінага падатку ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула (акрамя арганізацый, указаных у падпункце 2.2 гэтага пункта), – з 1-га чысла месяца, у якім арганізацыя аказвае паслугі па абслугоўванні і рамонце і за які спісачная колькасць работнікаў арганізацыі складае не больш за 15 чалавек;

2.2. якія раней спынілі прымяненне адзінага падатку ў адпаведнасці з падпунктам 3.1 пункта 3 гэтага артыкула і аднавілі (пачалі) ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце да сканчэння дванаццаці паслядоўных каляндарных месяцаў, якія ідуць непасрэдна следам за падатковым перыядам, у якім спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце, – з 1-га чысла месяца, які ідзе непасрэдна следам за падатковым перыядам, у якім раней спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце.

3. Прымяненне арганізацыямі адзінага падатку спыняецца:

3.1. з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за падатковым перыядам, у якім спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце на перыяд, не меншы за дванаццаць паслядоўных каляндарных месяцаў, што ідуць следам непасрэдна за падатковым перыядам, у якім спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце.

Пры гэтым у выпадку, калі апошнім днём ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце з'яўляецца апошні дзень падатковага перыяду, то такая дзейнасць лічыцца спыненай у гэтым падатковым перыядзе.

Прымяненне адзінага падатку спыняецца пры ўмове адлюстравання факта спынення дзейнасці арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку на даход, пастаўлены за абавязак, за падатковы перыяд, у якім спынена гэта дзейнасць.

У выпадку, калі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку за падатковы перыяд, у якім спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце, арганізацыя не адлюстравала факт спынення такой дзейнасці, любы наступны за ім падатковы перыяд, у якім арганізацыя не аказвала паслуг па абслугоўванні і рамонце і ў падатковай дэкларацыі (разліку) за які адлюстраваны ўказаны факт, з'яўляецца для мэт гэтай главы падатковым перыядам, у якім спынена дзейнасць арганізацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце.

Адлюстраванне факта спынення дзейнасці па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце не можа быць праведзена (анулявана):

у перыяд правядзення праверкі ў падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку за падатковы перыяд, які правяраецца;

у падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку за падатковы перыяд, які правяраецца;

3.2. з 1 студзеня года, што ідзе непасрэдна следам за годам, за які спісачная колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім складае больш за 15 чалавек.

4. Вылічэнне і аплата адзінага падатку праводзяцца за ўсе падатковыя перыяды пачынаючы з месяца, з якога ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула арганізацыя абавязана пачаць прымяненне адзінага падатку, да месяца (уключна), які папярэднічаў месяцу, з якога ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула спыняецца прымяненне адзінага падатку (далей у гэтай главе – перыяд прымянення адзінага падатку), незалежна ад спісачнай колькасці работнікаў арганізацыі і ажыццяўлення дзейнасці па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце.

Для разліку спісачнай колькасці работнікаў арганізацыі і сярэдняй колькасці работнікаў арганізацыі ў мэтах гэтай главы, а таксама для прымянення палажэнняў пунктаў 2 і 3 гэтага артыкула арганізацыя, рэарганізаваная ў форме пераўтварэння, і арганізацыя, якая ўзнікла ў выніку яе рэарганізацыі, прызнаюцца адной і той жа арганізацыяй.

5. Для мэт гэтай главы:

5.1. пад аўтамататранспартнымі сродкамі разумеюцца транспартныя сродкі, якія прыводзяцца ў рух рухавіком, прызначаныя для руху па дарогах і для перавозкі пасажыраў, грузаў і (ці) пастаўленага на іх абсталявання (аўтамабілі (у тым ліку аўтамабілі для буксіравання транспартных сродкаў, прычэпаў, паўпрычэпаў, прычэпаў-роспускаў), квадрацыклы, мотакаляскі, матацыклы, мотаролеры, мапеды, мотавеласіпеды, скутары), а таксама мотаўсюдыходы, квадрацыклы, трыцыклы, снегаходы, гоначныя аўтамабілі і матацыклы, прычэпы, паўпрычэпы, прычэпы-роспускі. Пры гэтым да аўтамататранспартных сродкаў не адносяцца колавыя трактары, самаходныя машыны, тралейбусы, трамваі;

5.2. пад кампанентамі аўтамататранспартнага сродку разумеюцца складовыя часткі канструкцыі (агрэгаты, вузлы і дэталі) аўтамататранспартнага сродку, дадзеныя для абслугоўвання і (ці) рамонту асобна ад аўтамататранспартнага сродку;

5.3. пад паслугамі па абслугоўванні і рамонце разумеюцца працы, якія адносяцца да аўтамататранспартных сродкаў і (ці) іх кампанентаў:

рэгламентныя працы (па відах тэхнічнага абслугоўвання, у тым ліку талонах сэрвіснай кніжкі);

змазачна-запраўвачныя працы (за выключэннем палівазапраўвачных);

кантрольна-дыягнастычныя працы (у тым ліку якія праводзяцца на прадмет адпаведнасці аўтамататранспартных сродкаў абавязковым патрабаванням бяспекі ў мэтах допуску да ўдзелу ў дарожным руху);

рэгуліровачныя працы;

уборачна-мыйныя працы (за выключэннем прац па мыйцы, паліроўцы лакафарбавага пакрыцця воскам (тэфлонам), уборцы, якія ажыццяўляюцца плацельшчыкамі, якія не аказваюць іншыя паслугі, што адносяцца ў адпаведнасці з гэтым падпунктам да паслуг па абслугоўванні і рамонце);

працы па перадпродажнай падрыхтоўцы;

паслугі па дыягностыцы няспраўнасцей;

кантрольна-назіральныя працы;

паслугі па замене і (ці) аднаўленні агрэгатаў, вузлоў і дэталяў (у тым ліку рухавікоў, каробак перадач, падвесак, рулявых кіраванняў, тармазных сістэм,

вядучых мастоў і прыводаў вядучых колаў, паліўнай апаратуры, электраабсталявання, шыб, кузаваў (кабін, рам, салонаў) і (ці) іх элементаў);

шынамантаж (уключаючы балансіроўку колаў, рамонт мясцовых пашкоджанняў дыскаў, шын і камер);

падрыхтоўка да афарбоўкі і (ці) афарбоўка;

установка дадатковага абсталявання;

іншыя паслугі (працы), якія ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-2012 «Класіфікатар прадукцыі па відах эканамічнай дзейнасці» класіфікуюцца ў класе 45.20 і катэгорыі 45.40.5;

5.4. пад абслугоўваючым аб'ектам арганізацыі разумеюцца капітальная пабудова (будынак, збудаванне), яе частка (у тым ліку ізаляванае памяшканне, яго частка, гаспадарчая пабудова), адкрытая пляцоўка, абсталяванне і іншыя аб'екты, якія знаходзяцца ва ўласнасці, гаспадарчым вядзенні, аператыўным кіраванні ці карыстанні арганізацыі, якія прызначаны і (ці) выкарыстоўваюцца для аказання паслуг па абслугоўванні і рамонце;

5.5. спісачная колькасць работнікаў арганізацыі за месяц вызначаецца як вылічаная ў парадку, устаноўленым Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь, спісачная колькасць работнікаў у сярэднім за месяц (за выключэннем работнікаў, якія знаходзяцца ў водпусках па цяжарнасці і родах, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзіцяці ва ўзросце да трох месяцаў або прызначэннем іх апекунамі, па доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад трох да шаснаццаці гадоў).

Пры вызначэнні спісачнай колькасці работнікаў у сярэднім за месяц, у якім ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыі, сума колькасці работнікаў спісачнага складу (за выключэннем работнікаў, якія знаходзяцца ў водпусках па цяжарнасці і родах, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзіцяці ва ўзросце да трох месяцаў або прызначэннем іх апекунамі, па доглядзе за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў, у сувязі з усынаўленнем (удачарэннем) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад трох да шаснаццаці гадоў) за ўсе дні працы арганізацыі ў гэтым месяцы дзеліцца на агульную колькасць дзён працы арганізацыі ў такім месяцы.

Для мэт часткі другой гэтага падпункта пад днямі працы арганізацыі разумеюцца каляндарныя дні месяца (уключаючы дні, якія з'яўляюцца выхаднымі днямі і (ці) нерабочымі дзяржаўнымі святамі (нерабочымі святочнымі днямі)) без уліку дзён, якія папярэднічаюць дню, у якім ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыі;

5.6. спісачная колькасць работнікаў арганізацыі ў сярэднім за год вызначаецца шляхам падсумоўвання спісачнай колькасці работнікаў арганізацыі за ўсе месяцы гэтага года і дзялення атрыманай сумы на 12 (на колькасць месяцаў такога года). Пры гэтым у разліку не ўдзельнічаюць месяцы (месяц), якія папярэднічаюць месяцу, у якім ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыі;

5.7. сярэдняя колькасць работнікаў за справаздачны месяц вызначаецца шляхам падсумоўвання вылічаных за гэты месяц у парадку, устаноўленым Нацыянальным статыстычным камітэтам Рэспублікі Беларусь:

спісачнай колькасці работнікаў арганізацыі ў сярэднім за месяц, вызначанай з улікам палажэнняў падпункта 5.5 гэтага пункта;

сярэдняй колькасці працуючых па сумяшчальніцтве з месцам асноўнай працы ў іншых наймальнікаў;

сярэдняй колькасці асоб, якія выконвалі працу па грамадзянска-прававых дагаворах (у тым ліку заключаных з юрыдычнымі асобамі, калі прадметам дагавору з'яўляецца аказанне паслугі па даванні, найме работнікаў). Пры гэтым пад справаздачным месяцам разумеецца падатковы перыяд, за які праводзяцца вылічэнне і аплата адзінага падатку;

5.8. разлік спісачнай колькасці і сярэдняй колькасці работнікаў праводзіцца ў цэлым па арганізацыі зыходзячы з колькасці ўсіх работнікаў (асоб), якія прымаюцца для разліку спісачнай колькасці і сярэдняй колькасці работнікаў у адпаведнасці з падпунктамі 5.5–5.7 гэтага пункта, у тым ліку тых, якія не ўдзельнічаюць у аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце.

6. У мэтах гэтай главы дзейнасць па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце прызнаецца дзейнасцю, якая ажыццяўляецца арганізацыяй, пры наяўнасці любой з наступных акалічнасцей:

6.1. паслугу па абслугоўванні і рамонце аказвае арганізацыя.

Пры гэтым паслуга прызнаецца паслугай, якая аказваецца, калі прыняты заказ (заяўка) на аказанне паслугі па абслугоўванні і рамонце і (ці) аўтамотатранспартны сродак (яго кампанент) дадзены для аказання такой паслугі або знаходзіцца (у тым ліку на часовым захоўванні) на тэрыторыі (уключаючы адкрытыя пляцоўкі) арганізацыі, якая аказвае паслугі, без дакументаў, якія пацвярджаюць іншую мэту, чым аказанне паслуг па абслугоўванні ці рамонце, да здзяйснення наступных фактаў:

аказанне паслуг па абслугоўванні і рамонце завершана;

дакументы, якія пацвярджаюць, што паслугі па абслугоўванні і рамонце аказаны, падпісаны заказчыкам і выканаўцам паслугі;

аўтамотатранспартны сродак (яго кампанент) перададзены заказчыку паслугі, а таксама вывезены (выехаў) з тэрыторыі (уключаючы адкрытыя пляцоўкі) арганізацыі, якая аказвае паслугі, у выпадку знаходжання на гэтай тэрыторыі (уключаючы адкрытыя пляцоўкі);

6.2. абслугоўваючы аб'ект арганізацыі функцыянуе. У прыватнасці, на абслугоўваючым аб'екце знаходзяцца работнік (работнікі) ці прадстаўнік арганізацыі, на якіх (якім) ускладзены абавязак (дадзена права) ажыццяўлення запісу на чаргу, і (ці) прыёму заказу (заяўкі) на аказанне паслуг па абслугоўванні і рамонце, і (ці) афармлення дакументаў, звязаных з аказаннем гэтых паслуг, і (ці) аказання паслуг па абслугоўванні і рамонце (часткі паслуг);

6.3. ажыццяўляюцца (у тым ліку па-за абслугоўваючым аб'ектам) па тэлефоне (сетцы Інтэрнэт) або ў прысутнасці заказчыка (яго прадстаўніка) прыём заказаў (заявак), і (ці) запіс на чаргу, і (ці) заключэнне дагавораў на аказанне паслуг па абслугоўванні і рамонце на абслугоўваючым аб'екце арганізацыі або па-за ім.

7. Абароты па рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце, аказаных плацельшчыкам адзінага падатку, не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць.

Палажэнні часткі першай гэтага пункта не прымяняюцца ў каляндарным годзе, калі па абаротах па рэалізацыі ў гэтым каляндарным годзе паслуг, указаных у частцы першай гэтага пункта, плацельшчыкам адзінага падатку прынята рашэнне вылічваць і аплачваць падатак на дабаўленую вартасць, адлюстраванае ў яго ўліковай палітыцы. Пры гэтым падатак на дабаўленую вартасць вылічваецца і аплачваецца на працягу

ўсяго перыяду прымянення адзінага падатку ў такім каляндарным годзе ў адносінах да ўсіх абаротаў па рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце.

8. Пры вызначэнні валавога прыбытку для мэт вылічэння падатку на прыбытак не ўлічваюцца:

выручка ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце за перыяд прымянення адзінага падатку;

затраты на вытворчасць і рэалізацыю гэтых паслуг (у тым ліку тыя, якія адносяцца да маёмасці, выкарыстанай пры аказанні такіх паслуг, а таксама ўскосныя затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў, размеркаваныя на аперацыі па аказанні такіх паслуг у парадку, устаноўленым падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 182 гэтага Кодэкса);

сумы адзінага падатку.

9. Плацельшчыкі адзінага падатку:

абавязаны забяспечыць раздзельны ўлік выручкі ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце і затрат па вытворчасці і рэалізацыі гэтых паслуг;

абавязаны размяркоўваць усе ўскосныя затраты на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных правоў на аперацыі па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце ў парадку, устаноўленым падпунктам 2.2 пункта 2 артыкула 182 гэтага Кодэкса;

не маюць права прымяняць асаблівыя рэжымы падаткаабкладання, прадугледжаныя главамі 32 і 34 гэтага Кодэкса, у перыяд прымянення адзінага падатку і да канца каляндарнага года, у якім яго прымяненне спынена.

10. Філіялы арганізацый – плацельшчыкаў адзінага падатку не маюць права вылічваць сумы падаткаў, збораў (пошлін) і выконваць падатковыя абавязацельствы гэтых арганізацый.

**Артыкул 379. Аб'ект падаткаабкладання адзінага падатку**

Аб'ектам падаткаабкладання адзінага падатку прызнаецца даход ад аказання паслуг па абслугоўванні і рамонце.

**Артыкул 380. Падатковая база адзінага падатку**

1. Падатковая база адзінага падатку вызначаецца як грашовае выражэнне даходу ад аказання паслуг па абслугоўванні і рамонце.

Даходам ад аказання паслуг па абслугоўванні і рамонце ў мэтах гэтай главы прызнаецца сума даходу, пастаўленага за абавязак, за падатковы перыяд і выручкі ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце за падатковы перыяд у памеры, які перавышае даход, пастаўлены за абавязак, за падатковы перыяд.

Даход, пастаўлены за абавязак, за падатковы перыяд вылічваецца як здабытак базавай даходнасці на аднаго работніка ў месяц і сярэдняй колькасці работнікаў арганізацыі за справаздачны месяц.

Пры гэтым базавая даходнасць на аднаго работніка ў месяц вызначаецца шляхам дзялення стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб, устаноўленай згодна з дадаткам 24 да гэтага Кодэкса для горада Мінска, пры ажыццяўленні віду дзейнасці, указанага ў падпункце 1.1.1 пункта 1 артыкула 337 гэтага Кодэкса, на каэфіцыент 0,1.

У выручку ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце ўключаецца кошт маёмасці (у тым ліку матэрыялаў, тэхнічных вадкасцей, камплектуючых, запасных

частак), выкарыстанай пры аказанні гэтых паслуг, за выключэннем належнай заказчыку і прынятай ад яго для аказання такіх паслуг.

Выручка ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце (у тым ліку пры бязвыплатным аказанні паслуг з уключэннем выкарыстанай пры іх аказанні маёмасці) вызначаецца ў парадку, устаноўленым для мэт вылічэння падатку на прыбытак, і адлюстроўваецца на дату, устаноўленую для мэт вылічэння такога падатку.

Сумы падатку на дабаўленую вартасць па абаротах па рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце, вылічаныя плацельшчыкам адзінага падатку ў сувязі з прынятым ім рашэннем, указаным у частцы другой пункта 7 артыкула 378 гэтага Кодэкса, а таксама вылічаныя ў адпаведнасці з падпунктам 7.1 пункта 7 артыкула 129 гэтага Кодэкса ў сувязі з іх залішнім прад'яўленнем, у выручку ад рэалізацыі паслуг па абслугоўванні і рамонце не ўключаюцца.

2. Для мэт вылічэння адзінага падатку абласныя (Мінскі гарадскі) Саветы дэпутатаў маюць права павялічваць (змяншаць), але не больш чым у два разы, базавую даходнасць на аднаго работніка ў месяц у адносінах да ўсёй тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і (ці) у залежнасці ад месца ажыццяўлення плацельшчыкам дзейнасці па аказанні паслуг па абслугоўванні і рамонце (населены пункт, па-за населеным пунктам, месца ажыццяўлення дзейнасці ў межах населенага пункта (цэнтр, ускраіна)).

Вылічэнне і аплата адзінага падатку зыходзячы з базавай даходнасці на аднаго работніка ў месяц, павялічанай (зменшанай) у адпаведнасці з рашэннямі абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў дэпутатаў, прынятымі згодна з часткай першай гэтага пункта (далей у гэтым артыкуле – рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў), праводзяцца з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім адпаведнае рашэнне ўступіла ў сілу.

У выпадку прыняцця рашэння мясцовага Савета дэпутатаў аб адмене раней устаноўленага павелічэння (змяншэння) базавай даходнасці ці аб павелічэнні (змяншэнні) базавай даходнасці ў іншым памеры вылічэнне і аплата адзінага падатку зыходзячы з раней устаноўленага павелічэння (змяншэння) базавай даходнасці спыняюцца з 1-га чысла месяца, што ідзе следам за месяцам, у якім указанае рашэнне ўступіла ў сілу.

Пры наяўнасці ў плацельшчыка абслугоўваючага аб'екта, што функцыянуе, адзіны падатак вылічваецца зыходзячы з базавай даходнасці на аднаго работніка ў месяц, вызначанай з улікам яе павелічэння (змяншэння), устаноўленага рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў на тэрыторыі, на якой знаходзіцца ўказаны аб'ект, калі іншае не ўстаноўлена часткай шостай гэтага пункта.

Пры адсутнасці ў плацельшчыка на працягу ўсяго падатковага перыяду абслугоўваючага аб'екта, што функцыянуе (у прыватнасці, калі аказанне паслуг па абслугоўванні і рамонце ажыццяўляецца з выездам да заказчыка (на месца знаходжання аўтамотатранспартнага сродку) ці дзейнасць па аказанні гэтых паслуг не ажыццяўляецца ў адным ці некалькіх падатковых перыядах), адзіны падатак за гэты падатковы перыяд вылічваецца з базавай даходнасці на аднаго работніка ў месяц, вызначанай з улікам яе павелічэння (змяншэння), устаноўленага рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў па месцы знаходжання плацельшчыка.

Пры наяўнасці ў плацельшчыка некалькіх абслугоўваючых аб'ектаў, якія функцыянуюць на працягу ўсяго або часткі падатковага перыяду, вылічэнне адзінага падатку праводзіцца зыходзячы з найбольшага памеру базавай даходнасці на аднаго

работніка ў месяц з памераў такой даходнасці, якія дзейнічаюць на тэрыторыях, на якіх знаходзяцца ўказаныя аб'екты, з улікам яе павелічэння (змяншэння), устаноўленага рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

3. Пры выяўленні падатковым або іншым кантрольным (наглядным) органам факта аказання арганізацыяй – плацельшчыкам адзінага падатку паслуг па абслугоўванні і рамонце з прыцягненнем да іх аказання асоб (асобы), якія не знаходзяцца з арганізацыяй у працоўных (грамадзянска-прававых) адносінах, або пры выяўленні ўказаным органам асоб (асобы), якія не знаходзяцца ў такіх адносінах, але ажыццяўляюць запіс на чаргу і (ці) прыём заказаў (заявак) на аказанне арганізацыяй – плацельшчыкам адзінага падатку паслуг па абслугоўванні і рамонце і (ці) афармляюць дакументы, звязаныя з аказаннем арганізацыяй – плацельшчыкам адзінага падатку гэтых паслуг, падатковая база, вылічаная ў парадку, устаноўленым пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, павялічваецца на суму, атрыманую як здабытак базавай даходнасці на аднаго работніка ў месяц, вызначанай у адпаведнасці з пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, колькасці ўказаных асоб і каэфіцыента тры.

Пры гэтым павелічэнне падатковай базы праводзіцца з пачатку перыяду прымянення адзінага падатку ў каляндарным годзе, да якога адносіцца факт, названы ў частцы першай гэтага пункта, па месяц (уключна), да якога адносіцца такі факт, калі да сканчэння гэтага месяца з усімі асобамі, указанымі ў частцы першай гэтага пункта, заключаны адпаведны працоўны ці грамадзянска-прававы дагавор.

У іншым выпадку павелічэнне падатковай базы праводзіцца па апошні месяц (уключна) каляндарнага года, да якога адносіцца факт, названы ў частцы першай гэтага пункта.

### Артыкул 381. Стаўка, падатковы перыяд, парадак вылічэння, тэрміны падачы падатковых дэкларацый (разлікаў) і аплаты адзінага падатку

1. Стаўка адзінага падатку ўстанаўліваецца ў памеры пяць (5) працэнтаў.

2. Падатковым перыядам адзінага падатку прызнаецца каляндарны месяц.

3. Сума адзінага падатку вылічваецца як здабытак падатковай базы і стаўкі адзінага падатку.

4. Плацельшчыкі падаюць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю (разлік) па адзіным падатку не пазней за 20-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

5. Аплата адзінага падатку праводзіцца не пазней за 22-е чысло месяца, які ідзе следам за мінулым падатковым перыядам.

# РАЗДЗЕЛ VIII
# ПАДАТКААБКЛАДАННЕ АСОБНЫХ КАТЭГОРЫЙ ПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ

## ГЛАВА 41
## АСАБЛІВАСЦІ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ Ў СВАБОДНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ ЗОНАХ

### Артыкул 382. Агульныя ўмовы прымянення асаблівасцей падаткаабкладання ў свабодных эканамічных зонах

1. Асаблівасці падаткаабкладання ў свабодных эканамічных зонах (далей – СЭЗ) прымяняюцца ў адносінах да арганізацый, зарэгістраваных адміністрацыяй СЭЗ у якасці рэзідэнтаў СЭЗ у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб СЭЗ.

2. Рэзідэнты СЭЗ у адносінах да падаткаў, збораў (пошлін) карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, устаноўленыя гэтым Кодэксам для плацельшчыкаў падаткаў, збораў (пошлін) і (ці) іншых абавязаных асоб, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных актамі заканадаўства, якія рэгламентуюць дзейнасць СЭЗ, і мытным заканадаўствам Мытнага саюза, а таксама Законам Рэспублікі Беларусь «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь», міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, устаноўленыя гэтым Кодэксам, калі іншае не прадугледжана пунктамі 4 і 5 артыкула 383 гэтага Кодэкса, распаўсюджваюцца на рэалізацыю рэзідэнтамі СЭЗ:

3.1. за межы Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам у адпаведнасці з заключанымі паміж імі дагаворамі тавараў (прац, паслуг) уласнай вытворчасці, вырабленых гэтымі рэзідэнтамі на тэрыторыі СЭЗ.

Прымяненне асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ у выпадку, указаным у частцы першай гэтага падпункта, ажыццяўляецца пры ўмове наяўнасці:

дагавора, заключанага паміж рэзідэнтам СЭЗ і замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобай, на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя тавараў (прац, паслуг);

дакументаў, якія пацвярджаюць рэалізацыю і вываз тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (мытныя дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з заяўленымі мытнымі працэдурамі, транспартныя (таварасуправаджальныя) і іншыя дакументы), выкананне прац, аказанне паслуг (акты выкананых прац, акты аб аказанні паслуг і іншыя дакументы ў залежнасці ад характару выкананых прац, аказаных паслуг), і дакументаў, якія пацвярджаюць вываз вынікаў прац за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3.2. за межы Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам тавараў уласнай вытворчасці, вырабленых імі на тэрыторыі СЭЗ, у выпадку, калі такая рэалізацыя ажыццёўлена на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў, заключаных гэтымі рэзідэнтамі СЭЗ, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі зарэгістраванага ў Рэспубліцы Беларусь холдынга, з камісіянерам (паверaным), іншай аналагічнай асобай, якая з'яўляецца ўдзельнікам гэтага ж холдынга (далей у гэтым падпункце – камісіянер – удзельнік холдынга).

Да ўказанага ў частцы першай гэтага падпункта камісіянера – удзельніка холдынга не адносяцца нерэзідэнты Рэспублікі Беларусь і рэзідэнты СЭЗ.

Прымяненне асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ у выпадку, указаным у частцы першай гэтага падпункта, ажыццяўляецца пры ўмове наяўнасці:

дагавора камісіі, даручэння ці іншага аналагічнага грамадзянска-прававога дагавора, заключанага паміж рэзідэнтам СЭЗ і камісіянерам – удзельнікам холдынга;

копіі дагавора, заключанага камісіянерам – удзельнікам холдынга з пакупніком – замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобай, у адпаведнасці з якім рэалізаваны тавары;

транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў рэзідэнтам СЭЗ камісіянеру – удзельніку холдынга (пры наяўнасці такой адгрузкі);

копій транспартных (таварасуправаджальных) дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку тавараў пакупнікам – замежным юрыдычным ці фізічным асобам;

копій дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (мытныя дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з заяўленымі мытнымі працэдурамі, транспартныя (таварасуправаджальныя) і іншыя дакументы);

справаздачы камісіянера – удзельніка холдынга аб выкананні даручэння (пры яе наяўнасці);

копіі пасведчання аб рэгістрацыі холдынга з пералікам удзельнікаў холдынга, які пацвярджае ўключэнне камісіянера – удзельніка холдынга і рэзідэнта СЭЗ у якасці ўдзельнікаў аднаго холдынга;

3.3. за межамі Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам у адпаведнасці з заключанымі паміж імі дагаворамі тавараў уласнай вытворчасці, вырабленых гэтымі рэзідэнтамі на тэрыторыі СЭЗ.

Прымяненне асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ у выпадку, указаным у частцы першай гэтага падпункта, ажыццяўляецца пры ўмове наяўнасці:

дагавора, заключанага паміж рэзідэнтам СЭЗ і замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобай, на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя тавараў;

дагавора, які прадугледжвае захоўванне тавараў на тэрыторыі замежнай дзяржавы і (ці) удзел тавараў у выстаўках-кірмашах, якія праводзяцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы, заключанага рэзідэнтам СЭЗ з замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобай, якая аказвае паслугі па захоўванні тавараў і (ці) арганізацыі ўдзелу рэзідэнта СЭЗ у выстаўцы-кірмашы;

дакументаў, якія пацвярджаюць вываз тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (мытныя дэкларацыі на тавары, выпушчаныя ў адпаведнасці з заяўленымі мытнымі працэдурамі, транспартныя (таварасуправаджальныя) і іншыя дакументы);

таварнай накладной, выпісанай рэзідэнтам СЭЗ на адрас пакупніка – замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобы, і дакументаў, якія пацвярджаюць адгрузку (водпуск) тавараў рэзідэнта СЭЗ пакупніку – замежнай юрыдычнай ці фізічнай асобе з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежнай дзяржавы ці з выстаўкі-кірмашу, якая праводзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы;

3.4. тавараў (прац, паслуг) уласнай вытворчасці, якія выраблены імі на тэрыторыі СЭЗ, іншым рэзідэнтам СЭЗ згодна з заключанымі з імі дагаворамі.

Прымяненне асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ у выпадку, указаным у частцы першай гэтага падпункта, ажыццяўляецца пры ўмове наяўнасці:

дагавора, заключанага паміж рэзідэнтамі СЭЗ, на падставе якога ажыццяўляецца рэалізацыя тавараў (прац, паслуг);

дакументаў, якія пацвярджаюць рэалізацыю тавараў (таварна-транспартныя накладныя і (ці) іншыя дакументы), выкананне прац, аказанне паслуг (акты выкананых прац, акты аб аказанні паслуг і іншыя дакументы ў залежнасці ад характару выкананых прац, аказаных паслуг);

копіі пасведчання аб рэгістрацыі, выдадзенага адміністрацыяй СЭЗ, якое пацвярджае рэгістрацыю юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка ў якасці рэзідэнта СЭЗ, якому рэалізуюцца тавары (працы, паслугі). Копія пасведчання павінна быць засведчана подпісам кіраўніка (упаўнаважанай ім асобы) такой юрыдычнай асобы, подпісам указанага індывідуальнага прадпрымальніка (упаўнаважанай ім асобы).

4. Для прымянення асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ, устаноўленых гэтым Кодэксам:

тавары (працы, паслугі) павінны з'яўляцца таварамі (працамі, паслугамі) уласнай вытворчасці рэзідэнта СЭЗ, які ажыццяўляе іх рэалізацыю (у тым ліку на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў у адпаведнасці з падпунктам 3.2 пункта 3 гэтага артыкула), і павінны быць выраблены (выкананы, аказаны) ім на тэрыторыі СЭЗ, рэзідэнтам якой ён з'яўляецца;

копія сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці (сертыфіката прац і паслуг уласнай вытворчасці), выдадзенага ва ўстаноўленым парадку, павінна быць пададзена рэзідэнтам СЭЗ у падатковы орган па месцы пастаноўкі яго на ўлік.

5. Асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, установленыя гэтым Кодэксам, калі іншае не прадугледжана пунктамі 4 і 5 артыкула 383 гэтага Кодэкса, не распаўсюджваюцца на:

грамадскае харчаванне, дзейнасць у сферы ігральнага бізнесу, дзейнасць па арганізацыі і правядзенні электронных інтэрактыўных гульняў, аперацыі з каштоўнымі паперамі;

рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), вытворчасць (выкананне, аказанне) якіх ажыццяўляецца поўнасцю ці часткова з выкарыстаннем асноўных сродкаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці ці іншым рэчавым праве рэзідэнта СЭЗ, і (ці) працы работнікаў рэзідэнта СЭЗ па-за яе тэрыторыяй.

Асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ не распаўсюджваюцца на банкі і страхавыя арганізацыі.

6. Для мэт гэтай главы:

пад рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ за межы Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам тавараў разумеецца адчужэнне тавараў рэзідэнтам СЭЗ (у тым ліку на падставе дагавораў камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагавораў у адпаведнасці з падпунктам 3.2 пункта 3 гэтага артыкула) замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам з вывазам тавараў за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

пад рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ за межы Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам прац (паслуг) разумеецца выкананне прац, аказанне паслуг рэзідэнтам СЭЗ для замежных юрыдычных і (ці) фізічных асоб пры ўмове, што вынікі гэтых прац вывозяцца за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а паслугі спажываюцца ўказанымі асобамі за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ за межы (за граніцамі) Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам у адпаведнасці з заключанымі паміж імі дагаворамі тавараў (прац, паслуг), а таксама рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ тавараў (прац, паслуг) іншым рэзідэнтам СЭЗ згодна з заключанымі з імі дагаворамі не з'яўляецца рэалізацыя рэзідэнтам СЭЗ тавараў (прац, паслуг) па дагаворах камісіі, даручэння ці іншых аналагічных грамадзянска-прававых дагаворах;

пад рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ за межамі Рэспублікі Беларусь замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам тавараў разумеецца адчужэнне рэзідэнтам СЭЗ замежным юрыдычным і (ці) фізічным асобам тавараў, вывезеных за межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь да заключэння рэзідэнтам СЭЗ дагавора з указанымі асобамі, на падставе якога ажыццяўляецца іх рэалізацыя, з адгрузкай (водпускам) тавараў з месцаў захоўвання на тэрыторыі замежных дзяржаў і (ці) з выставак-кірмашоў, якія праводзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаў;

пад рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ прац і паслуг уласнай вытворчасці разумеецца рэалізацыя рэзідэнтам СЭЗ прац і паслуг уласнай вытворчасці, дата якой прыпадае

на перыяд дзеяння сертыфіката прац і паслуг уласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку;

пад рэалізацыяй рэзідэнтам СЭЗ тавараў уласнай вытворчасці разумеецца рэалізацыя рэзідэнтам СЭЗ тавараў уласнай вытворчасці, дата вырабу якіх прыпадае на перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку. Для мэт гэтага абзаца рэзідэнт СЭЗ забяспечвае вядзенне раздзельнага ўліку аб'ёмаў тавараў уласнай вытворчасці, выробленых у перыяд дзеяння сертыфіката прадукцыі ўласнай вытворчасці;

дата рэалізацыі вызначаецца ў адносінах да кожнага падатку, збору (пошліны) у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

у адносінах да кожнага падатку, збору (пошліны) выкарыстоўваецца паняцце тавараў (прац, паслуг), вызначанае для яго гэтым Кодэксам.

7. Асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ прымяняюцца рэзідэнтам СЭЗ не раней чым з 1-га чысла месяца, які ідзе следам за месяцам рэгістрацыі яго ў якасці рэзідэнта СЭЗ.

8. Рэзідэнты СЭЗ абавязаны забяспечыць раздзельны ўлік выручкі (даходаў), затрат (расходаў), сум, якія ўдзельнічаюць пры вызначэнні падатковай базы па падатках, зборах (пошлінах) па дзейнасці, на якую распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ. Пры адсутнасці раздзельнага ўліку ўказаных выручкі (даходаў), затрат (расходаў) і сум вылічэнне і аплата падаткаў, збораў (пошлін) праводзяцца рэзідэнтамі СЭЗ без прымянення асаблівасцей падаткаабкладання ў СЭЗ.

Размеркаванне прамых затрат, якія адносяцца да тавараў уласнай вытворчасці аднаго найменні, паміж аперацыямі па іх рэалізацыі, на якія распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, і аперацыямі па іх рэалізацыі, на якія не распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, можа праводзіцца прапарцыянальна сумам выручкі, атрыманай па адпаведных аперацыях.

Для мэт часткі другой гэтага пункта:

указанае размеркаванне павінна быць прадугледжана ва ўліковай палітыцы рэзідэнта СЭЗ і праводзіцца з пачатку і да заканчэння адпаведнага каляндарнага года;

для разліку прапорцыі кожная з сум выручкі змяншаецца на сумы падаткаў, якія вылічваюцца з адпаведнай выручкі.

Затраты, якія адносяцца выключна да тавараў, на рэалізацыю якіх распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, не ўлічваюцца ў якасці затрат, якія адносяцца на тавары, на рэалізацыю якіх не распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ.

**Артыкул 383. Асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ**

1. Рэзідэнты СЭЗ:

1.1. вылічваюць і аплачваюць у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, законамі Рэспублікі Беларусь і (ці) актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза:

падатак на прыбытак, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 3 гэтага артыкула;

падатак на дабаўленую вартасць;

акцызы;

падатак на нерухомасць, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 4 гэтага артыкула;

экалагічны падатак;

падатак за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў;
зямельны падатак, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 5 гэтага артыкула;
дзяржаўную пошліну;
патэнтныя пошліны;
афшорны збор;
гербавы збор;
мытныя пошліны;
мытныя зборы;
утылізацыйны збор;
мясцовыя падаткі і зборы;

1.2. выконваюць абавязкі падатковых агентаў, у тым ліку абавязкі вылічваць, утрымліваць і пералічваць пры выплаце (налічэнні) заработнай платы і іншых даходаў падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

2. Пры ўстанаўленні іншых падаткаў, збораў (пошлін) абавязак іх аплачваць па дзейнасці, на якую распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, ускладаецца на яе рэзідэнтаў шляхам унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў у пункт 1 гэтага артыкула.

3. Прыбытак рэзідэнтаў СЭЗ, атрыманы ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) уласнай вытворчасці, вызваляецца ад падатку на прыбытак.

4. Рэзідэнты СЭЗ вызваляюцца ад падатку на нерухомасць:

4.1. на працягу трох гадоў, якія падлічваюцца пачынаючы з квартала, на які прыпадае дата рэгістрацыі арганізацыі ў якасці рэзідэнта СЭЗ па аб'ектах падаткаабкладання гэтым падаткам, размешчаных на тэрыторыі адпаведных СЭЗ, набытых (узнікшых) ва ўказаны трохгадовы перыяд, незалежна ад напрамку іх выкарыстання, калі іншае не ўстаноўлена часткай другой гэтага падпункта. Пры гэтым ільгота даецца пачынаючы з квартала, у якім набыты (узнік) аб'ект падаткаабкладання падатку на нерухомасць.

Льгота, прадугледжаная часткай першай гэтага падпункта, не распаўсюджваецца на аб'екты падаткаабкладання падаткам на нерухомасць, узятыя і (ці) здадзеныя (перададзеныя) рэзідэнтам СЭЗ у арэнду (фінансавую арэнду (лізінг)), іншае аплатнае ці бязвыплатнае карыстанне;

4.2. па аб'ектах падаткаабкладання гэтым падаткам, размешчаных на тэрыторыі адпаведных СЭЗ, незалежна ад напрамку іх выкарыстання. Льгота, прадугледжаная гэтым падпунктам, даецца ў квартале, калі ў квартале, які непасрэдна папярэднічае яму, рэзідэнтам СЭЗ ажыццяўлялася рэалізацыя тавараў (прац, паслуг), на якую распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ.

5. Вызваляюцца ад зямельнага падатку:

5.1. зямельныя ўчасткі рэзідэнтаў СЭЗ, размешчаныя ў межах СЭЗ і дадзеныя ім пасля рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў СЭЗ для будаўніцтва аб'ектаў (за выключэннем зямельных участкаў, дадзеных у часовае карыстанне і своечасова не вернутых у адпаведнасці з заканадаўствам), з 1-га чысла месяца, на які прыпадае дата ўказанай рэгістрацыі, па месяц (уключна), у якім прыняты ў эксплуатацыю апошні з аб'ектаў, для будаўніцтва якіх дадзены зямельны ўчастак, але не больш за пяць гадоў, якія падлічваюцца з месяца, на які прыпадае дата рэгістрацыі ў якасці рэзідэнта СЭЗ.

Льгота, прадугледжаная часткай першай гэтага падпункта, дзейнічае незалежна ад палажэнняў пункта 3 артыкула 239 гэтага Кодэкса;

5.2. зямельныя ўчасткі рэзідэнтаў СЭЗ незалежна ад іх мэтавага прызначэння, размешчаныя ў межах СЭЗ (за выключэннем зямельных участкаў, дадзеных у часовае

карыстанне і своечасова не вернутых у адпаведнасці з заканадаўствам, самавольна занятых).

Льгота, прадугледжаная часткай першай гэтага падпункта, даецца з 1-га чысла першага месяца па апошняе чысло трэцяга месяца квартала, калі ў квартале, які непасрэдна папярэднічае яму, рэзідэнтам СЭЗ ажыццяўлялася рэалізацыя тавараў (прац, паслуг), на якую распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ, і дзейнічае незалежна ад палажэнняў пункта 3 артыкула 239 гэтага Кодэкса.

6. Прыбытак, які вызваляецца ад падатку на прыбытак у адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула, вызначаецца на працягу падатковага перыяду нарастаючым вынікам як сума прыбытку і страт, атрыманых з пачатку падатковага перыяду ад дзейнасці, на якую распаўсюджваюцца асаблівасці падаткаабкладання ў СЭЗ.

Прыбытак ад рэалізацыі асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, маёмасных правоў і пазарэалізацыйныя даходы, якія прызнаюцца гэтакімі гэтым Кодэксам для мэт вылічэння падатку на прыбытак, у тым ліку ад аперацый па здачы ў арэнду (перадачы ў фінансавую арэнду (лізінг)) маёмасці, не ўлічваюцца ў складзе прыбытку, які вызваляецца ад падатку на прыбытак у адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула.

## ГЛАВА 42
## ПАДАТКААБКЛАДАННЕ СЯЛЯНСКІХ (ФЕРМЕРСКІХ) ГАСПАДАРАК, КАЛЕГІЙ АДВАКАТАЎ, АДВАКАЦКІХ БЮРО, БЕЛАРУСКАЙ НАТАРЫЯЛЬНАЙ ПАЛАТЫ І ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ СТРУКТУР, ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ, ІНШЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

### Артыкул 384. Падаткаабкладанне сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак

1. Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі на працягу трох гадоў з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў частцы вытворчасці прадукцыі раслінаводства (акрамя кветак і дэкаратыўных раслін), жывёлагадоўлі (акрамя пушнога звераводства), рыбаводства і пчалаводства вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі на працягу тэрміну і ў частцы дзейнасці, указанай у пункце 1 гэтага артыкула, не вызваляюцца ад мытных плацяжоў, падатку на дабаўленую вартасць і акцызаў, якія спаганяюцца падатковымі органамі пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, ад абавязку вылічыць і пералічыць у бюджэт падатак на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 114 гэтага Кодэкса, а таксама ад абавязкаў падатковых агентаў, у тым ліку ад абавязку ўтрымліваць пры выплаце заработнай платы і іншых даходаў з сум, якія налічваюцца (пералічваюцца), падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул 385. Падаткаабкладанне калегій адвакатаў, адвакацкіх бюро, Беларускай натарыяльнай палаты і яе арганізацыйных структур

1. Калегіі адвакатаў, адвакацкія бюро, Беларуская натарыяльная палата і яе арганізацыйныя структуры, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам, за выключэннем дзяржаўнай пошліны.

Плацельшчыкі, указаныя ў частцы першага гэтага артыкула, вызваляюцца ад дзяржаўнай пошліны ў выпадках, устаноўленых артыкулам 285 гэтага Кодэкса, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Калегіі адвакатаў, адвакацкія бюро не вызваляюцца ад мытных плацяжоў, мясцовых падаткаў і збораў, а таксама ад абавязкаў падатковых агентаў, у тым ліку ад абавязку ўтрымліваць пры выплаце заработнай платы і іншых даходаў з сум, якія налічваюцца (пералічваюцца), падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. Беларуская натарыяльная палата і яе арганізацыйныя структуры не вызваляюцца ад мытных плацяжоў, мясцовых падаткаў і збораў, а таксама ад абавязкаў падатковых агентаў, у тым ліку ад абавязку ўтрымліваць пры выплаце даходаў натарыусам, якія ажыццяўляюць натарыяльную дзейнасць у натарыяльных канторах, заработнай платы работнікам, а таксама іншых даходаў з сум, якія налічваюцца (пералічваюцца), падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул 386. Падаткаабкладанне дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый

1. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь і яго структурныя падраздзяленні вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін, за выключэннем мытных), устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іх тэрытарыяльныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя (падсправаздачныя) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, іх тэрытарыяльныя органы, мытні, Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь, тэрытарыяльныя пракуратуры, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і іх структурныя падраздзяленні, суды вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам, пры ўмове поўнага пералічэння атрыманых сродкаў у бюджэт, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Арганізацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ці ўваходзяць у склад (сістэму) дзяржаўных органаў, органы і падраздзяленні, у тым ліку воінскія часці, арганізацыі, падпарадкаваныя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (за выключэннем навуковых арганізацый), якія фінансуюцца з бюджэту, вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам, пры ўмове, што атрыманыя сродкі падлягаюць у поўным аб'ёме залічэнню ў даходы адпаведных бюджэтаў у кошт кампенсацыі іх расходаў.

4. Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, галоўныя кіраўніцтвы юстыцыі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь вызваляюцца ад падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам, у адносінах да грашовых сродкаў, якія атрымліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам пры прымусовым здзяйсненні дзеянняў па маёмасных спагнаннях і па патрабаваннях, якія маюць немаёмасны характар.

5. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь і яго структурныя падраздзяленні не вызваляюцца ад абавязкаў падатковых агентаў, у тым ліку ад абавязку ўтрымліваць пры выплаце заработнай платы і іншых даходаў з сум, якія налічваюцца (пералічваюцца), падаткі, зборы (пошліны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

6. Грашовыя сродкі, якія атрымліваюцца:

бюджэтнымі арганізацыямі (уключаючы дзяржаўныя органы) у выглядзе міжнароднай тэхнічнай і замежнай бязвыплатнай дапамогі;

Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь ад заявачных узносаў замежных удзельнікаў міжнародных спартыўных мерапрыемстваў;

Дэпартаментам па матэрыяльных рэзервах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь ад выпуску і запазычання матэрыяльных каштоўнасцей мабілізацыйнага матэрыяльнага рэзерву, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, а таксама ад штрафаў і пеняў за парушэнне патрабаванняў заканадаўства па аперацыях з гэтымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі ў аб'ёмах, неабходных для фінансавання аперацый з матэрыяльнымі каштоўнасцямі мабілізацыйнага матэрыяльнага рэзерву;

Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі (Дзелавым і культурным комплексам, у тым ліку гаспадарча-адміністрацыйным аб'яднаннем) ад ажыццяўлення дзейнасці, якая прыносіць даходы, – застаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам у іх распараджэнні, не абкладаюцца падаткамі, зборамі (пошлінамі).

7. Маёмасць, у тым ліку грашовыя сродкі, якая набываецца пры ажыццяўленні аператыўна-вышуковай дзейнасці органамі, упаўнаважанымі ажыццяўляць указаную дзейнасць, за выключэннем выпадкаў, калі парадак распараджэння такой маёмасцю, у тым ліку грашовымі сродкамі, вызначаецца судом, не абкладаецца падаткамі, зборамі (пошлінамі).

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. Лукашэнка**

Дадатак 1
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі акцызаў на падакцызныя тавары**

| Найменне тавараў* | Код адзінай Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза | Адзінка падаткаабкладання | Стаўкі акцызаў, рублёў за адзінку падаткаабкладання | |
|---|---|---|---|---|
| | | | з 1 студзеня па 30 чэрвеня | з 1 ліпеня па 31 снежня |
| 1. Спірт: | з 2207, з 2208 90 910 0, з 2208 90 990 0 | | | |
| 1.1. этылавы з харчовай сыравіны, спірт сінтэтычны, спірт этылавы дэнатураваны | | 1 літр бязводнага (стопрацэнтнага) этылавага спірту, які змяшчаецца ў гатовай прадукцыі | 4,77 | 4,77 |
| 1.2. этылавы сырэц з харчовай сыравіны, адпушчаны арганізацыям Рэспублікі Беларусь для вытворчасці спірту этылавага рэктыфікаванага | | 1 літр гатовай прадукцыі | 0,00 | 0,00 |
| 1.3. этылавы рэктыфікаваны з харчовай сыравіны, адпушчаны арганізацыям Рэспублікі Беларусь для вытворчасці алкагольнай прадукцыі, воцату і слабаалкагольных напояў | | » | 0,00 | 0,00 |
| 1.4. этылавы рэктыфікаваны тэхнічны | | 1 літр бязводнага (стопрацэнтнага) этылавага спірту, які змяшчаецца ў гатовай прадукцыі | 0,03 | 0,03 |
| 2. Алкагольная прадукцыя з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш (за выключэннем спіртоў, він пладовых мацаваных марачных, палепшанай якасці | з 2204, з 2205, з 2206 00, з 2208 | » | 14,04 | 14,04 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| і спецыяльнай тэхналогіі, він фруктова-ягадных натуральных, він натуральных, у тым ліку пеністых, шампанскіх, газіраваных і шыпучых, сідру, піва і піўнога кактэйлю, спіртазмяшчальных раствораў) | | | | |
| 3. Віны пладовыя мацаваныя марачныя, палепшанай якасці і спецыяльнай тэхналогіі | з 2206 00 | 1 літр бязводнага (стопрацэнтнага) этылавага спірту, які змяшчаецца ў гатовай прадукцыі | 11,46 | 11,46 |
| 4. Віны фруктова-ягадныя натуральныя, сідры фруктова-ягадныя | з 2206 00, з 2208 | 1 літр гатовай прадукцыі | 0,15 | 0,15 |
| 5. Віны натуральныя, у тым ліку пеністыя, шампанскія, газіраваныя і шыпучыя | з 2204, з 2205, з 2206 00 | » | 0,90 | 0,90 |
| 6. Слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту большай за 1,2 працэнты і меншай за 7 працэнтаў (слабаалкагольныя натуральныя напоі, іншыя слабаалкагольныя напоі), віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў, сідры (за выключэннем фруктова-ягадных): | з 2204, з 2206 00, з 2208 90 | | | |
| 6.1. слабаалкагольныя натуральныя напоі | | 1 літр бязводнага (стопрацэнтнага) этылавага спірту, які змяшчаецца ў гатовай прадукцыі | 11,76 | 11,76 |
| 6.2. іншыя слабаалкагольныя напоі, віны з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2 працэнта да 7 працэнтаў | | » | 20,59 | 20,59 |
| 6.3. сідры (за выключэннем сідраў фруктова-ягадных) | | 1 літр гатовай прадукцыі | 0,49 | 0,49 |
| 7. Піва, піўны кактэйль: | | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7.1. піва з нарматыўнай (стандартызаванай) колькасцю аб'ёмнай долі этылавага спірту да 0,5 працэнта ўключна | з 2202 91 000 0 | 1 літр гатовай прадукцыі | 0,00 | 0,00 |
| 7.2. піва з нарматыўнай (стандартызаванай) колькасцю аб'ёмнай долі этылавага спірту большай за 0,5 працэнта да 7 працэнтаў | з 2203 00 | » | 0,35 | 0,35 |
| 7.3. піва з нарматыўнай (стандартызаванай) колькасцю аб'ёмнай долі этылавага спірту 7 працэнтаў і большай | з 2203 00 | » | 0,74 | 0,74 |
| 7.4. піўны кактэйль | з 2203 00, з 2206 00 | » | 0,35 | 0,35 |
| 8. Спіртазмяшчальная прадукцыя: | з 1302 19, з 2101, з 2307 00, з 2308 00, з 2403 99 900 9 | | | |
| 8.1. з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і большай, за выключэннем адпушчанай арганізацыям Рэспублікі Беларусь для вытворчасці безалкагольных напояў | | 1 літр бязводнага (стопрацэнтнага) этылавага спірту, які змяшчаецца ў гатовай прадукцыі | 20,59 | 20,59 |
| 8.2. з аб'ёмнай доляй этылавага спірту да 7 працэнтаў, а таксама з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і большай, адпушчаная арганізацыям Рэспублікі Беларусь для вытворчасці безалкагольных напояў | | 1 літр гатовай прадукцыі | 0,00 | 0,00 |
| 9. Тытунёвыя вырабы: | | | | |
| 9.1. тытунь люлькавы, курыльны | з 2403 11 000 0, з 2403 19 | 1 кілаграм | 88,30 | 92,31 |
| 9.2. прызначаныя для спажывання шляхам награвання | з 2403 | 1 кілаграм тытунёвай сумесі (награвальнага тытуню) | 116,76 | 116,76 |
| 9.3. цыгары | з 2402 10 000 0 | 1 штука | 5,15 | 5,38 |
| 9.4. сігарылы | з 2402 10 000 0 | 1000 штук | 76,79 | 80,28 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9.5. цыгарэты з фільтрам пры рознічнай цане (па групах): | з 2402 20 | | | |
| 9.5.1. з 1 студзеня па 30 чэрвеня да 100 рублёў (I група) | | » | 20,71 | |
| з 1 ліпеня па 31 снежня да 102,5 рубля (I група) | | | | 21,65 |
| 9.5.2. з 1 студзеня па 30 чэрвеня ад 100 да 140 рублёў (II група) | | » | 52,21 | |
| з 1 ліпеня па 31 снежня ад 102,5 да 145 рублёў (II група) | | | | 54,58 |
| 9.5.3. з 1 студзеня па 30 чэрвеня ад 140 рублёў (III група) | | 1000 штук | 59,86 | |
| з 1 ліпеня па 31 снежня ад 145 рублёў (III група) | | | | 62,58 |
| 9.6. цыгарэты без фільтра, папяросы | з 2402 20 | » | 15,94 | 16,66 |
| 10. Аўтамабільны бензін**: | з 2710 | | | |
| 10.1. не адпаведны класу 5 | | 1 тона | 435,08 | 435,08 |
| 10.2. класа 5 | | » | 252,59 | 252,59 |
| 11. Дызельнае паліва: | з 2710 | | | |
| 11.1. дызельнае паліва**: | | » | | |
| 11.1.1. не адпаведнае класу 5 | | » | 187,05 | 187,05 |
| 11.1.2. класа 5 | | » | 138,33 | 138,33 |
| 11.2. дызельнае паліва, адгружанае (адпушчанае) для вытворчасці дызельнага паліва з метылавымі эфірамі тлустых кіслот | | » | 0,00 | 0,00 |
| 12. Дызельнае паліва з метылавымі эфірамі тлустых кіслот | з 2710, з 3826 00 | 1 тона | 42,46 | 42,46 |
| 13. Суднавае паліва | з 2710 | » | 182,60 | 182,60 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 14. Газ вуглевадародны звадкаваны, які выкарыстоўваецца ў якасці аўтамабільнага паліва: | з 2711 | | | |
| 14.1. маркі ПБА, ПА | | 1000 літраў | 28,71 | 28,71 |
| 14.2. маркі ПТ, БТ і іншых марак | | » | 54,21 | 54,21 |
| 15. Газ прыродны паліўны кампрыміраваны, які выкарыстоўваецца ў якасці аўтамабільнага паліва | з 2711 | 1000 куб. метраў | 54,21 | 54,21 |
| 16. Маслы маторныя, уключаючы маслы (вадкасці), прызначаныя для прамыўкі (ачысткі ад адкладанняў) масленых сістэм рухавікоў унутранага згарання | з 2710, з 3403 | 1 тона | 367,95 | 367,95 |

* Пры прымяненні ставак акцызаў у адносінах да ўвезеных падакцызных тавараў належыць кіравацца як найменнем тавару, так і яго кодам адзінай Таварнай наменклатуры знешнеэканамічнай дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза.

** Пры прымяненні ставак акцызаў у адносінах да аўтамабільных бензінаў і дызельнага паліва, дыферэнцыраваных па экалагічных класах, належыць кіравацца тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза «Аб патрабаваннях да аўтамабільнага і авіяцыйнага бензіну, дызельнага і суднавага паліва, паліва для рэактыўных рухавікоў і мазуту» (ТР ТС 013/2011), зацверджаным рашэннем Камісіі Мытнага саюза ад 18 кастрычніка 2011 г. № 826.

Дадатак 2
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах

| Найменне населеных пунктаў і іншых тэрыторый | Стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах за месяц, рублёў | | | |
|---|---|---|---|---|
| | жылыя памяшканні (за кожны жылы пакой, які здаецца), садовыя домікі, дачы | нежылыя памяшканні, машына-месцы | | |
| | | металічны ці драўляны гараж, машына-месца | жалезабетонны ці цагляны гараж | іншыя нежылыя памяшканні (за 1 кв. метр плошчы) |
| Горад Мінск | 32,50 | 10,50 | 13,50 | 5,30 |
| Гарады Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў | 30,50 | 8,40 | 11,60 | 4,20 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Гарады Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Жодзіна, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Наваполацк, Орша, Пінск, Полацк, Рэчыца, Светлагорск, Слуцк, Салігорск | 20,00 | 5,30 | 7,40 | 3,20 |
| Іншыя гарады абласнога, раённага падпарадкавання і пасёлкі гарадскога тыпу | 14,70 | 4,20 | 5,30 | 3,20 |
| Іншыя населеныя пункты і тэрыторыі | 10,50 | 3,20 | 4,20 | 2,10 |

Дадатак 3
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі зямельнага падатку на сельскагаспадарчыя землі сельскагаспадарчага прызначэння

(рублёў за гектар)

| Кадастравая ацэнка зямель (агульны бал) | Стаўкі зямельнага падатку на | | |
|---|---|---|---|
| | ворныя землі, абложныя землі, землі пад пастаяннымі культурамі | лугавыя землі | |
| | | палепшаныя | натуральныя |
| Да 6 | 0,95 | 0,60 | 0,05 |
| 7 | 0,95 | 0,60 | 0,09 |
| 8 | 0,95 | 0,60 | 0,12 |
| 9 | 0,95 | 0,60 | 0,16 |
| 10 | 0,95 | 0,60 | 0,19 |
| 11 | 0,95 | 0,60 | 0,22 |
| 12 | 0,95 | 0,60 | 0,27 |
| 13 | 0,95 | 0,60 | 0,31 |
| 14 | 0,95 | 0,60 | 0,34 |
| 15 | 0,95 | 0,60 | 0,37 |
| 16 | 0,95 | 0,60 | 0,41 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17 | 0,95 | 0,60 | 0,44 |
| 18 | 0,95 | 0,60 | 0,48 |
| 19 | 0,95 | 0,60 | 0,52 |
| 20 | 0,95 | 0,60 | 0,57 |
| 21 | 1,17 | 0,95 | 0,59 |
| 22 | 1,58 | 1,24 | 0,62 |
| 23 | 1,99 | 1,52 | 0,66 |
| 24 | 2,40 | 1,80 | 0,71 |
| 25 | 2,81 | 2,08 | 0,74 |
| 26 | 3,22 | 2,36 | 0,78 |
| 27 | 3,63 | 2,64 | 0,81 |
| 28 | 4,04 | 2,92 | 0,83 |
| 29 | 4,45 | 3,20 | 0,88 |
| 30 | 4,86 | 3,50 | 0,92 |
| 31 | 5,27 | 3,78 | 0,95 |
| 32 | 5,68 | 4,06 | – |
| 33 | 6,09 | 4,34 | – |
| 34 | 6,50 | 4,62 | – |
| 35 | 6,91 | 4,90 | – |
| 36 | 7,32 | 5,18 | – |
| 37 | 7,73 | 5,46 | – |
| 38 | 8,14 | 5,74 | – |
| 39 | 8,55 | 6,02 | – |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 40 | 8,96 | 6,30 | – |
| 41 | 9,37 | 6,60 | – |
| 42 | 9,78 | 6,90 | – |
| 43 | 10,19 | 7,18 | – |
| 44 | 10,60 | 7,46 | – |
| 45 | 11,01 | 7,74 | – |
| 46 | 11,42 | 8,02 | – |
| 47 | 11,83 | 8,30 | – |
| 48 | 12,24 | 8,58 | – |
| 49 | 12,65 | 8,86 | – |
| 50 і больш | 13,06 | 9,14 | – |

Заўвага. Стаўка зямельнага падатку кожнай 0,1 бала кадастравай адзнакі вышэй за 21 бал павялічваецца на 0,041 рубля для ворных зямель, абложных зямель і зямель пад пастаяннымі культурамі і на 0,028 рубля для палепшаных лугавых зямель.

Дадатак 4
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Сярэднія стаўкі зямельнага падатку па раёнах Рэспублікі Беларусь

(рублёў за гектар)

| Найменне раёнаў | Стаўка падатку |
|---|---|
| Брэсцкая вобласць | |
| Баранавіцкі | 22,33 |
| Бярозоўскі | 20,13 |
| Брэсцкі | 20,01 |
| Ганцавіцкі | 13,89 |

| | |
|---|---|
| Драгічынскі | 15,12 |
| Жабінкаўскі | 18,79 |
| Іванаўскі | 14,50 |
| Івацэвіцкі | 15,96 |
| Камянецкі | 20,01 |
| Кобрынскі | 15,59 |
| Лунінецкі | 10,48 |
| Ляхавіцкі | 21,84 |
| Маларыцкі | 11,32 |
| Пінскі | 14,14 |
| Пружанскі | 17,92 |
| Столінскі | 15,12 |
| Віцебская вобласць | |
| Бешанковіцкі | 10,84 |
| Браслаўскі | 5,57 |
| Верхнядзвінскі | 6,43 |
| Віцебскі | 7,66 |
| Глыбоцкі | 11,32 |
| Гарадоцкі | 2,85 |
| Докшыцкі | 11,20 |
| Дубровенскі | 15,73 |
| Лепельскі | 6,18 |
| Лёзненскі | 7,78 |

| | |
|---|---|
| Міёрскі | 8,76 |
| Аршанскі | 16,34 |
| Полацкі | 3,51 |
| Пастаўскі | 8,88 |
| Расонскі | 2,85 |
| Сенненскі | 8,88 |
| Талачынскі | 14,87 |
| Ушацкі | 4,46 |
| Чашніцкі | 9,37 |
| Шаркаўшчынскі | 11,32 |
| Шумілінскі | 6,56 |
| Гомельская вобласць | |
| Брагінскі | 12,39 |
| Буда-Кашалёўскі | 17,69 |
| Веткаўскі | 17,69 |
| Гомельскі | 13,53 |
| Добрушскі | 19,15 |
| Ельскі | 9,26 |
| Жыткавіцкі | 13,42 |
| Жлобінскі | 19,88 |
| Калінкавіцкі | 11,45 |
| Кармянскі | 22,07 |
| Лельчыцкі | 10,84 |

| | |
|---|---|
| Лоеўскі | 9,49 |
| Мазырскі | 11,81 |
| Нараўлянскі | 11,81 |
| Акцябрскі | 15,35 |
| Петрыкаўскі | 8,88 |
| Рэчыцкі | 14,26 |
| Рагачоўскі | 19,52 |
| Светлагорскі | 11,32 |
| Хойніцкі | 19,52 |
| Чачэрскі | 16,22 |
| Гродзенская вобласць | |
| Бераставіцкі | 24,89 |
| Ваўкавыскі | 25,64 |
| Воранаўскі | 19,63 |
| Гродзенскі | 23,92 |
| Дзятлаўскі | 15,59 |
| Зэльвенскі | 24,89 |
| Іўеўскі | 14,64 |
| Карэліцкі | 25,77 |
| Лідскі | 18,54 |
| Мастоўскі | 22,21 |
| Навагрудскі | 19,02 |
| Астравецкі | 13,89 |

| | |
|---|---|
| Ашмянскі | 17,92 |
| Свіслацкі | 19,02 |
| Слонімскі | 21,23 |
| Смаргонскі | 14,50 |
| Шчучынскі | 22,58 |
| Мінская вобласць | |
| Бярэзінскі | 11,81 |
| Барысаўскі | 17,31 |
| Вілейскі | 14,64 |
| Валожынскі | 15,96 |
| Дзяржынскі | 20,99 |
| Клецкі | 29,06 |
| Капыльскі | 25,39 |
| Крупскі | 10,71 |
| Лагойскі | 10,59 |
| Любанскі | 15,96 |
| Мінскі | 21,84 |
| Маладзечанскі | 19,88 |
| Мядзельскі | 7,78 |
| Нясвіжскі | 31,51 |
| Пухавіцкі | 15,86 |
| Слуцкі | 25,87 |
| Смалявіцкі | 17,92 |

| | |
|---|---|
| Салігорскі | 19,02 |
| Старадарожскі | 12,43 |
| Стаўбцоўскі | 17,44 |
| Уздзенскі | 17,69 |
| Чэрвеньскі | 17,08 |
| Магілёўская вобласць | |
| Бялыніцкі | 19,88 |
| Бабруйскі | 21,97 |
| Быхаўскі | 16,70 |
| Глускі | 14,98 |
| Горацкі | 18,41 |
| Дрыбінскі | 14,74 |
| Кіраўскі | 23,43 |
| Клімавіцкі | 13,28 |
| Клічаўскі | 15,25 |
| Касцюковіцкі | 9,00 |
| Краснапольскі | 10,84 |
| Крычаўскі | 17,44 |
| Круглянскі | 22,58 |
| Магілёўскі | 21,35 |
| Мсціслаўскі | 14,50 |
| Асіповіцкі | 18,30 |
| Слаўгарадскі | 12,54 |

| | |
|---|---|
| Хоцімскі | 13,04 |
| Чавускі | 15,86 |
| Чэрыкаўскі | 17,56 |
| Шклоўскі | 22,07 |

Дадатак 5
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Функцыянальнае выкарыстанне зямельных участкаў (віды ацэначных зон)**

| Функцыянальнае выкарыстанне зямельных участкаў | Мэтавае прызначэнне зямельных участкаў |
|---|---|
| Калектыўна-дзелавая зона | Зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў адміністрацыйнага, фінансавага прызначэння, рознічнага гандлю, гасцінічнага прызначэння, грамадскага харчавання, аховы здароўя і па аказанні сацыяльных паслуг, адукацыі і выхавання, навуковага прызначэння і навуковага абслугоўвання, фізкультурна-аздараўленчага і спартыўнага прызначэння, культурна-асветнага і відовішчнага прызначэння, бытавога абслугоўвання насельніцтва, па аказанні пасрэдніцкіх і турыстычных паслуг, аўтамабільных заправачных і газанапаўняльных станцый, аўтамабільных рынкаў, ігральных устаноў, рынкаў (за выключэннем аўтамабільных), гандлёвых цэнтраў, у тым ліку аўтамабільных стаянак, якія абслугоўваюць гэтыя рынкі і гандлёвыя цэнтры, аўтастаянак і гаражоў, за выключэннем дадзеных арганізацыям, якія ажыццяўляюць захоўванне транспартных сродкаў фізічных асоб, гаражным кааператывам, кааператывам, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак |
| Жылая шматкватэрная зона | Зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў шматкватэрнай жылой забудовы, уключаючы інтэрнаты |
| Жылая сядзібная зона | Зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў сядзібнай жылой забудовы (будаўніцтва і (ці) абслугоўвання аднакватэрнага, блакіраваныя жылога дома, абслугоўвання зарэгістраванай арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй кватэры ў блакіраваным жылым доме, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, традыцыйных народных промыслаў), зямельныя ўчасткі арганізацый, якія ажыццяўляюць захоўванне транспартных сродкаў фізічных асоб, гаражных кааператываў, кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, зямельныя ўчасткі фізічных асоб для будаўніцтва (устаноўкі) часовых індывідуальных гаражоў, вядзення калектыўнага садаводства, дачнага будаўніцтва і агародніцтва, касьбы і выпасу сельскагаспадарчых жывёл, а таксама для службовых зямельных надзелаў |
| Вытворчая зона | Зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў прамысловасці, транспарту, сувязі, энергетыкі, аптовага гандлю, матэрыяльна-тэхнічнага і харчовага забеспячэння, нарыхтовак і збыту прадукцыі, камунальнай гаспадаркі, па рамонце і абслугоўванні аўтамабіляў |

| | |
|---|---|
| Рэкрэацыйная зона | Зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў прыродаахоўнага, аздараўленчага, рэкрэацыйнага, гісторыка-культурнага прызначэння |

Дадатак 6
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі, размешчаныя ў населеных пунктах, а таксама за межамі населеных пунктаў, зямельныя ўчасткі садаводчых суполак і дачных кааператываў

| Віды функцыянальнага выкарыстання зямельных участкаў | Стаўкі зямельнага падатку (у працэнтах) |
|---|---|
| Калектыўна-дзелавая зона для размяшчэння: | |
| аўтамабільных рынкаў, ігральных устаноў | 3 |
| аўтамабільных заправачных і газанапаўняльных станцый | 2 |
| рынкаў (за выключэннем аўтамабільных), гандлёвых цэнтраў, у тым ліку аўтамабільных стаянак, якія абслугоўваюць гэтыя рынкі і гандлёвыя цэнтры | 0,7 |
| іншых аб'ектаў | 0,55 |
| Жылая шматкватэрная зона | 0,025 |
| Жылая сядзібная зона | 0,1 |
| Вытворчая зона | 1,1 |
| Рэкрэацыйная зона | 1 |

Дадатак 7
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі экалагічнага падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра

(рублёў)

| | Стаўка падатку |
|---|---|
| За выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, сумарна за 1 тону рэчываў: | |

| | |
|---|---|
| другога класа небяспекі | 870,78 |
| трэцяга класа небяспекі | 287,87 |
| чацвёртага класа небяспекі | 143,04 |

Дадатак 8
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі экалагічнага падатку за скіданне сцёкавых вод

(рублёў)

| | Стаўка падатку |
|---|---|
| За скіданне сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты, за 1 куб. метр: | |
| у вадатокі | 0,10 |
| у вадаёмы | 0,12 |
| За скіданне сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе пасля ачысткі на збудаваннях біялагічнай ачысткі ў натуральных умовах (на палях фільтрацыі, палях падземнай фільтрацыі, у фільтруючых траншэях, пясчана-гравійных фільтрах), а таксама праз земляныя накапляльнікі, за 1 куб. метр | 0,12 |
| За скіданне сцёкавых вод у нетры, за 1 куб. метр | 6,90 |

Дадатак 9
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі экалагічнага падатку за пахаванне, захоўванне адходаў вытворчасці

(рублёў)

| | Стаўка падатку |
|---|---|
| 1. За пахаванне 1 тоны: | |
| 1.1. бяспечных адходаў вытворчасці | 5,13 |
| 1.2. небяспечных адходаў вытворчасці: | |
| трэцяга класа небяспекі | 130,18 |

| | |
|---|---|
| чацвёртага класа небяспекі | 64,91 |
| 2. За захоўванне 1 тоны: | |
| 2.1. бяспечных адходаў вытворчасці | 1,12 |
| 2.2. небяспечных адходаў вытворчасці: | |
| першага класа небяспекі | 113,61 |
| другога класа небяспекі | 33,33 |
| трэцяга класа небяспекі | 11,09 |
| з іх: | |
| лігніну | 2,26 |
| асадку з адстойнікаў (сыры асадак з каагулянтам (флакулянтам), асадак пасля прамыўкі фільтраў), асадкаў збудаванняў біялагічнай ачысткі гаспадарча-фекальных сцёкавых вод | 0,16 |
| чацвёртага класа небяспекі | |
| з іх: | |
| цвёрдых галітавых адходаў, шламаў галітавых глiнiстасалявых, фасфагіпсу | 0,69 |
| глею актыўнага ачышчальных збудаванняў | 0,12 |
| іншых адходаў | 5,54 |

Дадатак 10
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў

(рублёў)

| | Стаўка падатку |
|---|---|
| 1. За здабычу (адабранне) 1 тоны: | |
| 1.1. гіпсу | 0,980 |

| | |
|---|---|
| 1.2. жалезных руд | 0,940 |
| 1.3. мелу, мергелю, вапняку і даламіту | 0,110 |
| 1.4. пяску, які выкарыстоўваецца ў якасці фармовачнага, для вытворчасці шкла, фарфора-фаянсавых вырабаў, вогнетрывалых матэрыялаў, цэменту | 0,180 |
| 1.5. сапрапеляў вільготнасцю 60 працэнтаў | 0,010 |
| 1.6. каменнай солі | 0,850 |
| 1.7. торфу вільготнасцю 40 працэнтаў | 0,050 |
| 1.8. бурага вугалю (у пераліку на ўмоўнае паліва) | 1,930 |
| 1.9. гаручых сланцаў (у пераліку на ўмоўнае паліва) | 0,430 |
| 2. За здабычу (адабранне) 1 куб. метра: | |
| 2.1. бентанітавых глін | 0,720 |
| 2.2. гліны, супеску, суглінку і трэпелаў | 0,110 |
| 2.3. каменю: | |
| будаўнічага | 0,720 |
| абліцовачнага | 1,810 |
| 2.4. мінеральных вод, мінералізаваных прамысловых вод, якія здабываюцца для падтрымання пластавога ціску пры здабычы нафты | 0,530 |
| 2.5. моранага дубу | 78,210 |
| 2.6. пяску для: | |
| выкарыстання ў дарожным будаўніцтве | 0,050 |
| іншага выкарыстання | 0,090 |
| 2.7. пясчана-гравійна-валуннага матэрыялу для: | |
| выкарыстання ў дарожным будаўніцтве | 0,080 |
| іншага выкарыстання | 0,160 |

| | |
|---|---|
| 2.8. падземных і паверхневых вод: | |
| для гаспадарча-пітнога водазабеспячэння насельніцтва* | 0,010 |
| арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі для вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і раслінаводства, арганізацыямі і іх адасобленымі падраздзяленнямі, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць па вытворчасці прадукцыі рыбаводства, садаводчымі суполкамі і дачнымі кааператывамі | 0,001 |
| прэсных і мінеральных для вытворчасці алкагольных, безалкагольных, слабаалкагольных напояў і піва** | 3,360 |
| для іншага выкарыстання | 0,030 |
| 2.9. мінералізаваных прамысловых вод для іншага выкарыстання | 0,180 |
| 3. За здабычу (адабранне) бурштыну, за 1 кілаграм | 11,740 |
| 4. За здабычу (адабранне) золата, за 1 грам | 1,560 |
| 5. За адабранне 1 тоны: | |
| 5.1. вінаграднага смаўжа | 33,620 |
| 5.2. лічынак хіранамід | 4807,590 |
| 5.3. зялёнай жабы (сажалкавай, ядомай, азёрнай) | 3912,420 |
| 5.4. даўгапальцага (вузкапальцага) рака | 1245,850 |
| 6. За адабранне гадзюкі звычайнай, за 1 экзэмпляр | 5,760 |

* Пад здабычай (адабраннем) вады для гаспадарча-пітнога водазабеспячэння насельніцтва разумееццa здабыча (адабранне) вады, якая адпускаецца для насельніцтва, што пражывае ў жылых дамах, а таксама для арганізацый і аб'ектаў аховы здароўя, турызму, фізічнай культуры і спорту, сацыяльнага абслугоўвання, адукацыі, культуры і мастацтва, якія забяспечваюць сацыяльна-бытавыя патрэбы насельніцтва.

** Пад алкагольнымі напоямі разумеюцца гарэлка, лікёра-гарэлачныя вырабы, віно, каньяк, брэндзі, кальвадас, шампанскае і іншыя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 працэнтаў і больш. Пад слабаалкагольнымі напоямі разумеюцца напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту меншай за 7 працэнтаў. Пад безалкагольнымі напоямі разумеюцца воды мінеральныя; воды пітныя, воды газіраваныя не падсалоджаныя і не араматызаваныя; воды мінеральныя і газіраваныя з дабаўленнем цукру ці іншых падсалоджвальных ці араматычных рэчываў (асвяжальныя напоі); напоі безалкагольныя іншыя, якія не змяшчаюць малочных тлушчаў; напоі квасныя; напоі танізавальныя; напоі на аснове чайнага паўфабрыкату; напоі фруктовыя, нектары, сокі, напоі з агародніны.

Дадатак 11
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах нафты**

(рублёў)

| Сярэдні за мінулы падатковы перыяд узровень цэн на нафту гатунку «Юралс» на сусветных рынках нафтавай сыравіны, у доларах ЗША за 1 бараль | Стаўка падатку за здабычу (адабранне) прыродных рэсурсаў у адносінах да 1 тоны нафты |
|---|---|
| да 80 | 19,94 |
| ад 80 да 90 | 24,82 |
| ад 90 да 100 | 42,32 |
| ад 100 да 110 | 58,95 |
| ад 110 да 120 | 76,45 |
| ад 120 да 130 | 92,85 |
| ад 130 да 140 | 110,58 |
| ад 140 да 150 | 126,98 |
| ад 150 да 160 | 144,70 |
| ад 160 да 170 | 161,10 |
| ад 170 да 180 | 177,50 |
| ад 180 да 190 | 195,23 |
| ад 190 да 200 | 212,74 |
| больш за 200 | 229,36 |

Дадатак 12
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі консульскага збору**

| Найменне консульскага дзеяння | Стаўка консульскага збору ў еўра (калі не ўказана іншае) |
|---|---|
| **Разгляд хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб выдачы віз Рэспублікі Беларусь** | |
| 1. Разгляд хадайніцтва аб выдачы ўязной візы: | |
| індывідуальнай | 60 |
| групавой (з чалавека) | 10 |
| **Разгляд заяў аб афармленні дакументаў для выезду з Рэспублікі Беларусь і (ці) уезду ў Рэспубліку Беларусь. Разгляд пытанняў, звязаных са знаходжаннем за межамі Рэспублікі Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь. Разгляд пытанняў, звязаных з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь** | |
| 2. Выдача (абмен) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь: | |
| у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь | 40 |
| у галоўным консульскім кіраванні і консульскіх пунктах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (аплачваецца зыходзячы з памеру базавай велічыні, які дзейнічае на дзень аплаты) | 12 базавых велічыняў |
| 3. Абмен пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, які пражывае ў Рэспубліцы Беларусь | 100 |
| 4. Разгляд заявы аб аднакратным прадаўжэнні тэрміну дзеяння пашпарта грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які часова выехаў з Рэспублікі Беларусь | 20 |
| 5. Выдача пасведчання на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь | 20 |
| 6. Пастаноўка на консульскі ўлік грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь: | |
| у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь | 10 |
| у галоўным консульскім кіраўніцтве і консульскіх пунктах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (аплачваецца зыходзячы з памеру базавай велічыні, які дзейнічае на дзень аплаты) | 1 базавая велічыня |
| 7. Разгляд заявы аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 70 |
| 8. Разгляд заявы аб выхадзе з грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 250 |
| 9. Разгляд заявы аб рэгістрацыі страты грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 35 |
| 10. Разгляд заявы аб вызначэнні прыналежнасці да грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 35 |
| 11. Разгляд заявы аб афармленні пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які выехаў з Рэспублікі Беларусь для часовага знаходжання за яе межамі | 175 |

| | |
|---|---|
| 12. Разгляд заявы замежнага грамадзяніна і асобы без грамадзянства аб выдачы дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь | 105 |
| **Здзяйсненне дзеянняў, звязаных з рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану** | |
| 13. Рэгістрацыя заключэння шлюбу, уключаючы выдачу пасведчання | 50 |
| 14. Рэгістрацыя скасавання шлюбу | 50 |
| 15. Рэгістрацыя перамены прозвішча, уласнага імя і імя па бацьку, уключаючы выдачу пасведчання | 70 |
| 16. Выдача пасведчання ў сувязі з аднаўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану | 20 |
| 17. Выдача пасведчання ў сувязі з унясеннем змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану, аднаўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану | 50 |
| 18. Выдача паўторнага пасведчання аб рэгістрацыі акта грамадзянскага стану | 35 |
| 19. Выдача даведкі, якая змяшчае звесткі з запісаў актаў грамадзянскага стану або звязана з іншымі дзеяннямі дзяржаўных органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану | 35 |
| **Здзяйсненне натарыяльных дзеянняў** | |
| 20. Пасведчанне здзелак (дагаворы, завяшчанні, даверанасці і іншыя), акрамя дагавораў аб адчужэнні і закладзе нерухомай маёмасці, права ўласнасці ці іншае права на якую зарэгістравана на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку: | |
| 20.1. пасведчанне дагавораў адчужэння транспартных сродкаў: | |
| блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы, усынавіцелям і ўсыноўленым) | 70 |
| іншым асобам | 175 |
| 20.2. пасведчанне дагавораў дарэння імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё», у тым ліку пагадненняў (дагавораў) аб унясенні ў іх змяненняў і дапаўненняў | 10 |
| 20.3. пасведчанне пагадненняў (дагавораў) аб пераразмеркаванні долей у агульнай уласнасці, падзеле маёмасці, аб вызначэнні долей або вылучэнні долі | 140 |
| 20.4. пасведчанне дагавораў паручыцельства і іншых абавязацельстваў аналагічнага характару | 140 |
| 20.5. пасведчанне згод | 35 |
| 20.6. пасведчанне іншых пагадненняў (дагавораў), акрамя ўказаных у падпунктах 20.1–20.5 гэтага пункта | 70 |
| 20.7. пасведчанне завяшчанняў | 35 |

| | |
|---|---|
| 20.8. пасведчанне даверанасцей у адносінах да транспартных сродкаў, у тым ліку ў парадку перадавер'я: | |
| блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы, усынавіцелям і ўсыноўленым) | 35 |
| іншым асобам | 105 |
| 20.9. пасведчанне даверанасцей на права карыстання, валодання і распараджэння маёмасцю, акрамя даверанасцей, указаных у падпункце 20.8 гэтага пункта: | |
| блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы, усынавіцелям і ўсыноўленым) | 35 |
| іншым асобам | 70 |
| 20.10. пасведчанне іншых даверанасцей, акрамя ўказаных у падпунктах 20.8 і 20.9 гэтага пункта | 35 |
| 21. Прыняцце мер па ахове спадчыны ці кіраванні ім па даручэнні натарыуса | 140 |
| 22. Выдача пасведчанняў аб праве на спадчыну: | |
| 22.1. спадчыннікам па законе 1-й чаргі; спадчыннікам па завяшчанні, у лік якіх уваходзяць унукі спадчынадаўца і асобы, якія пры наследаванні па законе лічыліся б спадчыннікамі 1-й чаргі | 35 |
| 22.2. спадчыннікам па законе 2-й чаргі; спадчыннікам па завяшчанні, у лік якіх уваходзяць пляменнікі, пляменніцы спадчынадаўца і асобы, якія пры наследаванні па законе лічыліся б спадчыннікамі 2-й чаргі | 70 |
| 22.3. спадчыннікам па законе 3-й чаргі; спадчыннікам па завяшчанні, якія пры наследаванні па законе лічыліся б спадчыннікамі 3-й чаргі | 105 |
| 22.4. спадчыннікам па законе 4-й чаргі; спадчыннікам па завяшчанні, у лік якіх уваходзяць стрыечныя браты і сёстры спадчынадаўца і асобы, якія пры наследаванні па законе лічыліся б спадчыннікамі 4-й чаргі | 140 |
| 22.5. спадчыннікам па законе наступных чэргаў; спадчыннікам па завяшчанні, якія пры наследаванні па законе лічыліся б спадчыннікамі наступных чэргаў, а таксама асобам, якія не ўваходзяць у кола спадчыннікаў па законе | 175 |
| 23. Выдача пасведчанняў аб праве ўласнасці на долю маёмасці, нажытай сужэнцамі ў перыяд шлюбу | 35 |
| 24. Сведчанне правільнасці копій дакументаў і выпісак з іх | 35 |
| 25. Сведчанне сапраўднасці подпісу на дакументах, за выключэннем сапраўднасці подпісу перакладчыка (за кожны подпіс) | 35 |
| 26. Сведчанне сапраўднасці подпісу перакладчыка на перакладах дакументаў | 20 |
| 27. Сведчанне правільнасці перакладу дакумента з адной мовы на іншую (за кожную старонку перакладу) | 70 |

| | |
|---|---|
| 28. Пасведчанне фактаў знаходжання грамадзяніна ў жывых і пэўным месцы, тоеснасці грамадзяніна з асобай, адлюстраванай на фатаграфіі, часу прад'яўлення дакументаў, перадачы заяў юрыдычных і фізічных асоб іншым юрыдычным і фізічным асобам, прыняцця на захоўванне дакументаў | 105 |
| 29. Прыняцце ў дэпазіт грашовых сум і каштоўных папер | 70 |
| 30. Здзяйсненне выканаўчага надпісу | 70 |
| 31. Натарыяльныя дзеянні па забеспячэнні доказаў, якія патрабуюцца для вядзення спраў у органах замежных дзяржаў | 35 |
| 32. Здзяйсненне марскога пратэсту | 210 |
| 33. Выдача дублікатаў натарыяльна пасведчаных дакументаў | 35 |
| 34. Здзяйсненне іншых натарыяльных дзеянняў, акрамя ўказаных у пунктах 20–33 гэтага дадатку | 70 |
| **Легалізацыя дакументаў. Пастаўленне апастыля** | |
| 35. Легалізацыя афіцыйнага дакумента: | |
| у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь | 35 |
| у галоўным консульскім кіраўніцтве і консульскіх пунктах Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (аплачваецца зыходзячы з памеру базавай велічыні, які дзейнічае на дзень аплаты) | 0,5 базавай велічыні |
| 36. Пастаўленне апостыля на афіцыйным дакуменце, складзеным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь: | |
| пры звароце ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь | 35 |
| пры звароце ў галоўнае консульскае кіраўніцтва і консульскія пункты Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (аплачваецца зыходзячы з памеру базавай велічыні, які дзейнічае на дзень аплаты) | 0,5 базавай велічыні |
| **Выпатрабаванне дакументаў. Выдача даведак** | |
| 37. Выпатрабаванне дакумента для грамадзян Рэспублікі Беларусь | 35 |
| 38. Выпатрабаванне дакумента для іншых асоб | 70 |
| 39. Выдача іншых даведак | 35 |

Дадатак 13
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце ў суды, за выключэннем судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска)

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Разгляд іскавай заявы: | |
| 1.1. маёмаснага характару (за выключэннем іскавай заявы, указанай у падпункце 1.2 гэтага пункта) | 5 працэнтаў цаны іску |
| 1.2. аб спагнанні расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні | 1 базавая велічыня з кожнай абавязанай асобы |
| 2. Разгляд іскавай заявы: | |
| 2.1. аб скасаванні шлюбу | 4 базавыя велічыні |
| 2.2. аб скасаванні паўторнага шлюбу | 8 базавых велічыняў |
| 2.3. аб скасаванні шлюбу з асобай, прызнанай ва ўстаноўленым парадку адсутнай без вестак ці недзеяздольнай, а таксама іскавай заявы аб скасаванні шлюбу з асобай, асуджанай да пазбаўлення волі на тэрмін, не меншы за 3 гады | 1 базавая велічыня |
| 2.4. па спрэчках, звязаных з заключэннем, змяненнем ці скасаваннем дагавора, аб прызнанні дагавора незаключаным, аб прызнанні здзелкі несапраўднай, аб устанаўленні факта мізэрнасці здзелкі | 5 базавых велічыняў |
| 2.5. немаёмаснага характару (ці не падлеглай ацэнцы) | 3 базавыя велічыні |
| 3. Разгляд заявы аб распачынанні загаднага вядзення | па стаўках, устаноўленых пунктам 1 гэтага дадатку |
| 4. Разгляд скаргі: | |
| 4.1. на рашэнні аб спыненні разгляду хадайніцтва аб даванні статусу бежанца, дадатковай абароны ці сховішча ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў даванні статусу бежанца і аб даванні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў даванні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадаўжэнні тэрміну давання дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца ці дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь | 1 базавая велічыня |
| 4.2. па справе, якая ўзнікае з адміністрацыйна-прававых адносін, на адказ на зварот фізічнай асобы, на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы | 1 базавая велічыня |
| 5. Разгляд заявы па справе ў парадку асаблівага вядзення | 2 базавыя велічыні |

| | |
|---|---|
| 6. Разгляд заявы аб адмене рашэння трацейскага суда | 2 базавыя велічыні |
| 7. Разгляд апеляцыйнай ці нагляднай скаргі, за выключэннем скаргаў, указаных у пунктах 10 і 11 гэтага дадатку | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за разгляд іскавай заявы ці іншай заявы, скаргі, а па маёмасных спрэчках – стаўкі, вылічанай зыходзячы з сумы, якая аспрэчваецца |
| 8. Разгляд скаргі на пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні: | |
| 8.1. аб накладанні: | |
| 8.1.1. штрафу ў памеры: | |
| Меншым за 10 базавых велічыняў | 0,5 базавай велічыні |
| ад 10 да 100 базавых велічыняў | 2 базавыя велічыні |
| ад 100 базавых велічыняў і больш | 3 базавыя велічыні |
| 8.1.2. іншага адміністрацыйнага спагнання | 1 базавая велічыня |
| 8.2. не звязаную з накладаннем спагнання, у тым ліку аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні | 1 базавая велічыня |
| 9. Разгляд скаргі на адмову ў распачынанні крымінальнай справы, спыненне папярэдняга расследавання крымінальнай справы або крымінальнага пераследавання, адмову ў распачынанні вядзення па акалічнасцях, якія адкрыліся нанава | 1 базавая велічыня |
| 10. Разгляд скаргі на прыгавор, прысуд, пастанову суда па крымінальнай справе: | |
| 10.1. нагляднай першаснай ці паўторнай, за выключэннем паўторнай, указанай у падпункце 10.2 гэтага пункта | 1 базавая велічыня |
| 10.2. паўторнай, якая падаецца ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 11. Разгляд апеляцыйнай ці нагляднай скаргі на прыгавор, прысуд, пастанову суда ў частцы вырашэння грамадзянскага іску ў крымінальным працэсе | па стаўках, устаноўленых пунктам 7 гэтага дадатку |
| 12. Разгляд іншай скаргі, не ўказанай у пунктах 4, 7–11 гэтага дадатку | 0,1 базавай велічыні |
| 13. Паўторная выдача копій судовага рашэння, прыгавору, прысуду, пастановы суда | 1 базавая велічыня і, акрамя таго, 0,1 базавай велічыні за кожную выврабленую старонку |

| | |
|---|---|
| 15. Выдача копій рашэння суда аб скасаванні шлюбу | ад 1 да 3 базавых велічыняў (з аднаго ці з абодвух сужэнцаў) |
| 16. Выдача судом дублікатаў, копій іншых дакументаў | 0,1 базавай велічыні і, акрамя таго, 0,003 базавай велічыні за кожную выраблeную старонку |

Дадатак 14
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце ў судовую калегію па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь**

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Разгляд іскавай заявы: | |
| 1.1. маёмаснага характару | 5 працэнтаў цаны іску |
| 1.2. немаёмаснага характару (ці не падлеглай ацэнцы), якая падаецца: | |
| 1.2.1. юрыдычнымі асобамі і арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі | 50 базавых велічыняў |
| 1.2.2. фізічнымі асобамі | 20 базавых велічыняў |
| 2. Разгляд скаргі на рашэнне Апеляцыйнага савета пры дзяржаўнай установе «Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці», а таксама на рашэнне іншага органа па пытаннях, звязаных з аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці, якая падаецца: | |
| 2.1. юрыдычнымі асобамі і арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі | 50 базавых велічыняў |
| 2.2. фізічнымі асобамі | 20 базавых велічыняў |
| 3. Разгляд нагляднай скаргі на рашэнне судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай адпаведна пунктамі 1 і 2 гэтага дадатку |
| 4. Разгляд паўторнай нагляднай скаргі на рашэнне судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь | 25 працэнтаў стаўкі, устаноўленай адпаведна пунктамі 1 і 2 гэтага дадатку |
| 5. Паўторная выдача копіі судовай пастановы судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь: | |

| | |
|---|---|
| 5.1. юрыдычным асобам і арганізацыям, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі | 5 базавых велічыняў і, акрамя таго, 0,5 базавай велічыні за кожную вырабленую старонку |
| 5.2. фізічным асобам | 2 базавыя велічыні і, акрамя таго, 0,3 базавай велічыні за кожную вырабленую старонку |

Дадатак 15
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце ў судовую калегію па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічныя суды абласцей (горада Мінска)**

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Разгляд іскавых заяў | |
| 1.1. маёмаснага характару пры цане іску: | |
| 1.1.1. да 100 базавых велічыняў | 25 базавых велічыняў |
| 1.1.2. ад 100 да 1000 базавых велічыняў | 5 працэнтаў ад цаны іску, але не менш за суму, устаноўленую падпунктам 1.1.1 гэтага пункта |
| 1.1.3. ад 1000 да 10 000 базавых велічыняў | 5 працэнтаў ад 1000 базавых велічыняў плюс 3 працэнты ад сумы, якая перавышае 1000 базавых велічыняў |
| 1.1.4. ад 10 000 базавых велічыняў і больш | 1 працэнт ад цаны іску, але не менш за суму, устаноўленую падпунктам 1.1.3 гэтага пункта |
| 1.2. аб прыцягненні да субсідыярнай адказнасці па даўгах юрыдычнай асобы | 25 базавых велічыняў |
| 2. Разгляд іскавай заявы па спрэчцы аб якасці пастаўленага тавару | 80 працэнтаў стаўкі, устаноўленай адпаведна падпунктамі 1.1.1–1.1.4 пункта 1 гэтага дадатку |
| 3. Разгляд іскавай заявы (заявы) немаёмаснага характару, у тым ліку заявы па гаспадарчых (эканамічных) спрэчках і іншых справах, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін немаёмаснага характару, скаргі на адказ на зварот юрыдычнай асобы, індывідуальнага | |

| | |
|---|---|
| прадпрымальніка ці фізічнай асобы, скаргі на пастанову, дзеянне (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, якая падаецца: | |
| 3.1. юрыдычнай асобай: | |
| у судовую калегію па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь | 50 базавых велічыняў па кожным патрабаванні (акце) |
| у эканамічныя суды абласцей (горада Мінска) | 20 базавых велічыняў па кожным патрабаванні (акце) |
| 3.2. індывідуальным прадпрымальнікам | 10 базавых велічыняў па кожным патрабаванні (акце) |
| 3.3. фізічнай асобай | 5 базавых велічыняў па кожным патрабаванні (акце) |
| 4. Разгляд іскавай заявы па спрэчках, звязаных з заключэннем, змяненнем ці скасаваннем дагавора, аб прызнанні дагавора незаключаным, аб прызнанні здзелкі несапраўднай, аб устанаўленні факта мізэрнасці здзелкі, якая падлягае разгляду: | |
| 4.1. у судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь | 50 базавых велічыняў |
| 4.2. у эканамічных судах абласцей (горада Мінска) | 20 базавых велічыняў |
| 5. Разгляд заявы аб распачынанні загаднага вядзення пры суме спагнання: | |
| 5.1. да 100 базавых велічыняў | 2 базавыя велічыні |
| 5.2. ад 100 да 300 базавых велічыняў | 5 базавых велічыняў |
| 5.3. ад 300 базавых велічыняў і больш | 7 базавых велічыняў |
| 6. Разгляд скаргі: | |
| 6.1. апеляцыйнай | 40 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за разгляд іскавай заявы (заявы, скаргі), а па маёмасных спрэчках – стаўкі, вылічанай зыходзячы з сумы, якая аспрэчваецца |
| 6.2. касацыйнай | 80 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за разгляд іскавай заявы (заявы, скаргі), а па маёмасных спрэчках – ад стаўкі, вылічанай зыходзячы з сумы, якая аспрэчваецца |
| 6.3. нагляднай | 80 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за разгляд іскавай заявы (заявы, скаргі), а па маёмасных спрэчках – ад стаўкі, вылічанай зыходзячы з сумы, якая аспрэчваецца |

| | |
|---|---|
| 7. Разгляд скаргі на пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні: | |
| 7.1. аб накладанні: | |
| 7.1.1. штрафу ў памеры: | |
| Меншым за 10 базавых велічыняў | 0,5 базавай велічыні |
| ад 10 да 100 базавых велічыняў | 2 базавыя велічыні |
| ад 100 базавых велічыняў і больш | 3 базавыя велічыні |
| 7.1.2. іншага адміністрацыйнага спагнання | 1 базавая велічыня |
| 7.2. не звязаную з накладаннем адміністрацыйнага спагнання, у тым ліку аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні | 1 базавая велічыня |
| 8. Разгляд заявы аб прызнанні юрыдычнай асобы ці індывідуальнага прадпрымальніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам), якая падаецца крэдыторам | 10 базавых велічыняў |
| 9. Разгляд заявы аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне: | |
| 9.1. якая падаецца ў судовую калегію па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь | 15 базавых велічыняў |
| 9.2. якая падаецца ў эканамічныя суды абласцей (горада Мінска) | 10 базавых велічыняў |
| 10. Разгляд скаргі на натарыяльныя дзеянні ці адмову ў іх здзяйсненні | 10 базавых велічыняў |
| 11. Разгляд хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, іншага пастаяннага арбітражнага органа | 10 базавых велічыняў |
| 12. Разгляд заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, медыятыўнага пагаднення | 10 базавых велічыняў |
| 13. Разгляд хадайніцтва аб забеспячэнні іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом | 10 базавых велічыняў |
| 14. Разгляд заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда ці замежнага арбітражнага рашэння | 10 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 15. Разгляд іншай скаргі, не ўказанай у пунктах 3, 6, 7 і 10 гэтага дадатку | 0,5 базавай велічыні |
| 16. Выдача судом дублікатаў, копій дакументаў | 0,2 базавай велічыні і, акрамя таго, 0,03 базавай велічыні за кожную выробленую старонку |

Дадатак 16
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце ў органы прымусовага выканання

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Выдача копій дакументаў, якія знаходзяцца ў выканаўчым вядзенні | 0,1 базавай велічыні і, акрамя таго, 0,003 базавай велічыні за кожную выробленую старонку |
| 2. Паўторная выдача копій дакументаў, якія знаходзяцца ў выканаўчым вядзенні | 1 базавая велічыня і, акрамя таго, 0,1 базавай велічыні за кожную выробленую старонку |
| 3. Даванне звестак аб выканаўчых вядзеннях, распачатых у адносінах да даўжнікоў | 3 базавыя велічыні за звесткі аб кожным даўжніку |

Дадатак 17
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце ў органы пракуратуры

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Разгляд наглядной скаргі на судовую пастанову, за выключэннем наглядной скаргі, указанай у пункце 2 гэтага дадатку | па стаўках, устаноўленых пунктам 7 дадатку 13 да гэтага Кодэкса |
| 2. Разгляд наглядной скаргі на судовую пастанову судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) | па стаўках, устаноўленых падпунктам 6.3 пункта 6 дадатку 15 да гэтага Кодэкса |
| 3. Разгляд наглядной скаргі на прыгавор, прысуд, пастанову суда па крымінальнай справе: | |
| 3.1. першаснай, а таксама паўторнай, за выключэннем указанай у падпункце 3.2 гэтага пункта | 1 базавая велічыня |
| 3.2. паўторнай, якая падаецца ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 4. Разгляд наглядной скаргі на прыгавор суда ў частцы вырашэння грамадзянскага іску | па стаўках, устаноўленых пунктам 7 дадатку 13 да гэтага Кодэкса |

| | |
|---|---|
| 5. Разгляд скаргі на пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні: | |
| 5.1. аб накладанні: | |
| 5.1.1. штрафу ў памеры: | |
| Меншым за 10 базавых велічыняў | 0,5 базавай велічыні |
| ад 10 да 100 базавых велічыняў | 2 базавыя велічыні |
| ад 100 базавых велічыняў і больш | 3 базавыя велічыні |
| 5.1.2. іншага адміністрацыйнага спагнання | 1 базавая велічыня |
| 5.2. не звязаную з накладаннем спагнання, у тым ліку аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні | 1 базавая велічыня |
| 6. Разгляд іншай скаргі, не ўказанай у пунктах 1–5 гэтага дадатку | 0,1 базавай велічыні |
| 7. Паўторная выдача копій пастаноў органаў пракуратуры аб спыненні крымінальнай справы, аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы | 0,5 базавай велічыні і, акрамя таго, 0,1 базавай велічыні за кожную выробленую старонку |

Дадатак 18
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце да ўпаўнаважаных службовых асоб мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Пасведчанне завяшчання | 1 базавая велічыня |
| 2. Пасведчанне даверанасці на права карыстання, валодання і распараджэння транспартным сродкам, у тым ліку ў парадку перадавер'я: | |
| 2.1. блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы), усынавіцелям і ўсыноўленым (удачароным) | 1 базавая велічыня |
| 2.2. іншым асобам | 2 базавыя велічыні |
| 3. Пасведчанне даверанасці на права карыстання, валодання і распараджэння маёмасцю, акрамя даверанасці, указанай у пункце 2 гэтага дадатку: | |

| | |
|---|---|
| 3.1. блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы), усынавіцелям і ўсыноўленым (удачароным) | 1 базавая велічыня |
| 3.2. іншым асобам | 2 базавыя велічыні |
| 4. Пасведчанне даверанасці на ажыццяўленне банкам, яго структурнымі падраздзяленнямі банкаўскіх аперацый і іншай, прадугледжанай заканадаўствам дзейнасці | 2 базавыя велічыні |
| 5. Пасведчанне іншай даверанасці, акрамя ўказаных у пунктах 2–4 гэтага дадатку | 0,5 базавай велічыні |
| 6. Пасведчанне згоды | 0,3 базавай велічыні |
| 7. Прыняцце мер да аховы спадчыннай маёмасці | 4 базавыя велічыні |
| 8. Сведчанне правільнасці копій: | |
| 8.1. дакументаў, выкладзеных не больш чым на трох старонках | 0,4 базавай велічыні |
| 8.2. дакументаў, выкладзеных на чатырох старонках і больш | 1 базавая велічыня |
| 9. Сведчанне правільнасці выпісак з дакументаў | 1 базавая велічыня |
| 10. Сведчанне сапраўднасці подпісу на дакументах, за выключэннем сапраўднасці подпісу перакладчыка: | |
| 10.1. на ўстаноўчых дакументах (статутах і змяненнях да іх), картцы для падачы ў банк | 1 базавая велічыня (за кожны подпіс) |
| 10.2. на іншых дакументах | 0,3 базавай велічыні (за кожны подпіс) |
| 11. Выдача дублікатаў натарыяльна пасведчаных дакументаў | 1 базавая велічыня |
| 12. Здзяйсненне іншых натарыяльных дзеянняў, не ўказаных у гэтым дадатку | 2 базавыя велічыні |
| 13. Складанне праектаў здзелак, заяў, выраб копій дакументаў і выпісак з дакументаў | 0,2 базавай велічыні |

Дадатак 19
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны пры звароце да рэгістратараў рэспубліканскай і тэрытарыяльных арганізацый па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|

| | |
|---|---|
| 1. Пасведчанне дагавораў адчужэння жылога дома, дачы, садовага доміка, гаража, іншых капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) (далей у гэтым дадатку і дадатку 22 да гэтага Кодэкса – капітальная пабудова) з зямельным участкам і без зямельнага ўчастка, кватэры, іншага ізаляванага памяшкання, машына-месца, зямельнага ўчастка, у тым ліку долі ў праве ўласнасці на іх, дагавораў фінансавай арэнды (лізінгу), прадметам лізінгу па якіх з'яўляюцца кватэра прыватнага жыллёвага фонду ў шматкватэрным ці блакіраваным жылым доме і (ці) аднакватэрны жылы дом прыватнага жыллёвага фонду: | |
| 1.1. блізкім сваякам (бацькам, дзецям, сужэнцам, родным братам і сёстрам, унукам, дзеду, бабцы), усынавіцелям (удачарыцелям) і ўсыноўленым (удачароным) | 2 базавыя велічыні |
| 1.2. іншым асобам | 5 базавых велічыняў |
| 2. Пасведчанне дагавораў адчужэння прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў | 25 базавых велічыняў |
| 3. Пасведчанне дагавораў аб закладзе | 5 базавых велічыняў |
| 4. Пасведчанне пагадненняў (дагавораў) аб пераразмеркаванні долей у агульнай уласнасці, аб раздзеле ці зліцці аб'ектаў нерухомай маёмасці, аб вызначэнні долей або аб вылучэнні долі, вычляненні ізаляванага памяшкання або машына-месца з капітальнай пабудовы | 4 базавыя велічыні |
| 5. Пасведчанне дагавораў давернага кіравання маёмасцю | 5 базавых велічыняў |
| 6. Пасведчанне іншых пагадненняў (дагавораў), якія з'яўляюцца падставай узнікнення, пераходу, спынення правоў ці абмежаванняў (абцяжарванняў) правоў на нерухомую маёмасць, якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2002 года «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй” (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 87, 2/882), акрамя дагавораў, указаных у пунктах 1–5 гэтага дадатку | 2 базавыя велічыні |
| 7. Пасведчанне пагадненняў (дагавораў) аб змяненні ці скасаванні дагавораў, указаных у пунктах 1–6 гэтага дадатку | па стаўках, устаноўленых за пасведчанне адпаведных дагавораў |
| 8. Выдача дублікатаў пасведчаных рэгістратарам дакументаў | 2 базавыя велічыні |

Дадатак 20
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны за здзяйсненне дзеянняў, звязаных з рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Рэгістрацыя заключэння шлюбу, уключаючы выдачу пасведчання | 1 базавая велічыня |

| | |
|---|---|
| 2. Рэгістрацыя скасавання шлюбу па рашэннях судоў, якія ўступілі ў законную сілу да 1 верасня 1999 года, уключаючы выдачу пасведчання, за выключэннем выпадкаў, калі рашэннем суда асоба вызвалена ад дзяржаўнай пошліны | 2 базавыя велічыні |
| 3. Рэгістрацыя скасавання шлюбу па ўзаемнай згодзе сужэнцаў, якія не маюць агульных непаўналетніх дзяцей і спрэчкі аб маёмасці (у адпаведнасці з артыкулам 35[1] Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і), уключаючы выдачу пасведчанняў | 4 базавыя велічыні |
| 4. Рэгістрацыя перамены прозвішча, уласнага імя і імя па бацьку, уключаючы выдачу пасведчання | 2 базавыя велічыні |
| 5. Выдача пасведчання ў сувязі з унясеннем змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану, аднаўленнем запісаў актаў грамадзянскага стану | 1 базавая велічыня |
| 6. Выдача паўторнага пасведчання аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану | 1 базавая велічыня |

Дадатак 21
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны за выдачу (абмен), пасведчанне дакументаў, неабходных для выезду з Рэспублікі Беларусь і (ці) уезду ў Рэспубліку Беларусь, выдачу (абмен) ці прадаўжэнне тэрміну дзеяння дакументаў, звязаных са знаходжаннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь, за разгляд пытанняў, звязаных з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь

| Найменне дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Выдача пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь | 10 базавых велічынъ |
| 2. Выдача (абмен) замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь для часовых выездаў з Рэспублікі Беларусь | 2 базавыя велічыні за выдачу праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь і 1 базавая велічыня за кожны год яго дзеяння |
| 3. Выдача (абмен) замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь для выезду з Рэспублікі Беларусь на пастаяннае пражыванне за межамі Рэспублікі Беларусь | 5 базавых велічынъ |
| 4. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства праязнога дакумента Рэспублікі Беларусь для выезду з Рэспублікі Беларусь у сувязі з ануляваннем дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 5. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства візы для выезду з Рэспублікі Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 6. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства візы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь | 3 базавыя велічыні |

| | |
|---|---|
| 7. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства, якія часова ці пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, двухкратнай візы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 8. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства шматразовай візы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь | 6 базавых велічыняў |
| 9. Рэгістрацыя або прадаўжэнне тэрміну часовага знаходжання замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь | 1 базавая велічыня |
| 10. Выдача грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, дакумента: | |
| 10.1. аб аднаразовым запрашэнні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства ў Рэспубліку Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 10.2. аб двухразовым запрашэнні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства ў Рэспубліку Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 10.3. аб шматразовым запрашэнні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства ў Рэспубліку Беларусь | 6 базавых велічыняў |
| 11. Выдача юрыдычнай асобе, а таксама індывідуальнаму прадпрымальніку дакумента аб запрашэнні ў Рэспубліку Беларусь | 8 базавых велічыняў |
| 12. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, дакумента аб аднаразовым запрашэнні ў Рэспубліку Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 13. Выдача замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства дазволу на часовае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 14. Выдача (абмен) замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства віду на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 15. Разгляд заявы аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 5 базавых велічыняў |
| 16. Разгляд заявы аб выхадзе з грамадзянства Рэспублікі Беларусь | 10 базавых велічыняў |
| 17. Унясенне змяненняў у раней выдадзеныя дакументы, указаныя ў пунктах 5–13 гэтага дадатку | 0,5 базавай велічыні |
| 18. Выдача дакументаў, указаных у пунктах 1–14 гэтага дадатку, наўзамен страчаных (выкрадзеных) | па стаўках, устаноўленых пунктамі 1–14 гэтага дадатку |
| 19. Разгляд заявы замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства аб выдачы дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь | 2 базавыя велічыні |
| 20. Выдача спецыяльнага дазволу на права ажыццяўлення разавай рэалізацыі тавараў на рынках і (ці) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах ці яго дубліката замежнаму грамадзяніну ці асобе без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ці часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь | 1 базавая велічыня |

| | |
|---|---|
| 21. Выдача спецыяльных дазволаў на права займання працоўнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь | 5 базавых велічыняў |
| 22. Аднаразовае прадаўжэнне тэрміну дзеяння спецыяльных дазволаў на права займання працоўнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 23. Выдача дазволаў на прыцягненне ў Рэспубліку Беларусь замежнай рабочай сілы | 5 базавых велічыняў |
| 24. Аднаразовае прадаўжэнне тэрміну дзеяння дазволаў на прыцягненне ў Рэспубліку Беларусь замежнай рабочай сілы | 3 базавыя велічыні |
| 25. Выдача (абмен) пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь | 1 базавая велічыня |
| 26. Выдача (абмен) нацыянальнага пасведчання асобы марака Рэспублікі Беларусь | 1 базавая велічыня |
| 27. Пасведчанне згод, неабходных для выезду з Рэспублікі Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь | 0,3 базавай велічыні |

Дадатак 22
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі дзяржаўнай пошліны па іншых аб'ектах абкладання дзяржаўнай пошлінай

| Найменне дакументаў і дзеянняў, за якія спаганяецца дзяржаўная пошліна | Стаўкі дзяржаўнай пошліны |
|---|---|
| 1. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 1.1. камерцыйнай арганізацыі (за выключэннем указаных у падпункце 1.2 гэтага пункта) | 1 базавая велічыня |
| 1.2. камерцыйнай арганізацыі, у якой колькасць заснавальнікаў-інвалідаў перавышае 50 працэнтаў, камерцыйнай арганізацыі, якая ствараецца арганізацыяй ветэранаў, таварыствам інвалідаў, а таксама сялянскай (фермерскай) гаспадаркі | 0,8 базавай велічыні |
| 1.3. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут камерцыйнай арганізацыі (установчы дагавор – для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора), за выключэннем указаных у падпункце 1.4 гэтага пункта | 2 базавыя велічыні |
| 1.4. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут камерцыйнай арганізацыі (установчы дагавор – для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора), у якой колькасць заснавальнікаў (удзельнікаў) – інвалідаў перавышае 50 працэнтаў, камерцыйнай арганізацыі, створанай арганізацыяй ветэранаў, таварыствам інвалідаў, а таксама сялянскай (фермерскай) гаспадаркі | 0,5 базавай велічыні |
| 1.5. некамерцыйнай арганізацыі (за выключэннем указаных у пунктах 3, 6, 9, 11, 13 і 14 гэтага дадатку) | 0,5 базавай велічыні |

| | |
|---|---|
| 1.6. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут некамерцыйнай арганізацыі (за выключэннем указаных у пунктах 3, 6, 9, 11, 13 і 14 гэтага дадатку) | 0,25 базавай велічыні |
| 1.7. індывідуальнага прадпрымальніка | 0,5 базавай велічыні |
| 1.8. змяненняў, унесеных у пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка | 0,25 базавай велічыні |
| 2. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за дзяржаўную рэгістрацыю адпаведных юрыдычнай асобы або індывідуальнага прадпрымальніка |
| 3. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 3.1. палітычных партый, іх саюзаў (асацыяцый) і іх сімволікі (гімн, значок, вымпел, гальштук) | 20 базавых велічынь |
| 3.2. рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў, міжнародных грамадскіх аб'яднанняў, рэспубліканскіх прафесійных саюзаў, іх саюзаў (асацыяцый) і іх сімволікі (гімн, значок, вымпел, гальштук) | 10 базавых велічынь |
| 3.3. мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, тэрытарыяльных прафесійных саюзаў, прафесійных саюзаў у арганізацыях, іх саюзаў (асацыяцый) і іх сімволікі (гімн, значок, вымпел, гальштук) | 5 базавых велічынь |
| 3.4. рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў і іх сімволікі, пастаянна дзейных міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, арганізацый, якія забяспечваюць правядзенне медыяцыі, створаных у якасці некамерцыйных арганізацый | 2 базавыя велічыні |
| 3.5. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), пастаянна дзейных міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, арганізацый, якія забяспечваюць правядзенне медыяцыі, створаных у якасці некамерцыйных арганізацый | 30 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за дзяржаўную рэгістрацыю палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый) і іх сімволікі, пастаянна дзейных міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, арганізацый, якія забяспечваюць правядзенне медыяцыі, створаных у якасці некамерцыйных арганізацый |
| 3.6. сімволікі палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, калі яна адбываецца не адначасова з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за іх дзяржаўную рэгістрацыю |

| | |
|---|---|
| 3.7. арганізацыйных структур палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, надзеленых правамі юрыдычнай асобы | 0,2 базавай велічыні |
| 4. Выдача дубліката: | |
| 4.1. пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі, прафесійнага саюза, іншага грамадскага аб'яднання, іх саюза (асацыяцыі), рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання, пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, Беларускай натарыяльнай палаты | 25 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за іх дзяржаўную рэгістрацыю |
| 4.2. статута з адзнакамі аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі, прафесійнага саюза, іншага грамадскага аб'яднання, іх саюза (асацыяцыі), пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, Беларускай натарыяльнай палаты | 25 працэнтаў стаўкі, устаноўленай за іх дзяржаўную рэгістрацыю |
| 5. Пастаноўка на ўлік арганізацыйных структур палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, арганізацый, якія забяспечваюць правядзенне медыяцыі, створаных у якасці адасобленага падраздзялення юрыдычнай асобы | 0,1 базавай велічыні |
| 6. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 6.1. пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці некамерцыйнай арганізацыі | 2 базавыя велічыні |
| 6.2. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статут пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці некамерцыйнай арганізацыі | 30 працэнтаў стаўкі, устаноўленай падпунктам 6.1 гэтага пункта |
| 7. Пастаноўка на ўлік пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці адасобленага падраздзялення (падраздзялення) юрыдычнай асобы | 0,1 базавай велічыні |
| 8. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці некамерцыйнай арганізацыі, дубліката пасведчання аб пастаноўцы на ўлік пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці адасобленага падраздзялення (падраздзялення) юрыдычнай асобы, статута з адзнакамі аб дзяржаўнай рэгістрацыі пастаянна дзейнага трацейскага суда, створанага ў якасці некамерцыйнай арганізацыі | 25 працэнтаў стаўкі, устаноўленай падпунктам 6.1 пункта 6 гэтага дадатку |
| 9. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 9.1. мясцовых фондаў | 5 базавых велічыняў |
| 9.2. рэспубліканскіх і міжнародных фондаў, створаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | 10 базавых велічыняў |
| 9.3. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты: | |
| 9.3.1. мясцовых фондаў | 1 базавая велічыня |

| | |
|---|---|
| 9.3.2. рэспубліканскіх і міжнародных фондаў, створаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | 3 базавыя велічыні |
| 9.4. змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у статуты фондаў у сувязі са змяненнем іх віду | па стаўцы, установленай для дзяржаўнай рэгістрацыі фонду таго віду, які прадугледжаны такімі змяненнямі і (ці) дапаўненнямі |
| 10. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі фонду і (ці) статута з адзнакамі аб дзяржаўнай рэгістрацыі | 25 працэнтаў стаўкі, установленай за дзяржаўную рэгістрацыю фонду |
| 11. Дзяржаўная рэгістрацыя калегіі адвакатаў, адвакацкага бюро, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у іх статуты | 5 базавых велічыняў |
| 12. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі калегіі адвакатаў, адвакацкага бюро | 50 працэнтаў стаўкі, установленай пунктам 11 гэтага дадатку |
| 13. Дзяржаўная рэгістрацыя Палаты падатковых кансультантаў, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у яе статут, выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі | 2 базавыя велічыні |
| 14. Дзяржаўная рэгістрацыя Беларускай натарыяльнай палаты, змяненняў і (ці) дапаўненняў, унесеных у яе статут | 2 базавыя велічыні |
| 15. Дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя): | |
| 15.1. друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, відэа- і кінахранікальных праграм, сеткавых выданняў, іншых формаў (спосабаў) перыядычнага распаўсюджвання прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, акрамя ўказаных у падпунктах 15.2–15.7 гэтага пункта | 40 базавых велічыняў |
| 15.2. друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, відэа- і кінахранікальных праграм, іншых формаў (спосабаў) перыядычнага распаўсюджвання прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі (акрамя радыё- і тэлепраграм), якія спецыялізуюцца на паведамленнях і матэрыялах для дзяцей і падлеткаў, інвалідаў, а таксама адукацыйна-пазнавальнага і культурна-асветнага прызначэння. Указаная спецыялізацыя (тэматыка) у такіх сродках масавай інфармацыі павінна складаць не менш за 90 працэнтаў аб'ёму асобнага нумара (выпуску) сродку масавай інфармацыі | 20 базавых велічыняў |
| 15.3. друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, відэа- і кінахранікальных праграм, іншых формаў (спосабаў) перыядычнага распаўсюджвання прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі (акрамя радыё- і тэлепраграм), якія спецыялізуюцца на паведамленнях і матэрыялах рэкламнага ці эратычнага зместу | 120 базавых велічыняў |
| 15.4. радыё- і тэлепраграм, прадугледжаных для распаўсюджвання на тэрыторыі: | |
| 15.4.1. рэспублікі | 1000 базавых велічыняў |
| 15.4.2. вобласці | 500 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 15.4.3. горада Мінска | 500 базавых велічыняў |
| 15.4.4. абласнога цэнтра | 400 базавых велічыняў |
| 15.4.5. адміністрацыйнага раёна | 300 базавых велічыняў |
| 15.4.6. у межах аднаго населенага пункта | 200 базавых велічыняў |
| 15.5. радыё- і тэлепраграм, якія спецыялізуюцца на паведамленнях і матэрыялах для дзяцей і падлеткаў, інвалідаў, а таксама праграм адукацыйна-пазнавальнага і культурна-асветнага прызначэння. Указаная спецыялізацыя (тэматыка) у такіх праграмах павінна складаць не менш за 90 працэнтаў аб'ёму вяшчання | 10 працэнтаў стаўкі, устаноўленай адпаведна падпунктамі 15.4.1–15.4.6 гэтага пункта |
| 15.6. радыё- і тэлепраграм, якія спецыялізуюцца на паведамленнях і матэрыялах рэкламнага ці эратычнага зместу | 300 працэнтаў стаўкі, устаноўленай адпаведна падпунктамі 15.4.1–15.4.6 гэтага пункта |
| 15.7. радыё-, тэлепраграм і сеткавых выданняў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі | 5 базавых велічыняў |
| 16. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі | 8 базавых велічыняў |
| 17. Дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) выдаўца, вырабляльніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў | 8 базавых велічыняў |
| 18. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабляльніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў | 4 базавыя велічыні |
| 19. Выдача пасведчання на ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці | 8 базавых велічыняў |
| 20. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у пасведчанне на ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці, выдача яго дубліката | 4 базавыя велічыні |
| 21. Дзяржаўная рэгістрацыя асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тытунёвых вырабаў, алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту | 40 базавых велічыняў |
| 22. Перарэгістрацыя асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тытунёвых вырабаў, алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту | 20 базавых велічыняў |
| 23. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі асноўнага тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тытунёвых вырабаў, алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту | 20 базавых велічыняў |
| 24. Дзяржаўная рэгістрацыя (пацвярджэнне дзяржаўнай рэгістрацыі) лекавага сродку, біямедыцынскага клетачнага прадукту, дзяржаўная рэгістрацыя (перарэгістрацыя) медыцынскага вырабу, дзяржаўная рэгістрацыя фармацэўтычнай | 10 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| субстанцыі, ветэрынарнага прэпарата, прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыйнага пасведчання ветэрынарнага прэпарата | |
| 25. Дзяржаўная рэгістрацыя выпуску (дадатковага выпуску) эмісійных каштоўных папер: | |
| 25.1. акцый акцыянернага таварыства (за выключэннем акцыянернага таварыства, створанага шляхам рэарганізацыі іншай асобы, акцыянернага таварыства, да якога далучана іншая юрыдычная асоба, а таксама выпадкаў павелічэння статутнага фонду за кошт уласнага капіталу акцыянернага таварыства) | 0,2 працэнта аб'ёму выпуску (дадатковага выпуску) акцый, але не больш за 300 базавых велічыняў |
| 25.2. акцый акцыянернага таварыства, створанага шляхам рэарганізацыі іншай асобы, або акцыянернага таварыства , да якога далучана іншая юрыдычная асоба | 0,2 працэнта аб'ёму выпуску (дадатковага выпуску) акцый, але не больш за 30 базавых велічыняў |
| 25.3. акцый акцыянернага таварыства, якія эмітуюцца за кошт уласнага капіталу акцыянернага таварыства | 10 базавых велічыняў |
| 25.4. аблігацый | 35 базавых велічыняў за кожны выпуск |
| 26. Унясенне змяненняў у Дзяржаўны рэестр каштоўных папер: | |
| 26.1. пры павелічэнні намінальнага кошту акцый (за выключэннем выпадкаў павелічэння намінальнага кошту акцый за кошт уласнага капіталу акцыянернага таварыства), у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў | 0,2 працэнта павелічэння статутнага фонду, але не больш за 300 базавых велічыняў |
| 26.2. пры павелічэнні намінальнага кошту акцый за кошт уласнага капіталу акцыянернага таварыства, у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў | 10 базавых велічыняў |
| 26.3. пры ўнясенні іншых змяненняў | 10 базавых велічыняў |
| 27. Выдача дубліката пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі выпуску (дадатковага выпуску) каштоўных папер | 2 базавыя велічыні |
| 28. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 28.1. марскога судна | 7 базавых велічыняў |
| 28.2. судна змешанага (рака – мора) плавання | 3,5 базавай велічыні |
| 28.3. судна ўнутранага плавання | 2,5 базавай велічыні |
| 29. Дзяржаўная рэгістрацыя права ўласнасці на судна, якое будуецца, ці на долю ў ім: | |
| 29.1. марскога судна | 7 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 29.2. судна змешанага (рака – мора) плавання | 3,5 базавай велічыні |
| 29.3. судна ўнутранага плавання | 2,5 базавай велічыні |
| 30. Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, у тым ліку іпатэкі, якія падлягаюць унясенню ў Дзяржаўны рэестр марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны суднавы рэестр Рэспублікі Беларусь ці суднавую кнігу: | |
| 30.1. для марскога судна | 1,5 базавай велічыні |
| 30.2. для судна змешанага (рака – мора) плавання | 0,7 базавай велічыні |
| 30.3. для судна ўнутранага плавання | 0,5 базавай велічыні |
| 31. Выдача дубліката дакумента, які пацвярджае факт дзяржаўнай рэгістрацыі: | |
| 31.1. марскога судна | 3,5 базавай велічыні |
| 31.2. судна змешанага (рака – мора) плавання | 1,5 базавай велічыні |
| 31.3. судна ўнутранага плавання | 1,5 базавай велічыні |
| 32. Дзяржаўная рэгістрацыя і класіфікацыя маламернага судна: | |
| 32.1. маламернага грабнога судна | 1 базавая велічыня |
| 32.2. іншага маламернага судна | 2 базавыя велічыні |
| 33. Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў звестак, якія падлягаюць унясенню ў суднавую кнігу для маламернага судна | 1 базавая велічыня |
| 34. Выдача (абмен) пасведчання на права кіравання маторным маламерным суднам, магутнасць рухавіка якога перавышае 3,7 кВт (5 конскіх сіл), міжнароднага пасведчання на права кіравання прагулачным суднам, дублікатаў такіх пасведчанняў | 1 базавая велічыня |
| 35. Выдача дубліката суднавага білета: | |
| 35.1. маламернага вёславага судна | 1 базавая велічыня |
| 35.2. іншага маламернага судна | 2 базавыя велічыні |
| 36. Сертыфікацыя ў грамадзянскай авіяцыі: | |
| 36.1. дзейнасці эксплуатантаў, якія ажыццяўляюць (плануюць) авіяцыйныя перавозкі (працы) на грамадзянскіх паветраных судах: | |

| | |
|---|---|
| 36.1.1. першага і другога класа | 25 базавых велічыняў |
| 36.1.2. трэцяга і чацвёртага класа | 10 базавых велічыняў |
| 36.2. дзейнасці па распрацоўцы і вырабе паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў, паветраных вінтоў, камплектуючых вырабаў да іх і агрэгатаў, авіяцыйных трэнажораў | 10 базавых велічыняў |
| 36.3. дзейнасці па тэхнічным абслугоўванні паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў | 10 базавых велічыняў |
| 36.4. дзейнасці па рамонце паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, пераабсталяванні, выкананні дапрацовак па бюлетэнях распрацоўшчыка і (ці) вырабляльніка | 20 базавых велічыняў |
| 36.5. дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў адпаведнага ўзроўню згодна пераліку пасад авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь | 15 базавых велічыняў |
| 36.6. аэрапортнай дзейнасці | 10 базавых велічыняў |
| 36.7. дзейнасці па абслугоўванні паветранага руху і забеспячэнні паветраных перавозак | 15 базавых велічыняў |
| 36.8. аэрадрома грамадзянскай авіяцыі | 15 базавых велічыняў |
| 37. Сертыфікацыя ў эксперыментальнай авіяцыі: | |
| 37.1. дзейнасці па распрацоўцы і вырабе эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, камплектуючых вырабаў да іх, агрэгатаў і авіяцыйных трэнажораў | 10 базавых велічыняў |
| 37.2. дзейнасці па тэхнічным абслугоўванні эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў | 10 базавых велічыняў |
| 37.3. дзейнасці па рамонце эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, а таксама па іх пераабсталяванні і дапрацоўцы па бюлетэнях распрацоўшчыка і (ці) вырабляльніка | 20 базавых велічыняў |
| 37.4. дзейнасці па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу эксперыментальнай авіяцыі | 15 базавых велічыняў |
| 37.5. аэрадрома эксперыментальнай авіяцыі | 15 базавых велічыняў |
| 38. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 38.1. грамадзянскага паветранага судна: | |
| 38.1.1. першага і другога класа | 7 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 38.1.2. трэцяга і чацвёртага класа | 5 базавых велічыняў |
| 38.1.3. лёгкага і звышлёгкага лятальнага апарата | 2 базавыя велічыні |
| 38.2. аэрадрома грамадзянскай авіяцыі | 5 базавых велічыняў |
| 39. Дзяржаўная рэгістрацыя: | |
| 39.1. эксперыментальнага паветранага судна: | |
| 39.1.1. першага і другога класа | 7 базавых велічыняў |
| 39.1.2. трэцяга і чацвёртага класа | 5 базавых велічыняў |
| 39.1.3. лёгкага, звышлёгкага і беспілотнага лятальнага апарата | 2 базавыя велічыні |
| 39.2. аэрадрома эксперыментальнай авіяцыі | 5 базавых велічыняў |
| 40. Дзяржаўная рэгістрацыя транспартнага сродку (за выключэннем указаных у пункце 46 гэтага дадатку) з выдачай: | |
| 40.1. рэгістрацыйных знакаў: | |
| 40.1.1. аўтамабіля | 2 базавыя велічыні |
| 40.1.2. матацыкла, мапеда, прычэпа, паўпрычэпа | 1 базавая велічыня |
| 40.2. пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку | 1 базавая велічыня |
| 41. Выдача: | |
| 41.1. вадзіцельскага пасведчання | 2 базавыя велічыні |
| 41.2. пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку ў выпадку ўнясення змяненняў у дакументы, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй транспартнага сродку | 1 базавая велічыня |
| 41.3. рэгістрацыйных знакаў у выпадку ўнясення змяненняў у дакументы, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй: | |
| 41.3.1. аўтамабіля | 2 базавыя велічыні |
| 41.3.2. матацыкла, мапеда, прычэпа, паўпрычэпа | 1 базавая велічыня |
| 41.4. часовага дазволу на права кіравання механічным транспартным сродкам у выпадку страты (выкрадання) вадзіцельскага пасведчання | 0,05 базавай велічыні |

| | |
|---|---|
| 41.5. рэгістрацыйных знакаў транспартнага сродку, часова дапушчанага да ўдзелу ў дарожным руху | 1 базавая велічыня |
| 42. Абмен вадзіцельскага пасведчання, а таксама вадзіцельскага пасведчання ўзору Міністэрства ўнутраных спраў СССР | 2 базавыя велічыні |
| 43. Выдача дублікатаў: | |
| 43.1. пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку | 1 базавая велічыня |
| 43.2. вадзіцельскага пасведчання | 3 базавыя велічыні |
| 44. Прыём экзаменаў на права кіравання механічным транспартным сродкам: | |
| 44.1. тэарэтычны кваліфікацыйны экзамен на права кіравання транспартным сродкам | 0,3 базавай велічыні |
| 44.2. практычны кваліфікацыйны экзамен на права кіравання транспартным сродкам: | |
| 44.2.1. матацыклам | 0,7 базавай велічыні |
| 44.2.2. іншым транспартным сродкам (за выключэннем мапеда) | 1 базавая велічыня |
| 45. Узгадненне маршруту перавозкі небяспечных грузаў | 0,5 базавай велічыні |
| 46. Дзяржаўная рэгістрацыя колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны з выдачай: | |
| 46.1. рэгістрацыйнага знака | 1,5 базавай велічыні |
| 46.2. пасведчання аб рэгістрацыі колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны (тэхнічнага пашпарта) | 1 базавая велічыня |
| 46.3. тэхнічнага талона на колавы трактар, прычэп да яго, самаходную машыну юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка | 1 базавая велічыня |
| 47. Выдача: | |
| 47.1. рэгістрацыйнага знака на колавы трактар, прычэп да яго, самаходную машыну наўзамен таго, якi страчаны (выкрадзены) ці прыйшоў у непрыдатнасць | 3 базавыя велічыні |
| 47.2. пасведчання трактарыста-машыніста | 2 базавыя велічыні |
| 47.3. новага талона да пасведчання трактарыста-машыніста | 0,5 базавай велічыні |
| 47.4. часовага дазволу на права кіравання колавым трактарам, самаходнай машынай у выпадку страты (выкрадання) пасведчання трактарыста-машыніста, а таксама пасведчання трактарыста-машыніста (з катэгорыямі), выдадзенага на тэрыторыі рэспублік былога СССР | 0,1 базавай велічыні |

| | |
|---|---|
| 47.5. тэхнічнага талона на колавы трактар, прычэп да яго, самаходную машыну юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка ў выпадку ўнясення змяненняў у дакументы, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны | 2 базавыя велічыні |
| 47.6. дублікатаў: | |
| 47.6.1. пасведчання аб рэгістрацыі колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны (тэхнічнага пашпарта) | 1,5 базавай велічыні |
| 47.6.2. тэхнічнага талона на колавы трактар, прычэп да яго, самаходную машыну юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка | 1,5 базавай велічыні |
| 47.6.3. пасведчання трактарыста-машыніста наўзамен страчанага (выкрадзенага), а таксама пасведчання трактарыста-машыніста (з катэгорыямі), выдадзенага на тэрыторыі рэспублік былога СССР | 3 базавыя велічыні |
| 47.6.4. дакумента завода-вырабляльніка (пашпарта-дубліката) | 1 базавая велічыня |
| 48. Абмен пасведчання трактарыста-машыніста, а таксама пасведчанняў трактарыста-машыніста (з катэгорыямі), выдадзеных на тэрыторыі рэспублік былога СССР | 1 базавая велічыня |
| 49. Абмен пасведчання аб рэгістрацыі колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны (тэхнічнага пашпарта) | 1 базавая велічыня |
| 50. Унясенне змяненняў у дакументы, звязаныя з дзяржаўнай рэгістрацыяй, зняццем з уліку, пастаноўкай на часовы ўлік колавага трактара, прычэпа да яго, самаходнай машыны | 0,1 базавай велічыні |
| 51. Прыём кваліфікацыйных экзаменаў на права кіравання колавым трактарам, самаходнай машынай: | |
| 51.1. па правілах дарожнага руху | 0,1 базавай велічыні |
| 51.2. па правілах тэхнічнай эксплуатацыі колавых трактароў, самаходных машын | 0,1 базавай велічыні |
| 51.3. па кіраванні колавых трактароў, самаходных машын | 0,2 базавай велічыні |
| 52. Правядзенне дзяржаўнага тэхнічнага агляду: | |
| 52.1. колавага трактара, самаходнай машыны | 0,3 базавай велічыні |
| 52.2. прычэпа да колавага трактара | 0,2 базавай велічыні |
| 53. Правядзенне тэхнічнай экспертызы самаробнага трактара, малагабарытнага трактара, мотаблока, прычэпа да іх | 2 базавыя велічыні |
| 54. Рэгістрацыя ў якасці рэзідэнта свабоднай эканамічнай зоны | 50 базавых велічыняў |
| 55. Выдача пасведчання кіраўніка некамерцыйнай арганізацыі | 1 базавая велічыня |

| | |
|---|---|
| 56. Выдача (прадаўжэнне тэрміну дзеяння) дазволу на адкрыццё прадстаўніцтва: | |
| 56.1. замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь, за выключэннем указаных у падпункце 56.2 гэтага пункта | 65 базавых велічыняў за кожны год дзеяння дазволу |
| 56.2. некамерцыйнай замежнай арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама замежнай арганізацыі, якая ажыццяўляе выключна дабрачынную дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | 20 базавых велічыняў за кожны год дзеяння дазволу |
| 57. Выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці, за выключэннем указаных у пунктах 59, 63, 65 і 67 гэтага дадатку | 10 базавых велічыняў |
| 58. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці, выдача яго (яе) дубліката, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 60–62, 64, 66–68 і 70 гэтага дадатку, прадаўжэнне тэрміну дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), які выдаецца на ажыццяўленне відаў дзейнасці, звязаных са спецыфічнымі таварамі (працамі, паслугамі) | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай пунктам 57 гэтага дадатку |
| 59. Выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці: | |
| 59.1. банку, за выключэннем указанага ў падпункце 59.2 гэтага пункта | 2200 базавых велічыняў |
| 59.2. банку, які ствараецца шляхам рэарганізацыі банка (банкаў) | 550 базавых велічыняў |
| 59.3. нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі | 1100 базавых велічыняў |
| 60. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у пералік банкаўскіх аперацый, указаны ў спецыяльным дазволе (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, у мэтах атрымання права на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый: | |
| 60.1. па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, на рахункі і (ці) ва ўклады (дэпазіты) | 1100 базавых велічыняў |
| 60.2. на ажыццяўленне іншых банкаўскіх аперацый | 500 базавых велічыняў |
| 61. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, не звязаных са змяненнем указанага ў ім пераліку банкаўскіх аперацый | 4 базавыя велічыні |
| 62. Выдача дубліката спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці | 200 базавых велічыняў |
| 63. Выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на аптовы гандаль і захоўванне алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту і тытунёвых вырабаў: | |
| 63.1. складаючай працай і паслугай (адной са складаючых прац і паслуг) якога з'яўляюцца аптовы гандаль алкагольнымі напоямі і (ці) аптовы гандаль тытунёвымі вырабамі | 1300 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 63.2. складаючай працай і паслугай якога не з'яўляецца дзейнасць, указаная ў падпункце 63.1 гэтага пункта | 10 базавых велічыняў |
| 64. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на аптовы гандаль і захоўванне алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, нехарчовага этылавага спірту і тытунёвых вырабаў у частцы: | |
| 64.1. уключэння аптовага гандлю алкагольнымі напоямі і (ці) аптовага гандлю тытунёвымі вырабамі ў якасці складаючай працы і паслугі, у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў | 1300 базавых велічыняў |
| 64.2. уключэння гандлёвых аб'ектаў, складскіх памяшканняў, дзе прадугледжваецца захоўванне алкагольных напояў і (ці) захоўванне тытунёвых вырабаў па дагаворах захоўвання і ў якіх (з выкарыстаннем якіх) прадугледжваецца ажыццяўленне аптовага гандлю алкагольнымі напоямі і (ці) аптовага гандлю тытунёвымі вырабамі, у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў | 650 базавых велічыняў за кожны гандлёвы аб'ект або складское памяшканне |
| 64.3. унясення іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў, не ўказаных у падпунктах 64.1 і 64.2 гэтага пункта (за выключэннем выпадкаў, калі такія змяненні і (ці) дапаўненні ўносяцца адначасова з унясеннем змяненняў і (ці) дапаўненняў, прадугледжаных у падпунктах 64.1 і 64.2 гэтага пункта) | 4 базавыя велічыні |
| 65. Выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на рознічны гандаль алкагольнымі напоямі і (ці) тытунёвымі вырабамі | 38 базавых велічыняў |
| 66. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на рознічны гандаль алкагольнымі напоямі і (ці) тытунёвымі вырабамі ў частцы: | |
| 66.1. уключэння рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі ці рознічнага гандлю тытунёвымі вырабамі ў якасці складаючай працы і паслугі і (ці) уключэння гандлёвых аб'ектаў, у якіх суіскальнік ліцэнзіі збіраецца ажыццяўляць рознічны гандаль, аб'ектаў грамадскага харчавання, у якіх суіскальнік ліцэнзіі збіраецца ажыццяўляць продаж алкагольных напояў і (ці) тытунёвых вырабаў, у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў | 19 базавых велічыняў |
| 66.2. унясення іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў, не ўказаных у падпункце 66.1 гэтага пункта, за выключэннем выпадкаў, калі такія змяненні і (ці) дапаўненні ўносяцца адначасова з унясеннем змяненняў і (ці) дапаўненняў, прадугледжаных у падпункце 66.1 гэтага пункта | 4 базавыя велічыні |
| 67. Выдача спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу | 500 базавых велічыняў |
| 68. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу, звязаных са змяненнем указаных у ім складаючых прац і паслуг, месцазнаходжання ігральных устаноў (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 69 гэтага дадатку), у тым ліку пры адначасовым унясенні іншых змяненняў і (ці) дапаўненняў | 50 працэнтаў стаўкі, устаноўленай у пункце 67 гэтага дадатку |

| | |
|---|---|
| 69. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу, не звязаных са змяненнем указаных у ім складаючых прац і паслуг, месцазнаходжання ігральных устаноў і (ці) звязаных з іх выключэннем | 10 базавых велічыняў |
| 70. Выдача дубліката спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу | 50 базавых велічыняў |
| 71. Выдача пасведчання на права ажыццяўлення знешнегандлёвай дзейнасці ў адносінах да спецыфічных тавараў (прац, паслуг), яго пераафармленне | 20 базавых велічыняў |
| 72. Выдача разавых і генеральных ліцэнзій на ўвоз (імпарт) прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, і вываз (экспарт) спецыфічных тавараў (прац, паслуг) | 10 базавых велічыняў |
| 73. Выдача разавых ліцэнзій на рэімпарт, увоз на перапрацоўку, часовы ўвоз прадукцыі ваеннага прызначэння, тавараў (прац, паслуг), якія кантралююцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, на рээкспарт, вываз на перапрацоўку, часовы вываз, у тым ліку ў выпадку здачы ў арэнду, спецыфічных тавараў (прац, паслуг), унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у ліцэнзію, выдача дубліката ліцэнзіі, выдача імпартнага сертыфіката і яго дубліката, а таксама ліцэнзіі на аказанне пасрэдніцкіх паслуг юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, звязаных з перамяшчэннем спецыфічных тавараў з адной замежнай дзяржавы ў іншую | 5 базавых велічыняў |
| 74. Выдача ліцэнзіі на ўвоз (вываз) хімікатаў, якія падпадаюць пад рэжым кантролю Канвенцыі аб забароне распрацоўкі, вытворчасці, назапашвання і прымянення хімічнай зброі і аб яе знішчэнні | 5 базавых велічыняў |
| 75. Выдача дубліката ліцэнзіі на ўвоз (вываз) хімікатаў, якія падпадаюць пад рэжым кантролю Канвенцыі аб забароне распрацоўкі, вытворчасці, назапашвання і прымянення хімічнай зброі і аб яе знішчэнні, унясенне ў яе змяненняў і (ці) дапаўненняў, прадаўжэнне тэрміну яе дзеяння | 2,5 базавай велічыні |
| 76. Выдача (афармленне) ліцэнзіі на экспарт і (ці) імпарт тавараў: | |
| 76.1. разавай ліцэнзіі | 5 базавых велічыняў |
| 76.2. генеральнай або выключнай ліцэнзіі | 10 базавых велічыняў |
| 77. Выдача дубліката ліцэнзіі на экспарт і (ці) імпарт тавараў: | |
| 77.1. разавай ліцэнзіі | 2,5 базавай велічыні |
| 77.2. генеральнай або выключнай ліцэнзіі | 5 базавых велічыняў |
| 78. Выдача заключэнняў (дазвольных дакументаў) на ўвоз і (ці) вываз небяспечных адходаў, абмежаваных да перамяшчэння праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь пры ўвозе і (ці) вывазе на падставах неэканамічнага характару: | |

| | |
|---|---|
| 78.1. увоз у Рэспубліку Беларусь | 6 базавых велічыняў |
| 78.2. перамяшчэнне транзітам праз Рэспубліку Беларусь | 5 базавых велічыняў |
| 78.3. вываз з Рэспублікі Беларусь | 4 базавыя велічыні |
| 79. Выдача заключэння (дазвольнага дакумента) на вываз культурных каштоўнасцей ці пісьмовага паведамлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб тым, што заключэнне (дазвольны дакумент) на вываз культурных каштоўнасцей не патрабуецца: | |
| 79.1. рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей: | |
| 79.1.1. адной гісторыка -культурнай каштоўнасці | 1 базавая велічыня |
| 79.1.2. дзвюх і больш гісторыка -культурных каштоўнасцей | 1,5 базавай велічыні |
| 79.2. іншых рухомых матэрыяльных культурных каштоўнасцей: | |
| 79.2.1. адной – чатырох культурных каштоўнасцей | 1 базавая велічыня |
| 79.2.2. пяці – дваццаці культурных каштоўнасцей | 1,5 базавай велічыні |
| 79.2.3. дваццаці адной і больш культурных каштоўнасцей | 3 базавыя велічыні |
| 79.2.4. аўтару культурных каштоўнасцей: | |
| адной – чатырох культурных каштоўнасцей | 0,5 базавай велічыні |
| пяці і больш культурных каштоўнасцей | 1 базавая велічыня |
| 80. Паўторная выдача заключэння (дазвольнага дакумента) на вываз культурных каштоўнасцей або пісьмовага паведамлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб тым, што заключэнне (дазвольны дакумент) на вываз культурных каштоўнасцей не патрабуецца, на працягу каляндарнага года таму ж заяўніку на вываз тых жа: | |
| 80.1. адной – чатырох культурных каштоўнасцей | 0,5 базавай велічыні |
| 80.2. пяці і больш культурных каштоўнасцей | 1 базавая велічыня |
| 81. Выдача дазволаў на набыццё, захоўванне, захоўванне і нашэнне зброі, сертыфікатаў адпаведнасці зброі і боепрыпасаў: | |
| 81.1. для юрыдычных асоб: | |
| 81.1.1. дазволу на набыццё службовай і грамадзянскай зброі, боепрыпасаў (для юрыдычных асоб – пастаўшчыкоў) | 5 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 81.1.2. дазволу на набыццё зброі, боепрыпасаў (для юрыдычных асоб, якія займаюцца вытворчасцю, рамонтам зброі, яго складовых частак і кампанентаў, боепрыпасаў) | 5 базавых велічыняў |
| 81.1.3. дазволу на набыццё спартыўнай і паляўнічай зброі (для ўстаноў адукацыі і арганізацый фізічнай культуры і спорту) | 1 базавая велічыня |
| 81.1.4. дазволу на набыццё паляўнічай зброі (для арганізацый, якія вядуць паляўнічую гаспадарку) | 1 базавая велічыня |
| 81.1.5. дазволу на захоўванне службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасаў да яе | 6 базавых велічыняў |
| 81.1.6. сертыфіката адпаведнасці на службовую і грамадзянскую зброю, боепрыпасы, а таксама канструктыўна падобныя да зброі вырабы | 2 базавыя велічыні |
| 81.2. для фізічных асоб – грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь: | |
| 81.2.1. дазволу на набыццё грамадзянскай зброі (самаабароны, спартыўнай, паляўнічай і сігнальнай зброі) | 1 базавая велічыня за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 81.2.2. дазволу на захоўванне і нашэнне грамадзянскай зброі | 2 базавыя велічыні за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 81.2.3. сертыфіката адпаведнасці на службовую і грамадзянскую зброю, боепрыпасы, а таксама канструктыўна падобныя са зброяй вырабы | 1 базавая велічыня |
| 81.3. дазволу на набыццё грамадзянскай зброі для фізічных асоб – замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ці часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь | 1 базавая велічыня за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 82. Прадаўжэнне тэрміну дзеяння дазволаў на набыццё, захоўванне, захоўванне і нашэнне зброі: | |
| 82.1. для юрыдычных асоб: | |
| 82.1.1. дазволу на набыццё службовай і грамадзянскай зброі, боепрыпасаў (для юрыдычных асоб – пастаўшчыкоў) | 2 базавыя велічыні |
| 82.1.2. дазволу на набыццё зброі, боепрыпасаў (для юрыдычных асоб, якія займаюцца вытворчасцю, рамонтам зброі, яго складовых частак і кампанентаў, боепрыпасаў) | 2 базавыя велічыні |
| 82.1.3. дазволу на набыццё спартыўнай і паляўнічай зброі (для ўстаноў адукацыі і арганізацый фізічнай культуры і спорту) | 0,5 базавай велічыні |
| 82.1.4. дазволу на набыццё паляўнічай зброі (для арганізацый, якія вядуць паляўнічую гаспадарку) | 0,5 базавай велічыні |
| 82.1.5. дазволу на захоўванне службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасаў да яе | 3 базавыя велічыні |

| | |
|---|---|
| 82.2. для фізічных асоб – грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь: | |
| 82.2.1. дазволу на набыццё грамадзянскай зброі (самаабароны, спартыўнай, паляўнічай і сігнальнай зброі) | 0,5 базавай велічыні за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 82.2.2. дазволу на захоўванне і нашэнне грамадзянскай зброі | 1 базавая велічыня за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 82.3. дазволу на набыццё грамадзянскай зброі для фізічных асоб – замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ці часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь | 0,5 базавай велічыні за кожную адзінку грамадзянскай зброі |
| 83. Уключэнне звестак аб службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасах у Дзяржаўны кадастр службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасаў: | |
| 83.1. для арганізацый | 1 базавая велічыня |
| 83.2. для фізічных асоб | 0,5 базавай велічыні |
| 84. Выдача заключэння (дазвольнага дакумента) на часовы ўвоз і часовы вываз паляўнічай зброі і боепрыпасаў да яе замежнымі грамадзянамі для ўдзелу ў паляванні | 2 базавыя велічыні за кожную адзінку паляўнічай агнястрэльнай, пнеўматычнай і кідальнай зброі |
| 85. Выдача пропускаў на права ўезду (уваходу), часовага знаходжання, перасоўвання ў пагранічнай зоне замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, выдача пропускаў на права ўезду (уваходу), часовага знаходжання, перасоўвання ў пагранічнай паласе | 0,4 базавай велічыні |
| 86. Выдача пропускаў на права пазачарговага ўезду на тэрыторыю аўтадарожных пунктаў пропуску праз дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь: | |
| 86.1. юрыдычным і фізічным асобам тэрмінам дзеяння на: | |
| 86.1.1. аднаразовы ўезд | 5 базавых велічыняў |
| 86.1.2. 1 месяц | 15 базавых велічыняў |
| 86.1.3. 3 месяцы | 25 базавых велічыняў |
| 86.1.4. 6 месяцаў | 50 базавых велічыняў |
| 86.1.5. 1 год | 100 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 86.2. юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, якія ажыццяўляюць міжнародныя грузавыя перавозкі, на адзін грузавы транспартны сродак тэрмінам дзеяння на: | |
| 86.2.1. 1 месяц | 25 базавых велічыняў |
| 86.2.2. 6 месяцаў | 100 базавых велічыняў |
| 86.2.3. 1 год | 150 базавых велічыняў |
| 87. Выдача (афармленне) дакументаў, якія сведчаць права карыстання, пажыццёвага атрыманага ў спадчыну валодання зямельным участкам, права арэнды зямельнага ўчастка, права ўласнасці на зямельны ўчастак: | |
| 87.1. арганізацыям | 2 базавыя велічыні |
| 87.2. фізічным асобам | 0,5 базавай велічыні |
| 88. Выдача сертыфіката імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» і пераафармленне імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць», «Жыллё»: | |
| 88.1. выдача сертыфіката імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» | 0,15 базавай велічыні |
| 88.2. пераафармленне імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» | 0,03 базавай велічыні |
| 88.3. пераафармленне імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» ў чэкі «Маёмасць» | 0,02 базавай велічыні |
| 89. Даванне права на паляванне | 1 базавая велічыня за кожны год палявання |
| 90. Даванне па кожным суб'екце інфармацыі, якая змяшчаецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным суднавым рэестры Рэспублікі Беларусь ці суднавай кнізе, рэестры спецыяльных дазволаў (ліцэнзій), Дзяржаўным рэестры грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры палітычных партый, саюзаў (асацыяцый) палітычных партый, рэестрах мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый) мясцовых грамадскіх аб'яднанняў, Дзяржаўным рэестры прафесійных саюзаў, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў, рэестрах тэрытарыяльных прафесійных саюзаў, прафесійных саюзаў арганізацый, саюзаў (асацыяцый) прафесійных саюзаў | 1 базавая велічыня за кожны экзэмпляр выпіскі |
| 91. Даванне па кожнай фізічнай асобе персанальных даных фізічных асоб з рэгістра насельніцтва | 1 базавая велічыня за кожную даведку (выпіску) |
| 92. Даванне абязлічаных персанальных даных фізічных асоб з рэгістра насельніцтва | 300 базавых велічыняў |
| 93. Вылучэнне рэсурсу нумарацыі, узгадненне перадачы рэсурсу нумарацыі: | |

| | |
|---|---|
| 93.1. нумара абанента з зоны нумарацыі | 0,03 базавай велічыні |
| 93.2. зон нумарацыі | 2600 базавых велічыняў |
| 94. Пастаўленне апастыля на афіцыйным дакуменце, складзеным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | 0,5 базавай велічыні |
| 95. Рэгістрацыя па месцы жыхарства ці месцы знаходжання грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь | 0,5 базавай велічыні |
| 96. Узгадненне правілаў страхавання па кожным відзе добраахвотнага страхавання, змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў іх, звязаных з унясеннем змяненняў і (ці) дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне страхавой дзейнасці | 30 базавых велічыняў |
| 97. Узгадненне змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў правілы страхавання па кожным відзе добраахвотнага страхавання, не звязаных з унясеннем змяненняў ці дапаўненняў у спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне страхавой дзейнасці | 20 базавых велічыняў |
| 98. Дзяржаўная рэгістрацыя рэкламнай гульні | 5 базавых велічыняў |
| 99. Выдача пасведчання аб рэгістрацыі электроннай інтэрактыўнай гульні | 30 базавых велічыняў |
| 100. Выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі электроннай інтэрактыўнай гульні | 3 базавыя велічыні |
| 101. Выдача пасведчання аб рэгістрацыі латарэі | 30 базавых велічыняў |
| 102. Выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі латарэі | 3 базавыя велічыні |
| 103. Выдача пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на сцэнічных пляцоўках ці ў спецыяльна не прызначаных для гэтых мэт месцах пад адкрытым небам або ў памяшканні з праектнай умяшчальнасцю зыходзячы з колькасці месцаў, а пры яе адсутнасці – зыходзячы з планаванай для рэалізацыі колькасці ўваходных білетаў: | |
| 1–150 месцаў (уваходных білетаў) | 3 базавыя велічыні |
| 151–300 месцаў (уваходных білетаў) | 10 базавых велічыняў |
| 301–500 месцаў (уваходных білетаў) | 30 базавых велічыняў |
| 501–1000 месцаў (уваходных білетаў) | 50 базавых велічыняў |
| 1001–1500 месцаў (уваходных білетаў) | 80 базавых велічыняў |
| 1501–2000 месцаў (уваходных білетаў) | 100 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 2001–3000 месцаў (уваходных білетаў) | 150 базавых велічыняў |
| больш за 3000 месцаў (уваходных білетаў) | 200 базавых велічыняў |
| 104. Выдача пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на сцэнічных пляцоўках ці ў спецыяльна не прызначаных для гэтых мэт месцах пад адкрытым небам або ў памяшканні пры адсутнасці праектнай умяшчальнасці і рэалізацыі ўваходных білетаў | 3 базавыя велічыні |
| 105. Выдача сертыфіката прафесійнага бухгалтара, сертыфіката прафесійнага бухгалтара банка | 8 базавых велічыняў |
| 106. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у сертыфікат прафесійнага бухгалтара, сертыфікат прафесійнага бухгалтара банка | 4 базавыя велічыні |
| 107. Выдача дубліката сертыфіката прафесійнага бухгалтара, сертыфіката прафесійнага бухгалтара банка | 5 базавых велічыняў |
| 108. Выдача кваліфікацыйнага атэстата аўдытара, пасведчання аб атэстацыі ацэншчыка | 8 базавых велічыняў |
| 109. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у кваліфікацыйны атэстат аўдытара, у пасведчанне аб атэстацыі ацэншчыка, прадаўжэнне тэрміну дзеяння пасведчання аб атэстацыі ацэншчыка | 4 базавыя велічыні |
| 110. Выдача дубліката кваліфікацыйнага атэстата аўдытара, пасведчання аб атэстацыі ацэншчыка | 5 базавых велічыняў |
| 111. Правядзенне атэстацыі з выдачай пасведчання эксперта ў галіне прамысловай бяспекі | 1 базавая велічыня |
| 112. Атэстацыя спецыялістаў | 6 базавых велічыняў |
| 113. Пераатэстацыя спецыялістаў (паўторнае праходжанне атэстацыі) | 2 базавыя велічыні |
| 114. Унясенне змяненняў у атэстацыйны дакумент, прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння | 2 базавыя велічыні |
| 115. Выдача дубліката атэстацыйнага дакумента | 2 базавыя велічыні |
| 116. Прыём кваліфікацыйнага экзамену ў фізічнай асобы, якая прэтэндуе на атрыманне кваліфікацыйнага атэстата падатковага кансультанта | 5 базавых велічыняў |
| 117. Разгляд заявы аб заключэнні пагаднення аб цэнаўтварэнні для мэт падаткаабкладання | 500 базавых велічыняў |
| 118. Выдача дазволу на праезд па тэрыторыях замежных дзяржаў, у тым ліку дзяржаў – удзельніц СНД, аўтамабільных транспартных сродкаў Рэспублікі Беларусь, якія выконваюць міжнародныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў і грузаў | 1 базавая велічыня |
| 119. Выдача шматразовага дазволу тэрмінам дзеяння 1 год на праезд па тэрыторыях замежных дзяржаў аўтамабільных транспартных сродкаў Рэспублікі Беларусь, якія выконваюць міжнародныя аўтамабільныя перавозкі грузаў | 20 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| 120. Выдача шматразовага (з абмежаванай колькасцю паездак) дазволу на праезд па тэрыторыях замежных дзяржаў аўтамабільных транспартных сродкаў Рэспублікі Беларусь, якія выконваюць міжнародныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў: | |
| 120.1. да 5 паездак уключна | 2,5 базавай велічыні |
| 120.2. да 10 паездак уключна | 5 базавых велічыняў |
| 120.3. да 15 паездак уключна | 7 базавых велічыняў |
| 120.4. да 20 паездак уключна | 9 базавых велічыняў |
| 121. Выдача дазволу Еўрапейскай канферэнцыі міністраў транспарту тэрмінам дзеяння: | |
| 121.1. 1 месяц | 3,5 базавай велічыні |
| 121.2. 1 год без абмежаванняў на праезд па тэрыторыях асобных дзяржаў | 30 базавых велічыняў |
| 121.3. 1 год з абмежаваннямі на праезд па тэрыторыях асобных дзяржаў | 20 базавых велічыняў |
| 122. Выдача дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху: | |
| 122.1. арганізацыі за: | |
| 122.1.1. легкавы аўтамабіль, які мае дазволеную максімальную масу: | |
| не большую за 1 тону | 7 базавых велічыняў |
| большую за 1 тону, але не большую за 2 тоны | 9 базавых велічыняў |
| большую за 2 тоны, але не большую за 3 тоны | 11 базавых велічыняў |
| большую за 3 тоны | 14 базавых велічыняў |
| 122.1.2. прычэп, які мае дазволеную максімальную масу: | |
| не большую за 0,75 тоны | 5 базавых велічыняў |
| большую за 0,75 тоны | 12 базавых велічыняў |
| 122.1.3. прычэп-дачу (караван) | 5 базавых велічыняў |
| 122.1.4. грузавы аўтамабіль, аўтамабіль-цягач, грузапасажырскі аўтамабіль, які мае дазволеную максімальную масу: | |

| | |
|---|---|
| не большую за 2,5 тоны | 12 базавых велічыняў |
| большую за 2,5 тоны, але не большую за 3,5 тоны | 17 базавых велічыняў |
| большую за 3,5 тоны, але не большую за 12 тон | 22 базавыя велічыні |
| большую за 12 тон | 25 базавых велічыняў |
| 122.1.5. аўтобус з колькасцю пасадачных месцаў: | |
| да 20 уключна | 12 базавых велічыняў |
| ад 21 да 40 уключна | 17 базавых велічыняў |
| большай за 40 | 22 базавыя велічыні |
| 122.1.6. матацыкл | 3 базавыя велічыні |
| 122.1.7. седлавы цягач | 20 базавых велічыняў |
| 122.2. фізічнай асобе за: | |
| 122.2.1. легкавы аўтамабіль, які мае дазволеную максімальную масу: | |
| не большую за 1,5 тоны | 3 базавыя велічыні |
| большую за 1,5 тоны, але не большую за 2 тоны | 6 базавых велічыняў |
| большую за 2 тоны, але не большую за 3 тоны | 8 базавых велічыняў |
| большую за 3 тоны | 11 базавых велічыняў |
| 122.2.2. прычэп, які мае дазволеную максімальную масу: | |
| не большую за 0,75 тоны | 2 базавыя велічыні |
| большую за 0,75 тоны | 11 базавых велічыняў |
| 122.2.3. прычэп-дачу (караван) | 2 базавыя велічыні |
| 122.2.4. грузавы аўтамабіль, аўтамабіль-цягач, грузапасажырскі аўтамабіль, які мае дазволеную максімальную масу: | |
| не большую за 2,5 тоны | 8 базавых велічыняў |

| | |
|---|---|
| большую за 2,5 тоны, але не большую за 3,5 тоны | 17 базавых велічыняў |
| большую за 3,5 тоны, але не большую за 12 тон | 22 базавыя велічыні |
| большую за 12 тон | 25 базавых велічыняў |
| 122.2.5. аўтобус з колькасцю пасадачных месцаў: | |
| да 20 уключна | 12 базавых велічыняў |
| ад 21 да 40 уключна | 17 базавых велічыняў |
| большай за 40 | 22 базавыя велічыні |
| 122.2.6. матацыкл | 2 базавыя велічыні |
| 122.2.7. седлавы цягач | 20 базавых велічыняў |
| 123. Выдача дазволаў на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, захоўванне і пахаванне адходаў вытворчасці, спецыяльнае водакарыстанне | 8 базавых велічыняў |
| 124. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на спецыяльнае водакарыстанне, прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння, выдача дубліката гэтага дазволу, унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на захоўванне і пахаванне адходаў вытворчасці, выдача дубліката гэтага дазволу, унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у дазвол на выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння | 4 базавыя велічыні |
| 125. Выдача комплекснага прыродаахоўнага дазволу | 20 базавых велічыняў |
| 126. Унясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у комплекснае прыродаахоўнае дазвол, прадаўжэнне тэрміну яго дзеяння, выдача дубліката такога дазволу | 8 базавых велічыняў |

Дадатак 23
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

## Стаўкі патэнтных пошлін

| Юрыдычна значныя дзеянні, за здзяйсненне якіх спаганяецца патэнтная пошліна | Стаўка патэнтнай пошліны ў базавых велічынях (калі не ўказана іншае) |
|---|---|
| 1. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай вынаходстваў: | |
| 1.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на: | |

| | |
|---|---|
| адно вынаходства | 3,5 |
| групу вынаходстваў | 3,5 і дадаткова 1,5 за кожнае вынаходства больш за адно |
| 1.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка | 3 |
| 1.3. аднаўленне права канвенцыйнага прыярытэту па заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства па хадайніцтве заяўніка | 3 |
| 1.4. падача еўразійскай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, праверка яе на адпаведнасць патрабаванням экспертызы па фармальных прыкметах і перасылка ў Еўразійскае патэнтнае ведамства | 3,5 |
| 1.5. публікацыя звестак аб заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства, якая прайшла папярэднюю экспертызу са станоўчым вынікам, да сканчэння васямнаццаці месяцаў з даты паступлення заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства | 3,5 |
| 1.6. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства ў адносінах да: | |
| аднаго вынаходства, якое змяшчае да дзесяці (уключна) залежных пунктаў формулы | 17 |
| аднаго вынаходства, якое змяшчае больш за дзесяць залежных пунктаў формулы | 17 і дадаткова 1,5 за кожны залежны пункт формулы больш за дзесяць |
| групы вынаходстваў | 17 і дадаткова 10 за кожны незалежны пункт формулы больш за адзін |
| 1.7. унясенне змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства па ініцыятыве заяўніка ці па запыце экспертызы, якія прадугледжваюць: | |
| уключэнне ў формулу вынаходства пунктаў, якія адсутнічаюць у першапачаткова пададзенай і прынятай да разгляду формуле | 1,5 і дадаткова 1,5 за кожны новы незалежны пункт формулы |
| уключэнне пунктаў у формулу вынаходства пасля падачы хадайніцтва аб правядзенні патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства | 1,5 і дадаткова 10 за кожны новы незалежны пункт формулы, 1 за кожны новы залежны пункт формулы больш за дзесяць |
| 1.8. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка, за выключэннем выпадкаў, указаных у падпункце 1.7 гэтага пункта | 1,5 |
| 1.9. пераўтварэнне заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства ў заяўку на выдачу патэнта на карысную мадэль | 3,5 |

| | |
|---|---|
| 1.10. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на вынаходства за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да трох месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 1 |
| ад трох да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3,5 |
| 1.11. правядзенне паўторнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства | 7 |
| 1.12. рэгістрацыя вынаходства ў Дзяржаўным рэестры вынаходстваў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на вынаходства | 7 |
| 1.13. падтрыманне ў сіле патэнта на вынаходства па гадах: | |
| першы | – |
| другі | – |
| трэці | 3,5 |
| чацвёрты | 3,5 |
| пяты | 5 |
| шосты | 5 |
| сёмы | 7 |
| восьмы | 7 |
| дзявяты | 8,5 |
| дзясяты | 8,5 |
| адзінаццаты | 10 |
| дванаццаты | 10 |
| трынаццаты | 12 |
| чатырнаццаты | 12 |
| пятнаццаты | 13,5 |

| | |
|---|---|
| шаснаццаты | 13,5 |
| сямнаццаты | 15,5 |
| васямнаццаты | 15,5 |
| дзевятнаццаты | 17 |
| дваццаты | 17 |
| дваццаць першы | 23 |
| дваццаць другі | 23 |
| дваццаць трэці | 23 |
| дваццаць чацвёрты | 23 |
| дваццаць пяты | 23 |
| 1.14. падтрыманне ў сіле еўразійскага патэнта на вынаходства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь | па стаўках гадавых пошлін за падтрыманне ў сіле патэнта на вынаходства ў адпаведнасці з падпунктам 1.13 гэтага пункта |
| 1.15. перасылка заявачных дакументаў міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці | 3,5 |
| 1.16. нясвоечасовае ўступленне на нацыянальную стадыю па віне заяўніка міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі | 13,5 |
| 1.17. перавод на нацыянальную стадыю міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі | у памеры патэнтных пошлін за падачу і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства |
| 1.18. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на вынаходства | 13,5 |
| 1.19. аднаўленне дзеяння патэнта на вынаходства | 13,5 |
| 2. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай карысных мадэляў: | |
| 2.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на: | |

| | |
|---|---|
| адну карысную мадэль, якая змяшчае да дзесяці (уключна) залежных пунктаў формулы | 7 |
| адну карысную мадэль, якая змяшчае больш за дзесяць залежных пунктаў формулы | 7 і дадаткова 1,5 за кожны залежны пункт формулы больш за дзесяць |
| групу карысных мадэляў | 7 і дадаткова 3,5 за кожную карысную мадэль больш за адну |
| 2.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка | 3 |
| 2.3. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка | 1,5 |
| 2.4. пераўтварэнне заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль у заяўку на выдачу патэнта на вынаходства | 3,5 |
| 2.5. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на карысную мадэль за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да трох месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 1 |
| ад трох да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3,5 |
| 2.6. рэгістрацыя карыснай мадэлі ў Дзяржаўным рэестры карысных мадэляў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на карысную мадэль | 7 |
| 2.7. падтрыманне ў сіле патэнта на карысную мадэль па гадах: | |
| першы | 3 |
| другі | 3 |
| трэці | 3 |
| чацвёрты | 4 |
| пяты | 4 |
| шосты | 4 |
| сёмы | 7 |
| восьмы | 7 |

| | |
|---|---|
| дзявяты | 7 |
| дзясяты | 7 |
| 2.8. нясвоечасовае ўступленне на нацыянальную стадыю па віне заяўніка міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі | 13,5 |
| 2.9. перавод на нацыянальную стадыю міжнароднай заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, пададзенай у адпаведнасці з Дагаворам аб патэнтнай кааперацыі | у памеры патэнтных пошлін за падачу і правядзенне экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль |
| 2.10. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на карысную мадэль | 13,5 |
| 2.11. аднаўленне дзеяння патэнта на карысную мадэль | 13,5 |
| 2.12. правядзенне праверкі карыснай мадэлі на адпаведнасць умовам патэнтаздольнасці: | |
| адной карыснай мадэлі, якая змяшчае да дзесяці (уключна) залежных пунктаў формулы | 12 |
| адной карыснай мадэлі, якая змяшчае больш за дзесяць залежных пунктаў формулы | 12 і дадаткова 1 за кожны залежны пункт формулы больш за дзесяць |
| групы карысных мадэляў | 12 і дадаткова 6 за кожную карысную мадэль больш за адну |
| 3. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай прамысловых узораў: | |
| 3.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор у адносінах да: | |
| аднаго варыянта прамысловага ўзору, які змяшчае да сямі (уключна) відаў вырабу | 7 |
| аднаго варыянта прамысловага ўзору, які змяшчае больш за сем відаў вырабу | 7 і дадаткова 1 за кожны від вырабу больш за сем |
| некалькіх варыянтаў прамысловага ўзору | 7 і дадаткова 3,5 за кожны варыянт прамысловага ўзору больш за адзін, 1 за кожны від вырабу больш за сем у адносінах да кожнага варыянта прамысловага ўзору |
| 3.2. прадаўжэнне тэрміну падачы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор з просьбай канвенцыйнага прыярытэту па хадайніцтве заяўніка | 3 |

| | |
|---|---|
| 3.3. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка | 1,5 |
| 3.4. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на прамысловы ўзор за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да трох месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 1 |
| ад трох да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3,5 |
| 3.5. рэгістрацыя прамысловага ўзору ў Дзяржаўным рэестры прамысловых узораў Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на прамысловы ўзор | 7 |
| 3.6. падтрыманне ў сіле патэнта на прамысловы ўзор па гадах: | |
| першы | 3 |
| другі | 3 |
| трэці | 3 |
| чацвёрты | 4 |
| пяты | 4 |
| шосты | 4 |
| сёмы | 7 |
| восьмы | 7 |
| дзявяты | 8,5 |
| дзясяты | 8,5 |
| адзінаццаты | 8,5 |
| дванаццаты | 10 |
| трынаццаты | 10 |
| чатырнаццаты | 10 |

| | |
|---|---|
| пятнаццаты | 10 |
| 3.7. прадаўжэнне тэрміну дзеяння патэнта на прамысловы ўзор | 13,5 |
| 3.8. аднаўленне дзеяння патэнта на прамысловы ўзор | 13,5 |
| 4. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай гатункаў раслін: | |
| 4.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны | 5 |
| 4.2. разгляд змяненняў у матэрыялы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны, якія ўносяцца па ініцыятыве заяўніка | 2 |
| 4.3. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на выдачу патэнта на гатунак расліны за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць | 1 |
| 4.4. змяненне наймення гатунку расліны па ініцыятыве заяўніка | 10 |
| 4.5. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны без падачы заяўнікам вынікаў выпрабаванняў гатунку расліны | 38 |
| 4.6. правядзенне патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны з падачай заяўнікам вынікаў выпрабаванняў гатунку расліны | 19 |
| 4.7. рэгістрацыя гатунку расліны ў Дзяржаўным рэестры гатункаў ахоўных раслін Рэспублікі Беларусь і выдача патэнта на гатунак расліны і пасведчання селекцыянера | 10 |
| 4.8. падтрыманне ў сіле патэнта на гатунак расліны па гадах: | |
| першы | 4 |
| другі | 4 |
| трэці | 4 |
| чацвёрты | 8 |
| пяты | 8 |
| шосты | 8 |
| сёмы | 10 |
| восьмы | 10 |

| | |
|---|---|
| дзявяты | 10 |
| з дзясятага па дваццаць пяты | 14 |
| 5. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай таварных знакаў: | |
| 5.1. падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака, з іх: | |
| падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака, калі рэгістрацыя таварнага знака просіцца для аднаго класа Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 10 |
| падача і правядзенне папярэдняй экспертызы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака, калі рэгістрацыя таварнага знака просіцца больш чым для аднаго класа Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 10 і дадаткова 5 за кожны клас Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг больш за адзін |
| 5.2. правядзенне экспертызы заяўленага знака | 28 |
| 5.3. падача заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака ў адпаведнасці з Мадрыдскім пагадненнем і Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення, праверка і перасылка гэтай заяўкі ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, калі рэгістрацыя таварнага знака просіцца: | |
| для аднаго класа Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 10 |
| больш чым для аднаго класа Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 10 і дадаткова 5 за кожны клас Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг больш за адзін |
| 5.4. падача заявы аб наступным указанні, праверка і перасылка наступнага ўказання ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці ў адпаведнасці з Мадрыдскім пагадненнем і Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення | 7 |
| 5.5. падача заявы аб замене нацыянальнай рэгістрацыі таварнага знака міжнароднай рэгістрацыяй таварнага знака (артыкул 4bis Мадрыдскага пагаднення і Пратакола да Мадрыдскага пагаднення) | 14 |
| 5.6. просьба рэгістрацыі таварнага знака ў адпаведнасці з Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення, калі рэгістрацыя таварнага знака просіцца: | |
| не больш чым для трох класаў Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 600 швейцарскіх франкаў |
| больш чым для трох класаў Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг для рэгістрацыі знакаў | 600 швейцарскіх франкаў і дадаткова 50 швейцарскіх франкаў за кожны клас Міжнароднай класіфікацыі тавараў і паслуг больш за тры |
| 5.7. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага знака, зарэгістраванага ў адпаведнасці з Пратаколам да Мадрыдскага пагаднення | 700 швейцарскіх франкаў |

| | |
|---|---|
| 5.8. падача заявы аб унясенні па ініцыятыве заяўніка змяненняў у матэрыялы заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака | 2 |
| 5.9. падача заявы аб вылучэнні заяўкі на рэгістрацыю таварнага знака | 2 |
| 5.10. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт папярэдняй экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю таварнага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць | 1 |
| 5.11. падача заявы аб пераўтварэнні заяўкі на рэгістрацыю калектыўнага знака ў заяўку на рэгістрацыю таварнага знака | 7 |
| 5.12. правядзенне паўторнай экспертызы заяўленага знака | 10 |
| 5.13. прадаўжэнне тэрміну падачы хадайніцтва аб правядзенні паўторнай экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 1 |
| ад шасці да дванаццаці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за дванаццаць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3 |
| 5.14. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3 |
| 5.15. рэгістрацыя таварнага знака ў Дзяржаўным рэестры таварных знакаў і знакаў абслугоўвання Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на таварны знак | 19 |
| 5.16. рэгістрацыя калектыўнага знака ў Дзяржаўным рэестры таварных знакаў і знакаў абслугоўвання Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на калектыўны знак | 57 |
| 5.17. падача заявы аб пераўтварэнні калектыўнага знака ў таварны знак адной з асоб, якія мелі правы на яго выкарыстанне | 10 |
| 5.18. падача заявы аб раздзяленні рэгістрацыі таварнага знака шляхам размеркавання тавараў, у адносінах да якіх зарэгістраваны таварны знак | 10 |
| 5.19. падача заявы аб раздзяленні міжнароднай рэгістрацыі таварнага знака ў адпаведнасці з Правілам 27bis Агульнай інструкцыі да Мадрыдскага пагаднення аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў і Пратаколам да гэтага пагаднення, праверка і перасылка гэтай заявы ў Міжнароднае бюро Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці | 10 |
| 5.20. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі таварнага знака | 55 |
| 5.21. прадаўжэнне тэрміну дзеяння рэгістрацыі калектыўнага знака | 96 |

| | |
|---|---|
| 5.22. даванне шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння мінулага тэрміну дзеяння рэгістрацыі для: | |
| таварнага знака | 19 |
| калектыўнага знака | 29 |
| 5.23. падача заявы аб прызнанні таварнага знака ці знака, які выкарыстоўваецца ў якасці таварнага знака, агульнавядомым у Рэспубліцы Беларусь таварным знакам | 96 |
| 5.24. унясенне звестак, якія адносяцца да агульнавядомага ў Рэспубліцы Беларусь таварнага знака, у пералік агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў і выдача пасведчання на агульнавядомы ў Рэспубліцы Беларусь таварны знак | 19 |
| 5.25. падача заявы аб спыненні прававой аховы агульнавядомага ў Рэспубліцы Беларусь таварнага знака | 96 |
| 6. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай найменняў месцаў паходжання тавараў і (ці) даваннем права карыстання найменнямі месцаў паходжання тавараў: | |
| 6.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўкі на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару | 96 |
| 6.2. падача заявы аб унясенні па ініцыятыве заяўніка змяненняў у матэрыялы заяўкі на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўкі на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару | 14 |
| 6.3. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт папярэдняй экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, заяўцы на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць | 1 |
| 6.4. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы заяўленага знака за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 2 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 3 |
| 6.5. рэгістрацыя наймення месца паходжання тавару ў Дзяржаўным рэестры найменняў месцаў паходжання тавараў Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару | 45 |
| 6.6. прадаўжэнне тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару | 65 |
| 6.7. даванне шасцімесячнага тэрміну для прадаўжэння мінулага тэрміну дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару | 29 |

| | |
|---|---|
| 7. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з прававой аховай тапалогій інтэгральных мікрасхем: | |
| 7.1. падача і правядзенне экспертызы заяўкі на рэгістрацыю тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы | 19 |
| 7.2. прадаўжэнне тэрміну адказу на запыт экспертызы па заяўцы на рэгістрацыю тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы за кожны месяц прадаўжэння, аб якім просяць: | |
| да трох месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 1 |
| ад трох да шасці месяцаў уключна з даты сканчэння тэрміну | 3 |
| больш за шэсць месяцаў з даты сканчэння тэрміну | 5 |
| 7.3. рэгістрацыя тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы ў Дзяржаўным рэестры тапалогій інтэгральных мікрасхем Рэспублікі Беларусь і выдача пасведчання на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы | 10 |
| 8. Іншыя юрыдычна значныя дзеянні ў адносінах да аб'ектаў права прамысловай уласнасці: | |
| 8.1. унясенне змяненняў, выпраўленняў у дзяржаўныя рэестры аб'ектаў права прамысловай уласнасці, пералік агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў, Дзяржаўны рэестр ліцэнзійных дагавораў, дагавораў уступкі і дагавораў закладу правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны рэестр дагавораў комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) Рэспублікі Беларусь, ахоўныя дакументы на аб'екты права прамысловай уласнасці (патэнты, пасведчанні) і пасведчанні селекцыянера | 7 |
| 8.2. выдача дублікатаў ахоўных дакументаў на аб'екты права прамысловай уласнасці (патэнты, пасведчанні) і пасведчанняў селекцыянера | 5 |
| 8.3. разгляд заявы аб рэгістрацыі ліцэнзійнага дагавора, дагавора ўступкі выключнага права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор, гатунак расліны, таварны знак, тапалогію інтэгральнай мікрасхемы, дагавора аб закладзе маёмасных правоў, якія сведчацца пасведчаннем на таварны знак | 10 і дадаткова 5 за кожныя (звыш аднаго) патэнт, пасведчанне, калі па дагаворы даюцца (перадаюцца) правы па некалькіх патэнтах, пасведчаннях |
| 8.4. разгляд заявы аб рэгістрацыі дагавора комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) | 10 і дадаткова 5 за кожны патэнт, пасведчанне |
| 8.5. разгляд заявы аб рэгістрацыі змяненняў у ліцэнзійны дагавор, дагавор уступкі выключнага права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор, гатунак расліны, таварны знак, тапалогію інтэгральнай мікрасхемы, дагавор аб закладзе маёмасных правоў, якія сведчацца пасведчаннем на таварны знак, дагавор комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу), скасаванні дагавора комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) | 5 і дадаткова 5 за кожны патэнт, пасведчанне, калі змяненні звязаны з даваннем правоў па новым патэнце, пасведчанні |
| 8.6. падача для афіцыйнага апублікавання заявы аб даванні любой асобе права на выкарыстанне аб'екта права прамысловай уласнасці (адкрытая ліцэнзія) ці спыненні дзеяння адкрытай ліцэнзіі | 2 |

| | |
|---|---|
| 8.7. падача ў Апеляцыйны савет пры Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці: | |
| скаргі на рашэнні, прынятыя па выніках папярэдняй ці патэнтнай экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, на рашэнне па выніках экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль ці на выдачу патэнта на прамысловы ўзор, а таксама на рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі таварнага знака, прынятае па выніках паўторнай экспертызы | 19 |
| скаргі на рашэнне папярэдняй экспертызы аб адмове ў прыняцці да разгляду заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны | 19 |
| скаргі на рашэнне аб адмове ў выдачы патэнта на гатунак расліны | 24 |
| скаргі на рашэнне папярэдняй экспертызы аб адмове ў прыняцці да разгляду заяўкі на таварны знак | 10 |
| скаргі на рашэнне папярэдняй экспертызы аб адмове ў прыняцці да разгляду заяўкі на рэгістрацыю і даванне права карыстання найменнем месца паходжання тавару, ці на рашэнне папярэдняй экспертызы аб адмове ў прыняцці да разгляду заяўкі на даванне права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару | 24 |
| скаргі на рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі наймення месца паходжання тавару і даванні права карыстання ім і на рашэнне аб адмове ў даванні права карыстання ўжо зарэгістраваным найменнем месца паходжання тавару | 57 |
| скаргі на рашэнне экспертызы заяўкі на рэгістрацыю тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы | 10 |
| пярэчанні супраць выдачы патэнта на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор, гатунак расліны, а таксама супраць давання прававой аховы таварнаму знаку | 29 |
| пярэчанні супраць рэгістрацыі наймення месца паходжання тавару і (ці) выдачы пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару | 48 |
| заявы аб спыненні дзеяння рэгістрацыі наймення месца паходжання тавару і пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару | 10 |
| 8.8. даванне па хадайніцтве выпісак з дзяржаўных рэестраў аб'ектаў права прамысловай уласнасці, пераліку агульнавядомых у Рэспубліцы Беларусь таварных знакаў, Дзяржаўнага рэестра ліцэнзійных дагавораў, дагавораў уступкі і дагавораў закладу правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага рэестра дагавораў комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) Рэспублікі Беларусь | 5 |
| 8.9. падача хадайніцтва аб аднаўленні прапушчаных заяўнікам тэрмінаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі | 5 |
| 9. Юрыдычна значныя дзеянні, звязаныя з дзейнасцю патэнтных паveраных: | |
| 9.1. падача заявы аб атэстацыі кандыдата ў патэнтныя павераныя | 5 |
| 9.2. правядзенне кваліфікацыйнага экзамену | 14 |

| | |
|---|---|
| 9.3. паўторнае правядзенне кваліфікацыйнага экзамену ці яго часткі | 19 |
| 9.4. рэгістрацыя патэнтнага паверанага і выдача пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверанага | 10 |
| 9.5. падача заявы аб прадаўжэнні тэрміну дзеяння пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверанага | 10 |
| 9.6. падача заявы аб унясенні змяненняў, выпраўленняў у Дзяржаўны рэестр патэнтных паверaных Рэспублікі Беларусь | 7 |
| 9.7. выдача дубліката пасведчання аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверанага | 5 |
| 9.8. даванне па хадайніцтве выпісак з Дзяржаўнага рэестра патэнтных паверaных Рэспублікі Беларусь | 5 |

Дадатак 24
да Падатковага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб**

| Від дзейнасці, які ажыццяўляецца | Стаўкі адзінага падатку за месяц, рублёў | | | |
|---|---|---|---|---|
| | г. Мінск | гарады Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў, Мінскі раён | гарады Баранавічы, Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Жодзіна, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Наваполацк, Орша, Пінск, Полацк, Рэчыца, Светлагорск, Слуцк, Салігорск | іншыя населеныя пункты |
| 1. Індывідуальнымі прадпрымальнікамі: | | | | |
| 1.1. тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў, тэхнічнае абслугоўванне і рамонт матацыклаў | 290 | 252 | 208 | 154 |
| 1.2. рамонт прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў, вытворчасць адзення, вытворчасць абутку, вытворчасць гатовых тэкстыльных вырабаў, акрамя адзення, вытворчасць дываноў і дывановых вырабаў, мыццё, хімічная чыстка і афарбоўванне тэкстыльных і футравых вырабаў | 82 | 71 | 57 | 44 |
| 1.3. аказанне паслуг цырульнямі і салонамі прыгажосці | 128 | 111 | 94 | 68 |
| 1.4. дзейнасць таксі, дзейнасць іншага пасажырскага сухапутнага транспарту, не ўключанага ў іншыя групоўкі, дзейнасць пасажырскага | 177 | 154 | 111 | 96 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| рачнога транспарту, дзейнасць грузавога рачнога транспарту, дзейнасць грузавога аўтамабільнага транспарту | | | | |
| 1.5. агульнае будаўніцтва будынкаў, спецыяльныя будаўнічыя працы | 147 | 128 | 116 | 93 |
| 1.6. медыцынская, у тым ліку стаматалагічная, практыка, іншая дзейнасць па ахове здароўя | 197 | 171 | 139 | 99 |
| 1.7. дзейнасць па чыстцы і прыбіранні, дзейнасць, якая спрыяе вырошчванню сельскагаспадарчых культур і гадаванню жывёл, аказанне сацыяльных паслуг без забеспячэння пражывання | 35 | 30 | 28 | 23 |
| 1.8. даванне месцаў для кароткатэрміновага пражывання (за кожны жылы пакой, які здаецца, у кватэры, жылым доме, за кожны садовы домік, за кожную дачу) | 148 | 129 | 84 | 73 |
| 1.9. здача ў арэнду (субарэнду), наём (паднайманне) жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач, машына-месцаў (за кожны жылы пакой, які здаецца, у кватэры, жылым доме, за кожны садовы домік, за кожную дачу, за кожнае машына-месца), акрамя давання месцаў для кароткатэрміновага пражывання | 35 | 30 | 15 | 12 |
| 1.10. іншыя віды прац і паслуг, не пайменаваныя ў падпунктах 1.1–1.9 гэтага пункта | 131 | 114 | 88 | 70 |
| 1.11. рознічны гандаль таварамі, аднесенымі да наступных груп тавараў: | | | | |
| 1.11.1. хлеб і хлебабулачныя вырабы, малако і малочная прадукцыя | 83 | 72 | 59 | 47 |
| 1.11.2. агародніна, плады, ягады, кавуны, дыні, вінаград | 102 | 89 | 78 | 56 |
| 1.11.3. іншыя харчовыя тавары (за выключэннем піва, піўнога кактэйлю, алкагольных напояў) | 130 | 113 | 98 | 89 |
| 1.11.4. аўтамотатранспартныя сродкі | 438 | 381 | 318 | 299 |
| 1.11.5. адзенне з натуральнай скуры (паліто, паўпаліто, курткі, блэйзары, жакеты, камізэлькі, пінжакі, плашчы, касцюмы), дываны і дывановыя вырабы, складаныя бытавыя электратавары (акрамя электрахаладзільнікаў бытавых і маразільнікаў, машын пральных бытавых) | 299 | 260 | 239 | 221 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1.11.6. іншыя непрадуктовыя тавары (за выключэннем ювелірных і іншых бытавых вырабаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, спецыфічных тавараў, тытунёвых вырабаў, нафтапрадуктаў праз аўтазаправачныя станцыі, каштоўных папер, газет і часопісаў, усіх відаў вырабаў з натуральнага футра, мэблі, электрахаладзільнікаў бытавых і маразільнікаў, машын пральных бытавых, тэлевізійных прыёмнікаў каляровага і чорна-белага адлюстравання, камп'ютараў бытавых персанальных, ноўтбукаў, іх складовых частак і вузлоў, электронных кніг, планшэтных камп'ютараў, мабільных тэлефонаў, запасных частак да аўтамабіляў) | 115 | 100 | 89 | 79 |
| 1.12. грамадскае харчаванне праз аб'екты грамадскага харчавання (за выключэннем продажу алкагольных напояў, піва, піўнога кактэйлю і тытунёвых вырабаў) | 158 | 137 | 125 | 97 |
| 2. Фізічнымі асобамі, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, за выключэннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь: | | | | |
| 2.1. рэалізацыя кацянят і шчанят пры ўмове ўтрымання хатняй жывёлы (кошкі, сабакі) | 44 | 38 | 35 | 32 |
| 2.2. рэалізацыя прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады, жывёл (за выключэннем кацянят і шчанят) | 72 | 63 | 55 | 54 |
| 2.3. рэалізацыя хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, гатовай кулінарнай прадукцыі | 45 | 39 | 27 | 20 |
| 2.4. відэаздымка падзей | 122 | 106 | 89 | 64 |
| 2.5. дзейнасць акцёраў, танцораў, музыкаў, выканаўцаў гутарковага жанру, якія выступаюць індывідуальна, аказанне паслуг тамадой | 120 | 104 | 84 | 60 |
| 2.6. дзейнасць капіравання, падрыхтоўкі дакументаў і іншая спецыялізаваная офісная дзейнасць | 79 | 69 | 60 | 45 |
| 2.7. дзейнасць пісьмовага і вуснага перакладу | 79 | 69 | 60 | 45 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.8. дзейнасць, звязаная з віншаваннем з днём нараджэння, Новым годам і іншымі святамі незалежна ад месца іх правядзення | 120 | 104 | 84 | 60 |
| 2.9. кашэнне траў на газонах, прыбіранне азяленёнай тэрыторыі ад лісця, скошанай травы і смецця | 28 | 24 | 21 | 18 |
| 2.10. музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў | 120 | 104 | 84 | 60 |
| 2.11. нанясенне аквагрыму | 74 | 64 | 57 | 45 |
| 2.12. настройка музычных інструментаў | 59 | 51 | 44 | 26 |
| 2.13. аказанне паслуг па вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі, аказанне паслуг па драбленні зерня, выпас жывёлы | 22 | 19 | 16 | 13 |
| 2.14. цырульніцкія і касметычныя паслугі, паслугі манікюру і педыкюру | 105 | 91 | 59 | 33 |
| 2.15. аказанне паслуг, якія аказваюцца пры дапамозе аўтаматаў для вымярэння вагі, росту | 23 | 20 | 16 | 13 |
| 2.16. даванне належных на праве ўласнасці фізічнай асобе іншым фізічным асобам жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач для кароткатэрміновага пражывання (за кожны жылы пакой, які здаецца, у кватэры, жылым доме, за кожны садовы домік, за кожную дачу) | 133 | 116 | 82 | 71 |
| 2.17. вытворчасць адзення (у тым ліку галаўных убораў) і абутку з матэрыялаў спажыўца | 63 | 55 | 47 | 24 |
| 2.18. працы і паслугі дызайну інтэр'ераў, графічнага дызайну, афармлення (упрыгажэння) аўтамабіляў, унутранай прасторы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), памяшканняў, іншых месцаў, мадэліраванне прадметаў афармлення інтэр'ера, тэкстыльных вырабаў, мэблі, адзення і абутку, прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў | 110 | 96 | 86 | 43 |
| 2.19. распрацоўка вэб-сайтаў, устаноўка (настройка) камп'ютараў і праграмнага забеспячэння, аднаўленне камп'ютараў пасля збою, рамонт, тэхнічнае абслугоўванне камп'ютараў і перыферыйнага абсталявання, навучанне працы на персанальным камп'ютары | 110 | 96 | 86 | 44 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.20. распілоўка і колка дроў, пагрузка і разгрузка грузаў | 18 | 16 | 12 | 9 |
| 2.21. рамонт і аднаўленне, уключаючы перацяжку, хатняй мэблі з матэрыялаў спажыўца | 69 | 60 | 52 | 28 |
| 2.22. рамонт гадзіннікаў, абутку | 58 | 50 | 43 | 25 |
| 2.23. рамонт швейных, трыкатажных вырабаў і галаўных убораў, акрамя рамонту дываноў і дывановых вырабаў | 66 | 57 | 50 | 42 |
| 2.24. рэпетытарства | 38 | 33 | 30 | 24 |
| 2.25. зборка мэблі | 63 | 55 | 47 | 28 |
| 2.26. мыццё і прасаванне пасцельнай бялізны і іншых рэчаў у хатніх гаспадарках грамадзян, выгул хатніх жывёл і догляд за імі, закупка прадуктаў, мыццё посуду і прыгатаванне ежы ў хатніх гаспадарках грамадзян, унясенне платы за карыстанне жылым памяшканнем і жыллёва-камунальныя паслугі са сродкаў асобы, якая абслугоўваецца, | 28 | 24 | 21 | 18 |
| 2.27. упакоўка тавараў, дадзеных спажыўцом | 49 | 43 | 33 | 28 |
| 2.28. паслугі ўтрымання, догляду і дрэсіроўкі хатніх жывёл, акрамя сельскагаспадарчых жывёл | 26 | 23 | 16 | 13 |
| 2.29. догляд за дарослымі і дзецьмі | 28 | 24 | 21 | 18 |
| 2.30. фотаздымка, выраб фатаграфій | 114 | 99 | 77 | 60 |
| 2.31. чыстка і прыбіранне жылых памяшканняў | 66 | 57 | 55 | 45 |
| 2.32. тынкавальныя, малярскія, шкляныя працы, працы майстравання пакрыцця падлогі і абліцоўвання сцен, абклейвання сцен шпалерамі, кладка (рамонт) пячэй і камінаў | 136 | 118 | 103 | 58 |
| 3. Разавая рэалізацыя замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, прадукцыі раслінаводства і пчалаводства | 170 | 148 | 128 | 111 |